Хто ёсць Хто
сярод беларусаў свету



2000

Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Францыска Скарыны
пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь

Грамадскае аб'яднанне
"Міжнародная асацыяцыя беларусістаў"

Хто ёсць Хто сярод беларусаў свету

Энцыклапедычны даведнік

Частка 1

Беларусы і ўраджэнцы Беларусі ў памежных краінах

Выданне першае, разлічанае на дапаўненні



Мінск 2000

УДК 008 (476) (092) (035)
ББК 70(Беи)я2
Х 87

Рэдакцыйная калегія

Адам Мальдзіс, старшыня (Цэнтр імя Ф. Скарыны)
Юрый Вашкевіч (Цэнтр імя Ф. Скарыны)
Вольга Гапоненка (Музей гісторыі НАНБ)
Яніна Кісялёва (Цэнтральная навуковая бібліятэка НАНБ)
Сяргей Панізьнік (Саюз беларускіх пісьменнікаў)
Віталь Скалабан (Цэнтр імя Ф. Скарыны)
Галіна Сяргеева намеснік старшыні (Інстытут гісторыі НАНБ)
Ірына Тамільчык, сакратар (Цэнтр імя Ф. Скарыны)
Любоў Уладыкоўская-Канаплянік (Цэнтр імя Ф. Скарыны)
Ларыса Языковіч (Беларуская энцыклапедыя)

Х 87

Хто ёсць хто сярод беларусаў свету. Энцыклапедычны даведнік. Частка 1. Беларусы і ўраджэнцы Беларусі ў памежных краінах / Рэдакцыйная калегія: А. Мальдзіс і інш. – Мн. "Энцыклапедыкс", 2000. – 334 с.

ISBN 985-6599-17-2

Матэрыял даведніка згрупаваны па чатырох раздзелах: агульныя артыкулы, арганізацыі, перыядычныя выданні, персаналіі. У раздзел "Персаналіі" ўключаны як дзеячы беларускай дыяспары, так і ўраджэнцы Беларусі – беларусы, рускія, палякі, літоўцы, габрэі, татары. У храналагічным плане ўвага ў даведніку засяроджана на беларускай дыяспары XX ст., але ў раздзел "Персаналіі" ўключаны таксама матэрыялы XVI-XIX стст.

УДК 008 (476) (092) (035)

ББК 70(Беи)я2

ISBN 985-6599-17-2

© "Энцыклапедыкс", 2000

Рэдкалегія выказвае сардэчную падзяку Дзяржаўнаму камітэту па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь за фінансаванне работы па падрыхтоўцы даведніка да друку і метадычныя парады.

Ад рэдкалегіі

Работа над даведнікам была распачата ў Цэнтры імя Ф. Скарыны ў 1993 г. у адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай "Беларусы ў свеце". Да 1997 г. яна вялася на грамадскіх пачатках. З 1997 г. кіраўніцтва і фінансаванне работы ажыццяўляліся Дзяржаўным камітэтам па справах рэлігій і нацыянальнасцей. Тады ж было вырашана падзяліць даведнік на дзве часткі: памежныя краіны (уключаючы новыя дзяржавы, якія ўтварыліся на тэрыторыі былога Савецкага Саюза) і далёкае замежжа. Такі падзел быў абумоўлены спецыфікай матэрыялу: у памежных краінах (тэрмін "блізкае замежжа" быў тут адкінуты як навукова недакладны) беларусы з'яўляюцца пераважна карэнным (аўтахтонным) насельніцтвам або перасяленцамі, у далёкім замежжы — пераважна эмігрантамі (эканамічнымі, палітычнымі).

У кожнай частцы матэрыялы згрупаваны па чатырох раздзелах: агульныя артыкулы; арганізацыі, установы і падзеі; перыядычныя выданні і зборнікі; персаналіі. Унутры раздзелаў артыкулы размешчаны ў алфавітным парадку. У раздзел "Персаналіі" ўключаны як дзеячы беларускай дыяспары, так і ўраджэнцы Беларусі — не толькі беларусы, але і рускія, палякі, яўрэі, літоўцы, татары. Выбар ажыццяўляўся зыходзячы як са значнасці асобы, яе дзейнасці, так і наяўнасці матэрыялу. Прытым у дачыненні да асоб, якія не засведчылі сваю беларускасць (належнасцю да арганізацый дыяспары, творчасцю на беларускай мове і г. д.), пад увагу бралася толькі тэрыторыя сучаснай Беларусі (г. зн. не ўключаны ўраджэнцы Беласточчыны, Віленшчыны, Латгаліі, Пскоўшчыны, Смаленшчыны, якія да рэвалюцыі ўваходзілі ў Гродзенскую, Віленскую, Віцебскую і Магілёўскую губ.). З другога боку, Віленшчына да 1939 г. не разглядаецца як тэрыторыя памежнай краіны, паколькі яна арганічна была звязана з заходняй часткай Беларусі. Не ўключаны ў даведнік агульнавядомыя ўраджэнцы Беларусі, дзейнасць і творчасць якіх належаць пераважна Польшчы (Т. Касцюшка, С. Манюшка, А. Міцкевіч, Ю. Нямцэвіч і інш.).

У храналагічным плане ўвага ў даведніку засяроджана на беларускай дыяспары XX ст. Але ў агульныя артыкулы і ў раздзел "Персаналіі" ўключаны таксама матэрыялы XI–XIX стст.

Чытачоў просім ласкава ўлічыць, што даведнік яшчэ далёкі ад паўнаты (тут мы спадзяемся на крытычныя заўвагі і дапаўненні), што аўтарская работа над ім фактычна спынілася ў 1998 г., а пазнейшыя дапаўненні ўносіліся, так бы мовіць, на грамадскіх пачатках. У першым выданні адсутнічаюць многія ілюстрацыі. Рыхтуюцца другое выданне і другая частка даведніка, дзе будуць прадстаўлены беларусы і ўраджэнцы Беларусі (пераважна эмігранты) з краін, з якімі Беларусь не мяжуе.

I. Агульныя артыкулы

Бежанцы

Асобы, якія пакінулі краіну свайго грамадзянства ці пастаяннага месца жыхарства ў выніку праследаванняў па палітычных, расавых, рэлігійных матывах, або ў выніку ўзброеных дзеянняў ці іншых надзвычайных сітуацый і не атрымалі грамадзянства іншай дзяржавы. У міжнародным праве паняцце "бежанец" з'явілася пасля Першай сусветнай вайны для абазначэння асоб, якія добраахвотна ці пад прымусам ваенных або грамадзянскіх улад пакінулі тэрыторыі, што знаходзіліся пад пагрозай заняцця або былі заняты непрыяцелем.

У Беларусі з'ява бежанства была шырока распаўсюджана у час Першай сусветнай вайны. Яна набыла масавы характар у 1915 г. у сувязі з паражэннем расійскай арміі вясной - летам 1915 г. Да восені 1915 г. бежанскі рух быў стыхійным, плана эвакуацыі не было. Дадатковую блытаніну ўносіла тое, што расійскія ваенныя ўлады ва ўмовах адступлення спрабавалі праводзіць палітыку "выпаленай зямлі", часткай якой была прымусовая дэпартацыя насельніцтва прыфрантавой зоны ўглыб краіны. Звычайна рухаліся на фурманках, над якімі рабілася буда (абцягнуты палатном каркас з арэшніку). Асабліва шмат бежанцаў запоўніла Брэсцка-Маскоўскую шашу, дзе ў ліпені 1915 г. на ўчастку Кобрын – Баранавічы знаходзілася 400 тыс. чалавек. Становішча бежанцаў было надзвычай цяжкім. Голад, дрэнныя жыллёвыя ўмовы спрыялі развіццю хвароб, у т. л. шырокаму распаўсюджанню эпідэмій. Высокай была смяротнасць. Узнікалі канфлікты з мясцовым насельніцтвам. З лета 1915 г. расійскія ўлады пачалі прымаць меры па арганізацыі бежанскага руху. 24.7.1915 г. быў уведзены інстытут Галоўнаўпаўнаважанага па ўладкаванні бежанцаў на франтах. Беларусь увайшла ў раён дзейнасці Галоўнаўпаўнаважанага (С. Зубчанінаў) па ўладкаванні бежанцаў Паўночна-Заходняга фронта, які вызначаў парадак высялення, напрамкі і спосабы перамяшчэння бежанцаў у вызначаныя раёны, наглядаў за ўрачэбна-санітарнай і харчовай дапамогай бежанцам. Галоўнаўпаўнаважанаму падпарадкоўваліся раённыя ўпаўнаважаныя ў Гродзенскай, Мінскай і Віцебскай губернях.

Па патрабаванні ваенных улад Усерасійскі земскі саюз і Усерасійскі саюз гарадоў разгарнулі на шляхах следавання бежанцаў сетку пунктаў для аказання харчовай і медыцынскай дапамогі. У жніўні 1915 г. па загаду Галоўнага начальніка забеспячэння армій Паўночна-Заходняга фронта генерала М. Данілава і па ўзгадненні з камандуючымі арміямі былі вызначаны асноўныя напрамкі руху бежанцаў з заходніх раёнаў Беларусі ва ўсходнія, а таксама этапы перасялення. 30.8.1915 г. быў прыняты закон "Аб забеспячэнні патрэб бежанцаў", пры міністры ўнутраных спраў Расійскай імперыі была створана Асобая нарада па ўладкаванні бежанцаў, якая каардынавала сваю дзейнасць з мясцовымі губернскімі, павятовымі і гарадскімі органамі ўлады. Значную дапамогу бежанцам аказваў Камітэт яе імператарскай высокасці вялікай княжны Таццяны Мікалаеўны (Таццянінскі камітэт, пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. пераўтвораны ва Усерасійскі камітэт дапамогі пацярпелым ад вайны). У верасні 1915 г. пры Таццянінскім камітэце быў утвораны Асобы аддзел па рэгістрацыі бежанцаў з выканаўчым органам — Цэнтральным усерасійскім бюро па рэгістрацыі бежанцаў. Актыўна дапамагалі беларускім бежанцам розныя дабрачынныя арганізацыі, у т. л. нацыянальнага характару. Так, у красавіку 1915 г. у Вільні было заснавана Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны (кіраўнік В. Іваноўскі), якое адкрыла шэраг аддзелаў (у тым ліку ў Мінску) на месцах з правам весці работу незалежна ад таварыства ў Вільні. Першай установай, якая была створана за межамі Беларусі, стала Беларускае таварыства ў Петраградзе па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны (студзень 1916 г.). Гэтыя арганізацыі не толькі дапамагалі палепшыць матэрыяльнае становішча перасяленцаў, але і клапаціліся пра іх духоўна-нацыянальные развіццё. Па дадзеных Асобага аддзела па рэгістрацыі бежанцаў, на 1 студзеня 1917 г. колькасць бежанцаў з 4 беларускіх губерняў складала 879168 чал. З 1915 да 1916 гг. асноўная маса бежанцаў выселілася з Гродзенскай губерні (іх колькасць складала 689178 чал. (каля 78 % ад агульнай колькасці бежанцаў з беларускіх зямель). На 1.2.1917 г. колькасць бежанцаў з 5 заходніх губерняў склала 1130042 чалавекі. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. сярод бежанцаў дзейнічалі арганізацыі Беларускай сацыялістычнай грамады, Беларускай народнай грамады. У Маскве адбыліся 2 з'езды бежанцаў-беларусаў [24–27.9.(7–10.10) і 19–21.11.(2–4.12).1917 г.]. Частка бежанцаў прыжылася на новых месцах і паступова асімілявалася, аднак нямала было ў бежанскім асяроддзі і тых, хто, нягледзячы на адарванасць ад радзімы, цікавіўся яе праблемамі і падтрымліваў партыі, у праграмах якіх праводзілася ідэя адраджэння Беларусі. Так, у час выбараў у агульнарасійскі Устаноўчы сход у лістападзе 1917 г. спіс, па якім праходзіла Беларуская Сацыялістычная Грамада, атрымаў 998 галасоў выбаршчыкаў у Калужскай губерні (пераважную большасць якіх складалі бежанцы з Беларусі).

Новую хвалю бежанства з Беларусі выклікала наступленне нямецкай арміі ў лютым - сакавіку 1918 г. Галоўным чынам бежанцы-беларусы асядалі ў Петраградзе, ва ўнутраных губернях Расіі (Арлоўская, Калужская, Курская, Маскоўская, Тульская, Уладзімірская), у Паволжы, на Украіне. Паводле дадзеных Народнага камісарыята ўнутраных спраў, па стану на 11.5.1918 г. у Расіі жыло 2292395 выхадцаў з Беларусі, з якіх 2059857 складалі беларусы і рускія. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. СНК РСФСР абвясціў, што ўсе бежанцы, якія не

адмовіліся ад расійскага грамадзянства, разглядаюцца як грамадзяне РСФСР (пастанова ад 27.7.1918 г.). У 1918–1919 гг. справамі бежанцаў займалася Цэнтральная калегія па справах аб палонных і бежанцах (ЦКПБ), створаная ў красавіку 1918 г. пры Наркамаце па ваенных справах РСФСР, у маі 1919 г. перададзеная ў Наркамат унутраных спраў РСФСР. З чэрвеня 1918 г. усе прыватныя і грамадскія арганізацыі, што дапамагалі бежанцам, маглі дзейнічаць толькі з дазволу ЦКПБ і знаходзіліся пад яе кантролем. У ліпені 1918 г. усе ўрадавыя ўстановы, якія займаліся справамі бежанцаў, былі скасаваны.

Па стану на сакавік 1918 г. бежанцам-беларусам дапамагалі Аддзел дапамогі бежанцам пры Багадухаўскай земскай управе Харкаўскай губерні, Арганізацыя бежанцаў-беларусаў Вербскай воласці Паўлаградскага павета Екацярынаслаўскай губерні, Арганізацыя бежанцаў-беларусаў Пакроўскага павятовага земска-гарадскога камітэта дапамогі бежанцам (Уладзімірская губ.), Арэнбургскі гурток беларусаў, Бежанскі аддзел Вейдзелеўскага палітычнага камітэта, Бежанскі камітэт Бекаўскай воласці Сярдобскага павета Саратаўскай губерні, Бежанскі павятовы камітэт пры Медынскай земскай управе Калужскай губерні, Беларуска-ўкраінскі камітэт дапамогі ахвярам вайны ў Барнауле, Беларуская народная грамада ў Маскве, Беларуская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя ў Петраградзе, Беларуская сацыялістычная грамада ў Маскве, Беларуская сацыялістычная грамада ў Петраградзе, Беларуская чыгуначная грамада ў Маскве, "Беларуская хатка" ў Арле, "Беларуская хатка" ў Маскве, "Беларуская хатка" ў Петраградзе, Беларускі нацыянальны гурток у г. Багародзіцку Тульскай губерні, Белеўскае аддзяленне Беларускай грамады Тульскай губерні, Бранскі валасны камітэт Жыздрынскага павета Калужскай губерні, Гарадскі камітэт па ўладкаванні бежанцаў г. Аткарска (Саратаўская губ.), Гельсінгфорская народная грамада, Гурток беларускай сацыялістычнай моладзі ў Калузе, Жыздрынскі аддзел Беларускай народнай грамады, Калужскі аддзел Беларускай народнай грамады, Камітэт па ўладкаванні бежанцаў пры Гарахавецкім павятовым і гарадскім камітэце (Уладзімірская губ.), Лівенскі валасны камітэт дапамогі бежанцам (Варонежская губ.), Нова-Торжскі аддзел Беларускай народнай грамады, Орган бюро Беларускай народнай грамады ў Екацярынаславе, Яраслаўскае беларускае таварыства, Саюз беларусаў г. Архангельска, Саратаўскі аддзел Беларускай народнай грамады, Сестрарэцкі аддзел Беларускай народнай грамады, Таганрогскі гарадскі камітэт па бежанцах, Тамбоўскі аддзел Беларускай народнай грамады, Тульскі аддзел Беларускай народнай грамады, Уфімскі камітэт бежанцаў-беларусаў і інш. У 1918–1919 гг. работу сярод бежанцаў-беларусаў праводзілі Беларускі нацыянальны камісарыят і беларускія секцыі РКП(б). Па ініцыятыве Беларускага нацыянальнага камісарыята ў ліпені 1918 г. у Маскве адбыўся Усерасійскі з'езд бежанцаў з Беларусі, дзе былі прыняты важныя рашэнні, якія датычыліся лёсу Беларусі. Вяртанне бежанцаў на бацькаўшчыну пачалося ўжо ў жніўні 1918 г., калі паміж ЦКПБ і германскімі генеральнымі консуламі ў Маскве і Петраградзе было заключана пагадненне аб больш планамернай рээвакуацыі бежанцаў.

Масавае вяртанне бежанцаў-беларусаў адбылося пасля завяршэння савецка-польскай вайны 1919–1921 гг. на аснове заключанага 24.2.1921 г. дагавора аб рэпатрыяцыі паміж Польшчай, з аднога боку, і РСФСР і УССР, з другога. З 1918 да 1924 г. толькі ў Заходнюю Беларусь вярнулася каля 700 тыс. бежанцаў. У складзе Часовага рабоча-сялянскага савецкага урада Беларусі (студзень–люты 1919 г.) дзейнічала Камісія па справах аб палонных і бежанцах. У Беларусі пытаннямі эвакуацыі і рзвакуацыі бежанцаў таксама займаліся Галоўная камісія па справах аб палонных і бежанцах (1919), Асобаўпаўнаважаны Цэнтральнай Калегіі аб палонных і бежанцах (1919), Мінская губернская камісія аб палонных і бежанцах (1919), Упраўленне Галоўнага ўпаўнаважанага Заходніх абласцей Цэнтрэвака (Галоўэваказах, 1920–1922). Беларускае упраўленне па эвакуацыі насельніцтва (Белэвак, 1920–1922).

У часы Другой сусветнай вайны паняцце "бежанцы" у адносінах да беларусаў, якія пакідалі радзіму, амаль не ўжывалася. Асобы, якія былі вымушаны пакінуць родныя месцы па тых ці іншых прычынах, разглядаліся як асобы ў эвакуацыі ці перамешчаныя асобы. Пасля Другой сусветнай вайны СССР адмовіўся ад удзелу ў галоўных міжнародна-прававых актах, дзе вызначаўся статус бежанцаў і абавязкі дзяржаў у адносінах да іх (Канвенцыя 1951 г. і Пратакол 1967 г.), спаслаўшыся на тое, што пад выглядам бежанцаў дзяржавы Захаду падтрымліваюць ваенных і крымінальных злачынцаў і выкарыстоўваюць іх супраць сацыялістычных краін. Праблема бежанства лічылася для СССР неактуальнай.

У пачатаку 1990-х гг. праблема бежанства зноў набыла актуальнасць у сувязі з працэсам распаду СССР і міжэтнічнымі канфліктамі на яго тэрыторыі, а таксама з большай адкрытасцю былых саюзных рэспублік навакольнаму свету. Беларусь стала краінай, якая прымае бежанцаў. Бежанцы, якія трапляюць сюды, умоўна дзеляцца на дзве катэгорыі. Першую складалі беларусы або прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей былога СССР, якія перасяляліся ў Рэспубліку Беларусь у пошуках прытулку ад ваенных дзеянняў або з прычыны нязгоды з палітыкай кіраўніцтва новых незалежных дзяржаў, дзе яны пражывалі на момант ліквідацыі СССР. Другую катэгорыю бежанцаў складалі выхадцы з краін Азіі і Афрыкі, якія спадзяваліся трапіць з тэрыторыі Беларусі ў развітыя краіны Заходняй Еўропы. Па афіцыйных дадзеных, у Рэспубліцы Беларусь у 1992 г. было зарэгістравана каля 10 тыс. прэтэндэнтаў на статус бежанцаў, у 1993 г. - 10442, у 1994 г. - 5323, у 1995 г. - 3762. Па даных УВКБ ААН, на Беларуси па стану на канец ліпеня 2000 г. жыло 389 чалавек са статусам бежанцаў. З іх 297 былі з Афганістана, 35 – з Грузіі, 14 – з Азербайджана, 17 з Таджыкістана, 18 – з Эфіопіі, 4 – з Ірана, і па аднаму з Індыі, Ірака, Ліберыі, Руанды. 22.2.1995 г. Рэспубліка Беларусь прыняла закон аб бежанцах з улікам палажэнняў Канвенцыі 1951 г. і Пратакола 1967 г. (уступіў у дзеянне з 1.7.1995 г.). У 1999 г. прыняты новы закон аб бежанцах. У 1992 г. у Беларусі створана Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў з задачай аказання ім дапамогі. У складзе

беларускага ўрада праблемамі бежанцаў займаецца Камітэт па міграцыі пры Міністэрстве працы Рэспублікі Беларусь. У савецкай гістарыяграфіі тэма бежанства даследавалася фрагментарна. З канца 1980-х г. актыўна распрацоўваецца беларускімі гісторыкамі. Асэнсаванню бежанства як важнай падзеі ў гісторыі Беларусі пачатку XX ст. садзейнічала выстаўка і навуковыя чытанні "Бежанства. Невядомы зыход. 1915–1921", праведзеныя ў снежні 1995 г. у Бельску-Падляшскім (Польшча).

Аляксандр Ціхаміраў

Беларускае рэлігійнае жыццё ў памежных краінах

Беларускія царкоўныя арганізацыі, прыходы, суполкі задавальняюць рэлігійныя патрэбы вернікаў-беларусаў у памежных краінах — арганізуюць супольныя малітвы, сумеснае святкаванне рэлігійных святаў, вядуць асветна-выхаваўчую работу сярод вернікаў, займаюцца дабрачыннай, выдавецкай, грамадска-культурнай дзейнасцю.

Беларусы, якія жывуць на сваіх этнічных землях у межах Польшчы, галоўным чынам на Беласточчыне і Падляшшы, і якіх налічваецца, па розных меркаваннях, ад 200 да 500 тысяч чалавек, у асноўным з'яўляюцца вернікамі Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы. Яны колькасна пераважаюць у Беластоцка-Гданьскай і Варшаўска-Бельскай епархіях. Епархіі падзяляюцца на дэканаты (благачынні): Беласток, Сямяцічы, Гарадок, Гайнаўка, Бельск-Падляшскі, Нарва, Саколка і Нарэўка. На Беласточчыне і Падляшшы існуюць праваслаўныя прыходы, у якіх вернікі — пераважна беларусы (да 90 %). Такіх прыходаў цяпер налічваецца каля 100. У сваёй дзейнасці царква карыстаецца царкоўнаславянскай мовай, а таксама мовамі сваіх вернікаў (са студзеня 1988 г. пачаліся казанні на беларускай мове ў Беластоцкай царкве Марыі Магдалены). З 1989 г. прадстаўнікамі беларускай праваслаўнай моладзі ў Беластоку пачаў выдавацца часопіс "Фос" (ад грэчаскага — "Святло"), прысвечаны нацыянальна-рэлігійным праблемам. У 1989 г. ён атрымаў бласлаўенне архіепіскапа Беластоцкага Савы і такім чынам набыў афіцыйны статус царкоўнага органа. У Падляшскім тыднёвіку "Праваслаўе" ў 1990-х гг. існуе дадатак на беларускай мове. Беларуская праваслаўная моладзь у Польшчы актыўна ўдзельнічае ў справах Праваслаўнага брацтва, філіялы якога існуюць ва ўсіх епархіях ПАПЦ. Гэтая рэлігійна-грамадская арганізацыя ставіць сваёй мэтай адраджэнне духоўных каштоўнасцей сярод моладзі, аднаўленне старадаўніх культурных традыцый, у тым ліку беларускай. Аддзяленні Брацтва праваслаўнай моладзі Варшаўска-Бельскай і Беластоцка-Гданьскай епархіі дапамагаюць юнакам і дзяўчатам у набыцці рэлігійнай адукацыі, арганізуюць прыходскія і міжпрыходскія сустрэчы, паломніцтвы па святых мясцінах, у тым ліку з 1989 г. — на найвялікую праваслаўную святыню ў Польшчы гару Грабарку, шукаюць арганізаваныя формы адпачынку для моладзі і дзяцей, займаюцца выдавецкай дзейнасцю, праводзяць фестывалі царкоўнай музыкі, наладжваюць сувязі з праваслаўнай моладдзю Беларусі. У 1992 г. 26 гурткоў брацтва дзейнічалі ў 23 прыходах Беластоцка-Гданьскай епархіі. На стан праваслаўнай царквы ў Польшчы і беларускіх вернікаў у ёй (іх, па розных падліках, налічваецца ад 100 да 280 тыс. чалавек) звяртаюць увагу беларускія палітычныя і грамадска-культурныя арганізацыі ў Польшчы (Беларускае дэмакратычнае аб`яднанне, Беларускае аб`яднанне студэнтаў, Беларускае грамадска-культурнае таварыства і інш.).

Беларускае рэлігійнае жыццё пэўным чынам вызначаецца і ў краінах СНД. Так, у Маскве, пры Таварыстве беларускай культуры імя Ф. Скарыны з 1991 г. дзейнічаюць беларускія уніяцкая і каталіцкая суполкі. У Санкт-Пецярбургу па ініцыятыве Беларускага грамадска-культурнага таварыства у 1993 г. створана праваслаўная суполка. Мэрыя Санкт-Пецярбурга выдзеліла пляцоўку для пабудовы беларускай царквы, але адсутнасць сродкаў не дазваляе пакуль яе пачаць. Праваслаўная беларуская суполка існуе таксама ў Рызе.

Ларыса Языковіч

Беларусы на Украіне

Працэс фарміравання беларускай прысутнасці на ўкраінскіх землях налічвае шмат стагоддзяў. У IX–X стст. плямёны радзімічаў і крывічоў былі аб'яднаны пад уладай кіеўскіх князёў. Пазней, у XI ст., калі Полацкая зямля адасобілася ад Кіева, значныя людскія перамяшчэнні выклікаліся эканамічным і палітычным становішчам, голадам, эпідэміямі, ваеннымі сутыкненнямі. Неаднойчы полацкія князі выбіраліся на Кіеўскі пасад, а гродзенскія і пінскія князі выстаўлялі свае дружыны ў сумесных паходах супраць полаўцаў.

У XII ст., у час існавання ўдзельных княстваў, назіраецца пашырэнне сувязей мінскага, друцкіх, полацкага князёў з паўднёварускімі, стварэнне дынастычных саюзаў. На поўдні цесныя палітычныя і культурныя сувязі з Кіевам мела Тураўскае княства. Праз гарады Тураў і Пінск ішлі шляхі з Кіева ў Польшчу, што ўмацоўвала іх ролю ў дзейнасці Кіеўскай Русі. У XII–XIII стст. насельніцтва зямель Панізоўя Сожа з Гомелем, Чачэрскам, а таксама Рагачоў і Рэчыца ўваходзілі ў склад Чарнігаўскага княства, а Бярэсце — у сферу ўплыву Галіцкага княства. Барацьба паміж галіцка-валынскімі і мацнеючымі літоўскімі князямі ў канцы XIII ст. завяршылася перамогай апошніх, у выніку чаго ўсё Верхняе Панямонне аказалася пад уладай Вялікага Княства Літоўскага.

Аб'яднанне літоўскіх, беларускіх і значнай часткі ўкраінскіх зямель у адзіную дзяржаву стварала ўмовы для міграцыі беларускага насельніцтва. У выніку бітваў, якіх было шмат у XIII–XVII стст., многа людзей прымусова

ці добраахвотна перамяшчалася з месца на месца. У Вялікім Княстве Літоўскім былі створаны прававыя падставы для свабоднага перамяшчэння як на тэрыторыі княства, так і за яго межы. Беларускія і ўкраінскія праваслаўныя магнаты атрымалі роўныя правы з літоўскімі магнатамі-католікамі. Іншае становішча было ў сялянства, якое, пратэстуючы супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, уцякала ад сваіх гаспадароў у неабжытыя мясціны Украіны. Хутка пачало развівацца "слаўнае Запарожскае войска". Шмат пераходаў у суседнія землі назіралася ў галодныя, неўраджайныя гады. Але не ўсе беларусы, якія ўцякалі на Украіну ад голаду, заставаліся там назаўсёды.

Антыфеадальныя паўстанні канца XV – пачатку XVI ст. пад кіраўніцтвам С. Налівайкі (1594), Т. Трасілы (1630), І. Сулімы (1635), Паўлюка (1637), Я. Астраніцы (1638), Дз. Гуні, якія адбываліся на Украіне і ў якіх прымалі ўдзел беларусы, таксама суправаджаліся значнымі перамяшчэннямі сялянства. Асобнае месца ў гісторыі беларускага і ўкраінскага народаў займае вызваленчая вайна 1648–1654 гг. Сярод людзей, блізкіх да гетмана Хмяльніцкага, можна назваць выхадцаў з беларускіх зямель Станіслава Крычэўскага, Яна Кастырскага. Беларусы былі ў складзе вайсковых адзінак, аб чым сведчаць беларускія прозвішчы, якія сустракаюцца ў спісах многіх палкоў.

Разам з украінцамі беларусы засялялі землі па р. Уздай і Сула. Тут былі заснаваны гарады Барва, Жураўка, Курэнка, Свецін, Сінец і інш. Беларускія пасяленні існавалі на левабярэжнай Украіне, іх засяляла пераважна сялянская беднота, але былі і заможныя перасяленцы. І хаця эканамічныя і сацыяльна-палітычныя ўмовы Беларусі і Украіны другой паловы XVII–XVIII стст. у агульных рысах былі аднолькавыя, паток беларускіх перасяленцаў не зменшыўся. Гэта былі ўдзельнікі антыфеадальных выступленняў, сялянства, шляхта. Назіралася і прымусовае перасяленне для наладжвання гаспадаркі на новых землях. Міграцыя працоўнай сілы праяўлялася і ў выглядзе адыходніцтва. Па дадзеных перапісу 1897 г. каля 34 тыс. чал. з пяці беларускіх губерняў працавалі на Украіне. У XIX ст. шляхі адыходнікаў цягнуліся ў Екацярынаслаўскую, Кіеўскую, Херсонскую і Чарнігаўскую губерні, дзе паскорана развіваліся прамысловасць, транспарт, горная справа.

Цікавае і багатае на падзеі жыццё беларусаў на Украіне ў пачатку XX ст. У 1905–1912 гг. на Украіне жыла Цётка. Тут былі выдадзены ў 1906 г. яе паэтычныя зборнікі "Скрыпка беларуская", "Хрост на свабоду". На ўкраінскай зямлі працавалі М. Доўнар-Запольскі (там ён напісаў "Гісторыю Беларусі", "Асновы дзяржаўнасці Беларусі"), У. Фальскі (дырэктар тэатра імя М. Занькавецкай у Кіеве), навуковец Л. Леўшчанка, паэт Я. Фарботка, вядомыя палітычныя і грамадскія дзеячы — С. Некрашэвіч, А. Баліцкі і інш. Шмат бежанцаў Першай сусветнай вайны, беларусаў, сканцэнтравалася ў Адэскай акрузе (больш за 100 тыс. чал.) і ваколіцах Кіева. Са снежня 1917 г. у Адэсе дзейнічала Беларуская вайсковая рада, якая аб'ядноўвала воінаў-беларусаў Румынскага фронту. Беларуская нацыянальная рада — каардынацыйны цэнтр адэскіх беларускіх арганізацый — заснавала Беларускі нацыянальны камісарыят. Нацыянальную і культурную дзейнасць ажыццяўлялі як аддзелы пры дзяржаўных органах — Беларуская секцыя пры губернскім аддзеле народнай асветы Адэсы (1918–1923), так і грамадскія арганізацыі — "Беларускі гай" у Адэсе (1917–1920), Кіеве, беларускія студэнцкія зямляцтвы (Кіеў, Львоў). Выходзілі газеты: "Белорусское эхо" (Кіеў), "Белорусы в Одессе", "Белорусское слово" (1918), друкаваліся кнігі (выдавецтва "Зорка"). У Львове, які на той час знаходзіўся ў складзе Аўстра-Венгрыі, у 1907 г. адкрыўся па сутнасці першы беларускі замежны музей. Потым, у 20–30-я гг., у складзе СССР, не маючы падтрымкі з боку беларускіх афіцыйных улад, пры моцным дыктаце Масквы, якая праводзіла цэнтралізатарскую палітыку, беларускія арганізацыі на Украіне паступова спынілі сваю дзейнасць.

Па перапісе насельніцтва 1989 г. этнічная група беларусаў на Украіне налічвала 440 тыс. чалавек. Гэта каля 1 працэнта ад усёй колькасці насельніцтва ў дзяржаве. Беларуская дыяспара займае трэцяе месца сярод этнічных меншасцей. У працэнтных адносінах найбольш беларусаў жыве ў Данецкай вобл. (77 тыс., 1,4 %), Днепрапятроўскай (50 тыс., 1,3 %), у Рэспубліцы Крым (50 тыс., 2,1 %). 80 % беларусаў, якія жывуць ва Украіне, — гараджане. Але ёсць і сельскія кампактныя пасяленні, беларускія вёскі, асабліва ў Ровенскай вобл.

Агульнасць гістарычных каранёў, суседства нашых народаў спрыяюць вырашэнню сацыяльных інацыянальных праблем пражывання беларусаў на тэрыторыі Украіны. Усе іх правы рэгулююцца адпаведным законам, які прыняты Вярхоўнай Радай і дзейнічае з чэрвеня 1992 г. У ім Украіна гарантуе ўсім сваім грамадзянам аднолькавыя правы і свабоды, падтрымлівае развіццё нацыянальных меншасцей, захоўванне імі сваёй культуры, традыцыі, гісторыі, мовы.

Па сацыяльна-прафесійнаму і адукацыйнаму ўзроўню беларусы на Украіне не вылучаюцца. Практычна ва ўсіх сферах грамадскага жыцця можна сустрэць прадстаўнікоў беларускай этнічнай групы. Павел Матышэўскі — вядомы вучоны-правазнаўца, прафесар Кіеўскага універсітэта імя Т. Шаўчэнкі, доктар юрыдычных навук; Валерый Варона — доктар эканамічных навук, прафесар, дырэктар Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Украіны; Юрый Грыневіч — доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі, саветнік-эксперт Нацыянальнай камісіі па радыяцыйнай абароне насельніцтва Украіны пры Вярхоўнай Радзе; Мікалай Каваль — заслужаны артыст Украіны, артыст Нацыянальнага тэатра оперы і балета; Міхаіл Кужко — доктар медыцынскіх навук, прафесар Інстытута фцізіятрыі і пульманалогіі Акадэміі медыцынскіх навук Украіны і інш.

На Украіне за апошнія гады ўзніклі і працуюць больш за 20 беларускіх нацыянальна-культурных таварыстваў (Нікалаеў, Жытомір, Адэса, Львоў, Севастопполь, Ізяслаў, Белая Царква). З 1997 г. працуе Савет беларускіх таварыстваў, якім кіруе старшыня Кіеўскага нацыянальна-культурнага таварыства "Беларусь" Міхаіл Піліпенка, ураджэнец Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл., генерал-лейтэнант у адстаўцы, Герой Савецкага Саюза, старшыня

Камітэта Герояў Савецкага Саюза Украіны, заслужаны работнік сувязі СССР, Ганаровы грамадзянін Кіева. Таварыства "Украіна—Беларусь" узначальвае акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Украіны Ігар Паходня, вядомы вучоны ў галіне металургіі і тэхналогіі металаў, лаўрэат дзяржаўных прэмій СССР 1971 і 1978 гг., заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Украіны.

Нацыянальна-культурныя таварыствы гуртуюць беларусаў у месцах іх пражывання, падтрымліваюць традыцыі, звычаі беларускага народа, ствараюць ансамблі, нядзельныя школы, праводзяць розныя культурна-асветніцкія мерапрыемствы. Яны цесна звязаны і падтрымліваюцца беларускім пасольствам на Украіне, якое ў сваю чаргу мае добрыя кантакты з Камісіяй па правах чалавека, нацыянальных меншасцей і міжнацыянальных адносін Вярхоўнай Рады і Міністэрства па справах нацыянальнасцей і міграцыі. З іх дапамогай вырашаюцца пытанні рэстытуцыі. Так, у Беларусь з фондаў Кіева-Пячэрскага дзяржаўнага гістарычна-культурнага запаведніка вернуты 5 ікон XVI ст., якія ў 1942 г. былі вывезены з Беларусі ў Германію, а потым перададзены названаму запаведніку. Беларусы Львоўшчыны клапоцяцца пра вяртанне ў Беларусь двух слуцкіх паясоў і Бібліі Францыска Скарыны, якія захоўваюцца ў Нацыянальным музеі ў Львове. Вядзецца работа па сумесным выкарыстанні беларускіх кніг з бібліятэкі К. Храптовіча-Бутэнева. У сувязі з гэтым Нацыянальная камісія па пытаннях вяртання на Украіну культурных каштоўнасцей пры Кабінеце міністраў Украіны стварыла экспертную групу, прапанавала будучай Нацыянальнай камісіі па пытаннях рэстытуцыі Рэспублікі Беларусь стварыць аналагічную групу і правесці сумесныя пасяджэнні на базе Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Вернадскага ў Кіеве.

Для аказання прававой дапамогі беларусам, якія жывуць на Украіне, створаны юрыдычны клуб "Феміда". У яго ўвайшлі вядомыя вучоныя-правазнаўцы, юрысты-практыкі беларускай нацыянальнасці. Кіруе клубам старшы саветнік юстыцыі, кандыдат юрыдычных навук С. Зелянкоўскі.

Заслугоўвае ўвагі работа беларускага нацыянальна-культурнага таварыства ў Рэспубліцы Крым. Ім праведзены фестывалі беларускай культуры ў Ялце і Сімферопалі, арганізаваны паказ мастацкіх выставак "Сінявокая Беларусь" і "Чарнобыльскі боль". Адбыліся цікавыя супольныя мерапрыемствы вучоных, пісьменнікаў па прапагандзе беларускай культуры. На высокім узроўні прайшла чытацкая канферэнцыя па кнізе "Вянок васільковы" беларускага паэта М. Казакова, які жыў у Крыме. Фондам культуры Рэспублікі Крым установлена прэмія імя Максіма Багдановіча, лаўрэатам якой стаў фальклорны ансамбль "Світанак" з сяла Мар'янаўка Чырвонагвардзейскага раёна Крыма за прапаганду беларускай народнай творчасці. У крымскіх школах, дзе кампактна пражываюць беларусы, факультатыўна вывучаецца беларуская мова, праводзяцца фестывалі старшакласнікаў, прысвечаныя дружбе беларускага і ўкраінскага народаў. У этнаграфічным музеі Крыма адкрыты раздзел пра побыт і традыцыі беларускага народа.

Вялікую работу праводзяць нацыянальна-культурныя таварыствы беларусаў у Кіеве (старшыня М. Піліпенка), Херсоне (Л. Трусаў), Івана-Франкоўску (С. Салук), Харкаве і інш. У Кіеве створаны ансамбль беларускай песні і танца. Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь дапамагло ў набыцці сарака беларускіх нацыянальных касцюмаў для ансамбля. У бібліятэцы "Дружба народаў" у Кіеве адкрыты філіял беларускай літаратуры. Творчасць Янкі Купалы, Якуба Коласа, Петруся Броўкі, Максіма Танка і інш. вядомых пісьменнікаў уключана ў навучальныя праграмы сярэдніх школ, спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў. У Львове Нацыянальна-культурным таварыствам імя Ф. Скарыны выдаецца газета на беларускай мове "Беларус Галіччыны", транслююцца па радыё 15-хвілінныя перадачы"Весці з Рэспублікі Беларусь".

Аб'яднанні беларусаў кожны год складаюць з пасольствам Рэспублікі Беларусь планы выдання літаратуры на беларускай мове. У 1997 г. выдадзены вучэбны дапаможнік "Беларуская мова" пад рэдакцыяй Рыгора Піўтарака (дарэчы, ён узначальвае Украінскую асацыяцыю беларусістаў), зацверджаны Міністэрствам адукацыі Украіны падручнік для вучняў агульнаадукацыйных школ і студэнтаў ВНУ. У тым жа годзе выдадзены зборнік беларускіх паэтаў "Жамчужыны беларускай лірыкі". Творы надрукаваны на дзвюх мовах — беларускай і ўкраінскай — у перакладзе вядомых паэтаў М. Рыльскага, В. Сасюры, М. Цярэшчанкі, А. Малышкі, Р. Лубкіўскага, П. Гарэцкага і інш. На дзвюх мовах выдадзены беларускія народныя казкі. Падрыхтаваны да друку "Украінска-беларускі размоўнік", зборнік твораў беларускіх пісьменнікаў аб роднай прыродзе "Мой край".

Пасольства Рэспублікі Беларусь на Украіне клапоціцца пра інфармацыйнае забеспячэнне беларускай дыяспары. Так, у каталог украінскіх перыядычных выданняў уключаны 60 найменняў беларускіх газет і часопісаў, а ў нацыянальна-асветныя таварыствы рэгулярна паступае газета "Голас Радзімы".

Беларусы і ўраджэнцы Беларусі, якія выехалі з Беларусі на Украіну ці там нарадзіліся, прытрымліваюцца розных палітычных поглядаў, перакананняў. Яны маюць раздвоеную нацыянальную свядомасць, г. зн. паняцці "нацыянальнасць" і "родная мова" ў іх не супадаюць. Доля насельніцтва, якое лічыць роднай мову сваёй нацыянальнасці, у беларусаў больш нізкая, чым у іншых народаў, што маюць сваю дзяржаўнасць. Матэрыялы перапісу насельніцтва 1989 г. паказваюць, што на Украіне толькі 156,2 тыс. беларусаў лічаць беларускую мову роднай (35,5 %). Найбольшая колькасць такіх беларусаў пражывае ў Кіеўскай вобласці — 50 % ад агульнай колькасці беларусаў, потым ідуць Палтаўская, Кіраваградская, Харкаўская, Херсонская, Днепрапятроўская вобласці. Менш беларусаў, якія атаясамліваюць нацыянальнасць і родную мову, пражывае ў Ровенскай вобласці — 18,1 %. Ровенскія беларусы — самая малалікая група, прадстаўнікі якой палічылі роднай мовай рускую (12,8 %), затое яна на першым месцы сярод тых, хто вызначае ўкраінскую мову як родную.

Раз'яднанасць беларусаў па палітычных поглядах, канфесійнай прыналежнасці, часам адсутнасць узаемнага даверу адмоўна адбіваюцца на стане нацыянальнай жыццядзейнасці, падзяляюць кіраўніцтва суполак. У 1998 г. ініцыятыўнай групай зроблена спроба стварыць Каардынацыйны цэнтр беларускіх арганізацый на Украіне.

Анфіса Ляднёва, Міхаіл Піліпенка (Кіеў)

Беларусы ў Арменіі

У Рэспубліцы Арменія пражывае каля тысячы беларусаў. У чэрвені 1998 г. у Ерэване зарэгістравана Ерэванская беларуская абшчына, якая налічвае больш 100 беларусаў. Асноўная мэта дзейнасці – вывучэнне беларускай мовы, гісторыі, культуры. Уваходзіць у склад Саюза нацыянальнасцей Арменіі, якая аб'ядноўвае 12 нацыянальных арганізацый. Старшыня абшчыны – В. Крыштонік. Існуе грамадская арганізацыя "Славянскі Дом", куды ўваходзяць беларусы, рускія, украінцы. Сустаршыня арганізацыі - беларуска Г. Гаўрыловіч.

Ніна Петухова

Беларусы ў Казахстане

Гісторыя беларуска-казахскіх стасункаў мае даўнія вытокі. У перадкастрычніцкія, да 1917 г., часы, зносіны насілі эпізадычны характар. Зафіксаваны асобныя, даволі рэдкія факты знаходжання ў Казахстане выхадцаў з Беларусі. Напрыклад, у першай палове 60-х гг. XIX ст. на поўнач Казахстана былі высланы некаторыя ўдзельнікі паўстання 1863–1864 гг., падаўленага Мураўёвым-"вешальнікам". Вядомы і канкрэтныя імёны ўдзельнікаў паўстанняў, ураджэнцаў беларускай зямлі, якія адкрылі для сябе Казахстан не па сваёй волі (З. Серакоўскі, Б. Залескі і інш.). Случак Браніслаў Залескі, сябар Тараса Шаўчэнкі па казахскай ссылцы, вярнуўшыся з выгнання, выдаў у 1869 г. вялікі жывапісны альбом "Жыццё казахскіх стэпаў...".

Для беларусаў і надалей казахскія стэпы былі сталым месцам высылкі. У 70-я гг. мінулага стагоддзя тут знаходзілася частка асуджаных беларускіх народнікаў, а пазней — сацыял-дэмакратаў. У прыватнасці, у 1886–1888 гг. у Акмолінскім пав. адбываў пакаранне трохгадовай высылкай член арганізацыі "Чорны перадзел", а пазней — актыўны член Мінскай сацыял-дэмакратычнай арганізацыі П. Румянцаў, у доме якога, як вядома, у 1898 г. адбыўся I з'езд РСДРП. У 1901 г. у Семіпалацінску вёў рэвалюцыйную прапагандысцкую дзейнасць высланы туды прадстаўнік Мінскай сацыял-дэмакратычнай арганізацыі С. Мілеўскі. А яшчэ ж былі і перасяленцы — сяляне, што ехалі ў Казахстан у пошуках лепшай долі на пачатку XX ст.

Нельга абысці ўвагай такі прыкметны факт паслякастрычніцкай гісторыі. Кіраўніком першага ўрада Казахстана з'яўляўся наш суродзіч — В. Радус-Зяньковіч, вядомы ў Беларусі як прапагандыст і публіцыст ленінскай школы. Праўда, нарадзіўся В. Радус-Зяньковіч у Казахстане, у сям'і высланага з Беларусі ўдзельніка паўстання 1863–1864 гг., ураджэнца Мсціслаўскага пав. Многія беларускія дзеячы культуры (У. Дудзіцкі, П. Бітэль, Я. Скрыган, С. Хурсік і інш.) адбывалі незаслужанае пакаранне ў Казахстане ў савецкі час.

З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны з Беларусі былі эвакуіраваны людзі, заводы, навуковыя і культурныя ўстановы. Казахстан стаў таксама месцам базіравання многіх тылавых шпіталяў, дзе далечваліся параненыя савецкія воіны. Тут знайшлі прытулак і працу 10,7 тысячы рабочых і служачых, эвакуіраваных з Беларусі, члены іх сем'яў. Сюды былі вывезеныя калектывы Беларускага тэатра оперы і балета, віцебскага абласнога драматычнага тэатра імя Я. Коласа, многія з беларускіх кінематаграфістаў. Толькі за перыяд з 4 верасня 1941 па красавік 1942 г. коласаўцы далі 8 шэфскіх канцэртаў, 12 спектакляў і 21 канцэрт у вайсковых шпіталях. У Алма-Аце знаходзілася і спявачка Беларускага тэатра оперы і балета Л. П. Александроўская. Яна выступала з казахскай артысткай Куляш Байсеітавай у рабочых клубах Алма-Аты і Караганды, у вайсковых шпіталях і ў прыфрантавой паласе. На алма-ацінскай кінастудыі беларускі рэжысёр У. Корш-Саблін у 1942 г. стварыў першыя беларускія фільмы перыяду Вялікай Айчыннай вайны — "Беларускія навелы" ("Пчолка" і "Баявыя сябры"). Першая з іх прысвечана барацьбе народных мсціўцаў на акупаванай беларускай зямлі, другая расказвае пра франтавікоў, што змагаюцца з ворагам на танку "Беларусь", які пабудаваны на ахвяраванні працаўнікоў тылу. Праз казахстанскі стэп ехаў у эвакуацыю Якуб Колас. А у казахстанскім гарадку Уральску знайшоў свой апошні прытулак вядомы беларускі пісьменнік Змітрок Бядуля. Аднолькава дарагая памяць аб ім і беларусам, і казахам. На надмагільнай пліце залатымі літарамі надпіс: "Змітрок Бядуля. 1886–1941". Затым на рускай, казахскай і беларускай мовах: "Вядомы беларускі пісьменнік Самуіл Яфімавіч Плаўнік".

З пачаткам асваення цалінных зямель у Казахстан выехалі дзесяткі тысяч сялян, спецыялістаў у галіне сельскай гаспадаркі, шмат якіх там аселі. У складзе студэнцкіх будатрадаў там працавалі многія маладыя беларускія паэты. Вяртаючыся, разам з пылам казахстанскага стэпу, з сонечным загарам прывозілі дадому рамантычныя вершы. А казахстанская вершаваная кніжка Рыгора Барадуліна атрымала высокаю адзнаку Усесаюзнага літаратурнага конкурсу, прысвечанага сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве (1957).

Сярод іншых падзей беларуска-казахскага пабрацімства ў галіне культуры варта нагадаць Дні літаратур народаў СССР, што праводзіліся ў Беларусі (1972) і Казахстане (1974) і Тыдзень беларускай літаратуры ў Казахстане

(1974). Казахстан пазнаваў Беларусь і на спектаклях па п'есах К. Крапівы, А. Макаёнка, А. Маўзона, А. Петрашкевіча, М. Матукоўскага, А. Дударава.

У іншанацыянальным складзе Казахстана беларусаў налічваецца цяпер прыкладна 170 тыс. чал. У апошнія гады, асабліва пасля паспаду Савецкага Саюза, у Казахстане актывізаваўся беларускі грамадска-культурны нацыянальны рух. У Алма-Аце працуе культурны асяродак "Беларусь". Створана Асацыяцыя выпускнікоў землеўпарадкавальнага факультэта Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Казахстане. Існуе Згуртаванне беларусаў Казахстана. Некаторы час у Прыазёрску Джэзказганскай вобл. плённа працавала, складзеная з вайскоўцаў-беларусаў, мясцовая рада ТБМ імя Ф. Скарыны. Узначальваў яе падпалкоўнік Станіслаў Суднік. Пры радзе дзейнічала нядзельная беларуская школа. Вайскоўцы выдавалі і з дапамогай камп`ютэрнай тэхнікі тыражыравалі газету "Рокаш" (усяго пабачыла свет 15 нумароў). У Прыазёрску накладам у 50 асобнікаў быў выдадзены зборнік вершаў Станіслава Судніка "Пагоня за мову".

Алесь Карлюкевіч

Беларусы ў Кыргызстане

Беларусы паявіліся ў Кыргызстане ў канцы XIX ст., калі ён увайшоў у склад Расіі і яе ўрад указам ад 13 ліпеня 1889 г. дазволіў перасяленне на неасвоеныя багатыя землі жыхарам Расіі, у тым ліку з Украіны і Беларусі. Найбольш беларускіх сялян прыехала з Мінскай і Магілёўскай губерняў. Яны везлі з сабой небагаты скарб: хатнія рэчы, нацыянальнае адзенне, кнігі духоўнага зместу, захоўвалі не толькі рэчы, але і свае традыцыі. Беларусы рассяліліся ў сельскай мясцовасці сярод рускага і ўкраінскага народаў. Таму ім цяжка было захаваць сваю родную мову. Але ж ёсць нашчадкі перасяленцаў, якія яшчэ ведаюць і трохі размаўляюць на мове сваіх бацькоў.

Асабліва вялікі прыезд беларусаў у Кыргызстан адбыўся пасля Вялікай Айчыннай вайны, у 1953–1970 гг., калі ў Кыргызстане пачалі аднаўляць прамысловасць, сельскую гаспадарку і культуру. Сюды былі накіраваны настаўнікі, выкладчыкі ВНУ, лекары, юрысты, інжынеры, працаўнікі сельскай гаспадаркі. На пачатак 1993 г. у Кыргызстане пражывала 9,5 тыс. беларусаў. Цяпер значная частка іх вярнулася ў Беларусь, і на тэрыторыі Кыргызстана па стану на студзень 1998 г. пражывала 6,5 тыс. чалавек. У 1993 г. беларусы Кыргыстана аб'ядналіся ў грамадскую арганізацыю - Беларускую абшчыну "Світанак".

Ніна Міронава (Бішкек)

Беларусы ў Латвіі

Першыя ўзаемныя кантакты продкаў беларусаў, насельнікаў Полацкай зямлі, з продкамі латышоў сягаюць у VIII ст. Узаемаадносіны славян з балтамі ў тыя часы засноўваліся на сумесным тэрытарыяльным жыцці, агульных інтарэсах. Перасяленню славян, мірнай "каланізацыі" імі новых зямель спрыяла само цячэнне Дзвіны. Яна праславілася з IX ст. як вялікі гандлёвы шлях "з варагаў у грэкі". З узвышэннем Полацка (першы напамін у летапісах — 862 г.) пашыраліся межы, маштабы яго ўздзеяння — не толькі на ўсход і поўдзень, але і на паўночны захад (Пскоў, Ноўгарад) і асабліва па цячэнню Дзвіны. І, як сцвярджае М. Ермаловіч, "да пачатку XII ст. усё Ніжняе Падзвінне было ўладаннем Полацка". Полацкае пранікненне туды паклала пачатак беларускай прысутнасці на латышскіх землях. Па-першае, усе так званыя Барысавы камяні па Дзвіне знаходзяцца на захад ад Полацка — каля Дзісны, Друі. Ёсць камень з надпісам каля Краславы. Латышскія вучоныя даследавалі мноства камянёў з выбітымі на іх крыжамі, якія знаходзіліся па берагах Даўгавы аж да самага вусця. Сваю выснову яшчэ ў 1950 г. зрабіў Б. Брэжга: "Дзвінскія камяні — падарожныя знакі на важнейшай для Полацка артэрыі, а не ў сувязі з паходамі Барыса на земгалаў". Яшчэ адзін доказ прысутнасці нашых продкаў — лівонскія хронікі, дзе зафіксаваны, з пэўнай доляй прадузятасці, усе намаганні полацкіх палітыкаў, дзяржаўных дзеячаў, ваяроў. Першым дакументам трэба назваць "Лівонскую хроніку" Генрыха Латвійскага як аўтарытэтную крыніцу па гісторыі нашай барацьбы з нямецкай агрэсіяй. Стваралася яна ў 1224–1227 гг. на лацінскай мове. Дзякуючы "Лівонскай хроніцы" Генрыха Латвійскага прызнана, што язычнікі-лівы плацілі даніну полацкаму каралю Уладзіміру (Валдэмару ў Генрыха Латвійскага), якога хроніка называе русам. Замкам русаў хроніка называе Кукенойс (Кокнэсэ), дзе валадарыў князь Вячка. Русіяй называе хроніка Полацкую зямлю. На працягу стагоддзяў Дзвіна перш-найперш служыла не вайне, а міру. Энцыклапедыя "Рыга" зафіксавала нават асаблівасці "беларускага гандлю ў Рызе". У ёй адзначаецца, што па Дзвіне-Даўгаве беларускія купцы праводзілі да 600 стругаў штогод. Захаваліся сотні кантрактаў аб узаемных пастаўках — важных дакументаў пра беларускую прысутнасць на берагах Рыжскага заліва. Полацкія купцы вялі ўпартую барацьбу за права свабоднага гандлю ў Рызе і за яе межамі. Крыніцамі для вывучэння гэтага пытання служаць актавая дакументацыя, урадавыя статуты, а таксама дарчыя, угодчыя, устаўныя, судныя ўмовы, прывілеі, купчыя, менавыя граматы, мытныя кнігі і іншыя сведчанні прадпрымальнасці і энергічнасці нашых продкаў. У гандлёвых дагаворах Полацка з Рыгай захаваліся найбольш даўнія нормы правоў, асаблівасці старажытнай беларускай мовы. Гісторыя даводзіць, што недзе ў 1210 г. паміж Полацкам і Рыгай быў заключаны "вечны мір".

Полацкае княства стала марской дзяржавай, своеасаблівай імперыяй, якая ў выніку ўзаемадачыненняў з латыголамі і лівамі атрымала выхад да мора. Нават пасля перакрыцця крыжацкімі агрэсарамі вусця Дзвіны-Даўгавы полацкія князі, епіскапы праз васалаў праводзілі сваю палітыку, у тым ліку і рэлігійную (хрышчэнне мясцовых плямёнаў). 1453-м годам пазначана ўзнікненне ў Рызе царквы св. Мікалая, які быў апекуном падарожнікаў і купцоў. У 1754 г. беларускія плытагоны наведвалі тут свой храм св. Тройцы. Новая Троіцкая царква была ўзведзена ў Рызе на востраве Кліверсгольм у 1779–1780 гг. Пазней яе бярвенні разабралі і ўзвялі з цэглы Троіцка-Задзвінскую царкву (1895). Іконы, царкоўны посуд быў туды прывезены з Віцебска і Полацка. Старажылы Рыгі памятаюць яе як "беларускую". У XVI ст. плытагоны заснавалі Гольмгольфскую слабаду каля Крэйцбурга (Крустпілса), які меў перашапачатковую назву Крэўсгорад. У 1670 г. рыжскі герцаг Якаў надаў слабадзе магдэбурскае права. На процілеглым берагу Дзвіны размясціўся горад Якабштадт (Екабпілс). У гэтых мясцінах было некалькі праваслаўных (г. зн. беларускіх) цэркваў. Свята-Духаўскую царкву, да прыкладу, называлі "прывезенай на плытах". Нездарма для вернікаў Латгальскага краю духоўнай натхняльніцай, нябеснай апякункай стала святая Ефрасіння Полацкая. Многа цэркваў было пасвечана ў яе імя, створана нямала ікон з выявай святой ігумені, княжны Полацкай. У 1931 г. копія крыжа прападобнай Ефрасінні была ўстаноўлена ў Яўнлатгальскай (Абрэнскай) царкве.

Ганзейскі гандлёвы і палітычны саюз, які склаўся ў першай палове XIII ст., у XIV–XVI стст. налічваў 200 гарадоў, у тым ліку Полацк. Таму натуральна, што бацька Францыска Скарыны Лукаш меў сваю "кантору" у Рызе, дзе, магчыма, служыў пляменнік Францыска Раман Скарына. У Рызе купцы-крывічы пабудавалі свой Крэўскі двор. У горадзе жыло і працавала столькі людзей з верхняга цячэння Дзвіны, што ад царквы Якуба яшчэ з XII ст. забудаваўся так званы Крэўскі канец. На гэтай тэрыторыі горада смаляне, віцьбічы, палачане мелі, апрача праваслаўнай царквы св. Мікалая, багадзельню, канвент (купецкую гільдыю), склады і ўласныя дамы з прылеглымі бальніцай і могілкамі.

Вякамі складваліся агульныя рысы менталітэту ў насельнікаў Прыдзвіння, праходзіла іх духоўная дыфузія. Крывічы па-латышску — krievi, родныя па крыві. Не чужаком плыў па Дзвіне-Даўгаве стырнавы Грышка, дзед латышскага пісьменніка Андрэя Упіта. Насустрач яму ішоў у Крывіцкі край сяброў-сабрысаў дзед Рыгора Барадуліна Андрэй Галвіньш, майстар па млынах. Перасяленне продкаў сучасных беларусаў на тэрыторыю вадазбору Дзвіны праходзіла нязмушана, натуральна. Так, у 1599 г. дзве трэці жыхароў Рэжыцы (Рэзекне) складалі беларусы. У XVII ст. 10 паселішчаў вакол горада былі заселены толькі беларусамі. А перапіс насельніцтва 1897 г. паказаў, што на тэрыторыі тагачаснай Латвіі жыло 79523 беларусы. Адмена прыгоннага права, развіццё чыгуначных шляхоў зносін, патрэба рабочых рук ў партовых гарадах штурхала ў дарогу найбольш смелых і прадпрымальных. Людзі шукалі не толькі свабоды, але і добрага заробку, магчымасці атрымаць асвету, прафесійнае майстэрства. Прыцягненне культурных цэнтраў Прыбалтыкі (тады Ліфляндыі) значна павялічыла прысутнасць беларусаў у Рызе, Мітаве, Дынабургу (Дзвінску, Даўгапілсе).

У XIX – пачатку XX ст. з Латвіяй былі звязаны як з месцам нараджэння ці прабывання многія беларускія грамадскія і культурныя дзеячы, пісьменнікі, мастакі. Найперш трэба назваць імёны Ігната Буйніцкага, Эдварда Вайвадзіша, Віктара Вальтара, Ніны Ватацы, Канстанціна Езавітава, Зміцера Жылуновіча (Цішкі Гартнага), Міхаіла Калініна, Казіміра Кастравіцкага (Каруся Каганца), Уладзіміра Кудрэвіча, Вацлава Ластоўскага, Івана Луцкевіча, Пятра Масальскага (Пятра Сакола), Пятра Мірановіча, Сяргея Палуяна, Міколы Пашкевіча, Пётры Сергіевіча, Язэпа Сушынскага, Аляксандра Уласава, Івана Фёдарава (Янкі Маўра), Уладзіміра Шыманца, Браніслава Эпімах-Шыпілы. В. Ластоўскі ў 1907 г. разам з Эдзюкам (Эдвардам) Будзькам, Макарам Касцевічам (Краўцовым) пачаў гуртаваць беларускія сілы ў Рызе. Аднадумцы чыталі лекцыі на беларускай мове для інтэлігенцыі, настаўнікаў, выступалі перад рабочымі з Беларусі.

У Рызе, якая ў 1918 г. была абвешчана сталіцай незалежнай Латвіі, у 1920 г. прабываў урад Беларускай Народнай Рэспублікі на чале з В. Ластоўскім. Там жа знаходзіліся яго прадстаўнікі, праводзіліся мерапрыемствы. Вайскова-дыпламатычную місію БНР у Латвіі і Эстоніі ўзначальваў палкоўнік Канстанцін Езавітаў, консулам быў Уладзімір Пігулеўскі. Урад В. Ластоўскага імкнуўся кансалідаваць нацыянальныя сілы. 20 кастрычніка 1920 г. у Рызе прайшла палітычная канферэнцыя прадстаўнікоў беларускіх палітычных партый. Ад эсэраў прысутнічалі В. Ластоўскі, Я. Мамонька, К. Дуж-Душэўскі, А. Галавінскі, А. Вальковіч, ад сацыялістаў-федэралістаў — П. Крачэўскі, В. Захарка, Я. Варонка, К. Езавітаў, Ю. Гадыцкі-Цвірка, ад сацыял-дэмакратаў — А. Аўсянік. Канферэнцыя дамагалася стварыць вакол урада В. Ластоўскага адзіны нацыянальны блок, сарваць перамовы ў Рызе паміж РСФСР і Польшчай аб падзеле тэрыторыі Беларусі. Аднак яшчэ 11 жніўня 1920 г. паміж урадамі Латвіі і РСФСР было падпісана мірнае пагадненне, паводле якога са складу Віцебскай губерні Латвіі перадаваліся Дзвінскі, Люцынскі і Рэжыцкі паветы са значнай часткай беларускага насельніцтва. Асобны параграф дамовы абавязваў Латвію спыніць на сваёй тэрыторыі дзейнасць эмігранцкіх арганізацый, — у тым ліку ўрада БНР, яе дыпламатычных місій. Таму ўрад В. Ластоўскага пераехаў з Рыгі ў Коўна. Затое ў кастрычніку 1920 г. у Рыгу быў выкліканы Аляксандр Чарвякоў як прадстаўнік БССР, а таксама Уладзімір Пічэта і Алесь Бурбіс як эксперты для падрыхтоўкі дакументаў па заключэнні міру. Але А. Чарвякоў так і не быў дапушчаны да падпісання Рыжскай мірнай дамовы 18 сакавіка 1921 г.

У Рызе дзейнічала Рада Беларускай калоніі, заснаваная ў 1919 г. Першая вечарына, праведзеная ёй, адбылася 17 снежня таго ж года. У сакавіку 1920 г. выйшаў першы (і апошні) нумар яе часопіса "На чужыне" пад рэдакцыяй Рыгора Казячага. К. Езавітаў вымушаны быў прыняць латвійскае грамадзянства, бо працягваць культурна-асветную работу як эмігранту забаранялася пагадненнем паміж РСФСР і Латвіяй. Спынілася дзейнасць "Выдавецтва Вайскова-дыпламатычнай місіі" БНР у Рызе (1920–1921). Затое паўстала культурна-асветнае таварыства "Бацькаўшчына". Яго ўстаноўчы сход прайшоў 25 сакавіка 1921 г. у Дзвінску. Першым старшынёй Цэнтральнага праўлення стаў настаўнік Ян Харлап. Разгарнулася арганізацыйна-грамадская, асветна-школьная, выдавецкая, аматарска-тэатральная дзейнасць таварыства — у першую чаргу ў Латгаліі праз першасныя суполкі, Люцынскую, Краслаўскую, Стара-Слабодскую, дзе пераважала беларускае насельніцтва.

Дзякуючы Янісу Райнісу пры Міністэрстве асветы Латвіі ў 1921 г. быў створаны Беларускі аддзел для кіраўніцтва школьнымі ўстановамі (кіраўнік Сяргей Сахараў). Сталі працаваць летнія курсы беларусазнаўства ў Дзвінску і Люцыне. Выкладаць на іх быў запрошаны Ігнат Дварчанін, які арганізаваў там драматычную дружыну, а пазней і хор. Так узнік Беларускі народны тэатр пры таварыстве "Бацькаўшчына".

Першым значным вынікам работы таварыства "Бацькаўшчына" было стварэнне сеткі пачатковых школ (каля 60), заснаванне Люцынскай і Дзвінскай гімназій, сельскагаспадарчай школы. 1 снежня 1921 г. адкрыліся (спачатку як аднагадовыя) Беларускія дзяржаўныя настаўніцкія курсы. Узначальвалі іх К. Езавітаў, пазней Э. Будзька, П. Мядзёлка, з лекцыямі выступаў А. Луцкевіч. Сярод вядомых выпускнікоў курсаў — Э. Вайвадзіш, В. Вальтар, У. Жылка, П. Масальскі, П. Мірановіч, А. Салаўёў. З верасня 1923 г. працавала 1-я Беларуская пачатковая школа ў Рызе. Потым да 1930-х гг. да яе дадаліся 2-я школа, прыватная гімназія, вячэрняя школа для дарослых.

Паводле канстытуцыйнага права, прынятага ў латвійскай дзяржаве, кожная нацыянальная меншасць павінна была мець сваіх дэпутатаў у Сойме. Тэарэтычна такое права мелі і беларусы, якіх, паводле афіцыйных звестак 1921 г., у краіне налічвалася звыш 70 тысяч. Але з прычыны слабой арганізаванасці такога дэпутата-абаронцы яны не мелі. Таму па просьбе беларускай інтэлігенцыі абарону нацыянальна-культурных інтарэсаў беларускай меншасці ўзяў на сябе латышскі паэт, дэпутат Сойма Яніс Райніс.

Найбольш значным асяродкам беларускай культурна-асветніцкай работы ў 20–30-я гг. з'яўлялася Дзвінская (Даўгапілская) дзяржаўная беларускай гімназія, якая праіснавала да 1935 г. Першым яе дырэктарам стаў Іван Краскоўскі, другім — Сяргей Сахараў. Вучні паступалі сюды пераважна з 16 беларускіх пачатковых школ у Пустынскай і Прыдруйскай валасцях Дзвінскага павета. Яны вывучалі латышскую, беларускую, рускую, лацінскую, нямецкую мовы. Выдавалі на гектографе часопіс "Школьная праца". Штогод гімназію заканчвала 15–16 матурыстаў. Сярод выкладчыкаў вылучаліся У. Пігулеўскі, А. Якубецкі, Я. Гайлевіч, П. Мядзёлка. У 1927 г. госцем гімназіі быў В. Ластоўскі. Матэрыльную дапамогу аказваў ёй Ян Райніс. Многія выпускнікі прысвяцілі сваё жыццё служэнню беларускай, латышскай, рускай, польскай, чэшскай, славацкай культурам. Сярод іх — паэты Аўген Бартуль, Валянціна Казлоўская, Мікола Талерка, перакладчык Янка Доўгі, мастак Міхаіл Калінін, оперная спявачка Надзея Нікалаева-Комісар, рэжысёр Язэп Камаржыцкі, археолаг Людміла Краскоўская, кампазітар Юлія Александровіч-Фельдманэ. З канцэртамі, п'есамі Я. Купалы, Ф. Аляхновіча, Каруся Каганца, Зоські Верас, В. Сахаравай гімназісты наведвалі самыя аддаленыя куткі Латгальскага краю, абуджаючы самасвядомасць людзей, узбагачаючы іх духоўна. Нездарма С. Сахараў звяртаўся ў лісце да сваіх вучняў з такімі словамі: "...маю надзею, што тая духоўная сувязь, якая ўстанавілася паміж мною і маімі выхаванцамі на грунце агульначалавечых і культурна-нацыянальных ідэалаў, ніколі не загіне".

Высокі ўзровень навучання, прэстыжнасць Дзвінскай, Люцынскай і іншых беларускіх асветных устаноў, значны ўздым беларускай самасвядомасці выклікалі зайздрасць і варожасць у шавіністычна настроеных прадстаўнікоў латышскіх, рускіх і польскіх нацыянальных асяродкаў. Не абыйшлося і без знешніх негатыўных фактараў, аб чым паведаміў Я. Райніс у сваім выступленні ў Мінску на Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу (1926). Паводле сфабрыкаваных паліцыяй у 1924–1925 гг. матэрыялаў аб "спробах далучэння" Латгаліі да БССР былі арыштаваны па абвінавачанню ў дзяржаўнай здрадзе многія настаўнікі, сябры таварыства "Бацькаўшчына" — К. Езавітаў, І. Краскоўскі, П. Мядзёлка, У. Пігулеўскі, А. Якубецкі. У красавіку 1925 г. суд апраўдаў іх, але дзейнасць таварыства паступова спынялася. Нядобразычліўцы дамагліся свайго: колькасць беларусаў паміж перапісам насельніцтва ў 1920 г. і ў 1925 г. скарацілася амаль ўдвая — з 75650 чалавек да 38010. Фінансаванне ж дзейнасці культурна-нацыянальных аўтаномій залежала ад паказчыкаў перапісу. Але цяжкасці не зламілі беларускіх адраджэнцаў у Латгаліі. Узнікалі новыя арганізацыі. У 1924 г. былі створаны таварыствы "Рунь" (старшыня А. Шчорс), "Беларуская хата" (старшыня М. Дзямідаў, цэнтральная сядзіба — у Рызе, аддзелы — у Лібаве, Люцыне, Дзвінску). З сярэдзіны 20-х гадоў культурна-асветную работу праводзілі беларускія таварыствы "Прасьвета", "Аратай", асветніцкі кааператыў "Культура і праца", "Таварыства беларускага тэатра" (пазней — "Беларускае тэатральнае таварыства ў Латвіі"), "Таварыства беларускіх вучыцялёў" (у 1939 г. яно мела намер прыняць назву "Таварыства беларусаў Латвіі"), "Навукова-краязнаўчае таварыства", "Таварыства беларускай моладзі" і інш.

Значную работу правяло Беларускае выдавецтва ў Латвіі. У 1933 г. яно выдала ў перакладзе на беларускую мову апавяданне Андрэя Упіта "Фракеец Кілон". "Выпускаючы адно з цікавых гістарычных апавяданняў Андрэя Упіта, — гаворыцца ў прадмове да кнігі, — Беларускае выдавецтва хоча пакласці гэтым пачатак сістэматычнаму друкаванню перакладаў з латышскай мовы на беларускую, каб пазнаёміць наша грамадства з творчасцю латышскіх

пісьменнікаў і гэтым дапамагчы беларусам як у Латвіі, гэтак і па-за межамі яе азнаёміцца з духоўным жыццём латышскага народа і з ягонымі літаратурнымі скарбамі". Аднак беларускія выдавецтвы ў Латвіі ўсё ж пераважна выдавалі арыгінальныя кнігі. Пачынаючы з 1925 г., у асноўным па Латгаліі і Ілукстаншчыне, дзе жыло больш за ўсё беларусаў, разыходзіліся такія выданні "Бібліятэкі беларусаў-выбаршчыкаў" як "Праграма Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў ў Дзяржаўны Сейм...", "Статут Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў", "Бярыцеся ўсе за навукова-даследчую працу", а таксама адозвы, плакаты, паштоўкі з партрэтамі пісьменнікаў. Да 1933 г. Беларускае выдавецтва ў Латвіі надрукавала ў Рызе зборнік апавяданняў Віктара Вальтара "Леснікова сена" і зборнік вершаў Пятра Сакола "На світанні". Тады ж жонка беларускага фальклярыста і этнографа Сяргея Сахарава Вольга Нікановіч выдала ў Дзвінску п'есу "Птушка на волі". Асаблівую цікавасць уяўляе зборнік вершаў гуртка маладых беларускіх паэтаў у Латвіі, які яны назвалі "Першы крок" (Рыга, 1926). Гэтая маленькая анталогія выйшла тыражом ў 500 экз. У зборнік увайшлі вершы В. Ашурка, А. Баркоўскага, А. Бартуля, Э. Вайвадзіша, В. Вальтара, Я. Ванага, Я. Воркуля, В. Казлоўскай, Кастусёнка (К. Езавітава), В. Сахаравай. У 1932 г. у Рызе ўбачыў свет друкаваны лацінкай зборнік вершаў Веры Вайцюлевіч.

У многіх беларускіх выданнях Латвіі друкаваліся фальклорныя запісы. Дзесяткі людзей з-пад Краслаўкі, Рэжыцы, з Ілукстанскага і Люцынскага паветаў, з Дагды і Дзвінска запісвалі і перасылалі легенды, паданні, песні, прыпеўкі, казкі, народныя анекдоты, прыказкі, загадкі. Толькі Беларускае навукова-краязнаўчае таварыства ў 1932–1934 гг. склала два рукапісныя зборнікі, якія змяшчалі да 1000 запісаў. У 1940 г. С. Сахараў выдаў у Рызе першы выпуск "Народнай творчасці латгальскіх і ілукстанскіх беларусаў". Усе астатнія падрыхтаваныя выпускі засталіся ў рукапісах: акупацыя перашкодзіла іх публікацыі. У 1970–1990 гг. фальклорныя запісы С. Сахарава, дзякуючы якому захавалася багатая культурная спадчына беларусаў ў Латвіі, змешчаны ў адпаведных тамах "Беларускай народнай творчасці" — серыі, што выдавала АН БССР. Сам жа фальклярыст прызнаваўся, што на навуковае збіральніцтва натхніў яго Я. Райніс, які да апошніх год жыцця марыў напісаць фальклорную драму "Беларусы".

Побач з кніжнымі выданнямі выходзілі ў Латвіі і перыядычныя. Але існавалі яны ў Рызе, якая пасля судовага працэсу 1925 г. зноў стала эпіцэнтрам беларускай дзейнасці пераважна нядоўга. З 1925 г. пад рэдакцыяй К. Езавітава выдавалася газета "Голас Беларуса". У 1926 г. з'явіліся чатыры нумары часопіса "Месячніка вясковай гаспадаркі і кааперацыі", "Гаспадар" (выдавец Беларускае цэнтральнае пазыкова-зберагальнае таварыства ў Латвіі, рэдактар Я. Шчорс). У 1926–1930 гг. выходзіў часопіс Дзвінскай дзяржаўнай беларускай гімназіі "Школьная праца" (рэдактар С. Сахараў). Самае грунтоўнае выданне, часопіс "Беларуская школа ў Латвіі", рэдагаваў у Рызе К. Езавітаў (1926–1929, 1932–1934). У 1930 г. выйшлі чатыры нумары "Нашай долі" — органа "беларускай дэмакратычнай думкі" ў Латвіі (выдавец — Беларускае культурна-асветнае таварыства "Прасьвета", рэдактар — У. Відаўскі). Беларускі літаратурна-грамадскі і педагагічны штомесячнік "Таварыства беларускіх вучыцялёў у Латвіі", "Школа і жыццё" спрабаваў выдаць у Рызе М. Дзямідаў, але да чытача дайшоў толькі адзін нумар. "Шлях праўды" — так называлася беларускай аднаднёўка 1930 г. (выдавец — Дзвінскі і Люцынскі аддзелы "Таварыства беларускіх вучыцялёў у Латвіі", рэдактар — Ф. Клагін). У 1931 г. выйшлі два нумары палітычнай, грамадскай і літаратурнай газеты "Беларускае слова" (рэдактар П. Жураўскі). У 1931 г. у Дзвінску пад рэдакцыяй Я. Якубаўскага выдавалася "Думка беларуса" — "часопісь Беларускае дэмакратычнае партыі ў Літве". Гэта была не адзіная спроба дапамагчы суайчыннікам ў Коўне і Вільні. Асаблівы ўклад тут унесла тады "Беларускае выдавецтва ў Латвіі", друкуючы для суседзяў кнігі, падручнікі, паштоўкі, ноты.

Ацэньваючы здабыткі духоўнай жыццядзейнасці латвійскіх беларусаў за 20 перадваенных гадоў, можна зрабіць вывад, што, нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, інертнасць, неарганізаванасць, не зважаючы на аўтакратычныя формы праўлення К. Ульманіса, калі нацыянальныя школы ператвараліся ў змешаныя, далучаліся да латышскіх або зусім зачыняліся, калі арыштоўваліся беларускія дзеячы, беларуская нацыянальная меншасць ў Латвіі ўсё ж мела магчымасці для самавыяўлення. Зрабіла істотныя крокі да грамадзянскай сталасці. Ёй дапамагалі дзеячы латышскай культуры. 3 чэрвеня 1929 г. на адкрыцці Таварыства культурнага збліжэння з народамі СССР Я. Райніс сказаў: "Ад гэтага дня мы пачынаем збліжэнне з усходам, з народамі ўсходу. Два вялікія народы, з якімі мы хочам збліжаць сваю культуру, гэта беларусы і вялікарусы. Асабліва сімпатычныя нам беларусы, якія так блізкія да літоўцаў..." Культура традыцыйных узаемаадносін у яе высокім, райнісаўскім гучанні дала свой плён. Яна выступала супраць чалавечага, нацыянальнага раз'яднання свету, за магчымасць ацаніць духоўныя скарбы іншых народаў, атрымаць дадатковыя імпульсы для самаразвіцця.

Спарадненне беларускага і латышскага народаў, узаемавыручка ў цяжкі час асабліва праявіліся ў гады фашысцкай акупацыі. У Саласпілскі лагер прывозілі тады з Асвейскага раёна беларускіх дзяцей, у якіх бралі кроў для нямецкіх салдат. Як маглі ратавалі маленькіх вязняў Саласпілса жанчыны Латвіі. І таму ў Рызе, іншых гарадах Латвіі на кожнай вуліцы жыве некалькі беларускіх сем'яў, лёс якіх пазначаны таўром Саласпілса. Мастак-графік К. Буш, былы вязень канцлагера, адчуў неабходнасць зафіксаваць для гісторыі ўсё, што бачыў і перажыў. І з яго знакамітай саласпілскай графічнай серыі паўсталі вобразы дзяцей-асвейцаў. Згадваючы лёсы беларусаў, стварыў ён у 1960–1962 гг. такія творы, як "У лазню", "На тарфяным балоце", "У апошні шлях", "У матак адбіраюць дзяцей" (гэтыя велізарныя графічныя лісты дэманстраваліся ў Саласпілсе, Рызе).

Беларускае грамадска-культурнае жыццё не спынілася ў Латвіі і ў гады акупацыі. З 1941 г. працавалі пачатковыя школы ў Дзвінскім, Люцынскім і Рэжыцкім паветах, гімназія ў Індры. У Рызе былі адкрыты 3 беларускія шасцікласныя школы, у 1943–1944 гг. выходзіў часопіс "Новы шлях", які рыхтаваўся ў Мінску (рэдактар Уладзімір Сядура).

Пасля Другой сусветнай вайны ў выніку эміграцыі на Захад і высылак на Усход Латвія згубіла 12 працэнтаў свайго насельніцтва. У рэспубліку прыбывалі перасяленцы з Расіі, Украіны, Беларусі. Толькі беларусаў тут налічвалася ў 1959 г. 61,9 тыс., у 1970 г. — 94,9 тыс., да 1979 г. — 111,5 тыс., у 1989 г. — каля 120 тыс. чалавек. Найбольш сканцэнтраваліся беларусы ў Рызе (у 1995 г. каля 70 тыс.) і Даўгаўпілсе (больш 10 тыс.). У многіх гарадах нацыянальнай меншасцю аказаліся самі латышы. Так званае рускамоўнае насельніцтва не заўсёды праяўляла прыхільнасць да абвешчаных "Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Латвіі" (1989), "Дэкларацыі па пытанню дзяржаўнай незалежнасці Латвіі" (1990), лаяльнасць да адноўленай 21 жніўня 1991 г. незалежнасці Латвійскай Рэспублікі. Гэта магло адмоўна адбіцца на кансалідацыі грамадства. Таму Народны рух Латвіі быў падтрыманы і многімі нелатышамі. Паспяхова прайшоў Форум народаў Латвіі. Самавызначэнне, нацыянальную ідэнтыфікацыю паскорыла стварэнне Асацыяцыі нацыянальна-культурных таварыстваў Латвіі (АНКОЛ). У 1989 г. іх было зарэгістравана каля дваццаці, у тым ліку і Латвійскае таварыства беларускай культуры "Сьвітанак". Аднак не ўсім беларусам адпавядала нацыянальная ідэя, не ўсе шанавалі сваю, а, значыць, і іншыя мовы. Так узнік "Беларускі культурны цэнтр" пры Балта-славянскім таварыстве. Многія беларусы звязалі сябе з "Інтэрфронтам".

У 1990 г. Латвійскі фонд славянскай пісьменнасці і славянскіх культур адзначыў у Рызе 500-годдзе з часу нараджэння Ф. Скарыны. Была арганізавана выстаўка "Францыск Скарына і яго час". На свята прыехалі самадзейны ансамбль народных інструментаў з Гродна "Музыкі", фальклорны ансамбль "Світанак" з Вілейкі. Студэнты Беларускай дзяржаўнай філармоніі выканалі ў Грамадска-палітычным цэнтры, дзе праходзіла юбілейнае святкаванне, творы беларускіх кампазітараў, а таксама народныя і класічныя. У мерапрыемствах прынялі ўдзел беларусы Рыгі.

Нацыянальны характар мае Латвійскае таварыства беларускай культуры "Сьвітанак", якое дзейнічае ў Рызе з 1988 г. На рахунку таварыства арганізацыя выставак "Беларусы ў Латвіі", праведзеная ў Музеі гісторыі Рыгі і мараходства ў 1989 г. на аснове фондаў рыжскіх бібліятэк і прыватных збораў, першая выстаўка Аб'яднання мастакоў-беларусаў Балтыі "Маю гонар" (Ваенны музей, 1991). У тым жа Ваенным музеі адбылася персанальная выстаўка В. Целеша (1992).

Таварыства "Сьвітанак" (у Раду яго ўваходзяць і латышы) спрабуе ўзнавіць традыцыі і прынцыпы дзейнасці даваенных беларускіх суполак. Стараннямі В. Целеша ў 1991 г. у Рызе ўзнікла дзіцячая мастацкая студыя "Вясёлка" і беларуская нядзельная школа. Ён жа ўзначаліў Аб'яднанне мастакоў-беларусаў Балтыі "Маю гонар" (1991).

Беларусы Латвіі сёння гуртуюцца вакол Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны "Прамень" і беларускага культурна-асветніцкага аб'яднання "Уздым" у Даўгаўпілсе (створаны ў 1993 г.). З 1994 г. выходзіць штомесячная газета беларусаў Латвіі "Прамень". У Даўгаўпілсе друкуюцца старонкі культурна-асветніцкага таварыства "Уздым" — "Слова беларуса" ў газеце "Динабург"; "Беларус Латгаліі" — у газеце "Латгалес Лайкс" (рэдактар старонак С. Валодзька). У 1991 г. беларускамоўныя старонкі з'яўляліся ў газеце "Вентас Балс" (у г. Вентспілс, рэдактары У. Скрабатун і А. Нарушэвіч). Пры таварыстве "Прамень" у Рызе створаны ансамбль беларускай народнай песні "Надзея" (кіраўнік З. Кальвіш), а пры таварыстве "Уздым" у Даўгаўпілсе — жаночы ансамбль "Купалінка".

Латвійская дзяржава спрыяе школьнай адукацыі на нацыянальных мовах. Беларускія факультатывы існавалі ў школах Елгавы, Тукумса, Краславы. У Краслаўскай гімназіі "Вясёлка" самі вучні вызначаюць сваю нацыянальную прыналежнасць. Такім шляхам 175 выхаванцаў настаўніцы С. Стальмачонак пачалі вывучаць мову сваіх продкаў, народныя звычаі, праводзіць фальклорныя святы. Беларуская нядзельная школа існуе ў Даўгапілсе. На гарадскі баланс горада ўзята Рыжская беларуская школа.

З 1996 г. у Даўгаўпілсе і Рызе дзейнічаюць суполкі Міжнароднага фонду Янкі Купалы. Асацыяцыю прадпрымальнікаў-беларусаў Латвіі "Беларускі шлях" ўзначальвае В. Піскунова. У Даўгаўпілсе ў 1996 г. створана таварыства культуры "Латвія — Беларусь", дзе сябрамі рады абраны і беларусы.

У нялёгкіх палітычных і эканамічных умовах беларусы Латвіі сваёй грамадскай дзейнасцю працягваюць традыцыі папярэднікаў — будзіцеляў 20–30-х гг. Іх вопыт сведчыць, што толькі сутворчасць нацыянальнай меншасці з дзяржавай, адкрытасць на культуру тытульнай нацыі, асабістая годнасць і павага да астатніх суграмадзян прыводзяць да суладдзя ў грамадстве. Значную дапамогу беларусам Латвіі ў іх справах аказваюць Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Урад Беларусі, Міністэрства замежных спраў, Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь, міністэрствы адукацыі і культуры, грамадскія арганізацыі Беларусі.

Сяргей Панізьнік

Беларусы ў Літве

Гістарычныя, эканамічныя, культурны-духоўныя сувязі паміж беларусамі і літоўцамі, іх агульнае гістарычнае мінулае істотна ўплывала на становішча беларускай дыяспары ў Літве ў розныя перыяды.

На працягу XIII–XIV стст. продкі беларусаў і літоўцаў ва ўмовах крыжацкай агрэсіі і пад пагрозай манголататарскага нашэсця стварылі супольную Літоўска-Беларускую дзяржаву — Вялікае Княства Літоўскае. Гэта дапамагло ім абараніць сваю незалежнасць, стварыць спрыяльныя ўмовы для сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця. З заключэннем Люблінскай уніі 1569 г. паміж ВКЛ і Польскім Каралеўствам беларусы і літоўцы аказаліся ў новай еўрапейскай дзяржаве-канфедэрацыі — Рэчы Паспалітай. Пасля яе падзелаў у канцы XVIII ст. (1772, 1793, 1795) беларускія і літоўскія землі былі ўключаны ў склад Расійскай імперыі, дзе з 1796 па 1802 г. існавала Беларуская губерня, а з 1797 па 1801 г. — Літоўская. З іх скасаваннем назвы "Беларусь", "Літва" афіцыйна ў Расіі зніклі ў палітычным сэнсе. У губернях з пераважна літоўскім насельніцтвам пражывала таксама немалая колькасць беларусаў. Паводле перапісу 1897 г., на літоўскіх землях іх было 70 300 чалавек (пятая па колькасці этнічная супольнасць). У губернях з пераважна беларускім насельніцтвам пражывалі і літоўцы. У адпаведнасці з перапісам 1897 г. у Віленскай губерні 56 % жыхароў складалі беларусы, 17,6 % — літоўцы. Пад уплывам беларускага этнасу жыхары Усходняй і Паўднёва-Усходняй Літвы (аўкштайты, дзукі) набылі шмат агульнага ў лексіцы, фальклоры, матэрыяльнай культуры (адзенне, ежа, побыт).

У межах Расійскай імперыі беларускі і літоўскі народы вялі супольную нацыянальна-вызваленчую барацьбу (тайныя таварыствы патрыятычнай моладзі ў Літве і Беларусі — філаматы, філарэты, прамяністыя, змова С. Канарскага – Ф. Савіча і інш., паўстанні 1830–1831, 1863–1864). У апошняй чвэрці XIX ст. Віленская цэнтральная група народнікаў кіравала гурткамі ў Вільні, Віцебску, Гродне, Коўне, Магілёве, Мінску. Аб рэвалюцыйных сувязях сведчыць аб'яднанне Ковенскай і Віленскай арганізацый у 1906 г. у абласны саюз РСДРП Літвы і Беларусі, які існаваў да 1908 г. Літоўская арыентацыя праяўлялася ў пэўных колах беларускага нацыянальнага руху, у польскім часопісе "Litwa", які выходзіў у Вільні. У 1915–1918 гг. абмяркоўвалася ідэя канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага на аснове беларускай і літоўскай незалежнасці.

Да Першай сусветнай вайны нацыянальнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё беларускага і літоўскага народаў праходзіла ў адзінай прасторы. У 1915 г. фронт падзяліў Беларусь на дзве часткі. Акупацыя немцамі амаль усёй Віленскай, Гродзенскай і заходняй часткі Мінскай губерні, падтрымка Германіяй літоўцаў у атрыманні незалежнасці моцна паўплывала на стан і дзейнасць беларускай супольнасці гэтага рэгіёна. У верасні 1917 г. была створана Літоўская Рада (Тарыба, орган улады да 1920), якая ў снежні падпісала Дэкларацыю аб аднаўленні незалежнасці літоўскай дзяржавы са сталіцай у Вільні ў саюзе з Германіяй. 16 лютага 1918 г. Тарыба абвясціла акт аб незалежнасці Літвы. Па Брэсцкаму міру (сакавік 1918 г.) Германія дабілася аддзялення ад Расіі Літвы, далучыўшы да яе частку Беларусі. У Коўне была створана Беларуская грамада для абароны сацыяльна-эканамічных інтарэсаў беларусаў, спрыяння рэалізацыі беларускіх нацыянальных ідэалаў, якая дзейнічала ў 1917–1918 гг. Каардынацыйным цэнтрам беларускіх арганізацый на занятых Германіяй тэрыторыях стала Віленская беларуская рада (студзень 1918 – чэрвень 1919 гг., старшыня Антон Луцкевіч). Яна заняла незалежніцкія пазіцыі ў сувязі з набыццём Літвой суверэнітэту, вітала абвяшчэнне БНР. У красавіку 1918 г. Віленская беларуская рада адхіліла прапанову Літоўскай Тарыбы дэлегіраваць у яе склад прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай меншасці. Лістападаўская рэвалюцыя ў Германіі 1918 г., яе паражэнне і дэнансацыя Расіяй у сувязі з гэтым Брэсцкага міру вызваліла беларускія землі ад літоўскай апекі. Па даручэнню А. Луцкевіча, які восенню 1918 г. узначаліў урад БНР, ужо ў лістападзе Віленская беларуская рада вяла перамовы з Літоўскай Тарыбай, каб наладзіць палітычнае і ваеннае супрацоўніцтва супраць палякаў і расійскіх бальшавікоў, каб стварыць федэратыўную беларуска-літоўскую дзяржаву. У выніку ўрад БНР 3 снежня 1918 г. пераехаў у Вільню, а ў склад Літоўскай Тарыбы былі кааптаваны 6 сяброў Віленскай беларускай рады (В. Ластоўскі, І. Луцкевіч і інш.). У Літоўскім урадзе стварылася Міністэрства беларускіх спраў на чале з Язэпам Варонкам да 1920 г., затым да 1923 – Д.Сямашкам. Яно ўзяло пад свой кантроль беларускія тэрыторыі, перададзеныя раней Германіяй Літве. У складзе літоўскага войска з 1918 г. існавалі беларускія часці. У Коўне для беларускіх вайсковых аддзелаў выдавалася газета "Варта Бацькаўшчыны" (1919–1920). Тут выходзілі беларускі ілюстраваны штомесячнік "Часопісь" (1919–1920) і часопіс "Наша зямля" (1920). Друкавалі беларускія кніжкі і брашуры выдавецтва Міністэрства беларускіх спраў у Літве (1919–1920), Выдавецкае таварыства імя Ф. Скарыны (1919–1921). У 1919–1921 гг. у Коўне імі апублікаваны працы В. Ластоўскага, К. Езавітава, Я. Варонкі, падручнікі па фізіялогіі і анатоміі Н. Малышава, батаніцы В. Зяленскага і інш.

Новая палітычная кан'юнктура, што склалася пасля адыходу германскіх войскаў і ў пярэдадзень савецка-польскай вайны, падштурхнула кіраўніцтва РСФСР аб'яднаць абвешчаную 1 студзеня 1919 г. ССРБ (БССР) з савецкім урадам Літвы, каб "засцерагчы гэтыя рэспублікі ад небяспекі праяўлення ў іх нацыянальна-шавіністычных памкненняў" (Я. Свярдлоў), а таксама стварыць буферную зону паміж Польшчай і РСФСР. Антыбеларуская палітыка бальшавікоў праявілася ў абвешчанай 27 лютага 1918 г. Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы (ЛітБел), якая ўключала Гродзенскую, Мінскую, Віленскую і Ковенскую губерні. Ва ўсіх беларускіх школах была ўведзена руская мова навучання, адсутнічала прэса на беларускай мове. Ва ўрадзе ЛітБела не было

ніводнага беларуса для абароны нацыянальных інтарэсаў свайго народа. Хутка гэтая тэрыторыя была захоплена польскімі войскамі - і ЛітБел фактычна перастала існаваць у жніўні 1919 г.

У канцы 1919 – пачатку 1920 г. у Коўне актывізаваліся сілы беларускага руху, якія разлічвалі на стварэнне беларускай дзяржавы дзякуючы падтрымцы краін Захаду і новых дзяржаў на тэрыторыі былой Расіі, у тым ліку Літвы. Хаця ўзніклі пэўныя складанасці ў сувязі з ходам савецка-польскай вайны ў адносінах паміж літоўскімі ўладамі і БНР адносна прыналежнасці зямель "гістарычнай Літвы" з цэнтрам у Вільні, але ўзаемныя інтарэсы ў барацьбе супраць дамаганняў Польшчы на Вільню і Віленскі край спрыялі ўзмацненню кантактаў. У пачатку 1920 г. урад БНР лічыў свае адносіны з Літвой дружалюбнымі. На тэрыторыі Літвы дзейнічалі беларускія вайсковыя часці, захоўвалася Міністэрства беларускіх спраў. З лютага 1920 г. у Коўне асталяваліся і аднавілі сваю дзейнасць Народная рада і ўрад БНР, якія сталі цэнтрам гуртавання беларускіх арганізацый. Тут дзейнічала дыпламатычнае прадстаўніцтва БНР пры ўрадзе Літвы (1921–1924), Беларускае прэс-бюро выдавала бюлетэнь, інфармавала літоўскае грамадства. У красавіку – верасні 1922 г. у Коўне выходзіў на беларускай мове штомесячны грамадска-палітычны і літаратурны часопіс "Беларускі сьцяг", які выступаў з пазіцый абароны беларускай дзяржаўнасці. З лютага 1921 г. у Літве дзейнічаў Камітэт загранічных груп Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (да 1923). Ядро Камітэта складала ковенская група (Т. Грыб, А. Цвікевіч і інш.).

Прэтэнзіі Літвы на беларускія землі рабілі няўстойлівымі, не заўсёды акрэсленымі яе ўзаемаадносіны з беларускім урадам у эміграцыі. Так, летам 1920 г. адносіны ўрада Літвы і беларускіх арганізацый пагоршыліся ў сувязі з тым, што на яго перагаворах з Масквой ігнараваліся інтарэсы Беларусі. Урад РСФСР 12 лютага 1920 г. заключыў дагавор з Літвой, паводле якога ў яе склад увайшла тэрыторыя з гарадамі Вільня, Гродна, Ліда, Браслаў — яе РСФСР лічыла сваёй (ЛітБел была ліквідавана). Дагавор адкрываў магчымасць супольнага выступлення супраць палякаў Чырвонай Арміі і ўсіх літоўскіх войскаў, у якіх былі і беларусы. Далучэнне часткі этнічных беларускіх зямель да Літвы без удзелу прадстаўнікоў і высвятлення волі насельніцтва было негатыўна ўспрынята як Народнай, так і Найвышэйшай радамі. Але да паляпшэння адносін з урадам БНР літоўцаў вымусіла хуткае адступленне савецкіх войск пад націскам палякаў і акупацыя войскамі польскага генерала Люцыяна Жалігоўскага т. зв. Сярэдняй Літвы — беларускіх і літоўскіх зямель з цэнтрам у Вільні, якія па савецка-літоўскаму дагавору перадаваліся Літве. У сувязі з аб'яўленай мабілізацыяй Беларускі нацыянальны камітэт у Вільні ў мемарандуме Л. Жалігоўскаму заявіў, што беларусы жадаюць быць нейтральнымі ў спрэчках паміж Сярэдняй Літвой і Літоўскай Рэспублікай і не жадаюць быць уцягнутымі ў барацьбу з літоўскім народам, у арміі якога нямала беларусаў, што паступілі ў яе для абароны краю ад бальшавікоў. Але аднадушша па гэтаму пытанню не было. Пасля нарады 10 лістапада 1920 г. у Вільні аб адносінах да "Сярэдняй Літвы" (удзельнічалі І. Луцкевіч, Ф. Ярэміч і інш.) у склад яе ўрада быў накіраваны В. Іваноўскі. 11 лістапада 1920 г. заключаны дагавор паміж БНР і Літоўскай Рэспублікай аб узаемным прызнанні, аб супрацоўніцтве і супольнай барацьбе за вызваленне беларускіх і літоўскіх зямель з-пад польскай акупацыі. Вырашэнне тэрытарыяльных прэтэнзій адкладвалася да склікання Беларускага ўстаноўчага сойма. Прадугледжвалася нацыянальна-тэрытарыяльная аўтаномія ў мясцовасцях Літвы з перавагай беларускага насельніцтва. Міністэрства беларускіх спраў пры літоўскім урадзе з 1920 г. мела свой друкаваны орган — газету "Пагоня" (Вільня—Коўна). Беларускія вайсковыя аддзелы дапамагалі літоўцам у абароне незалежнасці, шмат беларусаў пры гэтым загінула. Выдаваўся двухтыднёвы часопіс "Вайсковы" (1921), які спрыяў выхаванню воінаў у нацыянальным духу.

У Каўнасе актывізавалася беларуская грамадская, асветная, навуковая дзейнасць. Культурна-асветныя мерапрыемствы ладзіла Беларускае сабранне (красавік 1921 – люты 1922 г.), якое адчыніла Беларускі клуб. З'явілася прафесіянальная арганізацыя Саюз сялян-беларусаў у Літве (узначальваў А.Карабач), які сваім кандыдатам у Сойм выстаўляў вядомага сацыял-дэмакрата А. Тымінскага.

Змена знешніх і ўнутраных абставін — умацаванне Літоўскай дзяржавы, стабілізацыя яе палітычнага і эканамічнага жыцця, рашэнне ў пачатку 1923 г. Канферэнцыі паслоў краін Антанты пакінуць Вільню і Віленскі край у складзе Польшчы, слабасць беларускага нацыянальнага руху, раскол у асяроддзі беларускай эміграцыі, спрэчкі адносна будучай прыналежнасці Вільні абумовілі рэзкую змену адносін да беларускай супольнасці. У 1923 г. было ліквідавана Міністэрства беларускіх спраў у Літве, асобныя беларускія вайсковыя часці, на што беларуская эміграцыя адрэагавала негатыўна. Сход беларускіх грамадскіх і палітычных дзеячаў у Літве (Каўнас, 23 жніўня 1923 г.) пратэставаў супраць антыбеларускай палітыкі літоўскага ўрада, адмоўна аднёсся да рашэнняў і паводзін В. Ластоўскага, К. Дуж-Душэўскага і інш., якія прывялі да ўрадавага крызісу. Быў сфарміраваны новы ўрад БНР на чале з А. Цвікевічам. Негатыўнае стаўленне Літоўскага ўрада прымусіла прэзідыум Рады і ўрад БНР 1 лістапада 1923 г. пакінуць Каўнас (у Літве застаўся толькі А. Цвікевіч). Але нацыянальна-культурная дзейнасць працягвалася. На базе закрытага Міністэрства беларускіх спраў Літвы быў створаны Беларускі цэнтр у Коўне (1923–1927), які займаўся перакладамі на беларускую мову, выданнем навуковай літаратуры, школьных падручнікаў. Дзейнасць цэнтра трымалася на ініцыятывах і намаганнях В. Ластоўскага, які карыстаўся вялікай папулярнасцю сярод літоўскіх дзяржаўных дзеячаў і займаўся ў гэты час навуковай, літаратурнай і выдавецкай дзейнасцю. Ён апублікаваў "Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік" (1924), "Гісторыю беларускай (крыўскай) кнігі" (1926). Рэдагаваў часопіс "Крывіч" (1923–1926). Пасля ад'езду В. Ластоўскага ў БССР цэнтр спыніў існаванне.

Арганізаваны ў 1925 г. Беларускі нацыянальны камітэт у Каўнасе не змог аб'яднаць беларускую дыяспару на аснове культурна-асветнай работы, а ператварыўся ў эмігранцкую арганізацыю. Шмат беларусаў далучаліся да рускіх і польскіх арганізацый, траплялі ў чужароднае асяроддзе, адрываліся ад свайго этнасу. Паводле першага літоўскага перапісу 1923 г. у межах тагачаснай Літвы беларусамі запісаліся толькі 4400 асоб (0,2 % насельніцтва). Гэта вынік слабай нацыянальнай свядомасці, няўвагі літоўскай улады, якая аддала яе, па словах К. Езавітава, "на распыл у расейскія і польскія рукі". Па яго ж падліках, найбольш рэальная колькасць беларусаў на той час складала 40–45 тыс. Дэнацыяналізацыі беларусаў спрыяла малалікасць нацыянальных школ. Аб развіцці беларускага школьніцтва ў Літве дае ўяўленне наступная колькасць вучняў у беларускіх школах: 1921 г. — 105, 1922 — 115, 1923 — 58, 1924 — 36, 1925 — 34, 1926 — 0, 1927 і 1928 — па 32 вучні. У 1929 г. на ўсю Літву існавала толькі адна беларуская пачатковая школа.

Змяншэнню беларускай прысутнасці ў Літве садзейнічала і несправядлівае рашэнне літоўскага ўрада, які аднёс да "русіфікатараў" тых беларускіх асоб, што праз пазямельны банк купілі зямлю ў Літве, — адабраў яе ў гаспадароў і выслаў іх за дэмаркацыйную лінію. Яны не змаглі адстаяць свае правы; марнымі аказаліся і спробы дабіцца справядлівасці беларускіх грамадскіх дзеячаў. Літоўска-беларускі сход у Коўне (1927) запатрабаваў, каб паводле закона "аб русіфікатарстве" беларусаў не адносілі да варожых элементаў, пакінулі іх на набытых землях.

З пачатку 30-х гг. нацыянальна-культурная беларуская работа ў Літве ажывілася. Шырокі размах набыла дзейнасць Беларускага культурна-асветнага таварыства ў Каўнасе (1932–1935). Пашырэнню сярод беларусаў народных традыцый і культуры, іх гуртаванню спрыялі аддзяленні ў правінцыі, клуб "Беларуская хатка" (Каўнас), Беларускі народны універсітэт, Беларускі народны тэатр, хоры, дзіцячы садок і бібліятэка-чытальня. "Літоўскі веснік" 29 сакавіка 1933 г. паведаміў, што таварыства "з 1932 г. паставіла 213 спектакляў, 454 лекцыі ў Народным універсітэце, 218 харавых спяванак". Таварыства супрацоўнічала з Аб'яднаннем студэнтаў-беларусаў Літоўскага універсітэта імя Вітаўта Вялікага ў Каўнасе (1933–1936), якое праводзіла навуковыя чытанні і дыскусіі, заахвочвала навучэнцаў-беларусаў да пазнання Літоўскага краю. У 1933 г. быў адноўлены Беларускі цэнтр пры Міністэрстве замежных спраў Літвы, але яго прысутнасць у грамадскім жыцці была малапрыкметнай. З 1933 г. выходзіў часопіс "Беларускі асяродак" (выдавец і рэдактар К. Дуж-Душэўскі). У сярэдзіне 30-х гг. Міжнародная асацыяцыя беларускіх арганізацый (Каўнас) прапагандавала ідэю стварэння незалежнай беларускай дзяржавы, падтрымлівала і ўдзельнічала ў палітычных акцыях беларускай эміграцыі.

З пачаткам Другой сусветнай вайны, далучэннем у верасні 1939 г. Заходняй Беларусі да БССР некаторыя лідэры беларускага нацыянальнага руху (А. Станкевіч і інш.) эмігравалі ў Літву, а многія з тых, што засталіся, былі рэпрэсаваны савецкімі органамі і высланы ў лагеры (А. Луцкевіч, В. Жук-Грышкевіч, М. Краўцоў, У. Самойла і інш.). Паводле савецка-літоўскага дагавору аб узаемадапамозе, які быў падпісаны СССР і ўрадам Літвы 10 кастрычніка 1939 г., Вільня і Віленская вобласць з насельніцтвам больш за 457 тыс. чал. (Віленска-Трокскі, частка Свянцянскага і Браслаўскага паветаў) былі далучаны да Літвы без уліку жадання насельніцтва і яго нацыянальнага складу (платай за гэта стала размяшчэнне савецкіх войск на тэрыторыі Літвы). Такім чынам, у яе складзе з'явіліся беларусы-аўтахтоны, якія хаця жылі на сваіх этнічных землях, але аказаліся па-за межамі асноўнага этнасу. На далучаныя тэрыторыі ўлады арганізавалі інтэнсіўнае перасяленне этнічных літоўцаў. Беларусы, якія не нарадзіліся ў Вільні і вобласці, не маглі атрымаць літоўскага грамадзянства. Нямала было выпадкаў, калі беларусаў прымушалі змяніць прозвішча на літоўскі лад. Але пэўная прысутнасць беларускай культуры дазвалялася. Выходзіла адноўленая газета "Крыніца", Віленская беларуская гімназія была ператворана ў прагімназію з пачатковай школай пры ёй. Дзейнічала настаўніцкая семінарыя. Нацыянальную работу вялі Беларускае навуковае таварыства, Беларускі цэнтр. Пасля ўключэння ў 1940 г. Літвы ў склад СССР частка беларускіх дзеячаў эмігравала ад патэнцыяльных рэпрэсій ў краіны Заходняй Еўропы. У ліку дэпартаваных савецкай уладай на ўсход і поўнач СССР жыхароў Літоўскай ССР былі і беларусы. Тыя, хто застаўся, спрабавалі ажывіць беларускую культурна-асветную справу. Савецкая ўлада дазволіла адкрыць у Віленскім краі некалькі беларускіх пачатковых школ. Але на паўнакроўную нацыянальную дзейнасць надзеі не было. Віленскую беларускую гімназію ператварылі ў няпоўную сярэднюю школу, а фонды Віленскага беларускага музея перадалі АН Літоўскай ССР.

Пасля акупацыі (з чэрвеня 1941 г.) Літвы гітлераўскімі войскамі, нягледзячы на цяжкасці "новага парадку" і жорсткі кантроль нямецкіх улад, беларускія нацыянальныя сілы намагаліся працягваць культурна-асветную работу: дзейнічала беларуская гімназія, настаўніцкая семінарыя, Беларускі музей імя А. Луцкевіча. У 1941 г. у Вільнюсе ўзнікла беларуская палітычная арганізацыя — Беларускі нацыянальны камітэт (старшыня В. Іваноўскі, затым — Б. Грабінскі). Выдавалася на беларускай мове (лацінкай) газета "Беларускі голас" (1942–1944, рэдактар Ф. Аляхновіч).

Пасля вызвалення Літвы беларуская культурна-асветная работа тут практычна прыпынілася: былі закрыты беларуская гімназія, настаўніцкая семінарыя, ліквідаваны Беларускі музей імя І. Луцкевіча, фонды якога перадалі розным літоўскім установам, а частка іх трапіла ў БССР. Перад прыходам Савецкай Арміі некаторыя нацыянальныя, грамадскія і культурныя дзеячы эмігравалі на Захад, а пасля аднаўлення савецкай улады многія беларусы разам з сем'ямі былі дэпартаваны на поўнач і ўсход Савецкага Саюза. Нямала беларусаў выехала ў Польшчу на падставе пагаднення аб узаемнай эвакуацыі насельніцтва, заключанага Літоўскай ССР і Польскім камітэтам нацыянальнага

вызвалення (Люблін, 22 верасня 1944 г.). Нацыянальна-культурныя патрэбы беларусаў ігнараваліся. У выніку працягвалася паланізацыя беларусаў-католікаў, якіх афіцыйная статыстыка адносіла да палякаў, і русіфікацыя беларусаў-праваслаўных. У пасляваенныя гады пачаўся сістэматычны прыток у Літву беларусаў па вярбоўцы, на новабудоўлі і інш. У 1959 г. іх налічвалася 30 тыс., у 1979 г. — 58 тыс., 1989 г. — 63 тыс. (або 1,7 % усяго насельніцтва). Але гэтая беларуская супольнасць не мела нацыянальна арганізаванага жыцця. Адсутнічала адпаведная падтрымка з боку БССР. Паводле перапісу 1989 г. 25 560 асоб з іх (або больш 45 %) лічылі роднай мовай беларускую, 1591 беларус — літоўскую, а 33 695 — рускую. Заняпаду беларускага нацыянальнага руху на этнічна беларускіх землях Віленшчыны спрыяла і змена яе насельніцтва (масавае перасяленне сюды этнічных літоўцаў). Нацыянальна арыентаваныя беларусы гуртаваліся вакол асобных адраджэнцаў (мастак П. Сергіевіч, пісьменніца Зоська Верас, літаратары Я. Шутовіч, Л. Луцкевіч, л. Л. Кароль, Л. Мурашка і інш.).

Працэсы лібералізацыі ў СССР паспрыялі абуджэнню беларускага нацыянальнага руху ў Літве. Разгарнулі работу першыя нацыянальныя культурна-асветныя арганізацыі: Таварыства беларускай культуры ў Літве (1989), "Сябрына" (1988). Намаганнямі першага з іх у 1989 г. на могілках Роса ў Вільнюсе быў перазахаваны прах беларускага драматурга і грамадскага дзеяча Ф. Аляхновіча, а ў 1991 г. пастаўлены яму помнік (скульптар Э. Падбярэскі). З 1989 г. пачаліся беларускія перадачы на літоўскім радыё і тэлебачанні. Беларускія нацыянальна-дэмакратычныя сілы ў Літве дапамаглі правесці ў Вільнюсе Другі вольны сойм беларускіх суполак (1989), Устаноўчы з'езд Беларускага народнага фронту (1989). Нямала беларусаў было сярод тых, хто ў студзені 1990 г. падтрымліваў барацьбу за дзяржаўнасць Літвы; 9 з іх узнагароджаны медалём за адвагу і самаахвярнасць, праяўленыя пры абароне незалежнасці Літоўскай Рэспублікі (А. Аблажэй, Х. Балаховіч, С. Дубавец і інш.).

Пасля абвяшчэння незалежнасці Літвы і Беларусі, распаду СССР становішча беларускай дыяспары ў Літве істотна змянілася. Пачаўся працэс вяртання беларусаў на бацькаўшчыну, але разам з тым не перапыніўся і выезд іх у Літву. У 1992–1999 гг. у Беларусь прыехала больш за 13,4 тыс. чал., а выбыла ў Літву больш за 3 тыс. Аб колькасці беларусаў сярод іх даюць уяўленне статыстычныя звесткі за 1995–1997 гг. Сярод тых, хто тады эмігравaў з Беларусі, доля беларусаў наблізілася да чвэрці (332 асобы), а палова тых, хто прыехаў з Літвы, былі беларусы (700 чал.). Этнічныя беларусы складаюць значную частку сярод 2500 чалавек, якія прыбылі з Літвы і прэтэндуюць на статус бежанцаў у Беларусі.

Па дадзеных дэпартамента статыстыкі Літвы, у 90-х гг. у краіне пражывала 55 тыс. беларусаў, або 1,5 % усяго насельніцтва. Яны займаюць чацвертае месца сярод нацыянальных супольнасцей Літвы. Доказам значных праяў асіміляцыі беларусаў з'яўляецца тое, што больш за палову літоўскіх палякаў, якія кампактна пражываюць ва Усходняй Літве, размаўляюць паміж сабой па-беларуску. У Віленскім краі, па меркаванню многіх вучоных-этнографаў, пражывае куды больш беларусаў, чым засведчана перапісам і статыстыкай. Але многія пасляваенныя мігранты-беларусы не вылучаюць сябе з польскага і рускамоўнага асяроддзя.

Пасля абвяшчэння незалежнасці Літвы большасць беларусаў, якія стала пражываюць у гэтай дзяржаве, прынялі яе грамадзянства, а пэўная колькасць атрымала беларускае. Істотна іншы маштаб набыло гуртаванне суродзічаў, выяўленне і рэалізацыя іх нацыянальных імкненняў. Беларуская грамада выразна заявіла ўладам і грамадскасці аб сваіх нацыянальных патрэбах, неабходнасці адраджэння культурнай і гістарычнай спадчыны беларусаў на Віленшчыне. Таварыства беларускай культуры ў Літве, клуб аматараў беларускай народнай творчасці "Сябрына" і рэгіянальная рада Беларускага народнага фронту "Адраджэнне" прынялі ўдзел (у ліку больш 30 грамадскіх арганізацый) ва ўстаноўчым з'ездзе Садружнасці Усходняй Літвы (люты 1992 г.), якая ствараласа ў падтрымку незалежнай дэмакратычнай Літоўскай Рэспублікі, дзеля развіцця нацыянальных культур, абароны правоў грамадзян, што гарантаваліся законамі Літвы і яе міжнароднымі пагадненнямі. На гэтым з'ездзе прадстаўнікі Каардынацыйнай рады беларускіх згуртаванняў у Літве выказалі спадзяванні на аднаўленне Віленскай беларускай гімназіі і Музея імя І. Луцкевіча, узмацненне існуючых на літоўскім радыё і тэлебачанні беларускіх служб, увядзенне беларускага прадстаўніцтва ў Вярхоўнай радзе Літоўскай Рэспублікі і інш. Беларусы цяпер прадстаўлены ў Радзе нацыянальных суполак пры Дэпартаменце нацыянальных меншасцей і іміграцыі пры ўрадзе Літвы, існуе беларуская філія Інфармацыйнай палаты народаў Літвы.

У 2000 г. культурна-асветную работу вялі ў Літве больш 20 беларускіх арганізацый. 10 з іх утварылі Згуртаванне беларускіх грамадскіх арганізацый (ЗБГА) у Літве (прэзідэнт — Л.Мурашка). Актыўна дзейнічае Таварыства беларускай культуры ў Літве, грамадскую і культурна-асветную работу вядуць Таварыства беларускай школы, Таварыства беларускай мовы Віленскага краю, Таварыства беларускага пісьменства, Згуртаванне беларускай моладзі Віленшчыны, беларускія таварыствы Тракайскага, Шальчынінкайскага, Швянчонскага раёнаў, суполка беларусаў у Шаўляі, Згуртаванне беларусаў у Каўнасе, Вісагінская суполка беларусаў і беларускі культурны цэнтр "Крок" (Вісагінас), Беларускі культурны цэнтр у Шальчынінкаі, гарадскі беларускі клуб "Сябрына" ў Вільнюсе з аддзяленнямі ў Пабрадзе і Ваўчунай.

Значнымі здабыткамі беларусаў у Літве стала заснаванне нацыянальнага друку, школы, фальклорных калектываў, мастацкіх суполак. Важнай падзеяй стала аднаўленне 3 верасня 1993 г. дзейнасці Віленскай беларускай сярэдняй школы (сёння яна носіць імя Ф. Скарыны) пры падтрымцы літоўскага і беларускага ўрадаў, пры дапамозе суродзічаў з Літвы, ЗША, Вялікабрытаніі, а таксама Беларусі. Створаны факультатывы навучання беларускай мове і беларускія пачатковыя класы (з 1994 г.) у школах Вісагінаса, Шальчынінкая, Друскінінкая. У 1997 г. пры

151-м садку ў Вільнюсе адкрыта беларуская група. Значную ролю ў падрыхтоўцы настаўнікаў для беларускіх школ выконвае беларускае аддзяленне факультэта славістыкі Вільнюскага педагагічнага універсітэта (кафедру беларускай мовы, літаратуры і этнакультуры ў ім узначальвае кандыдат філалагічных навук Лілія Плыгаўка)

Інфармаванасці беларусаў аб жыцці бацькаўшчыны і нацыянальнай дыяспары, аб гісторыі і культуры беларускага народа спрыяюць беларускія газеты і іншыя выданні ў Літве. З 1994 г. выдаецца "Наша старонка" ў Шальчынінкаі. Пэўны час выходзіла ў Вільнюсе адноўленая "Наша ніва" (1991–1995), з'яўляліся беларускія старонкі ў літоўскай газеце "Рэха" і польскай "Кур'ер віленьскі". З 1997 г. выдаецца газета беларусаў Літвы "Рунь", якую на II з'ездзе беларусаў краін Балтыі вырашана ператварыць у газету суродзічаў гэтага рэгіёна. Тым жа з'ездам ухвалена ідэя штогадовага выпуску сшытка "Беларусы Балтыі: Учора, сёння, заўтра", першы з якіх у 1998 г. апублікаваны выдавецтвам Таварыства беларускай культуры "Рунь". Створанае ў 1998 г., яно выпусціла ў свет "Вандроўкі па Вільні" Лявона Луцкевіча, "У пошуках зачараваных скарбаў" Марыяна Пецюкевіча; "Пад бел-чырвона-белым (Memento patriam)", "Мая адысея" Сымона Шаўцова, "Каляды на чужбіне" Юрыя Весялкоўскага; "Лявонава доля" Міраславы Русак, а ў серыі "Партрэты віленчукоў" – публікацыі у 1999 г. пра Лявона Луцкевіча, Аляксандра Каўша, Зоську Верас, у 2000 г. – Аляксандра Уласава, Пётра Сергіевіча. Выдавецтва "Наша Ніва" надрукавала кнігу паэзіі С. Адамовіча "Плавільшчыкі расы" (1999) і інш. З удзелам беларускай дыяспары у Вільнюсе апублікаваны кнігі У. Арлова і Г. Сагановіча "Дзесяць вякоў беларускай гісторыкі" (1999) і "Аняменне. З хронікі знішчэння беларускай мовы" (2000).

Прыкметнай з'явай у жыцці беларускай нацыянальнай супольнасці сталі радыёперадачы на літоўскім радыё ("Беларускае слова" штотыднёва па асноўнай праграме літоўскага радыё і "Навіны для беларусаў Літвы" штодзённа па другой радыёпраграме). З 1998 г. на канале Вільнюскай радыёстанцыі "Радыё" выходзіць праграма сучаснай беларускай музыкі ("Бернардынскі сад"). Працуе беларуская праграма "Віленскі сшытак" на літоўскім тэлебачанні. З 1996 г. беларускія телеперадачы з'явіліся ў г. Вісагінасе — іх арганізаваў Беларускі культурны цэнтр "Крок" з дапамогай Савета Еўропы. З 1 студзеня 2000 г. у Вільнюсе пачала работу беларускамоўная радыёстанцыя "Балтыйскія хвалі". Далучаюць суродзічаў да нацыянальных традыцый, культуры, знаёмяць з імі іншыя этнічныя супольнасці клуб аматараў беларускай народнай творчасці "Сябрына", 6 калектываў мастацкай самадзейнасці: хор "Сябрына" (Вільнюс), беларускі фальклорны ансамбль "Шчара" і ансамбль "Крок" у Вісагінасе, вакальны дзіцячы калектыў "Спадчына" (Друскінінкай) і інш. У 1998 г. раённы агляд-конкурс беларускай песні ў Шальчынінкаі сабраў больш за 100 удзельнікаў. Духоўную повязь з бацькаўшчынай, моцны нацыянальны пачатак у творчасці праяўляюць сябры суполкі мастакоў Літвы (А. Аблажэй, А. Балаховіч, К. Балаховіч, У. Голуб, С. Зялёнка, У. Кузьменька, Э. Падбярэскі), якая ўваходзіць у Аб'яднанне мастакоў-беларусаў Балтыі "Маю гонар". Персанальныя і калектыўныя выстаўкі іх твораў экспанаваліся не толькі ў Літве, але і іншых краінах Балтыі, на бацькаўшчыне. Культурна-асветным асяродкам становіцца створаны сябрамі Таварыства беларускай мовы Віленскага краю ў засценку Вашунава Докшыцкага р-на Віцебскай вобл. гісторыка-этнаграфічны музей "Засцянковая хата", а таксама бібліятэка пры ім ("Крынічка"), якая налічвае каля 5 тыс. тамоў.

У Вільнюсе склаўся актыўны беларускі навуковы асяродак. Тут ладзяцца навуковыя канферэнцыі, вечарыны з нагоды юбілеяў выдатных дзеячаў Беларусі, значных падзей яе гісторыі. Вывучаецца гісторыя беларусаў у Літве. Прадстаўнікі аматараў беларускай культуры — сябры Літоўскай асацыяцыі беларусістаў, якую ўзначальвае Альма Лапінскене, удзельнічалі ў міжнародных навукова-практычных канферэнцыях па культуры і адукацыі беларускага замежжа (Мінск, 1996, Беласток, 1998). Так, на першай з іх праблемы замежжа і памежжа ў беларускай культуры Віленскага краю асэнсоўваў вядомы адраджэнец Лявон Луцкевіч. З удзелам прадстаўнікоў дыяспар беларуска-літоўскім "круглым сталом" абмяркоўваліся праблемы адукацыі і культуры беларускай дыяспары ў Літве і літоўскай ў Беларусі (чэрвень 1998 г., в. Рымдзюны Астравецкага р-на Гродзенскай вобл.). Намаганнямі беларусаў Літвы ўзнаўляецца памяць пра вядомых дзеячаў беларускага нацыянальнага руху, лёс якіх звязаны з гэтай краінай. Па ініцыятыве Таварыства беларускай культуры мемарыяльнымі дошкамі ў Вільнюсе ўшанаваны памяць Вацлава Ластоўскага, мастака Пётры Сергіевіча. Пры садзейнічанні Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына", іншых структур і асоб устаноўлены мемарыяльныя дошкі Кастусю Каліноўскаму, Янку Купалу, Браніславу Тарашкевічу, Рыгору Шырме (скульптар — мінчанін А. Мірончык). На віленскіх могілках Роса перазахаваны ў 1993 г. прах Івана Луцкевіча, пастаўлены помнікі яму і Антону Луцкевічу, агульным клопатам беларусаў Вільнюса, Гданьска і Мінска ў 1995 г. пастаўлены помнік Альбіну Стаповічу, беларускаму кампазітару і грамадскаму дзеячу.

Наладжваецца на нацыянальнай аснове царкоўна-рэлігійнае жыццё. Дзейнічае каталіцкая секцыя Таварыства беларускай мовы Віленскага краю. Намаганнямі беларускай каталіцкай грамады ў Вільні і вернікаў іншых нацыянальнасцей у касцёле св. Барталамея з 1998 г. адбываюцца богаслужэнні на беларускай мове, якія праводзіць ксёндз Я. Шуткевіч.

Суайчыннікі з Літвы актыўна ўдзельнічаюць у міжнародных акцыях беларускага нацыянальнага руху. Галасы іх прадстаўнікоў гучалі на Сходзе беларусаў блізкага замежжа (1992), з'ездах беларусаў свету (1993, 1997), з'ездах беларусаў краін Балтыі (1994, 1998), сустрэчах беларускай моладзі свету (1994, 1997), сустрэчы кіраўнікоў беларускіх замежных суполак (1995) і інш.

У нацыянальным беларускім руху ў Літве існуюць розныя палітычныя і ідэалагічныя плыні: ёсць прыхільнікі ўмацавання незалежных, дэмакратычных Літвы і Беларусі, ёсць прыхільнікі аднаўлення СССР, абыякавыя да лёсу сваёй бацькаўшчыны. Некаторыя беларускія суполкі падтрымліваюць дзейнасць Рады БНР (яе сябрам стаў старшыня Таварыства беларускай культуры Х. Нюнька). У Вільнюсе прайшла сесія еўрапейскага сектара Рады БНР (ліпень 1997 г.). Тут з 1999 г. знаходзіцца Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га склікання С. Шарэцкі. Беларусы пакуль не маюць сваіх прадстаўнікоў у складзе заканадаўчай і выканаўчай улады Літвы, якія адстойвалі б іх законныя правы і інтарэсы. Толькі пры польскай палітычнай арганізацыі, Выбарчай акцыі палякаў Літвы, з 1995 г. дзейнічае беларуская секцыя ў складзе 10 асоб. Па яе спісу ў 1997 г. дэпутатам Віленскага раённага самакіравання ўжо другі раз абраны сябра Таварыства беларускай мовы Юры Гіль.

Пасля набыцця незалежнасці Беларуссю і Літвой новымі па характару сталі ўзаемаадносіны да сваіх грамадзян на тэрыторыі іншай краіны, а таксама нацыянальных дыяспар, працоўных мігрантаў. У адным з першых падпісаных Рэспублікай Беларусь у якасці суверэннай дзяржавы міжнародных актаў, Дэкларацыі аб прынцыпах добрасуседскіх адносін з Літоўскай Рэспублікай (кастрычнік 1991 г.), абодва бакі прызналі этнічную, культурную і моўную самабытнасць нацыянальных супольнасцей, іх права свабодна выяўляць гэтую самабытнасць без якой-небудзь дыскрымінацыі і ва ўмовах поўнай роўнасці перад законам. У Дагаворы аб добрасуседстве і супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Літоўскай Рэспублікай, падпісаным 6 лютага 1995 г. і ратыфікаваным Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь 26 красавіка 1996 г., вызначаюцца асобы, якія адносяцца да нацыянальнай меншасці, акрэсліваюцца і канкрэтызуюцца іх правы па захаванню нацыянальнай тоеснасці: свабодна карыстацца роднай мовай у асабістым і грамадскім жыцці, мець доступ да інфармацыі і СМІ на роднай мове, вучыцца на роднай мове, захоўваць свае нацыянальныя традыцыі, ствараць культурна-асветныя і іншыя ўстановы і арганізацыі, свабодна вызнаваць і распаўсюджваць сваю рэлігію, інфармацыйныя матэрыялы рэлігійнага зместу на роднай мове, непасрэдна ці праз сваіх прадстаўнікоў на дзяржаўным і мясцовым узроўнях удзельнічаць у грамадскім жыцці, падтрымліваць кантакты з бацькаўшчынай, замежнымі грамадзянамі агульнага этнічнага паходжання. Дзяржавы ўзялі на сябе абавязак устрымлівацца ад дзеянняў, якія могуць выклікаць прымусовую асіміляцыю. Беларусь і Літва падпісалі міжурадавыя пагадненні аб абароне правоў беларускіх грамадзян у Літве і літоўскіх у Беларусі (1997), аб гарантыях іх правоў у галіне пенсійнага забеспячэння (1994). З улікам рынку свабоднай рабочай сілы ў 1996 г. заключана пагадненне аб магчымасці ўзаемнага часовага працаўладкавання і сацыяльнай абароны грамадзян (ратыфікавана 13 лістапада 1997 г.). На самаадчуванне суродзічаў, іх зносіны з бацькаўшчынай уплывае візавы рэжым паміж Літвой і Беларуссю, уведзены з сакавіка 1994 г. З улікам наяўнасці ў Літве этнічных беларусаў для пэўных іх катэгорый зроблены выключэнні, прадстаўлены льготы. З 1994 г. дзейнічае спрошчаны парадак (па пропусках) перасячэння дзяржаўнай мяжы жыхарамі памежных тэрыторый.

Асобныя праблемы захавання беларускай прысутнасці ў Літве абмяркоўваліся ў ходзе знаходжання ў гэтай краіне беларускіх урадавых і іншых дэлегацый. З прадстаўнікамі беларускай супольнасці сустракаўся Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка, калі быў на канферэнцыі кіраўнікоў дзяржаў Усходняй і Цэнтральнай Еўропы (Вільнюс, 1997). Канкрэтную падтрымку літоўскім беларусам аказвае адкрытае тут у 1994 г. Пасольства Беларусі, айчынныя міністэрствы культуры і адукацыі, Дзяржкамітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей, які з 1997 г. узгадняе дзейнасць усіх ведамстваў па выкананню Дзяржаўнай праграмы "Беларусы ў свеце". Вільнюская беларуская школа забяспечваецца падручнікамі, дапаможнікамі, абсталяваннем. Некаторыя мастацкія калектывы атрымалі музычныя інструменты, нацыянальныя касцюмы. Сучасны выдавецкі комплекс перададзены Беларускаму культурнаму цэнтру ў Шальчынінкаі. У гэтым горадзе па ініцыятыве старшыні цэнтра П. Малафея і на сродкі дзяржаўных устаноў Беларусі пры падтрымцы мэра Шальчынінкая адкрыты ў 1999 г. першы у свеце помнік Кастусю Каліноўскаму (скульптар Валяр'ян Янушкевіч). Пры ўдзеле беларускай грамадскасці перад літоўскімі ўладамі ставяцца праблемы адраджэння нацыянальнай спадчыны: аб аднаўленні Віленскага беларускага музея імя Івана Луцкевіча як цэнтра беларускай культуры, пашырэнні беларускага школьніцтва, павелічэнні часу беларускамоўных перадач на радыё і тэлебачанні (ТБК у 1998 г. прасіла Прэзідэнта Літвы стварыць беларускую рэдакцыю на літоўскім радыё). Літоўскія беларусы працягваюць звяртацца ў кампетэнтныя інстанцыі, каб рэалізаваць пастанову СМ ЛітССР ад 6 жніўня 1960 г. аб адкрыцці ў Павільнісе дома-музея Я. Коласа, а таксама стварыць экспазіцыю пра жыццё і дзейнасць беларускай пісьменніцы Цёткі, жонкі літоўскага адраджэнца С. Кайрыса. Вырашэнне гэтых праблем паспрыяе прыпыненню дэнацыяналізацыі беларусаў, захаванню і развіццю беларускай этнічнай супольнасці ў Літве.

Галіна Сяргеева

Беларусы ў Малдове

Гісторыя міждзяржаўных адносін паміж Беларуссю і Малдовай пачынаецца яшчэ ад часоў Вялікага Княства Літоўскага і Малдаўскага княства — феадальнай дзяржавы, што існавала у XIV-XIX стст. У старажытных беларускіх актах Малдаўскае княства фігуруе пад назвай Валошчына, Валошскае ваяводства. Як адзначаецца у тагачасных крыніцах, ужо пры "первых господарех воевод волоских й князей литовских... они мели межи собою братство и прыятельство и мир". Сапраўды, на працягу многіх стагоддзяў Малдова была сферай палітычных інтарэсаў ВКЛ. Пасля спынення першай княжацкай дынастыі малдаўскія баяры ў 1374 г. запрасілі да сябе на пасад з ВКЛ князя Юрыя Карыятавіча, які, праўда, княжыў нядоўга, бо ў тым жа годзе памёр. Аднак ужо ў 1385 г., пасля падпісання Крэўскай уніі, Ягайла пры падтрымцы вялікага князя Вітаўта ўстанавіў над Малдаўскім княствам сюзерэнітэт Польшчы. Пазней яно аказвала дапамогу Вітаўту ў яго барацьбе супраць уніі. Справа дайшла нават да стварэння саюза Вітаўта, малдаўскага ваяводы Рамана і маскоўскага вялікага князя Васіля I.

У 1399 г. Малдова выступіла саюзнікам Вітаўта ў бітве з войскам Залатой Арды на рацэ Ворскла, дзе саюзныя войскі пацярпелі значнае паражэнне. З канца XIV ст. ва ўнутрымалдаўскіх справах актыўны ўдзел браў сын Альгерда вялікі князь ВКЛ Свідрыгайла. Падчас складаных жыццёвых калізій ён неаднаразова вымушаны быў пакідаць радзіму і шукаць сабе прытулак у Малдове. У сваю чаргу, палітычныя эмігранты з Малдовы сустракалі гасцінны прыём у ВКЛ. Не выключана, што на мяжы XIV-XV стст. Малдаўскае княства было ў васальнай залежнасці ад ВКЛ. У далейшым паміж дзвюма дзяржавамі ўсталяваліся раўнапраўныя адносіны. Вядома звыш 10 двухбаковых пагадненняў, заключаных у XV—XVI стст. паміж ВКЛ і Маддовай, якія сведчаць аб гэтым. Вялікае княства Літоўскае неаднаразова аказвала падтрымку Малдаўскаму княству ў яго барацьбе супраць агрэсіі Асманскай імперыі. Беларускія ваяры разам з малдаванамі пралівалі кроў на палях бітваў з туркамі за свабоду Малдовы. Увогуле адносіны беларуска-літоўскага гаспадарства з Малдаўскім княствам вызначаліся сяброўствам і ўзаемадапамогай. Паводле дагавораў, ВКЛ амаль заўсёды захоўвала з Малдовай мір. Так было нават тады, калі Польшча, звязаная уніяй з ВКЛ, ваявала супраць Малдаўскага княства. Адносіны Вялікага Княства Літоўскага да Малдовы з'яўляліся зручнай магчымасцю прадэманстраваць ВКЛ сваю незалежную пазіцыю ад Польшчы, сведчылі аб добрым стаўленні праваслаўных беларусаў да малдаван-адзінаверцаў. Так, калі ў 1506 г. кароль Польшчы і вялікі князь літоўскі Жыгімонт I Стары рыхтаваў паход на Малдову, ён прапанаваў удзельнічаць у ім войскам княства, але атрымаў рашучую адмову з боку Рады ВКЛ. На сойме 1532 г. у Вільні прадстаўнікі Жыгімонта марна прасілі дазволу на выкарыстанне супраць Малдовы войскаў ВКЛ, а ў 1551 г. увогуле вальны сойм у Вільні вырашыў "прысегу учинити на вечны мир и покой воеводе волошскому з панством его милости великим княствам Литовским". Актыўныя дыпламатычныя адносіны з Малдовай падтрымліваліся ВКЛ і пасля Люблінскай уніі 1569 г.

Усё гэта спрыяла культурнаму збліжэнню ВКЛ і Малдаўскага княства. Яшчэ на пачатку XV ст. былі спробы злучыць праваслаўныя цэрквы ВКЛ і Малдаўскага княства ў адзіную мітраполію. Паўднёваславянская мова малдаўскай рэдакцыі, якая была афіцыйнай у Малдове да канца XVII ст., мае моцны ўплывак старабеларускай мовы. Беларускі друкар з Віленскай брацкай друкарні Самуіл Рагаля быў заснавальнікам малдаўскага кнігадрукавання. У 1643 г. ён быў пасланы мітрапалітам П. Магілай да малдаўскага гаспадара Васіля Лупу ў Ясы, дзе арганізаваў друкарню, у якой у тым жа годзе была выдадзена першая малдаўская друкаваная кніга "Евангелле вучыцельнае" ("Карця дэ ынвенцатуре"). Многія славутыя беларуска-літоўскія магнаты былі звязаны дынастычнымі шлюбамі з малдаўскімі гаспадарамі. Вядома, сказанае вышэй тычылася ў першую чаргу стасункаў паміж вышэйшымі пластамі грамадства беларуска-літоўскага гаспадарства і Малдовы. Пасля далучэння Малдовы да Расіі у канцы XVIII - пачатку XIX ст., калі беларусы і малдаване апынуліся ў адзінай дзяржаве — Расійскай імперыі, — склаліся больш спрыяльныя умовы для ўзаемнай міграцыі насельніцтва, хаця яна была у цэлым нязначнай. У часы першай сусветнай вайны ў Малдове знаходзілі сабе прытулак бежанцы з беларускіх зямель.

У 1924 г. была створана Малдаўская АССР у складзе УССР, а правабярэжная частка малдаўскіх зямель (Бесарабія) была пад уладай Румыніі. У чэрвені 1940 г., пасля далучэння Савецкім Саюзам гэтай часткі, была створана Малдаўская ССР. Устойлівая, хаця і невялікая беларуская супольнасць у Малдове з'явілася толькі пасля Другой сусветнай вайны. Прыязджалі ў асноўным беларусы па аргнаборах, на будоўлі, па абавязковаму размеркаванню навучэнцаў, па сямейных абставінах. У 1959 г. у Малдове было звыш 9 тысяч беларусаў, у 1979 - каля 14 тысяч, у 1989 - 20 тысяч. Па сацыяльнаму складу гэта былі прадстаўнікі ўсіх слаёў грамадства, пераважна рабочыя і сяляне. У адпаведнасці з тэорыяй збліжэння і зліцця народаў, якая ажыццяўлялася ў той час у СССР, беларусы, як і іншыя нацыянальныя групы, не мелі ў Малдове сваіх культурна-асветных асяродкаў.

У 90-я гады, пасля распаду СССР, набыцця краінамі незалежнасці ў жыцці беларускай дыяспары Малдовы адбыліся істотныя змены. Пэўная частка беларусаў вярнулася на Радзіму. У 1991—1995 гг. з агульнай колькасці 4353 жыхароў Малдовы, якія прыехалі у Беларусь, беларусы склалі 1673 чалавекі, ці больш 38%. За гэты ж час з Беларусі ў Малдову перасяліліся 2277 чалавек, у тым ліку і пэўная колькасць беларусаў (у 1995 г. — 45 беларусаў). Беларусы Малдовы пачалі арганізацыю нацыянальна-культурнага жыцця. Была створана і пачала праводзіць работу Беларуская грамада ў Рэспубіцы Малдова (Кішынёў, старшыня Уладзімір Дзяржыцкі), у Бендэрах заснавана суполка "Беларусь" (кіраўнік Ганна Лапацьева). Пад кіраўніцтвам настаўніцы Любові Чавусавай у Кішынёве дзейнічае нядзельная беларуская школа. Заняткі праходзяць у беларускай бібліятэцы імя Максіма Багдановіча

(загадчыца Нэлі Цішко). Гэты філіял муніцыпальнай бібліятэкі размешчаны ў адным з мікрараёнаў Кішынёва. Беларусы малдовы выдаюць вершаваныя зборнікі ("Беларуская душа". Кішынёў, 1999), араганізуюць мастацкія выстаўкі. Прадстаўнікі беларускіх суполак удзельнічалі ў рабоце Сходу беларусаў блізкага замежжа, I і II з'ездах беларусаў свету, што адбыліся ў Мінску ў 1993 і 1997 гг. Суполкі падтрымліваюць сувязі з беларускім пасольствам у Малдове.

Беларусь і Малдова прынялі шэраг узаемных дакументаў, якія абараняюць правы сваіх грамадзян на тэрыторыі гэтых краін. У верасні 1995 г. было падпісана пагадненне паміж уладамі дзяржаў аб гарантыях правоў грамадзян у галіне пенсійнага забеспячэння. З 1997 г. дзейнічае Пагадненне аб працоўнай дзейнасці і сацыяльнай абароне грамадзян Рэспублікі Беларусь, што працуюць на гэрыторыі Малдовы, і яе грамадзян, якія працуюць на тэрыторыі Беларусі. Яно распаўсюджваецца на грамадзян і членаў іх сем'яў, а таксама асоб, якія маюць пастаяннае месца жыхарства на тэрыторыі Беларусі і Малдовы. У ім вызначаюцца пытанні налічэння працоўнага стажу, часовай непрацаздольнасці ў сувязі з цяжарнасцю і родамі, прафесійнымі захворваннямі і г.д. У верасні 1997 г. заключана міжурадавае Пагадненне аб абароне правоў і інтарэсаў беларусаў у Малдове і малдаван у Беларусі.

Таццяна Папоўская

Беларусы ў Польшчы

Складовчай часткай беларускай дыяспары пасляваеннага перыяду з'яўляюцца беларусы, якія жывуць у складзе Польшчы. Згодна з дагаворам паміж СССР і Польшчай аб савецка-польскай дзяржаўнай мяжы ад 16 жніўня 1945 г. да Польшчы адыходзіла амаль уся Беластоцкая вобласць у складзе 17 раёнаў з абласным цэнтрам і 3 раёны Брэсцкай вобласці на тэрыторыі Белавежскай пушчы. Прынцыпы вызначэння граніцы паміж Польшчай і СССР былі выпрацаваны саюзнікамі па антыгітлераўскай кааліцыі на Тэгеранскай і Ялцінскай канферэнцыях. У аснову іх была пакладзена лінія Керзана. Але згодна з савецка-польскім дагаворам ад яе былі зроблены даволі значныя адхіленні (да 30 км) на карысць Польшчы. У новых межах польскай дзяржавы засталася даволі значная колькасць беларускага насельніцтва. Па сутнасці дзве суседнія дзяржавы вырашалі свае праблемы за кошт беларускага народа. У ходзе дэмаркацыі мяжы паміж БССР і Польшчай адбывалася рэпатрыяцыя насельніцтва паміж імі. Згодна з пагадненнем паміж урадамі БССР і Польшчы ад 9 верасня 1944 г. рэпатрыяцыі падлягалі грамадзяне беларускай, украінскай, рускай нацыянальнасцей, якія жылі ў Беластоцкім, Аўгустоўскім, Сакольскім, Шчучынскім, Ломжынскім, Высока-Мазавецкім, Бельскім, Бяла-Падляскім паветах і іншых раёнах Польшчы і жадалі перасяліцца на Беларусь, а таксама ўсе палякі і габрэі, якія былі польскімі грамадзянамі да 17 верасня 1939 г., пражывалі ў заходніх вобласцях Беларусі і жадалі перасяліцца на тэрыторыю Польшчы. Асноўны абмен насельніцтвам адбываўся ў 1944–1948 гг., калі з СССР у Польшчу выехала амаль 1, 5 млн чалавек, у тым ліку з БССР больш за 270 тысяч. Амаль 99 % усіх тых, хто выехаў з БССР у Польшчу, дэкларавалі сябе палякамі, але можна ўпэўненна сцвярджаць, што разам з палякамі за межы Беларусі выехала значная колькасць беларусаў каталіцкага веравызнання, якія баяліся савецкай улады, рэпрэсій з боку таталітарнай дзяржавы, прымусовай калектывізацыі, атэістычнага ўціску. Значная частка гэтых людзей накіроўвалася на захад і паўночны захад краіны, на тэрыторыі, што адыйшлі да Польшчы ад Германіі пасля Другой сусветнай вайны. Партыйна-дзяржаўныя органы БССР прымалі меры, каб перашкодзіць выезду ў Польшчу беларусаў-католікаў. На пасяджэннях бюро ЦК КП(б)Б вызначаліся канкрэтныя мерапрыемствы ддя забяспечэння кантролю за ходам запісаў на выезд, пашырэння агітацыйна-прапагандысцкай работы, выяўлення "варожых правакацыйных элементаў". У 1944–1946 гг. пытанні эвакуацыі беларускага насельніцтва з тэрыторыі Польшчы і польскіх грамадзян з тэрыторыі Беларусі разглядаліся 16 раз, па ім было прынята 5 сумесных пастаноў СНК БССР і ЦК КП(б)Б, што сведчыць аб наяўнай вастрыні гэтай праблемы. У сярэдзіне 40-х гг пылітычная і эканамічная сітуацыя — складанае эканамічнае становішча, дзеянні польскага нацыяналістычнага падполля, незадаволенасць ходам правядзення аграрнай рэформы — прымусілі выехаць з Беласточчыны ў глыбіню Польшчы шмат беларусаў праваслаўнага веравызнання. Таму акрамя тэрыторыі Беластоцкага ваяводства этнічныя беларусы пражываюць зараз у Ольштынскім краі (былая Усходняя Прусія), у Памор'і (раёны Гданьска і Шчэціна), а таксама некаторая колькасць у Варшаве, Кракаве, Торуні і іншых гарадах. Беларусы мігрыравалі не толькі ў межах Польшчы. Пасля таго, як з 1956 г. дзяржаўныя ўлады ПНР дазволілі эміграцыю за межы краіны, толькі ў Канаду выехала больш 3 тыс. беларусаў. Як падкрэслівае беларускі даследчык з Польшчы Я. Мірановіч, лік усіх беларусаў, якія выехалі на захад, поўнач і ў цэнтральныя ваяводствы краіны немагчыма акрэсліць нават прыблізна. Гэта датычыць як колькасці рэпатрыянтаў беларускай нацыянальнасці, якія прыбывалі ў Польшчу ў першыя пасляваенння гады, так і колькасці мясцовых беларусаў, якія пераехалі з Беласточчыны ў іншыя рэгіёны. Беларусы-католікі прыбывалі ў Польшчу, запісаўшыся палякамі, што, дарэчы, было адной з умоў рэпатрыяцыі. У выпадку ж унутранай міграцыі праваслаўных беларусаў з Беласточчыны іх рух нідзе дакументальна не фіксаваўся. Я. Мірановіч лічыць, што дакладна можна вызначыць толькі колькасць беларусаў, у большасці праваслаўных, якія насялялі Беластоцкае ваяводства ў першыя пасляваенныя гады. Хаця тут таксама жыла і пэўная колькасць беларусаў каталіцкага веравызнання, якія часткова насялялі Сакольскі і Беластоцкі паветы гэтага ваяводства. Увогуле беларусы на тэрыторыі ваяводства насялялі ўсходнюю частку Бельскага, Сакольскага і Беластоцкага паветаў. Але вызначыць нацыянальнасць гэтых людзей было даволі цяжка,

таму што значная іх колькасць не адносіла сябе ні да палякаў, ні да беларусаў, а лічыла сябе "тутэйшымі", г. зн. тымі, што жывуць тут на сваіх спрадвечных землях. Згодна з дадзенымі польскай статыстыкі ў першыя пасляваенныя гады ў Бельскім павеце беларусы складалі 45 % насельніцтва, або амаль 86 тыс. чалавек. У такіх гмінах, як Орля, Нарва, Нараўка, Кляшчэлі, беларусы складалі звыш 90 % насельніцтва. У Беластоцкім павеце ў 1945 г. налічылі 32 тыс. беларусаў, а ў 1946 г. — 25 тыс. У Сакольскім павеце беларусы жылі ў 13 гмінах (14 тыс. чалавек). У Беларускую ССР з Беласточчыны выехала больш 36 тыс. беларусаў, у тым ліку з Беластоцкага павета — 12 328, Бельскага — 10 122 і Сакольскага — 9 680 чалавек. Маючы на ўвазе колькасць асоб, што выехалі ў БССР, Я. Мірановіч мяркуе, што пасля вызвалення ад немцаў на тэрыторыі Беласточчыны жыло як мінімум 160 тыс. беларусаў. А улічваючы розныя недакладнасці, якія існавалі пры іх падліках (нядобрасумленнасць прадстаўнікоў мясцовых улад, якім было даручана падлічыць колькасць асоб няпольскай нацыянальнасці на падуладных ім адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках, увогуле адсутнасць такіх падлікаў па некаторых гмінах, імкненне зменшыць колькасць беларусаў і г. д.) лік беларусаў у сапраўднасці быў некалькі большы. Але ўдакладніць гэтую лічбу няма ніякай магчымасці з-за адсутнасці адпаведных дакументаў. Увогуле звесткі пра колькасць беларусаў у Польшчы за ўвесь час пасля Другой сусветнай вайны з'яўляюцца недакладнымі і спрэчнымі. Існуюць дзве групы меркаванняў па гэтаму пытанню. Савецкія даследчыкі лічылі, што ў 1957 г. у Польшчы пражывала 200 тыс беларусаў, у 1959 г. — 100 тыс., у 1985 г. — 160 тыс. Паводле падлікаў польскіх спецыялістаў — гісторыкаў, геграфаў, дэмографаў беларускага паходжання ў сярэдзіне 60-х гг. на Беласточчыне беларускае насельніцтва складада 375 тыс. чалавек, а колькасць беларусаў ва ўсёй Польшчы — каля 500 тыс. чадавек. Дасследчык з Польшчы К. Падляскі ў сваёй працы "Bialorusini, Litwini, Ukraincy", выдадзенай у Беластоку ў 1990 г., лічыць, што к канцу 80-х гг. у Польшчы пражывала ад 250 да 400 тыс. беларусаў.

Пэўныя звесткі пра колькасць беларусаў у Польшчы дае Польская аўтакефальная праваслаўная царква, вернікамі якой з'яўляюцца беларусы. Згодна з данымі Польскага статыстычнага штогодніка за 1990 год, ПАПЦ налічвала 870 тыс. веруючых. З іх тыя, што атсамлівалі сябе з беларускай нацыянальнасцю, складалі трэцюю частку, г. зн. 290 тыс. чалавек. Па меркаванню кіраўніка ПАПЦ мітрапаліта Варшаўскага Васіля, гэта царква ўключае таксама каля 250 тыс. палякаў праваслаўнага веравызнання. Значная частка гэтых людзей — спаланізаваныя беларусы. У сваю чаргу Польскі каталіцкі касцёл лічыць, што на Беласточчыне пражывае кадя 500 тыс. чалавек, з якіх 400 тыс. католікаў і каля 100 тыс. праваслаўных.

Цікавы матэрыял да пытання аб колькасці беларусаў як у Польшчы, так і на Беласточчыне даюць вынікі выбараў у Сейм у 1989 г., у якіх беларусы ўпершыню ўдзельнічалі як самастойная палітычная сіла. Згодна з вынікамі выбараў усяго на Беласточчыие пражывала 680, 8 тыс. чалавек, з якіх беларусы складалі 30 % усяго насельніцтва — гэта 206, 8 тыс. чалавек. У тым ліку ў Беластоку — 65, 5 тыс. чалавек (25 % насельніцтва)— беларусы, у Бельску-Падляскім — 17, 2 тыс. (65 %), у Гайнаўцы — 15,1 тыс. беларусаў (65 %). У некаторых гмінах Беластоцкага ваяводства беларусы склададі да 95 % насельніцтва. Увогуле ў Беластоцкім ваяводстве існуе 28 гмін, у якіх у большай або меншай колькасці жывуць беларусы. З іх у 17 гмінах беларусаў даволі значная колькасць(Нарва, Дубічы Царкоўныя, Чыжы, Гарадок, Нараўка, гміна і горад Бельск, гміна і горад Гайнаўка, Орля, Кляшчэлі, Чаромха, Мілейчыцы, Нурэц Станцыя, Мельнік, Белавежа, Міхалова). Самы буйны па колькасці асяродак беларусаў у Польшчы — у Беластоку. Вынікі выбараў 1989 г. паказалі, што беларусаў на Беласточчыне, а, значыць, і ва ўсёй Польшчы, аказалася значна менш, чым лічылі да гэтага польскія даследчыкі беларускага паходжання. Гэта, па-першае, вынік асіміляцыі беларускай меншасці ў Польшчы праз мяшаныя шлюбы. Як падкрэслівае беларускі даследчык з Польшчы А. Латышонак, толькі ў Беластоку амаль палова праваслаўных бярэ шлюбы з католікамі. А гэта ў асноўным вядзе да пераходу ў каталіцтва і прыняцця польскага каталіцкага менталітэту, да адрачэння ад беларускасці. Па другое, складаным для беларусаў Польшчы заўсёды было пытанне нацыянальнага самавызначэння. Этнічныя беларусы, але ў складзе польскай дзяржавы, у выніку яе доўгатэрміновай палітыкі, перастаюць лічыць сябе беларусамі, фарміруюць у сябе самасвядомасць пануючай у дзяржаве нацыі.

Аддзел нацыянальных меншасцей, які дзейнічае ў складзе Міністэрства культуры і мастацтва Польшы таксама, абапіраючыся на вынікі выбараў 1989 г., лічыць, што ў Польшчы пражывае 200 тыс. беларусаў. Прыкладна такую ж лічбу — 200–230 тыс. беларусаў у Польшчы на 1993 год паводле даных польскага часопіса "Polityka" дае газета "Беларус", якая выходзіць у ЗША.

Па свайму сацыяльнаму статусу беларусы ў Польшчы, і менавіта на Беласточчыне, пасля заканчэння Другой сусветнай вайны былі ў пераважнай большасці сялянамі. Беларуская вёска была патрыярхальнай, з элементамі натуральнай гаспадаркі, мела даволі слабыя сувязі з рынкам. Значная колькасць усяго неабходнага ў сельскай гаспадарцы выраблялася на месцы. Такая сацыяльная структура беларускай вёскі захоўвалася амаль да канца 40-х гг. Да гэтага часу тут захаваліся нязменнымі метады апрацоўкі зямлі, дамінавалі традыцыйныя погляды, звычаі і сувязі. Ва ўсходняй частцы Беластоцкага ваяводства пераважалі слабыя, пясчаныя і супесчаныя глебы. Значную частку гэтай тэрыторыі займалі лясы і пусткі, што ўскладняла магчымасці земляробства і жывёлагадоўлі на гэтых землях. Без адпаведных інвестыцый гэты рэгіён не мог выраблять прадукцыю на рынак. Перамены пачаліся з канца 40-х – пачатку 50-х гг., калі ў выніку калектывізацыі, распаўсюджвання сродкаў масавай камунікацыі, развіцця адукацыі, транспартнай сеткі фактычна распалася традыцыйная сацыяльная структура беларускай вёскі. Беларуская моладзь з небагатай вёскі перасялялася ў гарады, дзе шукала магчымасці заробку і працаўладкавання.

Першымі змянялі месца жыхарства дэмабілізаваныя салдаты. Магчымасці сацыяльнага росту для беларусаў давалі войска, міліцыя, фабрыка ці завод, сфера абслугоўвання, у некаторай ступені мясцовы адміністрацыйны апарат. За перыяд існавання ПНР тэрыторыі, якія засялялі беларусы, лічыліся крыніцай працоўнай сілы. Менавіта адсюль ішлі наборы на прыярытэтныя новабудоўлі. Прамысловыя прадпрыемствы з'явіліся і на самой Беласточчыне. Тут таксама значна выраслі гарады. Вёска страчвала сваё насельніцтва, працаваць на зямлі амаль не было каму. Гэта працэсы, якія датычаць не толькі беларусаў. Яны ішлі і ідуць па ўсёй Польшчы. Вынікаюць яны перш за ўсё з рэакцыі на горшыя ўмовы жыцця ў вёсцы. Але беларуская вёска заўсёды была бяднейшая за польскую, і на ёй гэтыя працэсы адбіваліся найбольш балюча. На цяперашні час у гарадах Беласточчыны жыве больш беларусаў, чым у вёсках. Насельніцтва многіх сельскіх гмін даволі сталага ўзросту. Так, напрыклад, у гміне Міхалова, дзе жывуць пераважна беларусы, больш за 80 % насельніцтва — пенсіянеры.

Працэс калектывізацыі, распачаты ў другой палове 40-х гг., для беларускай вёскі меў некалькі іншыя вынікі, чым польскай. Я. Мірановіч лічыць, што яны былі горшымі. Гэтым працэсам была ахоплена значна большая частка насельніцтва. Развіццё кааператываў часта праходзіла пад адміністрацыйным уціскам. Адміністрацыйна-бюракратычнае кіраўніцтва прыводзіла да таго, што падалі ўраджаі, змяншалася прадукцыйнасць працы. Калектыўныя гаспадаркі пачыналі прыносіць не даходы, а страты, не маглі існаваць без датацый дзяржавы. Дзеці сялян, якія працавалі ў кааператывах, прасцей пакідалі вёску і ехалі шукаць лепшай долі ў горад. Іх бацькі не мелі ўласных гаспадарак, якія б заставаліся іх нашчадкам у спадчыну. Пасля 1990 г. у Польшчы змяніўся падыход да калектыўнага гаспадарання. Значная частка беларускіх сялян вярнулася працаваць на сваю зямлю. Зараз частка беларускіх сялян у Польшчы, а менавіта на Беласточчыне, па-ранейшаму працуе ў кааператывах. Другая частка вядзе сваю ўласную гаспадарку. Як адна, так і другая формы гаспадарання ў беларускай вёсцы перажываюць шматлікія цяжкасці, выкліканыя складаным эканамічным становішчам польскай дзяржавы. Працэс міграцыі сельскага насельніцтва ў гарады, выкліканы эканамічнымі прычынамі, працягваецца. Гэты працэс фактычна спрыяў змяненню вёскі. Змяншалася колькасць працоўных рук, што вымушала ўжо з канца 50-х гг. шукаць новыя метады гаспадарання. Вынік гэтага працэсу — тое, што з'явіліся ўмовы для развіцця таварнай гаспадаркі, усталявання эканамічных адносін беларускай вёскі з рынкам.

Дзеці і ўнукі тых беларусаў, што засталіся ў Польшчы пасля Другой сусветнай вайны, амаль цалкам змянілі свой сацыяльны статус. Мала хто з іх імкнецца працаваць у вёсцы. Значная частка абсталёўваецца ў гарадах, набывае сярэднюю і вышэйшую адукацыю. Сфарміравалася шырокая праслойка беларускай інтэлігенцыі — гэта працаўнікі тэхнічных спецыяльнасцей, інжынеры, настаўнікі, журналісты, лекары, навукоўцы і інш. З'явілася свая творчая інтэлігенцыя — пісьменнікі, мастакі, спевакі і г. д. Вясковае беларускае насельніцтва, якое складала да канца 50-х гг. ядро беларускай супольнасці ў Польшчы, інтэгравалася ў агульнадзяржаўную плынь гаспадарчага і культурнага жыцця. Але ў горадзе актыўна праходзіў працэс дэнацыяналізацыі беларусаў, чаму ў значнай ступені спрыяла і палітыка дзяржаўнай улады.

У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе існаванне беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы фактычна не прызнавалася афіцыйнымі ўладамі БССР і Польшчы. Толькі з часоў адлігі 50-х гадоў у СССР і краінах Усходняй Еўропы беларусы ў Польшчы атрымалі магчымасць абмежаванай нацыянальна-культурнай дзейнасці. У 1956 г. было заснавана Беларускае грамадска-культурнае таварыства (БГКТ), 4 сакавіка 1956 г. выйшаў першы нумар тыднёвіка "Ніва" — яго друкаванага органа. З 1957 г. у Беластоку штогод выходзіць "Беларускі каляндар". Беларуская мова выкладалася ў школах Беласточчыны, былі створаны беларускія ліцэі ў Бельску і Гайнаўцы. Беларусы стварылі значную колькасць фальклорных, мастацкіх аматарскіх калектываў, праводзілі конкурсы беларускай песні, фестывалі, мастацкія выстаўкі. К пачатку 80-х гг. існавала 180 гурткоў БГКТ, якія аб'ядноўвалі больш за 6 тысяч чалавек у Беластоку, Варшаве, Гданьску, Бельску, Гайнаўцы і інш. Беларускія творчыя сілы згуртаваліся вакол літаратурна-мастацкага аб'яднання "Белавежа" (з 1958 г.), членамі якога стала каля 30 чалавек. Вядомасць у Польшчы і Беларусі набылі літаратурныя творы С. Яновіча, А. Барскага (Баршчэўскага), В. Шведа, Я. Чыквіна, М. Гайдука і інш. У 1956 г. створана кафедра беларускай філалогіі ў Варшаўскім універсітэце. У канцы 50-х гг. было створана таксама Беларускае навуковае таварыства, вядомасць набылі навуковыя даследаванні Ю. Туронка, Б. Белаказовіча, У. Юзвюка, А. і Я. Мірановічаў. Культурна-асветная дзейнасць была адзіным накірункам грамадскай дзейнасці беларусаў у Польшчы як нацыянальнай супольнасці. Праявы грамадска-палітычнай актыўнасці не дазваляліся. Увогуле ў 70-я гг. польскія ўлады пачалі здзяйсняць на практыцы тэзіс ПАРП аб Польшчы як мононацыянальнай дзяржаве, які быў сфармуляваны ў пастанове 8 пленума ЦК ПАРП "Аб паглыбенні патрыятычнага адзінства народа, аб умацаванні дзяржавы і развіцці сацыялістычнай дэмакратыі" ад 30 лютага 1976 г. У выніку было ліквідавана многае з таго, што было створана беларусамі ў 50-я – 60-я гг. Спынілі сваю дзейнасць многія народныя калектывы, тэатры, гурткі і г. д. Дзесяткі пачатковых школ з беларускіх пераўтварыліся ў школы, дзе беларуская мова вывучалася як прадмет, такі ж лёс напаткаў беларускія ліцэі ў Гайнаўцы і Бельску. БГКТ і яго друкаваны орган "Ніва" засталіся адзінымі беларускімі ўстановамі ў Польшчы. Іх дзейнасць строга кантралявалася і фінансавалася Міністэрствам унутраных спраў.

Пэўныя намаганні ў накірунку актывізацыі і рэарганізацыі беларускай дзейнасці былі зроблены ў пачатку 80-х гг., калі ў Польшчы ўзмацнілася барацьба супраць аўтарытарна-бюракратычнага рэжыма. У мемарандуме БГКТ, накіраваным у лістападзе 1980 г. у ЦК ПАРП, была дадзена аб'ектыўная характарыстыка становішча

беларускай меншасці, выказваліся патрабаванні стварэння ўмоў для пашырэння беларускай нацыянальнай дзейнасці ў Польшчы, прапарцыянальнага прадстаўніцтва беларусаў у органах улады і кіравання. Пашырыўся ўдзел беларускага насельніцтва ў грамадска-палітычным жыцці Польшчы. У 1981 г. пачало дзейнічаць Беларускае аб'яднанне студэнтаў (БАС) (афіцыйна польскімі ўладамі было зарэгістравана ў 1988 г.). У выніку ўвядзення ваеннага становішча ў Польшчы ў снежні 1981 г. была прыпынена дзейнасць БГКТ, БАС, газеты "Ніва". Беларускі нацыянальны рух у Польшчы, у якім пачала шырока ўдзельнічаць моладзь, у гэты час існаваў амаль нелегальна. "Салідарнасць", якая прыйшла да ўлады ў 1990 г., упершыню афіцыйна прызнала наяўнасць у краіне нацыянальных меншасцей. У 1990 г. была створана першая беларуская палітычная партыя — Беларускае дэмакратычнае аб'яднанне (БДА), мэтай якога стала пераўтварэнне беларускай меншасці ў Польшчы ў суб'ект унутрыдзяржаўных і міжнародных палітычных адносін. У 1989 г. адбыліся выбары ў сейм і сенат Польшчы, у 1990 г. у органы мясцовага самакіравання, у якіх беларуская грамадскасць вылучыла сваіх асобных кандыдатаў. У шэрагу гмін Беласточчыны кандыдаты БДА атрымалі перамогу. Канец 1980-х гг. у Польшчы адзначаны ўзнікненнем беларускіх выдавецтваў: Беларускага незалежнага выдавецтва (1980 г.), літаратурнага выдавецтва "Бераг" (1988 г.), гістарычнага імя У. Ігнатоўскага (1988 г.), публіцыстычнага выдавецтва "Кантакт" (1989 г.). З'явіліся новыя беларускія перыядычныя выданні — часопісы "Сустрэчы" (Варшава, з 1983 г.), "FOS" (Беласток, з 1989 г.), "Czasopis" (Беласток, з 1990 г.), "Дыскусія" (Варшава, з 1993 г.) і інш. Літаратурнае аб'яднанне "Белавежа" з 1989 г. стала самастойным, а не органам БГКТ, як гэта было раней. З 1990-х гг. беларускі нацыянальны рух у Польшчы падняўся на якасна новы ўзровень. У краіне былі зарэгістраваны новыя беларускія арганізацыі — Рада Беларускіх арганізацый у Польшчы, Саюз гмін Усходняй Беласточчыны, Зьвяз беларускай моладзі, Беларускае гістарычнае таварыства, Асацыяцыя беларускіх журналістаў і інш. Тыднёвік беларусаў у Польшчы "Ніва" з 1992 г. стаў самастойным (орган Праграмнай рады тыднёвіка), а не органам БГКТ. Паміж новымі і старымі структурамі беларускага нацыянальнага руху ў Польшчы, у прыватнасці, паміж БДА і БГКТ адсутнічае паразуменне па пытаннях тактыкі, метадаў дзейнасці, а таксама размеркавання сродкаў, увогуле даволі абмежаваных, якія польскі ўрад выдзяляе на патрэбы нацыянальных меншасцаў у краіне. З 1992 г. у Варшаве пачала працу беларуская рэдакцыя Польскага радыё. У 1995 г. на Беласточчыне існавалі 44 школы і 2 ліцэі (у Бельску і Гайнаўцы), дзе беларуская мовы выкладалася як прадмет навучання (4–6 гадзін у тыдзень), каля 4 300 чалавек вывучалі беларускую мову ў школах. 3 верасня 1997 г. у Беластоку пачаў работу універсітэт, створаны на базе Варшаўскага універсітэта, што дае больш спрыяльныя магчымасці для атрымання вышэйшай адукацыі для беларусаў Беласточчыны. Зараз у пяці вышэйшых навучальных установах Польшчы існуюць кафедры беларускай філалогіі. У 1997 у выніку парламенцкіх выбараў у Польшчы дэпутатам польскага сейма стаў прадстаўнік беларускай дыяспары ў Беластоцкім ваяводстве Ян Сычэўскі, кіраўнік БГКТ, якое зараз аб'ядноўвае больш як 5 тысяч беларусаў на Беласточчыне. Акрамя таго беларускія суполкі існуюць у Варшаве (Згуртаванне варшаўскіх беларусаў), у Гданьску (беларуская "Хатка") і Ольштыне (беларускі гурток). Пэўная раз'яднанасць беларускіх арганізацый у Польшчы па палітычных поглядах не дазваляе ім дасягнуць больш значных поспехаў у вырашэнні беларускага пытання ў Польшчы. У апошнія гады значна пашырыліся сувязі беларусаў Польшчы з Беларуссю ў галіне культуры, навукі, адукацыі. Далейшае развіццё нацыянальнага руху беларусаў у Польшчы патрабуе яго падтрымкі на дзяржаўным узроўні з боку Беларусі. Першыя крокі ў гэтым накірунку былі зроблены ў кастрычніку 1990 г., калі пад час візіту ў Польшчу ўрадавай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь была падпісана Дэкларацыя аб беларуска-польскіх адносінах, у якой упершыню на міжурадавым узроўні былі ўзяты абавязацельствы аб абароне інтарэсаў нацыянальных меншасцяў у абедзьвюх краінах: беларусаў у Польшчы і палякаў у Беларусі. У выніку падпісання пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Міністэрствам нацыянальнай адукацыі Рэспублкі Польшча і Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь (сакавік 1992 г.) былі створаны спрыяльныя магчымасці для развіцця кантактаў беларускіх суродзічаў у Польшчы з Беларуссю ў галіне навукі і асветы. Крокам у гэтым накірунку з'явілася таксама падпісанне 23 чэрвеня 1992 г. першага ў гісторыі Беларусі і Польшчы Дагавора аб добрасуседстве і супрацоўніцтве, які разлічаны на 15 гадоў. У Дагаворы замацавана абявязацельства дзяржаў захоўваць міжнародныя прынцыпы, якія датычаць абароны правоў нацыянальных меншасцей. У выніку падпісаных пагадненняў у вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя ўстановы Беларусі прымаюцца беларусы з Польшчы. У 1996 г. Беларусь і Польшча заключылі двухбаковае пагадненне аб магчымасці ўзаемнага працаўладкавання і сацыяльнай абароны грамадзян абедзьвюх краін, што таксама мае непасрэднае дачыненне да беларусаў у Польшчы.

Ларыса Языковіч

Беларусы ў Расіі (Расійскай Федэрацыі)

Ранняя міграцыя. Перасяленні ў сярэднія вякі з беларускіх княстваў (Полацкага, Тураўскага і інш.) на землі Паўночнай і Паўночна-Усходняй Русі цяжка прасачыць. Але можна меркаваць, што рознабаковыя сувязі з Наўгародскай, Уладзіміра-Суздальскай і іншымі землямі спрыялі міграцыі сюды жыхароў беларускіх зямель. Ранняя міграцыя вызначалася і дынастычнымі шлюбамі. Умацаванню палітычных сувязей зямель садзейнічалі шлюб сына Юрыя Далгарукага Усевалада з дачкой віцебскага князя Усяслава ў 1175 г., шлюб князя ўладзіміра-суздальскага

Аляксандра (Неўскага) з дачкой полацкага князя Брачыслава ў 1238 г. У бітве са шведскімі рыцарамі на Няве (1240) мужна змагаўся палачанін Якаў, які знаходзіўся на службе пры двары Аляксандра Яраслававіча.

Міграцыя з беларускіх зямель ВКЛ у Маскоўскую дзяржаву. Насельніцтва этнічных беларускіх зямель Вялікага Княства Літоўскага перасялялася ў гарады і княствы Паўночнай і Паўночна-Усходняй Русі, а затым — у Маскоўскую дзяржаву па эканамічных, палітычных, рэлігійных і інш. Прычынах, масава выводзілася ў палон у ходзе войнаў. Найперш сюды выязджалі пакрыўджаныя ці незадаволеныя палітыкай вялікіх князёў прадстаўнікі пануючага саслоўя са сваімі войскамі і сялянамі, а таксама тыя, хто пацярпеў паражэнне ў дынастычнай барацьбе за ўладу. У 1265 г. у Пскоў з дружынай уцёк удзельнік змовы супраць Міндоўга князь Доўмант, які ўзначаліў барацьбу пскавіцян і наўгародцаў супраць нямецкага ордэна. Князь тураўскі і пінскі Нарымунт Гедымінавіч у 1333 г. атрымаў Ладагу і Арэшак "в кормление", а карэльскую зямлю "в отчину и дедину". Полацкі князь Андрэй, які адмовіўся прысягаць вялікаму князю ВКЛ Ягайлу, выехаў у Маскоўскае княства, дзе ўзначаліў "войско великое" з полацкіх і пскоўскіх воінаў і дапамог маскоўскаму князю Дзмітрыю выйграць Кулікоўскую бітву. Пад кіраўніцтвам мсціслаўскага князя Сямёна Лунгвена (у 1389–1407 гг. — намеснік у Ноўгарадзе) былі разбіты шведскія войскі на Няве (1392). У Маскоўскае княства перасяліўся ў 1408 г. сапернік вялікага князя ВКЛ Вітаўта северскі князь Свідрыгайла, многія баяры. У XIV–XV стст. Шматлікія дынастычныя шлюбы пэўным чынам уплывалі на прамаскоўскую палітычную арыентацыю часткі праваслаўнай знаці ВКЛ. Пашырэнню міграцыі на ўсход спрыяла атрыманае паводле прывілею 1447 г. права князёў, рыцараў, шляхты і баяр пакідаць ВКЛ. Права ж усіх свабодных людзей на выезд за мяжу прадугледжвалі Статуты ВКЛ 1566 і 1588 гг. (за выключэннем "непрыяцельскіх краін").

Маскоўская дзяржава, якая з канца XV ст. пачала змаганне за "единение" пад сваёй уладай усходнеславянскіх зямель (Старажытнай Русі), заахвочвала сепаратысцкія памкненні праваслаўнай знаці ВКЛ. У 80–90-я гг. XV ст. пераходы праваслаўных феадалаў на бок Масквы сталі частымі. Пасля выкрыцця ў 1481 г. змовы супраць Казіміра IV, на чале якой стаялі слуцкі князь М. Алелькавіч, Ф. Бельскі і адзін з князёў Гальшанскіх, яе ўдзельнікі і прыхільнікі перасяліліся ў Маскоўскую дзяржаву (Навасельскія, Адоеўскія і інш.). З канца XV ст. перамяшчэнні на ўсход, найперш прымусовыя, былі выкліканы пераходам ад памежных канфліктаў да адкрытай барацьбы за сферы ўплыву на землях Старажытнай Русі паміж Маскоўскай дзяржавай і ВКЛ (войны 1492–1494, 1500–1503, 1507–1508, 1512–1522, 1534–1537 гг.). У час першай з гэтых войнаў з памежных раёнаў ВКЛ перабеглі "на службу" ў Маскву князі С. Варатынскі, М. Мязецкі, А. і В. Бялеўскія, А. Вяземскі са сваімі ўдзеламі. Паводле заключанага ў 1494 г. мірнага дагавора ВКЛ прызнала ўсе "ад'езды" і страціла Вяземскае княства і землі ў басейне Верхняй Акі. Пераходы памежных князёў разам з "дварамі", баярамі, слугамі пад уладу Масквы справакавалі ваенны канфлікт 1500–1503 гг. На службу да Івана III тады перабеглі князі С. Бельскі, В. Шамячыч, С. і І. Мажайскія і інш. Вярхоўскія і чарнігава-северскія князі. ВКЛ не дамаглося вяртання "здрадцаў", а да Маскоўскай дзяржавы адышлі 29 гарадоў і 70 валасцей, у тым ліку Бранск, Чарнігаў, Гомель і інш. У 1508 г., пасля задушэння мецяжу супраць вялікага князя ВКЛ Жыгімонта I Старога, у Маскву выехалі князі Міхаіл, Іван і Васіль Глінскія і іх блізкія паплечнікі. Вялікі князь маскоўскі Васіль III заключыў у красавіку 1508 г. з мяцежнікамі пагадненне аб сумесных ваенных дзеяннях і выкарыстаў іх для заваявання беларускіх зямель і заключэння выгаднага яму міру. Многія з беглай знаці набылі ў Маскоўскім княстве значны ўплыў, знаходзіліся ў блізкім сваяцтве з вялікакняжацкімі, а потым і царскімі родамі (Патрыкеевічы, Бельскія, Глінскія і інш.). Глінская стала жонкай Васіля III. Пасля смерці мужа яна была рэгентам Рускай дзяржавы пры сваім малалетнім сыне — вялікім князі Іване IV. Набліжанымі да яго сталі сыны В. Глінскага. Адзін з іх (Юрый) быў у ліку ініцыятараў абвяшчэння Івана IV першым расійскім царом.

Акрамя праваслаўнай знаці ВКЛ на ўсход беглі і сяляне, гараджане, выводзіліся захопленыя ў ходзе ваенных дзеянняў палонныя, якія затым прымалі ўдзел у заваяванні і асваенні новых зямель. Так, у сібірскім паходзе Ермака (1582) удзельнічалі каля 300 выхадцаў з ВКЛ, сярод якіх былі і палонныя з беларускіх зямель. Удзельнічалі яны і ў разгроме хана Кучума ў 1598 г. Сярод першых пасяленцаў Цюмені, Табольска, Тары у канцы XVI ст. было нямала жыхароў ВКЛ, у тым ліку з беларускіх зямель.

Праз выхадцаў з Беларусі ў Расію пашыраліся здабыткі еўрапейскай асветы і культуры XVI ст. А некаторыя перасяленцы пакінулі прыкметны след у развіцці рускай грамадскай думкі і асветы. Добра адукаваны беларускі шляхціц І. Перасветаў, які з 1539 г. жыў у Маскве, стаў адным з ідэйных натхняльнікаў рэформ Івана IV. Далучэнню Маскоўскай дзяржавы да кнігадрукавання спрыялі І. Фёдараў (Федаровіч), род якога паходзіў з Беларусі, і беларус П. Мсціславец: на прывезеным з ВКЛ друкарскім абсталяванні яны выпусцілі першыя дакладна датаваныя ў Маскоўскай дзяржаве кнігі "Апостал" (1564) і два выданні "Часоўніка", па якіх навучалі грамаце.

Беларусы ў Расіі XVII–XVIII стст. Значны рост перасяленняў у Расію ў канцы XVI–XVII ст. быў выкліканы ўзмацненнем прыгонніцкай эксплуатацыі сялян у ВКЛ, нацыянальна-рэлігійным прыгнётам беларускага насельніцтва ў канфедэратыўнай дзяржаве — Рэчы Паспалітай. Маскоўская дзяржава заахвочвала іміграцыю беларусаў як "исконно русских" для асваення новых заваяваных на ўсходзе рэгіёнаў, давала прытулак беглым (а многім прыгонным і волю), прымала іх на службу (як і палонных, якія прысягнулі на вернасць), аказвала нават пэўную матэрыяльную падтрымку. З улікам значнай колькасці перасяленцаў царкоўны сабор 1620 г. прыняў спецыяльную пастанову аб перахрышчванні беларусаў, "вяртанні іх ва ўлонне сапраўднай веры".

Шляхта, рамеснікі, гандляры, сяляне масава выводзіліся з беларускіх зямель у глыбінныя раёны Расіі ў ходзе яе войнаў з Рэччу Пасталітай (1632–1634, 1654–1667). Так, летам 1633 г. у Томску з'явілася вялікая група "литовских людей", у тым ліку выхадцаў з Мсціслаўскага, Крычаўскага, Аршанскага, Магілёўскага і інш. Паветаў. У час вайны 1654–1667 гг. жыхары беларускіх зямель прымусова перасяляліся пад Маскву, у іншыя цэнтральныя раёны, а найбольш — у Паволжа, Урал і Сібір. У баярына М. Чаркаскага з Арзамаскага павета ў 70-я гг. XVII ст. налічвалася больш за 800 сялян з Беларусі. Масавы характар набыў захоп беларусаў у маскоўскі палон рускімі служылымі людзьмі. На расійскіх абсягах паявіліся ўжо і асобныя пасяленні. Па царскаму ўказу 1672 г. у Маскве з беларусаў была заснавана Мяшчанская (Новамяшчанская) слабада, якая падпарадкоўвалася пасольскаму прыказу. Па звестках гісторыка Р. Лешчанкі, у 70-я гг. XVII ст. утварыліся беларускія слабоды ў Верхатур'і. У XVIII ст. працягвалася фарміраванне ў Сібіры воінскіх падраздзяленняў з беларусаў-ваеннапалонных. Выхадцы з ВКЛ у першай палове XVIII ст. заснавалі каля 20 вёсак з 200 вядомых на той час у Томскім павеце.

Прыкметная прысутнасць беларускага насельніцтва ў Расіі абумовіла значны ўплыў яго на развіццё некаторых галін яе матэрыяльнай і духоўнай культуры. Перасяленцы садзейнічалі сельскагаспадарчаму асваенню Паволжа і Сібіры, а "служивая литва" — замацаванню на новых заваяваных Расіяй тэрыторыях. Некаторыя перасяленцы займалі высокія дзяржаўныя пасады, сталі военачальнікамі, заснавальнікамі купецкіх родаў. Нацыянальна-рэлігійны ўціск (наступленне каталіцызму) абумовілі арыентацыю на Маскву ў першай палове XVII ст. вядомых беларускіх пісьменнікаў, адукаваных праваслаўных святароў, манахаў-кніжнікаў, якія звязалі свой лёс з Расіяй. Значны ўплыў на развіццё рускай культуры, асветніцтва, кнігадрукавання аказалі Сімяон Полацкі, паэты А. Белабоцкі і Ф. Газвінскі, вучоны і літаратар Е. Славінецкі, Куцеінская літаратурная школа на чале з ігуменам І. Труцэвічам. Клопатамі Сімяона Полацкага ў Маскве з'явіліся новыя для Расіі асветніцкія ўстановы: свецкая Верхняя друкарня, прыватны кнігазбор і славяна-грэка-лацінская акадэмія. Важным асяродкам асветы стала вывезеная па загаду патрыярха Нікана восенню 1654 г. у Іверскі манастыр (пад Ноўгарадам) друкарня куцеінскага Богаяўленскага манастыра пад Оршай (разам з майстрамі і вялікай колькасцю кніг). У 1676 г. яе абсталяванне атрымаў Маскоўскі друкарскі двор. Ураджэнец Мсціслаўшчыны Ілья Капіевіч (Капіеўскі) выдаў на рускай мове ў Амстэрдаме, Гданьску і Маскве каля 20 кніг (слоўнікі, падручнікі па граматыцы, арыфметыцы, астраноміі, навігацыі) новым рускім алфавітам. Выхадцы з беларускіх зямель і іх нашчадкі былі ў ліку першапраходцаў, пачынальнікаў геаграфічнага і этнаграфічнага вывучэння карэнных народаў Прыўралля, Сібіры, Чукоткі, Камчаткі (А. Каменскі-Длужык, Л. Сеніцкі, І. Казырэўскі, І. Яўрэінаў і інш.). Калектыў першага у Расіі прыдворнага тэатра (1672–1676) амаль цалкам складаўся з беларусаў Мяшчанскай слабады. Многія беларускія музычныя дзеячы ў XVII ст. плённа працавалі ў Расіі (А. Беражанскі, І. Дзякоўскі, І. Календа, І. Канюхоўскі, Д. Рагачэўскі, З. Гламазінскі).

У другой палове XVII ст. дзесяткі майстроў-рамеснікаў з Полацка, Віцебска, Оршы, Шклова, Магілёва і інш. Гарадоў працавалі ў Збройнай палаце, аздабляліі церамы Крамля, Каломенскі палац, Навадзевічы, Данскі і Новаіерусалімскі (на Істры) манастыры. Беларускія майстры прынеслі ў Расійскую дзяржаву новыя рамёствы, свой адметны стыль, матывы і тэхніку скульптурнай разьбы па дрэве ("беларуская рэзь"), вытворчасць паліхромнай паліванай керамікі. Сваё майстэрства яны праявілі ў іканапісе, жывапісе, ювелірнай справе, культавым і свецкім дойлідстве. Сучасныя даследчыкі прыйшлі да высновы, што Сімяон Полацкі і А. Белабоцкі былі пачынальнікамі асветніцтва на рускіх і ўсходнеславянскіх землях, а мастацкія прынцыпы барока Расія пераймала праз творы Сімяона Полацкага, В. Пазнанскага, С. Палубеса, В. Кораня.

Беларусы па-за сваімі этнічнымі межамі ў складзе Расіі XIX ст. Пасля далучэння беларускіх зямель да Расіі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795), узброеных праяў нацыянальна-вызваленчага руху ў Беларусі ўлады выслалі ў розныя рэгіёны дзяржавы па палітычных матывах тысячы асоб, пераважна дробнай і сярэдняй шляхты: удзельнікаў паўстанняў 1794, 1830–1831, 1863–1864 гг., прыхільнікаў аднаўлення ВКЛ у час паходу Напалеона ў Расію ў 1812 г. У 1820–1840 гг. у Расію ссылаліся дзекабрысты, удзельнікі тайных таварыстваў патрыятычнай моладзі ў Літве і Беларусі (філаматы, філарэты, заране і інш.). Пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі і Літве было саслана на катаргу ў Сібір і арыштанцкія роты 12 355 чал., высланы без следства і суда 3776 чал. Сярод іх былі прадстаўнікі шляхты, мяшчане, сяляне.

Пасля адмены прыгоннага права сялянская міграцыя (адыход на заработкі ў інш. Губерні Еўрапейскай Расіі, перасяленне ў Сібір і на Далёкі Усход) набыла сталы, а затым, на рубяжы XIX–XX стст., і масавы характар. Выезду ў пошуках больш высокага заработку, незанятай ці таннай зямлі спрыяла развіццё чыгуначнай сеткі ў Беларусі і Расійскай імперыі, адкрыццё ў канцы XIX ст. Транссібірскай магістралі. Паводле расійскага перапісу 1897 г. за межамі губерняў з пераважна беларускім насельніцтвам (Віленская, Віцебская, Гродзенская, Магілёўская, Мінская) пражывала 540 тыс. іх ураджэнцаў. Перасяленне беларусаў, якія афіцыйна лічыліся адгалінаваннем рускага этнасу, заахвочвалася ўладамі і было выклікана расслаеннем і абеззямельваннем сялянства, адсутнасцю развітой прамысловасці, якая паглынула б лішак рабочай сілы. З канца XIX ст. павялічыўся прыток беларускай інтэлігенцыі ў расійскія гарады. У 1861–1913 гг. прыблізна 1,5 млн. чалавек з беларускіх губерняў выехала па эканамічных прычынах пераважна ў Еўрапейскую частку Расіі, Сібір, на Далёкі Усход, але ў 1895–1900 гг. кожны сёмы (14 %) з іх затым вярнуўся ў родныя мясціны. Нацыянальны ўціск беларускага народа ў Расійская імперыі, незавершанасць станаўлення беларускай нацыі вялі да паскоранай асіміляцыі мігрантаў, але даследчыкі адзначаюць і пэўнае

захаванне імі мовы, звычаяў, традыцый, этнічных прыкмет у адзенні, харчаванні, побыце, будаўніцтве, вядзенні гаспадаркі.

Наяўнасць сярод перасяленцаў беларускай інтэлігенцыі абумовіла з'яўленне па-за этнічнымі межамі Беларусі нацыянальна арганізаванага культурнага і палітычнага жыцця. Адным з важных яго цэнтраў стаў Пецярбург. З 40-х гг. XIX ст. тут зарадзіўся беларускі літаратурна-грамадскі рух (беларуска-польскі грамадскі гурток Р. Падбярэзскага – Я. Баршчэўскага), які набыў большую нацыянальную адметнасць у другой палове XIX – на пачатку XX ст. Беларуская інтэлігенцыя стварыла ў Пецярбургу першыя нацыянальныя арганізацыі: асветную — "Крывіцкі вязок" (1868) і палітычную — "Гоман" (1884). Існаванне апошняй сведчыць, што беларуская нацыянальна-грамадская думка гэтага часу развівалася пад уплывам рускай народніцкай ідэалогіі. Група "Гоман" належала да беларускай фракцыі партыі "Народная воля", адным з заснавальнікаў якой быў І. Грынявіцкі. Акрамя яго прыкметную ролю ў рускім рэвалюцыйна-дэмакратычным руху адыгралі беларусы М. Судзілоўскі, Р. Ісаеў, С. Кавалік. Мэтай пецярбургскага нелегальнага Гуртка моладзі польска-літоўска-беларускай і маларускай (1889–1893) была прапаганда сацыялістычных ідэй (А. Гурыновіч і інш.).

Творчая спадчына выхадцаў з Беларусі ўзбагаціла рускую навуку і культуру. Некаторыя з высланых у розныя куткі Расіі беларусы зарэкамендавалі сябе таленавітымі даследчыкамі прыроды, побыту, традыцый, мовы народаў Сібіры, Крайняй Поўначы, Далёкага Усходу (І. Чэрскі, Б. Дыбоўскі, Э. Пякарскі, А. Янушкевіч, В. Кавалеўскі, М. Віткоўскі, А. Чаканоўскі, Э. Гадлеўскі). Значны ўплыў на развіццё рускай навукі аказалі таленавітыя фізікі І. Яркоўскі, Ж. Урублеўскі, А. Садоўскі, хімік Э. Урублеўскі.

Гонарам Расіі сталі беларусы М. Пржавальскі (Перавальскі) — славуты географ і падарожнік, даследчык Цэнтральнай Азіі, заснавальнік Расійскага мінералагічнага таварыства, ураджэнец Магілёўшчыны прафесар С. Куторга, рэктар Казанскага універсітэта, ураджэнец Міншчыны астраном З. Дубяга, дыпламат, даследчык Японіі і Кітая І. Гашкевіч. Вядомасць набылі выхадцы з Беларусі — кампазітар В. Казлоўскі (аўтар расійскага гімна "Гром победы раздавайся", першага расійскага рэквіема), спявачка, музычны педагог Г. Жарабцова-Андрэева, літаратурны крытык С. Дудышкін і інш. У 1800 г. артысты балета Шклоўскага тэатра Зорыча былі пераведзены ў балетную трупу Пецярбургскіх імператарскіх тэатраў, а аркестр — у Маскву. Імёны выхадцаў з Беларусі мастакоў І. Аляшкевіча, С. Заранкі, К. Хруцкага, якія працяглы час жылі і працавалі ў Маскве і Пецярбургу, увайшлі ў гісторыю рускага мастацтва. В. Бялыніцкі-Біруля і С. Жукоўскі былі членамі таварыства перасоўных выставак.

Беларусы ў іншаэтнічных раёнах Расіі І чвэрці XX стагодзя. Масавая працоўная міграцыя беларускага насельніцтва па-за этнічную тэрыторыю, найвышэйшы ўздым якой прышоўся на перыяд пасля рэвалюцыі 1905 года, павялічыла беларускую дыяспару ў Расіі. Да першай сусветнай вайны па эканамічных прычынам толькі ў Сібір з Беларусі накіраваліся (пераважна сяляне) больш за 700 тысяч чалавек. У ходзе абвешчанай у 1906 годзе зямельнай (сталыпінскай) рэформы праводзілася палітыка дзяржаўнай падтрымкі перасялення ў Сібір і на ўскраіны імперыі з мэтай каланізацыі гэтых абшараў "рускім элементам" (да яго адносілі і праваслаўных беларусаў). У 1907-1914 гадах з Беларусі такім чынам перасялілася 335,4 тысячы чалавек (галоўным чынам, сяляне-беднякі), але 36,5 тысячы чалавек затым вярнуліся ў родны край з-за цяжкіх умоў жыцця на новых месцах.

У пачатку XX стагоддзя цэнтрам беларускага нацыянальнага грамадска-культурнага жыцця заставаўся Пецярбург. У 1902-1904 гг. дзейнічаў "Круг беларускай народнай прасветы і культуры". Пасля адмены ў 1905 годзе забароны на выданні па-беларуску тут пачалі працаваць першае легальнае беларускае выдавецтва "Загляне сонца і ў наша аконца" (1906-1914), Беларускі навукова літаратурны гурток студэнтаў Санкт-Пецярбургскага універсітэта (1912-1914). Расійская сталіца стала адным з галоўных цэнтраў беларускага адраджэнскага руху. Тут жылі Я. Купала, Цішка Гартны, Алесь Гурло, Браніслаў Тарашкевіч, Цётка, прафесар Браніслаў Энімах-Шыпіла, які фактычна кіраваў пецярбургскімі беларускімі арганізацыямі. 9 лютага 1913 г. у Пецярбургу была пастаўлена "Паўлінка" Янкі Купалы. Адбылося канцэртнае выступленне групы Ігната Буйніцкага (1911 г.), праходзілі літаратурныя вечары, у тым ліку з удзелам рускіх пісьменнікаў. Беларускае інтэлектуальнае асяродзе, з якім быў звязаны Максім Горкі, узнікла ў Ніжнім Ноўгарадзе (з 1896 г.) і Яраслаўлі (з 1908 г.) вакол беларускага этнографа Адама Багдановіча і яго сына, паэта Максіма Багдановіча. У 1915-1916 гг. у Маскве Янка Купала вучыўся ў гарадскім народным універсітэце імя А. Шаняўскага.

Першая сусветная вайна (1914-1918) выклікала значны прыток беларускага насельніцтва ў цэнтральныя губерні Расіі і далей на ўсход. У 1915 годзе пры адступленні царскай арміі з тэрыторыі Беларусі сюды рынуўся паток бежанцаў, а таксама насільна эвакуіраванага насельніцтва. Па афіцыйных данных, у маі 1918 года ў іншаэтнічных рэгіёнах Расіі знаходзілася амаль 2,3 мільёна бежанцаў з Беларусі (найбольшая колькасць у Тамбоўскай, Самарскай, Калужскай, Казанскай, Курскай, Саратаўскай губернях, Петраградзе і Маскве). Аб абуджэнні нацыянальнай свядомасці бежанцаў сведчыць паяўленне арганізацый у іх падтрымку – Беларускае таварыства ў Петраградзе па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны (з студзеня 1916 года да пачатку 1918), Беларуска-ўкраінскі камітэт помачы ахвярам вайны ў Барнауле, а таксама дзейнасць культурна-асветных арганізацый: "Беларуская хатка" ў Арле (1917-1918), Беларускі нацыянальны гурток у Багародзіцку (1917-1918), Арэнбургскі гурток беларусаў (1918) і інш. У рэчышчы нацыянальна-вызваленчага змагання народаў Расіі, пасля Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 года паскорылася развіццё і беларускага нацыянальнага руху. Ажывілася палітычная, культурна-асветная дзейнасць у асяродках беларусаў-бежанцаў, рабочых, вайскоўцў і інш. Па ініцыятыве Беларускай народнай грамады

(грамадска-палітычнай і культурна-асветнай арганізацыі), якая адстойвала права беларускага народа на дзяржаўнае самавызначэнне ў складзе Расійскай Федэратыўнай рэспублікі ў Маскве былі праведзены два Усерасійскія з'езды бежанцаў-беларусаў восенню 1917 года. На першым з іх грамада зрабіла спробу выпрацаваць тактыку для ўсіх беларускіх арганізацый на Устаноўчы сход, але сустрэла супраціўленне Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ) – нацыянальнай леванародніцкай партыі. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі яе арганізацыі з'явіліся ў Петраградзе, Маскве, Казані, Сарататве, Калузе, Тамбове і інш. У Калужскай губерні ў час выбараў ва Устаноўчы сход у лістападзе 1917 года спіс, па якім праводзіла выбары БСГ, атрымаў 998 галасоў. БСГ мела прадстаўнікоў у Савеце рабочых і салдацкіх дэпутатаў і гарадской думе Петраграда, удзельнічала ў рабоце Савета нацыянальных сацыялістычных партый (т. зв. Расійскага інтэрнацыянала). Частка грамадаўцаў брала ўдзел у абвяшчэнні БНР. Петраградская і маскоўская арганізацыі БСГ падтрымалі савецкую аснову беларускай дзяржаўнасці.

За аўтаномію Беларусі ў складзе Расійскай Федэратыўнай рэспублікі выступаў праэсэраўскі Беларускі абласны камітэт пры Усерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў, заснаваны ў Петраградзе з дэлегатаў ад беларускіх губерняў на Усерасійскіх з'ездах сялянскіх дэпутатаў, членаў Устаноўчага сходу, прадстаўнікоў арміі (лістапад 1917-1918, старшыня Я. Канчар), а таксама секцыя беларусаў пры ЦК партыі левых эсэраў.

Прыхільнікі стварэння беларускай дзяржаўнасці на савецкай платформе, якія імкнуліся спалучыць нацыянальную і сацыялістычную ідэі (А. Чарвякоў, А. Усціловіч (Усціновіч), І. Лагун і інш.) восенню 1917 года на базе петраградскіх арганізацый БСГ заснавалі Беларускую сацыял-дэмакратычную рабочую партыю (БСДРП існавала да красавіка 1918 года), члены якой удзельнічалі ў Кастрычніцкім узброенным паўстанні 1917 года. Партыя дэлегавала сваіх прадстаўнікоў на Усебеларускі з'езд (Мінск, снежань 1917 года) і патрабавала затым праз ЦК РСДРП(б) расследаваць прычыны яго разгону. Затым беларускія сілы, якія стаялі на грунце савецкай улады, гуртаваліся вакол Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкома, камісар А. Чарвякоў), які з лютага 1918 па сакавік 1919 года быў аддзелам Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцей РСФСР і меў аддзяленні ў Петраградзе, Смаленску, Сарататве, Віцебску. У сваёй палітычнай і культурна-асветнай працы Белнацком абапіраўся на беларускія секцыі РКП(б) – часткі мясцовых бальшавіцкіх арганізацый у Петраградзе, Маскве, Варонежы, Казані, Невелі, Сарататве, Тамбове і інш., якія дзейнічалі ў 1918-1919 гадах. Актывізацыі беларускага нацыянальнага руху спрыялі праведзены Белнацкомам супольна з беларускімяі секцыямі РКП(б) Усерасійскі з'езд бежанцаў з Беларусі (Масква, 1918), першая канферэнцыя беларускіх савецкіх партый і арганізацый (1918), дзейнасць Беларускага народнага універсітэта ў Маскве (1918), заснаванне грамадска-палітычных і культурна-асветных арганізацый: Беларускай чыгуначнай грамады (1918) і Беларускага навукова-культурнага таварыства (1918-1919) у Маскве, Беларускага вольна-эканамічнага таварыства (1918-1920) і Таварыства ахвотнікаў беларускага народнага штукарства (1918) у Петраградзе, Беларускай вучнёўскай грамады (1918) і гуртка беларускай сацыялістычнай моладзі (1918) у Калузе, клубаў "Беларуская хатка" (1918-1919) у Петраградзе і "Беларус" (1919) у Маскве. Друкаваны орган Белнацкома "Дзянніца", які выдаваўся ў Петраградзе, а затым у Маскве (1918-1919), абуджаў нацыянальную свядомасць беларусаў у Расіі, быў першай савецкай газетай на беларускай мове.

Белнацком і беларускія секцыі РКП(б) у рэчышчы бальшавіцкай палітыкі абаранялі інтарэсы беларусаў у РСФСР, выяўлялі інтарэсы той іх часткі, што імкнулася да нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння беларускага народа на платформе савецкага ладу і ў саюзе з РСФСР, бралі ўдзел у падрыхтоўцы абвяшчэння ССРБ (БССР). Канферэнцыя беларускіх секцый РКП(б), якая адбылася ў Маскве 21-23 снежня 1918 года, прызнала неабходным стварэнне Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі, выбрала Цэнтральнае бюро беларускіх секцый РКП(б) (старшыня З. Жылуновіч), якому даручыла склікаць Усебеларускі з'езд камуністаў і заснаваць нацыянальны партыйны цэнтр. Гэта падштурхнула ЦК РКП(б) да вырашэння пытання аб утварэнні БССР і КП(б)Б, нягледзячы на супрацьдзеянне як у цэнтры, так і ў кіраўніцтве Паўночна-Заходняга абкома РКП(б), абласнога выканаўчага камітэта Саветаў рабочых, салдацкіх, сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту (А. Мяснікоў, К. Ландар, В. Кнорын і інш.), якія выступалі супраць ідэі беларускай дзяржаўнасці, лічылі гэта сепаратызмам. 25 снежня 1918 года на сумесным экстранным пасяджэнні калегіі Белнацкома прадстаўнікамі цэнтральнага бюро секцый РКП(б) і Маскоўскай беларускай секцыі РКП(б) вызначаны спіс кандыдатаў у Часовы ўрад Савецкай Беларускай Рэспублікі. Цэнтральнае бюро беларускіх секцый дэлегавала прадстаўнікоў на абласную партыйную канферэнцыю ў Смаленск, якая абвясціла сябе І-м з'ездам КП(б)Б (30-31 снежня 1918). Ад беларускіх секцый З. Жылуновіч і І. Лагун увайшлі ў склад Цэнтральнага бюро КП(б)Б. Па рашэнню ЦК РКП(б) на І-м з'ездзе КП(б)Б было пракламавана ўтварэнне БССР, у Часовы рабоча-сялянскі ўрад ад Белнацкома і беларускіх секцый РКП(б) увайшлі З. Жылуновіч (старшыня), У. Фальскі , Я. Дыла, Д. Чарнушэвіч, А. Квачанюк, А. Чарвякоў, І. Пузыроў, Ф. Шантыр.

У студзені 1919 года, неўзабаве пасля абвяшчэння БССР, паводле рашэння ЦК РКП(б) усходнія этнічныя беларускія тэрыторыі былі далучаны да РСФСР (Віцебская, Магілёўская, Смаленская губерніі). У адносінах да карэннага насельніцтва гэтых зямель працягвалася палітыка русіфікацыі, а раз'яднанасць этнічнай тэрыторыі (па Рыжскай дамове 1921 года паміж Расіяй і Польшчай у склад апошняй уключана Заходняя Беларусь) парушыла натуральнае развіццё нацыянальна-палітычных працэсаў, аказала негатыўны ўплыў на працэсы нацыянальнай кансалідацыі.

Беларусы ў расійскіх рэгіёнах СССР (1922–1991). Дзяржаўная палітыка СССР садзейнічала рассяленню беларусаў у іншаэтнічных раёнах краіны. Іх прытоку ў РСФСР спрыяў планавы набор рабочай сілы ў аддаленыя і цяжкія для жыцця і працы раёны Поўначы, на новабудоўлі Урала, Сібіры. Значная колькасць беларусаў знаходзілася ў Расіі на сваіх этнічных землях ад студзеня 1919 г. — толькі ў 1924 г. БССР вярнулі 15 паветаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў, а ў 1926 г. — Гомельскі і Рэчыцкі паветы. Але частка ўсходнебеларускіх зямель засталася ў складзе РСФСР. Паводле перапісу 1926 г. за межамі Беларусі ў СССР знаходзілася 602,5 тыс. яе ўраджэнцаў (галоўным чынам сялян), з іх 320 тыс. — у Сібіры і на Далёкім Усходзе. У Заходняй вобласці (з 1937 г. — Смаленскай) пражывала 83 тыс. беларусаў, у Ленінградскай вобласці — 55 тыс., Маскве і Маскоўскай вобласці — 42 тыс. чал. У 1926–1939 гг. з БССР, насельніцтва якой складала каля 5 млн. чалавек, выехалі 617 тыс. чал. (пераважна жыхары сельскай мясцовасці), у тым ліку большасць з іх у РСФСР. Пры гэтым значная доля беларусаў была пераселена прымусова. У канцы 1920 – пачатку 1930-х гг. у РСФСР былі высланы многія прадстаўнікі нацыянальнай інтэлігенцыі, абвінавачаныя ў так званым "нацыянал-дэмакратызме". Масавыя дэпартацыі з Беларусі ажыццяўляліся ў ходзе суцэльнай калектывізацыі, палітычных рэпрэсій 1930-х гг. (гл. арт. *Дэпартацыя*).

У 1920-я гг. пад уплывам нэпа і беларусізацыі пры пэўным садзейнічанні дзяржаўных органаў БССР і РСФСР на абсягах апошняй актывізавалася нацыянальная дзейнасць беларусаў, найперш на сваіх этнічных землях. Каардынацыяй і кіраваннем сістэмай нацыянальнай адукацыі і культурна-асветных устаноў займалася Беларускае цэнтральнае бюро пры Народным камісарыяце асветы РСФСР. Дзейнічалі беларускія секцыі пры Віцебскім (1921–1924), Смаленскім (1922–1923, 1925–1927), Гомельскім (1921 – пач. 1927) губернскіх аддзелах народнай асветы. У 1920-х гг. у месцах кампактнага пражывання беларускага насельніцтва (Смаленшчына, Заходняя Сібір і Далёкі Усход) функцыянавалі дзесяткі беларускіх школ, клубаў, хат-чытальняў і інш. Беларусізацыя школ першай ступені Заходняй вобласці дасягнула 36 %. З 1930 г. пачалі работу Руднянскі беларускі педагагічны тэхнікум і беларускі рабфак у Смаленску.

Пасля заканчэння Грамадзянскай вайны актыўную культурна-асветную і навуковую работу ў Расіі разгарнулі беларускія зямляцтвы, якія дэкларавалі лаяльнасць да савецкай улады: смаленскае і гомельскае, Беларуская культурна-навуковая асацыяцыя пры Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі ў Маскве, беларускія асацыяцыі ў Ленінградзе, Смаленску, Горы-Горках. Дзейнічала Цэнтральнае бюро беларускіх студэнцкіх арганізацый у Маскве. У 1921 г. у Маскве адкрыта беларуская оперна-драматычная студыя пры МХАТ. Беларуская песенная камісія пры Маскоўскім інстытуце музычнай навукі апрацавала і гарманізавала 250 беларускіх народных песень. Улады імкнуліся падпарадкаваць сабе нацыянальна-культурную дзейнасць, перавесці яе ў рэчышча афіцыйнай ідэалогіі. У процівагу існуючым беларускім асацыяцыям з 1929 г. партыйна-камсамольскія органы БССР ініцыявалі стварэнне беларускіх студэнцкіх зямляцтваў на аснове пралетарскай ідэалогіі і паходжання з БССР. Пры фінансавай і матэрыяльнай падтрымцы ўлад у 1920-я гг. існавалі Беларускае пралетарскае студэнцкае зямляцтва ў Маскве, беларускія зямляцтвы ў Варонежы, Волагдзе, Казані, Ленінградзе, Растове-на-Доне, Саратаве, Смаленску, Томску, якія стваралі беларускія бібліятэкі, гурткі беларускай мовы і гісторыі. У 1924–1930 гг. у Маскве дзейнічала Таварыства палітычных эмігрантаў з Заходняй Беларусі (аддзяленні ў Смаленску і Уладзіміры). Але паступова беларускі пралетарскі зямляцкі рух губляў нацыянальную аснову, моцна ідэалагізаваўся. Разам з набыткамі выявіліся і яўныя цяжкасці ў развіцці беларускага культурна-асветнага руху: недахоп сродкаў, падрыхтаваных кадраў, невысокі ўзровень, безадказнасць мясцовых выканаўцаў палітыкі беларусізацыі, а ў многіх месцах — негатыўнае стаўленне ці нават супраціўленне гэтаму працэсу мясцовага партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва, органаў народнай асветы, пасіўнасць саміх беларусаў, іх слабое самаўсведамленне.

Пры рэзкай змене палітычнага і нацыянальнага курсаў у СССР на рубяжы 20–30 гг. дзейнасць нацыянальных грамадскіх арганізацый была прызнана нямэтазгоднай. Ліквідацыя нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў у Расіі на этнічных землях паскорыла працэсы іх асіміляцыі. Запаволілася, а затым і зусім спынілася беларусізацыя ў іншаэтнічных рэгіёнах Расіі. У другой палове 30-х гг. былі ліквідаваны апошнія нацыянальныя арганізацыі — Беларускі клуб у Маскве (1936), Беларускае студэнцкае зямляцтва ў Ленінградзе (1937).

У гады Вялікай Айчыннай вайны, калі Беларусь стала важнейшым плацдармам ваенных дзеянняў, ва ўсходнія раёны СССР было эвакуіравана звыш 1,5 млн. чал., а таксама больш за 120 буйных прадпрыемстваў, устаноў адукацыі, навукі і культуры, вядучых творчых калектываў. Эвакуіраванае насельніцтва працавала ў прамысловасці, на чыгунцы, у сельскай гаспадарцы, навуковых установах РСФСР. Пад Масквой з 1943 г. аднавіў дзейнасць Беларускі дзяржаўны універсітет, у Яраслаўлі — Мінскі медыцынскі інстытут. Пасля заканчэння вайны шмат эвакуіраваных засталося на Урале, у Паволжы, Сібіры, іншых рэгіёнах РСФСР. Пачаўся новы масавы прыток перасяленцаў з Беларусі праз сістэму аргнабора. З 1946 да 1963 г. такім чынам выехала 530 тыс. чалавек, большасць з якіх асела ў Расійскай Федэрацыі. Так, у Карэліі яны склалі 11 % усяго насельніцтва і 15 % сельскіх жыхароў (1959). Пасля вайны перасяленні ў аддаленыя раёны Расіі мелі і прымусовы характар: дэпартацыя многіх з тых, што па розных прычынах засталіся на акупаванай тэрыторыі і добраахвотна ці прымусова супрацоўнічалі з немцамі, каго ваеннае ліхалецце занесла за мяжу (ваеннапалонныя, остарбайтэры, андэрсаўцы), высяленні з заходніх абласцей БССР заможных сялян ("кулакоў") у сувязі з ажыццяўленнем тут прымусовай калектывізацыі.

Далейшую дынаміку міграцыі беларусаў у РСФСР адлюстроўваюць наступныя лічбы: іх колькасць у 1959 г. — 844 тыс., 1970 г. — 964 тыс., 1979 г. — 1 млн. 52 тыс., 1989 г. — 1 млн. 206 тыс. чал. Калі ў 1959 г. беларусы складалі 0,7 % усіх жыхароў Расіі, то ў 1989 — 0,8 %. У гэты час каля 80 % іх пражывала ў гарадах. Такая вялікая прысутнасць беларусаў з усіх сацыяльных слаёў стала вынікам партыйна-дзяржаўнай палітыкі стымулявання ўнутрыдзяржаўнай міграцыі (вярбоўкі, грамадскія заклікі на новабудоўлі, планавае размеркаванне выпускнікоў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных устаноў).

У еўрапейскай частцы Расіі найбольш шматлікія і кампактныя беларускія асяродкі да канца 80-х гг. склаліся ў Маскве і Маскоўскай вобл. (каля 130 тыс.), Санкт-Пецярбургу і Ленінградскай вобл. (больш за 127 тыс.), Калінінградскай вобл. (каля 74 тыс.), Карэліі (55,5 тыс.), Краснадарскім краі (37 тыс.).

Аб масавым прытоку беларускага насельніцтва ў Сібір і на Далёкі Усход, яго ўдзеле ў асваенні гэтых рэгіёнаў сведчыць тое, што ў Іркуцкай вобл. Іх асела каля 74 тыс., Цюменскай — 49 тыс., Краснаярскім краі — каля 34 тыс. Сотні тысяч інжынерна-тэхнічнай інтэлігенцыі і рабочых удзельнічалі ў сацыяльна-эканамічным развіцці Сібіры і паўночных раёнаў Расіі. Нямала беларусаў і іх нашчадкаў займалі ў РСФСР значныя дзяржаўныя пасады, сталі кіраўнікамі прадпрыемстваў, грамадскімі і культурнымі дзеячамі, вядомымі вучонымі (дыпламат А. Грамыка, даследчык Арктыкі акадэмік О. Шміт, заснавальнік геліябіялогіі Л. Чыжэўскі, гісторык М. Улашчык, псіхолаг Л. Выгоцкі, матэматык І. Брайцаў, А. Маліноўскі заклаў фундамент новай навукі — кібернетыкі, сусветную вядомасць набыў авіяканструктар П. Сухі).

У адпаведнасці з курсам на збліжэнне і зліццё нацый савецкія ўлады ігнаравалі нацыянальна-культурныя патрэбы беларусаў, як і інш. Народаў СССР. У рэгіёнах РСФСР адсутнічалі праявы арганізаванай нацыянальнай беларускай дзейнасці, а нацыянальныя асяродкі не мелі ні маральнай, ні матэрыяльнай падтрымкі з боку ўлад БССР. Гэта стала адной з прычын іх паскоранай асіміляцыі. Не толькі нашчадкі, але і многія перасяленцы ў першым пакаленні запісваліся рускімі. Паводле перапісу 1989 г. беларускую мову роднай лічылі ад 28 % да 37 % беларусаў у Расіі. Але большасць з іх працягвалі захоўваць пэўныя этнічныя прыкметы: беларускае вымаўленне, адметнасці ў харчаванні, веданне народных традыцый, культуры. На пачатку 1970-х гг. з'явіліся першыя нефармальныя (створаныя па ініцыятыве знізу) культурныя суполкі ў Маскве: Клуб аматараў "Песняроў", часовыя студэнцкія гурткі ў маскоўскіх ВНУ, якія мелі характар зямляцтваў.

Карэнныя зрухі ў грамадска-палітычным і сацыяльна-эканамічным жыцці з сярэдзіны 1980-х гг. спрыялі нацыянальна-культурнаму абуджэнню беларусаў у РСФСР, стварэнню ў канцы 80-х гг. нацыянальных культурна-асветных арганізацый ў Маскве (суполка студэнцкай моладзі "Пагоня", 1987; Таварыства беларускай культуры імя Ф. Скарыны, 1988) і Санкт-Пецярбургу (Беларускае грамадска-культурнае таварыства, 1988). Аднак моцныя праявы дэнацыяналізацыі беларусаў спрычыніліся да больш позняга нацыянальнага адраджэння, якое закранула меншую долю суродзічаў у параўнанні з інш. Дыяспарамі.

Сучасны стан беларускай дыяспары ў Расійскай Федэрацыі (1992–2000). Істотным фактарам змены міграцыйных працэсаў, паскаральнікам далейшага гуртавання беларусаў, выяўлення і рэалізацыі іх нацыянальных культурна-асветных патрэб стала набыццё Беларуссю незалежнасці і звязанае з гэтым паглыбленне працэсаў дзяржаўнага, нацыянальна-культурнага адраджэння на бацькаўшчыне, фарміраванне новай палітыкі ў дачыненні да замежных суайчыннікаў.

На момант распаду СССР 1 млн. 155 тыс. беларусаў аказаліся ў Расійскай Федэрацыі. У наступныя гады выразна праявілася тэндэнцыя да вяртання іх на бацькаўшчыну, хоць з 1993 г. гэты працэс запаволіўся, бо рэпатрыяцыя адбываецца без дзяржаўнай падтрымкі, а сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў краіне застаецца складанай. За 1992–1997 гг. Беларусь прыняла з Расіі 97 тыс. беларусаў — 50 % ад агульнага ліку прыехаўшых (194 тыс. асоб). За гэты ж час у Расіі склалася найбольшая беларуская дыяспара ў свеце. У апошнія гады яна папоўнілася, пераважна па эканамічных прычынах, дзесяткамі вучоных, прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі, перспектыўнымі спартсменамі. Многія прадпрымальнікі перанеслі сваю дзейнасць у Расію ў сувязі з больш спрыяльнымі падатковымі, інвестыцыйнымі ўмовамі гаспадарання. Адметнасць сучаснага стану беларускай дыяспары — наяўнасць значнай часовай працоўнай міграцыі. Жыхары Беларусі ўладкоўваюцца найчасцей вадзіцелямі гарадскога транспарту, будаўнікамі. На паліўна-энергетычным комплексе Расіі працуе ад 5 да 10 тыс. вахтавікоў (маятнікавая міграцыя). У 1993 г. Беларусь і Расія падпісалі пагадненне аб працоўнай дзейнасці і сацыяльнай абароне грамадзян на тэрыторыі абедзвюх дзяржаў. Адмена Федэральнай міграцыйнай службай Расіі з 1996 г. дазволу на працаўладкаванне грамадзян Беларусі на яе тэрыторыі, увядзенне рэгістрацыйнага парадку павялічыла сюды прыток новых работнікаў. За першае паўгоддзе 1996 г. больш за 10 тыс. грамадзян Беларусі знайшлі работу ў Расіі. Пэўная колькасць асоб уладкоўваецца ў Расіі нелегальна.

Абвяшчэнне незалежнасці Беларусі, працэсы нацыянальнага адраджэння пачатку 1990-х гг. актывізавалі культурна-асветную, нацыянальную дзейнасць расійскіх беларусаў. Спрыяюць захаванню традыцый свайго народа, яго мовы, гісторыі, культуры, папулярызацыі іх у Расіі беларускія суполкі ў Маскве, Санкт-Пецярбургу, Петразаводску, Саснагорску, Калінінградзе, Ніжнім Ноўгарадзе, Новасібірску, Цюмені, Арэнбургу, Омску, Краснаярску, Іркуцку, Цвяры, Ноўгарадзе, Яраслаўлі, Петрапаўлаўску-Камчацкім. Пачатак царкоўна-рэлігійнага жыцця на нацыянальнай аснове на постсавецкім абшары закладзены сябрамі Маскоўскага таварыства

беларускай культуры, якія ў 1991 г. заснавалі уніяцкую і каталіцкую суполкі. Беларусы-вернікі Санкт-Пецярбурга арганізавалі праваслаўную абшчыну, але у 1998 г. дзейнасць яе была спынена.

Творчыя, навуковыя здабыткі беларускіх мастакоў, пісьменнікаў, вучоных, якія жывуць і працуюць у Расіі, узбагачаюць культуру, навуку Беларусі і Расіі. Актыўна працуе суполка мастакоў Санкт-Пецярбурга (І. Чарнякевіч, В. Сівуха, Ю. Казак, М. Ткачэнка), належыць беларускай культуры творчая спадчына таленавітага літаратара І. Ласкова (1941–1994, Якуцк), пісьменнікаў А. Кірвеля, А. Кавалюк, І. Сібілы (Санкт-Пецярбург), драматурга М. Каляды (Екацерынбург). Спрыяюць развіццю беларусікі ў Расіі грунтоўныя публікацыі А. Каўкі, Я. Шыраева, Л. Шчавінскай (Масква), В. Грыцкевіча, І. Маціеўскага, М. Нікалаева (Санкт-Пецярбург), А. Котлярчука (Бранск), М. Ількевіча (Смаленск). Найбольш ініцыятыўныя навуковыя асяродкі склаліся ў Маскве, Санкт-Пецярбургу, Новасібірску. У расійскіх навуковых цэнтрах праявілі свой талент выдатныя вучоныя-беларусы і выхадцы з Беларусі: хімік В. Капцюг (1931–1997), геолаг А. Трафімук, касманаўты П. Клімук і У. Кавалёнак, фізікі Ж. Алфёраў, Б. Галёркін, В. Гальданскі, У. Міткевіч, Ф. Шапіра.

У развіцці сучаснай беларускай супольнасці ў Расіі праявіліся дзве процілеглыя тэндэнцыі – абуджэнне да нацыянальнага жыцця, самаўсведамлення расійскіх беларусаў і паскораная іх асіміляцыя ў цяперашніх умовах (існаванне Саюза, магчымае стварэнне саюзнай дзяржавы). Сведчанне гэтага – адсутнасць беларускіх школ, нацыянальнага друку (выдаюцца толькі бюлетэні "Шляхам Скарыны" у Маскве і "Маланка" ў Іркуцку), амаль поўная асіміляцыя беларусаў на беларуска-расійскім паграніччы, дзе яны жывуць на сваіх этнічна гістарычных землях. У той жа час створаны два каардынацыйныя цэнтраы: Міжрэгіянальнага аб'яднання беларусаў Расіі (сакавік 1999 г.) і нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Беларусы ў Расіі" (красавік 1999 г.).

Пасля набыцця Беларуссю незалежнасці адбыліся істотныя змены ў яе адносінах да дыяспары. З 1990 г. дзейнічае Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына", з якім падтрымліваюць сувязі расійскія беларусы. Больш іх патрэбамі стала цікавіцца таварыства "Радзіма". Прадстаўнікі беларускіх суполак Расіі былі ўдзельнікамі Першага сходу беларусаў блізкага замежжа (снежань 1992). Першага (ліпень 1993) і Другога (ліпень 1997) з'ездаў беларусаў свету. У адпаведнасці з дзяржаўнай праграмай "Беларусы ў свеце" аказваецца падтрымка расійскім беларусам. Міжнародны дагавор, які ў 1995 г. падпісалі Беларусь і Расія, прадугледжвае магчымасць свабоднага выяўлення, захавання і развіцця для суродзічаў этнічнай, культурнай, моўнай, рэлігійнай самабытнасці. У студзені 1999 г. Беларусь ратыфікавала дагавор з Расіяй аб роўных правах грамадзян. Падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Дзяржаўным камітэтам па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам нацыянальнай палітыкі Расійскай Федэрацыі (1.3.1999). Кіраўнікі Беларусі, урадавыя дэлегацыі пры наведванні Расіі сустракаюцца з суродзічамі. З улікам спецыфікі ўзаемаадносін Беларусі і Расіі і наяўнасці сотняў тысяч беларусаў у Расіі, асіміляцыя якіх адбываецца хутчэй ў параўнанні з інш. Этнасамі, асаблівага клопату і падтрымкі бацькаўшчыны патрабуе культурна-асветная работа суродзічаў.

Галіна Сяргеева

Беларусы на Смаленшчыне. Як вядома, продкі беларусаў, смаленскія і полацкія крывічы, у XI–XVI стст. уваходзілі ў адзінае Вялікае Княства Літоўскае, а затым, у XVI–XVII стст., у Рэч Паспалітую. Таму на працягу многіх стагоддзяў беларускія і смаленскія землі знаходзіліся ў цесных палітычных, эканамічных і культурных сувязях. У пачатку XX ст., лічыў акадэмік Я. Карскі, у Смаленскай губерні пражывала каля 1 млн. беларусаў. Многа выехала іх з Беларусі туды на пачатку Першай сусветнай вайны. Усё гэта аказала вялікі ўплыў на працэс фарміравання мясцовага этнасу, яго традыцыйнай народнай культуры. Дарэвалюцыйныя даследчыкі з 12 паветаў вобласці 7 адносілі да ліку беларускіх, а Смаленшчыну — да ліку беларускіх губерняў. 575,6 тыс. жыхароў Смаленшчыны лічылі сябе беларусамі.

Пасля рэвалюцыі 1917 г. на Смаленшчыне пачаўся бурны перыяд развіцця беларушчыны. Тут праводзіліся шматлікія з'езды беларускіх арганізацый: салдат, бежанцаў, грамадска-культурных работнікаў, настаўнікаў. У канцы 1917 г. у Смаленску прайшоў з'езд беларускіх грамадскіх і настаўніцкіх арганізацый, галоўнай мэтай якога было абмеркаванне палітычнага лёсу беларусаў. Былі выкладзены два погляды: з аднаго боку — пазіцыя прыхільнікаў беларускай дзяржаўнасці, з другога — аб'яднання з Расіяй. На ім жа была прынята рэзалюцыя: "Беларусь павінна быць самастойнай". 30–31 снежня 1918 г. 6-я Паўночна-заходняя абласная канферэнцыя РКП(б) абвясціла сябе ў Смаленску з'ездам кампартыі Беларусі і прыняла Пастанову аб стварэнні БССР у складзе Мінскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай губерняў, а 2 лютага 1919 г. Расійская Федэрацыя пацвердзіла самастойнасць БССР. У 1925 г. пры Смаленскім Губана быў створаны Савет па асвеце беларусаў, які распрацаваў доўгатэрміновы план з наступнымі мерапрыемствамі: скласці этнаграфічную карту беларускага насельніцтва Смаленскай губерні; зрабіць спіс беларусаў, якія ведаюць ці жадаюць вывучаць беларускую мову; высветліць магчымасць пераводу некалькіх школ на беларускую мову; выкарыстаць студэнтаў-беларусаў для прапаганды і правядзення падрыхтоўкі насельніцтва да пераходу на родную мову; прасіць Губана накіраваць настаўнікаў на курсы перападрыхтоўкі ў Мінск; распрацаваць канкрэтны план па адкрыццю беларускіх школ і план палітыка-асветнай работы ў гэтым напрамку. Аднак гэты змястоўны план да канца рэалізаваны не быў. Работа па яго выкананню пачалася толькі ў прыгранічных з Беларуссю раёнах. У архівах ёсць справаздачы мясцовых органаў

аб ходзе выканання гэтага плана. Напрыклад, існуе дакладная запіска ў Смаленскі аблана наступнага зместу: "У 1927 г. у Шумячскім раёне адкрыта 11 беларускіх школ, заняткі праходзяць на беларускай мове. [...] У Руднянскім раёне адкрыта 16 школ".

Са Смаленшчынай звязаны лёс многіх славутых беларусаў. Пісьменнік Максім Гарэцкі з 1917 г. жыў у Смаленску, супрацоўнічаў з газетай "Известия Смоленского Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов", дзе апублікаваў 12 артыкулаў; выдаў "Руска-беларускі слоўнік"; адначасова ў мясцовым філіяле Маскоўскага археалагічнага інстытута вучыўся на факультэце гісторыі мастацтваў; у 1937 г. арыштаваны УНКУС Смаленскай вобл. і расстраляны ў г. Вязьме. Народны паэт Беларусі Янка Купала у 1917–1919 гг. працаваў у Смаленску агентам па забеспячэнню ў губхарчкаме; тут напісаў цыкл вершаў, які ўмоўна называецца "Смаленскім". Можна назваць таксама прозвішчы Аляксандра Ляўданскага, Данілы Макоўскага, Данілы Пагуляева, Уладзіміра Дабравольскага, Івана Хазерава. Зробленыя на Смаленшчыне археалагічныя даследаванні А. Ляўданскага ахопліваюць шырокае кола старажытнасцей — ім апублікавана 70 навуковых і навукова-папулярных артыкулаў. З 1922 да 1925 г. ён вучыўся ў Смаленскім універсітэце, працаваў у абласным музеі, выкладаў ва універсітэце. Д. Макоўскі, ураджэнец Магілёўскай губерні, доктар гістарычных навук, быў прафесарам Смаленскага педуніверсітэта з 1930 да 1969 г., актыўна займаўся краязнаўствам, аўтар прац па гісторыі Смаленскай зямлі. Ураджэнец той жа Магілёўскай губерні Д. Пагуляеў, доктар геолага-мінералагічных навук, прайшоў шлях ад студэнта і асістэнта да прафесара і загадчыка кафедры геалогіі Смаленскага педінстытута, зрабіў вялікі ўклад у вывучэнне прыроды і геалогіі Смаленшчыны. Краязнаўцу, этнографу, фальклярысту У. Дабравольскаму, ураджэнцу Смаленшчыны, належаць працы "Адрозненні ў вераваннях і звычаях беларусаў і вялікарусаў Смаленскай губерні", "Абрады і павер'і, якія адносяцца да хатніх і палявых работ сялян Смаленскай губерні", зборнікі прыказак і загадак. Асноўная яго праца — "Смаленскі этнаграфічны зборнік", які ўтрымлівае вялікі матэрыял па духоўнай культуры беларусаў. І. Хазераў, ураджэнец Мінска, даследаваў помнікі архітэктуры Смаленска, Віцебска, Полацка, быў дырэктарам Смаленскага музея. Яго працы "Архітэктура Беларусі і Смаленшчыны XI–XIII стагоддзяў", "Разваліны Манамахавага сабора ў Смаленску" захаваліся ў рукапісах.

У выніку рэпрэсій 30–50-х гг. і палітыкі русіфікацыі беларускія школы і культурныя арганізацыі на Смаленшчыне былі закрыты. Сёння арганізаванага беларускага жыцця на Смаленшчыне няма. Беларускай праблематыкай займаецца некалькі навукоўцаў. Найбольш актыўны з іх — Мікалай Ількевіч, які апублікаваў кнігу пра М. Гарэцкага, некалькі артыкулаў у альманаху "Годы", удзельнічаў у беларусазнаўчых канферэнцыях у Мінску.

Ліяна Азаранка (Смаленск)

Беларусы ў Башкортастане. У Рэспубліцы Башкортастан пражывае каля 25 тысяч беларусаў. У ліпені 1998 г. створаны Рэспубліканскі нацыянальна-культурны цэнтр беларусаў Башкортастана. Асноўная яго мэта — захаванне і развіццё нацыянальнай культуры сярод беларусаў рэспублікі. Асноўная дзейнасць цэнтра засяроджваецца вакол сістэматычных публікацыі матэрыялаў пра Беларусь у перыядычных выданнях Башкортастана, правядзення выставак мастакоў Беларусі, стварэння беларускай бібліятэкі, набыцця твораў беларускіх мастакоў для карцінных галерэй у раённых цэнтрах, стварэння Дома рамёстваў. Найбольш актыўнымі дзеячамі цэнтра з'яўляюцца В. Бабенка, дырэктар Інфармацыйнага цэнтра пры філіяле Маскоўскага гуманітарнага інстытута славянскіх моваў, намеснік старшыні Дзяржсходу Башкортастана па нацыянальных пытаннях; А. Міхальчанка, выкладчыца беларускай мовы і літаратуры на кафедры беларускай мовы і літаратуры пры філіяле Маскоўскага гуманітарнага інстытута славянскіх моваў. Узначальвае цэнтр В. Рамановіч, былы дырэктар завода. У дзвюх гімназіях цэнтра Іглінскага раёна Башкортастана ўведзена выкладанне беларускай мовы як няпрофільнай.

Ніна Петухова

Беларусы ў Карэліі. У 1990 г у Карэліі пражывала 57 тыс. беларусаў. Большасць з іх прыехалі туды пасля Другой сусветнай вайны (для параўнання: да Кастрычніцкай рэвалюцыі толькі некалькі дзесяткаў іх жыло ў Карэліі). Працавалі яны пераважна на лесараспрацоўках. З пачатку 1960-х беларусы пачалі пакідаць рэспубліку, іх колькасць і доля адносна іншых нацыянальнасцей сталі скарачацца (так, у 1989 г. яны складалі ўсяго 7 % агульнай колькасці насельніцтва рэспублікі).

У 1990 г. створана Беларускае культурнае таварыства Карэліі. На пасяджэнні яго арганізацыйнага камітэта старшынёй быў выбраны беларускі спявак Лявон Габрусёнак. Мэтамі Беларускага культурнага таварыства з'яўляюцца актывізацыя нацыянальных кантактаў на культурнай аснове — літаратурнай і мастацкай, у прыватнасці. Пачынальнікі таварыства імкнуцца захаваць беларускую мову, забяспечыць маладое пакаленне кнігамі і падручнікамі на роднай мове. Праўда, у Карэліі паступова сціраюцца адрозненні паміж прадстаўнікамі розных нацыянальнасцей, якія насяляюць рэспубліку.

Святлана Сачанка

Беларусы ў Комі. У рэспубліцы Комі жыве каля 27 тысяч беларусаў. Сярод іх — нашчадкі былых ахвяр "кулацкай ссылкі", палітычных рэпрэсій 30–40-х гг. Але асноўная іх частка трапіла сюды ў пасляваенныя гады, калі разбуранай краіне патрэбны былі вугаль і нафта, газ і драўніна. Многа тут выпускнікоў былога Мінскага лесатэхнічнага інстытута. Яны працавалі на адказных пасадах у лясной прамысловасці, у леспрамгасах. Як і ўсюды, беларусы тут вельмі паважаныя людзі. Іх выбіраюць дэпутатамі, на розныя кіруючыя пасады. Гэта, напрыклад, генеральны дырэктар АТ "Аптгандаль" Г. Набокіх, намеснік міністра ўнутраных спраў В. Бабошын.

У наш складаны час, калі не кожны можа наведаць свой родны край, беларусы Комі, каб не забыць сваю мову, гісторыю, культуру, ствараюць нацыянальныя арганізацыі. Вясной 1996 г. у Сыктыўкары была зарэгістравана нацыянальна-культурная арганізацыя "Беларусы". Асноўная яе мэта — захаванне самабытнай культуры, традыцый беларускага народа. Старшынёй савета арганізацыі быў абраны Аркадзь Крупенька, былы міністр мясцовай прамысловасці Комі, а цяпер пенсіянер, удзельнік Другога з'езду беларусаў свету. Прыязджаў у Беларусь і ў складзе ўрадавай дэлегацыі Рэспублікі Комі.

Арганізацыі дыяспары існуюць у Саснагорску (3200 асоб), Ухце (1500 асоб). У Саснагорску жыве Георгій Усцілоўскі, актыўны член мясцовага "Мемарыяла", дэлегат Першага і Другога з'ездаў беларусаў свету, член Вялікай рады Згуртавання беларусаў свету. Ён у 1993 г. стварыў ва Ухце беларускую суполку "Бацькаўшчына". Не шкадуючы сіл і сваёй пенсіі, увесь час ён праводзіць у архівах, каб адшукаць звесткі аб рэабілітаваных ураджэнцах Беларусі. Іх прозвішчы друкаваліся ў перыядычных беларускіх выданнях. Г. Усцілоўскі з'яўляецца аўтарам кнігі "Саснагорскі мемарыял" (Сыктыўкар, 1996).

Прадстаўнікі беларускіх суполак ў Рэспубліцы Комі прысутнічалі пры падпісанні пагаднення паміж Расіяй і Беларуссю па стварэнню Саюза, заключэнні пагаднення паміж Комі і Беларуссю, удзельнічалі у падрыхтоўцы да візіту Прэзідэнта Беларусі ў Комі, арганізацыі выстаўкі беларускай тэхнікі Белаўтамаза. У рэспубліканскіх газетах надрукаваны артыкулы "Беларусы аб'ядноўваюцца пакуль адзін з адным", "Беларуская аўтаномія Комі", "Радзіма адна — Беларусь" і інш.

Найбольш вядомыя беларусы ў Комі — П. Галавачоў, выпускнік Мінскага лесатэхнічнага інстытута, працаваў 22 гады дырэктарам лесаперапрацоўчага камбіната ў Сыктыўкары, Ганаровы работнік народнай гаспадаркі Комі, выдатнік народнай адукацыі РСФСР; В. Бабошын, намеснік міністра ўнутраных спраў рэспублікі; І. Ізмалкоў, саліст тэатра оперы і балета; В. Вашчылка, намеснік кіраўніка адміністрацыі Рэспублікі; Л. Палянская, начальнік упраўлення культуры г. Сыктыўкара; Н. Гайшук, намеснік пракурора таго ж горада; В. Кузняцоў, намеснік генеральнага дырэктара "Комінафта".

Ніна Петухова

Беларусы ў Якуціі (Рэспубліка Саха). Ужо ў шэрагах першых заваёўнікаў Якуціі былі беларусы, якія мелі найменне "польскіх і літоўскіх людзей". Потым беларусы траплялі туды як сасланыя ўдзельнікі паўстанняў, як чыноўнікі, што накіроўваліся туды на работу, ці як людзі, што шукалі лепшай долі. Першы ўсеагульны перапіс насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г. зафіксаваў у Якуціі 7 беларусаў, 427 палякаў (сярод іх былі праваслаўныя), 30225 рускіх (з іх 23 католікі). Гэта азначае, што беларусы пры перапісе ўвайшлі ў лік іншых народаў. Перапіс 1926 г. фіксуе беларусаў ужо ў колькасці 21 чал. (палякаў 160 чал., рускіх 30156) і адзначае ў іх асяроддзі самы малы працэнт (28 %) валодання роднай мовай з усіх народаў, што ў той час насялялі Якуцію. Савецкі час у гісторыі Якуціі адзначыўся тым, што вялікая колькасць беларусаў была выслана туды ў лагеры сістэмы ГУЛАГа, шмат беларусаў прыехала на будоўлі, на "асваенне паўночных тэрыторый" і г. д. Перапісы насельніцтва засведчылі ў гэтыя гады няўхільны прырост беларускага насельніцтва ў Якуціі: 1959 г. — 2548 чал., 1970 г. — 4090 чал., 1979 г. — 6769 чал., 1989 г. — 9900 чал. Па перапісе 1989 г. беларусы занялі па колькасці пятае месца сярод насельнікаў рэспублікі.

Большая колькасць беларусаў пражывае ў гарадах Нерунгры (1693 чал.), Якуцк (1657 чал.), Мірны (472 чал.), а таксама ў Усць-Янскім (808 чал.), Мірнінскім (803 чал.), Алданскім (722 чал.), Аймяконскім (601 чал.), Ленскім (494 чал.) раёнах Якуціі.

З беларускіх суполак нейкі час існавала беларускае зямляцтва "Віцяблянка". 24 кастрычніка 1990 г. было зарэгістравана Беларускае культурна-асветнае таварыства "Суродзіч", якое перастала існаваць са смерцю пісьменніка І. Ласкова ў 1994 г.

Алесь Баркоўскі (Якуцк)

Беларусы ў Эстоніі

Беларусаў у Эстоніі налічваецца каля 20 тыс. Прыблізна 10 тыс. з іх жывуць у сталіцы, Таліне. Праблемы, з якімі сутыкаюцца эстонскія беларусы, датычаць забеспячэння правоў чалавека ва ўмовах незалежнай дэмакратычнай дзяржавы. Беларусы Эстоніі патрабуюць, каб іх дзеці маглі вучыцца на роднай мове, знаёміцца з гісторыяй, культурай, звычаямі зямлі сваіх продкаў. Ёсць у мясцовых беларусаў іншыя пытанні, не абумоўленыя захаваннем нацыянальнай адметнасці: атрыманне грамадзянства, працаўладкаванне, падтрымка міжэтнічных і міжнародных кантактаў.

Пэўная колькасць беларусаў пасялілася ў Эстоніі пасля абвяшчэння ёю суверэнітэту. З канца 1980-х гадоў дзеля таго, каб палегчыць гэтай нацыянальнай меншасці змаганне за свае правы, пры дапамозе эстонскага ўрада створаны шэраг беларускіх арганізацый. Прешай сярод іх было згуртаванне беларусаў у Кохтла-Ярве (1989), затым пачалі дзейнічаць Беларуска-Эстонскае згуртаванне (БЭЗ узнікла ў 1991 г., штаб-кватэра месціцца ў г. Йыхві — блізка Кохтла-Ярве), Беларускі культурны цэнтр "Бацькаўшчына" (з 1994 г. у Таліне), Таварыства беларускай культуры, суполкі "Лёс", "Грунвальд". Існуе ў Эстоніі таксама Цэнтр дзелавога супрацоўніцтва з іншымі народамі. Прызнаныя лідэры беларускага нацыянальнага руху ў Эстоніі: М. Астраумава, В. Галавашкіна, Т. Галкоўская, Л. Глімакова, І. Дрозд, У. Дзехцярук, З. Клыга, Г. Корка, С. Разанка, Р. Рэвут, С. Сотчанка, Л. Чыкальская, М. Юрэня і многія інш.

Самай актыўнай і шматлікай (каля 100 чалавек) з'яўляецца нацыянальная арганізацыя з назвай БЭЗ, якую ўзначальваюць М. Астраумава, У. Дзехцярук, З. Клыга. Яна мае дакладна вызначаную мэту дзейнасці (абарона законных правоў эстонскай часткі беларускага этнасу), шляхі вырашэння пастаўленых задач. Працу бэзаўцаў характарызуюць дальнабачнасць і прафесіяналізм. За апошнія некалькі гадоў БЭЗ і інш. Беларускія арганізацыі ўдзельнічалі ў розных мерапрыемствах: традыцыйным эстонскім свяце "Спатканне", фестывалі нацыянальных меншасцяў "Ліра", стварэнні аб'яднання беларускіх мастакоў Балтыі "Маю гонар", Другой канферэнцыі па культуры і адукацыі беларускага замежжа, што праходзіла ў Мінску ў 1996 г. і інш. Пры БЭЗе арганізаваны невялікі фальклорны ансамбль (ён шукае, вывучае народныя песні), праводзіўся конкурс дзіцячых малюнкаў; сябры згуртавання выдалі паэтычны зборнік У. Дзехцерука "Сярод белых эстонскіх начэй" (1996), наладзілі падарожжы на веласіпедах па краіне і блізкім замежжы — Літве, Латвіі, Беларусі, шмат дапамаглі мнагадзетным сем'ям, пенсіянерам, беларускім дзецям-чарнобыльцам і сіротам. У Гомелі ўдзельнікі БЭЗа арганізавалі гастролі Эстонскага маладзёжнага хору з г. Пюсі. БЭЗ яшчэ ў 1995 г. выступіў з ініцыятывай аб стварэнні пры старшыні мясцовага павета "круглага стала" па справах нацыянальных меншасцей. З гэтым беларускім аб'яднаннем падтрымліваюць сувязі падобная ж сябрына Літвы, латвійскі "Світанак", беларускія суполкі Таліна, Санкт-Пецярбурга і інш. Рэспублік і гарадоў былога Савецкага Саюза, краін Захаду. Цесныя сяброўскія стасункі ўсталяваліся ў БЭЗа з амерыканскімі беларусамі.

Суполка "Лёс" (кіраўнік Шабека) засяроджвае ўвагу галоўным чынам на культурніцкай дзейнасці: пашырае сярод суайчыннікаў ў Эстоніі гістарычныя веды. За правядзенне канцэртаў, імпрэз, фэстаў адказнае талінскае аб'яднанне беларусаў "Бацькаўшчына", якое ўзначальвае Н. Савінава. "Бацькаўшчына" сумесна са Згуртаваннем беларусаў свету "Бацькаўшчына" (Мінск) утварыла турыстычны цэнтр для паездак з Беларусі ў Эстонію. Адпачынак вялікай колькасці беларускіх дзяцей у Эстоніі быў арганізаваны Цэнтрам дзелавога супрацоўніцтва разам з адным з беларускіх чарнобыльскіх дзіцячых фондаў і эстонскім дзіцячым фондам. Вядуцца радыёперадачы на беларускай мове, выдаецца шматнацыянальны часопіс "Вытокі" (пры актыўным удзеле З. Клыга).

Зразумела, што беларусы — не адзіная ў Эстоніі нацыянальная меншасць. Насельніцтва рэспублікі складаюць, акрамя таго, і азербайджанцы, армяне, велі, карэйцы, латышы, літоўцы, мардвіны, меры, рускія, татары, угры, узбекі, украінцы, фіны, чувашы, габрэі і інш. Яны таксама ствараюць свае арганізацыі, беражліва ставяцца да нацыянальнай спадчыны. Дзеля ўрэгулявання праблем нацыянальных меншасцей у краіне афіцыйна існуе "круглы стол" па справах нацменшасцей пры Прэзідэнце (працуе ў тэарэтычным накірунку — абмен інфармацыяй, сумесная распрацоўка праграм). На яго пасяджэнні запрашаюць прадстаўнікоў як урада і рознагаліновых урадавых устаноў Эстоніі, так і замежных арганізацый: Рады Еўропы, АБСЕ. Абмяркоўваюцца палітычнае, эканамічнае становішча рэспублікі, чытаюцца лекцыі аб паняццях правоў чалавека, грамадзянскай супольнасці і інш. Тэмай адной з праведзеных там канферэнцый была, напрыклад, "Інтэграцыя нацыянальных меншасцей у эстонскае асяроддзе". Міністэрства культуры і інш. Дзяржаўныя ўстановы Эстоніі шмат увагі надаюць нацыянальным пытанням, якія дапамагаюць вырашаць і міністэрствы культуры Беларусі, Украіны, Расіі і інш.

Беларусы Эстоніі працягваюць умацоўваць кантакты з бацькаўшчынай. У 1996 г. Міністэрства культуры, Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі падаравалі беларускім суполкам у Эстоніі 20 аўтэнтычных лістоў графікі з выявамі дзеячаў гісторыі, культуры Беларусі. На гастролі ў Эстонію выязджалі хор "Світанак", калектыў мастацкай самадзейнасці "Юнацтва", бард Алесь Камоцкі і інш. Няма сумненняў у тым, што гэтыя адносіны будуць развівацца і надалей.

Святлана Сачанка

Высылка

Від пакарання ў крымінальным праве, звязаны з прымусовым высяленнем з пэўнай мясцовасці асобы, якая абвінавачваецца ў палітычным ці крымінальным злачынстве. Ажыццяўлялася кампетэнтнымі органамі дзяржаўнага кіравання на падставе рашэння суда ці ў адміністрацыйным (пазасудовым) парадку. Асоба, прыгавораная да высылкі, магла быць пераселена ў межах дзяржавы (у яе іншую мясцовасць) ці за яе межы (у іншую краіну). Звычайна асобе, прыгаворанай да высылкі, прадастаўляўся спіс з указаннем мясцовасцей, пражыванне ў якіх забаронена. З улікам гэтага асоба мела права самастойна выбраць новае месца жыхарства. Разнавіднасцю высылкі з'яўлялася ссылка, калі асоба была абавязана пражываць у вызначанай мясцовасці з пазбаўленнем права перамяшчэння.

Найстаражытнейшай формай высылкі з'яўлялася выгнанне. На ранніх этапах існавання дзяржаўнасці ва ўсходніх славян асобы, якіх абвяшчалі злачынцамі, высылаліся ў аддаленыя мясцовасці дзяржавы або за яе межы. Найбольш вядомай у гэтых адносінах стала высылка ў Візантыйскую імперыю полацкіх князёў па загаду кіеўскага князя Мсціслава Уладзіміравіча ў 1129 г. У часы Кіеўскай Русі высылка магла аб'ядноўвацца са зняволеннем (т. зв. "заточение"). У Вялікім Княстве Літоўскім пакаранне выгнаннем прымянялася ў часы станаўлення і росквіту дзяржаўнасці і пасля аб'яднання Вялікага Княства з Каралеўствам Польскім у Рэч Паспалітую (1569). Звычайна да высылкі прыгаворваліся прадстаўнікі феадальнай знаці, асуджаныя за найбольш цяжкія злачынствы. Асоба, асуджаная на выгнанне, пазбаўлялася шляхецкага звання. Жыхарам дзяржавы забаранялася садзейнічаць выгнанніку і наогул мець з ім адносіны. Ссылка ў іншыя мясцовасці ў юрыдычнай практыцы Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай не прымянялася. У Расіі ссылка на ўскраіны дзяржавы была адным з найбольш распаўсюджаных відаў пакарання ўжо ў XVI ст. У 1760 г. расійскім памешчыкам было дазволена ссылаць прыгонных ў адміністрацыйным парадку ў Сібір на пасяленне, у 1765 г. – на катаргу. У 1822 г. парадак ссылкі быў урэгуляваны Статутам аб ссыльных, які распрацаваў М. Спяранскі. У XIX ст. практыка прымянення ссылкі пашырылася. У 1845 г. расійскае заканадаўства разглядала ссылку як адну з важнейшых мер пакарання. З другой паловы XIX ст. даволі часта прымянялася адміністрацыйная ссылка. У 1850-х гг. права такой ссылкі было дадзена віленскаму генерал-губернатару і намесніку Каўказа.

У XIX ст. да ссылкі прыгаворваліся дзекабрысты, члены тайных рэвалюцыйных таварыстваў 1820–1840-х гг., удзельнікі паўстанняў у Царстве Польскім, Літве і Беларусі 1831–1832 і 1863–1864 гг., народнікі, марксісты. Па стану на 1900 г. толькі ў сібірскай ссылцы знаходзіліся звыш 287 тыс. чалавек. З тэрыторыі Беларусі насельніцтва ссылалася найбольш масава пасля паўстання 1863–1864 гг. Па афіцыйных звестках, з літоўска-беларускіх губерняў было выселена ў аддаленыя губерні Расіі звыш 3 тыс. чалавек. У пачатку XX ст. асноўнымі месцамі ссылкі былі Якуцкая вобласць, Іркуцкая губерня, асобныя паветы Забайкальскай (Нерчынскі, Чыцінскі, Верхнеудзінскі, Селенгінскі, Баргузінскі), Енісейскай (Ачынскі, Мінусінскі, Енісейскі, Канскі, Краснаярскі), Табольскай (Табольскі, Ішымскі, Цюкалінскі, Тарскі) губерняў, Томскі павет Томскай губерні, Сахалін (выкарыстоўваўся пераважна як месца ссылкі для асоб, асуджаных за крымінальныя злачынствы). У 1900 г. царскі ўрад адмяніў пажыццёвую ссылку ў Сібір і абмежаваў ссылку на пасяленне для крымінальных элементаў, аднак захаваў нязменнай практыку палітычнай ссылкі. У 1905 г. многія ссыльныя былі вызвалены ў сувязі з абвешчанай амністыяй, аднак пасля 1906 г. практыка прымянення палітычнай ссылкі зноў пашырылася. 19 сакавіка 1917 г. расійскі Часовы ўрад амнісціраваў усіх палітычных ссыльных, прадаставіў ім права вярнуцца да месцаў папярэдняга пражывання. 9 мая 1917 г. палітычная ссылка ў Расійскай імперыі была афіцыйна скасавана.

У савецкай прававой практыцы высылка як мера пакарання стала прымяняцца з 1921 г. Дэкрэт Савета Народных Камісараў РСФСР ад 21 жніўня 1921 г. узаконіў практыку высылкі за межы РСФСР у адносінах да замежных грамадзян, "спосаб жыцця, дзейнасці і паводзін якіх будзе прызнаны несумяшчальным з прынцыпамі і спосабам жыцця рабоча-сялянскай дзяржавы". У 1922 г. ссылка стала прымяняцца ў адносінах да асоб, якія мелі дачыненне да контррэвалюцыйных выступленняў, а таксама да крымінальнікаў-рэцыдывістаў. 10 жніўня 1922 г. прыняты дэкрэт Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта, які афіцыйна ўводзіў адміністрацыйныя высылкі "з мэтай ізаляцыі асоб, якія маюць дачыненне да контррэвалюцыйных выступленняў". Палажэнне аб ссылцы як меры пакарання, вызначанай судом, было замацавана ў "Основных началах уголовного законодательства СССР и Союзных республик" 1924 г. Да 1933 г. высылка ў іншыя раёны СССР магла прызначацца на тэрмін ад 3 да 10 гадоў у спалучэнні з папраўча-працоўнымі работамі або без іх ("простая" ссылка). У 1933 г. "простая" ссылка была скасавана. У 1934 г. права прымянення адміністрацыйнай ссылкі без суда дадзена Асобай нарадзе пры НКУС СССР. Асноўнымі месцамі высылкі былі паўночныя раёны СССР, Сібір, Казахстан. У пачатку 1930-х гг. высылка як мера пакарання актыўна прымянялася ў адносінах да сялян, якія лічыліся кулакамі. З БССР за прыналежнасць да кулацтва ў 1931–1934 гг. было выслана каля 260 тыс. чалавек. Таксама ў гэты час з Беларусі высылаліся прадстаўнікі інтэлігенцыі, якіх абвінавачвалі ў сувязях з кулакамі, дзеяннях па рэстаўрацыі капіталізму і імкненні стварыць буржуазна-дэмакратычную, незалежную Беларусь (сфабрыкаваныя справы "Саюза вызвалення Беларусі", беларускага філіяла "Працоўнай сялянскай партыі", "Саюза моладзі"). Толькі па справе "Саюза вызвалення Беларусі" ў 1931 г. за межы БССР было выслана 77 чалавек (у т. л. В. Ластоўскі, Я. Лёсік, С. Некрашэвіч, В. Пічэта, А. Смоліч, А. Цвікевіч і інш.). У канцы 1930-х – сярэдзіне 1940-х гг. высылка ў іншыя рэгіёны СССР набыла масавы характар (гл. *Дэпартацыя*). У 1968 г. "Основы уголовного законодательства СССР и союзных республик" адмянілі практыку высылкі без суда і абмежавалі высылку ў межах СССР 5-гадовым тэрмінам. Мінімальны тэрмін высылкі вызначаўся законамі рэспублік (у БССР складаў 1 год). У 1950–1980-х гг. высылка як мера пакарання ў СССР прымянялася рэдка. Замежныя грамадзяне і (з 1970-х гг.) асобы, якія абвінавачліся ў антысавецкай дзейнасці або парушэнні савецкага заканадаўства, маглі высылацца за межы СССР.

Аляксандр Ціхаміраў

Дыяспара беларуская

Частка беларускага народа, якая жыве па-за межамі Беларусі. У канцы XIX ст. – 1990-я гады беларуская дыяспара ахоплівала ад 1/6 да амаль 1/3 часткі беларускай нацыі. У канцы 1990-х гадоў за межамі Рэспублікі Беларусь пражывала 3–3,5 млн. беларусаў.

У розных гістарычных умовах перасяленне насельніцва беларускіх этнічных зямель у іншыя рэгіёны было выклікана эканамічнымі, палітычнымі, ваеннымі, рэлігійнымі і іншымі прычынамі. Ранняя эміграцыя вызначалася найперш уцёкамі з Вялікага Княства Літоўскага пакрыўджаных ці незадаволеных яго палітыкай прадстаўнікоў пануючага саслоўя. Натуральнай эміграцыі з беларускіх зямель садзейнічалі створаныя ў ВКЛ прававыя падставы. Паводле прывілея 1447 г. вялікага князя ВКЛ Казіміра IV (пазней замацаваны ў Статуце ВКЛ 1529) князі, рыцары, шляхта і баяры маглі пакідаць дзяржаву "для лепшого щастья набытья", навучання ваеннаму майстэрству. Статуты ВКЛ 1566 і 1588 г. пацвердзілі права вольных людзей розных саслоўяў на лячэнне, набыццё адукацыі, навучанне рамяству за мяжой. Многія з "вольных" людзей, якія выязджалі ў замежныя краіны, пакідалі там добрую спадчыну, садзейнічалі пашырэнню кнігадрукавання і асветы (Ф. Скарына, П. Мсціславец, Сімяон Полацкі, І. Капіевіч і інш.). У XVI–XVII стст. Выезд за мяжу быў выкліканы узмацненнем прыгоннай эксплуатацыі сялян у ВКЛ, нацыянальна-рэлігійнага ўціску ў Рэчы Паспалітай. У XVII–XVIII стст. У ходзе войнаў Расіі з Рэччу Паспалітай і іншымі дзяржавамі беларускія землі часта станавіліся арэнай жорсткіх бітваў, а іх жыхары масава выводзіліся ў глыб імперыі. Выхадцы з Беларусі і прымусова пераселеныя сяляне, рамеснікі, гандляры, шляхта садзейнічалі гаспадарчаму асваенню Паволжа і Сібіры, некаторыя з іх займалі ў Расіі высокія дзяржаўныя і ваенныя пасады, сталі заснавальнікамі купецкіх родаў, узбагачалі культурнае жыццё ў месцах свайго пражывання. Перасяленцы беларускіх зямель і іх нашчадкі былі ў ліку пачынальнікаў геаграфічнага, этнаграфічнага вывучэння новых каланізаваных Расіяй тэрыторый, карэнных народаў Прыўралля, Сібіры, Чукоткі, Камчаткі (А. Каменскі, Л. Сеніцкі і інш.) У другой палове XVII ст. дзесяткі майстроў-рамеснікаў з Полацка, Віцебска, Оршы, Шклова, Магілёва і інш. Гарадоў працавалі ў Аружэйнай палаце, аздаблялі церамы Крамля, Каломенскі палац, Новадзявочы, Данскі і Нова-Іерусалімскі (на Істры) манастыры. Яны прынеслі ў Рускую дзяржаву новыя рамёствы, свой адметны стыль, матывы і тэхніку скульптурнай разьбы па дрэве ("беларуская рэзь"), вырабу шматколернай кафлі. Тры падзелы Рэчы Паспалітай 1772, 1793, 1795 гг. і развіццё ў сувязі з гэтым у канцы XVIII–XIX стст. Нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі вызначалі палітычныя прычыны эміграцыі. Боязь рэпрэсій з боку царскага ўрада выштурхнула з бацькаўшчыны тысячы ўдзельнікаў паўстанняў 1794, 1830–1831, 1863–1864 гг., а таксама прыхільнікаў аднаўлення ВКЛ у час паходу ў 1812 г. Напалеона на Расію. Яны рассеяліся па свеце, некаторыя ўключыліся ў рэвалюцыйны і вызваленчы рух у Еўропе і Амерыцы (Т. Касцюшка, В. Урублеўскі, М. Судзілоўскі, З. Мінейка і інш.), садзейнічалі развіццю культуры і навукі краін свайго пражывання, узбагачалі тым самым і беларускую спадчыну (І. Дамейка, Г. Дмахоўскі, Н. Орда, А. Рыпінскі, К. Ельскі і інш.). Паводле перапісу 1897 г. у Расійскай імперыі за межамі губерняў пераважна з беларускім насельніцтвам (Віленская, Віцебская, Гродзенская, Магілёўская, Мінская) пражывалі больш 500 тыс. беларусаў. Усходняя беларуская дыяспара папаўнялася таксама шляхам гвалтоўнага высялення найперш па палітычных матывах нелаяльнай да ўлады шляхты, удзельнікаў нацыянальна-вызваленчых паўстанняў. Даследчыкамі прыроды, побыту, традыцый народаў Сібіры, Далёкага Усходу, Казахстана сталі сасланыя Я. Чэрскі, Э. Пякарскі, А. Янушкевіч і інш.

Першая хваля масавай працоўнай міграцыі беларускага насельніцтва ў іншаэтнічныя рэгіёны Расійскай імперыі (усходняя) і за яе межы (заходняя) пракацілася на рубяжы XIX–XX стст. Яна ўзмацніла працэс фарміравання беларускай дыяспары за межамі Бацькаўшчыны. Да Першай сусветнай вайны па эканамічных прычынах толькі ў Сібір з Беларусі перасялілася больш за 700 тыс. (пераважна сяляне), за межы Расіі — 500–600 тыс. чалавек (пераважна ў ЗША, Канаду, Бразілію, Аргенціну, краіны Заходняй Еўропы). У 1914 г. зарэгістравана першае супольнае Таварыства беларусаў і маларосаў (ЗША, штат Мічыган). У рускіх асяродках ЗША і Канады беларусы складалі значную частку, былі заснавальнікамі многіх праваслаўных цэркваў, прыходаў, удзельнікамі грамадска-культурнага жыцця.

Першая сусветная вайна 1914–1918 гг., Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі 1917 г., германская і польская акупацыі Беларусі выклікалі значны адток беларускага насельніцтва на Усход Расіі (246 тыс. бежанцаў і эвакуіраваных пасля не вярнуліся на радзіму), вываз ваеннапалонных у Германію, выезд больш 120 тыс. чалавек у Літву, Латвію, Эстонію, Чэхаславакію, Турцыю і інш. Краіны. За мяжой з'явілася першая арганізаваная палітычная эміграцыя (урад і вайсковыя фарміраванні БНР, кіраўніцтва партыі беларускіх эсэраў). Працоўная (сялянская) эміграцыя звязана з выездам у Амерыку і Еўропу (каля 180–250 тыс. жыхароў Заходняй Беларусі, якія знаходзіліся пад уладай Польшчы). Найбольшай актыўнасцю і нацыянальна-культурнай дзейнасцю ў міжваенны перыяд вызначалася беларуская дыяспара ў Літве, Латвіі, Чэхаславакіі, ЗША, Францыі, Аргенціне (існавалі таварыствы, нацыянальны друк, асвета). З БССР у 1926–1938 гг. у іншыя рэгіёны СССР перасялілася больш 600 тыс. чалавек (планавы набор рабочай сілы, *дэпартацыі*, палітычныя рэпрэсіі і інш.). Рассеяныя па абшарах дзяржавы беларусы стварылі дзесяткі грамадскіх, культурна-асветных арганізацый, якія ў 1930-я гады былі знішчаны ўладамі.

У выніку Другой сусветнай вайны амаль 1,5 млн. беларусаў эвакуіравалася на Усход і толькі трэць з іх вярнулася ў БССР; у ліку савецкіх ваеннапалонных за мяжой апынуліся сотні тысяч беларусаў; 385 тыс. чалавек вывезена ў

Германію на прымусовую працу. Да сакавіка 1946 г. у СССР рэпатрыіравана 520 тыс. беларусаў. Аснову беларускай дыяспары склалі таксама члены беларускіх арганізацый, устаноў, вайсковых фарміраванняў на акупіраванай тэрыторыі, якія выехалі на Захад. Пасля вайны пры адсутнасці свабоднага ўезду і выезду з СССР беларуская дыяспара папаўнялася нязначна. Рэгулярны прыток беларусаў і выхадцаў з Беларусі ў заходнія краіны выявіўся ў канцы 1980-х гадоў. У 1988–1991 гг. атрымалі дазвол на эміграцыю з БССР на Захад 74 тыс. чалавек, а ў 1992-1999 гг. – больш за 69 тыс. жыхароў Беларусі. (у Ізраіль, ЗША, Германію, Аўстралію, Польшчу, Канаду). На 1999 г. па неафіцыйных звестках, каля 500 тыс. беларусаў пражывала ў ЗША, каля 100 тыс. — у Канадзе, дзесяткі тысяч у Аргенціне, Бразіліі, Францыі, Бельгіі, Германіі, а таксама ў новых цэнтрах беларускай дыяспары – Вялікабрытаніі і Аўстраліі. Прыкладна 250–400 тыс. беларусаў Беласточчыны апынуліся ў Польшчы пасля вызначэння пасляваенных дзяржаўных граніц. Пасля распаду СССР і ўтварэння на яго абшарах новых незалежных дзяржаў у іх апынулася больш за 2 млн. беларусаў. У наступныя гады вызначылася тэндэнцыя іх вяртання на Бацькаўшчыну, хоць хутка выявілася і запавольванне гэтага працэсу ў сувязі з пагаршэннем сацыяльна-эканамічнага становішча Беларусі, адсутнасцю пэўнай дзяржаўнай падтрымкі рэпатрыяваных суродзічаў, цяжкасцю ўладкавання. У 1992–1999 гг. Беларусь прыняла з новых незалежных дзяржаў 408 тыс. асоб, з якіх амаль 188 тыс. беларусы. За гэты час сюды перасяліліся амаль 210 тыс. жыхароў Беларусі, у тым ліку ў Расію – 155 тыс., Украіну – больш 37 тыс., краіны Балтыі – 5,2 тыс., Казахстан – 4,3 тыс. Беларусы сярод іх складалі адносна невялікую частку.

На постсавецкай прасторы цяпер сканцэнтравана пераважная большасць усіх замежных беларусаў. На 1999 г. у Расіі іх больш 1 млн. 100 тыс. чалавек, на Украіне больш 400 тыс., Казахстане — 170 тыс., Латвіі — амаль 100 тыс., Літве — 50 тыс., Эстоніі — 25 тыс. і г. д. Частка беларускай дыяспары, што жыве на памежных з Рэспублікай Беларусь тэрыторыях з'яўляецца карэнным насельніцтвам на гэтых землях. Духоўнай асновай нацыянальнага самавызначэння, праявай самабытнасці, адметнасці сталі створаныя ў замежжы працай і ахвярнасцю многіх беларусаў грамадскія, палітычныя, асветна-культурныя, навуковыя, рэлігійныя арганізацыі, суполкі мастакоў, нацыянальны друк і асвета, культурныя цэнтры, музеі і архівы, мастацкія калектывы, пабудаваныя храмы. За мяжой дзейнічаюць Беларуская аўтакефальная праваслаўная царква, Беларуская праваслаўная царква ў юрысдыкцыі канстанцінопальскага патрыярха, Беларускія каталіцкія (уніяцкія) місіі ў Чыкага, Лондане, Парыжы. Царкоўна-рэлігійнае жыццё на нацыянальнай аснове складваецца і на постсавецкім абшары (Масква, Вільнюс, Рыга). Захаванню нацыянальнай свядомасці, пашырэнню звестак пра беларусаў спрыяюць Беларуска-амерыканскае задзіночанне, Беларускае нацыянальнае аб'яднанне, Беларускі кангрэсавы камітэт, Беларуска-амерыканская рада ў Чыкага (усе ў ЗША), Згуртаванне беларусаў Вялікабрытаніі, Згуртаванне беларусаў Канады, Федэрацыя беларускіх арганізацый у Аўстраліі, Беларускі хаўрус у Францыі, жаночыя, маладзёжныя і інш. Арганізацыі; правядзенне традыцыйных сустрэч беларусаў Паўночнай Амерыкі (з 1952 — 25 сустрэч), Аўстраліі (з 1976 — 13 сустрэч); перыядычны друк, у т. л. штомесячная газета "Беларус" (у ЗША ў 1980-я гады выходзіла 15 выданняў на беларускай мове). Нацыянальна-культурныя, сацыяльна-палітычныя інтарэсы беларусаў Польшчы выказваюць палітычная партыя Беларускае дэмакратычнае аб'яднанне, Беларускае аб'яднанне студэнтаў і іншыя таварыствы, згуртаваныя ў Раду беларускіх арганізацый і Беларускі Саюз, Беларускае грамадска-культурнае таварыства, газета "Ніва", часопіс "Беларускі гістарычны сшытак" і інш. З канца 1980-х гадоў пачаўся працэс нацыянальна-культурнага гуртавання беларусаў СССР. Аб дынаміцы іх арганізацыйнага аб'яднання на постсавецкай прасторы сведчыць грамадская культурна-асветная дзейнасць у 2000 г. больш 100 беларускіх суполак, таварыстваў, згуртаванняў, цэнтраў у Расіі, на Украіне, Малдове, Латвіі, Літве, Эстоніі, Казахстане, Кыргызстане, Арменіі, Узбекістане. Выдаюцца газеты "Рунь" (Вільнюс), і "Прамень" (Рыга). Цэнтры навукова-культурнага жыцця беларускай дыяспары: Беларускі інстытут навукі і мастацтва ў Нью-Йорку, Англа-беларускае таварыства, Бібліятэка і музей імя Ф. Скарыны ў Лондане, філіял Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Таронта (Канада), Вялікалітоўскі Фонд імя Л. Сапегі, фонд імя П. Крачэўскага (ЗША), асацыяцыя "Беларускія перспектывы" (Францыя). Ажыццяўляецца праект стварэння Цэнтра беларускіх даследаванняў у Францыі з удзелам нацыянальнай дыяспары і нашчадкаў беларусаў-эмігрантаў.

Асяроддзе замежных беларусаў вылучала сваіх вядомых людзей у розных галінах навукі, мастацтва, грамадскага жыцця, рэвалюцыйнага руху. Сярод іх — дыпламаты (І. Гашкевіч), вучоныя (А. Адамовіч, Я. Запруднік, А. Калубовіч, А. Каўка, В. Кіпель, Б. Кіт. І. Любачка, А. і Я. Мірановічы, І. Прыгожын, Я. Садоўскі, С. Станкевіч, У. Сядура, В. Тумаш, Ю. Туронак, П. Урбан, Я. Шыраеў, У. Юзвюк і інш.), спевакі (М. Забэйда-Суміцкі, П. Конюх, Б. Данчык), кампазітары (М. Равенскі, М. Шчаглоў-Куліковіч), паэты і пісьменнікі (Н. Арсеннева, А. Барскі, Э. Вайвадзіш, А. Кірвель, У. Клішэвіч, І. Ласкоў, А. Салавей, І. Снарская, М. Сяднёў, Я. Чыквін, В. Швед, С. Яновіч і інш.), мастакі (А. Ахола-Вало, М. Давыдзюк, В. Жаўняровіч, П. Мірановіч, М. Наўмовіч, І. Рагалевіч-Дудко, Г. Русак, Т. Стагановіч, Л. Тарасевіч, З. Чайкоўскі, У. Шыманец, І. Шыманец-Сурвіла і інш.).

Партыйна-дзяржаўныя колы Беларусі доўгія гады ў адносінах да беларускай дыяспары вялі палітыку яе непрызнання, ізаляцыі ад бацькаўшчыны, расколу па ідэалагічных адзнаках, русіфікацыі. Створаная ў пасляваенны час беларуская секцыя Савецкага камітэта "За вяртанне на Радзіму" (1955) і Беларускага таварыства па сувязях з суайчыннікамі за мяжой (1964, з 1976 — Беларускае таварыства "Радзіма") трымалі сувязь толькі з кіраўніцтвам тых арганізацый, якія лаяльна ставіліся да сацыялістычнага ладу. Ігнараваліся нацыянальна-культурныя патрэбы суродзічаў у іншаэтнічных раёнах СССР. З пачаткам працэсаў дэмакратызацыі, нацыянальнага адраджэння,

палітычных і эканамічных рэформ узніклі ўмовы для пераасэнсавання ролі беларускай дыяспары. З канца 1980-х гадоў новыя грамадскія рухі ў Беларусі (БНФ, ТБМ і інш.) сталі ініцыятарамі ўсталявання з ёй сталых зносін. Істотныя змены ў адносінах беларускай дыяспары, у т. л. і на дзяржаўным узроўні, пачаліся, калі Беларусь атрымала незалежнасць. Дзейнічае Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" (з 1990), падтрымку ўрада атрымалі яго ініцыятывы агульнанацыянальнага маштабу — Першы сход беларусаў блізкага замежжа (снежань 1992), Першы з'езд беларусаў свету (ліпень 1993). У 1997 г. адбыўся Другі з'езд беларусаў свету. У 1999 г. створана асацыяцыя "Святло Радзімы".

У замежжы палітычныя апаненты кіраўніцтву Беларусі гуртуюцца вакол Рады БНР, стварылі Кааліцыю ў падтрымку дэмакратыі і правоў чалавека ў Беларусі (ЗША), Беларускі цэнтр (Бельгія), Віленскі цэнтар грамадскіх ініцыятываў "Дэмакратыя дзеля Беларусі". З 1996 г. у Варшаве выдаюцца "Беларускія ведамасьці", часопіс "Эпоха".

Вырашэнню праблем беларускай дыяспары спрыялі прыняцце Закона аб грамадзянстве (1991), Закона аб парадку выезду і ўезду (1993), уключэнне ў шэраг падпісаных Беларуссю міжнародных дагавораў (з Расіяй, Польшчай, Украінай, Кыргызстанам, Казахстанам і інш.) артыкулаў аб магчымасці свабоднага выяўлення, захавання і развіцця суайчыннікамі этнічнай, культурнай, моўнай, рэлігійнай самабытнасці, прыняцце дзяржаўнай праграмы "Беларусы ў свеце", стварэнне Дзяржаўнага камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей РБ, які займаецца і справамі дыяспары.

Галіна Сяргеева

Дэпартацыя

Дэпартацыя (лацінскае deportatio — літаральна вываз) — выгнанне, прымусовае высяленне асоб з месца пастаяннага жыхарства па сацыяльных, палітычных, рэлігійных і іншых матывах. Прымяняецца як мера крымінальнага ці адміністрацыйнага пакарання "сацыяльна-небяспечных" асоб з абмежаваннем свабоды перамяшчэння на новым месцы. У праве — тэрмін для абазначэння асобных відаў ссылкі.

У Расійскай імперыі шырока практыкавалася высылка тых грамадзян, якіх улады лічылі "непажаданымі", "нядобранадзейнымі" ў палітычных адносінах. У 1824 г. больш 20-ці ўдзельнікаў тайных таварыстваў патрыятычнай моладзі ў Беларусі і Літве (філаматы, філарэты) былі высланы ў Пецярбург (А. Міцкевіч, Ю. Яжоўскі, Ф. Малеўскі) і ў аддаленыя губерні Расіі. Пасля падаўлення нацыянальна-вызваленчых паўстанняў 1794 г., 1830–1831 гг., 1863–1864 гг. былі высланы ўжо тысячы асоб, пераважна ў аддаленыя і кліматычна суровыя для жыцця і працы рэгіёны імперыі. У сувязі з нелаяльнымі адносінамі шляхты да новай улады ў паўднёвыя губерні Расіі пераселена пасля паўстання 1830–1831 гг. значная частка дваран, якая не змагла пацвердзіць сваю прыналежнасць да гэтага саслоўя і была пераведзена ў разрад дзяржаўных сялян-аднадворцаў. Пасля падаўлення паўстання 1863 г. на Беларусі ў Сібір і іншыя этнічныя рэгіёны былі высланы 12 483 асобы (на пасяленне ў Сібір, катаргу, арыштанцкія роты і г. д.). Некаторыя з выселеных у розныя куткі Расіі зарэкамендавалі сябе таленавітымі даследчыкамі прыроды, побыту, традыцый, мовы народаў Сібіры, Крайняй Поўначы, Далёкага Усходу, Казахстана (І. Чэрскі, Э. Пякарскі, А. Янушкевіч і інш.).

У гады Першай сусветнай вайны, калі расійскія ўлады ва ўмовах адступлення 1915 г. спрабавалі прымяняць тактыку "выпаленай зямлі", частка насельніцтва была прымусова дэпартавана з прыфрантавой тэрыторыі углыб дзяржавы.

Пасля ўсталявання савецкай улады дэпартацыі прымяняліся ў адносінах да апазіцыі, іншадумцаў, патэнцыяльных непрыхільнікаў новага ладу жыцця. З месц пастаяннага пражывання гвалтоўна і незаконна высылаліся (у 20–40-я г. масава, без суда і следства) грамадзяне, якіх таталітарная сістэма з класавых пазіцый прызнавала ворагамі народа. Дэпартацыі практыкаваліся не толькі ў адносінах да асоб, але і саслоўяў (найперш непралетарскага паходжання — дваранства, заможнага сялянства, нацыянальнай інтэлігенцыі і нават народаў (у гады Другой сусветнай вайны выселены чачэнцы, інгушы, калмыкі, карачаеўцы, крымскія татары, немцы Паволжа).

За межы Беларусі ў канцы 1920 – пачатку 1930-х г. дэпартаваны шматлікія прадстаўнікі нацыянальнай інтэлігенцыі, абвінавачаныя у т. зв. "нацыянал-дэмакратызме" (У. Дубоўка, У. Жылка, В. Ластоўскі, С. Некрашэвіч, У. Пракулевіч, А. Цвікевіч і інш.). Масавыя дэпартацыі з Беларусі сялянства ажыццяўляліся ў ходзе суцэльнай калектывізацыі, якая з 1929 г. праводзілася адміністрацыйна-прымусовымі метадамі, была абумоўлена палітычна-класавымі, а не эканамічнымі прычынамі. У ходзе рэалізацыі палітыкі "ліквідацыі кулацтва як класа", да якога ўлады Беларусі аднеслі шмат сераднякоў, было "раскулачана" каля 15 % сялянскіх гаспадарак. Да вясны 1930 г. у БССР было "раскулачана" і выселена са сваіх двароў больш за 15,5 тыс. сялянскіх сем'яў. Многія з іх былі вывезены на Крайнюю Поўнач, у Сібір, Казахстан і іншыя рэгіёны з фармулёўкай "за антысавецкую агітацыю супраць калектывізацыі", "невыкананне збожжавых паставак", "шкодніцтва ў калгасах". З мая 1932 г. па май 1933 г. выслана 35 тыс. сем'яў. Усяго ў 1931–1934 гг. з БССР гвалтоўна выселена каля 260 тыс. асоб, многія з якіх загінулі ад голаду, непасільнай працы у месцах дэпартацыі ці яшчэ ў дарозе.

У ходзе палітычных рэпрэсій 30-х г., развязанага уладай масавага тэрору супраць розных слаёў грамадства, у шэрагу жорсткіх мер (пакаранне смерцю, турэмнае зняволенне, папраўча-працоўныя лагеры) прымяняюцца і

дэпартацыі для застрашэння тых, хто крытычна ставіўся да палітыкі савецкай улады ці мог стаць яе патэнцыяльным праціўнікам, каб прадухіліць і задушыць супраціўленне таталітарнай сістэме.

Пасля далучэння да БССР Заходняй Беларусі савецкая ўлада стала актыўна пазбаўляцца ад "ненадзейных", "класава варожых" элементаў і з гэтай тэрыторыі з кастрычніка 1939 г. і да нападу Германіі на СССР у чэрвені 1941 г. з грубымі парушэннямі закона было дэпартавана больш за 120 тыс. чалавек (частка іх лічылася спецперасяленцамі).

Калі Другая сусветная вайна перасягнула межы СССР, пачаліся пазасудовыя расправы і высылкі ні ў чым не вінаватых членаў сем'яў "здраднікаў Радзімы" і ваеннапалонных. Ужо 28 чэрвеня 1941 г. з'явіўся загад, які прадугледжваў адказнасць членаў сям'і завочна асуджаных здраднікаў Радзімы, вызначаны парадак высялення ў аддаленыя раёны. Крыху пазней карныя органы атрымалі права прыцягваць да крымінальнай адказнасці дарослых членаў сям'і ваеннапалоннага, іх арышту і высылкі з месцаў сталага пражывання.

Ахвярамі татальнага недаверу з боку савецкай сістэмы ў пасляваенныя гады сталі жыхары Беларусі, якія па розных прычынах засталіся на акупаванай немцамі тэрыторыі, аказаліся за мяжой (ваеннапалонныя, остарбайтэры, удзельнікі еўрапейскага антыфашысцкага руху супраціўлення, ваяваўшыя ў саюзных арміях). Падазронасць, недавер, неабгрунтаваныя дэпартацыі зведалі многія з тых, чые паводзіны ў адпаведнасці з міжнароднымі нормамі не маглі кваліфікавацца як супрацоўніцтва з ворагам, хто рабіў гэта пад прымусам.

Вайскоўцы-беларусы з 2-га Польскага корпуса пад камандаваннем генерала У. Андэрса (8-я Брытанская армія), што змагаліся на Заходнім фронце і пасля яго расфарміравання ў 1946–1947 гг. вярнуліся на бацькаўшчыну, былі 1 красавіка 1951 г. разам з сем'ямі вывезены на спецпасяленне ў Іркуцкую вобласць. Пры гэтым рашэнне аб іх высяленні і канфіскацыі маёмасці прымалася асобай нарадай ужо пасля вывазу. Амністыяй 1955 г. андэрсаўцы былі памілаваны (а не рэабілітаваны) і пачалі вяртацца ў родныя мясціны.

Дэпартацыі з заходніх абласцей БССР прадоўжыліся ў 1944–1953 гг., калі тут ажыццяўлялася прымусовая калектывізацыя. У верасні 1951 г. Савет Міністраў СССР прыняў Пастанову "Аб высяленні кулакоў з Беларускай ССР", у выніку ажыццяўлення якой толькі ў 1952 г. за межы БССР была выслана 4431 "кулацкая" сям'я ў Казахстан, Якуцію, Кіргізію і іншыя аддаленыя рэгіёны дзяржавы.

З другой паловы 50-х г. пачалася рэабілітацыя бязвінных ахвяр таталітарнай сістэмы, якая працягваецца і цяпер. Пасля распаду СССР, паяўлення на яго абсягах новых незалежных дзяржаў праблема аднаўлення гістарычнай справядлівасці ў адносінах да дэпартаваных грамадзян і народаў набыла міжнародны характар. У кастрычніку 1992 г. Арменія, Беларусь, Казахстан, Кыргызстан, Малдова, Расія, Таджыкістан, Туркменістан, Узбекістан, Украіна падпісалі Пагадненне па пытаннях, звязаных з узнаўленнем правоў дэпартаваных асоб, нацыянальных меншасцяў і народаў. У ім дзяржавы асудзілі "меўшае месца ў мінулай таталітарнай практыцы" прымусовае перасяленне народаў, нацыянальных меншасцяў і асобных грамадзян былога СССР як злачынства, якое супярэчыць агульначалавечым, гуманным прынцыпам. Яны перанялі на сябе абавязкі па законнай абароне дэпартаваных і забеспячэнні добраахвотнага вяртання ў месцы іх пражывання на момант высылкі. У пагадненні прадугледжваецца вырашэнне пытанняў грамадзянства, свабоднага выезда-ўезда, пенсійнага забеспячэння, спрыяння ў атрыманні крэдытаў для ўладкавання. Сваім рашэннем ад мая 1996 г. Арменія, Беларусь, Казахстан, Расія, Кыргызская Рэспубліка, Таджыкістан і Украіна абавязаліся прымаць меры па вырашэнню комплекса пытанняў, неабходных для рэалізацыі Пагаднення 1992 г.

Галіна Сяргеева

Міграцыя

Слова Міграцыя паходзіць ад лац. migratio — перасяленне (насельніцтва). Пад ім разумеюцца тэрытарыяльныя перамяшчэнні людзей (з мэтай перамены месца пражывання) у межах дзяржавы (унутраная) і з адной краіны ў другую (знешняя — эміграцыя і іміграцыя). На міграцыю ўплываюць прыродныя, дэмаграфічныя, эканамічныя, культурныя, маральныя, сацыяльна-псіхалагічныя, палітычныя, ваенныя, рэлігійныя і інш. Фактары. У сярэднія вякі знешняя міграцыя з беларускіх княстваў, а затым Вялікага Княства Літоўскага ажыццяўлялася шляхам дынастычных шлюбаў, перасяленняў у Маскоўскую дзяржаву праваслаўнай знаці, нязгоднай з існуючай палітыкай (разам з войскам і сялянамі), вывазу ў палон. Натуральнай эміграцыі з беларускіх зямель спрыяў прывілей 1447 г. вялікага князя ВКЛ Казіміра IV, паводле якога князі, рыцары, шляхта і баяры маглі пакідаць краіну. Права ўсіх свабодных людзей на выезд за мяжу прадугледжвалася статутамі 1566 і 1588 г. (за выключэннем "непрыяцельскіх" дзяржаў). З канца XVI ст. у Расіі павялічылася колькасць беглых у Расію сялян з беларускіх зямель у пошуках волі ці незанятай зямлі. У XVII–XVIII стст. Масавы характар набыў вываз у ходзе войнаў Расіі з Рэччу Паспалітай і іншымі краінамі не толькі служылых людзей, але і шляхты, рамеснікаў, сялян. Пашырэнне ў XVII ст. у Рэчы Паспалітай палітыкі паланізацыі выклікала выезд з беларускіх зямель на ўсход вядомых беларускіх дзеячаў культуры, праваслаўных святароў. Далучэнне ў канцы XVIII ст. беларускіх зямель да Расіі пашырыла міграцыю з іх, асабліва пасля адмены прыгоннага права, у цэнтральныя і паўднёвыя раёны еўрапейскай Расіі, Сібір, Казахстан, Далёкі Усход. У канцы XIX – пачатку XX ст. масавасць набыў адыход беззямельных ці малазямельных беларускіх сялян на заработкі ў іншаэтнічныя рэгіёны дзяржавы, павялічылася эканамічная эміграцыя (асабліва пасля

рэвалюцыі 1905–1907 гг.) у ЗША, Канаду, іншыя краіны Амерыкі, Заходнюю Еўропу (сюды пераважна на сезонную працу). Сярод раёнаў нечарназёмнай паласы Расіі 5 губерняў з пераважна беларускім насельніцтвам далі 85 % усіх перасяленцаў, адмоўнае сальда міграцыі за 1897–1914 гг. склала 0,5 млн. асоб.

Вымушаныя масавыя перасяленні жыхароў адбыліся ў Першую сусветную вайну, калі беларускія землі аказаліся ў эпіцэнтры баявых дзеянняў (сотні тысяч эвакуіраваных і бежанцаў у глыбінныя раёны Расіі, некалькі дзясяткаў тысяч ваеннапалонных у Германіі), а затым пасля рэвалюцый 1917 г. у Расіі, польскай акупацыі (дзесяткі тысяч асоб эмігравалі ў Літву, Латвію, Эстонію, Польшчу і інш.). З Заходняй Беларусі, якая да 1939 г. уваходзіла ў склад Польшчы, выехала за яе межы ў выніку сацыяльнага і нацыянальна-рэлігійнага ўціску каля 200 тыс. чалавек. Аб актыўнай міграцыі насельніцтва БССР сведчыць тое, што ў міжваенны перыяд у іншаэтнічныя рэгіёны СССР выехала больш за 1,6 млн. чалавек (планавы набор рабочай сілы, уцёкі сялян ад прымусовай калектывізацыі, высылка і ссылка "раскулачаных", беспадстаўна рэпрэсіраваных па палітычных і ідэалагічных матывах, святароў і інш.) (*гл. Дэпартацыя*). З 1924 па 1939 г. Беларусь мела адмоўнае сальда міграцый (960 тыс. у сучасных граніцах). У перадваенныя гады пашырылася ўнутрырэспубліканская міграцыя. З 1926 па 1939 г. удзельная вага гарадскога насельніцтва павялічылася на 8 %.

Вялізныя міграцыйныя зрухі выклікала Другая сусветная вайна. З пачаткам яе 70–80 тыс. жыхароў — беларусаў Заходняй Беларусі, прызваных у польскае войска, трапілі ў нямецкі палон. Пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР савецкія ўлады ў 1939–1940 г. правялі тут масавыя дэпартацыі насельніцтва (найперш палякаў) у Сібір, Казахстан і інш. Пасля нападу Германіі на СССР 1,5 млн. чалавек з Беларусі былі эвакуіраваны ва ўсходнія раёны дзяржавы. Больш 1 млн. 100 тыс. жыхароў Беларусі змагаліся ў шэрагах Савецкай Арміі, тысячы — у арміях саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі, еўрапейскім руху супраціўлення. 385 тыс. асоб з акупаванай тэрыторыі было вывезена на прымусовыя работы ў Германію, у ліку савецкіх ваеннапалонных сотні тысяч жыхароў БССР аказаліся ў Германіі ці захопленых ёй краінах. Пасля вайны засталіся ў Заходняй Еўропе, а затым у большасці сваёй эмігравалі на амерыканскі і аўстралійскі кантыненты дзесяткі тысяч остарбайтэраў, ваеннапалонных, выехалі за мяжу тыя, хто ў гады нямецкай акупацыі працаваў (добраахвотна ці прымусова) у цывільнай адміністрацыі, культурна-асветных установах Беларусі, вайскоўцы атрадаў Беларускай краёвай абароны і інш. Большасць грамадзян, якія ў гады вайны аказаліся за межамі СССР, вярнуліся на Радзіму, сюды трэба таксама далучыць некалькі дзясяткаў тысяч выхадцаў з Беларусі, якія эмігравалі ў дарэвалюцыйны і даваенны час (*гл. Рэпатрыцыя*).

Пасля вайны дзяржаўная стымуляцыя ўнутрыміграцыйных працэсаў (планавыя вярбоўкі, грамадскія прызывы на новабудоўлі, абавязковае размеркаванне маладых спецыялістаў і інш.) спрыяла таму, што з 1949 па 1964 г. БССР мела адмоўнае сальда міграцыі ў 1,2 млн., затым паступова адток насельніцтва ў іншыя рэспублікі скараціўся і ў 1980-я гг. адмоўнае сальда не перавышала 1–2 тыс. чал. У год. Толькі ў 1950-х — пачатку 1960-х гг. з Беларусі выехала каля 900 тыс. чал. На новабудоўлі і цалінныя землі Сібіры, Казахстана, іншых раёнаў краіны. За межамі БССР на тэрыторыі СССР у 1959 г. пражывала 1,4 млн. беларусаў, у 1970 г. — 1,8 млн., у 1989 г. — 2,1 млн. Унутраная міграцыя ў межах БССР вызначалася з 1960-х гг. масавым перасяленнем сельскіх жыхароў у гарады ў сувязі з ростам прамысловасці. Урбанізацыя працягваецца і цяпер, што прыводзіць да абвастрэння праблемы працоўных рэсурсаў у вёсцы. Чарнобыльская катастрофа абумовіла экалагічную міграцыю насельніцтва з забруджаных тэрыторый Гомельскай і Магілёўскай абласцей у іншыя раёны рэспублікі.

Пры адсутнасці ў СССР заканадаўча замацаванага права на эміграцыю выезд з БССР у замежныя краіны быў нязначны (шлюбы з іншаземцамі, эміграцыя з канца 1960-х гг., найчасцей грамадзян яўрэйскага паходжання, для ўз'яднання сямей). Ажыўленне пачалося толькі пасля пачатку лібералізацыі ў СССР. З БССР у 1988–1991 г. атрымалі дазвол на выезд ў заходнія краіны больш як 74 тыс. чал.

Пасля набыцця Беларуссю незалежнасці праявіліся істотна новыя тэндэнцыі ў напрамку і балансе эмігрыйна-іміграцыйных працэсаў. У 1992–1999 гг. у Беларусь прыбыло 668 тыс. чал., а пакінула яе 495 тыс. асоб. У гэтыя гады Беларусь мела дадатнае сальда міграцыі з новымі незалежнымі дзяржавамі на постсавецкай тэрыторыі (за выключэннем 1994–1995 гг.). За кошт гэтага адбываўся прырост насельніцтва краіны. Калі ў 1992–1999 гг. рэспубліка прыняла з новых незалежных дзяржаў 408 тыс. жыхароў, то з Беларусі ў гэтыя краіны выехала 210 тыс. чал., а больш за 69 тыс. чал. Атрымалі дазвол на эмігрцыю ў Ізраіль, ЗША, Германію, Канаду, Польшчу і інш. У апошнія гады паявіліся новыя віды іміграцыі ў Беларусь: вымушаная, нелегальная, працоўная і інш. Па неафіцыйных звестках на тэрыторыі рэспублікі знаходзіцца 100–300 тыс. нелегальных мігрантаў. Больш 30 тыс. чал., якія ў 1992–1999 гг. прыбылі ў Беларусь, прэтэндуюць на статус бежанцаў. Пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусь пачала фарміраваць уласную міграцыйную палітыку. Важнымі крокамі на гэтым шляху стаў закон аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь (18.10.1991), прыняцце ў маі 1993 г. закона аб парадку выезду грамадзян з Беларусі і ўезду ў яе (дзейнічае з 1.1.1994). Канстытуцыя, прынятая 15 сакавіка 1994 г., замацавала за грамадзянамі права "свабодна перамяшчацца і выбіраць месца жыхарства ў межах Рэспублікі Беларусь, пакідаць яе і бесперашкодна вяртацца назад". У ліпені 1992 г. заснавана Дзяржаўная міграцыйная служба пры Дзяркамітэце па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва (затым пры Міністэрстве працы). З 1 студзеня 1997 г. яна пераўтворана ў Камітэт па міграцыі пры Міністэрстве працы. Беларусь — член Міжнароднай арганізацыі па міграцыі (у снежні 1996 г. у Мінску заснавана яе прадстаўніцтва). Паміж ёй і ўрадам Беларусі падпісана ў чэрвені 1998 г. пагадненне аб супрацоўніцтве,

ратыфікаванае ў маі 1999 г. З 1995 г. у Беларусі дзейнічае прадстаўніцтва Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў.

Практычнымі мерамі па рэгуляванню міграцыйных працэсаў сталі падпісаныя рэспублікай у 1990-я гг. міжурадавыя пагадненні аб абароне правоў сваіх грамадзян з Польшчай, Расіяй, Украінай, Літвой, Казахстанам, Славакіяй, Кубай. Падпісана 30 кастрычніка 1996 г. і ратыфікавана 6 студзеня 1998 г. пагадненне паміж урадамі Беларусі і Расіі аб рэгуляванні працэсаў перасялення і абароне правоў перасяленцаў. На сацыяльную абароненасць працоўных мігрантаў у заходнееўрапейскіх краінах скіравана пагадненне аб партнёрстве і супольніцтве з еўрапейскімі супольніцтвамі і іх дзяржавамі–членамі (6.3.1995). Прыняты закон "Аб знешняй працоўнай міграцыі" (17.6.1998). Асноўныя мэты і прынцыпы эміграцыйна-іміграцыйнай палітыкі Беларусі, механізмы яе рэалізацыі сфармуляваны ў Дзяржаўнай міграцыйнай праграме, ухваленай урадам 8 красавіка 1998 г.

Галіна Сяргеева

Натуралізацыя

"Натуралізацыя" (укараненне) — прадастаўленне дзяржавай свайго грамадзянства іншаземцу ці асобе без грамадзянства (апатрыду) па яго просьбе. Звычайна пры натуралізацыі грамадзянства прадастаўляецца ў індывідуальным парадку (па заяве асобы аб прыёме ў грамадзянства), але сусветная практыка дапускае набыццё грамадзянства шляхам натуралізацыі ў выпадках шлюбу грамадзянкі пэўнай дзяржавы з грамадзянінам іншай дзяржавы, усынаўлення дзіцяці з грамадзянствам іншай дзяржавы, аптацыі (права на змену грамадзянства жыхароў тэрыторыі, якая пераходзіць у склад іншай дзяржавы на аснове адпаведнай дамоўленасці). Працэдура і ўмовы натуралізацыі рэгулююца нацыянальным заканадаўствам дзяржавы. Тыповымі ўмовамі натуралізацыі з'яўляюцца адпаведны тэрмін пражывання ў дадзенай дзяржаве (напрыклад, у Вялікабрытаніі патрабуецца сямігадовы тэрмін пражывання, у Францыі і ЗША – пяцігадовы); служба ў пэўных органах дзяржавы або яе ўзброеных сілах; шлюб з грамадзянінам адпаведнай дзяржавы; паслугі, якія аказваюцца дзяржаве; "добрыя паводзіны". Дзяржава можа прад'яўляць дадатковыя патрабаванні да асобы, якая жадае атрымаць грамадзянства шляхам натуралізацыі. Часта заканадаўства розных дзяржаў змяшчае палажэнні, якія абмяжоўваюць натуралізацыю. Натуралізацыя праводзіцца вышэйшымі органамі дзяржаўнай улады, органамі дзяржаўнага кіравання (звычайна, ведамствамі унутраных спраў), судовымі органамі, мясцовымі органамі дзяржаўнай улады. Своеасаблівай разнавіднасцю натуралізацыі з'яўляецца "дараванне", калі грамадзянства пэўнай дзяржавы прадастаўляецца не па просьбе зацікаўленай асобы, а па ініцыятыве дзяржаўных органаў з адпаведнай кампетэнцыяй.

Аляксандр Ціхаміраў

Рэпатрыяцыя

Слова "Рэпатрыяцыя" вядзе сваё паходжанне ад лац. repatriatio. Сэнс яго (вяртанне на радзіму) – вяртанне ў краіну грамадзянства, сталага пражывання ці паходжання асоб, якія апынуліся ў іншай дзяржаве ў выніку войнаў, надзвычайных прыродных катаклізмаў, па палітычных, рэлігійных, эканамічных, этнічных, асабістых прычынах: ваеннапалонных, бежанцаў, інтэрніраваных і перамешчаных асоб, эмігрантаў (з узнаўленнем у правах грамадзянства). Рэпатрыяцыя вядома са старажытнасці, але ўпершыню юрыдычна замацавана ў мірных дагаворах пасля Першай сусветнай вайны ў сувязі з урэгуляваннем праблемы бежанцаў (гл. *Бежанцы*). Рэпатрыяцыя ажыццяўляецца, як правіла, на падставе міжнародных дагавораў ці пры наяўнасці адпаведных законаў у зацікаўленых дзяржавах. Яна звязана са зменай (набыццём) грамадзянства і можа быць разнавіднасцю аптацыі — выбару асобай грамадзянства, калі змянілася дзяржаўная прыналежнасць тэрыторыі яе пражывання. Гэта мела месца пасля заканчэння савецка-польскай войны на падставе заключанага 24 лютага 1921 г. дагавора аб рэпатрыяцыі паміж Польшчай і РСФСР, УССР. Да 1924 г. у Заходнюю Беларусь (у складзе Польшчы) вярнулася каля 700 тыс. бежанцаў, пераважна з Расійскай Федэрацыі. Дзесяткі тысяч асоб, якія пакінулі Расію пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі і ў ходзе грамадзянскай вайны, вярнуліся ў СССР, у тым ліку ў БССР. Нэп, беларусізацыя, пашырэнне тэрыторыі БССР, амністыя 1923 г. паспрыялі вяртанню на бацькаўшчыну ў другой палове 1920-х гг. і часткі палітычных эмігрантаў. Прыток рэпатрыянтаў у СССР спыніўся з пачаткам масавых палітычных рэпрэсій.

Пэўная рэпатрыяцыя звязана з пачаткам Другой сусветнай вайны. Пры заключэнні 28 жніўня 1939 г. дагавора аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй быў падпісаны і канфідэнцыяльны пратакол аб выездзе асоб нямецкай нацыянальнасці з тэрыторыі, якая адышла да СССР, а беларусаў і ўкраінцаў — з акупаванай Германіяй тэрыторыі Польшчы. У адпаведнасці з падпісаным 16 лістапада 1939 г. пагадненнем Германія перадала СССР 38424 пастаянных жыхароў заходнебеларускіх і заходнеўкраінскіх зямель. Германскі ўрад пасля заканчэння тэрміну работ па эвакуацыі бежанцаў прапанаваў у сакавіку 1940 г. у абмен на 1–2 тыс. нямецкіх асоб, якія не паспелі выехаць ці знаходзіліся ў заключэнні, перадаць СССР 50 тыс. палонных германа-польскай вайны — ураджэнцаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Сваю адмову савецкі ўрад тлумачыў у ноце Народнага камісарыята замежных спраў тым, што пагадненнем ад 1939 г. не прадугледжана вяртанне гэтай катэгорыі асоб у месцы іх пражывання і што ў адпаведнасці з законамі СССР яны не могуць быць прызнаны савецкімі грамадзянамі, бо не

знаходзіліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны на момант іх уключэння ў склад СССР.

Праблемы рэпатрыяцыі мільёнаў савецкіх грамадзян (ваеннапалонных, вывезеных на работу— з БССР каля 385 тыс. чал.) востра паўстала ў канцы Другой сусветнай вайны і пасля яе завяршэння ў Еўропе. На гэты час на тэрыторыі Германіі і Аўстрыі налічвалася звыш 6 млн. чалавек з СССР, з іх амаль 5 млн. "остарбайтэраў". Па рашэнню СНК СССР ад 4 кастрычніка 1944 г. рэпатрыяцыі падлягалі ў абавязковым парадку ўсе савецкія грамадзяне, якія ў ходзе Другой сусветнай вайны апынуліся за мяжой. Выключэнне было зроблена для замужніх жанчын, якія мелі дзяцей. У кастрычніку 1944 г. было створана Упраўленне ўпаўнаважанага СНК СССР па справах рэпатрыяцыі. Пры СНК БССР, а таксама РСФСР, Украіны, Малдавіі, Эстоніі і Латвіі дзейнічалі аддзелы рэпатрыяцыі. У рэспубліцы былі арганізаваны аддзелы пры выканкамах абласцей, функцыянавалі размеркавальныя пункты, спецыяльныя фонды харчавання, адзення і абутку, былі выдзелены пэўныя сродкі для дапамогі рэпатрыянтам. СССР дамагаўся максімальнай рэпатрыяцыі сваіх грамадзян да сярэдзіны 1950-х гг., каб задаволіць патрэбы дзяржавы ў рабочай сіле для аднаўлення разбуранай вайной гаспадаркі, прадухіліць патэнцыяльную масавую эміграцыю, прадэманстраваць міжнароднай супольнасці прыхільнасць савецкіх людзей да існуючага ладу. СССР дабіўся ад саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі згоды на абавязковую рэпатрыяцыю на Крымскай канферэнцыі (Ялта, люты 1945 г.). Міжнародна-прававымі актамі па рэгуляванні рэпатрыяцыі сталі заключаныя адпаведныя пагадненні СССР з Вялікабрытаніяй і ЗША (11.2.1945), Бельгіяй (13.3.1945), Францыяй (29.6.1945). Яны прадугледжвалі вяртанне дамоў грамадзян гэтых дзяржаў — бежанцаў і перамешчаных асоб, у тым ліку ваеннапалонных. З сакавіка 1945 г. пачалася арганізаваная рэпатрыяцыя савецкіх грамадзян з-за мяжы. Пры гэтым СССР адмовіўся ад удзелу Адміністрацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях дапамогі і аднаўлення (ЮНРРА), якая займалася яшчэ міжнароднай прававой абаронай бежанцаў і перамешчаных асоб (1943–1946). З савецкай зоны акупацыі рэпатрыяцыйныя місіі арганізавалі вываз у СССР практычна ўсіх, незалежна ад іх намераў. Натуральным жаданнем пераважнай большасці спакутаваных людзей было імкненне пакінуць разбураную вайной Еўропу, пры гэтым яны спадзяваліся на нармальныя адносіны да сябе на радзіме. Да 1 сакавіка 1946 г., калі ў асноўным рэпатрыяцыя была завершана, у СССР вярнулася амаль 521 тыс. беларусаў (больш за 385 тыс. грамадзянскіх асоб і каля 135 тыс. ваеннапалонных). Юрыдычнай падставай для вяртання на бацькаўшчыну эмігрантаў папярэдніх хваляў стаў Указ Прэзідыума ВС СССР ад 14 чэрвеня 1946 г. "Аб аднаўленні ў грамадзянстве СССР падданых былой Расійскай імперыі, а таксама асоб, якія страцілі савецкае грамадзянства", іншыя акты 1945–1947 гг., паводле якіх беларусы і ўкраінцы з даваеннай Польшчы атрымалі права на набыццё савецкага грамадзянства. Каб паскорыць вяртанне, СМ БССР і ЦК КП(б)Б у 1946 г. прынялі пастанову "Аб рэпатрыяцыі беларускіх грамадзян, якія знаходзяцца ў Францыі", а ў 1947 г. быў назначаны прадстаўнік СМ БССР у заходнюю зону Германіі і Аўстрыю. Пад уплывам перамогі СССР і заходніх саюзнікаў у Другой сусветнай вайне тысячы эмігрантаў, у тым ліку выхадцаў з Беларусі, паверылі савецкай прапагандзе, эмігранцкай прэсе пракамуністычнай арыентацыі і прынялі грамадзянства СССР (у Францыі, Бельгіі, Аргенціне і інш.). Але ад рэпатрыяцыі ўхіляліся дзесяткі тысяч беларусаў, якія апынуліся ў амерыканскай, брытанскай і французскай зонах акупацыі і якія з ліпеня 1945 г. знаходзіліся ў лагерах для перамешчаных асоб. Вяртацца ў СССР не жадалі многія з жыхароў (пераважна сяляне Заходняй Беларусі, палонныя, якія агулам залічваліся ўладамі ў здраднікі), асобы, якія прымусова ці добраахвотна супрацоўнічалі з акупантамі, ваявалі на іх баку. Савецкія рэпатрыяцыйныя місіі наведвалі лагеры, агітавалі вяртацца дамоў, а многіх грамадзян СССР прымусова пераводзілі ў савецкую зону. Прымусовасць, паспешлівасць, неразборлівасць у сродках пры вырашэнні пытанняў рэпатрыяцыі выклікалі рознагалоссі з саюзнікамі. Негатыўны розгалас у свеце атрымалі арышты эмігрантаў у Празе, аблавы на іх у Сафіі і Бялградзе, гвалтоўная адпраўка у Саюз перамешчаных асоб з лагера "Борэгар" у Францыі. З 1947 г. саюзнікі адмовіліся ад прымусовай рэпатрыяцыі. Сесія Савета Міністраў замежных спраў СССР, ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі ад 23 красавіка 1947 г. пацвердзіла пагадненне Кантрольнага савета ў Германіі аб новым парадку выдачы зацікаўленым краінам ваенных злачынцаў — толькі пасля прад'яўлення аргументаваных юрыдычных доказаў іх віны. Такое ж рашэнне прыняла 2-я сесія ГА ААН. Але БССР не прадставіла заходнім дзяржавам абгрунтаванні да спіса ваенных злачынстваў, аб якім летам 1947 г. паведаміў яе прадстаўнік на нарадзе намеснікаў у СМ замежных спраў. Савецкія прадстаўнікі адсутнічалі і ў створанай замест ЮНРРА Міжнароднай арганізацыі па справах бежанцаў (IRO, 1947–1952), якая па рашэнні 8-ай сесіі ЭКАСАС ААН (1949) займалася ўжо не вяртаннем бежанцаў на радзіму, а іх рассяленнем у іншых дзяржавах. Прадстаўнікі СССР і БССР выступілі супраць стварэння Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў і не прымалі ўдзел у яго рабоце. Яны не далучыліся да Канвенцыі аб статусе бежанцаў, якую 25 ліпеня 1951 г. падпісалі Бельгія, Данія, ФРГ, Францыя, Вялікабрытанія і інш. І ў адпаведнасці з якой да бежанцаў былі аднесены і перамешчаныя асобы. Да 1952 г. у СССР вярнуліся, галоўным чынам прымусова, беларусы і прадстаўнікі іншых нацыянальнацей, выхадцы з БССР (пераважна з дзяржаў, дзе размясціліся савецкія войскі), колькасцю 104893 чал. — у адпаведнасці з Жэнеўскай канфенцыяй 1948 г. аб абароне ахвяр вайны.

Палітычная "адліга", прыадкрыццё "жалезнай заслоны" з сярэдзіны 1950-х гг., прапаганда рэпатрыяцыі савецкім друкам, пасольствамі, камітэтамі "За вяртанне на Радзіму" (з 1955 г. дзейнічала беларуская секцыя Савецкага камітэта "За вяртанне на Радзіму", а ў 1960–1964 гг. — "За вяртанне на Радзіму і развіццё культурных сувязей з суайчыннікамі") абумовілі нязначную рээміграцыю. Вярталіся ў асноўным эмігранты і іх нашчадкі з былой Расійскай імперыі і міжваеннай Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы. З Францыі і Аргенціны ў БССР прыехала ў 1953–1955 гг.

каля 200 чал. Па некаторых звестках, да 1964 г. сюды прыбыло каля 10–15 тыс. аргенцінскіх беларусаў. Аднак ужо ў пачатку 1960-х гг. пачаўся іх адток у Паўднёвую Амерыку, і 40–50 працэнтаў рээмігрантаў, расчараваных савецкай рэчаіснасцю, пакінулі бацькаўшчыну. Пасля іх вяртання ў краіны ранейшага пражывання прыток рээмігрантаў з іх перапыніўся. Далейшыя заклікі да рэпатрыяцыі, асабліва ў асяроддзі пасляваеннай эміграцыі, водгуку не знаходзілі, і вярталіся нямногія. Пасля распаду СССР без дзяржаўнай падтрымкі пачалася рэпатрыяцыя беларусаў, ураджэнцаў Беларусі з новых незалежных дзяржаў на постсавецкай тэрыторыі. У 1992-1999 гг. з іх прыехала ў Беларусь 408 тыс. чалавек, у тым ліку 188 тыс. беларусаў.

Галіна Сяргеева

Эміграцыя

"Эміграцыя" (ад лац. emigro – высяляюся – выезд грамадзян са сваёй Бацькаўшчыны ў іншую краіну на пастаяннае або доўгае пражыванне па палітычных, рэлігійных, эканамічных, этнічных ці інш. прычынах, а таксама ў выпадку сацыяльных (войны, рэвалюцыі) або прыродных катаклізмаў.

Ранняя эміграцыя з беларускіх зямель. Насельніцтва пачало пакідаць землі Беларусі ўжо на ранніх этапах фарміравання беларускай дзяржаўнасці. Ва ўмовах існавання найстаражытнейшых дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі Беларусі (Полацкага і Тураўскага княстваў) за мяжу зыходзілі прадстаўнікі кіруючай эліты, якія былі вымушаны пакідаць родныя мясціны ў сувязі з палітычнымі абставінамі (часцей за ўсё ў выніку паражэння ў барацьбе за ўладу). Так, тураўскі князь Святаполк, які пацярпеў паражэнне ў барацьбе за кіеўскі "стол" са сваім братам, ноўгарадскім князем Яраславам, шукаў сховішча ў польскага караля Баляслава I Харобрага. У 1129 г. кіеўскі князь Мсціслаў Уладзіміравіч загадаў выслаць з Полацкай зямлі ў Візантыйскую імперыю 5 князёў з дынастыі Рагвалодавічаў з жонкамі і дзецьмі і толькі двое з пяці выгнаннікаў вярнуліся ў родныя мясціны ў 1140 г. Падобны характар эміграцыя мела ў ранні перыяд існавання Вялікага Княства Літоўскага і ў часы яго росквіту (XIII – першая палова XV ст.). У 1265 г. князь нальшанскі Даўмонт пасля заваявання Нальшан навагрудскім князем Войшалкам пакінуў радзіму і разам са сваёй дружынай перасяліўся ў Пскоў, дзе прыняў праваслаўе, быў выбраны вечам князем пскоўскім і кіраваў горадам да сваёй смерці (1299 г.). У 1377 г. брат вялікага князя літоўскага Ягайлы, полацкі князь Андрэй адмовіўся прызнаць уладу Ягайлы і пераехаў спачатку ў Пскоў, а потым у Маскву, дзе быў да 1386 г. У час жорсткай барацьбы за ўладу ў Вялікім Княстве Літоўскім у канцы XIV ст. двойчы выязджаў за межы дзяржавы ў пошуках палітычнага прытулку князь гродзенскі і троцкі Вітаўт (у 1382–1384 гг. знаходзіўся разам з сям'ёй у Мазовіі і на тэрыторыі Тэўтонскага ордэна; у 1390–1392 гг. на тэрыторыі Тэўтонскага ордэна). У 1408 г. у Маскву пераехаў северскі князь Свідрыгайла Альгердавіч, які атрымаў ад маскоўскага князя Васілія I "в кормление" Уладзімір-на-Клязьме, Пераяслаўль, Юр'еў-Польскі, Валакаламск, Ржэў і палову Каломны. У 1439 г. пасля паражэння ў змаганні за ўладу з вялікім князем літоўскім Жыгімонтам Кейстутавічам Свідрыгайла ратаваўся ў Малдове, адкуль вярнуўся на радзіму ў 1445 г.

У другой палове XV ст. права падданых вялікага князя на вольны выезд за мяжу было замацавана ў юрыдычных дакументах. У прывілеі ад 2.5.1447 г. вялікі князь Казімір дазволіў пакідаць Вялікае Княства Літоўскае "для пошукаў лепшай долі і навучання рыцарскай справе ва ўсялякія землі акрамя непрыяцельскіх" "княжатам, панам хоругоўным, шляхцічам і баярам". У 1529 г. дадзенае права было замацавана ў Статуце Вялікага Княства Літоўскага. Па Абласным віцебскім прывілеі ад 16.3.1503 г. і Абласным полацкім прывілеі ад 21.2.1547 г. права на вольны выезд атрымалі і мяшчане. Статут Вялікага Княства Літоўскага 1566 г. адзначаў, што за мяжу могуць выязджаць вольныя людзі "всякого стану", Статут 1588 г. пацвердзіў дадзены артыкул. Толькі зрэдку вялікія князі ўводзілі абмежаванні на наведванне той ці іншай краіны (напрыклад, у 1520-х гг. вялікі князь літоўскі Жыгімонт I Стары забараніў сваім падданым наведваць Германію для атрымання адукацыі ў сувязі з Рэфармацыяй, якая там пачалася). Падданыя вялікіх князёў літоўскіх актыўна выкарыстоўвалі дадзенае права. Яны выязджалі ў Свяшчэнную Рымскую імперыю, італьянскія дзяржавы (Геную, Венецыю, Падую, Фларэнцыю і інш.), Польшчу, Чэхію, Францыю, Іспанію, дзе паступалі на ваенную службу ці павышалі свой адукацыйны ўзровень (з сярэдзіны XVI да сярэдзіны XVII стст. Ва універсітэтах Балонні, Падуі, Цюбінгена, Вітэнберга, Гейдельберга, Лейпцыга, Лювэна, Базеля, Кракава, Кёнігсберга і іншых еўрапейскіх гарадоў навучалася каля 460 студэнтаў з шляхецкіх сямей Беларусі і Літвы), садзейнічалі распаўсюджанню друкарства і адукацыі (найбольш вядомым у гэтых адносінах стаў Ф. Скарына). Знаходжанне за мяжой спрыяла перанясенню элементаў заходнееўрапейскай культуры на тэрыторыю Беларусі. Нягледзячы на наяўнасць права на вольны выезд, у XV–XVIII стст. Захоўвалася і эміграцыя з Вялікага Княства Літоўскага па палітычных матывах (у склад палітычных эмігрантаў уваходзілі прадстаўнікі эліты, якія былі незадаволены курсам на ўзмацненне цэнтралізацыі ў дзяржаве і паскоранае распаўсюджанне рымска-каталіцкага веравызнання пасля Крэўскай уніі 1385 г.). Асноўным напрамкам такой эміграцыі была Маскоўская дзяржава. Сотні жыхароў Вялікага Княства Літоўскага перасяліліся ў Маскоўскую дзяржаву ў XVII ст. у сувязі з абвастрэннем палітычных, рэлігійных і сацыяльных супярэчнасцей на іх радзіме. У канцы XVI–XVII ст. значная колькасць выхадцаў з Вялікага Княства Літоўскага перасялілася на "вольныя землі" у нізоўях Дняпра і на Дану, уліўшыся ў склад запарожскага і данскога казацтва.

Барацьба за "спадчыну Рурыкавічаў", якая пачалася паміж Вялікім Княствам Літоўскім (пазней Рэччу Паспалітай) і Маскоўскай дзяржавай ў канцы XV ст. і працягвалася з перапынкамі да канца XVII ст. выклікала прымусовую эміграцыю. Перш за ўсё ў лік "эмігрантаў па прымусу" ўваходзілі ваеннапалонныя. Другой крыніцай прымусовай эміграцыі была дэпартацыя мірнага насельніцтва з тэрыторый, захопленых у час вядзення баявых дзеянняў. Вывезеныя людзі становіліся рабамі-халопамі і рассяляліся ў межах Маскоўскай дзяржавы. Буйнамаштабныя высяленні прымяняліся ў адносінах да беларускага насельніцтва у час Лівонскай вайны 1564–1583 гг., вайны паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскім царствам 1654–1667 гг. і Паўночнай вайны 1700–1721 гг. Асобы, перамешчаныя з Беларусі, рассяляліся ў Маскве (у верасні 1672 г. для іх была створана асобая Мяшчанская слабада, якая падпарадкоўвалася Пасольскаму прыказу), Яраслаўлі, Пераяслаўлі, Растове, Кастраме, Углічы, Паволжы, Прыкам'і, Прыураллі. У канцы XVI–XVII ст. перасяленцы з Беларусі актыўна ўдзельнічалі ў асваенні ўсходніх раёнаў Маскоўскай дзяржавы (Сібіры, Далёкага Усходу, Чукоткі, Камчаткі). У другой палове XV–XVII ст. выхадцы з Беларусі (Пётр Мсціславец, Сімяон Полацкі, Ілля Капіевіч і інш.) спрыялі азнаямленню насельніцтва Маскоўскай дзяржавы з дасягненнямі еўрапейскай культуры. Дзясяткі майстроў з Полацка, Віцебска, Оршы, Магілёва і іншых беларускіх гарадоў удзельнічалі ў будове храмаў і палацаў у Маскоўскай дзяржаве. Амаль цалкам беларускім па сваім складзе быў калектыў палацавага тэатра, сфарміраванага ў 1673 г. па распараджэнню цара Аляксея Міхайлавіча (акцёры набіраліся ў Мяшчанскай слабадзе).

У першай палове XVII ст. выхадцы з беларускіх зямель трапілі на тэрыторыю каланіяльнай Амерыкі (у сучасныя ЗША і Канаду). У другой палове XVIII ст. эмігранты з Беларусі ўдзельнічалі ў барацьбе паўночнаамерыканскіх калоній за незалежнасць ад Англіі (найбольш вядомым у гэтых адносінах стаў Т. Касцюшка).

Беларуская эміграцыя канца XVIII ст. – 1870-х гг. Пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі ў канцы XVIII ст. перамяшчэнні насельніцтва з этнічна беларускіх зямель у іншыя рэгіёны імперыі (у цэнтральныя раёны Расіі, Сібір, Казахстан, Прыбалтыку, Украіну, Крым, на Каўказ і Далёкі Усход) фармальна праходзілі ў межах адзінай дзяржавы і не патрабавалі ад перасяленцаў змены падданства. Сапраўднымі эмігрантамі у перыяд з канца XVIII ст. да 1917 г. былі толькі тыя, хто высяляўся за межы Расійскай імперыі.

У канцы XVIII ст. – 1870-х гг. беларуская эміграцыя мела выразна палітычны характар. За мяжу ад'язджалі ўдзельнікі паўстанняў 1794, 1830–1831, 1863–1864 гг., асобы, якія выступілі на баку Напалеона I падчас вайны 1812 г., члены рэвалюцыйных таварыстваў, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі ў 1820–1870-х гг. Дакладныя лічбы пра колькасць тых, хто пакінуў Бацькаўшчыну, прывесці цяжка з прычыны адсутнасці адпаведных статыстычных даных. Магчыма, колькасць выхадцаў з тэрыторыі Беларусі ў агульнай эміграцыйнай плыні, якая складалася з ураджэнцаў Польшчы, Літвы і Украіны, дасягала некалькіх тысяч чалавек. У складзе эмігрантаў пераважалі асобы шляхецкага паходжання (пераважна з сярэдняй і дробнай шляхты), каталіцкага ці грэка-каталіцкага веравызнання, ураджэнцы заходняй і цэнтральнай частак Беларусі (Віленская, Гродзенская і Мінская губ.). Найбольш масавай і дэмакратычнай па сваім складзе была эміграцыя 1860-х гг., у складзе якой з'явіліся мяшчане і нават сяляне. Асноўная частка эмігрантаў перасялілася ў Францыю, асобныя дзеячы знайшлі прытулак у Бельгіі, Балгарыі, Вялікабрытаніі, Грэцыі, ЗША, Швейцарыі, дзяржавах Германіі і Італіі. У гэты час выхадцы з беларускіх зямель звычайна далучаліся да польскіх эміграцыйных устаноў і не праяўлялі сябе як асобная частка эміграцыі са сваім нацыянальным абліччам. Толькі ў 1864 г. выхадцы з літоўскіх і беларускіх зямель стварылі ў Парыжы Літоўскае таварыства і звярнуліся да Польскага эміграцыйнага цэнтра з прапановай пераўтварыць таварыства ў самастойны Літоўскі замежны камітэт, аднак палякі з гэтай прапановай не пагадзіліся і таварыства было вымушана спыніць сваю дзейнасць. Прадстаўнікі гэтай эміграцыйнай хвалі працавалі ў галіне адукацыі і культуры (М.–К. Агінскі, Ф. Дзеружынскі, А. Міцкевіч, Г. Дмахоўскі, Н. Орда, А. Рыпінскі), праславіліся ў галіне навукі і тэхнікі (І. Дамейка, К. Ельскі, І. Граковіч), уключыліся ў вызваленчы і рэвалюцыйны рух на еўрапейскім і амерыканскім кантынентах (Т. Касцюшка, В. Гарноўскі, В. Урублеўскі, З. Мінейка, У. Борзабагаты, А. Трусаў, М. Судзілоўскі і інш.).

Масавая эміграцыя з Беларусі ў 1880-х – 1917 гг. Асабліва значныя памеры эміграцкі рух з Беларусі набыў у канцы XIX – пачатку XX ст., калі, у адрозненне ад папярэдніх эміграцыйных хваляў беларускае насельніцтва пачало выходзіць за мяжу пераважна па эканамічных матывах. Галоўнай прычынай выезду на чужыну было сялянскае малазямелле і неразвітасць на Беларусі буйной прамысловасці. Людзі ехалі на чужыну з мэтай заробку грошай, каб, вярнуўшыся, купіць кавалак зямлі, абзавесціся гаспадаркай. Эміграцыя па палітычных матывах была параўнальна нешматлікай і назіралася толькі у час руска-японскай вайны 1904–1905 гг. і расійскай рэвалюцыі 1905–1907 гг. Першымі пачалі пакідаць Беларусь у пошуках лепшай долі жыхары Ашмянскага і Вілейскага паветаў Віленскай губерні (у 1883 г.). У 1890-х гг. сталі выязджаць за мяжу жыхары Мінскай губерні. З Віцебскай і Магілёўскай губерняў насельніцтва перасялалася за мяжу пасля 1905 г. у сувязі з правядзеннем сталыпінскай аграрнай рэформы. Да 1914 г. найбольшая колькасць эмігрантаў паходзіла з Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў. Дакладную лічбу эмігрантаў прывесці цяжка з прычыны адсутнасці адпаведных статыстычных звестак. Большасць даследчыкаў лічыць, што з канца XIX ст. да 1914 г. Беларусь пакінула не менш за 500 тыс. чалавек. Галоўным чынам эмігранты накіроўваліся ў Германію, Данію (эміграцыя ў гэтыя краіны мела сезонны характар), ЗША, Бразілію, Аргенціну і Канаду. У складзе эмігрантаў пераважалі мужчыны ва узросце 18–35 гадоў, фізічна моцныя, але неадукаваныя і некваліфікаваныя. Выезд з сямействам быў у гэты час для беларусаў з'явай рэдкай.

На характар эміграцыі ўплывала тое, што ўрад Расійскай імперыі ставіўся да адыходу беларускіх работнікаў адмоўна і імкнуўся затрымаць іх у межах імперыі. Да 1917 г. замежны адыход па сутнасці быў неўрэгуляваны ў прававых адносінах, нязменнай заставалася складаная працэдура афармлення неабходных выязных дакументаў. Па гэтай прычыне значная частка беларускага насельніцтва выходзіла за мяжу тайна. З 1906 г. расійскі ўрад некалькі змяніў свае адносіны да эмігрантаў: пачалася распрацоўка закона аб выездзе за мяжу з мэтай заробку, прыняты меры па спрашчэнні працэдуры выезду і зніжэнні кошту замежных пашпартоў. Расійскія параходныя кампаніі ("Восточно-Азиатское пароходство", "Добровольный флот") былі прыцягнуты да перавозкі эмігрантаў. Асноўная іх маса перасялялася ў ЗША, дзе выкарыстоўвалася на цяжкіх, некваліфікаваных работах (вугальныя шахты, сталеліцейныя заводы, работа на будоўлях і фермах). Адпрацаваўшы некалькі (звычайна 3–5) гадоў, работнікі-беларусы вярталіся на радзіму (зразумела, пры спрыяльных абставінах, бо праца эмігрантаў часта была небяспечнай для жыцця і шкоднай для здароўя). Падобны характар мела эміграцыя ў Аргенціну. У Канадзе і Бразіліі эмігранты з Беларусі асядалі на зямлі, бо ўдзельнічалі ў каланізацыйным руху. Нягледзячы на даволі значную дыяспару, беларусы не здолелі заявіць за мяжой аб сябе у нацыянальным плане з прычыны незавершанасці працэсу станаўлення беларускага этнасу. Звычайна людзі, якія пакінулі Бацькаўшчыну да Першай сусветнай вайны, разглядалі беларускасць як рэгіяналізм у рускай ці польскай (у залежнасці ад веравызнання) супольнасці і далучаліся да эканамічных, палітычных, культурных і рэлігійных арганізацый, якія ствараліся ў замежжы іншыя народы (часцей за ўсё рускія і палякі) і асімілявaліся ў іх. Дзеці беларусаў, калі іх бацькі заставаліся на чужыне, цалкам страчвалі сувязь са сваёй этнічнай радзімай. Эміграцыя была практычна адарвана ад беларускага нацыянальнага руху на этнічнай радзіме, у сувязі з чым большасць беларускіх грамадскіх дзеячаў у пачатку XX ст. (у т. л. А. Луцкевіч, В. Ластоўскі) разглядалі эміграцыйны рух як шкодны для Беларусі. Толькі асобныя дзеячы (напрыклад, рэдактар і выдавец "Нашай нівы" А. Уласаў) лічылі, што з эмігрантамі трэба працаваць як з асобнай катэгорыяй беларускага насельніцтва. Спробы арганізаваць за мяжой беларускія ўстановы, якія рабіліся да 1914 г. (дзейнасць А. Сянкевіча ў Балціморы ў 1910 г., В. Татарчыка ў Нью-Йорку ў 1913–1914 гг., заснаванне ў 1913 г. у Гранд-Рэпідз, штат Мічыган, Таварыства беларусаў і маларосаў) не былі паслядоўнымі. Толькі пасля Першай сусветнай вайны беларусы пачалі ствараць на чужыне свае суполкі, арганізацыі, клубы, як гэта рабілі іншыя народы. У пачатку XX ст. частка беларускіх эмігрантаў (пераважна ў ЗША) належала да замежных прафсаюзаў і нават удзельнічала ў стварэнні прафсуполак. Далучаліся яны і да палітычных арганізацый (напрыклад, беларускія эмігранты ўваходзілі ў Федэрацыю саюзаў рускіх рабочых, якая была створана анархістамі і дзейнічала ў Чыкага і іншых гарадах ЗША). Выезд за мяжу меў добрыя вынікі для беларусаў, паколькі эмігранты маглі пазнаёміцца з больш дасканалымі прыладамі працы, яе арганізацыяй, пачыналі пашыраць свой кругагляд, цікавіцца газетамі, кнігамі і тэатрам, набывалі вопыт арганізаванай барацьбы за свае інтарэсы. Вялікай падмогай для хатняй гаспадаркі былі і зароблены за мяжой грошы, бо напярэдадні Першай сусветнай вайны толькі з ЗША беларускія эмігранты штогод высылалі на радзіму па 300–500 руб.

Першая сусветная вайна істотна паўплывала на развіццё эміграцыйных працэсаў у Беларусі. Баявыя дзеянні ў Еўропе перакрылі традыцыйныя шляхі зносін Беларусі з заакіянскімі краінамі — праз Прыбалтыку, Германію і Аўстра-Венгрыю. На радзіму можна было трапіць толькі праз Архангельск або Далёкі Усход і Сібір. Працяглыя марскія падарожжы сталі небяспечнымі з-за разгорнутай Германіяй у 1915 г. падводнай вайны. Значная частка беларускіх мужчын была мабілізавана ў рускую армію. Такім чынам, эмігранцкі рух з Беларусі быў перапынены, да 1917 г. адбывалася толькі павольнае вяртанне на радзіму тых эмігрантаў, якія пакінулі яе да 1914 г. У час Першай сусветнай вайны пачалося збліжэнне паміж эмігрантамі і свядомай беларускай інтэлігенцыяй. У чэрвені 1916 г. беларускія дзеячы ў Вільні звярнуліся да суайчыннікаў праз газету "Гоман" з заклікам арганізавацца і аказаць Беларусі палітычную падтрымку.

Беларуская эміграцыя ў 1918–1921 гг. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. у Расіі вызначылася тэндэнцыя да вяртання на радзіму тых, хто пакінуў яе ў ранейшыя часы. Людзей прыцягвала магчымасць уладкавання жыцця ў новых, дэмакратычных умовах, знікла боязь рэпрэсій за выступленні супраць ранейшага ладу. Аднак абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей у Расіі, наступствам якога сталі Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. і грамадзянская вайна 1918–1922 гг., а таксама баявыя дзеянні, якія праходзілі на тэрыторыі Беларусі ў 1918–1920 гг., выклікалі новы адыход насельніцтва за межы Беларусі. У 1918–1921 гг. Беларусь пакінулі звыш 100 тыс. чалавек. У складзе эмігрантаў былі прадстаўнікі разначыннай інтэлігенцыі, памешчыкі, прадпрымальнікі, фінансісты, сяляне, якія не жадалі жыць ва ўмовах "дыктатуры пралетарыяту". У склад эмігрантаў трапілі і асобы, прымусова вывезеныя ў 1918 г. на работу ў Германію (толькі з Мінскай губерні немцы вывезлі некалькі тысяч чалавек). Эмігранты 1918–1921 гг. перасяляліся галоўным чынам у Балгарыю, Вялікабрытанію, Германію, Данію, ЗША, Латвію, Літву, Польшчу, Турцыю, Фінляндыю, Францыю, Чэхаславакію, Эстонію, Югаславію. Адметнай асаблівасцю эміграцыі было тое, што ў гэты час пачалася праца па згуртаванню беларускага насельніцтва на чужыне вакол ідэі беларускай дзяржаўнасці. Галоўным чынам гэтую работу праводзілі дыпламатычныя прадстаўніцтвы Беларускай Народнай Рэспублікі. Прынцыповае рашэнне пра перанясенне дзейнасці за мяжу было прынята на пасяджэнні Рады БНР 28.11.1918 г., яго практычная рэалізацыя адбылася ў 1919–1921 гг. Да 1921 г. дыпламатычныя ўстановы БНР існавалі ў Балгарыі (консульскае аддзяленне ў Сафіі), Германіі (місія і консульства ў Берліне), Грузіі (місія ў Тбілісі), Данії (консульства ў Капенгагене), Латвіі (вайскова-дыпламатычная місія і консульства ў Рызе), Літве

(дыпламатычная місія і консульства ў Каўнасе), Турцыі (консульства ў Стамбуле), Украіне (місія, консульства і гандлёва-прамысловая палата ў Кіеве), Фінляндыі (місія ў Хельсінкі), Францыі (місія ў Парыжы), Чэхаславакіі (місія і консульства ў Празе), Эстоніі (пашпартны аддзел Рыжскай вайскова-дыпламатычнай місіі ў Таліне), Югаславіі (консульскае аддзяленне ў Бялградзе). Яны дамагаліся прызнання замежнымі дзяржавамі незалежнасці Беларусі ў яе этнаграфічных межах, аказання ёй ваеннай, матэрыяльнай і фінансавай падтрымкі, садзейнічання ў арганізацыі беларускіх узброеных сіл, выдавалі пашпарты БНР выхадцам з Беларусі, абаранялі правы беларускіх грамадзян за мяжой, садзейнічалі грамадскім арганізацыям, што ствараліся беларусамі на чужыне. З пачатку 1920 г. за межы Беларусі перанеслі сваю дзейнасць Народная Рада БНР на чале з П. Крачэўскім і ўрад БНР на чале з В. Ластоўскім, якія выступалі супраць падзелу тэрыторыі Беларусі паміж Польшчай і РСФСР, патрабавалі неадкладнага допуску прадстаўнікоў БНР на мірныя перагаворы і кампенсацыі Беларусі страт, якія яна панесла у час Першай сусветнай і савецка-польскай войнаў. У канцы 1920 г. прадстаўнікі БНР за мяжой патрабавалі скасавання мірнага дагавора паміж Польшчай, РСФСР і УССР ад 12.10.1920 г. у частцы, якая датычылася Беларусі. Асноўнымі формамі працы беларускай палітычнай эміграцыі былі сустрэчы з замежнымі палітычнымі і ваеннымі дзеячамі, выданне мемарандумаў і дэкларацый, складанне прэс-рэлізаў пра становішча Беларусі (толькі з сакавіка 1920 г. да лютага 1921 г. органамі БНР было выдадзена 26 мемарандумаў і дэкларацый, дзе ў той ці іншай форме закраналася беларуская праблематыка). Апрача прадстаўнікоў БНР у склад палітычнай эміграцыі 1919–1921 гг. уваходзілі прадстаўнікі Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, Беларускай партыі сацыялістаў-федэралістаў і іншых беларускіх палітычных партый, якія знаходзіліся ў апазіцыі да польскіх акупацыйных уладаў і Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Літвы і Беларусі (з верасня 1920 г. Беларусі), цесна звязанай з органамі ўлады РСФСР, і асобы, якія ўваходзілі ў склад антысавецкіх узброеных фарміраванняў (беларускія атрады ў літоўскай арміі, літоўска-беларуская дывізія ў складзе войска польскага, армія Булак-Балаховіча і інш.). Разыходжанні паміж рознымі плынямі эміграцыі перашкаджалі яе паспяховай дзейнасці. Найбольш значнай акцыяй па згуртаванню сіл эміграцыі стала *Першая Усебеларуская канферэнцыя* (верасень 1921 г.), аднак яна не змагла пераадолець рознагалоссі ў эмігранцкім асяроддзі. У сярэдзіне 1920-х гг. ва ўмовах стабілізацыі міжнароднага становішча і зніжэння цікавасці да беларускай праблематыкі ў свеце прадстаўнікі беларускай палітычнай эміграцыі пачалі схіляцца да думкі аб неабходнасці вяртання ў БССР, станоўча ацэньваючы крокі савецкага ўрада па ажыццяўленню нэпа, адраджэнню беларускай нацыянальнай культуры. Станоўча была ацэнена імі пастанова прэзідыумаў ЦВК СССР і БССР ад 13.7.1923 г. аб амністыі, якой падлягалі не толькі сяляне і "паходзячыя з працоўнага асяроддзя" ўдзельнікі антысавецкіх фарміраванняў 1918–1920 гг., але і палітычныя і культурныя дзеячы, члены ўрадаў і розных палітычных партый (пры ўмове лаяльных адносін да савецкай улады). Пасля *Другой Усебеларускай канферэнцыі* (кастрычнік 1925 г.) многія беларускія эмігранты вярнуліся на Бацькаўшчыну і падключыліся да працэсаў нацыянальнага адраджэння, аднак у 1930-х гг. яны сталі ахвярамі палітычных рэпрэсій у СССР.

Аляксандр Ціхаміраў

Эміграцыя з Заходняй Беларусі. У пошуках працы і лепшых умоў жыцця з Заходняй Беларусі прыкладна з 1924 г. пачалася масавая эміграцыя насельніцтва. Яна абумоўлівалася цэлым комплексам эканамічных, сацыяльных і палітычных абставін, у якіх апынуліся беларусы паводле ўмоваў Рыжскага мірнага дагавору 1921 г. паміж Савецкай Расіяй і Украінай з Польшчай. У адпаведнасці з ім (без удзелу Беларусі) ад яе была адарвана і перададзена Польшчы амаль што палова тэрыторыі, населенай у асноўным грамадзянамі беларускай нацыянальнасці. Па дагавору Польшча атрымала землі Віленскага, Навагрудскага, Палескага ваяводстваў, а таксама Гродзенскага, Ваўкавыскага і іншых паветаў Беластоцкага ваяводства, што складала 107 тыс. км^2 і пад польскую ўладу трапіла каля 3 млн. беларусаў.

У сацыяльным складзе насельніцтва гэтага рэгіёна пераважалі сяляне (85%). Іх інтарэсы патрабавалі радыкальнага вырашэння аграрнага пытання, надзялення малазямельнага і беззямельнага сялянства зямлёй, інтэнсіфікацыі сялянскай гаспадаркі. Інтарэсы ж польскіх землеўладальнікаў патрабавалі эканамічнага і сацыяльнага ўмацавання памешчыцкіх гаспадарак. Пасля зямельнай рэформы за імі было замацавана 37% ворных земляў і каля 90 % лясоў. Польскі ўрад спрыяў і развіццю сярэдняга, моцнага сялянска-серадняцкага польскага землеўладання ў Заходняй Беларусі, перадаючы казённыя землі так званым асаднікам. Да 1939 г. ужо 37 тыс. гаспадарак у Заходняй Беларусі належала каланістам-палякам, якія ў сярэднім мелі па 500 га зямлі, у той час як беларускі селянін валодаў 2,7 га. Малазямелле і беззямелле вяло да жабрацкага існавання. Не было работы і ў гарадах, дзе эканамічны крызіс прывёў да заняпаду прамысловасці, згортвання будаўніцтва, і, у выніку, да высокага ўзроўню беспрацоўя.

Складаным было становішча і ў сацыяльнай, нацыянальна-культурнай сферах жыцця беларусаў. Паступова, але мэтанакіравана, зачыняліся беларускія школы. З 412 пачатковых школ, што былі ў Заходняй Беларусі ў 1922 г., да 1933 г. былі ліквідаваны практычна ўсе, зачынены беларускія гімназіі ў Вільні і Навагрудку. Беларускае настаўніцтва ўсялякімі шляхамі выціскалася з краю ў карэнныя польскія вобласці. Сюды ж накіроўвалася каталіцкае духавенства, паявіліся клерыкальныя арганізацыі, на якія дзяржавай ускладаліся абавязкі правядзення жорсткай палітыкі дэнацыяналізацыі беларускага насельніцтва.

Беларусы адчувалі сваю безабароннасць, не мелі ўпэўненасці ў заўтрашнім дні на роднай зямлі, але ў чужой дзяржаве. Гэта прымушала пакідаць зямлю продкаў, падавацца ў эміграцыю. Новая савецка-польская мяжа выключала магчымасць шукаць работы ва ўсходніх раёнах Беларусі, але ж, з другога боку, міграцыйная палітыка Польшчы адкрывала шляхі ў іншыя краіны свету.

Адносна колькасці тых, хто эміграваў з Заходняй Беларусі. існуюць розныя меркаванні. Але большасць як айчынных, так і польскіх даследчыкаў, схіляюцца да лічбы ад 180 да 240 тыс. чалавек. У адпаведнасці з сацыяльным складам насельніцтва эміграцыя была ў большасці сваёй сялянскай і мела эканамічны характар. Эмігравала ў невялікай колькасці і інтэлігенцыя, удзельнікі заходнебеларускага рэвалюцыйнага руху: грамадоўцы і сябры КПЗБ, якія праследаваліся польскімі ўладамі. У канцы 30-х гадоў за мяжу вымушаны былі выехаць беларускія каталіцкія святары з Друі.

Асноўная колькасць беларусаў накіроўвалася ў Канаду, ЗША, Францыю, Літву, Латвію, Аргенціну, Бразілію. Значная частка выхадцаў з Заходняй Беларусі пасялілася ў Францыі. У канцы 20-х гадоў тут пачаў разгортвацца арганізаваны беларускі культурны рух, існавала некалькі беларускіх гурткоў у Біянкуры, Эльзасе і Латарынгіі. З 1930 г. актыўную нацыянальную дзейнасць у Францыі праводзіў "Хаўрус беларускай працоўнай эміграцыі" (Парыж) і 5 яго філіяў ў правінцыі, Беларуская жаночая грамада (з 1938 г.).

Значнае месца па колькасці беларусаў-эмігрантаў займаў амерыканскі кантынент. На падставе некаторых крыніц можна зрабіць выснову, што ад агульнага ліку эміграцыі з Заходняй Беларусі, у краінах Паўднёвай Амерыкі, ЗША і Канадзе асела прыкладна трэцяя частка. У ліку многіх прычын такая масавая эміграцыя беларусаў за акіян тлумачыцца тым, што шматлікія параходныя кампаніі з мэтай атрымаць як мага большы прыбытак, прыкладалі вялікія намаганні ў агітацыі сялян да пераезду.

Большая частка эмігрантаў з Заходняй Беларусі накіравалася ў Аргенціну. Асабліва моцны рух беларусаў у гэтую краіну пачаўся ў 1926–1927 гг. і з гэтага часу штогод павялічваўся. Прыток эмігрантаў у Аргенціну заахвочваўся і рэгуляваўся яе ўрадам. Меркаванні аб агульнай колькасці тых, хто пераехаў у Аргенціну, вельмі супярэчлівыя. Найбольш верагоднай з'яўляецца лічба ў 100 тыс. чалавек, прыведзеная А. Калубовічам на падставе падлікаў Аб'яднання беларусаў у Аргенціне.

Згуртаванню суродзічаў у Аргенціне садзейнічалі культурна-асветныя таварыствы "Грамада", "Культура", "Белавежа", Бібліятэка імя І. Луцкевіча. У 1939 г. беларускія суполкі у Аргенціне аб'ядналіся ў Федэрацыю беларускіх арганізацый. Дзейнасць яе вызначалася прасавецкімі настроямі, арыентацыяй на рускую культуру. Многія заходне-беларускія перасяленцы далучыліся да прафесійнага руху і Кампартыі Аргенціны. Прасавецкі, пракамуністычны кірунак асноўнай масы беларускіх арганізацый у Аргенціне прыводзіў да русіфікацыі, зніжэння нацыянальнага зместу іх жыцця і як вынік да заняпаду.

Таццяна Папоўская

Эміграцыя ў гады Другой сусветнай вайны. З пачаткам Другой сусветнай вайны перапыніўся прыток беларускіх эмігрантаў на амерыканскі кантынент і карэнным чынам змяніліся іх колькасць і становішча ў еўрапейскіх дзяржавах. На акупаваных немцамі тэрыторыях аказаліся сталыя беларускія асяродкі з арганізаваным нацыянальным жыццём (у Празе, Парыжы, Варшаве, Лодзі і інш). Захоп Германіяй Польшчы і далучэнне Заходняй Беларусі да БССР выклікалі выезд на захад палітычных дзеячаў, якія не мелі даверу да палітыкі савецкай улады.

У Германію і на акупаваныя ёю тэрыторыі эмігравалі многія беларусы з віленскага і іншых асяродкаў прыбалтыйскіх дзяржаў напярэдадні іх інкарпарацыі ў СССР. 70–80 тысяч беларусаў, што ваявалі ў складзе польскага войска, трапілі ў нямецкі палон, а затым з канца 1939 г. і на працягу 1940 г. атрымалі права ўладкоўвацца вольнымі работнікамі.

Напярэдадні вайны і ў яе пачатку павялічылася зацікаўленасць нямецкіх уладаў да беларускага пытання, рабіліся захады для выкарыстання ў сваіх мэтах рознагалоссяў, асабістых амбіцый, барацьбы за лідэрства сярод беларускіх эмігрантаў, уцягванне іх у сферу ўплыву нямецкай палітыкі. У лістападзе 1939 г. пры Міністэрстве ўнутраных спраў было створана Беларускае прадстаўніцтва, якое займалася беларусамі ў Германіі, а пазней і на акупаваных ёю тэрыторыях. Арганізацыю матэрыяльнай падтрымкі і культурна-асветнай работы ажыццяўлялі грамадскія арганізацыі: Беларускі Камітэт самапомачы, створаны летам 1940 г. у Берліне (меў аддзелы ў Мюнхене, Лейпцыгу, Вене, Празе, Лодзі, Торуні і іншых месцах) і Беларускі камітэт у Генеральнай губерні, дзейнічаў у Варшаве ад студзеня 1940 г. (меў аддзяленні ў Кракаве і Бялай Падлясцы).

Неакрэсленасць пазіцыі кіраўніцтва Германіі ў пачатку вайны адносна статуса Беларусі, пэўная зацікаўленасць беларускім пытаннем спарадзіла разлік часткі лідэраў беларускай эміграцыі на падтрымку іх памкненняў да незалежнасці Беларусі (І. Ермачэнка, М. Шчорс, Р. Астроўскі і інш.). У сувязі з гэтым 19 чэрвеня 1941 г. у Берліне узнік Беларускі нацыянальны цэнтр (старшыня М. Шчорс), які па высновах польскага гісторыка Ю. Туронка, "у спрыяльных умовах збіраўся аб'явіць сябе часовым урадам па ходу заняцця немцамі Беларусі".

Лідэры створанай летам 1940 г. у Варшаве Партыі беларускіх нацыяналістаў (Я. Станкевіч, В. Іваноўскі) наадварот арыентаваліся на заходніх саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі, лічылі, што яны стануць пераможцамі і будуць вырашаць праблемы пасляваеннага ўладкавання Еўропы, а тады можна будзе пытанне незалежнасці Беларусі вывесці на міжнародны ўзровень.

Напад Германіі на СССР, працяглая акупацыя тэрыторыі Беларусі абумовілі масавае, галоўным чынам прымусовае, перамяшчэнне яе насельніцтва. У ліку савецкіх ваеннапалонных за мяжой аказаліся сотні тысяч беларусаў. Шмат іх загінула ад непасільнай працы, холаду, голаду, хвароб у лагерах ваеннапалонных. Нямала жыхароў Беларусі аказаліся вязнямі канцлагераў. Амаль 385 тыс. асоб былі прымусова адпраўлены з акупаванай БССР у Германію як танная працоўная сіла (остарбайтэры). Напрыканцы вайны ў Германіі паявіліся лагеры прымусова вывезеных з акупаваных тэрыторый (і БССР) дзяцей ад 6 да 12 гадоў. На працу ў Германію паехалі каля 5 тыс. юнакоў і дзяўчат Саюза беларускай моладзі. Мелі яны, як і прымусова вывезеныя, нялёгкія ўмовы жыцця і працы, але ў адрозненне ад апошніх праводзілі (хоць і абмежаваную) нацыянальную культурна-асветную працу. У гады вайны ў Германіі выдаваліся газеты "Раніца", "Беларускі работнік", часопісы "Беларускі студэнт", "Малады змагар", была 15-хвілінная перадача на беларускай мове ў Гамбургу.

Ва ўмовах пашырэння вайны палітычнае размежаванне эміграцыі, існаванне двух арыентацый прадаўжалася. У беларускі нацыянальны рух на акупаванай немцамі тэрыторыі, які быў антыбальшавіцкім, улілося некалькі дзесяткаў уплывовых прадстаўнікоў палітычнай эміграцыі, якія занялі лідзіруючыя пазіцыі ў грамадска-палітычных і культурных фарміраваннях, увайшлі ў склад БЦР — дарадчага органа і цэнтральнай установы беларускай адміністрацыі на акупаванай тэрыторыі (І. Ермачэнка, В. Іваноўскі і інш.). Прадстаўнікі ад беларускіх арганізацый з Варшавы, Кракава, Лодзі, Прагі, Берліна, Вены, Кёнігсберга былі ўдзельнікамі 2-га Усебеларускага кангрэса, скліканага са згоды нямецкіх уладаў 27 чэрвеня 1944 г., ён выказаўся за незалежную Беларусь.

Нямецкія ўлады ізалявалі прэзідэнта БНР В. Захарку, які знаходзіўся ў акупаванай Празе і, нягледзячы на захады адпаведных устаноў, адмовіўся выступаць ад імя БНР у падтрымку германскай палітыкі. Перад сваёй смерцю ў 1943 г. ён перадаў паўнамоцтвы М. Абрамчыку, які наведаў беларускія землі, звязаўся з лідэрамі антынямецкай арыентацыі, але быў арыштаваны гестапа і вывезены ў Парыж. Прыхільнікі антыгітлераўскай кааліцыі дзяржаў рабілі захады па ўсталяванні з ёю сувязей (В. Іваноўскі і інш.). Паспяховае наступленне савецкіх войскаў выклікала значную эмігранцкую хвалю з Беларусі тых, хто баяўся вяртання сталінскага рэжыму. Але большасць уцякаўшых была завернута ў СССР пры хуткім прасоўванні Чырвонай Арміі на захад. Тым не менш за мяжу выехалі дзесяткі тысяч беларусаў, у тым ліку арганізацыі, установы, вайсковыя фарміраванні, створаныя на акупаванай тэрыторыі (БЦР, Галоўны штаб Саюза беларускай моладзі, Сабор епіскапаў Беларускай праваслаўнай царквы, атрады Беларускай краёвай абароны і дапаможнай паліцыі), інтэлігенцыя, якая працавала ў гады вайны ў цывільнай адміністрацыі, адукацыйнай сістэме, культурна-асветных арганізацыях. Гэтая плынь была ў асноўным палітычнай — антыбальшавіцкай, апазіцыйнай савецкай уладзе.

БЦР, якая выехала ў Кёнігсберг, а затым Берлін, зрабіла захады па афармленні сябе ўрадам у выгнанні. Каб зацвердзіць сябе як "законнае беларускае палітычнае прадстаўніцтва за межамі Бацькаўшчыны", БЦР прыняла ў студзені 1945 г. новы статут і канстытуцыю. Былі наладжаны сувязі з Міністэрствам усходніх абшараў, у складзе якога быў беларускі аддзел (і прадстаўнік БЦР), а таксама з беларускім аддзелам нямецкай арганізацыі "Працоўны фронт". Пры гэтым, напярэдадні бачнага ўжо паражэння Германіі дзеячы БЦР праводзілі палітыку лавіравання, пэўнага процідзеяння нямецкім уладам (зацягванне фарміравання вайсковых адзінак, адказ далучыцца да Камітэта вызвалення народаў Расіі), рабілі спробы наладзіць кантакты з заходнімі саюзнікамі па антыгітлераўскай кааліцыі, каб стварыць умовы для далейшай дзейнасці эміграцыі пасля вайны. Менавіта з улікам гэтага быў створаны ўрад, які ва ўмовах гітлераўскай Германіі павінен быў выступаць як калегія БЦР, а пасля яе разгрому — як кабінет Міністраў БНР. Большасць членаў БЦР у канцы вайны трапіла ў зоны акупацыі ЗША і Вялікабрытаніі.

Няпростым быў лёс беларускіх вайсковых фарміраванняў, якія пры адступленні немцаў былі ўключаны ў германскае войска. Батальёны Беларускай краёвай абароны (да 16 тыс. чалавек) на захадзе Польшчы былі далучаны да Рускай дывізіі СС і адпраўлены на заходні фронт. Нямала гэтых беларусаў, якія аказаліся летам 1944 г. на тэрыторыі Францыі, дэзерціравалі, далучыліся да мясцовых партызан, а адзін батальён перайшоў у Швейцарыю. Восенню 1944 г. большасць іх уступіла ў войска Андэрса і змагалася супраць Германіі. Значная частка беларусаў з дывізіі Зіглінга ў раёне Вагезаў (Францыя) здаліся ў палон англа-амерыканскім саюзнікам восенню 1944 г. Рэшткі дывізіі, у тым ліку некалькі тысяч беларусаў, былі накіраваны ў Рускую вызваленчую армію (РВА) пад камандаваннем Уласава. Сотні з іх прымалі ўдзел у вызваленні Прагі ад немцаў. Каля 3 тыс. беларусаў, якія адмовіліся служыць у РВА ці дывізіі Зіглінга былі раззброены і накіраваны ў працоўныя брыгады. Сотні беларусаў-остарбайтэраў, уцекачоў з лагераў ваеннапалонных, працоўных каманд, канцлагераў вялі антыфашысцкую барацьбу на тэрыторыі акупіраваных еўрапейскіх дзяржаў. Сярод арганізатараў антыфашысцкага змагання ў канцлагерах Германіі былі ўраджэнцы Беларусі Л. Маневіч, Д. Цумараў, П. Шаўраў, І. Мураўёў, В. Грынь. У французскім руху супраціўлення ўдзельнічалі ўраджэнцы Беларусі Ф. Варанішча, Т. Чахоўская, В. Барбук, У. і С. Ліхота-Кісель, Ф. Кажамякін, Н. Лісавец, К. Хазановіч, К. Тарасевіч, М. Косікаў, В. Меткаў, В. Сямёнава, М. Андрыеўская, Л. Кашычкіна, А. Кандраценка. У партызанскіх атрадах змагаліся А. Варанкоў (Бельгія), В. Квіцінскі, У. Анічэнка, У. Харытончык, Б. Калач, П. Зуйкевіч, А. Грынеўскі (Чэхаславакія), С. Фралоў (Італія), В. Аляксашкін (Грэцыя). Узброенае змаганне супраць акупантаў жыхары Беларусі вялі ў складзе часцей нацыянальна-вызваленчай арміі Югаславіі.

У гады Другой сусветнай вайны паглыбілася размежаванне беларускай эміграцыі на амерыканскім кантыненце. Прасавецкая арыентацыя ўзмацнілася сярод дарэвалюцыйных і міжваенных перасяленцаў, асабліва ў Аргенціне.

На хвалі антыфашысцкага ўздыму пачалі ствараццa камітэты ў падтрымку СССР. Беларускі дэмакратычны камітэт дапамогі Радзіме меў 36 падкамітэтаў у Аргенціне, Парагваі, Бразіліі, Уругваі. Створаны ў Маскве Славянскі камітэт ініцыраваў паяўленне на амерыканскім кантыненце падобных камітэтаў. Шмат выхадцаў з Беларусі ўключыліся ў агульнаславянскія акцыі маральнай і матэрыяльнай падтрымкі антыгітлераўскай кааліцыі.

Актывізавалася дзейнасць нацыянальных таварыстваў і паявіліся новыя: "Мінск", імя Ф. Скарыны, імя Я. Купалы (Аргенціна), Беларуска-амерыканская нацыянальная рада (ЗША), Федэрацыя рускіх канадцаў, большасць якіх склалі выхадцы з Заходняй Беларусі.

Аднак перавага ў кіраўніцтве славянскім рухам рускіх лідэраў, найчасцей пракамуністычнай, прасавецкай арыентацыі вяла да звужэння нацыянальна-культурнай дзейнасці, русіфікацыі, непрымання гэтай пазіцыі асобнымі таварыствамі. Нацыянальнымі па характару дзейнасці былі нешматлікія беларускія арганізацыі. Так, Беларуска-амерыканская нацыянальная рада святкавала 25 сакавіка як Дзень незалежнасці Беларусі, даводзіла да грамадскасці ідэю яе суверэннасці.

Нямала беларускіх эмігрантаў змагалася на франтах Другой сусветнай вайны ў войсках дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі. Улады Францыі ў 1939 г. упершыню прызвалі ў армію эмігрантаў і больш 6 тыс. беларусаў былі мабілізаваны. У баях з германскімі войскамі праявілі мужнасць сотні амерыканскіх беларусаў. Па падліках беларускага эмігранта В. Сянкевіча ў брытанскім войску служыла не менш 30 тыс. беларусаў, з іх больш за 1700 загінулі на заходніх франтах, у тым ліку ў вядомай бітве пры Монтэ-Касіна (Італія).

Яшчэ ў ходзе вайны ў адпаведнасці з рашэннем СНК СССР (кастрычнік 1944 г.) пачалася абавязковая рэпатрыяцыя савецкіх грамадзян, якая не пакідала ім выбару, пазбаўляла магчымасці застацца ў эміграцыі. Але заходнія саюзнікі па антыгітлераўскай кааліцыі не адносілі да падлягаючых рэпатрыяцыі тых асоб, якія да пачатку Другой сусветнай вайны пражывалі ў Польшчы (г. зн. у Заходняй Беларусі), прыбалтыйскіх дзяржавах. Карыстаючыся гэтым, многія беларусы, змяніўшы нацыянальнасць, пазбеглі прымусовай рэпатрыяцыі.

Галіна Сяргеева

II. Арганізацыі, установы, падзеі

Аб'яднанне студэнтаў-беларусаў Літоўскага універсітэта імя Вітаўта Вялікага ў Каўнасе

Нацыянальная грамадская арганізацыя ў Літве. Створана ў лютым 1933 г. Налічвала 15 чал. У праўленне аб'яднання ўваходзілі А. Вус, А. Зэйгліш, Л. Раманейка, Д. Рудзь, Г. Чаркас. Мэты аб'яднання — задавальненне патрэб акадэмічнага жыцця, а таксама навуковых, культурных і эканамічных інтарэсаў сваіх сяброў. Аб'яднанне супрацоўнічала з *Беларускім культурна-асветным таварыствам у Каўнасе*, спрыяла вывучэнню праблем беларусазнаўства студэнтамі-беларусамі ў Літве, арганізоўвала навуковыя чытанні, дыспуты, вечарыны для збліжэння са студэнтамі-літоўцамі. У ліпені 1933 г. разам з іншымі беларускімі арганізацыямі Літвы аб'яднанне выступіла з прапановай аб стварэнні Міжнароднай асацыяцыі беларускіх арганізацый — вышэйшага органа для ўсіх нацыянальных арганізацый у Беларусі і за яе межамі. У 1936 г. спыніла сваю дзейнасць з-за фінансавых і арганізацыйных цяжкасцей.

Аляксандр Ціхаміраў

"Агніца"

"Агніца", культурна-асветніцкае таварыства беларусаў у Палтаве, створана ў 1992 г. па ініцыятыве цяперашняга кіраўніка таварыства Іны Снарскай, выкладчыка Палтаўскага кааператыўнага інстытута Паўла Шуканава і Алега Плюшча. Асноўныя мэты дзейнасці "Агніцы" — вывучэнне, захаванне і прапаганда гісторыі, звычаяў, традыцый, мовы, культурнай спадчыны беларускага народа, знаёмства з сучаснымі палітычнымі і грамадскімі падзеямі ў Беларусі, абмеркаванне апошніх навін у галіне літаратуры, культуры і асветы. Таварыства праводзіць вечарыны, на якіх гучаць творы беларускіх паэтаў, ладзіць сустрэчы з вядомымі беларускімі дзеячамі, канцэрты, выставы.

Значны ўклад у развіццё беларускай культуры і яе прапаганду на Палтаўшчыне ўносіць кіраўнік таварыства Іна Снарская. Яе вершы і артыкулы, прысвечаныя пытанням адукацыі, мовы, літаратуры, гісторыі Беларусі, напісаныя па-беларуску, рэгулярна друкуюцца на старонках перыядычных выданняў. Выступаючы ў украінскім друку, па радыё, Іна Снарская закранае вострыя праблемы сучаснасці.

"Агніца" прымае актыўны ўдзел у культурна-грамадскім жыцці Палтаўшчыны. Таварыства ўдзельнічала у рабоце I і II з'ездаў беларусаў свету. Іна Снарская і Павел Шуканаў выбраны ў Вялікую раду Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына".

Ірына Тамільчык

Асацыяцыя беларускіх студэнтаў ВНУ

Асацыяцыя беларускіх студэнтаў ВНУ у Петраградзе, грамадская культурна-асветная арганізацыя 1923—1925 (?) гг. Заснавана 25 сакавіка 1923 г. на гарадской нарадзе студэнтаў-беларусаў ВНУ Петраграда па ініцыятыве Беларускай асацыяцыі пры Петраградскім сельскагаспадарчым інстытуце. Асноўныя мэты: арганізацыя беларускага студэнцтва ў Петраградзе для вывучэння гісторыі, эканомікі, культуры і рэвалюцыйнага руху Беларусі. Кіруючы орган — управа. Культурна-асветныя мерапрыемствы адбываліся ў памяшканні студэнцкага клуба Петраградскага сельскагаспадарчага інстытута. 1 красавіка 1923 г. адбылася сустрэча сяброў асацыяцыі з дзеячамі беларускага рэвалюцыйнага руху Я. Канчарам і З. Жылуновічам (апошні меў значны ідэйны ўплыў на актыў асацыяцыі). Падтрымлівала сувязі з беларускім вучоным А. Сержпутоўскім. Сярод актывістаў — студэнты Казловіч, Краскоўскі, Рамановіч і інш. Асацыяцыя рэарганізавана ў Беларускае студэнцкае зямляцтва ў Ленінградзе.

Юры Васілеўскі

Асацыяцыя "Святло Радзімы"

Дзеля пашырэння дапамогі беларусам замежжа ў развіцці нацыянальна-культурнай дзейнасці па ініцыятыве беларусаў Латвіі і Эстоніі ў 1999 г. была створана міжнародная грамадская арганізацыя "Асацыяцыя "Святло Радзімы". Асноўная яе мэта — захаванне традыцыйнай духоўнай і матэрыяльнай культуры ў замежжы, садзейнічанне стварэнню беларускіх інфармацыйна-культурных цэнтраў, развіццю гандлёва-эканамічных сувязей, стварэнню гандлёвых дамоў у іншых краінах. Старшынёй праўлення Асацыяцыі абраны Аляксандр Білык, старшыня Дзяржаўнага камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь, член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі па вывучэнню нацыянальных меншасцей.

Праўленнем асацыяцыі, куды ўваходзяць дасведчаныя спецыялісты па праблемах беларускай дыяспары, а таксама вопытныя юрысты і эканамісты, распрацаваны асноўныя праграмы яе дзейнасц:

"Спадчына". У рамках праграмы будуць ажыццяўляцца сумесныя праекты з беларускай дыяспарай па захаванні традыцыйнай беларускай культуры, духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей беларусаў у іншых краінах свету, аказанні дапамогі нацыянальна-культурным аб'яднанням Рэспублікі Беларусь, аднаўленні помнікаў архітэктуры, культавых збудаванняў у Беларусі, рэстытуцыі культурных каштоўнасцей, а таксама арганізацыя і правядзенне канферэнцый, семінараў, фестываляў, выставак і іншых мерапрыемстваў.

"Ад родных ніў". Праграма ставіць сваёй мэтай распаўсюджанне інфармацыі пра Беларусь, азнаямленне з яе сучасным жыццём, распрацоўку турыстычных маршрутаў для азнаямлення з Радзімай, развіццё сувязей прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей рэспублікі з краінамі свайго гістарычнага паходжання.

"Дзелавое супрацоўніцтва". Мэта праграмы заключаецца ў інфармацыйнай падтрымцы бізнесу выхадцаў з Беларусі, якія пражываюць за яе межамі, аказанні канкрэтных паслуг прадпрымальнікам па эфектыўнаму вядзенню бізнесу ў Беларусі, абмену ідэямі паміж удзельнікамі інфармацыйнай сеткі, садзейнічанні атрыманню кансультацый і падтрымкі з боку дзяржаўных устаноў і прадпрымальніцкіх структур, стварэнні сумесных прадпрыемстваў і гандлёвых дамоў.

"Дзеці". Праграма накіравана на спрыянне арганізацыі аздараўлення дзяцей з Беларусі ў іншых краінах, адпачынку дзяцей беларусаў з-за мяжы ў Беларусі.

"Адукацыя". Праграма ставіць сваёй мэтай падтрымку беларускамоўнай адукацыі, школ і факультатываў у замежжы, садзейнічанне стварэнню ўмоў для вывучэння родных моваў, гісторыі, культуры для прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей у Беларусі.

"Памяць". Арганізацыя дагляду за месцамі пахавання родных і блізкіх па даручэннях замежных суайчыннікаў. Дапамога ў складанні радаводаў.

Ніна Петухова

Асветнае таварыства беларусаў

Асветнае таварыства беларусаў (АТБ) у Варшаве існавала з восені 1936 г. да верасня 1939 г. Да афіцыйнай рэгістрацыі 23 снежня 1937 г. дзейнічала пад назвай Арганізацыйны камітэт беларускага таварыства ў Варшаве. Аб'ядноўвала прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі, работнікаў, студэнтаў варшаўскіх ВНУ (каля 1 тыс. чал.). У праўленне АТБ уваходзілі Я. Гапановіч (старшыня), П. Ластаўка (сакратар). Таварыства мела на мэце правядзенне культурна-асветнай і выдавецкай дзейнасці, арганізацыю бібліятэк, клубаў, аказанне матэрыяльнай дапамогі і маральнай падтрымкі сябрам АТБ, беларусам, якія жылі ў Варшаве, і інш. АТБ арганізавала і правяло вечарыну-канцэрт для беларускага грамадства ў зале Варшаўскага музычнага таварыства (6.2.1937, прысутнічала 400 чал.), канцэрт беларускага спевака М. Забэйды-Суміцкага ў Варшаўскай кансерваторыі (24.5.1938), даклад па беларускай літаратуры і літаратурную вечарыну М. Танка (3.7.1939), сустрэчы з дзеячамі беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі А. Клімовічам, С. Паўловічам, М. Танкам і інш. Пры АТБ працавалі курсы беларускай мовы, гурткі мастацкай самадзейнасці. У 1937—1938 гг. пры таварыстве існавалі нелегальныя групы КПЗБ і КСМЗБ. З АТБ цесна супрацоўнічалі калекцыянер і гісторык беларускай літаратуры Р. Зямкевіч, беларускі паэт Г. Леўчык. Сярод актывістаў таварыства адвакат А. Бычкоўскі, прафесар Варшаўскай кансерваторыі С. Казура, дзеяч беларускага руху Б. Руткоўскі, кампазітар А. Шыдлоўскі, М. Забэйда-Суміцкі, Л. Панько, В. Чарняўская і інш. Дзейнасць АТБ была спынена ў першыя дні нападу фашысцкіх войскаў на Польшчу.

Юры Васілеўскі

"Бацькаўшчына"

Культурна-асветнае таварыства беларускай нацыянальнай меншасці ў Латвіі. Створана ў Дзвінску (Даўгаўпілс) 25 сакавіка 1921 г. групай інтэлігенцыі на чале з настаўнікам Я. Харлапам. Сябры таварыства аб'ядноўвалі беларускае насельніцтва Латгальскага краю, развівалі яго сацыяльную і нацыянальную свядомасць, пашыралі асвету, беларускі друк, інфармавалі латышскую грамадскасць і ўрад пра становішча беларускай меншасці, яе культурна-асветныя патрэбы. У розны час дзейнасці таварыства спрыялі М. Гарэцкі, І. Дварчанін, К. Езавітаў (адзін з кіраўнікоў Цэнтральнага праўлення), У. Жылка, І. Краскоўскі, П. Мядзёлка, У. Пігулеўскі, С. Сахараў, А. Якубецкі і інш., а таксама прадстаўнікі латышскай інтэлігенцыі, сярод якіх — Б. Брэжга, Я. Райніс. Дзякуючы падтрымцы Райніса пры Міністэрстве асветы Латвіі ў 1921 г. быў створаны Беларускі аддзел для кіраўніцтва навучальнымі ўстановамі (кіраўнікі Сахараў, Пігулеўскі), у Дзвінскім і Люцынскім паветах адкрыта каля 60 беларускіх школ, заснаваны Дзвінская і Люцынская гімназіі, настаўніцкія курсы, сельскагаспадарчая школа. Паводле сфабрыкаваных паліцыяй Латвіі матэрыялаў супраць сяброў "Бацькаўшчыны" (са слоў Райніса — па ініцыятыве не латышскіх, а іншаземных колаў) былі арыштаваны Езавітаў, Мядзёлка, Пігулеўскі, Краскоўскі, Якубецкі і інш. У красавіку 1925 г. суд апраўдаў усіх абвінавачаных, але беларускаму руху былі нанесены непапраўныя страты.

Сяргей Панізьнік

"Беларус"

Рабочы клуб, які дзейнічаў у Маскве ў 1919 г. Адкрыты 23 лютага 1919 г. культурна-асветным аддзелам Беларускага нацыянальнага камісарыята і Маскоўскай беларускай секцыяй РКП(б) для правядзення палітычнай і культурна-асветнай работы сярод беларусаў, падрыхтоўкі кадраў для работы ў Беларусі. У арганізацыі і дзейнасці клуба ўдзельнічалі А. Бурбіс, А. Грыневіч, Я. Дыла, П. Каравайчык, І. Мазур, Ф. Турук, Я. Хлябцэвіч і інш. Меў бібліятэку з чытальняй. У снежні пераўтвораны ў літоўска-беларускі клуб, які дзейнічаў у 1920 г.

Віталь Скалабан

Беларуска-ўкраінскі камітэт помачы ахвярам вайны (Беларуская грамада) у Барнауле

Нацыянальная грамадская арганізацыя. Створана ў пачатку 1918 г. для дапамогі бежанцам Першай сусветнай вайны. Асноўнымі задачамі арганізацыі былі абарона матэрыяльных і юрыдычных інтарэсаў беларускіх і ўкраінскіх бежанцаў, культурна-асветная работа сярод іх. Старшыня — М. Бліадуха. Супрацоўнікі камітэта падтрымлівалі кантакты з прадстаўнікамі камітэтаў дапамогі бежанцам іншых нацыянальнасцей. У 1918 г. камітэт уваходзіў у Міжнародны камітэт бежанцаў у Сібіры (размяшчаўся ў Барнауле). Дзейнічаў у складаных умовах Грамадзянскай вайны, таму быў вымушаны неаднаразова прыпыняць аказанне дапамогі бежанцам. У канцы 1920 г. дзейнасць камітэта была спынена канчаткова.

Юры Васілеўскі, Аляксандр Ціхаміраў

Беларуска-эстонскае згуртаванне БЭЗ

Грамадска-культурная арганізацыя беларусаў у г. Йыхві. Створана на аснове Згуртавання беларусаў Кохтла-Ярве, якое існавала да 1991 г. БЭЗ афіцыйна зарэгістравана 21 мая 1991 г. Старшыні — Уладзімір Дзехцярук, Маргарыта Астраумава. Мэта згуртавання — спрыяць кансалідацыі беларусаў на падставе духоўнай, культурнай, рэлігійнай агульнасці; развіццё сувязей з суайчыннікамі за мяжой; азнаямленне эстонцаў з гістарычнай і культурнай спадчынай Беларусі; наладжванне ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з гаспадарчымі структурамі Беларусі.

Згуртаваннем праводзіцца значная культурна-асветна работа — адзначаюцца нацыянальныя беларускія і эстонскія святы, гадавіны значных гістарычных падзей, угодкі выдатных дзеячаў культуры; праводзяцца Дні беларускай культуры, вечарыны, віктарыны, канцэрты, сустрэчы, знаёмствы з мастацкімі калектывамі "Васілёк" (ЗША), "Юнацтва", "Скарыначка" (Беларусь); удзел ў выстаўках творчага аб'яднання беларусаў-мастакоў Балтыі "Маю гонар" (з 1992 г.) і выстаўцы мастакоў у Саўт-Рыверы (1993, ЗША); арганізуюцца краязнаўчыя вандроўкі па Беларусі, Эстоніі, Расіі. Дзеці эстонскіх беларусаў удзельнічалі ў конкурсе дзіцячага малюнка ў Саўт-Рыверы (1994 г.). З 1994 г. наладжаны творчыя сувязі з аб'яднаннем "МЭЯ" (Мастацтва. Экалогія і Я. Гомель). У рамках праграмы па прапагандзе беларускай культуры ў Эстоніі наладжаны 4 выставы гомельскіх мастакоў.

У 1995 г. БЭЗ арганізавала прэзентацыю зборніка вершаў і апавяданняў У. Дзехцерука "Сярод белых эстонскіх начэй". З мая 1992 г. на хвалях Эстонскага радыё існуе беларуская праграма. Пры згуртаванні закладзена бібліятэка.

Беларуска-эстонскае згуртаванне прымала ўдзел у стварэнні Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына" (1990), падтрымлівае сталыя сувязі з Беларускім таварыствам "Радзіма", беларускімі арганізацыямі замежжа. Сябры згуртавання прынялі ўдзел у рабоце Першага і Другога з'ездаў беларусаў свету (1993, 1997), сходзе беларусаў блізкага замежжа (1992), з'езда беларусаў краін Балтыі (1994), І сустрэчы беларускай моладзі свету (1994).

Анфіса Ляднёва

Беларускае аб'яднанне студэнтаў

Беларускае аб'яднанне студэнтаў (БАС) заснавана ў 1981 г. у Варшаве студэнтамі-беларусамі вышэйшых навучальных устаноў. Да канца 1981 г. налічвала каля 500 прыхільнікаў у Варшаве і Беластоку. Галоўныя мэты арганізацыі: інтэграцыя студэнцкай моладзі беларускай нацыянальнасці ў грамадства Польшчы, папулярызацыя беларускай культуры, вывучэнне ўласнай гісторыі і традыцый, захаванне помнікаў беларускай гісторыі і матэрыяльнай культуры, выдавецкая і турыстычная дзейнасць, арганізацыя сустрэч, конкурсаў і іншых мерапрыемстваў. У канцы мая 1981 г. Міністэрства навукі, вышэйшай адукацыі і тэхнікі адмовіла БАС у афіцыйнай рэгістрацыі. Пасля ўвядзення 13 снежня 1981 г. у Польшчы ваеннага становішча дзейнасць арганізацыі была спынена. З 1982 г. працавала нелегальна. У лістападзе і снежні 1981 г. выданы тры нумары бюлетэня "Апошнія паведамленні БАС". № 1 і 2 былі распаўсюджаны ў студэнцкіх асяродках Варшавы і Беластока, № 3 быў канфіскаваны ўладамі.

У 1981 г. па ініцыятыве БАС адбыўся першы беларускі студэнцкі рэйд-вандроўка "Залатая восень", які паклаў пачатак пешым рэйдам беларускай моладзі на Беласточыне з мэтай вывучэння роднага краю. У 1981 г. таксама ўпершыню былі праведзены "Атрасіны" для студэнтаў-беларусаў першага курса, якія праводзяцца да нашых дзён

у Варшаве і Беластоку. З 1982 г. беларускія студэнты праводзілі сваю дзейнасць у рамках Рады культуры студэнтаў беларускай нацыянальнасці, якая існавала пры Цэнтральнай радзе культуры згуртавання польскіх студэнтаў у Варшаве. У 1983–1990 гг. гэтая Рада выдавала часопіс "Сустрэчы" — другі пасля тыднёвіка "Ніва" афіцыйны беларускі часопіс у Польшчы пасля Другой сусветнай вайны (выйшла 13 нумараў). У 1986–1991 гг. у "Ніве" друкавалася старонка беларускіх студэнтаў "Прысутнасць", якая з'яўлялася раз у месяц і была прысвечана актуальным праблемам жыцця і дзейнасці студэнтаў-беларусаў у Польшчы. У сярэдзіне 1980-х гг. дасягнула росквіту турыстычная дзейнасць беларускіх студэнтаў у Польшчы, праводзіліся пешыя рэйды-вандроўкі беларускай моладзі па Беласточчыне ("Падарожжа" і інш.). З 1984 г. штогод праводзіцца самы маштабны рэйд — "Бацькаўшчына", шлях якога праходзіць праз вёскі і мястэчкі амаль усёй Беласточчыны. Беларускія студэнты ў 1983–1990 гг. выдалі 3 зборнікі беларускіх песень, сярод якіх "Слоўнік беларускага студэнта" (1983), "Чараўніца" (1989), а таксама многа адозваў, дэкларацый, паштовак, газет-аднадзёнак, рэйдавых маршрутных газет і інш. У сакавіку 1987 г. у Бельску-Падляшскім адбыўся з'езд беларускіх студэнтаў, які арганізавала Рада культуры студэнтаў беларускай нацыянальнасці. Ён прыняў пастанову аб стварэнні самастойнай беларускай студэнцкай арганізацыі ў Польшчы, абмеркаваў пытанні аховы духоўных і матэрыяльных помнікаў беларускай культуры на Беласточчыне. 26 сакавіка 1988 г. быў утвораны арганізацыйны камітэт БАС. 29 лістапада 1988 г. аб'яднанне афіцыйна зарэгістравана польскімі дзяржаўнымі ўладамі і стала другой пасля Беларускага грамадска-культурнага таварыства беларускай арганізацыяй у Польскай дзяржаве пасля Другой сусветнай вайны. Першы з'езд БАС адбыўся ў Беластоку 17 снежня 1988 г. На ім быў прыняты статут арганізацыі, вызначаны яе кіруючыя органы — Усеагульны сход і Галоўная рада. Галоўная рада знаходзілася ў Варшаве, а з 1991 г. — у Беластоку. З 1988 г. арганізацыю ўзначальвалі Я. Вапа, У. Пац, Б. Кучынская. У 1989 г. апублікаваны 3 нумары "Апошніх паведамленняў БАС" — бюлетэня Галоўнай рады, які адлюстроўваў дзейнасць аб'яднання, змяшчаў матэрыялы, прысвечаныя пытанням беларускай гісторыі і культуры ў Польшчы. Мясцовымі арганізацыямі БАС з'яўляюцца гуртк, якія дзейнічаюць у вышэйшых навучальных установах Беластока, Варшавы, Гданьска, Любліна, Ольштына, гурток студэнтаў-беларусаў з Польшчы працуе ў ЗША. Беларускае аб'яднанне студэнтаў з'яўляецца ініцыятарам шматлікіх грамадска-культурных мерапрыемстваў, у тым ліку фестывалю музыкі беларускай моладзі "Басовішча", які праводзіцца штогод, (з 1990 г.) і ў якім прымаюць удзел маладзёжныя музычныя калектывы з Беласточчыны і Беларусі, святкавання Купалля, дня абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі (з 1985), конкурсаў сярод вучняў беларускіх ліцэяў на лепшае веданне беларускай мовы і літаратуры. З 1991 г. БАС з'яўляецца членам-заснавальнікам Рады беларускіх арганізацый у Польшчы, яно ўдзельнічала ў стварэнні Беларускага дэмакратычнага аб'яднання, Беларускага гістарычнага таварыства і некаторых інш. грамадска-палітычных і культурна-асветных арганізацый беларусаў у Польшчы. У 1995 г. клопатамі Беларускага гістарычнага таварыства ў Беластоку пабачыла свет кніга актыўных дзеячаў БАС С. Іванюка і Я. Вапы "Беларускі студэнцкі рух у Польшчы ў 1981–1992 гг.", прысвечаная гісторыі стварэння і дзейнасці арганізацыі. У 1994 г. надрукавана кніга В. Харужага "Беларускі пазацэнзурны друк у Польшчы 1981–1990 гг.", значная частка матэрыялаў якой таксама прысвечана пытанням гісторыі БАС.

Ларыса Языковіч

Беларускае вольна-эканамічнае таварыства ў Петраградзе

Існавала з кастрычніка 1918 да 1920 г. Створана пры садзейнічанні Петраградскага аддзялення Беларускага нацыянальнага камісарыята і беларускай секцыі РКП(б). Мела мэтай спрыяць развіццю навукі, культуры і народнай гаспадаркі Беларусі. Пасяджэнні арганізацыйнага бюро па стварэнні таварыства адбыліся 14 чэрвеня і 14 ліпеня 1918 г. Былі распрацаваны статут таварыства (за аснову прынялі статут Беларускага навукова-культурнага таварыства ў Маскве з дапаўненнем задач эканамічнага характару) і зварот "Да вывучэння Беларусі" за подпісамі М. Аўсянага, Я. Канчара і А. Вазілы. Першае ўрачыстае пасяджэнне таварыства адбылося 13 кастрычніка 1918 г., прысутнічала 27 чал. Былі заслуханы даклады "Задачы і мэты таварыства" (Р. Каўшыла), "Аб прафесіянальнай адукацыі ў краі" (Аўсяны), "Да пытання пра стварэнне ўпраўлення меліярацыйных і агракультурных работ на Беларусі" (Я. Канчар), "Пра стан народнай гаспадаркі на Беларусі" (А. Вазіла), "Пра сучасны стан школы на Беларусі" (Дз. Сабалеўскі). У праўленне таварыства ўвайшлі акадэмік Я. Карскі, прафесар П. Жуковіч (ганаровыя сябры), Я. Канчар (старшыня праўлення), М. Аўсяны, А. Вазіла, П. Міклашэўскі, М. Сабалеўскі, Дз. Сабалеўскі, П. Бывалькевіч (члены праўлення), А. Сержпутоўскі, Ф. Баліцкі, У. Півавараў, І. Пятровіч (Я. Нёманскі), П. Савініч, І. Хвядчэня, З. Баранчык. Паводле сведчання Сержпутоўскага, у рабоце таварыства прымалі таксама ўдзел акадэмікі С. Альдэнбург і А. Шахматаў. 22 лістапада 1918 г. праўленне абмеркавала пытанні пра выданне навуковага часопіса "Белоруссия", зборніка беларускіх прыказак Сержпутоўскага, стварэнне ў Петраградзе Беларускага пачатковага політэхнікума, арганізацыю ўпраўлення меліярацыйных і агракультурных работ, стварэнне бібліятэкі. Звесткі пра дзейнасць таварыства ў 1919–1920 гг. фрагментарныя. У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі захоўваюцца кнігі з пячаткай бібліятэкі таварыства.

Віталь Скалабан

"Беларускае выдавецкае таварыства" ў Латвіі

Існавала ў Рызе ў 1926–1934 гг. Мела на мэце пашырэнне асветы і нацыяльнай самасвядомасці сярод беларусаў Латвіі. Асаблівую ўвагу ўдзяляла выпуску літаратуры па палітычных і адукацыйных праблемах, гісторыі Беларусі (кнігі і брашуры "Беларусы ў Латвіі", "Беларусы ў Літве", "Беларусь у мінулым і сучасным" К. Езавітава, "Вялікае апрашчэнне ці вялікае ўдасканаленне?" А. Галынца). Тыражом 500 экз. выдала зборнік вершаў маладых беларускіх паэтаў у Латвіі "Першы крок", куды ўвайшлі вершы В. Ашурка, А. Баркоўскага, А. Бартуля, Э. Вайвадзіша, В. Вальтара, Я. Ванага, Я. Воркуля, Кастусёнка (К. Езавітава), В. Казлоўскай, В. Сахаравай. Убачылі свет таксама апавяданні "Леснікова сена" В. Вальтара, "Франкеец Кілон" А. Упіта (у перакладзе з латышскай мовы), брашуры "Пяцігоддзе Дзвінскай беларускай дзяржаўнай гімназіі" С. Сахарава, "Юбілейны нарыс дзейнасці Таварыства "Бацькаўшчына" К. Езавітава, "Дзесяцігоддзе 1-ай Рыжскай беларускай асноўнай школы" С. Сіцько. Выпускала педагагічную літаратуру ("Як вучыць дзяцей у новай школе?" А. Луцкевіча), падручнікі на беларускай мове і ў перакладзе з латышскай, у тым ліку "Беларуская школа: Першая пасля лемантара кніга для чытання" (1926), "Наша крыніца: Чытанне для беларускіх школ у Латвіі" (1927) і інш., "Беларусь у мінулым і сучасным: Канспэкт пазашкольнаму працаўніку для лекцыяў з чароўным ліхтаром" К. Езавітава (1929), "Праграмы беларускай пачатковай школы ў Латвіі 1925–1926 гг.". Выйшлі "Папулярныя нарысы па тэорыі кааперацыі" К. Пажыткова, беларускія кнігі-календары С. Сахарава. Выдавала часопіс "Беларуская школа ў Латвіі". Выпусціла каля 20 нумароў. Закрыта ў сувязі з устанаўленнем у Латвіі аўтакратычнага праўлення К. Ульманіса.

Сяргей Панізьнік

Беларускае гістарычнае таварыства = *Białoruskie Towarzystwo Historyczne*

Навуковая арганізацыя беларускіх гісторыкаў у Польшчы. Створана ў 1993 г. у Беластоку. У сваёй дзейнасці кіруецца Статутам (прыняты ў 1993 г.). Старшынёй БГТ у 1993–1996 гг. быў А. Мірановіч, затым — А. Латышонак. Друкаваны орган — часопіс "Беларускія гістарычныя сшыткі" ("Bialoruskie Zeszyty Historyczne", з 1994 г.). Таварыства налічвае каля 20 сябраў (А. Латышонак, А. Мірановіч, Я. Мірановіч, А. Глагоўская, Г. Сасна, Д. Фёнік, С. Іванюк, Я. Вапа, Ю. Каліна, К. Гамулка і інш.). Мэта арганізацыі — спрыяць развіццю навуковай і культурна-асветнай дзейнасці беларускага грамадства ў Польшчы, вывучэнню гісторыі Беларусі і беларусаў у Польшчы, распаўсюджванню гістарычных ведаў, захаванню беларускіх народных традыцый. Важны накірунак дзейнасці таварыства — прапаганда міжнацыянальнай і рэлігійнай талерантнасці, мацаванне добрых узаемаадносін паміж беларусамі і палякамі, а таксама іншымі нацыянальнасцямі і этнічнымі супольнасцямі Польшчы. Статутныя мэты арганізацыя рэалізуе праз навуковую, публіцыстычную, выдавецкую, выхаваўчую дзейнасць. Спрыяе арганізацыі і правядзенню канферэнцый, сімпозіумаў, семінараў па праблемах беларусазнаўства, пытаннях гісторыі Беларусі і беларускай нацыянальнай супольнасці ў Польшчы. Пры фінансавай дапамозе Міністэрства культуры і мастацтва Польшчы, органаў мясцовага самакіравання Беластока і Беласточчыны, некаторых навуковых фондаў таварыства выдала ў Беластоку шэраг навуковых манаграфій, у ліку якіх праца Г. Сасны і Д. Фёніка "Дзейнасць царквы ў Бельску-Падляшскім" (1995), В. Харужага "Беларускі пазацэнзурны друк у Польшчы ў 1981–1990 гг." (1994), А. Латышонка "Беларускія вайсковыя фармаванні 1917–1923" (1995), "Беларускі студэнцкі рух у Польшчы 1981–1992: Выбраныя дакументы" (1996), зборнік дакументаў "Беларусы і польска-беларускія адносіны на Беласточчыне 1944-1956" (1996) і інш.

Ларыса Языковіч

Беларускае грамадска-культурнае таварыства (БГКТ)

Культурная і грамадская арганізацыя беларусаў Беласточчыны. Аб'ядноўвае людзей, зацікаўленых пытаннямі развіцця беларускай культуры. Заснавана ў 1956, прадстаўляе інтарэсы беларускамоўных жыхароў Польшчы. Да 1988 была адзінай установай з падобнай мэтай у Польшчы. Сядзіба галоўнага праўлення БГКТ знаходзіцца ў Беластоку. Пры Беларускім грамадска-культурным таварыстве існуюць некалькі секцый: навуковая, лектарская, выдавецкая і інш., дзейнічаюць каля 180 гурткоў, бібліятэкі, клубы. БГКТ дапамагае весці з Беластока радыёперадачы на беларускай мове (з 1957), пры ўдзеле гэтай арганізацыі ў Варшаўскім універсітэце была створана кафедра беларускай філалогіі.

Таварыства спрыяе творчасці мясцовых калектываў мастацкай самадзейнасці, рабоце літаратурна-мастацкага аб'яднання "Белавежа". У актыве БГКТ і правядзенне школьных конкурсаў драматычных гурткоў, чытальнікаў і інш., святаў, фестываляў, аглядаў беларускай песні і г. д. Арганізацыя наладжвала маладзёжныя падарожжы па Беласточчыне, адпачынак у Польшчы беларускіх дзяцей (з 1989).

З выдзідзеных БГКТ кніг варта адзначыць штогодныя выпускі "Беларускага календара", зборнікі навуковых артыкулаў, творы ўдзельнікаў аб'яднання "Белавежа". Да 1992 г. Друкаваным органам Беларускага грамадска-культурнага таварыства з'яўлялася газета "Ніва".

Вядомыя сучасныя дзеячыБГКТ — М. Гайдук, К. Майсеня, Я. Сычэўскі і інш.

Святлана Сачанка

Беларускае грамадска-культурнае таварыства ў Санкт-Пецярбургу (БГКТ)

Створана ў 1989 г. Старшыня таварыства — В. Грыцкевіч, сярод актывістаў — навукоўцы, супрацоўнікі Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі (М. Нікалаеў, М. Ткачэнка, А. Разумаў), мастакі (І. Чарнякевіч, В. Сівуха), нашчадкі Луцкевічаў — М. Чапалёва, М. Пярова, студэнты, вайскоўцы, рабочыя, пенсіянеры. БГКТ мае філіял — Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны і рэгіянальную суполку Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, якую ўзначальвае А. Мельнікаў. Таварыства з'яўляецца адным з арганізатараў навуковых канферэнцый ("Санкт-Пецярбург і беларуская культура" (1993–1996), творчых вечароў і сустрэч з музыкантамі, спевакамі, артыстамі. Яго сябры чытаюць лекцыі па гісторыі і культуры Беларусі ў Санкт-Пецярбургу. Беларускія мастакі ўвайшлі ў міжрэгіянальнае творчае аб'яднанне "Маю гонар" і ўдзельнічаюць у калектыўных і персанальных выстаўках у Расіі, Беларусі, краінах Балтыі. Па ініцыятыве і сіламі сяброў таварыства ў разам з літоўскай суполкай у прыгарадзе Пецярбурга Левашова (на месцы масавых расстрэлаў савецкіх грамадзян) пастаўлены памятны крыж ахвярам таталітарнай сістэмы з Беларусі і Літвы (1992).

Сябры таварыства прымаюлі ўдзел у міжнародных навуковых канферэнцыях, сходзе беларусаў бліжняга замежжа (1992), з'ездах беларусаў свету (1993, 1997), Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, мерапрыемствах Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына". Высілкамі сябраў таварыства апублікаваны кнігі І. Грыгаровіча "Беларуская іерархія" (Мн., 1992, пераклад на беларускую мову М. Нікалаева), "Ленінградскі мартіралог. 1937-1938. (кніга памяці ахвяр палітычных рэпрэсій)" Том 1, жнівень-верасень 1937 г. (Санкт-Пецярбург. 1995). Рэдактар тома — А.Я. Разумаў).

Анфіса Ляднёва

Беларускае дэмакратычнае аб'яднанне (БДА)

Палітычная партыя беларусаў у Польшчы. Створана ў 1990 г. на базе Беларускага клуба, які дзейнічаў з 1989 г. Папярэднікамі БДА былі Беларускае незалежнае выдавецтва і Беларускае аб'яднанне студэнтаў. Устаноўчы кангрэс БДА адбыўся ў Беластоку 10 лютага 1990 г. Удзельнічала каля 100 дэлегатаў. Кангрэс прыняў праграму і статут арганізацыі, адозвы да беларускай эміграцыі і Беларускага народнага фронту "Адраджэнне". Асноўнай мэтай БДА вызначана — выказванне патрабаванняў беларускага насельніцтва Польшчы і абарона яго інтарэсаў. Кіруючы орган БДА — галоўная рада, якую ўзначаліў С. Яновіч. 26 студзеня 1992 г. у Беластоку адбыўся 2 кангрэс Беларускага дэмакратычнага аб'яднання, у рабоце якога ўдзельнічалі 54 дэлегаты. Прысутнічалі таксама прадстаўнікі Вярхоўнага Савета Беларусі, БНФ "Адраджэнне", Беларускага камітэта "Дзеці Чарнобыля", Згуртавання беларусаў Канады. Кангрэс ухваліў Праграмную дэкларацыю БДА, абраў С. Яновіча ганаровым старшынёй БДА, Галоўную раду ў скдадзе 11 чалавек (Я. Вапа, Ю. Каліна, В. Стахвюк, Я. Мірановіч, П. Юшчук, Л. Тарасэвіч, А. Максімюк, С. Іванюк, Е. Раманюк, В. Сельвясюк, М. Ваўранюк), галоўную рэвізійную камісію. Старшыня Галоўнай рады БДА — А. Латышонак. Да сярэдзіны 1990-х гг. у склад БДА уваходзіла каля 200 чалавек. У сваёй дзейнасці яно выступае за паўнату грамадскіх правоў беларусаў у Польшчы, развіццё тэрытарыяльнага самакіравання ўсіх узроўняў, беларускай культуры і школьніцтва, гаспадарча-эканамічнае развіццё рэгіёнаў Польшчы, населеных пераважна беларусамі. Актыўна ўдзельнічае ў правядзенні выбараў у мясцовыя і вышэйшыя органы ўлады, агітуе за вылучэнне і абранне ў іх беларускіх прадстаўнікоў. Выдае друкаваны орган — бюлетэнь "Беларускія навіны". З 2-й пал. 1990 г. дзейнасць БДА значна скарацілася, хоць афіцыйна яно не зачынена. Яго ўдзельнікі і актыўныя сябры зараз больш актыўна працуюць у іншых арганізацыях, якія стварылі ў 1990-я гг. беларусы ў Польшчы.

Міхась Ткачоў, Ларыса Языковіч

Беларускае згуртаванне палітычных вязняў і ссыльных у Вільнюсе

Беларускае згуртаванне палітычных вязняў і ссыльных у Вільнюсе — грамадская арганізацыя. Статут згуртавання зарэгістраваны ў 1993 г. Старшыня А. Анішчык. Мэта згуртавання – арганізацыя ўзаемадапамогі ахвярам таталітарнай сістэмы, абарона інтарэсаў былых палітзняволенных. Праводзіць асветную і выдавецкую дзейнасць. Прымае ўдзел у агульналітоўскіх акцыях былых палітычных вязняў (З'езд палітычных вязняў і ссыльных Літвы, 1998).

Галіна Сяргеева

Беларускае зямляцтва пралетарскага студэнцтва ў Кіеве

Нацыянальная грамадская арганізацыя, створаная студэнтамі-беларусамі Кіева 16 снежня 1926 г. На пачатку 1927 г. аб'ядноўвала навучэнцаў з 12 ВНУ Кіева (Ветэрынарна-заатэхнічны, Медыцынскі, Політэхнічны, Сельскагаспадарчы інстытуты, Інстытут народнай адукацыі, Губернская савецкая партшкола і г. д.). Налічвала больш за 170 сяброў. Складалася з аўтаномных аддзелаў, арганізаваных пры ВНУ Кіева. Выканаўчым органам зямляцтва з'яўлялася праўленне (старшыня — М. Аляшкевіч, сакратар — П. Бруква). Мела на мэце вывучэнне гісторыі, эканамічнай геаграфіі, прамысловасці, культуры і мастацтва Беларусі і аказанне матэрыяльнай дапамогі сябрам. Актывістамі зямляцтва былі М. Журык, К. Мядзведзеў, М. Рымша, Я. Чмыхаў, П. Ясінскі. Пры зямляцтве дзейнічалі культурніцкая і эканамічная секцыі, гурткі беларускай мовы і прыродазнаўства, беларуская бібліятэка. Сябры зямляцтва спрыялі арганізацыі ў Кіеве беларускага клуба, праводзілі беларускія вечарыны. Зямляцтва падтрымлівала сувязь з арганізацыямі і ўстановамі БССР (Цэнтральнае бюро пралетарскага студэнцтва Беларусі, ЦК КПБ, Наркамат асветы БССР), УССР (Кіеўская акруговая рада пралетарскага студэнцтва, Украінская акадэмія навук), беларускімі студэнцкімі зямляцтвамі Варонежа, Ленінграда, Масквы. У 1927–1928 гг. атрымала ад Цэнтральнага бюро пралетарскага студэнцтва Беларусі грашовую датацыю (1205 руб.) і разавую грашовую дапамогу ад Наркамата асветы БССР. Ва ўмовах распачатай у БССР барацьбы супраць "нацдэмаўшчыны" было пазбаўлена падтрымкі з боку Беларусі і ў 1930 г. спыніла сваю дзейнасць.

Юрый Васілеўскі, Аляксандр Ціхаміраў

Беларускае культурна-асветнае таварыства (БКАТ) ў Каунасе (Коўне)

Нацыянальная грамадская арганізацыя ў Літве. Падрыхтоўка да стварэння БКАТ пачалася восенню 1931 г. па ініцыятыве В. Барысовіча, К. Плескачэўскай, С. Якавюка. 28 лютага 1932 г. літоўскі ўрад зацвердзіў статут арганізацыі, пасля чаго ў Каўнасе адбыўся яе ўстаноўчы сход. Галоўнымі задачамі з'яўляліся "арганізацыя беларускай меншасці і праца над узаемным беларуска-літоўскім культурным яднаннем". Таварыства мела на мэце гуртаванне беларускай меншасці Коўна і ўсёй Літвы на падставах культурна-нацыянальнай працы, сяброўскае збліжэнне з літоўскімі дзеячамі дзеля выхавання моладзі ў духу дзяржаўнасці і любві да літоўскай культуры, пашырэнне ў асяроддзі беларусаў нацыянальнай культуры, выхаванне культурна-грамадскіх дзеячаў, фізічнае выхаванне беларускай моладзі. У таварыстве была свая сімволіка (штандар з дэвізам "Жыве мова — жыве народ!"). Неабходная умова сяброўства — веданне беларускай мовы і гісторыі. У 1933 г. таварыства аб'ядноўвала больш 1000 чал. Яго актывістамі былі С. Якавюк (старшыня праўлення), В. Барысовіч, А. Белавусаў, С. Дзядзевіч, М. Гардзейчык, К. Герасімчык, М. Езайціс, Я. Казун, А. Матач, С. Матач, К. Плескачэўская, Г. Радзюк, Я. Ясінскі і інш. Мела Бразельскае, Гялвойскае, Вількамірскае, Мярэцкае, Аліцкае аддзяленні; Тракайскае і Дзарасайскае прадстаўніцтвы; жаночы аддзел у Коўне. Каардынацыйным цэнтрам БКАТ з'яўлялася "Беларуская хатка" ў Коўне (заг. С. Матач). Сябры таварыства працавалі ў Беларускім народным універсітэце, наведвалі са згоды міністэрства асветы Літвы мясцовасці з пераважна беларускім насельніцтвам, перад якім выступалі з лекцыямі па беларусазнаўству. Пры БКАТ працаваў Беларускі народны тэатр са сталай тэатральнай студыяй (кіраўнікі К. Плескачэўская, С. Матач), які ў 1932–1933 гг. ажыццявіў каля 30 пастановак у Коўне і 10 у правінцыі. Таварыства мела хоры ў Коўне і пры Бразельскім аддзяленні. У сакавіку 1933 г. з дазволу літоўскіх улад ковенскі хор выступіў па гарадскім радыё з нагоды 15-х ўгодкаў БНР. У лютым 1933 г. пры БКАТ былі створаны дзіцячы садок і бібліятэка-чытальня. У ліпені таго ж года таварыства увайшло ў ініцыятыўны камітэт Міжнароднай асацыяцыі беларускіх арганізацый (Коўна). Выступала за адраджэнне незалежнай беларускай дзяржавы ў яе этнічных межах, удзельнічала ў палітычных акцыях беларускай эміграцыі. Супрацоўнічала з Аб'яднаннем студэнтаў-беларусаў Літоўскага універсітэта імя Вітаўта Вялікага ў Коўне. У 1935 г. спыніла сваю дзейнасць.

Аляксандр Ціхаміраў

Беларускае культурна-асветніцкае таварыства "Уздым" у г. Даўгаўпілсе (Латвія)

Беларускае таварыства "Уздым" утварылася ў пачатку 1992 г., афіцыйна зарэгістравана ў Міністэрстве юстыцыі Латвійскай Рэспублікі 6 ліпеня 1993 г.

Намаганнямі сяброў "Уздыма" 8 кастрычніка 1995 г. адчынена Беларуская нядзельная школа. На працягу першага года заняткаў настаўніцай гэтай школы была Вольга Паўловіч, а ў далейшым да апошняга часу — Таццяна Бучэль. Яна вядзе таксама факультатыўныя заняткі па беларускай мове ў Даўгаўпілскім універсітэце. У Беларускай нядзельнай школе дзеці розных узростаў (20 чалавек) вывучаюць беларускую мову, літаратуру, фальклор, гісторыю Беларусі, развучваюць беларускія песні і найгрышы. Дзякуючы дапамозе Міністэрства адукацыі Беларусі (па выкупленых ім пуцёўках) тройчы адпачывалі ў летніку "Зубраня" на возеры Нарач беларускія дзеці з Латвіі. Ездзілі на экскурсію ў г. Віцебск да вучняў Латышскай нядзельнай школы і прымалі іх у сябе ў Даўгаўпілсе.

Утвораны намаганнямі сяброў "Уздыма" тут працуе беларускі жаночы ансамбль "Купалінка", які шмат разоў прымаў удзел у канцэртах у Даўгаўпілсе і ў Браславе (у тым ліку пад час Дзён славянскага пісьменства і друку, Дзён беларускай культуры).

Намаганнямі беларускай суполкі "Уздым" на будынку, дзе з 1922 па 1935 гг. працавала Даўгаўпілская дзяржаўная беларуская гімназія, устаноўлена мемарыяльная дошка, праведзены Дні беларускай культуры (у 1996 і ў 1997 гг.), у якіх прымалі ўдзел ансамблі з Беларусі ("Талака" з Віцебска, "На панадворку" з Браслава, ансамбль з Рыгі "Надзея"). З выстаўкай прыязджалі мастакі-беларусы суполкі "Маю гонар", была праведзена навуковая канферэнцыя "Беларусы ў Латвіі: 75 гадоў Беларускай гімназіі ў Даўгаўпілсе". Матэрыялы, якія прагучалі на гэтай канферэнцыі, рыхтуюцца да друку сябрамі "Уздыма".

Намаганнямі сяброў "Уздыма" выдаецца беларуская старонка "Беларус Латгаліі" (з перыядычнасцю адзін раз у тры месяцы) у мясцовай рэгіянальнай газеце "Латгалес Лайкс", дзе друкуюцца матэрыялы аб жыцці мясцовых беларусаў, навіны з Беларусі і з беларускага замежжа, матэрыялы па гісторыі Беларусі і інш. Рэдагуе старонку "Беларус Латгаліі" Станіслаў Валодзька.

Сябры "Уздыма" змяшчаюць матэрыялы аб жыцці ў Латвіі як суайчыннікаў-беларусаў так і папярэднікаў, друкуюць паведамленні аб значных культурных падзеях на Беларусі ў латвійскіх газетах "Дынабург", "Міліён", "Латгалес Лайкс", у газеце беларусаў Латвіі "Прамень", у беларускіх выданнях "Голас Радзімы", "Звязда", "Кантакты і дыялогі" і інш., з мэтай папулярызацыі беларушчыны прымаюць удзел у радыё- і тэлевізійных перадачах як у Латвіі, так і ў Беларусі.

Сябры "Уздыма" наладжваюць сувязі з людзьмі розных нацыянальнасцей, якія жывуць у Даўгаўпілсе і наогул у Латвіі.

Таварыства адыгрывае значную ролю ў наладжванні сувязей беларусаў у Латвіі з Бацькаўшчынай. Паспяхова хадайнічала перад беларускімі ўладамі аб спрашчэнні візавага рэжыму для беларусаў Латвіі (подпісы на імя Прэзідэнта Беларусі, сабраныя яго сябрамі, у пачатку 1996 г. прывозілі ў Адміністрацыю Прэзідэнта і былі прыняты МЗС Беларусі). Удзельнічаюць у рабоце Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына", былі дэлегатамі З'езда беларусаў бліжняга замежжа, Першага і Другога з'ездаў беларусаў свету (а таксама Нечарговага з'езда беларусаў свету).

Таварыства абараняе інтарэсы сваіх суайчыннікаў, звяртаючыся ў розныя інстанцыі латвійскіх улад, у тым ліку да міністра замежных спраў Латвіі і Прэзідэнта Латвіі, што часам дае станоўчыя вынікі: у канцы 1997 г. у Браславе адчынены консульскі пункт Латвійскай Рэспублікі, што нашым суайчыннікам, якія жывуць недалёка ад беларуска-латвійскай мяжы, пры набыцці віз дае магчымасць эканоміць час і грошы (не патрэбна ехаць для гэтага ў Віцебск).

Старшынёй таварыства "Уздым" з 1992 па 1993 г. быў Канстанцін Капуста, сустаршынямі з 1993 па 1995 г. — Зінаіда Дзегцярэнка і Мікола Паўловіч, затым старшынёй быў С. Валодзька. Зараз другі год падрад "Уздым" узначальвае Таццяна Бучэль.

Станіслаў Валодзька (Даўгаўпілс)

Беларускае культурнае таварыства "Хатка"

Грамадска-культурная арганізацыя беларусаў у Польшчы, створаная ў Гданьску 23 мая 1992 г. Дзейнасць таварыства засяроджваецца на пытаннях культуры, асветы, захавання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў Гданьскага Памор'я, якія з'явіліся на гэтай тэрыторыі пасля Другой сусветнай вайны як выхадцы з Савецкага Саюза і Усходняй Беласточчыны. У сакавіку 1993 г. таварыства "Хатка" афіцыйна зарэгістравана мясцовымі органамі ўлады ў Гданьску. Яе кіраўніком з'яўляецца Лена Глагоўская.

Арганізацыя працягвае дзейнасць Аддзела Беларускага грамадска-культурнага таварыства, які быў створаны ў Гданьску ў лістападзе 1967 г. Да гэтага, 10 кастрычніка 1967 г., узнік Арганізацыйны камітэт па стварэнню ў Гданьску аддзела БГКТ. На ўстаноўчым сходзе 1 снежня 1967 г. было адзначана, што арганізацыя налічвае больш за 100 членаў. Сярод кіраўнікоў і заснавальнікаў аддзела былі Г. Красько, І. Мельнік, В. Снежка, М. Галёнка, І. Шарыньскі, І. Філіпік, С. Вішэнка, М. Таканюк і інш. Аддзел БГКТ у Гданьску называў сябе таксама Беларускім клубам. Галоўная ўвага беларусаў Гданьска была сканцэнтравана на пытаннях культуры і асветы. З 1971 г. дзейнічалі курсы па вывучэнню беларускай мовы, знаёмству з элементамі беларускай гісторыі, літаратуры, музыкі, народнага мастацтва. Прайшлі сустрэчы з беларускімі літаратарамі Я. Чыквіным, В. Шведам, С. Яновічам, М. Шаховічам, А. Баршчэўскім, М. Канапацкім, К. Бенздаруком і інш., якія пазнаёмілі слухачоў з літаратурнай творчасцю беларусаў у Польшчы. Цікавымі мерапрыемствамі таварыства былі сустрэчы з навукоўцамі, літаратарамі, мастакамі, артыстамі, грамадска-палітычнымі дзеячамі з Беларусі. Гданьск наведалі пісьменнік А. Мальдзіс, пасол Рэспублікі Беларусь у Польшчы У. Сянько, артысты Тэатра-студыі кінаакцёра, тэатра "Дзе-я?" у Мінску, а таксама прадстаўнікі беларускай дыяспары з краін далёкага замежжа С. Карніловіч, В. Станкевіч і інш. Святкаваліся важнейшыя гістарычныя падзеі, памятныя даты ў гісторыі беларускага народа, юбілеі беларускіх класікаў Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча і інш. Аддзел БГКТ спрыяў стварэнню беларускіх аматарскіх калектываў — танцавальных (ансамбль "Маланка"), вакальных (ансамбль "Жаваранкі"), тэатральных,

харэаграфічных. Арганізоўваліся турыстычныя рэйды-вандроўкі членаў арганізацыі па ўзбярэжжы Гданьскага Памор'я, а з 1991 г. — па Беласточчыне (маршрут Супрасль—Драгічын і інш.). Праводзіліся конкурсы на лепшае дэкламаванне вершаў беларускіх паэтаў. З 1991 г. члены арганізацыі прымалі удзел у правядзенні летняй беларускай калоніі "Грунвальд", якая праходзіла ў Беларусі (каля Дзяржынска). Летам 1991 г. быў арганізаваны адпачынак у Гданьску для 20 дзяцей з Беласточчыны. Летам 1992 г. у Гданьску знаходзілася група беларускай моладзі з Беларускага ліцэя ў Мінску колькасцю ў 30 чалавек, якія на працягу 10 дзён наведалі Гданьск, Гданьскае Памор'е і Кашубскае Паазер'е. У канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. былі наладжаны трывалыя кантакты з беларускімі рухамі ў Беларусі, Літве і на Беласточчыне. Па запрашэнню клуба "Паходня" з Гродна беларусы з Гданьска ў сакавіку 1990 г. наведалі Гродна і Вільнюс. Па запрашэнню Таварыства беларускай культуры ў Вільні прадстаўнікі беларусаў з Гданьска у маі 1991 г. удзельнічалі ў перанясенні праху І. Луцкевіча з Закапанэ ў Вільнюс.

У 1992 г. у сувязі з развіццём грамадска-палітычных працэсаў у Польшчы, зменамі ў структуры і дзейнасці Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы аддзел БГКТ у Гданьску быў пераўтвораны ў Беларускае культурнае таварыства "Хатка". Асноўныя кірункі і мэты дзейнасці арганізацыі засталіся ранейшымі, але новая арганізацыя сутыкнулася са значнымі фінансавымі цяжкасцямі. У верасні 1994 г. таварыства арганізавала Другі фестываль нацыянальных меншасцей у Гданьску, у снежні 1994 г. удзельнічала ў адкрыцці помніка А. Стэповічу ў Вільнюсе, у сакавіку—красавіку 1995 г. — у правядзенні выстаўкі "Выдавецкая дзейнасць нацыянальных меншасцей у Польшчы", якая праходзіла ў бібліятэцы Польскай акадэміі навук у Гданьску. З 25 сакавіка 1993 г. Беларускае культурнае таварыства "Хатка" выдае інфармацыйны бюлетэнь "Звесткі з Хаткі". Сваю дзейнасць таварыства каардынуе са структурамі іншых нацыянальных меншасцей у Польшчы, з беларускамі арганізацыямі на Беласточчыне.

Ларыса Языковіч

Беларускае літаратурнае аб'яднанне "Белавежа"

Беларускае літаратурнае аб'яднанне "Белавежа" створана 8 чэрвеня 1958 г. у Беластоку пры рэдакцыі газеты "Ніва". Заснавальнікамі аб'яднання сталі Яша Бурш, Уладзімір Гайдук, Пётр Ластаўка, Мар'ян Пецюкевіч, Вінцук Склубоўскі, Ян Чыквін, Зміцер Шатыловіч, Віктар Швед, Сакрат Яновіч. Першым старшынёй быў Георгій Валкавыцкі. У 1959 г. выдадзены першы калектыўны паэтычны зборнік "Рунь". У 1960 г. "Белавежу" ўключаюць у структуру Галоўнага ўпраўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства (БГКТ) у якасці яго асветніцкай часткі і падпарадкоўваюць свайму статуту. У 1989 г. "Белавежа" выходзіць са складу БГКТ і рэгіструецца як самастойнае аб'яднанне. Яго старшынёй становіцца Ян Чыквін.

Сябры "Белавежы" друкавалі свае творы на старонках "Нівы", альманахаў "Мой родны кут" (1963), "Белавежа" (№ 1, 1965, № 2, 1971, № 3, 1980, № 4, 1989), "Літаратурная Беласточчына" (1973), "Гасцінец" (1992), "Мае песні табе дару" (1993), у "Беларускіх календарах". Зрэдку іх творы з'яўляліся на старонках мінскіх часопісаў. Проза і паэзія "белавежцаў" у перакладзе друкавалася ва ўсіх важнейшых польскіх літаратурных штомесячніках і штотыднёвіках. У перакладзе на польскую мову выходзілі і кнігі — у першую чаргу Сакрата Яновіча, Яна Чыквіна, Надзеі Артымовіч. У 60-х гг. у Саюз польскіх пісьменнікаў быў прыняты Алесь Барскі (Алесь Баршчэўскі), у пачатку 70-х — Сакрат Яновіч, Ян Чыквін, яшчэ пазней — Віктар Швед, Надзея Артымовіч, Міхась Шаховіч, Мікалай Гайдук, Зося Сачко, Васіль Петручук.

У 60–70-х гг. асноўнай формай працы сяброў "Белавежы" былі аўтарскія сустрэчы. Белавежцы правялі многа творчых вечароў у Польшчы, а таксама ў Мінску, Гродне, Брэсце, Вільнюсе, Маскве, Лондане, Кліўлендзе, Нью-Йорку, Венецыі, Любляне, Рыме, Празе.

З 1990 г. пачала выходзіць "Бібліятэчка Беларускага літаратурнага аб'яднання "Белавежа". У гэтай серыі з'явілася ўжо 25 кніг паэзіі, прозы, нарысаў, навуковых даследаванняў, бібліяграфічных інфарматараў. Дынаміку творчага росту ўдзельнікаў літаратурнага аб'яднання адлюстроўвае наступны паказчык: на працягу першых трыццаці гадоў (1958–1988) выйшлі 42 аўтарскія кнігі, а за апошняе няпоўнае дзесяцігоддзе (1989–1998) — 60 кніжных выданняў, не лічачы перакладной дзейнасці А. Барскага. Шматжанравая творчасць "белавежцаў", станаўленне іх творчых індывідуальнасцей, значэнне і роля беларускага літаратурнага руху ў Польшчы з 80-х гг. зрабіліся сталай тэмай універсітэцкіх лекцый, дыпломных прац, навуковых дысертацый. Змястоўныя артыкулы пра іх можна знайсці ў польскіх, беларускіх і англамоўных энцыклапедыях, літаратурных слоўніках і бібліяграфічных даведніках. Паасобныя паэтычныя і празаічныя творы "белавежцаў" перакладзены на польскую, англійскую, італьянскую, нямецкую, сербахарвацкую, рускую, украінскую мовы. У апошнія гады членамі Саюза беларускіх пісьменнікаў сталі Алесь Барскі, Мікалай Гайдук, Міра Лукша, Васіль Петручук, а сябрамі беларускага ПЭН-цэнтра — Ян Чыквін і Сакрат Яновіч.

Ян Чыквін (Беласток)

Беларускае навукова-краязнаўчае таварыства ў Латвіі

Узнікла на аснове Навукова-краязнаўчага гуртка ў Рызе. Статут таварыства зарэгістраваны 30 чэрвеня 1932 г. у рыжскім акруговым судзе. Мэта таварыства — аб'яднаць усе беларускія і прыхільныя да беларускага адраджэння навуковыя і культурныя сілы, якія працавалі над пытаннямі гісторыі, геаграфіі, этнаграфіі, літаратуры, мастацтва, музыкі, фальклору, эканомікі Латвіі і Беларусі, пашыралі здабытыя веды сярод беларускага і латышскага грамадства, садзейнічалі ўзаемнаму азнаямленню і культурнаму збліжэнню абодвух народаў. Старшынёй праўлення таварыства быў абраны Канстанцін Езавітаў, намеснікам — Аляксандр Родзька, скарбнікам — Сцяпан Сіцько, сакратаром — Галіна Нікіфароўская. Даўгаўпілскае аддзяленне таварыства ўзначальваў Сяргей Сахараў, Люцынскае — Казека. Таварыства праводзіла з'езды, кангрэсы, курсы, фальклорныя экспедыцыі, экскурсіі, навуковыя справаздачы, утрымлівала бібліятэкі-чытальні, архіў. На заснаваны грашовы фонд выдавала брашуры, інструкцыі, падручнікі, кнігі. Каардынавала работу аддзяленняў, падтрымлівала сувязі з падобнымі таварыствамі ў Латвіі і за яе межамі, у тым ліку і ў Савецкай Беларусі. У 1933 г. было сабрана 30 біяграфій для зборніка "Біяграфіі дзеячаў беларускага Адраджэння".

Сяргей Панізьнік

Беларускае навукова-культурнае таварыства (БНКТ) ў Маскве

Нацыянальная грамадская арганізацыя. Заснавана БНКТ у Маскве 14 ліпеня 1918 г. пры падтрымцы Беларускага нацыянальнага камісарыята (ва ўстаноўчым сходзе прынялі ўдзел звыш 100 чал.). Мела на мэце развіццё нацыянальна-культурнай свядомасці беларусаў, прыцягненне шырокіх колаў беларускага грамадства да культурнай працы на Бацькаўшчыне, аб'яднанне ўсходнеславянскіх народаў. У склад таварыства ўваходзілі В. Брайцаў (сакратар праўлення), Я. Дыла, В. Качалаў, М. Любаўскі, У. Пічэта (старшыня праўлення), Ф. Турук, М. Янчук і інш. У лістападзе 1918 г. сябры таварыства утварылі рэдакцыйна-выдавецкую камісію, куды ўваходзілі Пічэта і Янчук. Яна планавала выданне матэрыялаў і даследаванняў па гісторыі і этнаграфіі Беларусі, зборнікаў беларускага фальклору і нарысаў беларускай літаратуры, прац па эканамічных і сельскагаспадарчых навуках. Пры дапамозе культурна-асветніцкага аддзела БНКТ выдала даклад М. Любаўскага "Асноўныя моманты ў гісторыі Беларусі". У лютым 1919 г. падрыхтавала да выдання часопіс "Белорусская жизнь" (у свет не выйшаў). Сябры таварыства ўдзельнічалі ў рабоце Беларускага народнага універсітэта ў Маскве (1918). Прадстаўнікі таварыства Янчук і Брайцаў прынялі ўдзел у нарадзе па арганізацыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, якую склікаў Наркамасветы РСФСР (22 сакавіка 1919 г.). Аднак у складаных умовах грамадзянскай вайны таварыства не змагло наладзіць трывалыя кантакты з арганізацыямі ў Беларусі і за яе этнічнымі межамі і фактычна спыніла сваю дзейнасць у другой палавіне 1919 г.

Віталь Скалабан, Аляксандр Ціхаміраў

"Беларускае незалежнае выдавецтва"

Створана ў Польшчы ў 1980 г., дало пачатак пазацэнзурнаму беларускаму выдавецкаму руху ў гэтай краіне. У 1980 г. выдавала матэрыялы дакументальнага і інфармацыйна-публіцыстычнага накірунку, газеты-аднадзёнкі, плакаты, зборнікі беларускіх песень і вершаў. З лютага 1981 г. стабілізавала сваю дзейнасць, пачало выдаваць інфармацыйна-публіцыстычны зборнік "Беларускія дакументы" (на беларускай мове лацінкай). У выхадных дадзеных кніг, якія выйшлі пасля ўвядзення ў Польшчы ваеннага становішча (1981), у канспірацыйных мэтах пазначаўся 1981 г. 1-шы і 2-гі сшыткі "Беларускіх дакументаў" убачылі свет у 1981 г., 3-ці і 4-ты — у 1983 г. На 1982–1983 гг. прыпадае найбольшая актыўнасць "Беларускага незалежнага выдавецтва". У першай палове 1982 г. была выдадзена брашурай ананімная паэма "Сказ пра Лысую гару", якая ў рукапісах распаўсюджвалася ў Беларусі ў 1980-я гг. У тым жа годзе была выдадзена "Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека" — важнейшы дакумент міжнароднага права, прыняты Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у 1948 г. Найважнейшымі публікацыямі выдавецтва, якія прэзентавалі беларускую грамадска-палітычную думку гэтага перыяду, былі брашуры Сакрата Яновіча "Праваслаўная царква ў Беластоцкім краі і беларуская мова ў ёй" і "Думкі пра аўтаномію" (1982). У гэтых працах у публіцыстычнай форме былі прадстаўлены разважанні аўтара адносна двух найбольш істотных аспектаў існавання кожнага народа: нацыянальнай мовы і культуры ў рэлігійным жыцці і форм захавання нацыянальнай свядомасці ва ўмовах існавання народа як нацыянальнай меншасці. Публікацыі С. Яновіча мелі вялікае значэнне ў канцы 1980-х гг., калі на хвалі палітычных змен ва Усходняй Еўропе з'явіліся ўмовы для развіцця грамадска-палітычнай актыўнасці беларусаў Беласточчыны. У другой палове 1983 г. дзейнасць выдавецтва была прыпынена з-за паліграфічных цяжкасцей і рэпрэсій супраць супрацоўнікаў выдавецтва з боку улад. Да 1985 г. рэдактары "Беларускага незалежнага выдавецтва" ўдзельнічалі у распаўсюджванні (у выглядзе машынапісных тэкстаў) ананімных твораў — песень, вершаў, публіцыстычных артыкулаў, якія адлюстроўвалі рэаліі грамадска-палітычнага жыцця Беласточчыны сярэдзіны 1980-х гг., а таксама ў пашырэнні ксеракопій і фотакопій сатырычных

малюнкаў. У 1987 г. друкарская дзейнасць выдавецтва аднавілася. У верасні 1987 г. быў надрукаваны зборнік вершаў Л. Геніюш "Дзевяць вершаў", які змяшчаў творы, прысвечаныя рэлігійнай праблематыцы, напісаныя ў апошнія гады жыцця паэткі і раней нідзе не друкаваныя. У кастрычніку 1987 г. пабачыла свет публіцыстычнае эсе С. Яновіча "Пісьмо да сябра", у якім аўтар аналізаваў грамадска-палітычныя змены, што адбываліся ў жыцці беларусаў Беласточчыны ў другой палове 1980-х гг. У лютым 1988 г. у Беластоку апублікаваны "Архіўны сшытак" — выданне, якое з'явілася працягам "Беларускіх дакументаў". У ім на 160 старонках у храналагічнай паслядоўнасці змешчаны фактычна раней нідзе не публікаваныя ўрадавыя дакументы, дэкларацыі, выступленні, публіцыстычныя артыкулы з сярэдзіны 1983 г. да лістапада 1987 г., якія датычыліся дзейнасці і становішча беларусаў у Польшчы. Выданне змяшчала хроніку падзей беларускага жыцця з 1983 да 1987 г., а таксама фрагменты найбольш значных артыкулаў з перыядычнага друку гэтага часу, якія мелі дачыненне да беларусаў і праваслаўя. "Архіўны сшытак" быў апошняй публікацыяй "Беларускага незалежнага выдавецва", якое на гэтым спыніла сваю выдавецкую дзейнасць. На працягу 7 гадоў свайго існавання БНВ апублікавала 11 выданняў, у тым ліку 5 дакументальнага характару, 3 публіцыстычнага, 2 зборнікі вершаў і адну брашуру агульным тыражом 2000 экз. "Беларускае незалежнае выдавецтва" адыграла важную ролю ў выхаванні маладых пакаленняў беларусаў Беласточчыны, развіцці іх грамадска-палітычнай дзейнасці ў 1990-я гг.

Ларыса Языковіч

Беларускае пралетарскае студэнцкае зямляцтва

Беларускае пралетарскае студэнцкае зямляцтва ў Маскве існавала з 27 мая 1923 да вясны 1930 г. Створана як ідэалагічная і арганізацыйная альтэрнатыва Беларускай культурна-навуковай асацыяцыі пры Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі, якая ў 1923 г. спыніла дзейнасць. Статутныя мэты: "змаганне з буржуазна-шавіністычнай і непралетарскай ідэалогіяй часткі беларускага студэнцтва ў Маскве"; арганізацыя навуковай і культурніцкай работы сярод беларускіх студэнтаў; падрыхтоўка для Беларусі кваліфікаваных спецыялістаў, якія ведаюць мясцовыя асаблівасці і беларускую мову; стварэнне навуковых гурткоў па спецыялізаванаму вывучэнню Беларусі, яе гісторыі, геаграфіі, роднай мовы і літаратуры; арганізацыя вучэбнай практыкі ў Беларусі; размеркаванне пасля заканчэння ВНУ на работ ў Беларусь; матэрыяльная ўзаемадапамога. Паводле статута, сябрамі маглі быць толькі выхадцы з пралетарскіх слаёў Беларусі. У склад гарадской арганізацыі ўваходзілі аўтаномныя зямляцтвы пры асобных ВНУ. Дзейнічала пад кіраўніцтвам Цэнтральнага бюро, якое прадстаўляла зямляцтва па-за межамі Масквы, распрацоўвала планы і методыку работы, вырашала фінансавыя пытанні, размяркоўвала стыпендыі і грашовую дапамогу, пуцёўкі ў санаторыі і на лячэнне. Дзейнічала ў кантакце і пад кантролем Маскоўскага бюро студэнтаў пры гарадскім савеце прафсаюзаў, паўнамоцнага прадстаўніцтва БССР у РСФСР і інш. З восені 1923 г. зямляцтва атрымлівала матэрыяльныя датацыі ад СНК БССР, Наркамата асветы БССР і Цэнтральнага савета прафсаюзаў БССР. Найбольш буйная нацыянальная студэнцкая арганізацыя ў Маскве (756 чал.), якая аб'ядноўвала зямляцтвы 22 ВНУ. Была створана шырокая сетка навуковых гурткоў па беларусазнаўству, спецыяльных прадметах, беларускай мове і літаратуры, культуры, гісторыі, геаграфіі і эканамічнай геаграфіі. Зямляцтва ўдзельнічала ў агульнагарадскіх мерапрыемствах Маскоўскага бюро студэнтаў, камсамола, у мітынгах супраць палітыкі Польшчы ў Заходняй Беларусі. З сябрамі зямляцтва сустракаліся А. Чарвякоў, У. Ігнатоўскі, В. Кнорын, В. Багуцкі, М. Мароз і інш. Пры зямляцтве існавалі студэнцкі хор пад кіраўніцтвам беларускага кампазітара М. Равенскага, драматычныя гурткі. Вясной 1924 г. з дапамогай З. Жылуновіча выдадзены часопіс "Змаганне", на старонках якога асвятлялася палітычная, навуковая і культурніцкая дзейнасць студэнцтва. З лютага 1925 г. супольна з ЦБ пралетстуда Беларусі ў Мінску выдаваўся часопіс "Чырвоны сцяг" (выйшла 8 нумараў). У 1923/24 навучальным годзе на баланс зямляцтва перададзены Беларускі клуб і бібліятэка. У 1926 г. працавалі 12 гурткоў беларускай мовы і літаратуры, у якіх займалася 200 студэнтаў. На 1 студзеня 1927 г. у зямляцтве налічвалася 830 сяброў з 21 ВНУ, было наладжана супрацоўніцтва з Украінскім пралетарскім студэнцкім зямляцтвам і Беларускай драматычнай студыяй у Маскве (восень 1923), аддзяленнем Таварыства палітэмігрантаў з Заходняй Беларусі ў Маскве (сакавік 1925). Зімой 1927 г. праведзена вечарына- сустрэча з Я. Коласам. З 1927 г. арганізоўвала гурткі для заахвочвання напісання дыпломаў па беларускай тэматыцы пры Інстытуце інжынераў шляхоў зносін, гідрамеліярацыйны гурток пры Маскоўскай сельскагаспадарчай акадэміі імя Ціміразева. Лепшым дыпломнікам выдзяляліся спецыяльныя стыпендыі. У 1927-1928 навучальным годзе колькасць гурткоў беларускай мовы і літаратуры, гісторыі, драматычных і вакальных паменшылася, паступова спынялася беларусізацыя дзейнасці зямляцтва. З 1928-1929 навучальнага года дзейнасць яго бюракратызавалася і фактычна была зведзена да агітацыі і прапаганды пралетарскай ідэалогіі. Паводле рашэння Цэнтральнага бюро зямляцтва і ЦБ пралетстуда Беларусі, згуртаванні студэнтаў па тэрытарыяльна-нацыянальных прыкметах былі скасаваны і ўсе пытанні работы з моладзю перададзены ў камсамольскія арганізацыі па месцы вучобы. Сябрамі зямляцтва ў Маскве ў розныя гады былі дзяржаўны дзеяч Беларусі Р. Парэчын, беларускія пісьменнікі і літаратары А. Ляжневіч, А. Гародня (А. Функ), Ю. Гаўрук, У. Дубоўка, М. Дуброўскі, К. Якаўчык, Л. Родзевіч, мастакі І. Ахрэмчык, В. Руцай, Р. Семашкевіч, М. Філіповіч, А. Шаўчэнка, спявачка І. Яўнзем, вучоныя Ю. Вольскі, М. Лойка, В. Лубяка, Я. Палявы,

А. Пракапчук, Ф. Яхімовіч, мастацтвазнавец А. Ус, артыст М. Міцкевіч, студэнты М. Брыт, А. Кахановіч, М. Кіеня і інш. З зямляцтвам супрацоўнічалі прафесары П. Растаргуеў, Ф. Турук і інш.

Юрый Васілеўскі

Беларускае прэс-бюро

Беларускае прэс-бюро, інфармацыйнае бюро і карэспандэнцкія пункты, якія ствараліся ўрадам Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) для інфармавання замежнай грамадскасці пра Беларусь, беларускае пытанне і дзейнасць урада БНР. Першае прэс-бюро існавала з лета 1919 да 1925 г. пры Надзвычайнай місіі БНР у Берліне. Выдавала інфармацыйны бюлетэнь на беларускай і нямецкай мовах (1-шы нумар захоўваецца ў Цэнтральнай бібліятэцы АН Літвы), фундатарам і шэф-рэдактарам якога ў 1919 г. быў князь С. Сапега. Беларускія прэс-бюро дзейнічалі таксама ў Рызе пры Вайскова-дыпламатычнай місіі БНР у Латвіі і Эстоніі (1919—1921; кіраўнік У. Грунтоў), Капенгагене (1919—1921; д-р І. Лур'е), Коўне (пры дыпламатычным прадстаўніцтве БНР у Літве, 1921—1924; выдавала свой бюлетэнь), Нью-Йорку (1921; Бубешка), Таліне (наз. інфармацыйны аддзел, 1921—1922; М. Чарвякоў). Карэспандэнцкія пункты ў розны час існавалі ў Парыжы, Празе, Варшаве, Вене, Бялградзе, Сафіі, Вільні, Гданьску, Канстанцінопалі. Задачай кожнага бюро было забяспечваць сродкі масавай інфармацыі краіны свайго месцазнаходжання матэрыяламі пра падзеі ў Беларусі і вакол яе, збіраць інфармацыю па беларускай праблеме і дасылаць яе ў берлінскае прэс-бюро.

Руслан Лобаў

Беларускае сабранне

Грамадская арганізацыя, якая існавала з красавіка 1921 г. да лютага 1922 г. у Коўне (Каўнасе). Паводле статута, зацверджанага літоўскімі ўладамі 7.5.1921 г., ставіла сваімі мэтамі культурную дзейнасць сярод беларускага насельніцтва ў Літве, палітычнае, навуковае, мастацкае і фізічнае выхаванне сваіх сяброў. У склад Беларускага сабрання ўваходзілі Я. Варонка (старшыня), В. Ластоўскі (сакратар), А. Вальковіч (скарбнік), А. Галавінскі, К. Дуж-Душэўскі, В. Захарка, А. Ружанцоў, А. Рэшка, А. Цвікевіч, Я. Шальмук і іншыя беларускія нацыянальныя дзеячы. Сабранне падтрымлівала дзейнасць урада БНР на чале з В. Ластоўскім, выступала за вызваленне Заходняй Беларусі з-пад улады Польшчы. У чэрвені 1921 г. адкрыла "Беларускі клуб" (вул. Лайсвес алея, 66), які хутка быў закрыт літоўскай паліцыяй па фармальнай прычыне.

Юрый Васілеўскі, Аляксандр Ціхаміраў

Беларускае студэнцкае зямляцтва ў Варонежы

Нацыянальная грамадская арганізацыя, створаная беларускімі студэнтамі Варонежскага сельскагаспадарчага інстытута ў лістападзе 1924 г.

На момант утварэння колькасць членаў зямляцтва складала 31 чал. Пазней да арганізацыі далучыліся студэнты універсітэта і рабфака. З восені 1925 г. дзялілася на секцыю пры Варонежскім сельгасінстытуце і секцыю пры Варонежскім універсітэце. У канцы 1925 г. мела 55 сяброў (34 у сельгасінстытуце і 21 ва універсітэце). Да арганізацыі далучыліся як выхадцы з тэрыторыі Беларусі, так і беларусы — выхадцы з Літвы і РСФСР (Пскоўшчына, Смаленшчына). Актывістамі зямляцтва былі К. Бужынскі (старшыня праўлення да 8.11.1926), Т. Дамінікоўскі (сакратар да 8.11.1926), Кантар (старшыня праўлення з 8.11.1926), Шчытовіч (сакратар з 8.11.1926), Брожын, Давыдаў, А. Малевіч, Шкрэдаў. Падтрымлівала сувязі з арганізацыямі і ўстановамі БССР (Цэнтральнае бюро пралетарскага студэнцтва Беларусі, Наркамасветы БССР) і РСФСР (Варонежскае гарадское бюро пралетстуда). Атрымлівала фінансавую дапамогу з боку ўрада БССР. Рэгулярна атрымлівала ад ЦБ пралетстуда Беларусі беларускія перыядычныя выданні. Планавала арганізаваць гурткі беларусазнаўства і беларускай мовы, правесці беларусізацыю працы зямляцтва. Ва ўмовах распачатай ў канцы 1920-х гг. у БССР барацьбы супраць "нацдэмаўшчыны" было вымушана згарнуць сваю дзейнасць. У красавіку 1928 г. ад супрацоўніцтва з зямляцтвам адмовілася Варонежскае гарадское бюро пралетстуда. Вясной 1929 г. дзейнасць зямляцтва была спынена.

Юрый Васілеўскі, Аляксандр Ціхаміраў

Беларускае студэнцкае зямляцтва ў Варшаве

Беларуская грамадская арганізацыя, створаная ў 1908 г. пры Варшаўскім універсітэце па ініцыятыве М. Гуткоўскага (кіраваў арганізацыяй да 1912 г.) і пры падтрымцы тагачаснага рэктара Варшаўскага універсітэта праф. Я. Карскага. У 1908 г. налічвала каля 100 чал. Арганізоўвала культурныя і этнаграфічныя мерапрыемствы (беларускія вечарыны і інш.), якія неаднаразова мелі дабрачынны характар. У вечарынах удзельнічалі вядомыя

дзеячы культуры Беларусі (Г. Леўчык, І. Буйніцкі, А. Пшчолка, М. Тэадаровіч, П. Гуткоўскі і інш.). Актывістамі былі браты Гуткоўскія, А. Салаўёвіч і інш. Царскія ўлады ставіліся да дзейнасці зямляцтва насцярожана і ў 1913 г. арыштавалі Р. Гуткоўскага за выданне ім праграмы вечарыны на беларускай мове. У 1914 г. дзейнасць зямляцтва была спынена.

Юрый Васілеўскі, Аляксандр Ціхаміраў

Беларускае студэнцкае зямляцтва ў Казані

Нацыянальная грамадская арганізацыя, створаная ў 1924 г. Аб'ядноўвала студэнтаў-беларусаў Казанскага універсітэта, Ветэрынарнага, Політэхнічнага, Сельскай гаспадаркі і лесаводства, Усходняга педагагічнага інстытутаў, Вышэйшай дзяржаўнай мастацкай майстэрні, рабфакаў і інш. Налічвала больш за 60 асоб Актывістамі зямляцтва былі М. Шыркевіч (старшыня праўлення), П. Кірык (сакратар), М. Бухман, В. Каральчук, Я. Сачко, І. Стома. Супрацоўнічала з Цэнтральным бюро зямляцтваў Казані. Звярталася з просьбай аб матэрыяльнай дапамозе да стыпендыяльнай камісіі пры ЦВК БССР. Далейшы лёс зямляцтва невядомы.

Юрый Васілеўскі, Аляксандр Ціхаміраў

Беларускае студэнцкае зямляцтва ў Ленінградзе

Нацыянальная грамадская арганізацыя, створаная ў 1925 г. на базе Асацыяцыі беларускіх студэнтаў ВНУ у Петраградзе. Аб'ядноўвала студэнтаў-беларусаў асобных навучальных устаноў Петраграда/Ленінграда. Паводле статута асноўнымі мэтамі зямляцтва з'яўляліся нацыянальна-культурная праца, навуковая дзейнасць, аказанне матэрыяльнай дапамогі сябрам зямляцтва. Супрацоўнічала з установамі і арганізацыямі БССР (Цэнтральнае бюро пралетарскага студэнцтва Беларусі, Наркамасветы БССР) і РСФСР (Ленінградскім гарадскім саветам пралетарскага студэнцтва). З 1927 г. атрымлівала фінансавую дапамогу ад Наркамасветы БССР (да 1500 руб. на навучальны год) на арганізацыю культурна-асветных мерапрыемстваў. Сябры зямляцтва правялі літаратурна-музычныя вечарыны беларускіх пісьменнікаў Я. Купалы, Я. Коласа, Ц. Гартнага, З. Піваварава, Б. Пятроўскага, Р. Сапуна (Р. Папараця), Я. Шарахоўскага. Арганізацыя наладзіла трывалыя кантакты з беларускімі вучонымі і дзеячамі нацыянальна-культурнага руху, што пражывалі ў Ленінградзе, — А. Сержпутоўскім, К. Пушкарэвічам, Я. Канчарам, Л. Сеўруком і інш. У студзені 1929 г. стварыла навуковае таварыства па вывучэнню Беларусі, якое налічвала каля 30 сяброў (старшыня праўлення А. Дрозд, навуковы сакратар Пратасевіч). Сябры таварыства (М. Грынблат і інш.) удзельнічалі ў экспедыцыях па Беларусі, арганізаваных супрацоўнікамі АН БССР. У 1930-х гг. зямляцтва пачало згортваць сваю дзейнасць і ў канцы 1930-х гг. канчаткова спыніла яе.

Юрый Васілеўскі, Аляксандр Ціхаміраў

Беларускае (Паўночна-Каўказскае) студэнцкае зямляцтва ў Растове-на-Доне

Нацыянальная грамадская арганізацыя, заснаваная 27 лютага 1927 г. пры Паўночна-Каўказскім універсітэце (Растоў-на-Доне). Аб'ядноўвала студэнтаў-беларусаў медыцынскага, педагагічнага, эканамічнага факультэтаў (24 чал.). Мела на мэце культурна-асветную дзейнасць сярод беларускага студэнцтва і аказанне матэрыяльнай дапамогі сябрам зямляцтва. У склад зямляцтва ўваходзілі Ц. Селіванаў (старшыня праўлення), А. Жэбрун (сакратар), М. Кавалёў, Г. Саланевіч, А. Шэўчык і інш. Падтрымлівала сувязь з арганізацыямі ў БССР (Цэнтральнае бюро пралетарскага студэнцтва Беларусі ў Мінску і інш.), атрымлівала ад Наркамасветы БССР грашовыя датацыі. Распаўсюджвала сярод мясцовых студэнтаў-беларусаў перыядычныя выданні, якія перасылаліся ў Растоў-на-Доне з БССР. Далейшы лёс арганізацыі невядомы.

Юрый Васілеўскі, Аляксандр Ціхаміраў

Беларускае студэнцкае зямляцтва ў Сараташе

Нацыянальная грамадская арганізацыя, утвораная восенню 1927 г. па ініцыятыве Я. Шавялёва, які і ўзначаліў зямляцтва. Аб'ядноўвала пераважна студэнтаў Саратаўскага універсітэта. Колькасць сяброў складала 65 чал. Падтрымлівала сувязі з установамі і арганізацыямі БССР (Цэнтральнае бюро пралетарскага студэнцтва Беларусі, Наркамасветы БССР) і РСФСР (Саратаўскае губернскае бюро пралетарскага студэнцтва). Атрымлівала літаратуру па беларусазнаўству, падручнікі па беларускай мове. У 1927/28 навучальным годзе грашовую датацыю зямляцтву даслаў Наркамасветы БССР. Далейшы лёс арганізацыі невядомы.

Юрый Васілеўскі, Аляксандр Ціхаміраў

Беларускае студэнцкае зямляцтва ў Смаленску

Нацыянальная грамадская арганізацыя, створаная восенню 1924 г. студэнтамі-беларусамі Смаленскага універсітэта. Мела на мэце вядзенне культурна-асветнай работы сярод навучэнцаў-беларусаў і этнічнага беларускага насельніцтва Смаленска. Выканаўчы орган (бюро) зямляцтва ўзначальваў студэнт педагагічнага факультэта Смаленскага універсітэта У. Ганчароў (да 6.3.1926), які адначасова працаваў загадчыкам аддзела народнай адукацыі Смаленскай губ. Актывістамі зямляцтва былі А. Міхальчанка (сакратар), М. Чуняева (намеснік старшыні і старшыня культурнай камісіі), М. Цішкевіч (сакратар), Гамаліцкі (старшыня рэвізійнай камісіі), І. Дашкевіч, І. Дзмітрачэнка, К. Жэжаль, В. Клім, С. Кулагін, Б. Манеўскі, М. Чадовіч, М. Шыкун. У 1926 г. колькасць сяброў зямляцтва складала 115 чал., у 1928 г. — 158 чал. Яно аб'ядноўвала студэнтаў педагагічнага, медыцынскага, рабочага факультэтаў Смаленскага універсітэта, фармацэўтычнага і кааператыўнага тэхнікумаў, губернскай савецкай партшколы. Пры зямляцтве працавалі гурткі беларусазнаўства (выкладчыкі Ганчароў, П. Кароль), драматычны (кіраўнік І. Хацкевіч), харавы (у 1926 г. кіраўнік П. Івашчанка, пазней Ратнер). Сябры арганізацыі праводзілі літаратурна-мастацкія вечарыны, ставілі спектаклі, спрыялі стварэнню беларускага аддзела ў губернскай бібліятэцы, наладзілі кантакты з дзеячамі беларускай навукі і культуры (М. Гарэцкім, У. Ігнатоўскім, Я. Коласам). Зямляцтва супрацоўнічала са Смаленскім губернскім выканкамам, Беларускай секцыяй пры Смаленскім губернскім аддзеле народнай адукацыі, губернскім саветам прафсаюзаў, губернскім краязнаўчым таварыствам, Таварыствам палітычных эмігрантаў Заходняй Беларусі ў Смаленску. Падтрымлівала сувязі з дзяржаўнымі органамі, арганізацыямі і ўстановамі БССР (Цэнтральным бюро пралетарскага студэнцтва Беларусі, Наркамасветы БССР, Аршанскім, Віцебскім, Мазырскім і Мінскім акруговымі выканкамамі). У 1927 г. атрымала фінансавую дапамогу з БССР (300 руб.). Атрымлівала і распаўсюджвала сярод навучэнцаў-беларусаў беларускія перыядычныя выданні і падручнікі. 29 лістапада 1925 г. правяло І канферэнцыю навучэнцаў-беларусаў г. Смаленска. Ва ўмовах распачатай у БССР барацьбы супраць "нацдэмаўшчыны" не мела больш падтрымкі з Беларусі і ў канцы 1920-х гг. спыніла існаванне.

Юрый Васілеўскі, Аляксандр Ціхаміраў

Беларускае студэнцкае зямляцтва ў Томску

Нацыянальная грамадская арганізацыя, заснаваная 20 верасня 1927 г. студэнтамі-беларусамі Сібірскага тэхналагічнага інстытута і Томскага універсітэта. Налічвала 31 чал. Зямляцтвам кіравалі Пашкоўскі (старшыня праўлення) і А. Багданаў (сакратар). Падтрымлівала сувязі з арганізацыямі і ўстановамі БССР (Цэнтральнае бюро пралетарскага студэнцтва Беларусі, Наркамасветы БССР). Выпісвала і распаўсюджвала беларускія газеты і часопісы. Далейшы лёс зямляцтва невядомы.

Юрый Васілеўскі, Аляксандр Ціхаміраў

Беларускае студэнцкае зямляцтва ў Тыфлісе

Нацыянальная грамадская арганізацыя, заснаваная ў Тыфлісе (суч. Тбілісі, Грузія) 23 студзеня 1927 г. Аб'ядноўвала беларусаў-студэнтаў Тыфліскага дзяржаўнага політэхнічнага інстытута. Галоўнымі мэтамі зямляцтва былі садзейнічанне вывучэнню беларускай мовы і аказанне матэрыяльнай дапамогі яго сябрам. Актывістамі зямляцтва былі М. Густыр (старшыня бюро), Ф. Брыль (сакратар), Ізмайловіч, Кот, Свігач, Чарняўскі. Кантактавала з Цэнтральным бюро пралетарскага студэнцтва Беларусі ў Мінску, пры яго дапамозе накіравала ў БССР асобных сяброў зямляцтва на летнюю практыку. Звярталася па арганізацыйную і матэрыяльную дапамогу да дзяржаўных органаў БССР, але не атрымала яе. Выпісвала і распаўсюджвала беларускія перыядычныя выданні. У канцы 1920-х гг. зямляцтва пераўтварылася ў Беларускую секцыю пры Тыфліскім клубе народаў Захаду. У 1930 г. спыніла існаванне.

Юрый Васілеўскі, Аляксандр Ціхаміраў

Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі

Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, акрамя свайго прамога прызначэння, таксама актыўна працуе з беларускай дыяспарай. Гэтым самым яно дапамагае выконваць дзяржаўную праграму "Беларусы ў свеце".

На працягу апошніх гадоў для супрацоўніцтва з замежнымі суайчыннікамі таварыства шырока выкарыстоўвае розныя магчымасці. Перад удзельнікамі Дзён культуры, гастрольных паездак нацыянальных творчых калектываў, удзельнікамі выставак майстроў мастацтва і народных промыслаў, іншых традыцыйных мерапрыемстаў, якія праводзіць таварыства за мяжой, заўсёды ставіцца мэта пашыраць і ўмацоўваць кантакты з беларускім замежжам. БелТД накіроўвае свае намаганні на больш актыўнае супрацоўніцтва сваіх замежных

партнёраў з аб'яднаннямі беларусаў, якія жывуць у межах іх рэгіёнаў. З многімі з іх ёсць пагадненні аб падтрымцы культурна-асветніцкай дзейнасці нашай дыяспары. Суайчыннікі маюць непасрэднае дачыненне да стварэння і работы таварыстваў дружбы з Беларуссю. Дарэчы, такія таварыствы існуюць у Польшчы, Балгарыі, Літве, Расіі, на Украіне, у Францыі, Германіі, ЗША.

Прыкладам плённага супрацоўніцтва з нашымі суайчыннікамі можа быць дзейнасць таварыства "Украіна — Беларусь", якое ўзначальвае акадэмік Нацыянальнай АН Украіны Ігар Пахадня. Беларусы ўдзельнічаюць у рабоце таварыства, разам адзначаюць на Украіне падзеі ў культурным жыцці Беларусі, атрымліваюць дапамогу ад таварыства ў вырашэнні праблем. У сваю чаргу таварыства "Беларусь-Украіна" актыўна супрацоўнічае з украінскімі суполкамі ў Беларусі - рэспубліканскім "Ватра" і мінскім "Кабзар". Разам праводзяцца вечары, прысвечаныя знамянальным падзеям у культурным жыцці Украіны. Украінская дыяспара ахвотна знаёміць беларусаў з нацыянальнымі, культурнымі традыцыямі, народнай творчасцю.

БелТД садзейнічае выступленням высокакваліфікаваных спецыялістаў па гісторыі беларускай культуры, літаратуры, мастацтва перад прадстаўнікамі беларускай дыяспары. Так, у час правядзення Дзён Беларусі ў Балгарыі прайшлі пазнавальна-азнаямленчыя выступленні вядомага мастака У. Басалыгі пра развіццё сучаснага беларускага мастацтва. Неаднаразова перад беларускай дыяспарай у Польшчы, Літве, ЗША выступалі старшыні таварыстваў дружбы з асобнымі краінамі і іх намеснікі — прафесары Генадзь Цыхун, Ірына Шаблоўская, Вячаслаў Рагойша, кандыдат навук Вячаслаў Чамярыцкі, мастак Георгій Паплаўскі. Сістэмай сталі сустрэчы прадстаўнікоў БелТД з нашымі суайчыннікамі ў час міжнародных навуковых канферэнцый, гастроляў, афіцыйных візітаў да замежных партнёраў. Сумесна з польскімі партнёрамі і НАН РБ падрыхтавана і праведзена чарговая VII канферэнцыя "Беларусь Усходняя і Заходняя ў міжваенны перыяд", удзел у якой прынялі польскія навукоўцы беларускага паходжання (1997). У БелТД адбылася прэзентацыя кнігі беластоцкага беларускага паэта і вучонага Яна Чыквіна "Далёкія і блізкія" з удзелам аўтара, вечарына, прысвечаная творчасці латышскага паэта беларускага паходжання Міколы Талеркі, у якой удзельнічаў прадстаўнік беларускай дыяспары з Даўгаўпілса (Латвія).

У краінах, дзе пражываюць нашы суайчыннікі: напрыклад, у штаце Ларгау (Швейцарыя), Італіі, Францыі, Германіі былі арганізаваны шматлікія выстаўкі. Беларусы Італіі мелі магчымасць наведаць канцэрты дзіцячага ансамбля "Літарынка", ансамбля "Квецень", Францыі – "Ведрыца", Фінляндыі – "Контрданс", Польшчы – студыі "Вясёлка". Невялікія бібліятэчкі беларускай літаратуры і перыядычных выданняў, інфармацыйных бюлетэняў былі перададзены кіраўніцтву дыяспары Мурманскай, Іркуцкай абласцей, Санкт-Пецярбурга.

Беларускім таварыствам дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі праводзіцца работа па ўсталяванню кантактаў з беларускімі суполкамі далёкага і блізкага замежжа, аказваецца ім інфармацыйная і іншая дапамога. Традыцыйна амаль ва ўсіх мерапрыемствах, якія былі арганізаваны БелТД у 1998 г. у замежных краінах, прымалі ўдзел, ці прысутнічалі на іх прадстаўнікі беларускіх дыяспар. Гэта было ў ЗША, дзе праходзілі канцэрты Дзяржаўнага ансамбля танца Беларусі, у Францыі — на канцэртах ансамбля "Купалінка"; у Швейцарыі — на канцэртах Дзяржаўнага Камернага хору Беларусі; у Бельгіі — на канцэртах цымбальнага ансамбля "Ведрыца". Нашы суайчыннікі ў Францыі, Германіі, Даніі, Аўстрыі мелі магчымасць пазнаёміцца з творамі беларускіх мастакоў. У верасні 1998 г. у Гайнаўцы (Польшча) адбылася сустрэча беларускіх пісьменнікаў са сваімі калегамі, у тым ліку і беларусамі, а ў Варшаве адбылася сустрэча прадстаўнікоў беларускай дыяспары з дэлегацыяй нашых журналістаў, якая знаходзілася там па запрашэнні таварыства "Польшча-Беларусь".

Пры актыўным удзеле БелТД у Навагрудку прайшлі ўрачыстасці, прысвечаныя падвядзенню вынікаў чарговай агульнапольскай алімпіяды беларускай мовы і ўзнагароджанне яе пераможцаў. Для іх была арганізавана экскурсія па мясцінах, звязаных з імем Адама Міцкевіча. У БелТД адбыліся сустрэчы з прадстаўнікамі беларускіх суполак Малдовы, Латвіі, Якуціі, Новасібірска.

У канцы 1998 г. па запрашэнню БелТД Беларусь наведаў Антон Пауломо (Паўловіч) з Фінляндыі – беларус па паходжанню, прадзед якога на пачатку стагоддзя працаваў начальнікам Мінскага вакзала. А. Паўломо з'яўляецца арганізатарам суполкі беларусаў Фінляндыі, а таксама ініцыятарам стварэння таварыства "Фінляндыя-Беларусь". У час яго знаходжання ў Мінску распрацаваны і падпісаны пратакол аб супрацоўніцтве. Для беларускай суполкі ў Фінляндыі перададзена бібліятэчка літаратуры і перыядычных выданняў. Такія бібліятэчкі БелТД накіраваны таксама ў Ірландыю, Іспанію, Канаду, Расію (Якуцк, Благавешчанск), Латвію.

У планах БелТД заўсёды прадугледжваецца выкарыстанне сваіх магчымасцей для пашырэння супрацоўніцтва з замежнымі суайчыннікамі. Гэта мэта ставіцца намі перад удзельнікамі ўсіх мерапрыемстваў, якія праводзіць таварыства ў замежных краінах, а таксама ў Беларусі.

Арсен Ваніцкі

Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за мяжой (Таварыства "Радзіма")

Добраахвотная грамадская арганізацыя, якая падтрымлівае кантакты з беларускай дыяспарай у краінах яе пражывання. Створана ў 1964 г. Да гэтага, у 1955–1964 гг., дзейнічала Беларуская секцыя Савецкага камітэта "За вяртанне на Радзіму". Галоўнай яе задачай да 1960 г. было вярнуць як мага больш людзей, раскіданых вайной,

да сваіх сем'яў, а заадно папоўніць ГУЛАГ былымі савецкімі ваеннапалоннымі, пакараць тых, хто супрацоўнічаў з акупантамі.

Заснавальнікамі Беларускага таварыства "Радзіма" выступілі Р. Шырма і М. Танк. Яго старшынямі былі Р. Шырма, мастак М. Савіцкі, цяпер — кампазітар С. Картэс. У савецкія гады таварыства было адзінай дазволенай уладамі арганізацыяй, якая падтрымлівала кантакты з беларускай эміграцыяй і праводзіла сярод яе культурна-асветніцкую работу. Яна мела сваё выданне — газету "Голас Радзімы", якая штотыднёва пасылалася ў грамадскія арганізацыі дыяспары, тысячам суайчыннікаў, выхадцаў з Беларусі па прыватных адрасах. Штогод адпраўляліся сотні кніг для фарміравання бібліятэк у культурных, грамадска-асветных арганізацыях, кінафільмы і фотавыстаўкі, нотная літаратура, нацыянальныя касцюмы для гурткоў мастацкай самадзейнасці і інш. Штогод праводзіліся курсы для ўдзельнікаў і кіраўнікоў хораў і танцавальных гурткоў, курсы па культуры, мове і гісторыі Беларусі. Таварыства прымала для адпачынку ў піянерскіх лагерах дзяцей і ўнукаў замежных суайчыннікаў. Актывісты і кіраўнікі арганізацый прыязджалі на адпачынак і лячэнне ў савецкія санаторыі і дамы адпачынку.

Таварыства "Радзіма" падтрымала ініцыятыву аднаго з аўтараў "Культурнага праекта Араў-парка", нашага земляка Мінкевіча, устанавіць у Араў-парку, побач з помнікамі А. Пушкіну, Т. Шаўчэнку, У. Уітмену помнік Я. Купалу. У 1973 г. намаганнямі таварыства бюст-помнік Я. Купалы (скульптар А. Анікейчык), быў устаноўлены у культурным цэнтры Араў-парк (каля Нью-Йорка).

Да абвяшчэння Беларусі незалежнай дзяржавай таварыству дазвалялася весці работу толькі з так званымі "прагрэсіўнымі арганізацыямі замежных суайчыннікаў" (Федэрацыя рускіх канадцаў, Федэрацыя культурна-спартыўных клубаў у Аргенціне, Камітэт "Рускага голасу" ў ЗША, Саюз савецкіх грамадзян у Бельгіі, розныя аб'яднанні ў Галандыі, Вялікабрытаніі, Аўстраліі). У такіх арганізацыях, як правіла, беларусы, хаця яны складалі большасць, не мелі свайго аблічча, выступалі разам з рускімі і ўкраінцамі носьбітамі агульнай савецкай культуры.

Сёння Таварыства "Радзіма" дзейнічае як арганізацыя, што імкнецца дапамагчы замежным беларусам, нягледзячы на іх палітычныя погляды і канфесійную прыналежнасць. Культурныя і эканамічныя кантакты як з аб'яднаннямі землякоў за мяжой, так і з паасобнымі суайчыннікамі застаюцца прыярытэтнымі накірункамі дзейнасці. Яе абсягі пашырыліся за кошт беларусаў, што жывуць у краінах СНД і Балтыі, у Польшчы. Значны уклад зроблены таварыствам у будаўніцтва музея беларускай культуры ў Гайнаўцы. Новы напрамак работы таварыства — арганізацыя і каардынацыя гуманітарнай дапамогі ад замежных суайчыннікаў жыхарам Беларусі, якія пацярпелі ад Чарнобыльскай катастрофы 1986 г.

Вацлаў Мацкевіч

Беларускае таварыства ў Петраградзе па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны

Дабрачынная арганізацыя для аказання дапамогі бежанцам-беларусам у Першую сусветную вайну. Існавала са студзеня 1916 да пачатку 1918 г. Заснавальнікі Б. Эпімах-Шыпіла, Ч. Родзевіч, А. Ярэміч, У. Міткевіч. На ўстаноўчым сходзе 31 студзеня 1916 г. у члены таварыства ўступіў 21 чал., у т. л. Ф. Абрантовіч, Л. Адамовіч, В. Арэнь, Ф. Будзька, А. і С. Валейкі, А. Гагалінскі, З. Жылуновіч, Я. Кавецкая. Б. і В. Лемешы, С. Станкевіч, М. і У. Сталыгвы, Л. Хвецька. У камітэт таварыства былі выбраны Л. Сеўрук (старшыня), А. Ярэміч (нам. старшыні), М. Мігай (нам. старшыні), Э. Будзька (сакратар), А. Беніцэвіч, М. Дзевялтоўская-Гінтаўт, Ч. Родзевіч, Б. Тарашкевіч, Б. Эпімах-Шыпіла і інш. Таварыства аказвала дапамогу грашыма і рэчамі, адкрыла інтэрнаты ддя беларускіх студэнтаў і вучняў, дзіцячы прытулак, кравецкую майстэрню, выдавала лістоўкі з заклікам ахвяраваць грошы для бежанцаў, у т. л. "Пагалелым ад вайны беларусам памажыце!". Наладжвала "Беларускія вечарыны". Падтрымлівала сувязі з Мінскім аддзелам Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, Беларускім нацыянальным камітэтам у Мінску. Імкнулася пашырыць уплыў на ўсю тэрыторыю Расіі, дзе знаходзіліся бежанцы. У снежні 1917 г. камітэт таварыства перавыбраны, у яго ўвайшлі і члены Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі А. Чарвякоў, А. Усціловіч (Усціновіч) і інш. Спыніла дзейнасць са стварэннем Беларускага нацыянальнага камісарыята. Архіў таварыства захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (ф. 672) і Гістарычным архіве г. Санкт-Пецярбурга (ф. 1935), спіс членаў — у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (ф. 511, воп. 1, спр. 8, л. 1–2 адв.). Гл. таксама арт. *Бежанцы.*

Віталь Скалабан

Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа (БТЧК)

Існавала з красавіка 1921 да сярэдзіны 1922 г. на тэрыторыі Літвы. Утворана на аснове Жэнеўскай канвенцыі 22 жніўня 1864 г. аб таварыствах Чырвонага Крыжа. Статутныя мэты: аказанне медыцынска-санітарнай, матэрыяльнай і маральнай дапамогі беларускім ваеннапалонным, бежанцам, эмігрантам, хворым, сіротам, усім пацярпелым ад ваенных дзеянняў, садзеянне ў рээміграцыі на бацькаўшчыну. БТЧК знаходзілася ў Коўне ў атэлі "Метраполь". Старшыня таварыства Я. Варонка, віцэ-старшыні І. Цвікевіч і Н. Ліпоўскі, скарбнік П. Мядзёлка. Яднала 32 чал. Мела аддзяленні і прадстаўніцтвы ў Берліне (А. Бароўскі), на Гродзеншчыне (С. Баран-Нямір), у Вільні (А. Карабач), Празе (М. Вяршынін), Рызе (К. Езавітаў), Канстанцінопалі, Амерыцы. Дабрачынны фонд фарміраваўся са збораў ад грамадска-культурных мерапрыемстваў з ахвяраванняў прыватных асоб, дзяржаўных

і грамадскіх арганізацый. БТЧК супрацоўнічала з эміграцыйным урадам Беларускай Народнай Рэспублікі ў Коўне, урадавымі ўстановамі Літвы, Літоўскім таварыствам Чырвонага Крыжа. Займалася выдавецкай дзейнасцю, у 1921 г. выпусціла тры маркі серыі "Беларусь. Пошта", збор ад іх продажу пайшоў на дабрачынныя мэты.

Юрый Васілеўскі

Беларускае таварыства Чырвонага крыжа ў Каўнасе

Нацыянальная грамадская арганізацыя ў Літве. Створана ў красавіку 1921 г. Налічвала тады каля 30 сяброў. Мэты таварыства — матэрыяльная і маральная дапамога ў першую чаргу ўсім беларускім грамадзянам, незалежна ад іх нацыянальнасці і веры, якія пацярпелі ад вайны, недародаў, эпідэмій; дапамога беларускім грамадзянам, якія знаходзіліся ў палоне, турмах, эмігрантам, шырокая арганізацыя дапамогі дзецям. У склад кіраўніцтва таварыства ўваходзілі Я. Варонка (старшыня), А. Цвікевіч (віцэ-старшыня), Н. Ліпоўскі (віцэ-старшыня), П. Мядзёлка (скарбнік), А. Галавінскі (сакратар). Мела сімволіку — чырвоны крыж на белым полі. Арганізавала сетку прадстаўніцтваў за мяжой — у Германіі (кіраўнік А. Бароўскі), Чэхаславакіі (М. Вяршынін), Латвіі (К. Езавітаў), ЗША (А. Бубешка), а таксама на Гродзеншчыне (С. Баран) і Віленшчыне (А. Карабач). Сродкі збірала шляхам ахвяраванняў, грашовых пазык і іншых збораў, арганізацыі канцэртаў, лекцый, відовішчаў. Аказвала падтрымку жыхарам Заходняй Беларусі, выступала ў падтрымку барацьбы беларускага народа за нацыянальнае вызваленне і аб'яднанне ў адзінай дзяржаве. Пасля 1922 г. лёс невядомы.

Аляксандр Ціхаміраў

Беларускае цэнтральнае бюро пры Народным камісарыяце асветы РСФСР

Орган па каардынацыі і кіраванню сістэмай нацыянальных адукацыйных і культурна-асветных устаноў беларускага насельніцтва ў РСФСР (у т. л. на этнічна беларускіх тэрыторыях). Утворана ў 1921 г. па хадайніцтву Паўнамоцнага прадстаўніцтва БССР пры ўрадзе РСФСР. Кіравалася пастановамі, дырэктывамі і інструкцыямі па нацыянальнаму пытанню і асвеце нацыянальных меншасцей ЦК РКП(б), Наркамата па справах нацыянальнасцей РСФСР, калегіі Наркамата асветы РСФСР, Цэнтральнага савета па асвеце народаў нярускай мовы (Саўнацмен) пры Наркамаце асветы РСФСР, галоўных упраўленняў Наркамата асветы РСФСР па прафадукацыі і сацыяльным выхаванні. Уваходзіла ў склад Саўнацмена пры Наркамаце асветы РСФСР на правах беларускага аддзела. Фінансавалася з бюджэтаў Наркамата асветы РСФСР і БССР. Загадчык М. Лойка (да лета 1927), пазней Н. Каляда. Актывісты У. Дубоўка, Ю. Вольскі, С. Шышова, І. Крыцкі, Мянькоўскі. У ліпені 1921 г. распрацавала план работы. Дзякуючы садзейнічанню бюро ў 1921–1922 гг. былі адкрыты беларускія секцыі пры Віцебскім, Гомельскім, Смаленскім аддзелах народнай асветы, арганізаваны беларускія культурна-асветныя ўстановы ў Сібіры і Петраградзе, праводзіліся перыядычныя месячныя беларускія курсы Наркамасветы РСФСР па падрыхтоўцы настаўнікаў беларускіх школ у Мінску, губернскія летнія курсы беларускіх настаўнікаў у Гомелі і Смаленску. Да 1926 г. пры ўдзеле бюро было створана каля 200 беларускіх школ розных ступеняў, клубаў, хат-чытальняў, пунктаў па ліквідацыі непісьменнасці. Бюро забяспечвала беларускія ўстановы вучэбнай, палітычна-асветнай і мастацкай беларускамоўнай літаратурай, вырашала арганізацыйныя, кадравыя і фінансавыя пытанні беларускіх секцый і інш. падначаленых устаноў. Яно дамаглося ўвядзення курса беларусазнаўства ў праграмы некаторых ВНУ Смаленска, Сібіры і інш. Пры дапамозе Цэнтральнага дзяржаўнага выдавецтва народаў СССР выпускала ў Маскве падручнікі для школ і інш. літаратуру. Праводзіла канферэнцыі беларускіх настаўнікаў РСФСР, вучняў беларускіх школ. У 1930 г. было ліквідавана з перадачай функцый інспектару па асвеце нацыянальных меншасцей Наркамасветы РСФСР.

Юрый Васілеўскі, Аляксандр Ціхаміраў

Беларуская абшчына Львоўшчыны

Беларуская абшчына Львоўшчыны, якая з'яўляецца культурна-грамадскай арганізацыяй, зарэгістравана 26 снежня 1999 г. Галоўныя яе статутныя органы — агульны сход, Рада. Староста абшчыны — Сяргей Кулікоў. Асноўная мэта дзейнасці — аб'яднанне беларусаў і грамадзян іншых нацыянальнасцей Львоўскай вобл. для задавальнення і абароны сваіх законных нацыянальна-культурных, моўных, адукацыйных, асветніцкіх, сацыяльна-эканамічных і іншых агульных інтарэсаў. Абшчына налічвае (2000 г.) больш за 100 актывістаў. Сябрамі абшчыны могуць быць калектывы і асобы, якія дасягнулі 14-ці гадоў незалежна ад нацыянальнасці, сацыяльнага стану, палітычных поглядаў, веравызнання і якія лічаць беларускую мову роднай, прызнаюць статут арганізацыі і па магчымасці падтрымліваюць яе матэрыяльна. Па асноўных напрамках дзейнасці абшчыны створаны групы: медыцынская, прававая, педагагічная, гуманітарнай дапамогі, маладзёжная, мастацкага выхавання, ветэранаў вайны і працы. Арганізацыя атрымлівае дапамогу ад дзяржаўных устаноў горада і вобласці, наладжвае кантакты

з Львоўскай епархіяй Украінскай праваслаўнай царквы, дзелавыя адносіны з рускай, грэчаскай і габрэйскай суполкамі, Саюзам беларусаў на Украіне. Падтрымлівае цесныя сувязі з Пасольствам Беларусі на Украіне, мае дамоўленасці аб супрацоўніцтве з Дзяржаўным камітэтам па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь.

Інтэлектуальны патэнцыял членаў абшчыны дазваляе арганізаваць работу клубаў, гурткоў, секцый і груп па інтарэсах. Савет суполкі плануе ў бліжэйшыя месяцы пачаць выданне сваёй штомесячнай газеты, атрымаць эфірны час для штотыднёвай радыёперадачы і адкрыць нядзельную беларускую школу для дзяцей і дарослых па вывучэнню гісторыі этнічнай радзімы, беларускай культуры, мовы і літаратуры, а таксама паглыбленню ведаў па ўкраінскай мове і літаратуры. Таварыства займаецца культурна-грамадскай і дабрачыннай дзейнасцю, ладзіць разнастайныя святы, вечарыны, дапамагае і падтрымлівае адзінокіх, хворых, старых людзей. Набыты вопыт аказання харчовай гуманітарнай дапамогі членам суполкі.

Сяргей Кулікоў (Львоў), Галіна Сяргеева

Беларуская абшчына "Світанак"

Грамадская арганізацыя беларусаў у Кыргызстане.

Заснавана 20 студзеня 1993 г. беларусамі, якія пражываюць у Бішкеку, з дапамогай Пасольства Рэспублікі Беларусь. Мае свой статут, зарэгістравана Міністэрствам юстыцыі Кыргызскай Рэспублікі 27 красавіка 1993 г. Яе арганізатарамі былі С. Б. Руцкі, А. С. Шут, А. У. Тумар, А. І. Сталяроў, Н. А. Міронава, Л. Г. Матвеева, Е. П. Міхайлава, Г. З. Скробут. Беларуская абшчына аб'яднала беларусаў, якія пражываюць у Кыргызстане (цяпер каля 6,5 тыс. чалавек) для таго, каб у далечыні ад радзімы ў нейкай меры зберагчы родную мову, культуру і духоўнасць.

Дзейнасць абшчыны накіравана таксама на тое, каб даваць кансультацыі па розных пытаннях, у тым ліку аб правах нацыянальных меньшасцей, а таксама аб парадку прыняцця беларускага грамадзянства тымі, хто хоча выехаць на пражыванне ў Беларусь. Сябры абшчыны дапамагаюць перакладаць на беларускую мову патрэбныя для гэтага дакументы.

Рада Беларускай абшчыны "Світанак" актыўна ўдзельнічае ва ўсіх сустрэчах, мерапрыемствах, якія праводзяць грамадскія арганізацыі, урад і Асамблея народаў Кыргызстана для развіцця сяброўскіх сувязей з усімі народамі, пражываючымі на яго тэрыторыі. Рада падтрымлівае сувязі з Цэнтрам нацыянальных культур, з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, якая рэгулярна дасылае кнігі для бібліятэкі абшчыны, а таксама з Таварыствам "Радзіма". З 1997 г. з-за разыходжанняў у палітычных поглядах абарваліся сувязі Беларускай абшчыны "Світанак" са Згуртаваннем беларусаў свету "Бацькаўшчына".

Абшчына мае вакальную групу "Світанак", якая выконвае народныя песні на беларускай мове.

Старшынёй абшчыны з'яўляецца А. С. Шут, старшынёй Рады ў 1993–1995 гг. — А. І. Сталяроў, у 1995–1996 гг. — І. Н. Ахраменка, з 1996 г. — Н. А. Міронава.

Ніна Міронава (Бішкек)

Беларуская вучнёўская грамада

Беларуская вучнёўская грамада ў Калузе, грамадская арганізацыя існавала ў 1918 г. Заснавана вучнямі навучальных устаноў, эвакуіраваных з тэрыторыі Беларусі ў час Першай сусветнай вайны. 18 чэрвеня 1918 г. зарэгістравана Беларускім нацыянальным камісарыятам. Асноўная мэта — аб'яднанне вучняў-беларусаў усіх навучальных устаноў на нацыянальнай культурна-асветнай глебе. Вышэйшы орган — агульны сход сяброў, выканаўчы — выбарнае праўленне (5 членаў і 2 кандыдаты). Старшыня праўлення П. Сліжэўскі, сакратар А. Раманчук, актывісты Л. Сушко, В. Кузьміцкая. Арганізоўвала лекцыі і даклады, праводзіла культурныя мерапрыемствы. Працавалі літаратурная і драматычная секцыі, бібліятэка. Мела аддзелы пры асобных навучальных установах.

Юрый Васілеўскі

Беларуская гандлёвая палата ў Кіеве

Нацыянальная грамадска-эканамічная арганізацыя на Украіне. Створана ў красавіку 1918 г. Адразу пасля заснавання наладзіла кантакты з Народным сакратарыятам БНР у Мінску і атрымала статус установы БНР. Народны сакратарыят зацвердзіў статут і штат палаты (М. Доўнар-Запольскі — старшыня, Г. Базарэвіч, Т. Бурчак). Ад палаты патрабавалася адыгрываць ролю пасрэдніка ў беларуска-ўкраінскім гандлі, абараняць інтарэсы беларускіх гандляроў і вытворцаў на Украіне, прадастаўляць зацікаўленым асобам неабходную інфармацыю. Яна атрымлівала даручэнні на закупку тавараў на Украіне і на продаж беларускіх тавараў украінскім фірмам і прыватным асобам, вывучала магчымасці развіцця гандлю з Аўстра-Венгрыяй, Румыніяй, Донам, Кубанню і іншымі паўднёвымі рэгіёнамі Расіі. Супрацоўнікі палаты падрыхтавалі праект генеральнай дамовы аб гандлі з Украінскай Народнай Рэспублікай (заключаны не быў). Ад імя палаты былі падпісаны некалькі прыватных пагадненняў з

міністэрствам гандлю і прамысловасці УНР, атрыманы дазвол на пастаўку ў Беларусь цукру і збожжа узамен на прадукцыю лесаперапрацоўчых прадпрыемстваў. Супрацоўнікі палаты намераваліся утварыць рэгістрацыйныя пункты ў Мазыры, Лунінцы, Рэчыцы, Гомелі, Полацку, Оршы. Палата супрацоўнічала з консульствам БНР у Кіеве, беларускімі арганізцыямі на Украіне. Яе дзейнасці перашкаджалі германскія акупацыйныя ўлады на Украіне, якія, аднак, абяцалі не рэквізаваць набытыя ёю тавары. У лютым 1919 г. дзейнасць палаты спынілася.

Аляксандр Ціхаміраў

Беларуская грамада ў Коўне

Нацыянальная грамадская арганізацыя. Утворана ў 1917 г. Мела на мэце аб'яднанне беларускага насельніцтва г. Коўна (Каўнаса, Літва) і яго наваколляў дзеля абароны сацыяльна-эканамічных інтарэсаў і спрыяння рэалізацыі беларускіх нацыянальных ідэалаў. Мела статут, які прадугледжваў адкрыццё беларускіх школ, дзіцячых прытулкаў, бальніц і кааператываў, выпуск літаратуры, канцэртную і тэатральную дзейнасць. Пры грамадзе існаваў гурток моладзі. Выканаўчым органам грамады была рада, актывістам якой быў Р. Казячы. У 1918 г. спыніла існаванне.

Юрый Васілеўскі, Аляксандр Ціхаміраў

Беларуская народная грамада

Беларуская народная грамада, БНГ, грамадска-палітычная, культурна-асветная і дабрачынная арганізацыя, якая дзейнічала ў 1917—1918 гг. у Расіі сярод ураджэнцаў Беларусі. Заснавана 9 мая 1917 г. на мітынгу ў Маскоўскім універсітэце па ініцыятыве групы беларускіх інтэлігентаў (больш як 130 чал.). Узначальвалі археолаг Я. І. Васілевіч, адвакат А. І. Цвікевіч, выкладчык гімназіі Ф. Ф. Турук і інш. Да лета 1917 г. налічвала больш за 1 тыс. членаў. Аб'ядноўвала прадстаўнікоў розных класаў і сацыяльных груп беларускай нацыі, асноўны кантынгент складалі бежанцы. Мела аддзелы ў Калузе, Сарататве, Тамбове, Сестрарэцку і інш. На правах секцый БНГ дзейнічалі гурткі прафесараў, настаўнікаў, студэнтаў, праваслаўнага духавенства.

У аснову палітычнай платформы БНГ было пакладзена патрабаванне аўтаноміі Беларусі ў складзе Расіі, якая павінна быць абвешчана федэратыўнай рэспублікай з аднапалатным парламентам, выбраным на падставе ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні. БНГ выказвалася за роўнасць усіх грамадзян перад законам, недатыкальнасць асобы, свабоду сумлення, слова, друку, сходаў, саюзаў, стачак і г. д.; выбарнасць і падсправаздачнасць усіх службовых асоб і незалежнасць суда; аддзяленне царквы ад дзяржавы; права ўсіх народаў Расіі, у т. л. беларускага, карыстацца роднай мовай у сферы адукацыі, самакіравання і суда. Выступала за пераход усёй зямлі ў агульна-народную ўласнасць "з правам карыстаць з яе тым, хто сам на ёй працуе", заканадаўчую ахову працы ва ўсіх галінах вытворчасці, паступовую адмену ўсіх ускосных падаткаў і ўстанаўленне прагрэсіўнага падатку на даходы, маёмасць і спадчыну; бясплатную абавязковую адукацыю для ўсіх дзяцей да 16 гадоў. У якасці канкрэтных форм сваёй работы БНГ намячала арганізацыю палітычных клубаў, правядзенне сходаў, мітынгаў, чытанне лекцый, адкрыццё музеяў, тэатраў, бібліятэк, дабрачынных устаноў (спажывецкіх крам, сталовых, прытулкаў, шпіталяў). Выстаўляла патрабаванне неадкладна заснаваць у адным з гарадоў Беларусі універсітэт, наладзіць выдавецкую справу. У чэрвені 1917 г. выступіла з пратэстам супраць прадстаўніцтва польскім памешчыкам А. Э. Мейштовічам інтарэсаў Беларусі на Асобай нарадзе па выпрацоўцы праекта палажэння аб выбарах ва Устаноўчы сход. У ліпені 1917 г. прадстаўнікі БНГ прынялі ўдзел у з'ездзе беларускіх нацыянальных арганізацый і партый у Мінску. Па ініцыятыве БНГ 24—27 верасня 1917 г. у Маскве праведзены Першы Усерасійскі з'езд бежанцаў-беларусаў, на якім прысутнічалі дэлегаты з 14 губерняў Расіі. На з'ездзе БНГ спрабавала аб'яднаць пад сваім кіраўніцтвам усе беларускія нацыянальныя арганізацыі, але сутыкнулася з рэзкім процідзеяннем з боку Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ). У выніку канфлікту фракцыя БСГ пакінула з'езд, адхіліўшы прапанову БНГ аб выпрацоўцы сумеснай тактыкі на выбарах ва Устаноўчы сход. 19—21 лістапада 1917 г. па ініцыятыве БНГ у Маскве праведзены Другі з'езд бежанцаў-беларусаў. На выбарах ва Устаноўчы сход выстаўляла кандыдатаў па Магілёўскай выбарчай акрузе ў блоку з Магілёўскім беларускім камітэтам, Народным беларускім камітэтам (Орша) і Саюзам беларускай дэмакратыі (Гомель), але не дасягнула поспеху. Удзельнічала ў падрыхтоўцы і правядзенні Усебеларускага з'езда. У лютым 1918 г. у звароце "Да ўсіх народаў Расіі і дэмакратыі ўсяго свету" ад імя бежанцаў з Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губерняў асудзіла прэтэнзіі аўстра-германскай дэлегацыі на мірных перагаворах у Брэсце на беларускія землі, адстойвала прынцып непадзельнасці Беларусі, права беларускага народа на дзяржаўнае самавызначэнне ў складзе Расійскай федэратыўнай рэспублікі. Да лета 1918 г. БНГ паступова спыніла дзейнасць.

Станіслаў Рудовіч

Беларуская нацыянальна-палітычная нарада ў Рызе (Рыжская нарада беларускай эміграцыі)

Адбылася ў Рызе 20.10.1920 г. У рабоце нарады ўдзельнічалі 15 чалавек (у т. л. К. Дуж-Душэўскі, Я. Мамонька, Я. Варонка, В. Захарка, П. Крачэўскі, А. Цвікевіч, В. Ластоўскі, К. Езавітаў, А. Аўсянік), якія прадстаўлялі беларускія цэнтры Вільні, Германіі, ЗША, Латвіі, Літвы, Польшчы, Украіны, Францыі, Чэхаславакіі. Удзельнікі нарады былі членамі Партыі беларускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў, Беларускай партыі сацыялістаў-федэралістаў, Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі. На нарадзе былі заслуханы даклады з месцаў і інфармацыя аб агульнай сітуацыі. Удзельнікі нарады выказаліся ў падтрымку ўрада БНР на чале з В. Ластоўскім, прызнаўшы яго дзеянні, накіраваныя на абарону незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі, "правільнымі, канешнымі і згоднымі з воляй усяго Беларускага Народу" і па прапанове В. Ластоўскага прынялі зварот да беларускага народа.

Нарада прыняла рэзалюцыі ў адносінах да утварэння Сярэдняй Літвы і да прэлімінарнага мірнага дагавора паміж РСФСР і Польшчай, які быў заключаны ў Рызе 12.10.1920 г. Удзельнікі нарады расцанілі ўтварэнне Сярэдняй Літвы як "палітычную авантуру і шантаж" і падкрэслілі, што Рыжскі мірны дагавор ад 12.10.1920 г. не можа лічыцца сапраўдным для Беларусі, паколькі яе прадстаўнікі адсутнічалі на перагаворах. Удзельнікі Рыжскай нарады патрабавалі ад Польшчы і РСФСР дапусціць прадстаўнікоў БНР на далейшыя перагаворы і выказвалі намер "усімі спосабамі і сродкамі весці барацьбу і далей за незалежнасць і непадзельнасць Беларускай Народнай Рэспублікі з усімі яе ворагамі".

Аляксандр Ціхаміраў

Беларуская рада ў Адэсе

Нацыянальная грамадска-палітычная арганізацыя, створаная 19 сакавіка 1918 г. на аб'яднаным пасяджэнні рады арганізацыі "Беларускі гай" і Беларускай вайсковай рады. Налічвала 50 сяброў. Старшынёй рады быў абраны праф. Сапожка. Садзейнічала арганізацыі беларускага насельніцтва Адэсы і наваколля, праводзіла нацыянальную культурна-асветную работу ў яго асяроддзі. Выступала з пазіцый незалежнасці і непадзельнасці Беларусі, прапагандавала гэтую ідэю ў масах пры дапамозе прэсы, адозваў, плакатаў, лекцый, спектакляў і да т. п. 7 красавіка 1918 г. прыняла пастанову, у якой асуджала заключэнне Брэсцкага міру, заклікала беларускі народ да супраціўлення і патрабавала неадкладнага склікання II Усебеларускага з'езда для разгляду становішча Беларусі і абароны права беларусаў на свабоднае існаванне. Арганізавала Беларускае культурна-асветнае таварыства ў Адэсе, якое ладзіла лекцыі, спектаклі, вечарыны (пры таварыстве дзейнічалі тэатральная група і хор). У памяшканні рады была арганізавана бібліятэка-чытальня.

Выканаўчым органам рады з'яўляўся Беларускі нацыянальны камісарыят (БНК), створаны 19 сакавіка 1918 г. У склад БНК уваходзілі Я. Трафімаў (старшыня да ліпеня 1918 г.), С. Некрашэвіч (старшыня з ліпеня 1918 г.), А. Баліцкі (пам. камісара і ўпаўнаважаны па нацыянальна-палітычных справах), Г. Козел (упаўнаважаны па ваенных справах), П. Гудзень (упаўнаважаны па эвакуацыі бежанцаў-беларусаў), П. Ільючонак (упаўнаважаны па аб'яднанню славянства), С. Янушкевіч (скарбнік), А. Ляжневіч (сакратар), І. Мацюкевіч (сакратар), П. Пячонкін (сакратар). З красавіка 1918 г. БНК кантактаваў з урадам БНР і ў маі 1918 г. атрымаў ад яго паўнамоцтвы дыпламатычнай установы БНР да прызначэння ў Адэсу консула БНР. Дапамагаў бежанцам-беларусам на Украіне, спрыяў арганізацыі Адэскага камітэта дапамогі пацярпелым ад вайны. Па заданню БНК яго прадстаўнікі выязджалі ў Екацярынаслаў і Елізаветград для арганізацыі беларускага насельніцтва. БНК супрацоўнічаў з урадам Украінскай Народнай Рэспублікі. Вясной 1918 г. дамагаўся ад яго садзейнічання ў арганізацыі вайскоўцаў-беларусаў і накіраванні іх на бацькаўшчыну, выступаў супраць запланаванай перапраўкі на Беларусь польскіх легіёнаў, сфарміраваных на Украіне. Сябры БНК патрабавалі таксама прадстаўлення беларусам на Украіне культурна-нацыянальнай аўтаноміі (прапанова была адхілена ўкраінскім урадам). У 1918 г. сябры БНК кантактавалі з прадстаўнікамі аўстра-германскай акупацыйнай адміністрацыі ў Адэсе. Пасля заняцця Адэсы войскамі Антанты ў студзені 1919 г. кіраўніцтва БНК звярталася да галоўнакамандуючага саюзнымі арміямі ў Расіі генерала Бертэльё з просьбай дапамагчы ў арганізацыі Беларускай (Заходняй) арміі. Дзейнасць Беларускай рады і БНК у Адэсе была спынена ў лютым 1920 г. (па іншых звестках — у ліпені 1920).

Аляксандр Ціхаміраў

Беларуская секцыя

Беларуская секцыя пры Выбарчай акцыі палякаў Літвы (ВАПЛ), палітычная арганізацыя. Секцыя існуе з 1994 г. У яе складзе 10 асоб. Узначальвае секцыю М. Матусевіч. Двойчы (1994, 1997) па спісу ВАПЛ дэпутатам Вільнюскага раённага самакіравання абіраўся сябра ТБК Ю. Гіль.

Галіна Сяргеева

Беларуская секцыя пры Адэскім губернскім аддзеле народнай асветы

Беларуская секцыя пры Адэскім губернскім аддзеле народнай асветы існавала з 1918 да 1923(?) г. Займалася культурна-асветнай работай сярод беларускіх бежанцаў Першай сусветнай вайны ў Адэсе (у 1922 г. было каля 20 тыс.). Разам з Беларускай секцыяй пры Адэскім губкаме РКП(б) арганізавала беларускі рабочы клуб і на яго базе гурткі гістарычна-літаратурнай і палітычнай граматы, беларускі хор, трупу артыстаў. Пад кіраўніцтвам секцыі ў 1922 г. працавалі 6 беларускіх школ, у т. л. 2 школы-камуны (400 вучняў). Арганізавала і кіравала беларускім дзіцячым прытулкам (1919—1922), дзіцячым тэатрам і хорам. З 1921 г. супрацоўнічала з Беларускім цэнтральным бюро пры Народным камісарыяце асветы РСФСР. У секцыі працаваў вучоны і дзяржаўны дзеяч Беларусі С. Некрашэвіч, секцыі дапамагалі дзяржаўныя дзеячы Беларусі А. Баліцкі, П. Іллючонак, Л. Рытар і інш.

Юрый Васілеўскі

Беларуская секцыя пры Смаленскім губернскім бюро народнай асветы

Дзяржаўная культурна-асветная ўстанова ў РСФСР, створаная па рашэнню Цэнтральнага Савета па асвеце народаў нярускай мовы (Саўнацмен) пры Наркамаце асветы РСФСР у 1922 г. Непасрэдна падпарадкоўвалася Беларускаму цэнтральнаму бюро пры Наркамасветы РСФСР і Саўнацмену пры Смаленскім губернскім аддзеле народнай асветы. Мела на мэце арганізацыю беларускіх школ, клубаў, інш. культурна-асветных устаноў. Займалася выяўленнем і даследаваннем раёнаў кампактнага пражывання беларусаў на тэрыторыі губерні, вывучала мэтазгоднасць выкладання беларускай мовы ў школах і ўстановах, рэгістравала настаўнікаў з веданнем беларускай мовы, хадайнічала аб накіраванні слухачоў на Цэнтральныя беларускія настаўніцкія курсы ў Мінску. У чэрвені 1923 г. была ліквідавана па рашэнню аддзела народнай асветы Смаленскай губ., у 1925 г. адноўлена пасля настойлівых захадаў Наркамасветы РСФСР, які склікаў спецыяльную нараду па беларускаму пытанню і па яе выніках прыняў пастанову. Яна абавязала мясцовыя ўлады карэнным чынам палепшыць задавальненне патрэб беларусаў у нацыянальнай адукацыі. У красавіку 1925 г. пры секцыі быў створаны Савет па асвеце беларусаў, які распрацаваў доўгатэрміновы план-сетку беларускіх школ на Смаленшчыне. У 1925/26 навучальным годзе пры дапамозе секцыі былі адкрыты першыя 2 беларускія школы і 2 пункты па ліквідацыі непісьменнасці. Летам 1926 г. арганізавала беларускую метадычную камісію на 1926/27 навучальны год (загадчык У. Ганчароў), распрацавала вучэбныя праграмы для школ па беларускай мове, геаграфіі, гісторыі, правяла губернскія летнія курсы беларускіх настаўнікаў. Спрыяла ўвядзенню курса беларусазнаўства на педагагічным факультэце Смаленскага універсітэта з мэтай падрыхтоўкі спецыялістаў для беларускіх школ і культурна-асветных устаноў Смаленшчыны (з верасня 1926), беларускіх аддзяленняў савецкай партшколы і рабфака Смаленскай губ. Пад кіраўніцтвам секцыі ў 1926/27 навучальным годзе ў Руднянскім, Рослаўльскім, Манастыршчынскім, Шумяцкім паветах працавала 21 беларуская школа з 652 вучнямі і гурток па вывучэнню беларускай мовы ў Заходнім упраўленні сувязі, у 1927/28 навучальным годзе (37 беларускіх школ. Супрацоўнічала з *Беларускім студэнцкім зямляцтвам у Смаленску*. Увосень 1927 г. секцыя была ліквідавана па рашэнню аддзела народнай асветы Смаленскай губ. (матыў — недахоп грошай на ўтрыманне ўсіх нацыянальных секцый губана). Яе функцыі і кіраўніцтва нацыянальнымі школамі былі перададзены інспектару па справах нацыянальных меншасцей губернскага аддзела народнай асветы.

Юрый Васілеўскі, Аляксандр Ціхаміраў

Беларуская філія

Беларуская філія Інфармацыйнай палаты народаў Літвы, грамадская арагнізацыя. Створана ў 1997 г. У яе складе 10 сяброў. Мэта філіі – інфармацыйны абмен, арганізацыя перадач беларускага радыё і тэлебачання ў Вільнюсе.

Галіна Сяргеева

"Беларуская хатка" ў Арле

Нацыянальная грамадская арганізацыя, заснаваная 29 кастрычніка 1917 г. на агульным сходзе беларусаў, якія у час Першай сусветнай вайны перасяліліся ў Арол і яго наваколле. Мела на мэце абарону правоў і інтарэсаў беларусаў, аказанне матэрыяльнай дапамогі, культурна-выдавецкую дзейнасць, падтрымку ідэі аўтаноміі Беларусі ў яе этнаграфічных межах. Кіруючым органам арганізацыі з'яўляўся савет, выканаўчым — праўленне ў складзе старшыні, намесніка старшыні, скарбніка і сакратара. Рэгістравала бежанцаў-беларусаў у Арле і Арлоўскай губерні, займалася дабрачыннай дзейнасцю, праводзіла культурна-асветныя мерапрыемствы. Кантактавала з Беларускай радай у Мінску, падзяляла накірунак яе дзейнасці. У чэрвені 1918 г. спрабавала наладзіць кантакты з

Беларускім нацыянальным камісарыятам, але ў выніку ідэйных разыходжанняў не знайшла з яго боку падтрымкі і восенню 1918 г. мусіла спыніць сваю дзейнасць.

Юрый Васілеўскі, Аляксандр Ціхаміраў

"Беларуская хатка" ў Петраградзе

Нацыянальная культурна-асветная грамадская арганізацыя, створаная па ініцыятыве Петраградскага аддзялення Беларускага нацыянальнага камісарыята і Петраградскай беларускай секцыі РКП(б) 19 кастрычніка 1918 г. з мэтай падрыхтоўкі кадраў для працы ў Беларусі. У канцы 1918 г. налічвала 207 чал. Арганізавала курсы па беларусазнаўству. У пачатку 1919 г. спыніла сваю дзейнасць у сувязі з вяртаннем значнай часткі актыву ў Беларусь.

Аляксандр Ціхаміраў

Беларуская чыгуначная грамада ў Маскве

Нацыянальная грамадска-палітычная і прафесійная арганізацыя, створаная беларусамі-бежанцамі ў 1918 г. Зарэгістравана Беларускім нацыянальным камісарыятам 25 мая 1918 г. Мела на мэце нацыянальна-культурнае адраджэнне Беларусі, развіццё прамысловасці, гандлю, асветы, удасканальванне і развіццё чыгуначнай сеткі і інш. шляхоў зносін у Беларусі, беларусізацыю чыгункі, абарону прафесійных і класавых інтарэсаў яе сяброў. Выступала за федэрацыю дэмакратычнай Беларусі з РСФСР, прадстаўленне ў Беларусі роўных правоў усім нацыям і рэлігіям, роўнае выбарчае права, выбарнасць судовай адміністрацыі, арганізацыю народнай міліцыі, нацыяналізацыю вытворчасці, свабоду забастовак, 8-гадзінны працоўны дзень, аддзяленне царквы ад дзяржавы, адкрыццё беларускіх ВНУ, увядзенне беларускай мовы ў адміністрацыйнае і судовае справаводства і сферу адукацыі. Мела свайго прадстаўніка ва Усерасійскім прафсаюзе чыгуначнікаў. У канцы 1918 г. грамада спыніла існаванне.

Юрый Васілеўскі, Аляксандр Ціхаміраў

Беларуская школа імя Францыска Скарыны ў Вільнюсе

У прыгожым раёне Вільнюса Каралінішках, па вуліцы Сеціна, 21, што ў перакладзе на беларускую мову азначае "Блакітнага промня", размешчана беларуская школа імя Ф. Скарыны. У школе больш 140 вучняў, 37 настаўнікаў. Дырэктар школы – Галіна Сівалава.

У канцы 80-х гг. у Вільнюсе пачала дзейнічаць нядзельная беларуская школа, у 1991 г. пры дзіцячым садку адкрыўся адзін першы клас, у наступным – ужо тры класы, у 1993 г. пачалі працаваць 12 беларускіх класаў пры рускай школе, у 1994 г. беларуская школа атрымала асобнае памяшканне дзяцячага садка. У 1995 г. адбыўся першы выпуск. Выпускнікі яе паспяхова вучацца ў ВНУ Беларусі і Літвы. Выкладанне амаль усіх прадметаў вядзецца на беларускай мове, геаграфія і гісторыя Літвы — на літоўскай. Узмоцнена з першага класа выкладаецца літоўская мова, з першага ж класа вывучаюцца дзве замежныя мовы – англійская і руская, у старэйшых, па жаданню вучняў, нямецкая або французская, латынь. У школе ёсць камп'ютэрны клас, бібліятэка, якая налічвае 7 тыс. экземпляраў кніг. Дзейнічаюць драмгурток, лялечны тэатр, ансамбль "Лянок", гурток керамікі. Беларуская школа ў Вільнюсе працягвае традыцыі Віленскай беларускай гімназіі.

Леакадзія Мілаш (Вільнюс)

Беларускі аддзел пры Міністэрстве асветы Латвіі

Нацыянальная культурна-асветная ўстанова, створаная 1 кастрычніка 1921 г. па ініцыятыве сяброў таварыства "Бацькаўшчына" ў Дзвінску. Прапанову беларускіх дзеячаў падтрымаў латышскі пісьменнік Ян Райніс, які тады з'яўляўся дэпутатам латвійскага Устаноўчага сейма. Першапачаткова аддзел складаўся з 2 чалавек (старшыні С. Сахарава і справавода Я. Шчорса). У 1922 г. штат яго быў павялічаны, у канцы года меў 6 супрацоўнікаў. У тым жа годзе ўрад Латвіі пашырыў фінансавую дапамогу аддзелу, які праводзіў значную работу па арганізацыі беларускага насельніцтва Латвіі: садзейнічаў адкрыццю беларускіх навучальных устаноў і кіраваў іх дзейнасцю, праводзіў штогадовыя настаўніцкія курсы, набываў і распаўсюджваў беларускія падручнікі. У жніўні 1923 г. супрацоўнікі аддзела склікалі II Канферэнцыю беларускіх настаўнікаў Латвіі. Аддзел падтрымліваў цесныя кантакты з таварыствам "Бацькаўшчына" ў Дзвінску.

Дзейнасць аддзела праходзіла ў складаных умовах. За спыненне яго фінансавання неаднаразова выступалі прадстаўнікі рускай і польскай абшчын. З падазронасцю ставіліся да аддзела і латвійскія чыноўнікі. З 1923 г.

латвійскія ўлады пачалі пераводзіць беларускія школы пад кантроль Агульнага дэпартамента па школьных справах, а ў 1925 г. спынілі дзейнасць аддзела. У 1927 г. ён аднавіў работу і, як раней, падтрымліваў беларускае школьніцтва ў краіне. Пасля ўсталявання ў Латвіі дыктатуры К. Ульманіса (1934) аддзел разам з іншымі беларускімі арганізацыямі быў ліквідаваны.

Аляксандр Ціхаміраў

Беларускі камітэт у Варшаве (Варшаўскі беларускі камітэт)

Нацыянальная грамадская арганізацыя. Створана ў маі 1919 г. на сходзе беларусаў, якія знаходзіліся тады ў Варшаве (пераважна ўраджэнцаў Заходняй Беларусі), а таксама палякаў—ураджэнцаў Беларусі. Мэты дзейнасці — азнаямленне польскай грамадскасці з праблемамі Беларусі, гуртаванне беларусаў Варшавы, садзейнічанне збліжэнню Польшчы і Беларусі. Кіраўнікамі камітэта былі М. Аб'язерскі (старшыня), Л. Дубейкаўскі (віцэ-старшыня), К. Гардзялкоўскі (пісар і скарбнік), П. Аляксюк, В. Цывінскі, Т. Галоўка, Ч. Янкоўскі, Р. Скірмунт, Б. Тарашкевіч, Э. Вайніловіч. У актыве камітэта — І. Гесэ, Г. Ляўковіч, Б. Ангяльчук, Ю. Саргон і Я. Саргон, Я. Арбуз, М. Новік, З. Тубялевіч. Дзеячы камітэта выступалі за ўтварэнне трывалага саюза паміж Польшчай і Беларуссю пры ўмове прызнання палякамі права на культурна-нацыянальнае самавызначэнне беларусаў. У студзені 1920 г. сябры камітэта звярталіся да Генеральнага камісара Усходніх зямель, патрабуючы ад яго паслядоўнага правядзення ў жыццё палажэнняў, выкладзеных у звароце Ю. Пілсудскага "Да жыхароў былога Вялікага Княства Літоўскага" ад 22 красавіка 1919 г. Яны патрабавалі таксама стварыць пастаянны Польска-беларускі камітэт пры Генеральным камісарыяце Усходніх зямель, пратэставалі супраць закрыцця навучальных устаноў у Беларусі, польскіх рэпрэсій супраць беларускіх нацыянальных дзеячаў. Разам з тым, у зваротах да грамадзян Беларусі сябры камітэта заклікалі падтрымліваць польскую армію, матывуючы гэта тым, што яна нясе беларусам "вызваленне і волю". Камітэт планаваў наладзіць трывалыя сувязі з беларускім насельніцтвам на тэрыторыях, якія знаходзіліся пад польскай акупацыяй, шляхам адкрыцця аддзяленняў на месцах, але пасля адступлення польскай арміі з Беларусі летам 1920 г. адмовіўся ад гэтай ідэі. Пасля 1921 г., ва ўмовах пагаршэння польска-беларускіх адносін, дзейнасць камітэта спынілася.

Аляксандр Ціхаміраў

Беларускі клуб у Маскве

Нацыянальная грамадская арганізацыя. Утворана ў лютым 1922 г. па ініцыятыве студэнтаў-беларусаў (пераважна сяброў Беларускай культурна-навуковай асацыяцыі пры Пятроўскай сельгасакадэміі), Галоўпалітасветы Наркамата асветы БССР і паўнамоцнага прадстаўніка БССР у РСФСР М. Мароза. Першапачаткова меў імя С. Булата. Падтрымліваў кантакты з Цэнтральным бюро Беларускага пралетарскага студэнцкага зямляцтва (восенню 1923 г. яно кіравала работай клуба). Сябры клуба чыталі лекцыі, праводзілі дыспуты, літаратурна-мастацкія вечарыны. Пры клубе працавалі бібліятэка (1200 кніг), літаратурны гурток (у 1920-я гг. — Маскоўскі філіял літаратурнага аб'яднання "Маладняк"), студэнцкія гурткі беларусазнаўства. З вясны 1930 г. загадчыкам клуба быў беларускі літаратар Д. Абакшонак, кіраўніком літаратурнага гуртка — паэт М. Дуброўскі. У 1920-я гг. клуб наведвалі Г. Гарэцкі, Ю. Гаўрук, У. Дубоўка, П. Жук, М. Кіеня, М. Лойка, М. Мароз, М. Міцкевіч; у пачатку 1930-х гг. — літаратары З. Астапенка, Ю. Віцьбіч, А. Жаўрук, А. Звонак, А. Кучар, М. Лужанін, У. Сядура, Ю. Таўбін, А. Ушакоў, Н. Чарнушэвіч, П. Шукайла, мастацтвазнаўца А. Ус і інш. У канцы 1930-х гг. (магчыма, у 1938-м) дзейнасць клуба была спынена.

Юрый Васілеўскі, Аляксандр Ціхаміраў

Беларускі навукова-літаратурны гурток

Беларускі навукова-літаратурны гурток студэнтаў Санкт-Пецярбургскага універсітэта, культурна-асветная арганізацыя ў 1912—1914 гг. Узнік на хвалі нацыянальна-вызваленчага руху народаў царскай Расіі на ўзор гурткоў студэнтаў іншых нацыянальнасцей. Афармiўся дзякуючы ініцыятыве студэнта фізіка-матэматычнага факультэта Я. Хлябцэвіча. У арганізацыйную групу ўваходзіла 16 чалавек. Статут гуртка быў зацверджаны саветам прафесараў універсітэта толькі 30 снежня 1912 г., хоць з яго праектам студэнты звярталіся ў рэктарат яшчэ ў 1905—1906 гг. Мэта гуртка — "навуковае азнаямленне з духоўным (мова, літаратура, народная славеснасць) і грамадскім (этнаграфія, статыстыка, народная гаспадарка) жыццём Беларусі". Кіраўнік гуртка — дацэнт А. Разенфельд, староста — студэнт гісторыка-філалагічнага факультэта Б. Тарашкевіч. Галоўная заслуга гуртка — навуковае абгрунтаванне неабходнасці развіцця беларускай мовы, літаратуры і культуры і значны ўклад студэнтаў у гэту справу. Яны распрацоўвалі тэмы: "Рукапісны альбом Вярыгі-Дарэўскага", "Фанетычная транскрыпцыя беларускіх твораў", "Развіццё беларускай нацыянальнай ідэі" (Тарашкевіч), "Беларуская народная музыка" (А. Грыневіч), "Адраджэнне беларускай народніцкай літаратуры" (Хлябцэвіч), "Вывучэнне старажытных гістарычных помнікаў

і ахова даўніны" (К. Душэўскі), "Беларуская бібліяграфія" (Р. Зямкевіч) і інш. Гурткоўцы выпусцілі нумар часопіса "Раніца" (1914), рыхтавалі часопіс "Сябра" (рукапіс 1-га нумара захоўваецца ў Цэнтральнай бібліятэцы Літоўскай АН), разам з суполкай "Загляне сонца і ў наша аконца" ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы альманаха "Маладая Беларусь" (1912—1913). Гурток падтрымлівалі І. Бадуэн дэ Куртэнэ, С. Вянгераў, Я. Карскі, А. Пагодзін, Е. Раманаў, А. Шахматаў і іншыя вядомыя вучоныя, пісьменнікі і грамадскія дзеячы. Некаторыя неафіцыйныя пасяджэнні гуртка адбываліся на кватэры Б. Эпімах-Шыпілы, куды прыходзілі студэнты-беларусы з іншых навучальных устаноў Пецярбурга, а таксама людзі розных прафесій, якія не мелі права наведваць пасяджэнні гуртка ва універсітэце. Гурток садзейнічаў ажыццяўленню ідэй асветніцкага характару, што выявілася ў прапагандзе беларускіх кніг, адкрыцці бібліятэк ў Беларусі, у т. л. Астрамечаўскай бібліятэкі імя Ф. Паўленкава, у развіцці беларускага тэатральнага мастацтва.

Рыгор Семашкевіч

Беларускі народны універсітэт у Маскве

Нацыянальная культурна-асветніцкая ўстанова. Створана 1 ліпеня 1918 г. у Маскве па ініцыятыве супрацоўнікаў Беларускага нацыянальнага камісарыята для падрыхтоўкі нацыянальных кадраў, здольных весці адукацыйную работу ў Беларусі. На вучобу ва універсітэт залічваліся настаўнікі народных і сярэдніх школ Беларусі, прадстаўнікі аддзелаў народнай адукацыі пры мясцовых Саветах, сябры беларускіх культурна-асветных арганізацый, іншыя асобы, якія цікавіліся праблемамі Беларусі. Заняткі праводзіліся штодзённа і былі бясплатнымі для слухачоў (аплочваліся БНК). Іншагароднія атрымлівалі жыллё, матэрыяльную дапамогу, ім таксама аплочваўся праезд да месца вучобы. У ліпені 1918 г. колькасць слухачоў універсітэта склала 109 чал. Загадваў універсітэтам П. Урбановіч. Перад слухачамі з лекцыямі па праблемах беларусазнаўства, сацыяльна-палітычных, агульнапедагагічных, прыродазнаўча-навуковых пытаннях выступалі У. Пічэта ("Гісторыя беларускага народа"), Я. Чапуркоўскі ("Антрапалогія беларусаў"), Я. Канчар ("Гісторыя нацыянальнага і рэвалюцыйнага руху на Беларусі"), А. Ясінскі ("Гісторыя адукацыі на Беларусі"), П. Растаргуеў ("Беларуская мова"), З. Жылуновіч ("Агляд беларускай літаратуры"), У. Дабравольскі ("Элементы тэатра ў народнай беларускай паэзіі"), А. Калмагораў, А. Мінін, А. Сабашнікаў, А. Фартунатаў і інш. Частка прачытаных лекцый выдадзена пад назвай "Курс беларусазнаўства" (1918–1920). Слухачы адначасова маглі наведваць лекцыі на Усерасійскіх настаўніцкіх курсах, арганізаваных Наркамасветы РСФСР. Планавалася, што універсітэт будзе працаваць да 1 верасня 1918 г., але па прычыне арганізацыйных і фінансавых цяжкасцей яго дзейнасць завяршылася 12 жніўня 1918 г.

Аляксандр Ціхаміраў

Беларускі нацыянальны гурток у Багародзіцку (Тульская губ.)

Грамадская культурна-асветная арганізацыя беларускіх бежанцаў Першай сусветнай вайны. Заснавана на агульным сходзе 17(30) красавіка 1917 г., існавала да лета 1918(?) г. Мэта — аб'яднанне "свядомых беларусаў розных губерняў". Старшыня М. Найбіч, сакратар Панасюк. Сябры гуртка арганізавалі чытанне лекцый па гісторыі і культуры Беларусі, паставілі ў Багародзіцку драматычны спектакль. Працавала беларуская бібліятэка і каса ўзаемадапамогі. У красавіку 1918 г. налічваў 17 сяброў і 20 прыхільнікаў, пераважна вучняў эвакуіраванай Ковенскай гаспадарчай школы. Вясной 1918 г. наладзіў сувязь з Беларускім нацыянальным камісарыятам.

Юрый Васілеўскі

Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацкам, Белнакам)

Аддзел Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцей РСФСР. Распачаў дзейнасць у Петраградзе па ініцыятыве левых беларускіх арганізацый (Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі, Петраградскага аддзела Беларускай сацыялістычнай грамады, беларускай секцыі пры ЦК левых эсэраў, беларускіх ваенных груп Кранштата і Фінляндыі). На нарадзе з удзелам прадстаўнікоў названых груп, якая адбылася 7(20) студзеня 1918 г. у Петраградзе, былі выбраны кандыдаты ў склад Беларускага нацыянальнага камісарыята. 31 студзеня (13 лютага) 1918 г. СНК РСФСР выдаў дэкрэт аб стварэнні Беларускага нацыянальнага камісарыята пры Народным камісарыяце па справах нацыянальнасцей РСФСР і зацвердзіў прапанаваны склад яго кіраўніцтва. На момант стварэння кіраўнікамі Белнацкама былі А. Чарвякоў (камісар), В. Скарынка (намеснік камісара), З. Жылуновіч (сакратар). У сакавіку 1918 г. у апараце Белнацкама працавала 10 чалавек. З сакавіка 1918 па сакавік 1919 г. супрацоўнікамі Белнацкама былі Г. Багдановіч, І. Баранкевіч, А. Вазіла, А. Грыневіч, І. Дварчанін, К. Душэўскі, П. Каравайчык, Я. Канчар, І. Лагун, І. Мазур, М. Мароз, В. Мачульскі, Ч. Родзевіч, Дз. Сабалеўкі, Б. Тарашкевіч, Ф. Турук, А. Усціловіч, Дз. Чарнушэвіч, Ф. Шантыр. Працаваў у цеснай сувязі з беларускімі секцыямі РКП(б). У маі-ліпені 1918 г. у дзейнасці Белнацкама важную ролю адыгрывалі члены беларускай секцыі пры ЦК партыі левых эсэраў (І. Пятровіч, М. Семяновіч, В. Чадовіч). У сакавіку 1918 г. Белнацкам разам з іншымі савецкімі

ўстановамі былі пераведзены ў Маскву. Складаўся з 6 аддзелаў (агітацыйна-палітычны, культурна-асветніцкі, бежанскі, выдавецкі, працы, ліквідацыйны) і канцылярыі. Меў аддзяленні ў Віцебску, Петраградзе (камісар І. Лагун), Смаленску, прадстаўнікоў у Арле, Калузе, Оршы, Сараташе, Тамбове. Вырашаў нацыянальна-культурныя і агітацыйна-палітычныя задачы. Вёў улік беларускіх арганізацый і ўстаноў, эвакуіраваных у час Першай сусветнай вайны, клапаціўся аб бежанцах і праводзіў сярод іх культурную і агітацыйную работу, адкрываў беларускія школы, клубы, гурткі. Заснаваў Беларускі народны універсітэт у Маскве, Вышэйшыя курсы па беларусазнаўству ў Петраградзе, удзельнічаў у стварэнні Беларускага навукова-культурнага таварыства ў Маскве, Беларускага вольнага эканамічнага таварыства і Таварыства ахвотнікаў беларускага народнага штукарства ў Петраградзе. Меў друкаваныя органы: першую савецкую газету на беларускай мове "Дзяньніца" і часопіс, орган Петраградскага аддзялення Белнацкама, "Чырвоны шлях". Выдаваў літаратуру на беларускай і рускай мовах, у т. л. альманах "Зажынкі", публіцыстычныя нарысы Я. Канчара, агітацыйныя брашуры і інш. Выступаў за нацыянальнае самавызначэнне беларускага народа на савецкай аснове і за федэрацыю Беларусі з РСФСР. Выступаў супраць Рады і ўрада Беларускай Народнай Рэспублікі. У красавіку-ліпені 1918 г. разам з беларускімі секцыямі РКП(б) арганізаваў шэраг выступленняў беларускага насельніцтва на неакупаванай немцамі тэрыторыі Беларусі і за яе этнічнымі межамі, у час якіх дзеячы БНР абвінавачваліся ў здрадзе беларускаму народу і спробе адарваць Беларусь ад Расіі. Адначасова вёў палеміку з дзеячамі Паўночна-Заходняга абкама РКП(б) і Аблвыканзаха (А. Мяснікоў, В. Кнорын; знаходзіліся ў Смаленску), якія выступалі супраць ідэі беларускай дзяржаўнасці і абвінавачвалі работнікаў Белнацкама ў "буржуазным нацыяналізме". У жніўні 1918 г. кіраўніцтва Белнацкама выступіла з ініцыятывай перайменавання Заходняй вобласці ў Беларускую вобласць, якая павінна была ахапіць этнічныя беларускія землі (першапачаткова свабодныя ад нямецкай акупацыі, а ў перспектыве і тыя, што былі акупаваны немцамі). Беларуская вобласць разглядалася як аўтаномная частка РСФСР. Да моманту склікання Усебеларускага з'езда Саветаў уся паўната ўлады на яе тэрыторыі павінна была перайсці да Цэнтральнага беларускага камісарыята. Ініцыятыва Белнацкама была падтрымана на сходах беларусаў (работнікаў Пуцілаўскага завода ў Петраградзе і маракоў Балтыйскага флоту). 23–24 жніўня 1918 г. па ініцыятыве Петраградскага аддзела Белнацкама ў Петраградзе была склікана Першая канферэнцыя беларускіх савецкіх арганізацый і партый (удзельнічалі прадстаўнікі мясцовых аддзелаў Белнацкама, маракоў Балтыйскага флоту, работнікаў Петраграда і Кранштата, петраградскай Беларускай секцыі РКП(б), сацыял-дэмакратаў (інтэрнацыяналістаў) і эсэраў, якая пастанавіла, што Беларусь павінна быць "шырокаўтаномнай дзяржаўнай адзінкай" і "ўвайсці ў вялікі федэратыўны Расійскі Саюз раўнапраўным сябрам". Пытанне аб стварэнні Беларускай Савецкай Рэспублікі ставілася работнікамі Белнацкама і ў лістападзе 1918 г. ва ўмовах паспяховага вызвалення тэрыторыі Беларусі з-пад нямецкай акупацыі. 15 лістапада 1918 г. на пасяджэнні калегіі Белнацкама было вырашана накіраваць членаў камітэта ў Оршу і іншыя вызваленыя мясцовасці Беларусі. У сувязі з гэтым адбылося скарачэнне апарату Белнацкама. Па стану на пачатак лістапада 1918 г. колькасць супрацоўнікаў Белнацкама складала 52 асобы (44 у цэнтральным апараце і 8 эмісараў на месцах), у снежні 1918 г. яна скарацілася да 32 асоб (24 асобы ў цэнтральным апараце і 8 эмісараў на месцах). 25 снежня 1918 г. наркам па справах нацыянальнасцей РСФСР І. Сталін сустрэўся з кіраўнікамі Белнацкама і прапанаваў ім вылучыць кандыдатаў у склад ўрада Беларускай Савецкай Рэспублікі і на пасаду старшыні ўрада. Увечары таго ж дня на аб'яднаным экстраным пасяджэнні членаў Калегіі Белнацкама, Цэнтральнага бюро беларускіх секцый РКП(б) і Камітэта Маскоўскай беларускай секцыі РКП(б) былі вызначаны кандыдаты ў склад Часовага ўрада Беларускай Савецкай Рэспублікі (Жылуновіч — старшыня, У. Фальскі, Я. Дыла, Чарнушэвіч, А. Квачанюк, Чарвякоў, І. Пузыроў, Шантыр. У сакавіку 1919 г. Белнацкам быў скасаваны. Яго культурна-асветніцкі аддзел быў пераўтвораны ў Беларускі пададдзел аддзела асветы нацыянальных меншасцей Народнага камісарыята асветы РСФСР.

Аляксандр Ціхаміраў

Беларускі пададдзел Аддзела асветы нацыянальных меншасцей Народнага камісарыята асветы РСФСР

Дзейнічаў у Маскве з красавіка 1919 да сакавіка 1921 г. Створаны на базе культурна-асветнага аддзела Беларускага нацыянальнага камісарыята. Меў на мэце правядзенне культурна-асветнай работы сярод беларусаў. Загадчык — Ф. Турук, інструктар — Я. Хлябцэвіч (да кастрычніка 1919 г. у Кіеве, затым у Маскве). Пададдзелам выдадзены дапаможнік для настаўнікаў школ Беларусі "Курс беларусазнаўства" (1918–1920; частка лекцый, прачытаных у Беларускім народным універсітэце), першы на рускай мове зборнік Я. Купалы "Выбраныя вершы ў перакладах рускіх паэтаў" (1919), "Нарысы беларускай літаратуры" (1920, рэд. М. Янчук), "Этнаграфічная карта беларускага племя" Я. Карскага (1920). Падтрымліваў сувязі з Я. Купалам, намеснікам наркома асветы Літоўска-Беларускай ССР А. Чарвяковым, вучнямі навучальных устаноў у Горках (сярод іх Г. Гарэцкі), акадэмікам А. Шахматавым. У Кіеве Хлябцэвіч вёў перамовы з М. Доўнар-Запольскім пра выданне яго прац "Гісторыя Беларусі" і "Паны і мужыкі ў мінулым Беларусі", прадажу бібліятэкі Беларускаму універсітэту. Пададдзел удзельнічаў у арганізацыі БДУ, Беларускай драматычнай студыі ў Маскве.

Віталь Скалабан

Беларускі пасольскі клуб (БПК) у Варшаве

Беларуская нацыянальная дэпутацкая фракцыя ў Сейме Польшчы. БПК быў утвораны ў лістападзе 1922 г. Аб'ядноўваў 11 дэпутатаў (паслоў) ад Заходняй Беларусі. У склад клуба ўваходзілі прадстаўнікі розных палітычных плыняў: сацыял-дэмакраты (А. Аўсянік, П. Мятла, Б. Тарашкевіч, Ф. Ярэміч), сацыялісты-рэвалюцыянеры (С. Баран, У. Каліноўскі, С. Якавюк), незалежныя сацыялісты (С. А. Рак-Міхайлоўскі), хрысціянскія дэмакраты (А. Станкевіч), а таксама беспартыйныя (М. Какановіч, В. Рагуля). Старшынёй БПК быў Б. Тарашкевіч. Дэпутаты клуба падтрымлівалі кантакты з беларускімі прадстаўнікамі ў сенаце (В. Багдановіч, А. Назарэўскі, А. Уласаў), а таксама з сябрамі Беларускіх нацыянальных камітэтаў у Варшаве і Вільні. БПК абараняў сацыяльныя і нацыянальныя правы беларускага народа, быў у апазіцыі да польскай дзяржаўнай палітыкі, сумесна з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей (яўрэямі, украінацамі і інш.) змагаўся супраць паланізацыі, а з усімі дэмакратычнымі сіламі — за сацыяльныя гарантыі для працоўных. Першапачаткова асноўнымі метадамі работы БПК з'яўляліся праца ў сеймавых камісіях, выступленні з сеймавай трыбуны, запыты (інтэрпеляцыі) да польскага ўрада. У першай палавіне 1920-х гг. сябры БПК выпрацавалі праект аўтаноміі для Заходняй Беларусі з цэнтрам у Вільні (на разгляд сейма вынесены не быў), пад выглядам дэпутацкіх справаздач у беларускай прэсе і на публічных сходах спрабавалі арганізаваць беларускае насельніцтва, прынялі рашэнне штомесячна накіроўваць на патрэбы беларускага нацыянальнага руху (стварэнне школ, выпуск друкаваных выданняў, пасылка моладзі на вучобу за мяжу) 30 працэнтаў свайго заробку. Яны таксама дамагаліся ўз'яднання ўсёй Беларусі, выступалі за перагляд Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. У 1925 г. БПК выдаваў "Бюлетэнь Беларускага пасольскага клуба". Дзейнасць яго выклікала незадавальненне польскіх уладаў, па ініцыятыве якіх былі пазбаўлены мандатаў Каліноўскі (яго месца заняў сацыял-дэмакрат П. Валошын), Баран і Якавюк. Нежаданне польскіх улад улічваць інтарэсы беларусаў, перашкоды ў выкананні дэпутатамі-беларусамі сваіх паўнамоцтваў выклікалі паміж сябрамі БПК разыходжанні па пытаннях тактыкі. Частка паслоў лічыла неабходным больш радыкальныя дзеянні, устанавіла кантакт з Камуністычнай партыяй Заходняй Беларусі (КПЗБ). Летам і восенню 1924 г. Б. Тарашкевіч сустракаўся з яе кіраўнікамі. Сувязь паміж КПЗБ і левым крылом БПК падтрымліваў М. Гурын-Маразоўскі. У гэты ж час большасць сяброў БПК схілялася да думкі пра неабходнасць арыентацыі на СССР і БССР. У чэрвені 1925 г. адбыўся падзел БПК, са складу якога выйшлі прадстаўнікі левага крыла (Валошын, Мятла, Рак-Міхайлоўскі, Тарашкевіч), якія утварылі асобны сеймавы клуб — Беларускую сялянска-работніцкую грамаду. У БПК засталіся Аўсянік, Какановіч, Рагуля, Станкевіч, Ярэміч. Новым старшынёй БПК стаў Рагуля. У маі 1926 г. сябры БПК падтрымалі пераварот Ю. Пілсудскага, але хутка зноў перайшлі ў апазіцыю да польскіх уладаў. Пасля выбараў 4 сакавіка 1928 г. быў утвораны новы БПК, у склад якога ўвайшлі прадстаўнікі Беларускай хрысціянскай дэмакратыі і Беларускага сялянскага саюза П. Каруза, А. Стэповіч, Я. Станкевіч, К. Юхневіч, Ярэміч. БПК дзейнічаў паралельна з Беларускім пасольскім клубам "Змаганне", сябры якога выступалі з левых пазіцый. Дзейнасць БПК была скіравана на абарону агульнадэмакратычных, сацыяльных і нацыянальных інтарэсаў беларускага народа. Яго сябры выступалі з антыкамуністычных пазіцый, перашкаджалі спробам паставіць беларускі рух пад кантроль спецорганаў СССР. Дзейнасць БПК спынілася ў 1930 г. у сувязі з роспускам сейма і правядзеннем новых выбараў у польскі парламент.

Аляксандр Ціхаміраў

Беларускі цэнтр у Літве

Нацыянальная грамадская арганізацыя. Створана ў красавіку 1923 г. у Каўнасе (Коўна) па ініцыятыве В. Ластоўскага, які імкнуўся праз дзейнасць цэнтра дапамагчы беларусам у Літве і за яе межамі захаваць сваю нацыянальную адметнасць. Кіраўніком цэнтра быў Ластоўскі, у яго актыў ўваходзілі К. Душэўскі, А. Матач, В. Барысовіч. Сябры цэнтра займаліся культурна-асветнай дзейнасцю. Да сакавіка 1927 г. яны выдалі некалькі кніг, у т. л. вялікафарматную "Гісторыю беларускай (крыўскай) кнігі" В. Ластоўскага, у якой разглядалася развіццё беларускай літаратуры ад X да XIX стст. (1926), часопіс "Крывіч"; прачыталі звыш 150 дакладаў і лекцый; выступалі па літоўскім радыё. Спрабавалі аказваць матэрыяльную дапамогу беларусам у Літве. У 1927 г., пасля пераезду Ластоўскага ў БССР, дзейнасць цэнтра прыпынілася.

У 1932 г. К. Душэўскі выступіў з ініцыятывай аднаўлення яго дзейнасці. 23 лютага 1933 г. у Каўнасе прайшоў арганізацыйны кангрэс Беларускага цэнтра, на якім адбыліся выбары яго кіраўніцтва. На чале адноўленага цэнтра сталі К. Душэўскі (старшыня), В. Барысовіч (сакратар), І. Сіротка (скарбнік). У актыве — Ясінская, Карняк, Т. Іваноўскі, В. Іваноўскі, М. Спірыдовіч. Галоўнай мэтай адноўлены цэнтр ставіў аб'яднанне і каардынацыю дзейнасці асобных беларусаў і беларускіх арганізацый Каўнаса і ўсёй Літвы. Дзейнасць арганізацыі была таксама накіравана на ўзаемнае пазнанне і таварыскае збліжэнне літоўскага і беларускага грамадства, узгадаванне духа дзяржаўнасці Літвы ў беларускім асяроддзі, пашырэнне сярод беларусаў Літвы нацыянальнай свядомасці, на культурную працу ў беларускім асяроддзі, аказанне сябрам юрыдычнай і маральнай падтрымкі. Галоўнай крыніцай фінансавання цэнтра былі складкі сяброў. Дапамогу цэнтру аказвала Міністэрства замежных спраў Літвы. У сакавіку 1934 г. сябры цэнтра ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы Балтыйска-беларускай канферэнцыі (не адбылася).

Разам з тым, у адрозненне ад 1920-х гг., адноўлены цэнтр не вёў шырокай грамадскай і культурнай дзейнасці, яго спробы наладзіць дыялог з іншымі беларускімі арганізацыямі Літвы не мелі поспеху. У другой палове 1930-х гг. (магчыма, у 1936-м) Беларускі цэнтр спыніў сваю дзейнасць па прычыне арганізацыйных і фінансавых цяжкасцей.

Аляксандр Ціхаміраў

Беларускі этнаграфічны музей у Гайнаўцы

Культурна-асветная ўстанова на Беласточчыне (Польшча), рашэнне пра будаўніцтва якой было прынята Беларускім грамадска-культурным таварыствам у 1986 г. Старшынёй праўлення грамадскага камітэта будаўніцтва музея з'яўляецца К. Майсеня. Адна з асноўных мэт, пастаўленых аўтарамі задумы, — дасягнуць высокага ўзроўню выканання праекта. Пры музеі мяркуецца стварыць асяродак беларускай культуры, што ўключаў бы выставачныя залы, чытальную і кіназалы, гатэль, адміністрацыйныя памяшканні і інш. Фінансаванне будаўніцтва Беларускага этнаграфічнага музея ў Гайнаўцы ажыццяўляе шэраг дзяржаўных і прыватных устаноў і арганізацый. Сярод іх Міністэрствы культуры і мастацтва Рэспублікі Польшча, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і інш. Сродкі на абсталяванне музея паступаюць у выглядзе ахвяраванняў з Беларусі, Бельгіі, Канады, ЗША, Аўстраліі і інш. краін свету. У 1998 г. у ЗША створана Ініцыятыўная група па збору ахвяраванняў на музей, якая знаходзіць прыхільнікаў у іншых краінах.

Сучасны стан будаўніцтва адлюстроўвае магчымасці арганізацый-удзельнікаў. Прыстасаваны для музейных патрэб цэх дрэваапрацоўчага камбіната (у ім адбываліся мастацкія, этнаграфічныя і інш. выставы) пашырыўся да памяшкання прасторных памераў, утворанага з некалькіх частак. Агульная плошча апошняй з іх, праца над якой пачалася ў 1991 г., складае каля 800 кв. метраў (там павінны размясціць 6 выставачных залаў). Існуюць два філіялы музея, плошчай 2000 кв. метраў; будаўніцтва іх распачата ў 1989 г.

Экспазіцыя Беларускага этнаграфічнага музея ў Гайнаўцы будзе прысвечана гісторыі, этнаграфіі, мастацтву беларусаў. Арганізатарамі прадугледжана работа ў ім як пастаянных, так і часовых выставак. Будучы музей абяцае стаць важным рэгіянальным асяродкам нацыянальнай культуры.

Святлана Сачанка

Беларускія дзяржаўныя настаўніцкія курсы

Адкрыты 1 снежня 1921 г. у Даўгаўпілсе (вул. Віцебская, 16) як аднагадовыя. Кіраўнік — Кастусь Езавітаў. Пазнейшыя кіраўнікі — Эдвард Будзька, Андрэй Якубецкі. Другі выпуск адбыўся ў будынку Беларускай дзяржаўнай гімназіі (вул. Варшаўская, 16). З 1923 г. пераведзены ў Рыгу. Кіраўнікі А. Родзька, М. Дзямідаў, С. Сахараў, Г. Плыгаўка, Я. Шчорс, П. Жэрдзі. На курсах працавалі І. Дварчанін, М. Гарэцкі, П. Мядзёлка, з лекцыямі выступаў А. Луцкевіч. Сярод выпускнікоў паэты У. Жылка, П. Сакол (Масальскі), Э. Вайвадзіш, празаік В. Вальтэр, мастакі П. Мірановіч, А. Салаўёў. З гурткоў мастацкай самадзейнасці на курсах узнікалі тэатральныя калектывы. Многія з выпускнікоў трапілі на вучобу ў Чэхаславакію, Савецкую Беларусь, выкладалі ў гімназіях і школах Латвіі. Курсы працавалі з невялікімі перапынкамі да 1944 г.

Сяргей Панізьнік

Беларускія секцыі РКП(б)

Бальшавіцкія арганізацыі, якія існавалі ў 1918–1919 гг. у Петраградзе, Маскве, Сараце, Тамбове, Казані, Невелі і іншых гарадах як часткі мясцовых партыйных арганізацый. Кіраўнікі — З. Жылуновіч, А. Чарвякоў, І. Лагун, А. Усціловіч, Я. Дыла, Ф. Балбека, Дз. Чарнушэвіч, Р. Каўшыла, І. Мазур, П. Клыш і інш.

Першая секцыя ўзнікла ў Петраградзе ў красавіку 1918 г. на аснове Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі. У снежні 1918 г. налічвала больш 90 членаў і каля 120 спачувальнікаў. Накіроўвала дзейнасць Петраградскага аддзялення Беларускага нацыянальнага камісарыята, удзельнічала ў стварэнні Беларускага вольна-эканамічнага таварыства і "Беларускай хаткі" ў Петраградзе. Яе прадстаўнікі ўдзельнічалі ў рабоце Усерасійскага з'езда бежанцаў з Беларусі (ліпень 1918, Масква) і Першай канферэнцыі беларускіх савецкіх партый і арганізацый (жнівень 1918, Петраград). Секцыя стварыла Першы беларускі камуністычны атрад, накіраваны ў студзені 1919 г. у Мінск.

У Маскве 25 мая 1918 г. адбыўся сход камуністаў-беларусаў, на якім прысутнічала 14 чалавек. Было абрана Аргбюро, якому даручалася звярнуцца ў ЦК РКП(б) з просьбай зацвердзіць стварэнне Беларускай секцыі пры ЦК РКП(б) і выдзеліць сродкі для пасылкі агітатараў на Беларусь і падрыхтоўку Усебеларускага партыйнага з'езда. Але ЦК РКП(б), скарыстаўшы водгук К. Ландэра, не падтрымала гэту ініцыятыву. Наступную спробу беларусы-камуністы зрабілі 3 ліпеня на сходзе ў Народным камісарыяце па справах нацыянальнасцей, калі абралі Аргбюро, якому даручалася стварыць секцыю беларусаў пры ЦК РКП(б). Рэзалюцыя сходу 4 ліпеня была накіравана ў ЦК РКП(б), але зноў не атрымала падтрымкі. Асновай для стварэння секцыі ў Маскве стала фракцыя камуністаў–

служачых Беларускага нацыянальнага камісарыята. Да лістапада 1918 г. фракцыя вырасла як за кошт супрацоўнікаў, што ўступілі ў РКП(б) (З. Жылуновіч), так і за кошт супрацоўнікаў, што прыбылі з акупаванай тэрыторыі (Дз. Чарнушэвіч, Я. Бампі). Па ініцыятыве фракцыі 3 лістапада 1918 г. быў скліканы сход беларусаў-камуністаў, на якім прысутнічала 14 чалавек. Сход пастанавіў стварыць Беларускую секцыю РКП(б) у Маскве і абраў Бюро ў складзе І. Лагуна, М. Хрэнава, З. Жылуновіча, А. Усціловіча (апошняму даручалася выкананне тэхнічнай работы па стварэнню секцыі). Прэсненскі райкам РКП(б) 14 лістапада 1918 г. зацвердзіў маскоўскую беларускую секцыю РКП(б). Газета Белнацкама "Дзянніца" з 3 снежня 1918 г. стала адначасова і органам маскоўскай Беларускай секцыі РКП(б). Разам з культурна-асветным аддзелам Белнацкама секцыя адкрыла ў Маскве рабочы клуб "Беларус".

У Сараташе секцыя, створаная ў верасні 1918 г., яднала 30 членаў і 32 спачувальнікаў, мела клуб, праводзіла мітынгі беларускіх бежанцаў.

Беларускія секцыі РКП(б) удзельнічалі ў падрыхтоўцы абвяшчэння БССР. Канферэнцыя Беларускіх секцый РКП(б) (21–23.12.1918, Масква) прызнала неабходным стварэнне ўрада Беларусі, выбрала Цэнтральнае бюро ў складзе З. Жылуновіча (старшыня), Ф. Балбекі, І. Няцецкага, М. Драка-Дракона, А. Чарвякова і кандыдата Я. Дылы. 25 снежня 1918 г. адбылося экстранае пасяджэнне калегіі Белнацкама з прадстаўнікамі ЦБ Беларускіх секцый РКП(б), дзе быў вызначаны спіс кандыдатаў у склад Часовага ўрада Беларусі. Старшынёй урада тайным галасаваннем быў прапанаваны З. Жылуновіч, які і напісаў тэкст Маніфеста аб утварэнні БССР, прыняты ў Смаленску ў ноч з 1 на 2 студзеня 1919 г. У склад першага ўрада БССР ад беларускіх секцый РКП(б) увайшлі У. Фальскі, Я. Дыла, Дз. Чарнушэвіч, А. Квачанюк, А. Чарвякоў, І. Пузыроў, Ф. Шантыр. ЦБ КП(б) Беларусі неаднаразова прымала рашэнні аб ліквідацыі Беларускіх секцый РКП(б) на тэрыторыі Беларусі. Пасля стварэння Літоўска-Беларускай ССР (люты 1919) беларускія камуністы секцый пачалі аб'ядноўвацца з літоўскімі, было створана літоўска-беларускае Цэнтральнае бюро пры ЦК РКП(б). З аднаўленнем 31 ліпеня 1920 г. БССР ЦК РКП(б) дазволіў падзел літоўскіх і беларускіх секцый, але беларускія секцыі не аднавіліся.

Віталь Скалабан

"Бераг"

"Бераг" ("Brzeg"), беларускае незалежнае выдавецтва ў Польшчы, існавала ў 1988 г. у Беластоку. Створана намаганнямі маладой беларускай інтэлігэнцыі, у першую чаргу студентаў. Апублікавала два зборнікі беларускай паэзіі — "Моладзі" (выбраныя вершы Янкі Купалы, якія раней друкаваліся ў розных выданнях і набылі характар народных) і "Саната ростані" Зьніча (Алега Бембеля), куды ўключаны вершы рэлігійна-філасофскага характару, прысвечаныя 1000-годдзю прыняцця хрысціянства на Русі. Пасля публікацыі гэтых кніг выдавецтва спыніла сваю дзейнасць.

Ларыса Языковіч

Вайскова-дыпламатычная місія БНР у Латвіі і Эстоніі

Дыпламатычнае прадстаўніцтва БНР ў 1919–1921 гг. Утворана ў верасні 1919 г. паводле рашэння ўрада БНР на чале з А. Луцкевічам. Была акрэдытавана пры ўрадах Латвіі і Эстоніі. Размяшчалася ў Рызе. Начальнік (шэф) місіі (К. Езавітаў, саветнікі (райцы) (падпалкоўнік Р. Шаўковы (да 19.5.1920 г.), генерал-маёр П. Вент, сакратары (І. Чарапук (да 31.5.1920 г.), паручнік Ю. Гладкі. 5.4.1920 г. паўнамоцтвы місіі былі пацверджаны ўрадам В. Ластоўскага. Асноўнымі задачамі місіі былі консульская работа і арганізацыя беларускіх узброеных сіл у краінах Балтыі. Пры місіі дзейнічалі рэгістрацыйна-пашпартныя аддзелы ў Рэвелі (Таліне) (7.12.1919 г. – жнівень 1920 г.; кіраўнікі – Ф. Шанкат, М. Маркевіч), Лібаве (Ліепаі) (26.12.1919 г. – 8.8.1920 г.; кіраўнік – П. Цвяткоў). Ёй падпарадкоўвалася таксама консульства БНР у Рызе (ліпень 1919 – 1.2.1921 г.; консулы (штабс-капітан Б. Шымковіч, Р. Казячы, д-р У. Пігулеўскі). Місія падтрымлівала сувязі з дыпламатычнымі ўстановамі БНР (у Германіі, Літве, Данії і іншых краінах), дапамагала арганізацыйнаму афармленню беларускай калоніі ў Латвіі (старшыня Рады беларускай калоніі – Я. Данілюк), кантралявала працэс рэгістрацыі і выдачы віз і пашпартоў БНР выхадцам з Беларусі ў Латвіі і Эстоніі, рэгістравала прадстаўніцтвы беларускіх палітычных партый (эсэраў, сацыял-дэмакратаў) ў Латвіі, садзейнічала стварэнню беларускага прэс-бюро ў Рызе, культурна-асветнага таварыства "Бацькаўшчына", курсаў беларусазнаўства, часопіса "На чужыне" і інш. Мела ў Рызе выдавецтва. Місія праводзіла работу па абароне нацыянальна-дзяржаўных інтарэсаў Беларусі. Яе члены падтрымлівалі сувязі з вайскова-дыпламатычнымі місіямі дзяржаў Антанты і ЗША ў Прыбалтыцы, да ведама якіх даводзілі інфармацыю аб праблемах Беларусі, удзельнічалі ў рабоце беларуска-латвійскай памежнай камісіі (сакавік 1920 г.). Місія накіравала дыпламатычныя ноты ўрадам замежных краін (Вялікабрытаніі, Францыі, ЗША, Германіі, Японіі, Даніі, Нарвегіі, Швецыі, Швейцарыі) з просьбай прызнаць незалежнасць Беларусі і прадухіліць яе падзел паміж Польшчай і РСФСР, садзейнічала ўстанаўленню дыпламатычных адносін БНР з Фінляндыяй, Эстоніяй, Латвіяй, накіравала надзвычайныя дыпламатычныя місіі ў ЗША (чэрвень 1920 г.; кіраўнік — І. Чарапук) і РСФСР (ліпень 1920 г.;

кіраўнік — В. Захарка), дамагалася ўдзелу БНР у Канферэнцыі балтыйскіх дзяржаў (жнівень 1920 г.). У снежні 1919 г. супрацоўнікі місіі арганізавалі пераход часцей пад камандаваннем С. Булак-Балаховіча са складу арміі Юдзеніча на бок БНР у якасці яе Асобнага атрада, ажыццяўлялі палітычнае і арганізацыйнае кіраўніцтва Асобным атрадам БНР (студзень — сакавік 1920 г.); для яго фінансавай падтрымкі ў лютым 1920 г. місія надрукавала і распаўсюдзіла паштовыя маркі "Асобны атрад БНР". У кастрычніку 1920 г. садзейнічала падрыхтоўцы Беларускай нацыянальна-палітычнай нарады ў Рызе. Пасля дыпламатычнага націску кіраўніцтва РСФСР на ўрад Латвіі напярэдадні падпісання Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. дзейнасць місіі была спынена.

Аляксандр Ціхаміраў

Варшаўскі нарадавольніцкі гурток беларускіх студэнтаў

Варшаўскі нарадавольніцкі гурток беларускіх студэнтаў, нелегальная суполка прыхільнікаў рэвалюцыйнай арганізацыі "Народная воля" з ліку ўраджэнцаў Беларусі — студэнтаў Варшаўскага універсітэта ў 1882—1883 гг. Утварыўся ў канцы 1882 г. намаганнямі студэнтаў-нарадавольцаў В. Руткевіча, Г. Яцкевіча і В. Вайніловіча, якія мелі вопыт нелегальнай работы ў Гродне і Віцебску. Акрамя выхадцаў з Беларусі (больш за 10 чал.) у гурток уваходзілі і варшавяне (7 чал.) на чале з С. Калішскім. На базе гуртка па даручэнню члена Выканаўчага камітэта "Народнай волі" В. Фігнер створана падпольная друкарня на чале з ураджэнцам Гродна М. Янчэўскім. Пры наладжванні падпольнага друку і вядзенні рэвалюцыйнай прапаганды гурток падтрымліваў цесныя кантакты з кіраўнікамі польскай рабочай партыі "Пралетарыят" Л. Варынскім, А. Дэмбскім, Э. Плоскім. Шмат увагі гурткоўцы аддавалі тэорыі вызваленчага руху. Абмяркоўваючы праграмныя дакументы "Пралетарыяту" і арганізацыі "Народнай волі" ў Паўночна-Заходнім краі, большасць іх заявіла пра гатоўнасць "да любой рэвалюцыйнай дзейнасці, акрамя тэрору". Адмова ад тактыкі тэрору была вынікам супрацоўніцтва з "Пралетарыятам", які ў гэты час станавіўся на шлях класавай палітычнай барацьбы. Пасля арышту ў Вільні 22 жніўня 1883 г. кіраўніка Янчэўскага дзейнасць гуртка аслабела, да канца года спынілася. Некаторыя гурткоўцы (В. Разумейчык, М. Манцэвіч і інш.) уступілі ў рады "Пралетарыяту".

Валерый Чарапіца (Гродна)

Выдавецтва Грыневіча ў Пецярбургу

Прыватнае беларускае выдавецтва. Заснавана ў 1910 г. А. Грыневічам. Спецыялізавалася на выпуску твораў мастацкай літаратуры. Выдала 11 кніг агульным тыражом 28 тыс. экз., у т. л. зборнік вершаў "Гусляр" і драматычную паэму "Адвечная песня" Я. Купалы (абодва — 1910 г.), зборнікі апавяданняў Я. Коласа, У. Галубка, "Беларускія песні з нотамі" Грыневіча (1910. Т. 1; 1912. Т. 2. з А. Зязюлем). У 1913 г. спыніла сваю дзейнасць.

Аляксандр Ціхаміраў

Выдавецтва "Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў"

Беларускае выдавецкае таварыства ў Латвіі. Існавала ў Рызе ў 1926—1934 гг. Мела на мэце пашырэнне асветы і нацыянальнай самасвядомасці сярод латвійскіх беларусаў. Асаблівую ўвагу звяртала на выпуск літаратуры па палітычных і асветных праблемах, гісторыі Беларусі (кнігі і брашуры К. Езавітава "Беларусы ў Латвіі", "Беларусы ў Літве", "Беларусь у мінулым і сучасным", А. Галынца "Вялікае апрашчэнне ці вялікае удасканаленне?", брашура "Беларускі працэс у Латвіі"). Выдала зборнік вершаў маладых беларускіх паэтаў у Латвіі "Першы крок", апавяданні "Леснікова сена" В. Вальтэра, "Фракеец Кілон" А. Упіта (у пер. з латышскай мовы), брашуры "Гістарычны нарыс пяцігоддзя Дзвінскай дзяржаўнай беларускай гімназіі за 1922—1927 гг." С. Сахарава, "Беларускае культурна-асветнае таварыства "Бацькаўшчына" ў Латвіі" Езавітава, "Дзесяцігоддзе 1-й Рыжскай беларускай асноўнай школы, 1923— 1933" С. Сіцько. Выдавала педагагічную літаратуру ("Як вучыць дзяцей у новай школе?" А. Луцкевіча), падручнікі (на беларускай мове і ў перакладзе з латышскай), "Праграмы беларускай пачатковай школы ў Латвіі 1925—1926 гг.". Выйшлі "Папулярныя нарысы па тэорыі кааперацыі" К. Пажытнова, беларускія кнігі-календары Сахарава. Друкавала часопіс "Беларуская школа ў Латвіі". Выпусціла каля 20 выданняў. Зачынена ў сувязі з устанаўленнем у Латвіі дыктатуры К. Ульманіса.

Арсень Ліс

"Гоман"

Беларуская рэвалюцыйная група ў Пецярбургу. Створана ў пачатку 1880-х гг. студэнтамі-ураджэнцамі Беларусі па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам былых сяброў Віцебскага рэвалюцыйнага гуртка А. Марчанкі і Х. Ратнера. Сябры групы — М. Стацкевіч, У. Крупскі, С. Нясцюшка-Буйніцкі, А. Ратнер, Сафронаў. Падзяляла праграмныя і

арганізацыйныя погляды "Народнай волі", імкнулася стаць яе абласной арганізацыяй у Беларусі. У 1884 г. (у студзені і лістападзе) выдала ў Пецярбургу 2 нумары падпольнага часопіса "Гомон" на рускай мове. У перадавіцы першага нумара часопіса абвяшчалася пра намер пакласці "першы камень у падваліны федэратыўнае самастойнасці Беларусі". Група выступала за ліквідацыю ў Расіі самадзяржаўя і скліканне Устаноўчага сходу, утварэнне федэрацыі свабодных раўнапраўных аўтаномных абласцей, лічыла неабходным пасля прыходу да ўлады мясцовых рэвалюцыйных арганізацый ажыццявіць сацыялістычныя пераўтварэнні, галоўным чынам у зямельнай справе. Сябры групы выступалі супраць расійскіх лібералаў, крытыкуючы іх за непаслядоўнасць у барацьбе супраць самадзяржаўя і адмову прызнаць правы народаў на самавызначэнне. Асноўныя спадзяванні яны ўскладалі на выхаванне свядомай беларускай інтэлігенцыі, але цікавіліся і сялянскім пытаннем у Беларусі, заклікалі сваіх прыхільнікаў вывучаць эканамічнае становішча беларускіх сялян. Група крытычна ставілася да дэмакратычных свабод буржуазнага грамадства, лічыла іх "жорсткай іроніяй над працоўнымі класамі". Вялікая ўвага надавалася нацыянальнаму пытанню. Сябры групы сцвярджалі, што беларусы маюць сваю мову, гісторыю, культуру, тэрыторыю, а сама Беларусь уяўляе сабой адзіны эканамічны раён, і, зыходзячы з гэтага, лічылі, што для беларусаў барацьба супраць самаўладства мае не толькі сацыяльна-класавы, але і нацыянальна-вызваленчы характар. Група падтрымлівала сувязь з арганізацыяй "Народная воля" ў Паўночна-Заходнім краі, рэвалюцыйнымі гурткамі Вільні, Віцебска, Магілёва, Мінска, Пецярбурга, Кіева, Харкава, Слуцкага і Дзісненскага паветаў, спрабавала стварыць Беларускую сацыял-рэвалюцыйную партыю, але спроба поспеху не мела. У сярэдзіне 1880-х гг. ва ўмовах рэпрэсій з боку расійскага ўрада, скіраванай супраць палітычнай апазіцыі, спыніла сваю дзейнасць.

Аляксандр Ціхаміраў

"Грамада"

"Грамада", беларускае нелегальнае выдавецкае таварыства. Існавала ў Пецярбургу ў 1906—1907 гг. Выдавала арыгінальную і перакладную агітацыйную літаратуру рэвалюцыйнага зместу. Шырокай дзейнасці разгарнуць не паспела, бо усе выданні таварыства былі забаронены царскай цэнзурай. Захавалася 6 брашур, у т.л. "Як мужыку палепшыць сваё жыццё" (лацінкай і кірыліцай), "Чы будзе для ўсіх зямлі?", "Што такое свабода?" Сігава (пер. з украінскай), "Забастоўка" (лацінкай), "Гутарка аб тым, куды мужыцкія грошы ідуць".

Юрый Васілеўскі

Гурток беларускай моладзі

Гурток беларускай моладзі пры Навазыбкаўскім палітэхнікуме. Існаваў з 26 лістапада 1923 г. да вясны 1926 г. у Навазыбкаве (Бранская вобл.). Заснаваны студэнтамі-беларусамі агранамічнага і педагагічнага факультэтаў палітэхнікума. У склад гуртка ўваходзіла 17 чал., старшыня М. Бандарчук, сакратар М. Гуцаў, актывісты М. Карафа-Корбут, І. Гуцаў. Меў на мэце культурнае і эканамічнае адраджэнне Беларусі. Ставіў задачы: вывучэнне беларускай мовы, народна-гаспадарчых, нацыянальна-культурных і грамадска-палітычных традыцый Беларусі. З пачатку 1924 г. пры гуртку пачалі працаваць курсы беларускай мовы (кіраўнік М. Гуцаў). Гуртку дапамагала Беларуская секцыя пры Гомельскім губернскім аддзеле народнай асветы, якая забяспечвала яго літаратурай па сельскай гаспадарцы, краязнаўству, беларускай перыёдыкай (газетамі "Савецкая Беларусь", "Звязда", часопісамі "Вольны сцяг", "Зорка"). У 1924 г. хадайнічала перад Наркаматам асветы БССР аб выдзяленні для сяброў гуртка месцаў у ВНУ БССР.

Юрый Васілеўскі

Гурток беларускай сацыялістычнай моладзі

Гурток беларускай сацыялістычнай моладзі ў Калузе, грамадская арганізацыя ў 1918 г. Аб'ядноўваў беларусаў-бежанцаў Першай сусветнай вайны. 30 мая 1918 г. зарэгістраваны Беларускім нацыянальным камісарыятам. Асноўная мэта — прапаганда беларускай нацыянальна-сацыялістычнай ідэі. Умова сяброўства — валоданне беларускай мовай. Выканаўчыя органы — рада выбарных і ўрад (старшыня Я.Крыўка). Пры гуртку існавалі секцыі: драматычная, культурна-асветная, гістарычная, агітацыйная, народнага штукарства. Праводзіў вечарыны, чытанні, канцэрты.

Гурток маладых беларускіх паэтаў у Латвіі

Літаратурнае аб'яднанне пачаткоўцаў з асяроддзя беларускай нацыянальнай меншасці ў Латвіі, якое ўзнікла пры Беларускім культурна-асветным таварыстве "Бацькаўшчына" на аснове літгурткоў пры Дзвінскай, Люцынскай, Рыжскай беларускіх гімназіях, пры рэдакцыях газеты "Голас беларуса", часопіса "Беларуская школа ў Латвіі" і інш. Дзейнасць гуртка спрыяла кансалідацыі маладых творчых сіл, павышэнню мастацкіх якасцей твораў

пачаткоўцаў, іх працы па ўмацаванню латышска-беларускіх грамадска-літаратурных сувязей. У 1926 г. у Рызе Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў выдала зборнік вершаў гуртка маладых беларускіх паэтаў пад назвай "Першы крок" (500 экз.). З ім азнаёміўся Ян Райніс. Ён пераклаў на латышскую мову і надрукаваў верш Аўгена Бартуля "Бунтаўшчык". З іншых удзельнікаў гуртка трэба адзначыць Эдуарда Вайвадзіша, Віктара Вальтэра, Якуба Воркуля, Валянціну Казлоўскую, Надзею Нікалаеву, Мікалая Талерку, Пятра Масальскага, Вольгу Сахараву. Не ўсім з іх удалося ва ўмовах тагачаснай Латвіі разгарнуць свой талент. Адны ад хвароб і галотнага жыцця заўчасна памерлі (Г. Іванова, Я. Воркуль, В. Вальтэр), другія змаглі выдаць па адным зборніку: Пятро Сакол (П. Масальскі) — зб. вершаў "На світанні" (Рыга, 1929); Вера Вайцюлевіч — "Вершы" (Рыга, 1932); Віктар Вальтэр — зб. апавяданняў "Леснікова сена" (Рыга, 1933). З-за нястачы фінансавых сродкаў засталіся ў рукапісах зборнікі вершаў Я. Воркуля, М. Талеркі, П. Масальскага, яго ж зборнік перакладаў латышскіх народных песень — дайнаў (частка надрукавана толькі ў 1979 у "Даляглядах"), а таксама раман В. Вальтэра "Роджаныя пад Сатурнам". З пяці п'ес, напісанных В. Сахаравай-Нікановіч, былі выдадзены толькі дзве: "На полацкім замчышчы" (Дзвінск, 1928) і "Птушка на волі" (Дзвінск, 1932).

Большасць твораў сяброў гуртка маладых беларускіх паэтаў надрукаваны ў перыёдыцы: у газетах "Голас беларуса" (Рыга, 1925–1929), "Думка беларуса" (Дзвінск, 1930), часопісе "Беларуская школа ў Латвіі" (Рыга, 1926–1929, 1932–1934), часопісе на шапірографе "Ластаўка" (Люцін, 1923–1925), часопісе на шклографе "Школьная праца" (Дзвінск, 1926–1929), рукапісным часопісе "Пачатковец" (Дзвінск, 1929), а таксама на старонках "Беларускіх календароў" (1928, 1937), укладзеных С. Сахаравым.

Сяргей Панізьнік

Гурток моладзі польска-літоўска-беларускай і маларускай

Гурток моладзі польска-літоўска-беларускай і маларускай (Kolo mlodziezy polskiej, bialorysikej i malorysikej), маладзёжная арганізацыя выхадцаў з Польшчы, Літвы, Беларусі і Украіны ў Пецярбургу ў 1889—1893. Аб'ядноўвала пераважна студэнтаў Тэхналагічнага інстытута. Склад гуртка быў непастаянны, налічваў каля 25 чалавек, з іх выбіраліся старшыня і касір. Меў касу ўзаемадапамогі. Старшынямі ў розны час былі К. Дабкевіч, І. Вілейшыс, М. Дамашэвіч, з красавіка 1893 г. беларускі паэт-рэвалюцыянер А. Гурыновіч. Спачатку напрамак дзейнасці гуртка быў асветніцкі: распаўсюджванне сярод рабочых і сялян легальнай літаратуры для ўзняцця агульнага ўзроўню народнай адукаванасці. Кнігі выпісвалі з Варшавы і набывалі ў Пецярбургу. Паступова ва ўмовах развіцця рэвалюцыйнага руху гурток эвалюцыяніраваў да палітычнай работы. Некаторыя яго члены сталі прапагандыстамі ў рабочых гуртках, падтрымлівалі кантакты з сацыял-дэмакратычнымі арганізацыямі. Гурток імкнуўся наладзіць сувязь з групай Г. Пляханава "Вызваленне працы", з украінскім паэтам-рэвалюцыянерам І. Франко ў першую чаргу для атрымання рэвалюцыйнай літаратуры. Гурыновіч у лісце ад 12 лістапада 1892 г. да сваёй знаёмай у Цюрыху С. Пяткевіч звяртаўся з просьбай выслаць гуртку каля тысячы экземпляраў кніг 20 назваў на беларускай, рускай, польскай і ўкраінскай мовах (у асноўным палітычнага характару). Ліст быў перахоплены паліцыяй, якая ўстанавіла тайны нагляд за многімі гурткоўцамі і пазней выкрыла іх удзел у прапагандысцкай рабоце. Пачынаючы з чэрвеня 1893 г. былі арыштаваны К. Акуліч, Гурыновіч, І. Непакайчыцкі і інш., у іх знайшлі нелегальную літаратуру. Пратаколы допытаў, жандарская перапіска па гэтай справе, у якую было ўцягнута 20 чалавек, сведчаць пра даволі шырокі размах прапагандысцкай работы гуртка. Гурткоўцы Акуліч, Непакайчыцкі, Кіліянскі былі адміністрацыйна прыгавораны (без суда) да турэмнага зняволення. Гурток спыніў існаванне пасля арышту актыву.

Рыгор Семашкевіч

Дзвінская беларуская гімназія

Сярэдняя навучальная ўстанова гуманітарнага профілю беларускай меншасці ў Латвіі. Мела дзяржаўны статус. Беларускі аддзел пры Міністэрстве асветы Латвіі атрымаў дазвол на арганізацыю гімназіі 1 красавіка 1922 г. Адкрыта 3 снежня 1922 г. на вул. Варшаўскай, 16 у Даўгаўпілсе (да 1920 г. — Дзвінск) намаганнямі Беларускага культурна-асветніцкага таварыства "Бацькаўшчына". Дырэктарамі гімназіі былі І. Краскоўскі (1922–1925), С. Сахараў (1925–1932), Чаманіс (1932–1938). Настаўнікамі ў розны час працавалі У. Пігулеўскі, П. Мядзёлка-Грыб, А. Якубецкі. Я. Гайлевіч і інш. Сярод лектараў арганізаваных там Беларускіх дзяржаўных настаўніцкіх курсаў былі М. Гарэцкі, І. Дварчанін, А. Луцкевіч. З лекцыямі па гісторыі беларускай літаратуры 9–10 красавіка 1927 г. у гімназіі выступаў В. Ластоўскі. Сяброўскія кантакты з гімназіяй падтрымлівалі К. Езавітаў, Я. Райніс, Б. Брэжга і інш. дзеячы. Гімназісты вывучалі беларускую, латышскую, рускую, нямецкую, лацінскую мовы, рэлігію, гісторыю, матэматыку і інш. прадметы. У гімназіі дзейнічалі літаратурна-гістарычны, мастацкі, фатаграфічны, радыётэхнічны гурткі, хор, балалаечны аркестр. На гектографе друкаваўся вучнёўскі часопіс "Школьная праца" (1926–1930, усяго выйшла 14 нумароў). Дзеці былі ўцягнуты ў скаўцкі рух — пры гімназіі існаваў асобны скаўцкі атрад.

Навучэнцы актыўна ўдзельнічалі ў пазакласнай рабоце: збіралі фальклор, выступалі з лекцыямі, канцэртамі, наладжвалі тэатральныя пастаноўкі па творах Я. Купалы, В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Аляхновіча, К. Каганца, В. Сахаравай. У гімназіі былі праведзены ўрачыстыя мерапрыемствы да 400-годдзя беларускага друку і ў гонар першадрукара Ф. Скарыны (1925), 25-годдзя з дня смерці Ф. Багушэвіча (1925), 20-годдзя літаратурнай творчасці Я. Купалы, Я. Коласа (1926).

"Беларускі працэс" 1924–1925 гг. ускладніў становішча гімназіі, перашкодзіў нармальнаму вучэбна-выхаваўчаму працэсу. Хоць падсудныя былі апраўданы, але настаўнікі І. Краскоўскі, П. Мядзёлка вымушаны былі звольніцца і выехаць з Латвіі. Да Дзвінскай гімназіі была далучана закрытая ўладамі 12 жніўня 1925 г. Беларуская гімназія ў Лудзе (Люцыне), якая існавала там з 1 верасня 1922 г. Паступова былі адноўлены ранейшыя пазіцыі. У 1927 г. была апублікавана брашура "Гістарычны нарыс пяцігодзьдзя Дзьвінскай Дзяржаўнай Беларускай гімназіі за 1922–1927 гг." (укладальнік — дырэктар С. Сахараў).

Гімназія імкнулася да захавання беларускай нацыянальнай самабытнасці, выхавання патрыятычных пачуццяў, развіцця роднай мовы, пашырэння гуманістычных, дэмакратычных поглядаў, засваення каштоўнасцей сусветнай культуры. З'яўлялася сапраўднай "кузняй, дзе выхоўваліся шчырыя і моцныя сыны свайго народа і прыхільнікі Латвійскай дзяржавы" (С. Сахараў). Моладзь працягвала вучобу па накіраванню Таварыства "Бацькаўшчына" ў вну Чэхаславакіі, потым — у Латвійскім універсітэце ў Рызе. Многія навучэнцы гімназіі сумленна служылі не толькі беларускай, але і латышскай, рускай, польскай, чэшскай, славацкай і інш. культурам. Сярод іх — празаік В. Вальтэр, паэты А. Бартуль, Э. Вайвадзіш, В. Казлоўская, П. Сакол (П. Масальскі), М. Талерка, перакладчык І. Доўгі, рэжысёр І. Камаржынскі, оперная спявачка Н. Нікалаева-Комісар, мастакі М. Калінін, П. Мірановіч, археолаг Л. Краскоўская. Па-рознаму склаліся іх жыццёвыя лёсы. Некаторыя пазней апынуліся ў эміграцыі.

У 1932 г. пачалася паступовая ліквідацыя гімназіі. Быў звольнены дырэктар С. Сахараў, які атрымаў невялікую пенсію, а таксама закрыты першы клас. Ва ўмовах дыктатуры К. Ульманіса беларускія школы ў Латвіі прыйшлі ў заняпад. У 1938 г. гімназія спыніла сваё існаванне.

Аляксандр Вабішчэвіч

Другі з'езд беларусаў свету

Адбыўся ў Мінску 26–27 ліпеня 1997 г. у будынку Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі. Арганізаваны і праведзены Згуртаваннем беларусаў свету "Бацькаўшчына". Старшынёй Аргкамітэта па падрыхтоўцы з'яўляўся Радзім Гарэцкі, рабочую групу ўзначаліла Ганна Сурмач. Прысутнічалі 700 удзельнікаў, сярод іх 180 дэлегатаў ад розных краін свету, у тым ліку з усіх памежных краін. Невялікая колькасць дэлегатаў у параўнанні з Першым з'ездам тлумачыцца тым, што было ўстаноўлена мінімальнае прадстаўніцтва — па 1 асобе ад суполкі. Некаторыя суполкі заходняй дыяспары не прыслалі на з'езд сваіх дэлегатаў у сувязі з палітычным становішчам у Беларусі, аднак імі былі дасланы прывітанні з'езду і выказана падтрымка ўдзельнікам і Згуртаванню "Бацькаўшчына". З'езд адкрыў народны пісьменнік Васіль Быкаў, было зачытана прывітанне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі. З прывітальнымі словамі выступілі: народны паэт Ніл Гілевіч, старшыня Таварыства беларускай мовы Генадзь Бураўкін і інш. З асноўным дакладам "Праблемы захавання беларускай прысутнасці ў свеце" выступіў прэзідэнт Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына" Радзім Гарэцкі. З садакладамі — Аляксандр Арцішэўскі ("Праблемы фізічнага захавання нацыі") і ад заходняй дыяспары Васіль Еўдакімаў (Англія). На з'ездзе прысутнічала дэлегацыя Украінскай сусветнай Каардынацыйнай Рады на чале са старшынёй пісьменнікам Іванам Драчом, які выступіў з прамовай. Справаздачны даклад Рады ЗБС "Бацькаўшчына" зачытала старшыня Рады Ганна Сурмач, даклад Рэвізійнай камісіі — яе старшыня Ірына Жарская. Прадстаўнікі дзяржаўных структур — Генадзь Пяцігор, Тадэвуш Стружэцкі, Іван Яновіч выступілі з інфармацыяй аб дзяржаўнай падтрымцы дыяспары. Абмеркаванне дакладаў праходзіла актыўна, выказаліся многія прадстаўнікі беларускіх суполак. З'езд праходзіў у складаных умовах. Дэлегатамі выказваліся розныя, часам супрацьлеглыя, думкі ў адносінах да сітуацыі ў Беларусі. Частка ўдзельнікаў выказалася ў падтрымку беларускіх улад, другая крытычна паставілася да становішча ў краіне. Частку дэлегатаў з'езда прыняў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. З'ездам былі прыняты выніковыя дакументы: Заява ўдзельнікаў з'езда па тэме асноўнага даклада з заклікам аб'яднаць усе намаганні дзеля захавання беларускай нацыі, Рэзалюцыя аб адабрэнні дзейнасці Рады ЗБС "Бацькаўшчына" за справаздачны перыяд, Рэзалюцыя аб сітуацыі з будынкам Беларускага гуманітарнага ліцэя. Адбыліся перавыбары кіруючых органаў ЗБС "Бацькаўшчына". Былі абраны новыя Вялікая і Малая Рады, перавыбраны на новы тэрмін прэзідэнт ЗБС Р. Гарэцкі і старшыня Г. Сурмач. Ажыццяўлялася і культурная праграма з'езда — канцэрт, прэзентацыя кнігі "Далёкія і блізкія" Я. Чыквіна (Беласток) — пра беларускіх літаратараў у замежжы, экскурсійная паездка ў Мір, Навагрудак, Стоўбцы. Адметнай з'явай на з'ездзе стала ўрачыстае віншаванне беларускіх татараў з нагоды 600-гадовага юбілею іх пасялення ў Вялікім Княстве Літоўскім. Удзельнікі з'езда віншавалі з юбілейнымі датамі ў 1997 г. многіх вядомых людзей у беларускім замежжы. Былі абраны новыя ганаровыя сябры ЗБС — Янка Брыль, Юлія Андрусішына, Барыс Кіт. З'езд выявіў рэальную сітуацыю ў беларускай дыяспары, канстатаваў пашырэнне беларускага руху ў замежжы, які выявіўся ў павелічэнні беларускіх суполак у свеце. Правядзенне форуму замацавала магчымасць далейшага аб'яднання беларусаў, падцвердзіла зацікаўленасць нашых суродзічаў у падтрымцы сувязей з Радзімай,

у вызначэнні лёсу краіны, у захаванні і падтрымцы беларускай прысутнасці ў свеце. З'езд даў новы імпульс для дзейнасці ЗБС "Бацькаўшчына", пацвердзіў неабходнасць захавання арганізацыі і падтрымаў абраныя накірункі працы.

Ганна Сурмач

Жаночы камітэт пры беларускай калоніі

Жаночы камітэт пры беларускай калоніі ў Коўне. Існаваў у 1923 г. Старшыня М. Пракулевіч. У праўленне камітэта ўваходзілі А. Дуж-Душэўская, П. Захарка, М. Крачэўская, С. Ластоўская (да 7.6.1923), З. Цвікевіч. Дзейнічаў паводле статута, зарэгістраванага ў Міністэрстве беларускіх спраў Літвы. Займаўся культурна-асветнай і дабрачыннай дзейнасцю, арганізоўваў канцэрты, вечарыны, рэфераты, збіраў ахвяраванні на карысць беларускіх прытулкаў,у дапамогу падсудным працэсу 45-ці, арганізаванага ўладамі Польшчы над удзельнікамі партызанскага руху ў Заходняй Беларусі, і інш. Супрацоўнічаў з радай Саюза сялян-беларусаў у Літве, якую ўзначальваў А. Карабач. Перастаў існаваць у сувязі з ліквідацыяй Міністэрства беларускіх спраў Літвы і роспускам іншых беларускіх арганізацый.

Аляксандра Гесь

"Загляне сонца і ў наша аконца"

Беларускае выдавецтва ў Пецярбургу. Заснавана ў студзені 1906 г. на кааператыўных асновах па ініцыятыве Б. Эпімах-Шыпілы; налічвала тады каля 45 чал. Зарэгістравана ў маі 1906 г. Была першай легальнай беларускай выдавецкай суполкай у Расійскай імперыі. Ставіла перад сабой асветніцкія мэты. Кіруючым органам таварыства з'яўлялася ўправа, у склад якой уваходзілі В. Іваноўскі (старшыня), У. Сталыгва (сакратар). Сябрамі суполкі былі Эпімах-Шыпіла, Ю. Іваноўскі, В. Валэйка, У. Калашэўскі. За час свайго існавання суполка выдала 38 кніг агульным тыражом больш за 100 тыс. экз. (кнігі друкаваліся ў польскай друкарні К. Пянткоўскага кірыліцай і лацінкай, некаторыя паралельна двума шрыфтамі). У 1906 г. выдала падручнікі ("Беларускі лемантар, або Першая навука чытання" К. Каганца, "Першае чытанне для дзетак-беларусаў" Цёткі). З 1907 г. наладзіла выданне літаратурных твораў у падпісной серыі "Беларускія песняры"; планавала выдаць 8 кніг, у т. л. творы Ф. Багушэвіча "Дудка беларуская", "Смык беларускі", "Скрыпачка беларуская", арыгінальныя творы В. Дуніна-Марцінкевіча і яго пераклад "Пана Тадэвуша" А. Міцкевіча. Рэальна да сакавіка 1908 г. выдала толькі 4 кнігі ("Дудка беларуская" і "Смык беларускі" Багушэвіча, 2 першыя быліцы "Пана Тадэвуша" ў перакладзе Дуніна-Марцінкевіча, "Гапон" Дуніна-Марцінкевіча). Апублікавала таксама першыя кнігі Я. Купалы ("Жалейка", 1908), З. Бядулі ("Абразкі", 1913), Ц. Гартнага ("Песні", 1913). Апрача кніг выпускала навукова-папулярныя і публіцыстычныя брашуры, паштоўкі з краявідамі Беларусі і партрэтамі беларускіх пісьменнікаў (больш за 20). Арганізавала сетку распаўсюджання сваёй літаратуры шляхам заключэння пагадненняў з кнігарнямі (увесну 1908 г. кнігі выдавецтва можна было набыць, акрамя Пецярбурга, у Вільні, Мінску, Віцебску, Гродне, Магілёве, Гомелі, Слоніме, Варшаве). Увесну 1908 г. па прычыне фінансавых і арганізацыйных цяжкасцей суполка прыпыніла сваю дзейнасць, але пасля заключэння ў кастрычніку 1909 г. новага дагавора членаў-заснавальнікаў (В., І., С. Іваноўскія, Сталыгва, Валейка, А. і Р. Трэпка-Неканды, Г. Ражноўскі, А. Грыневіч) аднавіла яе. З 1910 г. у склад супрацоўнікаў выдавецтва ўваходзіў Я. Купала. У 1909 г. сябры суполкі перавыдалі кнігу Дуніна-Марцінкевіча "Вечарніцы". У 1910 г. выдадзены "Шчароўскія дажынкі" і "Купала" Дуніна-Марцінкевіча (з прадмовай В. Іваноўскага), падручнік Я. Коласа "Другое чытанне для дзяцей-беларусаў" (разам з віленскім таварыствам "Наша хата"). У 1910–1913 гг. літаграфскім спосабам выдадзена серыя драматычных твораў, у т. л. "Модны шляхцюк" К. Каганца, "Сватанне" і "Мядзведзь" А. Чэхава (у перакладах Н. Чарноцкага і В. Ластоўскага), "Пашыліся ў дурні" і "Па рэвізіі" М. Крапіўніцкага (у перакладзе і апрацоўцы Н. Чарноцкага), "У зімовы вечар" (у перакладзе В. Ластоўскага) і "Хам" Э. Ажэшка, "Паўлінка" Я. Купалы, "Міхаська" В. Іваноўскага (пад псеўданімам Далецкія), "Як яны жаніліся" А. Валодзскага (у перакладзе В. Ластоўскага). Тыраж выданняў складаў па 200–400 экз. У 1912–1913 гг. выдавала часопіс-альманах "Маладая Беларусь", дзе змяшчалі свае творы Я. Купала, Я. Колас, Цётка, З. Бядуля, Ц. Гартны, А. Гурло, К. Буйло, Н. Чарнышэвіч, Новіч, Я. Журба, Петрашкевіч, А. Луцкевіч, А. Пагодзін, А. Янулайціс і інш. (выдадзены 3 сшыткі). У 1913 г. выдала зборнік вершаў Купалы "Шляхам жыцця" і паэму "Сон на кургане". У 1914 г. перавыдала (няпоўна) "Дудку беларускую" Багушэвіча. У другой палове 1913 г., пасля пераезду ў Вільню Іваноўскага і Купалы, дзейнасць выдавецтва пачала затухаць і канчаткова спынілася ў канцы 1914 г. у сувязі з падзеямі Першай сусветнай вайны.

Аляксандр Ціхаміраў

Звяз беларускай моладзі (ЗБМ)

Беларуская грамадская маладзёжная арганізацыя ў Польшчы. Аб'ядноўвае юнакоў і дзяўчат ва ўзросце 15–17 гадоў, пераважна школьнікаў, выхаванцаў беларускіх ліцэяў, а таксама маладых работнікаў, беларускую моладзь

з вёсак Беласточчыны. Афіцыйна зарэгістравана дзяржаўнымі ўладамі ў 1992 г. Старшыні: Марк Заброцкі (з 1992 г.), Багдан Сіманенка (з 1994 г.). Арганізацыя не ставіць палітычных мэтаў, сваёй галоўнай задачай лічыць захаванне беларускай нацыянальнай свядомасці, стварэнне ўласнага беларускага маладзёжнага асяродка, азнаямленне шырокага кола людзей з беларускай культурай як часткай шматэтнічнай культуры сучаснай Польшчы. Дзейнічае супольна з беларускімі школамі, Беларускім аб'яднаннем студэнтаў, іншымі беларускімі арганізацыямі ў Польшчы. Арганізуе для моладзі грамадска-культурныя мерапрыемствы — выстаўкі, сустрэчы, конкурсы, віктарыны, вандроўкі, дыскатэкі і вечары адпачынку, з 1994 г. у Бельску штогод праводзіць фестываль песні "Бардаўская восень".

Ларыса Языковіч

Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына"

Незалежная грамадская арганізацыя. Створана па ініцыятыве беларускай інтэлігенцыі для ўстанаўлення кантактаў з суродзічамі ў замежжы. 6 сакавіка 1990 г. у Мінску на сходзе прадстаўнікоў навуковай, творчай грамадскасці быў абраны Арганізацыйны камітэт на чале з пісьменнікам Яўгенам Лецкам. Аргкамітэтам быў распрацаваны праект статута і падрыхтавана ўстаноўчая канферэнцыя, якая адбылася 10 верасня 1990 г. у Мінску (Дом літаратараў). У канферэнцыі прынялі ўдзел прадстаўнікі беларускіх суполак з рэспублік СССР і з Беласточчыны (Польшча), замежныя ўдзельнікі святкавання 500-гадовага юбілею Ф. Скарыны, прадстаўнікі грамадскасці з Беларусі. Было прынята рашэнне аб стварэнні Згуртавання, зацверджаны Статут, абраны кіруючыя органы — Рада і Управа. На ганаровую пасаду прэзідэнта быў абраны народны пісьменнік Васіль Быкаў, старшынёй Рады і Управы — Яўген Лецка. Ідэю стварэння Згуртавання падтрымала і беларуская дыяспара ў заходніх краінах. Асноўныя задачы згуртавання: спрыяць адраджэнню культуры, мовы, нацыянальнай свядомасці і традыцый беларускага народа, кансалідацыі беларусаў свету, наладжваць патрэбныя для Беларусі сувязі з замежжам, аказваць дапамогу ў арганізацыі нацыянальнага, культурнага жыцця беларускім суполкам у замежжы, падтрымліваць пастаянныя кантакты паміж Беларуссю і яе дыяспарай у свеце.

Арганізацыйную аснову згуртавання складалі больш за 80 беларускіх суполак у замежжы, рэгіянальныя арганізацыі ва ўсіх абласных цэнтрах Беларусі і індывідуальныя сябры. Вышэйшым органам згуртавання з'яўляюцца з'езды беларусаў свету, якія праводзяцца раз у чатыры гады. Першы з'езд арганізаваны з удзелам дзяржаўных структур і грамадскіх арганізацый 8–10 ліпеня 1993 г. у Мінску. (гл. *Першы з'езд беларусаў свету*). Былі ўнесены змены ў структуру кіруючых органаў. Рада была падзелена на два органы — Вялікую і Малую. У склад Вялікай Рады абіраюцца прадстаўнікі з усіх краін свету, дзе жывуць беларусы, і з Беларусі, яе задачай з'яўляецца вырашэнне важных стратэгічных пытанняў дзейнасці. Малая Рада складаецца з прадстаўнікоў з Беларусі дзеля больш аператыўнага яе склікання і вырашэння тактычных пытанняў. Прэзідэнтам быў абраны акадэмік Радзім Гарэцкі, старшынёй Рады — Ганна Сурмач. Другі з'езд адбыўся 26–27 ліпеня 1997 г. у Мінску (гл. *Другі з'езд беларусаў свету*). Абраны новы склад Вялікай і Малой Радаў, паўторна перавыбраны прэзідэнт і старшыня Рады. З'езды беларусаў свету з'яўляюцца не толькі галоўнымі мерапрыемствамі ЗБС "Бацькаўшчына", але і важнейшымі форумамі ўсёй сусветнай беларускай грамадскасці, яны сталі адметнымі падзеямі ў жыцці беларускай нацыі. Асноўнымі формамі дзейнасці згуртавання былі вызначаны разавыя і перыядычныя мерапрыемствы, непасрэдныя кантакты з беларускай дыяспараю ў час выезду супрацоўнікаў да беларускіх суполак у замежжа, прыём іх прадстаўнікоў у сядзібе згуртавання (г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 15), падтрымка і ўдзел у мерапрыемствах, якія праводзяцца ў беларускім замежжы, забеспячэнне беларускай дыяспары інфармацыяй пра Беларусь, рассылка друкаваных выданняў, беларускіх кніжак, метадычная дапамога ў наладжванні нацыянальна-культурнага жыцця ў розных краінах, правядзенне навуковых даследаванняў дзейнасці беларускай дыяспары і інш. Згуртаванне было арганізатарам такіх буйных мерапрыемстваў, як Першы сход беларусаў блізкага замежжа (снежань 1992), сустрэча-нарада кіраўнікоў беларускіх суполак у замежжы (лістапад 1995), тры міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі "Культура і адукацыя беларускага замежжа" (1994, 1996, 1998), прыняло ўдзел у рэгіянальных сустрэчах беларусаў (Першы і Другі з'езды краін Балтыі, 1994, 1998), сустрэчах беларусаў краін Паўночнай Амерыкі.

Згуртаванне наладзіла ў 1991 г. вандроўку мастацкіх калектываў на цеплаходзе па Волзе ў гарады, з якімі быў звязаны лёс М. Багдановіча. Правяло два летнікі для дзяцей замежных беларусаў на Нарачы (1993,1994). З удзелам згуртавання была праведзена культурная праграма "Беларусы ў Празе" (1996). Аказвала дапамогу ў будаўніцтве Беларускага музея ў Гайнаўцы (Польшча), ажыццяўляла выдавецкую дзейнасць (выдадзены кнігі М. Ермаловіча "Старажытная Беларусь", зборнік вершаў Н. Арсенневай і інш., 3 выпускі зборніка "Культура беларускага замежжа"). Па ініцыятыве і пры ўдзеле згуртавання быў адноўлены вобраз Крыжа св. Ефрасінні Полацкай, па выніках работы выдадзена кніга "Жыватворны сімвал Бацькаўшчыны" У. Арлова і зроблены дакументальны фільм "Шлях да святыні" В. Шавялевіча. Стала сузаснавальнікам Міжнароднага дабрачыннага фонду Жыватворнага Крыжа св. Ефрасінні Полацкай і разам з ім аказвае дапамогу ў аднаўленні Полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра.

Важным напрамкам дзейнасці згуртавання з'яўляецца ўсталяванне эканамічных сувязей паміж беларусамі ў розных краінах, спрыянне эканамічным кантактам Беларусі ў замежжы. У ліпені 1993 г. пры згуртаванні было створана *Згуртаванне прадпрымальнікаў беларускай дыяспары*, а пазней — сумеснае прадпрыемства "Міжнародны цэнтр прадпрымальнікаў беларускай дыяспары". У склад гэтых структур увайшлі прадпрымальнікі-беларусы з розных краін свету. Згуртаванне аказвала матэрыяльную дапамогу беларускім суполкам у замежжы і ў правядзенні мерапрыемстваў ЗБС "Бацькаўшчына". Яно не толькі падтрымлівае пастаяныя кантакты з беларускім замежжам, але і з'яўляецца актыўным чыннікам грамадскага жыцця ў самой Беларусі, прымае ўдзел у розных мерапрыемствах нацыянальна-культурнага плана. Сваёй дзейнасцю ЗБС "Бацькаўшчына" аб'ядноўвае ўсіх беларусаў у адну сусветную беларускую супольнасць, садзейнічае таму, каб нашы суродзічы не забывалі пра свае карані, пра бацькоўскую зямлю, захоўвалі сваю беларускую адметнасць сярод іншых народаў.

Ганна Сурмач

Згуртаванне беларускай культуры Іда-Вірумаа

У сакавіку 1989 г. было створана Кохтла-Ярвескае згуртаванне беларускай культуры, якое з цягам часу перарасло ў аб'яднанне беларусаў Іда-Вірумаа у Кохтла-Ярве, Йыхві, Сомпа, Ківіылі, Ору, Сіламяэ. Дзейнічае на тэрыторыі Паўночна-Усходняй Эстоніі, дзе этнічных эстонцаў усяго каля 20 %. Астатняе насельніцтва рэгіёна складаюць рускія, фіны, палякі, украінцы, яўрэі, татары ды інш. Сярод іх — каля 7 тысяч этнічных беларусаў. Згуртаванне падтрымлівае сяброўскія сувязі з беларускімі культурнымі суполкамі ў іншых краінах Балтыі, Санкт-Пецярбургу, ладзіць мастацкія выстаўкі, у тым ліку і беларускіх мастакоў, прапагандуе беларускую культуру, фальклор у Эстоніі. Сярод найбольш актыўных яго сяброў Уладзімір Дзехцярук, Зінаіда Клыга, Тамара Пашкоўская, Тамара і Мікола Галкоўскія, Надзея Гаўрылава, Ганна Корка, Лідзія Глімакова і інш. — сёння ў спісах згуртавання больш за 100 асоб.

Пятрусь Капчык (Ізяслаў, Украіна)

Згуртаванне беларускіх грамадскіх арганізацый (ЗБГА) у Літве

Грамадская арганізацыя беларускай супольнасці ў краіне. Заснавана ў верасні 1996 г., зарэгістравана 10 студзеня 1997 г. з мэтай каардынацыі, узгаднення культурна-асветнай дзейнасці беларускіх арганізацый, пашырэння беларускай прысутнасці ў Літве, умацавання сувязей з бацькаўшчынай. У 2000 г. у склад згуртавання ўваходзіла 10 беларускіх суполак і 3 філіялы. Прэзідент — Лявон Мурашка. ЗБГА падтрымлівае цесныя сувязі з міністэрствамі адукацыі, культуры Беларусі і іншымі ўстановамі. Беларускае пасольства ў Літве спрыяла згуртаванню ў атрыманні дапамогі беларускіх улад для рамонту Віленскай беларускай сярэдняй школы, набыцця падручнікаў, абсталявання. Па рэкамендацыі больш 20 навучэнцаў школы прыняты на вучобу ў вну Беларусі. Згуртаванне дапамагае ў арганізацыі культурна-асветнай работы. Удзельнічае ў святкаванні абвяшчэння БНР, Слуцкага паўстання. Пры падтрымцы літоўскіх устаноў правяло святы беларускай песні ў Шальчынікаі (1996), Вісагінасе (1997), Вільнюсе (1998), Друскінінкаі (1999), Швянчонісе (2000). Пры садзейнічанні ЗБГА Міністэрства культуры і Дзяржкамітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей Беларусі перадалі камплекты нацыянальных сцэнічных касцюмаў мастацкім калектывам Вісагінаса і Друскінінкая, камп'ютэрнага выдавецкага комплексу Беларускаму культурнаму цэнтру ў Шальчынінкаі. Намаганнямі ЗБГА і пры яго ўдзеле ўрад Беларусі выдзеліў сродкі для стварэння помніка Кастусю Каліноўскаму (скульптар В. Янушкевіч), які ўстаноўлены ў Шальчынінкаі пры спрыянні мэра горада. Згуртаванне мае намер узнавіць Музей беларускай культуры і заняцца пашырэннем нацыянальнай адукацыі, хадайнічае аб пераўтварэнні школы ў гімназію. Рада згуртавання ў маі 1998 г. пастанавіла ў сувязі з адраджэннем "сімвала святасці і дзяржаўнасці беларускай зямлі" — крыжа Св. Ефрасінні Полацкай — лічыць 5 чэрвеня святочным днём для беларусаў Літвы.

Галіна Сяргеева

Згуртаванне прадпрымальнікаў беларускай дыяспары

Грамадская арганізацыя, створана 9 ліпеня 1993 г. пры Згуртаванні беларусаў свету "Бацькаўшчына" ў час Першага з'езда беларусаў свету. На устаноўчай канферэнцыі згуртавання прысутнічалі 78 прадстаўнікоў з ЗША, Англіі, Германіі, Расіі, Украіны, Казахстана, Польшчы, Латвіі і інш. З'езд прыняў пастанову "Аб Радзе прадпрымальнікаў беларускай дыяспары" і заклікаў дзяржаўныя ўлады падтрымаць яе дзейнасць. У кіруючы орган згуртавання — Каардынацыйную Раду было абрана 13 сяброў: В. Аўраменка (Беларусь), М. Бяляцкі (Беларусь), Я. Кабановіч (Латвія), А. Лук'янчык (ЗША), М. Панічаў (Расія), А. Сілівончык (Расія), В. Ткачэнка (Беларусь), М. і П. Юшчукі (Польшча), А. Ядчанка (Украіна), Я. Ясвіловіч (Англія) і інш. Старшынёй быў абраны Барыс Стук, эканамічны дырэктар ЗБС "Бацькаўшчына", адказным сакратаром — Алена Макоўская. Асноўнымі мэтамі згуртавання былі вызначаны: каардынацыя намаганняў прадпрымальнікаў беларускай дыяспары ў мацаванні

эканамічных сувязей Рэспублікі Беларусь і тых краін, дзе жывуць прадстаўнікі беларускай дыяспары, спрыянне нацыянальнаму і культурнаму адраджэнню Рэспублікі Беларусь, падтрыманне дзейнасці ЗБС "Бацькаўшчына" і інш. грамадскіх і культурных арганізацый беларускай дыяспары. Каардынацыйнай Радай 29 ліпеня 1993 г. было прынята рашэнне аб стварэнні Міжнароднага цэнтра прадпрымальнікаў беларускай дыяспары ў форме сумеснага прадпрыемства. Цэнтр быў створаны і зарэгістраваны Міністэрствам знешніх эканамічных сувязей 14 чэрвеня 1994 г. Заснавальнікамі цэнтра выступілі фізічныя і юрыдычныя асобы з розных краін і з Беларусі. Стварэнне цэнтра прадпрымальнікаў значна пашырыла магчымасці згуртавання і стварыла рэальны механізм для выканання сумесных эканамічных праектаў, аб'яднання беларускіх прадпрымальнікаў з розных краін у адну інфармацыйную прастору. Згуртаванне дапамагала заснаванню гандлёвых дамоў за межамі Беларусі (Гандлёвы дом "Беларусь" у Рызе), ажыццяўляла інш. эканамічную дзейнасць. Сябры згуртавання аказваюць дапамогу беларускім суполкам у сваіх краінах, фінансуюць выданне газет, правядзенне розных мерапрыемстваў. Згуртаванне ўдзельнічала ў фінансаванні многіх значных праграм і мерапрыемстваў ЗБС "Бацькаўшчына" — Першага і Другога з'ездаў беларусаў свету, канферэнцый, Праграмы аднаўлення вобраза Крыжа св. Ефрасінні Полацкай, выдання кніг і інш.

Ганна Сурмач

"Зорка"

Беларускі грамадска-культурны клуб у Кіеве ў 1917–1919(?) гг. Сярод яго ўдзельнікаў — Л. Леўшчанка, Ю. Фарботка. Прадстаўнік гуртка К. Мядзёлка ўдзельнічаў у з'ездзе воінаў-беларусаў Заходняга фронту (Мінск, кастрычнік 1917 г.). Сябры гуртка заснавалі беларускае выдавецтва "Зорка", якое выпусціла складзеную Леўшчанкам анталогію "Дыяменты беларускага прыгожага пісьменства" (Кіеў, 1919).

Віталь Скалабан

З'езды беларусаў краін Балтыі (1994, 1998)

Арганізаваліся беларускімі суполкамі Літвы, Латвіі, Эстоніі, Калінінграда, Санкт-Пецярбурга, Польшчы з удзелам грамадскіх арганізацый з Беларусі. Асноўная мэта — кансалідацыя беларускай грамадскасці ў рэгіёне Балтыі, устанаўленне кантактаў, абмеркаванне і вырашэнне сумесных праблем, супрацоўніцтва ў галіне развіцця нацыянальнай культуры і адукацыі. Галоўным арганізатарам з'ездаў стала Таварыства беларускай культуры ў Літве. Першы з'езд адбыўся 6–7 жніўня 1994 г. у Вільнюсе. Прайшлі дыскусіі, сустрэчы па інтарэсах па наступных тэмах: беларускія суполкі і іх узаемасувязь; сродкі масавай інфармацыі; школьніцтва, праблемы адукацыі; мастацкая самадзейнасць; рэгіянальныя сувязі і абмены і кантакты з Беларуссю праз ЗБС. З удзелам дэлегатаў была адчынена мемарыяльная дошка Янку Купалу. З'езд прыняў выніковыя дакументы: Дэкларацыю Першага з'езда беларусаў Балтыі; Зварот да ўладаў Беларусі з просьбай падтрымаць беларусаў краін Балтыі. Другі з'езд праходзіў 25–26 ліпеня 1998 г. у будынку былой Віленскай беларускай гімназіі. З'езд прывітаў прэзідэнт Літвы Валдас Адамкус, выступілі дэлегаты ад многіх беларускіх суполак і госці з Беларусі. Абмяркоўваліся надзённыя пытанні жыцця беларусаў у Прыбалтыйскіх краінах, становішча ў Беларусі, патрэбы беларускіх асяродкаў у галіне культуры, адукацыі. Былі прыняты Зварот да беларусаў Балтыі, Заява аб сітуацыі ў Беларусі, Віншаванне грамадзянам Беларусі і ўсім беларусам свету з нагоды прыняцця 27 ліпеня 1990 г. Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце. Віленскія мастакі-беларусы зрабілі мастацкую выстаўку. Па выніках з'езда 27 ліпеня 1998 г. прайшла прэс-канферэнцыя ў Саюзе журналістаў Літвы. Інфармацыя пра з'езд і яго дакументы апублікаваны ў газеце "Рунь" (Вільнюс, 1998. 14–16 жн.).

Ганна Сурмач

Іркуцкае таварыства беларускай культуры імя Я. Чэрскага

Заснавана 31 мая 1996 г. на І з'ездзе беларусаў Іркуцкай вобласці, які зацвердзіў назву, эмблему і асноўныя палажэнні Статута. Кіруючы орган — Рада (старшыня — доктар экан. навук Г. Соніч), сябры — А. Рудакоў, А. Грыбаноўская, Г. Клімовіч, Н. Краснова, інш. Мэты таварыства — гуртаванне беларусаў Усходняй Сібіры, захаванне беларускай свядомасці, мовы і культурных традыцый, пашырэнне ведаў аб Беларусі і беларускім народзе, праца з дзецьмі. Колькасць сябраў таварыства — каля 150 чал. Пры таварыстве працуе беларуская нядзельная школа, дзейнічае маладзёжны клуб з танцавальнай, фальклорнай, краязнаўчай секцыямі, створаны дзіцячы ансамбль "Пралескі". У Цэнтральнай гарадской бібліятэцы адкрыты беларускі аддзел. Члены таварыства ладзяць святкаванні беларускіх нацыянальных і традыцыйных святаў, юбілеі вядомых пісьменнікаў і грамадскіх дзеячаў. Выдаецца газета-бюлетэнь "Маланка".

Анфіса Ляднёва

Камітэт беларускі ў Польшчы

Беларускі камітэт у Польшчы, арганізацыя грамадскай апекі над беларусамі ў Польшчы ў гады Другой сусветнай вайны. Створаны ў пачатку 1940 г. у Варшаве з дазволу нямецкіх акупацыйных улад. Першапачаткова называўся Беларускі саюз самапомачы, летам 1940 г. быў перайменаваны ў Камітэт беларускі. Кіраўнікі Ф. Акінчыц, М. Шчорс, М. Ждановіч і інш. Меў прадстаўніцтвы ў Белай Падляскай і Кракаве, гурткі на Падляшшы. Членамі камітэта былі даваенныя жыхары Варшавы, уцекачы з паўночна-ўсходніх ваяводстваў Польшчы, якія не пажадалі заставацца на занятай у верасні 1939 г. савецкімі войскамі тэрыторыі і ў пачатку вайны шукалі прытулку ў Варшаве, а таксама вызваленыя з нямецкага палону ваеннаслужачыя польскай арміі беларускай нацыянальнасці. У сакавіку 1942 г. аб'ядноўваў каля 6 тыс. чалавек. Камітэт займаўся зборам і размеркаваннем сярод сваіх членаў адзення, прадуктаў харчавання, картак на набыццё прамысловых тавараў штодзённага ўжытку, аказаннем юрыдычнай, медыцынскай і грашовай дапамогі. Працавала камітэцкая сталоўка, паслугамі якой у 1942 г. штодзённа карысталіся каля 150 чалавек. З мэтай пашырэння нацыянальнай адукацыі арганізоўваліся лекцыі, дыскусійныя вечары, курсы беларусазнаўства, на якіх з дакладамі выступалі Я. Станкевіч, М. Шчорс, В. Гадлеўскі, П. Татарыновіч, Ч. Ханяўка і інш. Дзейнічалі беларуская бібліятэка, хор і аркестр, драматычная секцыя (сярод інш. пастаўлены спектаклі "Выбары старшыні" Я .Быліны, "Суд" У. Галубка), дзіцячы тэатр (кіраўнік Л. Панько), праводзіліся канцэрты з удзелам М. Забэйды-Суміцкага. Намаганнямі Камітэта беларускага ў Варшаве была адкрыта беларуская пачатковая школа з інтэрнатам (працавала ў 1942—1944 гг.), летам 1943 г. арганізаваны двухмесячны лагер для вучняў у Забалоцці (Бела-Падляская гміна). Камітэт садзейнічаў стварэнню ў Варшаве беларускай праваслаўнай і каталіцкай парафій, царкоўнага брацтва імя св. Юрыя, якое ў 1942—1943 гг. выдала "Унармаваны статут праваслаўных царкоўных брацтваў", "Беларускі праваслаўны малітоўнік", "Праваслаўны месяцаслоў на 1942 г.", "Беларускі праваслаўны патэрык". У рамках Камітэта беларускага працавалі праваслаўная (кіраўнік А. Шыла, з кастрычніка 1943 г. А. Краскоўскі) і каталіцкая (Татарыновіч) царкоўныя камісіі, якія займаліся лінгвістычнай уніфікацыяй беларускамоўных тэкстаў праваслаўных і каталіцкіх малітваў, правапісу імён. Члены камітэта архімандрыт Філафей (Нарко), Краскоўскі і Б. Стрэльчык уваходзілі ў створаную ў верасні 1941 г. мітрапалітам Дзянісам Беларускую царкоўную раду, якая распрацоўвала для нямецкіх улад рэкамендацыі па аднаўленню дзейнасці праваслаўнай царквы ў Беларусі. Кіраўніцтва Камітэта беларускага не было аднадушным у поглядах на рэалізацыю асноўнай палітычнай мэты — аднаўленне беларускай дзяржаўнасці. Адны (Шчорс, Гадлеўскі і інш.) выступалі за супрацоўніцтва з Германіяй, вербавалі кандыдатаў для акупацыйнай адміністрацыі ў Беларусі, давалі нямецкім уладам рэкамендацыі па вырашэнню беларускага пытання; другія (Станкевіч і інш.) арыентаваліся на заходнія дзяржавы, імкнуліся да тактычнага пагаднення з польскім нацыянальным падполлем; трэція (В. Літвінчык, К. Паўлоўская) супрацоўнічалі з камуністычным падполлем. Дзейнасць камітэта фактычна спынілася 1 жніўня 1944 г. з пачаткам Варшаўскага паўстання. Управа Камітэта беларускага была эвакуіравана ў Кракаў і намінальна існавала да вызвалення горада Савецкай Арміяй у студзені 1945 г.

Юрый Туронак (Варшава)

Камітэт загранічных груп беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў

Існаваў ў 1921–1924 гг. у г. Каўнасе (Коўне). Утвораны 6.2.1921 г. Аб'ядноўваў частку членаў Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р), якая апынулася ў эміграцыі пасля падпісання Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. Ядро камітэта склалі Т. Грыб, А. Цвікевіч, Л. Заяц, К. Дуж-Душэўскі, В. Ластоўскі, А. Вальковіч і інш., якія пражывалі ў Коўне. Камітэт узначальвалі Грыб (ЦК БПС-Р, ковенская група), А. Галавінскі (гродзенская група), Я. Чарапук (рыжская група). Камітэт заявіў аб непрызнанні Рыжскага дагавора і БССР, аб працягу барацьбы за незалежную Беларускую працоўную Рэспубліку ў яе этнаграфічных межах. Ён адмежаваўся ад дзейнасці С. Булак-Балаховіча, Б. Савінкава, партыі "Зялёны дуб", ахарактарызаваўшы апошнюю як "авантурніцкую і прапольскую". Абвясціў адзіным беларускім нацыянальна-дзяржаўным прадстаўніцтвам Народную Раду БНР і яе кабінет міністраў на чале з Ластоўскім. Падтрымліваў сувязь з прадстаўнікамі левага крыла Віленскага беларускага нацыянальнага камітэта (С. Рак-Міхайлоўскі, Ф. Ярэміч і інш.). Адзін з арганізатараў склікання Першай Усебеларускай канферэнцыі ў Празе (верасень 1921 г.), стварыў для яе падрыхтоўкі спецыяльную камісію і надпартыйны орган-фундатар — "Беларускую нацыянальную сувязь". 17.6.1922 г. утварыў прэзідыум у складзе А. Карабача (старшыня), У. Пракулевіча і А. Галавінскага для арганізацыйнага ўмацавання камітэта. Арганізаваў таксама праэсэраўскую "Беларускую сялянскую грамаду ў Літве". У красавіку 1923 г. камітэт пакінуў Ластоўскі, у ліпені 1923 г. — Дуж-Душэўскі. У кастрычніку 1923 г. Грыб, П. Бадунова і Я. Мамонька стварылі ў Празе Бюро ЦК ПБС-Р за граніцай, якое 17.10.1923 г. выключыла ковенскі камітэт у поўным складзе з БПС-Р за ўдзел у выбарах у літоўскі сейм і падтрымку ўрада А. Цвікевіча. Камітэт не прызнаў гэтага рашэння, але, па сутнасці, перастаў выконваць функцыі адзінага партыйнага цэнтра БПС-Р у эміграцыі. Пасля фармальнага рашэння аб самароспуску БПС-Р, прынятым на з'ездзе ў Мінску (чэрвень 1924 г.), Камітэт загранічных груп беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў спыніў сваё існаванне.

Валянціна Лебедзева, Аляксандр Ціхаміраў

Кафедра беларускай філалогіі Вільнюскага педуніверсітэта

Кафедра беларускай філалогіі (да 1999 г. – кафедра беларускай мовы, літаратуры і этнакультуры) была створана на факультэце славістыкі ВПУ паводле Пастановы Урада Літоўскай Рэспублікі ад 31 ліпеня 1991 г. У беларускай адукацыйнай сістэме Літвы яна займае цэнтральнае месца як метадычны цэнтр па наступных накірунках: каардынацыя і падрыхтоўка спецыялістаў для беларускіх навучальных устаноў у Літве і літоўскіх – у Беларусі; канцэпцыя беларускай школы ў агульнаадукацыйнай сістэме краіны; паляпшэнне методыкі выкладання роднай мовы ў іншамоўным асяроддзі; стварэнне вучэбных дапаможнікаў і адаптацыя падручнікаў.

Па ініцыятыве кафедры арганізавана сярэдняя школа з беларускай мовай навучання (СШ імя Ф. Скарыны) у Вільнюсе, распрацаваны праграмы па беларускай мове, аказваецца іншая метадычная дапамога. Цяпер на трох курсах беларускага аддзялення вучацца 34 асобы. Акрамя асноўнай спецыяльнасці "беларуская філалогія" студэнты паралельна займаюцца на іншых спецыяльнасцях: псіхалогія, літоўская мова, нямецкая мова, мастацтва і інш. Выпускнікі беларускага аддзялення працуюць у Вільнюскай сярэдняй школе імя Ф. Скарыны, беларускіх пачатковых класах г. Вісагінаса, беларускіх праграмах літоўскага радыё і тэлебачання, школах Беларусі, а таксама працягваюць вучобу ў магістрантуры. Наладжаны кантакты з шэрагам навуковых і навучальных устаноў розных краін. Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэтам імя М. Танка, Міжнароднай асацыяцыяй беларусістаў, Цэнтрам нацыянальных культур (Беларусь), Беларускім інстытутам навукі і мастацтва (ЗША), Клагенфурцкім універсітэтам (Аўстрыя) і інш. Ініцыявана стварэнне аналагічнага цэнтра літуаністыкі ў Беларусі.

У 1992 г. сумесна з Нацыянальным навукова-асветным цэнтрам імя Ф. Скарыны і Міжнароднай асацыяцыяй беларусістаў кафедрай была праведзена навуковая канферэнцыя, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння пісьменніцы З. Верас. У 1997 г. кафедра выступіла адным з арганізатараў Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Культура беларуска-літоўска-польскага памежжа". Супрацоўнікі кафедры часта выступаюць з навуковымі дакладамі на міжнародных канферэнцыях па праблемах мовы, адукацыі і культуры, выкладаюць на летніх Міжнародных студыях славістыкі, друкуюцца ў навуковых зборніках і часопісах.

Асноўны накірунак навуковай дзейнасці – беларуская культура ў Літве і яе трансфармацыя праз беларуска-літоўскае памежнае ўзаемадзеянне.

Ліля Плыгаўка (Вільнюс)

"Круг беларускай народнай прасветы і культуры"

"Круг беларускай народнай прасветы і культуры" ("Круг беларускі"), культурна-асветная арганізацыя ў Пецярбургу ў 1902—1904 гг. У яе ўваходзілі В. Іваноўскі, браты І. і А. Луцкевічы, беларускія студэнты, якія вучыліся ў ВНУ Пецярбурга. Займалася друкаваннем і распаўсюджваннем беларускіх выданняў, у т. л. тых, што выпускаліся за мяжой, пошукам сродкаў для выдання беларускай літаратуры ў Расіі. Фінансавую і іншую падтрымку арганізацыі аказвалі браты К. і А.Кастравіцкія. Мела цесныя сувязі з прыхільнікамі беларускай кнігі ў Варшаве і Кракаве. Выдала паэтычны зборнік "Вязанка" Я. Лучыны (1903, цэнзуры быў прадстаўлены як напісаны на балгарскай мове), на гектографе — зборнікі "Калядная пісанка на 1904 год" і "Велікодная пісанка" (1904). Сябры арганізацыі спрабавалі выдаваць у 1902 г. нелегальную газету "Свабода".

Уладзімір Філякоў

"Крывіцкі вязок"

Беларуская нацыянальна-асветная суполка. Дзейнічала ў Пецярбургу ў 1868–1870 гг. Стваральнікам і кіраўніком суполкі з'яўляўся паэт і публіцыст В. Савіч-Заблоцкі. Колькасны і асабісты склад арганізацыі невядомы, пра яе дзейнасць матэрыялаў амаль не захавалася і вядома толькі з уласных слоў Савіча-Заблоцкага. Суполка займалася выданнем папулярных беларускіх кніг для простанароддзя, вывучэннем беларускай мовы, збіраннем фальклору, падрыхтоўкай слоўніка беларускай мовы, падручнікаў па розных галінах ведаў для беларускіх сялян. Члены суполкі займаліся таксама збіраннем матэрыялаў і вывучэннем гісторыі Беларусі, знаходзіліся пад уплывам ідэй народнікаў, прапагандавалі неабходнасць "хаджэння ў народ" для яго асветы. Пецярбургскія ўлады абвінавацілі ўдзельнікаў арганізацыі ў "сацыялізме і прапольскіх сімпатыях". Яе дзейнасць была афіцыйна забаронена, а В. Савіч-Заблоцкі быў вымушаны выехаць у Варшаву.

Ларыса Языковіч

Латвійскі Фонд беларускай культуры

Латвійскі фонд беларускай культуры (ЛФБК) створаны 27 ліпеня 1995 г. у Рызе. 25 верасня 1995 г. зарэгістраваны ў Міністэрстве юстыцыі Латвійскай Рэспублікі. Колькасць сяброў — 41 чалавек. ЛБФК — адкрыты грамадскі фонд, асноўнай мэтай якога з'яўляецца захаванне беларускай культуры, мовы, традыцый беларускага народа і ўзбагачэнне духоўнага жыцця беларусаў, якія пражываюць у Латвіі. У мэты фонду ўваходзіць вывучэнне, захаванне, развіццё і папулярызацыя культурна-гістарычнай спадчыны, нацыянальнай культурнай самабытнасці беларусаў; развіццё і пашырэнне вывучэння фальклору. Галоўныя напрамкі дзейнасці — супрацоўніцтва з беларускімі суполкамі Латвіі і падтрымка іх; падтрымка беларускіх школ; навуковая дзейнасць і арганізацыя семінараў, выставак, канферэнцый, святкаванне памятных дат, падзей, звязаных з гісторыяй і культурай беларускага народа; спрыянне развіццю народнай мастацкай творчасці; адраджэнне беларускіх народных промыслаў і рамёстваў, звычаяў і абрадаў.

ЛБФК мае сваю атрыбутыку, з'яўляецца юрыдычнай асобай і мае рахунак у банку. Фінансавыя сродкі фонду складаюцца з уступных і членскіх узносаў, ахвяраванняў і іншых даходаў з крыніц фінансавання, не забароненых законамі Латвіі. Рада фонду ў колькасці 9 чалавек выбіраецца тэрмінам на 2 гады. Старшыня Рады фонду да 9 мая 1997 г. быў Юрый Ярчак, затым старшынёй фонду абраны Алесь Карповіч.

Алесь Карповіч (Рыга)

Люцынская дзяржаўная беларуская гімназія

Сярэдняя вучэбная ўстанова для дзяцей беларускай меншасці ў Латвіі. Заснавана 1 верасня 1922 г. як прыватная гімназія Беларускага культурна-асветнага таварыства "Бацькаўшчына". Са жніўня 1923 г. — на ўтрыманні Беларускага аддзела пры Міністэрстве асветы Латвіі. Асяродак беларускай нацыянальнай жыццядзейнасці ў Люцінскім (Лудзенскім) павеце. Набіраліся ў гімназію вучні з 30 навакольных пачатковых школ. Навучэнцы ў час пазакласнай работы збіралі ўзоры беларускай народнай творчасці, выдавалі літаратурны часопіс "Ластаўка", дзе змяшчаліся фальклорныя запісы, вершы пачаткоўцаў — Пятра Масальскага (псеўданім Пятро Сакол), Валянціны Казлоўскай (псеўданім Лясная кветка). Драматычны гурток, якім кіраваў Сяргей Казека, ладзіў спектаклі (любімая п'еса — "Паўлінка" Янкі Купалы). Сярод самадзейных артыстаў — К. Мікалюнас, І. Казлоўскі, Я. Кудраўцаў, З. Васілеўская. У архіве Я. Райніса ў Рызе зберагаецца фотаздымак Кацярыны Мікалаюнас ў ролі Паўлінкі з надпісам: "Яго Міласці Высокапаважанаму Грамадзяніну Дэпутату Я. Райнісу ад Люцынскай Беларускай гімназіі на ўспамін. 28.4.1923 г." (Музей гісторыі літаратуры і мастацтва Латвіі імя Я. Райніса).

Гімназія функцыянавала ў складзе 4-х класаў (80–85 вучняў). Дырэктарамі былі Г. Плыгаўка, К. Езавітаў, У. Пігулеўскі і інш.

З мая 1924 па красавік 1925 г. у Латвіі праходзіў так званы "Беларускі судовы працэс", на якім беларускія настаўнікі абвінавачваліся ў антыдзяржаўных дзеяннях. Дырэктар К. Езавітаў апынуўся у турэмным зняволенні. Усе падсудныя былі апраўданы, але ў выніку агітацыі супраць беларускага руху 1 жніўня 1925 г. Міністэрства асветы Латвіі гімназію закрыла. Частка вучняў вярнулася дадому, частка паступіла ў рускія школы, а 34 вучні перайшлі вучыцца ў Дзвінскую дзяржаўную беларускую гімназію.

Сяргей Панізьнік

"Маланка"

Гурт беларускай народнай песні ""Маланка" — адзін з самых папулярных беларускіх калектываў Беласточчыны. Існуе ён з 1990 г. пры Доме культуры ў Бельску-Падляшскім. Склад калектыву — 16 асоб, у тым ліку 11-ціасабовая група і 5-ціасабовая інструментальная група. "Маланка" ўзнікла ў студзені 1990 г. як вакальнае трыо, у якім спявалі ранейшыя ўдзельнікі ансамбля "Дзявочыя ноткі" з Белліцэя ў Бельску-Падляшскім. Дэбют трыо адбыўся ў лютым 1990 г. на раённым аглядзе беларускай песні ў Бельску-Падляшскім, а на цэнтральных спаборніцтвах гурт стаў лаўрэатам.

Першая замежная паездка "Маланкі" — яе выступленне на Фестывалі харавой музыкі ў Гродне ў красавіку 1991 г. У 1993 г. ансамбль прыняў удзел у свяце Еўропы ў Сан-Лямбэр дзю Лятэ ў Францыі, даўшы там тры канцэрты. У лістападзе 1993 г. пабываў у Германіі ў мясцовасці Бад-Эсэн. Другі раз "Маланка" наведала Бад-Эсэн у снежні 1995 г. У тым жа годзе гурт удзельнічаў у І Міжнародным фестывалі фальклору ў Пінску, рэпрэзентаваў беларускую супольнасць на аглядах калектываў нацыянальных і этнічных меншасцей у Гданьску, Варшаве, Пуньску. "Маланка" — шматразовы лаўрэат Фестываляў беларускай песні ў Беластоку, а таксама ўдзельнік шматлікіх беларускіх мерапрыемстваў на Беласточчыне. У рэпертуары калектыву беларускія народныя песні, песні з Падляшша. Лірычныя і жартоўныя песні, выкананыя ў простай музычнай апрацоўцы і стылізаванай форме карыстаюцца вялікай папулярнасцю сярод слухачоў. Гурт запісаў чатыры магнітафонныя касеты: тры — з народнымі песнямі і адну — з праваслаўнымі калядкамі. Плануецца выдаць кампакт-дыск.

Сяргей Лукашук (Бельск-Падляшскі, Польшча)

"Маю гонар"

Аб'яднанне мастакоў-беларусаў Балтыі. Створана ў 1991 г. у Рызе на ўстаноўчым з'ездзе. Старшынёй абраны Вячка Целеш, сакратаром Маргарыта Астраумава. Назва аб'яднання адлюстроўвае пашану яго членаў да сваіх нацыянальных каранёў, мовы, гісторыі, гонар далучаць сваю працу да адраджэння беларускай культурнай спадчыны. "Маю гонар" мае аддзяленні ў Латвіі (В. Целеш, Мікола Гаўрыловіч, Галіна Зашчыранская, Ларыса Лойка, Васіль Малышчыц, Тамара Насенка і інш.), Эстоніі (М. Астраумава), Літве (Алег Аблажэй, Хрысціна Балаховіч), Санкт-Пецярбургу (Юрый Казак, Ігар Казлоўскі, Іван Чарнякевіч, Віктар Сівуха), Швецыі (Ян Кузьміцкі), якія маюць права арганізоўваць выстаўкі як у сябе, так і па-за межамі сваіх краін. У Літве выстаўкі твораў беларускіх мастакоў з 1995 г. ладзяцца кожныя два гады. Агульныя выстаўкі былі арганізаваны ў Рызе ў 1991, 1996 гг. з выездам у іншыя краіны — Беларусь, Эстонію. У 1993 г. "Маю гонар" ўдзельнічала ў выстаўцы мастакоў-беларусаў свету "Жыве Беларусь!", прысвечанай I з'езду беларусаў свету.

Мастакі аб'яднання прадстаўляюць розныя напрамкі выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, скульптуры, графікі, жывапісу.

Анфіса Ляднёва

Міжнародная асацыяцыя беларусістаў (МАБ)

Грамадскае (недзяржаўнае, непалітычнае, непрыбытковае) аб'яднанне, якое гуртуе звыш 650 вучоных, пісьменнікаў, перакладчыкаў, дзеячаў культуры з 23 краін свету, у тым ліку з памежных краін. Створана 27 мая 1991 г. на Першым Міжнародным кангрэсе беларусістаў, у якім прымалі таксама удзел вучоныя — беларусы з Польшчы, Расіі, Украіны, (А. Баршчэўскі, В. Грыцкевіч, А. Каўка, Ю. Туронак, Я. Чыквін і інш.). На кангрэсе былі акрэслены асноўныя задачы МАБ: пашырэнне беларускай культуры ў свеце, сумеснае вывучэнне спадчыны беларускага народа, дапамога зарубежным даследчыкам адпаведнай літаратурай і бібліяграфічнай інфармацыяй, арганізацыя навуковых канферэнцый, сімпозіумаў і г. д. Беларусы з памежных краін выступілі з дакладамі таксама на II Кангрэсе МАБ (Н. Баршчэўская, А. Баршчэўскі, В. Грыцкевіч, А. Катлярчук, А. Каўка, А. Мусорын, Л. Пісарэк, М. Ткачэнка, В. Целеш, Я. Чыквін, Я. Шыраеў і інш.). У час кангрэса прайшлі "круглыя сталы", прысвечаныя беларуска-латышскаму, беларуска-літоўскаму, беларуска-польскаму, беларуска-рускаму і беларуска-украінскаму грамадска-культурнаму ўзаемадзеянню (іх матэрыялы апублікаваны у зб. "Беларусіка = Albarutheniса" Вып. 6; Мн., 1997. Ч. 2.). У памежных краінах дзейнічаюць, праводзяць канферэнцыі, выдаюць кнігі нацыянальная і рэгіянальныя асацыяцыі беларусістаў, якія узначальваюць М. Абала (Латвія), А. Лапінскене (Літва), А. Баршчэўскі (Польшча), А. Нарбут і М. Нікалаеў (Расія — Масква і Санкт-Пецярбург), Р. Піўтарак (Украіна). Жыццё беларусаў у памежных краінах і далёкім замежжы знаходзіць шырокае адлюстраванне у выданнях МАБ — найперш у зборніках "Беларусіка = Albarutheniса" і штомесячным інфармацыйна-аналітычным бюлетэні "*Кантакты і дыялогі*". Так, у пятым выпуску "Беларусікі" (Мн., 1996) змешчаны матэрыялы міжнароднай канферэнцыі "Культура беларускага замежжа". У 1998 г. выйшаў "Беларускі зборнік", складзены пецярбургскімі беларусістамі на падставе матэрыялаў штогадовых канферэнцый "Санкт-Пецярбург і беларуская культура". Р. Піўтараком выдадзены падручнік беларускай мовы для украінцаў, М. Абала рыхтуе беларуска-латышскі слоўнік. Літоўскімі і польскімі беларусістамі праведена некалькі сумесных навуковых мерапрыемстваў, прысвечаных культурнаму памежжу (сустрэча "Дарога да ўзаемнасці" ў Белавежы, канферэнцыя, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння З. Верас у Вільнюсе).

Алеся Белавусава

Міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі "Культура і адукацыя беларускага замежжа" (1994, 1996, 1998)

Ініцыятарам іх правядзення выступіла Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" сумесна з Нацыянальным навукова-асветным цэнтрам імя Ф. Скарыны. Удзельнікамі былі навукоўцы з Беларусі і з замежжа, а таксама тыя, хто меў практычны вопыт арганізацыі нацыянальна-культурнага жыцця ў беларускай дыяспары. Навуковым кіраўніком падрыхтоўкі канферэнцый з боку ЗБС з'яўляўся доктар мастацтвазнаўства Анатоль Сабалеўскі.

Галоўная мэта канферэнцый — вывучэнне і навуковае асэнсаванне культурных здабыткаў беларускага замежжа. Беларуская культура ў замежжы стала своеасаблівым феноменам у агульнай плыні нацыянальнай культуры. Яна развівалася на беларускай глебе і адначасова адчувала на сабе ўплыў культур тых народаў, сярод якіх жывуць беларусы ў розных краінах. Культура замежных беларусаў мае вялікія дасягненні, якія павінны быць даследаваны і зафіксаваны ў навуковай галіне. Асноўная тэматыка выступленняў — праблемы гісторыі, адукацыі, мовы, літаратуры, асобных відаў мастацтва, вывучэнне творчасці дзеячаў культуры.

Рада ЗБС "Бацькаўшчына" ў 1994 г. прыняла рашэнне перыядычна праводзіць канферэнцыі раз у два гады. Першая мела назву "Культура беларускага замежжа", праходзіла яна 12–13 чэрвеня 1994 г. у Мінску (Дом

літаратара). Даклады і паведамленні зрабілі 34 чал. З асноўным дакладам на тэму "Культура павінна жыць і аб'ядноўваць нацыю" выступіў віцэ-прэзідэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Радзім Гарэцкі. Былі заслуханы выступленні вядомых навукоўцаў — А. Сабалеўскага, Уладзіміра Конана, Сакрата Яновіча, Аляксея Каўкі, Зоры і Вітаўта Кіпеляў, Масея Сяднёва, Валянціна Грыцкевіча, Антона Луцкевіча, Антона Мірановіча і інш. Удзельнікі канферэнцыі прынялі рашэнне аб змяненні назвы канферэнцый на: "Культура і адукацыя беларускага замежжа". Матэрыялы канферэнцыі апублікаваны ў зборніку "Беларусіка = Albarutheniса–5" (Мн., 1995). Другая канферэнцыя адбылася 5–6 кастрычніка 1996 г. у Мінску (Дом літаратара). У першы дзень, на пленарным пасяджэнні, былі заслуханы пяць дакладаў — А. Сабалеўскага, Л. Лыча, Г. Сяргеевай, Я. Запрудніка, А. Мальдзіса і 19 паведамленняў. Другі дзень — работа секцый па культуры далёкага і блізкага замежжа. Матэрыялы канферэнцыі выдадзены ў зборніку "Культура беларускага замежжа" (Мн., 1998. Кн. 3.). Трэцяя канферэнцыя адбылася 17–19 ліпеня 1998 г. у Беластоку (Польшча), у будынку Беластоцкага універсітэта. Суарганізатарамі з боку беларусаў Польшчы былі Беларускі саюз у Польшчы, Беларускае гістарычнае таварыства, Літаратурнае аб'яднанне "Белавежа". 17 ліпеня 1998 г. канферэнцыя адкрылася пасяджэннем "круглага стала" на тэму "Беларусы Беласточчыны ў дыяспары". Назаўтра адбыліся пленарныя пасяджэнні. Заслухана пяць дакладаў — А. Мальдзіса, С. Яновіча, У. Конана, Г. Сяргеевай, А. Сабалеўскага і 19 паведамленняў. Прынята рэзалюцыя ў падтрымку беларускай культуры ў Польшчы і адкрыцця Беларускага культурнага цэнтра ў Беластоку. Для ўдзельнікаў канферэнцыі была арганізавана вандроўка па беларускіх мясцінах Беласточчыны.

Ганна Сурмач

Міністэрства беларускіх спраў пры ўрадзе Літвы (Міністэрства беларускіх спраў Літвы)

Дзяржаўная ўстанова Літвы. Створана ў лістападзе 1918 г. на падставе дамоўленасці паміж Прэзідыумам Літоўскай Тарыбы і Віленскай Беларускай радай для абароны інтарэсаў беларускага насельніцтва на тэрыторыях, якія павінны былі ўвайсці ў склад Літоўскай дзяржавы (Віленшчына і Гродзеншчына). Кіраўнікі: Я. Варонка (лістапад 1918 – люты 1920 г.), Д. Сямашка (люты 1920 – лістапад 1923 г.). Першапачаткова знаходзілася ў Вільні, у пачатку 1919 г. пераехала ў Гродна. З сакавіка 1919 г. — у Каўнасе (Коўна). У час знаходжання ў Вільні і Гродне кіраўнікі міністэрства прызначалі павятовых і гарадскіх камісараў, суддзяў, школьных інспектараў, ляснічых на Гродзеншчыне і Віленшчыне. У 1919–1920 гг. супрацоўнікі міністэрства садзейнічалі арганізацыі беларускага войска ў Літве, выступалі з пратэстамі супраць акупацыі польскімі войскамі беларускіх зямель, інфармавалі аб праблемах Беларусі прадстаўнікоў дыпламатычных місій замежных дзяржаў, што знаходзіліся ў Прыбалтыцы, дапамагалі дзейнасці Беларускага прэс-бюро ў Каўнасе, падтрымлівалі нелегальную сувязь з беларускімі арганізацыямі на тэрыторыях, занятых палякамі. У маі 1920 г. Д. Сямашка ўдзельнічаў у мірных перагаворах паміж Літвой і РСФСР, на якіх патрабаваў прызнаць правы Літвы на Віленшчыну і Гродзеншчыну. У 1921–1923 гг. міністэрства падтрымлівала прэтэнзіі Літвы на Вільню і Віленскую вобл., якія фактычна, а з сакавіка 1922 г. і юрыдычна ўваходзілі ў склад Польскай дзяржавы.

Значная ўвага надавалася супрацоўнікамі міністэрства выданню беларускай грамадска-палітычнай, навукова-папулярнай, педагагічнай і мастацкай літаратуры. Пры міністэрстве дзейнічала выдавецтва, якое за гады існавання выпусціла каля 20 кніг і брашур, у т. л. "Асновы дзяржаўнасці Беларусі" М. Доўнар-Запольскага, "Беларускі рух ад 1917 да 1920 года" і "Беларуская справа да міравой нарады ў Версалі" Я. Варонкі, "Міністэрства беларускіх спраў. За дзесяць месяцаў існавання" М. Засецкага, "Успаміны аб польскай акупацыі Гарадзеншчыны ў 1919–1920 г." І. Антонава, паэтычныя зборнікі "Дудка беларуская" і "Смык беларускі" Ф. Багушэвіча, зборнік "Казкі жыцця" Я. Коласа, паэму "Тарас-палясоўшчык", "Казкі" Г. -К. Андэрсена, англійскую легенду "Спявак Блондэль" (пер. В. Ластоўскі), навукова-папулярныя кнігі "Неба і зоры" (пер. Г. Казячы), "Закон жыцця сярод жывёл і раслін" В. Лункевіча, агульнаадукацыйныя падручнікі "Новы лемантар для беларускіх дзетак" (3-е выд.) Я. Станкевіча, "Батаніку" В. Зяленскага, "Фізіялогію і анатомію чалавека" Н. Малышава, падручнік "Новая гісторыя" Р. Віпера, "Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік" В. Ластоўскага, "Слоўнік геаметрычных і трыганаметрычных тэрмінаў і сказаў" К. Дуж-Душэўскага і Ластоўскага. Пры дапамозе міністэрства з верасня 1920 г. у Каўнасе выдаваўся ілюстраваны грамадска-палітычны, літаратурны і навукова-гістарычны штомесячнік "Часопіс".

З 1922 г. міністэрства пачало згортваць сваю дзейнасць, бо літоўскі ўрад лічыў беларускую праблематыку неістотнай, за гэта яго кіраўніцтва падвяргалася крытыцы з боку дзеячаў БНР і беларускай грамадскасці ў Літве. У лістападзе 1923 г. (па іншых звестках, у пачатку 1924) ва ўмовах пагаршэння літоўска-беларускіх адносін міністэрства было скасавана паводле загаду ўрада Літвы.

Аляксандр Ціхаміраў

Першы з'езд беларусаў свету

Праходзіў 8–10 ліпеня 1993 г. у Мінску, у Дзяржаўным тэатры оперы і балета. Арганізатарам з'яўлялася Згуртаванне беларусаў свету (ЗБС) "Бацькаўшчына" сумесна з дзяржаўнымі органамі і іншымі грамадскімі структурамі. Аргкамітэт па падрыхтоўцы з'езда быў створаны Радай ЗБС 29 ліпеня 1992 г. Сустаршынямі яго былі

выбраны: ад грамадскасці — Васіль Быкаў, ад дзяржаўных структур — міністр замежных спраў Пётр Краўчанка. Рабочую групу для арганізацыйнай працы па падрыхтоўцы з'езда ўзначаліла сябра Рады ЗБС Ганна Сурмач. Прысутнічалі 1200 удзельнікаў (з іх дэлегатаў — 996). Ад заходняй дыяспары — 255, (Англія, Аргенціна, Аўстрыя, Аўстралія, Бельгія, Германія, ЗША, Канада, Польшча, Францыя, Чэхія, Швейцарыя), ад усходняй дыяспары — 235 (Казахстан, Кыргызстан, Латвія, Літва, Малдова, Расійская Федэрацыя, Туркменія, Узбекістан, Украіна, Эстонія). Астатнія — з Беларусі.

З'езд адкрыў прэзідэнт ЗБС "Бацькаўшчына" В. Быкаў. З прывітаннямі выступілі Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі Станіслаў Шушкевіч, народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч. Даклад "Беларуская ідэя і адбудова беларускай дзяржаўнасці" зрабіў Радзім Гарэцкі, віцэ-прэзідэнт АН РБ. Ад заходняй дыяспары выступіў з дакладам Янка Запруднік (ЗША), ад дзяржаўных структур — намеснік Старшыні Савета Міністраў Міхаіл Дзямчук. Са справаздачным дакладам ад ЗБС "Бацькаўшчына" выступіў старшыня Рады Яўген Лецка.

Пленарныя пасяджэнні адбываліся 8 і 10 ліпеня. Усяго на іх выступіла больш за 70 чал. 9 ліпеня працавалі пяць "круглых сталоў" па тэмах: "Беларуская дзяржаўнасць", "Беларуская культура", "Беларуская гаспадарка", "Беларуская дыяспара", "Праблемы Чарнобыля". У другой палове дня прайшлі сустрэчы ўдзельнікаў з грамадскасцю па інтэрэсах: у Музеі Янкі Купалы, Доме літаратараў і інш. Прыняты дзевяць выніковых дакументаў: Дэкларацыя аб прынцыпах нацыянальнага дзяржаўнага будаўніцтва; звароты да беларусаў свету, да беларускага народа; Зварот да Парламента і Урада Рэспублікі Беларусь; Заява па вайсковаму пытанню; Рэзалюцыя аб падтрымцы дзейнасці ЗБС "Бацькаўшчына"; Пастанова аб Радзе прадпрымальнікаў беларускай дыяспары; Рэзалюцыя аб падтрымцы Беларускай рэдакцыі Радыё "Свабода"; Зварот аб устанаўленні мемарыяльнай дошкі на будынку, дзе была абвешчана БНР. З'езд адначасова стаў важнейшым кіруючым органам ЗБС "Бацькаўшчына", у сувязі з чым адбыліся перавыбары кіруючых органаў. У склад Вялікай Рады ЗБС увайшло 97 прадстаўнікоў з Беларусі і замежжа. Былі абраны новыя кіраўнікі: прэзідэнт — Р. Гарэцкі, старшыня Рады — Г. Сурмач. Удзельнікам з'езда была прапанавана змястоўная культурная праграма: 7 ліпеня — Нарачанскі форум для дзяцей і моладзі; Купальскія святы на Стаўбцоўшчыне і ў Баркулабаве; мастацкая выстава "Жыве Беларусь" у Палацы мастацтваў, паэтычнае свята каля помніка Я. Купалу, 8 ліпеня адбыўся вялікі святочны канцэрт у Дзяржаўным тэатры оперы і балета (рэжысёр Мікола Дудчанка); шматлікія выстаўкі твораў народных майстроў, фотавыстаўкі. У час з'езда адбылося адкрыццё мемарыяльнай дошкі М. Гарэцкаму і музейнай экспазіцыі "Беларусь ў свеце" ў Нацыянальным навукова-асветным цэнтры імя Ф. Скарыны, там жа прайшло абмеркаванне прынцыпаў і слоўніка даведніка "Беларусы ў свеце". Па прапанове галоўнага мастака з'езда Э. Агуновіча сімвалам форуму была абрана постаць святой Ефрасінні Полацкай. Да з'езда былі выдадзены плакат і афіша (аўтар У. Васюк), розная сувенірная прадукцыя з выявай сімволікі форуму. Для дэлегатаў былі выдадзены прэс-рэлізы: Беларуская дыяспара; Чарнобыль у Беларусі; кароткая інфармацыя пра Беларусь на англійскай і беларускай мовах, а таксама святочны нумар газеты "Звязда". Праведзены чатыры прэс-канферэнцыі для журналістаў і грамадскасці аб падрыхтоўцы, ходзе і выніках з'езда. З'езд стаў першым у гісторыі вялікім зборам беларусаў усяго свету. Удзельнікі абмеркавалі надзённыя пытанні, падзяліліся ўражаннямі аб сустрэчах з Радзімай, выказалі пажаданні на будучыню.

Выбары Рады "Бацькаўшчыны", якая прадстаўляла ўсе буйнейшыя беларускія арганізацыі як з Беларусі, так і з розных краін, стварыла юрыдычную аснову для аб'яднання беларусаў у адзіную сусветную супольнасць. У гэтым галоўная значнасць падзеі. Беларуская нацыя паспрабавала кансалідавацца не толькі ў рамках дзяржаўных межаў, але і асэнсаваць сябе ў кантэксце прысутнасці ў свеце. Па выніках з'езда выдадзены зборнік дакументаў і матэрыялаў "Першы з'езд беларусаў свету (8–10 ліпеня 1993 г.)" у Беластоку (1997).

Ганна Сурмач

Першы сход беларусаў блізкага замежжа

Адбыўся 19–20 снежня 1992 г. у Мінску (Дом літаратара). Арганізаваны Згуртаваннем беларусаў свету "Бацькаўшчына" з удзелам дзяржаўных структур і грамадскіх арганізацый. Гэта быў першы вялікі збор замежных беларусаў на Радзіме. Прынялі ў ім удзел суайчыннікі з Расіі, краін Балтыі, Украіны, Малдовы, Сярэдняй Азіі і Польшчы, а таксама з самой Беларусі — усяго 300 чал. Дэлегаты прадстаўлялі 63 суполкі. Асноўнай падставай для склікання сходу была складаная сітуацыя, якая ўтварылася пасля развалу СССР у новых незалежных краінах. Ваенныя канфлікты, цяжкое эканамічнае і палітычнае становішча ў многіх рэгіёнах прымусілі беларусаў шукаць падтрымкі на Бацькаўшчыне ці ўвогуле вяртацца ў родныя мясціны. Многія засталіся без працы, без жылля, страцілі жыццёвыя набыткі. Усе гэтыя пытанні і абмяркоўваліся ў час сходу. Працавала кансультацыйная Рада з прадстаўнікоў міністэрстваў і ведамстваў Беларусі, якія адказвалі на пытанні, давалі патрэбную інфармацыю для замежных беларусаў, дапамагалі вырашыць розныя іх праблемы. Сход адкрыў ад імя ЗБС "Бацькаўшчына" старшыня Аргкамітэта Валерый Герасімаў. Выступілі старшыня Вярхоўнага Савета РБ Станіслаў Шушкевіч, намеснік старшыні Савета Міністраў Міхаіл Дзямчук, народны пісьменнік, прэзідэнт ЗБС "Бацькаўшчына" Васіль Быкаў, старшыня Камісіі па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных зносінах Вярхоўнага Савета Міхаіл Слямнёў, міністр абароны РБ Павел Казлоўскі, народны паэт Ніл Гілевіч, віцэ-прэзідэнт АН РБ Радзім Гарэцкі, міністр замежных спраў Пётр Краўчанка, старшыня БНФ Зянон Пазняк, прадстаўнікі дыяспары. Навуковы даклад

"Беларусы свету: гісторыя, сучаснасць, праблемы" зрабіў сябра Рады ЗБС "Бацькаўшчына" доктар гістарычных навук Леанід Лыч. Асабліва востра дыскутаваліся вайсковыя пытанні. Многія беларускія вайскоўцы выказалі жаданне вярнуцца ў Беларусь і служыць сваёй краіне. Актыўны ўдзел у дыскусіі прыняла дэлегацыя ад Міністэрства абароны Беларусі, якая прысутнічала на сходзе, і грамадская арганізацыя —Беларускае згуртаванне вайскоўцаў на чале з Мікалаем Статкевічам. Удзельнікі сходу падтрымалі праект канцэпцыі дзяржаўнай Праграмы "Беларусы ў свеце", які па даручэнню ўрада распрацавала Акадэмія навук Беларусі. Былі прыняты выніковыя дакументы сходу: Зварот да народа Беларусі, Зварот да беларусаў свету, Заява ўдзельнікаў Першага сходу, Зварот да Парламента і Урада Рэспублікі Беларусь, Пастанова аб аднаўленні вобраза духоўнай рэліквіі беларускага народа — Крыжа св. Ефрасінні Полацкай (усе яны апублікаваны ў газ. Літ і Мастацтва. 5 сакавіка 2000 г.). Дакументы заклікаюць народ, дзяржаўныя структуры мацаваць незалежную Беларускую дзяржаву, аб'ядноўваць нацыю, нацыянальную культуру, падтрымліваць тых беларусаў ва ўсім свеце, каму патрэбна дапамога. Былі выкладзены канкрэтныя прапановы аб усталяванні кантактаў і спрыянні беларусам замежжа. Сход выявіў агульныя мэты і задачы, акрэсліў праблемы і стварыў умовы для правядзення новага форуму — Першага з'езда беларусаў свету ў 1993 г.

Ганна Сурмач

Прыазёрская гарадская рада Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны

Існавала ў 1989–1993 гг. Створана ў канцы 1989 г. у г. Прыазёрску Джэзказганскай вобласці Казахстана групай беларускіх афіцэраў на чале з падпалкоўнікам С. Суднікам і маёрам І. Сужаненкам. З жніўня 1990 г. выдавала газету "Рокаш". У верасні 1990 г. адкрыла беларускую нядзельную школу ў Прыазёрску (дзенічалі 3 класы, у якіх налічвалася больш за 40 вучняў). У верасні 1991 г. Радай таварыства была створана Прыазёрская суполка Беларускага згуртавання вайскоўцаў. Рада падрыхтавала і выдала камп'ютэрным спосабам кнігу вершаў С. Судніка "Пагоня за мову", а таксама "Шыхтовы статут беларускага войска". Спыніла існаванне ў сярэдзіне 1993 г. у сувязі з ад'ездам большасці членаў Рады з Прыазёрска.

Ларыса Языковіч

"Світанак"

Беларускі культурны цэнтр (БКЦ) у Ташкенце. Створаны ў кастрычніку 1993 г. ініцыятыўнай групай супрацоўнікаў Паўнамоцнага прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь ва Узбекістане на чале з Аляксандрам Косавым. Першым старшынёй быў абраны Кірыл Гром. З кастрычніка 1995 г. БКЦ узначальвае беларускі паэт Сяргей Пратасевіч. Асноўныя мэты дзейнасці "Світанку" — кансалідацыя беларусаў Узбекістана; вывучэнне, захаванне і прапаганда звычаяў, традыцый, мовы, культурнай спадчыны беларускага і ўзбекскага народаў, развіццё паміж імі разнастайных сувязей, супрацоўніцтва з культурнымі цэнтрамі іншых нацыянальнасцей, дабрачыннасць. Матэрыяльную падтрымку таварыству аказваюць узбекска-беларускія прадпрыемствы "Узбекмашсервіс", "Узбелст", МП "Вераніка" і "Элком", кіраўнікі якіх У. Макарэнка, Х. Мансураў, А. Клімковіч і В. Лабкоў з'яўляюцца членамі савета "Світанку" і ўдзельнічаюць у яго рабоце.

"Світанак" матэрыяльна падтрымлівае адзінокіх, хворых, састарэлых беларусаў, набываючы пуцёўкі для адпачынку і лячэння, медыкаменты; аказвае дапамогу ў выездзе да сваякоў; накіроўвае моладзь на вучобу ў Беларусь. Створаны і пашыраецца банк дадзеных аб беларусах, што жывуць ва Узбекістане і жадаюць пераехаць на бацькаўшчыну. Рэгулярна праводзяцца культурна-масавыя мерапрыемствы — сустрэчы са знакамітасцямі, лекцыі, канцэрты. "Світанак" арганізаваў калектыў мастацкай самадзейнасці "Бэзавыя зоры", якім кіруе В. Цітова. У памяшканні БКЦ працуе беларуская бібліятэка.

"Світанак" прымае ўдзел у грамадскім жыцці краіны, з'яўляецца адным з заснавальнікаў грамадскага руху "Народнае адзінства". Вядзецца работа па стварэнню Таварыства ўзбекска-беларускай дружбы. Як рэгіянальная арганізацыя БКЦ "Світанак" уваходзіць у склад Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына".

Анфіса Ляднёва

Севастопальскае таварыства беларусаў імя Максіма Багдановіча "Пагоня"

Грамадска-культурная арганізацыя Севастопальскае таварыства беларусаў імя Максіма Багдановіча "Пагоня" заснавана ў 1997 г. Ініцыятарам стварэння і старшынёй суполкі з'яўляецца Валерый Барташ. Асноўныя мэты дзейнасці — адраджэнне беларускай культуры, захаванне народных традыцый, вывучэнне мінулага Беларусі, ушанаванне памяці беларускіх дзеячаў, згуртаванне свядомых беларусаў для ўзнаўлення іх актыўнага грамадска-культурнага жыцця ў горадзе.

Суполка займаецца культурна-дабрачыннай дзейнасцю. Традыцыяй стала наведванне магілы М. Багдановіча ў Ялце ў дні яго нараджэння і смерці. Там слухаюцца вершы паэта, якія чытаюць Ганна Васюкіна, Ларыса Белік, Віка Азарава, гучыць малебен, які служыць па-беларуску малады праваслаўны святар Ігар Чыкіта. Да свята Дзяды суполка рыхтуецца загадзя, у выхадныя дні беларусы талакой працуюць на Брацкім могільніку, дзе пахаваны тысячы нашых землякоў, якія загінулі пры абароне Севастопаля ў 1854–1855 гг. Свята памінання продкаў распачынаецца каля помніка Аляксандру Казарскаму, беларусу, герою руска-турэцкай вайны 1828–1829 гг., камандзіру легендарнага брыга "Меркурый". Акрамя вечарынаў паэзіі М. Багдановіча суполка падрыхтавала і правяла ў гарадской бібліятэцы імпрэзы, прысвечаныя Ефрасінні Полацкай, Кастусю Каліноўскаму, Ларысе Геніюш. Таварыства мае штомесяц 30 мінут эфірнага часу на радыё. Стараннямі В. Барташа кожная акцыя, праведзеная суполкай, абавязкова асвятляецца ў газетах і праз электронную пошту. У дар ад мастака А. Марачкіна таварыства атрымала партрэт М. Багдановіча на фоне крымскага краявіду. Урачыстая перадача карціны адбылася ў Літаратурным музеі М. Багдановіча ў Мінску.

У планах "Пагоні" — установка ў Балаклаве мемарыяльнай дошкі Адаму Міцкевічу, 200-годдзе якога таварыства адзначыла, наладзіўшы тэатралізаваную дзею; правядзенне акцый у абарону беларускай мовы, у тым ліку вечарыны, прысвечанай Францішку Багушэвічу; выраб і ўстаноўка каменнага Ефрасіннеўскага крыжа — як сімвала беларускай прысутнасці ў Крыме.

Ірына Марачкіна

Смаленскае аддзяленне Беларускага нацыянальнага камісарыята

Нацыянальная ўстанова, падраздзяленне Беларускага нацыянальнага камісарыята ў РСФСР. Утворана 16 ліпеня 1918 г. на аснове Беларускага нацыянальнага аддзела Выканаўчага камітэта Заходняй вобласці. Першапачаткова складалася з 12 чалавек. Супрацоўнікамі аддзялення былі Ф. Замойскі (старшыня), М. Коцікаў, Я. Стратановіч, І. Шнітко, П. Кароль, М. Рыбецкі, В. Ілавайскі, Ф. Заостраўскі, К. Вітальд, М. Савіч, Я. Шайтараў, А. Бранкевіч, В. Дабравольскі, М. Немчыновіч, В. Юшкевіч, А. Кучаева, Т. Сакалоў. Дзялілася на пададдзелы: бежанскі; культурна-асветны; выдавецтва, друку і агітацыі; канцылярыя і ўпраўленне. Пры дапамозе аддзялення ў Смаленску была адчынена бібліятэка-чытальня і рабоча-сялянскі клуб. Супрацоўнікі аддзялення чыталі лекцыі для працоўных Смаленска і Смаленскай губ. (Ельнінскі і Краснінскі пав.), праводзілі вечарыны-спектаклі, навуковыя экскурсіі, распаўсюджвалі прыкладныя веды ў галіне сельскай гаспадаркі, тлумачылі карыснасць сельгаскааперацыі, камунальнай апрацоўкі зямлі. Вельмі актыўна яны працавалі з бежанцамі-беларусамі: праводзілі іх рэгістрацыю, вырашалі пытанні планамернай рээвакуацыі, вялі сярод іх агітацыйна-тлумачальную работу. Аддзяленне распаўсюджвала газеты БНК "Дзянніца" і "Чырвоны шлях". У жніўні 1918 г. планавала выдаць уласную газету "Рунь" на беларускай мове (не выдавалася). Пад кантролем аддзялення вялася агітацыйная дзейнасць на тэрыторыі Беларусі, што знаходзілася пад нямецкай акупацыяй. 28 снежня 1918 г. аддзяленне БНК ліквідавана ў сувязі з ўтварэннем БССР.

Аляксандр Ціхаміраў

"Спадчына"

Беларускае нацыянальна-культурнае аб'яднанне (г.Нарва, Эстонія). Арганізацыйнае пасяджэнне аб'яднання адбылося 8сакавіка 1997 г. На ім выступілі Ігнат Трусаў, былы дырэктар школы, які прыгадаў радкі з паэмы "Тарас на Парнасе", Сцяпан Дзмітрук, які таксама чытаў вершы. Так узнікла у Нарве аб'яднанне "Спадчына". 18 ліпеня яно ўжо было зарэгістравана.

За час работы аб'яднання беларусы Нарвы пазнаёміліся з Уладзімірам Дзехцеруком, набылі кнігу яго вершаў "Сярод белых эстонскіх начэй", якая выйшла ў свет у 1995 г. у выдавецтве "Ээсці раамант". З нагоды Вялікоднага тыдня "Спадчына" наладзіла вечарыну, на якой гасцямі былі консул РБ В. Раманоўскі, кіраўнікі іншых беларускіх суполак у Эстоніі Ніна Савінава, Маргарыта Астравумава, старшыні нацыянальных згуртаванняў габрэяў, палякаў, немцаў, шведаў. Беларусы рэгулярна ўдзельнічаюць у днях горада, што праходзяць 6-8 чэрвеня. Кожная з жанчын вышывала сабе кашулю. У падрыхтаваных сваімі рукамі народных строях яны выходзілі на "творчую пляцоўку", упрыгожаную ручнікамі, абрусамі, іншымі рэчамі беларускага побыту. Гледачы прымалі ўдзел у беларускіх гульнях, арганізаваных Тамарай Абрамавай, Нінай і Мікалаем Аніскевічамі. А духмяны пах любімай стравы беларусаў, дранікаў, якія гатавала Таццяна Караткевіч разам з дочкамі Светай і Любашай і сынам Сярожкай, прыцягнуў усіх да беларускай пляцоўкі. Мастачка М. Астравумава арганізавала ў Нарве выстаўку творчага аб'яднання МЭЯ. Адбылося спатканне з ансамблем "Сябры". На гэтую сустрэчу да беларусаў Нарвы, акрамя знакамітага калектыву, прыяджалі з Мінска І. Яновіч, Л. Балаўнёва, Генеральны консул РБ І. Бондар. Перад выступленнем "Сяброў" гучалі песні ў выкананні БЭЗу. На выстаўцы жыхары і госці Нарвы пазнаёміліся з мастацкімі творамі беларускіх дзяцей: керамікай Марыны Жураўлёвай, выяўленчымі творамі Марыі Цыганок.

Аб'яднанню дапамагаюць Міністэрства адукацыі РБ, якое даслала падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей, Таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, "Радзіма". Матэрыяльную і маральную падтрымку аказваюць Прыбалтыйская ГРЭС, аўтабаза , дырэктар гарадскога музея Э. Эфендзіеў, віцэ-мэр Г. Мальдон, старшыня гарадскога сходу А. Паль.

"Спадчына" стала членам Круглага стала нацыянальных меньшасцей Іда-Вірумаа. У Нарве створаны Каардынацыйны савет нацыянальных супольнасцей, куды на сённяшні дзень уваходзіць 12 нацыянальных аб'яднанняў.

Таццяна Караткевіч-Цыганок (Нарва, Эстонія)

Студэнцкія беларускія гурткі ў памежных краінах у канцы XIX – пачатку XX ст.

Адна з форм нацыянальна-вызваленчага руху беларускага народа.

Першыя спробы гуртавання беларускай студэнцкай моладзі прыпадаюць на пачатак XIX ст. Студэнты з Беларусі, якія вучыліся ў Вільні, Пецярбургу, Маскве, прымалі ўдзел у нелегальных арганізацыях асветніцкага і рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірунку [філаматы і філарэты ў Віленскім універсітэце (1817–1923), Дэмакратычнае таварыства ў Віленскай медыцынскай акадэміі (1836–1838), Братні саюз літоўскай моладзі (1846–1849), гурткі ў Пецярбургу і Маскве ў 1850 – пачатку 1860-х гг.]. У выніку адмены прыгоннага права паскорылася кансалідацыя беларускай нацыі, абуджалася нацыянальная свядомасць, мацнела імкненне вызваліцца з-пад сацыяльнага і нацыянальнага ўціску. Пасля задушэння паўстання 1863–1864 гг. у Польшчы, Беларусі і Літве жорсткія рэпрэсіі затрымалі стварэнне беларускіх гурткоў і развіццё нацыянальна-вызваленчага руху. Пад уплывам рэвалюцыйнай сітуацыі канца 1870 – пачатку 1880-х гг. пачалося ажыўленне беларускага студэнцкага руху, што на новым гістарычным этапе набыў выразны нацыянальны характар.

У першай палове 80-х гг. у Пецярбургу дзейнічала некалькі беларускіх студэнцкіх гурткоў. Сярод іх найбольш вядома народніцкая група "Гоман", што выпускала нелегальны гектаграфічны часопіс "Гомон", дзе ўпершыню ў гісторыі айчыннай грамадскай думкі абгрунтоўвалася ідэя пра існаванне беларускай нацыі, падкрэслівалася задача фарміравання народнай інтэлігенцыі, арганічна звязанай з працоўнымі масамі Беларусі. Пад уплывам распаўсюджвання марксізму ў Расіі некаторыя асветніцкія гурткі і зямляцкія арганізацыі пераходзілі да рэвалюцыйнай работы. Нелегальны "Гурток моладзі польска-літоўска-беларускай і маларускай" ("Koło polskie", 1889–1893) у Пецярбургу падтрымліваў сувязь з сацыял-дэмакратычнымі арганізацыямі, вёў прапаганду сярод студэнтаў і рабочых. Яго ўдзельнікам, а потым кіраўніком быў беларускі паэт-дэмакрат А. Гурыновіч. З гуртком падтрымлівала сувязі студэнцкая арганізацыя ў Маскве, што аб'ядноўвала беларусаў, украінцаў, палякаў [М. Абрамовіч, В. Вароўскі, А. Гайдамовіч, П. Здановіч, А. Лявіцкі (Ядвігін Ш.), Н. Чарноцкі і інш.] і выдала беларускую рэвалюцыйную брашуру "Дзядзька Антон" (1892) і апавяданне У. Гаршына "Сігнал" (1891, пер. Ядвігіна Ш.). Пераважна ў асветніцкім кірунку дзейнічаў "Круг беларускай народнай прасветы і культуры" (1902–1904) у Пецярбургу. Яго намаганнямі ўбачылі свет нелегальная адозва да беларускай інтэлігенцыі (1902) з заклікам шырыць у народзе асвету на роднай мове, "Вязанка" Я. Лучыны і зборнікі "Казкі", "Калядная пісанка на 1904 год" і "Велікодная пісанка". Гурткоўцы надрукавалі, але з-за небяспекі мусілі знішчыць 1-ы і адзіны нумар газеты "Свабода". На старонках сваіх выданняў яны асвятлялі пытанні гістарычна-этнічнай адметнасці беларускага народа, рост яго нацыянальнай і палітычнай свядомасці. Тут упершыню надрукаваны вершы Цёткі. Кіраўнікі "Круга..." прымалі ўдзел у заснаванні Беларускай рэвалюцыйнай грамады (з 1903 г. Беларуская сацыялістычная грамада) — першай нацыянальнай партыі, што сведчыла пра пэўную пераемнасць і ўзаемазалежнасць асветніцкай і грамадска-палітычнай плыней у беларускім нацыянальным руху. На пачатку 1900-х гг. існаваў беларускі гурток пры Ягелонскім універсітэце ў Кракаве, што ставіў сваёй мэтай вывучэнне стану гаспадаркі, асветы і культуры беларускай вёскі, узаемаадносін паміж сялянствам і шляхтай.

Рэвалюцыя 1905–1907 гг. пашырыла і паглыбіла нацыянальна-патрыятычны рух, беларускія гурткі ўзнікалі амаль ва ўсіх студэнцкіх цэнтрах. Вызначалася дзейнасць Беларускага навукова-літаратурнага гуртка Пецярбургскага універсітэта (статут афіцыйна зацверджаны ў снежні 1912 г., кіраўнік дацэнт А. Разенфельд, стараста Б. Тарашкевіч, сярод членаў — А. Бычкоўскі, К. Душэўскі, А. Зянюк, К. Пушкарэвіч, Ю. Снапко, Я. Сушынскі, У. і Я. Хлябцэвічы). Гурткоўцам памагаў Б. Эпімах-Шыпіла. У мерапрыемствах разам са студэнтамі ўдзельнічалі Я. Купала, Ц. Гартны, А. Грыневіч, Я. Драздовіч, П. Мядзёлка, Цётка, У. Эпімах-Шыпіла. Дзейнасць гуртка, накіраваную на вывучэнне духоўных скарбаў беларускага народа, падтрымлівалі Я. Колас, вядомыя беларускія і рускія вучоныя. З 1908 г. у Варшаве існавала беларускае студэнцкае зямляцтва (да 1912 г. кіраўнік студэнт Варшаўскага універсітэта М. Гуткоўскі). Вядома арганізаваная ім вечарына 2(15) лютага 1913 г., дзе выступалі трупа І. Буйніцкага, хор пад кіраўніцтвам М. Тэадаровіча, дэкламатар П. Гуткоўскі, які чытаў творы П. Простага, А. Паўловіча, Ядвігіна Ш. Дзякуючы намаганням Р. Гуткоўскага была надрукавана праграма вечарыны на беларускай мове, за што ён быў арыштаваны. Дзейнасці зямляцтва спрыялі паэт Г. Леўчык, праф. Я. Карскі, яго жонка і дачка С. і Н. Карскія.

Многія студэнцкія беларускія гурткі мала даследаваны. Існавалі Гродзенскі навуковы гурток студэнтаў Пецярбургскага універсітэта, што ў 1912 г. выдаў на рускай мове брашуру Я. Хлябцэвіча (псеўд. Філімон Паляшчук) "Вясковы спадарожнік. Як адкрыць у вёсцы бясплатную бібліятэку-чытальню", Пецярбургскае таварыства студэнтаў-беларусаў. Беларускі гурток дзейнічаў сярод студэнтаў сельскагаспадарчага інстытута ў г. Нова-Александрыі (цяпер г. Пулавы Люблінскага ваяводства, Польшча). У сакавіку 1914 г. кіраўніцтва гуртка звярнулася да рэдакцыі "Нашай нівы" з просьбай дапамагчы яму літаратурай па беларускай тэматыцы. "Беларуская

нацыянальная хеўра" існавала ў Глухаўскім настаўніцкім інстытуце (Чарнігаўская губ., сярод членаў Я. Журба, які пісаў пра гэта ў "Нашай ніве" 28 сакавіка 1908 г.). Пра спробу гуртавання беларускіх студэнтаў у Кіеве паведамляў С. Палунін ("Наша ніва". 1909. № 34). У беларускі гурток студэнтаў Юр'еўскага (цяпер Тартускага) універсітэта ўваходзілі В. Дружчыц, У. Ігнатоўскі, Х. Імшэннік і інш. Гурткі мелі сувязь паміж сабой, у 1910-я гг. узмацніліся тэндэнцыі да кансалідацыі студэнцкага беларускага руху.

Студэнцкія беларускія гурткі арганічна звязаны з развіццём беларускай літаратуры, мастацтва, навукі, абуджалі і паглыблялі нацыянальную і патрыятычную свядомасць.

Аляксей Каўка (Масква), Віталь Скалабан

Сустрэча кіраўнікоў беларускіх суполак замежжа

Была арганізавана ў Мінску 11–12 лістапада 1995 г. Згуртаваннем беларусаў свету "Бацькаўшчына". На ёй прысутнічалі старшыні і прадстаўнікі беларускіх суполак з розных краін свету і ад рэгіянальных арганізацый з Беларусі. Асноўная мэта — абмеркаванне сітуацыі ў беларускім замежжы і вызначэнне накірункаў далейшай дзейнасці. Былі таксама падсумаваны вынікі працы "Бацькаўшчыны" ў сувязі з 5-й гадавінай заснавання. З дакладам ад Рады выступіла яе старшыня Ганна Сурмач ("Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына", пройдзены шлях і перспектывы дзейнасці"). Працаваў "круглы стол", дзе вяліся дыскусіі па набалелых праблемах дыяспары: пра вяртанне беларусаў на Радзіму, выкананне Праграмы "Беларусы ў свеце", дапамогу ў забеспячэнні патрэб беларускай дыяспары ў галіне культуры і адукацыі, арганізацыю дзейнасці беларускіх суполак. Былі прыняты выніковыя дакументы: Зварот да Вярхоўнага Савета, Прэзідэнта, Урада аб дапамозе дыяспары, Зварот да беларускіх суполак у замежжы, Рэзалюцыя ў падтрымку дзейнасці ЗБС "Бацькаўшчына". Сустрэча дала магчымасць кіраўнікам беларускіх суполак ў замежжы абмеркаваць актуальныя пытанні.

Ганна Сурмач

"Сьвітанак"

Таварыства беларускай культуры ў Латвіі. Грамадская арганізацыя беларускай дэмакратычнай інтэлігенцыі. Ініцыятарамі заснавання ў лістападзе 1988 г. выступілі Вячка Целеш, Сяргей Кузняцоў, Мікола Ярчак інш. Кіруючы орган — Рада (старшыні: С. Кузняцоў (1988–1991), М. Ярчак (1992–1996), Васіль Малышчыц (з 1997 г.)). Статут вызначае абавязковае валоданне сябрамі таварыства беларускай мовай, падтрымкі незалежнасці Латвіі і Беларусі. Напрамкі дзейнасці "Сьвітанка" — захаванне нацыянальнай культурнай спадчыны, выхаванне ў беларусаў нацыянальнай свядомасці, прапаганда культуры і беларускай асветы, вопыту беларускага адраджэння ў Латвіі 1920-х гг., папулярызацыя старадаўніх добрасуседскіх беларуска-латышскіх сувязей, узаемадзеянне з нацыянальна-культурнымі арганізацыямі іншых нацыянальнасцей.

Таварыства праводзіць разнастайную культурна-асветную дзейнасць. Адзначаны юбілеі Ф. Скарыны (1990), М. Багдановіча (1991), К. Езавітава (1993), у Музеі гісторыі Рыгі арганізавана выстава "Беларусы ў Латвіі" (1989). Рэгулярна праводзяцца выставы мастакоў Беларусі і сябраў аб'яднання беларусаў-мастакоў Балтыі "Маю гонар". На вечарыны "Сьвітанка" запрашаюцца вядомыя беларускія пісьменнікі, гісторыкі, артысты, грамадскія дзеячы з Беларусі.

Пры "Сьвітанку" з 1989 г. працуе беларуская мастацкая студыя "Вясёлка", навучэнцы якой прымалі ўдзел у выставах у Латвіі, Данії, Беларусі. З 1993 г. дзейнічае Рыжская беларуская нядзельная школа, з 1994 г. — Рыжская беларуская асноўная школа. Разумеючы важнасць выхавання дзяцей нацыянальна-свядомымі беларусамі сябры таварыства ў 1996 г. заснавалі маладзёжную суполку. З 1990 г. пры "Сьвітанку" працуе бібліятэка беларускай літаратуры. Штомесячна (з 1990 г.) на Латвійскім радыё выходзіць беларуская радыёперадача.

"Сьвітанак" — член Асацыяцыі нацыянальных культурных аб'яднанняў Латвіі, прымае актыўны ўдзел у яе працы. Сябры таварыства ўдзельнічалі ў міжнацыянальных мерапрыемствах: Форуме народаў Латвіі (1988), Форуме культуры Латвіі (1990), фестывале мастацтваў нацыянальна-культурных таварыстваў "Латвіяс вайнагс" (1996).

Таварыства "Сьвітанак" — адно з заснавальнікаў і сябра Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына (1990), удзельнічала ў працы Першага і Другога з'ездаў беларусаў свету (1993, 1997), схода беларусаў бліжняга замежжа (1992), з'ездзе беларусаў краін Балтыі (1994).

Анфіса Ляднёва

"Сябры"

Грамадская арганізацыя, заснавана 16 верасня 1995 г. як беларуска-славянскае таварыства у г. Набярэжныя Чалны (Татарстан). Кіраўнік — Аляксандр Румянцаў. Мэты таварыства — садзейнічанне пашырэнню культурных і гандлёвых сувязей паміж Татарстанам і Беларуссю, аказанне дапамогі членам таварыства, развіццё ўласнай вытворча-гандлёвай дзейнасці, наладжванне культурных і дзелавых сувязей з замежнымі беларускімі арганізацыямі.

Анфіса Ляднёва

"Сябрына"

Клуб аматараў беларускай народнай творчасці. Заснаваны ў 1987 г. у Вільні пры Літоўскім рэспубліканскім Палацы культуры прафсаюзаў. Афіцыйна зарэгістраваны ў чэрвені 1988 г. З'яўляецца першай беларускай непалітычнай арганізацыяй на тэрыторыі Літвы на новай хвалі беларускага адраджэння. Аб'ядноўвае ў сваіх шэрагах больш за 200 жыхароў Вільнюса розных нацыянальнасцей — палякаў, літоўцаў, татараў, яўрэяў. Пры клубе дзейнічаюць аднаіменны хор беларускай народнай песні і курсы англійскай мовы. Сярод заснавальнікаў "Сябрыны" Зоська Верас, Валянцін Стэх, Янка Багдановіч, Павел Каруза, Вера Шастак, Валдзіс Банайціс, Юрка Зімніцкі, Ніна Ляшкевіч, Марыя Маслоўская, Міхась Санько, Алег Аблажэй, Хрысціна Балаховіч. Першым старшынёй клуба быў Мікалай Матач, затым старшынёй быў абраны Валянцін Стэх. З 1996 г. клуб узначальвае Раман Вайніцкі.

Асноўная мэта клуба — зберагчы на літоўскай зямлі, дзе пражывае больш за 50 тыс. беларусаў, беларускія звычаі, народныя песні, беларускую мову, адрадзіць забытыя беларускія святы, народныя гульні. "Сябрына" актыўна праводзіць асветніцкую дзейнасць: ладзіць сустрэчы з гісторыкамі, мастацтвазнаўцамі, філолагамі. Аднымі з першых мерапрыемстваў клуба былі лекцыя пра жывапіс Беларусі XII–XIX стст., сустрэчы з беларускімі фалькларыстамі Ліяй Салавей і Арсенам Лісам, літаратуразнаўцам і пісьменнікам Адамам Мальдзісам, якія паклалі пачатак рэгулярным творчым сустрэчам з вядомымі беларускімі вучонымі і дзеячамі культуры. Па запрашэнню "Сябрыны" ў Вільнюсе адбыліся выступленні Беларускага Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, народнага ансамбля камернай музыкі Палаца культуры Белсаўпрафа і інш.

Са з'яўленнем клуба стала магчымым арганізоўваць вечарыны, прысвечаныя розным гістарычным і культурным датам Беларусі, сустрэчы з цікавымі людзьмі, ладзіць канцэрты, аднавіць народныя рамёствы і традыцыі. Сярод гэтых мерапрыемстваў — літаратурныя вечары, прысвечаныя 110-годдзю Цёткі, 100-годдзю Паўліны Мядзёлкі. Арганізуюцца сустрэчы-вечарыны на каталіцкія і праваслаўныя Каляды. Для дзяцей горада члены клуба праводзяць навагоднія святы на беларускай мове. З 1990 г. "Сябрына" арганізоўвала выстаўкі маладых беларускіх мастакоў — так званы "беларускі куток" на штогадовым літоўскім свяце-кірмашы "Казюкас". Па ініцыятыве сяброў клуба на літоўскім радыё арганізавана і вядзецца перадача на беларускай мове — "Беларускае слова на хвалях Літвы", у газеце "Летувас" выходзіць старонка клуба — "Пагоня". З мая 1990 г на літоўскім тэлебачанні заснавана перадача "Запрашае "Сябрына", якая выходзіць у эфір два разы на тыдзень. Пры ўдзеле сяброў клуба ў новавільняйскай кнігарні адкрыты аддзел беларускай кнігі, за своечасовым папаўненнем якога новымі беларускамоўнымі выданнямі сочыць Валдас Банайціс. Пры ўдзеле "Сябрыны" з дапамогай Міністэрства адукацыі РБ беларускія школы Вільнюса забяспечваюцца неабходнымі падручнікамі, а фальклорныя школьныя калектывы — нацыянальнымі беларускімі касцюмамі. Сябры клуба праводзяць работу па вяртанню на Віленшчыну імёнаў славутых беларускіх сыноў і дачок. Па ініцыятыве В. Банайціса і пры падтрымцы сяброў клуба адной з вуліц Вільні было нададзена імя Алаізы Пашкевіч (Цёткі).

Сярод актыўных сяброў клуба Юрый Зімніцкі — заснавальнік і доўгі час кіраўнік вакальна-харавога гурта "Сябрына", Міраслава Русак і Ванда Кірплюк — кіраўнікі (у розныя часы) дзяцячага гуртка па вывучэнню англійскай мовы пры "Сябрыне", Хведар Нюнька — кіраўнік Таварыства беларускай культуры пры Літоўскім фондзе культуры, мастакі Станіслаў Зялёнка, Уладзімір Кузьменка і Сяргей Поклад, журналіст Віктар Хруль і інш. "Сябрына" падтрымлівае цесныя сувязі з Беларускім фондам культуры, Згуртаваннем беларусаў свету "Бацькаўшчына", Нацыянальным навукова-асветным цэнтрам імя Ф. Скарыны.

Валянцін Стэх (Вільнюс)

"Сябрына", хор

Беларускі хор пры клубе аматараў беларускай народнай творчасці "Сябрына". Ініцыятарамі заснавання ў 1987 г. выступілі Лявон Луцкевіч, Лявон Кароль, Мікола Рулінскі — былыя вучні Віленскай беларускай гімназіі. Кіраўнікі хору: Юрый Зімніцкі (1987–1995), Валянціна Кавальчук (з 1995), канцэртмайстар — Таццяна Скорая, выкладчыца Літоўскай кансерваторыі. У рэпертуары хору каляндарна- і сямейна-абрадавыя, любоўныя, бытавыя, бяседныя, жартоўныя і сучасныя песні. Прымаў ўдзел у свяце "Пра ўсе сказаць прыйшла пара" (Беларусь, 1989), фестывале беларускай песні і танца (Вісагінас, 1997), культурных мерапрыемствах у Вільні, Друскінінкае, іншых гарадах Літвы. Хор мае сваё памяшканне, касцюмы, інструменты. Удзельнікі калектыву праз мастацтва спеваў знаёмяць слухачоў з багатай, разнастайнай культурай беларускага народа, прапагандуюць народныя песні сярод іншых нацыянальнасцей.

Анфіса Ляднёва

Таварыства апекі над эмігрантамі

Дабрачынная арганізацыя, створаная ў канцы 1890-х гг. у Варшаве для аказання дапамогі эмігрантам, якія ад'язджалі ў краіны Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі. Мела свой статут. Аказвала матэрыяльную, фінансавую і інфармацыйную дапамогу перасяленцам. У 1912 г. утварыла філію ў Вільні, якая там жа выдала на беларускай мове брашуру Я. Акаловіча "Рады для эмігрантаў, каторые едуць у Амэрыку, а такжэ размовы беларуска-англіцкіе" (1912), дзе змешчаны карысныя парады тым, хто ехаў з Беларусі ў пошуках заробку за акіян. У 1915 г. Таварыства апекі над эмігрантамі спыніла сваю дзейнасць.

Аляксандр Ціхаміраў

Таварыства беларускага пісьменства

Культурна-асветная і інфармацыйная грамадская арганізацыя ў Літве. Створана ў 1992 г. пры газеце "Наша ніва", якая прадстаўлена ў Вільнюсе карэспандэнцкім офісам і выдавецкім цэнтрам. Складаецца з індывідуальных і калектыўных сяброў. Старшыня — С. Дубавец. Ажыццяўляюцца праекты "Беларускі інфармацыйны цэнтр у Літве" (у ліку яго супрацоўнікаў прафесіянальныя журналісты, навукоўцы), а таксама "Кнігавыдавецкі праект".

У выдавецтве "Наша ніва" выйшлі кнігі Ю. Вітан-Дубейкаўскай "Мае ўспаміны" (1994), Б. Лесьмяна "Пан Плішчынскі" (1994), серыя пра віленскіх беларусаў (Л. Луцкевіч, З. Коўш і інш.).

Галіна Сяргеева

Таварыства беларускага тэатра ў Латвіі

Культурна-асветная арганізацыя беларускай супольнасці ў Латвіі, створаная для каардынацыі тэатральна-мастацкай дзейнасці. Статут зацверджаны 23 сакавіка 1927 г. Першы арганізацыйны сход адбыўся 25 красавіка 1927 г. Таварыства ўзнікла як вынік дзейнасці Беларускай (першай) драматычнай дружыны Ігната Дварчаніна (лектара летніх настаўніцкіх курсаў беларусазнаўства ў Дзвінску, 1921), Беларускай (другой) драматычнай дружыны Язэпа Камаржынскага, драматычных гурткоў пры Дзвінскай і Люцынскай беларускіх гімназіях, пры Таварыстве "Рунь", Таварыстве "Беларуская хата", Беларускага народнага тэатра (першага) у Рызе (заснаваны 20.2.1926). Яшчэ 24 красавіка 1926 г. апошні з названых тэатраў паставіў п'есу Я. Купалы "Паўлінка" (рэжысёр артыст Латышскага Нацыянальнага тэатра Ян Шаберт). Латышская прэса цёпла адгукнулася на спектакль, адзначыўшы ігру Надзеі Нікалаевай (Паўлінка), Міколы Трубецкага (Пранцысь), Параскевы Раманоўскай (Альжбета). Але без належнай фінансавай падтрымкі тэатр праіснаваў толькі год. І ўсё ж ён паспеў паставіць "Паўлінку" яшчэ і ў Люцынскім павеце — у вёсках Старая Слабада (16.4.1926), Рунданы (17.4.1926).

Дзякуючы дзейнасці Таварыства беларускага тэатра ў Латвіі распачалі сталую працу, начынаючы з 1928 г., два беларускія народныя тэатры: Рыжскі і Дзвінскі. Дырэктарам таварыства доўгі час выбіралася Вольга Васільеўна Пігулеўская-Бараноўская. Наладзілася фінансавая дапамога тэатрам з боку Латвійскага культурнага фонду і Беларускага аддзела пры Міністэрстве асветы. На беларускую мову былі перакладзены творы латышскіх, рускіх, польскіх, украінскіх аўтараў. Таварыства рэкамендавала для пастановак п'есы К. Каганца, В. Дуніна-Марцінкевіча, У. Галубка, М. Чарота, Л. Родзевіча і інш. Інсцэніроўкі для беларускіх тэатраў рабілі У. Пігулеўскі (паводле Марка Твена), дырэктар Рыжскага народнага тэатра Язэп Камаржынскі. Напрыклад, у 1931 г. таварыства паставіла дзесяць спектакляў, у тым ліку адбыліся тры прэм'еры. Рэжысёрамі часта запрашаліся артысты латышскіх і рускіх тэатраў. Таварыства арганізавала драматычныя гурткі амаль ва ўсіх беларускіх навучальных установах. У іх праводзіліся вечарыны з дакладамі, дэкламацыямі і спектаклямі. Так, 24 красавіка 1932 г. у Рыжскай беларускай дадатковай школе для дарослых адбылася лекцыя пра Я. Купалу. Выступілі хор пад кіраўніцтвам М. Грыўскага, дэкламатары вершаў Я. Купалы і Я. Коласа. 15 чэрвеня 1932 г. у Дзвінску адбылася канферэнцыя беларускіх настаўнікаў, якая рашыла 8 ліпеня 1932 г. адсвяткаваць ва ўсіх школах 50-годдзе з дня нараджэння Я. Купалы і звярнулася ў Латвійскі радыёфонд з просьбой прачытаць у гэты дзень лекцыю на тэму "Беларускае адраджэнне і творчасць Янкі Купалы", а таксама даць беларускае канцэртнае аддзеленне. 29 кастрычніка 1932 г. Рыжская беларуская прыватная гімназія разам з Таварыствам беларускіх вучыцялёў у Латвіі адзначыла 50-годдзе Я. Купалы і Я. Коласа. Кіраўнік Беларускага аддзела пры Міністэрстве асветы У. Пігулеўскі прачытаў лекцыю "Янка Купала і Якуб Колас у беларускім адраджэнні", а затым прагучалі дэкламацыі, спевы, спектакль "Пінская шляхта". 30 кастрычніка 1932 г. Таварыства "Беларуская хата" разам з Рыжскай беларускай вячэрняй школай для дарослых у Старым горадзе наладзіла вечарыну ў гонар 50-годдзя Я. Коласа. Старшыня таварыства Мікалай Дзямідаў выступіў з прамовай аб значэнні Я. Купалы і Я. Коласа ў "нацыянальна-сацыяльным руху беларускіх працоўных мас". Вучні прачыталі вершы Я. Купалы і Я. Коласа. 27 снежня 1932 г. Таварыства беларускае моладзі ў Латвіі адзначыла 50-годдзе Я. Купалы пастаноўкай у адным з глухіх куткоў Люцыншчыны п'есы Я. Купалы "Раскіданае гняздо". Як адзначыў часопіс "Беларуская школа ў Латвіі" (1933, № 2): "...першая ў Латвіі спроба паставіць на

вясковай сцэне гэтую цікавую драму прайшла дужа добра". 11 лютага 1933 г. вучні Рыжскай беларускай вячэрняй дадатковай школы разам з Таварыствам беларускай моладзі ў Латвіі наладзілі спектакль-вечарыну: была пастаўлена "Паўлінка" Я. Купалы. "Маладыя артысты, некаторыя з іх дэбютавалі ўпершыню, выканалі сваі ролі з поспехам, удала перадаючы тыпізацыю беларускага сялянства, інтэлігенцыі і шляхты, зарысаванай аўтарам п'есы" ("Беларуская школа ў Латвіі". 1933. № 2).

Пасля фашысцкага пераваротy ў Латвіі (1934) культурна-асветная дзейнасць беларусаў, як і іншых нацыянальных меншасцей, пачала затухаць.

Сяргей Панізьнік

Таварыства беларускай культуры ў Вільнюсе

Таварыства беларускай культуры ў Вільнюсе (ТБК) заснавана ў 1988 г. пры Літоўскім фондзе культуры. Установчым сходам ТБК, які адбыўся ў лютым 1989 г., была выбрана Рада ТБК на чале з Хведарам Нюнькам і распрацаваны Статут таварыства. Першыя члены суполкі — Л. Луцкевіч, Л. Караль, А. Анішчык, Ч. Кудаба, М. Рулінскі, Я. Багдановіч, Л. Мілаш. Галоўныя задачы ТБК, замацаваныя Статутам, — адраджэнне беларускай культуры ў Вільнюсе, захаванне народных традыцый, вывучэнне мінулага Беларусі, ушанаванне памяці беларускіх дзеячаў, згуртаванне свядомых беларусаў для ўзнаўлення актыўнага грамадска-культурнага жыцця ў краіне.

Дзякуючы руплівай працы членаў таварыства жыхары сённяшней Віленшчыны маюць магчымасць пазнаёміцца з імёнамі славутых землякоў, якія на пачатку XX ст. звязалі сваё жыццё з развіццём беларускай культуры. ТБК праводзіць дзейсную работу па ўвекавечанню памяці вядомых беларускіх дзеячаў навукі, асветы, культуры і мастацтва. Па яго ініцыятыве былі адноўлены і адкрыты новыя мемарыяльныя дошкі Ф. Скарыне, К. Каліноўскаму, Б. Тарашкевічу, Я. Купалу, В. Ластоўскаму, П. Сергіевічу, Р. Шырме, На могілках Роса перазахаваны прах Ф. Аляхновіча і І. Луцкевіча. Там жа ўстановлены помнікі братам А. і І. Луцкевічам, Ф. Аляхновічу, на праваслаўных могілках на Ліпаўцы – помнікі фальклярысту і кампазітару П. Карузе і сям'і Каўшоў. Таварыства працуе над экспазіцыямі музеяў Івана Луцкевіча і Якуба Коласа (у Павільнісе). У 1994-1995 гг. ТБК мела сваю штотыднёвую старонку на беларускай мове "Беларус Віленшчыны" ў газетах "Эхо Литвы" і "Kurier Wilenski", якую вёў Лявон Луцкевіч. З 25 сакавіка 1997 года выходзіць штомесячная газета "Рунь", рэдактарам якой з'яўляецца паэт і перакладчык Алег Мінкін. Намаганнямі таварыства выдадзены кнігі М. Пецюкевіча, "У пошуках зачараванных скарбаў", Л. Луцкевіча "Вандроўкі па Вільні", Ю. Вітан-Дубейкаўскай "Мае ўспаміны".

Таварыства беларускай культуры актыўна займаецца культурна-дабрачыннай дзейнасцю. Яно мае сваю сядзібу на вуліцы Жыгіманту — дамкі, якія пасля ўпартых намаганняў вільнюскія ўлады аддалі таварыству ў арэнду. У гэтых будынках, што яшчэ да вайны былі маёмасцю беларусаў, праведзены вечарыны, прысвечаныя Францыску Скарыне, Ларысе Геніюш, Уладзіміру Жылку, Івану Луцкевічу, Адаму Станкевічу, Францішку Багушэвічу, Вацлаву Ластоўскаму, ладзяцца сустрэчы з дзеячамі беларускага мастацтва. Тут жа знаходзіцца бібліятэка, рэдакцыя газеты "Рунь". ТБК супрацоўнічае з беларускай сярэдняй школай імя Ф. Скарыны і кафедрай беларускай філалогіі Віленскага педагагічнага універсітэта.

Галіна Войцік, Леакадзія Мілаш (Вільнюс)

Таварыства беларускай культуры ў Калінінградскай вобласці

Заснавана ў маі 1991 г. Ініцыятарамі стварэння таварыства – І. Шаховічам, В. Булаўскім, С. Маркевічам, Т. Рокач, Л. Пліско — на ўстаноўчым сходзе быў распрацаваны Статут таварыства, дзе вызначаны асноўныя мэты дзейнасці арганізацыі: абуджэнне ў беларусаў Калінінградчыны нацыянальнай самасвядомасці, цікавасці да сваіх каранёў, гісторыі Беларусі, роднай мовы, культуры. Цяпер таварыства налічвае каля двухсот чалавек. Старшыня суполкі — фізік, былы выкладчык Ігар Шаховіч. Дзякуючы намаганням найбольш актыўных членаў таварыства — І. Шаховіча, Т. Рокач, Т. Якаўлевай, Л. Сушкевіч, Н. Шаховіч, Я. Пеўнева, І. Фатахавай — вядзецца актыўная культурная праца як у абласным цэнтры, так і на перыферыі. Створаны філіялы ў Гвардзейскім і Праўдзінскім раёнах — месцах найбольш кампактнага пражывання этнічных беларусаў.

Пад уплывам дзейнасці таварыства актывізавалася культурна-грамадскае жыццё мясцовых беларусаў. Створаны шэраг калектываў мастацкай самадзейнасці. З поспехам у гледачоў выступаюць калінінградская "Мілавіца", калектывы з Гвардзейскага раёна — "Чабор" (п. Вялікая Паляна) і "Крыніца" (п. Азяркі). У Праўдзінскім раёне створаны фальклорны ансамбль у п. Краснае. Пералічаныя калектывы прымаюць актыўны ўдзел у штогодніх Днях беларускай культуры ў Калінінградскай вобласці, кірмашах народнай творчасці, "Днях горада", іншых мерапрыемствах ТБК. Дзеля кансалідацыі беларусаў Калінінградчыны і пашырэння ведаў аб беларускім краі таварыствам адкрыты беларускія бібліятэкі у гарадах Праўдзінск і Гвардзейск. Кніжны фонд гэтых бібліятэк ствараўся пры дапамозе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, іншых устаноў Міністэрства культуры Беларусі, а таксама на сродкі членаў ТБК. Цяпер па ініцыятыве старшыні ТБК Ігара Шаховіча вядзецца работа па

ўстанаўленню ў Калінінградзе помніка беларускаму першадрукару Ф. Скарыне, які там бываў (скульптар — Анатоль Арцімовіч). Сябры таварыства зацікаўлены ў адкрыцці школ ці класаў па вывучэнню роднай мовы дзецьмі беларусаў, стварэнні беларускамоўных праграм на мясцовым тэлебачанні і радыё.

Як рэгіянальная арганізацыя ТБК "Каралявец" уваходзіць у склад Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына". Старшыня таварыства Ігар Шаховіч на II з'ездзе беларусаў свету ў 1997 г. выбраны сябрам Вялікай рады ЗБС.

Пятрусь Капчык (Ізяслаў, Украіна)

Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны Віленскага краю (ТБМ)

Грамадская арганізацыя беларускай супольнасці ў Літве, створана ў 1992 г. Старшыня Ю. Гіль. Праводзіць культурна-асветныя мерапрыемствы па ўшанаванню памяці вядомых беларускіх дзеячаў. Сябры таварыства пры ўдзеле суродзічаў на бацькаўшчыне заснавалі ў 1993 г. у засценку Вашунава Докшыцкага р-на Віцебскай вобл. гісторыка-этнаграфічны музей "Засцянковая хата", які стаў асветна-культурным асяродкам для мясцовых жыхароў і беларусаў Віленшчыны. Пры ім працуе бібліятэка "Крынічка", якая налічвае каля 5 тыс. кніг. Па прапанове таварыства вуліца ў вёсцы Савічы (Рукойнейскайя сянюнія) названа ў гонар Ф. Багушэвіча, а ў мястэчку Меднікі – імем К. Каліноўскага. Таварыства мае прадстаўнікоў у складзе беларускай секцыі пры польскай палітычнай арганізацыі "Выбарчая акцыя палякаў Літвы" (ВАПЛ). У 1997 г. па спісе ВАПЛ дэпутатам Рады самакіравання Вільнюскага раёна быў абраны ўжо ў другі раз сябра ТБМ Ю. Гіль, які абараняе тут інтарэсы беларусаў. Сябры таварыства актыўна ўдзельнічалі ў мітынгу, які арганізавалі нацыянальныя меншасці Літвы ў кастрычніку 1998 г. у Вільнюсе ў сувязі з тым, што ўлады не вяртаюлі зямлю яе законным уласнікам – жыхарам Вільнюскага раёна. Яны выказалі пратэст супраць увядзення новага адміністрацыйнага падзелу Віленскага краю, паводле якога славянскае насельніцтва (пераважна этнічныя беларусы) аказвалася раз'яднаным і далучаным да раёнаў, дзе большасць складалі літоўцы.

Галіна Сяргеева

Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны "Прамень"

Асветна-культурнае згуртаванне беларусаў Рыгі. Створана 5 кастрычніка 1990 г. Галоўнымі накірункамі дзейнасці статутам вызначаны: зберажэнне і вывучэнне беларускай мовы; захаванне беларускай нацыянальнай самасвядомасці; выхаванне патрыятычных пачуццяў да сваёй этнічнай Радзімы, духоўных каранёў, культурнай спадчыны; ўзбагачэнне духоўнага жыцця беларусаў Латвіі. Галоўныя напрамкі дзейнасці Таварыства: дапамога ў вывучэнні беларускай мовы, гісторыі Беларусі і арганізацыя падпіскі на газеты і часопісы, якія выдаюцца ў Беларусі; арганізацыя лекцый, літаратурных вечарын, правядзенне абрадавых свят. Старшыні таварыства: Валянціна Кліменка (1990–1991), Алесь Карповіч (1991–1996), Мікалай Буры (з лістапада 1996 г.). Старшыней Рады з'яўляецца Алена Міцкевіч. Фінансавыя сродкі таварыства складаюцца з ахвяраванняў.

Таварыства вядзе значную працу па прэзентацыі беларускай прысутнасці ў Латвіі праз удзел у міжнацыянальных культурных праграмах: фестывалі мастацтваў нацыянальна-культурных таварыстваў "Латвіяс вайнагс" ("Латвійскі вянок", 1996), Днях славянскага пісьменства і культуры, канцэртах песенна-танцавальных калектываў, іншых мерапрыемствах. Члены таварыства арганізоўваюць святкаванне беларускіх нацыянальных, дзяржаўных і рэлігійных святаў, наладжваюць сустрэчы са знакамітымі людзьмі, сяброўскія вечарыны.

Рада таварыства "Прамень" разам з супрацоўнікамі беларускага пасольства ўпершыню сярод беларусаў Латвіі арганізавала афіцыйны прыём "Дыпламатычны салон" для азнаямлення латвійскіх і замежных дзяржаўных, грамадскіх і палітычных дзеячаў, прадстаўнікоў дзелавых колаў, творчай інтэлігенцыі, прэсы з гісторыяй, культурай і сучасным станам Беларусі і яе народа (1997).

ТБМ "Прамень" з'яўляецца рэгіянальным калектыўным сябрам Беларускага Рэспубліканскага ТБМ імя Ф. Скарыны, а таксама калектыўным сябрам Міжнароднага літаратурнага фонду імя Янкі Купалы. Таварыства ўдзельнічала ў спаборніцтве на лепшую арганізацыю працы ў ТБМ Беларусі і па выніках атрымала першае месца.

"Прамень" — адзін з ініцыятараў заснавання Латвійскага фонду беларускай культуры (1996). Падтрымлівае сувязі з Беларускім таварыствам "Радзіма", таварыствам "Латвія – Беларусь", прымае ўдзел у мерапрыемствах Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына". Са снежня 1994 г. выдае газету "Прамень" (рэдактар Лявон Шакавец). Як самастойнае падраздзяленне ў склад таварыства ўваходзіць фальклорны ансамбль "Надзея", з удзелам якога арганізоўваюцца экскурсіі ў розныя гарады Латвіі, дзе чытаюцца лекцыі і ладзяцца канцэрты. У 1993 г. ансамбль узнагароджаны Міністэрствам культуры Беларусі пахвальным лістом і атрымаў у падарунак беларускія нацыянальныя касцюмы. У 1994 г. міністр культуры Беларусі А. Бутэвіч прыязджаў у Рыгу, каб узнагародзіць таварыства юбілейным медалём Ф. Скарыны, і падараваў ансамблю канцэртны ўзмацняльнік з магнітафонам. Кіраўнік і заснавальнік ансамбля "Надзея" з 1990 да 1995 г. — Ніла Александровіч, з 1995 г. — Зоя Кальвіш.

Алесь Карповіч (Рыга), Анфіса Ляднёва

Таварыства беларускай школы

Таварыства беларускай школы, грамадская арганізацыя ў Літве.Створана ў 1994 г. Яго работай кіруюць Рада і Управа. Старшыня Л. Слесарава. Таварыства займаецца праблемамі беларускай асветы ў Літве, апякуецца Вільнюскай беларускай школай імя Ф. Скарыны, беларускай моладдзю з Літвы, якая вучыцца ў ВНУ Беларусі. Намаганнямі сяброў ТБШ ад пачатку 1999 г. фарміруецца беларуская група дзяцей у дзіцячым садку № 151 г. Вільнюса. Пры таварыстве ў 1997 г. створана Музейная рада, якая займаецца праектам адкрыцця музея беларускага школьніцтва для вывучэння, захавання і прапаганды традыцый беларускай школы на Віленшчыне і ў Заходняй Беларусі міжваеннага перыяду. Таварыства ўваходзіць у склад Згуртавання беларускіх грамадскіх арганізацый у Літве, удзельнічае ў яго мерапрыемствах.

Галіна Сяргеева

III. Выданні, зборнікі

"Апошнія паведамленні БАС"

"Апошнія паведамленні БАС" ("Apoљnija paviedamlenni BAS"), інфармацыйны бюлетэнь Беларускага аб'яднання студэнтаў у Польшчы. Выходзіў у 1981 і 1989 гг. у Варшаве. У лістападзе 1981 г. выйшлі № 1 і 2, якія былі распаўсюджаны ў студэнцкіх асяродках Варшавы і Беластока. У канцы 1981 г. выдадзены № 3, які быў канфіскаваны польскімі уладамі ў сувязі з увядзеннем ваеннага становішча ў Польшчы. У 1989 г. выйшлі 3 нумары бюлетэня. У ім адлюстраваны дзейнасць БАС, пытанні яго рэгістрацыі ў дзяржаўных установах Польшчы, змешчаны матэрыялы, прысвечаныя папулярызацыі беларускай культуры, гісторыі і нацыянальных традыцый, ахове помнікаў беларускай гісторыі і культуры, рэлігійным узаемаадносінам у Польскай дзяржаве, турыстычнай, грамадска-культурнай і інш. дзейнасці беларускіх студэнтаў. Выходзіў пад кіраўніцтвам Галоўнай рады БАС, рэдагаваўся варшаўскімі і беластоцкімі студэнтамі-беларусамі.

Ларыса Языковіч

"Беларус Віленшчыны" (1)

"Беларус Віленшчыны", штотыднёвая беларуская старонка ў рускай газеце "Эхо Літвы", орган Таварыства беларускай культуры ў Літве. Выдавалася з 5 лістапада 1993 г. да 30 снежня 1994 г. Выйшла 59 нумараў на беларускай мове (кірыліцай). На старонках прадстаўлена дзейнасць ТБК у Літве па захаванню беларускай культурнай спадчыны, культурна-асветныя мерапрыемствы беларускіх суполак, праблемы адраджэння беларускага грамадска-культурнага жыцця, беларускага школьніцтва ў Літве, інфармацыя пра галоўныя падзеі грамадска-палітычнага і культурнага жыцця бацькаўшчыны. Мела рубрыкі "Наша хронік.а", "Весткі з Беларусі", "Наш каляндар" (стараннямі І. Міхальчука штомесяц тут расказвалася пра найбольш адметныя падзеі беларускай гісторыі, гадавіны майстроў культуры, грамадска-палітычных дзеячаў), "Інфармацыя" (пра мерапрыемствы беларускай грамады, праграма беларускіх перадач па радыё і тэлебачанні), звесткі пра беларускія абрадавыя святы (Вялікдзень, Купалле, Каляды і інш.). Змешчана серыя артыкулаў Л. Луцкевіча "Пазнайма свой горад". Апублікаваны матэрыялы да ўгодкаў дзеячаў беларускага адраджэння XX ст. — Я. Драздовіча, А. Уласава, Б. Тарашкевіча, Р. Шырмы, В. Іваноўскага, А. Каўша, А. Стэповіча, С. Новіка-Пяюна, прадстаўнікоў беларускай культуры ў Літве — У. Рубацкага, Л. Мурашкі, Э. Падбярэзскага і інш. Публікаваліся артыкулы пра жыццё беларусаў у свеце (святкаванне ўгодкаў абвяшчэння БНР у Вільнюсе, ішых краінах, адзначэнне 50-х угодкаў вызвалення Беларусі ад фашысцкай акупацыі, Свята беларускай пісьменнасці і друку, сустрэча беларускай моладзі свету, Першы з'езд беларусаў краін Балтыі). Практычныя парады па візаваму рэжыму чытачы знайшлі ў інтэрв'ю прадстаўніка пасольства Беларусі ў Літве, змешчаны тлумачэнні Міністэрства асветы Беларусі адносна прыёму ў ВНУ краіны прадстаўнікоў беларускай дыяспары. На старонках "Беларуса Віленшчыны" друкаваліся такія аўтары, як Л. Луцкевіч, З. Каўшанка-Кратовіч, Л. Кароль, А. Анішчык, П. Саўчанка і інш.

Галіна Сяргеева

"Беларус Віленшчыны" (2)

„Беларус Віленшчыны", штотыднёвая беларуская старонка ў польскай газеце "Kurier Wileński", орган Таварыства беларускай культуры ў Літве. Выдавалася на беларускай мове лацінкай з 2 верасня 1994 г. да 31 сакавіка 1995 г. Усяго выйшаў 31 нумар. З 1 па 18-ты нумар змест старонкі ў асноўным дубліраваў тыя матэрыялы, што друкаваліся на беларускай старонцы ў рускай газеце "Эхо Литвы" (за выключэннем № 14). Захавалася і канцэпцыя гэтай старонкі, і рубрыкі ("Наша хроніка", "Весткі з Беларусі". "Інфармацыя", "Наш каляндар", тлумачэнні і традыцыі святкавання абрадавых беларускіх святаў). З'явіўся феналагічны каляндар на кожны месяц года. Надрукаваны артыкулы да гадавін беларускіх дзеячаў — Ф. Багушэвіча, А. Луцкевіча, У. Самойлы, С. Рак-Міхайлоўскага, К. Сваяка і інш. Серыя артыкулаў М. Савіча прысвечана беларускай мове Віленскага краю, яе гісторыі і сучаснаму стану. Змешчана заява Таварыства беларускай культуры ў Літве аб праблемах адраджэння беларускай мовы на беларуска-літоўскім памежжы (№ 26), яго заява ў абарону дзяржаўнай сімволікі Беларусі і беларускай мовы з нагоды прызначанага рэферэндуму (№ 31). На старонках друкаваліся матэрыялы Л. Луцкевіча, Л. Каваля, М. Савіча, П. Саўчанкі, С. Валодзькі і інш.

Галіна Сяргеева

"Беларуская школа ў Латвіі"

Навукова-папулярны, педагагічны і літаратурна-грамадскі часопіс (1926–1929, 1932–1934). Узнік як орган Таварыства беларускіх вучыцялёў у Латвіі і як дадатак да газеты "Голас беларуса". Адказны рэдактар К. Езавітаў. Выдавец — "Беларускае выдавецтва ў Латвіі". Рэдакцыя часопіса працавала ў цесным кантакце з Беларускім навукова-краязнаўчым таварыствам у Латвіі. Часопіс асвятляў становішча беларускіх навучальных устаноў, арганізацыю навучальнага працэсу ў беларускіх гімназіях, школах, рабіў агляды культурных падзей у жыцці беларусаў Літвы, Заходняй Беларусі, Чэхаславакіі, а таксама ў БССР, друкаваў фальклор беларусаў Латвіі, мастацкія творы мясцовых аўтараў, а таксама артыкулы па гістарычнай тэматыцы ("Ахова помнікаў старажытнасці на Віцебшчыне" Б. Брэжгі, "Літоўская метрыка і яе каштоўнасць для вывучэння мінуўшчыны Беларусі" З. Даўгялы і інш.). Нумары афармляліся фотаздымкамі тэатральных пастановак, школьных класаў, экскурсій, партрэтамі дзеячаў беларускай літаратуры і мастацтва — Я. Коласа, Я. Купалы, У. Галубка, М. Гарэцкага, а таксама Я. Райніса і інш. Многа ілюстрацый бралася з выданняў Савецкай Беларусі.

Сяргей Панізьнік

"Беларускі каляндар"

Выданне Беларускага грамадска-культурнага таварыства (БГКТ) у Польшчы. Выходзіць штогод з 1957 г. у Беластоку. Выпуск за 1993 г. надрукаваны ў Гродне, за 1994 і наступныя гады — па заказу БГКТ у Мінску, выдавецтвам "Беларусь". У першым нумары рэдакцыя падкрэсліла, што імкнецца стварыць выданне, якое з'явілася б дапаможнікам і дарадчыкам для беларусаў Польшчы, у якім яны знайшлі б шмат карыснага і цікавага, якое адлюстроўвала б сучаснае жыццё беларусаў у Польшчы і гісторыю беларускага народа. Структурна "Беларускі каляндар" падраздзяляецца на некалькі частак. На пачатку даюцца астранамічныя звесткі, імяніны, царкоўныя праваслаўны і каталіцкі календары па старому і новаму стылю. У каляндарным раздзеле падаюцца імёны і падзеі, якія пакінулі глыбокі след у гісторыі Беларусі — даты нараджэння і смерці Кастуся Каліноўскага, Адама Міцкевіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Цішкі Гартнага, Браніслава Тарашкевіча, угодкі Грунвальдскай бітвы, час выхаду першай легальнай беларускай газеты "Наша доля" і інш. Значнае месца ў выданні займаюць артыкулы з гістарычнай тэматыкай, матэрыялы аб дзейнасці БГКТ. "Беларускі каляндар" адлюстроўваў грамадска-палітычнае жыццё Польшчы, пры гэтым не пазбег палітызаванасці (матэрыялы пра дзейнасць ПАРП, ленінскія прынцыпы ў вырашэнні нацыянальнага пытання). Але адначасова мог змяшчаць на сваіх старонках такія матэрыялы, якія было немагчыма надрукаваць у Савецкай Беларусі. Цікавымі з'яўляюцца артыкулы Вінцука Склубоўскага "Праўнае становішча беларусаў у перадваеннай Польшчы і сёння" ("Беларускі каляндар", 1956), "Школьная справа і беларускі нацыянальна-вызваленчы рух" (1967), "Нашчадкі Грамады" (1981), Антона Мірановіча "Статут 1529 года — літоўскі, польскі ці беларускі" (1984), Аляксандра Анташэвіча "Каліноўскі — пачаткі і ідэі сучаснай Беларусі" (1984), Віктара Шведа "Абарончая вайна 1939 года" (1989), Сакрата Яновіча "Стагоддзе беларускай думкі" (1984) і інш. Значную частку выдання займаюць матэрыялы па гістарычнаму краязнаўству, нататкі пра гміны, вёскі, прыходы, цэрквы на Беласточчыне, а таксама па культуры і мастацтву. Надрукавана шмат вершаў, а таксама партрэты і біяграфіі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Танка, Уладзіслава Галубка, Змітрака Бядулі, Цёткі, вершы і апавяданні беларускіх пісьменнікаў у Польшчы — Алеся Барскага, Янкі Дубіцкага, Віктара Шведа, Сакрата Яновіча і інш. Апублікавана шмат фальклорнага матэрыялу — песень, казак, легендаў, паданняў, іншых відаў народнай творчасці. Змяшчаюцца рэпертуарныя старонкі для аматарскіх фальклорных і тэатральных калектываў. Апошнія старонкі выдання ўтрымліваюць разнастайныя парады гаспадарам, гумар, юрыдычныя парады, вершы і казкі для дзяцей. Выданне добра ілюстравана, змяшчае шмат фотаздымкаў беларускіх краявідаў, партрэты беларускіх пісьменнікаў, грамадскіх і культурных дзеячаў.

Ларыса Языковіч

"Беларускі сьцяг"

Штомесячны грамадска-палітычны і літаратурны часопіс. Выдаваўся ў красавіку – верасні 1922 г. у Каўнасе (Коўне) на беларускай мове як орган урада БНР (выйшлі 4 нумары). Рэдактар-выдавец - К. Душэўскі. Галоўнымі мэтамі выдання былі абарона незалежнай беларускай дзяржаўнасці, павышэнне грамадскай свядомасці шляхам асвятлення ўсіх бакоў беларускага жыцця. Узнімаў пытанні вызваленчага руху і будучыні беларускага народа, публікаваў артыкулы па праблемах барацьбы за адраджэнне і незалежнасць Беларусі ("Незалежнасць як праграма сённяшняга дня", "Чатыры гады", "Беларусь перад Генуэзскай канферэнцыяй", "Да пытання аб незалежнасці Беларусі" і інш.); гісторыі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ("Погляд П. Бяссонава на беларускую справу", "К. Каліноўскі", "З Беларуска-Літоўскай мінуўшчыны" і інш.); гісторыі і сучасных аспектаў рэлігійнага жыцця ў Беларусі. Вялікая ўвага надавалася палітычным і грамадскім падзеям на тэрыторыі Заходняй Беларусі, у Польшчы, Літве, Латвіі і БССР, якія разглядаліся з нацыянальна-дэмакратычных пазіцый. Як аўтары-публіцысты

выступалі В. Ластоўскі (публікаваўся пад псеўданімам Власт), А. Цвікевіч (пад псеўданімам А. Галынец і крыптанімам А. Ц.), І. Трызна. У часопісе таксама змяшчаліся афіцыйныя дакументы ўрада БНР (звароты да Вярхоўнай рады Лігі Нацый, кіраўнікоў Генуэзскай канферэнцыі) і палітычных партый Беларусі (Мемарандум Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў да канферэнцыі Венскага сацыялістычнага аб'яднання з мэтай азнаямлення сусветнай грамадскасці са становішчам беларускага насельніцтва ў Заходняй Беларусі); артыкул Я. Станкевіча пра беларускія прозвішчы; успаміны А. Аўсяніка (пад крыптанімам А. А-к) пра А. Гаруна, апавяданні і вершы В. Ластоўскага, творы Р. Тагора ў перакладзе А. Цвікевіча і інш.

Аляксандр Ціхаміраў

"Беларускія гістарычныя сшыткі" = "Białoruskie Zeszyty Historyczne"

Друкаваны орган Беларускага гістарычнага таварыства. Выдаюцца ў Беластоку з 1994 г. два разы ў год. У рэдакцыйную калегію ўваходзяць В. Харужы, Д. Фёнік, С. Іванюк, Ю. Каліна, А. Латышонак, А. Мірановіч, Я. Мірановіч, Я. Вапа. Фінансавую падтрымку выданню аказвае Міністэрства культуры і мастацтва Польшчы, а таксама мясцовае самакіраванне г. Беластока і фундацыя імя Стэфана Баторыя ў Варшаве. Публікуе навуковыя артыкулы, агляды, рэфераты, біяграфічныя і архіўныя матэрыялы, дыскусійныя артыкулы, рэцэнзіі на навуковыя публікацыі, прысвечаныя палітычнай, гаспадарчай, сацыяльнай гісторыі Беларусі, Беласточчыны, пытанням культуры, дэмаграфіі, гістарычнай геаграфіі Беларусі з часоў старажытнасці да нашых дзён. Змяшчае на сваіх старонках працы членаў Беларускага гістарычнага таварыства, іншых даследчыкаў беларускай гісторыі з Польшчы, Беларусі, Расіі, Літвы і інш. краін. Друкуе матэрыялы навуковых канферэнцый, прысвечаных гісторыі Беларусі, інфармуе чытачоў аб падзеях міжнароднага навуковага жыцця, аб удзеле ў ім беларускіх гісторыкаў Польшчы. Шмат увагі надае беларускаму грамадска-палітычнаму руху ў Польшчы ў перыяд паміж Першай і Другой сусветнымі войнамі і ў наш час. Змяшчае анатаваныя агляды манаграфічных выданняў сяброў Беларускага гістарычнага таварыства. Друкуе артыкулы і матэрыялы на польскай, беларускай і рускай мовах. Выданне ілюстраванае. Распаўсюджваецца ў Польшчы, пераважна на Беласточчыне, у Беларусі, Расіі, Літве, Вялікабрытаніі і інш. краінах свету.

Ларыса Языковіч

"Беларускія дакументы"

"Беларускія дакументы" - інфармацыйна-публіцыстычны і дакументальны зборнік. Выдаваліся Беларускім незалежным выдавецтвам у Беластоку (Польшча) у 1981–1983 гг. Выйшла 4 сшыткі (1-шы і 2-гі — у 1981 г.; 3-ці і 4-ты — у 1983 г.).

Мэта выдання — распаўсюджванне аб'ектыўнай інфармацыі аб праявах беларускай актыўнасці ў Польшчы, публікацыя дакументаў незалежнага беларускага грамадска-культурнага руху, матэрыялаў, якія раней нідзе не друкаваліся. Змяшчалі актыкулы з польскіх і замежных перыядычных выданняў, а таксама фрагменты і вытрымкі з іх, публіцыстычныя матэрыялы. У № 1 (люты 1981 г., памер — 20 старонак, тыраж — 270 экземпляраў) змешчаны Мемарандум Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы (лістапад 1980 г.), адрасаваны першаму сакратару Польскай аб'яднанай рабочай партыі С. Кані, адозва мясцовага аддзялення БГКТ да беларусаў Беласточчыны, матэрыялы аб дзейнасці БГКТ у Польшчы і яго філіяла ў Беластоку, адозва Арганізацыйнага камітэта Беларускага аб'яднання студэнтаў да студэнтаў беларускай нацыянальнасці ў Польшчы. У № 2 (ліпень 1981 г.) уключаны хроніка падзей жыцця беларусаў у Польшчы, агляд польскага і замежнага перыядычнага друку, апублікаваны ліст польскага публіцыста Багдана Скарадзінскага, прысвечаны адносінам палякаў да беларускай нацыянальнай меншасці. Там жа змешчаны гістарычныя дакументы, прысвечаныя зараджэнню беларускай дзяржаўнай ідэі ў канцы Першай сусветнай вайны. Частка тыражу гэтага сшытка ў жніўні 1981 г. была канфіскавана органамі дзяржаўнай бяспекі Польшчы. № 3 (ліпень 1983 г.) амаль цалкам прысвечаны спробам стварэння і дзяржаўнай рэгістрацыі Таварыства аховы помнікаў беларускай гісторыі і матэрыяльнай культуры ў Польшчы. На 30-ці старонках выдання апублікаваны пратаколы пасяджэнняў Арганізацыйнага камітэта, лісты і адозвы да дзяржаўных органаў, праект статута арганізацыі, матэрыялы сустрэчы ў рэдакцыі з М. Шаховічам, адным з членаў Арганізацыйнага камітэта. На старонках № 4 (жнівень 1983 г., памер 72 старонкі, тыраж каля 300 экз.) надрукаваны дакументы, якія маюць адносіны да беларускай грамадска-культурнай актыўнасці ў Польшчы таго часу, архіўныя дакументы аб беларускім нацыянальным руху ў даваенны і пасляваенны перыяды, хроніка беларускага жыцця на Беласточчыне, агляд найбольш цікавых кніжных выданняў, лісты чытачоў, матэрыялы беларускага самавыдавецкага друку — лістоўкі, адозвы, прысвечаныя пытанням адраджэння беларускай мовы, навучання дзяцей на беларускай мове, публікацыі, прысвечаныя пытанням змены беларускіх гістарычных назваў на тэрыторыі Беласточчыны, беларускага літаратурнага руху і г. д. Гістарычную каштоўнасць маюць публікацыі дакументаў, якія адлюстроўваюць дзейнасць Беларускага грамадска-культурнага таварыства таго перыяду і якія больш нідзе не былі надрукаваны і, верагодна, увогуле не захаваліся.

Ларыса Языковіч

"Беларусы Балтыі: учора, сёння, заўтра"

Выданне літоўскіх беларусаў пра дзейнасць суродзічаў балтыйскага рэгіёна. Ідэя выдання такога штогадовага сшытка была абмеркавана на II з'ездзе беларусаў Балтыі (Вільнюс, ліпень 1998). Сшытак першы выйшаў у выдавецтве Таварыства беларускай культуры ў Літве "Рунь" (Вільнюс, 1998) пад рэдакцыяй С. Вітушкі і А. Мінкіна., тыражом у 500 экз. Матэрыяльную дапамогу аказаў дабрачынны і дапаможаны фонд "Phare".

Першая частка сшытка, "Беларусы Літвы ў люстэрку гісторыі", уключае матэрыялы С. Вітушкі (Вільнюс) пра адраджэнне беларускага жыцця ў Літые з канца 80-х гадоў XX ст. (на бел., літ., англ. мовах). Дзесяцігадовую культурную і грамадска-палітычную дзейнасць Таварыства беларускай культуры ў Літве падсумоўвае яго старшыня Х. Нюнька. У артыкуле "Над этнічнай і моўнай мапай Паўднёва-Усходняй Літвы" прафесар Вільнюскага універсітэта В. Чэкман разважае пра вынікі экспедыцыі групы мовазнаўцаў восенню 1989 г. па гэтай тэрыторыі і вызначае межы пражывання тут польскага насельніцтва, якое дома размаўляе "па-просту", г.зн. на заходнебеларускім дыялекце.

У другой частцы сшытка змешчаны матэрыялы II з'езда беларусаў Балтыі: віншаванне прэзідэнта Літоўскай Рэспублікі В. Адамкуса, старшыні Рады БНР І. Сурвіла, выступленні дэлегатаў – старшыні Вярхоўнага Савета 13-га склікання С. Шарэцкага "Цярністы шлях да незалежнасці" (Мінск), старшыні БНФ З. Пазняка "Калі бяда на Бацькаўшчыне – бяда паўсюль" (Нью-Йорк), доктара гістарычных навук А. Грыцкевіча "Беларусь і краіны Усходняй Еўропы" (Мінск) і намесніка старшыні ЗБС "Бацькаўшчына" Г. Сурмач "Сённяшнія рэаліі дзейнасці ЗБС "Бацькаўшчына" (Мінск). Набыткам і праблемам беларускіх суполак Балтыі, адносінам да іх уладаў Беларусі прысвечаны выступленні старшыні Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу В. Грыцкевіча, кіраўніка рыжскай суполкі "Сьвітанак" С. Кузняцова, старшыні Таварыства беларускай культуры ў Таллінне А. Лапышава, прадстаўніка Беларуска-Эстонскага згуртавання ў Кохтла-Ярве З. Клыга, сакратара Беларускага гістарычнага таварыства ў Беластоку В. Харужага. Змешчаны дакументы, прынятыя дэлегатамі II з'езда беларусаў Балтыі.

Трэцяя частка ўтрымлівае звесткі пра беларускія суполкі Літвы. Матэрыялы сшытка ілюстраваны фатаздымкамі і рэпрадукцыямі твораў беларускіх мастакоў Вільнюса.

Галіна Сяргеева

"Белорусская криница"

"Белорусская криница", эканамічна-гаспадарчы часопіс. Выдаваўся ў 1918—1919 гг. у Петраградзе Беларускім аддзелам Камісарыята па справах нацыянальнасцей Саюза Камун Паўночнай вобласці на рускай мове. Рэдактар І. Баранкевіч. Друкаваў распараджэнні Савецкага ўрада, хроніку эканамічнага жыцця. Змешчаны артыкулы "Абавязак савецкага ўрада" і "Белавежская пушча" Баранкевіча (пад псеўданімам Беларус), "Сонца Беларусі ўзыходзіць" і "Народная гаспадарка Беларусі" А. Вазілы (пад псеўданімам Клім Злобіч, Антон Хатыня), "Нарысы па зямельным пытанні" Я. Канчара, "Да пытання пра неабходнасць пашырэння на Беларусі сельскагаспадарчай адукацыі" Дз. Сабалеўскага і інш.

Віталь Скалабан

"Белорусское эхо"

"Белорусское эхо", штотыднёвая грамадска-палітычная, літаратурная і эканамічная газета. Выдавалася з 30 мая да 1 лістапада 1918 гг. у Кіеве на рускай мове (частка матэрыялаў друкавалася па-беларуску). Рэдактар А. Мадзалеўскі. Мела карэспандэнтаў у буйных гарадах Украіны і Беларусі, Маскве і Петраградзе. Асноўнай задачай ставіла гуртаванне беларусаў, якія жылі на Украіне, забеспячэнне іх сувязі з радзімай. Праводзіла ідэю нацыянальнага аб'яднання беларускіх сіл на Украіне і Беларусі ў цэлым (арт. "Аб'ядноўвайцеся" М. Доўнар-Запольскага, "Неадкладная справа" і "Нашы задачы" І. Краскоўскага пад псеўданімам Кій і крыптанімам І. К., "Асновы еднасці" А. Навіны). Выступала за адбудову, умацаванне і незалежнасць беларускай дзяржавы, яе свабоднае нацыянальнае і эканамічнае развіццё, нацыянальнае адраджэнне, аб'яднанне ўсіх грамадскіх сіл беларускага народа дзеля рэалізацыі нацыянальных інтарэсаў, прызнанне суверэннасці Беларусі з боку суседніх дзяржаў, найперш РСФСР (паведамленне пра абвяшчэнне незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР), перадавіца ад 3.6.1918 г., тэкст ноты дэлегацыі БНР на чале з А. Цвікевічам, Доўнар-Запольскім да расійскага ўрада аб непрызнанні пунктаў Брэсцкага міру 1918 г., якія закраналі інтарэсы Беларусі, тэкст размовы Я. Хлябцэвіча са старшынёй Віленскай Беларускай рады А. Луцкевічам, арт. "Прамы доўг" Цвікевіча пад псеўданімам А. Гвоздзь і інш). У публікацыях "Беларускі рух у Гомельскім павеце" і "Украінскія культтрэгеры" (абодва пад крыптанімам Ікс-эн), "Братняя ліцытацыя Беларусі" Я. Юзюковіча, "Голас грамадзян" выступала супраць прэтэнзій гетманаўскай Украіны на паўднёва-беларускія землі. Разглядала пытанні арганізацыі эканамічнага жыцця ў Беларусі (арт. "Беларуская гандлёвая палата ў Кіеве", "Арганізацыя гандлю", "Гандлёвыя перспектывы Беларусі"

Доўнар-Запольскага пад псеўданімам М. Целяпень і без подпісу), праблему бежанцаў (рубрыка "Бежанскі аддзел", публікацыі Краскоўскага, перадавіцы), пісала пра мінулае, сучаснае і перспектывы беларускага адраджэнскага руху [арт. "Тры акты" П. Крачэўскага, "Заходняя камуна" Цвікевіча (А. Гвоздь), "Дзяржаўнае будаўніцтва на Беларусі і міжнацыянальныя адносіны" пад крыптанімам Т.]. Асвятляла дзейнасць урада БНР, друкавала яго афіцыйныя распараджэнні і паведамленні, абмяркоўвала стан і перспектывы ўзаемаадносін беларускага ўрада з новастворанымі дзяржавамі (арт. "Бліжэйшыя праблемы" А.Цвікевіча — А. Гвоздзя), пытанні дзяржаўнага будаўніцтва і культурнага жыцця ў Беларусі (рубрыка "Хроніка метраполіі"), паведамляла пра дзейнасць беларускіх культурна-асветных і грамадска-палітычных суполак на Украіне і ў Расіі (рубрыка "Беларускія арганізацыі на Украіне"). На старонках газеты змешчаны творы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, З. Вехаця, У. Галубка, Ц. Гартнага, М. Грамыкі, К. Каганца, А. Паўловіча, Ю. Фарботкі, Ф. Чарнышэвіча, літаратурна-гістарычны нарыс "Беларусь у песнях" Фарботкі, артыкул пра Купалле як беларускае свята, інфармацыя пра выхад брашуры Цвікевіча пра беларускі адраджэнскі рух, альманах "Варта", хроніка падзей і інш. Выйшла 9 нумараў.

Арсень Ліс, Алена Шорахава

"Голас Беларуса"

"Сялянска-работніцкая штотыднёвая газета", орган беларускай нацыянальнай супольнасці ў Латвіі. Арганізавана ў 1921 г. Таварыствам "Бацькаўшчына". Рэдактарам-выдаўцом быў К. Езавітаў. У 1925 г. выйшла 18 нумароў, у 1926 — 20, у 1927 — 11, у 1928 — 1, у 1929 — 2 нумары. Першая беларуская газета ў Латвіі (у 1920 г. выйшла толькі аднаднеўка "На чужыне") ставіла мэтай абуджэнне нацыянальнай свядомасці латвійскіх беларусаў, гуртаванне іх на сацыяльна-эканамічным і нацыянальным грунце, абарону інтарэсаў беларускага сялянства, работнікаў і інтэлігенцыі, развіццё культурнай і нацыянальнай самабытнасці. Газета паведамляла аб дзейнасці суполак, таварыстваў, пісала аб стане асветы, знаёміла чытачоў з жыццём беларусаў у Літве, Чэхаславакіі, Сібіры, Савецкай Беларусі. Побач з допісамі беларусаў з розных мясцін Латвіі, асабліва Латгаліі, змяшчала літаратурныя творы пачынаючых аўтараў, пераклады з латышскай мовы.

Сяргей Панізьнік

"Голас Радзімы"

Грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая газета, заснаваная ў 1955 г. Беларускай секцыяй Савецкага камітэта "За вяртанне на Радзіму" як орган афіцыйнай прапаганды так званага савецкага ладу жыцця і савецкай знешняй палітыкі, ідэалагічнай апрацоўкі беларускай эміграцыі, аселай у краінах Захаду. Да 1960 г. выходзіла пад назвай "За вяртанне на Радзіму" і выконвала галоўную функцыю — спрыяць вяртанню ў СССР як мага большай колькасці беларусаў — былых ваеннапалонных, моладзі, вывезенай на прымусовыя работы ў Германію, і інш. З утварэннем у 1964 г. Беларускага таварыства па культурных сувязях з суайчыннікамі за мяжой газета становіцца яго органам і мае назву "Голас Радзімы". Яе асноўная задача, вызначаная партыйна-дзяржаўным кіраўніцтвам, — стварэнне для замежных арганізацый прывабнага вобразу Савецкай Беларусі. Паколькі большасць эмігрыцыі з дарэвалюцыйных і міжваенных гадоў складалі выхадцы з вёскі, асабліва заходнебеларускай, то галоўным накірункам прапаганды ў "Голасе Радзімы" стаў паказ сацыялістычных пераўтварэнняў у беларускай вёсцы. Газета высылалася больш як ў 50 краін свету. Да 1991 г. змяшчаліся матэрыялы як на беларускай, так і на рускай мовах, штомесячна выходзілі англійскія і іспанскія старонкі. Тэматычныя напрамкі — грамадска-палітычнае жыццё, культура, эканоміка, гісторыя, прапаганда "міралюбівай знешняй палітыкі СССР" і барацьба з "беларускім буржуазным нацыяналізмам". Публікавалася шмат артыкулаў па краязнаўству, этнаграфіі, архітэктуры. З сярэдзіны 70-х гг., нягледзячы на цэнзуру, газеце ўдаецца заняць больш дэмакратычныя пазіцыі. У гэты час рэдакцыя выдае зборнік вершаў У. Клішэвіча (былога вязня ГУЛАГа, які пасля вайны жыў у ЗША) "Сняцца дні мне залатыя", друкуюцца нататкі А. Мальдзіса "За Ла-Маншам, сярод беларусаў", нарыс В. Трыгубовіч пра ксяндза Чарняўскага з Вішнева, які адпраўляў набажэнства па-беларуску, вялікі артыкул гісторыка М. Ермаловіча да 1000-годдзя Беларусі. Пад рубрыкай "Нашы славутыя землякі" выходзяць нататкі Г. Кісялёва пра К. Каліноўскага, С. Цярохіна пра аўтара трактата аб ракетабудаванні К. Семяновіча, У. Касько пра А. Сержпутоўскага, Я. Янушкевіча пра Б. Эпімах-Шыпілу і інш. З пачаткам перабудовы і абвяшчэння Беларусі суверэннай дзяржавай газета займае адраджэнцкія пазіцыі. Пашыраецца тэматыка аб мінуўшчыне, больш матэрыялаў падаецца пра жыццё беларусаў у замежжы, узнімаюцца вострыя сацыяльна-палітычныя праблемы. Газета імкнецца ўзважана інфармаваць чытачоў дыяспары аб усім, што адбываецца ў Беларусі.

Аўтарамі газеты ў розныя часы былі пісьменнікі К. Буйло, К. Крапіва, І. Мележ, М. Лынькоў, А. Макаёнак, Ф. Янкоўскі, П. Панчанка, Я. Брыль, М. Танк, П. Пестрак, С. Грахоўскі, І. Чыгрынаў, Р. Барадулін, гісторыкі М. Улашчык, В. Круталевіч, М. Сташкевіч, А. Грыцкевіч, І. Ігнаценка, А. Кароль, філосафы В. Шалькевіч, У. Конан, краязнаўца Г. Каханоўскі і інш. Да 1993 г. рэдакцыя газеты выдавала "Бібліятэчку "Голасу Радзімы". Выйшла больш за 150 брашур і кніг, у тым ліку на гістарычную тэматыку: А. Грыцкевіча "Вакол "Слуцкага

паўстання" (1987), В. Шалькевіча "Кастусь Каліноўскі" (1986) на беларускай і англійскай мовах, С. Цярохіна "Славутыя адвагай на вайне" (1991), да 580-годдзя Грунвальдскай бітвы, У. Конана "Боская і людская мудрасць (Францішак Скарына: жыццё, творчасць, светапогляд)" (1980), І. Ігнаценкі, А. Караля "Усевалад Ігнатоўскі і яго час" (1991), І. Саверчанкі "Астафей Валовіч" (1992). Апошняя кніжка бібліятэчкі — "Вяртанне" Л. Савік (жыццяпіс Барыса Кіта). З 1997 г. заснавальнікамі газеты "Голас Радзімы" акрамя Таварыства "Радзіма" сталі Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей, Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі.

Вацлаў Мацкевіч

"Дзянніца"

Грамадская і літаратурная газета. Выдавалася з 1(14).11.1916 да 31.12.1916 (13.1.1917) г. у Петраградзе на беларускай мове. Рэдактар-выдавец З. Жылуновіч (Ц. Гартны). Выходзіла адначасова з газетай "Светач" ("Swietac"). Асвятляла цяжкае становішча Беларусі ў Першую сусветную вайну. Гартны ў артыкулах "Аб беларускім універсітэце" (№ 1, пад псеўданімам Змітро Капылянін), "Яшчэ аб беларускім універсітэце" (№ 5, пад крыптанімам Д. Ж-ч) выступаў за развіццё беларускай культуры, друку, заснаванне беларускага універсітэта. Інфармавала пра дзейнасць Беларускіх таварыстваў у Петраградзе і Казані па аказанню дапамогі пацярпелым ад вайны, беларускую вечарыну ў Петраградзе 12 лістапада 1916 г. (былі пастаўлены спектаклі "Як яны жаніліся" і "Па рэвізіі" М. Крапіўніцкага). М. Багдановіч пад псеўданімам М. Осьмак у № 4 ад 27.11.1916 г. змясціў артыкул "Агляд працы за першы год Мінскага аддзела Беларускага таварыства для помачы пацярпелым ад вайны" — гэта апошняе прыжыццёвае выступленне паэта ў беларускім друку. У артыкуле Э. Будзькі "Думкі да граматыкі" (№ 1–7, пад псеўданімам Акцуб, крыптанімам А. Б.) разгледжаны асаблівасці беларускай народнай мовы, паказана неўнармаванасць беларускага правапісу. "Дзянніца" друкавала творы Гартнага (1-я частка рамана "Бацькава воля", вершы), К. Буйло, А. Паўловіча, Х. Чарнышэвіча (Тодар Ч-віч), Ф. Шантыра (Ф. Ш-р) і інш. Паведаміла пра смерць Цёткі і падкрэсліла, што гэта "вялікая страта для беларусаў" (№ 6). Выданне з-за фінансавых і цэнзурных цяжкасцей (многія матэрыялы здымаліся цэнзурай, газета выходзіла з белымі плямамі, спынена на № 7.

Віталь Скалабан

"Зажынкі"

"Зажынкі", грамадска-палітычны, літаратурна-мастацкі зборнік выдадзены ў 1918 г. у Маскве Беларускім нацыянальным камісарыятам. Змешчаны ў ім артыкул Я. Нёманскага "Нацыянальныя задачы Беларусі" разглядаў пытанні нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння Беларусі ў форме "шырокай аўтаноміі краявога жыцця" ў кантэксце стварэння ў краі Савецкага (Радавага) палітычнага ладу і федэратыўнага злучэння з Савецкай Расіяй, крытыкаваў як утапічную ідэю БНР аб дзяржаўнай незалежнасці Беларусі і магчымасці федэрацыі з заходнімі дзяржавамі (Польшчай, Украінай, прыбалтыйскімі краінамі). Праблемам стварэння нацыянальнай школы, асабліва вышэйшай, падрыхтоўкі свядомай беларускай інтэлігенцыі прысвечаны артыкул Я. Пятровіча (Я. Нёманскага) "Да культурна-асветных задач Беларусі", эканамічнага стану Беларусі — артыкул Я. Канчара, беларускай літаратуры — крытычны агляд З. Жылуновіча. У зборніку змешчаны творы Я. Купалы, Я. Коласа, Цёткі, А. Гаруна, Ц. Гартнага, Ф. Шантыра; упершыню надрукавана "Беларуская Марсельеза" з пазначэннем "народны твор" (сапраўдны аўтар — А. Мікульчык).

Аляксей Каўка (Масква)

"Кантакт" ("Шляхі беларускай думкі")

Беларускі грамадска-палітычны часопіс. Выдаваўся выдавецтвам "Кантакт", друкаваўся адначасова ў Польшчы і Беларусі. Выходзіў нерэгулярна у пачатку 1989 – ліпені 1990 гг. Выйшлі 4 нумары. Змяшчаў артыкулы, дзе аналізавалася сітуацыя ў Беларусі і на Беласточчыне, палітычныя, дыскусійныя матэрыялы, гістарычныя нататкі, перадрукі з замежных сродкаў масавай інфармацыі, а таксама матэрыялы, прысвечаныя пытанням палітычнага развіцця Беларусі. У № 1 (сакавік 1989 г.) надрукаваны артыкулы аб адносінах "Салідарнасці" да беларускага нацыянальнага руху ў Польшчы, аб стварэнні БНФ "Адраджэнне" і разгоне дэманстрацыі каля Усходніх могілак, артыкул Ю. Туронка "Кожны чацвёрты і Курапаты", у якім аўтар спрабаваў прааналізаваць памеры дэмаграфічных страт беларускага народа ў гады Другой сусветнай вайны. № 2 (ліпень 1989 г.) змяшчае артыкулы, у якіх аналізуецца грамадска-палітычная сітуацыя ў Польшчы і на Беласточчыне (артыкул "Што здарылася ў Беластоцкім краі?", падпісаны крыптонімам А. А.), шэраг матэрыялаў публіцыстычнага характару, а таксама артыкулы, якія закраналі гістарычную праблематыку — беларускі нацыянальны рух пачатку XX ст., палітычную сітуацыю на Віленшчыне ў міжваенны перыяд і інш. У № 3 (люты 1990 г.) апублікаваны артыкулы, прысвечаныя аналізу сітуацыі ў Беларусі, дзейнасці Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы, артыкул Ю. Туронка, прысвечаны беларускаму нацыянальнаму руху ў 20-я гг. нашага стагоддзя, змястоўны матэрыял А. Жука аб каталіцызме ў

Беларусі ў XX ст., а таксама артыкул падпісаны Марыянам Б., пра атмасферу ў Саюзе пісьменнікаў БССР у 70-я гг. і інш. № 4 (апошні, ліпень 1990 г.) быў амаль цалкам прысвечаны агляду перспектыў беларускай палітычнай актыўнасці ў Польшчы, асабліва на Беласточчыне (артыкул "Палітычныя перспектывы Беластоцкага краю" С. Яновіча, "Беларусы і наменклатура" Я. Іванюка, "Неакаланіялізм і беларусы" В. Мароза і інш.). Змешчаны матэрыялы, прысвечаныя сітуацыі, якая склалася ў беларускім праваслаўным асяродку ў Польшчы, шэраг артыкулаў па гістарычнай тэматыцы. Часопіс "Кантакт" спрыяў працэсам адраджэння беларускай нацыянальнай самасвядомасці ў Польшчы і Беларусі, развіццю агульнабеларускай грамадска-палітычный думкі, стварэнню Беларускага дэмакратычнага аб'яднання ў Польшчы.

Ларыса Языковіч

"Кантакты і дыялогі"

Штомесячны інфармацыйна-аналітычны і культуралагічны бюлетэнь,які выдаецца Міжнароднай асацыяцыяй беларусістаў і Беларускім таварыствам дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі. Выходзіць з 1996 г. Публікуе матэрыялы пра грамадска-культурнае узаемадзеянне Беларусі з замежнымі, у тым ліку з памежнымі краінамі. Пастаяннымі рубрыкамі у бюлетэні з'яўляюцца "Культура і адукацыя беларускага памежжа", "Постаці культурнага памежжа", "Беларускае замежжа: старонкі будучага даведніка" (пад апошняй рубрыкай прайшлі апрабацыю многія артыкулы дадзенага даведніка). На старонках бюлетэня часта выступаюць аўтары з Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны. Выдадзены тэматычны нумар "Беларусы у памежных краінах" (1998, № 10–11).

Тамара Шкурко

"Крывіч"

Літаратурна-навуковы і грамадскі часопіс нацыянальна-дэмакратычнага накірунку. Выдаваўся з чэрвеня 1923 да сакавіка 1927 г. у Коўне (Каўнасе) на беларускай мове. Рэдактары — В. Ластоўскі і К. Дуж-Душэўскі. Мэта часопіса была акрэслена ў яго першым нумары: "Ня толькі абслужыць у роднай мове духовыя вымаганьні сярэдняга беларускага інтэлігента, але і прылажыць усіх высілкаў да адшуканьня шляхоў к самавызначэньню Беларусі ў сферы духовасьці". Вызначаўся разнастайнасцю тэматыкі і змястоўнасцю публікацый. Кожны нумар часопіса меў раздзелы: літаратурны (творы беларускага пісьменства, беларускія пераклады з рускай, польскай, англійскай, японскай, фінскай, эстонскай і інш. моваў), навукова-крытычны (даследаванні розных бакоў беларусазнаўства), "запіскі" (шматлікія звесткі пра беларусаў, іх гісторыю і культуру), інфармацыйны (бібліяграфічныя агляды, водгукі).

Аўтарам большасці публікацый на старонках "Крывіча" быў В. Ластоўскі. У кожным нумары былі яго вершаваныя ці празаічныя творы. Адметнымі з'яўляюцца аповесць "Лабірынты", дзе пераплятаюцца мінулае і сучаснасць (1923. № 2, 3, 6), успаміны В. Ластоўскага пра М. Багдановіча (1926. № 1), падарожныя нататкі аб паездцы ў Мінск на Акадэмічную канферэнцыю па рэформе беларускага правапісу і азбукі 1926 г. (1927. № 1). Артыкулы В. Ластоўскага пра першабытную і сярэдневяковую айчынную гісторыю развівалі яго "крыўскую" тэорыю і канцэпцыю самабытнага шляху беларускага народа: "Аб найменнях "гуды" — "крывічы" — "русь", "Пачатны летапіс аб крывічах у асьвятленьні гістарычнай крытыкі", "Смаленская легенда аб св. Меркурыі", "Да шуканьня крыніц народнай творчасці", "Крыўскі варыянт быліны аб Ільлю Мурамцы", "Што спрыяе разросту і ўпадку народаў і дзяржаў", "Прычыны заняпаду крыўскай мовы ў XVII ст." і інш. У часопісе друкаваліся асобныя матэрыялы, што ўвайшлі ў кнігу В. Ластоўскага "Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі" (1926). Некаторыя публікацыі закраналі пытанні гісторыі нацыянальнай культуры — пра камяні-краўцы, конаўкі, знішчэнне уніяцкіх кніг пасля 1839 г. Брэсцкая унія 1596 г. разглядалася як нацыянальна-культурная з'ява. Паводле В. Ластоўскага, уніяцтва магло стаць нацыянальнай рэлігіяй беларусаў, калі б мела дзяржаўны статус, захоўвала народную мову і літургію, пры ўмове прыналежнасці да яго ўсіх слаёў насельніцтва. Гісторыя асветы адлюстравана ім у аўтабіяграфічным артыкуле "Старабеларуская вясковая школа" і ў публікацыі "Віленская грэка-лацінска-руская акадэмія". Друкаваліся матэрыялы, прысвечаныя Ф. Скарыне, Л. і С. Зізаніям, А. Міцкевічу, Ф. Дастаеўскаму. Змяшчаліся таксама слоўнікавыя матэрыялы В. Ластоўскага, тэрміналогія па анатоміі, фізіялогіі, батаніцы, фрагменты беларускага зельніка, лацінска-руска-беларускі слоўнік па арніталогіі (апрацаваны разам з Т. Іваноўскім і К. Дуж-Душэўскім). На старонках выдання быў апублікаваны невядомы аўтограф Ф. Багушэвіча, творы М. Багдановіча (сярод іх — папраўлены з "Каляднай пісанкі" 1913 г. варыянт "Апокрыфа"), даследаванне пра яго паэтычную творчасць А. Узнясенската, мовазнаўчыя працы Я. Станкевіча. З'явіліся апрацаваныя ўрыўкі кітаба, пераклады "Песні песняў" з Біблії. Чытачы змаглі пазнаёміцца па беларускіх перакладах з творамі замежных аўтараў — Ю. Ахо, В. Бонзельса, Г. Гаўптмана, С. Інгмана, Р. Кіплінга, Б. Мэёна, Р. Тагора, Э. Сетан-Томпсана, А. Талстога, О. Уайльда, А. Франса і інш.

Пытанні эканамічнай гісторыі Беларусі закраналіся К. Дуж-Душэўскім у працах "Даваенны бюджэт Беларусі", "Беларусь і водка". Вайсковая гістарычная тэматыка асвятлялася ў артыкулах А. Ружанцова "Два вайсковых

статуты" (1923. № 1), "Літоўска-беларускае войска цэсара Напалеона" (1923. № 6), а таксама ва ўспамінах К. Езавітава пра Цэнтральную беларускую вайсковую раду (1924. № 1; 1925. № 1). Цікавасць выклікаюць грунтоўныя працы А. Шлюбскага "Матэрыялы да крыўскае гісторапісі: Доля кнігасховаў і архіваў", "Матэрыялы да гісторыі крыўскай этнаграфіі: П. В. Шэйн (1826–1900)" і інш., нарысы пра эстонскую народную творчасць. Рэгулярна змяшчаліся навіны грамадска-палітычнага і нацыянальна-культурнага жыцця беларусаў у БССР і іншых рэгіёнах СССР, Заходняй Беларусі, Літве, Латвіі, Чэхаславакіі і інш. краінах. Друкаваліся агляды беларускай, польскай, літоўскай прэсы. Часопіс змяшчаў рэцэнзіі на выдадзеныя ў БССР, Заходняй Беларусі, у асяроддзі беларускай эміграцыі кнігі і часопісы, а таксама на замежныя перыядычныя і манаграфічныя выданні пра Беларусь. Падрабязна выкладзена праца Камітэта паняволеных Польшчай нацый у Парыжы і Жэневе, пратэст супраць антыбеларускай скіраванасці канкардату 1925 г. паміж польскім урадам і Ватыканам, супраць разгрому рэжымам "санацыі" Ю. Пілсудскага ў 1927 г. Беларускай сялянска-работніцкай грамады (надрукаваны ліст В. Ластоўскага да старшыні французскай Лігі абароны правоў чалавека і грамадзяніна Баша, рэзалюцыя пратэсту Аб'яднанага сходу беларускіх грамадскіх арганізацый у Літве, тэлеграма на імя прэзідыума Кангрэса паняволеных народаў у Бруселі). Пасля адмовы літоўскага ўрада фінансаваць выданне часопіса, палітычнага пераваротy 17 снежня 1926 г. у Літве, пераезду В. Ластоўскага ў БССР выпуск "Крывіча" спыніўся. Усяго выйшла 12 нумараў.

Аляксандр Вабішчэвіч

"Ластаўка" (1)

Зборнік вучнёўскіх твораў Дзяржаўнай Люцынскай беларускай гімназіі ў Латвіі за 1923–1924 вучэбны год, які выйшаў у г. Лудза (да 1920 г. — Люцын) з друкарні В. Суера. Гэта — "выбранае" з дзясяці папярэдніх нумароў часопіса. У мастацкіх адносінах выдзяляюцца вершы Пятра Масальскага (выступаў і пад псеўданімамі Пятрусь, Пятро Сакол), Валянціны Казлоўскай (псеўданім Лясная кветка), Якуба Воркуля, Гелены Івановай.

Сяргей Панізьнік

"Ластаўка" (2)

Літаратурны штомесячны часопіс, які выпускалі на шапірографе вучні Люцынскай (Лудзенскай) беларускай дзяржаўнай гімназіі ў Латвіі (май 1923 – ліпень 1925) у колькасці 30–35 экз. У рэдагаванні часопіса прымалі ўдзел Г. Плыгаўка, першы дырэктар гімназіі, С. Сахараў, фальклярыст, этнограф, У. Пігулеўскі, які стаў вядомым перакладчыкам, членам Саюза пісьменнікаў СССР, і інш. У часопісе змяшчаліся фальклорныя запісы, зробленыя ў вёсках Люцыншчыны ад беларускамоўнага насельніцтва, а таксама ўласныя творы гімназістаў.

Сяргей Панізьнік

"Ніва"

Тыднёвік беларусаў у Польшчы. Выданне Беларускага грамадска-культурнага таварыства (БГКТ да 1992 г.), а цяпер "Ніву" выдае Праграмная рада. Выходзіць з 4 сакавіка 1958 г., на беларускай мове. Асноўныя тэматычныя напрамкі тыднёвіка — грамадска-палітычны і культурна-асветніцкі. Газета змяшчае інфармацыю пра падзеі ў Польшчы, асабліва на Беласточчыне, у суседняй Беларусі, ва ўсім свеце.

Пастаяннымі змястоўнымі напаўняльнікамі штотыднёвіка з'яўляюцца гісторыя, краязнаўства, мастацтвазнаўства, мемуарыстыка, жыццё моладзі, дзейнасць БГКТ і яго актывістаў і інш. Сярод сталых рубрык газеты вылучаюцца літаратурная (друкуюцца пераважна творы сяброў літаратурна-мастацкага аб'яднання "Белавежа"), мовазнаўчая "Гутаркі аб мове", дзіцячая "Зорка", псіхалагічная "Сэрцайка", гумарыстычная "Ніўка" і інш. У апошнія гады значнае месца адводзіцца матэрыялам аб далёкім замежжы.

Доўгі час рэдактарам "Нівы" быў Георгій Ваўкавыцкі, затым Яўген Мірановіч. Цяпер старшынёй Праграмнай рады тыднёвіка з'яўляецца Яўген Мірановіч, а галоўным рэдактарам — Віталь Луба. З публіцыстыкай, мастацкімі творамі, навуковымі артыкуламі на старонках "Нівы" выступалі вядомыя пісьменнікі, вучоныя А. Баршчэўскі (А. Барскі), С. Яновіч, В. Швед, Я. Максімюк, Я. Чыквін, Н. Амельянюк, А. Грыцкевіч і інш.

Доўгая гісторыя існавання беластоцкага штотыднёвіка засведчыла прыхільнасць аўтараў і выдаўцоў "Нівы" да ідэі нацыянальнага адраджэння беларускага народа.

Святлана Сачанка

"Першы крок"

Зборнік вершаў гуртка маладых беларускіх паэтаў у Латвіі (Рыга, 1926). Выйшаў у серыі "Бібліятэка Беларуса-Выбаршчыка" стараннем "Таварыства Беларусаў Выбаршчыкаў у Дзяржаўны Сойм, павятовыя, гарадскія і валасныя самаўрады ў Латвіі". Сярод дваццаці аўтараў кнігі — В. Ашурак, А. Бартуль, Э. Вайвадзіш, В. Вальтар,

Я. Ванаг, Я. Воркуль, К. Езавітаў, В. Казлоўская, Н. Мікалаева, Б. Рык, В. Сахарава, П. Сакол (Масальскі), М. Талерка.

У. Жылка, тады студэнт філасофскага аддзялення Карлава універсітэта ў Празе, змясціў у часопісе "Новы прамень" (1926. № 1) рэцэнзію на гэты зборнік, дзе пісаў: "З'яўленнем дваццаці новых і маладых паэтыцкіх сілаў, якія выступаюць у "Першым кроку" — ужо адзін з вынікаў праробленае нацыянальнае працы. З'явішча прыемнае і пацяшаючае тым болей, што латвійскі куток беларускага Наддзвіння адрэзаны ад жывога беларускага цела [...]. У далёка неспрыяючай латвійскай сапраўднасці Дваццаць паднялі меч беларускага Слова".

Сяргей Панізьнік

"Прамень"

"Прамень"— культурна-асветніцкая газета беларусаў Латвіі, выходзіць з снежня 1994 г. на беларускай мове. Заснавана беларускімі суполкамі ў Латвіі. 14 мая 1994 г. яны стварылі Раду па выданню газеты. Галоўным рэдактарам Рада зацвердзіла Лявона Шакаўца. Непасрэдна выданнем газеты займаецца Таварыства беларускай мовы "Прамень". Перыядычнасць – раз у месяц , выходзілі аб'яднаныя нумары за два месяцы.

Газета інфармуе чытачоў пра дзейнасць беларускіх суполак у Латвіі, палітычнае, эканамічнае і культурнае жыццё ў Беларусі. Друкуе матэрыялы па гісторыі Беларусі, развіццё беларускай культуры, мовы, нацыянальныя традыцыі беларусаў. Многія публікацыі расказваюць пра вядучых беларускіх дзеячаў у Латвіі. Падаюцца аб'явы, рэклама і іншая інфармацыя для латышскіх беларусаў. Газета выдаецца на сродкі, атрыманыя ад прыхільнікаў беларускай справы. Галоўныя ахвярадаўцы выдання былі беларускія прадпрымальнікі Латвіі Янка Кабановіч, Валянціна Піскунова.

Ганна Сурмач

"Рунь"

Беларуская газета, заснаваная Віленскім Таварыствам беларускай культуры. Першы нумар "Руні" выйшаў 25 сакавіка 1997 г. у Вільнюсе. Перыядычнасць выдання — 1 нумар у месяц. Рэдакцыйную раду ўзначальвае перакладчык, паэт, літаратуразнаўца Алег Мінкін. "Рунь" расказвае пра жыццё беларусаў у Літве, змяшчае гістарычныя артыкулы, архіўныя матэрыялы, у тым ліку шматлікія фотаздымкі, успаміны відных беларускіх дзеячаў, разнастайныя матэрыялы, прысвечаныя адраджэнню беларускай культуры. Дзейнасць рэдкалегіі газеты падпарадкавана абуджэнню нацыянальнай свядомасці этнічных беларусаў у Літве і пашырэнню ведаў аб сваім краі.

За час існавання, "Рунь" ужо змагла прыцягнуць да сябе ўвагу — на яе адрас прыходзяць шматлікія водгукі з-за мяжы, дасылаюцца новыя матэрыялы. Рэдакцыйная рада зацікаўлена ў пашырэнні кола чытачоў свайго выдання: кожны чарговы нумар дасылаецца ў тыя краіны свету, дзе таксама пражываюць беларусы.

На Другім з'ездзе беларусаў краін Балтыі было прапанавана зрабіць газету "Рунь" інфармацыйным органам беларусаў Балтыі, што дасць магчымасць паўней выкарыстаць творчы патэнцыял рэдкалегіі і павялічыць тыраж газеты.

Леакадзія Мілаш (Вільнюс)

"Скарыніч"

Маскоўска-мінскае літаратурна-навуковае выданне. Выйшлі чатыры зборнікі (Мн., 1991. Вып. 1.; Мн., 1993. Вып. 2.; М; Мн:, Смаленск, 1997. Вып. 3;. Мн., 1999, Вып. 4). Укладальнік — маскоўскі вучоны-беларус А. Каўка. Выдаецца на беларускай мове, частка тэкстаў — на рускай. Вып. 1, 2 выйшлі ў выдавецтве "Мастацкая літаратура", вып. 3 — у выдавецтве "Тэхналогія" пры фінансавай падтрымцы Маскоўскага згуртавання беларусаў "Бацькаўшчына" і камерцыйна-выдавецкай фірмы "Рух", вып. 4 – у выдавецтве "Беларускі кнігазбор" пры фінансавай падтрымцы М. Шкялёнка.

Адна з асноўных тэм зборнікаў — творчая спадчына вялікага беларускага асветніка Ф. Скарыны і праблемы яе вывучэння. Гэтаму прысвечаны раздзелы "Вячыстае святло Скарыны" (вып. 1) і "Прарок на бацькаўшчыне" (вып. 2). У вып. 1 змешчаны матэрыялы дыскусіі, арганізаванай ў 1989 г. Інстытутам сусветнай літаратуры АН СССР супольна з Саветам па беларускай літаратуры пры Саюзе пісьменнікаў СССР і Маскоўскім таварыствам беларускай культуры па энцыклапедычнаму даведніку "Францыск Скарына і яго час" (Мн., 1988). Навукоўцы з Масквы, Мінска, Ленінграда, Варшавы, Гомеля, Калугі выказалі тады свае меркаванні, прапановы, у т. л. думку "аб неабходнасці якаснага новага прарыву ў вывучэнні асобы і творчай спадчыны першадрукара" (Вып. 1. С. 47). Уяўленні сучаснікаў — вучоных, пісьменнікаў, рабочых, настаўнікаў, студэнтаў — пра вялікага продка раскрываюцца ў іх адказах на пытанні "Скарыніча" з нагоды 500-х угодкаў яго нараджэння. Змешчаны анатацыі выданняў за 1988, 1989 гг. пра Ф. Скарыну ў Беларусі і беларускім замежжы. У вып. 2 прадстаўлены матэрыялы, прысвечаныя святкаванню 500-х угодкаў Ф. Скарыны і святу славянскага пісьменства літаратараў і навукоўцаў з Беларусі, беларускага замежжа — С. Яновіча (Беласточчына), Б. Бялаказовіча (Варшава), М. Нікалаева

(Ленінград), А. Анішчыка (Вільнюс), В. Целеша (Рыга), інжынера А. Сабалеўскага (Масква). Змешчаны выказванні ў сувязі з гэтым вядомых у замежжы беларусістаў і літаратараў Ю. Мядзведзева (Масква), В. Дзіекава (Сафія), Т. Бэрда (Нью-Йорк), К. Гутшміта (Берлін), Дж. Дынглі (Лондан), А. Лапінскене (Вільнюс), Т. Левашкевіча (Познань), Г. Пікарды (Лондан), А. Рогава (Масква), С. Скарыны (Манрэаль). Гэтая публікацыя ў "Скарынічы" — своеасаблівыя агледзіны дасягненняў ў галіне скарыназнаўства, вызначэнне праблем далейшых даследаванняў спадчыны беларускага асветніка. Выкладзены таксама развагі Г. Лебедзева і У. Конана аб творах і творчасці Ф. Скарыны, погляд Я. Неміроўскага на бібліяграфічны даведнік "Пяць стагодзьдзяў Скарыніяны. XVI–XX", падрыхтаваны ў эміграцыі В. Тумашам і выдадзены ў 1989 г. Беларускім інстытутам навукі і мастацтва ў Нью-Йорку (вып. 2).

Да 400-х угодкаў друкаванага Статута Вялікага Княства Літоўскага прымеркаваны матэрыялы скарынаўскага семінара (Масква, 1989), на якім абмяркоўвалася энцыклапедычнае выданне "Статут Вялікага княства Літоўскага. 1588" (Мн., 1989). У выступленнях вучоных з Варшавы (Б. Бялаказовіч), Масквы (А. Каўка, Я. Неміроўскі, Ю. Лабынцаў), Ленінграда (В. Грыцкевіч), Мінска (А. Грыцкевіч, Г. Сагановіч) падкрэслівалася агульнаславянскае і агульнаеўрапейскае значэнне гэтага буйнога прававога і літаратурнага помніка, вызначалася навуковая і нацыянальна-асветная роля гэтага выдання (Вып. 2).

Асэнсаванню шляху і творчай спадчыны пісьменніцкага згуртавання 1920-х гадоў "Узвышша" прысвечаны выпуск 4 "Скарыніча" , прымеркаваны да 100-ых ўгодкаў аднаго з яго вядучых прадстаўнікоў А. Бабарэкі. У ім змешчаны дакументы з гісторыі літаратурнага аб'яднання (публікацыі Р. Платонава, І. Куркова, А. Каўкі), эпісталярыя пісьменнікаў-"узвышэнцаў" (публікацыі А. Бабарэкі, Я. Кісялёвай, А. Гесь), роздум пра ролю іх творчасці у кантэксце беларускай і сусветнай культуры У. Конана, А. Каўкі, І. Багдановіч. У раздзеле гэтага выпуска "Постаці" – матэрыялы пра беларускага гісторыка ў Варшаве Ю. Турнка і бібліяграфія яго прац.

У "Скарынічы" апублікаваны матэрыялы з рукапіснай спадчыны жыхара Масквы вядомага беларускага гісторыка М. Улашчыка (публікацыя А. Улашчыка), яго успаміны "Хроніка" (Вып. 1, 2), "Навальніца" (Вып. 3), якія знаёмяць з яго "нязвыклымі, поўнымі горычы і драматызму універсітэтамі" (А. Каўка. Вып. 1. С. 96), трагічным лёсам беларускай інтэлігенцыі і сялянства.

У зборніках змешчаны невядомыя раней архіўныя дакументы (са сховішчаў Нацыянальнага архіва РБ, Беларускага дзяржаўнага архіва, архіва КДБ РБ, Цэнтральнага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, гісторыка-дакументальнага дэпартамента МЗС Расіі), мемуарныя матэрыялы, публікацыі пра жыццё і творчасць дзеячаў беларускай культуры і навукі Б. Эпімах-Шыпілы, В. Ластоўскага, Я. Лёсіка, У. Ігнатоўскага, праз постаці якіх раскрываюцца здабыткі і цяжкасці нацыянальнага адраджэння ў канкрэтнай гістарычнай рэальнасці 20-х гг. (публікацыі А. Каўкі, Р. Платонава).

Дзякуючы раздзелам "Вяртанне" (Вып. 2) і "Забытыя тэксты" (Вып. 3), "Незабытыя тэксты" (Вып. 4) уводзяцца ў грамадскі ўжытак матэрыялы з рукапіснай, забытай ці малавядомай спадчыны Я. Лёсіка, А. Смоліча, І. Луцкевіча, А. Бабарэкі, Я. Варонкі, Я. Дылы. У палемічным тэксце невядомага аўтара "О "старой" и "новой" Унии", адшуканым ва Украінскім дзяржаўным гістарычным архіве ў Львове, разглядаецца праблема беларускай нацыянальнай царквы (публікацыя А. Каўкі. Вып. 3). У "Письме русскому другу" А. Каўкі, якое напісана ў 1977 г., мела шырокае хаджэнне ў спісах, а ўпершыню было выдадзена беларускай эміграцыяй у Лондане (1979), асэнсоўваецца, па словах аўтара, "адвечна вострая праблема нацыянальнай выжывальнасці беларусаў" (Вып. 1). Вострапалемічны артыкул Лукаша Валовіча "Национальное "адраджэньне" Белоруссии" (публікацыя І. Бурсава, А. Каўкі) і эсэ ўкраінскага пісьменніка-эмігранта Яўгена Маланюка "Маларасійства" прысвечаны нацыянальнай свядомасці, праблемам адраджэння народаў Беларусі і Украіны (Вып. 2).

У зборніках узноўлены публікацыі 20-х гг. аб нацыянальна-культурнай працы беларусаў у Маскве, змешчаны дакументы з гісторыі стварэння ў снежні 1988 г. і хроніка дзейнасці Маскоўскага таварыства беларускай культуры імя Ф. Скарыны (Вып. 1, 2). Выданне ілюстравана рэдкімі фатаздымкамі.

Галіна Сяргеева

"Сустрэчы"

"Сустрэчы" ("Spotkania"), часопіс. Выдаваўся Радай культуры студэнтаў беларускай нацыянальнасці пры Акруговай радзе Згуртавання польскіх студэнтаў у Варшаве. Выходзіў у 1983–1990 гг., усяго апублікавана 13 нумараў. Матэрыялы часопіса прысвечаны пытанням беларускага нацыянальнага руху і грамадска-культурнай дзейнасці беларускіх студэнтаў у Польшчы, беларускай культуры. У кожным нумары змяшчалася хроніка дзейнасці беларускага студэнцкага руху (сустрэчы, грамадска-культурныя мерапрыемствы, вандроўкі па Беласточчыне і г. д.). У "Сустрэчах" пачалі сваю прафесійную дзейнасць многія сучасныя беларускія журналісты Польшчы. Гэта было другое, пасля тыднёвіка "Ніва", афіцыйнае беларускае перыядычнае выданне ў пасляваеннай Польшчы.

Ларыса Языковіч

"Фос"

"Фос" ("Fos", ад грэч. святло), часопіс рэлігійнага характару, орган Праваслаўнага беларускага брацтва св. Кірыла Тураўскага на Беласточчыне. Першы нумар выйшаў у пачатку 1989 г., выданне працягваецца.

Спачатку "Фос" рэдагавалі вучні Вышэйшай праваслаўнай духоўнай семінарыі ў Яблэчне. Часопіс стаў першым праваслаўным выданнем на беларускай мове, якое ўбачыла свет у Польшчы ў пасляваенны час. Размнажаецца з дапамогай ксеракапіравання, тыражом 40–80 экз., распаўсюджваецца ў Польшчы, асабліва на Беласточчыне, частка даходзіць да Беларусі і беларускай дыяспары на Захадзе. Фінансавую дапамогу ў выданні часопіса аказваюць прыватныя асобы ў Польшчы і з краін Захаду. Змяшчае тэалагічныя і гістарычныя артыкулы, агляд рэлігійных і грамадска-палітычных падзей у Польшчы, хроніку беларускага нацыянальнага руху ў краіне. З канца 1989 г. выдаваўся як часопіс праваслаўнай беларускай моладзі, орган Брацтва праваслаўнай моладзі Беластоцка-Гданьскай епархіі, аўтаномны дадатак да "Listu Informacyjnego" ("Інфармацыйнага ліста") — часопіса, які выдавала Брацтва праваслаўнай моладзі Беластоцка-Гданьскай епархіі. З 1990 г. вызначае сябе як квартальнік Брацтва праваслаўнай моладзі Беластоцка-Гданьскай епархіі. Часопіс быў адным з ініцыятараў паломніцтваўвандровак праваслаўнай беларускай моладзі па рэлігійных мясцінах Беласточчыны (праводзяцца з 1989 г.).

Ларыса Языковіч

"Часопіс" ("Czasopis")

Інфармацыйна-культурны часопіс Усходняй Беласточчыны. Орган Аб'яднання беларускіх журналістаў. Выдаецца з красавіка 1990 г. у Беластоку, цяпер у Крынках. Выходзіць штомесячна, друкуецца пры фінансавай падтрымцы Міністэрства культуры і мастацтва Польшчы і фундацыі імя Стэфана Баторыя ў Варшаве. Галоўны рэдактар Ю. Хмялеўскі. У склад рэдакцыйнай калегіі ўваходзяць В. Харужы, С. Іванюк, Ю. Каліна, Д. Сільчык, Ю. Сільчык і інш. Асноўная частка матэрыялаў друкуецца на польскай мове, некаторыя артыкулы і паведамленні — па-беларуску. З выданнем стала супрацоўнічаюць беларускія журналісты, грамадскія дзеячы, даследчыкі П. Бяко, Д. Фёнік, А. Гаўрылюк, С. Яновіч, М. Кандрацюк, А. Латышонак, М. Лукша, А. Мірановіч, С. Назарук, Л. Тарасэвіч, А. Глагоўская, і інш. Часопіс змяшчае на сваіх старонках агляды польскамоўнага і беларускамоўнага перыядычнага друку ў Польшчы, а таксама перыядычнага друку Беларусі, аналізуе палітычныя падзеі ў Польшчы, Беларусі, Расіі, Літве, заходнееўрапейскіх краінах. Шмат увагі надае асвятленню царкоўнага жыцця ў Польшчы і на Беласточчыне, гісторыі праваслаўных прыходаў у краі, змяшчае календары рэлігійных святаў, артыкулы, прысвечаныя рэлігійнай тэматыцы, гісторыі хрысціянства. Значнае месца ў часопісе займаюць праблемы грамадска-палітычнага і культурнага жыцця беларусаў у Польшчы, нацыянальнага жыцця, сацыяльна-эканамічнага і палітычнага становішча беларускай нацыянальнай супольнасці ў Польскай дзяржаве, праблемы эканамічнага стану сучаснай Беласточчыны. Выданне адлюстроўвае вынікі выбараў у парламент і органы мясцовага самакіравання ў Польшчы, у тым ліку і на Беласточчыне. Змяшчаюцца лісты чытачоў, успаміны ўдзельнікаў гістарычных падзей у Польшчы і Беларусі, артыкулы пра дзеячаў беларускай культуры, нататкі пра гміны, вёскі, праваслаўныя прыходы, цэрквы на Беласточчыне, літаратурныя і публіцыстычныя творы беларускіх пісьменнікаў Беласточчыны, дыскусійныя матэрыялы, інтэрв'ю з прадстаўнікамі дзяржаўных улад Польшчы, вышэйшым рэлігійным праваслаўным кіраўніцтвам. Выданне ілюстраванае. Распаўсюджваецца ў Польшчы, дасылаецца на Беларусь, у інш. краіны.

Ларыса Языковіч

"Чырвоны шлях"

Грамадска-палітычны і літаратурны часопіс. Выдаваўся ў Петраградзе з ліпеня па снежань 1918 г. Беларускім аддзелам Камісарыята па справах нацыянальнасцей Саюза камуністаў Паўночнай вобласці (Петраградскім аддзяленнем Беларускага нацыянальнага камісарыята). Выйшла 10 здвоеных нумароў. Рэдактар А. Вазіла (№ 1–4), № 5–10 падпісвала рэдакцыйная калегія. Асвятляў дзейнасць Беларускага нацыянальнага камісарыята, беларускіх секцый РКП(б), пытанні гісторыі, культуры, палітычнага і эканамічнага жыцця. Прапагандаваў ідэю стварэння Беларускай рэспублікі у цеснай сувязі з Расіяй. Негатыўна ставіўся да Беларускай Народнай Рэспублікі, у той жа час крытыкаваў бальшавікоў за гвалтоўны разгон Усебеларускага з'езда 1917 г. у Мінску. Змясціў навуковыя артыкулы Я. Карскага ("Доктар Францішак Скарына"), А. Сержпутоўскага ("Беларуская народнасць і рэлігія", "Да пытання пра беларускую арганізацыю"), П. Каравайчыка ("Пра беларускую літаратурную мову", пад псеўданімам П. Любецкі), Дз. Сабалеўскага ("Беларусь і беларусы"). Упершыню надрукаваў вершы Я. Купалы, аб'яднаныя ў цыкл "Забраны край". Перадрукаваў вершы Цёткі, змясціў замалёўкі А. Сержпутоўскага "Малюнкі Беларусі" (пад псеўданімам Навум Смага), літаратурныя і публіцыстычныя творы І. Баранкевіча (псеўданім Беларус), А. Вазілы, Я. Канчара і інш., вершы Т. Шаўчэнкі ў перакладзе на рускую мову А. Сержпутоўскага. Змяшчаў "Галерэю беларускіх паэтаў, пісьменнікаў і вучоных". Друкаваў рэцэнзіі на беларускія навуковыя і публіцыстычныя выданні ("Асноўныя моманты гісторыі Беларусі" М. Любаўскага, "Руска-беларускі слоўнік" М. і Г. Гарэцкіх, "Матчын дар" А. Гаруна, "Прамову на Усебеларускім з'ездзе" А. Вазілы і інш.) Архіўныя дакументы часопіса зберагаюцца ў Расійскім дзяржаўным архіве літаратуры і мастацтва і Расійскім дзяржаўным архіве Санкт-Пецярбурга.

Віталь Скалабан


Аблажэй Алег


Алфёраў Жарэс


Аляшкевіч Мікалай


Анішчык Аляксей


Анцукевіч Мікалай


Артымовіч Надзея


Астраумава Маргарыта


Багдановіч Адам


Байкачоў Міхаіл


Балакіна Раіса


Балаховіч Андрэй


Балаховіч Хрысціна


Баркоўскі Алесь


Барташэвіч Альберт


Баршчэўская Ніна


Баршчэўскі Аляксандр


Брадоўскі Леан


Брайцаў Якуб


Буры Мікалай


Бучэль Таццяна


Бушко Мікалай


Бялыніцкі-Біруля Вітольд


Валасовіч Канстанцін


Валодзька Станіслаў


Вальтар Віктар


Вараняева Ларыса


Варона Валерый


Вількіцкі Андрэй


Вольскі Аркадзь


Вуек Зыгмунт


Гаданьчук Ірына


Гайдук Лідзія


Гайдук Мікола


Гайдук Уладзімір


Галавачоў Павел


Галавачоў Пётр


Галуза Уладзімір


Гарэцкі Усяслаў


Гаўрылюк Андрэй


Гаштальд Тадэвуш


Гіль Юрый


Глагоўская Алена


Глод Аляксандр


Грыцкевіч Валянцін


Дзяржыцкі Уладзімір


Дубяга Зміцер


Дыбоўскі Бенядзікт


Езавітаў Кастусь


:Жалтоўскі Іван


Жамойцін Янка


Жыбрык Ніна


Зенюк Янка


Зялёнка Станіслаў


Зяльдовіч Якаў


Зямкевіч Рамуальд


Іванюк Ганна


Каваленка Надзея


Кавалеўскі Восіп


Казакоў Міхаіл


Казарскі Аляксандр


Калінковіч Мікалай


Кальвіш Зоя


Камароў Яўген


Камароўскі Георгій


Канапацкі Мацей


Капцюг Валянцін


Капчык Пятрусь


Каратынскі Вінцэсь


Карнейчук Мікалай


Карповіч Алесь


Клімук Пётр


Копа Сцяпан


Крупенька Аркадзь


Кузняцоў Сяргей


Кузьменка Уладзімір


Кулікоў Сяргей


Куптэль Міхась


Лех Геннадзь


Луба Віталь


Лукашэвіч Юзаф


Львовіч Мая


Максімюк Ян


Мандэльштам Леанід


Марцінкенене Юзэфа


Матышэўскі Павел


Маханько Віталь


Мекін Чэслаў


Меркін Генадзь


Мігдал Аркадзь


Міканенка Валерый


Мілаш Леакадзія


Мінкін Алег


Міранавіч Антон


Міронава Ніна


Міхалеўскі Серафін


Мялешка Міхась


Навумавец Антон


Нарбут Андрэй


Наркевіч Альгерд


Нарушэвіч Алена


Нюнька Хведар


Паўловіч Мікалай


Петручук Васіль


Пігулеўскі Уладзімір


Піліпенка Міхаіл


Піскунова Валянціна


Плуг Адам


Прудніка ў Іван


Пятрунніка ў Аляксандр


Рудкоўскі Барыслаў


Рулінскі Мікалай


Руткоўскі Браніслаў


Сабалеўскі Антон


Сабэцкая Анна


Савінава Ніна


Сакол Пятро


Саленіекс Эдуардс


Сахарава Вольга


Сахараў Сяргей


Сачко Зося


Сергіевіч Пётра


Сілівончык Анатоль


Снарская Іна


Сосна Грыгорый


Станкевіч Здзіслаў


Стэповіч Вітаўт


Сулкоўскі Мікалай


Сухі Павел


Сычэўскі Янка


Сэнюх Чэслаў


Трафімук Андрэй


Ціхаў Гаўрііл


Улашчык Аляксандр


Улашчык Мікалай


Урбан Галіна


Усцілоўскі Георгій


Хвісюк Мікалай


Хмялеўскі Міхась


Худаба Чэслаў


Целеш Вячка


Церахаў Мікалай


Чарнякевіч Яніна


Чыквін Ян


Чэрскі Іван


Шакавец Лявон


Шаховіч Ігар


Шаховіч Міхась


Швед Віктар


Шклярэўскі Ігар


Шміт Ота


Шугля Уладзімір


Шутаў Сцяпан


Шутовіч Янка


Шчавінская Ларыса


Шыраеў Яўген


Якубоўскі Іван


Якубук Пётр


Яновіч Сакрат


Ярмалковіч Віктар


Яцкевіч Мечыслаў









Беларускія выданні ў Латвіі



Ансамбль “Купалінка” беларускага таварыства “Уздым” на днях беларускай культуры (Даўгаўпілс, Латвія)



Беларускі вечар у Даўгаўпілсе (Латвія)



Беларускі ансамбль “Надзея” таварыства “Прамень” (Рыга, Латвія)







Беларускія выданні ў Літве



Беларусы і госці на “Villa Sokrates”
(Беласточчына, Польшча)







Беларускія выданні ў Польшчы



Гурт беларускай народнай песні “Маланка” — шматразовы лаўрэат Фестывалю беларускай песні ў Беластоку (Польшча)



Пячатка беларускай суполкі Новасібірска



Ансамблі “Чабор” і “Крыніца” на святе “Дзень горада” (Калінінград, Расія)



Беларуская суполка Іркуцка на святе сустрэчы вясны (Расія)



Тут пахаваны беларускія гулагаўцы ў Комі



Фальклорны ансамбль “Чабор” п. Вялікая Паляна Гвардзейскага р-на Калінінградскай вобл. (Расія)



Беларускае выданне ў Маскве



Беларусы Севастопаля сабраліся на пасяджэнне


За нашану радзімаму слову
Ушануюць нас браця-народы!

ГАЛІЦКАЯ РУНЬ

Адзіная, незалежная беларуская штодзённая газета Украіны

Выдаецца з траўня 1998 года у Львове

№ 1(0) травень 1998 г.

Заснавальнік Барыс Цімашенка

Памянем гэтыя імёны

Віншаванне

Беларускія выданні на Украіне


Григорій Півторак

Білоруська мова

Підручник


Грунвальд

Другая Беларусь


Уладзімер Дзехцярук

СЯРОД БЕЛЫХ ЭСТОНСКІХ НАЧЭЙ

Згуртаваньня Беларускай Культуры "БЭЗ"

Беларускія выданні ў Эстоніі


Уладзімер Дзехцярук

СЯРОД БЕЛЫХ ЭСТОНСКІХ НАЧЭЙ

Згуртаваньня Беларускай Культуры "БЭЗ"

Беларусы ў Эстоніі



Беларуская суполка "БЭЗ" (Эстонія)



IV. Персаналіі

Аблажэй Алег

***Аблажэй Алег** (6.5.1954, в. Лезнявічы Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл.), мастак.*

У 1977 г. А. Аблажэй закончыў Віцебскі педагагічны інстытут па спецыяльнасці чарчэнне і маляванне. Потым — служба ў арміі. У 1985 г. скончыў Вільнюскі дзяржаўны мастацкі інстытут (цяпер акадэмія) па спецыяльнасці графіка.

Сёння А. Аблажэй шырока вядомы як мастак, займаецца жывапісам, акварэллю, ілюструе кнігі. У яго афармленні выйшлі ў Беларусі творы В. Жуковіча "Гуканне вясны", Д. Бічэль-Загнетавай "Гараднічанка", у Маскве — "Шведскія казкі", творы Э. Хэмінгуэя, "Сербская паэзія", у Вільнюсе — "Казка пра Султана" і інш. А нядаўна ў польскім выдавецтве "Эліпса" ўбачыла свет і яго ўласная кніга на польскай мове "Сем казак пра каралеўнаў", ім самім жа і афармленая, — яна хутка стала бібліяграфічнай рэдкасцю. У 1984–1986 гг. у Літве выдадзена серыя канвертаў з партрэтамі літоўскіх дзеячаў, афармленая А. Аблажэм, а таксама серыя паштовак. Ён — мастацкі рэдактар газеты "Рунь", піша для яе сатырычныя фельетоны, мастацкі афарміцель дзіцячага часопіса "Лола", малюе таксама партрэты вядомых дзеячаў, краявіды. Любімая яго тэма — жанчына ў фантастычных строях і проста жанчына. Яго працы выстаўляліся неаднаразова ў Літве, Польшчы, Германіі, Эстоніі, Латвіі, Беларусі.

У Літве А. Аблажэя добра ведаюць не толькі як мастака, але і як грамадскага дзеяча. Ён прымаў актыўны ўдзел у дзейнасці "Саюдзіса", супрацоўнічае з беларускімі арганізацыямі Вільнюса. Член рады Таварыства беларускай культуры, суполкі мастакоў краін Балтыі "Маю гонар". Узнагароджаны літоўскім медалём "За падзеі 13-га студзеня".

Леакадзія Мілаш (Вільнюс)

Абламовіч Ігнацій

***Абламовіч Ігнацій Карлавіч** (1787, Слонім – 1847, Кіеў), фізік, прафесар.*

І. Абламовіч паходзіў са шляхецкага роду. Нарадзіўся ў сям'і слонімскага ваяводы. У 1804 г. паступіў у настаўніцкую семінарыю пры Віленскім універсітэце. У званні магістра філасофіі, якое ён атрымаў у 1806 г., быў накіраваны на работу ў Мінскую класічную гімназію, дзе з 1808 г. быў выкладчыкам хіміі, фізікі і натуральнай гісторыі. У 1810 г. быў запрошаны ў Віленскі універсітэт памочнікам загадчыка фізічнага кабінета. З верасня 1813 г. — выкладчык фізікі, хіміі і натуральнай гісторыі Віленскай гімназіі, з верасня 1817 г. — ад'юнкт-прафесар хіміі ў Віленскім універсітэце. У 1818 г. камандзіраваны ў Парыж для ўдасканалення ведаў у фізіцы, хіміі і натуральнай гісторыі (стажыроўка працягвалася да 1824 г.). Пасля вяртання ў 1827 г. прызначаны выкладчыкам фізікі і прыродазнаўства Валынскага ліцэя, затым пераведзены ардынарным прафесарам фізікі ў Кіеўскі універсітэт (1834–1837). Звольнены ў 1837 г. у сувязі з выслугай гадоў.

На працягу многіх гадоў І. Абламовіч быў сябрам Вучонага камітэта Кіеўскага універсітэта. Арганізаваў там фізічны кабінет, праводзіў са студэнтамі метэаралагічныя назіранні. Аўтар праектаў "Па часці тэхналогіі для вучылішчаў" і пакінутага ў рукапісе дапаможніка "Падрабязны канспект курса тэхналогіі, які мае быць выкладзены ў універсітэце". Узнагароджаны ордэнам св. Анны 3-й ступені (1837) за 25 гадоў выдатнай службы.

Вольга Гапоненка

Абрамоўскі Станіслаў

***Абрамоўскі (Абрамаўскас) Станіслаў (Стасіс)** (16.10.1927, в. Нявошы Лідскага пав. Навагрудскага ваяв., цяпер в. Зарэчча Воранаўскага р-на Гродзенскай вобл.), інжынер, гісторык мастацтва, архітэктар. Заслужаны архітэктар Літвы (1977).*

С. Абрамоўскі ў 1950 г. скончыў Каўнаскі універсітэт. У 1950–1970 гг. працаваў выкладчыкам у Каўнаскім політэхнічным інстытуце, з 1970 г. — выкладчык Віленскага інжынерна-будаўнічага інстытута, дацэнт. У 1965 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме "Развіццё мураванага будаўніцтва ў Літве ў XШ–XV стст.". Займаўся вывучэннем архітэктурных помнікаў Літвы.

С. Абрамоўскі апублікаваў навуковыя працы і артыкулы аб архітэктурным ансамблі ў Цітувенай, Медзінінкайскім замку, архітэктуры Каўнаса. Пісаў пра будаўніцтва Тракайскага замка, утварэнне г. Тракай і

яго абаронную сістэму і інш. Аўтар праектаў некалькіх населеных пунктаў у Таўрагскім і Кельменскім р-нах Літвы.

Яніна Кісялёва

Агрызка Іасафат

Агрызка Іасафат Пятровіч *(1826, Лепельскі пав. Віцебскай губ., па іншых крыніцах, Мінскай губ. — 18.3.1890, Іркуцк, Расія), выдавец, журналіст, удзельнік грамадскага і рэвалюцыйна-вызваленчага руху 1860-х г.*

Нарадзіўся І. Агрызка ў небагатай шляхецкай сям'і. Закончыў Лепельскае павятовае вучылішча (1841), Мінскую гімназію (1844), дзе паказаў выдатныя веды па рускай мове і быў удастоены права на атрыманне чына XIV класа. У 1845 г. паступіў на юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта, які скончыў са ступенню кандыдата права (1849). З 1850 г. — на службе ў кадыфікацыйнай камісіі (камісіі па рэвізіі і складанню законаў) Царства Польскага. У 1857 г. пераведзены ў Дэпартамент горных і саляных спраў. З 1861 г. працаваў у Дэпартаменце падаткаў і збораў Міністэрства фінансаў, а ў лютым 1863 г. быў прызначаны яго віцэ-дырэктарам, займаў іншыя высокія пасады.

І. Агрызка актыўна займаўся літаратурна-выдавецкай дзейнасцю. Заснаваў у 1858 г. у г.Каломне друкарню (з 1861 г. друкарня была перанесена ў Пецярбург) і са студзеня 1859 г. выдаваў там на польскай мове газету польскага рэвалюцыйнага камітэта ў Пецярбургу "Slowo" (выдавалася да 21 лютага, забаронена царскім урадам). У тыпаграфіі І. Агрызкі друкаваліся часопісы "Архитектурный вестник", "Журнал Министерства народного просвещения", "Горный журнал", "Народная беседа", "Солдатская беседа", некаторыя выданні Пецярбургскай акадэміі навук, розных навуковых таварыстваў Расіі, кнігі па гістарычных, эканамічных, юрыдычных навуках, падручнікі і навучальныя дапаможнікі (усяго ў 1858–1864 гг. надрукавана больш за 100 назваў кніг). Выдаў некаторыя тамы "Матэрыялаў для геаграфіі і статыстыкі Расіі, сабраных афіцэрамі Генеральнага штаба" (па Віленскай, Гродзенскай губ., 1861–1863 гг. перавыдаў зборы старажытных законаў Рэчы Паспалітай "Volumina Legum" (1859—1860, т. 1–8.), двухтомны зборнік літаратурных твораў польскіх аўтараў "Pismo zbiorowe" (1859), першы збор твораў М. Дабралюбава (1862, т. 1–4.) і інш.

У студэнцкія гады І. Агрызка ўключыўся ў грамадскі рэвалюцыйны рух, прымыкаў да гуртка З. Серакоўскага, польскай рэвалюцыйнай арганізацыі ў Пецярбургу. Падтрымліваў цесныя сувязі з М. Чарнышэўскім, з рэвалюцыйным таварыствам "Зямля і воля". У час паўстання 1863–1864 гг. прызначаны галоўным прадстаўніком Варшаўскага ўрада ў Пецярбургу. 14 лістапада 1864 г. арыштаваны і прыгавораны да пакарання смерцю (у 1865 г. прыгавор быў заменены на 20 гадоў катаргі). У 1871 г. І. Агрызка быў вызвалены з турмы і пакінуты ў Якуцку пад наглядам паліцыі, потым пераведзены ў Верхняленск. Займаўся там сельскай гаспадаркай, вучыў глебазнаўству мясцовых жыхароў. Апошнія гады жыцця правёў у Іркуцку пад асобым наглядам паліцыі і генерал-губернатара Усходняй Сібіры.

Пахаваны ў Іркуцку.

Генадзь Кісялёў

Адамовіч Юрый

Адамовіч Юрый Леапольд *(2.11.1908, Мінск – 1939), заолаг.*

Ю. Адамовіч скончыў гімназію ў Мінску (1930) і Пазнанскі універсітэт (1934). У 1936 г. атрымаў у Познані ступень магістра філасофіі па спецыяльнасці заалогія і параўнальная анатомія. З 1933 г. працаваў дэманстратарам, а з 1934 г. — асістэнтам кафедры заалогіі Пазнанскага універсітэта.

Праводзіў даследаванні флоры і фаўны Палесся, цікавіўся пытаннямі экалогіі. Быў абраны членам Пазнанскага таварыства сяброў навукі.

Загінуў у верасні 1939 г. пры спробе перайсці мяжу паміж Польшчай і СССР.

Вольга Гапоненка

Азарэвіч Дзмітрый

Азарэвіч Дзмітрый Іванавіч *(1.10.1848, г. Горы-Горкі Магілёўскай губ., цяпер раённы цэнтр Магілёўскай вобл. – 1912, Варшава), юрыст, гісторык рымскага права, прафесар.*

Нарадзіўся Дз. Азарэвіч ў сям'і прафесара заканадаўства Горы-Горацкага земляробчага інстытута. Пачатковую адукацыю атрымаў у пецярбургскай Анненскай школе. Скончыў з залатым медалём 3-ю Пецярбургскую

гімназію (1866), юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта (1870). У 1872 г. абараніў у Пецярбургскім універсітэце магістэрскую дысертацыю "Аб розніцы паміж апекай і папячыцельствам па рымскаму праву". З 1874 г. працаваў надзвычайным прафесарам у Дзямідаўскім юрыдычным ліцэі (Яраслаўль). У 1877 г. у Новарасійскім універсітэце абараніў дысертацыю "Прэкарыум па рымскаму праву" і атрымаў ступень доктара юрыдычных навук. У 1882 г. быў абраны прафесарам кафедры рымскага права Новарасійскага універсітэта, у 1887 г. — прафесарам грамадзянскага судовага будаўніцтва і судовага справаводства Варшаўскага універсітэта.

Навуковыя працы Д. Азарэвіча прысвечаны гісторыі і практыцы рымскага права. Першыя навуковыя даследаванні ён выканаў у студэнцкія гады. За даследаванне "Аб дагаворы даверанасці" быў узнагароджаны праўленнем Пецярбургскага універсітэта залатым медалём. Сярод асноўных навуковых прац вучонага — "Аб розніцы паміж апекай і апякунствам па рымскаму праву" (СПб., 1872), "Патрыцыі і плебеі ў Рыме" (СПб., 1875), "Гісторыя візантыйскага права" (Яраслаўль, 1876–1877. Ч. 1–2.), "Прэкарыум па рымскаму праву" (Яраслаўль, 1877), "Антычны свет і хрысціянства" (Яраслаўль, 1880), "Сістэма рымскага права" (СПб.; Варшава, 1887–1889. Т. 1–3).

Вольга Гапоненка

Алейнікаў Пётр

Алейнікаў Пётр Марцінавіч *(12.7.1914, в. Крывель Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл. — 9.6.1965), рускі кінаакцёр.*

П. Алейнікаў паходзіў з беднай сялянскай сям'і. Бацька яго працаваў лесасплаўшчыкам на Дняпры, праваліўся ў халодную ваду, захварэў і памёр. Пяцігадовы Пётр пайшоў жабраваць. Бадзяўся, часта начаваў на лаўцы ў шклоўскім гарадскім парку, на чыгуначным вакзале. Гадаваўся ў Шклоўскай школе-інтэрнаце, Барсукоўскай дзіцячай калоніі, Першай усебеларускай камуне імя 10-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Там кіраваў гуртком мастацкай самадзейнасці, рана праявіў акцёрскія здольнасці. У 1930 г. атрымаў сярэднюю адукацыю і вытрымаў конкурс (1 тыс. абітурыентаў на 40 месцаў) у Ленінградскі інстытут сцэнічных мастацтваў. Вучыўся на кінематаграфічным аддзяленні ў рэжысёра, драматурга і тэарэтыка кіно С. Герасімава. У яго фільме "Сямёра смелых" П. Алейнікаў зняўся ў ролі Пецькі Малібогі. Поспех быў сенсацыйным. Папулярнасць акцёра замацавалі фільмы "Вялікае жыццё", "Трактарысты", "Аляксандр Пархоменка", "Глінка" (цудоўна сыграў ролю Пушкіна). Затым доўгія гады П. Алейнікава не запрашалі на здымкі. Каб зарабіць на жыццё, ён быў вымушаны ездзіць па краіне і выступаць на эстрадзе. Пры гэтым часта наведваў Шклоўшчыну. Спадзяваўся вярнуцца ў кіно. Апошнім фільмам П. Алейнікава была стужка "Наталенне смагі" ("Туркменфільм", 1965).

Нягледзячы на шырокае прызнанне, П. Алейнікаў не меў ніякіх званняў, яго імя не згадваецца ў "Большой Советской Энциклопедии". На радзіме П. Алейнікава, у в. Крывель, на падмурку хаты, дзе нарадзіўся акцёр, збудаваны дом-музей. Адкрыты 12 ліпеня 1998 г. Адна частка музея — краязнаўчая, пра в. Крывель, другая прысвечана славутаму акцёру беларусу.

Сын П. Алейнікава Тарас працаваў да выхаду на пенсію кінааператарам навукова-папулярнага кіно ў Маскве. Дачка Арына жыве ў ЗША.

Вацлаў Мацкевіч

Алфёраў Жарэс

Алфёраў Жарэс Іванавіч *(15.3.1930, г.Віцебск), фізік, сапраўдны член Расійскай акадэміі навук (1979; член-карэспандэнт з 1972). Замежны член НАН Беларусі (1995). Лаўрэат Нобелеўскай прэміі (2000).*

Бацькі Ж. Алфёрава, Іван Карпавіч і Ганна Уладзіміраўна, нарадзіліся і жылі ў Беларусі. Бацька ўдзельнічаў у Кастрычніцкай рэвалюцыі, у чая грамадзянскай вайны камандаваў палком, быў адным з кіраўнікоў цэлюлозна-папяровай прамысловасці былога СССР. На момант нараджэння сына Жарэса — дырэктар аднаго з заводаў у Віцебску. Потым сям'я выехала ў Расію, вярнулася ў Беларусь пасля вайны. Ж. Алфёраў вучыўся ў СШ № 42 г. Мінска, дзе фізікай захапіў яго настаўнік Я. Мельцэрзон. Закончыўшы ў 1947 г. з залатым медалём сярэднюю школу, паступіў у Беларускі політэхнічны інстытут, а потым перавёўся ў Ленінградскі электратэхнічны інстытут, які закончыў на выдатна ў 1952 г. З 1953 г. працуе ў Фізіка-тэхнічным інстытуце імя А. Іофе АН СССР (цяпер Расійская акадэмія навук), з 1973 г. — загадчык лабараторыі, з 1987 г. — дырэктар. Адначасова з 1972 г. — прафесар кафедры оптаэлектронікі Ленінградскага электратэхнічнага інстытута (цяпер Санкт-Пецярбургскі электратэхнічны універсітэт), дэкан арганізаванага ім фізіка-тэхнічнага факультэта Ленінградскага палітэхнічнага інстытута. З 1989 г. — старшыня Прэзідыума Санкт-Пецярбургскага навуковага цэнтра Расійскай акадэміі навук. У 1991 г. абраны віцэ-прэзідэнтам РАН

Навуковыя даследаванні Ж. Алфёраў праводзіць у галіне фізікі паўправаднікоў, паўправадніковай і квантавай электронікі, тэхнічнай фізікі. Свае першыя навуковыя даследаванні па фотаправоднасці тэлурыда вісмута ён выканаў у студэнцкія гады. Прымаў дзейсны ўдзел у стварэнні першых айчынных транзістараў, фотадыёдаў, магутных германіевых выпрамляльнікаў. Даследаванні ў гэтым кірунку абагульнены ў кандыдацкай дісертацыі, якую ён паспяхова абараніў у 1959 г.

У 1967 г. Ж. Алфёраў сумесна з калегамі стварыў у сістэме AlAs-GaAs гетэраструктуры, блізкія па сваіх уласцівасцях да ідэальнай мадэлі паўправадніковага лазера, а потым і першы паўправадніковы гетэралазер, які працаваў у неперапынным рэжыме пры пакаёвай тэмпературы. У 1970 г. прапанаваў ідэальны пераход шматкампанентных злучэннях InGaAsP і стварыў лазеры на іх аснове, якія знайшлі шырокае выкарыстанне ў якасці крыніц выпраменьвання ў валаконна-аптычных лініях сувязі павялічанай адлегласці. Адкрыў з'явы звышінжэкцыі, электроннага і аптычнага абмежавання ў гетэраструктурах і паказаў, што ў паўправадніковых гетэраструктурах можна прынцыпова па-поваму кіраваць электроннымі і светлавымі патокамі. Стварыў "ідэальныя" паўправадніковыя гетэраструктуры. Гэта дазволіла кардынальна палепшыць параметры большасці з вядомых паўправадніковых прыбораў і стварыць прынцыпова новыя прыборы, перспектыўныя для выкарыстання ў аптычнай і квантавай электроніцы. Даследаваннямі Ж. Алфёрава практычна закладзены асновы прынцыпова новай электронікі на падставе гетэраструктур з шырокім дыяпазонам прымянення, якая вядома сёння як "зонная інжынерыя". Вынікі даследаванняў гетэрапераходаў у паўправадніках Ж. Алфёраў абагульніў у доктарскай дысертацыі, якую паспяхова абараніў у 1970 г. Некаторыя вынікі яго фундаментальных прац ляглі ў аснову новых навуковых і тэхнічных накірункаў, у тым ліку — буйнамаштабнай вытворчасці сонечных элементаў для касмічных батарэй (адна з іх была ўстаноўлена ў 1986 г. на базавым модулі касмічнай станцыі "Мір" і дзейнічала на арбіце ўвесь тэрмін эксплуатацыі без відавочнага памяньшэння магутнасці).

З 1983 г. прыарытэтны кірунак навуковых даследаванняў — сінтэз і даследаванне уласцівасцей нанаструктур паменшанага памеру (квантавых дратоў і квантавых кропак). У 1993–1994 гг. упершыню сумесна з вучнямі рэалізаваў гетэралазер на аснове структур з квантавымі кропкамі — "штучнымі атамамі".

Акадэмік Ж. Алфёраў — аўтар больш за 500 навуковых прац, у тым ліку 3 манаграфій, больш за 50 вынаходніцтваў. Сярод яго вучняў 48 кандыдатаў і 15 дактароў навук. За фундаментальныя даследаванні ў галіне гетэрапераходаў у паўправадніках і стварэнне на іх аснове новых прыстасаванняў Ж. Алфёраву прысуджана Ленінская прэмія СССР (1972), Дзяржаўная прэмія СССР (1984). Ён узнагароджаны залатым медалём Франклінскага інстытута ЗША (1971). У 2000 г. яму (сумесна з амерыканскімі вучонымі) была прысуджана Нобелеўская прэмія ў галіне фізікі. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Расійскай Федэрацыі "За заслугі перад Айчынай" II ступені.

З'яўляецца галоўным рэдактарам часопіса "Письма в журнал теоретической физики", членам рэдакцыйнай калегіі часопіса "Физика и техника полупроводников", старшынёй Савета па фізіцы і хіміі паўправаднікоў Расійскай АН, сябрам Еўрапейскага фізічнага таварыства.

У навуковым супрацоўніку акадэмік Ж. Алфёраў больш за ўсё цэніць "уменне выбраць перспектыўны кірунак, смеласць ў гэтым выбары, цярпліваць і настойлівасць, калі няма хутка бачных поспехаў у яе правядзенні".

Вольга Гапоненка

Альтшулер Аляксандр

Альтшулер Аляксандр Якаўлевіч *(псеўд. Альтуці; сакавік 1870, Полацк – чэрвень 1950, Масква), артыст оперы, рэжысёр і педагог. Заслужаны артыст РСФСР і Украінскай ССР.*

З пяці гадоў жыў у Пярмі. Займаўся ў мясцовым музычна-драматычным гуртку, дзе выступаў у канцэртах пад акампанемент С. Дзягілева. Першыя ўрокі вакалу браў у вядомага педагога Кабелы. У 1888 г., пры матэрыяльнай падтрымцы пермскай грамадскасці, паехаў у Маскву, дзе вучыўся ў Музычна-драматычным вучылішчы. Па яго заканчэнню ў 1893 г. дэбютаваў пад псеўданімам Альтуці ў маскоўскай Італьянскай оперы (працаваў разам з Л. Собінавым). У 1894–1912 гг. спяваў на оперных сцэнах Казані, Астрахані, Екацерынбурга; у 1907 і з 1912 г. — Варонежа, Іркуцка; з 1908 г. — Пярмі, Саратава; пасля 1917 г. — Адэсы, Баку, Растова-на-Доне; у 1920–1924 гг. — Харкава; у 1925–1926 гг. — Пярмі. Займаўся таксама рэжысурай. Сярод яго пастановак — "Аіда", "Жыд", "Кармэн" (першая пастаноўка ў Екацерынбургу). З 1930 г. — суфлёр Вялікага тэатра. Запісваўся на грампласцінкі. Узнагароджаны ордэнамі "Герой працы" (1923) і "Знак Пашаны" (1937). Пра А. Альтшулера ёсць звесткі ў кнізе ўспамінаў А. Пазоўскага "Запіскі дырыжора" (М., 1968).

Алесь Карлюкевіч

Альтшулер Сямён

Альтшулер Сямён Аляксандравіч *(24.9.1911, Віцебск – 24.1.1983, Казань), фізік, член-карэспандэнт АН СССР (1976).*

С. Альтшулер скончыў Казанскі універсітэт (1932), у якім працаваў з 1935 г. У 1955 г. быў абраны прафесарам.

Навуковыя даследаванні С. Альтшулера прысвечаны радыёспектраскапіі і парамагнетызму, у прыватнасці, ядзернаму магнетызму. У 1934 г. сумесна з І. Тамам выказаў ідэю аб існаванні ў нейтрона магнітнага моманту і дакладна вызначыў яго знак і велічыню. У 1948 г. вызначыў уплыў звыштонкіх магнітных узаемадзеянняў на спектры электроннага парамагнітнага рэзанансу. Высунуў тэорыю акустычнага парамагнітнага рэзанансу (1952). Прапанаваў метад атрымання звышнізкіх тэмператур, які заснаваны на адыябатыўным размагнічванні ядзерных спінаў ванфлекаўскіх парамагнетыкаў.

Вольга Гапоненка

Аляшкевіч Мікалай

Аляшкевіч Мікалай *(4.5.1920, в. Катлова Навагрудскага пав. Навагрудскага ваяв., цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл.), інжынер воднага будаўніцтва.*

М. Аляшкевіч паходзіць з беларускай сялянскай сям'і. У 1934 г. закончыў пачатковую школу ў роднай вёсцы Катлова. Да 1939 г. працаваў на бацькоўскай гаспадарцы, займаўся пчалаводствам. Вучыўся ў сярэдняй школе. Затым, пры савецкай уладзе, кіраваў хлебапякарнямі ў Навагрудку. У 1941–1944 гг. працаваў у Баранавічах на чыгунцы. У 1944 г. выехаў з сям'ёй у Польшчу, пасяліўся ў Гданьску. Працаваў фатографам у Цэнтральным архіве Войска польскага. У 1947–1950 гг. займаўся фатаграфіяй, меў прыватнае атэлье. Пасля яго закрыцця ўладамі вучыўся ў агульнаадукацыйным ліцэі ў Гданьску. У 1957 г. скончыў факультэт воднага будаўніцтва ў Гданьскім палітэхнікуме. Да 1985 г. працаваў у Інстытуце воднага будаўніцтва Польскай акадэміі навук у Гданьску. Займаўся даследаваннем марскога будаўніцтва ў галіне дынамікі мора.

М. Аляшкевіч — аўтар шматлікіх артыкулаў па праблемах выкарыстання энергіі ветравага хвалявання мора, працэсаў узаемадзеяння ветравых хваляў з гідратэхнічнымі пабудовамі, уплыву масы вады на велічыню і характар удару марскіх хваляў, метадалогіі гідраўлічных даследаванняў прасторавага хвалявання. Яго публікацыі друкаваліся на старонках навуковых выданняў Польшчы, ЗША, Германіі, Японіі. Сярод іх "Методыка даследаванняў уплыву скалавых эфектаў у гідраўлічных даследаваннях працэсаў хвалевага ўдару" (у сааўтарстве), "Рухомы паглынальнік хваляў, які забяспечвае порт перад хваляваннем" і інш. Вынікі даследаванняў М. Аляшкевіча былі выкарыстаны на практыцы ў водным будаўніцтве, у тым ліку пры будаўніцтве Паўночнага порта ў Гданьску. У 1980 г. наш суайчыннік удзельнічаў у распрацоўцы праблемы выкарыстання ракі Сенегал у Афрыцы.

У 1973 г. М. Аляшкевіч атрымаў спецыяльную ўзнагароду старшыні ПАН і Міністэрства навукі, Вышэйшай адукацыі і тэхнікі за ўдзел у распрацоўцы метадаў матэматычнага і фізічнага мадэлявання натуральных працэсаў узаемадзеяння ветравых хваляў з марскім берагам і штучнымі абмежаваннямі. У 1983 г. атрымаў адзнаку "Заслужаны для Гданьскай зямлі" за асаблівыя заслугі ў развіцці свайго рэгіёна.

Жыве ў Гданьску.

Алена Глагоўская (Гданьск, Польшча)

Анішчык Аляксей

Анішчык Аляксей Сцяпанавіч *(псеўд. Сцяпанаў, Андрэй Чэмер, А. Шпак і інш.; 19.7(1.8).1912, хут. Мондзіна Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл.), педагог, журналіст, паэт, грамадскі і культурны дзеяч, эканаміст.*

Восенню 1924 г. А. Анішчык быў прыняты ў Навагрудскую беларускую гімназію, якая аказала вялікі ўплыў на фарміраванне яго асобы. Пасля вучобы на эканамічным факультэце Пазнанскага універсітэта (1930–1935) атрымаў дыплом магістра эканамічных навук. Працаваў у Псіхатэхнічным інстытуце ў Катавіцах, кіраваў там курсамі для інжынераў і тэхнікаў. У верасні 1939 г. абараняў Варшаву. Пасля пераходу ў БССР настаўнічаў у Навагрудку, быў дырэктарам школы на Беласточчыне. У час нямецкай акупацыі зноў займаўся педагагічнай работай на Навагрудчыне — у в. Уселюб, у Беларускай настаўніцкай семінарыі ў Навагрудку, а таксама рэдагаваў газету "За праўду" і загадваў мясцовай друкарняй. У маі—чэрвені 1944 г. быў запрошаны працаваць у акупацыйным

сектары радыёперадач і ў рэдакцыю часопіса "Узвышша" (Мінск). Выступаў на Другім Усебеларускім кангрэсе 1944 г. Пры адступленні гітлераўскія ўлады вывезлі яго на прымусовыя работы ў Германію. Пасля фашысцкай няволі з мая 1945 г. быў на журналісцкай і выдавецкай рабоце ў ПНР: рэдактарам газеты "Trybuna robotnicza" (Катавіцэ), арганізатарам-выдаўцом часопіса "Kupiec Polski" (Кракаў), супрацоўнікам газеты "Słowo Polskie", дырэктарам выдавецтва "Czytelnik" (Вроцлаў), кіраўніком яго аддзела (Шчэцін).

У красавіку 1948 г. А. Анішчык быў арыштаваны органамі МДБ і вывезены ў Мінск. Прыгавораны да расстрэлу, які замянілі на 25 гадоў у лагеры строгага рэжыму. Пасля смерці Сталіна А. Анішчык быў вызвалены, але затым паўторна арыштаваны і прысуджаны Вярхоўным судом Комі АССР па арт. 58 КК РСФСР да 10 гадоў пазбаўлення волі і 5 гадоў паражэння ў грамадзянскіх правах. Лагерныя этапы расцягнуліся на 14 гадоў: 9 — у Пячорлагу каля Варкуты (Запаляр'е), 5 — у Дубраўлагу (Мардовія). Вярнуўся на бацькаўшчыну ў 1962 г. Працаваў эканамістам у Навагрудскім р-не, Лідзе, Вільнюсе, дзе напярэдадні выхаду на пенсію займаў адказную пасаду ў адным з праектна-канструктарскіх інстытутаў. А. Анішчык — адзін з арганізатараў беларускага грамадска-культурнага жыцця ў Літве. Сябра рады арганізацыі беларусаў Віленшчыны "Сябрына". Прымаў актыўны ўдзел у стварэнні і дзейнасці Таварыства беларускай культуры, Таварыства беларускай школы, Згуртавання палітвязняў-беларусаў, беларускай сярэдняй школы ў Вільнюсе. Удзельнічаў у з'ездах беларусаў Балтыі і іншых мерапрыемствах беларускай дыяспары. Падтрымліваў сувязі з навукоўцамі, прадстаўнікамі грамадскіх і творчых колаў Беларусі і Літвы. Наладжваў экскурсіі ў Вязынку, Жупраны, Ракуцёўшчыну і іншыя гістарычныя мясціны.

Літаратурнай творчасцю А. Анішчык займаўся з гімназічных гадоў. Друкаваў свае творы на старонках заходнебеларускіх часопісаў "Беларускі летапіс", "Калоссе", "Шлях моладзі" (у конкурсе на лепшае апавяданне яго твор "На родным палетку" атрымаў прызавое месца). Асабліва выніковымі для творчасці былі 1990-я гг. Аўтар выдадзеных у Вільнюсе кніг — аўтабіяграфічнай паэмы "Мондзінская балада" (1996), зборнікаў "За калючым дротам" (1996), "Жыццё жывым належыць" (1997, на рус. і пол. мовах), біяграфічнага нарыса "Сяргей Хмара" (1998). Вынікам некалькіх дзесяцігоддзяў збіральніцкай працы з'явілася яго манаграфія "Навагрудская беларуская гімназія" (Вільнюс, 1997). Падрыхтаваў да друку кнігу пра Б. Кіта, зборнік апавяданняў, лірыкі і нарысаў пра Я. Шутовіча, А. Клімовіча, Шнаркевічаў, А. Орса, Т. Стагановіч і іншых дзеячаў беларускай дыяспары ў Вільнюсе і эміграцыі.

Аляксандр Вабішчэвіч

Антановіч Канстанцін

Антановіч Канстанцін Піліпавіч *(1883, в. Ратча Магілёўскай губ., цяпер Магілёўскі р-н – ?) рэвалюцыянер.*

Нарадзіўся К. Антановіч у сялянскай сям'і. У 1905 г. наведваў масоўкі, распаўсюджваў літаратуру на беларускай мове. Выехаўшы ў Сібір, працаваў шахцёрам у Чарамхова пад Іркуцкам, дзе ўступіў у РСДРП. У 1909 г. на губернскай канферэнцыі РСДРП у Іркуцку быў арыштаваны і асуджаны на 4 гады катаржных работ, што было заменена пасяленнем у Якуцкай вобл. Жыў у Якуцку, 1916–1917 гг. — у Іркуцку.

Алесь Баркоўскі (Якуцк)

Анцукевіч Мікалай

Анцукевіч Мікалай Пятровіч *(4(17).2.1892, Ельск Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер цэнтр р-на Гомельскай вобл. – 21.12.1971, Вільнюс), педагог-філолаг, лінгвіст, літаратуразнавец, гісторык.*

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Пасля сканчэння ў 1903 г. народнай школы паступіў спачатку у Мазырскую, а затым у Бабруйскую гімназію, якую скончыў з залатым медалём у 1911 г. Паступіў у Пецярбургскую ваенна-медыцынскую акадэмію, а ў 1912 г., пакінуўшы там вучобу, — у Нежынскі гісторыка-філалагічны інстытут князя Безбародкі, які закончыў у 1919 г. У гэты ж час за кандыдацкую дысертацыю "Гісторыя Турава-Пінскага княства" атрымаў вучоную ступень кандыдата гістарычных навук. Спецыялізаваўся ў галіне старажытнагрэчаскай, лацінскай і царкоўнаславянскай моваў, гісторыі, педагогікі, беларускай і рускай моваў і літаратур. Свабодна валодаў французскай, нямецкай, англійскай, польскай і літоўскай мовамі.

У 1920–1928 гг. працаваў выкладчыкам гісторыі ў Лунінецкім рускім рэальным вучылішчы. З 1928 да 1933 г. — выкладчык лацінскай мовы ў польскай гімназіі ў Стоўбцах. У гэты ж перыяд актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці беларускай суполкі. У 1933 г. запрошаны на работу ў Віленскую беларускую гімназію на пасаду выкладчыка лацінскай мовы і адначасова інспектара па выхаваўчай рабоце. З 1936 да 1938 г. — дырэктар гэтай гімназіі. У 1938 г. за імкненне захаваць навучальны працэс на беларускай мове зняты з пасады і пераведзены выкладчыкам лацінскай мовы ў польскую гімназію ў г. Ломжу пад Варшавай. У 1939 г. арыштаваны як заложнік ад беларускага насельніцтва Усходняй Польшчы. З верасня 1939 і да канца 1942 г. — зноў дырэктар Віленскай беларускай гімназіі. З пачатку 1943 да ліпеня 1944 г. працаваў выкладчыкам лацінскай мовы, педагогікі, логікі і

гісторыі ў Віленскай беларускай настаўніцкай семінарыі. З 1944 да лютага 1945 г. — завуч 6-й Рускай жаночай гімназіі ў Вільнюсе. Затым перайшоў у Вільнюскі педагагічны інстытут як старшы выкладчык кафедры рускай мовы, а ў ліпені 1945 г. быў запрошаны на такую ж пасаду ў Вільнюскі універсітэт. У 1950 г. з-за ідэалагічных абвінавачанняў быў вымушаны пайсці на пенсію.

Асноўная праца М. Анцукевіча — "Слова аб палку Ігаравым" (Вільня, 1938; Вільнюс, 1992). У рукапісах захоўваецца пераклад на рускую мову "Адысеі" Гамера і старажытнагрэчаска-рускі слоўнік, зроблены па гэтым творы, падручнік лацінскай мовы для першых трох класаў рускай гімназіі, падручнік па сінтаксісу рускай мовы для літоўскіх школ, падручнік па педагогіцы для настаўніцкіх семінарый на беларускай мове, збор фальклорных матэрыялаў з беларускага Палесся.

Алесь Анцукевіч (Вільнюс)

Арлоўскі Зянон

***Арлоўскі Зянон** (28.10 (8.11).1871, былы маёнтак Норвідполь Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Мінская вобл.—1948), урач-інфекцыяніст, прафесар Віленскага і Лодзінскага універсітэтаў.*

Нарадзіўся З. Арлоўскі ў шляхецкай сям'і. Пачатковую адукацыю атрымаў дома. У 1882 г. быў прыняты ў другую класічную гімназію ў Вільні, якую скончыў у 1891 г. з залатым медалём. У 1891—1897 гг. вучыўся ў Медыцынскай акадэміі ў Пецярбургу. З 1898 г. працаваў урачом у шпіталі клінікі інфекцыйных хвароб імя Ф. І. Пастарнацкага ў Пецярбургу. У час эпідэміі чумы з кастрычніка 1898 да чэрвеня 1899 г. аказваў медыцынскую дапамогу ў Самаркандзе. У 1902 г. абараніў дысертацыю "Аб уплыве мышьяка на рост і хімічны склад Aspergilli nigri" (Спб., 1902) і атрымаў ступень доктара медыцыны. У 1906 г. абараніў доктарскую дысертацыю і быў пакінуты пры Клініцы дэтальнай паталогіі інфекцыйных хвароб. У 1905—1917 гг. выкладаў курс інфекцыйных хвароб у Вайсковай фельчарскай школе у Пецярбургу, а ў 1906—1917 гг . – у школах дантыстаў. З 1911 г. кіраваў клінікай інфекцыйных хвароб на 150 ложкаў пры школе медыцынскіх сясцер Расійскага Чырвонага Крыжа.

З. Арлоўскі — аўтар прац па праблемах закупоркі крывяносных артэрый (1903), бактэрыялагічнага выяўлення брушного тыфу. Вывучаў карэляцыю ўласцівасцей страўнікавага соку і каліта (т. зв. colitis protozoica). Прапанаваў методыкі распазнавання рака страўніка (1904), першапачатковай стадыі рака лёгкіх (1905). Праводзіў даследаванні паталогіі сэрца і крывяносных сасудаў, выканаў эксперыментальныя даследаванні склероза сасудаў у кроліка (1905—1907). Адзін з ініцыятараў і арганізатараў Аб'яднання польскіх урачоў і прыродазнаўцаў у Пецярбургу. У 20–30 я гг. выкладаў у Віленскім універсітэце, працягваў там ранейшыя даследаванні. Пасля Другой сусветнай вайны выехаў у Польшчу. Жыў Лодзі.

Вольга Гапоненка

Артымовіч Надзея

***Артымовіч Надзея** (18.2.1946. в. Аўгустова Беластоцкага ваяв., Польшча), паэтэса. Сябар Саюза польскіх пісьменнікаў (1985).*

Дзяцінства Н. Артымовіч прайшло ў г. Бельску Беластоцкага ваяв., дзе яна закончыла беларускую пачатковую школу і Беларускі агульнаадукацыйны ліцэй імя Б. Тарашкевіча. Вывучала рускую філалогію на настаўніцкіх курсах у Беластоку (1966–1967) і беларускую філалогію ў Варшаўскім універсітэце (1968–1982). Працавала ў Варшаве перакладчыцай. З 1979 г. жыве і працуе ў Бельску. Творчым дэбютам Н. Артымовіч з'яўляецца верш "Ой, ляцелі гусі...", надрукаваны ў 1970 г. у беластоцкай газеце "Ніва". Аўтар зборнікаў вершаў "Роздумы" (1981), "Сезон у белых пейзажах" (1990). Вядучыя ў творчасці паэтэсы — грамадзянска-патрыятычная тэма і інтымная лірыка. Яе хвалююць таксама праблемы адаптацыі вясковага чалавека ў сучасным горадзе (цыкл вершаў "Варшаўскія пейзажы"). Для вершаў Н. Артымовіч характэрны метафарычнасць, ускладнёнасць формы. Творы паэтэсы выдаваліся ў перакладзе І. Леанчука на польскай мове — "У сне і болі слова" (1984) і інш.

Адам Мальдзіс

Аскназій Ісак

***Аскназій Ісак Львовіч** (Лейбавіч; 16.1.1856, Дрыса Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінск Віцебскай вобл. – 1902, па інш. звестках 1903, Масква), мастак, акадэмік.*

І. Аскназій нарадзіўся ў багатай яўрэйскай сям'і. Вучыўся ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў (1870–1880), па інш. звестках (1874–1879). Пасля паспяховага яе заканчэння атрымаў стыпендыю для чатырохгадовага навучання за мяжой. Праходзіў яе ў Германіі, Польшчы, Аўстрыі, Італіі (1880–1884). Вярнуўшыся, жыў у Віцебску,

потым у Пецярбургу. І. Аскназій быў глыбока рэлігійным чалавекам, ганарыўся сваім паходжаннем, што адбілася ў яго мастацкай творчасці. У акадэміі яго асуджалі за празмерную увагу да тэм, узятых з Бібліі, яўрэйскай гісторыі і жыцця. Тым не менш, у 1885 г. ён быў выбраны акадэмікам.

І. Аскназій — мастак акадэмічнага напрамку. Прыхільнік нацыянальна-гістарычнай тэматыкі, аднак звяртаўся і да жанравага жывапісу. Найбольш вядомы яго працы — "Аўраам выганяе Агар і Ісмаіла", "Майсей у пустыні", "Смерць Іегуды ха-Леві", "Эклезіяст". "Яўрэйскае вяселле", "Пярэдадзень суботы".

Браніслава Котава

Астраумава Маргарыта

Астраумава (Звягіна) Маргарыта Іванаўна *(28.12.1940, Каўнас), мастачка, старшыня Згуртавання беларускай культуры Іда-Вірумаа БЭЗ (Эстонія).*

М. Астраумава нарадзілася ў Літве ў руска-беларускай сям'і (бацька — рускі, маці — беларуска). Калі пачалася вайна, сям'я эвакуіравалася ў Саратаўскую вобл., адкуль у 1944 г. пераехала на радзіму маці ў г. Лепель, што на Віцебшчыне. Тут ў 1958 г. М. Астраумава скончыла сярэднюю школу і паступіла ў Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут, дзе ў 1962 г. атрымала дыплом выкладчыка малявання і чарчэння. Працаваць яе накіроўваюць у Эстонію, у г. Кохтла-Ярве. Спачатку яна выкладае ў сярэдняй школе, а затым кіруе мастацкай студыяй у Доме піянераў (1963–1965). Адначасова, да 1971 г., працуе ў школе. З 1971 г. — у мастацкай школе г. Йыхві, цяпер — дырэктар гэтай школы, а з 1985 г. яшчэ і загадчыца Йыхвінскага філіяла Эстонскага мастацкага музея.

М. Астраумава разам з Зінаідай Клыга і Уладзімірам Дзехцеруком у сакавіку 1989 г. стварыла Згуртаванне беларускай культуры ў Іда-Вірумаа БЭЗ, з 1994 г. з'яўляецца старшынёй гэтага згуртавання. Яна трэці раз запар абіраецца дэпутатам гарадскога сходу, з'яўляецца старшынёй "Круглага стала нацыянальных суполак пры старэйшыне Іда-Вірумааскага павета". Часта выстаўляецца на мастацкіх выстаўках ў краінах Балтыі, Фінляндыі, Германіі. Яе карціны ўпрыгожваюць салоны і кватэры не толькі ў Эстоніі, але і ў блізкім і далёкім замежжы. Асабліва любіць маляваць нацюрморты, кветкі, краявіды.

Шмат часу М. Астраумава аддае заняткам з дзецьмі. Малюнкі беларускіх дзяцей Іда-Вірумаа ўпрыгожваюць розныя імпрэзы БЭЗа, імі захапляюцца беларусы Амерыкі, дзе ў Саўт-Рыверы праходзіла іх выстаўка. Штогод па ініцыятыве М. Астраумавай у Йыхві ладзяцца творчыя летнікі фінскіх і мясцовых мастакоў, на якія прыязджаюць і беларускія мастакі. М. Астраумава — укладальнік, рэдактар і мастак-афарміцель кнігі У. Дзехцерука "Сярод белых эстонскіх начэй" (1995).

Прыкладала намаганні дзеля адкрыцця мемарыяльнай дошкі вядомаму беларускаму пісьменніку Янку Скрыгану, які знаходзіўся ў Эстоніі ў высылцы. Клапоціцца пра далейшае развіццё нядзельнай школы, фальклорнага ансамбля, арганізацыю свята беларускай песні.

Пятрусь Капчык (Ізяслаўль, Украіна)

Асяндоўскі Антоній

Асяндоўскі Антоній Фердынанд *(27.5.1878, Віцебск – 3.1.1945, Гродзіск пад Варшавай, Польшча), вандроўнік, географ, польскі пісьменнік, публіцыст.*

А. Асяндоўскі скончыў гімназію ў Пецярбургу і фізіка-матэматычны факультэт Пецярбургскага універсітэта. Як выкладчык гэтага універсітэта ўдзельнічаў у навуковых экспедыцыях па Алтаю і Каўказу, у басейне Енісея і вакол Байкала. У 1899 г. выдаў у Пецярбургу сваю першую кнігу з апісаннем вандроўкі па Алтаю і кіргізскіх стэпах. У 1899–1990 гг. вывучаў хімію і фізіку ў Сарбоне (Парыж). Пасля вяртання з Францыі працаваў у Тэхнічным інстытуце ў г. Томску. Па заданню расійскага ўрада арганізаваў тэрытарыяльна-пошукавую работу па даследаванню мінеральнай і расліннай сыравіны ў Харбіне, выконваў абавязкі сакратара Уладзівастоцкай філіі Расійскага геаграфічнага таварыства. Надрукаваў некалькі дзесяткаў артыкулаў у навуковых часопісах Расіі, Аўстрыі і Польшчы. Сярод іх — "Выкапнёвыя вуглі паўвострава Мураўёва-Амурскага і прылягаючых мясцін" (Записки Общества Амурского края. 1902) і "Аб золатапрамысловасці Усходняй Сібіры" (Вестник Востока. 1903). За ўдзел у рэвалюцыі 1905 г. арыштаваны ў Харбіне і да 1907 г. знаходзіўся ў зняволенні. З 1908 г. жыў у Кіеве, затым у Пецярбургу. Надрукаваў некалькі артыкулаў у расійскіх журналах; з 1909 г. рэдагаваў "Петербургский дневник". У 1918–1920 гг. выкладаў эканамічную геаграфію і хімію ў політэхнічным інстытуце і сельскагаспадарчай акадэміі ў Омску, быў дарадчыкам у Калчака. Пасля паражэння калчакоўцаў хаваўся ва Урунхайскім краі (цяперашняя Тува), затым у Манголіі (с. Чатгал ля воз. Хубсугул, з мая 1921 г. — ва Урзе). Праз некаторы час пераехаў ва Уладзівасток, дзе зноў стаў сакратаром Усходняга аддзела РГТ. Пасля таго, як на Далёкім Усходзе ўсталявалася савецкая ўлада, эміграваў у Японію, а затым у ЗША, дзе выдаў кнігу аб сваіх прыгодах у Манголіі

— "Звяры, людзі і богі" (Нью-Йорк, 1922). У польскім перакладзе яна з'явілася ў Варшаве і выдавалася двойчы (1923 і 1925) пад назвай "Па краіне людзей, звяроў і багоў: Конна па Цэнтральнай Азіі". Геаграфічныя, прыродазнаўчыя і этнаграфічныя матэрыялы, змешчаныя ў кнізе, прынеслі аўтару заслужаную славу пісьменніка. У 1922 г. А. Асяндоўскі пераехаў у Польшчу, дзе быў кансультантам Міністэрства вайсковых спраў і Міністэрства прамысловасці і гандлю. Выкладаў у Вышэйшай вайсковай школе, у Вышэйшай гандлёвай школе і Школе палітычных навук у Варшаве. Апублікаваў шэраг спецыяльных прац па геаграфіі і эканоміцы, горнай справе. Адначасова працягваў друкаваць белетрыстыку, прыгодніцкія кнігі на польскай мове, дзе выкарыстоўваў успаміны пра гады, праведзеныя ў Расіі (Сібір), Манголіі і Японіі: "У людскіх і лясных гушчарах" (Варшава, 1923), "За кітайскай сцяной" (Варшава, 1924) і інш.

У 1924–1926 гг. разам з жонкай Соф'яй і Камілем Гіжыцкім, сябрам па Манголіі, ажыццявіў чарговую вандроўку па Паўночнай і Заходняй Афрыцы. У выніку гэтага з'явіліся новыя рэпартажы у прэсе і кнігі, выдадзеныя ў Варшаве і Львове. У 1930 г. зрабіў падарожжа чыгункай па Турцыі, Сірыі, Палесціне, Месапатаміі і Ірану. Аповесці, апавяданні і замалёўкі А. Асяндоўскага карысталіся ў свой час вялікай папулярнасцю, папулярызавалі геаграфічныя веды аб іншых краінах і народах. У канцы жыцця рэдагаваў газету "Wiadomoњsi Warszawskie" і часопіс "Film-Romans".

Валерый Ярмоленка

Аўдзееў Міхаіл

Аўдзееў Міхаіл Васільевіч *(15.9.1913, в. Гарадзец Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Магілёўскай вобл. – 22.6.1979, Масква), военачальнік. Герой Савецкага Саюза.*

М. Аўдзееў служыў у Чырвонай Арміі з 1932 г. Закончыў Варашылаўградскую ваенную авіяцыйную школу пілотаў. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У паветраных баях збіў 9 самалётаў. Пасля вайны закончыў Ваенную акадэмію Генштаба у Маскве. У 1964 г. выйшаў у адстаўку у званні генерал-маёра. Сярод іншых баявых узнагарод — 6 ордэнаў Чырвонага Сцяга. М. Аўдзееў аўтар трох кніг успамінаў пра вайну пад агульнай назвай "Ля самага Чорнага мора" (М., 1968–1975).

Алесь Карлюкевіч

Аўсянік Антон

Аўсянік Антон *(1888, в. Кабылле Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер в. Кастрычніцкая Вілейскага р-на Мінскай вобл. – 1933(?)), беларускі грамадска-палітычны дзеяч.*

А. Аўсянік скончыў тэхналагічны інстытут у Харкаве, вучыўся на караблебудаўнічым факультэце Пецярбургскага політэхнічнага інстытута. У Пецярбургу далучыўся да Беларускай сацыялістычнай грамады. У 1917 г. знаходзіўся ў Бабруйску, арганізаваў там выбары дэлегатаў на Першы Усебеларускі кангрэс, быў яго ўдзельнікам. У 1918–1919 гг. узначальваў Беларускую раду ў Бабруйску. Уваходзіў у склад Рады БНР, быў яе сакратаром. У 1918 г. удзельнічаў у перагаворах з прадстаўнікамі германскай акупацыйнай адміністрацыі ў Беларусі і дыпламатычнымі прадстаўнікамі РСФСР на Украіне, разам з іншымі членамі дэлегацыі БНР дамагаўся дыпламатычнага прызнання Беларускай дзяржавы ў яе этнаграфічных межах. У 1919–1920 гг. — намеснік старшыні Беларускай вайсковай камісіі. У кастрычніку 1920 г. быў удзельнікам Беларускай нацыянальна-палітычнай нарады ў Рызе. У лістападзе 1920 г. удзельнічаў у перагаворах з літоўцамі пра заключэнне дагавора аб сумеснай барацьбе супраць Польшы, быў прызначаны ўрадам В. Ластоўскага дыпламатычным прадстаўніком БНР у Літве. У 1921 г. высланы з Літвы, пераехаў у Вільню, працаваў у сельскай гаспадарцы. У 1922 г. абраны дэпутатам сейма Польшчы, уваходзіў у Беларускі пасольскі клуб. Актыўна змагаўся за вызваленне Заходняй Беларусі з-пад улады Польшчы і ўз'яднанне ўсіх беларускіх зямель у адной дзяржаве. У пачатку 1930-х гг. пераехаў у БССР. Далейшы лёс А. Аўсяніка невядомы.

Аляксандр Ціхаміраў

Ахрамовіч Раман

Ахрамовіч Раман Цімафеевіч *(13.11.1923, Мінск – 10.2.1989, Масква), усходазнавец.*

Р. Ахрамовіч нарадзіўся ў Мінску ў сям'і служачага. Пасля заканчэння сярэдняй школы пераехаў у Маскву. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны стаў байцом Маскоўскага народнага апалчэння, пазней быў накіраваны ў акупаваную Беларусь, дзе ажыццяўляў паліткіраўніцтва партызанскім атрадам імя Ленінскага камсамола. У баях

неаднаразова быў паранены. У 1944 г., пасля вызвалення Беларусі, Р. Ахрамовіч паступіў на іранскае аддзяленне Маскоўскага інстытута ўсходазнаўства і ў 1949 г. скончыў яго. У 1953 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю "Праблемы неафганскіх народнасцей у сучасным Афганістане". Пасля абароны амаль дваццать гадоў працаваў у Інстытуце ўсходазнаўства АН СССР як навуковы супрацоўнік, а ў 1962–1975 гг. займаў пасаду намесніка дырэктара гэтай установы. У гэты ж перыяд выкладаў у Інстытуце міжнародных адносін пры Міністэрстве Замежных спраў СССР (1957–1959) і Інстытуце ўсходніх моваў пры МДУ (1962–1963). Абараніў доктарскую дысертацыю на тэму "Грамадскі рух і дзяржаўная палітыка Афганістана пасля Другой сусветнай вайны". З 1975 г. і да апошніх дзён жыцця працаваў дырэктарам Інстытута краін Азіі і Афрыкі пры МДУ.

Р. Ахрамовіч быў вядомым афганазнаўцам і, акрамя таго, распрацоўваў праблемы нацыянальна-вызваленчага руху і міжнародных адносін на Усходзе. Ён аўтар каля 70 прац па гэтых пытаннях. Асноўнымі сярод іх з'яўляюцца: "Дзяржаўны лад Афганістана" (М., 1956); "Афганістан пасля Другой сусветнай вайны: Нарыс гісторыі" (М., 1961); "Вывучэнне гісторыі Афганістана ў Савецкім Саюзе // Савецкае афганазнаўства за 40 гадоў" (М., 1961, на пушту); "Афганістан у 1861–1966 гг.: Палітычны стан, канстытуцыйная рэформа" (М., 1967).

Р. Ахрамовіч быў удзельнікам XXV (Масква, 1960), XXVIII (Канбера, 1971), XXX (Мехіка, 1976), XXXI (Токіо—Кіёта, 1983), XXXII (Гамбург, 1986) Міжнародных кангрэсаў усходазнаўцаў, II сесіі Міжнароднага кангрэса афрыканістаў (Дакар, 1967). У 1988 г. быў выбраны ганаровым доктарам Кабульскага універсітэта (Афганістан). Усходазнавец вёў актыўнае грамадскае жыццё. З'яўляўся членам секцыі гістарычных навук Камітэта па Ленінскіх і Дзяржаўных прэміях СССР, быў членам Прэзідыума Савецкага камітэта салідарнасці краін Азіі і Афрыкі, віцэ-прэзідэнтам Таварыства "Савецкі Саюз – Афганістан", старшынёй Расійскага-Палестынскага таварыства, а таксама галоўным рэдактарам часопіса "Вестник Московского университета. Востоковедение", членам рэдкалегіі часопіса "Вопросы истории".

Віктар Астрога

Ачапоўскі Ян

***Ачапоўскі Ян** (1800, в. Пацейкі Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл. — 7.3.1871, Варшава), урач, доктар медыцыны.*

Нарадзіўся Я. Ачапоўскі ў сям'і святара грэка-каталіцкай царквы. Скончыў гімназію ў Слуцку. Вучыўся на медыцынскім факультэце Віленскага універсітэта. У 1824 г. абараніў дысертацыю і атрымаў ступень доктара медыцыны. З 1826 г. працаваў у Варшаве вайсковым урачом., з 1842 г. — урачом у дэпартаменце Сената Польшчы. Потым ардынатар у Евангелічным шпіталі, займаўся прыватнай практыкай.

Я. Ачапоўскі даследаваў і ў 1839 г прапанаваў. новы спосаб лячэння эпілепсіі, разглядаў гэтую хваробу як самастойную. У 1855 г. увайшоў у склад камісіі па вывучэнню эпілепсіі. Даследаваў таксама атрутнае ўздзеянне тытуню на арганізм чалавека. Прапанаваў спосабы лячэння рэўматычных хвароб ёдаўтрымліваючымі вадкасцямі. Член Варшаўскага таварыства ўрачоў (1825), Віленскага таварыства ўрачоў (1835), Кракаўскага навуковага таварыства (1847). З 1839 г. намеснік рэдактара часопіса "Pamiętnik Towarzystwa Lekarskiego Warszawskiego".

Вольга Гапоненка

Багдановіч Адам

***Багдановіч Адам (Адольф) Ягоравіч** (псеўд. і крыпт. А. Б., А. Б-овіч, А.-Б-віч, А. Борисовский, Гродненский обыватель; 20.3(1.4).1862, паводле інш. звестак 25.3(6.4).1862, м. Халопенічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Крупскі р-н Мінскай вобл. – 16.4.1940, Яраслаўль); этнограф, фалькларыст, мемуарыст. Бацька паэта М. Багдановіча.*

А. Багдановіч паходзіць з сям'і беззямельнага селяніна, былога прыгоннага, які быў дваровым (кухарам) у памешчыка і пры вызваленні надзелу не атрымаў. У сям'і існавалі багатыя традыцыі народнай культуры. Выдатнай знаўцай народнай творчасці, таленавітай апавядальніцай была бабка Рузаля (Разалія Казіміраўна Осьмак). Маючы учэпістую памяць, А. Багдановіч з дзяцінства назапасіў багатыя веды у галіне беларускага фальклору, якія выкарыстаў пазней у сваіх фальклорна-этнаграфічных працах. Адам Ягоравіч рана спазнаў нястачы, з 7 год быў аддадзены на працу ў маёнтак. Узімку здольны хлопчык паспяхова вучыўся ў пачатковай школе ў Халопенічах і ў Мінску, куды ў пошуках заробкаў часова перабраўся бацька. Пасля заканчэння школы працаваў памочнікам настаўніка ў Халопенічах, вучыўся у Мінску розным рамёствам (у кандытара, у чыгуначным дэпо і слясарнай майстэрні). У час вучобы ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі (1879—1882) арганізаваў сярод семінарыстаў гурток самаадукацыі. Пасля выпуску з семінарыі быў накіраваны настаўнікам у сельскую школу ў в. Пагарэлае Ігуменскага пав. У той жа час стаў актыўным членам мінскай арганізацыі рэвалюцыянераў-нарадавольцаў. З 1885 г. — загадчык гарадскога пачатковага вучылішча ў Мінску. У 1892 г. выбраў службу па Сялянскаму зямельнаму банку і пераехаў у Гродна. Пастаянна займаўся самаадукацыяй, у прыватнасці, вывучыў самастойна

нямецкую, французскую, польскую, лацінскую, грэчаскую і старажытную яурэйскую мовы, што дапамагала яму ў навукова-асветніцкай дзейнасці. Яшчэ ў семінарскія гады А. Багдановіч перадаў некаторыя свае фальклорныя запісы настаўніку П. Увядзенскаму, які супрацоўнічаў з вядомым фалькларыстам П. Шэйнам. З цягам часу і сам А. Багдановіч стаў непасрэдным карэспандэнтам-супрацоўнікам Шэйна, які надрукаваў у сваіх "Матэрыялах для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю" (т. 1—3, 1887—1902) зробленыя А. Багдановічам запісы народных песень, казак, легенд, апісанне абрадаў беларускага вяселля і інш. У 1896 г., пасля смерці жонкі (Марыі Апанасаўны Мякоты, маці Максіма), быў пераведзены па службе у Ніжні Ноўгарад, дзе адразу ж увайшоў у кола перадавой мясцовай інтэлігенцыі, пасябраваў з М. Горкім. Неўзабаве блізкія сяброўскія сувязі дапоўніліся сваяцкімі: сястра жонкі Горкага, Кацярыны Паўлаўны, Аляксандра Паўлаўна Волжына, стала жонкай Адама Ягоравіча. Яна хутка памерла, але сваяцкія ўзаемаадносіны А. Багдановіча і яго дзяцей з Кацярынай Паўлаўнай захаваліся надоўга. Працуючы ў сялянскім банку ў Ніжнім Ноўгарадзе, А. Багдановіч адстойваў інтарэсы сялян, у сувязі з чым выклікаў варожасць у мясцовага дваранства і ў 1907 г. быў пераведзены ў Яраслаўль, дзе пражыў амаль без перапынка ў да канца жыцця. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі быў прызначаны кіраўніком Яраслаўскага аддзялення сялянскага банка. Пасля скасавання банка (1920) перайшоў на педагагічную працу — выкладаў у тэхнікумах Яраслаўля. Перапісваўся з М. Горкім. Пайшоўшы у 1931 г. на пенсію, яшчэ з большым захапленнем заняўся навуковай працай.

З 1886 г. А. Багдановіч пачаў выступаць у перыядычным друку (у "Минском листке", "Минских губернских ведомостях", "Гродненских губернских ведомостях", "Виленском вестнике") з артыкуламі па гісторыі і этнаграфіі, народнай асвеце і зямельнаму пытанню, рэцэнзіямі і артыкуламі пра навінкі рускай і заходнееўрапейскай літаратуры, тэатральныя пастаноўкі і інш. Асабліва каштоўныя былі апублікаваныя ім этнаграфічныя працы: "Нарыс становішча жанчыны ў сялянскім асяроддзі беларускага краю", "Педагагічныя погляды беларускага народа" (1896), "Пра паншчыну" (1894). Манаграфія "Пережыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў" (Гродна, 1895) атрымала высокую ацэнку рускіх і польскіх вучоных. Звыш 10 год аддаў ён галоўнай сваёй навуковай працы — двухтомнай манаграфіі "Мова зямлі. Утварэнне водарачных імёнаў і вытворных ад іх", у якой раскрыў сувязь рачной і азёрнай наменклатуры краін Еўропы, Азіі, Паўночнай Афрыкі з глыбокімі этнагенічнымі працэсамі старажытнасці. Нягледзячы на высокую ацэнку вучоных і падтрымку М. Горкага, кнігу ў тагачасных умовах выдаць не ўдалося. На тэарэтычнай аснове гэтай манаграфіі А. Багдановіч напісаў таксама даследаванні "Этнічны склад народаў славянскіх і рускіх", "Этнічны склад беларускага народа" (засталіся ў рукапісах), "Мова зямлі.. Насельніцтва Верхняга Паволжа, Акі і Камы" (апубл. у 1966 у Яраслаўлі). Талент Багдановіча — пісьменніка і вучонага — у поўнай меры раскрыўся ў аўтабіяграфічных мемуарах, якія ён пачаў у 1934 г. і працягваў пісаць да канца жыцця. Гэта мастацкі твор і адначасова даследаванне па этнаграфіі, фальклору, народнай асвеце, культуры і сацыялогіі Беларусі 2-й паловы XIX ст. Выдатным мемуарным помнікам з'яўляюцца і ўспаміны пра М. Горкага (пісаліся у 1928—1935). А. Багдановіч таксама аўтар прац "Рэвалюцыйны рух у г. Мінску і губерні у 80 і пачатку 90-х гг.", "Да гісторыі партыі "Народнай волі" ў Мінску і Беларусі, 1880—1892 г.", "З мінулага мястэчка Халопенічы" (засталіся ў рукапісах).

А. Багдановіч адыграў значную ролю ў станаўленні асобы свайго сына Максіма. Ён захаваў яго рукапісную спадчыну, якую ў 1923 г. асабіста прывёз у Мінск і перадаў у Інбелкульт. На іх аснове ў 1927-1928 гг. быў выдадзены Збор твораў Максіма Багдановіча ў 2-х тамах (самі рукапісы загінулі ў часы Вялікай Айчыннай вайны). А. Багдановіч напісаў таксама каштоўныя ўспаміны пра сына — "Матэрыялы да біяграфіі Максіма Багдановіча" (1923, апубл. у 1960). Уласны архіў і бібліятэка А. Багдановіча моцна пацярпелі ў час пажару ў Яраслаулі ў 1918 г. Тое, што захавалася, у тым ліку рукапісы прац А. Багдановіча савецкага перыяду, у 1957 г. перадалі ў Інстытут літаратуры АН БССР яго сыны Павел і Мікалай. Кнігазбор зберагаецца у ЦНБ АН БССР.
Пахаваны ў Яраслаўлі.

Генадзь Кісялёў

Багдановіч Янка

Багдановіч Янка *(Іван Антонавіч; псеўд. Я. Ваўштолскі, Янка Ваўштолскі, крыпт. Я. Б.; 4(17).11.1906, в. Гібінята Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. – 13.7.1990, Вільнюс), беларускі празаік, паэт, публіцыст, мемуарыст.*

Нарадзіўся Я. Багдановіч у сялянскай сям'і. У 1918 г. яго бацькі амаль адначасова памерлі. Дванаццацігадоваму Янку і яго малодшаму брату Віктару давялося жыць спачатку ў Барунскім, затым у Віленскім дзіцячых прытулках, арганізаваных беларускай інтэлігенцыяй на зыходзе Першай сусветнай вайны. Скончыўшы Віленскую беларускую гімназію (1927), працаваў у друкарні імя Ф. Скарыны (1927–1941). У 1930 г. Я. Багдановіч пачаў друкаваць у віленскіх газетах і часопісах свае вершы, артыкулы, допісы, уключыўся ў заходнебеларускі грамадска-культурны рух. Разам з Я. Шутовічам, М, Пецюкевічам, Я. Найдзюком выдаваў незалежны часопіс "Шлях моладзі" (1929–1940), у якім друкаваў лірычныя замалёўкі, апавяданні, вершы, байкі. У гады вайны вучыўся

ў Віленскай настаўніцкай семінарыі і адначасова працаваў у пачатковай школе № 50 (1941–1943), настаўнічаў у Павільніскай пачатковай школе № 23, у 1945 г. стаў яе дырэктарам. Затым быў дырэктарам віленскай польскай школы № 22 (1945–1946), якая пазней была далучана да школы № 16, дзе Я. Багдановіч таксама працаваў у 1946–1952 гг. Рэгулярна пісаў артыкулы ў польскую газету "Czerwony sztandar" ("Чырвоны штандар"). У 1952 паступіў у Нова-Вільняйскі педагагічны інстытут. У жніўні 1952 г. быў беспадстаўна рэпрэсаваны, высланы ў Варкуту, дзе жыў да верасня 1956 г. Пасля рэабілітацыі вярнуўся ў Вільнюс і зноў працаваў настаўнікам пачатковай школы № 16 (1956–1967), васьмігадовай № 3 (1967–1974). Завочна скончыў педінстытут.

Апрача вершаў, апавяданняў і артыкулаў Я. Багдановіч пісаў успаміны пра пісьменнікаў, настаўнікаў. Аўтар успамінаў "На жыццёвым шляху" (Мн., 1992), у якіх паказаны жыццё і побыт віленскай беларускай інтэлігенцыі ў даваенны час. У 60–80-я гг. кватэра Я. Багдановіча была адным з асяродкаў, вакол якіх гуртаваліся віленскія беларусы.

Арсень Ліс

Баена Юрый

Баена Юрый *(Юрка; 24.3.1957, в. Мокрае каля Бельска-Падляшскага Беластоцкага ваяв., Польшча), педагог, паэт, палітычны і грамадскі дзеяч.*

Ю. Баена нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У 1972 г. скончыў васьмігодку ў в. Дубяжын, а затым — ліцэй імя Б. Тарашкевіча з беларускай мовай навучання ў Бельску (1976). У 1976–1980 гг. — студэнт геаграфічнага факультэта Люблінскага універсітэта М. Кюры-Складоўскай. З верасня 1980 г. — настаўнік геаграфіі ў пачатковай школе з дадатковай беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім. Быў выбраны радным гарадской рады Бельска (1990); сябрам управы г. Бельска (1998); старшынёй раённага аддзела Саюза польскіх настаўнікаў. Аўтар праграмы па выкладанню і навучанню беларускай і рэгіянальнай тэматыкі на ўроках геаграфіі ў пачатковых і сярэдніх агульнаадукацыйных школах Беласточчыны, зацверджанай у 1997 г. Міністэрствам нацыянальнай адукацыі.

У друку Ю. Баена дэбютаваў беларускім вершам "Дом", апублікаваным на літаратурнай старонцы "Белавежа" ў беластоцкай "Ніве". Друкаваўся ў альманахах Беларускага літаратурнага аб'яднання "Белавежа", беларускіх календарах. Аўтар паэтычных зборнікаў "Лісты блакітных успамінаў" (1991) і "Вечар над светам" (1998). Вершы Ю. Баены насычаны паэтычнай асацыятыўнасцю, прасякнуты любоўю да бацькоўскай зямлі, прагай абараніць яе чысціню.

Ян Чыквін (Бельск-Падляшскі, Польшча)

Бажанаў Мікалай

Бажанаў Мікалай Данілавіч *(2.5.1899, Жлобін — 13.1.1985, г. Ромны Сумскай вобл., Украіна), рускі пісьменнік.*

Нарадзіўся М. Бажанаў у сям'і доктара. Атрымаўшы сярэднюю адукацыю, працаваў настаўнікам у чыгуначнай школе на станцыі Бахмач Чарнігаўскай вобл. У 1929 г. закончыў Кіеўскі інстытут народнай гаспадаркі. З 1930 г. працаваў інжынерам, эканамістам на чыгуначным транспарце. У 1944–1959 гг. начальнік планавага аддзела на кансервавым заводзе ў Ромнах Сумскай вобл. З 1959 г. на пенсіі.

Друкавацца М. Бажанаў пачаў з 1936 г. Пісаў на рускай мове. Аўтар кнігі "Рахманінаў" (1962, 1966) і "Танееў" (1971), якія пабачылі свет у маскоўскім выдавецтве "Молодая гвардия" ў серыі "Жизнь замечательных людей". Абедзве кнігі пепракладзены на шэраг еўрапейскіх моваў. Выступаў у друку з апавяданнямі. Асобным выданнем выйшаў аўтабіяграфічны эцюд М. Бажанава "Усе вятры часу" (1971).

Узнагароджаны медалём "За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг." і Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Украінскай ССР.

Алесь Карлюкевіч

Байкачоў Міхаіл

Байкачоў Міхаіл Васільевіч *(19.5.1954, Мінск), мастацтвазнавец, дзеяч беларускай дыяспары ў Расіі.*

Пасля заканчэння ў 1971 г. Мінскай СШ № 86 М. Байкачоў вучыўся на юрыдычным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1971–1976). Служыў у радах Савецкай Арміі (1976—1981), удзельнічаў у ваенных дзеяннях у Афганістане. Да 1986 г. быў старшым кансультантам аддзела юстыцыі Ніжагародскага аблвыканкама, потым на працягу года — старшым інжынерам лабараторыі сацыялогіі і псіхалогіі працы завода "Чырвонае Сормава" ў Ніжнім Ноўгарадзе. У 1987—1990 гг. працаваў рэстаўратарам-рэзчыкам па дрэву Ніжагародскага

спецыялізаванага навукова-рэстаўрацыйнага вытворчага ўпраўлення, у 1990–1995 гг. — мастаком-рэстаўратарам аддзела рэстаўрацыі Ніжагародскага дзяржаўнага гісторыка-архітэктурнага музея-запаведніка (НДГАМЗ), у 1995—1998 гг. — малодшым навуковым супрацоўнікам аддзела гісторыі мастацкіх промыслаў і народнага мастацтва НДГАМЗ, з 1998 г. — старшым навуковым супрацоўнікам. У 1998 г. М. Байкачоў скончыў Акадэмію культуры ў Санкт-Пецярбургу па спецыяльнасці музеязнаўства.

У сферы навуковых даследаванняў М. Байкачова — вывучэнне гісторыі сучаснага стану і мастацкіх асаблівасцей народнага мастацтва, мастацкіх промыслаў і рамёстваў Ніжагародскай вобласці, тэорыя і практыка міжрэгіянальных сувязей у музейнай дзейнасці і мастацтвазнаўстве. Займаецца праблемамі, звязанымі з народным мастацтвам, мясцовымі промысламі і рамёствамі, семантыкай, міфалогіяй, фальклорам, этнаграфіяй і гісторыяй насельніцтва Ніжагародскага краю. Актыўна прапагандуе народнае мастацтва, выязджае ў экспедыцыі па збору этнаграфічнага матэрыялу, ладзіць разнастайныя выстаўкі і экспазіцыі. На базе НДГАМЗ стварае сістэму ўзаемнага пранікнення розных форм дзейнасці, звязаных з народнымі промысламі і рамёствамі, фальклорам, тэатрам, навучальнымі ўстановамі, дзіцячай творчасцю і работай прафесійных майстроў. М. Байкачоў быў адным з ініцыятараў стварэння ў вобласці Таварыства аматараў беларускай культуры і беларускай мовы. Наладзіў супрацоўніцтва з Таварыствам беларускай культуры ў Санкт-Пецярбургу.

Сярод шматлікіх навуковых публікацый М. Байкачова (у сааўтарстве з мастацтвазнаўцам Н. Памфілавай) —"Дух дрэва" (1995), "Некаторыя аспекты камплектавання калекцыі Музея гісторыі мастацкіх промыслаў" (1996), "Саматужная мэбля Ніжагародскай губерні" (1996), "Народны роспіс Павятлужжа: Новыя адкрыцці" (1997), праграма для сістэмы Інтэрнет аб сучасных мастацкіх промыслах Ніжагародскай вобл. і інш.

М. Байкачоў неаднаразова ўдзельнічаў у гарадскіх і абласных выстаўках народнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Лаўрэат III фестывалю майстроў па дрэву "Таямніцы дрэва" (1997–1998) у Ніжнім Ноўгарадзе (дыплом I ступені). Удзельнічаў у I з'ездзе беларусаў свету.

Ірына Тамільчык

Бакст Мікалай

Бакст Мікалай Ігнатавіч *(Ноах Ісакавіч; 1842, Мір Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. – 1904, Пецярбург), фізіёлаг, пісьменнік, грамадскі дзеяч.*

Адукацыю М. Бакст атрымаў у равінскім вучылішчы ў Жытоміры і Пецярбургскім універсітэце. Пасля заканчэння універсітэта накіраваны Міністэрствам адукацыі ў Германію, дзе прцягваў вучобу пад кіраўніцтвам вядомага нямецкага фізіёлага Г. Гельмгольца. У 1867 г. прызначаны лектарам па фізіялогіі ў Пецярбургскім універсітэце. Успышка антысемітызму ў Германіі і пагромы ў Расіі выклікалі ў Бакста цікавасць да яўрэйскага пытання. Ён лічыў, што неабходна дамагацца поўнага раўнапраўя яўрэяў у Расіі, паляпшэння ўмоў іх існавання. Быў экспертам камісіі Палена (1883–1888), створанай рускім урадам для перагляду заканадаўства аб яўрэях.

М. Бакст напісаў на нямецкай і рускай мовах шэраг прац па фізіялогіі і неўралогіі, а таксама артыкулаў, апублікаваных ў рускіх і яўрэйскіх часопісах, аб становічшы яўрэяў у Расіі.

Браніслава Котава

Балакіна Раіса

Балакіна (Лявонава) Раіса Пятроўна *(3.1.1947, в. Чачэвічы Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл.), канструктар касмічнай тэхнікі.*

Р. Балакіна нарадзілася ў беларускай сям'і сельскіх педагогаў. У 1963 г. скончыла Чачэвіцкую сярэднюю школу. Вучылася ў Маскоўскім авіяцыйным інстытуце імя С. Арджанікідзе. Пасля яго заканчэння ў 1969 г. працавала ў Цэнтральным канструктарскім бюро эксперыментальнага машынабудавання (цяпер Ракетна-касмічная карпарацыя "Энергія" імя С. П. Каралёва). Займалася канструяваннем касмічнай тэхнікі. Мае дачыненне да стварэння касмічнай станцыі "Мір", лятаючага апарата шматразовага выкарыстання "Буран", міжнароднай касмічнай станцыі "Альфа". Займаецца таксама дызайнам унутраных адсекаў — рабочых месцаў і блокаў жыццезабеспячэння касманаўтаў.

Жыве ў Каралёве Маскоўскай вобл.

Аляксей Кажамяка (в. Пенькаўка Клімавіцкага р-на)

Балаховіч Андрэй

Балаховіч Андрэй Сцяпанавіч *(20.7.1965, Вільнюс), мастак, беларускі грамадскі дзеяч.*

А. Балаховіч вучыўся ў Мядзельскай сярэдняй школе Мінскай вобл. Цікавіцца жывапісам і маляваць пачаў у школьныя гады — паказваў краявіды Нарачанскага краю. Займаўся ў студыях жывапісу ў Волагдзе, Архангельску. Скончыў завочнае аддзяленне жывапісу і графікі Маскоўскага універсітэта мастацтваў.

З 1986 г. А. Балаховіч прымае пастаянны ўдзел у выстаўках. Яго карціны знаходзяцца ў прыватных калекцыях Польшчы, Фінляндыі, Германіі, ЗША, Даніі, Аўстраліі, Аргенціны, Францыі, Швецыі, Расіі і іншых краін свету. Пейзажы А. Балаховіча маюць вялікі поспех сярод айчынных і замежных аматараў мастацтва. У 1996 г. ён прыняты ў Саюз народных мастакоў Літвы. Актыўна ўдзельнічае ў грамадска-культурным жыцці беларусаў Літвы. Узнагароджаны медалём Літоўскай Рэспублікі "У памяць аб 13-м студзеня"). Жыве ў Вільнюсе.

Валянцін Нідзянскі (Вільнюс)

Балаховіч Хрысціна

Балаховіч Хрысціна *(18.9.1959, Вільнюс), мастачка, беларускі грамадскі дзеяч.*

Х. Балаховіч скончыла Вільнюскую мастацкую акадэмію па аддзяленню жывапісу. Яна выстаўляецца ў розных галерэях, удзельнічае ў выстаўках у Вільнюсе, краінах Балтыі, Польшчы, Беларусі. Мастачка працуе над нацюрмортамі, пейзажамі, якія сама называе "ціхім жыццём". Яе карціны — адлюстраванне краявідаў роднай Віленшчыны, захапленне прыгажосцю і разнастайнасцю прыроды. Пэўны час Х. Балаховіч была вядучай беларускай праграмы на Літоўскім тэлебачанні. Працуе таксама ў галіне мультыплікацыі. Вядзе гурток малявання ў беларускай школе імя Ф. Скарыны ў Вільнюсе. Ілюструе кнігі, аформіла серыю канвертаў і паштовак. Паспяхова займаецца перакладамі з беларускай і літоўскай моваў.

Х. Балаховіч прымае актыўны ўдзел у грамадска-культурным жыцці беларускай дыяспары ў Вільнюсе, прапагандуе ідэі адраджэння і захавання беларускай культуры ў Літве. Уваходзіла ў Раду "Саюдзіса". Прымала ўдзел у розных культурных мерапрыемствах, якія праводзіліся ў Мінску. Яна сябар суполкі беларускіх мастакоў "Маю гонар", якую ўзначальвае Вячка Целеш. Узнагароджана былым прэзідэнтам Літвы Альгірдасам Бразаўскасам медалём. Жыве і працуе ў Вільнюсе.

Леакадзія Мілаш (Вільнюс)

Балашэвіч Леанід

Балашэвіч Леанід Іосіфавіч (Лявон Язэпавіч) *(6.2.1937, Рагачоў Гомельскай вобл.), афтальмолаг. Сапраўдны член Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі і Лазернай акадэміі навук Расійскай Федэрацыі.*

Нарадзіўся Л. Балашэвіч ў сям'і аграномa. У гады Вялікай Айчыннай вайны разам з маці і братам жыў у в. Бярозка Магілёўскай вобл. (спалена нямецкімі карнікамі, сям'я цудам выратавалася). Пасля вайны жыў у г. п. Рудзенск Пухавіцкага р-на Мінскай вобл., дзе ў 1954 г. з залатым медалём скончыў сярэднюю школу. У 1954–1960 гг. вучыўся ў Ваенна-марской медыцынскай акадэміі ў Ленінградзе. У 1960–1967 гг. праходзіў службу на падводных лодках, надводных караблях і ў медыцынскай службе злучэнняў падводных лодак Ваенна-марскога флоту СССР. З 1967 да 1969 г. вучыўся на факультэце падрыхтоўкі кіруючага складу медыцынскай службы на аддзяленні афтальмалогіі. У 1969–1970 гг. служыў у Ваенна-Марскім флоце начальнікам вочнага аддзялення ваенна-марскога шпіталя ў Северадзвінску. З 1971 г. жыве і працуе ў Ленінградзе (Санкт-Пецярбургу). У 1971–1987 гг. — у Ваенна-медыцынскай акадэміі: навуковы супрацоўнік, старшы ардынатар, выкладчык кафедры афтальмалогіі. У 1987 г. закончыў вайсковую службу ў званні палкоўніка, пазаштатнага галоўнага афтальмолага Ваенна-Марскога флоту СССР. З 1987 г. працаваў намеснікам дырэктара Ленінградскага філіяла Маскоўскага навукова-творчага калектыву "Мікрахірургія глаза", якім кіраваў акадэмік С. М. Фёдараў. З 1994 г. — дырэктар гэтага філіяла. Адначасова з 1997 г. узначальвае кафедру афтальмалогіі Санкт-Пецярбургскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Л. Балашэвіч актыўна займаецца навукова-даследчай працай. У 1974 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па пытаннях уздзеяння на орган зроку інтэнсіўных светлавых раздражняльнікаў. Удзельнік навуковых даследаванняў па распрацоўцы і выкарыстанню лазернай тэхнікі для афтальмалогіі; прымаў удзел у стварэнні і выпрабаваннях першага савецкага аргонавага лазера для афтальмалогіі "Ліман-2". У 1996 г. абараніў доктарскую дысертацыю па пытаннях выкарыстання лазераў у афтальмалогіі. Аўтар манаграфіі "Светлавыя пашкоджанні вока" і каля 130 друкаваных прац па розных праблемах афтальмалогіі.

Ларыса Языковіч

Баранкевіч Іван

Баранкевіч Іван Міхайлавіч *(6.7.1888, в. Трасцівец Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Быхаўскі р-н Маглёўскай вобл. – 27.6.1942, с. Кзыл-Тау, Казахстан), празаік, нарысіст, перакладчык, удзельнік рэвалюцыйнага руху.*

І. Баранкевіч паходзіў з сялян. У 1903 г. уступіў у РСДРП. Удзельнік рэвалюцыі 1905–1907 гг. У 1910 г. служыў радавым у паветрана-плавальным батальёне ў Іркуцку. У 1913–1914 гг. працаваў у кааператыўных арганізацыях Магілёўскай губ., супрацоўнічаў у часопісе "Вестник Могилевского земства". У Першую сусветную вайну — на Паўднёва-Заходнім фронце. У 1918–1919 гг. — загадчык агітацыйна-выдавецкага пададдзела Петраградскага аддзялення Беларускага нацыянальнага камісарыята. Супрацоўнічаў у часопісе "Чырвоны шлях", быў рэдактарам часопіса "Белорусская криница" (Петраград). Аўтар біяграфіі У. Леніна, выдадзенай у Петраградзе ў 1919 г. пад псеўданімам Беларус. У 20-я гг. жыў у Магілёве, працаваў настаўнікам, у 1923–1925 гг. — супрацоўнік газет "Соха и молот", "Магілёўскі селянін", дзе друкаваў нарысы і апавяданні на тэмы з жыцця вёскі. У 1923–1924 гг. арыштоўваўся органамі АДПУ. З 1927 г. — у Ленінградзе, уваходзіў у літаратурную групу "Резец", друкаваў апавяданні з беларускай тэматыкай у часопісе "Резец", працаваў бібліятэкарам. Перакладаў на рускую мову творы Я. Коласа. У 1930 г. як былы меншавік арыштаваны і сасланы ў Сярэднюю Азію тэрмінам на 3 гады. У 1936 г. пераехаў у Мурманск, дзе супрацоўнічаў у газетах і працаваў настаўнікам у школах, бухгалтарам Саюзкінапраката. У верасні 1939 г. арыштаваны, у лютым 1940-га накіраваны на абследаванне ў псіхіятрычную бальніцу г. Ноўгарада. У ліпені 1940 г. прызнаны здаровым. Трымаў галадоўку 34 дні. Пастановай Асобай нарады пры НКУС СССР ад 28.5.1941 г. асуджаны на 8 гадоў лагераў. Пакаранне адбываў у Карлагу. Паводле афіцыйнай версіі, памёр ад туберкулёзу лёгкіх. Пахаваны на могілках Кзыл-Таускага аддзялення Карлага (цяпер с. Кзыл-Тау Шэцкага р-на Джэзканганскай вобл. Казахстана). Рэабілітаваны ў 1982 г.

Віталь Скарабаган

Баркоўскі Алесь

Баркоўскі Алесь *(25.8.1953, п. Асятрова Усць-Куцкага р-на Іркуцкай вобл.), гісторык, беларусіст, краязнавец.*

Бацькі А. Баркоўскага Зінаіда (у дзявоцтве Камлюк) і Анатоль Баркоўскія паходзілі з в. Міханавічы Мінскага р-на. У Сібір жа трапілі ў сувязі з тым, што бацьку накіравалі туды на службу пасля заканчэння школы МУС у Ашхабадзе. У 1963 г. А. Баркоўскі разам з бацькамі пераехаў у г. Дзяржынск Мінскай вобл., дзе ў 1970 г. скончыў сярэднюю школу № 2. З 1970 да 1973 г. вучыўся ў Якуцкім рачным вучылішчы на суднавадзіцельскім аддзяленні, а з 1973 да 1975 г. служыў у арміі на Далёкім Усходзе. Пасля працаваў у Ленскім аб'яднаным рачным параходстве, будаваў Мінскае метро, здабываў золота на Алдане. Цяпер працуе капітанам-механікам у Акцыянерным таварыстве "Якуцкі рачны порт".

У Якуцку А. Баркоўскі ўдзельнічаў у заснаванні беларускай суполкі "Суродзіч", выпускаў газету "Паўночнае зьзяньне", выдаў шэраг брашур. Выступае ў друку з артыкуламі пра беларуска-якуцкія сувязі (у выданнях "Голас часу", "Кыым", "Полярная звезда" і інш.). Перакладаў на беларускую мову творы У. Высоцкага, Т. Лады-Заблоцкага, М. Лермантава і інш., на рускую — Ф. Аляхновіча, А.-Р. Каменскага-Длужыка і інш., на якуцкую — С. Палуяна (разам з І. Нікалаевай). Напісаў кароткую гісторыю ўзаемаадносін паміж Японіяй і Беларуссю (Падарожнік. 1997. № 6, 7). Сабраў у архівах Рэспублікі Саха (Якуція) матэрыялы пра сасланых туды з Беларусі паўстанцаў 1863–1864 гг., "кулакоў" і інш.

Вікторыя Пятрушкіна (Якуцк)

Барташэвіч Альберт

Барташэвіч Альберт *(2.8.1942, в. Раёўшчына Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл.), мовазнавец, доктар габілітаваны (1972), прафесар (1986).*

А. Барташэвіч нарадзіўся ў беларускай вёсцы. Вучыўся ў Вроцлаўскім універсітэце, пасля сканчэння якога (1964) быў старшым асістэнтам у Вышэйшай педагагічнай школе ў Аполі (1964–1968). Да 1973 г. — ад'юнкт у Пазнанскім універсітэце імя А. Міцкевіча. Быў прызначаны намеснікам дэкана філалагічнага факультэта Шлёнскага універсітэта (Катавіцэ). З 1974 г. працаваў у Варшаўскім універсітэце — кіраваў аддзелам рускай мовы (1974–1992). Намеснік дэкана факультэта русістыкі і славістыкі (1975–1977), дэкан факультэта русістыкі і прыкладной лінгвістыкі (1977–1987) таго ж універсітэта. У 1987 г. А. Барташэвіч стаў дырэктарам Інстытута русістыкі Вышэйшай педагагічнай школы ў Ольштыне, з 1992 г. узначальваў кафедру ўсходняга славяназнаўства, а з 1993 г. — кафедру

славянскага мовазнаўства. З 1994 г. узначальвае там Інстытут усходняга славяназнаўства. У 1994–1996 гг. — дэкан факультэта гуманістыкі. З 1995 г. у Пазнанскім універсітэце імя А. Міцкевіча кіруе секцыяй рускай мовы.

А. Барташэвіч займаецца навуковымі даследаваннямі ў галіне ўсходнеславянскага мовазнаўства, польска-ўсходнеславянскай кампаратывістыкі, гісторыі рускай мовы, анамастыкі, лексікалогіі і перакладазнаўства. Ім напісаны каля 120 навуковых прац, у тым ліку "Гісторыя суфіксальнай адыменнай дэрывацыі назоўнікаў у рускай мове" (1972), "Пытанні эвалюцыі сучаснай рускай мовы" (1986), "Слоўнік a tergo сучаснай беларускай мовы" (1988–1989. Т. 1–4), "Рускае словаўтварэнне для палякаў" (1990), "Беларуска-польскі і польска-беларускі слоўнік" (1996). Аўтар падручнікаў "Гісторыя рускай літаратурнай мовы" (1979), "Нарыс гістарычнай граматыкі рускай мовы" (1988), кнігі "Індэкс a tergo да слоўніка мовы Пушкіна" (1985).

А. Барташэвіч — член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, ганаровы сябра Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Узнагароджаны медалём імя Пушкіна, ордэнам Дружбы, залатым Крыжам заслугі, Кавалерскім крыжам і іншымі адзнакамі і ўзнагародамі. Ганаровы доктар Калінінградскага універсітэта (1997).

Ірына Тамільчык

Бартусевіч Уладзімір

Бартусевіч (Бартусявічус) Уладзімір (Уладас) *(5.2.1927, г. п. Свір Свянцянскага пав. Віленскага ваяв., цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл. — 10.3.1982, Вільнюс), дырыжор, заслужаны артыст Літвы (1955), заслужаны дзеяч мастацтва Літоўскай ССР (1966), народны артыст Літоўскай ССР (1974), заслужаны дзеяч мастацтва Мангольскай Народнай Рэспублікі (1976).*

У 1945–1952 гг. У. Бартусевіч іграў на жалейцы ў Народным ансамблі песні і танца Літоўскай ССР. У 1952 г. скончыў Літоўскую кансерваторыю па класу жалейкі ў Повіласа Самуціса і народных інструментаў у Йонаса Швядаса. У 1952–1962 гг. працаваў мастацкім кіраўніком Ансамбля песні і танца студэнтаў Вільнюскага універсітэта. З 1962 да 1972 г. — мастацкі кіраўнік Ансамбля песні і танца "Летува". Адначасова ў 1955–1961 гг. працаваў выкладчыкам у Дзяржаўнай кансерваторыі Літвы. У 1972–1982 гг. — галоўны рэжысёр Дзяржаўнай філармоніі Літвы.

Працуючы мастацкім кіраўніком Ансамбля песні і танца студэнтаў Вільнюскага універсітэта, У. Бартусевіч падрыхтаваў 8 праграм. На сусветных фестывалях моладзі і студэнтаў у 1957 г. у Маскве і ў 1959 г. у Вене ансамбль быў узнагароджаны залатым медалём. З ансамблем "Летува" падрыхтаваў 5 праграм. За падрыхтоўку праграм "Вецер стагоддзяў" (1965) і "Святочныя вечары" (1969) У. Бартусевічу ў 1970 г. прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР. З 1965 г. ён з'яўляўся галоўным дырыжорам Рэспубліканскіх святаў песні. У 1974–1981 гг. быў рэжысёрам мангольскіх масавых мастацкіх выступленняў ва Улан-Батары і Маскве. З ансамблем "Летува" гастраляваў у рэспубліках Савецкага Саюза, а таксама ў Аўстрыі, Англіі, Індыі, Канадзе, Францыі, Фінляндыі, Японіі. У 1983 г. У. Бартусевіч выдаў кнігу "На ніве народнага мастацтва" (на літоўскай мове), публікаваў артыкулы пра народную музыку.

Яніна Кісялёва

Баруховіч Ічэ

Баруховіч Ічэ *(псеўд. у рускіх выданнях — Ісаак Барысаў; 1923, Рагачоў Гомельскай вобл. – 1972, Масква), паэт, нарысіст.*

І. Баруховіч скончыў настаўніцкі інстытут у 1940 г., працаваў настаўнікам у мяст. Стрэшын Жлобінскага р-на. У гады Вялікай Айчыннай вайны — начальнік асабістай радыёстанцыі савецкага ваеначальніка генерала Ватуціна. У 50–70 гг. працаваў у адміністрацыйным апараце Саюза пісьменнікаў СССР.

Вершы пісаў на ідыш, нарысы і рэпартажы у асноўным на рускай мове. "На зялёным беразе" (1941), "У добры час" (1947), "Каля кастра гадоў" (1974). Некалькі кніг яго вершаў апублікаваны ў перакладзе на рускую мову. З'ўляўся членам рэдкалегіі маскоўскага часопіса "Савеціш Геймланд" ("Савецкая Радзіма").

Браніслава Котава

Баршчэўская Ніна

Баршчэўская Ніна *(29.6.1956, мяст. Козлікі Гайнаўскага пав. Беластоцкага ваяв., Польшча), філолаг, мовазнаўца, беларускі грамадскі дзеяч Польшчы.*

Н. Баршчэўская нарадзілася ў беларускай сялянскай сям'і. Вучылася ў вясковых школах Кожына і Гародчына. З дзяцінства вывучала беларускую мову. Пасля заканчэння васьмі класаў паступіла ў агульнаадукацыйны ліцэй з беларускай мовай навучання імя Б. Тарашкевіча ў Бельску-Падляшскім, які закончыла ў 1975 г. Вучылася на кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта (1975–1980), дзе паглыбляла свае веды па вывучэнню беларускай мовы і літаратуры. Тэма дыпломнай працы — беларускія гаворкі Беласточчыны. Праходзіла навуковую стажыроўку на гэтай жа кафедры, дзе працуе па сённяшні дзень. У 1988 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю пра дыялектызмы ў беларускай мове. Займаецца праблемай стаўлення беларускай эміграцыі да роднай мовы. У падрыхтоўцы навуковых прац ёй дапамагалі праф. Л. Шакун і айцец Аляксандр Надсан, а таксама стажыроўка на кафедры беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў Мінску і ў Беларускай бібліятэцы імя Ф. Скарыны ў Лондане.

Н. Баршчэўская — аўтар шматлікіх навуковых публікацый. Сярод іх "Моўныя пытанні на старонках беларускіх эміграцыйных выданняў у Нямеччыне", "Ідэя абароны беларускай мовы на старонках "Бацькаўшчыны" і інш. Яе артыкулы з'яўляліся на старонках розных перыядычных выданняў Польшчы і Беларусі. У сааўтарстве была распрацавана праграма для школы з вывучэннем беларускай мовы. Была рэдактарам "Беларускага календара" за 1989 і 1992 г.

Н. Баршчэўская выступала з дакладамі на розных міжнародных навуковых канферэнцыях. Прымала ўдзел у II і III Міжнародных кангрэсах беларусістаў.

Ірына Тамільчык

Баршчэўскі Аляксандр

Баршчэўскі Аляксандр *(псеўд. А. Баравы, Алесь Барскі; 2.11.1930, в. Бандары Беластоцкага ваяв., Польшча), паэт, літаратуразнавец, фальклярыст, драматург. Сябар Саюза польскіх пісьменнікаў (1962), сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў (1995). Ганаровы доктар БДУ (1993), член Міжнароднай Акадэміі навук Еўразіі (1994).*

А. Баршчэўскі паходзіць з сялянскай сям'і. Вучыўся ў сельскагаспадарчай школе ў Бельску-Падляшскім, на універсітэцкіх падрыхтоўчых курсах у Любліне. Скончыў Лодзінскі універсітэт (1955). Абараніў кандыдацкую (1966) і доктарскую (1986) дысертацыі. З 1956 г. выкладае на кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта, яе нязменны прафесар і загадчык. Па запрашэнню выкладаў ва універсітэтах Віцебска, Гродна, Лондана, Любліна, Мінска, Нью-Йорка і інш. Актыўна ўдзельнічаў у рабоце Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы (з 1964 г. яго старшыня). У апошнія гады сістэматычна выступае ў беластоцкай газ. "Ніва" як публіцыст. Апублікаваў нарысы аб сваіх паездках у СССР, ЗША, Англію. Віцэ-прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, старшыня Польскага беларусістычнага таварыства, намеснік старшыні Згуртавання фальклярыстаў Беларусі.

У друку выступае з 1956 г. Адзін з вядучых прадстаўнікоў беларускай літаратуры ў Польшчы. Вершы пачаў пісаць з 1956 г. Аўтар паэтычных кніг "Белавежскія матывы" (1962), "Жнівень слоў" (1967), "Мой бераг" (1975), "Блізкасць далёкага" (1983), "Лірычны пульс" (1986), "Зборніка абразкоў, артыкулаў і дарожных нататак бачанага і перажытага" (1992), даследаванняў "Гісторыя беларускай літаратуры. Ч. 1. Фальклор" (1976), "Гісторыя беларускай культуры. Ч. 2. Перыяд Вялікага Княства Літоўскага" (1981), "Ігнат Дварчанін, палітык і вучоны" (у сааўтарстве з А. Бергман і Е. Тамашэўскім, 1990), "Беларуская абраднасць і фальклор усходняй Беласточчыны" (1990) — апошнія чатыры працы выйшлі на польскай мове. У сааўтарстве з В. Шведам выдаў беларускія хрэстаматыі для VII і VIII класаў. Творы А. Баршчэўскага перакладаліся на англійскую, нямецкую і інш. мовы. У сваю чаргу ён сам перакладае з беларускай, рускай і ўкраінскай на польскую мову, у прыватнасці, пераклаў зборнік беларускіх народных казак "Д'ябальская скрыпка" (1973, 1977), "Невычэрпны збан" (1976), зборнікі вершаў В. Лукшы (1983), Я. Купалы (1984), В. Віткі (1985), А. Пысіна (1985), паэму Я. Купалы "Яна і я" (1985), зборнікі рускіх і ўкраінскіх казак і інш. Галоўныя тэмы паэзіі — вернасць родным караням, складаны духоўны свет сучаснага чалавека, інтымныя пачуцці. Вершы А. Баршчэўскага вылучаюцца экспрэсіўнасцю, метафарычнасцю. Аўтар драматычных і празаічных твораў, падручнікаў для студэнтаў. Даследуе фальклор Беласточчыны. Перакладае з беларускай, рускай і ўкраінскай моваў.

Узнагароджаны медалём Ф. Скарыны (1991), іншымі ўзнагародамі.

Адам Мальдзіс

Барэйка Аркадзь

Барэйка Аркадзь Аляксандравіч *(26.1.1898, в. Дуброўка, цяпер Полацкі р-н Віцебскай вобл. – 12.12.1955, Масква), военачальнік. Герой Савецкага Саюза.*

У Савецкай Арміі А. Барэйка з 1918 г. У 1920 г. скончыў Віцебскія пяхотныя камандзірскія курсы. У 1922 г. — курсы "Выстрал". Удзельнік грамадзянскай вайны. У савецка-фінскую вайну 1939–1940 гг. камандаваў палком. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны на фронце. Камандуючы 9-м гвардзейскім стралковым корпусам (61-я армія, Цэнтральны фронт), вызначыўся ў бітве за Днепр. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена ў студзені 1944 г. У 1945 г. А. Барэйка скончыў Ваенную акадэмію Генштаба. Быў ваенным камендантам Вены. У 1953 г. у званні генерал-маёра выйшаў у адстаўку. Узнагароджаны 3 ордэнамі Леніна, 2 ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнамі Суворава 2-й ступені.

Алесь Карлюкевіч

Баталаў Рыгор

Баталаў Рыгор Міхайлавіч *(28.1.1915, Віцебск), военачальнік, мемуарыст, Герой Савецкага Саюза.*

У Савецкай Арміі Р. Баталаў з 1934 г. Скончыў Мінскае ваеннае вучылішча (1937), у 1942 г. — паскораны курс Ваеннай акадэміі імя М. Фрунзе, у 1952 г. прайшоў поўны курс той жа акадэміі. У 1959 г. скончыў Ваенную акадэмію Генштаба. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена ў кастрычніку 1943 г. за фарсіраванне Дняпра на чале 229-га стралковага палка (72-я гвардзейская стралковая дывізія, Стэпавы фронт). У 1971 г. у званні генерал-лейтэнанта Р. Баталаў выйшаў у адстаўку. Працаваў намеснікам дырэктара Інстытута кібернетыкі АН Украіны. Сярод іншых баявых узнагарод Р. Баталава 4 ордэны Чырвонага Сцяга, ордэны Кутузава 2-й ступені, Чырвонай Зоркі. Выдаў мемуары "Ратнае поле" (Кіеў, 1985).

Алесь Карлюкевіч

Белы Валерый

Белы Валерый Фёдаравіч *(22.8.1948, г. Крычаў Магілёўскай вобл.), канструктар касмічнай тэхнікі.*

В. Белы нарадзіўся ў сям'і электрыка. У 1966 г. скончыў Крычаўскую СШ №2. Некаторы час працаваў мастаком-афарміцелем на заводзе гумава-тэхнічных вырабаў у Крычаве. Затым паступіў у Маскоўскае вышэйшае тэхнічнае вучылішча імя М. Баумана. У 1973 г. быў прызваны на ваенную службу ў Савецкую Армію. Пасля дэмабілізацыі працягнуў вучобу ў тым жа вучылішчы (1976–1978). Скончыўшы вучобу, працаваў інжынерам-канструктарам Навукова-вытворчага аб'яднання "Энергія" (цяпер Ракетна-касмічная карпарацыя "Энергія" імя С. П. Каралёва). Займаўся стварэннем і ўдасканаленнем універсальнай ракетна-касмічнай сістэмы "Энергія".

Жыве ў Каралёве Маскоўскай вобл.

А. Кажамяка (в. Пенькаўка Клімавіцкага р-на)

Белы Міхаіл

Белы Міхаіл Фёдаравіч *(25.10.1935, г. Крычаў Магілёўскай вобл. — 7.6.1988, г. Каралёў Маскоўскай вобл.), балістык касмічных апаратаў.*

М. Белы, брат В. Белага, скончыў сярэднюю школу ў Крычаве з залатым медалём. Яшчэ ў дзяцінстве ў яго выявіліся здольнасці да матэматыкі і жывапісу. Пасля заканчэння ў 1958 г. Днепрапятроўскага дзяржаўнага універсітэта працаваў у Асобым канструктарскім бюро (цяпер Ракетна-касмічная карпарацыя "Энергія" імя С. П. Каралёва). За тры гады скончыў механіка-матэматычны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. В. Ламаносава. На прадпрыемстве займаўся балістыкай касмічных лятальных апаратаў: рыхтаваў разліковыя дадзеныя па вывядзенню іх на арбіту і стыкоўцы. Удзельнічаў у балістычных разліках 50-ці пускаў касмічных лятальных апаратаў.

Пахаваны ў Крычаве.

А. Кажамяка (в. Пенькаўка Клімавіцкага р-на)

Бескін Ізраіль

Бескін Ізраіль Саламонавіч *(25.11.1895, Віцебск – 15.1.1964, Іркуцк), военачальнік. Герой Савецкага Саюза.*

У Савецкай Арміі І. Бескін з 1918 г. Удзельнічаў у грамадзянскай вайне на Далёкім Усходзе, у савецка-фінскай вайне 1939–1940 гг. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны на фронце — начальнік артылерыі механізаванага корпуса, намеснік начальніка артылерыі арміі. Камандуючы артылерыяй 70-й арміі (2-гі Беларускі фронт), кваліфікавана спланаваў і арганізаваў дзеянні артылерыі ў Вісла-Одзерскай аперацыі па прарыву моцна наладжанай абароны праціўніка і пры фарсіраванні Одэра паўднёвей г. Шчэцін (Польшча). Званне Героя Савецкага Саюза І. Бескіну прысвоена ў маі 1945 г. У 1953 г. у званні генерал-лейтэнанта выйшаў у адстаўку. Жыў у Іркуцку.

Алесь Карлюкевіч

Блажэўскі Рамуальд

Блажэўскі Рамуальд Восіпавіч *(26.5.1839, Гродна – 1907, Казань), матэматык, прыват-дацэнт.*

Р. Блажэўскі скончыў Гродзенскую гімназію (1855) і ў тым жа годзе паступіў на медыцынскі факультэт Маскоўскага універсітэта. Перавёўся на фізіка-матэматычны факультэт і скончыў яго кандыдатам у 1860 г., пасля чаго быў накіраваны на навуковую стажыроўку ў Парыж. У 1867 г. абараніў доктарскую дысертацыю па матэматыцы. З 1869 г. — прыват-дацэнт Маскоўскага універсітэта. Выкладаў матэматычную фізіку. Распрацаваў і вёў спецкурс па геаметрычнай оптыцы. У 1872–1873 гг. выкладаў матэматыку ў гімназіях па запрашэнню Варшаўскай навучальнай акругі. У 1874–1887 гг. працаваў настаўнікам матэматыкі ў навучальных установах Уфы. З 1888 г. — прыват-дацэнт чыстай матэматыкі Казанскага універсітэта.

Р. Блажэўскі навуковыя даследаванні праводзіў у галіне інтэгральнага вылічэння і матэматычнай фізікі. Сярод асноўных яго навуковых прац — "Аб эліптычных інтэгралах 3-га віда" (М., 1864); "Пра сучасны стан вышэйшай оптыкі" (Варшава, 1873); "Sur un probleme de Geometrie plane" (Nouvelles annales des mathematiques. 1894–1895. Т. 1; "Solution elementaire d'une question probabilities" (Nouvelles annales des mathematiques. 1894–1895. Т. 1.

Вольга Гапоненка

Блізняцова Марыя

Блізняцова Марыя Васільеўна *(1906 г., в. Амінавічы Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Асіповіцкі р-н Магілёўскай вобл.), вучоны, выкладчык.*

Нарадзілася М. Блізняцова ў сялянскай сям'і. У 1920-я гг. вучылася на рабфаку ў Мінску, пасля заканчэння якога паступіла на хімічны факультэт Маскоўскага універсітэта. Але з-за хваробы была вымушана перапыніць вучобу. Затым паступіла ў Ваенна-медыцынскую акадэмію ў Ленінградзе ў ліку першага эксперыментальнага жаночага набору. Пасля заканчэння вучобы атрымала чын капітана, працавала ваенным хірургам. З 1938 г. — загадчыца шпіталя ў Полацку. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны — ваявала на Паўночным, Ленінградскім франтах, знаходзілася ў блакадным Ленінградзе. Пасля заканчэння вайны працавала выкладчыцай ў Ваенна-медыцынскай акадэміі, займалася навукова-даследчай працай ў галіне хірургіі. Аўтар каля 50 навуковых прац. Цяпер знаходзіцца на пенсіі. Узнагароджана ордэнамі і медалямі.

Ларыса Языковіч

Блузман Пётр

Блузман (Блузманас) Пётр (Пятрас) *(1.10.1915, в. Плоткі Віцебскага пав., цяпер Віцебскай вобл.), батанік, фізіёлаг раслін, прафесар.*

П. Блузман скончыў Вільнюскі універсітэт. З 1944 г. працаваў там выкладчыкам, з 1975 г. — загадчыкам кафедры фізіялогіі і мікрабіялогіі раслін. Адначасова ў 1945–1959 гг. выкладаў у Вільнюскім педагагічным інстытуце.

П. Блузман даследаваў уздзеянне вітамінаў групы В, мікраэлементаў на расліны, іх рост і ўраджайнасць. Даказаў, што мікраэлементы стымулююць біясінтэз тыямінавай і нікацінавай кіслот у лісцях раслін, адкрыў рэчывы, якія павышаюць іх устойлівасць. П. Блузман выдаў кнігі "Жыўленне і ўраджайнасць раслін" (1961), "Мікрабіялагічная тэхніка" (1970), "Жыццё ў Сусвеце" (1973), "Малекулы і жыццё" (1977). Адзін з аўтараў падручніка "Фізіялогія раслін" (1974).

Яніна Кісялёва

Брадоўскі Леан

***Брадоўскі Леан** (3.11.1918, Мінск), публіцыст, юрыст, сацыёлаг.*

Л. Брадоўскі нарадзіўся ў беларускай сям'і. Яго бацька быў уладальнікам маёнтка Хоціхава недалёка ад Барысава, маці паходзіла з Гомельшчыны. Першыя 10 год свайго жыцця Л. Брадоўскі з сям'ёй правёў у Брэсце-над-Бугам. Пасля двухгадовага прабывання ў г. Лукаў на Падляшшы пераехаў з бацькамі на Віленшчыну, якая стала для яго "малой бацькаўшчынай". У 1937 г. скончыў Віленскую гімназію імя Зыгмунта Аўгуста. Вучыўся ў Віленскім універсітэце на факультэце права і грамадскіх навук, скончыць які не змог з-за падзей Другой сусветнай вайны. У 1946 г. скончыў юрыдычна-эканамічны факультэт універсітэта імя А. Міцкевіча ў Познані. У 1972 г. атрымаў званне доктара юрыдычных навук ва універсітэце М. Каперніка ў Торуні. Яго тэарэтычнай і практычнай спецыяльнасцю была сацыяльная палітыка — даследаванне і наладжванне разнастайных сувязей паміж людзьмі ў розных жыццёвых абставінах. Л. Брадоўскі быў праціўнікам таталітарнага гітлераўскага і сталінскага рэжымаў, анархіі, заўсёды выступаў за сацыяльную справядлівасць і падпарадкаванне дзяржаўным законам. У грамадскіх справах выкарыстоўваў метады дыялогу ці неапартуністычнага кампрамісу. Працаваў у гаспадарчым муніцыпалітэце Прамыслова-гандлёвай палаты, у Таварыстве "ПАКС" тэрытарыяльным муніцыпалітэце Варшаўскай народнай рады. Л. Брадоўскі быў сааўтарам новых форм самакіравання жыхароў у асяроддзі дзеля эканамічнага і выхаваўчага ўмацавання сям'і як асноўнай сацыяльнай ячэйкі. Кіраваў навуковымі даследаваннямі і сацыяльнымі эксперыментамі на тэрыторыі розных польскіх гарадоў. У час ваеннага становішча ў Польшчы ў 80-х гг. Л. Брадоўскі быў заснавальнікам Дыялогавай групы "Кансенсус", мэтай якой была легалізацыя руху "Салідарнасць". Гэтае аб'яднанне ініцыявала гістарычны польскі "круглы стол", які пачаў сваю работу 6 лютага 1989 г. У перыяд гарбачоўскай "галоснасці" і "перабудовы" Л. Брадоўскі са сваёй жонкай Данутай, якая нарадзілася ў Кракаве і выхоўвалася ў Вільні, распачалі дзейнасць па прымірэнню і супрацоўніцтву палякаў з літоўцамі. У выніку гэтага 10 снежня 1988 г. быў створаны Агульнапольскі клуб прыхільнікаў Літвы, друкаваным органам якога з'яўляецца квартальнік "Lithuania", на старонках якога друкуецца многа беларусазнаўчых матэрыялаў. Л. Брадоўскі стаў ганаровым членам клуба.

Л. Брадоўскі заўсёды быў прыхільнікам мірнага суіснавання і творчага супрацоўніцтва славянскіх народаў — беларускага, польскага, літоўскага, рускага і ўкраінскага. Значнае месца ў яго публіцыстыцы займае беларуская праблематыка. Ён быў удзельнікам II Міжнароднага кангрэса беларусістаў. Ініцыяваў напісанне кнігі пра родную вёску Хаціхава, устаноўку ў Барысаве крыжа ў памяць ксяндза Генрыка Глябовіча, расстралянага нацыстамі.

Заахвочвае пераклады беларускай паэзіі.

Чэслаў Сэнюх (Варшава)

Брайцаў Іван

***Брайцаў Іван Раманавіч** (27.1.1870, в. Забелішына Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Хоцімскі р-н Магілёўскай вобл. – 4.1.1947, Горкі (Ніжні Ноўгарад), Расія, матэматык, прафесар.*

Я. Брайцаў скончыў Клімавіцкае павятовае вучылішча (1885), два гады працаваў вясковым настаўнікам. У 1892 г. з адзнакай скончыў 6-ю Маскоўскую гімназію. З 1892 г. Я. Брайцаў — студэнт матэматычнага аддзялення фізіка-матэматычнага факультэта Маскоўскага універсітэта. У 1897 г. як адзін з лепшых выхаванцаў універсітэта быў пакінуты для падрыхтоўкі да прафесарскага звання. У 1899 г. абраны прыват-дацэнтам Маскоўскага універсітэта. Працаваў у Варшаўскім політэхнічным інстытуце (1900–1916) і Варшаўскім універсітэце (1908–1915), Данскім політэхнічным інстытуце (г. Новачаркаск, 1907–1908). У 1904 г. абараніў магістэрскую дысертацыю і быў абраны прафесарам па кафедры чыстай матэматыкі, з 1908 г. загадваў кафедрай матэматыкі Варшаўскага політэхнічнага інстытута. У 1915 г. быў эвакуіраваны разам з Варшаўскім політэхнічным інстытутам у Ніжні Ноўгарад. Я. Брайцаў — адзін з тых прадстаўнікоў дарэвалюцыйнай навукі, хто без ваганняў прызнаў савецкую ўладу. У 1918–1939 гг. быў дэканам фізіка-матэматычнага факультэта Ніжагародскага (Горкаўскага) універсітэта (адкрыты ў 1918 г.) і загадваў там кафедрай матэматыкі; з 1942 г. загадваў кафедрай тэорыі функцый, якая была створана па яго ініцыятыве. Член Маскоўскага матэматычнага таварыства (1904).

Навуковыя даследаванні Я. Брайцаў праводзіў у галіне тэорыі аналітычных функцый і функцыянальных ураўненняў. Прапанаваў метад пошуку асаблівых кропак аналітычных функцый і метад даследавання паводзін гэтых аналітычных функцый блізу асаблівых кропак. Распрацаваў метады рашэння і даследавання розных класаў функцыянальных ураўненняў у комплекснай вобласці. Выканаў даследаванні ў галіне спецыяльных функцый. Аўтар 60 навуковых прац, манаграфіі. З'яўляецца заснавальнікам навуковай школы ў галіне аналітычных функцый. Сярод яго вучняў — члены-карэспандэнты АН СССР М. Субоцін, А. Лявонцьеў, ганаровы дзеяч навукі РСФСР І. Лахін.

Я. Брайцаў прымаў удзел у стварэнні Беларускага дзяржаўнага універсітэта, склаў першы навучальны план для яго фізіка-матэматычнага факультэта.

Вольга Гапоненка

Брант Барыс

***Брант Барыс** (да 1933 г. Браудо; 21.8.1901, Мінск — 26.11.1975, Вільнюс), рэвалюцыйны дзеяч.*

Б. Брант нарадзіўся ў сям'і служачых. У 1917 г. скончыў рэальную школу. Уступіў у РКП(б) у 1919 г. У 1911–1921 гг. вёў нелегальную рэвалюцыйную дзейнасць у г. Паневежысе, быў членам камітэта КПЛ у Паневежскім р-не. У 1921–1922 гг. вёў партыйную работу сярод салдат у Каўнасе, за што быў зняволены. У 1922–1923 гг. вучыўся ў Каўнаскім універсітэце, быў сакратаром партыйнага гуртка студэнтаў. Вясной 1923 г. эміграваў у Германію, вучыўся ў Іенскім універсітэце, дзе атрымаў спецыяльнасць агранома. Працаваў у Берліне ў савецкім гандлёвым прадстаўніцтве. Быў членам Германскай камуністычнай партыі. У 1928 г. удзельнічаў у арганізацыі ў Берліне па ініцыятыве ЦК КПЛ з'езда палітэмігрантаў Літвы. Восенню 1929 г. Б. Брант па рашэнню ЦК КПЛ вярнуўся ў Літву. У 1929–1930 гг. вёў нелегальную партыйную работу ў Клайпедзе, быў сакратаром камітэта КПЛ Клайпедскага края. За рэвалюцыйную дзейнасць быў прыгавораны да турэмнага заключэння. У 1932 г. зноў эміграваў у Германію. Працаваў у органах КП Германіі. У канцы 1932 г. вярнуўся ў СССР. У 1932–1937 гг. працаваў у выканаўчым камітэце Чырвонага інтэрнацыянала прафесійных саюзаў у Маскве. У 1937 г. рэпрэсіраваны, вызвалены ў 1947 г., быў на гаспадарчай рабоце ў Горкаўскай і Калужскай абласцях. У 1948 г. Б. Брант быў зноў арыштаваны і высланы ў Краснаярскі край. Рэабілітаваны ў 1955 г. З 1955 да 1972 гг. працаваў у выканаўчым камітэце Вільнюскага р-на, у Міністэрстве меліярацыі і воднай гаспадаркі Літоўскай ССР.

Яніна Кісялёва

Брафман Якаў

***Брафман Якаў Аляксандравіч** (каля 1825, Клецк Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер — цэнтр раёна Мінскай вобл. – 1879, Пецярбург), публіцыст.*

Асірацеўшы ў раннім дзяцінстве, Б. Брафман уцёк з роднага горада, каб пазбегнуць набора у рэкруты. У 34 гады перайшоў з іудзейства ў праваслаўе, стаў выкладаць іўрыт у Мінскай семінарыі. Пасля працаваў у Вільні і Пецярбургу цэнзарам кніг, якія выдаваліся на іўрыце і ідыш. У рускіх перыядычных выданнях выкрываў яўрэйскае рэлігійнае жыццё. У 1869 г. выдаў "Кнігу кагала" — матэрыялы для вывучэння яўрэйскага побыту (пераклад пратакольных запісаў, пастаноў кіраўніцтва Мінскай яўрэйскай абшчыны). У 1875–1882 гг. выйшла другое, дапоўненае выданне кнігі ў 2-х т. (1 т. уяўляў сабой уводзіны да матэрыялаў, т. 2 — пераклад 1055 пастаноў кіраўніцтва Мінскай абшчыны (супраць 285 у 1-м выд.). Кнігі мелі вялікі поспех у антысеміцкіх колах і былі перакладзены на французскую, польскую і нямецкую мовы. "Кніга кагала" шырока выкарыстоўвалася антысеміцкімі аўтарамі ў антыяўрэйскай прапагандзе і адначасова паслужыла гісторыкам матэрыялам для вывучэння яўрэйства Расіі ў XIX ст.

Браніслава Котава

Брыш Аркадзь

***Брыш Аркадзь Адамавіч** (14.5.1917, Мінск), вучоны ў галіне абароннай прамысловасці, прафесар. Герой Сацыялістычнай Працы (1983). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1955), Ленінскай прэміі (1960).*

Нарадзіўся А. Брыш у сям'і настаўніка. У 1935 г. скончыў сярэднюю школу і паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Белдзяржуніверсітэта, які скончыў у 1940 г. З 1941 г. працаваў у рэнтгенаўскай лабараторыі АН БССР навуковым супрацоўнікам. У час Вялікай Айчыннай вайны — удзельнік адной з падпольных груп Мінска, са снежня 1941 г. — разведчык штаба партызанскай брыгады імя К. Варашылава (Мінская вобл.). З чэрвеня 1944 г. накіраваны ў АН СССР для навуковай работы. Працаваў у Інстытуце машыназнаўства АН СССР. У 1947–1954 гг. А. Брыш — навуковы супрацоўнік навукова-эксперыментальнай лабараторыі Галоўбуда СССР. З 1954 г. — намеснік галоўнага канструктара, а з 1964 г. — галоўны канструктар Усерасійскага навукова-даследчага інстытута эксперыментальнай фізікі (Масква). У 1958 г. абараніў дысертацыю на ступень доктара тэхнічных навук, у 1965 г. зацверджаны у навуковым званні прафесара.

А. Брыш — аўтар навуковых прац па даследаванню працэсаў выбуху і ўзбуджэння дэтанацыі. Ім распрацаваны рэнтгенаўскія і асцылаграфічныя метады даследавання хуткасных працэсаў выбуху. Прапанаваў

метады аўтаматызацыі выбуху і нейтроннага ініціявання атамных зарадаў. Прымаў удзел у стварэнні першай у СССР атамнай бомбы. За даследаванні ў галіне абароннай прамысловасці ўзнагароджаны Ленінскай і Дзяржаўнай прэміямі СССР, чатырма ордэнамі Леніна, двума ордэнамі Кастрычніцкай рэвалюцыі, ордэнам Чырвонай Зоркі. У гады вайны прымаў удзел у аперацыі падпольнай групы па выратаванню і захаванню сейфа з архівам Я. Коласа.

Вольга Гапоненка

Будзіловіч Антон

Будзіловіч Антон Сямёнавіч *(12(24).5.1846, в. Коматава Гродзенскай губ., цяпер Гродзенскі р-н – 12(25).12.1908, Пецярбург), гісторык, мовазнавец, філосаф, публіцыст.*

Нарадзіўся А. Будзіловіч ў сям'і уніяцкага святара. Вучыўся ў Віленскай гімназіі, Віленскай духоўнай семінарыі. У 1867 г. скончыў Пецярбургскі універсітэт. З 1875 г. прафесар Нежынскага гісторыка-філалагічнага інстытута. У 1879 г. абараніў доктарскую дысертацыю "Агульнаславянская мова ў шэрагу іншых агульных моваў старажытнай і новай Еўропы". З 1881 г. — прафесар, дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта Варшаўскага універсітэта, з 1892 г. — рэктар Юр'еўскага (цяпер Тартускі) універсітэта. У 1901 г. абраны членам Савета Міністэрства народнай асветы. Выступіў ініцыятарам адкрыцця славяназнаўчых кафедраў ва універсітэтах Расіі. З 1907 г. — рэдактар "Московских ведомостей".

Даследаваў старажытнаславянскае пісьменства, гісторыю, літаратуру і мову славянскіх народаў. У працы "Першабытныя славяне ў іх мове, быту і ўяўленнях паводле даддзеных лексікальных..." (1878—1882, не завершаная) упершыню ў рускай славістыцы разгледзеў пытанне пра славянскую матэрыяльную культуру і тэрыторыю. Гісторыю праваслаўнай царквы на Беларусі разглядаў у даследаваннях "Гістарычная нататка пра царкоўна-маёмасныя запісы з Заходняй Расіі" (1871), "Парадак ўтварэння нерухомай уласнасці царкоўнай ў Заходняй Расіі" (1882), "Вопіс нерухомай маёмасці Заходняй царквы (за X—XIX стст.)" (1882). Прыхільнік ідэі гуртавання славянскіх дзяржаў вакол Расіі і праваслаўнай веры. Аўтар гістарычных прац "Чэхія і Маравія" (1881), "Нарысы з сербскай гісторыі" (1877). Член Пецярбургскай акадэміі навук (1882).

А. М. Нечухрын (БелСЭ), іншыя энцыклапедыі, "Востоковеды..."

Булгарын Язэп

Булгарын Язэп *(1846 – ?), удзельнік вызваленчага руху.*

Паходзіў са шляхты Магілёўскай губ. За ўдзел у паўстанні 1863 г., па канфірмацыі камандуючага войскамі Віленскай вайсковай акругі, быў пазбаўлены ўсіх правоў і сасланы на катаржныя работы на заводах тэрмінам на 4 гады ў Іркуцкую губ. Па маніфесту 25 мая 1868 г. быў прыпісаны да сялян Урыкоўскай вол., а ў студзені 1869 г. перапісаны ў Вяцкую губ. Загадам ад 27 студзеня 1872 г. зноў паселены ў Іркуцкай губ., адкуль згодна з прадпісаннем генерал-губернатара Усходняй Сібіры міністрам унутраных спраў, па ўзгадненню з начальнікам III Аддзялення, за дрэнныя паводзіны быў пераведзены ў Якуцкую вобл. Прадпісаннем Якуцкага губернатара ад 5 сакавіка 1874 г. прызначаны ў Амгінскую вёску Алёкмінскай сялянскай вол., куды быў дастаўлены 9 красавіка 1874 г., дзе быў прыпісаны да сялянскай грамады.

Алесь Баркоўскі (Якуцк)

Бурш Яша

Бурш Яша (сапр. Анісяровіч Якаў*; 12.11.1929, г. Баранавічы), паэт, мастак.*

Пасля вайны Я. Бурш выехаў з бацькамі ў Польшчу. Скончыў Варшаўскую акадэмію мастацтва (1957). Працуе настаўнікам.

Друкавацца Я. Бурш пачаў у 1959 г. у беластоцкім зборніку "Рунь". Аўтар паэтычнага зборніка "Прамень думкі", выдадзенага ў 1964 г. як дадатак да "Нівы". Друкаваўся ў зборніках "Мой родны кут", "Белавежа", "Літаратурная Беласточчына", "Беларускім календары", штотыднёвіку "Ніва". Вершы Я. Бурша апавядаюць пра складаны духоўны свет сучаснага чалавека, выбар ім шляхоў у грамадстве, інтымныя пачуцці. Шмат месца ў яго творчасці займае пейзажная лірыка. Паэтычная мова Я. Бурша ўскладнёная, разлічаная на вобразна-асацыятыўнае мысленне чытача. Творы паэта перакладаліся на польскую мову. Адзін з арганізатараў беларускага літаратурна-мастацкага руху на Беласточчыне, член аб'яднання "Белавежа". Мастацкія творы Я. Бурша выстаўляліся ў Польшчы і за граніцай.

Адам Мальдзіс

Бурштынаў Аляксей

Бурштынаў Аляксей Данілавіч *(24.2.1902, Астровенская вол. Магілёўскай губ.) вучоны-лесавод, педагог, мемуарыст.*

А. Бурштынаў вучыўся у Віцебскім сельскагаспадарчым інстытуце, закончыў Ленінградскую лесатэхнічную акадэмію. У гады Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у партызанскім руху ў акупаваных раёнах Маскоўскай вобл. і Паўночнага Каўказа. Практычна ўсё жыццё А. Бурштынава звязана з лясной гаспадаркай. Узначальваў у Маскве Інстытут лесаводства і механізацыі лясной гаспадаркі, кіраваў Маскоўскім лясным інстытутам, Інстытутам драўніны. Быў начальнікам Галоўнага ўпраўлення адукацыі Міністэрства лясной гаспадаркі СССР. Аўтар больш як 150 навуковых прац, у тым ліку 8 кніг. Некаторыя з іх ("Лясныя рэсурсы СССР і свету" і інш.) выдадзены за мяжой. Рэдагаваў часопісы "Лес и степь", "В защиту леса", "Лесное хозяйство". Пры яго актыўным удзеле выдадзены розныя дапаможнікі, даведнікі, а таксама фундаментальная праца "Лясная энцыклапедыя". Аўтар мемуараў пра партызанскую вайну. Пра А. Бурштынава гаворыцца у манаграфіі А. Ніканава "Спіраль шматвяковай драмы: Аграрная навука і палітыка Расіі (XVIII–XX стст.)" (Мн., 1996).

Алесь Карлюкевіч

Буры Мікалай

Буры Мікалай Лаўрэнавіч *(22.8.1952., в. Красны Вугал Бярэзінскага р-на Мінскай вобл.), беларускі грамадскі дзеяч у Латвіі.*

М. Буры нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Пасля дзесяцігодкі паступіў на лесагаспадарчы факультэт Тэхналагічнага інстытута імя Кірава. Пасля заканчэння інстытута (1974) быў накіраваны ляснічым у Вентспілс (Латвія), потым працаваў у Карэліі і зноў у Латвіі. Жыве ў Рызе.

У 1995 г. М. Буры далучыўся да грамадскай дзейнасці беларускай дыяспары ў Латвіі, прымаў актыўны ўдзел у рабоце Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны "Прамень". Пры яго непасрэдным удзеле плённа распачаліся выданні газеты "Прамень" і канцэртныя выступленні ансамбля "Надзея". Вялікі рэзананс у беларускім замежжы атрымалі праведзеныя таварыствам "Дыпламатычны салон", Дні беларускай культуры, фестываль "Латвіяс вайнагс" ("Латышскі вянок"), Фестываль беларускай культуры, рамёстваў і майстэрства беларускага народа (Рыга, 1999).

Алесь Карповіч (Рыга)

Бутама-Названава Вольга

Бутама-Названава Вольга Мікалаеўна *(14(26). 10.1888, Быхаў Магілёўскай губ., цяпер Магілёўскай вобл. – 1.6.1960, Масква), камерная спявачка, педагог.*

В. Бутама-Названава вучылася ў Пецярбургскай кансерваторыі (клас Н. Ірэцкай, 1910–1915 гг.). Пасля заканчэння вяла канцэртную дзейнасць. З вялікім поспехам выступала з сольнымі канцэртамі ў Маскве, Кіеве і інш. гарадах. Прымала ўдзел у аўтарскіх канцэртах С. Рахманінава, А. Грачанінава, С. Пракоф'ева. З 1919 г. жыла ў Кіеве, з 1921 г. — у Маскве. На канцэртных эстрадах выступала да канца 1920-х гг. У 1926 г. гастралявала ў Берліне і Парыжы.

Рэпертуар спявачкі складаўся з твораў рускіх і заходнееўрапейскіх кампазітараў (М. Глінка, А. Даргамыжскі, М. Мусаргскі, А. Барадзін, П. Чайкоўскі, Л. Бетховен, Ф. Шуберт, І.-С. Бах, Р. Шуман). Высокую ацэнку таленту спявачкі даў А. Луначарскі. В. Бутама-Названава вяла педагагічную дзейнасць у Кіеўскай кансерваторыі (1919–1921), у Фрунзе (1941–1945). Ёй прысвечаны артыкул "Спявачка Бутама-Названава" С. Багуслаўскага (Зрелища. 1924. № 76).

Алесь Карлюкевіч

Бутрамееў Уладзімір

Бутрамееў Уладзімір Пятровіч *(20.3.1943, в. Расна Горацкага р-на Магілёўскай вобл., па іншых звестках хутар Вуеўскі каля Мсціслава), беларускі і рускі пісьменнік, кнігавыдавец-энцыклапедыст.*

Бацькі У. Бутрамеева былі настаўнікамі. Скончыў Раснянскую сярэднюю школу (1970), геаграфічны факультэт Магілёўскага пединстытута (1974). Працаваў у сельскіх школах Горацкага і Чэрыкаўскага раёнаў

Магілёўскай вобл. У 1980 г. пераехаў у пас. Альберцін каля Слоніма, на радзіму жонкі. Працаваў на Слонімскай папяровай фабрыцы, настаўнікам у вячэрняй школе, у Слонімскім прафесійна-аматарскім тэатры. У 1985 г. кінастудыя "Беларусьфільм" рэкамендавала У. Бутрамеева для паступлення на Вышэйшыя двухгадовыя курсы сцэнарыстаў і рэжысёраў у Маскве, якія скончыў з дыпломам кінадраматурга мастацкага фільма. У 1989–1991 гг. вучыўся ў Маскве на Вышэйшых літаратурных курсах. З 1991 г. працаваў на Беларускім тэлебачанні. З 1994 г. — у Маскве. Ініцыятар, каардынатар і рэдактар энцыклапедычных праектаў у маскоўскім выдавецтве "Олма-прэс". Свой творчы шлях У. Бутрамееў пачаў з публікацый у раённым і дзіцячым друку. Першую яго п'есу "Размовы па-суседску" набыў Беларускі рэспубліканскі метадычны цэнтр (у 1986 г. яна была перакладзена на малдаўскую мову). П'еса "Ізноў Несцерка" была пастаўлена народным тэатрам Мінскага аўтазавода. Па сцэнарыю У. Бутрамеева "Свой сад" быў зняты тэлефільм (1987), па п'есе "Страсці па Аўдзею" ("Крык на хутары") пастаўлены спектакль у тэатры імя Янкі Купалы. У Маскве на рускай мове выйшлі зборнікі яго аповесцей і апавяданняў "Любіць і верыць" (1986), "Зрух: Хроніка месца і часу" (1989). Аўтар гістарычна-публіцыстычнага рамана "Карона Вялікага княства" (М., 1999), прысвечанага мінуламу Беларусі і яе сучаснаму інтэлектуальнаму жыццю. У творчасці У. Бутрамеева адчуваюцца традыцыі беларускай, рускай і заходнееўрапейскай класікі, энцыклапедычнасць ведаў, выкарыстоўваюцца сродкі сучаснага мастацкага выяўлення.

Любоў Гарэлік

Бучэль Таццяна

Бучэль Таццяна Фамінічна *(9.7.1955, в. Германавічы Шаркоўшчынскага р-на Віцебскай вобл.), беларускі грамадскі дзеяч у Латвіі.*

Пасля заканчэння сярэдняй школы Т. Бучэль вучылася ў Мінску — на факультэце нямецкай і англійскай моваў Педагагічнага інстытута замежных моваў, які закончыла ў 1977 г. Два гады працавала настаўніцай замежных моваў у Беларусі. Затым, пераехаўшы ў Латвію, выкладала англійскую мову ў Даўгаўпілскім педагагічным інстытуце. З 1980 г. працуе загадчыцай Калкунскай бібліятэкі Даўгаўпілскага р-на. У 1999 г. паспяхова абараніла магістэрскую працу на тэму "Фразеалагізмы з міфалагічнымі кампанентамі ў беларускай і рускай мовах" у Даўгаўпілскім педагагічным універсітэце.

Наша суайчыннiца з'яўляецца адным з арганізатараў Беларускага культурна-асветніцкага таварыства "Уздым" (г. Даўгаўпілс), актыўна ўдзельнічае ў яго дзейнасці, уваходзіла ў Раду таварыства, а ў 1998 г. была абрана старшынёй "Уздыма". Т. Бучэль вядзе заняткі ў беларускай нядзельнай школе, якая дзейнічае ў Даўгаўпілсе пры таварыстве, знаёміць дзяцей з беларускай мовай і літаратурай, гісторыяй і культурай Беларусі, арганізуе правядзенне беларускіх народных святаў, праводзіць конкурсы на лепшае сачыненне на беларускай мове, экскурсіі па гарадах Беларусі, Літвы і Латвіі. З'яўляецца выкладчыкам спецкурса па беларускай мове ў Даўгаўпілскім педагагічным універсітэце. Друкуецца ў мясцовай прэсе.

Станіслаў Валодзька (Даўгаўпілс, Латвія)

Бушко Мікалай

Бушко Мікалай *(1.9.1949, в. Навасады Беластоцкага ваяв., Польшча), інжынер дрэваапрацоўчай прамысловасці, беларускі культурны дзеяч.*

М. Бушко нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Скончыў пачатковую школу ў роднай вёсцы. Вучыўся ў Гайнаўскім тэхнікуме дрэваапрацоўчай прамысловасці. У 1977 г. скончыў варшаўскую Галоўную школу сельскай гаспадаркі. З 1979 г. — дырэктар Гайнаўскага дома культуры. Адначасова вучыўся на педагагічным факультэце Варшаўскага універсітэта. У 1982 г. выступіў ініцыятарам і арганізатарам агляду "Дні царкоўнай музыкі", які потым стаў адзіным у свеце Міжнародным фестывалем царкоўнай музыкі. У 1996 г. заснаваў фонд "Царкоўная музыка".

М. Бушко прымае актыўны ўдзел у беларускім і польскім культурным і грамадска-палітычным жыцці. Адзначаны царкоўнымі і свецкімі званнямі і ўзнагародамі.

Ірына Тамільчык

Бялыніцкі-Біруля Аляксей

Бялыніцкі-Біруля Аляксей Андрэевіч *(30.10.1864, в. Бабкова Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяперашняе месцазнаходжанне невядома – 18.6.1937, Ленінград), падарожнік, географ і заолаг, прафесар. Член-карэспандэнт Расійскай акадэміі навук (1923).*

Далёкім продкам А. Бялыніцкага-Бірулі быў віцебскі казак Сямён Біруля, які прымаў удзел у абароне Віцебска ад войск Івана Грознага; адзін з Бялыніцкіх-Біруляў загінуў пад сцягам Касцюшкі, другі быў паранены пад Кобрынам у баі супраць напалеонаўскіх войск; прадзед — А. Паленаў (1738–1816), гісторык і асветнік, у сачыненні "Аб прыгоне сялян у Расіі" (1766, апубл. 1865) яшчэ ў часы Кацярыны II прапанаваў абмежаваць прыгон; дзед служыў на флоце пад камандай Ф. Ушакова, удзельнічаў у штурме Корфы; бацька — Андрэй Сімпліцыянавіч Бялыніцкі-Біруля (1825–1916), прыродазнавец, арганізаваў у сваім маёнтку першую ў Беларусі метэаралагічную станцыю. Сярод сваякоў Аляксея Бялыніцкага-Бірулі былі А. Паленаў (1871–1947), адзін з заснавальнікаў нейрахірургіі ў СССР, акадэмік АМН з 1945 г.; вядомыя мастакі В. Паленаў (1844–1927) і В. Бялыніцкі-Біруля (1972–1957), народны мастак БССР і РСФСР, сапраўдны член АМ СССР.

А. Бялыніцкі-Біруля скончыў гімназію ў Вязьме і прыродазнаўчае аддзяленне Пецярбургскага універсітэта. Са студэнцкіх часоў збіраў расліны, марскіх жывёл; на працягу многіх год працаваў у Заалагічным музеі Пецярбургскай АН. Вывучаў фауну і флору Шпіцбергена. Але самая яркая старонка ў жыцці натураліста звязана з першай Палярнай экспедыцыяй Расійскай акадэміі навук на судне "Заря" (1900), якое ўзначальваў Э. Толь. Бялыніцкі-Біруля ўпершыню апісаў флору, сабраную на сланцах п-ва Чалюскін. У час плавання вучоны зрабіў шматлікія даследаванні на наяўнасць планктона ў моры Лапцевых. Ён пакінуў "Зарю" і з трыма паляўнічымі арганізаваў зімоўку на адным з аголеных астравоў — Новая Сібір. Затым ён даследаваў тундравую флору і жывёльны свет, у т. л. ружовую чайку. Пасля вяртання ў с. Казачча ён даведаўся, што Толь прапаў без весткі, калі пераходзіў па слабому льду ў раёне в-ва Бенета. А. Бялыніцкі-Біруля вярнуўся ў Пецярбург на пачатку 1903 г. Па выніках экспедыцыі апублікаваў некалькі навуковых прац, сярод якіх трэба адзначыць "Нарысы аб жыцці палярнага ўзбярэжжа Сібіры", змешчаныя ў "Записках Императорской Академии наук" (1907. Т. 18, № 2). Яшчэ раней у зборніку "Отчеты о работах Русской полярной экспедиции, находящейся под начальством барона Толля" (Известия Императорской АН. 1902. Т. 16, № 5) з'явіліся тры яго справаздачы. Заслугі даследчыка фауны і флоры палярных раёнаў Расіі і асабліва Новасібірскіх астравоў былі высока ацэнены, — яго абралі сапраўдным членам пяці навуковых таварыстваў. Ён шырока вядомы вучонаму свету апублікаванымі працамі (звыш 100) па сістэматыцы і біягеаграфіі розных груп бесхрыбетных, птушак і млекакормячых. Яго імя носяць заліў і гара на Таймыры.

Валерый Ярмоленка

Бялыніцкі-Біруля Вітольд

Бялыніцкі-Біруля Вітольд Каятанавіч *(17 (29).2.1872, маён. Крынкі Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Бялыніцкі р-н Магілёўскай вобл. — 18.6.1957, Масква), беларускі і рускі мастак-пейзажыст, педагог, акадэмік жывапісу (1908). Ганаровы член АН БССР (1947) Член Акадэміі мастацтваў СССР (1947). Народны мастак БССР (1944). Народны мастак РСФСР (1947).*

Дзяцінства В. Бялыніцкага-Бірулі прайшло на Віцебшчыне. Вучыўся ў рысавальнай школе М.Мурашкі ў Кіеве, Маскоўскім мастацкім вучылішчы (1889–1896). Адзін з арганізатараў Асацыяцыі мастакоў рэвалюцыйнай Расіі. Член Таварыства перасоўных мастацкіх выставак (1904), Таварыства імя Куінджы (1909). Як мастак В. Бялыніцкі-Біруля сфарміраваўся пад уплывам сваіх настаўнікаў С. Каровіна, М. Неўрава, В. Паленава, а таксама І. Левітана. Працягваў і развіваў традыцыі лірычнага пейзажа. Для яго твораў характэрны тонкая кампазіцыйная пабудова, складаныя нюансы каляровых суадносін, эмацыянальная выразнасць. Найбольш вядомыя творы "Вясна ідзе" (1899), "Вечныя снягі" (1901), "У канцы зімы" (1907), "Восень" (1908), "У час цішыні" (1909), "Перад вясной" (1919), "Аголеныя бярозкі", "Квітнеючы бэз" (1920–1930), "Блакітнай вясной", "Вясна ідзе" (1940–1950), "Зноў расцвіла вясна", "Беларусь. Пачатак лета", "Зялёны май", "Зазяленелі беларускія бярозкі" (усе 1947), серыі пейзажаў Яснай Паляны, сядзібы П. М. Чайкоўскага ў Кліне і інш. У 1947 г. падарожнічаў па Беларусі, жыў пад Мінскам.

Звыш 440 работ В. Бялыніцкага-Бірулі знаходзіцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі. У г. п. Бялынічы адкрыт Бялыніцкі мастацкі музей яго імя, у Магілёве — Мастацкі музей В.К.Бялыніцкага-Бірулі (аддзел Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі). З 1996 г. у Магілёве праходзяць Міжнародныя пленэры па жывапісу імя В. Бялыніцкага-Бірулі.

Ірына Тамільчык

Бялыніцкі-Біруля Вячаслаў

Бялыніцкі-Біруля Вячаслаў Вікенцьевіч *(1870, паводле інш. крыніц 1873, Мінская губ. – 5.12.1966, Якуцк), грамадска-палітычны дзеяч, пісьменнік, публіцыст. Сябар Рускага геаграфічнага таварыства, першы народны камісар фінансаў Якуцкай Рэспублікі (1922).*

Паходзіў з сям'і палкоўніка — удзельніка руска-турэцкай вайны, і настаўніцы французскай мовы. Сваяк беларускага мастака В. К. Бялыніцкага-Бірулі. У Мінскай губ. скончыў чатыры класы рэальнага вучылішча, у 13-гадовым узросце разам з бацькамі наведаў Парыж, Рым, краіны Афрыкі. За час вандровак Вячаслаў добра вывучыў французскую мову. За правіны бацькі сям'ю выслалі ў Іркуцкую губ. У 1897 г. В. Бялыніцкага-Бірулю прынялі на дзяржаўную службу 3-е аддзяленне штата Іркуцкай Казённай палаты. Ён дасылаў у мясцовыя выданні ("Иркутский вестник", "Губернские ведомости", "Сибирь", "Восточный обзор" і інш.) нататкі, кантактаваў з іркуцкімі літаратарамі, вучонымі — Н. М. Ядрынцавым, В. Обручавым. Па рашэнню Іркуцкай Казённай палаты ў 1900 г. Вячаслава накіравалі вучыцца на бухгалтара ў Ніжнедзінскае павятовае скарбніцтва тэрмінам на два месяцы, затым ён працаваў па гэтай спецыяльнасці ў Верхаленскім скарбніцтве.

Па-ранейшаму займаўся літаратурнай дзейнасцю, публікаваўся цяпер ужо і ў маскоўскіх, пецярбургскіх газетах, часопісах ("Охота", "Русская охота"). Іркуцкія ўлады неаднойчы спрабавалі прыцягнуць В. Бялыніцкага-Бірулю за яго літаратурныя "вопыты" да судовай адказнасці, хаця публіцыстычныя творы тычылся пераважна прыродазнаўства і геаграфіі.

У 1911–1917 гг. В. Бялыніцкі-Біруля жыве, працуе ў Алёкмінску Якуцкай вобл., друкуе ў якуцкім часопісе "Ленские волны" шэраг апавяданняў — "У лесе", "Чырок", "На кірмашы" і інш. Кастрычніцкую рэвалюцыю В. В. Бялыніцкі-Біруля сустрэў у Якуцку. Калі ўлетку 1918 г. там усталявалася савецкая ўлада, дапамагаў бальшавікам (кіраваў Якуцкай Казённай палатай). У час "калчакаўшчыны" 10 месяцаў правёў пад следствам і хатнім арыштам. Студзень і люты 1920 г. В. Бялыніцкі-Біруля адпрацаваў загадчыкам канцылярыі, пісарам Вайскова-рэвалюцыйнага штаба. З 1920 г. — кіраўнік фінансавага аддзела Якуцкага губрэўкама, удзельнічаў у нацыяналізацыі банкаў, канфіскацыі маёмасці, як баец часці асобага прызначэння ахоўваў горад. Стаў членам партыі бальшавікоў у студзені 1921 г. Патомны дваранін, ён адмовіўся ад другой часткі свайго прозвішча, падпісваўся "В. Бялыніцкі".

У маі 1922 г. Бялыніцкага прызначылі народным камісарам фінансаў Якуцкай Аўтаномнай Сацыялістычнай Рэспублікі.

Нягледзячы на "бесперапынна аддадзеныя" савецкай уладзе 1918–1929 гг., Бялыніцкаму пагражалі рэпрэсіі. Таму ён вымушаны быў пераехаць у Алёкмінскі р-н той жа Якуцкай вобл. Рыхтаваў спецыялістаў па бухгалтарскіму уліку, узначальваў арцель "Сібірак", выступаў з нататкамі ў газеце "Сацыалистическая Якутия". Пасля 1941 г. шмат друкаваўся ў газетах, пісаў нататкі для радыё — словам, спрыяў перамозе над фашызмам, за што пазней быў узнагароджаны медалём "За самаахвярную працу ў Вялікай Айчыннай вайне".

У 1943 г. вярнуўся з сям'ёй у Якуцк, пасля 1957 г. атрымліваў персанальную пенсію.

Алесь Баркоўскі (Якуцк), Святлана Сачанка

Бяляцкін Сымон

Бяляцкін Сымон *(1874, Магілёў — 1944, Асвенцім, Польшча), яўрэйскіі пісьменнік, юрыст, прафесар (1923).*

С. Бяляцкін скончыў у 1899 г. Адэскі універсітэт, працаваў адвакатам у Маскве, Пецярбургу. У 1922–1940 гг. — выкладчык юрыдычнага факультэта Каўнаскага універсітэта. У гады фашысцкай акупацыі зняволены ў Каўнаскім гета. У 1944 г. загінуў у Асвенцімскім канцэнтрацыйным лагеры.

Навуковыя працы С. Бяляцкіна прысвечаны пытанням прыгоннага права ("Прыватнае права", 1928). Абараняў дэмакратычныя прававыя прынцыпы. С. Бяляцкіным былі напісаны раманы, аповесці, драмы (зб. "Людзі і лёсы". 1934).

Яніна Кісялёва

Бярдзяеў Валер'ян

Бярдзяеў Валер'ян *(7.3.1885, — 28.11.1956, Варшава), дырыжор. пелагог.*

В. Бярдзяеў вучыўся ў лейпцыгскай кансерваторыі па класу кампазіцыі і скрыпкі. Пасля дэбюту ў Дрэздэне (1906) выступаў у Расіі, шматлікіх еўрапейскіх гарадах. З 1908 г. дырыжор Марыінскага тэатра ў Пецярбургу. У 1930 — 1939 гг. дырыжор і прафесар кансерваторыі ў Варшаве. З 1945 г. дырыжор, а таксама (з 1947) дырэктар філармоніі ў Кракаве, з 1949 г. — опернага тэатра ў Познані, а з 1954 г. — у Варшаве.

В. Бярдзяеў быў прафесарам кракаўскай, познаньскай і варшаўскай вышэйшых музычных школ. Асабліва славіўся сваёй творчай інтэрпрэтацыяй твораў Л. Бетховена і расійскай класічнай музыкі. Вельмі высока цаніўся як выкладчык класічнай музыкі. У 1955 г. атрымаў польскую дзяржаўную ўзнагароду I ступені.

Юрый Вашкевіч

Бяржыніс Віктар

Бяржыніс Віктар *(Вікторас; 1.1.1923, Гомель), работнік друку, літоўскі літаратар, перакладчык.*

В. Бяржыніс скончыў Швянчонскую настаўніцкую семінарыю, настаўнічаў у гімназіях г. Уцяны. З 1948 да 1950 гг. працаваў загадчыкам па літаратурнай частцы Літоўскага драматычнага тэатра. У 1950—1952 гг. — рэдактар Выдавецтва палітычнай і навуковай літаратуры. У 1952 г. скончыў факультэт літоўскай мовы і літаратуры Вільнюскага педагагічнага інстытута. У 1954–1958 гг. працаваў у Інстытуце літоўскай мовы і літаратуры, з 1958 да 1983 г. — у розных рэдакцыях "Літоўскай Савецкай Энцыклапедыі".

В. Бяржыніс пераклаў на літоўскую мову зборнік артыкулаў М. Дабралюбава "Літаратурная крытыка" (1963, у сааўтарстве з Грайчунасам), "Чорную маці" Б. Дэйвідсона (1967), "Вяртанне Філіпа Лаціновіча" М. Крлежы (1969), "Пераможаш у барацьбе" В. Папова (1975), "Гісторыю майго сучасніка" У. Караленкі (1977, 3 кн.), "Святло Сусвету" Г. Лакснеса (1979), празаічныя творы іншых аўтараў.

Яніна Кісялёва

Вагнер Пётр

Вагнер Пётр Іванович *(1799, Пінск або Піншчына – 3.8.1876, Масква), медык, мінералог, тапограф, ганаровы прафесар.*

Нарадзіўся П. Вагнер у Беларусі. Пачатковую адукацыю атрымаў у Пінскай павятовай школе. Вучыўся ў Дэрпцкім універсітэце (цяпер Тартускі) на медыцынскім факультэце, які скончыў у 1819 г. са званнем аптэкарскага памочніка. Вывучаў медыцынскія навукі ў Віленскім універсітэце. У красавіку 1824 г. за поспехі ў навучанні быў пераведзены на "казённы кошт". Скончыў Віленскі універсітэт у студзені 1826 г. лекарам 1-га разраду з правам падрыхтоўкі да навуковай ступені доктара навук. З 1826 г. працаваў лекарам на Урале, на Багаслоўскім заводзе, куды быў накіраваны пасля вучобы. У 1829–1841 гг. — на Верх-Ісецкім заводзе. У час службы на Урале працягваў праводзіць навуковыя даследаванні. У 1831 г. абараніў у Віленскім універсітэце дысертацыю на ступень доктара медыцыны на тэму "Медыка-тапаграфічнае апісанне Багаслоўскага завода".

П. Вагнер цікавіўся мінералогіяй. Па яго ўласнаму прызнанню, ён адкрыў новы, невядомы раней мінерал і даў яму назву "пушкініт" у гонар папячыцеля Казанскага універсітэта Мусіна-Пушкіна. Апісанне мінерала было апублікавана ў 1840 г. у "Ученых записках Казанского университета". Праўда, далейшыя даследаванні паказалі, што гэты мінерал з'яўляецца разнавіднасцю іншага. Яго работы па мінералогіі былі з цікавасцю сустрэты навуковай грамадскасцю. У красавіку 1840 г. П. Вагнер быў зацверджаны прафесарам мінералогіі і геадэзіі Казанскага універсітэта. Стаў ініцыятарам адкрыцця пры універсітэце мінералагічнага кабінета. Далейшыя навуковыя даследаванні былі накіраваны на вывучэнне геалогіі Казанскай, Саратаўскай і Арэнбургскай губерняў. Ён правёў навуковую экспедыцыю для даследавання Кіргізскіх стэпаў і Каспійскага мора (вынікі навуковых даследаванняў апублікаваны не былі). У 1852 г. распачаў работу па стварэнню геагнастычных карт. (Першая такая карта была распрацавана для Пецярбургскай губерні прафесарам С. Куторгай). Карты Казанскай і Сімбірскай губерняў былі падрыхтаваны П. Вагнерам і выдадзены ў Пецярбургу ў 1855 г.

У верасні 1865 г. выйшаў на пенсію ў званні ганаровага прафесара Казанскага універсітэта.

Вольга Гапоненка

Вазіла Аляксандр

Вазіла Аляксандр Цімафеевіч *(28.8(9.9).1888, Прапойск Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Слаўгарад Магілёўскай вобл. – 3.12.1937), паэт, публіцыст, удзельнік рэвалюцыйнага руху.*

У 1904 г. А. Вазіла ўступіў у РСДРП, вёў рэвалюцыйную работу ў Пецярбургу, Кіеве, Іркуцку, Златаусце. Неаднаразова арыштоўваўся. У 1914 г. у Златаусце выдаў зборнік вершаў "Хвалі", які быў канфіскаваны цэнзурай. У 1917–1918 гг. належаў да сацыял-дэмакратаў-інтэрнацыяналістаў, быў старшынёй Быхаўскай павятовай земскай управы. На Усебеларускім з'ездзе (Мінск, 1917) выступіў супраць намераў абвясціць беларускую дзяржаўнасць. У 1918 г. — загадчык выдавецкага аддзела Петраградскага аддзялення Беларускага нацыянальнага камісарыята,

рэдактар часопіса "Чырвоны шлях". Пазней ад палітычнай дзейнасці адышоў. Неаднаразова арыштоўваўся. Жыў на радзіме. У 1932 г. у Маскве арыштаваны і этапіраваны у Магілёў, асуджаны на высылку ў Казахстан. Зноў арыштаваны ў 1937 г., і ў жніўні прыгавораны да 8 гадоў турмы. Ва Уладзімірскай турме 2 снежня 1937 г. тройкай НКУС Іванаўскай вобл. прыгавораны да расстрэлу. Па справе 1932 г. часткова рэабілітаваны ў 1959 г., цалкам — у 1989 г. Па жнівеньскай справе 1937 г. рэабілітаваны ў 1957 г. Звесткі аб рэабілітацыі па снежаньскай справе 1937 г. не выяўлены.

Віталь Скалабан

Вазнясенскі Аляксандр

Вазнясенскі (Узнесянскі, Узнясенскі) Аляксандр Мікалаевіч *(крыпт. А. В.–ій, А. В.–скі; 5(17).7.1888, с. Чукапы Сімбірскай губ., цяпер Ардатаўскага р-на Ульянаўскай вобл. – 16.1.1966, Казань), літаратуразнавец, прафесар.*

А. Вазнясенскі паходзіць з сям'і настаўніка. Скончыў славяна-рускае аддзяленне гісторыка-філалагічнага факультэта Варшаўскага універсітэта (1913), дзе быў пакінуты для падрыхтоўкі да прафесарскага звання. У 1915–1921 гг. — асістэнт, прыват-дацэнт гісторыка-філалагічнага факультэта Растоўскага універсітэта. У 1921–1927 гг. дацэнт, а з 1927 да 1930 г. — прафесар БДУ. У 1930–1934 гг. працаваў у Маскоўскім інстытуце кінематаграфіі, Маскоўскім гарадскім педагагічным інстытуце, Народным камісарыяце цяжкай прамысловасці. З 1934 да 1939 г. А. Вазнясенскі жыў у Ташкенце. У 1939 г. — прафесар Казанскага педагагічнага інстытута. З 1940 г. — прафесар, у 1943–1947 гг. — дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта Казанскага універсітэта. У 1942 г. сустракаўся ў Казані і Пячышчах з Я. Купалам.

Друкавацца А. Вазнясенскі пачаў з 1913 г. (першыя публікацыі не выяўлены). Быў прадстаўніком культурна-гістарычнай школы ва ўсходнеславянскім літаратуразнаўстве. У 20-я гг. развіваў традыцыі дакастрычніцкага акадэмічнага літаратуразнаўства, "філалагічнага метаду". Аналізуючы творчасць М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа, даў параўнальна-тыпалагічную характарыстыку іх творчасці ў кантэксце еўрапейскіх літаратур. А. Вазнясенскі аўтар артыкулаў пра М. Лермантава, І. Тургенева і інш., надрукаваных у рускім дарэвалюцыйным друку. Доктарская дысертацыя А. Вазнясенскага "Даследаванні па гісторыі новай беларускай літаратуры" (ч. 1–3) зберагаецца ў бібліятэцы Казанскага універсітэта. Пісаў на беларускай і рускай мовах.

Алег Лойка

Вайвадзіш Эдвард

Вайвадзіш Эдвард Людвігавіч *(23.1(5.2).1897, в. Вайвады Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Краслаўскі р-н Латвійскай Рэспублікі — 26.3.2000, там жа), беларукі паэт, педагог.*

Э. Вайвадзіш нарадзіўся ў сялянскай сям'і. З 1908 г. вучыўся ў Прыдруйскай школе, а потым у Ідрыцы, Друі, з 1912 г. — у Дрысенскім чатырохкласным вучылішчы, якое скончыў з пахвальным лістом. Да эвакуацыі ў Гарадок пад Віцебскам працаваў пісарам валаснога праўлення. Разам з бежанцамі трапіў у Петраград, дзе скончыў курсы паштова-тэлеграфных работнікаў. Адначасова вучыўся на вячэрніх агульнаадукацыйных курсах Чарняева. Быў сведкам Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый у сталіцы. Каля Асвеі перайшоў фронт і вярнуўся на радзіму. З 1920 г. зноў працаваў пісарам — на гэты раз латвійскага валаснога праўлення. У 1921 г. уключыўся ў культурна-асветную работу беларускага таварыства "Бацькаўшчына", многімі справамі якой апекаваўся Я. Райніс. З 1922 па 1959 г. Э. Вайвадзіш працаваў (з невялікімі перапынкамі) настаўнікам, кіраўніком беларускіх школ у Латгальскім краі. Скончыў агульнаасветныя чатырохгадовыя летнія настаўніцкія курсы пры Дзвінскай дзяржаўнай беларускай гімназіі. Валодаў некалькімі мовамі. Веданне нямецкай выратавала яго ад гібелі ў канцлагеры на востраве Руген, куды трапіў у 1942 г. пасля арышту нямецкімі акупацыйнымі ўладамі у сувязі з тым, што працаваў інспектарам беларускай павятовай школьнай рады.

На 1922 г. прыпадае першая публікацыя вершаў Э. Вайвадзіша, калі сам рэдактар газеты "Голас Беларуса" К. Езавітаў папрасіў у аўтара яго творы. Супрацоўнічаў малады настаўнік і з часопісам "Беларуская школа ў Латвіі". А ў 1926 г. стаў адным з аўтараў зборніка вершаў "Першы крок". Новы прыліў сіл Э. Вайвадзіш адчуў з абуджэннем у Латвіі беларускай дыяспары. З 1990 г. яго вершы з'яўляліся ў "Голасе Радзімы", "Настаўніцкай газеце", "Літаратуры і мастацтве", "Вожыку", "Звяздзе", "Нашым слове", у "Дні паэзіі", а таксама ў латвійскіх выданнях. Нацыянальны культурна-асветны цэнтр імя Ф. Скарыны ў серыі "Творцы беларускага замежжа" выдаў у 1996 г. зборнік Э. Вайвадзіша "Вершы, паэма, згадкі".

Яшчэ ў 1935 г. Э. Вайвадзіш, як добраахвотны карэспандэнт Дзяржаўнага статыстычнага ўпраўлення па сельскай гаспадарцы, быў узнагароджаны ордэнам за заслугі перад Латвійскай дзяржавай. У лютым 1997 г. стаў сябрам Саюза беларускіх пісьменнікаў. Святкаванне 100-гадовага юбілею паэта і асветніка стала працягам райнісаўскіх традыцый пабрацімства, латышска-беларускага духоўнага спараднення.

Сяргей Панізьнік

Вайнруб Мацвей

Вайнруб Мацвей Рыгоравіч *(2.5.1910, Барысаў Мінскай губ., цяпер вобл.), военачальнік, мемуарыст, Герой Савецкага Саюза.*

У 1925–1929 гг. працаваў на Барысаўскім шклозаводзе. З 1929 г. — у Чырвонай Арміі. Скончыў Беларускую аб'яднаную ваенную школу (1931), Ваенную акадэмію імя М. Фрунзе (1941). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Камандаваў бранятанкавымі і механічнымі войскамі 8-й гвардзейскай арміі (1-шы Беларускі фронт). Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена ў красавіку 1945 г. Пасля вайны працягваў службу ў арміі. Закончыў Ваенную акадэмію Генштаба (1951), завочна — Новасібірскі індустрыяльны інстытут (1956). У 1970 г. М. Вайнруб выйшаў у адстаўку ў званні генерал-лейтэнанта. Працаваў доўгі час у Кіеве ва Украінскім НДІ тэхнічнай інфармацыі. Сярод узнагарод — 2 ордэны Леніна, 4 ордэны Чырвонага Сцяга, ордэн Багдана Хмяльніцкага 1 ступені, 2 ордэны Чырвонай Зоркі. М. Вайнруб — аўтар мемуараў "Аднапалчане" (Кіеў, 1982), "Франтавыя лёсы" (Кіеў, 1985).

Алесь Карлюкевіч

Вайцюлевіч Вера

Вайцюлевіч Вера Сцяпанаўна *(псеўд. Вера Гаротная; 25.5.1902, в. Бярозкі Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Краслаўскі р-н, Латвія – 16.7.1986, Рыга), пісьменніца.*

У 1932 г. В. Вайцюлевіч выдала ў Рызе зборнік "Вершы" (чатыры творы ў арыгінале і іх пераклад на латышскую мову). Аўтар верша "Яну Райнісу", які прымаў непасрэдны ўдзел ў яе лёсе. Жыла ў дачкі, мастака-мадэльера Уладзіславы Душкінай. Многія апавяданні з яе багатай спадчыны друкаваліся ў 1980-х гадах у беларускіх газетах і часопісах.

Сяргей Панізьнік

Валасовіч Канстанцін

Валасовіч Канстанцін Адамавіч *(21.5.1869, в. Старчыцы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Салігорскі р-н Мінскай вобл. – 25.9.1919, Харкаў), падарожнік і прыродазнавец, географ і геолаг, заснавальнік палеагеаграфіі і чацвярцічнай геалогіі Паўночна-Заходняй Еўропы і Запаляр'я.*

К. Валасовіч нарадзіўся ў дваранскай сям'і. Скончыў Варшаўскі універсітэт. За рэвалюцыйную дзейнасць у 1894 г. быў арыштаваны, сядзеў у Петрапаўлаўскай крэпасці і Варшаўскай цытадэлі. У 1896–1899 гг. знаходзіўся ў ссылцы ў Архангельскай губ., дзе вывучаў чацвярцічныя адклады. Праводзіў геалагічная працы на Новасібірскіх астравах у часы першай Рускай палярнай экспедыцыі пад кіраўніцтвам Э. Толя (1900–1902). У 1902–1903 гг. лячыўся ў Цюрыху (Швейцарыя), дзе сустракаўся з У. Леніным. У Расіі зноў быў арыштаваны, потым вывучаў постпляцэнавыя адклады каля Петразаводска.

У 1908–1909 гг. К. Валасовіч кіраваў дзвюма геолага-геаграфічнымі экспедыцыямі ў нізоўях Лены на поўначы Якуціі, вывучаў геалогію Хараўлахскіх гор. Збярог для навукі шкілет і рэшткі вядомага Ляхаўскага маманта — унікальны экспанат, які зараз знаходзіцца ў Нацыянальным музеі гісторыі прыроды ў Парыжы. Правёў інжынерна-геалагічную работу па рэканструкцыі Архангельскага марскога порта. Працаваў над праблемамі чацвярцічнай геалогіі Паволжжа і Кубані. Апублікаваў 16 навуковых прац, сярод якіх — "Мамант востраваВялікага Ляхаўскага (Новасібірскія астравы)" у "Записках минаралогического общества" (Сер. 2. 1915. Т. 50). Імем К. Валасовіча названы мыс на паўночна-ўсходнім узбярэжжы востраваБальшавік у архіпелагу Паўночная Зямля, некаторыя выкапнёвыя расліны і жывёлы раёнаў Запаляр'я.

Валерый Ярмоленка

Валкавыцкі Георгій

Валкавыцкі Георгій *(псеўд. Хведар Асіпіч, Юрка Зубрыцкі, Рыгор Лясун, Сідар Макацёр, Рыгляс, Ювэ; 13.3.1923, Белавежа Беластоцкага ваяв.), празаік, паэт, публіцыст, грамадскі дзеяч.*

Г. Валкавыцкі скончыў у Белавежы сямігодку, у Гайнаўцы — рамесную школу. У 1941 г., пасля сканчэння лесаўпарадкавальных курсаў, абследаваў лясы Навагрудчыны. Вайну сустрэў на Свіцязі. У час нямецкай акупацыі — рабочы лесапільні. У 1943 г. вывезены ў Кёнігсберг. Працаваў слесарам на вагонабудаўнічым заводзе. З красавіка 1945 г. — у Савецкай Арміі. У чэрвені 1946 г. вярнуўся на радзіму. У 1949 г., пасля заканчэння

двухгадовых універсітэцкіх курсаў, быў накіраваны на вучобу ў Маскву. У 1954 г. скончыў Літаратурны інстытут імя М. Горкага ў Маскве. З 1956 г. прымаў актыўны ўдзел у дзейнасці Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы (БГКТ), уваходзіў у галоўнае праўленне БГКТ, у 1956–1958, 1960–1963, 1972–1984 гг. быў намеснікам старшыні галоўнага праўлення БГКТ. З верасня 1954 г. — супрацоўнік "Gazety Biaiostockiej". Браў удзел у заснаванні газеты "Ніва". У 1956–1985 гг. — яе галоўны рэдактар. Рэдагаваў "Беларускія календары" і літаратурныя альманахі. Член беларускага літаратурнага аб'яднання ў Польшчы "Белавежа". Неаднаразова ўзначальваў гэтае літаратурнае аб'яднанне (у 1958–1960, 1980–1982 гг. і інш.). З'яўляўся рэдактарам і складальнікам беларускіх літаратурных альманахаў у Польшчы "Рунь" (1959), "Мой родны кут" (1963), "Белавежа -1" (1965), "Белавежа — 2" (1972), "Белавежа -3" (1980), "Гасцінец" (1992) і інш.

Друкуецца Г. Валкавыцкі з 1948 г. Выступае ў розных жанрах. Аўтар зборнікаў лірыкі "Разнагоддзе" (1989), сатыры "Макатразмы" (1997), кніг прозы "Віры: Нататкі рэдактара" (1991), "Белая вязь" (1998). У цэнтры яго ўвагі — уласны жыццяпіс, беларускі літаратурны рух у Польшчы, прыгажосць роднага Белавежжа.

Жыве ў Беластоку.

Ян Чыквін (Бельск-Падляшскі, Польшча), Ларыса Языковіч

Валодзін Аляксандр

Валодзін (сапр. Ліфшыц) Аляксандр Майсеевіч *(10.11.1919, Мінск), рускі пісьменнік, драматург.*

У 1949 г. скончыў сцэнарны факультэт Інстытута кінематаграфіі ў Маскве. Працаваў у тэатры і кіно. У літаратуры дэбютаваў у 1954 г. зборнікам "Апавяданні". Але вядомасць набыў як драматург, аўтар п'ес "Фабрычная дзяўчынка" (1956), "Пяць вечароў" (1959), "У гасцях і дома" (1960), "Мая старэйшая сястра" (1961), "Прызначэнне" (1963), "Дульсінея Табоская" (1971), "Яшчарка" (1982), "Бландзінка" (1984) і інш. Гэтыя п'есы, нетрадыцыйныя як па мове, так і па структуры і тэматыцы, насычаныя лірызмам, складаныя па праблематыцы, былі прыкметнай з'явай у тэатральным жыцці СССР 50–60-х гг., выклікалі палеміку ў друку. Па сцэнарыях А. Валодзіна былі пастаўлены кінафільмы "Звоняць, адчыніце дзверы" (1965), "Восеньскі марафон" (1979) і інш. П'есы А. Валодзіна "Мая старэйшая сястра", "З каханымі не расставайцеся", "Дзве стралы", "Пяць вечароў", "Прызначэнне" ставіліся ў тэатрах Мінска, Брэста, Гродна, Магілёва.

Браніслава Котава

Валодзька Станіслаў

Валодзька Станіслаў *(11.11.1956, в. Падольцы Астравецкага р-на Гродзенскай вобл.), беларускі паэт і грамадскі дзеяч.*

С. Валодзька нарадзіўся ў сям'і селяніна-аднаасобніка. У 1974 г. скончыў Жукойненскую сярэднюю школу. У 1975–1977 гг. служыў у арміі ў Гомелі. З 1977 да 1979 г. працаваў шафёрам у саўгасе "Падольскі", пасля (да 1992 г.) механікам пуцявой машыны — спачатку ў Літве, затым у Латвіі. Цяпер працуе ў Даўгаўпілсе намеснікам дырэктара школы па гаспадарчай рабоце. У 1980 г. паступіў на завочнае аддзяленне філалагічнага факультэта БДУ, які скончыў у 1987 г.

Вершы С. Валодзька пачаў пісаць яшчэ ў школьным узросце. Друкаваўся ў Беларусі, Латвіі, Літве, Англіі, Польшчы, Украіне (у альманаху "Дзень паэзіі", часопісах і газетах "Краю мой, Нёман", "Роднае слова", "Эхо Литвы", "Панорама Латвии" і інш.). Выступаў з вершамі на радыё і тэлебачанні — як у Беларусі, так і ў Латвіі. У 1983 г. у Мінску выйшаў калектыўны зборнік паэзіі "Сцяжына", дзе змешчана вялікая падборка вершаў С. Валодзькі "На хвалях хвалявання". У 1995 г. у Даўгаўпілсе ўбачыў свет зборнік вершаў для дзяцей "Пацеркі", дзе яго вершы пададзены ў аўтарскім перакладзе з беларускай мовы на рускую. У 1996 г. у Мінску ў серыі "Бібліятэка часопіса "Маладосць" выйшаў зборнік лірычных вершаў "У вачах Айчыны", а ў 1988 г. у выдавецтве ў Даўгаўпілсе — зборнік вершаў "Зварот да сэрца" ў перакладзе на рускую мову.

З 1995 г. С. Валодзька ўзначальваў Беларускае культурна-асветніцкае таварыства "Уздым" (г. Даўгаўпілс, Латвія). Другі тэрмін з'яўляецца сябрам рады Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына". Складае і рэдагуе беларускамоўную старонку "Беларус Латгаліі" ў даўгаўпілскай рэгіянальнай газеце "Латгалес Лайкес".

Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Наталля Паўлоўская

Вальтар Віктар

Вальтар Віктар Бенядзіктавіч *(15(28).7.1902, Дзвінск Віцебскай губ., цяпер Латвія – 14.4.1931), пісьменнік.*

Пра бацькоў В. Вальтара нічога не вядома. Вучыўся ў Харкаўскім рэальным вучылішчы. Пасля вяртання сям'і з бежанства скончыў у Латвіі Беларускія настаўніцкія курсы, вучыўся ў Празе. Захварэўшы на сухоты, вярнуўся ў Дзвінск, працаваў у беларускіх школах Латвіі. Апавяданне В. Вальтара "Леснікова сена" было выдадзена асобна ў 1932 г. Рукапіс рамана "Роджаныя пад Сатурнам", пра жыццё беларускай эміграцыі і студэнцтва ў Празе, быў знойдзены ў Вільнюсе, у Цэнтральнай бібліятэцы АН Літвы. Друкаваўся ў газеце "Голас Радзімы". Са старонак рамана паўстаюць каларытныя фігуры П. Крачэўскага, Т. Грыба, Я. Станкевіча, П. Вяршыніна, Я. Ляцкага і іншых прадстаўнікоў беларускай, расійскай, украінскай эміграцыі ў Чэхіі.

Сяргей Панізьнік

Вальфсон Фёдар

Вальфсон Фёдар Іосіфавіч *(1907, в. Сідаравічы Магілёўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Магілёўскі р-н Магілёўскай вобл. – 26.4.1989, Масква), геолаг, прафесар. Лаўрэат Ленінскай прэміі (1965).*

Нарадзіўся Ф. Вальфсон у сялянскай сям'і. Скончыў Пецярбургскі горны інстытут (1930). Будучы студэнтам, працаваў у геалагічных экспедыцыях па вывучэнню рудных радовішчаў Арменіі. Пазней вёў пошукі карысных выкапняў у Ферганскай даліне і ў Магаджарскіх гарах Сярэдняй Азіі, дзе адкрыў радовішчы флюарытаў і свінцова-цынкавай руды. Унёс вялікі ўклад у разведку і вывучэнне каляровых і рэдкіх металаў Сярэдняй Азіі, Цэнтральнага Казахстана, Каўказа, Алтая і Забайкалля, а таксама Балгарыі і Германіі. Адзін з заснавальнікаў савецкай школы геолагаў-руднікаў, якія вывучалі структурныя асаблівасці радовішчаў карысных выкапняў.

Ф. Вальфсон удала спалучаў якасці вучонага і педагога. Педагагічную дзейнасць пачаў у Пецярбургскім горным інстытуце (1933), потым працяглы час працаваў прафесарам Маскоўскага інстытута каляровых металаў і золата (1935–1965) і Маскоўскага геолага-разведачнага інстытута (з 1965). Падрыхтаваў больш за 80 кандыдатаў і каля 10 дактароў навук. Яму належыць каля 250 апублікаваных прац, у тым ліку шэраг манаграфій і падручнікаў па геалогіі карысных выкапняў, перакладзеных на замежныя мовы. Сярод іх — "Развіццё вучэння аб рудных радовішчах у СССР" (1969), "Структуры рудных палёў і радовішчаў" (1975, 2 выд. 1985), "Асновы ўтварэння рудных радовішчаў" (1978) і інш. Праз год пасля яго смерці з друку выйшла апошняя манаграфія вучонага "Умовы фарміравання уранавых радовішчаў".

За распрацоўку геолага-геахімічных асноў пошукаў карысных выкапняў Ф. Вальфсону была прысуджана Ленінская прэмія. Ён узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. У Магілёўскім гісторыка-краязнаўчым музеі ёсць экспазіцыя пра Ф. Вальфсона.

Валерый Ярмоленка

Ваньковіч Мельхіёр

Ваньковіч Мельхіёр *(10.1.1892, б. маёнтак Калюжыцы Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Бярэзінскі р-н, Мінскай вобл. — 10.9.1974, Варшава), польскі публіцыст, пісьменнік.*

Паходзіў М. Ваньковіч з мясцовай шляхты (бацька – Мельхіёр Ваньковіч, маці – Марыя з Свайніцкіх). Дзяцінства прайшло на беларускай зямлі у Калюжыцы і Мінску. Потым М. Ваньковіч вобразна апісаў яго ў аповесці "Шчанюковыя гады" (1934). Гімназію скончыў у Варшаве. У1909—1911 гг. быў сакратаром маладзёжнай арганізацыі "РЕТ", заснаваў і рэдагаваў канспірацыйнае выданне "Wici" ("Віці"). У 1911 г. арыштоўваўся царскімі ўладамі. Вучыўся ў Школе палітычных навук у Кракаве і на юрыдычным факультэце Ягелонскага універсітэта. У 1917—1918 гг. служыў у корпусе ген. Доўбар-Мусніцкага. Напісаў і выдаў антысавецкую брашуру "Чаму польскі салдат уваходзіць у Літву і Беларусь" (1919). Прымаў удзел у вайне 1920 г. Пасля дэмабілізацыі працягваў вучобу ў Варшаўскім універсітэце, які скончыў у 1922 г. У 1922—1923 гг. быў сакратаром газеты "Kurier Poranny", а затым, да 1926 г., начальнікам аддзела прэсы і відовішчаў МУС. Заснаваў у Варшаве выдавецкае таварыства "Ryj" ("Руй") і быў яго саўладальнікам і літаратурным кіраўніком. Многа падарожнічаў па Заходняй Беларусі і апісваў яе ў сваіх папулярных рэпартажах. Сімпатызаваў беларускаму нацыянальнаму руху, пазнаёміўся з беларускім паэтам Машарам і цытаваў яго вершы. Вясной 1939 г. удзельнічаў у кангрэсе ПЭН-клубаў у Нью-Йорку. Пасля пачатку Другой сусветнай вайны трапіў за мяжу. З 1940 да 1949 г. быў у Румыніі, на Кіпры, у Палесціне, Іране, Іраку, Егіпце, Сірыі, Ліване, Італіі, Францыі, Германіі, Англіі. У 1943—1946 гг. працаваў ваенным карэспандэнтам. З 1949 г. жыў у ЗША, а ў маі 1958 г. вярнуўся на сталае жыхарства ў Польшчу. У 1964 г. арыштаваны па

абвінавачванню ў перадачы інфармацыі радыё "Свабодная Еўропа" і ўтрымліваўся дома пад наглядам. Тым не менш, выступаў з гутаркамі па тэлебачанні і ва універсітэце.

М. Ваньковіч – майстар рэпартажнай аповесці, дзе апісанне фактаў спалучаў з элементамі мастацкай фікцыі. У 30-я гг. напісаў вядомую кнігу, "Па слядах Смэнтка", якая даказвала польскасць мазурскіх земляў, цыклы рэпартажаў аб гаспадарчым развіцці Польшчы ("С.О.Р.", "Эстафета"), рэпартажы аб падарожжы па СССР "Пасталелая рэвалюцыя". З паслявaеннай творчасці М. Ваньковіча набылі шырокую вядомасць аповесць пра барацьбу палякаў з немцамі ў пачатку Другой сусветнай вайны "Вестэрплятэ", дакументальная манаграфія "Бітва за Монтэ-Касіно", аповесці пра эміграцыю "Панарама польскага лёсу", "Рэчыва", аповесці-ўспаміны "Трава на кратэры", "Туды і сюды", нарысы па тэорыі публіцыстыкі "Проста ад каровы", "Графін Лефантэна", зборнікі рэпартажаў і публіцыстыкі "Ад Стоўбцаў да Каіра", "Анод і катод". У іх часта выкарыстоўваліся беларускія матэрыялы, успаміны дзяцінства.

Юрый Вашкевіч

Варановіч Алі

Варановіч Алі Самуілавіч (Ізмайлавіч) *(1.4.1902, м. Ляхавічы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Брэсцкая вобл. – чэрвень 1941), татарскі дзеяч, арыенталіст.*

А. Варановіч нарадзіўся ў вядомай татарскай шляхецкай сям'і (бацька – Самуіл (Ізмаіл) Варановіч, маці Аміні з Шынкевічаў, родная сястра муфція Польшчы Якуба Шынкевіча, абранага ў 1925г.). У 1915 г. сям'я пераехала ў Расію, а затым у Крым, дзе А. Варановіч вучыўся ў сімферопальскай гімназіі і ў мясцовым універсітэце. У 1922 г. ён вяртаецца на радзіму і пасяляецца ў Вільні, дзе становіцца вольным слухачом Віленскага універсітэта, а з 1926 г. вучыцца ў Львоўскім універсітэце, які скончыў у 1932 г. з дыпломам магістра філасофіі ўсходазнаўчых навук. У 1933—1936 гг. вывучаў мусульманскую тэалогію ў Каіры, ва універсітэце Аль-Азгар. З 1937 г. — імам мусульманскай рэлігійнай абшчыны Варшавы. Быў адным з рэдактараў перыядычнага выдання "Rocznik Tatarski". У 1939 –1940 гг. жыў на тэрыторыі БССР. У 1941 г. абвінавачаны ў шпіянажы і арыштаваны НКВД у Клецку. Утрымоўваўся пад заключэннем у Баранавічах і Мінску. Загінуў пры нявысветленых абставінах, хутчэй за ўсё, быў расстраляны ў час эвакуацыі мінскіх турмаў.

Даследаванні А. Варановіча, галоўным, чынам прысвечаны татарам на беларуска-польска-літоўскіх землях, іх культуры і рэлігіі. Пераклаў фрагменты Карана (1935). Аўтар брашуры на арабскай мове аб ісламе ў міжваеннай Польшчы (1936) і артыкулаў "Рэшткі мовы літоўскіх татараў", "Кітаб літоўскіх татараў і яго змест", апублікаваных у штогодніку "Rocznik Tatarski" (1935, № 2).

Юрый Вашкевіч

Вараняева Ларыса

Вараняева Ларыса Валянцінаўна *(2.11.1959, в. Пажарышчы Маладзечанскага р-на Мінскай вобл.), геолаг.*

Л. Вараняева скончыла Гарадоцкую сярэднюю школу Маладзечанскага р-на з залатым медалём (1976), а затым першы курс бібліятэчнага аддзялення Беларускага інстытута культуры. У 1977 г. паступіла на другі курс геолагаразведачнага тэхнікума ў г. Міячы Чэлябінскай вобл. Пасля заканчэння тэхнікума (1980) атрымала накіраванне на в. Сахалін у Паўднёва-Сахалінскую геолагаразведачную экспедыцыю, дзе займалася пошукам вугалю. З 1985 г. працавала тэхнікам-геолагам Цэнтральна-Кольскай геалагічнай экспедыцыі ў г. Апатыты Мурманскай вобл. Завочна вучылася на геалагічным факультэце Варонежскага універсітэта (1986–1992). У 1988 г. яе пераводзяць геолагам у г. Манчагорск Мурманскай вобл., у Цэнтральна-Кольскую геалагічную экспедыцыю. Займалася пошукамі алмазаў, плаціны, золата, нікеля, медзі, іншых каляровых металаў і будаўнічых матэрыялаў. У час апошніх экспедыцый сумесна з іншымі геолагамі партыі Л. Вараняева выявіла буйныя радовішчы будаўнічых матэрыялаў і каляровых металаў. Шляхам складання новай геалагічнай карты, якая атрымала высокую ацэнку спецыялістаў Кольскага навуковага цэнтра Расійскай акадэміі навук, яна выдзеліла геалагічныя структуры, перспектыўныя на руднае золата, даказаўшы неабходнасць правядзення наступных работ. Л. Вараняева з'яўляецца лепшым спецыялістам Кольскага паўвострава.

Яўген Ігнатовіч

Варашыльскі Віктар

***Варашыльскі Віктар** (8.6.1927, Гродна — верасень 1996, Варшава), польскі паэт, празаік, публіцыст.*

В. Варашыльскі нарадзіўся ў сям'і ўрача Гжэгажа Варашыльскага; маці — Барбара з Градзенчыкаў. Сярэднюю школу скончыў у Гродне, дзе заставаўся да канца вайны, працаваў рабочым. У сакавіку 1945 г. па рэпатрыяцыі выехаў у Польшчу (Лодзь). Там атрымаў атэстат сталасці і вучыўся ва універсітэце, на аддзяленні польскай філалогіі. Дэбютаваў у 1945 г. У тым жа годзе пачаў працаваць рэпарцёрам у газеце "Głos Ludu' ("Глос люду").

У 1947 г. пераехаў у Варшаву, дзе працягваў вучобу ў Варшаўскім універсітэце. У канцы 40-х — пачатку 50-х гг. належаў да актывістаў групы маладых пісьменнікаў, якія прапагандавалі прынцыпы сацыялістычнага рэалізму. Быў сакратаром рэдакцыі газеты "Po prostu" ("По просту"), а затым інструктарам адзела культуры ЦК ПАРП. У 1950 г. атрымаў Дзяржаўную прэмію 3-й ступені. У 1952–1956 гг. вучыўся ў Маскве, дзе абараніў дысертацыю пра Маякоўскага і савецкую паэзію 20-х гг. У 1956 г. вярнуўся ў Варшаву, у 1957–1958 гг. быў галоўным рэдактарам тыднёвіка "Nowa Kultura" ("Нова культура"). З 70-х гадоў звязаны з дэмакратычнай апазіцыяй, пасля ўвядзення ў Польшчы ваеннага становішча (13.12.1981) інтэрніраваны. Супрацоўнічаў з каталіцкім месячнікам "Więź" ("Веньзь"), рэдактар часопіса "Zapis" ("Запіс"). Зборнік яго фельетонаў за 1971–1980 гг. быў выдадзены ў 1984 г. у самвыдаце.

В. Варашыльскі пачынаў сваю літаратурную творчасць з агітацыйнай паэзіі (зборнікі "Смерці няма", "Першая лінія міру"). Затым звярнуўся да рэфлексійнай лірыкі (зборнікі "З размовай", "Нязгода на паклон", "Знішчэнне гатункаў", "Пасля знішчэння". "У пошуках страчанага цяпла", а таксама 'Ты ёсць і іншыя вершы", "Дзённік інтэрнавання", выдадзеныя па-за цэнзурай). Аўтар зборнікаў апавяданняў "Бязлітасная зорка", зборніка празаічных мініяцюр "Гісторыі", зборніка рэпартажаў аб апошніх днях венгерскага паўстання 1956 г. "Венгерскі дзённік", літаратурных нарысаў і біяграфічных аповесцей пра М. Салтыкова-Шчадрына, У. Маякоўскага, С. Ясеніна, А. Пушкіна, твораў для дзяцей і моладзі. Перакладаў з рускай і беларускай паэзіі. У перакладзе выйшлі кнігі "Выбраныя вершы" М. Багдановіча (1974), "Альпійская балада" В. Быкава (1970), "Зімовая прыгода" (1968) і "Птушыныя клопаты" (1972) М. Танка і інш. На беларускую мову творы В. Варашыльскага перакладалі Я. Брыль, М. Танк, С. Яновіч і інш.

Юрый Вашкевіч

Варона Валерый

***Варона Валерый Міхайлавіч** (5.3.1940, г. Рэчыца Гомельскай вобл.), эканаміст, прафесар. Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Украіны.*

В. Варона паходзіць з сям'і беларусаў. У 1954 г. скончыў Рэчыцкую СШ № 7. Вучыўся ў Гомельскім тэхнікуме чыгуначнага транспарту (1954–1958). Працаваў на станцыі Фастаў-2 і Казацін-1 Паўднёва-Заходняй чыгункі. Пасля службы ў радах Савецкай Арміі (1959–1961) паступіў на эканамічны факультэт Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта імя Т. Шаўчэнкі. У час вучобы працаваў па спецыяльнасці ў аддзеле тэхніка-эканамічных даследаванняў Інстытута УкрНДІпластмаш. Пасля паспяховага заканчэння універсітэта ў 1967 г. вучыўся ў аспірантуры Кіеўскага інстытута народнай гаспадаркі (кафедра эканомікі). Да 1988 г. работа В. Вароны звязана з гэтым інстытутам: быў там асістэнтам кафедры палітэканоміі, дацэнтам, дэканам, прарэктарам па вучэбнай рабоце. У 1981–1985 гг. узначальваў лабараторыю НОП аддзела АСУВ Кіеўскага мотазавода. Загадваў аддзелам сацыялогіі працы аддзялення сацыялогіі Інстытута філасофіі НАН Украіны, аддзелам сацыялогіі рыначнай эканомікі Інстытута сацыялогіі НАН Украіны (1988–1992). З 1992 г. займае пасаду дырэктара гэтага інстытута.

У галіне эканомікі і сацыялогіі В. Варона апублікаваў шмат навуковых прац, сярод якіх — "Развіццё ўласнасці і ўдасканаленне сацыялістычных вытворчых адносін" (1971), "Канцэпцыя гаспадарання" (1989), "Прадпрымальнік Украіны" (1995), "Эканамічная сацыялогія" (у сааўтарстве, 1995). В. Варона займаўся праблемамі, звязанымі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС, якім прысвяціў сваё даследаванне "Сацыяльныя вынікі Чарнобыльскай катастрофы" (1996).

Ірына Тамільчык

Варонка Язэп

Варонка Язэп *(Іосіф Якаўлевіч; псеўд. Юрый Вегаў; 4(17).4.1891, Сакольскі пав. Гродзенскай губ. – 4.6.1952, Чыкага, ЗША), палітычны дзеяч, журналіст, публіцыст.*

Нарадзіўся Я. Варонка ў сялянскай сям'і. Да 1914 г. быў вольным слухачом юрыдычнага факультэта Пецярбургскага універсітэта, аднак не закончыў навучанне з-за адсутнасці сродкаў. Супрацоўнічаў ў пецярбургскіх газетах "Столичные вести", "Воскресная вечерняя газета" і часопісе "Зритель" (пад псеўд. Юрий Вегов). Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. уступіў у петраградскае аддзяленне Беларускай сацыялістычнай грамады, удзельнічаў у канферэнцыі БСГ у Петраградзе ў чэрвені 1917 г., быў абраны членам ЦК. На 2 сесіі Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый (15–24.10.1917, Мінск) падтрымаў прапанову аб увядзенні аўтаноміі Беларусі. Быў дэлегатам III з'езда БСГ (2–5.10.1917, Мінск). Уваходзіў у склад Вялікай беларускай рады, займаў пасады камісара юстыцыі і ўнутраных спраў. Да снежня 1917 г. узначальваў у Петраградзе камітэт Беларускага таварыства па аказанню дапамогі пацярпелым ад вайны. Прадстаўляў беларускія арганізацыі на Асобай нарадзе для выпрацоўкі палажэння аб выбарах ва Усерасійскі Устаноўчы сход. Удзельнічаў у рабоце Дзяржаўнай нарады (жнівень 1917, Масква) і Усерасійскай дэмакратычнай нарады (верасень 1917, Петраград), дзе адстойваў нацыянальныя інтарэсы Беларусі, патрабаваў не заключаць мір з Германіяй і яе саюзнікамі да вызвалення тэрыторыі Беларусі, перадаць зямлю ў распараджэнне зямельных камітэтаў, адмяніць смяротнае пакаранне, увесці ўсеагульную працоўную абавязанасць, выказваўся супраць урадавай кааліцыі расійскіх сацыялістычных партый з лібераламі, якія разглядаліся як партыі буржуазныя. Уваходзіў у склад Часовага савета Расійскай Рэспублікі (Перадпарламента). У снежні 1917 г. актыўна удзельнічаў у падрыхтоўцы і правядзенні Першага Усебеларускага кангрэса, быў абраны старшынёй Рады кангрэса. Пасля прымусовага роспуску кангрэса арыштаваны па загаду Савета Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронта, але разам з іншымі ўдзельнікамі быў адпушчаны на свабоду па загаду наркама па справах нацыянальнасцей Расійскай Савецкай Рэспублікі І. Сталіна. Уваходзіў у склад Выканаўчага камітэта Рады Усебеларускага кангрэса. У лютым 1918 г. быў адным з ініцыятараў абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі і яе незалежнасці ад Расіі. Уваходзіў у склад Рады БНР. У лютым 1918 г. быў абраны старшынёй Народнага сакратарыята Беларусі і народным сакратаром па замежных справах. 25 красавіка 1918 г. разам з іншымі сябрамі Прэзідыума Рады БНР падпісаў тэлеграму кайзеру Германіі Вільгельму II з выказваннем падзякі за вызваленне Беларусі "з цяжкага ўціску чужога пануючага здзеку і анархіі". У маі 1918 г. вёў перагаворы з германскай акупацыйнай адміністрацыяй па пытаннях развіцця самакіравання, адукацыі і культурнага жыцця на беларускай тэрыторыі. У ліпені 1918 г. атрымаў паўнамоцтвы прадстаўляць беларускія інтарэсы перад урадавымі ўстановамі Літвы, Украіны, Малдавіі, Грузіі, дзяржаўных утварэнняў Поўдня Расіі. Ва ўмовах крызісу Рады БНР (май 1918) уваходзіў у склад Часовай рады пяцёх. Пасля рэарганізацыі ўрада БНР у кастрычніку 1918 г. узначаліў Міністэрства ўнутраных спраў, потым — Міністэрства па нацыянальных справах. У лістападзе 1918 г. разам з Р. Скірмунтам наведаў Вялікабрытанію, дамагаўся ад англійскага ўрада прызнання незалежнасці БНР і аказання дапамогі ў барацьбе з бальшавікамі. У лістападзе 1918 г. вёў перагаворы з прадстаўнікамі літоўскай Тарыбы адносна ўтварэння федэратыўнай Літоўска-Беларускай дзяржавы. У снежні 1918 – лютым 1920 г. узначальваў міністэрства беларускіх спраў ва ўрадзе Літвы. Узначальваў Беларускую партыю сацыялістаў-федэралістаў. Займаўся выдавецкай і публіцыстычнай дзейнасцю. Рэдагаваў часопіс "Варта" (1918, Мінск), супрацоўнічаў з перыядычнымі выданнямі "Беларускі народ" (1919, Гродна), "Белорусская газета" (1919, Мінск), "Часопіс" (1919–1920, Каўнас), "Вольная Литва" (1920, Каўнас). Пісаў творы на беларускай, рускай і ўкраінскай мовах. У 1919–1920 гг. выдаў шэраг гісторыка-публіцыстычных прац, дзе абагульняў асноўныя факты з гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў XX ст., аналізаваў грамадска-палітычнае становішча Беларусі. Разглядаў Польшчу і Расію як "натуральных ворагаў" беларускага нацыянальнага адраджэння, аддаючы перавагу супрацоўніцтву з Літвой у справе вызвалення Беларусі. Удзельнічаў у Беларускай нацыянальна-палітычнай нарадзе ў Рызе (1920). У кастрычніку 1920 г. быў запрошаны да перагавораў урада БНР з Літвой, вынікам якіх стала пагадненне аб ўрэгуляванні літоўска-беларускіх узаемаадносін (11.11.1920). Выступаў супраць Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. У 1920–1923 гг. жыў у Літве. У лістападзе 1922 г. узначаліў таварыства "Беларуская грамада ў Каўнасе", у жніўні 1923 г. — Міністэрства асветы ў складзе ўрада БНР на чале з А. Цвікевічам. Увосень 1923 г. выехаў з сям'ёй у ЗША (у Чыкага). Стаў адным з пачынальнікаў беларускага палітычнага руху ў ЗША. Узначальваў Беларуска-Амерыканскую нацыянальную асацыяцыю, у 1940–1950-х гг. уваходзіў у кіраўніцтва Беларуска-Амерыканскай нацыянальнай рады. Супрацоўнічаў з расійскімі і ўкраінскімі эмігранцкімі арганізацыямі сацыялістычнай арыентацыі. У міжваенныя часы выступаў супраць польскай палітыкі ў адносінах да насельніцтва Заходняй Беларусі. У 1930-х гг. заснаваў у Чыкага і ў Бентан-Харбары (штат Мічыган) каля 7 школ, дзе вучыліся дзеці эмігрантаў з Беларусі. Быў выдаўцом і рэдактарам газеты "Белорусская трибуна" (1926, Чыкага), друкаваў у ёй свае творы. Планаваў выданне газеты на беларускай мове. Публікаваўся ў рускіх і ўкраінскіх эмігранцкіх выданнях. З 1929 г. пачаў весці праграмы на чыкагскім радыё на рускай, беларускай і іншых славянскіх мовах. Пахаваны ў Чыкага.

Аляксандр Ціхаміраў

Ваўбельскі Аляксандр

Ваўбельскі Аляксандр Антонавіч *(1851, Мінская губ. – 30.12.1881, Усць-Майскае Мегінскага улуса Якуцкай вобл.) рэвалюцыянер.*

А. Ваўбельскі паходзіў са шляхты Мінскай губ. Вучыўся ў Харкаўскім ветэрынарным інстытуце, але яго не скончыў, бо 8 ліпеня 1878 г. быў высланы пад нагляд паліцыі ў Кунгур (Пермскі край) за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях. У Кунгуры арганізаваў рабочы гурток. 29 верасня 1879 г. без дазволу выехаў у Перм, дзе быў арыштаваны і ў адміністрацыйным парадку высланы ў Якуцкую вобл., дзе скончыў жыццё самагубствам.

Алесь Баркоўскі

Велікоўскі Імануіл

Велікоўскі Імануіл Шымонавіч *(12.6.1895, Віцебск—17.11.1979, ЗША), урач, вучоны, пісьменнік.*

Нарадзіўся ў сям'і камерсанта, аднаго з актыўных удзельнікаў міжнароднага сіянісцкага руху. Закончыў 9-ю Імператарскую гімназію ў Маскве (1912). Вучыўся на медыцынскім факультэце ва універсітэце ў Манпелье (Францыя, 1912), затым — на медыцынскім факультэце Эдзінбургскага універсітэта (Англія, 1913–1914). У 1914 г. вяртаецца ў Маскву. Прадоўжыць вучобу ў Эдзінбургу перашкодзіла Першая імперыялістычная вайна. Восенню 1914 г. ён залічваецца слухачом курса юрыспрудэнцыі, гісторыі і эканомікі Вольнага універсітэта ў Маскве, які быў арганізаваны ў знак пратэсту супраць дыскрымінацыйнай палітыкі царскага ўрада. У 1915 г. яму ўдалося паступіць на другі курс медыцынскага факультэта Маскоўскага універсітэта, працягваючы гуманітарную адукацыю ў Вольным універсітэце. У 1917 г. ён выдае (пад псеўданімам Імануэль Раміо) брашуру "Трэці зыход", асноўная ідэя якой — вяртанне яўрэяў на зямлю Ізраіля. У лютым 1918 г. арыштавана маскоўскімі чэкістамі група маскоўскіх сіяністаў. Разам з бацькамі І. Велікоўскі пакідае Маскву, бадзяецца па Украіне, Каўказу. Вярнуўшыся ў 1921 г. у Маскву, заканчвае універсітэт, атрымлівае дыплом урача. А ў хуткім часе атрымлівае дазвол на выезд за мяжу для сябе і бацькоў, якія ўсё яшчэ знаходзяцца на Украіне. Бацькі выязджаюць у Эрэц-Ісраэль. А Імануіл — у Берлін з мэтай арганізацыі шматгаліновага навуковага часопіса, у якім будуць друкавацца работы лепшых вучоных-яўрэяў. Работа над часопісам, які пабачыў свет у 1923 г., спрыяе знаёмству І. Велікоўскага з А. Эйнштэйнам, Х. Вейцманам, Х. Бялікам. У маі 1923 г. ён разам з жонкай Элішэвай Крамер пераязджае ў Эрэц-Ісраэль. І. Велікоўскі працуе ўрачом, пачынае друкаваць артыкулы ў навуковых медыцынскіх часопісах. Прадказвае ролю электраэнцэфалаграфіі ў дыягностыцы эпілепсіі. Займаецца сур'ёзным вывучэннем псіхіятрыі. У 1929 г. вяртаецца ў Еўропу, знаёміцца з З. Фрэйдам. Піша артыкул "Пра фізічнае існаванне святла думкі". У 1931 г. Велікоўскія — у Тэль-Авіве. Імануіл працуе псіхатэрапеўтам. У 1937 г. прымае ўдзел у Інтэрнацыянальным кангрэсе псіхолагаў у Парыжы. У 1939 г. Велікоўскія пераязджаюць у ЗША. Пачынаюцца самыя прадуктыўныя гады дзейнасці І. Велікоўскага як неардынарнага вучонага. Урач, валодаючы ведамі ў многіх галінах навукі, фактычна робіць пераварот у навуковым свеце, прапаноўваючы новую перыядызацыю гісторыі цывілізацыі. У ЗША, іншых краінах свету выходзяць кнігі Велікоўскага "Міры ў сутыкненнях", "Стагоддзі ў хаосе", "Зямля ў пераваротах", "Народы мора", "Рамзес II і яго час". Ужо пасля яго смерці пабачылі свет кнігі "Чалавецтва ў амнезіі", "Астролагі і трунакапальнікі". Ненадрукаванымі засталіся яшчэ чатыры — "Час Ісаі і Гамера", "Сатурн і Патоп", "Юпіцер", "Арбіта". І. Велікоўскі распазнаў астральнае паходжанне рэлігій свету. Ён знайшоў, што ў Бібліі апісаны сапраўдныя гістарычныя падзеі, а т. зв. цуды маюць цалкам натуральнае тлумачэнне. Навуковыя гіпотэзы нашага суайчынніка пра планетарныя катастрофы маюць велізарную прадказальную сілу.

Алесь Карлюкевіч

Вендраў Залман

Вендраў Залман *(сапр. Вендраўскі Давід, 1877, Слуцк Мінскай губ., цяпер Мінскай вобл. – 1971, Масква), пісьменнік.*

З. Вендраў працаваў на ткацкай фабрыцы ў Лодзі, пісаў артыкулы пра цяжкае жыццё рабочых, за што быў звольнены. У пошуках працы пабываў у Англіі і Амерыцы, з 1915 г. жыў у Маскве. У савецкі час працаваў у яўрэйскіх арганізацыях, Народным камісарыяце па справах нацыянальнасцей. Пасля Вялікай Айчыннай вайны быў арыштаваны, абвінавачаны ў антысавецкай дзейнасці і прабыў 8 гадоў у турме. Вярнуўшыся, друкаваўся ў часопісе "Савеціш Геймланд". Пад націскам падпісаў антыізраільскую дэкларацыю савецкіх яўрэйскіх пісьменнікаў.

Пісаў на ідыш. З. Вендравым апублікаваны зборнікі апавяданяў "Без дома" (1907), "Вядомыя асобы" (1912), "Гумарэскі і апавяданні" (1912) і інш. У 1918 г. надрукаваў нарысы "Праца і нястача". У 1941 г. выйшла аўтабіяграфічная кніга З. Вендрава "На парозе жыцця", у 1967 г. зборнік апавяданняў.

Браніслава Котава

Верас Зоська

Верас Зоська *(адзін з псеуд., сапр. Сівіцкая, па мужу Войцік, Людвіка Антонаўна; 30.9.1892, г. п. Мянджыбаж Падольскай губ., цяпер Лятычаўскі р-н Хмяльніцкай вобл., Украіна – 6.10.1991, Вільнюс, беларуская пісьменніца, грамадскі дзеяч.*

Нарадзілася З. Верас у сям'і вайскоўца. У 1908 г. скончыла прыватнае камерцыйнае вучылішча ў Кіеве. Пераехала з бацькамі ў Беларусь. Скончыла ў Гродне прыватную жаночую гімназію (1912), у 1913–1914 гг. у Варшаве — слухачка курсаў агародніцтва і пчалярства.

Літаратурнай і грамадскай дзейнасці З. Верас прысвяціла сябе яшчэ ў юнацкія гады. Першыя спробы пяра маладой пісьменніцы надрукаваў у 1907 г. кіеўскі часопіс "Подснежник". У 1911 г. З. Верас пад псеўданімам Мірко выступала на старонках газеты "Наша ніва" з эцюдамі, напісанымі па-беларуску. Публікавала там вершы, заснаваныя на фальклорных матывах. У 1909–1913 гг. актыўна ўдзельнічала ў рабоце Гродзенскага гуртка беларускай моладзі. Гурткоўцы ладзілі для гімназістаў малодшых класаў беларускамоўныя вечарыны, на якіх чыталіся творы Ф. Багушэвіча, Я. Купалы і інш., а таксама ставіліся беларускія п'есы, распаўсюджвалася літаратура. Пісьменніца прымала ўдзел у выданні альманаха "Колас беларускай нівы" (Гродна, 1913). У гады Першай сусветнай вайны (з 1915) жыла ў Мінску, працавала (канец 1916 – пачатак 1917) у камітэце Таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. Добра ведала М. Багдановіча, З. Бядулю, Г. Леўчыка, Ядвігіна Ш., У. Галубка, І. Буйніцкага, А. Смоліча, Б. Тарашкевіча, С. Рак-Міхайлоўскага і інш. дзеячаў беларускай культуры. Удзельнічала ў рэвалюцыйным руху, працавала ў Беларускай сацыялістычнай грамадзе.

У 1918 г. пасялілася ў фальварку Альхоўнікі на Беласточчыне, а ў 1923–1991 гг. разам з сям'ёй жыла непадалёку ад Вільні ў невялікім дамку, які шматлікія госці З. Верас назвалі "Лясной хаткай" (потым згарэла). У 1924 г. выдала ў Вільні "Беларуска-польска-расейска-лацінскі батанічны слоўнік". Друкавала ў розных перыядычных выданнях апавяданні, артыкулы. У 1928–1939 гг. — старшыня Беларускага кааператыўнага таварыства "Пчала". Вынесла з віленскай турмы "Лукішкі" вершы М. Машары і выдала за свой кошт яго першы зб. "Малюнкі" (1928). Працавала рэдактарам часопісаў "Заранка" (1927–1931), "Пралеска" (1934–1935) і "Беларуская борць" (1934–1938). Перакладала з рускай і ўкраінскай моў на беларускую, збірала народныя песні, загадкі, прымаўкі. Склала пра беларускія гімназіі некалькі фотаальбомаў.

З пісьменніцай пастаянна кантактавалі, звярталіся да яе за парадай вучоныя, настаўнікі, школьнікі і інш. Карэспандэнцыя пісьменніцы мела сотні адрасатаў. У апошнія гады жыцця З. Верас працягвала творчую дзейнасць, друкавала публіцыстычныя артыкулы, успаміны ў штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва", часопісе "Маладосць" і інш. У 1982 г. прынята ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. У 1985 г. у Мінску выйшаў зборнік твораў пісьменніцы для дзяцей "Каласкі".

Пахавана на могілках Панерай.

Святлана Сачанка

Вернікоўскі Іван

Вернікоўскі Іван Антонавіч *(1799–1834), гісторык, вучоны-моваznавец, перакладчык, выкладчык.*

І. Вернікоўскі паходзіў са шляхты Ігуменскага пав. Мінскай губ. У 1819 г. скончыў вучылішча ў Мазыры. У верасні таго ж года паступіў на філасофскі факультэт Віленскага універсітэта, які скончыў са ступенню кандыдата ў 1820 г. У 1820–1824 гг. выкладаў сусветную гісторыю ў семінарыі пры Віленскім універсітэце. У жніўні 1824 г. з-за "палітычнай неблаганадзейнасці" пераведзены ў Казанскі універсітэт выкладчыкам усходніх моваў. Да 1827 г. знаходзіўся пад наглядам і апякунствам універсітэцкай адміністрацыі. У жніўні 1827 г. пераведзены выкладчыкам арабскай і персідскай моваў у Казанскую гімназію. У лістападзе 1830 г. быў абраны выкладчыкам старажытнай гісторыі і геаграфіі Казанскага універсітэта. У жніўні 1834 г. арыштаваны "за прыналежнасць да антыдзяржаўных арганізацый і антыдзяржаўную прапаганду ў Заходнім краі".

Займаўся літаратурнай і перакладчыцкай дзейнасцю. Зрабіў вершаваныя пераклады і выдаў у 1824 г. у Вільні на польскай мове оды старажытнагрэчаскага паэта Піндара.

Вольга Гапоненка

Весялоўскі Іван

Весялоўскі Іван Сямёнавіч *(2.9.1795, Магілёў – 16.4.1867, Масква), фізік, прафесар.*

Паходзіў І. Весялоўскі з беларускай шляхты. Яго бацька займаўся прыватнай судовай справай (памёр у 1797 г.). Пачатковую адукацыю будучы вучоны атрымаў дома. З 1803 г. вычыўся ў Магілёўскай духоўнай семінарыі. У 1812 г. скончыў Магілёўскую гімназію. У 1813 г. быў прыняты на фізіка-матэматычнае аддзяленне філасофскага факультэта Маскоўскага універсітэта. На працягу трох гадоў слухаў там лекцыі па матэматыцы, фізіцы, хіміі, тэхналогіі, а таксама курсы рускай славеснасці, французскай, нямецкай і лацінскай моваў, гісторыі і статыстыкі. У 1816 г. скончыў поўны курс са ступенню кандыдата фізіка-матэматычных навук. З 1816 г. вучыўся на медыцынскім факультэце Маскоўскага універсітэта. У 1823 г. абараніў дысертацыю "De vitiis aeris-atmosphaericic corpus humanum vivum afficicientibus" на ступень доктара медыцыны. У 1825 г. быў абраны ад'юнкт-прафесарам Маскоўскага аддзялення Медыка-хірургічнай акадэміі, дзе чытаў лекцыі па фізіцы і матэматыцы, спецыяльна распрацаваныя для студэнтаў медыцынскіх спецыяльнасцей. У 1825 г. па даручэнню папячыцеля універсітэта кн. А. Абаленскага адкрыў пры універсітэце аптэку. У 1828 г. у час эпідэміі халеры выконваў абавязкі інспектара ў Маскоўскім аддзяленні Медыка-хірургічнай акадэміі. У 1833 г. прызначаны ардынарным прафесарам фізікі акадэміі. Адначасова ў 1836 г. быў абраны прафесарам кафедры фізікі Маскоўскага універсітэта. У 1838 г. звольнены па стану здароўя з акадэміі, а ў 1839 г. — з універсітэта. У 1839 г. быў узнагароджаны "Знакам за выдатную службу Айчыне" і ў 1840 г. пераведзены ў стацкія саветнікі.

Навуковыя працы І. Весялоўскага прысвечаны даследаванню электрычнасці, галоўным чынам удакладненню прыроды т. зв. жыццёвай і атмасфернай электрычнасці. Выканаў шэраг эксперыментаў па тоеснасці абодвух відаў электрычнасці.

Вольга Гапоненка

Вігдарава Фрыда

Вігдарава Фрыда Абрамаўна *(1915, Орша Магілёўскай губ., цяпер Віцебскай вобл. – 1966, Масква), руская пісьменніца.*

У 1937 г. Ф. Вігдарава закончыла літаратурны факультэт Маскоўскага педагагічнага інстытута. У пачатку 60-х гг. працавала нарысісткай у газеце "Известия". У сакавіку 1964 г. прысутнічала на судовым працэсе паэта Іосіфа Бродскага і зрабіла стэнаграфічны запіс, які атрымаў сусветную вядомасць, з'явіўся важным дакументам у барацьбе за правы чалавека у СССР. Ф. Вігдарава была жонкай парадыста і дзіцячага пісьменніка, ураджэнца Віцебска Аляксандра Раскіна.

Кнігі Ф. Вігдаравай прысвечаны дзецям, іх выхаванню, маральным праблемам — аповесці "Мой клас" (1949), "Дарога ў жыццё" (1954), "Гэта мой дом" (1957), раман "Сямейнае счасце" (1961), аповесць "Кім вы яму даводзіцеся?" (1969). У сваіх артыкулах выказвала думкі пра немагчымасць паўнацэннага духоўнага жыцця ва ўмовах савецкага ідэалагічнага аднадумства.

Браніслава Котава

Вількіцкі Андрэй

Вількіцкі Андрэй Іпалітавіч *(1(13).7.1858, б. маёнтак каля Барысава Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. – 26.2(11.3).1913, Пецярбург), гідраграф-геадэзіст і падарожнік, генерал-лейтэнант флоту.*

А. Вількіцкі нарадзіўся у дваранскай сям'і. Скончыў Марскую акадэмію ў Пецярбургу (1880). У 1887 г. узначаліў экспедыцыю на Новую Зямлю ў Паўночным Ледавітым акіяне, дзе вёў гравітацыйныя назіранні. У 1894–1901 гг. пад яго кіраўніцтвам праводзіліся гідраграфічныя работы ад граніц Нарвегіі да вусця Енісея, у Енісейскім заліве і Обскай губе; у 1907–1913 гг. узначальваў Галоўнае гідраграфічнае ўпраўленне Расіі.

Вялікае значэнне мела праца А. Вількіцкага па забеспячэнню бяспечнага мараплавання (арганізацыя асобага корпусу гідрографаў, выданне новых марскіх карт, будаўніцтва маякоў). Ён аўтар прац па гідраграфіі і геадэзіі — друкаваўся ў часопісах "Морской сборник", "Записки гидрографии", "Известия Русского георгафического обществе". Рускае геаграфічнае таварыства ўзнагародзіла А. Вількіцкага двума залатымі медалямі.

Імем А. Вількіцкага названы востраў у Карскім моры, на паўночны ўсход ад Обскай губы.

Валерый Ярмоленка

Віннікаў Ісак

Віннікаў Ісак Натанавіч *(1897, Хоцімск Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл. – 1973, Ленінград), семітолаг, этнограф.*

У 1925 г. І. Віннікаў закончыў этнолага-лінгвістычнае аддзяленне Ленінградскага універсітэта і быў пакінуты пры кафедры агульнай этнаграфіі для навуковай дзейнасці. З 1929 г. працаваў у Інстытуце этнаграфіі АН СССР, які ўзначальваў у 1941–1942 гг. У 1945–1949 гг. быў загадчыкам кафедры асірыялогіі і гебраістыкі ў Ленінградскім універсітэце, працаваў у Ленінградскім аддзяленні Інстытута ўсходазнаўства АН СССР.

Асноўныя працы І. Віннікава прысвечаны мове і этнаграфіі народаў Сярэдняй Азіі. Склаў слоўнік арамейскіх надпісаў з IX ст. да н. э., слоўнік-канкарданцыю помнікаў палестынска-арамейскай мовы (апублікаваны часткова).

Браніслава Котава

Віралайнен Любоў

Віралайнен Любоў Іванаўна *(дзявочае — Уражэнка; каля 1941 г., г. Барысаў Мінскай вобл.), руская драматычная і кінаактрыса.*

Л. Віралайнен нарадзілася напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. Бацька загінуў на фронце, маці-партызанка два гады правяла ў фашысцкім канцлагеры. Л. Віралайнен, яе брата і сястру прытулілі людзі. Пасля вайны жылі ў зямлянцы, галадалі. З Беларусі сям'я (маці і трое дзяцей) пераехала ў Ленінград. Там Л. Віралайнен скончыла сярэднюю школу. У першым фільме знялася, калі вучылася яшчэ ў 10-м класе. Паступіла ў студыю пры Ленінградскім Вялікім драматычным тэатры, выступала на яго сцэне. Галоўны рэжысёр тэатра, Г. Таўстаногаў, даручаў Л. Віралайнен цікавыя ролі. Затым актрыса пакінула драматычны тэатр і вырашыла паспрабаваць сябе ў кінематографе. Знялася больш як у 50-ці фільмах. Найбольш вядомыя "Дарога дадому", "Расколатае неба", "Адзінаццаць надзей", "Адхіленне — нуль", "Гонка з праследаваннем". Вяршыняй творчых дасягненняў Л. Віралайнен у кіно стала роля Марыі ў фільме рэжысёра С. Герасімава "Любіць чалавека". Яна таксама многа здымалася на "Беларусьфільме".

Кінематограф зрабіў з Л. Віралайнен гераіню адной ролі — нашай станоўчай і спагадлівай жанчыны, якая ўмее кахаць і жадае быць каханай.

У 90-я гг. Л.Віралайнен захапілася аператарскай працай, здымае фільмы аб аперацыях на сэрцы. Цяпер іграе ў тэатры "Эксперымент". Жыве ў Санкт-Пецярбургу.

Вацлаў Мацкевіч

Віткоўскі Мікалай

Віткоўскі Мікалай *(1843, Віцебшчына – 24.10.1892, Іркуцк), падарожнік, археолаг.*

Адукацыі не атрымаў, служыў арганістам у касцёле. У 1863 г. за ўдзел у паўстанні пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага арыштаваны і сасланы на катаргу ў с. Алонка Балаганскага пав. Іркуцкай губ. У 1873 г. адпраўлены на пасяленне ў Іркуцк, дзе працаваў вадавозам і хатнім настаўнікам, а ў вольны час вывучаў прыродазнаўчыя навукі (геаграфію, геалогію, батаніку і заалогію), часта наведваў музей Сібірскага аддзялення Расійскага геаграфічнага таварыства. У Іркуцку пазнаёміўся з сасланым земляком Іванам Чэрскім, прымаў удзел у некаторых яго экспедыцыях, у прыватнасці, па басейну р. Селенгі. У хуткім часе М. Віткоўскі распачаў самастойную серыю палеантрапалагічных даследаванняў ва Усходняй Сібіры. Адкрыў у 1880 г. каля р. Кітой курганы эпохі неаліта і абверг думку аб тым, што Сібір не была заселена ў эпоху каменнага веку. У наступныя гады праводзіў раскопкі ў даліне Ангары, каб адшукаць першабытныя паселішчы. Яго асноўныя публікацыі "Кароткая справаздача аб раскопцы магілы каменнага веку ў Іркуцкай губерні" (1880. Т. 11. № 3–4), "Сляды каменнага веку ў даліне р. Ангары" (1889. Т. 20. № 1–2), "Прасверленыя камяні" (1890. Т. 21. № 4) змешчаны ў "Известиях Восточного Отдела РГО".

Вынікі палеантрапалагічных і археалагічных пошукаў прынеслі М. Віткоўскаму шырокую вядомасць у расійскіх навуковых колах. У 1882 г. ён быў узнагароджаны залатым медалём Расійскага геаграфічнага таварыства па аддзелу этнаграфіі. Пазней заняў пасаду дырэктара музея таварыства ў Іркуцку.

М. Віткоўскі не абмяжоўваўся археалогіяй і антрапалогіяй. Разам з І. Чэрскім займаўся геалагічнымі пошукамі, пытаннямі заалогіі, у прыватнасці, байкальскай нерпай, збіраў для музея ўзоры прыбайкальскіх раслін. Ён прылічаны да піянераў сібірскай археалогіі. П. Сямёнаў-Цянь-Шанскі адзначыў, што сваімі удалымі знаходкамі магіл каменнага веку ён аказаў неацэнную паслугу расійскай навуцы, і назваў яго "найлепшым знаўцам археалогіі дагістарычнага перыяду Сібіры".

Валерый Ярмоленка

Войцік Галіна

Войцік Галіна Антонаўна *(1.7.1927, Вільня, Віленскага ваяв., цяпер Вільнюс), філолаг, перакладчык, беларускі грамадскі дзеяч Літвы.*

Г. Войцік нарадзілася ў сям'і вядомага беларускага дзеяча Антона Войціка і беларускай пісьменніцы Зоські Верас (Людвікі Сівіцкай). Вучылася ў Віленскай беларускай гімназіі, у Віленскім універсітэце. Закончыла аспірантуру пры інстытуце замежных моваў у Маскве. Абаранілася ў 1963 г. Выкладала нямецкую мову ў Віленскім педінстытуце, на беларускай кафедры педуніверсітэта.

Г. Войцік — аўтар шматлікіх прац і дапаможнікаў для студэнтаў-філолагаў. Пераклала з літоўскай мовы на беларускую кнігу Ч. Худабы "Па Віліі: падарожныя запісы" і інш. Падрыхтавала да выдання кнігу Лявона Луцкевіча "Вандроўкі па вільні", кнігу ўспамінаў Зоські Верас. Пры актыўным удзеле Г. Войцік друкуюцца ўспаміны Л. Луцкевіча пра славутых жыхароў Вільнюса "Постаці" ў газеце "Рунь". З'яўляецца галоўным рэдактарам радыёперадачы "Беларускае слова на хвалях Літвы", запісы якой выкарыстоўваюцца ў беларускай школе на ўроках беларускай мовы і літаратуры. Часта выступае перад вучнямі беларускай школы імя Ф. Скарыны. Г. Войцік — член Міжнародных асацыяцый беларусістаў і германістаў. Жыве ў Вільнюсе.

Леакадзія Мілаш (Вільнюс)

Вольскі Аркадзь

Вольскі Аркадзь Іванавіч *(15.5.1932, г. Добруш Гомельскай вобл.), палітычны, дзяржаўны дзеяч. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.*

А. Вольскі нарадзіўся ў настаўніцкай сям'і. Пасля сканчэння Маскоўскага інстытута сталі і сплаваў працаваў на Маскоўскім заводзе імя Ліхачова (1955–1969), быў сакратаром парткама завода. З 1969 г. працаваў у апараце ЦК КПСС: загадчык сектара аўтамабільнай прамысловасці; намеснік загадчыка, першы намеснік загадчыка аддзела машынабудавання (1969–1983); памочнік Генеральнага сакратара ЦК КПСС (1983–1985); загадчык аддзела машынабудавання (1985–1988). З 1988 па 1989 гг. — прадстаўнік ЦК КПСС і Вярхоўнага Савета СССР у Нагорна-Карабахскай аўтаномнай вобл. Азербайджанскай ССР (НКАО); з 1989 па 1990 гг. — старшыня Камітэта асобага ўпраўлення НКАО. З 1990 па 1991 гг. — прэзідэнт Навукова-прамысловага саюза СССР. З 1992 г. — прэзідэнт Расійскага саюза прамыславікоў і прадпрымальнікаў (РСПП), сустаршыня Руху дэмакратычных рэформ (1991–1992); ганаровы прэзідэнт Міжнароднага кангрэса прамыславікоў і прадпрымальнікаў. Быў дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР 11-га склікання, дэпутатам Вярхоўнага Савета РСФСР 10-га склікання, народным дэпутатам СССР (1989–1992).

А. Вольскі ўзнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Вуек Зыгмунт

Вуек Зыгмунт *(22.9.1938, в. Сухадол Пінскага пав. Палескага ваяв., цяпер Пінскі р-н Брэсцкай вобл.), скульптар, педагог.*

З. Вуек нарадзіўся ў сям'і настаўніка. У 1941 г. разам з сям'ёй пераехаў у этнічную Польшчу (г. Равіч Пазнанскага ваяв.). Вучыўся ў Пазнанскай акадэміі мастацтваў у прафесара Б. Вайтовіча. Спецыялізуецца ў камені і бронзе. З'яўляецца аўтарам скульптурных работ, якія ў асноўным знаходзяцца на Цэнтральным Памор'і. Асноўны змест яго творчасці — страты і польскі народ у перыяд Другой сусветнай вайны, ваенная і рэлігійная тэматыка. У творчасці З. Вуека выразна гучыць і польска-беларуская тэматыка (бронзавая пліта ў парафіяльным касцёле ў Лаздунах Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл., прысвечаная ваенным падзеям на тэрыторыі Налібоцкай пушчы). Выстаўляўся ў гарадах Польшчы, Берліне, Капенгагене.

З. Вуек займаецца таксама педагагічнай дзейнасцю. Выкладае ў Ліцэі скульптурнага мастацтва ў Кашаліне. З 1996 г. — ад'юнкт кафедры прамысловага праектавання ў Кашалінскім палітэхнікуме.

Тадэвуш Гаштольд (Кашалін, Польшча)

Выгодскі Давід

Выгодскі Давід Ісакавіч *(1894, Гомель – 1943, ?), рускі перакладчык, крытык.*

Стрыечны брат Л. Выгоцкага. Д. Выгодскі закончыў рамана-германскае аддзяленне Ленінградскага універсітэта. Займаўся перакладамі, пісаў вершы. У 1938 г. быў арыштаваны, што выклікала пратэсты Ю. Тынянава, М. Зошчанкі, К. Федзіна, В. Шклоўскага і інш. рускіх пісьменнікаў. Памёр у заключэнні.

Шырокую вядомасць атрымалі пераклады Д. Выгодскага з еўрапейскіх (І. Бехер, А. Мальро, Б. Ібаньес, Б. Перес Гальдос, І. Мейрынк) і яўрэйскай (Х. Бялік) моваў. Яго пяру належаць таксама пераклады з беларускай мовы твораў А. Александровіча, М. Багдановіча, А. Гурло, У. Дубоўкі, Я. Коласа, Я. Пушчы (Альманах белорусской литературы. Л., 1929), артыкулы ў "Литературном Ленинграде" "Янка Купала" (1935. 14 сн.), "Якуб Колас" (1936. 11 кастр.), "Паэзія Беларусі" (1936. 8 лют.), "Юбилей Изи Харика" (1936. 1 студз.) і інш.

Браніслава Котава

Выгоцкі Леў

Выгоцкі Леў Сямёнавіч *(17.11.1896. г.Орша Віцебскай губ., цяпер Віцебская вобл., 11.6.1934, Масква), псіхолаг, педагог.*

Сям'я Выгоцкіх жыла ў Оршы, затым пераехала ў Гомель. Бацька працаваў упраўляючым аддзела банка, быў старшынёй Аб'яднання па распаўсюджванню асветы.

Л. Выгоцкі скончыў Гомельскую гімназію (1913). Тады ж паступіў на медыцынскі факультэт Маскоўскага універсітэта, але праз месяц перайшоў на юрыдычны факультэт, што давала яму большыя правы (дазваляла жыць па-за рысай аседласці і інш.). Адначасова вучыўся на курсах псіхалогіі і філасофіі Народнага універсітэта Шаняўскага. Па заканчэнні вучобы вярнуўся ў Гомель, дзе працаваў настаўнікам псіхалогіі і літаратуры разам са стрыечным братам Давідам Ісакавічам Выгоцкім (у будучым вядомым лінгвістам і філолагам). У 1919 г. яны арганізавалі літаратурпае выдавецтва. Акрамя школьнай работы Л. Выгоцкі праводзіў таксама заняткі ў тэатральнай студыі, чытаў лекцыі па пытаннях псіхалогіі і літаратуры, заснаваў лабараторыю псіхалогіі ў Гомельскім педагагічным тэхнікуме. З 1924 г. Л. Выгоцкі працаваў у Маскве: у МДУ, Інстытуце эксперыментальнай псіхалогіі, на педфакультэце Другога МДУ, затым у Эксперыментальным дэфекталагічным інстытуце, які ён арганізаваў і ўзначаліў. У гэты ж час кіраваў аддзелам адукацыі псіхічна і фізічна адсталых дзяцей пры Наркамаце асветы.

Навуковую дзейнасць Л. Выгоцкі пачаў з вывучэння псіхалогіі мастацтва, даследаваў успрыняцце літаратурных твораў ("Трагедыя аб Гамлеце, прынцы Дацкім". 1916; "Псіхалогія мастацтва", 1925). У 1925-1927 гг. вывучаў тэорыю рэфлексалагічнага і псіхалагічнага даследавання, праблемы псіхалагічнага выхавання. У працы "Гістарычны сэнс псіхалагічнага крызісу" (1927) даў глыбокі крытычны аналіз тагачаснай псіхалогіі. Л. Выгоцкі стварыў культурна-гістарычную тэорыю развіцця паводзін) і псіхалогіі чалавека, па якой дэтэрмінанты псіхічнага развіцця знаходзяцца не ўнутры арганізма, асобы дзіцяці, а звонку — сацыяльным узаемадзеянні яго з іншымі людзьмі, з дарослымі. Ім адкрыты новы накірунак у дэфекталогіі ("Асноўныя праблемы сучаснай дэфекталогіі", 1929). Распрацаваў таксама новае вучэнне аб лакалізацыі псіхічных функцый у кары галаўнога мозга ("Псіхалогія і вучэнне аб лакалізацыі псіхічных функцый", 1934), вывучаў праблемы афекта і інтэлекта ("Вучэнне аб эмоцыях", 1934). У апошнія гады жыцця Л. Выгоцкага асабліва цікавілі медыцынскія аспекты псіхалагічных даследаванняў. Ужо будучы прафесарам, ён паступіў у медыцынскі інстытут (спачатку ў Маскве, потым у Харкаве). Адначасова чытаў лекцыі на псіхалогіі ў Украінскай псіханеўралагічнай акадэміі. Некаторыя псіхалагічныя даследаванні Л. Выгоцкага былі выкананы з выкарастаннем педагагічнай тэрміналогіі ("Педалогія падлетка", 1929-1931 і інш.). Гэта абумовіла рэзкую крытыку яго ідэй у 30-я гг., выкліканую зусім не навуковымі падставамі. На доўгі час тэорыі Л. Выгоцкага былі выключаны з савецкай псіхалагічнай думкі. Толькі з 50-х гг. творасць вучонага пачала ацэньвацца незалежна ад палітычнай, кан'юктурнай прадузятасці.

Л. Выгоцкі стварыў вядомую навуковую школу, прыхільнікамі якой былі Я. Бажовіч, П. Гальперын, А. Запарожац, А. Ляонцьеў і інш. Яго тэорыі атрымалі вялікі рэзананс і ў сусветнай псіхалагічнай навуцы.

На радзіме вучонага, найперш у Гомелі праводзяцца чытанні, друкуюцца працы, прысвечаныя яго спадчыне.

Алена Русаковіч

Вярыга Аляксандр

Вярыга Аляксандр Андрэевіч *(23.11(5.12).1837–13(26).3.1905), хімік, педагог, прафесар.*

Нарадзіўся А. Вярыга на Віцебшчыне. Скончыў у 1860 г. фізіка-матэматычны факультэт Пецярбургскага універсітэта і быў пакінуты там для работы у хімічнай лабараторыі. З 1861 г. вучыўся ў Міхайлаўскім артылерыйскім вучылішчы, якое скончыў экстэрнам ў 1862 г. Быў на вайсковай службе, але хутка выйшаў у адстаўку. У 1862 г. накіраваны Міністэрствам народнай асветы на чатыры гады для стажыроўкі за мяжу — у навуковыя цэнтры Германіі і Швейцарыі. У 1866 г. быў запрошаны ў адкрыты ў Адэсе Новарасійскі (цяпер Адэскі) універсітэт. Пасля абароны магістэрскай дысертацыі на тэму "Даследаванне над азабензідам і яго гамолагамі" (1866) прызначаны дацэнтам кафедры хіміі ў тым жа універсітэце. У 1871 г. абараніў доктарскую дысертацыю "Аб рэакцыі прамога далучэння да групы азабензіда" і стаў экстраардынарным, а ў 1873 г. ардынарным прафесарам Новарасійскага універсітэта (займаў гэтую пасаду да 1896 г.). Чытаў у ім курс неарганічнай і тэхнічнай хіміі, а з 1874 г. — арганічнай хіміі. На пачатку 70-х гг. арганізаваў ва універсітэце навуковае кола аматараў хіміі. Быў адным з арганізатараў хімічнай лабараторыі. Сярод яго вучняў былі знакамітыя хімікі, у тым ліку акадэмік М. Зялінскі.

А. Вярыга праводзіў навуковыя даследаванні ў галіне арганачнай хіміі. Выканаў піянерскія работы па вывучэнню уласцівасцей азабензідаў і распрацаваў метады іх атрымання. У 1864 г. упершыню атрымаў бензідзін у працэсе ўдзеяння амальгамы натрыя на нітрабензол пры ўдзеле воцатнай кіслаты. Прапанаваў метад атрымання азабензолаў і яго гамолагаў. Сярод асноўных навуковых прац вучонага — "Пра азабензід і прадукты яго злучэнняў" (1870), "Даследаванне адэскіх саляных ліманаў" (1871), "Пра серу ў адэскім каменнавугальным газе" (1874). Шмат артыкулаў было ім надрукавана ў замежных навуковых выданнях і ў часопісе Рускага фізіка-хімічнага таварыства.

А. Вярыга ўнёс значны ўклад у паляпшэнне санітарнага стану Адэсы. Пры будове гарадскога водаправода выканаў даследаванні стану і ўласцівасцей днястроўскай вады, крыніц і калодзежаў вакол горада. З 1877 г. праводзіў комплексныя даследаванні хімічнага складу лячэбных ліманаў і гразевых крыніц. Упершыню выявіў ролю анаэробных мікраарганізмаў, якія аднаўляюць сернакіслыя солі з выдзяленнем серавуглярода. Вялікае значэнне і вядомасць мела барацьба А. Вярыгі з фальсіфікацыяй прадуктаў харчавання ў Адэсе. У 1880 г. ён арганізаваў там першую ў тагачаснай Расіі лабараторыю для даследавання прадуктаў харчавання.

Вольга Гапоненка

Вярыга Браніслаў

Вярыга Браніслаў Фартунатавіч *(1860–13.6.1925, Віцебшчына), фізіёлаг, педагог, прафесар Новарасійскага і Пермскага універсітэтаў.*

Нарадзіўся Б. Вярыга на Віцебшчыне. Скончыў прыродазнаўчае аддзяленне Пецярбургскага універсітэта (1881) і Ваенна-медыцынскую акадэмію (1886). Працаваў ў лабараторыях вядомых вучоных І. Сечанава, Э. Флюгера і І. Мечнікава. У 1888 г. абараніў доктарскую дысертацыю "Да пытання аб уздзеянні на нервы перапыннага і неперапыннага гальванічнага тока" (СПб., 1888) і атрымаў ступень доктара медыцыны. У 1897 г. быў абраны прафесарам Новарасійскага універсітэта ў Адэсе і займаў гэтыю пасаду да 1914 г. З 1917 г. Б. Вярыга — прафесар фізіялогіі Пермскага універсітэта, арганізаваў тут добра абсталяваную фізіялагічную лабараторыю.

Навуковыя даследаванні Б. Вярыгі прысвечаны пераважна электрафізіялогіі. Вывучаў уздзеянне электрычнага тока на нервовую сістэму чалавека і жывёл. Адкрыў і апісаў з'яву катоднай дэпрэсіі (працяглае зніжэнне ўзбуджальнасці, якое развіваецца ўслед за яе павышэннем у месцы прыкладання катода). Устанавіў, што гальванічны ток у залежнасці ад сілы і накіраванасці блакіруе паасобку або рухальныя, або адчувальныя нервовыя тканкі. Гэтыя даследаванні ўнеслі значны ўклад у фарміраванне поглядаў аб залежнасці працэсаў узбуджэння і тармажэння ад сілы і частаты працэсаў раздражнення. Яны мелі таксама важнае значэнне для фарміравання тэорыі М. Увядзенскага аб парабіёзе. Выканаў пад кіраўніцтвам І. Мечнікава цікавыя даследаванні аб імунітэце чалавека. Б. Вярыга вывучаў газаабмен у лёгкіх і тканках, першым устанавіў у 1892 г. з'яву ўплыву кісларода на здольнасць крыві звязваць вуглекіслату. Гэты эфект носіць назву "эфекту Вярыгі" (раней яго адкрыццё памылкова прыпісвалася зарубежным вучоным). Сярод асноўных навуковых прац вучонага — манаграфіі "Асновы фізіялогіі чалавека і вышэйшых жывёлін" (СПб., 1905–1910. Т. 1–2.), "Асновы агульнай фізіялогіі" (Адэса, 1912). Навуковую і педагагічную дзейнасць сумяшчаў з асветніцкай. Прымаў актыўны ўдзел у арганізацыі ў Адэсе вышэйшых жаночых курсаў. Выступаў з публічнымі лекцыямі і прапагандаваў найноўшыя дасягненні навукі.

Вольга Гапоненка

Гаданьчук Ірына

***Гаданьчук Ірына Міхайлаўна** (20.1.1965, Гданьск, Польшча), філолаг, дзеяч беларускай дыяспары ў Польшчы.*

І. Гаданьчук у 1994 г. закончыла рускае аддзяленне філалагічнага факультэта Гданьскага універсітэта. Даследавала беларускую лексікаграфію. Абараніла магістэрскую працу па тэме "Гісторыя беларускай лексікаграфіі з выдзяленнем медыцынскай тэрміналогіі". Працуе ў Гданьскім палітэхнічным інстытуце — у акадэмічнай камп'ютэрнай сетцы Гданьска, Гдыні і Сопата.

І. Гаданьчук — член Беларускага культурнага таварыства "Хатка" ў Гданьску. З'яўляецца старшынёй Гданьскага аддзела Беларускага аб'яднання студэнтаў. Спявала ў Гданьскім беларускім калектыве "Жаваранкі". Жыве ў Гданьску.

Алена Глагоўская (Гданьск, Польшча)

Гайдук Лідзія

***Гайдук Лідзія Платонаўна** (8.1.1935, в. Турэц Навагрудскага пав. і ваяв., цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл.), педагог, дзеяч беларускай дыяспары ў Польшчы.*

Л. Гайдук нарадзілася ў заможнай беларускай сям'і пасля заканчэння ў 1953 г. Турэцкай сярэдняй школы вучылася ў Беларускім дзяржаўным універсітэце (1953–1958). Выйшаўшы замуж, выехала на Беласточчыну (1958). Працавала ў пачатковай і сярэдняй школах настаўніцай беларускай мовы і літаратуры, з 1959 г. — у Бельскім педагагічным ліцэі. Разам з мужам Мікалаем Гайдуком распрацавала праграмы для навучання беларускай мове і літаратуры. У 1963 г. яны апрацавалі падручнік для 3 класа "Беларускае слова", у 1969-м — для 1 класа "У дружнай сям'і", у 1972-м — падручнік "У добры час". У 1975 г. падрыхтавала граматыку "Беларуская мова". Цікавілася народнай творчасцю Беласточчыны. Займалася асветніцкай дзейнасцю. Была адным з ініцыятараў правядзення розных курсаў для настаўнікаў, канферэнцый, дзе вырашаліся важныя культурна-асветніцкія пытанні. Л. Гайдук мае польскія ўзнагароды і адзнакі, у т. л. "Заслужаны для Беласточчыны".

Ірына Тамільчык

Гайдук Мікола

***Гайдук Мікола** (Мікалай Раманавіч; псеўд. Міка, І. Снарскі, Ігнат Снарскі, М. Снарскі, А. Чабор, Алесь Чабор; крыпт. М. Г.; 29.5.1933, в. Кабылянка Беластоцкага ваяв. Польшча – 2.9.1998, Беласток), беларускі празаік, паэт, публіцыст, педагог, гісторык, перакладчык, грамадскі і рэлігійны дзеяч беларускай дыяспары ў Польшчы. Заслужаны дзеяч культуры (1986). Сябар Саюза польскіх пісьменнікаў (1985), Саюза беларускіх пісьменнікаў (1995).*

М. Гайдук нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У 1951 г. скончыў агульнаадукацыйны ліцэй у Міхалове, у 1956 г. — аддзяленне рускай філалогіі Ленінградскага універсітэта, у 1959 г. — беларускае аддзяленне філфака Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Працаваў настаўнікам беларускай, рускай і лацінскай моваў у Агульнаадукацыйным ліцэі з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім (1959–1964), адначасова з'яўляўся кіраўніком і выкладчыкам беларускага фальклору і літаратуры на беларускім аддзяленні Завочных настаўніцкіх курсаў у Беластоку (1963–1964). У 1965–1971 гг. — дырэктар Агульнаадукацыйнага ліцэя з беларускай мовай навучання у Бельску-Падляшскім. З 1971 г. — публіцыст штотыднёвіка беларусаў Польшчы "Ніва", у 1987–1989 гг. — намеснік галоўнага рэдактара. З 1989 г. быў на пенсіі. Збіральнік беларускага фальклору, аўтар перакладаў на беларускую мову твораў польскіх, рускіх і інш. аўтараў. Змяшчаў свае артыкулы, творы на старонках часопісаў і зборнікаў "Studia polono-slavica-orientalia" (Варшава), "Slavia Orientalis" (Варшава), "Беларускі сьвет" (ЗША), "Беларускі каляндар", "Ніва", "Czasopis", "Белавежа", "Przegl№d Prawosiawny" (Беласток), "Весткі Інстытута беларусаведы" (Ляймен, Германія) і інш. Рэдагаваў праваслаўны рэлігійны маладзёжны квартальнік "Фос". Разам з жонкай, Л. Гайдук, падрыхтаваў падручнікі для пачатковых класаў беларускіх школ у Польшчы па роднай мове (3, 4 і 5 класы). Аўтар "Граматыкі беларускай мовы" для 5–8 класаў (1959–1987). У 1963 г. распрацаваў праграму навучання беларускай мове у 2–8 класах.

Як пісьменнік дэбютаваў у 1957 г. вершам ў беластоцкай "Ніве". У 1960 г. надрукаваў першае апавяданне. У 1988 г. выдаў зборнік вершаў на польскай мове "Цішыня", у 1981 г. — зборнік запісаных і апрацаваных казак і легенд "Аб чым шуміць Белавежская пушча" (у 1990 г. перавыдадзены на польскай мове, у 1996 г. дапоўненае выданне выйшла ў Мінску). У 1991 г. у Мінску ўбачыў свет зборнік яго апавяданняў і аповесцей "Трызна", у 1993 г. — зборнік гістарычных эсэ "Паратунак". Аўтар кнігі гістарычных эсэ "Брэсцкая унія 1596" (на польскай мове, Беласток, 1995) рускамоўнае выданне – Мінск, 1996), празаічнага зборніка "Белавежскія былі і небыліцы" (1996). Складальнік зборніка "Песні Беласточчыны", выдадзенага Акадэміяй навук Беларусі ў серыі "Беларуская

народная творчасць (1997) — у яго ўвайшлі 607 песень, часткова з нотамі. У беластоцкіх часопісах надрукаваў цыклы гістарычных эсэ "Нашы карані" і "Слядамі стагоддзяў". Творы М. Гайдука, яго апавяданні, вершы, нарысы, эсэ і артыкулы, прысвечаны пераважна гістарычнаму мінуламу беларускага і суседніх народаў, паўстанню 1863–1864 гг. на Беласточчыне, дзеячам беларускай культуры. У рэпартажах расказваў пра свае паездкі ў Беларусь. Займаўся перакладамі з польскай і лацінскай моваў.

Узнагароджаны Адзнакай тысячагоддзя Польшчы (1966), сярэбраным (1969) і кавалерскім (1984) Крыжамі ордэна Адраджэння Польшчы, ордэнамі Святой Роўнаапостальнай Марыі Магдалены III (1993) і II (1995) ступеняў Свяшчэннага Сінода епіскапаў Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы; сярэбранай (1974) і залатой (1978) адзнакамі "Заслужаны для Беласточчыны", дыпломам міністра культуры Рэспублікі Беларусь (1996) і інш.

Ларыса Языковіч

Гайдук Уладзімір

Гайдук Уладзімір *(7.9.1941, в. Полыме Беластоцкага ваяв., Польшча), паэт. Сябар Саюза польскіх пісьменнікаў.*

У. Гайдук нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У 1955 г. скончыў пачатковую школу і 2 гады вучыўся ў беларускім ліцэі ў Бельску-Падляшскім. Каб не заняпала бацькоўская гаспадарка, мусіў пакінуць вучобу. У сярэдзіне 1960-х гг. спрабаваў прадоўжыць адукацыю ў Беластоцкім завочным ліцэі, аднак цяжкія матэрыяльныя ўмовы зноў прымусілі адмовіцца ад задумы. Цяпер гаспадарыць на хутары.

У. Гайдук дэбютаваў у "Ніве" ў 1956 г. вершамі "Захад сонца" і "Зіма ідзе". Аўтар кніг паэзіі "Ракіта" (1971) і "Блакітны вырай" (1990). Творчасць У. Гайдука мае традыцыйны характар, звязана з фальклорам, пераважна прыродаапісальная. Піша на беларускай і польскай мовах.

Жыве на хутары Тарнопаль ля Гайнаўкі (Польшча).

Ян Чыквін (Беласток, Польшча)

Галавачоў Павел

Галавачоў Павел Якаўлевіч *(15.12.1917, в. Кашалёва Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл. – 2.7.1972), военачальнік. Двойчы Герой Савецкага Саюза.*

У Савецкай Арміі з 1938 г. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны з чэрвеня 1941. Лётчык-знішчальнік, камандзір звяна 9-га гвардзейскага знішчальнага авіяцыйнага палка (6-й гвардзейскай знішчальнай авіяцыйнай дывізіі 8-й паветранай арміі, 4-га Украінскга фронту), гвардыі старшы лейтэнант Галавачоў да лістапада 1943 г. здзейсніў 225 баявых вылетаў, удзельнічаў у 92 паветраных баях, асабіста збіў 17 самалётаў праціўніка. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена ў лістападзе 1943 г. Намеснік камандзіра эскадрыллі таго ж палка (303-й знішчальнай авіяцыйнай дывізіі 1-й паветранай арміі 3-га Беларуска фронту) капітан Галавачоў да сакавіка 1945 г. здзейсніў 385 баявых вылетаў, асабіста збіў 26 самалётаў праціўніка. У 1945 г. узнагароджаны другім медалём "Залатая Зорка". У 1951 г. скончыў Ваенна-паветраную акадэмію, у 1959 г. — Ваенную акадэмію Генштаба. Генерал-маёр авіяцыі (1957). У Гарадку Львоўскай вобл. на вуліцы яго імя ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Алесь Карлюкевіч

Галавачоў Пётр

Галавачоў Пётр Мікалаевіч *(12.7.1929, в. Ірынаўка Веткаўскага р-на Гомельскай вобл.), заслужаны работнік народнай гаспадаркі Комі АССР, выдатнік народнай адукацыі РСФСР.*

У 1936 г. П. Галавачоў разам з бацькамі пераехаў у Сыктыўкар, дзе вучыўся ў пачатковай школе. У жніўні 1944 г. вярнуўся на Беларусь. У 1946 г., скончыўшы Добрушскую сярэднюю школу, паступіў у Беларускі лесатэхнічны інстытут. Пасля заканчэння інстытута, у 1951 г., быў накіраваны ў Комі АССР, у Карткероскі леспрамгас. Пасля 14-ці гадоў работы галоўным інжынерам, а затым дырэктарам леспрамгаса пераведзены на пасаду дырэктара Сыктыўкарскага лесапільна-дрэваапрацоўчага камбіната. Пры П. Галавачове камбінат дасягнуў высокіх аб'ёмаў экспартных паставак і стаў адным з лепшых буйных прадпрыемстваў галіны Паўночна-Заходняга раёна СССР. П. Галавачоў узнагароджаны 2-ма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Дружбы народаў, медалямі за доблесную працу, у тым ліку і ў гады Вялікай Айчыннай вайны, іншымі ўзнагародамі. Цяпер ён — пенсіянер рэспубліканскага значэння Расійскай Федэрацыі.

Ніна Петухова

Галавінскі Аляксандр

Галавінскі Аляксандр Кузьміч *(кастрычнік 1886, в. Муравілле Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Касцюковіцкі р-н Магілёўскай вобл.), грамадска-палітычны дзеяч.*

А. Галавінскі скончыў Кіеўскі політэхнічны інстытут (1912). За ўдзел у студэнцкім рэвалюцыйным руху быў арыштаваны. Спачуваў партыі эсэраў. У Першую сусветную вайну служыў у паветраплавальным батальёне. У 1918 г. уваходзіў у прэзідыум Кіеўскай беларускай рады, быў загадчыкам бюро па ўладкаванню бежанцаў, прадстаўляў урад БНР на Украіне. У канцы 1918 г. камандзіраваны да ўрада БНР у Гродна як прадстаўнік украінскіх беларусаў. Быў саветнікам па тэхніка-эканамічных пытаннях пры міністры замежных спраў БНР. У 1919 г. арыштаваны румынскімі ўладамі. У 1920 г. пераехаў у Латвію. Удзельнічаў у Беларускай нацыянальна-палітычнай нарадзе ў Рызе (кастрычнік 1920). У кастрычніку — лістападзе 1920 г. вёў перагаворы з прадстаўнікамі Літвы, каб стварыць антыпольскі саюз. З 1921 г. знаходзіўся ў Літве, быў Старшынёй Рады Беларускай нацыянальнай сувязі, уваходзіў у склад Камітэта загранічных груп Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў у Каўнасе, Беларускага брацтва, выдаваў часопіс "Покліч". Выступаў за незалежную Беларусь ў яе этнічных межах, супраць каланізацыйнай палітыкі Польшчы ў адносінах да Заходняй Беларусі. Патрабаваў скасавання Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. у частцы, якая датычылася Беларусі. Быў адным з арганізатараў склікання Першай Усебеларускай канферэнцыі (Прага, верасень 1921). У 1923–1925 гг. працаваў інжынерам у Каўнасе. У 1923 г. падтрымаў урад БНР на чале з А. Цвікевічам, быў адным з кіраўнікоў Беларускага нацыянальнага камітэта ў Каўнасе. У гэты час, верагодна, пачаў супрацоўніцтва са спецслужбамі СССР. У кастрычніку 1925 г. удзельнічаў у рабоце Другой Усебеларускай канферэнцыі (Берлін), падтрымаў прапанову аб самароспуску ўрада БНР. У 1927 г. быў арыштаваны літоўскімі ўладамі. Пасля вызвалення пераехаў у БССР. Працаваў загадчыкам праектна-тэхналагічнага бюро УСНД, затым у НДІ прамысловасці БССР. 19 ліпеня 1930 г. арыштаваны ДПУ БССР па справе "Саюза вызвалення Беларусі". Паводле пастановы калегіі АДПУ БССР ад 10 красавіка 1931 г. сасланы на 5 гадоў у Ніжні Ноўгарад. Далейшы лёс А. Галавінскага невядомы. Рэабілітаваны Вярхоўным судом БССР у 1988 г.

Аляксандр Ціхаміраў

Галёркін Барыс

Галёркін Барыс Рыгоравіч *(4.3.1871, в. Прудок Лепельскага пав., цяпер Лепельскі р-н Віцебскай вобл. – 12.7.1945, Ленінград), вучоны ў галіне тэорыі пругкасці, прафесар. Акадэмік АН СССР (1935), член-карэспандэнт (1928), член Акадэміі архітэктуры СССР. Прафесар Пецярбургскага універсітэта і прафесар Інстытута шляхоў зносін (Пецярбург). Інжынер-генерал-маёр. Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі РСФСР (1934). Лаўрэат Сталінскай прэміі (1942).*

Нарадзіўся Б. Галёркін ў беднай сялянскай сем'і. Пачатковую адукацыю атрымаў у двухгадовым вучылішчы ў Полацку, з дванадцаці гадоў пачаць працаваць. Самастойна прайшоў курс гімназіі і ў 1893 г. вытрымаў экзамен па курсу рэальнага вучылішча ў Мінску (здаў экстэрнам). У 1899 г. паспяхова скончыў Пецярбургскі тэхналагічны інстытут і працаваў да 1903 г. у Харкаве на Паравозабудаўнічым механічным заводзе. З 1909 г. выкладаў у Пецярбургскім політэхнічным інстытуце, з 1920 г. — прафесар Петраградскага універсітэта, прафесар Інстытута шляхоў зносін. У 1939–1945 гг. — дырэктар Інстытута механікі АН СССР. Прымаў удзел у рэвалюцыйным руху Расіі, за што ў 1906 г. быў асуджаны.

Навуковыя даследаванні Б. Галёркін праводзіў у галіне будаўнічай механікі, вылічальнай матэматыкі, тэорыі пругкасці матэрыялаў. У 1913–1915 гг. распрацаваў праект металічнага будынка кацельні электрычнай станцыі ў Пецярбургу. Гэты будынак быў першым у Расіі буйным металічным прамысловым аб'ектам з вялікімі нагрузкамі і адным з лепшых інжынерных збудаванняў у Еўропе таго часу. Распрацаваў эфектыўныя метады дакладнага і набліжанага інтэгравання ўраўненняў тэорыі пругкасці. Прапанаваў метад пошуку прыбліжанага рашэння аператарных ураўненняў у выглядзе канчатковай лінейнай камбінацыі элементаў зададзенай лінейнай незалежнай сістэмы. Гэты метад атрымаў шырокае распаўсюджанне ў задачах тэорыі пругкасці, у варыяцыйным вылічэнні, матэматычнай фізіцы і тэхніцы пры рашэнні краевых задач. Адзін са стваральнікаў тэорыі згібу пласцінак. Даследаваў уплыў формы пласцінак на размеркаванне дзеючых на яе сіл (націску), вывучаў эфект размеркавання лакальнага ціску, уплыў пругкасці апорнага контура, паклаў пачатак даследаванням тэрмічных напружанняў. Прапанаваў (1930) выгляд рашэння ўраўнення пругкай раўнавагі, якія утрымліваюць тры бігарманічныя функцыі, што дазволіла рашыць многія важныя прасторавыя задачы тэорыі пругкасці. Распрацаваў матэматычную тэорыю цыліндрычных абалонак і прапанаваў прыбліжанае рашэнне для такіх абалонак пры адвольнай нагрузцы і любых апорах, што дазволіла разлічыць трубаправоды пад адвольнай нагрузкай.

Б. Галёркін — аўтар больш за 80 грунтоўных навуковых прац, якія пасля смерці вучонага былі выдадзены ў кнізе "Збор твораў" (М., 1952). З'яўляецца аўтарам шэрагу інжынерных праектаў. Быў канструктарам пры

праектаванні Днепрагэса , Волхаўскай ГЭС і інш. У час Вялікай Айчыннай вайны ўваходзіў у кола буйнейшых вучоных Ленінграда, якія арганізоўвалі абарону горада і краіны.

За распрацоўку матэматычнай тэорыі цыліндрычных абалонак яму была прысуджана Сталінская прэмія. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна.

Вольга Гапоненка

Галкін Самуіл

Галкін Самуіл Залманавіч *(1897, г. Рагачоў Магілёўскай губ., цяпер Гомельскай вобл. – 1960, Масква), яўрэйскі паэт, драматург.*

С. Галкін выхоўваўся ў хасідскай сям'і. Захапляўся паэзіяй. Да 1924 г. уваходзіў у гурток аднадумцаў, якія марылі пасяліцца ў Ізраілі. У ранніх сваіх вершах ён пісаў аб адыходзе яўрэяў ад старога ўкладу жыцця. У далейшым звяртаецца і да савецкай тэматыкі, а ў гады Другой сусветнай вайны піша патрыятычныя вершы. Найбольш каштоўная частка яго паэтычнай спадчыны — інтымная і філасофская лірыка. У 1950 г. С. Галкін быў арыштаваны, але пазбегнуў смяротнай кары. Вызвалены ў 1955 г., а затым рэабілітаваны.

Друкавацца Галкін пачаў з 1920 г. Пісаў спачатку на ідыш, потым на ідыш. Першыя зборнікі "Вершы" (1922) і "Боль і мужнасць" (1929). У канцы 1930-х гг. звяртаецца да драматургіі. Драматычныя паэмы "Бар-Кохба" (1939) і "Суламіф" (1940) прысвечаны старажытнай гісторыі яўрэйскага народа. Гераізму яўрэяў Варшавы С. Галкін прысвяціў драматычныя паэмы "За жыццё" і "Паўстанне ў гета" (1947). Перажытаму ў заключэнні прысвечаны яго вершы "Споведзь Сакрата" (1955), цыкл "Распавядаць бы ў радасны час" (1950–1958), які быў уключаны ў пасмяротны зборнік "Мой скарб" (М., 1966). Перакладаў на ідыш творы А. Пушкіна, С. Ясеніна, У. Шэкспіра і інш. Рускія пераклады твораў С. Галкіна сабраны ў зборніку "Вершы. Балады. Драмы" (М., 1958). Вершы С. Галкіна друкаваліся ў Беларусі як у арыгінале (Штэрн. 1928. № 11–12; 1933. № 8), так і ў перакладзе на беларускую мову (Рагачоўскі розгалас. Рагачоў, 1996).

Браніслава Котава

Галуза Уладзімір

Галуза Уладзімір Васільевіч *(19.9.1934, в. Новае Сяло Талачынскага р-на Віцебскай вобл.,) урач, кандыдат медыцынскіх навук, палкоўнік медыцынскай службы (1987), дзеяч беларускай дыяспары ў Расіі..*

У. Галуза нарадзіўся ў сям'і служачага, скончыў у 1953 г. сярэднюю школу ў Маладзечне. Вучыўся ў І-м Ленінградскім медыцынскім інстытуце імя акад. І. П. Паўлава, пасля заканчэння якога (1959) быў прызваны ў рады Савецкай Арміі. Вайсковую службу праходзіў у Венгрыі, на Украіне, у Ленінградзе. У 1969 г., пасля заканчэння факультэта ўдасканалення ўрачоў Ваенна-медыцынскай акадэміі імя С. М. Кірава, быў накіраваны ў Сібірскую ваенную акругу, дзе служыў начальнікам тэрапеўтычнага аддзялення ваенных шпіталяў у Томску, Омску і Новасібірску. У 1987 г. быў звольнены з арміі ў запас па выслузе гадоў з пасады вядучага тэрапеўта Новасібірскага акружнога ваеннага шпіталя ў званні палкоўніка медыцынскай службы. З 1988 па 1994 г. працаваў урачом-тэрапеўтам, старшым навуковым супрацоўнікам у Інстытуце агульнай паталогіі і экалогіі чалавека Сібірскага аддзялення Расійскай акадэміі медыцынскіх навук.

З 1994 г. У. Галуза актыўна займаецца грамадскай дзейнасцю, накіраванай на вырашэнне пытанняў захавання самабытнасці беларусаў Сібіры, развіцця беларускай мовы, адукацыі, беларускай культуры. Быў удзельнікам I і II з'ездаў беларусаў свету, "Чарнобыльскага шляху – 89" у Мінску. Член рады згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына", старшыня суполкі "Беларусы Сібіры" (з 1994 па 1999), прэзідэнт Нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў Новасібірска і Новасібірскай вобласці (з 1997), намеснік старшыні каардынацыйнага савета Асацыяцыі нацыянальных арганізацый Новасібірска і Новасібірскай вобл. Па яго ініцыятыве праведзена сустрэча беларусаў Заходняй Сібіры (1995), створаны аддзел беларускай літаратуры ў гарадской бібліятэцы (1995), беларускае тэлебачанне (1998), грамадскі беларускі культурны цэнтр (1998), адкрыта спецыялізацыя "Беларуская мова і беларуская літаратура" на філалагічным факультэце Новасібірскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта (1998), створаны беларускі вакальна-інструментальны ансамбль "Азарычы" (1999). З 1997 г. штогод праводзяцца абласныя фестывалі беларускай культуры, навукова-практычныя канферэнцыі "Культура і адукацыя нацыянальных меншасцей Сібіры". У 1997 г. праведзены грамадскія чытанні "480 гадоў усходнеславянскага кнігадрукавання", прысвечаныя Францыску Скарыне.

У. Галуза — аўтар больш за 100 навуковых прац, прысвечаных праблемам тэрапіі. Яго публікацыі таксама прысвечаны вывучэнню ўкладу беларусаў у асваенне і развіццё Сібіры, прапагандзе і адраджэнню беларускай традыцыйнай культуры Сібіры, абароне правоў беларусаў як нацыянальнай меншасці Сібіры.

Узнагароджаны 9-цю ўрадавымі ордэнамі і медалямі, знакам "Выдатнік аховы здароўя", сярэбраным медалём ВДНГ СССР. Падтрымлівае цесную сувязь з рэдакцыяй бюлетэня Каетакты і дыялогі" (Мінск).

Уладзімір Драздоў (Новасібірск, Расія)

Гальданскі Віталь

Гальданскі Віталь Іосіфавіч *(18.6.1923, Віцебск) — фізіка-хімік, акадэмік Расійскай акадэміі навук (1981; член-карэспандэнт з 1962). Лаўрэат Ленінскай прэміі (1980).*

Скончыў Маскоўскі універсітэт (1944). У 1942–1952 гг. працаваў у Інстытуце хімічнай фізікі АН СССР, у 1952–1961 гг. — загадчык сектара Фізічнага інстытута АН СССР, з 1961 г. — загадчык аддзела Інстытута хімічнай фізікі АН СССР. Адначасова з 1951 г. выкладаў у Маскоўскім інжынерна-фізічным інстытуце, абраны ў 1956 г. прафесарам. З 1988 г. узначальвае Інстытут хімічнай фізікі Расійскай акадэміі навук.

Навуковыя даследаванні ў галіне хімічнай фізікі, хіміі высокіх энергій, ядзернай хіміі, фізікі ядра і элементарных часцінак. Прапанаваў усебаковае выкарыстанне гама-рэзананснай спектраскапіі і анігіляцыі пазітронаў у хіміі. Адкрыў з'яву квантавага нізкатэмпературнага ліміта (парога) хуткасці хімічных рэакцый, адкрыў і растлумачыў з'яву асіметрыі мёсбаўэраўскіх спектраў, якая атрымала назву "эфект Гальданскага–Карагіна", заклаў асновы фізічнай хіміі пазітрона і пазітронія. Адкрыў палімерызацыю цвёрдых манамераў пад уздзеяннем ударных хваляў. Прадказаў з'яву двупратоннай радыеактыўнасці, выпраменьванне бета-спазняючых параў нейтронаў і пратонаў, існаванне і ўласцівасці многіх дзясяткаў невядомых ядраў, якія далёкія ад вобласці стабільнасці (у тым ліку ўласцівасці зверхцяжкага гелію-8), упершыню эксперыментальна вызначыў электрычную палярызаванасць пратона ў доследах на камптом-эфекту на пратоне. Сярод асноўных навуковых прац вучонага — "Двухпратонная радыеактыўнасць" (УФН. 1965. Т. 87. Вып. 2.), манаграфіі "Эфект Мёсбаўэра і яго прымяненне ў хіміі" (М., 1963), " Фізічная хімія пазітрона і пазітронія" (М., 1968).

За вынікі навуковых даследаванняў узнагароджаны Ленінскай прэміяй (1980), залатым медалём Д. І. Мендзялеева (1975), прэміяй імя Д. І. Мендзялеева (1966).

В. Гальданскі з'яўляецца галоўным рэдактарам часопіса "Хімія высокіх энергій" (1967—1987) і "Хімічная фізіка" (з 1987).

Вольга Гапоненка

Гарбук Вісарыён

Гарбук Вісарыён Сцяпанавіч *(11(24).11.1913, в. Шкілякі Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер Полацкага р-на Віцебкай вобл. – 8.8.1986, Пяцігорск, Расія), празаік. Сябар Саюза беларускіх пісьменікаў з 1963. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1979).*

Нарадзіўся ў сям'і селяніна-бедняка. Бацька памёр у 1917 г. Сямігадовага хлапчука ўзяў да сябе дзядзька Язэп Ключонак, настаўнік пачатковай школы. З яго дапамогай В. Гарбук скончыў школу сялянскай моладзі ў Чашніках, педтэхнікум у Лепелі. Быў сакратаром камсамольскай ячэйкі пры Дварэцкім сельсавеце Чашніцкага р-на; з 1933 г. пачаў працаваць настаўнікам і вучыцца завочна, з 1935 г. — стацыянарна на літфаку Мінскага педінстытута. Пісаў вершы, займаўся ў секцыі пачынаючых паэтаў пры СП БССР. У красавіку 1936 г. беспадстаўна рэпрэсіраваны. Зняволенне адбываў на Калыме. Вярнуўся ў 1940 г. Больш года працаваў настаўнікам у Мехаўскай школе (Гарадоцкі р-н). Поўнасцю рэабілітаваны ў 1961 г. У 1941–1946 гг. — у Чырвонай Арміі. Салдатам у складзе інжынерных войск прымаў удзел у абароне Масквы, вызваленні Беларусі, Варшавы, у баях на Вісленскім плацдарме, Одэры, паставіў свой аўтограф на сценах рэйхстага. Франтавая хвароба амаль на 14 гадоў прыкавала В. Гарбука да шпітальнага ложка. Толькі ў 1960 г. вярнуўся дадому інвалідам Айчыннай вайны першай групы. Жыў у Пяцігорску.

Літаратурнай працай В. Габрук пачаў займацца ўжо будучы цяжка хворым. Гэта стала для яго адзінай магчымасцю актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці. Працаваў літкансультантам (на грамадскіх пачатках) краявой газеты "Кавказская здравница" (Пяцігорск), прымаў удзел у рабоце літаб'яднання пры гэтай газеце, пасяджэнні якога адбываліся ў яго на кватэры, вёў шырокую перапіску і інш.

У 1957 часопіс "Семья і школа" змясціў першае апавяданне В. Гарбука "Прагулка ў будучыню". Пазней яго творы друкаваліся на старонках беларускіх перыядычных выданняў, у альманаху "Ставрополье" і інш. Першы зборнік апавяданняў "Не шукаю спакою" выйшаў у 1963 у Мінску. Аўтар кніг на беларускай і рускай мовах "Алачка-забывалачка" (1964), Танечкіны апавяданні" (1964), "На маім акне" (1966), "Твар у палоску" (1967), "Хто такія мы" (1973), "Горад без папугайчыкаў" (1983) і інш. Пісаў пра гераізм народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, расказваў пра надзённыя праблемы і з'явы жыцця сучаснага грамадства. Асабліва ўдаваліся апавяданні для дзяцей, дзе ёсць цікавыя назіранні, добрае веданне дзіцячай псіхалогіі. Перакладаў на беларускую мову і

апрацоўваў для дзяцей казкі народаў Паўночнага Каўказа (зборнік "Напой волатаў"). Па яго апавяданню "Твар у палоску" пастаўлены тэлефільм (1971). Узнагароджаны медалямі.

Лідзія Савік

Гарэцкі Усяслаў

Гарэцкі Усяслаў Гаўрылавіч*(5.6.1924, Масква), філолаг, педагог, беларускі грамадскі дзеяч, доктар педагагічных навук (1987), прафесар (1988), член-карэспандэнт Расійскай акадэміі адукацыі.*

У. Гарэцкі нарадзіўся ў сям'і вядомага беларускага дзеяча і вучонага Гаўрылы Гарэцкага. У 1941–1942 гг. працаваў станочнікам на заводзе № 74 г. Іжэўска (Удмурцкая АССР), з 1942 да 1945 г. — на Маскоўскім аўтамабільным заводзе. Быў курсантам вайсковага пяхотнага вучылішча ў Сарапуле. Працаваў настаўнікам Белавусаўскай сярэдняй школы ў Калужскай вобласці (1947–1954). У 1951 г. закончыў філалагічны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя У. І. Леніна. Быў выкладчыкам Маскоўскага бібліятэчнага інстытута (1954–1958). Вучыўся ў аспірантуры Маскоўскага гарадскога педагагічнага інстытута. На працягу 10 год (1958–1968) педагагічная дзейнасць У. Гарэцкага была звязана з Маскоўскім дзяржаўным педагагічным інстытутам, дзе ён быў асістэнтам, старшым выкладчыкам, дацэнтам. Да 1976 г. выконваў абавязкі загадчыка сектара пачатковага навучання Навукова-даследчага інстытута школ, да 1980 г. — загадчыка кафедры методыкі і педагогікі пачатковай школы Маскоўскага дзяржаўнага завочнага педагагічнага інстытута. З 1981 г. працуе загадчыкам лабараторыі, галоўным навуковым супрацоўнікам Інстытута агульнай адукацыі Міністэрства адукацыі Расійскай Федэрацыі. З 1979 г. з'яўляецца галоўным рэдактарам навукова-тэарэтычнага і метадычнага часопіса "Начальная школа".

У. Гарэцкі — аўтар больш за 250 прац па праблемах пачатковага навучання, адзін з вядучых спецыялістаў у галіне яго методыкі. Ён унёс вялікі ўклад у распрацоўку фундаментальных праблем навучання грамаце і чытанню, удасканаленню сістэмы навучання ў пачатковай школе. Яго тэарэтычныя і прыкладныя працы ("Аб шляхах і спосабах павышэння якасці ўрокаў чытання", "Асноўныя метады і прыёмы чытання", "Крытэрыі ацэнкі ўрокаў чытання", "Нагляднасць на ўроках чытання", "Крытычны аналіз стабільнага буквара і тэарэтычныя асновы новага буквара", "Буквары савецкага перыяду", "Азбукі Л. М. Талстога", "Асноўныя шляхі і формы самастойнай работы студэнтаў-завочнікаў", "Тэарэтычныя асновы і змест курса вучэбнага чытання ў пачатковай школе"), школьныя падручнікі ("Буквар", "Азбука", "Кніга для чытання", "Роднае слова" і інш.) занялі належнае месца ў распрацоўцы праграм сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў педагагічнага профілю, выкарыстоўваюцца ў дысертацыйных даследаваннях, пакладзены ў аснову канструявання школьных падручнікаў тыпу буквара і кнігі для чытання для пачатковых класаў школ Расійскай Федэрацыі, шэрагу яе аўтаномных тэрыторый, краін СНД. Некаторыя працы У. Гарэцкага перакладзены і выдадзены ў Балгарыі і Германіі.

Пры актыўным аўтарскім удзеле і пад кіраўніцтвам У. Гарэцкага у канцы 60-х гг. былі ўпершыню створаны метадычныя дапаможнікі новага комплекснага тыпу. Яны выйшлі некалькімі выданнямі агульным тыражом больш за 2 млн. экземпляраў і атрымалі шырокае прызнанне ў настаўнікаў і метадыстаў пачатковай школы. У. Гарэцкі як аўтар і кіраўнік вялікага аўтарскага калектыву прыняў актыўны ўдзел у стварэнні навучальных праграм, падручнікаў, усяго навучальна-метадычнага комплексу для новай 4-гадовай і абноўленай 3-гадовай пачатковай школы Расіі. У. Гарэцкі распрацаваў новую канцэпцыю далейшага развіцця і ўдасканалення методыкі навучання малодшых школьнікаў і стварэння адпаведных падручнікаў. Ім падрыхтаваны кнігі па курсу літаратурнага чытання ў пачатковай школе "Родная мова" (у 3 ч.).

У. Гарэцкі выдаў для рускіх школ у Беларусі новыя падручнікі "Рускае слова", у Эстоніі — "Новы рускі буквар", у Малдове — цыкл падручнікаў па чытанню. Ён праводзіць вялікую работу па падрыхтоўцы навуковых і педагагічных кадраў, чытае лекцыі па методыцы пачатковага навучання мове, праблемах букварыстыкі, удзельнічае ў многіх семінарах, канферэнцыях, на якіх выступае з навуковымі дакладамі.

У. Гарэцкі — член шэрагу вучоных саветаў, камісій, рэдсаветаў. Узнагароджаны двума ордэнамі "Знак пашаны", ордэнам "Дружбы народаў", медалём імя К. Ушынскага і інш. Удзельнічае ў працы беларускіх суполак Масквы.

Радзім Гарэцкі

Гаўрылюк Андрэй

Гаўрылюк Андрэй*(14.4.1949, Бельск-Падляшскі, Польшча), журналіст, выдавец, беларускі грамадскі дзеяч.*

Нарадзіўся А. Гаўрылюк у беларускай сям'і. Скончыў эканамічны ліцэй і курсы журналістаў у Беластоку. Пражываючы на Беласточчыне, у в. Відова, актыўна ўдзельнічаў у беларускім руху, арганізаваным Беларускім

грамадска-культурным таварыствам. Цікавіўся мінулым свайго краю, яго гісторыяй, этнаграфіяй, культурай, рэлігіяй. Спрыяў адкрыццю Беларускага музея ў Гайнаўцы, здаўшы ў яго фонд 20 экспанатаў.

З 1987 г. А. Гаўрылюк друкуецца ў "Ніве", "Czasopisie", "Голасе Радзімы" і шэрагу іншых газет і часопісаў на беларускай і польскай мовах. У сваіх артыкулах ён выступае за адраджэнне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, за вывучэнне і захаванне нацыянальных традыцый. Непакоіцца за лёс беларускай мовы, звяртаючыся да маладога пакалення з заклікамі яе вывучэння і шанавання. У 1992 г. быў выбраны старшынёй тэрытарыяльнай рады Беларускага дэмакратычнага аб'яднання ў Ольштыне.

А. Гаўрылюк выдаў кнігу "Быць беларусам", а таксама каля 20 публікацый з разглядам сітуацыі ў сённяшняй Беларусі ў ацэнках польскага друку. З 1994 г. на ўласныя сродкі выдае бюлетэнь "Грабіна", у якім друкуюцца матэрыялы па гісторыі, культуры і рэлігіі беларусаў, агляды сучаснага становішча ў Беларусі. Публікацыямі ў ім А. Гаўрылюк імкнецца прыцягнуць увагу чытачоў бюлетэня да вывучэння багатага мінулага Беларусі, пазнаёміць з новымі кнігамі, што выходзяць у свет.

З 1997 г. выдае штомесячнік "Kronika Biaioruska Andrzeja Gawryluka" і бюлетэнь "Gazeta Mniejszościowa Andrzeja Gawryluka", у якіх апавядаецца пра гісторыю і сучаснае жыццё нацыянальных супольнасцей Ольштыншчыны — татараў, украінцаў, беларусаў, літоўцаў, немцаў і інш.

Узнагароджаны 6 Ганаровымі граматамі за ахвярную працу на карысць Праваслаўнай Царквы. Жыве ў Ольштыне.

Ірына Тамільчык

Гаштальд Тадэвуш

***Гаштальд Тадэвуш** (1.1.1932, Віленшчына – 16.6.2000), доктар габілітаваны, прафесар Вышэйшай педагагічнай школы ў Слупску (Польшча), гісторык, грамадскі дзеяч.*

Т. Гаштальд паходзіць з сям'і, здаўна аселай у Ашмянскім павеце. У 1945 г. сям'я пераехала ў Польшчу, у г. Хошчна. Вучыўся ў Вроцлаўскім універсітэце. З 1969 г. працуе ў Вышэйшай педагагічнай школе ў Слупску. Займаецца навукова-даследчыцкай дзейнасцю. У сферы яго даследаванняў — гісторыя заходне-паморскага рэгіёна ў XIX і XX стст., дзейнасць польскіх ваеннапалонных у канцлагерах у час Другой сусветнай вайны. З'яўляецца аўтарам шматлікіх артыкулаў, 10 манаграфій, сярод якіх — "Па слядах паморскай аперацыі" (1973), "Культурнае жыццё ў лагерах польскіх ваеннапалонных на Заходнім Памор'і. 1939-1945" (1977), "Над Нёманам і Ашмянкай: з гісторыі АК на Віленшчыне і Навагрудчыне" (1991), "Культурна-асветніцкае жыццё ў лагерах польскіх ваеннапалонных у СССР (1939-1945)" (1994), "Налібоцкая пушча: з гісторыі праследаванняў, барацьбы і мардаванняў у 1939-1945 гг." (1998) і інш. З'яўляецца сааўтарам 7 навуковых даследаванняў, рэдактарам калектыўных зборнікаў.

Наш суайчыннік прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. З'яўляўся ініцыятарам стварэння і заснавальнікам "Таварыства прыхільнікаў Віленшчыны і Крэсаў Усходніх" у Кашаліне. З 1993 г. па 2000 г. рэдагаваў часопіс-бюлетэнь "Ziemia Oszmianska" ("Ашмянская зямля"), дзе друкуюцца матэрыялы, прысвечаныя актуальным пытанням гісторыі і культуры Беларусі. Цікавіўся падзеямі, што адбываліся ў Беларусі, папулярызаваў ідэі беларушчыны, цеснага культурнага ўзаемадзеяння польскага і беларускага народаў.

Ірына Тамільчык

Гваздзёў Яўген

***Гваздзёў Яўген Аляксандравіч** (1934, г. Пінск Палескага ваяв., цяпер Брэсцкая вобл.), марскі падарожнік.*

Я. Гваздзёў, беларус па паходжанні, гадаваўся ў далёкай сваячкі, бо яго бацька, арыштаваны ў 1937 г., не вярнуўся з ГУЛАГа, а маці загінула ў вайну. Я. Гваздзёў скончыў мараходную школу ў Астрахані, 35 гадоў плаваў суднавым механікам па Каспійскім моры. Марыў аб кругасветным падарожжы на яхце. Збіраў кнігі аб вандроўніках-адзіночках, якія плавалі па акіяне пад ветразем. Першае сваё судна збудаваў з грабной шлюпкі, хадзіў на ім зімой і ўлетку па Каспіі, 44 разы перасек мора ўздоўж і ўпоперак.

На яхце "Лена", даўжынёй усяго 5,5 м, без матора, толькі пад ветразем, выйшаў з Наварасійска і па Міжземным моры даплыў да Афінаў. Адтуль у красавіку 1993 г. Я. Гваздзёў, не ведаючы ніводнай мовы, амаль што без грошай, з запасам харчоў усяго на тры месяцы выправіўся ў кругасветнае падарожжа. Поўнае драматычных прыгод, падарожжа праз тры акіяны — Атлантычны, Ціхі і Індыйскі — доўжылася тры гады. З перапынкамі, на рамонт яхты і папаўненне харчовых запасаў яно прайшло па маршруце: Грэцыя — Каморскія астравы — Галапагоскія астравы — Таіці — Інданезія — Сінгапур — Шры-Ланка — Індыя — Сейшэльскія астравы — Самалі — Суэцкі канал —Турцыя — Грэцыя. На пачатку шляху албанскія пагранічнікі адабралі ў Я. Гваздзёва ўсе харчы і грошы, а 3 красавіка 1995 г. яхту "Лена" абрабавалі самалійскія ўзброеныя атрады, пакінуўшы толькі 40 л вады

і 12 кг рысу на астатнія 600 міль шляху. 13 лютага 1996 г. Я. Гваздзёў прывёў яхту ў Афіны. На "Лене" не было картаў, навігацыйных прыбораў, харчавання. Сваё "безразважнае і дзёрзкае", на думку знаўцаў марской справы, кругасветнае падарожжа наш зямляк здзейсніў, маючы 62 гады. У ліпені 1996 г. Я. Гваздзёў на "Лене" прычаліў у Махачкале.

Вацлаў Мацкевіч

Геніюш Юрый

Геніюш Юрый Іванавіч *(21.10.1935, м. Зэльва Ваўкавыскага пав. Беластоцкага ваяв., цяпер раённы цэнтр Гродзенскай вобл. — 21.11.1985, Беласток, Польшча), беларускі паэт, празаік, драматург, грамадскі дзеяч.*

Ю. Геніюш — сын беларускай паэтэсы Ларысы Геніюш. Па трагічных для сям'і Геніюшаў абставінах большую частку свайго жыцця правёў у Беластоку, адасоблена ад бацькоў. Прымаў актыўны ўдзел у дзейнасці Беларускага грамадска-культурнага таварыства (БГКТ) у Польшчы. З 1963 г. — член беларускага літаратурнага аб'яднання "Белавежа", удзельнік літаратурна-мастацкіх мерапрыемстваў БГКТ і "Белавежы": літаратурных конкурсаў, дыспутаў, семінараў і інш. Як пісьменнік дэбютаваў у кастрычніку 1963 г. на старонках тыднёвіка БГКТ "Ніва" апавяданнем "Прыкметы". У 1963 г. стаў лаўрэатам літаратурнага конкурсу БГКТ "Сучасная беластоцкая вёска" за апавяданне "Зямля". Супольна з С. Яновічам выдаў у Беластоку ў 1976 г. "Зборнік сцэнічных твораў". У 1992 г. літаратурнае аб'яднанне "Белавежа" выдала ў Польшчы кнігу "Маці і сын", у якой змешчаны раней не друкаваныя творы Л. Геніюш і вершы Ю. Геніюша, напісаныя на фальклорна-міфалагічнай аснове. У 1993 г. у Беластоку выйшла кніга прозы Ю. Геніюша "З маёй званіцы", якую выдала праграмная рада тыднёвіка "Ніва" за кошт фундацыі Міністэрства культуры і мастацтва Польшчы. У кнігу ўвайшлі фельетоны, гумарыстычныя творы і апавяданні, якія ў лаканічнай і своеасаблівай вобразнай форме (некаторыя творы нагадваюць анекдоты) расказваюць пра забаўныя моманты ў жыцці беларускай вёскі на Беласточчыне.

Пахаваны ў Беластоку.

Ларыса Языковіч

Гзоўскі Аляксандр

Гзоўскі Аляксандр Іосіфавіч *[псеўд. і крыпт. Юноша-Гзоўскі Аляксандр, Junosza-Gzowski Aleksander, Б. Ольгинский, Альфа-Бэта, А. Юноша, А. Б.; 8(20).4.1888 г., маёнт. Борхава (Борхаў) Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Рэчыцкі р-н Гомельскай вобл. – ?] рускі і польскі пісьменнік і журналіст.*

Нарадзіўся ў сям'і "абрусеўшага, дакладней, абеларусеўшага паляка" (з аўтабіяграфіі А. Гзоўскага, напісанай для С. Вянгерава, якая зберагаецца ў Пушкінскім доме ў Санкт-Пецярбургу; інфармацыя М. Нікалаева) Іосіфа Фартунатавіча Гзоўскага і Людвікі з Ланеўскіх-Волк. Скончыў Смаленскую гімназію, юрыдычны факультэт Маскоўскага універсітэта. У 1911–1912 гг. і з 1914 г. — у рускай арміі. У 1912–1914 гг. працаваў адвакатам. У 1915 г. скончыў Аляксееўскае ваеннае вучылішча ў Маскве. Служыў у Канску і Іркуцку. З кастрычніка 1917 г. — у Туркестане, рэдактар газеты "Туркестанский курьер" (Ташкент). У канцы 1917 – пачатку 1918 г. супрацоўнічаў з Часовым урадам у Какандзе. З лютага 1918 г. — у Маскве, супрацоўнік газет "Раннее утро" і "Русские ведомости". Як карэспандэнт гэтых газет выехаў у Смаленск. Пасля закрыцця газет (ліпень 1918) працаваў рабочым на чыгуначнай станцыі, восенню 1918 г. — загадчык юрыдычнай часткай аддзела сацыяльнага забеспячэння Заходняй вобласці (камуны). Супрацоўнічаў у газ. "Известия Западной коммуны". Разам з першым урадам БССР у студзені 1919 г. пераехаў у Мінск; супрацоўнік газет "Звезда" і "Бедняк", загадчык рэдакцыі часопіса "Заря Запада". Смаленскія і мінскія падзеі апісаў у творы "У дзяржаве чырвоных людажэрцаў: Аповесць з жыцця бальшавіцкай Расіі", выдадзенай асобнай кнігай у Варшаве ў 1921 г. у перакладзе на польскую мову. Першую рэдакцыю аповесці змясціў у газеце "Минский курьер" у 1919 г. пад назвай "Александр Мясникьянц: Роман в двух частях". Гзоўскі, застаўшыся ў Мінску, занятым польскімі войскамі, стаў выдаўцом і рэдактарам гэтай газеты. Паводле некаторых дадзеных, выданне фінансавалася "двуйкай" — польскай ваеннай разведкай. Другая рэдакцыя аповесці друкавалася ў жніўні–верасні 1920 г. у варшаўскай "Свободе" пад назвай "Каты рэвалюцыі". Гзоўскі быў рэдактарам "Свободы", а фактычным выдаўцом і кіраўніком — Б. Савінкаў. У 1921 г. — рэдактар варшаўскага аддзялення тэлеграфнага агенцтва "Руссопресс". Прыняўшы польскае грамадзянства, жыў у Варшаве, з 1927 г. — у Жэляхове Гарволінскага пав., а ў 1938 г. — у Собалеве таго ж павета. У Польшчы супрацоўнічаў з "Gazetą Poranną — 2 grosze", "Gazetą Warszawską ", часопісам "Prosto z mostu". Далейшы лёс А. Гзоўскага невядомы.

А. Гзоўскі з'яўляецца аўтарам многіх п'ес, аповесцей, мемуараў, якія сёння невядомы беларускаму чытачу. Асноўныя яго творы: "Атаман разбойницкай шайкі" (М., 1909; на рус. мове); "Гастралёр экспапрыятар" (М., 1909; на рус. мове); "У краіне чырвоных людаедаў". Варшава, 1921; на пол. мове); "Графіня з Палесся" (Варшава, 1928; на пол. Мове).

Віталь Скалабан

Гіль Юрый

***Гіль Юрый** (11.1.1942, в. Вашунова Докшыцкага р-на Віцебскай вобл.), гісторык, старшыня ТБМ імя Ф. Скарыны Віленскага краю, беларускі грамадскі дзеяч.*

Ю. Гіль нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння Параф'янаўскай сярэдняй школы (1959) два гады працаваў ў мясцовым калгасе "Чырвоны сцяг". У 1961-1964 гг. служыў у радах Савецкай Арміі. Вычыўся на гістарычным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута (1964-1968), пасля заканчэння якога быў настаўнікам гісторыі, дырэктарам васьмігадовай школы ў Докшыцкім рне. Жывучы ў Мінску, быў адказным сакратаром таварыства "Веды" Мінскага р-на (1972-1975), інспектарам аддзела кадраў сельгастэхнікі Мінскага р-на, выхавацелем у інтэрнаце Мінскага аб'яднанага авіяатрада. У 1985-1988 гг. працаваў рабочым, брыгадзірам будаўнікоў у Сібіры. З 1988 г. удзельнік беларускага нацыянальнага руху. Пэўны час узначальваў аддзяленне БНФ Мінскага р-на. У 1989 г. пераехаў у Вільнюс, дзе працаваў на розных прадпрыемствах. Быў ініцыятарам стварэння ТБМ імя Ф. Скарыны Віленскага краю, да 1996 г. выконваў абавязкі адказнага сакратара таварыства, цяпер узначальвае яго. У бацькоўскай хаце на сваёй радзіме заснаваў гісторыка-этнаграфічны музей "Засцянковая хатка".

Ю. Гіль з'яўляецца прадстаўніком ў органах мясцовай літоўскай улады, актыўна займаецца культурна-грамадскай дзейнасцю, плённа працуе ў галіне адраджэння і захавання беларускай культуры на Віленшчыне.

Леакадзія Мілаш (Вільнюс)

Гінцбург Ілья

***Гінцбург Ілья Якаўлевіч** (1859, Гродна – 1939, Ленінград), рускі скульптар.*

І. Гінцбург выхоўваўся ў рэлігійным асяроддзі гродзенскіх яўрэяў. Яго талент заўважыў М. Антакольскі, які ўзяў хлопчыка ў Пецярбург і сам вучыў яго скульптурнаму майстэрству. У 1878–1886 гг. І. Гінцбург вучыўся ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў, якую скончыў з залатым медалём за скульптуру "Плач Іерамії". Затым год удасканальваў сваё майстэрства ў Парыжы і Рыме. У 1919 г. заснаваў у Петраградзе недаўгавечнае Яўрэйскае таварыства заахвочвання мастацтваў. Да канца свайго жыцця працаваў у майстэрні пры акадэміі.

Творы І. Гінцбурга выкананы ў акадэмічным стылі. Скульптуры вызначаюцца непасрэднасцю назіранняў (на тэмы жыцця дзяцей, у тым ліку вядомыя "Хлопчык, які збіраецца купацца", 1886, "У куце", 1901), партрэтна-псіхалагічнай выразнасцю (бюсты Л. Талстога, А. Рубінштэйна, Л. Пастарнака, В. Верашчагіна і інш.), манументальнасцю вобразаў (надмагільны помнік У. Стасаву, 1910, помнік Д. Мендзялееву, 1932, абодва ў Санкт-Пецярбургу). Акрамя таго, Гінцбург напісаў мемуары "З майго жыцця" (1908), у якіх багата цікавых матэрыялаў пра жыццё яўрэяў у Расіі.

Браніслава Котава

Гіргас Уладзімір

***Гіргас Уладзімір Фёдаравіч** (1.12.1835, Гродна – сакавік 1887, Кіеў), філолаг, прафесар Пецярбургскага універсітэта.*

У. Гіргас паходзіў са шляхты. Скончыў 4-ю Пецярбургскую гімназію. У 1854 г. паступіў на факультэт усходніх моваў Пецярбургскага універсітэта, які скончыў у 1858 г. са ступенню кандыдата. Пасля універсітэта вывучаў арабскую і турэцкую мовы ў Парыжы (1858–1861). У 1861 г. быў накіраваны універсітэтам на Усход для удасканалення ведаў. Жыў у Сірыі і Егіпце да 1864 г. У 1865 г. абараніў дысертацыю "Правы хрысціян на Усходзе па мусульманскіх законах" (СПб., 1865) і атрымаў ступень магістра арабскай славеснасці. У тым жа годзе быў зацверджаны штатным дацэнтам на кафедры арабскай славеснасці Пецярбургскага універсітэта. У 1873 г. абараніў дысертацыю на ступень доктара філалогіі "Нарыс граматычнай сістэмы арабаў" (СПб., 1873). З 1874 г. — экстраардынарны прафесар, у 1878–1886 гг. — ардынарны прафесар Пецярбургскага універсітэта.

Навуковыя даследаванні У. Гіргаса прысвечаны тэорыі і гісторыі арабскай мовы і літаратуры. Вывучаў граматычныя асаблівасці арабскай мовы. Падрыхтаваў "Справаздачу пра вынікі паездкі ў Сірыю і Егіпет" (1864, у рукапісе), якая з'яўляецца адной з першых прац па арабскай дыялекталогіі ў Расіі. У. Гіргас — аўтар першай у Расіі "Арабскай хрэстаматыі" (СПб., 1875–1876. Вып. 1–2. Сумесна з В. Разенам) і "Слоўніка да "Арабскай хрэстаматыі" і "Карана" (Казань, 1881). Падрыхтаваў да выдання гістарычныя працы арабскага гісторыка і філолага Абу Ханіфа ад-Дынаверы "Асноўныя пачаткі арабскага права згодна з вучэннем Абу Ханіфі і Шафіі" (СПб., 1888). Распрацаваў і чытаў першы ў расійскай вышэйшай школе курс арабскай мовы і літаратуры.

Вольга Гапоненка

Глагоўская Алена

Глагоўская (Казлоўская) Алена *(1959, Беласточчына), беларускі і польскі гісторык, грамадскі дзеяч.*

У 1983 г. А. Глагоўская скончыла гістарычны факультэт Варшаўскага універсітэта са ступенню магістра гісторыі і паліталогіі. З 1984 г. працуе выкладчыкам гісторыі і паліталогіі Гданьскага універсітэта. Адначасова з 1997 г. працуе на кафедры беларускай культуры Беластоцкага універсітэта. У 1995 г. у Варшаўскім універсітэце абараніла доктарскую дысертацыю на тэму "Культурныя змены ў Беларусі ў 1914–1929 гг.". У 1996 г. выдала манаграфію на польскай мове пад такой жа назвай. Даследуе гісторыю беларускага нацыянальнага руху пачатку XX ст. і міжваеннага перыяду, беларускі грамадска-палітычны і нацыянальна-культурны рух у Польшчы 80–90-х гг., грамадска-палітычную сітуацыю ў сучаснай Беларусі. Змяшчае навуковыя артыкулы, рэцэнзіі на працы беларускіх даследчыкаў у Польшчы ў часопісе "Bialoruskie Zeszyty Historyczne", месячніку "Czasopis". З 1992 г. узначальвае Беларускае культурнае таварыства "Хатка"] Гданьску. Удзельніца Першага з'езду беларусаў свету (Мінск, ліпень 1993 г.), 1-й Усебеларускай канферэнцыі гісторыкаў (Мінск, люты 1993 г.), навуковых канферэнцый у Варшаве, Гданьску, Беластоку, Мінску, Вільнюсе і інш. Супрацоўнічае з Міжнароднай асацыяцыяй беларусістаў, выдавецтвам "Беларуская Энцыклапедыя". Сябар Беларускага гістарычнага таварыства.

Ларыса Языковіч

Глікман Давід

Глікман Давід Іосіфавіч *(17(29).5.1874, Слуцк Мінскай губ., цяпер вобл. — не раней 1930-х гг.), рускі паэт, драматург.*

Д. Глікман з сям'і загадчыка казённым яўрэйскім вучылішчам. Пасля сканчэння Магілёўскай гімназіі паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Кіеўскага універсітэта, затым перайшоў на медыцынскі факультэт гэтага ж універсітэта. Затым перавёўся на юрыдычны факультэт Новарасійскага універсітэта (Адэса, скончыў у 1903). Літаратурную дзейнасць пачаў у студэнцкія гады (газ. "Южное обозрение"). У 1890-я г. друкаваўся ў пецярбургскіх часопісах "Руль", "Утро", "Судьба народа", газеце "Биржевые ведомости". З 1904 г. — загадчык аддзела ў газеце "Новости и Биржевая газета". У 1905–1907 гг. пастаянны супрацоўнік сатырычных часопісаў "Благой мат", "Вампир", "Зарницы", "Спрут", "Стрелы". У 1920–1930 гг. як паэт-гумарыст супрацоўнічаў з савецкімі сатырычнымі часопісамі "Ревизор" і "Муха". З тэатральнымі рэцэнзіямі выступае ў часопісах "Жизнь искусства" і "Вестник театра и искусства". Вядомы і як драматург. У 1910-я гг. п'есы "Усё ўмоўна", "Белы чай", "Утопія", "Каго з двух" ставіліся ў розных тэатрах Пецярбурга, а таксама ў кіеўскім тэатры Кручыніна.

Алесь Карлюкевіч

Глінская Алена

Глінская Алена Васільеўна *(памерла каля 4.4.1538, Масква), вялікая княгіня, жонка вялікага рускага князя Васілія III, дачка літоўскага князя Васілія Львовіча Глінскага.*

Княжна Алена выйшла замуж за Васілія III у 1526 г. Пасля смерці мужа стала рэгентшай пры непаўналетнім Іване IV. Жорстка змагалася з князямі і баярамі, якія выступалі супраць цэнтральнай улады. У яе праўленне была праведзена грашовая рэформа, дзякуючы якой упарадкавалася манетнае хаджэнне ў Маскоўскім княстве. Пры яе ўладзе будаваліся новыя гарады, былі стабілізаваны адносіны з Польшчай і Швецыяй. Пры княгіне Алене Маскоўскі пасад (Кітай-горад) быў абнесены сцяной з цэглы. Пахавана ў Маскве ў царкве Узнясення.

Алесь Карлюкевіч

Глобус Мірон

Глобус Мірон Ільіч *(24.11.1895, г. Шчучын, Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер раённы цэнтр Гродзенскай вобл. – 2.10.1937, Верхнеўральск Чэлябінскай вобл.), вучоны, вынаходнік, дацэнт Ленінградскай Артылерыйскай акадэміі.*

М. Глобус нарадзіўся ў сям'і настаўніка. Пасля смерці бацькі ў шаснаццацігадовым узросце пачаў працаваць: спачатку даваў прыватныя ўрокі, пасля быў канторшчыкам у эксплуатацыйнай канторы г. Граева Гродзенскай губ. У перыяд з 1914 да 1917 г. працаваў шчэбеньшчыкам на будаўніцтве дарогі ў раёне Ноўгарада. У 1917 г. стаў ініцыятарам стварэння камуністычнай ячэйкі ў г. Кольна. У 1918 г. пераехаў у Расію. У Маскве вучыўся на Артылерыйскіх курсах, пасля заканчэння якіх быў прызначаны камандзірам узвода. У час грамадзянскай вайны, у

жніўні 1920 г., быў накіраваны на Паўднёвы фронт як памочнік камандзіра асобнай батарэі 20-й Маскоўскай брыгады курсантаў. Удзельнічаў у ваенных аперацыях на Кубані, у Дагестане, Баку. Восенню 1921 г. М. Глобус быў залічаны слухачом падрыхтоўчага аддзялення Артылерыйскай акадэміі ў як ад'юнкт. Адначасова па загаду Рэўваенсавета быў прызначаны начальнікам ваеннага пададдзела Камітэта па вынаходніцтвах, а затым — начальнікам аддзела гэтага камітэта.

З 1935 г. М. Глобус быў дацэнтам кафедры ўнутранай балістыкі Артылерыйскай акадэміі. За гады плённай працы ён атрымаў патэнты на 25 вынаходніцтваў, у т. л. на аўтаматычную гармату для самалётаў. Апублікаваў больш 20 тэарэтычных прац, якія атрымалі высокую ацэнку айчынных і замежных навукоўцаў. Гэта звярнула ўвагу органаў НКУС, і неўзабаве М. Глобус быў пераведзены ў рэзерв. Пасля па загаду наркома абароны яго адкамандзіравалі ў распараджэнне рэктара Томскага універсітэта. У студзені 1937 г. М. Глобус быў назначаны загадчыкам кафедры ўнутранай балістыкі гэтага універсітэта. Але ўжо ў сакавіку таго ж года яго арыштавалі па абвінавачанню ў сувязях з трацкістамі. 11 красавіка 1937 г. выязная сесія Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР у Новасібірску прызнала М. Глобуса вінаватым і прыгаварыла яго да турэмнага зняволення тэрмінам на 8 гадоў з пазбаўленнем палітычных правоў на 5 гадоў і канфіскацыяй маёмасці. Для адбывання пакарання М. Глобус быў накіраваны ў верхнеўральскую турму НКУС. Ён неаднаразова звяртаўся з лістамі да М. Калініна і К. Варашылава, але адказу не атрымаў. 2 кастрычніка 1937 г. М. Глобус быў расстраляны.

Ігар Кузняцоў

Глод Аляксандр

Глод Аляксандр Уладзіміравіч *(18.11.1948, в. Касілы Мастоўскага р-на Гродзенскай вобл.), грамадскі дзеяч беларускай дыяспары ў Расіі.*

А. Глод пачынаў працоўную дзейнасць літаратурным супрацоўнікам раённай газеты "Праца" ў г.п. Зэльва. У 1967 г. быў прызваны ў армію, дзе прайшоў усе ступені армейскай службы ад радавога-ракетчыка да палкоўніка юстыцыі, эксперта Урада Расіі ў галіне працоўнага, пенсійнага і сямейнага права. Пасля звальнення ў запас быў начальнікам юрыдычнага аддзела Міністэрства паліва і энергетыкі Расійскай Федэрацыі. Цяпер — старшы рэферэнт Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі, курыруе сферу культуры, турызму, аховы здароўя, навукі, дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў.

А. Глод актыўна займаецца грамадскай дзейнасцю. Быў ініцыятарам стварэння ў Маскве грамадскай арганізацыі "Аб'яднанне беларусаў Масквы "Бацькаўшчына", якая прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці расійскай сталіцы. Супрацоўнічае з Міністэрствам нацыянальнай палітыкі Расіі, Мэрыяй Масквы, нацыянальнымі аб'яднаннямі горада. Член кансультацыйнага савета Міннаца Расіі па справах зямляцтваў. Распрацаваў устаўныя дакументы грамадскай арганізацыі нацыянальна-культурных аўтаномій "Беларусы Расіі" і "Беларусы Масквы". Прымаў удзел у з'ездах беларусаў блізкага замежжа, беларусаў-ваеннаслужачых, I і II з'ездаў беларусаў свету. На I з'ездзе беларусаў Расіі выбраны намеснікам старшыні Савета федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Беларусы Расіі" па рабоце з рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі.

За актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Масквы А. Глод узнагароджаны медалём 850-годдзя Масквы.

Ірына Тамільчык

Гохман Веньямін

Гохман Веньямін Максавіч *(1918, Бабруйск – 1986, Ленінград), географ-эканаміст, доктар геаграфічных навук, прафесар.*

Нарадзіўся В. Гохман у рабочай сям'і. Скончыў сярэднюю школу ў Бабруйску, а ў 1939 г. хімічны факультэт Ленінградскага універсітэта. Але цікавасць да геаграфічнай навукі прывяла маладога вучонага ў 1946 г. у аспірантуру на геаграфічным факультэце Маскоўскага універсітэта пад кіраўніцтвам вядомага вучонага М. Баранскага. Пасля аспірантуры (1949) Гохман на працягу 5 гадоў працаваў выкладчыкам эканамічнай геаграфіі Томскага універсітэта, а з 1954 г. — навуковым супрацоўнікам Інстытута геаграфіі АН СССР у Маскве, дзе ўзначальваў аддзел геаграфіі сусветнай гаспадаркі.

Працуючы ў ІГ АН СССР, В. Гохман глыбока вывучыў сацыяльна-эканамічныя праблемы ЗША, пытанні сусветнай эканамічнай інтэграцыі, шмат зрабіў для перабудовы традыцыйнага краязнаўства, унёс вялікі ўклад у развіццё тэорыі і практыкі эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі, распачаў шэраг новых накірункаў у тэарэтычнай геаграфіі — геаінфармацыі, тэматычнай картаграфіі і інш. Ён актыўна працаваў у Міжнародным Геаграфічным саюзе, прымаў удзел у шэрагу міжнародных кангрэсаў. Шматлікія працы В. Гохмана былі перакладзены на замежныя мовы. Пад яго рэдакцыяй або ў яго перакладзе выдаваліся многія працы замежных вучоных-географаў. Асноўныя навуковыя працы В. Гохмана — "Геаграфія цяжкай прамысловасці ЗША" (М., 1956), "Эканамічныя раёны ЗША"

(М., 1958), "Савецкая геаграфія: Вынікі і задачы" (М., 1960), "Зрухі ў геаграфіі насельніцтва і гаспадаркі краін Заходняй Еўропы" (М, 1984).

Валерый Ярмоленка

Грабніцкі Адам

Грабніцкі Адам Станіслававіч *[25.12.1857(6.1.1858), б. маёнтак Цётшы Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Лепельскі р-н Віцебскай вобл. —13.10.1941, Дукштас, Літва], вучоны ў галіне садоўніцтва, садавод-памолаг. Адзін з першых даследчыкаў пладовых культур у Літве.*

Пачатковую адукацыю А. Грабніцкі атрымаў дома. У 1870—1878 гг. вучыўся ў рэальнай гімназіі ў Двінску, у 1883 г. скончыў Лясны інстытут у Пецярбургу, у якім з 1883 па 1922 г. выкладаў садоўніцтва і агародніцтва, з 1902 г. — прафесар гэтага інстытута.

Асноўныя працы А. Грабніцкага прысвечаны вызначэнню гатункаў і апыленню пладовых культур. Збіраў і вырошчваў пладовыя дрэвы, даследаваў іх плоданашэнне, марозаўстойлівасць, урадлівасць. У 1890—1904 гг. каля мястэчка Дукшты (цяпер Дукштас, Літва) на плошчы 12 га заснаваў памалагічны сад, які назваў "Раем". У ім было 796 гатункаў пладовых дрэў (у тым ліку 444 гатункі яблык, 154 – грушы, 116 – слівы, 83 гатункі вішні і чарэшні) і мноства розных гатункаў парэчкі і суніцы. Тут ён стала жыў і працаваў з 1922 г.

У 1903—1906 гг. А. Грабніцкі рэдагаваў дапаможнік па памалогіі "Атлас пладоў" (СПб., вып. 1—4), у якім апісаў 46 з 114 змешчаных ў атласе гатункаў пладовых дрэваў, пашыраных ў Расіі, Беларусі і Літве. Выдаў кнігі "Плады-веліканы і іх вырошчванне" (Пг., 1915), "Догляд за пладовым садам" (СПб., 1893; 1901), апошняя неаднаразова перавыдавалася (М.; Л., 1931. 7 выд.), "Персікі. Апісанне і відарыс найгалоўнейшых гатункаў, якія культывуюцца ў Расіі" (Пг., 1916), "Пасадка пладовых дрэваў" (СПб., 1906), "Да пытання аб перакрыжаваным апыленні пладовых дрэваў. Доследы і назіранні" (Пг., 1915), "Пладаводства. Лекцыі, прачытаныя ў Лясным інстытуце" (СПб., 1902—1903). Надрукаваў больш за 100 артыкулаў у расійскіх навуковых перыядычных і энцыклапедычных выданнях. Удзельнічаў у стварэнні "Поўнай энцыклапедыі рускай сельскай гаспадаркі і памежных з ёю навуках", для якой падрыхтаваў 31 артыкул.

У мяст. Дукштас А. Грабніцкаму пастаўлены помнік. Пахаваны на каталіцкіх могілках побач з былым маёнткам.

Вольга Гапоненка

Грамыка Андрэй

Грамыка Андрэй Андрэевіч *[5(18).7.1909, в. Старыя Грамыкі Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Веткаўскі р-н Гомельскай вобл. – 2.7.1989, Масква], савецкі дзяржаўны і палітычны дзеяч, палітык, дыпламат. Доктар эканамічных навук (1956). Двойчы Герой Сацыялістычнай Працы (1969, 1979). Лаўрэат Ленінскай прэміі, Дзяржаўнай прэміі СССР (1984).*

А. Грамыка паходзіць з сялянскай сям'і. Скончыў эканамічны інстытут у Маскве (1932), Вышэйшую камуністычную сельскагаспадарчую школу Беларусі імя У. І. Леніна. У 1936 г. працаваў у Інстытуце эканомікі АН СССР. З 1939 г. у Наркамаце замежных спраў СССР на дыпламатычнай рабоце. Быў Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом СССР у ЗША, пасланнікам у Рэспубліцы Куба (1943–1946). Узначальваў савецкую дэлегацыю на канферэнцыі ў Думбартан-Оксе па стварэнню ААН (1944). У 1945 г. удзельнічаў у рабоце Крымскай і Патсдамскай канферэнцый кіраўнікоў урадаў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі. Быў пастаянным прадстаўніком СССР у Савеце Бяспекі ААН (1946–1948), прымаў удзел у нарадах Палітычнага кансультатыўнага камітэта дзяржаў Варшаўскага дагавора. Займаў пасады намесніка міністра замежных спраў СССР (1948–1949), міністра (1957–1985), першага намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР (1983–1985), а таксама Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР (1985–1987). З 1956 г. быў членам ЦК КПСС, у 1973–1988 гг. — членам Палітбюро ЦК КПСС. У 1946–1950, 1958–1988 гг. А. Грамыка — дэпутат Вярхоўнага Савета СССР. У 1983 г. у Гомелі ўстаноўлены бюст А. Грамыкі (скульптар І. Рукавішнікаў, архітэктары А. Клімачкін, М. Пасохін). Напісаў шэраг прац па праблемах міжнародных адносін, кнігу ўспамінаў "Памятнае" (2-е выд. 1990).

Савецкі ўрад высока ацаніў шматбаковыя здольнасці, заслугі А. Грамыкі. Ён кавалер 7 ордэнаў Леніна, ордэнаў Працоўнага Чырвонага Сцяга, "Знак Пашаны", шматлікіх медалёў. Лічыцца, што яго дзейнасць спрыяла ўмацаванню міру і стабільнасці ў свеце, развіццю міжнароднага супрацоўніцтва, спыненню гонкі ўзбраенняў, была на карысць незалежнасці, свабодзе народаў.

Святлана Сачанка

Гржэскі Мікалай

Гржэскі Мікалай Карнілавіч *(7.11.1860, Мінская губ. – ?), юрыст.*

М. Гржэскі паходзіў са шляхты. Скончыў 1-ю Пецярбурскую гімназію. У 1879 г. паступіў на юрыдычны факультэт Пецярубргскага універсітэта. У 1883 г. прадставіў на конкурс навуковую працу "Дзяржаўная запазычанасць Расіі", якая была ухвалена факультэтам і надрукавана за кошт універсітэта. Пасля заканчэння універсітэта (1893) быў пакінуты для падрыхтоўкі да прафесарскага звання на кафедры фінансавага права. У 1883–1886 гг. знаходзіўся ў замежнай камандзіроўцы для падрыхтоўкі магістэрскай дысертацыі. У 1888 г. быў абраны хавальнікам статыстычнага кабінета юрыдычнага факультэта. Адначасова вёў заняткі са студэнтамі па статыстыцы знешняга гандлю Расіі. У 1888 г. атрымаў ступень магістра фінансавага права за работу "Падаткавая рэформа. Французская тэорыя XVIII стагоддзя". З 1889 г. працаваў у Міністэрстве фінансаў. М. Гржэскі праводзіў навуковыя даследаванні ў галіне эканамічнага права. Вывучаў ролю замежных інвестыцый у развіцці прамысловасці Расіі і краін Заходняй Еўропы, цікавіўся гісторыяў фінансавага права. Сярод асноўных навуковых прац М. Гржэскага — "Дзяржаўныя запазычанасці Расіі" (СПб., 1884, рус., ням., фр.), "Падатковая рэформа. Французская тэорыя XVIII стагоддзя" (СПб. 1888).

Вольга Гапоненка

Грыневіч Юрый

Грыневіч Юрый Акімавіч *(1937, в. Старына Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл.), медык, доктар медыцынскіх навук, прафесар. Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Украіны, правадзейны член Нью-Йоркскай Акадэміі навук.*

З 1949 г. Ю. Грыневіч пражывае на Украіне. Там скончыў сярэднюю школу, а ў 1960 г. — Кіеўскі медыцынскі інстытут імя акад. А. Багамольцава. Год працаваў у раённай бальніцы, у 1961–1970 гг. — навуковы супрацоўнік Кіеўскага НДІ клінічнай медыцыны імя Н. Д. Стражэска (цяпер Інстытут кардыялогіі), у 1970–1974 гг. — старшы навуковы супрацоўнік Кіеўскага НДІ аталарыенгалогіі імя А. Каламійчанкі. З 1974 г. працуе намеснікам дырэктара па навуковай рабоце Украінскага НДІ анкалогіі і радыялогіі, адначасова кіруе лабараторыяй клінічнай імуналогіі. У 1968 г. Ю. Грыневіч абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму "Матэрыялы да вывучэння фактараў неспецыфічнага імунітэту ў хворых рэўматызмам і хранічным танзілітам", у 1983 г. — доктарскую дысертацыю "Парушэнне імунітэту і яго ўзнаўленне біялагічна актыўнымі фактарамі тымуса пры канцэрагезе". У 1986 г. яму прысвоена званне прафесара. Ён аўтар звыш 350 навуковых прац і 3 вынаходніцтваў. Напісаў манаграфіі "Імунабіялогія нёбных міндалін" (1978), "Асновы клінічнай імуналогіі пухлінаў" (1986), "Імунабіялогія гармонаў тымуса" (1989), "Імуналогія і імунатэрапія пухлінаў малочнай залозы" (1990), "Структура тымусу і дыферэнцыроўка Т-лімфацытаў" (1991), "Імунатропныя прэпараты" (1994).

Браніслава Котава

Грыцкевіч Валянцін

Грыцкевіч Валянцін Пятровіч *(30.3.1933, Мінск), вучоны-гісторык, медык, дзеяч беларускай дыяспары ў Расіі.*

В. Грыцкевіч нарадзіўся ў сям'і настаўніка і ўрача. Скончыў у Мінску сярэднюю школу (1950), Інстытут замежных моваў (1955), медыцынскі інстытут (1956), гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1957). Працаваў урачом ва Узлянах Рудзенскага р-на Мінскай вобл. (1956–1957), у Мінску (1957–1969), Ленінградзе (1969–1971), старшым навуковым супрацоўнікам Ваенна-медыцынскага музея (1971–1995). Адначасова выкладаў гісторыю ў Ленінградскім інстытуце культуры (з 1980), з 1988 г. — дацэнт кафедры музеязнаўства гэтага ж інстытута (цяпер Пецярбургскі універсітэт культуры).

Навуковыя даследаванні В. Грыцкевіча прысвечаны гісторыі беларускай медыцыны (кандыдацкая дысертацыя абаронена ў 1963 г.) — кнігі "З факелам Гіпакрата" (Мн., 1987), "Адысея наваградскай лекаркі: Саламея Русецкая" (Мн., 1989), біяграфістыцы — у першую чаргу беларускай інтэлігенцыі ў замежжы — "Падарожжы нашых землякоў" (Мн., 1968), "Дзесяць шляхоў з Вільнюса" (Вільнюс, 1979, на літоўскай мове), "Нашы славутыя землякі" (Мн., 1984), "Ад Нёмана да берагоў Ціхага акіяна" (Мн., 1986), "Эдуард Пякарскі" (Мн., 1989), а таксама біяграфістыцы медыкаў — "Успаміны і дзённікі ў фондах музея: Анатаваны каталог" (Л., 1980), "Ваенныя медыкі — кавалеры ордэна Славы трох ступеняў" (Л., 1975, сумесна з Ф. Сатрапінскім), апісанням падарожжаў як гістарычнай крыніцы — "Шляхі вялі праз Беларусь" (Мн., 1980, сумесна з А. Мальдзісам), тэорыі і методыцы гістарычнага крыніцазнаўства (шэраг артыкулаў), методыцы вывучэння і выкладання гісторыі, асабліва ў Беларусі (шэраг публікацый 1988–1999 гг.), узаемным руска-беларускім перасяленням у XIV–XVIII стст. —

"Беларуска-рускія перасяленні XIV–XVIII стст." (Спадчына. 1993. № 3–5) і інш. У апошняе дзесяцігоддзе В. Грыцкевіч склаў першую ў свеце манаграфію, дзе асветлена гісторыя музейнай справы ў свеце (рыхтуецца да друку ў Мінску і ў Пецярбургу).

В. Грыцкевіч — адзін з арганізатараў і старшыня Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Пецярбургу (з 1989), сябар Саюза пісьменнікаў Беларусі, Міжнароднага ПЭН-цэнтра, ганаровы член Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, член Рускага геаграфічнага таварыства, Пецярбургскага таварыства гісторыкаў медыцыны, замежны член Беларускага таварыства гісторыкаў медыцыны, член Вялікай рады Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына".

Мікалай Нікалаеў (Санкт-Пецярбург, Расія)

Гурлянд Хаім Іона

***Гурлянд Хаім Іона** (1843, мяст. Клецк Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. – 1890, Адэса), яўрэйскі гісторык, рэлігійны дзеяч.*

У 1860 г. Х.-І. Гурлянд закончыў Віленскае равінскае вучылішча. У Пецярбургскім універсітэце вывучаў семіцкія мовы. У 1863 г. атрымаў там ступень магістра на тэму "Аб уздзеянні філасофіі мусульманскай рэлігіі на філасофію Майсея Майманіда". У 1873 г. прызначаны інспектарам Жытомірскага яўрэйскага настаўніцкага інстытута. Сумесна з матэматыкам Х. Гохманам заснаваў там у 1883 г. класічную і рэальную гімназію, дзе выкладаўся курс яўрэйскай гісторыі і літаратуры. У 1888 г. быў выбраны равінам Адэсы.

Чатыры працы Х.-І. Гурлянда пад агульным загалоўкам "Яўрэйскія архівы ў Санкт-Пецярбургу" (1865–1867) заснаваны на вывучэнні калекцыі А. Фірковіча (СПб., Публічная б-ка). Падрыхтаваў 7 выпускаў выдання "Да гісторыі ганенняў на яўрэяў" (Перамышль; Кракаў; Адэса, 1887–1892), куды ўключаны хронікі, плачы і пакаянныя малітвы эпохі Б. Хмяльніцкага, польска-шведскай вайны і Уманскай разні.

Браніслава Котава

Гурын Мікалай

***Гурын Мікалай Мікалаевіч** (23.4.1930, в. Цімошкавічы Навагрудскага пав., цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл.), хірург, навуковец, прафесар (з 1984).*

Нарадзіўся М. Гурын у сялянскай сем'і. Вучыўся ў Машэвіцкай пачатковай (1937–1941), Смольчыцкай сямігадовай (1944–1944) і Першай беларускай сярэдняй школе Навагрудка (1946–1949), якую скончыў з залатым медалём. Вучыўся ў Ваенна-марской медыцынскай акадэміі ў Ленінградзе (1949–1955). У 1955–1959 гг. працаваў урачом на эскадраным мінаносцы "Беспощадный" Чарнаморскага флоту. З 1959 да 1962 г. — у клінічнай ардынатуры Ваенна-медыцынскай акадэміі імя С. Кірава на кафедры ваенна-марской і шпітальнай хірургіі. У 1963–1969 гг. працаваў начальнікам 67-га базавага лазарэта і 176-й станцыі пералівання крыві Паўночнага флоту ў Запаляр'і. З 1969 г. жыве і працуе ў Ленінградзе (Санкт-Пецярбургу). У 1969–1978 гг. — ардынатар і выкладчык хірургіі кафедры ваенна-марской і шпітальнай хірургіі Ваенна-медыцынскай акадэміі. У 1978–1979 гг. па накіраванню працаваў у Афганістане галоўным хірургам Цэнтральнага ваеннага шпіталя афганскай арміі ў Кабуле. З 1982 г. — у Ленінградскім інстытуце ўдасканалення ўрачоў — загадчык кафедры марской медыцыны. У 1984–1994 гг. — першы прарэктар інстытута. З 1997 г. працуе загадчыкам кафедры агульнай урачэбнай практыкі і марской медыцыны.

Актыўна займаецца навукова-даследчай працай ў галіне медыцыны. У 1967 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. Доктар медыцынскіх навук (з 1979). З 1982 г. дацэнт. З'яўляецца аўтарам каля 170 навуковых прац, якія прысвечаны праблемам неадкладнай і рэканструкцыйнай хірургіі. Сааўтар і галоўны рэдактар такіх фундаментальных прац, як "Ваенна-палявая хірургія" (Кабул, 1980, на мове фарсі), "Марская медыцына" (Л., 1989), "Агульная ўрачэбная практыка" (СПб., 1996. Т. 1–2).

Прымае ўдзел у беларускай грамадска-культурнай дзейнасці ў Санкт-Пецярбургу; член Беларускага грамадска-культурнага таварыства, наведвае мерапрыемствы БГКТ, прымае ўдзел у іх падрыхтоўцы і правядзенні (удзельнічаў у падрыхтоўцы тэлевізійнай праграмы беларускага телебачання, прысвечанай 200-м угодкам Адама Міцкевіча).

Ала Кананюк

Гушча Ян

***Гушча Ян** (24.12.1917, б. фальварак Загасцінне Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Міёрскі р-н Віцебскай вобл. – 26. 6.1986, Лодзь, Польшча), польскі паэт, празаік, перакладчык.*

Нарадзіўся Я. Гушча ў сям'і чыноўніка. Скончыў гімназію ў Дзісне. Дэбютаваў у 1933 г. вершам "Горад". У 1934 г. паступіў на юрыдычны факультэт Віленскага універсітэта, адначасова вучыўся ў Вышэйшай школе палітычных навук у Вільні, якую скончыў у 1939 г. У 1937 г. стаў сябрам Прафсаюза польскіх пісьменнікаў. На працягу 1935—1939 гг. публікаваў вершы, эпіграмы і рэцэнзіі ў шматлікіх польскіх часопісах. У красавіку 1940 г. вывезены з-пад Дзісны ў Казахстан. У 1943 г. уступіў у Войска Польскае, дзе служыў афіцэрам 3-й дывізіі пяхоты імя Р. Траўгута. У 1944 г. працаваў у Саюзе польскіх патрыётаў у Маскве, рэдакцыі двухтыднёвіка "Nowe Widnokręgi". У ліпені 1944 г. пераехаў у Польшчу і працаваў у рэдакцыі газеты "Rzeczpospolita" ў Любліне, дзе публікаваў вершы, прозу, рэпартажы. У канцы 1945 г. перасяліўся ў Лодзь і стаў сябрам Саюза польскіх пісьменнікаў. У 1955—1957 гг. — сябра рэдакцыйнай калегіі двухтыднёвіка "Kronika". У 50—80-я гг. публікаваў паэтычныя творы, прозу і пераклады, галоўным чынам з беларускай мовы. У 1970—1971 гг. — галоўны рэдактар лодзінскага квартальніка "Osnowa".

Вершаваныя творы Я. Гушчы апублікаваны ў зборніках "Балада аб падарожных", "Штодзённасць кахання", "Выбраныя вершы", "Сентыментальнае падарожжа", "Размовы і заклёны", "Гады сярод гадоў". Зборнік вершаў "Стары павільён" у 1969 г. атрымаў узнагароду за найлепшую паэтычную кнігу 25-годдзя. Аўтар аповесцей "Мястэчка над Альшанкай", "Пярсцёнак з кайданоў" (апошняя ў плебісцыце Радыё "Свабодная Еўропа" была прызнана найлепшай кніжкай 1974 г., выдадзенай у Польшчы), шматлікіх апавяданняў. З яго эсэістыкі вылучаюцца "Успаміны не заўсёды журботныя", якія тычацца літаратурнага жыцця Вільні ў міжваенны перыяд, зборнік успамінаў і рэпартажаў "Здарэнні і прызнанні", а таксама "Урыўкі, эпізоды, нарысы" з нарысам "Паэт Белай Русі" пра Ф. Багушэвіча. Сатырычныя творы Я. Гушчы ўвашлі ў зборнікі "Ані так, ані сяк", "Дажынкі ў Адамове", "Аб людзях і з людзьмі", "Розныя нашыя справы", "Ноч перад агульным сходам", "Зачараваны банкнот", "Жарты, сатыры, эпіграмы". Я. Гушча пераклаў з беларускай мовы апавяданні 20 аўтараў, выдадзеныя пад назвай "Мае мядзведзі і іншыя беларускія апавяданні" (1975), выбраныя апавяданні У. Караткевіча пад агульнай назвай "Блакіт і золата дня" (1976). Рэдагаваў польскае выданне выбраных вершаў М. Багдановіча. Складальнік зборнікаў "Анталогія беларускай паэзіі" (1978), "Беларускія вершы" (1971), для якіх пераклаў большасць вершаў. Паэзія Я. Гушчы ў перакладах на беларускую мову шырока прадстаўлена ў зборніку "Горад мільённы і мы" (1972). У беларускім перакладзе выйшла таксама яго кніжка "Пан Грацыян і іншыя" (1976). Многія творы Я. Гушчы тэматычна звязаны з Беларуссю (апавяданне "Лямпа", вершы "Да сябра-беларуса", "Вязынка", зборнік эсэ "Аповесці ў чорных рамках").

У 1975 г. Я. Гушча атрымаў узнагароду г. Лодзі за дасягненні ў галіне навукі і культуры. Адзначаны Залатым крыжам заслугі (1955), Кавалерскім крыжам ордэна Адраджэння Польшчы (1969), адзнакай Заслужаны дзеяч культуры (1965).

Юрый Вашкевіч

Дабравольскі Уладзімір

***Дабравольскі Уладзімір Уладзіміравіч** (25.5.1880, Мазыр Мінскай губ., цяпер Гомельскай вобл. – 18.8.1956, Масква), вучоны-механік, матэматык, прафесар (1920), доктар тэхнічных навук. Член-карэспандэнт АН СССР (1946). Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі РСФСР (1943).*

Нарадзіўся У. Дабравольскі ў сям'і настаўніка матэматыкі. Скончыўшы Мінскае рэальнае вучылішча, паступіў у Маскоўскае вышэйшае тэхнічнае вучылішча. У пачатку 1902 г. за ўдзел у атныўрадавай дэманстрацыі быў сасланы ў Сібір. У канцы 1903 г. амнісціраваны, атрымаў магчымасць прадоўжыць вучобу ў Маскоўскім вышэйшым тэхнічным вучылішчы, якое скончыў у 1906 г. з адзнакаю, са званнем інжынера-механіка. Пасля заканчэння вучылішча працаваў у Бранскім сярэднім механіка-тэхнічным вучылішчы. З 1913 г. — у Маскоўскім сярэднім тэхнічным вучылішчы, дзе выкладаў механіку і некаторыя спецыяльныя прадметы. У 1920–1922 гг. працаваў у Туркестанскім дзяржаўным універсітэце. З 1922 г. выкладаў у Інстытуце інжынераў транспарту і Электратэхнічным інстытуце ў Маскве. У 1929–1936 гг. загадваў кафедрай тэорыі механікі ў Ваенна-паветранай акадэміі імя М. Жукоўскага. З 1930 да 1949 г. загадваў кафедрай Маскоўскага станкабудаўнічага інстытута. Адначасова працаваў у Інстытуце машынабудавання АН СССР (1937–1953).

Навуковыя даследаванні У. Дабравольскага прысвечаны тэорыі механізмаў і машын, дастасаванай механіцы, кінематычнай геаметрыі. Распрацаваў агульную тэорыю механізмаў для ўтварэння плоскіх крывых. Яго праца "Сінтэз механізмаў" (1944) была адзначана прэміяй імя акад. П. Чэбышава АН СССР (1946). Прымаў удзел у фарміраванні канцэпцыі рэформы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы. Зрабіў значны ўклад у распрацоўку

пытанняў развіцця тэхнічнай адукацыі. Аўтар падручнікаў і навучальных дапаможнікаў па механіцы для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных вучэбных устаноў, у т. л. падручніка "Тэхнічная механіка ў элементарным выкладанні", які неаднаразова перавыдаваўся (Бранск, 1913, 1921, 1922), падручніка па тэхнічнай механіцы і тэхніцы зменных токаў. Займаўся пытаннямі гісторыі тэхнікі і метадалогіі выкладання асобных яе раздзелаў. Унёс уклад у распрацоўку методыкі выкладання тэорыі механізмаў і машын, матэматыкі, тэхнічнай механікі, электратэхнікі. З'яўляўся адным з заснавальнікаў Арлоўскага тэхнічнага таварыства і прымаў актыўны ўдзел у яго рабоце. Чытаў у Арле і Бранску публічныя лекцыі па паветраплаванню і авіяцыі.

Вольга Гапоненка

Дабрынін Барыс

Дабрынін Барыс Фёдаравіч *(14(26).5.1885, Мінск – 4.9.1951, Кіеў), географ, доктар геаграфічных навук (1935), прафесар Маскоўскага, Кіеўскага і Тбіліскага універсітэтаў.*

Пачатковую адукацыю Б. Дабрынін атрымаў у Бабруйску. З сярэбраным медалём скончыў у 1903 г. гімназію ў Гомелі і паступіў на прыродазнаўчы факультэт Маскоўскога універсітэта, які паспяхова закончыў ў 1912 г. быў пакінуты ва універсітэце для падрыхтоўкі да прафесарскага звання. Адначасова выкладаў геаграфію ў сярэдніх навучальных установах Масквы. У 1916 г. абраны прыват-дацентам Маскоўскага універсітэта, чытаў там курс геаграфіі Еўропы. З 1931 г. прафесар Маскоўскага універсітэта. У 1938—1941 гг. загадваў кафедрай фізічнай геаграфіі замежных краін, якая была створана ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце па яго ініцыятыве. Адначасова ў 1934—1939 гг. загадваў аддзелам у Інстытуце геаграфіі АН СССР. З 1942 г. працаваў у Тбіліскім універсітэце загадчыкам кафедры фізічнага краіназнаўства. У 1950—1951 гг. прафесар і загадчык кафедры Кіеўскага універсітэта.

Навуковыя даследаванні Б. Дабрынін праводзіў у галіне фізічнай геаграфіі, геамарфалогіі краін, абласцей і раёнаў. Распрацаваў метадалагічныя асновы фізічнага краіназнаўства. Вывучаў прыроду і праводзіў глеба-геаграфічныя (ландшафтныя) даследаванні Крыма, Каўказа, Закаўказзя, Цэнтральнай часткі Рускай раўніны. Удзельнічаў у многіх навукова-даследчых экспедыцыях. Упершыню апісаў рэльеф і ландшафты Дагестана, Паўднёвага Урала, Алтая, Сярэдняга Паволжжа. Прапанаваў новую, палепшаную схему фізіка-геаграфічнага раянавання Еўропы, выкарыстаўшы занальны падыход. Б. Дабрынін з'яўляецца заснавальнікам навукі аб марскіх берагах. З пачатку 20-х гадоў распачаў актыўныя даследаванні марскіх берагавых тэрас. Арганізаваў у 30-я гг. пры Маскоўскім дзяржаўным універсітэце Камісію па вывучэнню марфалогіі ўзбярэжжа, якая аб'ядноўвала навуковыя і практычныя работы па вывучэнню марскіх берагоў. Прапанаваў ландшафтна-геамарфалагічны падыход пры даследаванні рэльефу. Распрацаваў тэорыю паходжання рэльефаў прыморскіх абласцей, у якой першым указаў на сувязь тэктонікі з рэльефам і ландшафтам. Матэрыялы, сабраныя Б. Дабрыніным у час экспедыцый, прадстаўлены ў экспазіцыях многіх краязнаўчых музеяў былога СССР.

Вынікі шматгадовых даследаванняў В. Дабрыніна былі абагульнены ў кнігах "Фізічная геаграфія СССР: Еўрапейская частка і Каўказ" (М., 1947, перавыдаваны 1948 і 1949 гг., перакладзена па польскую і венгерскую мовы), "Фізічная геаграфія Заходняй Еўропы" (М., 1948). Аўтар фундаментальных падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для вышэйшых навучальных устаноў па фізічнай геаграфіі Еўрапейскай часткі СССР і Заходняй Еўропы. Вялікую увагу ў навучальных працэсе надаваў нагляднасці пры выкладанні. Быў аўтарам некалькіх дзясяткаў фізіка-геаграфічных, геаморфалагічных і геабатанічных карт. Распрацаваў у Маскоўскім дзяржаўным універсітэце курс "Методыка палявых даследаванняў", "Фізічная геаграфія Заходняй Еўропы", "Фізічная геграфія замежных краін", "Фізічная геаграфія СССР", "Фізічная геаграфія Крыма і Каўказа". Свае тэарэтычныя палажэнні па праблемах глеба-геаграфічнага кнаіназнаўства вучоны ўпершыню сістэматызаваў у курсе "Фізіка-геаграфічнае раянаванне", які быў ім рачытаны ў 1951 г. для студэнтаў-географаў Кіеўскага універсітэта.

У час Вялікай Айчыннай вайны выконваў заданні Закаўказскага фронта па геафізічнаму апісанню шэрагу ўчасткаў ваенных дзеянняў.

Б. Дабрынін быў рэдактарам фізіка-геаграфічнага аддзела "Вялікай Савецкай Энцыклапедыі", часопіса "Землеведение".

Пахаваны ў Маскве, на Ваганькаўскіх могілках. Імем Б. Дабрыніна названы гара на "Зямлі Каралевы Мод" ў Антарктыдзе і бухта востраў Іторуп у Ахоцкім моры.

Вольга Гапоненка

Дамброўскі Франц

***Дамброўскі Франц Вікенцьевіч** [27.1.(8.2.)1851, Віцебск – ліпень 1909, Пецярбург], рускі празаік, перакладчык.*

Бацька пісьменніка, В. Дамброўскі, быў механікам па абсталяванню мукамольных млыноў, маці паходзіла са старажытнага шляхецкага роду, навучыла сына чытаць. У дзяцінстве Ф. Дамброўскага рыхтавалі ў ксяндзы. Пасля таго, як бацька ў 1863 г. пакінуў сям'ю, юнак да 19 гадоў рамеснічаў, займаўся сельскагаспадарчымі работамі, дробным гандлем, быў бурлаком, працаваў на чыгунцы, дзе і пачаў "изучать русскую грамоту по Бове, Еруслану". У 1867 г., згодна з Указам пра шляхту, перапісаны ў мяшчане. З 1870 г. працаваў у тэатры (акцёр, танцоўшчык, антрэпрынёр). Некаторы час быў наборшчыкам друкарні газеты "Рижский вестник". У 1873 г. пераехаў у Пецярбург, дзе іграў у балаганнай трупе, быў прызваны ў армію. У 1877 г. вызвалены па хваробе. З 1878 г. — сакратар рэдакцыі "Указателя по делам печати". У маі 1879 г. высланы з Пецярбурга ў Віцебск пад нагляд паліцыі па падазрэнню ў рэвалюцыйнай прапагандзе. У высылцы пачаў пісаць. Пасля дазволу (у снежні 1881 г.) вярнуўся ў Пецярбург, працаваў у рэдакцыях часопісаў "Наблюдатель", "Новый русский базар", "Родина". Першая публікацыя — аповесць "Тыповы суддзя" (Эхо. 1882, 6–17 апр.). Творы Ф. Дамброўскага, раман "Палец лёсу", (СПб., 1888), аповесць "Дачка сельскага святара" (дадатак да часопіса "Родина". 1887. № 5) і інш. адрасаваны ў асноўным гарадскому чытачу з народа. Аўтар вучэбных дапаможнікаў "Паляўнічы дома, у полі, у лесе і на вадзе" (СПб., 1891), "Польска-рускі буквар" (СПб., 1896), а таксама дарожнага даведніка "Поўны падарожнік па Пецярбургу і ўсіх яго ваколіцах" (СПб., 1896).

Алесь Карлюкевіч

Данілаў Іван

***Данілаў Іван Гаўрылавіч** (1923, в. Паўлавічы Круглянскага р-на Магілёўскай вобл. — 1975, Масква), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, генерал-маёр авіяцыі. Заслужаны ваенны лётчык СССР.*

І. Данілаў служыў у арміі з 1940 г. Скончыў авіяцыйную школу пілотаў у Горкаўскай вобл. У 1943–1945 гг. удзельнічаў у баях у складзе 1-га Украінскага, 3-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў. Зрабіў 261 баявы вылет, удзельнічаў у 46-ці паветраных баях, збіў 6 варожых самалётаў, правёў 45 штурмавых вылетаў. У 1949–1951 гг. вучыўся ў Краснадарскай школе штурманаў: у 1951–1959 гг. служыў у Далёкаўсходняй ваеннай акрузе, у 1973–1975 гг. — у Галоўным штабе СПА СССР.

І. Данілаў узнагароджаны трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, двума — Чырвонай Зоркі, ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі. Пахаваны на Увядзянскіх могілках у Маскве.

Вацлаў Мацкевіч

Данілевіч Міхаіл

***Данілевіч Міхаіл Георгіевіч** (1882, каля мяст. Ула Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Бешанковіцкі р-н Віцебскай вобл. — 1956, Ленінград, Расія), вучоны, медык-інфекцыяніст, прафесар.*

М. Данілевіч нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У 1910 г. скончыў Ваенна-медыцынскую акадэмію ў Пецярбургу, у 1912 г. — інтэрнатуру ў Выбаргскай дзіцячай бальніцы. Працаваў у Мікалаеўскай дзіцячай бальніцы, старшым урачом інфекцыйных аддзяленняў бальніцы імя Н. Ф. Філатава. Адначасова быў асістэнтам на кафедрах дзіцячых і інфекцыйных хвароб у Петраградскім медыцынскім інстытуце. З 1925 г. загадваў Васілевостраўскай дзіцячай бальніцай і з'яўляўся старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута аховы мацярынства і дзяцінства. Працаваў у Ленінградскім педыятрычным медыцынскім інстытуце, у Навукова-даследчым інстытуце дзіцячых інфекцый. Удзельнічаў у стварэнні савецкай аховы здароўя, будаўніцтве дзіцячых бальніц, амбулаторый.

Прафесар М. Данілевіч апублікаваў каля 150 навуковых прац, у тым ліку 5 манаграфій, прысвечаных пераважна такім хваробам, як шкарлятына, дыфтэрыя, дызентэрыя. М. Данілевіч першы ў расійскай навуцы сфармуляваў паняцце "перакрыжаваных інфекцый". Вывучыўшы іх ролю ў дзіцячай смяротнасці, ён прапанаваў сістэму прафілактыкі ўнутрыбальнічных заражэнняў. М. Данілевіч адным з першых у Савецкім Саюзе выявіў эфектыўнасць серапрафілактыкі адзёру. Быў членам праўлення Ленінградскага таварыства дзіцячых урачоў і Таварыства мікрабіёлагаў, эпідэміёлагаў і інфекцыяністаў, арганізатарам Камітэта па дзіцячых кропельных інфекцыях у Ленінградзе.

Вацлаў Мацкевіч

Данільчанка Анатоль

***Данільчанка Анатоль Барысавіч** (8.6.1940, п. Граза Гомельскага р-на і вобл.), рускі пісьменнік, кнігавыдавец).*

Свой рабочы шлях А. Данільчанка пачаў у 1956 г. рабочым на заводзе. Працаваў на шахтах Данбаса, у рэдакцыі газеты, выдавецтве, служыў у арміі. За гэты час асвоіў прафесіі слесара, электразваршчыка, мантажніка-вышынніка, камбайнера вугальных камбайнаў, журналіста, выдавецкага рэдактара. У 1974 г. скончыў Літаратурны інстытут імя А. М. Горкага ў Маскве. Тры гады ўзначальваў Валгаградскую пісьменніцкую арганізацыю, выбіраўся ў розныя пісьменніцкія, партыйныя і савецкія органы, дэпутаты абласнога савета.

Усяго А. Данільчанка выдаў больш за 10 асобных кніг. Сярод іх — раманы "Людзі жывуць сем'ямі" (1976, 1980, 1988, 1994), "Восеньскія туманы" (1986), зборнікі аповесцей і апавяданняў "Адзін на адзін" (1983), "Шчаслівы" (1990), аповесць "Дзед Кядрач" (1996) і інш. Публікаваўся ў розных зборніках, альманахах і часопісах. Сябар Саюза пісьменнікаў Расійскай Федэрацыі, захапляецца калекцыянаваннем мінералаў, старых манет.

Віктар Мядзведзеў (Сарэпта Валгаградскай вобл., Расія)

Дашчынскі Станіслаў

***Дашчынскі Станіслаў** (23.4.1938, в. Воўкаўшчына Круглянскага р-на Магілёўскай вобл.), рускі пісьменнік, вучоны. Кандыдат гістарычных навук.*

С. Дашчынскі скончыў рамесніцкае вучылішча ў Магілёве. З ліпеня 1956 г. жыве ў Расіі, на Кольскім паўвостраве. Працаваў на будаўніцтве Аленягорскай абагачальнай фабрыкі каменшчыкам, быў літаратурным супрацоўнікам газеты "Мончегорский рабочий". Служыў у войску на Кольскім паўвостраве, потым, па яго словах, "прайшоў усе прыступкі" да пасады рэдактара раённай газеты Саамскага краю "Ловозерская правда". Быў рэдактарам газет "Шахтер Арктики" на Шпіцбергене і "Заполярный труд" у г. Кола. Выбіраўся сакратаром райкама КПСС. Потым вярнуўся да журналістыкі — працаваў рэдактарам штотыднёвіка "Рыбный Мурман", быў стваральнікам і першым рэдактарам новай штодзённай абласной газеты "Мурманский вестник". Хадзіў у мора як памочнік капітана на плаўбазах "Поўначрыбхоладфлоту". Апошнім часам працуе ў Адміністрацыі Мурманскай вобл. (Камітэт па рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій). Узначальвае абласны "Мемарыял", абласную арганізацыю аматараў кнігі. Аўтар кніг "Кола", "Лоўвозера" (у сааўтарстве з І. Ушаковым), "Хата бабулі Захарыхі" (Мурманск), "Перамогу вырашае хвіліна адвагі" (Петразаводск), "Мурманск — горад-герой", "Пабрацімы Аляксандра Матросава" (Масква). Укладаў і рэдагаваў шматтомную кнігу памяці Мурманскай вобл., "Энцыклапедыю Кольскага краю". Большасць твораў С. Дашчынскага навеяны падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. А зборнік апавяданняў "Хата бабулі Захарыхі" — успамін "аб дзяцінстве, якое чорным крылом накрыла вайна". Дакументальная аповесць С. Дашчынскага пра партызан перакладзена на фінскую мову.

Святлана Сачанка

Дзевятоўскі Антоній

***Дзевятоўскі Антоній Кірылавіч** (9.8.1917, в. Бараўкі Віленскай губ., цяпер вёска не існуе, на яе месцы — мікрараён г. п. Варапаева Пастаўскага р-на Віцебскай вобл., вул. 17-га верасня; былы дом Дзевятоўскіх пад № 61 – 28.9.1995, г. Гайнаўка, Польшча), святар, магістр тэалогіі.*

А. Дзевятоўскі нарадзіўся на Пастаўшчыне ў сям'і "народнага беларускага паэта". Яго бацька сапраўды меў паэтычны талент, але працаваў на зямлі. Пасля заканчэння Варапаеўскай пачатковай школы і Дунілавіцкай сямігодкі А. Дзевятоўскі паступіў у Віленскую праваслаўную духоўную семінарыю. Пасля навучання ў ёй, у 1938 г., прыняў абрад пасвячэння і прадоўжыў вучобу на тэалагічным факультэце Варшаўскага універсітэта. Аднак Другая сусветная вайна не дазволіла скончыць яго. Ступень магістра тэалогіі атрымаў толькі ў 1961 г. Пасля вераснёўскай кампаніі 1939 г. самастойна прыняў парафію ў Снове. У пачатку вайны быў пераведзены ў новастворaную парафію ў Чэрвені на Міншчыне. Пазней а. Антонію даверылі парафію пры саборы св. Сафіі ў Полацку, а таксама кіраўніцтва Полацка-Віцебскай дыяцэзіяй. А. Антоній прымаў удзел у пераносе мошчаў св. Ефрасінні Полацкай з Віцебска ў Спаса-Ефрасіннеўскую царкву. Настаяцелем Сафійскага сабора а. Антоній заставаўся да набліжэння фронту. Затым яго накіравалі ў новую парафію ў в. Плёскі каля Бельска-Падляшскага.

З Плёсак у 1951 г. А. Дзевятоўскі быў пераведзены ў Гайнаўку. На тэрыторыі Гайнаўскага прыхода ўзвёў храмы, у тым ліку вядомы ў свеце храм Святой Тройцы (1973–1982, архітэктар праф. А. Грыгаровіч, па ўзору Ле Карбюзье). Дзякуючы гэтаму храму Гайнаўская зямля, якой ён праслужыў 44 гады, стала вядомым цэнтрам духоўнага жыцця як Беласточчыны, так і праваслаўнай культуры ў цэлым. Перад пачаткам і ў час будаўніцтва

храма а. Антоній многа падарожнічаў, быў духоўным правадніком паломнікаў у Іудзею і Галілею. Акрамя грашовых сродкаў на будаўнічыя работы прывозіў са сваіх паездак каштоўныя дары не толькі для гайнаўскіх цэркваў, але і для іншых храмаў у Польшчы.

За сваё жыццё А. Дзевятоўскі ўзвёў або прымаў удзел у будаўніцтве 11 храмаў. У апошнім сваім лісце ў Беларусь, да родных у Варапаеве, пісаў, што заклаў 12-ты. У лістападзе 1994 г. асвяціў царкву, пабудаваную на яго радзіме ў Варапаеве, перадаў мясцоваму святару дзве рызы і абраз. У 1988 г., 1000-гадовым па хрышчэнню Русі, да залатога 50-гадовага юбілею пастырства Антонія, выйшла брашура, прысвечаная Гайнаўскаму сабору і самому А. Дзевятоўскаму, а ў 1992 г. — манаграфія. З 1982 г. па ініцыятыве Антонія ў Гайнаўцы праводзіліся Дні царкоўнай музыкі, якія пазней сталі міжнародным фестывалем.

Іосіф Зямчонак (Варапаева, Віцебскай вобл.)

Дзяржыцкі Уладзімір

Дзяржыцкі Уладзімір Флягонтавіч *(26.11.1918, в. Барздоўка Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл.), урач, старшыня рады Беларускай грамады ў Рэспубліцы Малдова.*

У. Дзяржыцкі нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Скончыў 2-ю беларускую сямігодку ў Оршы. Пасля 1932 г. аказаўся за межамі Беларусі. Атрымаўшы сярэднюю медыцынскую адукацыю, у 1940 г. паступіў у Ваенна-медыцынскую акадэмію ў Ленінградзе. Закончыўшы яе, удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне як ваенны ўрач. Пасля вайны служыў у Савецкай Арміі ў Ленінградзе, Польшчы, на Украіне. З 1960 г. жыве ў Малдове. З 1960 г. працаваў старшым выкладчыкам на ваеннай кафедры Кішынёўскага медыцынскага інстытута, з 1974 г. — на факультэце ўдасканалення ўрачоў. Адначасова больш (за 20 год) — галоўны таксіколаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Малдова.

Прымае актыўны ўдзел у грамадска-культурным жыцці беларускай дыяспары ў Малдове: з дня заснавання беларускай суполкі ўдзельнічае ў яе рабоце, з 1993 г. — старшыня рады Беларускай грамады ў рэспубліцы. З сакавіка 2000 г. — старшыня Каардынацыйнай рады беларускіх суполак ў Малдове і Прыдняпроўі. Удзельнічаў ў рабоце I і II з'ездаў Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына", дзе быў выбраны сябрам Вялікай рады ЗБС.

У. Дзяржыцкі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі "За абарону Ленінграда", "За вызваленне Варшавы", "За ўзяцце Берліна".

Ірына Тамільчык

Доўбня Іван

Доўбня Іван Пятровіч *(31.1.1853, Пінск – 2.2.1912, Санкт-Пецярбург, Расія), матэматык, горны інжынер, прафесар, дырэктар Горнага інстытута Імператрыцы Кацярыны II, сапраўдны надворны саветнік.*

І. Доўбня нарадзіўся ў беднай сям'і унтэр-афіцэра, служачага прыстані на ўскраіне Пінска, дзе і прайшло яго дзяцінства. У 14 гадоў скончыў Пінскую гімназію, потым неафіцыйна працаваў за свайго бацьку валасным пісарам. Здольны юнак у 1870 г. бліскуча здаў экзамены і паступіў у Горны інстытут. Яму прызначылі там адзіную стыпендыю для прэтэндэнтаў-выдатнікаў. Пасля заканчэння інстытута ў 1875 г. І. Доўбня паступіў на педагагічныя курсы пры 2-й Санкт-Пецярбургскай ваеннай гімназіі. У 1877–1880 гг. выкладаў матэматыку ў арэнбургскай Няклюеўскай ваеннай гімназіі, потым, да 1897 г., — у Ніжагародскім кадэцкім корпусе графа Аракчэева. Пасля абароны дысертацыі на тэму "Доследы па тэорыі абелевых інтэгралаў" быў удастоены звання экстраардынарнага прафесара і ўзначаліў кафедру вышэйшай матэматыкі Горнага інстытута, а ў 1898 г. — прызначаны ардынарным прафесарам таго ж інстытута. У 1903 г. актыўна ўдзельнічаў у асобым савеце па перабудове працы эмерытальнай касы горных інжынераў. У 1904 г. звольніўся па ўласнаму жаданню, а ў 1906 г. вярнуўся на ранейшую пасаду ў інстытут. У 1910 г. саветам Горнага інстытута прызначаны выконваючым абавязкі дырэктара, а ў наступным годзе зацверджаны дырэктарам.

Большую частку свайго жыцця І. Доўбня прысвяціў педагагічнай дзейнасці. Яго сучаснікі — былы выхавальнік Ніжагародскага кадэцкага корпуса Е. Семашкевіч, прафесары М. Крылоў і А. Васільеў — у сваіх успамінах характарызавалі І. Доўбню як выкладчыка-мастака. М. Крылоў пасля смерці нашага земляка склаў спіс 44 яго прац і 28 артыкулаў па элементарнай матэматыцы, апублікаваных у айчынных і замежных матэматычных часопісах. Сярод іх асабліва важнае значэнне маюць артыкулы, прысвечаныя абелевым інтэгралам, у прыватнасці, т. зв. псеўдаэліптычным інтэгралам. Гэтыя пытанні маюць філасофскую цікавасць.

І. Доўбню, як адзначалі яго сучаснікі, вызначала шырыня поглядаў, цікавасць да іншых навук, айчыннай і замежнай літаратуры.

Браніслава Котава

Драянкоў Алесь

Драянкоў Алесь Фёдаравіч *(15.2.1936, п. Дзедаў Курган Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл.), дзеяч беларускай дыяспары ў Расіі, пісьменнік.*

Нарадзіўся А. Драянкоў у сям'і вясковага настаўніка, які пазней стаў вайскоўцам. Спачатку жыў у Беларусі, пазней — у Маскве. Закончыў МВТВ імя Баўмана, аспірантуру (дысертацыя па тэме "Дынаміка і трываласць"), МДУ імя Ламанасова (Этналогія). Працаваў у галіне практычнай касманаўтыкі, з 1993 г. — у Чарнобыльскай зоне на Палессі. Адзін з заснавальнікаў Маскоўскага таварыства беларускай культуры імя Ф. Скарыны (1989), спачатку намеснік, а ў 1990–1992 гг. — старшыня таварыства. Аўтар артыкулаў і апавяданняў у беларускім друку ("Літаратура і Мастацтва", "Наша слова", "Свабода", "Чырвоная змена" і інш.). Аўтар трох сцэнарыяў для Цэнтрнавукфільма (Масква).

Ала Такінданг

Дробыш-Драбышэўскі Аляксей

Дробыш-Драбышэўскі Аляксей Аляксеевіч *(псеўд. А. Уманскі, Перо і інш.; 20.8(2.9).1856, Магілёў – 3.6.1920, Ніжні Ноўгарад), журналіст, літаратар, крытык, перакладчык.*

А. Дробыш-Драбышэўскі паходзіў з дваран. Вучыўся ў Магілёўскай гімназіі. Затым — у ніжагародскай Аракчэеўскай ваеннай гімназіі, пасля заканчэння якой (1873) быў залічаны вольнаабавязаным у 11-ты пяхотны Пскоўскі полк. У хуткім часе выйшаў у адстаўку, пераехаў у Пецярбург. У кастрычніку 1873 г. арыштаваны за ўдзел у "гуртку артылерыстаў", больш 6 месяцаў знаходзіўся ў Петрапаўлаўскай крэпасці. У красавіку 1874 г., пасля вызвалення, пераехаў у Кіеў. Займаўся рэвалюцыйнай работай. Арыштаваны за распаўсюджванне рэвалюцыйнай літаратуры. З 1880 г. па "справе 137-мі" знаходзіўся ў сібірскай ссылцы.

У ссылцы распачаў літаратурную дзейнасць. Артыкулы, напісаныя ў час знаходжання ў Енісейску, склалі "Нарысы золатапрамысловасці ў Енісейскай тайзе" (СПб., 1888). Вярнуўшыся з Сібіры, жыў у Ніжнім Ноўгарадзе на кватэры ў У. Караленкі. У канцы 1888 г. пераехаў у Казань, супрацоўнічаў у "Казанском биржевом листке". У 1889–1890 гг. — сакратар і фактычны рэдактар "Волжского вестника". У той жа час у часопісе "Русское богатство" змяшчае артыкул "Адам Міцкевіч", у якім спрабуе прадставіць Міцкевіча як папярэдніка Ф. Дастаеўскага, Л. Талстога, звяртаючы ўвагу на падабенства містычных вучэнняў. Захапленне польскай літаратурай увогуле характэрна для А. Дробыш-Драбышэўскага (артыкул "Юлій Славацкі: паэт і містык" у часопісе "Русское богатство", 1901, № 5–6; пераклады драм А. Свентахоўскага "Фігляр", "Пад маскай", З. Красінскага "Ірыдыён"). У 1890–1892 гг. супрацоўнічаў у "Казанском вестнике". У канцы 1893 г. – ліпені 1894 г. — фактычны рэдактар газеты "Волгарь", садзейнічаў публікацыі ў ёй твораў М. Горкага. У 1894–1895 гг. рэдагаваў "Нижегородский листок" (па распараджэнню губернатара быў звольнены як палітычна ненадзейны). У 1895 г. узначаліў "Самарскую газету". З 1901 г. вёў раздзелы "Мімаходзь" і "Выпадковыя нататкі" у "Нижегородском листке". У 1918–1920 гг. рэдагаваў "Кооперативный вестник".

Алесь Карлюкевіч

Дубноў Сямён

Дубноў Сямён (Шымон) Маркавіч *(1860, Мсціслаў Магілёўскай губ., цяпер Магілёўскай вобл. – 1941, Рыга), гісторык, публіцыст.*

У 1880–1906 гг. С. Дубноў жыў у Пецярбургу, Адэсе, Вільні. З 1906 г. пасяліўся ў Пецярбургу, дзе з 1908 г. пачаў выкладаць яўрэйскую гісторыю на Курсах усходазнаўства, а з 1919 г. — у Яўрэйскім народным універсітэце. Заснаваў там гістарычны часопіс на іўрыце "Хе-'авар" (1918. Пг. Т. 1,2), а таксама (разам з іншымі) — Яўрэйскае гісторыка-этнаграфічнае таварыства. Каля дзесяці гадоў (1909–1918) рэдагаваў часопіс "Яўрэйская старына", дзе друкавалася многа матэрыялаў з Беларусі і пра Беларусь. Як член Таварыства па распаўсюджванню асветы сярод яўрэяў у Расіі змагаўся за адкрыццё нацыянальных яўрэйскіх школ. Выступаў за ўдзел яўрэяў у Дзяржаўнай Думе (1905). У 1906 г. заснаваў Яўрэйскую народную партыю, якая праіснавала да 1918 г., але не аказала значнага ўплыву на яўрэйскае жыццё ў Расіі. У 1922 г. Дубноў эмігрыраваў. Жыў спачатку ў Каўнасе, потым у Берліне. Пасля прыходу да ўлады Гітлера ў 1933 г. пераехаў у Рыгу. У верасні 1941 г., пасля акупацыі горада фашыстамі, быў арыштаваны і адпраўлены ў гета, дзе вёў дзённік. 8 снежня 1941 г. уключаны ў калону смяротнікаў. Дакладная дата і месца яго смерці невядомыя.

Першай значнай працай С. Дубнова з'яўляецца гісторыка-філасофскі эцюд "Што такое яўрэйская гісторыя" (1893), дзе гісторыя яўрэйскага народа паказваецца як гісторыя развіцця яўрэйскага нацыянальнага духу. З 1898 г.

працаваў над "Падручнікам яўрэйскай гісторыі", выдадзеным у трох тамах у Адэсе ў 1898–1901 гг. У 1900-х гг. выходзіць у свет яго "Усеагульная гісторыя яўрэяў", тры тамы якой сталі дадаткам да часопіса "Восход". Чацвёрты том, надрукаваны пад назвай "Навейшая гісторыя яўрэйскага народа 1789–1881", (Пг., 1914), уключае звесткі пра жыццё яўрэяў Беларусі. Асобныя часткі гэтай працы публікаваліся ў Маскве і Петраградзе ў савецкі час (1922–1923). "Сусветная гісторыя яўрэйскага народа" С. Дубнова ў 10 т. выйшла ў нямецкім перакладзе ў Берліне (1925–1929), пасля — на іўрыце (1923–1938), рускай мове (Рыга, 1934–1938), ідыш (1948–1958). У Тэль-Авіве на іўрыце апублікавана яго выніковая праца па гісторыі хасідскага руху "Гісторыя хасідызму" 1930–1931), дзе прасочваецца пераемнасць цэнтраў яўрэйскай культуры (Вавілон, Палесціна, Іспанія, Германія, Польшча, урэшце — гістарычная Літва з уключэннем беларускіх зямель).

С. Дубноў выступаў таксама як літаратурны крытык, педагог, публіцыст. Ім апублікаваны артыкулы "Размоўная мова" (пра ідыш), "Руска-яўрэйская інтэлігенцыя ў гістарычным аспекце", "Абуджэнне сусветнага сумлення і лёс яўрэйства". Пра сваё жыццё і творчасць С. Дубноў расказаў ва ўспамінах "Кніга майго жыцця" (Рыга, 1934–1935. Т. 1–2). Трэці том быў апублікаваны ў 1940 г. у Рызе, знішчаны фашыстамі, але перавыдадзены саюзам рускіх яўрэяў у Нью-Йорку (1957). У 1950 г. у Нью-Йорку выйшла кніга С. М. Дубновай-Эрміх "Жыццё і творчасць С. М. Дубнова", дзе гаворыцца пра яго мсціслаўскія карані.

Браніслава Котава

Дубяга Зміцер

Дубяга Зміцер Іванавіч *(21.9(3.10)1849, в. Соіна Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Мсціслаўскі р-н Магілёўскай вобл. – 22.10.1918, Казань, Расія), астраном, прафесар.*

Зм. Дубяга паходзіў з беларускай шляхты. Скончыў Магілёўскую гімназію (1868). У тым жа годзе паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Санкт-Пецярбургскага універсітэта, які скончыў у 1872 г. са ступенню кандыдата і залатым медалём за даследаванне "Выкарыстанне спектральнага аналізу ў астранамічных даследаваннях". Па рэкамендацыі Вучэбнага камітэта быў пакінуты на два гады (1872–1874) у тым жа універсітэце для падрыхтоўкі да прафесарскага звання. 10 чэрвеня 1874 г. быў прыкамандзіраваны да Пулкаўскай абсерваторыі як звышштатны астраном і працаваў там да 1884 г.. У снежні 1877 г. прызначаны ад'юнктам-астраномам абсерваторыі. 31 мая 1878 г. атрымаў ступень магістра Санкт-Пецярбургскага універсітэта, 2 сакавіка 1881 г. — ступень доктара астраноміі і геадэзіі. У 1881–1884 гг. чытаў як прыват-дацэнт лекцыі па астраноміі і геадэзіі ў тым жа універсітэце. У 1884–1918 гг. — ардынарны прафесар па кафедры астраноміі і геадэзіі Казанскага універсітэта і дырэктар Казанскай абсерваторыі. З 15 студзеня 1890 г. быў дэканам фізіка-матэматычнага факультэта Казанскага універсітэта. У 1899–1905 гг. — яго рэктар.

Навуковыя даследаванні Зм. Дубягі прысвечаны тэарэтычнай астраноміі, астранаметрыі і гравітаметрыі. Займаўся распрацоўкай тэорыі руху планет. Даследаваў арбіту спадаражніка Нептупа, стварыў тэорыю руху малой планеты Дыяны. Паводле назіранняў казанскіх астраномаў склаў каталог 4281 зоркі. Узначальваў экспедыцыі для назірання поўных сонечных зацьменняў, арганізаваныя па ініцыятыве Казанскага універсітэта, у Вяцкую губерню (1887) і на Новую Зямлю (1896). Па прапанове і ініцыятыве Зм. Дубягі універсітэтам былі накіраваны і падрыхтаваны навуковыя экспедыцыі ў розныя месцы Еўрапейскай Расіі для правядзення астранамічных і геадэзічных назіранняў. Пад яго кіраўніцтвам у 1885 і 1887 гг. выдадзены 2 тамы назіранняў Казанскай абсерваторыі. Быў ініцыятарам стварэння ва універсітэце новай астранамічнай абсерваторыі, якой было нададзена імя В. Энгельгарда. У 1889–1901 гг. прымаў удзел у яе будаўніцтве і адкрыцці. З 1901 г. быў яе дырэктарам. Дзякуючы намаганням З. Дубягі абсерваторыя Казанскага універсітэта была прызнана адной з лепшых на той час у Расіі.

Асноўныя навуковыя працы Зм. Дубягі: "Даследванне арбіты спадарожніка Нептуна, зробленае пулкаўскім рэфрактарам з 1847 па 1876 г." (СПб., 1878, магістэрская дысертацыя), Тэорыя руху планеты Дыяна". (СПб., 1880, доктарская дысертацыя. Нашаму суайчыннiку прысвечана праца В. Баранова "Памяці Дзмітрыя Іванавіча Дубяго" (Казань, 1919).

Вольга Гапоненка

Дудышкін Сцяпан

Дудушкін Сцяпан Сямёнавіч *[25.12.1820 (6.1.1821), Віцебск – 16(28).9.1866, Паўлаўск, Расія], літаратурны крытык, журналіст.*

У 1837 г. С. Дудышкін скончыў Віцебскую гімназію, у 1841 г. — юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта. Пасля яго заканчэння некаторы час жыў з прыватных урокаў. З 1842 г. — у Дэпартаменце знешняга

гандлю. У 1843 г. пераведзены ў Камісарыяцкі дэпартамент. Літаратурную дзейнасць пачаў як перакладчык. Знаходзіўся пад уплывам В. Бялінскага, яго крытычнага метаду. У артыкуле "Творы Фанвізіна" (Отечественные записки. 1847. № 8, 9) дэкларава ў неабходнасць гістарычнага падыходу да аналізу падзей сацыяльнага і літаратурнага жыцця. У 1848 г. С. Дудушкін пакінуў службу і цалкам прысвяціў сябе літаратурнай дзейнасці. Па сведчанню І. Ганчарова пачынаў "уваходзіць у моду: разумныя і карысныя артыкулы яго... прыкмечаны і расхвальваюцца ўсімі". В. Бялінскі падкрэсліў, што ў артыкулах С. Дудушкіна "відаць веданне справы, ён добра карыстаецца гістарычным вывучэннем развіцця, каб растлумачыць ім літаратурны твор дадзенай эпохі...)". В. Бялінскі і М. Някрасаў запрасілі С. Дадушкіна ў "Современник" як аднадумцу і пераемніка. Аднак супадзенне поглядаў крытыкаў было частковым: прынцып вернасці мастацтва сапраўднасці С. Дудышкін зводзіў да патрабавання праўдападобнасці, ідэю маральнага значэння асветы — да антытэзы адукаванасць—невуцтва, пад знакам якой і асэнсоўваў любы матэрыял. У 1852 г. перайшоў на працу ў "Отечественные записки", быў іх вядучым крытыкам, складальнікам штомесячных аглядаў. С. Дудышкін адгукнуўся на літаратурны дэбют Л. Талстога (Отечественные записки. 1852. № 10). З 1860 г. ён — фактычны рэдактар "Отечественных записок", адзін з іх выдаўцоў.

Алесь Карлюкевіч

Душэўскі Клаўдзій

Душэўскі (Дуж-Душэўскі) Клаўдзій Сцяпанавіч *(27.3(паводле інш. звестак 26.4).1891, мяст. Глыбокае Дзісненскага пав. Віленскай губ., цяпер г. Глыбокае Віцебскай вобл. – 25.9.1959, Каўнас, Літва), беларускі і літоўскі грамадска-палітычны і культурны дзеяч.*

К. Душэўскі скончыў Віленскае рэальнае вучылішча (1912), у час вучобы далучыўся да беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. У 1912–1918 гг. вучыўся ў Пецярбургскім горным інстытуце. Быў сябрам Беларускага навукова-літаратурнага гуртка студэнтаў Санкт-Пецярбургскага універсітэта, удзельнічаў ў выданні часопіса "Раніца". Падтрымліваў сувязі з рэдакцыяй газеты "Наша ніва" і прадстаўнікамі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху (І. і А. Луцкевічы, В. Ластоўскі, Р. Зямкевіч, А. Уласаў). Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. уступіў у Беларускую сацыялістычную грамаду (БСГ), у чэрвені — кастрычніку 1917 г. — член ЦК БСГ і яе прэзідыума. Удзельнічаў у з'ездзе беларускіх нацыянальных арганізацый (сакавік 1917, Мінск), ва Усерасійскай дэмакратычнай нарадзе (верасень 1917, Петраград). У 1918 г. працаваў у Маскве загадчыкам бежанскага аддзела Беларускага нацыянальнага камісарыята. Разам з тым, падтрымліваў ідэю аб незалежнасці і непадзельнасці Беларусі, з якой выступалі дзеячы БНР. Летам 1918 г. стаў сябрам Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. З красавіка 1919 г. — у Вільні. Уваходзіў у Беларускі нацыянальны камітэт. У маі 1919 г. абраны старшынёй Цэнтральнай Беларускай рады Віленшчыны і Гродзеншчыны, аднак у ліпені склаў з сябе паўнамоцтвы па прычыне нязгоды з прапольскай арыентацыяй большасці рады. Пасля гэтага ўзначальваў камітэт Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, Віленскі аддзел Саюза спажывецкіх таварыстваў Беларускага краю. Восенню 1919 г. выступаў за утварэнне Беларускай вайсковай камісіі. У гэты ж час прызначаны дыпламатычным прадстаўніком БНР у краінах Прыбалтыкі. У снежні 1919 г. прызначаны дзяржаўным сакратаром Рады БНР ва ўрадзе В. Ластоўскага. Зімой 1920–921 гг. выкладаў у Віленскай беларускай гімназіі і на беларускіх настаўніцкіх курсах. У пачатку 1921 г. арыштаваны польскімі ўладамі, пасля вызвалення (7.2.1921) пераехаў у Каўнас. Да канца 1923 г. працаваў у Міністэрстве беларускіх спраў пры ўрадзе Літвы, да канца 1930 г. — у Міністэрстве замежных спраў Літвы. У 1927 г. скончыў Літоўскі універсітэт у Каўнасе. Актыўна ўдзельнічаў у грамадска-палітычным жыцці беларускай калоніі ў Літве. Быў дэлегатам на Першай Усебеларускай канферэнцыі (верасень 1921, Прага). Асуджаў палітыку польскіх уладаў ў адносінах да беларускага насельніцтва. Крытычна ставіўся да палітыкі беларусізацыі, што праводзілася ў БССР, лічыў яе непаслядоўнай. Быў гарачым прыхільнікам ідэі цеснага саюза паміж беларусамі і літоўцамі, па гэтай прычыне разышоўся з большасцю дзеячаў БНР. Разам з В. Ластоўскім уваходзіў у склад кіраўніцтва Беларускага цэнтра ў Літве і Літоўска-беларускага таварыства (створана ў 1925). У 1920-х гг. падтрымліваў кантакты з беларускімі студэнтамі ў Празе. У 1925 г. не прызнаў самароспуску ўрада БНР, адмовіўся вярнуцца ў БССР. У 1927 г. выступіў за актывізацыю дзейнасці Беларускага цэнтра ў Літве, у 1933 г. узначаліў яго. Знаходзіўся ў канфліктных адносінах з кіраўнікамі большасці беларускіх арганізацый у Літве (Беларускае культурна-асветнае таварыства ў Літве, Аб'яднанне студэнтаў-беларусаў Літоўскага універсітэта імя Вітаўта Вялікага ў Каўнасе і г. д.), якія абвінавачвалі яго ў імкненні узурпіраваць уладу ў асяроддзі беларусаў Літвы. Пасля ўключэння Літвы ў склад СССР (1940) арыштаваны, знаходзіўся ў турме да чэрвеня 1941 г. У жніўні 1943 г. арыштаваны нацыстамі за аказанне дапамогі яўрэйскаму насельніцтву Літвы, знаходзіўся ў канцлагеры каля г. п. Правянішкес. У 1944–1946 гг. — дацэнт Каўнаскага універсітэта. У снежні 1946 г. арыштаваны, знаходзіўся пад следствам у Вільнюскай турме да мая 1947 г. У лютым 1952 г. зноў арыштаваны і асуджаны як "актыўны беларускі нацыяналіст" на 25 гадоў зняволення. Вызвалены ў красавіку 1955 г. Працаваў у інстытуце Літбудпраект.

К. Душэўскі актыўна працаваў у галіне беларускай культуры. Распрацоўваў праблемы вывучэння старажытных гістарычных помнікаў, аховы даўніны Беларусі. Рэдагаваў часопіс "Беларускі сцяг"(1922). Разам з В. Ластоўскім выдаваў і рэдагаваў часопіс "Крывіч" (1923–1926). У 1923 г. выступаў з лекцыямі на курсах беларусазнаўства пры Міністэрстве беларускіх спраў у Літве. У 1925 г. уваходзіў у склад ініцыятыўнай групы па арганізацыі святкавання 400-годдзя беларускага друку. Выступаў з прамовамі па каўнаскім радыё. Перакладаў на беларускую мову і выдаваў дапаможнікі для школ, у т. л. падручнікі па гісторыі сярэдніх вякоў і новага свету Р. Віпера. З 1933 г. выдаваў і рэдагаваў часопіс "Беларускі асяродак".

Вольга Гапоненка

Дыбоўскі Бенядзікт

Дыбоўскі Бенядзікт Іванавіч *[29.4(11.5).1833, б. маёнт. Адамарын (каля Дубровы) Вілейскага пав. Мінскай губ., цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл., па інш. крыніцах маёнт.: Тонвы Мінскага пав. – 31.1.1930, Львоў, Украіна], прыродазнавец, падарожнік, пісьменнік, грамадскі дзеяч, прафесар. Член Польскай акадэміі навук (1884) і замежны член-карэспандэнт АН СССР (1928).*

Нарадзіўся Б. Дыбоўскі ў шляхецкай сям'і. Пачатковую адукацыю атрымаў дома. Скончыў Мінскую гімназіі і ў 1853 г. паступіў на прыродазнаўчы факультэт Дэрпцкага (цяпер Тартускага_ універсітэта, адкуль быў выключаны за ўдзел у антыўрадавых дэманстрацыях. Затым засвойваў медыцыну і прыродазнаўчыя навукі ў Вроцлаве і Берліне, дзе вывучаў эмбрыялогію, слухаў лекцыі сусветна вядомых вучоных. У 1860 г. у Берлінскім універсітэце атрымаў ступень доктара медыцыны, а ў 1862 г. у Дэрпцкім універсітэце — ступень доктара медыцыны і хірургіі пасля абароны дысертацыйнай працы "Спроба манаграфіі пра кіпрынойдаў у Ліфляндыі" (Дэрпт, 1862). Гэта навуковае даследаванне атрымала высокія водгукі вучоных і было перавыдадзена ў Берліне.

З 1862 г. Б. Дыбоўскі — экстраардынарны прафесар заалогіі і палеанталогіі Варшаўскага універсітэта (у той час Галоўнай школы). Напярэдадні нацыянальна-вызваленчага паўстання 1863 г. выязджаў з канспірацыйнымі заданнямі ў Беларусь. За ўдзел у паўстанні ў 1864 г. быў асуджаны спачатку да павешання, а потым на 15 гадоў катаргі і сасланы ў Сібір, на возера Байкал (Сівакова, Дарасун). У 1875 г. амнісціраваны і ў 1877 г. вярнуўся на радзіму, наведаў Адамарын. Але, маючы намер вывучаць Камчатку, ужо праз год вярнуўся ў Расію. З 1879 г. працаваў урачом у Петрапаўлаўску-на-Камчатцы і адначасова праводзіў навуковыя даследаванні. З 1884 г. Б. Дыбоўскі — прафесар заалогіі і параўнальнай анатоміі і адначасова да 1886 г. загадчык кафедры заалогіі Львоўскага універсітэта, дзе займаўся сістэматызацыяй сабранага матэрыялу. У 1886–1887 гг. абраны дэканам філасофскага аддзялення універсітэта.

Б. Дыбоўскі з'яўляецца аўтарам каля 130 навуковых прац. Яго даследаванні прысвечаны розным галінам заалогіі, зоагеаграфіі, сістэматыкі і анатоміі жывёльнага свету, антрапалогіі і энтаграфіі. Вывучаў жывёльны і раслінны свет азёр Сібіры і Беларусі. Навуковыя даследаванні распачаў у час вучобы ў Дэрпцкім універсітэце. Яго першая навуковая праца (аб іхтыялагічным свеце Эстонскага краю) была надрукавана ў 1856 г. і адзначана Вучэбным камітэтам універсітэта залатым медалём.

Б. Дыбоўскі ўвайшоў у гісторыю навукі як першы даследчык фауны возера Байкал. Ён першы апісаў дзесяткі відаў птушак, рыб, насякомых, прасцейшых жывёлін (некаторыя з іх пазней былі названы яго імем). Вялікая частка гэтых даследаванняў была выканана у час сібірскага выгнання пры падтрымцы Усходне-Сібірскага аддзела Рускага геаграфічнага таварыства. Сабраў вялікую калекцыю прадстаўнікоў фауны Сібіры (звыш 2500 прэпарыраваных птушак і звыш 100 тыс. насякомых), частку якой перадаў Заалагічнаму музею Пецярбургскай акадэміі навук. У 1868 г. у в. Култук заснаваў метэастанцыю, якая была абсталявана сучаснымі прыборамі. Сам зрабіў прыбор для вымярэння глыбіні Байкала. Вынікі даследаванняў Байкала і Прыбайкалля былі прадстаўлены ў манаграфіі "Уклад у вывучэнне ніжэйшых ракападобных з групы гамарыдаў, якія выяўлены ў возеры Байкал", яна выйшла на нямецкай мове ў 1874 г. пры падтрымцы Энтамалагічнага таварыства у Пецярбургу і адзначана малым залатым медалём Рускага геаграфічнага таварыства. Вывучаў беларускія азёры Любань, Свіцязь, Чорнае і інш. Адным з першых у Еўропе стаў прыхільнікам і прапагандыстам эвалюцыйнай тэорыі Ч. Дарвіна. Шматлікія артыкулы Б. Дыбоўскага надрукаваны ў рускіх, польскіх, нямецкіх часопісах. Сярод асноўных навуковых прац вучонага — "Рыбы сістэмы воз. Байкал" і "Рыбы сістэмы вод Амура" (Известия Сибирского отделения Русского географического общества. 1876. Т. 7. № 1; 1877. Т. 8. № 1–2). Свае ўражанні пра падарожжы даследчык апісаў у кнігах "Пра Сібір і Камчатку" (Кракаў, 1912) і "Успаміны 1862–1878 гг." (Львоў, 1930).

Б. Дыбоўскі ўнёс значны ўклад ў арганізацыю сістэмы навуковых даследаванняў у Расіі і ў Галіцыі. Ён заснаваў у Львоўскім універсітэце добра абсталяваны Заалагічны інстытут (кабінет), абсталяваны сучаснымі прыборамі, і Музей заалогіі, у аснову якога былі пакладзены зборы камчацкіх экспанатаў, сабраныя вучоным. Стварыў тут фундаментальную бібліятэку з амаль 3000 тамоў кніг па прыродазнаўчых навуках, частку яе склалі прыватныя зборы вучонага, перададзеныя універсітэту. У савецкі час прапанаваў арганізаваць на Байкале пастаянную гідрабіялагічную станцыю. АН СССР ажыццявіла гэтую ідэю, а адно з навуковых суднаў было названа імем вучонага. Вывады нашага земляка былі ўлічаны пры праектаванні Брацкай ГЭС на Ангары.

Антрапалагічныя і этнаграфічныя зборы Б. Дыбоўскага сёння захоўваюцца ў музеях Варшавы, Львова, Кіева, Масквы, Іркуцка.

За навуковыя дасягненні і ўклад у рэфармаванне сістэмы вышэйшай адукацыі Б. Дыбоўскі быў абраны ганаровым прафесарам Львоўскага і Віленскага універсітэтаў, ганаровым доктарам Варшаўскага універсітэта, ганаровым грамадзянінам Львова, узнагароджаны ордэнам "Адраджэння Польшчы". Яму прысвечаны манаграфіі на рускай (Г. Вінкевіч) і польскай (А. Трэпка) мовах, паштовая марка. Пахаваны ў Львове на Лычакоўскіх могілках з воінскімі ўшанаваннямі як адзін з апошніх удзельнікаў паўстання 1863 г.

Вольга Гапоненка

Езавітаў Кастусь

Езавітаў Кастусь (Канстанцін) Барысавіч *[псеўд. Кастусёнак; крыпт. К-нак, К. Е., К. Ез.; 5.11.1893, Дзвінск (цяпер Даўгаўпілс, Латвія) – 23.5.1946, Мінск], паэт, публіцыст, гісторык, беларускі дзеяч у Латвіі.*

Нарадзіўся К. Езавітаў у сям'і капітана царскай арміі. У 1916 г. скончыў Віцебскі настаўніцкі інстытут і Паўлаўскае вайсковае вучылішча ў Пецярбургу. У чыне паручніка ўдзельнічаў у Першай сусветнай вайне. У 1917 г. арганізаваў у сваім пяхотным палку беларускую групу. Ад яе быў выбраны дэлегатам на з'езд беларусаў-вайскоўцаў у Віцебску, затым — на І Усебеларускі кангрэс, дзе стаў намеснікам старшыні Цэнтральнай Вайсковай рады. У лютым 1918 г., пры польскай уладзе, К. Езавітаў — камендант Мінска, узначаліў беларускі полк. Маючы талент арганізатара, шмат часу аддаваў стварэнню беларускіх вайсковых фарміраванняў. У сакавіку 1918 г. увайшоў у Раду Беларускай Народнай Рэспублікі, удзельнічаў у абвяшчэнні дзяржаўнай незалежнасці Беларусі. У першым урадзе БНР быў міністрам вайсковых спраў, атрымаў званне палкоўніка. Разам з Радай БНР эміграваў у Літву. У 1919 г. эмігрыйны ўрад БНР у Коўне накіраваў К. Езавітава ў Латвію і Эстонію з вайскова-дыпламатычнай місіяй. У 1920 г. той жа ўрад прысвоіў яму званне генерал-маёра. У 1921 г. К. Езавітаў прыняў латвійскае грамадзянства, распачаў арганізацыйную і культурна-асветніцкую работу сярод этнічных беларусаў Латвіі. Заснаваў у Дзвінску культурна-асветнае таварыства "Бацькаўшчына". Працаваў дырэктарам беларускай гімназіі ў Дзвінску, потым у Люцыне. Яго намаганнямі былі адкрыты ў Латвіі дзесяткі беларускіх школ і настаўніцкія курсы, а пры Міністэрстве асветы створаны Беларускі аддзел. Аднак у 1923 г. у Латвіі пачаўся ўціск беларускай нацыянальнай меншасці, школы зачыняліся, а вясной 1924 г. была сфабрыкавана справа аб тым, нібыта беларусы жадаюць далучыць частку латышскіх зямель (Латгалію) да Беларусі. Сярод беларускіх дзеячаў пачаліся арышты. К. Езавітаў быў зняволены на 11 месяцаў у турме да суда, бо не здолеў выплаціць вялікага залогу. У красавіку 1925 г. адбыўся суд, які апраўдаў усіх абвінавачаных. К. Езавітаў зноў стаў займацца грамадскай і культурна-асветніцкай працай: рыхтаваў і выдаваў падручнікі для школ, ладзіў беларускамоўную прэсу ("Голас беларуса", "Беларуская школа ў Латвіі"), арганізоўваў таварыствы ("Беларуская хата", "Прасвета", "Рунь" і інш.). У 1930-я гг. ён старшыня Беларускага нацыянальнага аб'яднання ў Латвіі, настаўнік. Арганізацыяй беларускіх школ у Латвіі займаўся да чэрвеня 1944 г., да таго, як быў адкліканы Беларускай Цэнтральнай радай у Мінск для ўдзелу ў калабарацыянісцкім II Усебеларускім кангрэсе, дзе быў выбраны членам Рады, рэферэнтам па вайсковых справах. Вярнуўся ў Рыгу. У жніўні 1944 г. выехаў у Берлін. У рангу генерала займаўся мабілізацыяй беларусаў у нацысцкую Беларускую Краёвую Абарону і пяхотную дывізію "Беларусь". Пры наступленні савецкіх войск 26 красавіка 1945 г. К. Езавітаў быў арыштаваны контрразведкай "Смерш", перавезены ў Маскву на Лубянку, а ў кастрычніку 1945 г. па патрабаванні Цанавы — у Мінск. Памёр у час следства ў шпіталі гарадской турмы МУС БССР.

Творчая спадчына К. Езавітава досыць разнастайная: гісторыка-папулярныя нарысы, публіцыстыка, вершы, успаміны. Упершыню выступіў у друку ў 1918 г. у часопісе "Варта" з гістарычнымі нататкамі "Вызваленне Мінска: запіскі каменданта". Валодаючы літаратурным талентам, ён імкнуўся дакументальна зафіксаваць развіццё нацыянальна-адраджэнцкай справы сярод беларусаў у Латвіі і Літве ў кнігах "Становішча беларускае школы ў Латвіі" (Вільня, 1923), "Беларусы ў Латвіі" (Рыга, 1927), "Беларускае культурна-асветнае таварыства "Бацькаўшчына" ў Латвіі" (Рыга, 1932), "Беларусы ў Літве" (Рыга, 1932). Папулярызаваў сярод беларускага настаўніцтва гісторыю Беларусі (арт. "Беларусь у мінулым і сучасным"), на факталагічнай аснове даследаваў гістарычныя адносіны паміж беларусамі і палякамі (арт. "Беларусы і палякі"). Адным з першых К. Езавітаў заняўся вывучэннем беларускай дыяспары (арт. "Беларусы ў Сібіры і на Далёкім Усходзе"). Пазней сталі вядомы яго дакументальна абгрунтаваныя ўспаміны пра І Усебеларускі кангрэс, іншыя ўзоры мемуарнага жанру. У перыяд турэмнага зняволення ў Латвіі раскрыўся паэтычны дар К. Езавітава. Бачачы і перажываючы цяжкае становішча, у якое трапіла бацькаўшчына, паэт, як і ўсе тагачасныя адраджэнцы, верыў у шчаслівую будучыню роднага краю, разлічваў на волю, якая прынясе "жывую ваду", каб загаіць раны на целе краіны. У 1925–1926 гг., калі была напісана большасць вершаў К. Езавітава, ён шчыра спадзяваўся, што аб'яднанне Беларусі ў адзіны шчаслівы дом будзе ісці з "цэнтральнай" (савецкай) Беларусі. У вершы "Беларусу-эмігранту" ён заклікаў вяртацца туды сыноў бацькаўшчыны, што апынуліся ў эміграцыі, а таксама звяртаўся да заходняга беларуса з заклікам: "Не хілісь прад нядоляю злой, — на Усход накіруй цьвёрды шлях". Сам К. Езавітаў, аднак, устрымаўся ад вяртання ў Савецкую

Беларусь. А ў пазнейшы час, бачачы рэпрэсіі, што ў 30-я гг. абрынуліся на беларускіх дзеячаў, змяніў свае адносіны да БССР. К. Езавітаў перакладаў з латышскай мовы творы Я. Райніса, А. Упіта, А. Курці і інш., пісаў пра іх у беларускім друку ("Полымя").

Ірына Багдановіч

Ерамееў Канстанцін

Ерамееў Канстанцін Сцяпанавіч *[6(18).6.1874, Мінск – 28.1.1931, Масква], рускі празаік, публіцыст, мемуарыст, выдавец, дзеяч рэвалюцыйнага руху.*

Сын жандармскага унтэр-афіцэра з прыпісных сялян. Два гады вучыўся ў Петразаводскім трохкласным вучылішчы (1883–1884). Працаваў падмайстрам, юнгам, з 1889 г. — перапісчыкам Аланецкай Казённай палаты. У 1893 г. экстэрнам здаў экзамены за поўны курс Петразаводскай гімназіі, паступіў добраахвотнікам у 107-мы Троіцкі пяхотны полк у Вільні, дзе зблізіўся з рэвалюцыйнымі коламі. У 1895 г. пакінуў службу. У 1896 г. уступіў у сацыял-дэмакратычную арганізацыю рабочага саюза Латвіі. У 1897 г. быў арыштаваны, у 1899 г. — высланы ва Уржум Вяцкай губ. У 1900–1901 гг. надрукаваў у "Олонецких губернских ведомостях" і газеце "Пермский край" звыш 50 нарысаў і фельетонаў, шэраг эканамічных, этнаграфічных і гістарычных нарысаў пра Карэлію. У 1902 г. арыштаваны за распаўсюджванне рэвалюцыйных выданняў, высланы ва Уфу, пасля ў Стэрлітамак. У 1903 г. эміграваў. У 1904 г. жыў у Лазане, дзе сустрэўся з У. Леніным, пасля ў Парыжы, дзе разам з А. Луначарскім працаваў наборшчыкам, столярам. У 1907 г. нелегальна вярнуўся ў Расію. З восені 1910 г. — адказны сакратар і выдавец газеты "Звезда" ("Невская звезда"). З 1912 г. працаваў у "Правде", выступаў з фельетонамі, апавяданнямі, памфлетамі. У яго шматлікіх сатырычных творах бачны традыцыі М. Салтыкова-Шчадрына. Выступаў з крытыкай дэкадэнцтва і натуралізму ў літаратуры. Удзельнік штурму Зімняга палаца і грамадзянскай вайны. У 1917 г. быў прызначаны рэдактарам газеты "Армия и флот рабочей и крестьянской Росии", у 1919 г. узначаліў Дзяржвыдат. З 1922 г. — рэдактар газеты "Рабочий", з 1929 г. — часопіса "Красная нива". Літаратурнай рабоце асаблівай увагі не надаваў, лічыў, што галоўнае — рэвалюцыйная дзейнасць. У 1900 г. напісаў аповесці "У лесе" і "На абозе" (выдадзены ў 1932 г.) — пра рускую Поўнач, прыроду і людзей Аланецкага краю. Аўтар мемуараў "Ленін і рабочы клас. Сустрэчы з Ільічом" (Л., 1924), "Полымя. Эцюды кастрычніцкіх дзён" (М., 1928). Незавершанымі засталіся гістарычныя раманы "Кандрацій Булавін", "Сцяпан Разін", "У агні вайны". Яму прысвечана манаграфія Р. Булацкага "Ерамееў — рэвалюцыянер, публіцыст" (Мн., 1976).

Алесь Карлюкевіч

Ермакоў Васіль

Ермакоў Васіль Пятровіч *(11.3.1845–16.3.1922), матэматык, прафесар Універсітэта Св. Уладзіміра ў Кіеве. Член-карэспандэнт Пецярбургскай акадэміі навук (1884).*

Нарадзіўся В. Ермакоў у в. Церуха каля Гомельскага пав., цяпер р-на ў сялянскай сям'і. Вучыўся ў Гомельскай гімназіі. У 1868 г. скончыў Універсітэт Св. Уладзіміра ў Кіеве і атрымаў ступень магістра матэматыкі (1873). У 1874 г. абраны дацэнтам чыстай матэматыкі Кіеўскага універсітэта. Пасля паспяховай абароны дысертацыі ў 1877 г., якая была прысвечана інтэграванню дыферэнцыйных ураўненняў механікі, атрымаў ступень доктара чыстай матэматыкі і быў прызначаны экстраардынарным прафесарам. З 1888 г. — ардынарны прафесар, з 1899 г. — ганаровы прафесар матэматыкі Кіеўскага універсітэта. З 1899 г. загадваў кафедрай вышэйшай матэматыкі Кіеўскага політэхнічнага інстытута.

Навуковыя даследаванні В. Ермакова прысвечаны тэорыі радоў, звычайным дыферэнцыйным ураўненням, ураўненням з прыватнымі вытворнымі, варыяцыйнаму вылічэнню, тэорыі спецыяльных функцый і алгебры. Адкрыў агульную прыкмету збежнасці радоў з неадмоўнымі неўзрастаючымі членамі, якая носіць яго імя і мае фундаментальнае значэнне для развіцця тэорыі радоў. Упершыню гэтая прыкмета была выкладзена на III з'ездзе рускіх прыродазнаўцаў і лекараў у 1871 г., які праходзіў у Кіеве, і была высока адзначана. Сёння агульная прыкмета В. Ермакова ўключана ў курсы па матэматычнаму аналізу.

В. Ермакоў даў больш просты ў параўнанні з Дырыхле доказ збежнасці рада Фур'е да разглядаемай функцыі. Прапанаваў метад касальных пераўтварэнняў пры звядзенні дыферэнцыйнага ўраўнення 1 парадку да функцыянальнага і незалежна ад С. Лі даў крытэрый інтэгруемасці ў квадратурах ураўнення 1 парадку. Развіў даследаванні С. Кавалеўскай пра ўмовы адназначнасці агульных інтэгралаў дыферэнцыйных ураўненняў. Правёў серыю работ па вырашэнню задачы пра рух двух і трох целаў.

Ім быў таксама прапанаваны метад будовы агульнага інтэграла ўраўнанняў вышэйшага парадку і са сталымі каэфіцыентамі, у якім прапанаваныя раней спосабы інтэгравання Кашы, Грына, Гельмгольца разглядаліся як прыватныя. Ён унёс уклад у распрацоўку тэорыі інтэгравання кананічных ураўнанняў і сумесных сістэм кананічных

ураўненняў. Увёў новыя паняцці — галоўная сістэма інтэгралаў першага парадку, агульны і асаблівы інтэграл, замкнёная і нармальная сістэмы ўраўнанняў. Атрымаў фундаментальныя вынікі па знаходжанню максімума і мінімума функцыі ў варыяцыйным вылічэнні, тэорыі спецыяльных функцый у алгебры. Вялікую ўвагу ўдзяляў методыцы выкладання матэматыкі.

В. Ермакоў — аўтар больш 150 навуковых прац. Асноўныя сярод іх: "Теория сходимости бесконечных строк и определенных интегралов" (Математический сборник. 1872. Т. 6. Вып. 1), "Интегрирование дифференциальных уравнений механики" (Университетские известия. 1877. № 2, 3, 4, "Нелинейные дифференциальные уравнения с частными производными первого порядка со многими переменными и канонические уравнения" (Университетские известия. 1884. № 1, 2, 3), "Вариационное исчисление в новом изложении" (Математический сборник. 1892. Т. 16. Вып. 2). Ёсць у яго спадчыне і манаграфія — "Теория Абелевых функций без римановых поверхностей" (Киев. 1902). Ён быў заснавальнікам, рэдактарам і выдаўцом аднаго з першых навуковых часопісаў па матэматыцы — "Журнала элементарной математики" (Кіеў, 1884–1886).

Вынікі навуковых даследаванняў В. Ермакова былі прызнаны навуковай супольнасцю. Ён першы матэматык–ураджэнец Беларусі, які стаў членам Пецярбургскай акадэміі навук (1884). Наш зямляк быў таксама абраны сапраўдным членам Маскоўскага матэматычнага таварыства (1874), ганаровым членам Харкаўскага матэматычнага таварыства. Быў адным з заснавальнікаў (1899) і ганаровым членам Кіеўскага фізіка-матэматычнага таварыства.

Вольга Гапоненка

Есьман Іосіф

Есьман Іосіф Гаўрылавіч *(1.12.1868, г. Вілейка Мінскай губ., цяпер раённы цэнтр Мінскай вобл. – 1.7.1955, г. Баку), вучоны ў галіне гідраўлікі, гідрамеханікі і гідраэнергетыкі. Акадэмік Акадэміі навук Азербайджана (1945), заслужаны дзеяч навук (1927), Герой Сацыялістычнай Працы (1932), доктар тэхнічных навук, прафесар.*

Нарадзіўся І. Есьман у сям'і ўрача. Пачатковую адукацыю атрымаў у Беларусі, вучыўся ў Мінскай гімназіі. У 1887 г. паступіў на механічнае адзяленне Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута, паспяхова закончыў яго ў 1892 г. Імя І. Есьмана як лепшага выпуска было занесена на мармуровую дошку Інстытута. У час канікул працаваў памочнікам машыніста на Мінскай чыгунцы, а ў 1900 г. паступіў на службу старшым інжынерам на Разанска-Уральскую чыгунку. З 1902 г. выкладаў у Пецярьбургскім політэхнічным інстытуце. Распрацаваў праграму і чытаў першы ў Расіі курс гідраўлікі і гідраўлічных рухавікоў з 1905 г. у Політэхнічным, з 1907 г. у Электратэхнічным інстытуце, а з 1910 г. у Інстытуце шляхоў зносін. Гэты курс І. Есьмана на гідраўліцы ўпершыню быў выдадзены ў 1906 г., а потым перавыдаваўся 10 разоў (апошняе выданне "Гідраўлікі" было ў 1955 г.). І. Есьман быў ініцыятарам стварэння і аўтарам праекта гідраўлічнай лабараторыі Пецярбургскага інстытута, арганізаванай у Інстытуце у 1905—1912 гг. У 1913 г. абараніў дысертацыю а атрымаў навуковую ступень адёюнкта па прыкладной матэматыцы. Абраны ў 1914 г. экстраардынарным, а ў 1915 г. ардынарным прафесарам Політэхнічнага інстытута. У лютым 1917 г. стаў дэканам механічнага факультэта гэтага інстытута. Унёс значны ўклад у стварэнне ў Азербайджане вышэйшай школы. Быў ініцыятарам і арганізатарам Уладыкаўказскага політэхнічнага інстытута, у 1919 г. абраны яго рэктарам. З 1922 г. І. Есьман прафесар , а з 1928 г. рэктар Азербайджанскага політэхнічнага інстытута (Баку), адначасова з 1932 г. дырэктар Энергетычнага інстытута Азербайджанскай АН. Працаваў і ў іншых вышэйшых навучальных установах краіны. У 1926 — 1929 гг. быў членам Дзяржаўнага савета і членам Калегіі Наркамасветы Азербайджанскай ССР.

Навуковыя даследаванні І. Есьмана прысвечаны гідраўліцы, гідрамеханіцы і гідраэнергетыцы. Вывучаў пытанні руху газаў у металургічных печах, пабудаваў тэорыю гэтага руху. Гэтыя даследаванні не згубілі сваёй актуальнасці і сёння, ляжаць у аснове разлікаў металургічных печаў па "формуле праф. Есьмана". Удзельнічаў у распрацоўцы праектаў новых водаправодаў у гарадах Расіі (Чэрыпавец, Омск, Сочы), сістэмы водаправода і каналізацыі ў Пецярбургу і яго ваколіцах. З 1910 г. удзельнічаў у рабоце Інстытута эксперыментальнай медыцыны (Пецярбург) па стварэнню гідраўлічнай тэорыі некаторых фізіялагічных працэсаў, у даследаваннях мікрабіялагічнага таварыства па стварэнню гідраўлічнай тэорыі з'яўлення жыцця ў клетках арганізмаў. Прымаў удзел у рабоце камісіі Пецярбургскай Акадэміі навук па вывучэнню вытворчых сіл Расіі, у складзе якой даследаваў пытанні выкарыстання чалавекам энергіі вады і сілы ветру. У 1916—1918 г. кіраваў гідратэхнічнымі работамі пры ўзвядзенні алюмініевых заводаў Чарнаморскага ўзбярэжжа, быў аўтарам праекта і адказным выканаўцам работ па будаўніцтву гідраэлектрычнай станцыі для алюмініевага завода ў Тыфлісе. Займаўся пытаннямі выкарыстання энергіі рэк Сібіры, Заходняй Дзвіны, Імарты, Ківача і інш. Быў навуковым кансультантам будаўніцтва буйнейшых ГЭС Закаўказзя. Прымаў удзел у распрацоўцы праекта Волга-Данскога канала.

І. Есьман стваральнік нафтавай гідраўлікі і арганізатар навукова-даследчых работ у гэтым кірунку. Стварыў і развіў навуковы накірунак па гідраўліцы вадкасць павышанай вязкасці. Прымаў удзел ва ўкараненні ў нафтаздабычу глыбокіх помпаў, ліфтаў і іншых падымальнікаў нафты. Прымаў актыўны ўдзел ў праектаванні нафтаправода Баку — Батумі і іншых аб'ектаў нафтавай прамысловасці. Выканаў фундаментальныя работы ў

галіне гідрамашынабудавання.. Прапанаваў тэорыю і правёў разлікі поршневых і цэнтрабежных помпаў, вадзяных турбін і турбабураў. Прымаў актыўны ўдзел у рабоце Рускага тэхнічнага таварыства, у 1923 – 1926 гг. быў старшынёй Бакінскага аддзялення таварыства. Супрацоўнічаў з выдавецтвам "Руская Энцыклапедыя", для якой падрыхтаваў многа энцыклапедычных артыкулаў, быў рэдактарам тэхнічнага аддзела выдання.

За ўклад ў развіццё гідраўлікі, гідрамеханікі і гідраэнергетыкі ў Расіі і СССР, стварэнне навуковай школы І. Есьман узнагароджаны Ордэнам Леніна, Ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалямі. Імя І. Есьмана прысвоена Энергетычнаму інстытуту Азербайджанскай Акадэміі навук.

Вольга Гапоненка

Жалтоўскі Іван

Жалтоўскі Іван Уладзіслававіч *[15(27).11.1867, Пінск Мінскай губ., цяпер Брэсцкай вобл. — 16.7.1957, Масква], беларускі і рускі архітэктар, педагог. Ганаровы член АН БССР (1947), акадэмік архітэктуры (1909), акадэмік Акадэміі архітэктуры СССР (1939–1956), Акадэміі будаўніцтва і архітэктуры СССР (1956). Заслужаны дзеяч навукі і мастацтва РСФСР (1932), заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1944).*

І. Жалтоўскі вучыўся ў Акадэміі мастацтваў у Пецярбургу (1887–1898). Выкладаў у вышэйшых мастацкіх навуковых установах Масквы. У 1953–1959 гг. узначальваў архітэктурную майстэрню-школу ў Інстытуце "Маспраект".

У ранніх работах І. Жалтоўскі выкарыстоўваў кампазіцыйныя прыёмы і архітэктурныя матывы эпохі Адраджэння (дом былога Скакавога таварыства на Скакавой алеі, 1903–1905; былы маёнтак А. Тарасава на вул. А. Талстога, 1909–1910; абодва — у Маскве). У 1918–1923 гг. удзельнічаў у складанні плана рэканструкцыі Масквы, быў аўтарам генплана і шэрагу павільёнаў Усерасійскай сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай выстаўкі ў Маскве (1923), павільёна СССР на Міжнароднай выстаўцы ў Мілане (1925–1926). Выкарыстоўваў формы класічнай архітэктуры: у Маскве — рэканструкцыя будынка Дзяржбанка СССР (1927–1929), дамы на Ленінскім праспекце (1949, Дзяржаўная прэмія СССР, 1950), Смаленскай плошчы (1950), праспекце Міру (1957), іпадром (1951–1955); будынкі Дома ўрада ў Махачкале (1927–1928), былога гаркама КПСС у Сочы (1934–1936) і інш. Пад яго кіраўніцтвам створаны праект галоўнай плошчы і драматычнага тэатра ў Гомелі (1941), распрацаваў план аднаўлення і рэканструкцыі гэтага горада (1946). Аўтар работ па тэорыі і практыцы архітэктуры. Пераклаў на рускую мову трактат італьянскага архітэктара А. Паладзіо (1938).

Узнагароджаны ордэнам Леніна, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Яму прысвечана альбомнае выданне "І. У. Жалтоўскі" (М., 1955).

Ірына Тамільчык

Жамойцін Янка

Жамойцін Янка (Ян) *(28.1.1922, в. Клімавічы Лідскага пав. Навагрудскага ваяв., цяпер Лідскі р-н Гродзенскай вобл.), літаратурны крытык, публіцыст, дзеяч беларускай дыяспары ў Польшчы.*

У 1929–1936 гг. Я. Жамойцін вучыўся ў польскіх школах у Скрыбаве і Шчучыне, у 1936–1939 гг. — у гімназіі ў Варшаве, у 1939–1941 гг. — у сярэдняй школе ў Лідзе. Атэстат сталасці атрымаў у беларускай школе ў Навагрудку ў 1943 г. У 1949 г. скончыў Прафесіянальны інстытут права і адміністрацыі ў Жэшаве (Польшча) і Варшаўскі універсітэт, дзе атрымаў дыплом магістра адміністрацыі (1979).

У 1943 г. Я. Жамойцін быў накіраваны падпольным кіраўніцтвам Беларускай незалежніцкай партыі ў Саюз беларускай моладзі з мэтай пашырэння нацыянальнай свядомасці, беларускай культуры і ідэі незалежнасці сярод моладзі. Працаваў на кіраўнічых пасадах ва ўстановах апекі ў 1943–1945 гг. У лістападзе 1945 г. арыштаваны органамі МГБ, а затым вызвалены польскімі ўладамі. У снежні 1949 г. арыштаваны паўторна і асуджаны ў 1950 г. у Мінску на 25 год працоўна-папраўчых лагераў. У жніўні 1956 г. быў вызвалены з адменай прысуду і ў студзені 1957 г. вярнуўся ў Варшаву. Адразу па вяртанню пачаў супрацоўнічаць з Беларускім грамадска-культурным таварыствам, а з 1962 г. — з літаратурным аб'яднаннем "Белавежа".

Я. Жамойцін публікаваўся ў тыднёвіку "Ніва", "Беларускіх календарах", "Czasopis", а з 1986 г. і ў перыёдыцы беларускага далёкага замежжа. Пісаў рэцэнзіі, крытычныя артыкулы на творы аўтараў "Белавежы", эсэ, рэпартажы, паведамленні на тэмы грамадскага жыцця. Асноўныя публікацыі Я. Жамойціна — "Белавежа 1980" (крытычны агляд) "Разважанні — бездарожжамі беларускай культуры да літаратурнага аб'яднання "Белавежа" (эсэ), "Вацлаў Ластоўскі ў люстры гісторыі" (крытычны агляд кніжкі Ю. Туронка), "Няздзейсненыя пошукі" — па слядах "Іліяды" Гамера (у перакладзе), "Пра Уладзіміра Самойлу" — рэцэнзія на працу А. Бергман, "Аповяд пра беларускую школу" (на кнігу Я. Максімюка), "Разбуральныя сілы жыццёвых хваляў" (на ўспаміны В. Ярмалковіча), "Полымя сэрцаў і свежасць думкі" (на тэму студэнцкай перыёдыкі), "Бела-чырвона-белы сцяг у

краявідзе Варшавы" (эсэ), "Саюз беларускай моладзі", "Беларусь — скрыжаванне чужых інтарэсаў", "З перажытага" (мемуары), аб'яднаны ў кнізе "Лёс аднаго пакалення" (Беласток, 1996).

Ала Такінданг

Жарабцова-Андрэева Ганна

Жарабцова-Андрэева Ганна Рыгораўна *(13(25).9.1868, па некаторых крыніцах 1870, 1872), Гродна – 1944 (па некаторых крыніцах 1945), Рыга), камерная спявачка, педагог, прафесар.*

Адукацыю Г. Жрабцова-Андрэева атрымала ў Пецярбургскім Кацярынінскім інстытуце. У 1887–1892 гг. навучалася спевам у Пецярбургскай кансерваторыі (клас Н. Ірэцкай). У 1891 г. дэбютавала ў кансерваторскім канцэрце, арганізаваным А. Рубінштэйнам. Пасля заканчэння кансерваторыі была запрошана ў Прагу, дзе прыняла ўдзел у прем'еры оперы А. Рубінштэйна "Маісей" (22 чэрвеня 1892 г.). Затым на працягу двух гадоў выступала з канцэртамі ў гарадах Германіі (Берлін, Кёнігсберг, Дрэздэн, Гамбург, Лейпцыг, партыя фартэпіяна — А. Рубінштэйн). Пазней гастралявала ў Амстэрдаме, Бруселі, Лондане, дзе давала сольныя канцэрты і прымала ўдзел у сімфанічных вечарах. Вярнуўшыся ў Расію, вяла актыўную канцэртную дзейнасць, выступала ў Пецярбургу, Маскве, Кіеве, Адэсе, Ніжнім Ноўгарадзе, Гродне, іншых гарадах. Г. Жарабцова-Андрэева — першая выканаўца многіх рамансаў С. Рахманінава, С. Пракоф'ева, А. Глазунова, І. Стравінскага, А. Арэнскага. Ёй прысвяцілі свае рамансы Н. Рымскі-Корсакаў (сярод іх — "Ангел"), А. Арэнскі ("Паэзія"), А. Рубінштэйн ("Wo?"). У 1907–1922 гг. выкладала сольныя спевы ў Пецярбургскай кансерваторыі (з 1913 г. — прафесар). У 1922 г. эмігравала з Расіі. Апошнія гады жыцця правяла ў Рызе, дзе давала прыватныя ўрокі спеваў. Пра Г. Жарабцову-Андрэеву ёсць звесткі ў кнізе "Ленінградская кансерваторыя ва ўспамінах. 1862–1962" (Л., 1962).

Алесь Карлюкевіч

Жыбрык Ніна

Жыбрык (дзявоч. Умецкая) Ніна Іосіфаўна *(21.3.1933, хутар бліз в. Малыя Навасёлкі Дзяржынскага р-на Мінскай вобл.) паэтэса, член Саюза пісьменнікаў СССР (1983), грамадскі дзеяч.*

Н. Жыбрык нарадзілася ў сялянскай сям'і. Ад бацькі атрымала ў спадчыну творчую здольнасць мастака, глыбокую цікавасць да прыроды, ад маці — сялянскую працавітасць і лагоднасць, любоў да кніг. Бацькі былі першымі выкладчыкамі, а поле, лес, луг, сярод якіх яна расла, — першымі "універсітэтамі". Вучыцца ў школе пачала з другога класа ў 1945 г., калі адчыніла дзверы сямігадовая школа ў в. Вялікія Навасёлкі. Закончыўшы Дзяржынскую дзесяцігодку, паступіла на біялагічны факультэт БДУ. У 1956 г. вучобу давялося перапыніць. З мужам, які быў накіраваны "на ўздым народнай гаспадаркі", пераехала на сталае жыццё у Марыйскую АССР. Спыніліся ў г. Волжску, дзе працавала лабарантам на лесазаводзе "Заря", а пасля заканчэння цэлюлозна-папяровага тэхнікума — тэхнолагам Марыйскага філіяла Ленінградскага навукова-даследчага інстытута паперы. З 1972 да 1978 г. была карэктарам рабочай газеты "Волжская правда", затым літаратурным супрацоўнікам завадской шматтыражкі "Марийский бумажник".

У 1978 г. сям'я пераехала ў невялікі пасёлак Мачалішчы. Яго з усіх бакоў абступаў лес, акружала нечапаная прырода. Яна аказалася ў той стыхіі, жыватворным асяроддзі, якое нагадвала родныя мясціны, давала сілы для ажыццяўлення новых творчых задум. На новым месцы працавала мастаком-надомніцай вытворчага аб'яднання "Пёлек" ("Падарунак"), бібліятэкарам, займалася грамадскай дзейнасцю, жывапісам, папаўняла экспанатамі хатні музей. Цяпер знаходзіцца на пенсіі.

Пісаць вершы Н. Жыбрык пачала ў чатырнаццаць гадоў. Паперы не хапала, і ў ход ішло ўсё, што было пад рукамі: мешкавіна, старыя шпалеры і нават запацелыя шыбіны вакон. Паэтычны дэбют адбыўся ў 1956 г., калі раённая газета "Ленинская правда" змясціла верш "Весна пришла" (на рускай мове). У Рэспубліцы Марый Эл вершы перыядычна змяшчаліся ў газетах "Волжская правда", "Молодой коммунист", "Ончыко" ("Уперад"), "Передовик"; выйшлі зборнікі "Будем знакомы" (1961), "К вам идут" (1965), "Радуга" (1967), "Откровение" (1970), "Теплые ладони подорожника" (1975), "Танец сыроежек" (1978), у якіх значнае месца займаюць беларускія матывы. Вершы Н. Жыбрык пра вечныя каштоўнасці — каханне, вернасць, дружбу, прыгажосць прыроды, нашу суровую надзённасць — прыцягваюць увагу як крытыкаў літаратуры, так і аматараў паэзіі. Член Саюза пісьменнікаў СССР (1983).

Н. Жыбрык вядома ў Рэспубліцы Марый Эл і за яе межамі як народная мастачка. З адыходаў драўніны, адмысловых карэнняў яна стварыла хатні музей высокамастацкіх вырабаў, сярод якіх "Звон Хатыні", "Боль Чарнобыля", "Паэт", "Дзеці" і інш. Значная частка калекцыі неаднаразова экспанавалася на персанальных выстаўках у краязнаўчым музеі г. Йашкар-Алы, Звянігаўскім раённым доме народнага мастацтва і двойчы ў Маскве. Частка калекцыі падаравана Карабелякскаму дзіцячаму дому. Сваё майстэрства яна ахвотна перадае не

толькі вучням мясцовай сярэдняй школы, але і настаўнікам вытворчай працы розных школ рэспублікі. Дом Н. Жыбрык з'яўляецца творчай майстэрняй, якая адкрыта для ўсіх жадаючых.

Свае рознабаковыя здольнасці Н. Жыбрык паспяхова спалучае з фітатэрапіяй. З ранняй вясны да позняй восені яна збірае лекавыя травы, вырошчвае іх на прысядзібным участку. Ёю сабрана і складзена больш за дзве тысячы рэцэптаў народнай медыцыны, якія паспяхова выкарыстоўваюцца ў штодзённай практыцы. Зборнік гэтых рэцэптаў можа прынесці вялікую карысць людзям, калі будуць знойдзены сродкі на яго выданне.

Вера Новік (Йашкар-Ала, Марый Эл)

Жэлігоўскі Люцыян

***Жэлігоўскі Люцыян** (17.10.1865, Нясвіж Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер раённы цэнтр Мінскай вобл. — 9.7.1947), генерал-палкоўнік Войска Польскага, дзяржаўны дзеяч.*

Л. Жэлігоўскі паходзіў са шляхецкай сям'і. Бацька яго быў удзельнікам паўстання 1863 г. З 1885 г. Л. Жэлігоўскі служыў у расійскай арміі, прымаў удзел у руска-японскай вайне 1904–1905 гг. У час Першай сусветнай вайны быў камандзірам пяхотнага палка ў чыне палкоўніка. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі — адзін з арганізатараў польскай арміі на тэрыторыі Расіі, стварaў польскія атрады на Кубані. У 1919 г. праз Адэсу і Бесарабію вярнуўся ў Польшчу на чале 4 стралковай дывізіі. У чэрвені 1919 г., атрымаўшы чын генерала, камандаваў спачатку 10 дывізіяй пяхоты (перайменаванай з 4 DS, потым — аператыўнай групай, якая дзейнічала ў 1919–1920 гг. у раёне Мінска. У кастрычніку 1920 г. на чале Літоўска-беларускай дывізіі па загаду Ю. Пілсудскага заняў Вільню і стварыў т. зв. "Цэнтральную Літву", далучаную пасля да Польшчы.

У 1921–1925 гг. Л. Жэлігоўскі быў інспектарам інспектарата арміі № 2. У 1923 г. атрымаў званне генерал-палкоўніка. У 1925 г. па прапанове Ю. Пілсудскага стаў міністрам абароны Польшчы. Выконваючы гэтыя функцыі, дамагаўся вяртання Ю. Пілсудскага да актыўнага палітычнага жыцця. Менавіта яму прыпісваюць падрыхтоўку ваеннага пераварота, зробленага Ю. Пілсудскім 12–15 мая 1926 г. У 1927 г. пайшоў у адстаўку і жыў у сваёй сядзібе на Віленшчыне. У 1935 г. быў абраны дэпутатам сейма IV склікання, стаў у ім старшынёй вайсковай камісіі. Але выступіў супраць фракцыі Нацыянальнага аб'яднання і супраць цыркуляра прэм'ера аб выключным статусе генерала Э. Рыдз-Сміглага і ў выніку спрэчак быў пазбаўлены пасады старшыні камісіі. У верасні 1939 г. у цывільным стане дапамагаў камандуючаму Паўднёвым фронтам генералу К. Сасноўскаму. Потым пераехаў у Францыю, а пасля яе акупацыі — у Вялікабрытанію, дзе стаў сябрам Нацыянальнай Рады Рэчы Паспалітай і дзеячам славянафілаў. Пасля вайны пасяліўся ў Лондане, рабіў захады па вяртанню польскіх салдат на радзіму. У Польшчы была выдадзена яго кніга "вайна 1920 года: успаміны і разважанні" (1930).

За сваю дзейнасць Л. Жэлігоўскі быў адзначаны шматлікімі ўзнагародамі, у т. л. ордэнам Віртуці Мілітары II і V ступеняў, ордэнам Адраджэння Польшчы II ступені, 4 разы — Крыжам адважных і інш.

Алена Русаковіч

Забара Натан

***Забара Натан** (1908, Рагачоў Магілёўскай губ., цяпер Гомельскай вобл. – 1975, Кіеў), яўрэйскі раманіст, драматург.*

Н. Забара ў 20-х гг. вучыўся ў Інстытуце яўрэйскай культуры пры Украінскай АН. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў на фронце. У пасляваенны час служыў карэспандэнтам у Германіі. У 1950–1956 гг. знаходзіўся ў турме і ў лагеры для зняволеных на Калыме. Выйшаўшы з заключэння, нелегальна выкладаў у Кіеве іўрыт.

Друкавацца Н. Забара пачаў з 1939 г. Аўтар "Радыёрамана" (1932), кнігі нарысаў "Людзі і часы" (1938), рамана "Сёння нараджаецца свет" (1965), рамана-хронікі "Звычайная мама" (1967) і інш. У 1970–1975 гг. у часопісе "Савеціш Гэймланд" былі надрукаваны тры часткі незакончанага гістарычнага рамана Н. Забары "Усё паўтараецца", дзе аўтар паказвае жыццё яўрэйства ў XIII–XIV стст.

Браніслава Котава

Закараўскас Юозас

***Закараўскас Юозас** (21.11.1904, в. Малькоўка Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер вобл. — 22.8. 1975, Вільнюс), педагог. Заслужаны настаўнік Літоўскай ССР (1958).*

Ю. Закараўскас у 1934 г. скончыў Камуністычны універсітэт нацыянальных меншасцей Захаду ў Маскве. У 1934–1936 гг. працаваў інспектарам упраўлення Народнага камісарыята асветы БССР, у 1936–1939 гг. — дырэктарам і настаўнікам літоўскіх школ у Беларусі. З 1939 да 1940 г. служыў у Чырвонай Арміі. У ліпені —

жніўні 1940 г. — палітрук генеральнага штаба Літоўскай народнай арміі, а з верасня 1940 г. — начальнік палітаддзела 179 дывізіі 29 тэрытарыяльнага корпуса Чырвонай Арміі у Вільнюсе. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у баях. У 1941–1945 гг. знаходзіўся ў нямецкім палоне, пасля вызвалення зноў служыў у Чырвонай Арміі. З 1946 да 1970 г. — інспектар школьнага ўпраўлення Міністэрства асветы Літоўскай ССР.

Яніна Кісялёва

Залескі Уладзімір

Залескі Уладзімір Мацвеевіч *(1938, в. Бабынічы Полацкага р-на Віцебскай вобл.), вядучы інжынер-тэхнолаг.*

У. Залескі нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння сярэдняй школы служыў у арміі (1957–1960). Вучыўся ў Ленінградскім тэхналагічным інстытуце. У 1965 г. быў накіраваны ў Асобае канструктарскае бюро №1 (цяпер Ракетна-касмічная карпарацыя "Энергія" імя С. П. Каралёва), якое займалася стварэннем ракетна-касмічнай тэхнікі. Да сённяшняга дня працуе на гэтым прадпрыемстве, дзе займаецца праблемамі стварэння цеплаізаляцыйных і цеплаахоўных матэрыялаў. Мае дачыненне да стварэння лятальных апаратаў "Саюз", "Буран", "Прагрэс", касмічных станцый "Метэор" і "Альфа". Аўтар 7 вынаходніцтваў у касмічнай тэхніцы.

Аляксей Кажамяка (в. Пенькаўка Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.)

Замыслоўскі Ягор

Замыслоўскі Ягор Ягоравіч *(6(18).6.1841, г. Гродна – 9(21).5.1896, г. Пецярбург), гісторык, археограф, педагог, прафесар Пецярбургскага універсітэта. Член-карэспандэнт Пецярбургскай акадэміі навук (1888).*

Нарадзіўся Я. Замыслоўскі ў сям'і чыноўніка. Скончыў 2-ю гімназію ў Пецярбургу. Вышэйшую адукацыю атрымаў ў Пецярбургскім універсітэце — у 1862 г. скончыў яго гісторыка-філалагічны факультэт са ступенню кандыдата навук. Працаваў настаўнікам у навучальных установах Пецярбурга. З 1864 г. выкладаў геаграфію ў Паўлаўскім жаночым інстытуце, Доме выхавання бедных дзяцей, іншых навучальных установах. У 1868–1871 гг. быў выкладчыкам гісторыі ў Імператарскім Аляксандраўскім ліцэі. З 1869 г. адначасова — выкладчык Гісторыка-філалагічнага інстытута.

У 1871 г. Я. Замыслоўскі абараніў дысертацыю "Царстваванне Фёдара Аляксеевіча" на ступень магістра рускай гісторыі. У тым жа годзе быў камандзіраваны Археаграфічнай камісіяй у навуковую камандзіроўку за мяжу на 2,5 месяцы. У 1878 г., пасля аднаўлення работы Археалагічнага інстытута, быў запрошаны на пасаду загадчыка кафедры гістарычнай геаграфіі. У 1884 г. абараніў дысертацыю "Герберштэйн і яго гісторыка-геаграфічныя паведамленні аб Расіі", атрымаў ступень доктара рускай гісторыі і быў зацверджаны экстраардынарным прафесарам, а праз некалькі месяцаў — ардынарным прафесарам Пецярбургскага універсітэта. Чытаў у ім лекцыі па гісторыі Расіі XVIII ст., помніках старажытнага рускага права, гістарыяграфіі і гістарычнай геаграфіі. У 1880–1889 г. выкладаў рускую і ўсеагульную гісторыю членам царскай сям'і — князю Георгію Аляксандравічу і будучаму цару Мікалаю Аляксандравічу, для чаго быў запрошаны ў Бозу (Італія). У 1890 г. з-за хваробы пакінуў працу ва універсітэце і Гісторыка-філалагічным інстытуце.

Навуковыя даследаванні Я. Замыслоўскага прысвечаны гісторыі, гістарыяграфіі і археаграфіі Расіі XVI–XVII стст. Сярод асноўных навуковых прац вучонага — артыкулы ў часопісе Міністэрства народнай асветы. Уваходзіў у склад Камісіі па выданні дакументаў Пятра I (1872). Прымаў удзел у рабоце III і IV археалагічных з'ездаў у 1874 і 1877 гг.

Я. Замыслоўскі быў членам многіх навуковых таварыстваў, у т. л. Імператарскага Геаграфічнага таварыства (з 1867), Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі (з 1879), Імператарскага Рускага археалагічнага таварыства (з 1881). За педагагічную дзейнасць узнагароджаны ордэнам св. Станіслава I ст. (1887), за ўкладанне пад яго кіраўніцтвам кнігі "Гісторыя расійскіх ордэнаў" — св. Анны I ст. (1892).

Вольга Гапоненка

Зарэцкі Айзік

Зарэцкі Айзік *(1891, Пінск – 1956, Масква), лінгвіст, прафесар.*

А. Зарэцкі нарадзіўся ў яўрэйскай сям'і. Вучыўся ў хедэры, а пасля ў рэальным вучылішчы. У 1913 г. паступіў на матэматычны факультэт Юр'еўскага (цяпер Тартускага) універсітэта. У 1918 г. у Самары ўступіў у Бунд, а ў 1919 г. — у РКП(б). Потым беспартыйны. Будучы членам Маскоўскай і Харкаўскай філалагічных камісій, актыўна займаўся арфаграфічнай рэформай ідыш. На ідыш распрацаваў тэрміналогію элементарнай

матэматыкі. У 1924–1940 гг. працаваў на філалагічных кафедрах яўрэйскіх навуковых цэнтраў Масквы і Мінска. Пасля Вялікай Айчыннай вайны жыў у Курску.

А. Зарэцкі — аўтар звыш 300 кніг і артыкулаў па сінтаксісу, арфаграфіі і методыцы выкладання ідыш. Яго кніга "Ідышэ граматык" неаднаразова выдавалася некалькі разоў. Працы А. Зарэцкага па яўрэйскаму фальклору засталіся ў рукапісах.

Браніслава Котава

Зенюк Янка

***Зенюк Янка** (28.5.1934, в. Рэніска Гайнаўскага пав. Беластоцкага ваяв., Польшча), доктар педагагічных навук, беларускі грамадскі дзеяч у Польшчы.*

Я. Зенюк закончыў сярэднюю школу ў Лодзі. Вучыўся ў Варшаўскім універсітэце, дзе атрымаў званне магістра педагогікі. Абараніў доктарскую дысертацыю у Інстытуце педагагічных даследаванняў (Варшава). Працаваў настаўнікам у пачатковых школах. Пасля заканчэння вайсковай службы быў загадчыкам аддзела ў ваяводскім праўленні Саюза сацыялістычнай моладзі, займаўся школьнымі і студэнцкімі справамі. З 1969 г. жыццё Я. Зенюка звязана з Галоўным праўленнем Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Беластоку — быў там вызваленым сакратаром, членам прэзідыума. Да сённяшняга дня з'яўляецца членам ГП БГКТ і старшынёй Клуба беларускай інтэлігенцыі ў Беластоку. Працаваў у Хрысціянскай акадэміі і Праваслаўнай духоўнай семінарыі ў Варшаве. З'яўляецца намеснікам старшыні Галоўнага праўлення Праваслаўнага брацтва свсв. Кірыла і Мяфодзія. Надае вялікую ўвагу вывучэнню Закона Божага ў школах. У 1998 г., згодна з воляй Сабора епіскапаў Праваслаўнай царквы ў Польшчы, з'яўляецца каардынатарам удасканалення настаўнікаў у выкладанні праваслаўнай рэлігіі ў школе пры мітрапаліце (Варшава). Удзельнічаў у рабоце Грамадскага камітэта пабудовы Музея беларускай культуры і мастацтва ў Гайнаўцы. З 1999 г. выконвае абавязкі дырэктара Педагагічнай ваяводскай бібліятэкі і курсаў удасканалення настаўнікаў у Беластоку.

Я. Зенюк займаецца культурна-грамадскай дзейнасцю. Вывучае гісторыю, культуру, этнаграфію, фальклор, рэлігію, мову беларускага народа, выступае з адпаведнымі артыкуламі ў друку, спрыяе абуджэнню нацыянальнай свядомасці этнічных беларусаў на Беласточчыне.

Ірына Тамільчык

Зялёнка Станіслаў

***Зялёнка Станіслаў Станіслававіч** (1.5.1959, в. Панкраты Вілейскага р-на Мінскай вобл.), мастак, паэт, дзеяч беларускай дыяспары ў Літве.*

С. Зялёнка нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння ў 1976 г. Крывіцкай сярэдняй школы паступіў у Мінскі электратэхнічны тэхнікум сувязі. З 1977 да 1979 г. служыў у арміі. Тэхнікум скончыў у 1981 г. і быў накіраваны ў Вільнюс, у Тэхнічны вузел саюзных магістральных сувязей і тэлебачання. У 1990 г. скончыў Вільнюскую вячэрнюю мастацкую школу і паступіў на завочнае аддзяленне Беларускай акадэміі мастацтваў.

С. Зялёнка – бадай што самы папулярны вільнюскі беларускі мастак, асоба амаль легендарная. Апрача жывапісу вядомы сваімі вотракрытычнымі вершамі. Нягледзячы на тое, што малюе ў асноўным краявіды, абапіраецца, як правіла, на сваю фантазію. Аматарам мастацтва ў Вільнюсе вядомы яго графічныя работы з відамі Вільнюса, а таксама касмічныя фантазіі. Ён добры партрэтыст і аўтар кніжных ілюстрацый. З 1989 г. пастаянна бярэ ўдзел у выстаўках — як агульных, так і персанальных. Яго працы знаходзяцца ў прыватных зборах Польшчы, Германіі, ЗША, Францыі, Іспаніі, Расіі, Ізраіля, Аўстраліі, Швецыі, Нарвегіі і інш. краін. З 1996 г. з'яўляецца членам Саюза народных мастакоў Літвы.

Вершы пачаў пісаць у 1995 г. Зараз рыхтуецца да друку яго зборнік.

Бярэ актыўны ўдзел у грамадскім і культурным жыцці беларусаў Літвы. Узнагароджаны медалём Літоўскай Рэспублікі "У памяць аб 13 студзеня".

Валянцін Нідзянскі (Вільнюс)

Зяльдовіч Якаў

Зяльдовіч Якаў Барысавіч *(8.3.1914, Мінск – 2.12.1987), фізік, прафесар. Акадэмік АН СССР (1958, член-карэспандэнт з 1946), тройчы Герой Сацыялістычнай Працы (1949, 1953, 1956), лаўрэат Ленінскай (1957) і чатырох Дзяржаўных прэмій СССР (1943, 1949, 1951, 1953).*

Нарадзіўся Я. Зяльдовіч у сям'і служачага. Скончыў у 1931 г. фізічны факультэт Маскоўскага універсітэта. У 1931–1963 гг. працаваў у Інстытуце хімічнай фізікі АН СССР. З 1964 г. — у Інстытуце матэматыкі АН СССР. З 1966 г. адначасова — прафесар Маскоўскага універсітэта.

Навуковыя даследаванні Я. Зяльдовіча прысвечаны хімічнай фізіцы, тэорыі гарэння, фізіцы ўдарных хваляў і дэтанацыі, фізічнай хіміі, фізіцы ядра і элементарных часцінак, астрафізіцы і касмалогіі. Ён з'яўляецца адным з заснавальнікаў макраскапічнай кінетыкі. У тэорыі гарэння выявіў сувязь паміж хуткасцю распаўсюджання полымя і кінетыкай хімічных рэакцый у ім, рашыў задачу падпалу сумесі напаленай паверхняй, вызначэння фронту распаўсюджання полымя. Стварыў фізічныя асновы ўнутранай балістыкі ракетных парахавых рухавікоў. У тэорыі дэтанацыі абгрунтаваў гіпотэзу Чэмплена–Шуге, упершыню растлумачыў з'яву ліміту дэтанацыі, прапанаваў рашэнне задачы ўдару з вялікай хуткасцю на паверхні асяроддзя. Прапанаваў (1939–1940 гг., сумесна з Ю. Харытонам) разлік ядзернага ланцуговага працэсу ва ўране, даследаваў эфект адыходу нейтронаў за парог дзялення з-за рассейвання, развіў тэорыю гамагеннага рэактара па цеплавых нейтронах і тэорыю рэзананснага паглынання нейтронаў ядрамі урана-238, даследаваў кінетыку рэактара і паказаў прынцыповую ролю спазняючыхся нейтронаў для рэгулявання яго работы. Будучы вучнем І. Курчатава, праводзіў навуковыя даследаванні пад яго кіраўніцтвам, у т. л. прымаў актыўны ўдзел у вырашэнні праблем, звязаных з выкарыстаннем ядзернай энергіі. Прадказаў магчымасць утрымання ультрахалодных нейтронаў у посудзе з адбіваючымі сценкамі, мюённы каталіз (1953) і распрацаваў яго тэорыю. Указаў на магчымасць існавання ядраў з вялікім лішкам нейтронаў. Увёў паняцце лентачных зарадаў (1952–1953), прадказаў бэта-расклад зараджаных піёнаў (1954) і з'яву захавання вектарнага току (1954 г., сумесна з С. Гернштэйнам). Прадказаў існаванне новых электрамагнітных характарыстык часціц, якія ўзнікаюць пры парушэнні цотнасці, і ўпершыню (1958–1960) звярнуў увагу на існаванне зарадавага форм-фактара нейтрына і парушэнне цотнасці стану атама за кошт слабага ўзаемадзеяння электрона з ядром. У 1958 г. прапанаваў метад выяўлення часціц з кароткім часам жыцця шляхам вымярэння размеркавання колькасці падзелу па эфектыўнай масе прадуктаў распаду. Гэты метад стаў адным з асноўных пры пошуку і вывучэнні рэзанансаў. З пачатку 60-х гг. навуковыя даследаванні Я. Зяльдовіча былі сканцэнтраваны, галоўным чынам, у галіне астрафізікі і касмалогіі. Ім была распрацавана тэорыя будовы звышцяжкіх цел з масай ад соцень тысяч да мільярдаў мас Сонца, дадзена завершаная якасная карціна апошніх этапаў эвалюцыі звычайных зорак рознай масы, уласцівасцей т. зв. "чорных дзірак". Фундаментальныя вынікі атрыманы Я. Зяльдовічам у тэорыі працэсаў "гарачага" Сусвету. Ён пабудаваў тэорыю ўзаемадзеяння гарачай плазмы Сусвету, які пашыраецца, і выпраменьвання, разгледзеў працэсы скажэння спектра рэліктавага выпраменьвання і ўзнікнення дробнамаштабных флуктацый інтэнсіўнасці выпраменьвання, развіў тэорыю росту адхіленняў у "гарачым" Сусвеце. Даследаваў апошнюю стадыю фарміравання галактык. Я. Зяльдовіч з'яўляецца стваральнікам школы рэлятывісцкай астрафізікі.

Навуковыя даследаванні вучонага адзначаны шматлікімі дзяржаўнымі ўзнагародамі, у тым ліку залатым медалём І. Курчатава (1974). Сапраўдны член многіх замежных акадэмій навук.

Вольга Гапоненка

Зямкевіч Рамуальд

Зямкевіч Рамуальд Аляксандравіч *(псеўд. Юры Алелькавіч, С. Барывой, Р. Суніца; крыпт. Р. Зем., Ром. Зем., Р-н Сун., Р. С-ца; 7.2.1881, Варшава – 1943 ці 1944, Асвенцім (?), Польшча), беларускі і польскі бібліяфіл, бібліёграф, гісторык літаратуры, публіцыст, перакладчык.*

Біяграфія Р. Зямкевіча высветлена недастаткова. Вядома, што яго бацька быў загадчыкам друкарні ў Варшаве, паходзіў са Случчыны. Сам ён па прафесіі інжынер-механік (вучыўся ў Кіеве). Па натуры страсны калекцыянер, шмат сіл і сродкаў аддаваў збіранню матэрыялаў па гісторыі беларускай літаратуры і культуры. Жыццё яго звязана з беларускім нацыянальна-культурным рухам. Пісаў на беларускай і польскай мовах.

З 1910 г. Р. Зямкевіч друкаваўся ў "Нашай ніве" і іншых беларускіх выданнях. Жыў пераважна ў Варшаве, дзе супрацоўнічаў з вядомымі беларусазнаўцамі Я. Карскім, М. Федароўскім. Пазней Р. Зямкевіч памог варшаўскаму славісту Ю. Галомбэку ў працы над манаграфіяй пра В. Дуніна-Марцінкевіча. Часта выязджаў з Варшавы ў Вільню — адзін з галоўных тагачасных асяродкаў беларускага культурнага руху. У 1908 г. рабіў фальклорна-этнаграфічныя запісы на Барысаўшчыне, дзе пасябраваў з пісьменнікам-нашаніўцам Я. Шпэтам. Вядомы яго паездкі ў Львоў і Раперсвіль (Швейцарыя), дзе былі багатыя архівы. У 1913–1914 гг. у пошуках гісторыка-літаратурных матэрыялаў і звестак аб'ехаў многія мясціны Магілёўшчыны. У 1915–1919 гг. жыў у

Мінску, працаваў вайсковым інжынерам. Актыўна ўдзельнічаў у з'ездзе беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25–27 сакавіка 1917 г. Сабраў унікальную бібліятэку, калекцыі рукапісаў і беларускага адзення. Збіральніцтвам займалася таксама жонка Р. Зямкевіча, журналістка і мастачка Л. Дунін-Баркоўская (1882–1919), якая перахоўвала архіў БСГ. Паводле звестак польскага гісторыка Э. Хвалевіка, большая частка пазнейшай бібліятэкі Р. Зямкевіча ў Варшаве (вул. Хмельна, 68) была прысвечана гісторыі, літаратуры, мовазнаўству і фальклору Беларусі, Літвы, Украіны і славянства наогул. У яго быў выдатны збор беларускіх, украінскіх, польскіх, літоўскіх старадрукаў, у тым ліку Біблія Ф. Скарыны, Астрожская біблія, слоўнік П. Бярынды, першыя выданні твораў Я. Каханоўскага і г. д., меў таксама аўтографы А. Рыпінскага, А. Вярыгі-Дарэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Лучыны, Ф. Багушэвіча, М. Багдановіча і інш., татарскія рукапісы XVI—XVII стст., пісаныя арабскімі літарамі па-беларуску, шматлікія кнігі па бібліяграфіі і бібліяфільству і г. д. На падставе сабраных калекцый напісаў шэраг прац па беларускай бібліяграфіі і гісторыі беларускай літаратуры, каштоўныя сваім багатым матэрыялам. Аўтар кніг "Адам Ганоры Кіркор" (1911), "Ян Баршчэўскі — першы беларускі пісьменнік XIX сталецця" (1911) і інш. Апублікаваная ім "Беларуская бібліяграфія" (1910) увайшла ў гісторыю як першы спецыяльны бібліяграфічны даведнік на беларускай мове. У гісторыка-літаратурных працах і публікацыях ён прывёў цікавыя звесткі пра Я. Баршчэўскага, М. Багдановіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, К. Каганца і інш., некаторыя іх рукапісы апублікаваў. Р. Зямкевіч выклікаў у беларускім грамадстве цікавасць да канкрэтнага літаратуразнаўства, да пошукаў і публікацый у гэтай галіне. Артыкулам "Тарас Шаўчэнка і беларусы" (1911) унёс уклад у вывучэнне беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязей, у станаўленне беларускага параўнальнага літаратуразнаўства. Вядомы вершы Р. Зямкевіча на польскай мове, а таксама некалькі зробленых ім перакладаў з украінскай і французскай моваў на беларускую. Напісаў "Кароткі нарыс гісторыі беларускай музыкі", які загінуў у рукапісе. У гады Другой сусветнай вайны Р. Зямкевіч трапіў пры нявысветленых акалічнасцях у гестапа і загінуў, паводле некаторых звестак, у канцлагеры. Загінула ў разбуранай Варшаве і большая частка яго багатых збораў. Асобныя рукапісы і лісты Р. Зямкевіча зберагаюцца ў сховішчах Мінска, Вільнюса, Варшавы, у тым ліку пераклады апавяданняў А. Дадэ і В. Стафаніка.

Генадзь Кісялёў

Іваноўскі Тадэвуш

Іваноўскі (Іванаўскас) Тадэвуш (Тадас) *(16.12.1882, в. Лябёдка Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. — 1.6.1970, г. Каўнас, Літва), прыродазнавец, прафесар. Акадэмік АН Літвы (1941), заслужаны дзеяч навукі Літоўскай ССР (1945).*

Т. Іваноўскі — родны брат беларускага грамадскага дзеяча Вацлава Іваноўскага. У 1903–1905 гг. вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце, займаўся рэвалюцыйнай дзейнасцю, за што праследаваўся царскімі ўладамі. У 1905–1908 гг. — студэнт Парыжскага універсітэта, па заканчэнню якога да 1910 г. працаваў на яго заалагічных станцыях. У 1910 г. скончыў Пецярбургскі універсітэт. Тады ж заснаваў Лабараторыю прыродазнаўчых навук у Пецярбургу, дзе і працаваў да 1915 г. У 1914 і 1917 гг. удзельнічаў у навуковых экспедыцыях каля берагоў Баранцавага мора, дзе збіраў матэрыялы для заалагічных музеяў. У 1919 г. адкрыў у Каўнасе прыродазнаўчую даследчую станцыю з заалагічным музеем і кіраваў ёю. У 1922 г. арганізаваў навуковую экспедыцыю на Істрыйскі паўвостраў (Адрыятычнае мора), у 1927 г. — на Вілсандскі востраў (Эстонія), у 1931 гг. — у Бразілію. З 1922 да 1940 г. Т. Іваноўскі — прафесар Каўнаскага універсітэта, загадчык кафедры заалогіі. Па яго ініцыятыве былі адкрыты ферма пушных звяроў, арніталагічная станцыя, запаведнік на возеры Жувінтас (1937), Каўнаскі заалагічны сад (1938). З 1940 да 1964 г. — загадчык кафедры заалогіі Вільнюскага універсітэта, а ў 1951–1954 гг. — адначасова загадчык кафедры лесаводства Сельскагаспадарчай акадэміі навук Літоўскай ССР. У 1954–1965 гг. — загадчык кафедры біялогіі Каўнаскага медыцынскага інстытута. Т. Іваноўскі — адзін з арганізатараў і першы дырэктар (1940–1950) Інстытута біялогіі АН Літвы. У савецкія часы ўдзельнічаў у шматлікіх экспедыцыях па Волзе, Обі, у Сярэдняй Азіі, Азербайджане, Казахстане. Вывучаў міграцыю птушак, шмат зрабіў для вывядзення новых гатункаў пладовых дрэў.

Т. Іваноўскі — адзін з актыўнейшых прапагандыстаў у Літве матэрыялістычнай тэорыі эвалюцыі Ч. Дарвіна. Займаўся пытаннямі аховы прыроды, рацыянальнага палявання. Галоўная яго праца "Птушкі Літвы" (1938–1955. Т. 1—3), за якую ён у 1959 г. атрымаў Дзяржаўную прэмію Літоўскай ССР. Выйшлі яго працы "Нашы птушкі і школа" (1923), "Падручнік па збору насякомых"(1924), "Міграцыя птушак" (1928), "Развядзенне пушных звяроў і яго перспектывы ў Літве" (1929), "Тры месяцы ў Бразіліі" (1932), "Запіскі прыродазнаўцы" (1955, 1982. 3-е дап. выд.), "Эвалюцыя жыцця" (1958), "Біялогія лясных птушак і звяроў і асновы паляўнічай гаспадаркі" (1971, у сааўт.) і шмат інш.

Яніна Кісялёва

Іванюк Ганна

Іванюк Ганна Арцёмаўна *(14.6.1947, в. Махнатае Гайнаўскага пав. Беластоцкага ваяв., Польшча), дзеяч беларускай дыяспары ў Польшчы.*

Г. Іванюк вучылася ў агульнаадукацыйным ліцэі з беларускай мовай навучання ў Гайнаўцы. У 1967 г. скончыла Медыцынскую санітарную школу ў Гданьску. Працавала ў галіне аховы здароўя. У 1973 — 1974 гг. вучылася ў Настаўніцкім інстытуце ў Гданьску. У 1979 г. закончыла гістарычны факультэт Гданьскага універсітэта. Абараніла магістэрскую працу "Брытанска-савецкая палітыка" ў 1938 — 1939 гг.". З 1973 г. працуе ў Комплексе медыцынскіх школ у Гдыні — спачатку настаўнікам санітарыі, з 1994 г. — кіраўніком навучання.

Г. Іванюк прымае актыўны ўдзел у грамадскім і культурным жыцці беларускай дыяспары. З'яўляецца адным з ініцыятараў стварэння Гданьскага аддзела Беларускага грамадска-культурнага таварыства, пазней — яго старшыня і сакратар. Член пленума ГП БГКТ на працягу многіх гадоў. Артыкулы Г. Іванюк пра беларускую дыяспару на Памор'і часта друкаваліся на старонках беластоцкай газеты "Ніва". Прымала ўдзел у дзейнасці Гданьскага беларускага калектыву "Жаваранкі". З 1992 г. — член Беларускага культурнага таварыства "Хатка". Жыве ў Гданьску.

Алена Глагоўская (Гданьск, Польшча)

Каваленка Надзея

Каваленка Надзея Канстанцінаўна *(19.12.1937, Мінск), доктар біялагічных навук (1991), лаўрэат Дзяржаўных прэмій Украіны (1989, 1997).*

Надзея Каваленка ў 1955 г. з сярэбраным медалём скончыла сярэднюю школу. Вучылася ў Мінскім дзяржаўным медыцынскім інстытуце (1955-1961). Працавала ў Беларускім навукова-даследчым санітарна-гігіенічным інстытуце Міністэрства аховы здароўя Беларусі (1961-1966). У 1966 г. пераехала ў Кіеў. Далейшая навуковая дзейнасць Н. Каваленка звязана з Інстытутам мікрабіялогіі і вірусалогіі НАН Украіны — там яна вучылася ў аспірантуры (1966-1969), абараніла кандыдацкую дысертацыю (1969). З 1986 г. працуе вядучым навуковым супрацоўнікам аддзела фізіялогіі прамысловых мікраарганізмаў ІМВ Нацыянальнай акадэміі навук Украіны.

Наша суайчынніца ўзначальвае групу па вывучэнню біялогіі малочнакіслых бактэрый. Навуковыя працы, якія выконваюцца пад яе кіраўніцтвам, былі падставай для пастаноў урадавых органаў аб развіцці новых напрамкаў у біялогіі і біятэхналогіі. Н. Каваленка ўпершыню прапанавала экалагічныя падыходы ў сістэматыцы малочнакіслых бактэрый, даследавала мікрабіялагічныя аспекты феномена даўгалецця пры рабоце ў складзе савецка-амерыканскай комплекснай экспедыцыі на працягу 1978-1981 гг. Распрацавала крытэрыі адбору прамысловых штампаў малочнакіслых бактэрый з высокай біялагічнай актыўнасцю, сабрала калекцыю новых штампаў гэтых мікраарганізмаў, на аснове якіх атрыманы лячэбна-прафілактычныя прэпараты. Н. Каваленка — аўтар 135 навуковых прац, у т. л. адной манаграфіі. Мае 11 аўтарскіх пасведчанняў і 9 патэнтаў. Падрыхтавала чатырох кандыдатаў навук. У выніку шматгадовых даследаванняў імі аформлены і прададзены ў Данію і Паўднёва-Афрыканскую Рэспубліку дзве ліцэнзіі на тэхналогію атрымання кісламалочнага прадукта "Гералакт".

Н. Каваленка ўзнагароджана залатымі і бронзавымі медалямі ВДНГ СССР (1983, 1986, 1987, 1989), медалямі "За працоўную доблесць" (1986), "У памяць 1500-годдзя Кіева" (1982), "Ветэран працы" (1985), трыма Ганаровымі граматамі Прэзідыума НАНУ і Цэнтральнага камітэта прафсаюзаў Украіны. Мае ганаровае званне "Вынаходнік СССР" (1990). Жыве ў Кіеве.

Ірына Тамільчык

Кавалеўскі Восіп

Кавалеўскі Восіп Міхайлавіч *(29.12.1800, Гродна – 26.10.1878, Варшава), філолаг, прафесар. Рэктар Казанскага універсітэта. Адзін з заснавальнікаў манголазнаўства ў Расіі. Член-карэспандэнт Пецярбургскай акадэміі навук (1847).*

В. Кавалеўскі ў 1817 г. скончыў Гродзенскую гімназію і паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Віленскага універсітэта, які скончыў у 1820 г. са ступенню кандыдата этыка-філасофскіх навук. Праслухаў курс настаўніцкай семінарыі пры Віленскім універсітэце і ў жніўні 1823 г. быў прыняты ў Віленскую гімназію старшым настаўнікам лацінскай і польскай моваў.

У 1824 г. за прыналежнасць да тайных таварыстваў філарэтаў і філаматаў разам з іншымі студэнтамі Віленскага універсітэта быў праведзены ў Казанскі універсітэт пад нагляд паліцыі. Выкладаў і ў Педагагічным

інстытуце ўсходнія мовы — арабскую, персідскую і татарскую. У 1825–1827 гг. адначасова выконваў абавязкі педагога-наглядальніка, памочніка інспектара студэнтаў.

Падарожнічаў з навуковай мэтай па Забайкаллю, Манголіі і Кітаі, вывучаў мову, літаратуру і этнаграфію манголаў. У 1828 г. Вучэбным камітэтам універсітэта камандзіраваны ў Іркутск для вывучэння мангольскай мовы. Са жніўня 1830 г. да восені 1831 г. знаходзіўся ў Пекіне як сакратар Духоўнай місіі для практыкі ва ўсходніх мовах і набыцця кніг і рукапісаў для бібліятэкі універсітэта. Пасля вяртання ў Казань В. Кавалеўскі быў вызвалены з-пад нагляду паліцыі (1832) і пакінуты на службе ва універсітэце.

У 1833 г. вучоны вытрымаў экзамен у Пецярбургскай акадэміі навук і быў прызначаны ад'юнкт-прафесарам Казанскага універсітэта на кафедры мангольскай мовы, у 1834 г. — экстраардынарным прафесарам, у 1835 г. — ардынарным прафесарам. Выкладаў ва універсітэце курс мангольскай мовы і часова, у 1837–1839 гг., курс усеагульнай гісторыі. У 1837–1841, 1845, 1853–1854 гг. — дэкан першага аддзялення філасофскага факультэта. Адначасова з 1844 г. быў дырэктарам 2-й Казанскай гімназіі і вучылішчаў Казанскай губерні. З 1854 г. В. Кавалеўскі выконваў абавязкі рэктара, з 1855 г. — рэктара Казанскага універсітэта. У 1860 г. быў звольнены з універсітэта і залічаны да Міністэрства асветы. У 1862 г. пераведзены ардынарным прафесарам усеагульнай гісторыі і абраны дэканам гісторыка-філалагічнага факультэта Варшаўскага універсітэта.

Навуковыя даследаванні В. Кавалеўскага былі прысвечаны гісторыі і тэорыі мангольскай мовы. Склаў у 1835 г. "Кароткую граматыку мангольскай кніжнай мовы", якая была першым навучальным дапаможнікам у Расіі па дадзенай спецыяльнасці. У 1836–1837 гг. выдаў "Мангольскую хрэстаматыю" (Т.1—2), у 1844–1849 гг. — "Мангольска-руска-французскі слоўнік", які быў выдадзены ў Казані ў 3 тамах. За яго вучонаму была прысуджана Дзямідаўская прэмія Пецярбургскай АН (1846). Аўтар перакладаў з мангольскай на польскую мову.

Вольга Гапоненка

Кавалёнак Уладзімір

Кавалёнак Уладзімір Васільевіч *(3.3.1942, в. Белае Крупскага р-на Мінскай вобл.), лётчык-касманаўт СССР, прафесар. Двойчы Герой Савецкага Саюза.*

У. Кавалёнак нарадзіўся ў сялянскай сям'і, вучыўся ў Зачысцкай і Хацюкоўскай сярэдніх школах Крупскага р-на. З дзяцінства захапляўся самалётамі. У 60-я гг. скончыў Балашоўскае лётнае вучылішча. Быў залічаны ў атрад касманаўтаў. Свой першы палёт у космас У. Кавалёнак здзейсніў у кастрычніку 1972 г. на караблі "Саюз-25", другі, 140-сутачны палёт — у чэрвені – лістападзе 1978 г. — на "Саюзе-29" і арбітальным комплексе "Салют-6", трэці — на транспартным караблі "Саюз Т-4" у сакавіку 1981 г. У. Кавалёнак прабыў у космасе ў агульнай суме 217 сутак. Пасля палётаў у космас вучыўся ў Ваеннай акадэміі Генеральнага штаба Узброеных Сіл СССР. Быў намеснікам начальніка ўпраўлення Цэнтра падрыхтоўкі касманаўтаў, начальнікам Цэнтральнага НДІ Міністэрства абароны СССР па авіяцыйна-касмічнай тэхніцы. З 1992 г. — начальнік Ваенна-паветранай інжынернай акадэміі імя М. Я. Жукоўскага, мае званне генерала-палкоўніка авіяцыі. У. Кавалёнак — член пяці айчынных і міжнародных акадэмій, кандыдат ваенных навук, прафесар. З'яўляецца віцэ-прэзідэнтам Міжнароднай асацыяцыі ўдзельнікаў касмічных палётаў.

У. Кавалёнак — аўтар больш 60-ці навуковых прац. Ім напісаны кнігі "Атмасфера Зямлі з "Салюта-6", "Начная Ф-2 вобласць іанасферы ў перыяды ўспышак на Сонцы", "Касмічная біялогія", "Даследаванне серабрыстых воблакаў з космасу". Напісаў аўтабіяграфічную кнігу "Радзіма мне крылы дала". У. Кавалёнак выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі і зацвярджэння сімвалаў яе суверэннасці разам з асістэнтамі-дэпутатамі першым унёс у залу пасяджэнняў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь бел-чырвона-белы дзяржаўны сцяг. У раённым цэнтры Крупкі адкрыты бюст-помнік У. Кавалёнку. У Хацюкоўскай сярэдняй школе створаны музей, прысвечаны беларускаму касманаўту.

Вацлаў Мацкевіч

Кавалёў Дзмітрый

Кавалёў Дзмітрый Міхайлавіч *(псеўд. В. Сецін; 4.6.1915, мяст. Ветка Магілёўскай губ., цяпер г. Ветка Гомельскай вобл. – 5.3.1977, Масква), рускі і беларускі паэт, перакладчык.*

Нарадзіўся Дз. Кавалёў у сям'і вясковага каваля. Бацька — беларус з в. Прудок пад Гомелем, маці — руская, са старавераў, якія жылі ў Ветцы з даўніх часоў. Дзяцінства прайшло ў пастаянных пераездах. У 1926 г. сям'я пераехала на радзіму бацькі ў в. Прудок. Там Дз. Кавалёў скончыў тры класы, чацвёрты пакінуў — стаў памагаць у хатняй гаспадарцы, а з 14 гадоў бацьку ў кузні. Потым разам з ім працаваў у калгасе і ў суднарамонтных майстэрнях Гомеля. Самыя лепшыя ўспаміны Дз. Кавалёва былі звязаны з Гомелем. У 1936–1939 гг. ён вучыўся на Гомельскім політэхнічным вячэрнім рабфаку. У той час вельмі захапляўся паэзіяй С. Ясеніна. У 1937–1938 гг. у

газеце "Палеская праўда" надрукаваў свае першыя вершы. Пасля заканчэння рабфаку настаўнічаў у Раманавіцкай школе на Гомельшчыне і адначасова працягваў вучобу на філалагічным факультэце Ленінградскага універсітэта. У студзені 1941 г. пайшоў служыць на Паўночны флот. Быў чырванафлотцам, стралком марской пяхоты. У час вайны ўдзельнічаў у баявых паходах падводных лодак і надводных караблёў, працаваў у франтавым друку Паўночнага флоту. Пасля дэмабілізацыі з арміі 9 гадоў жыў у Мінску, супрацоўнічаў у рэспубліканскіх газетах і часопісах. Шмат пісаў у той час, удасканальваючы сваё паэтычнае майстэрстна. У 1955 г. паступіў на Вышэйшыя літаратурныя курсы пры Літаратурным інстытуце імя А. М. Горкага. Пасля заканчэння іх з 1957 г. у Маскве, некаторы час працаваў намеснікам галоўнага рэдактара часопіса "Смена", потым загадчыкам рэдакцыі рускай прозы і паэзіі у выдавецтве "Молодая гвардия", выкладчыкам і кіраўніком паэтычнага семінара ў Літаратурным інстытуце імя А. М. Горкага.

Дз. Кавалёў — аўтар больш 20 зборнікаў паэзіі, выбраных твораў "Гады" (М., 1971), "Мой час" (М., 1977), "Выбраныя вершы" (М., 1990). Яго лірыцы ўласцівы высокі пафас грамадзянскасці, тонкае адчуванне псіхалогіі чалавека, роднай прыроды. Ён імкнуўся разгледзець кожнага чалавека, лепшае ў ім праз суперажыванне, псіхалагічнае і філасофскае асэнсаванне з'яў рэчаіснасці. У многіх вершах здолеў выказаць сябе, надзеі пакалення, да якога належаў, і тым самым скіраваць чытачоў на роздум аб агульнасці лёсаў, з якіх складаўся лёс народны. Ужо пасля смерці Дз. Кавалёва выйшаў зборнік яго паэзіі "Каму што дарагое" (1982), прысвечаны сябрам-аднапалчанам. Актыўна працаваў Дз. Кавалёў як перакладчык, асабліва з беларускай мовы на рускую. Выйшла некалькі кніг яго паэтычных перакладаў (зборнікі паэзіі Н. Гілевіча "Песню бярыце з сабой", А. Лойкі "Мая планета", М. Сурначова "Адна любоў", А. Грачанікава "Зоркі і курганы" і інш.). Ён пазнаёміў рускага чытача таксама з творамі беларускіх празаікаў (раманам І. Мележа "Подых навальніцы", з кнігамі Я. Брыля "Жменя сонечных промняў" і "Акраец хлеба", А. Адамовіча, Я. Брыля і У. Калесніка "Я з вогненнай вёскі..."). Надзвычай дарагімі былі для Дз. Кавалёва пераклады ўзбекскага пісьменніка С. Джуры, які гераічна загінуў у час Вялікай Айчыннай вайны, вызваляючы мясціны паэта на Гомельшчыне. Дз. Кавалёў выступаў і як літаратурны крытык. Пісаў артыкулы, прысвечаныя творчасці Я. Ісаева, М. Ісакоўскага, Ю. Прокушава, А. Твардоўскага, В. Фёдарава і інш. паэтаў. Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1947. Узнагароджаны медалямі.

Уладзімір Каваленка

Казакоў Міхаіл

Казакоў Міхаіл Аўрамавіч *(8.10.1938, в. Халіпы Дрыбінскага р-на Магілёўскай вобл. — 2000, Ялта, Украіна), беларускі, рускі і ўкраінскі паэт, журналіст. Сябар Саюза пісьменнікаў Украіны з 1984 г.*

М. Казакоў нарадзіўся ў беларускай сялянскай сям'і. Закончыў Крычаўскае педвучылішча (1956) і філалагічны факультэт Магілёўскага педінстытута (1961). Да 1964 г. быў дырэктарам Галабоўскай васьмігадовай школы ў родным раёне. У 1964 г. пераехаў у Крым, дзе ў сакскай раённай газеце "Красное знамя" працаваў карэктарам, літаратурным супрацоўнікам, адказным сакратаром, намеснікам рэдактара. З 1972 г. адказны сакратар, а з 1974 г. — намеснік рэдактара абласной "Курортной газеты" (цяпер "Крымская газета").

М. Казакоў — аўтар дзесяці зборнікаў вершаў, выдадзеных у Мінску ("Млечны шлях", "Родныя гарызонты", "Вянок васільковы"), Кіеве ("Сем калодзяў", "На нашай, на сваёй зямлі"), Маскве ("Зямное прыцягнение"), у Крыме ("Вечная крыніца", "Аўтограф", "Сілуэты Крыма", "Горыч палыну"), сааўтар калектыўнага зборніка "Светлая туга Беларусі". Прымаў актыўны ўдзел у грамадскім і культурным жыцці Крымскай аўтаноміі. З'яўляўся членам праўлення Саюза пісьменнікаў Крыма, членам Беларускага культурна-асветніцкага таварыства Крыма, камітэта па прэміях Аўтаномнай Рэспублікі Крым, старшынёй рэвізійнай камісіі Крымскай рэспубліканскай арганізацыі Саюза журналістаў, кіраўніком Ялцінскага гарадскога літаратурнага аб'яднання.

М. Казакоў — лаўрэат прэміі імя М. Багдановіча Крымскага рэспубліканскага фонду культуры, літаратурнай прэміі імя А. Чэхава.

Валерый Атрашкевіч (Магілёў)

Казарскі Аляксандр

Казарскі Аляксандр Іванавіч *(1798, м. Дуброўна Аршанскага пав. Віцебскай губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. – 28.6.1833, Нікалаеў, Украіна), герой руска-турэцкай вайны 1828–1829 гг., капітан I ранга (1831).*

А. Казарскі нарадзіўся ў сям'і ўпраўляючага маёнткам князя Любамірскага — Івана Кузьміча Казарскага. Летам 1808 г., калі Аляксандру споўнілася 10 год, уплывовы сваяк бацькі — Васіль Сямёнавіч Казарскі ўладкаваў яго ў Нікалаеўскае марское вучылішча, якое ў пачатку XIX ст. было адной з лепшых ваенных навучальных устаноў Расіі. У лютым 1814 г. Казарскі скончыў вучылішча ў чыне мічмана. Служыў у Чарнаморскім флоце (Севастопаль, 1814–1817 і 1820–1830) і Дунайскай ваеннай флатыліі (Ізмаіл, 1817–1820). Вызначыўся ў 1828 г.

пры ўзяцці Анапы і Варны, за што быў узнагароджаны залатой шабляй, атрымаў чын капітан–лейтэнанта і быў прызначаны камандзірам брыга "Меркурый", які ўваходзіў у склад крэйсерскага атрада эскадры па дазорах і разведцы. 26 мая 1829 г. у час разведкі каля Басфора 18-гарматны "Меркурый" на чале з Казарскім прыняў чатырохгадзінны бой з двума турэцкімі лінкорамі — "Селіміе" (110 гармат) і "Рэал-бей" (74 гармат) — і перамог. Праз некалькі дзён пра гэты подзвіг газета "Одесский вестник" напісала: "Гэты подзвіг такі, што не знаходзім іншага падобнага яму ў гісторыі мараплавання. Ён настолькі здзіўляючы, што ледзь можна гэтаму паверыць. Мужнасць, бясстрашнасць і самаадданасць, якія выявілі пры гэтым камандзір, афіцэры і экіпаж "Меркурыя", слаўней тысячы перамог звычайных". Неўзабаве турэцкія агенты прыслалі ў Пецярбург пісьмо аднаго турэцкага афіцэра, які прымаў удзел у баі з рускім брыгам. Ён прызнаваў: "Калі старажытныя і новыя летапісы захоўваюць для нас спробы бястрашнасці, то гэты апошні (учынак) зацьміць усе астатнія, і сведчанне аб ім заслугоўвае быць выпісаным залатымі літарамі ў храме Славы. Капітан гэты быў Казарскі, а назва брыга — "Меркурый". А. Казарскі атрымаў ордэн Георгія 4-й ступені, званне флігель–ад'ютанта ў свіце расійскага імператара і чын капітана II ранга. Брыгу "Меркурый" быў прыданы кармавы Андрэеўскі сцяг — вышэйшая ўзнагарода на рускім флоце.

У 1831 г. капітан I ранга А. Казарскі пабываў у Англіі для знаёмства з каралеўскім флотам. Прайшоў па рэках і азёрах з Белага мора ў Ладажскае возера, шукаючы карацейшы, чым у абход Скандынаўскага паўвострава, водны шлях з Колы (цяпер Мурманск) у Пецярбург (праз 100 гадоў яго праект быў рэалізаваны як Беламорска-Балтыйскі канал).

26 чэрвеня 1833 г. А. Казарскі раптоўна памёр. У Севастопалі яму ўзведзены помнік з надпісам "Казарскаму. Нашчадкам ў прыклад. 1834 год". Гэта першы помнік у горадзе (аўтар акадэмік архітэктуры А. Брулоў, родны брат мастака К. Брулова). І. Айвазоўскі стварыў дзве карціны, прысвечаныя брыгу "Меркурый" (1848, Рускі музей у Пецярбургу; 1892, Дзяржаўная галерэя Айвазоўскага ў Феадосіі). Цяпер на Чарнаморскім флоце ёсць тральшчык "Казарскі" і гідраграфічнае судна "Памяць "Меркурыя". На радзіме, у Дуброўне, у гонар земляка ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Валерый Ярмоленка

Кайгародаў Дзмітрый

Кайгародаў Дзмітрый Нікіфаравіч *[31.8(12.9).1846 г. Полацк – 11.2.1924, Ленінград, Расія], фенолаг, арнітолаг, аўтар навукова-папулярных кніг па прыродазнаўству, педагог, прафесар Ляснога інстытута (СПб).*

У 1863 г., па заканчэнню Полацкага кадэцкага корпуса, Дз. Кайгародаў паступіў у 2-е Канстанцінаўскае ваеннае вучылішча, у 1864 г. пераведзены ў Міхайлаўскае артылерыйскае вучылішча. У 1865 г. — падпаручык з прызначэннем у 3-ю Конна-артылерыйскую брыгаду (у Царстве Польскім, гэтаму перыяду прысвечаны яго артыкул — "З часоў польскага паўстання 1863 г. (Успаміны старога палачаніна)"). У 1868 г., не пакідаючы службы, паступіў вольным слухачом у Пецярбургскі земляробчы інстытут. Скончыў курс ляснога факультэта. У 1872 г. зацверджаны ў званні кандыдата. У 1873 г. па запросу Ляснога дэпартамента Міністэрства дзяржаўных маёмасцей быў пераведзены ў Корпус ляснічых і на два гады камандзіраваны для ўдасканальвання ў Германію, Аўстрыю, Швейцарыю, Швецыю, Францыю. Па вяртанню ў 1875 г. прыкамандзіраваны да Земляробчага інстытута (з 1881 г. Лясны інстытут) для чытання лекцый па лясной тэхналогіі і інжынернаму мастацтву. З 1878 г. — выкладчык, з 1882 г. — прафесар, у 1887–1891 гг. — памочнік дырэктара Ляснога інстытута. У кастрычніку 1905 г. звольнены са службы згодна з прашэннем. Адзін з заснавальнікаў Рускага таварыства аматараў светазнаўства, арганізатар і кіраўнік яго феналагічнага аддзела, сапраўдны член і старшыня феналагічнай камісіі Рускага геаграфічнага таварыства. У 1895 г. стварыў феналагічную сетку для правядзення біякліматычнага раяніравання Еўрапейскай часткі Расіі, склаў феналагічныя карты вясенняга прылёту птушак. З 1887 г. чытаў лекцыі ў народнай аўдыторыі Педагагічнага музея ваенна-навучальных устаноў у Саляным гарадку ў Пецярбургу, некаторыя з іх выдадзены асобнымі кнігамі. Шматразова выдаваліся яго кнігі "Гутаркі пра рускі лес" (упершыню — СПб., 1880–1881), "З зялёнага царства" (СПб., 1888), "Дрэва і яго жыццё" (М., 1897). Аўтар прац "Рускі талковы лесатаварны слоўнік" (1883), "Пра школьныя феналагічныя назіранні" (1920).

Вольга Гапоненка

Калінін Міхаіл

Калінін Міхаіл Сямёнавіч *(27.9.1905, мяст. Люцін Віцебскай губ., цяпер Лудза, Латвія – 14.2.1975, Рыга), мастак, педагог.*

М. Калінін скончыў Дзвінскую дзяржаўную беларускую гімназію (1926), Рыжскія настаўніцкія курсы (1931), вучыўся ў Латвійскай акадэміі мастацтваў (1926–1928). Працаваў мастаком-дэкаратарам, памочнікам рэжысёра, акцёрам у Дзвінскім і Рыжскім народных тэатрах, настаўнікам Рыжскай беларускай асноўнай школы (1931–1934).

Удзельнік культурна-асветнага руху за сацыяльную і нацыянальную свядомасць беларускай сялянска-работніцкай меншасці, прапагандаваў культурную спадчыну беларускага народа ў рамках Таварыства "Бацькаўшчына", Таварыства беларускага тэатра, Таварыства па культурных сувязях з народамі Усходу, заснаванага Я. Райнісам. Творчая спадчына М. Калініна — "Дзённік салдата", які ён вёў на вайне (застаўся ў рукапісе), малюнкі, акварэлі, карціны алеем, сярод якіх найбольш дасканалыя краявіды роднага латгальскага краю, партрэт Уладзіміра Пігулеўскага (захоўваюцца ў Рызе у дачкі Святланы).

Сяргей Панізьнік

Калінковіч Мікалай

Калінковіч (Калянковіч) Мікалай Мікалаевіч *[18.12.1950 (па пашпарту 15.1.1951), в. Цна Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл. – 24.7.1990, Тбілісі], беларускі і рускі пісьменнік, краязнавец.*

М. Калінковіч скончыў журфак БДУ (1976). Працаваў карэспандэнтам брэсцкай абласной газеты "Заря" (1976), намеснікам рэдактара лунінецкай раённай газеты "Ленінскі шлях" (1976–1978). З 1978 г. на службе ў органах дзяржаўнай бяспекі СССР. У 1984–1987 гг. вучыўся ў аспірантуры пры Маскоўскім вышэйшым вучылішчы КДБ СССР. Трагічна загінуў пры выкананні службовых абавязкаў у Тбілісі.

Друкавацца М. Калінковіч пачаў у 1968 г. у лунінецкай раённай газеце "Ленінскі шлях". З першых публікацый ён праявіў цікавасць да гісторыка-краязнаўчых тэм. Ужо на пачатку творчага шляху выразна акрэсліў сярод іншых аспектаў даследчых росшукаў знаходжанне Аляксандра Блока на Палессі. У час службы ў Туркменіі паказаў шырокаму колу лёсы землякоў-беларусаў, якія прымалі ўдзел ва ўсталяванні савецкай улады ў Закаспіі (Сяргей Малібожка, Барыс Тузін). Напісаў многа дакументальных нарысаў пра воінаў-туркменістанцаў, якія ўдзельнічалі ў вызваленні Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. У апошнія гады жыцця працаваў над кнігамі, прысвечанымі жыццю і службе Аляксандра Грыбаедава ў Беларусі (Брэст-Літоўск), а таксама лёсу крытыка і філосафа Уладзіміра Самойлы (урыўкі з гэтых дакументальных твораў друкаваліся ў брэсцкай абласной газеце "Заря" і ў газеце "Звязда"). Даследаваў "палескі перыяд" у жыцці Якуба Коласа (радыёспектакль на Беларускім радыё, публікацыя ў часопісе "Маладосць"). Літаральна ўсе публікацыі Мікалая Калінковіча прасякнуты высокім патрыятызмам. Героі яго дакументальных твораў вызначаюцца непадзельнай лучнасцю з Айчынай. Пісьменнік адкрыў шырокаму колу чытачоў невядомыя дагэтуль факты з гісторыі беларуска-рускіх і беларуска-туркменскіх гістарычных, культурных і літаратурных сувязей.

У Мінску выйшлі кнігі М. Калінковіча "Лунінец" (1981, у сааўтарстве), "Палескія дні Аляксандра Блока" (1985), "Лунінец" (1990). Шэраг зборнікаў яго мастацка-дакументальнай прозы пабачылі свет на рускай мове ў Ашхабадзе — "Не парываецца зямная сувязь" (1982), "Імя маё — Свабода" (1984), "На рубяжах тайнай вайны" (1985, у сааўт.), "Вяртанне світальнай рані" (1987).

Алесь Карлюкевіч

Кальвіш Зоя

Кальвіш Зоя Аркадзьеўна *(8.2.1947, в. Ліпава Міёрскага р-на Віцебскай вобл.), беларускі грамадскі дзеяч у Латвіі.*

З. Кальвіш нарадзілася ў беларускай сялянскай сям'і. Яе бацька быў музыкантам, спрыяў раскрыццю музычных здольнасцей дачкі. У 1961 г. скончыла сямігодку, вучылася ў Дрысенскай (цяпер Верхнядзвінская) і Міёрскай сярэдніх школах. Адзінаццаць класаў скончыла ў 1965 г. Набыла прафесію швеі. Вучылася на курсах баяністаў-масавікоў у Браслаўскай музычнай школе. Працавала кіраўніком мастацкай самадзейнасці мясцовага калгаса. У 1968 г. выйшла замуж. Пераехала ў Міёры, арганізавала там мастацкую самадзейнасць. У 1977 г. пераехала ў Рыгу. У 1987 г. скончыла планава-эканамічнае аддзяленне Рыжскага будаўнічага тэхнікума.

Наша суайчыннiца мае добрыя музычныя здольнасці, выконвае беларускія народныя песні. Знаўца гісторыі беларускай песенна-сцэнічнай культуры, прапагандуе яе сярод беларусаў Латвіі. З 1989 г. прымае ўдзел у рабоце Беларускага таварыства "Прамень" у Рызе. Была членам рэдакцыйнай калегіі газеты "Прамень", удзельнічала ў фальклорным ансамблі беларускай народнай песні "Надзея". У 1993 г. выбрана мастацкім кіраўніком ансамбля, які пад яе кіраўніцтвам з поспехам выступаў у розных гарадах Латвіі і Беларусі, удзельнічаў у многіх конкурсах і фестывалях, у т. л. Днях беларускай культуры ў Даўгаўпілсе, фестывалях творчых калектываў нацыянальных меншасцей Латвіі "Латвіяс вайнатэ". З. Кальвіш імкнецца да пашырэння рэпертуару ансамбля, адкрыцця новых талентаў.

Лявон Шакавец (Рыга)

Камаржынскі Язэп

Камаржынскі Язэп *(Іосіф Францавіч; 1899, Дзвінск (Даўгаўпілс), Латвія – канец 70 гг., Даўгаўпілс, Латвія), артыст, рэжысёр, грамадскі дзеяч беларускай дыяспары ў Латвіі.*

У 1919 г. Я. Камаржынскі скончыў гарадское рэальнае вучылішча. Акцёрскія здольнасці выявіў у пастаноўках трупы дзвінскага чыгуначнага тэатра пад кіраўніцтвам М. Канстанцінава. У час эвакуацыі ў Расію працаваў у Рабочай драматычнай дружыне (Рослаўль) і Вайсковай драматычнай дружыне. У 1919–1920 гг. — акцёр драмы, член Смаленскага аддзялення Усерасійскага прафесійнага саюза работнікаў мастацтва. Вярнуўшыся летам 1920 г. у Дзвінск, паступіў на Беларускія настаўніцкія курсы, дзе арганізаваў Беларускую драматычную дружыну, якая ажыццявіла шэраг пастановак у Дзвінску і навакольных вёсках, населеных беларусамі. Восенню 1929 г. Беларускі аддзел пры Міністэрстве асветы Латвіі запрасіў Я. Камаржынскага ў Рыгу. Спачатку ён працаваў у Беларускай пачатковай школе на Маскоўскім фарштаце, а потым быў прызначаны дырэктарам Беларускага народнага тэатра ў Рызе. Выступаў як артыст і рэжысёр, ставіў п'есы як беларускіх, так і латышскіх аўтараў. Я. Камаржынскі многа зрабіў для станаўлення Таварыства беларускага тэатра ў Латвіі. Беларускія асяродкі Латвіі шырока адзначылі 20-годдзе яго творчай дзейнасці (1938).

Пасля выхаду на пенсію ўдзельнічаў у мастацкай самадзейнасці Даўгаўпілскага гарадскога Дома культуры (тэатральныя сезоны 1961–1965 гг.). Загінуў у час аварыі на вуліцы.

Сяргей Панізьнік

Камароў Яўген

Камароў Яўген Іванавіч *(1933, Гомель), фотамастак. Заслужаны мастак Міжнароднай федэрацыі фотамастацтва.*

Я. Камароў нарадзіўся ў беларускай сям'і. Пасля заканчэння сярэдняй школы вучыўся ў Балашоўскім ваенна-авіяцыйным вучылішчы лётчыкаў. Служыў у вайсковых часцях пад Гомелем. У час службы цікавіўся фатаграфіяй. Пасля заканчэння ваеннай службы жыў у Ялце.

Упершыню прыняў удзел у рэспубліканскай фотавыстаўцы ў Мінску (1961). Быў удзельнікам і прызёрам усіх рэспубліканскіх, абласных гомельскіх і міжабласных фотавыставак (Гомель, Чарнігаў, Бранск) 1961–1975 гг. Прыняў удзел больш чым у 150 нацыянальных выстаўках, мае больш за 100 узнагарод. З 1985 г. удзельнік 470 міжнародных выставак, на якіх атрымаў 120 узнагарод. Сярод іх — 4 Гран-пры, 7 залатых медалёў Амерыканскага фотаграмадства і больш за 30 іншых залатых медалёў і кубкаў. Асноўныя тэмы творчасці — пейзажы і жыццё людзей.

Я. Камароў — член Саюза фотамастакоў Украіны, пачэсны член фотаклуба "Буэнас-Айрэс" і "Росарыо" (Аргентына), фотаклуба "Арызон" г. Сібіу (Румынія).

Ірына Тамільчык

Камароўскі Георгій

Камароўскі Георгій Яўгеньевіч *(псеўд. Г.Святлоў, Г.Яўгеньеў; 15.12.1938, Мінск), дыпламат, доктар гістарычных навук.*

Г. Камароўскі ў 1955 г. скончыў Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных адносін, у 1959 г. — аспірантуру таго ж інстытута. Са жніўня 1959 г. па люты 1999 г. на рабоце ў сістэме Міністэрства замежных спраў СССР і Расіі. З сакавіка 1993 г. па люты 1999 г. — генеральны консул Расіі ў г. Осака (Японія). Выйшаў у адстаўку ў рангу надзвычайнага і паўнамочнага пасланніка.

Г. Камароўскі з'яўляецца аўтарам каля 150 навуковых прац па гісторыі, культуры, рэлігіі, розных аспектах грамадска-палітычнага жыцця Японіі і Філіпін. Сярод іх — "Пяць тысяч будаў Энку" (М., 1968), "Старыя і новыя богі Японіі" (М., 1968, у сааўт.), "Шлях багоў: Сінто ў гісторыі Японіі" (М., 1985), "Лотас і палітыка: неабудысцкі рух у сучаснай Японіі" (М., 1989, у сааўт.), "Калыска японскай цывілізацыі: Нара. Гісторыя, рэлігія, культура" (М., 1994).

Ірына Тамільчык

Камінскі Антон

Камінскі Антон Антонавіч *(17.11.1862, Дрысенскі пав. Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н. Віцебскай вобл. – 5.8.1936, Ленінград, Расія), кліматолаг, гідролаг, прафесар.*

А. Камінскі нарадзіўся ў сям'і агранома. Скончыў гімназію ў Міта ве (1882) і фізіка-матэматычны факультэт Пецярбургскага універсітэта (1887). Пасля заканчэння універсітэта працаваў у Галоўнай фізічнай (цяпер Геафізічнай) абсерваторыі, дзе з 1889 г. стаў на чале метэаралагічнай сеткі, і гэтыя абавязкі выконваў амаль 30 гадоў. З 1922 г. — загадчык кліматалагічнага аддзела абсерваторыі (пазней інстытута). Быў адным з заснавальнікаў Гідралагічнага інстытута, дзе ў 1920–1930 гг. загадваў геафізічным аддзелам. У апошнія 30 гадоў жыцця многа часу аддаваў педагагічнай рабоце. Чытаў курс кліматалогіі ў Геаграфічным інстытуце, пераўтвораным у 1925 г. у геаграфічны факультэт Ленінградскага універсітэта. Тут арганізаваў кафедру кліматалогіі, якой раней не было ні ў адным універсітэце СССР і за межамі. Належаў да самых паважаных прафесараў універсітэта.

Шматгадовая работа ў Геафізічнай абсерваторыі дала А. Камінскаму матэрыял для класічнай манаграфіі аб распаўсюджванні вільготнасці ў Расіі "Гадавы ход і геаграфічнае размеркаванне вільготнасці паветра ў Расіі" (СПб., 1894; Ламаносаўская прэмія Акадэміі навук). Пад яго рэдакцыяй было выдадзена 14 тамоў "Летапісаў" Галоўнай фізічнай абсерваторыі. Аўтар карт распаўсюджвання вільготнасці ў "Кліматалагічным атласе Расіі" (1900). А. Камінскі быў вучоным з шырокім навуковым гарызонтам і паслядоўнікам А. Ваейкава. Яго цікавіла дачыненне кліматалогіі да розных галін народнай гаспадаркі — лясной справы і земляробства, транспарту і аховы здароўя. У прыватнасці, ім была выдадзена манаграфія "Тыпы засух і раўнінных сухавеяў у СССР" (1934). Многа працаваў ён і ў галіне гідралогіі, пісаў аб паводках у Ленінградзе, ваганнях узроўню Каспійскага мора. Спецыяльных кліматалагічных прац у Камінскага многа — гэта даследаванні клімату паўднёвага берага Крыма, Чарнаморскага ўзбярэжжа Каўказа, Урала, Якуціі, Манголіі. Плёнам усяго яго жыцця стала манаграфія "Ціск паветра і вецер у СССР" (з атласам, 1932–1936. 1—2 т.).

Валерый Ярмоленка

Кананюк Віталь

Кананюк Віталь Іванавіч *(3.12.1919, в. Вышаткі Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл.), генерал-маёр, спецыяліст у галіне ваеннай навукі, прафесар.*

Нарадзіўся В. Кананюк у сям'і сельскага настаўніка. У 1927–1935 гг. вучыўся ў сярэдняй школе у г. Сянно Віцебскай вобл. У 1933–1934 гг. працаваў пазаштатным карэспандэнтам газеты "Чырвоная змена", друкаваўся пад псеўданімам Янка Знаёмы, прымаў удзел у выданні маладзёжнай старонкі газеты Сенненскага р-на "Камунар". У 1935 г. паступіў у Маскоўскі палітэхнікум сувязі імя Падбельскага. Пасля заканчэння тэхнікума без экзаменаў, як выдатнік, быў залічаны ў Маскоўскі электратэхнічны інстытут сувязі, але перапыніў вучобу ў лістападзе 1939 г. у сувязі з прызывам на ваенную службу. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Прымаў удзел у баявых дзеяннях на Ленінградскім фронце, удзельнічаў у аперацыях па прарыву блакады Ленінграда ў 1943 г., па поўнаму сняццю блакады горада ў 1944 г., быў камандзірам роты, намеснікам камандзіра тэлеграфна-тэлефоннага батальёна асобнага палка сувязі фронту. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, 20 медалямі.

У 1946 г. паступіў на вучобу ў Ваенную акадэмію сувязі імя С. Будзённага, якую скончыў у 1950 г. У 1953 г. абараніў дысертацыю, атрымаў навуковую ступень кандыдата ваенных навук. Працаваў у Ваеннай акадэміі сувязі — старшы выкладчык, начальнік ваенна-навуковай групы, начальнік факультэта. У 1966–1981 гг. працаваў намеснікам начальніка Ваеннай акадэміі сувязі па вучэбнай і навуковай рабоце. У 1968 г. яму было прысвоена воінскае званне генерал-маёр. У 1976 г. — навуковае званне прафесар. У 1984 г. выйшаў у адстаўку па выслузе гадоў. Цяпер вядучы навуковы супрацоўнік, вучоны сакратар дысертацыйнага савета дзяржаўнага прадпрыемства "Дальняя сувязь" у Санкт-Пецярбургу.

Мікалай Нікалаеў (Санкт-Пецярбург, Расія), Ларыса Языковіч

Канапацкі Мацей

Канапацкі Мацей Гасанавіч *(псеўд. Анатоль Саевіч, 29.1.1926, Вільня), беларускі і польскі публіцыст, грамадска-культурны дзеяч, адзін з заснавальнікаў Беларускага культурнага таварыства "Хатка" ў Гданьску.*

М. Канапацкі нарадзіўся ў сям'і беларускага татарына мусульманскага веравызнання, камандзіра беларускіх аддзелаў у польскім войску ў 1919—1920 гг., дзеяча беларускага руху ў міжваеннай Польшчы. Да 1946 г. жыў з бацькамі ў Вільнюсе, вучыўся ў гімназіі імя А. Міцкевіча, а ў 1942—1944 гг. – у Віленскай беларускай гімназіі, дзе

яго бацька быў старшынёй бацькоўскага камітэта. У 1946 г. разам з бацькамі і сястрой Тамарай пераехаў у Быдгашч (Польшча) і з 1948 г. вучыўся на юрыдычным факультэце Торуньскага універсітэта. У 1950 г. пачаў вучобу на аддзяленні рускай філалогіі Ягелонскага універсітэта ў Кракаве, закончыў у 1955 г. у Варшаўскім універсітэце. Абараніў магістэрскую работу па тэме "Янка Купала як перакладчык польскай паэзіі". У 1955 г. пачаў працаваць журналістам у Польскім агенцтве прэсы. У 1957 г. пераехаў у Беласток і працаваў да 1964 г. у беларускім тыднёвіку "Ніва" (у 1958—1960 гг. таксама ў беларускай рэдакцыі Польскага радыё ў Беластоку). У 1964 г. пераехаў у Сопат, дзе да 1966 г. працаваў настаўнікам рускай мовы ў пачатковых школах. У 1966—1972 гг. — прэс-сакратар дырэктара Гданьскай суднаверфі. Выдаваў штодзённы інфармацыйны бюлетэнь. У 1968 г. заснаваў гурток Польскага арыенталістычнага таварыства, які пазней ператварыўся ў аддзел, і з'яўляўся яго старшынёй. У 1973 г. выехаў на Беласточчыну, дзе працаваў у ваяводскім Доме культуры ў Беластоку і займаўся татарскай праблематыкай. Затым у культурным цэнтры ў Саколцы стварыў сталую татарскую экспазіцыю, экспанаты для якой збіраў па ўсёй Польшчы. У 1977 г. вярнуўся ў Сопат. У 1979 г. пачаў працаваць у ваяводскім геранталагічным цэнтры ў Гдыні, стварыў Універсітэт трэцяга ўзросту ў Трыгарадзе. У 1995 г. выйшаў на пенсію. Жыве ў Сопаце з сястрой Тамарай.

М. Канапацкі — аўтар шматлікіх публікацый, прысвечаных беларуска-татарскім сувязям у XIX — XX стст. Дэбютаваў на старонках "Нівы" артыкулам "Янка Купала — вялікі прыяцель польскай літаратуры" (1956. № 20). Першы ў Польшчы знайшоў і надрукаваў некаторыя рукапісы Я. Лучыны, С. Манюшкі, Б. Каратынскага. Адшукаў нашчадкаў Ф. Багушэвіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, швагра Я. Купалы, якія жылі ў Польшчы. Вёў багатую карэспандэнцыю з польскімі і беларускімі славістамі і перакладчыкамі, якія займаліся беларускай культурай, — прафесарамі Э. Янкоўскім, С. Грабоўскім, М. Аляхновічам, А. Антановічам, С. Александровічам, А. Мальдзісам, М. Ю. Канановічам, В. Рудзінскім, Я. Шутовічам, М. Пецюкевічам. Сярод публікацый М. Канапацкага вылучаюцца наступныя: "50-годдзе з дня выхаду першага нумара "Нашай нівы" (Ніва. 1956. № 37), "Пісьмы Лучыны" (Ніва. 1961. № 52), "Помнікі арабска-беларускай пісьменнасці" (Ніва. 1963. № 20), "Татарская суполка ў Польшчы ўчора і сёння" (Przeglad Orientalistyczny. 1969. № 2), "Татары на беларускі лад" (Ніва. 1990. № 25).

Лена Глагоўская (Гданьск, Польшча)

Канчар Яўсей

Канчар Яўсей Сцяпанавіч *(20.9.(2.10)1882, в. Сяўкі Рэчыцкага пав. Мінскай губ., цяпер Лоеўскі р-н Гомельскай вобл. – 16.5.1979 Ленінград, Расія), грамадска-палітычны дзеяч, гісторык, публіцыст, географ.*

Нарадзіўся Я. Канчар у сялянскай сям'і. Скончыў Мар'інагорскае земляробчае вучылішча (1902). У 1902–1910 гг. жыў у Тыфлісе (Тбілісі), дзе далучыўся да рэвалюцыйнага руху, цікавіўся пытаннямі кааперацыі. У 1906 г. абвінавачаны ва ўдзеле ў антыўрадавых выступленнях і арыштаваны, але ў 1908 г. апраўданы судом. У 1910 г. пераехаў у Пецярбург, займаўся арганізацыйна-эканамічнымі праблемамі кааперацыі, быў супрацоўнікам Пецярбургскага камітэта сельскіх таварыстваў. Адначасова вучыўся на вышэйшых сельскагаспадарчых курсах (1910–1914). Склаў дапаможнік па кааперацыі ("Кіраўніцтва па сельскай кааперацыі", 1913). У сакавіку 1917 г. увайшоў у склад Беларускага нацыянальнага камітэта ў Мінску, у красавіку 1917 г. пакінуў яго. У лістападзе 1917 г. узначаліў Беларускі абласны камітэт пры Усерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў у Петраградзе. У снежні 1917 г. быў адным з арганізатараў склікання Першага Усебеларускага кангрэса ў Мінску, атрымаў ад кіраўніцтва Савецкай Расіі дазвол на яго правядзенне. Актыўна ўдзельнічаў у рабоце кангрэса, уваходзіў у склад Савета старшын кангрэса. Выступаў на кангрэсе з прапановай стварэння "асобнага цэнтра Беларусі як аўтаномнай дзяржавы". Разам з тым выступіў супраць неадкладнага абвяшчэння незалежнасці Беларусі ад Расіі, зыходзячы з таго, што беларускае сялянства не падрыхтавана да такога акту. Пасля прымусовага роспуску кангрэса савецкімі органамі Заходняй вобласці і фронту звяртаўся да кіраўніка савецкага ўрада У. Леніна, расійскіх наркамаў па справах нацыянальнасцей (І. Сталіна) і юстыцыі (Д. Штэйнберга), патрабуючы вызваліць арыштаваных удзельнікаў кангрэса і асудзіць дзеянні камісараў Заходняй вобласці і фронту. У лютым 1918 г. стаў загадчыкам навукова-статыстычнага аддзела Беларускага нацыянальнага камісарыята, пазней быў загадчыкам статыстычнага аддзела Камісарыята па справах нацыянальнасцей Саюза камун Паўночнай вобласці, узначальваў Беларускае вольна-эканамічнае таварыства ў Петраградзе. Супрацоўнічаў з газетай "Дзянніца", часопісам "Чырвоны шлях", у якіх неаднаразова друкаваў свае публіцыстычныя творы. У 1919 г. выдаў зборнік "Беларускае пытанне". У 1922 г. скончыў Петраградскую сельскагаспадарчую акадэмію, працаваў у ёй выкладчыкам. Пазней працаваў у Петраградскім універсітэце, Закаўказскім політэхнічным інстытуце, навуковых установах Ленінграда. Падтрымліваў сувязь з Асацыяцыяй беларускіх студэнтаў ВНУ і Беларускім студэнцкім зямляцтвам у Петраградзе (з 1927 г. — Ленінградзе). У 1920-х г. меркаваў вярнуцца ў БССР, аднак па невядомых прычынах не зрабіў гэтага. Падтрымліваў навуковыя кантакты з Інбелкультам, у 1923 г. напісаў эканамічную геаграфію БССР, прапанаваў яе рукапіс выдавецтву "Савецкая Беларусь" (рукапіс не выяўлены). У 1929 г. узначаліў Беларускае навуковае таварыства ў Ленінградзе. У 1930-х г. падрыхтаваў рукапісы прац "З гісторыі грамадзянскай вайны ў Беларусі ў 1917–1920 гг.", "Беларускія арганізацыі" "Гісторыя грамадзянскай вайны" (не выяўлены). У лістападзе 1938 г.

арыштаваны, знаходзіўся ў заключэнні да красавіка 1939 г. У час Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся ў блакадным Ленінградзе. Пасля вайны пражываў там жа. У канцы 1960-х г. прапанаваў свае паслугі як гісторык і мемуарыст "Беларускай Савецкай энцыклапедыі" і часопісу "Полымя".

Віталь Скалабан

Каплан Танхум

Каплан Танхум *(Анатолій Львовіч; 1902, Рагачоў Магілёўскай губ., цяпер Гомельскай вобл. – 1980, Ленінград, Расія), мастак.*

Маляваць Т. Каплан пачаў у дзяцінстве. У 1927 г. закончыў Акадэмію мастацтваў у Ленінградзе. Працаваў афарміцелем у прамысловасці. Праілюстраваў аповесці Д. Левіна "Вуліца шаўцоў" і "Вольныя штаты Славічы" (1932). У канцы 1930-х гг. для Музея этнаграфіі народаў СССР выканаў серыю літаграфій пра Бірабіджан, стварыў цыкл літаграфій "Касрылаўка", што прынеслі яму вядомасць як майстру яўрэйскай тэмы. У гэтым цыкле своеасабліва спалучыліся дзіцячыя ўспаміны пра Рагачоў і літаратурныя асацыяцыі. Лірычныя літаграфіі Т. Каплана 1944–1947 гг. аб'яднаны ў цыкл "Ленінград".

У 1952 г. Т. Каплан пачаў працаваць над цыклам вялікіх літаграфій "Зачараваны кравец" паводле аповесці Шолама Алейхема (выйшлі ў свет у 1963 г.), а ў 1962 г. стварыў цыкл "Песня песень". Цыклы манахромных літаграфій ("Тэўе-малочнік",1957–1961 гг. і "Стэмпеню", 1963–1967 гг., паводле Шолама Алейхема, "Фішка Храмы", 1966–1967 гг., паводле ўраджэнца Беларусі Мендэле Мойхер Сфорыма і "Апавяданні", 1967 г., паводле І. Л. Перэца) ставілі перад сабой мэту па-філасофску асэнсаваць лёсы літаратурных герояў як прадстаўнікоў народа, што іх спарадзіў. Да рамана нямецкага пісьменніка І. Баркоўскага пра выгнанца-яўрэя "Млын Левіна" (Берлін, 1975) і філасофскай драмы Г.-Э. Лесінга "Натан Мудры" (Лейпцыг, 1978) Т. Каплан выканаў графічныя ілюстрацыі. На тэмы яўрэйскага фальклору ім створаны цыклы літаграфій "Козачка" (1957–1961), "Яўрэйскія народныя песні" (1962), цыкл у тэмперы і серыя лістоў "Д. Шастаковіч. З яўрэйскай народнай паэзіі" (тэмпера і гуаш, 1962–1963). Адной з апошніх работ Т. Каплана сталі 30 афортаў да "Фішкі Храмога" (1978) Мендэле Мойхер Сфорыма (да творчасці свайго земляка мастак звяртаўся не аднойчы).

Браніслава Котава

Капцюг Валянцін

Капцюг Валянцін Афанасьевіч *(9.10.1931, п. Юхнаў Калужскай вобл. – 10.8.1997, Новасібірск, Расія), хімік-арганік, прафесар. Акадэмік АН СССР (1979), Расійскай АН (1991), член Нацыянальнай АН Беларусі (1995), акадэмій навук Балгарыі, Індыі, Манголіі. Лаўрэат Ленінскай прэміі (1990), Герой Сацыялістычнай Працы (1986).*

У В. Капцюга — беларускае паходжанне па бацькоўскай лініі. Бацькі працавалі сувязістамі. Скончыў Маскоўскі хіміка-тэхналагічны інстытут імя Дз. Мендзялеева (1954) і быў пакінуты там у аспірантуры. З 1959 г. працаваў у Інстытуце арганічнай хіміі Сібірскага аддзялення АН СССР у Новасібірску — навуковым супрацоўнікам, загадчыкам лабараторыі, загадчыкам аддзела, а з 1987 г. быў дырэктарам гэтага інстытута. Адначасова займаўся выкладчыцкай дзейнасцю. У 1966 г. быў абраны прафесарам, у 1978–1980 гг. — рэктар Новасібірскага універсітэта. У 1980–1989 гг. В. Капцюг — віцэ-прэзідэнт АН СССР і старшыня Прэзідыума Сібірскага аддзялення АН СССР. Навуковыя даследаванні В. Капцюг праводзіў у галіне фізіка-арганічнай хіміі. Выканаў фундаментальныя даследаванні па вывучэнню механізмаў рэакцый араматычных злучэнняў і малекулярных перагруповак з удзелам карбоніевых іонаў. Адкрыў шэраг рэакцый ізаметрызацыі, устанавіў механізмы і колькасныя заканамернасці перамяшчэння замяшчальнікаў у араматычных ядрах. Вывучаў будову і рэактыную здольнасць арэонавых іонаў і іх аналагаў. В. Капцюг з'яўляецца адным з ініцыятараў выкарыстання ЭВМ для рашэння задач арганічнай хіміі. Стварыў камп'ютэрызаваныя базы дадзеных па малекулярнай спектраскапіі арганічных злучэнняў. Распрацаваў шляхі практычнага выкарыстання розных тыпаў арганічных злучэнняў (у т. л. інгібітараў тэрмааксіяльнай дыструкцыі палімераў, якія паляпшаюць уласцівасці нафты, загартоўваючых асяроддзяў, памяншаючых дэфармацыю танкасценных дэталяў). Апошнія гады актыўна вывучаў праблему ўздзеяння хімічных рэчываў і радыенуклідаў на навакольнае асяроддзе і чалавека.

В. Капцюг з'яўляўся віцэ-прэзідэнтам Навуковага камітэта па праблемах навакольнага асяроддзя Міжнароднага савета навуковых сувязей, членам Кансультацыйнага савета вышэйшага ўзроўню па ўстойліваму развіццю пры Генеральным сакратары ААН. Значную ўвагу ўдзяляў падрыхтоўцы навуковых кадраў. У 1987–1990 гг. працаваў рэктарам Новасібірскага дзяржаўнага універсітэта, доўгі час загадваў там кафедрай арганічнай хіміі. Сярод яго вучняў шмат вядомых дактароў і кандыдатаў навук. За навуковую, педагагічную і грамадскую дзейнасць атрымаў званне Героя Сацыялістычнай Працы (1986), Ленінскую прэмію (1990), Міжнародную прэмію імя А. П. Карпінскага, узнагароджаны многімі ордэнамі СССР. У 1998 г. устаноўлена прэмія імя акадэміка

В. А. Капцюга, якая прысуждаецца Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і Сібірскім аддзяленнем РАН. Імя вучонага носіць праспект у Новасібірску.

Вольга Гапоненка, Анфіса Ляднёва

Капчык Пятрусь

Капчык Пятрусь Міхайлавіч *(псеўд. Рычард Ягелончык; 23.4.1944, в. Раўнаполле Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.), філолаг, паэт, перакладчык, журналіст, грамадскі дзеяч, педагог.*

Нарадзіўся П. Капчык ў сялянскай сям'і. З 1951 да 1962 г. вучыўся ў Раўнапольскай пачатковай, Караваеўскай сямігадовай і Рудзенскай сярэдняй школах Пухавіцкага р-на. У 1962 г. паступіў на вучобу ў ГарПТВ № 26 Данецка, якое скончыў праз год, пасля чаго паступіў у Макееўскае педагагічнае вучылішча. Педагагічную дзейнасць пачаў старшым піянерважатым школы-інтэрната № 2 г. Канатопа Сумскай вобл., дзе ў свой час працаваў беларускі паэт Францішак Багушэвіч. Адтуль вярнуўся ў Беларусь, працаваў у Брадзяцінскай васьмігодцы Маларыцкага р-на на Брэстчыне, Карнюткаўскай васьмігодцы Валожынскага р-на на Міншчыне. У 1969–1971 гг. вучыўся на аддзяленні таваразнаўства кнігі Мінскага кааператыўнага тэхнікума, які скончыў з адзнакай. Працаваў па спецыяльнасці ў Століне і Вялікай Бераставіцы. З 1975 г. пражывае за межамі Беларусі. Працаваў у будаўнічых арганізацыях Махачкалы, спалучаючы працу з завочнай вучобай на філалагічным факультэце Дагестанскага дзяржаўнага універсітэта, які скончыў у 1982 г. Пасля атрымання дыплома пераехаў у Таджыкістан, дзе працаваў у рэдакцыі абласной газеты "Кульская праўда". Ажаніўшыся, пераехаў на Украіну, у Ізяслаў Хмяльніцкай вобл., дзе з 1983 г. працуе выкладчыкам рускай мовы і замежнай літаратуры ў школе.

П. Капчык — аўтар артыкулаў, рэцэнзій, вершаў, гумарэсак, перакладаў. Яго першы допіс "Мая радасць" (на рускай мове) быў змешчаны ў дзіцячай газеце "Зорька", калі ён быў яшчэ вучнем Рудзенскай сярэдняй школы (1958). Публікацыі перыядычна з'яўляліся ў газетах "Чырвоная змена", "Мінская праўда", "Звязда", "Літаратура і мастацтва", "Настаўніцкая газета", "Наша слова", "Знамя юности", "Голас Радзімы", у часопісах "Вожык", "Беларусь", "Беларуская мова і літаратура", "Бярозка", "Вясёлка". Ён таксама публікаваў свае матэрыялы ў перыёдыцы на многіх мовах народаў былога Савецкага Саюза, а таксама на замежных мовах.

П. Капчык — кіраўнік гурта беларускай культуры "Зорка Венера" ў Ізяславе, прымае актыўны ўдзел у культурным і грамадскім жыцці беларускай дыяспары на Украіне, з'яўляючыся членам Рады культурных аб'яднанняў беларусаў Украіны. Ён прымаў удзел у рабоце Першага і Другога з'ездаў беларусаў свету. На Другім з'ездзе абраны сябрам рады Згуртавання Беларусаў свету "Бацькаўшчына".

Міхась Пятроўскі (Ізяслаў, Украіна)

Караткевіч-Цыганок Таццяна

Караткевіч-Цыганок Таццяна *(9.6.1959, г. Чачэрск Гомельскай вобл.), філолаг, педагог. Старшыня Беларуска-эстонскага культурна-асветніцкага аб'яднання (БЭКАА) "Спадчына", старшыня Каардынацыйнага савета нацыянальных аб'яднанняў г. Нарвы (Эстонія).*

Т. Караткевіч-Цыганок нарадзілася ў сям'і беларусаў. Маці паходзіла з сям'і заможных мяшчан, бацька — са шляхты. У 1981 г. скончыла гісторыка-філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага педінстытута. Працавала настаўніцай, завучам Чачэрскай СШ № 1, метадыстам Чачэрскага рана. У 1986 г. пераехала ў Нарву. У 1997 г. стала старшынёй БЭКАА "Спадчына". З'яўляецца пазаштатным карэспандэнтам газеты "Кренгольмский проспект" (Нарва), супрацоўнікам перадачы "Бацькаўшчына" на Радыё 4 (Талін). Выступае ў беларускім і эстонскім друку.

Член Нарвскага аддзялення Міжнароднай арганізацыі „EENA", круглага стала дзелавых жанчын г. Нарвы.

Ірына Тамільчык

Каратынскі Вінцэсь

Каратынскі Вінцэсь Аляксандравіч *(псеўд. Borywoj, Borzywojowicz; крыпт.: K. W.; W. K.; W. Kor.; 15.6.1831, в. Селішча Навагрудскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. – 7.2.1891, Варшава), беларускі і польскі паэт і публіцыст.*

Нарадзіўся В. Каратынскі ў сям'і былога прыгоннага Аляксандра Каратая, які перад жаніцьбай з шляхцянкай Юзафатай з Далідовічаў атрымаў вольную і пачаў насіць прозвішча Каратынскі. Рана страціў бацьку. У школу не хадзіў, асновы польскай і рускай пісьменнасці, а таксама арыфметыкі засвойваў пад кіраўніцтвам мясцовага арганіста. Займаўся самаадукацыяй, шмат чытаў і нават перапісваў для сябе кнігі ("Гісторыя Польшчы" І. Лялевеля,

"Дэман" М. Лермантава). Працаваў вандроўным хатнім настаўнікам на Навагрудчыне і ў ваколіцах Любчы. У час настаўнічання пазнаёміў са сваімі паэтычнымі спробамі былога уніяцкага святара Давідовіча, які звёў яго з У. Сыракомлем. Гэта вырашыла далейшы лёс В. Каратынскага. Летам 1850 г. ён перабраўся ў фальварак Залуча, арандаваны Сыракомлем, і стаў яго памочнікам-сакратаром. Імкненне да ведаў, тытанічная працавітасць, выключная памяць дапамаглі В. Каратынскаму ўзняцца да інтэлектуальных вышыняў. Акрамя беларускай і польскай моў ён авалодаў рускай, чэшскай, французскай, нямецкай. З вясны 1853 г. жыў ва ўзятай у арэнду Сыракомлем Барэйкаўшчыне (цяпер Вільнюскі р-н).

Першы верш "Над калыскай" В. Каратынскі апублікаваў у 1856 г., першы польскі паэтычны зборнік "Чым хата багата, тым рада" — у 1857 г. У. Сыракомля прапанаваў яму падрыхтаваць сумесную кнігу беларускіх твораў (па невядомых прычынах не выдадзена). На пачатку верасня 1858 г. В. Каратынскі прыняў удзел у складанні прывітальнага адраса Аляксандру II, напісаў да яго прыезду ў Вільню беларускі верш "Уставайма, братцы!..", напомніўшы тым самым манарху пра існаванне пагарджанай у вярхах беларускай мовы, а 23 кастрычніка ўпісаў у альбом А. Вярыгі-Дарэўскага вершаванае прысвячэнне "Далібог-то, Арцім...". В. Каратынскі наведваў вечарыны ў літаратурным салоне А. Кіркора, супрацоўнічаў у часопісе "Teka Wilenska", быў асноўным ад беларуска-літоўскага краю карэспандэнтам "Gazety Warszawskiej", у 1860 г. з'яўляўся членам рэдкалегіі газеты "Kurjer Wilenski", шмат працы аддаваў падрыхтоўцы матэрыялаў для "Слоўніка польскай мовы". Пасля выдання польскамоўных паэмы "Таміла" і вершаванага памфлета "Выпіў Куба да Якуба" В. Каратынскі вельмі рэдка выступаў у друку з паэтычнымі творамі. Напярэдадні паўстання 1863–1964 гг. ён спрычыніўся да стварэння агітацыйных вершаваных твораў антыцарскага зместу "Гутарка старога дзеда" і "Гутарка двух суседаў", за што ператрываў нагляд паліцыі і жандарскія вобыскі. Будучы сведкам самадзяржаўных рэпрэсій і прадбачачы непазбежнасць ад'езду з роднага краю, В. Каратынскі напісаў у 1864 г. беларускі элегічны верш "Туга на чужой старане", а на пачатку 1866 г. пераехаў з сям'ёй у Варшаву і цалкам прысвяціў сябе польскай журналістыцы. Уваходзіў у склад рэдакцыі "Gazety Warszawskiej", супрацоўнічаў у "Encyklopedii Powszechnej" С. Аргельбранда, рыхтаваў для яе артыкулы пра беларускія гарады (Віцебск, Валожын, Слуцк, Стоўбцы і інш.). У 1869–1877 гг. рэдагаваў папулярны "Kalendarz Jaworowskiego", быў членам рэдкалегіі часопісаў "Wieniec" (1878), "Tygodnik Powszechny" (1878–1885) і "Tygodnik Ilustrowany" ("Ілюстраваны штотыднёвік") (1886–1891). Памёр В. Каратынскі на працы, за пісьмовым сталом. Журналістцкую справу бацькі прадоўжылі яго сыны і ўнук Генрык, які напісаў кнігу ўспамінаў "Па-рознаму бывала..." (1972), дзе ёсць раздзел, прысвечаны дзеду. Спадчына В. Каратынскага была сабрана (у перакладах і арыгінале) У. Мархелем у "Творах" (Мн., 1994. 2 выд.). Партрэт В. Каратынскага стварыў мастак М. Купава.

Уладзімір Мархель

Карнейчук Мікалай

Карнейчук Мікалай Паўлавіч *(22.1.1920, в. Бербак Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл.), матэматык, прафесар. Член-карэспандэнт Нацыянальнай АН Украіны (1972). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1973).*

Нарадзіўся М. Карнейчук у сялянскай сям'і. У 1955 г. скончыў Днепрапятроўскі універсітэт і быў пакінуты ў ім на выкладчыцкай рабоце. У 1965 г. быў абраны прафесарам гэтага універсітэта. З 1974 г. працуе загадчыкам аддзела ў Інстытуце матэматыкі Украінскай АН.

Навуковыя даследаванні М. Карнейчука прысвечаны тэорыі функцый. Ён рашыў праблему Фавары ў тэорыі набліжэння функцый, распрацаваў новыя метады рашэння экстрэмальных задач, што дазволіла атрымаць шэраг значных вынікаў па набліжэнню некаторых класаў функцый паліномамі і сплайнамі. Даследаваў магчымасць аптымальных набліжэнняў функцый па іх класах з дапамогай лінейных метадаў. Рашыў некоторыя праблемы нелінейнай апраксімацыі, аптымальнага аднаўлення функцый і лінейных функцыяналаў.

Вольга Гапоненка

Каро Фердынанд

Каро Фердынанд *(6.5.1845, Брэст — 3.9.1927, маёнт. Канстанцін, Польшча), фармацэўт, даследчык флоры Усходняй Сібіры.*

Пачатковую адукацыю Ф. Каро атрымаў у Вроцлаве, дзе скончыў пачатковую школу і рэальнае вучылішча. У 1861—1863 гг. працаваў ў аптэцы ў Варшаве. Прымаў удзел ў паўстанні 1863 г. , за што арыштоўваўся. З 1866 г. вучыўся на фармацэўта на медыцынскім аддяленні ў Галоўнай школе ў Варшаве, курс якой паспяхова скончыў у 1868 г. Працаваў з таго часу правізарам у аптэцы ў Лосічах каля Седльцаў. У 1874 г. адкрыў уласную аптэку ў Чанстахове. З 1880 г. працаваў у вайсковай аптэцы ў Любліне. У 1887 г. пераехаў у Сібір, дзе кіраваў вайсковай аптэкай у Нежынску. З 1897 г. жыў у Благавешчанску. У 1913 г. набыў аптэку ў Варшаве.

Навуковыя працы Ф. Каро прысвечаны фларыстыцы і фіта-медыцыне. Даследаваў лекавыя ўласцівасці розных відаў раслін, знайшоў шэраг новых батанічных відаў раслін і апісаў іх. Першыя свае фларыстычныя даследаванні выканаў у час вучобы ў Галоўнай школе: збіраў расліны і рыхтаваў з іх лекавыя зборы. Спісы сабраных ім раслін з апісаннем іх фармакалагічных уласцівасцей былі апублікаваны Ф. Каро ў часопісах "Osterreichische Botanische Zeitschrift" (1867, 1871, 1879) і "Pamiktnik Fiziograficzny" (1881, 1883). Адным з першых даследаваў флору Прыбайкалля. Сабраў калекцыю раслін з 18 000 адзінак, якія належалі да 400 розных відаў (калекцыя Ф. Каро апісана чэшскім вучоным І. Фрэйнам у "Osterrerchische Botanische Zeitschrift" у 1889—1902 гг.). Сабраў калекцыю флоры ўзбярэжжаў Амура з 7000 адзінак, якія належалі да 270 розных відаў. У 1901 г. перадаў Варшаўскаму фармацэўтычнаму таварыству калекцыю з 4000 узораў лекавых раслін. Зборы лекавых раслін Ф. Каро былі ўзнагароджаны сярэбранымі медалямі на выстаўках у Маскве (1892) і Хабараўску (1899).

Член Варшаўскага фармацэўтычнага таварыства і з 1920 г. яго бібліятэкар, ганаровы член Польскага батанічнага таварыства. Імя Ф. Каро нададзена многім разнастайнасцям невядомых раней відаў раслін.
Памёр Ф. Каро ў сваім маёнтку Канстанціне пад Варшавай. Пахаваны ў Варшаве на Павонзкаўскіх могілках.

Вольга Гапоненка

Карповіч Алесь

Карповіч Алесь (Аляксандр) Аляксандравіч *(12.4.1934, в. Рубанава Ветрынскага р-на, цяпер Полацкі р-н Віцебскай вобл.), інжынер, грамадскі дзеяч беларускай дыяспары ў Латвіі.*

А. Карповіч пасля заканчэння ў 1954 г. Дзісненскай сярэдняй школы праходзіў службу ў радах Савецкай Арміі (1954–1957). Вучыўся ў Рыжскім авіяцыйным вучылішчы спецыяльных служб грамадзянскай авіяцыі па спецыяльнасці радыёлакацыя (1957–1960). Працаваў тэхнікам у Краснаярскім аэрапорце (1960–1963). У 1963 г. пераехаў у Рыгу, дзе завочна вучыўся на радыётэхнічным факультэце Рыжскага політэхнічнага інстытута (1963–1970). З 1963 па 1969 г. працаваў на чыгунцы, на радыёрэлейнай сувязі ў г. Елгава. З 1969 г. працаваў у навукова-даследчым інстытуце радыёізатопнага прыборабудавання ў галіне радыёэлектронікі. У 1992 г. выйшаў на пенсію. А. Карповіч з 1988 г. пачаў актыўна займацца грамадскай дзейнасцю. Прымаў непасрэдны ўдзел у стварэнні Таварыства беларускай культуры "Світанак", быў выбраны сябрам Рады таварыства. Сабраў бібліятэку беларускіх кніг і часопісаў. Многа часу прысвячае грамадскай справе па адраджэнню беларускасці ў Латвіі. Пры яго непасрэдным удзеле ствараліся Таварыства беларускай мовы "Прамень" (1990). Першы год ён выконваў абавязкі намесніка старшыні, потым на працягу 5 гадоў — старшыні таварыства. З 1997 г. — старшыня Рады Таварыства беларускай мовы "Прамень". Займаўся справай згуртавання сяброў ансамбля "Надзея" і сяброў ТБМ "Прамень" у адну суполку, арганізацыяй выдання газеты беларусаў Латвіі "Прамень", Латвійскага фонду беларускай культуры. З пачатку арганізацыі фонду (1995) быў намеснікам старшыні, а з 1997 г. — старшынёй фонду. Дапамагаў беларусам рэгіёнаў Латвіі ў стварэнні суполак. А. Карповіч займаўся наладжваннем сяброўскіх адносін паміж суполкамі Латвіі. У далейшых планах А. Карповіча — стварэнне ў Рызе Цэнтра беларускай культуры, пры якім павінна працаваць бібліятэка, кіёск беларускіх газет, кніжак і аўдыекасет з беларускімі песнямі.

М. Карповіч прымаў удзел у навуковых канферэнцыях, прысвечаных культуры беларускага замежжа, беларускаму кнігадрукаванню.

Мікола Буры (Рыга)

Карсалін Кандрат

Карсалін Кандрат Ільіч *[9(22).3.1809, Слуцк Мінскай губ., цяпер Мінская вобл. – 1884 (?), Слуцк], мастак. Акадэмік Пецярбургскай акадэміі мастацтваў (1854).*

Нарадзіўся К. Карсалін у незаможнай мяшчанскай сям'і. Дванадцацігадовым хлапчуком пачаў пісаць самавукам абразы, а з 14-ці гадоў працаваў памочнікам іканапісцаў. Першыя ўрокі партрэтнага майстэрства атрымаў пад кіраўніцтвам Тамаша Геса — выкладчыка Слуцкай гімназіі, выхаванца Віленскай мастацкай школы, вучня Я. Рустэма. З 1830 г. жыў у Арле з мастацкай працы. З 1838 г. — вольны слухач Пецярбургскай акадэміі мастацтваў, дзе ў 1839 г. атрымаў званне пазакласнага мастака. Не меў сродкаў працягваць вучобу і да 1843 г. знаходзіўся ў складзе Рускай духоўнай місіі ў Пекіне. Там шмат працаваў у партрэтным жанры, першым з беларусаў маляваў Кітай, пазнаёміўся з дыпламатам і вучоным-беларусам І. Гашкевічам. Пакінуў місію па стану здароўя і 10 гадоў правёў у Іркуцку, затым вярнуўся ў Пецярбург ужо сталым майстрам. У сярэдзіне 60-х гг. пакінуў службу пры акадэміі і хадайнічаў аб пенсіі, але яна была такой мізэрнай, што ён быў вымушаны даваць прыватныя ўрокі. Па новых архіўных звестках, адшуканых І. Ціткоўскім, з 1879 па 1883 г. Карсалін жыў у Слуцку і памёр тут у канцы 1883 ці на пачатку 1884 г.

Для творчасці К. Карсаліна характэрны адыход ад канонаў акадэмічнага класіцызму, пра што сведчаць шматлікія партрэты яго сучаснікаў. Пісаў абразы, карціны на біблейскія сюжэты і пейзажы. Айчынныя мастацтвазнаўцы падкрэсліваюць выкарыстанне таленавітым беларусам розных мастацкіх традыцый (сінтэз беларускага мастацтва XVII–XVIII стст., рускай акадэмічнай школы і кітайскага жывапісу).

Галіна Сяргеева

Касовіч Каятан

Касовіч Каятан Андрэевіч *(2.5.1814, Полацк – 24.1.1883, Санкт-Пецярбург, Расія), філолаг, прафесар (1857). Першы вучоны-санскрытолаг у Расіі.*

Нарадзіўся К. Касовіч ў сям'і свяшчэнніка. Пачатковую адукацыю атрымаў у Полацку. Вучыўся ў гімназіі ў Віцебску (скончыў у 1832 г.), дзе звярнуў на сябе ўвагу поспехамі ў старажытных мовах. Быў накіраваны ў Маскоўскі універсітэт "за казённы кошт". Скончыў у 1836 г. першае аддзяленне філасофскага факультэта Маскоўскага універсітэта са ступенню кандыдата. У 1839 г. быў прызначаны старшым настаўнікам грэчаскай мовы Цвярской гімназіі, а ў 1843 г. пераведзены настаўнікам таго ж прадмета ў 2-ю Маскоўскую гімназію. У 1845–1847 гг. — выкладчык у Інстытуце ўсходніх моваў Лазарава ў Маскве. У 1843 г. выйшла першае выданне яго "Элементарнай граматыкі грэчаскай мовы", у 1847 г. "Грэчаскіа-рускі слоўнік". У 1850 г. быў прызначаны рэдактарам вучэбных прац Імператарскай Публічнай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбургу. У 1851 г. камандзіраваны ў Лондан у Брытанскую бібліятэку. З 1858 г. выкладаў санскрыт у Пецярбургскім універсітэце. У 1854–1856 гг. быў надрукаваны яго "Санскрыцка-рускі слоўнік". У 1860 г. заняў пасаду экстраардынарнага прафесара кафедры санскрыцкай славеснасці. У 1864 г. Савет Харкаўскага універсітэта прысудзіў яму ступень доктара параўнальнага мовазнаўства. У гэтым жа годзе К. Касовіч быў зацверджаны экстраардынарным, а ў 1866 г. ардынарным прафесарам Пецярбургскага універсітэта.

Апрача санскрыту вывучаў таксама яўрэйскую і арабскую мовы. Прымаў актыўны ўдзел у распрацоўцы навучальных праграм для Пецярбургскага універсітэта. У 1857 г. быў абраны членам-карэспандэнтам Харкаўскага універсітэта. Член Рускага геаграфічнага таварыства (1849).

Вольга Гапоненка

Касцюшка Вацлаў

Касцюшка Вацлаў *(21.1.1911, в. Геранёны Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл. — 1.11.1984, Вільнюс), мастак.*

В. Касцюшка ў 1935 г. скончыў Каўнаскую мастацкую школу. У 1937–1940 гг. удасканальваў сваё майстэрства ў Парыжы. З 1947 да 1951 г. выкладаў у Вільнюскім мастацкім інстытуце, з 1951 да 1953 г. — у Мастацкім інстытуце Літвы.

У 1953–1963 гг. працаваў мастаком на камбінаце "Дайле" ў Вільнюсе. У 1964–1971 гг. —выкладчык Вільнюскага універсітэта.

В. Касцюшка з 1940 г. удзельнічаў у выстаўках. Аўтар батальных кампазіцый "Партызаны змагаюцца за Вільнюс" (1946), "Вызваленне Вільнюса" (1949). Пісаў пейзажы, ілюстраваў кнігі. Ім зроблена мастацкае афармленне зборніка народных песень "Два пеўнікі" (1949) і зборніка казак "Коцік і пеўнік" (1955). Праілюстраваў таксама "Звяры-музыкі" П. Цвіркі і "Пыхлівы заяц" Э. Межэлайціса. Маляваў плакаты, афармляў спектаклі, рабіў экслібрысы. Творам В. Касцюшкі ўласцівы рэалістычнасць малюнка, сюжэтнасць, пастэльнасць фарбаў.

Яніна Кісялёва

Каўка Аляксей

Каўка Аляксей Канстанцінавіч *(20.9.1937, в. Равецкі Бор (цяпер Машчаліна) Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл.), гісторык, літаратуразнавец, беларускі грамадскі дзеяч у Расіі. Доктар філалагічных навук (1991).*

А. Каўка скончыў Мінскі бібліятэчны тэхнікум (1954), філалагічны факультэт БДУ (1961), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1971). З 1968 г. жыве і працуе ў Маскве — адказны арганізатар міжнароднага аддзела ЦК ВЛКСМ, у 1971–1979 і 1983–1987 гг. — старшы навуковы супрацоўнік, загадчык сектара Польшчы Інстытута эканомікі сусветнай сацыялістычнай сістэмы АН СССР. У 1979–1982 гг. — прадстаўнік Саюза савецкіх таварыстваў дружбы і культурных сувязей з замежжам, саветнік пасольства СССР у Польшчы (урыўкі з польскага дзённіка "Недыпламатычныя нататкі" надрукаваў у Ніве. 1997. 1 снеж). З 1987 г. — галоўны рэдактар часопіса

"Советское славяноведение", з 1989 г. — вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута сусветнай літаратуры імя А. М. Горкага Расійскай АН. Доктар філалагічных навук (1991).

А. Каўка даследаваў гісторыю Польшчы, савецка-польскіх адносін ("Польшча: Бацькаўшчына і сацыялізм". 1977). З канца 1970-х гг. засяродзіўся на праблемах беларускага Адраджэння, спадчыне Ф. Скарыны ("Тут мой народ: Францішак Скарына і беларуская літаратура XVI – пачатку XX ст." М., 1988; "Жывом!" М.; Мн.,. 1997; "Будам жыць!" Мн., 1998). У 1979 г. на рускай і англійскай мовах у Лондане ананімна выдадзены яго "Ліст да рускага сябра". Укладальнік літаратурна-навуковых зборнікаў "Скарыніч" (Мн., Вып. 1–4, 1991–1999). Даследуе жыццё і творчасць М. Улашчыка: адказны рэдактар зборніка "Русь–Літва–Беларусь: Праблемы нацыянальнай самасвядомасці ў гістарыяграфіі і культуралогіі" (1997), які падрыхтаваны па матэрыялах навуковай канферэнцыі ў Маскве, прысвечанай 90-м угодкам М. Улашчыка, адзін са складальнікаў біябібліяграфічнага даведніка "М. М. Улашчык" (1996), адзін з рэдактараў спецыяльнага нумара "Беларускага гістарычнага агляду" (1996. Т. 3.), прысвечанага М. Улашчыку. У 1988–1990 гг. — старшыня Рады Маскоўскага таварыства беларускай культуры імя Ф. Скарыны. У 1991–1995 гг. узначальваў Маскоўскую рэгіянальную асацыяцыю Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Уваходзіць у праўленне Міжнароднага фонду імя Янкі Купалы. Узнагароджаны медалямі Ф. Скарыны; 850-годдзя Масквы.

Віталь Скалабан

Клімовіч Адольф

Клімовіч Адольф Юсцінавіч *(20.4(3.5).1900, в. Клюшчаны Свянцянскага пав. Віленскай губ., цяпер Астравецкі р-н, Гродзенскай вобл. – 24.11.1970, Вільнюс, Літва), грамадскі і культурны дзеяч, журналіст, выдавец.*

А. Клімовіч у час вучобы ў Віленскай беларускай гімназіі быў адным з арганізатараў культурна-асветніцкага гуртка. Гурток выдаў 7 нумараў часопіса "Маладое жыццё", мэтай якога з'яўлялася "гартаванне маладых беларускіх сіл на змаганне за духоўнае адраджэнне Беларусі". У 1918 г. удзельнічаў у Беларускай канферэнцыі (Вільня). У 1921 г. скончыў гімназію, а таксама Беларускія настаўніцкія курсы, пасля чаго разам з Н. Арсенневай і іншымі слухачамі атрымаў пасведчанне з запісам: "Можна быць беларускім настаўнікам". У 1922–1928 гг. А. Клімовіч вучыўся ў Пражскай вышэйшай школе інжынераў сельскай і лясной гаспадаркі (Чэхаславакія). У студэнцкія гады займаўся актыўнай грамадскай дзейнасцю — узначальваў Беларускую грамаду ў Празе, аддзел міжнародных зносін Аб'яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый (АБСА; 1926–1928), прымаў удзел у міжнародных з'ездах, кангрэсах у Рыме, Жэневе і інш. Пасля вяртання ў Заходнюю Беларусь не мог знайсці працу па спецыяльнасці. Падтрымліваў цесныя кантакты з культурна-асветніцкай арганізацыяй — Беларускім інстытутам гаспадаркі і культуры ў Вільні, кіраваў яго гаспадарчым аддзелам. Адначасова выкладаў у Віленскай беларускай настаўніцкай семінарыі імя Ф. Багушэвіча, але польскія ўлады закрылі яе ў 1932 г. У 1932–1939 гг. рэдагаваў беларускі кааператыўна-гаспадарчы часопіс "Самапомач". Як прадстаўнік Беларускага нацыянальнага камітэта быў накіраваны на XI кангрэс нацыянальных меншасцей у Жэневе (1933), аднак не атрымаў дазволу на выезд за мяжу. Належаў да актыву Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. З 1936 г. — кіраўнік беларускага нацыянальнага прадстаўніцтва ў II Польскай Рэспубліцы, рэдактар інфармацыйнага бюлетэня "Wiadomoњci Biaioruskie". У 1938 г. польская адміністрацыя выслала яго з Вільні, нейкі жыў у Варшаве. У верасні 1939 г. вярнуўся ў Вільню. З'яўляўся сакратаром, старшынёй Беларускага цэнтра ў Літве, рэдактарам газеты "Крыніца". У час Другой сусветнай вайны працаваў у Беларускай народнай самапомачы ў Лідзе. Адмовіўся выехаць на захад перад наступленнем савецкіх войск у 1944 г. Пасля вайны быў арганістам у Жылінах каля Тракай. Арыштаваны органамі МДБ у 1952 г. 28 лютага 1953 г. ваенны трыбунал Маскоўскай ваеннай акругі прыгаварыў яго да вышэйшай меры пакарання, аднак у красавіку 1953 г. расстрэл быў заменены на 25 гадоў лагераў.

Вярнуўся ў Вільнюс у 1960 г. Уладкаваўся на працу арганістам. Падтрымліваў сяброўскія сувязі з многімі дзеячамі беларускай дыяспары ў Літве і інш. краінах. Асабістыя архіўныя матэрыялы, частка бібліятэкі А. Клімовіча захоўваюцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў Мінску. Сярод іх — біяграфічны слоўнік беларускіх грамадскіх і культурных дзеячаў. Пахаваны ў в. Клюшчаны.

Аляксандр Вабішчэвіч (Брэст)

Клімук Пётр

Клімук Пётр Ільіч *(10.7.1942, в. Камароўка Брэсцкага р-на Брэсцкай вобл.), лётчык-касманаўт СССР (1973), генерал-палкоўнік авіяцыі (1980). Двойчы Герой Савецкага Саюза (1973, 1975). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1978).*

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Закончыў Чарнігаўскае вышэйшае авіяцыйнае вучылішча (1963), Ваенна-паветраную акадэмію імя Ю. Гагарына ў Маскве (1977). Канчатковае рашэнне стаць касманаўтам прыняў у 1962–1963 гг. Быў залічаны ў атрад касманаўтаў (1965). Упершыню здзейсніў палёт у космас 18–26 снежня 1973 г.

сумесна з В. Лебедзевым. Другі палёт П. Клімука адбыўся 24 мая – 26 ліпеня 1975 г. з В. Севасцьянавым; наступны, трэці, — 27 чэрвеня – 5 ліпеня 1978 г. у складзе міжнароднага экіпажа з В. Кавалёнкам, А. Іванчанкавым, М. Гермашэўскім.

За час сваёй работы на арбіце П. Клімук удзельнічаў у правядзенні шэрагу навуковых даследаванняў, фізічных, тэхналагічных, медыцынскіх, біялагічных эксперыментаў. Напрыклад, разам з іншымі ўдзельнікамі палёту займаўся візуальнымі назіраннямі, фатаграфаваннем і спектраграфаваннем зорнага неба, актыўных участкаў Сонца, палярных ззянняў, серабрыстых воблакаў і інш. Дзякуючы дзейнасці касманаўта стала магчымым вывучэнне праблем адаптацыі чалавека да абставін палёту, наступнага прыстасавання яго да зямных умоў. П. Клімук напісаў аўтабіяграфічны твор "Зоры — побач: Гісторыя аднаго палёту" (1977). Доўгі час быў дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР (з 1979). Кавалер 3-х ордэнаў Леніна (1973, 1975, 1978), ордэна "Крыж Грунвальда" 1-й ступені ПНР, многіх медалёў.

На радзіме першага беларускага касманаўта ў Брэсце ўстаноўлены бюст (скульптар І. Міско, архітэктар С. Баткоўскі, 1978). У 1976 г. выйшла кніга І. Ваганава, Н. Панасюка пра П. Клімука.

Святлана Сачанка

Клякоўскі Рамуальд

***Клякоўскі Рамуальд** (1.1.1924, Пінск), польскі вучоны ў галіне экалогіі і біяэнергетыкі. Доктар габілітаваны (1966), прафесар (1970). Акадэмік Польскай акадэміі навук (1994), член-карэспандэнт (1979). Замежны член Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1995).*

Пачатковую адукацыю Р. Клякоўскі атрымаў у Пінску. Скончыў Лодзінскі універсітэт (1950). У 1945–1952 гг. — асістэнт, ад'юнкт Лодзінскага універсітэта. У 1952–1987 гг. — загадчык лабараторыі, у 1970–1973 гг. — намеснік дырэктара Інстытута эксперыментальнай біялогіі Польскай акадэміі навук. У 1973–1982 гг. — дырэктар, адначасова, з 1975 г., загадчык лабараторыі Інстытута экалогіі Польскай акадэміі навук. У 1970–1973, 1984–1986 гг. — намеснік акадэміка-сакратара аддзялення біялагічных навук Польскай акадэміі навук, 1987—1995 гг. — акадэмік-сакратар, з 1995 г. – член сакратарыята гэтага ж аддзялення. З 1996 г. – прафесар у Міжнародным цэнтры экалогіі Польскай АН.

Навуковыя даследаванні Р. Клякоўскага прысвечаны праблемам экалогіі і біяэнергетыкі жывых арганізмаў. Быў ініцыятарам і адным з арганізатараў (з 1969) польскіх навуковых экспедыцый ў Антарктыку. Унёс істотны ўклад у вывучэнне энергетычных працэсаў, якія адбываюцца на розных узроўнях арганізацыі жывой матэрыі. Упершыню даследаваў паводзіны арганізма ў палярных рэгіёнах — у Арктыцы і Антарктыцы, што садзейнічала ўстанаўленню і вывучэнню асаблівасцей энергетычных працэсаў жывога арганізма ва ўмовах холаду. Распрацаваў навукова-метадычныя падыходы для аналізу патокаў энергіі ў экасістэмах, якія сёння з'яўляюцца хрэстаматыйнымі і ўключаны ў шматлікія міжнародныя метадычныя выданні па праблемах біяэнергетыкі. Арганізатар і каардынатар праектаў Польскай акадэміі навук у галіне аховы навакольнага асяроддзя.

Аўтар звыш 140 навуковых прац, у т. л. трох манаграфій. Сярод асноўных прац вучонага — "Экалагічная біяэнергетыка жывёлін са зменнай тэмпературай" (Варшава, 1993). "Матэматычнае мадэляванне экалагічных працэсаў" (Варшава, 1996).

Вольга Гапоненка

Коган Пётр

***Коган Пётр Сямёнавіч** (20.5.1872, Ліда – 2.5.1932, Масква), рускі гісторык літаратуры, крытык, перакладчык, прафесар.*

Нарадзіўся П. Коган у сям'і ўрача, калежскага саветніка. Класічную гімназію закончыў у Магілёве. У 1890 г. паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага універсітэта. Ва універсітэце стварыў студэнцкі гурток аматараў заходнееўрапейскай літаратуры. Светапогляд П. Когана сфарміраваўся ў студэнцкія гады пад уплывам І. Тэна, Г. Пляханава, "Камуністычнага маніфеста". Закончыўшы універсітэт у 1896 г., атрымаў рэкамендацыю для падрыхтоўкі да прафесарскага звання. Аднак папячыцель Маскоўскай акругі запярэчыў гэтаму, будучы пераканаўным, што нельга "прапусціць у прафесары асобу яўрэйскага паходжання, хаця і прыняўшую праваслаўную веру". Застаўшыся ў Маскве, з 1895 г. пачаў друкаваць артыкулы, нататкі, рэцэнзіі ў "Русской мысли", "Образовании", "Русском слове", "Педагогическом листке". З 1899 г. вёў у газеце "Курьер" бібліяграфічны аддзел. Выдаў "Нарысы па гісторыі заходнееўрапейскай літаратуры" (М., 1903–1910. Т. 1—3. 12-е выд., М., 1943) і "Нарысы па гісторыі найноўшай рускай літаратуры" (М., 1908–1912. Т. 1—3. 7-е выд., М.; Л., 1929. Т. 1—2), працы "Чарнышэўскі ў рускім вызваленчым руху" (Пг., 1917); "А. М. Горкі" (М.; Л., 1928); "Бялінскі і яго час" (М., 1911), "Уільям Шэкспір" (М.; Л., 1931), "Грэчаская літаратура" (М., 1937) і інш. Поспех першай працы

(да 1913 г. было прададзена каля 150 тыс. экз., перакладзена на балгарскую і грузінскую мовы) забяспечыў матэрыяльную незалежнасць і дапамог ажыццявіць даўняе жаданне: пасля здачы магістэрскіх экзаменаў яго зацвердзілі ў канцы 1911 г. прыват-дацэнтам Пецярбургскага універсітэта (быў ў ім да лістапада 1918 г.) з дазволам чытаць лекцыі. Адначасова выбраны прафесарам Вышэйшых жаночых курсаў імя Лесгафта. З вясны 1913 да верасня 1914 г. — у камандзіроўцы ад Пецярбургскага універсітэта (Дзюсельдорф, Франкфурт-на-Майне, Берлін, Парыж і інш.) для вывучэння жыцця і творчасці Г. Гейнэ. Гісторыі літаратур, створаныя Коганам, сведчаць пра яго энцыклапедычную адукаванасць. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ўдзельнічаў у шматлікіх мерапрыемствах і арганізацыях у сферы культуры, у 1918 г. — прафесар і член праўлення Смаленскага універсітэта, у 1921–1930 гг. — 1-га і 2-га Маскоўскіх дзяржаўных універсітэтаў, Усесаюзнага літаратурна-мастацкага інстытута, Даследчага інстытута археалогіі і мастацтвазнаўства. Старшыня Дзяржаўнага мастацкага камітэта Наркамасветы і інш. У працах П. Когана выразна адчуваецца вульгарны сацыялізм, няўвага да мастацкай формы, паэтыкі, але доўгі час яны бы'лі адзіным падручнікам для студэнтаў.

Алесь Карлюкевіч, Браніслава Котава

Копа Сцяпан

Копа Сцяпан *(2.10.1945, в. Маліннікі Бельскага пав. Беластоцкага ваяв., Польшча), музыкант, беларускі грамадска-культурны дзеяч.*

С. Копа вучыўся ў пачатковай школе ў роднай вёсцы (1952–1959). З маленства меў добрыя музычныя здольнасці: спяваў, граў на акардэоне. Закончыў агульнаадукацыйны беларускі ліцэй у Бельску-Падляшскім (1963), дзе займаўся ў духавым аркестры. Вучыўся на настаўніцкіх курсах у Беластоку (1963–1965). З 1966 г. пачаў працаваў у пачатковай школе ў Трасцянцы (Гайнаўскі пав.), дзе выкладаў беларускую мову, музыку, фізічнае выхаванне. З 1967 г. працаваў у Гарадку. Быў кіраўніком жаночага хору пры Гарадоцкім Доме культуры. Вучыўся ў Вышэйшай настаўніцкай школе ў Быдгашчы (1971–1973). Ажаніўшыся ў 1970 г., пераехаў на радзіму жонкі ў Гарадзіяны (1974). Вучыўся ў Вышэйшай педагагічнай школе ў Кельцах. Затым, да 1987 г., працаваў у пачатковай школе № 6 у Беластоку. Цяпер галоўны інструктар музыкі ў Ваяводскім асяродку анімацыі культуры. Выкладаў музыку па класу акардэона ў дзіцячых музычных гуртках. З 1967 г. па сённяшні дзень працуе з Гарадоцкім калектывам "Разспяваны гарадок", з якім удзельнічаў ва ўсіх музычных мерапрыемствах, арганізаваных беларускай дыяспарай у Польшчы, і ў розных конкурсах, у т. л. "Беларуская песня" (1970) і "Савецкая песня" (1980). Кіраваў хорам Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Беластоку (1983–1992), быў музычным кіраўніком ансамбля "Хлопцаў рыбалоўчаў".

Цікавіцца фальклорам С. Копа пачаў з 1987 г. Выдаў зборнікі народных песень "Мая зямля" (1991), "Фальклорны харавы калектыў з Добрыводы" (1994), "Фальклорны харавы калектыў з "Тынцічкі" (1995, апошнія два на польскай мове). Рыхтуе да друку песенны зборнік (звыш 100 песень) калектыву "Арэшкі" і зборнік песень, сабраных у наваколлі Бельска-Падляшскага.

Ірына Тамільчык

Косберг Сямён

Косберг Сямён Арыевіч *[1(14).10.1903, Слуцк – 3.1.1965], вучоны ў галіне авіяцыйных і ракетных рухавікоў, канструктар. Лаўрэат Ленінскай прэміі, Герой Сацыялістычнай Працы.*

С. Косберг нарадзіўся ў сям'і каваля. Скончыў камерцыйнае вучылішча ў Слуцку, у 1925 г. быў прызваны ў армію. У 1926 г. працаваў слесарам ў Ленінградзе, паступіў вучыцца ў Політэхнічны інстытут, адкуль быў пераведзены ў Маскоўскі авіяцыйны інстытут. Скончыў яго ў 1931 г., працаваў у Цэнтральным навукова-даследчым інстытуце маторабудавання, праектных арганізацыях авіяцыйнай прамысловасці СССР: намеснік галоўнага канструктара завода, галоўны канструктар завода. У 1941 г. — галоўны канструктар канструктарскага бюро. У час Вялікай Айчыннай вайны быў эвакуіраваны на ўсход разам з супрацоўнікамі КБ. Распрацаваў поршневыя бензінавыя авіяцыйныя рухавікі, якія выкарыстоўваліся на савецкіх хуткасных знішчальніках, а таксама на бамбардзіроўшчыках канструкцыі Тупалева. Пасля вайны займаўся распрацоўкай турбін, вадкасных рухавікоў для рэактыўных самалётаў-знішчальнікаў канструктараў А. Мікаяна і А. Якаўлева. З 1958 г., пасля сустрэчы з С. Каралёвым, пачаў працаваць ў галіне касманаўтыкі. З 1959 г. — доктар тэхнічных навук. Распрацаваў трэцюю ступень ракеты (да гэтага часу ракеты былі дзвюхступенныя), з дапамогай якой савецкі касмічны апарат быў выведзены на калямесяцавую арбіту, дзе сфатаграфаваў адваротны бок Месяца і ў тым ліку кратэр агульнай плошчай 58 кв. км, які названы імем Косберга. У 1961 г. стварыў трэцюю ступень касмічнай ракеты, на якой у космас падняўся першы касманаўт Ю. Гагарын, за што быў узнагароджаны званнем Героя Сацыялістычнай Працы. Удзельнічаў у распрацоўцы канструкцый, якія выводзілі на арбіту штучныя спадарожнікі Зямлі, касмічныя караблі

"Усход", "Узыход", "Саюз". Стварыў другую і трэцюю ступені ракеты-носьбіта "Пратон", якая даставіла савецкія касмічныя станцыі на Месяц, Марс і Венеру, вывелі ў космас арбітальную станцыю "Салют". С. Косберг узнагароджаны ордэнам Леніна, інш. ордэнамі і медалямі. Загінуў у аўтамабільнай катастрофе. Імем С. Косберга названа вуліца ў Слуцку.

Ларыса Языковіч

Котвіч Уладзіслаў

Котвіч Уладзіслаў *(20.3.1872, в. Осава Лідскага пав. Гродзенскай губ. – 3.10.1944, в. Чорны Бор пад Вільняй), падарожнік, гісторык прыродазнаўства, арыенталіст-манголазнаўца, прафесар. Член-карэспандэнт АН СССР.*

Закончыў Віленскую гімназію і аддзяленне ўсходніх моваў Пецярбургскага універсітэта (1895). Для паглыблення лінгвістычных даследаванняў ажыццявіў некалькі экспедыцый (1895, 1896, 1910, 1917) у калмыцкія стэпы для вывучэння калмыцкай мовы. Цікавіўся археалогіяй, у 1912 г. правёў экспедыцыю на поўнач Манголіі (даліна р. Архон) і Каракарум (Эрдэнэ-Дзуу), дзе знайшоў шэраг цюркскіх і мангольскіх надпісаў.

У 1900 г. быў выбраны дацэнтам, у 1918 г. — прафесарам мангольскай і маньчжурскай філалогіі Пецярбургскага (Петраградскага) універсітэта. З'яўляўся членам Расійскага камітэта даследаванняў Сярэдняй і Усходняй Азіі, дзе ініцыяваў некалькі экспедыцый і пасля апрацаваў іх матэрыялы; у гэты перыяд цікавіўся тунгускімі дыялектамі. Выдаў "Лекцыі па граматыцы мангольскай мовы" (1902), "Калмыцкія загадкі і прыказкі" (1905), "Спробы граматыкі калмыцкай гутарковай мовы" (1915, 1929), а таксама прымаў удзел у выданні гісторыка-геаграфічных манаграфій "Апісанне Маньчжурыі" (1897. Т. 1–2) і "Апісанне Карэі" (1900. Т. 1–3).

Пасля вяртання на радзіму, у 1923 г., стаў прафесарам кафедры філалогіі Далёкага Усходу ў Львоўскім універсітэце. У 1922–1937 гг. быў старшынёй польскага таварыства арыенталістаў, з 1927 г. рэдагаваў "Rocznik Orientalistyczny". Асобнае месца ў навуковай дзейнасці У. Котвіча займаюць працы па гісторыі прыродазнаўства. Апублікаваў шэраг прац пра вядомых падарожнікаў і натуралістаў Ю. Кавалеўскага, А. Мухлінскага, І. Петрашкевіча, Я. Патоцкага і інш. Поўная бібліяграфія яго навуковых прац на рускай, французскай і польскай мовах змешчана ў "Roczniku Orientalistycznym" (1950. Т. 16).

Валерый Ярмоленка

Красоўскі Апалінар

Красоўскі Апалінар Каятанавіч *[27.1.1817 (па інш. крыніцах 9.6.1818), б. маёнтак Каценавічы, цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл. — 9(21).6.1875 (па інш. крыніцах — 18.6.1875), Пецярбург], Расія, архітэктар, педагог, інжынер-генерал-лейтэнант. Член Акадэміі прыгожых мастацтваў у Пецярбургу.*

А.Красоўскі нарадзіўся ў сям'і выкладчыка Віленскага універсітэта. Скончыў Віленскую гімназію. Вучыўся ў Пецярбургскім інстытуце інжынераў шляхоў зносін, па заканчэнні якога (1836) (па інш. крыніцах — 1838) быў пакінуты асістэнтам. Потым стаў прафесарам архітэктуры. У 1848 г. прызначаны дырэктарам Пецярбургскага будаўнічага вучылішча. З 1849 г. загадваў кафедрай архітэктуры Пецярбургскага універсітэта, выкладаў на яго рэальным аддзяленні курс грамадзянскай архітэктуры і будаўнічага мастацтва. З 1869 г. прыкамандзіраваны да Будаўнічай канторы Міністэрства Імператарскага двара. З 1873 г. на пенсіі. Лета праводзіў на радзіме.

Асноўныя навуковыя даследаванні А. Красоўскага прысвечаны грамадзянскаму будаўніцтву. У 1851 г. убачыла свет яго асноўная праца "Грамадзянская архітэктура: Часткі будынкаў", з асобным альбомам чарцяжоў на 102 аркушах. Доўгі час гэтая кніга лічылася лепшым падручнікам у Расіі ў галіне архітэктуры і будаўніцтва. Праз 11 гадоў пасля смерці вучонага, у 1886 г., кніга была перавыдадзена ў Маскве. Пераклаў з польскай на рускую мову папулярны "Слоўнік для інжынераў", апублікаваў шмат артыкулаў па архітэктуры і будаўніцтву ў "Журнале Министерства путей сообщений". Найбольш значны з іх — "Гісторыя старажытнагрэчаскага архітэктурнага стылю" (1854).

Герман Брэгер

Крупенька Аркадзь

Крупенька Аркадзь Сцяпанавіч *(15.2.1931, в. Дуброўка Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл.), заслужаны работнік народнай гаспадаркі Комі АССР, старшыня Рады нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Беларусь" у Рэспубліцы Комі (Расійская Федэрацыя).*

Нарадзіўся А. Крупенька ў сялянскай сям'і. У 1947 г. скончыў 7 класаў Фашчаўскай сярэдняй школы, а затым, у 1951 г., — Аршанскі чыгуначны тэхнікум. Быў накіраваны на работу ў Комі АССР, у Усць-Немскі

леспрамгас. У 1959—1963 гг. вучыўся ў Вышэйшай партыйнай школе ў Ленінградзе. У 1963 г. абраны другім, а ў 1966 г. – першым сакратаром Усць-Куломскага райкама партыі (Комі АССР). У той жа час завочна закончыў 4 курсы гістарычнага факультэта Сыктыўкарскага педінстытута. З 1972 г. — міністр мясцовай прамысловасці Комі АССР. У 1988 — 1994 гг. — намеснік міністра працы і занятасці рэспублікі. З 1994 г. на пенсіі.

А. Крупенька некалькі разоў абіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Комі АССР. На працягу 22-х гадоў з'яўляўся членам абласнога камітэта партыі. У 1997 г. на арганізацыйным сходзе беларусаў абраны старшынёй Рады нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Беларусь". У чэрвені 1997 г. — дэлегат Другога з'езду беларусаў свету, на якім быў абраны членам Вялікай рады. У снежні 1997 г. — удзельнік урадавай дэлегацыі Рэспублікі Комі ў Мінску пры падпісанні — "Пагадненне аб эканамічным і культурным супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Комі". У жніўні 1998 г. абраны прадстаўніком рэгіянальнага аддзялення Комі ў складзе Асамблеі народаў Расіі.

Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонага Працоўнага Сцяга, ордэнам Знак Пашаны і двума медалямі.

Ніна Петухова

Кугель Аляксандр

Кугель Аляксандр (Аўраам) Рафаілавіч *(псеўд. Homo novus і інш.; 1864, Мазыр Мінскай губ., цяпер Гомельскай вобл. – 1928, Ленінград, Расія), рускі тэатральны крытык.*

Нарадзіўся А. Кугель у сям'і равіна. У 1886 г. скончыў юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта. Цікавіўся тэатрам. З 1882 г. выступаў у друку пераважна з тэатральнымі рэцэнзіямі. Разам з актрысай З. Холмскай у 1897–1918 гг. выдаваў і рэдагаваў ілюстраваны штотыднёвік "Театр и искусство", які меў шэраг дадаткаў — зборнікі п'ес і нотаў, тэатральных мемуараў. Своеасаблівым дадаткам да часопіса з'яўляўся таксама "Слоўнік сцэнічных дзеячаў" (1898–1916) — 16 выпускаў на літары А – М. У 1908 г. А. Кугель стварыў тэатр пародыі і сатыры "Крывое люстэрка", якім кіраваў да самай смерці. Востра рэагаваў на ўрадавы антысемітызм, выступаў з палемічнымі артыкуламі ў абарону правоў яўрэйскіх тэатральных труп, за павышэнне іх сцэнічнага ўзроўню. Прымаў актыўны ўдзел у стварэнні Яўрэйскага тэатральнага таварыства (1917). Лепшыя яго артыкулы ўключаны ў зборнікі "Сцвярджэнне тэатра" (1922), "Тэатральныя партрэты" (1923), "Профілі тэатра" (1929). У іх адстойваецца прымат акцёрскага майстэрства ў пастаноўцы, асуджаецца рэжысёрскі дыктат. А. Кугель лічыў сябе дзеячам рускай культуры, але адначасова імкнуўся ўздзейнічаць на развіццё яўрэйскага тэатра, абараняў яго ад праяў антысемітызму.

Браніслава Котава

Кузняцоў Сяргей

Кузняцоў Сяргей Юр'евіч *(19.11.1961, Рыга), урач, доктар медыцынскіх навук, грамадскі дзеяч беларускай дыяспары ў Латвіі.*

С. Кузняцоў паходзіць з беларускай сям'і. Яго продкі па мацярынскай лініі родам з Гомеля. Любоў да беларускай мовы, культуры абудзілася ў хлопчыка пад уплывам бабулі, да якой ён прыязджаў у час канікул. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Рызе. Пасля заканчэння ў 1985 г. Рыжскага медыцынскага інстытута працуе ў навуковай медыцынскай лабараторыі БІАЛАТ. Займаецца навукова-даследчыцкай работай у галіне анкалогіі, распрацоўвае і выпрабоўвае новыя лекі для прафілактыкі і лячэння рака. С. Кузняцоў — аўтар 120 навуковых артыкулаў і шэрагу кніг на латышскай, рускай, англійскай і нямецкай мовах у галіне лячэння анкалагічных захворванняў. Двойчы названы ў дзесятцы лепшых даследчыкаў рака ў Еўропе. З'яўляецца лаўрэатам міжнародных прэмій за распрацоўку унікальных метадаў прафілактыкі і лячэння рака.

С. Кузняцоў актыўна займаецца грамадскай дзейнасцю на ніве адраджэння беларушчыны ў Латвіі. Ён адзін з заснавальнікаў Латвійскага таварыства беларускай культуры "Світанак" у Рызе, якое ўзначальваў з 1988 да 1994 г. Працаваў вядучым беларускай праграмы "Світанак" Латвійскага радыё (1988–1993). У 1993 г. — рэдактар часопіса "Світанак". Артыкулы С. Кузняцова, прысвечаныя пытанням нацыянальнага адраджэння і прапаганды беларускай культуры, перыядычна з'яўляюцца на старонках латвійскіх газет "Padomju Latvija", "Atmoda".

С. Кузняцоў прымаў удзел у Першым з'ездзе беларусаў свету, быў дэлегатам Першага з'езда Народнага фронту Беларусі "Адраджэнне". У 1989 г. выбраны дэпутатам Рыжскага гарсавета. З'яўляецца сябрам Амерыканскай асацыяцыі хіміятэрапіі і Нью-Йоркскай акадэміі навук. Удзельнік міжнародных навуковых канферэнцый і сімпозіумаў у Японіі, Кітаі, Тайландзе, Францыі, Англіі, Канадзе, ЗША і інш. краінах.

Вячка Целеш (Рыга)

Кузьменка Уладзімір

Кузьменка Уладзімір Міхайлавіч *(13.8.1935, в. Заполле Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл.), мастак, культурна-грамадскі дзеяч беларускай дыяспары ў Літве.*

У. Кузьменка нарадзіўся ў сям'і служачага. У час Другой сусветнай вайны з 1943 да 1945 г. разам з маці знаходзіўся ў канцлагерах Польшчы, Германіі, Аўстрыі. Пасля вызвалення хадайнічаў перад амерыканскай вайсковай адміністрацыяй аб вяртанні ў СССР. Выхоўваўся ў дзіцячым доме ў Падброддзі (Пабрадзе, Літва), быў сынам палка вайсковай часці № 40272 у г. Укмярге (Літва). У 1958 скончыў Мінскае мастацкае вучылішча, у 1965 г. – Мінскі тэатральна-мастацкі інстытут. Яго настаўнікамі былі вядомыя мастакі А. Малішэўскі, Л. Лейтман. К. Касмачоў, А. Кашкурэвіч, М. Данцыг, У. Стальмашонак, Х. Ліўшыц. Да 1967 г. У. Кузьменка працаваў выкладчыкам у Мінскім педагагічным вучылішчы, у розных мастацка-вытворчых майстэрнях Мінска і Магілёва, у Вільнюскай студыі выяўленчага мастацтва пры Палацы чыгуначнікаў.

З 1965 г. У. Кузьменка выстаўляўся ў Мінску, Маскве, Санкт-Пецярбургу, Вільнюсе, Магілёве, Йыхве. Яго карціны знаходзяцца ў прыватных калекцыях Літвы, Польшчы, Беларусі, ЗША, Швецыі, Ізраіля, Аўстраліі і інш. краінах свету. Ён выканаў насценныя роспісы (эльфрэска) ў Магілёўскім вучылішчы транспартнай міліцыі, удзельнічаў у афармленні ВДНГ у Мінску, у распрацоўцы эскізаў і афармленні інтэр'ераў архітэктурнага комплекса ў калгасе "Савецкая Беларусь" Камянецкага р-на Брэсцкай вобл., а таксама бара "Шынок у Лявона" ў Мінску. У. Кузьменка – шматпланавы мастак. Ён працуе і алеем, і акварэллю, выдатна валодае тэхнікай кампазіцыі, тонка адчувае настрой прыроды. Шмат увагі надае замалёўкам старога Вільнюса, звяртаецца да нацюрморта і партрэта. Яго стыль блізкі да традыцыі беларускай рэалістычнай школы.

Бярэ актыўны ўдзел у грамадскім і культурным жыцці беларускай дыяспары ў Літве. Узнагароджаны медалём Літоўскай Рэспублікі "У памяць аб 13-ым студзеня". Жыве ў Вільнюсе.

Валянцін Нідзянскі (Вільнюс)

Кулікоў Сяргей

Кулікоў Сяргей Уладзіміравіч *(15.11.1931, в. Полжа Горацкага р-на Магілёўскай вобл.), генерал-маёр (1982), грамадска-культурны дзеяч беларускай дыяспары на Украіне.*

С. Кулікоў нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Да пачатку Другой сусветнай вайны вучыўся ў школе. У час вайны разам з сям'ёй жыў у лагеры партызанскага атрада, потым шэсць месяцаў знаходзіўся ў канцлагеры. Пасля вызвалення роднай вёскі вярнуўся туды і працягнуў вучобу ў школе. У 1949 г. паступіў у Аршанскі тэхнікум чыгуначнага транспарту, адкуль у студзені 1952 г. быў мабілізаваны ў армію. У 1956 г. закончыў ваеннае вучылішча. Афіцэрскую службу праходзіў на розных пасадах. Вучыўся ў Ленінградскай Вышэйшай акадэміі тыла і транспарту. Службу праходзіў у Ленінградскай і Прыкарпацкай ваенных акругах, Беларусі, Запаляр'і, Германіі, Румыніі, на Паўночным Каўказе, Украіне і інш. Выйшаў у адстаўку ў 1990 г.

С. Кулікоў актыўна займаецца грамадска-культурнай дзейнасцю. Стаў ініцыятарам стварэння і кіраўніком Нацыянальна-культурнага грамадства ў Львове "Белая Русь". З 1999 г. удзельнічаў у арганізацыі беларускіх асяродкаў у раёнах Львоўскай вобласці, з 2000 г. — староста культурна-грамадскай арганізацыі "Беларуская абшчына Львоўшчыны". Быў дэлегатам І з'езда беларусаў свету.

Узнагароджаны ордэнам "Чырвоная зорка" і "За службу Радзіме", іншымі узнагародамі, у т. л. замежнымі.

Ірына Тамільчык

Куптэль Міхась

Куптэль Міхась *(12.9.1942, в. Махнатае Беластоцкага ваяв., Польшча), інфарматык, грамадскі і культурны дзеяч беларускай дыяспары ў Польшчы.*

М. Куптэль нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Скончыў Педагагічны беларускі ліцэй ў Бельску-Падляшскім, затым, у 1967 г., — Вышэйшую педагагічную школу ў Гданьску. У 1977 і 1979 гг. як навуковы супрацоўнік Інстытута рыбалоўства падарожнічаў у Арктыку.

З 1981 г. з'яўляецца карэспандэнтам газеты "Ніва". Публікуецца ў навуковых выданнях у галіне інфарматыкі. М. Куптэль з'яўляецца адным з заснавальнікаў Беларускага культурнага таварыства "Хатка" (Гданьск) і цяпер уваходзіць у яго праўленне.

Ала Такіданг

Курака Міхаіл

Курака Міхаіл Канстанцінавіч *(23.9.1872, б. маёнт. Казелле Магілёўскай губ., цяпер Краснапольскі р-н Магілёўскай вобл. – 8.2.1920, Кузнецк, Расія), вучоны-металург, канструктар і будаўнік доменных печаў, аўтар арыгінальных канструкцый і прыёмаў працы ў металургіі.*

Нарадзіўся М. Курака ў збяднелай шляхецкай сям'і. Пачатковую адукацыю атрымаў дома. Вучыўся некаторы час у Полацкім кадэцкім корпусе, гімназіі ў Горках. Вышэйшай адукацыі не мей, але самастойна вывучыў фізіку і хімію ў адпаведнасці з праграмамі вышэйшай школы, ведаў некалькі замежных моваў (нямецкую, французскую). Працоўную дзейнасць М. Курака пачаў у 1890 г. на Аляксандраўскім заводзе па вытворчасці жалеза і жалезапракату Бранскага акцыянернага таварыства (цяпер Днепрапятроўскі металургічны завод). Потым працаваў на металургічных заводах на поўдні Расіі — на Гданцаўскім каля Крывога Рога (з 1892), Марыупальскім (з 1898), Краматорскім (з 1902). Актыўна удзельнічаў у рэвалюцыйных падзеях 1905 г., за што быў сасланы у 1906 г. у Валагодскую губ. У 1908 г., пасля адбыцця пакарання, вярнуўся ў Данецк, дзе працаваў на Юзаўскім металургічным заводзе. Засвоіў многія дапаможныя спецыяльнасці — быў каталем, пробаносам, падручным горнавага майстра. Выключныя здольнасці і веды дазволілі яму ў 1909 г. без вышэйшай адукацыі стаць начальнікам доменнага цэха. У 1917 г. па рашэнню Расійскага урада выехаў на Кузбас для арганізацыі металургічнай прамысловасці.

М. Курака унёс значны ўклад у арганізацыю і развіццё металургічнай прамысловасці Расіі, у распрацоўку перспектыўных тэхналогій выплаўкі сталі. Яму належыць шэраг цікавых тэхналагічных рашэнняў. Сканструяваў і пабудаваў на адной з печаў Краматорскага завода першы ў Расіі механічны скіпавы падымальнік для загрузкі шахты. Распрацаваў арыгінальную канструкцыю горна, якая і цяпер выкарыстоўваецца на доменных печах і лічыцца адной з самых надзейных. Удасканаліў фірменную прыладу для падачы дуцця. Увёў чатыры стандарты маркі фасоннай вогнетрывалай цэглы, што дазволіла ўдвая скараціць час капітальнага рамонту печаў.

Пад кіраўніцтвам М. Куракі распрацаваны праект буйнога металургічнага завода. Гэты праект быў рэалізаваны пры будаўніцтве Кузнецкага і Магнітагорскага металургічных камбінатаў, дзе знайшлі увасабленне многія навуковыя і тэхнічныя ідэі вучонага. М. Курака стварыў школу доменшчыкаў, якая адыграла вялікую ролю ў арганізацыі вытворчасці і ўдасканальванні тэхналогіі плаўкі чыгуна. Сярод яго вучняў — акадэмік АН СССР І. Бардзін. М. Курака падрыхтаваў грунтоўную навуковую працу "Канструкцыі доменных печаў", рукапіс якой быў знішчаны ў 1918 г. пры бандыцкім захопе яго лабараторыі.

Вольга Гапоненка

Куторга Сцяпан

Куторга Сцяпан *[12(24).2.1805, Мсціслаў Магілёўскай губ. – 25.4(7.5).1861, Пецярбург], геолаг, прыродазнавец, падарожнік. Стваральнік і першы старшыня Пецярбургскага мінералагічнага таварыства, прафесар Пецярбургскага універсітэта.*

Сярэднюю адукацыю атрымаў у Пецярбургу і ў 1827 г. паступіў у Пецярбургскі універсітэт. Ужо ў 1828 г. аказаўся ў ліку 20 студэнтаў, якія былі накіраваны ў Дэрпт (Тарту) для падрыхтоўкі да прафесарскай пасады. Абраўшы сваёй спецыяльнасцю заалогію, пачаў грунтоўна вывучаць анатомію і фізіялогію, адначасова праслухаў поўны курс навук на медыцынскім факультэце. У 1832 г. атрымаў ступень доктара медыцыны за працу "De organis vocis positacci erytracy". У 1833 г. атрымаў званне прафесара і (да 1861). кіраваў кафедрай заалогіі ў Пецярбургскім універсітэце. Першы ў Расіі пазнаёміў студэнтаў (1860) з эвалюцыйным вучэннем Ч. Дарвіна. Акрамя гэтага, з 1848 г. выкладаў мінералогію і геагнозію ў Пецярбургскім педагагічным інстытуце, а ў 1835–1848 гг. служыў цэнзарам Пецярбургскага цэнзарскага камітэта і нейкі час — інспектарам прыватных навучальных устаноў Санкт-Пецярбургскай навучальнай акругі. Асноўныя працы С. Куторгі: "Scolopendrae morsitantis anatome" (1834); "Eine Worte gegen die Theorie der Stufenweise Entebung der Organismen"; "Zur Naturgeschichte der Phoca communis" і "Zwei Beobachtungen der Knochenbruche beiden Heerschnephen" (усе 1839); "Beitrag zur Geognosie und Paleontologie Dorpats unseiner Umgebungen" (1835–1837); "Beitrag zur Kenntniss der organismen Uehereste der Kupfersandsnteines am Westlichen Alihange des Urals" (1838). Самай значнай працай С. Куторгі з'яўляецца выдадзеная ў 1852 г. 10-вёрстная геалагічная карта Пецярбургскай губ. — вынік шматгадовых даследаванняў. Гэтая праца была адзначана Дзямідаўскай прэміяй Пецярбургскай акадэміі навук. Шмат навукова-папулярных твораў с. Куторгі надрукавана ў "Библиотеке для чтения" (1845–1860).

Валерый Ярмоленка

Кухто Пётр

Кухто Пётр Апалонавіч *(19.3.1914, в. Карпілаўка Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Глускі р-н Магілёўскай вобл. – 17.11.1975, Барнаул, Расія), лётчык.*

Нарадзіўся П. Кухто ў сям'і лесніка (бацька беларус, маці латышка). У 1930 г. скончыў сямігодку і паступіў ў Полацкі лясны тэхнікум, па заканчэнню якога працаваў тэхнікам па механізацыі лясной гаспадаркі ў Бярэзінскім леспрамгасе. У 1936–1938 гг. служыў у арміі стралком-радыстам. У 1938 г. паступіў на курсы, па заканчэнню якіх быў накіраваны бортрадыстам у Якуцкую авіягрупу. У 1942 г. — у 1-ай Чырвонасцяжнай авіяэскадрыллі, якая пераганяла па ленд-лізу самалёты з ЗША па трасе Уэлькаль (Аляска) — Якуцк — Краснаярск. У 1944 г. накіраваны ў Іркуцк на вучобу. У 1945 г. у якасці другога пілота лятаў на самалёце С-47 па трасе Уэлькаль – Краснаярск, Берлін – Вена, Пхеньян – Пекін – Масква. У канцы 1945 г. пераведзены ў Якуцк, дзе першым пілотам лятаў на ПО-2. Пазней працаваў камандзірам Батагайскага авіяатрада. У 1974 г. пайшоў на пенсію з пасады камандзіра Віксінскай авіяэскадрыллі. Быў узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга і шматлікімі медалямі. У п. Маган і Ціксі цэнтральныя вуліцы названы ягоным імем, а Якуцкае кніжнае выдавецтва ў 1990 г. выпусціла аб ім кніжку В. Нерчу "Апавяданні пра Кухто".

Алесь Баркоўскі (Якуцк)

Кучараў Міхаіл

Кучараў Міхаіл *(20.11.1908, Нясвіж Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Мінская вобл. — 1.10.1950, г. Вільнюс), урач-анколаг, кандыдат медыцынскіх навук (1946).*

М. Кучараў у 1935 г. скончыў Віленскі універсітэт, працаваў у ім выкладчыкам. У 1940–1946 гг. — галоўны ўрач Рэспубліканскага анкалагічнага дыспансера у Вільнюсе. У 1945–1946 гг. адначасова быў інспектарам па анкалогіі Народнага камісарыята аховы здароўя Літоўскай ССР. З 1946 да 1950 г. — галоўны анколаг Міністэрства аховы здароўя, працаваў загадчыкам сектара анкалогіі ў Інстытуце эксперыментальнай медыцыны і анкалогіі. М. Кучараў апублікаваў навуковыя артыкулы аб комплексным лячэнні анкалагічных захворванняў. Вёў практычную работу па арганізацыі ў Літве спецыялізаванай анкалагічнай дапамогі.

Яніна Кісялёва

Лазарэвіч-Шапялевіч Леў Міхаіл

Лазарэвіч-Шапялевіч Леў Міхаіл Юльянавіч *(1.10.1863, Віцебск – 28.1.1909, Харкаў), літаратуразнавец, археолаг, прафесар Харкаўскага універсітэта.*

Нарадзіўся Л.-М. Лазарэвіч-Шапялевіч у шляхецкай сям'і. Скончыў у 1882 г. Віцебскую гімназію і ў тым жа годзе паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Харкаўскага універсітэта. У 1885 г. перайшоў у Новарасійскі (цяпер Адэскі) універсітэт, які скончыў у 1886 г. са ступенню кандыдата і быў пакінуты пры універсітэце для падрыхтоўкі да прафесарскага звання. Слухаў лекцыі ў Пецярбургскім універсітэце. У 1887 г. камандзіраваны для навуковага стажыравання на два гады за мяжу. Займаўся ў Венскім і Мюнхенскім універсітэтах, у Італіі. У кастрычніку 1889 г. здаў магістэрскі экзамен і быў зацверджаны прыват-дацэнтам па кафедры заходнееўрапейскай літаратуры Харкаўскага універсітэта. Чытаў курсы лекцый гісторыі ўсеагульнай літаратуры, італьянскай мовы. У 1892 г. абараніў дысертацыю "Эцюды пра Дантэ. Апакрыфічныя ўводзіны св. Паўла" і атрымаў ступень магістра ўсеагульнай літаратуры. Праз год быў прызначаны выконваючым абавязкі экстраардынарнага прафесара кафедры заходнееўрапейскай літаратуры. У 1895 г. абараніў доктарскую дысертацыю, а ў 1896 г. быў зацверджаны ў званні экстраардынарнага прафесара. У 1900 г. Л.-М. Лазарэвіч-Шапялевіч быў абраны звышштатным ардынарным прафесар, а ў 1904 г. зацверджаны ардынарным прафесарам Харкаўскага універсітэта.

Навуковыя даследаванні Л.-М. Лазарэвіча-Шапялевіча прысвечаны гісторыі заходнееўрапейскай літаратуры, гісторыі літаратуры і культуры сярэдневякоўя. Сваю першую навуковую працу пад назвай "Жукоўскі і рамантызм" вучоны напісаў у студэнцкія гады (1885) і атрымаў за яе залаты медаль. Даследаваў уплывы славянскіх традыцый на нямецкую літаратуру. Сярод яго асноўных навуковых прац — "Фаўст" Гётэ (СПб., 1890), "Нямецкая аповесць на славянскай глебе" (Харкаў, 1905), "Нарысы з гісторыі сярэдневяковай літаратуры і культуры" (СПб., 1900), "Кафедра гісторыі ўсеагульнай літаратуры ў Харкаўскім універсітэце" (Харкаў, 1907). З 1900 г. праводзіў раскопкі старажытнаславянскіх курганоў у Гарадоцкім, Невельскім, Себежскім паветах Віцебскай губ. Пры даследаванні крывіцкіх курганоў выявіў каштоўныя знаходкі, якія паступілі ў Эрмітаж, гістарычныя музеі Масквы, Харкава, музей Віцебскага статыстычнага камітэта.

Л.-М. Лазарэвіч-Шапялевіч быў дэпутатам ад Харкаўскага універсітэта на Міжнародным з'ездзе гісторыкаў у Рыме (красавік, 1903).

Вольга Гапоненка

Лапацін Антон

Лапацін Антон Іванавіч *(8.1.1897, в. Каменная Брэсцкага пав. Гродзенскай губ., цяпер Брэсцкага р-на – 9.4.1965, Масква), савецківаеначальнік, генерал-лейтэнант. Герой Савецкага Саюза (1945).*

У 1916–1917 гг. А. Лапацін служыў у царскай арміі. У Чырвонай Арміі — з 1918 г. Удзельнік грамадзянскай вайны — камандзір эскадрона ў 1-й Коннай арміі. З 1937 г. — камандзір кавалерыйскай дывізіі. На франтах Вялікай Айчыннай вайны з кастрычніка 1941 г. Удзельнік савецка-японскай вайны 1945 г. У 1947 г. кончыў Вышэйшыя акадэмічныя курсы пры Ваеннай акадэміі Генштаба. Праходзіў службу на розных пасадах у штабах ваенных акруг. З 1954 г. — у запасе. Узнагароджаны трыма ордэнамі Леніна, трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Кутузава 1-й ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі. Імем А. Лапаціна названа вуліца ў Будзёнаўску Стаўрапольскага края. Пра А. Лапаціна гаворыцца ў кнізе С. Дрыгі "За подзвігам подзвіг" (Калінінград, 1984).

Алесь Карлюкевіч

Ласкевіч Валянціна

Ласкевіч Валянціна *(28.9.1947, в. Рыбалы Беластоцкага ваяв., Польшча), грамадска-культурны дзеяч беларускай дыяспары ў Польшчы.*

В. Ласкевіч нарадзілася ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння пачатковай школы ў роднай вёсцы вучылася ў сельскагаспадарчым тэхнікуме ў Беластоку. З 1966 г. працавала ў сельскагаспадарчым кааператыве ў Бельску-Падляшскім. Адначасова пачала актыўна займацца грамадскай дзейнасцю на ніве беларускай культуры. З 1970 г. працавала інструктарам, потым кіраўніком культурна-асветнага аддзела Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Беластоку. У 1980 г. на з'ездзе БГКТ выбрана членам Прэзідыума Галоўнага праўлення. З 1984 г. выконвала абавязкі старшыні гарадскога аддзела БГКТ у Беластоку, з 1991 г. — сакратара Галоўнага праўлення. В. Ласкевіч была адным з арганізатараў разнастайных культурных мерапрыемстваў на Беласточчыне — фестываляў "Беларуская песня", "Беласток — Гродна", свята Купалля ў Белавежы, Свята беларускай культуры.

За грамадскую і культурную дзейнасць атрымала шэраг рэгіянальных і дзяржаўных узнагарод, у т. л. залатыя адзнакі "Заслужаны Беласточчыны", "Заслужаны дзеяч культуры", сярэбраны Крыж заслугі.

Ірына Тамільчык

Латышонак Алег

Латышонак Алег Юр'евіч *(27.5.1957, Эльблонг, Польшча), беларускі гісторык, публіцыст, грамадска-палітычны дзеяч у Польшчы.*

У 1980 г. скончыў Ягелонскі універсітэт у Кракаве. Працаваў настаўнікам у школе, супрацоўнікам Гістарычнага музея ў Кракаве, выкладчыкам Ягелонскага універсітэта. З 1991 г. — навуковы супрацоўнік Вайсковага музея ў Беластоку, з 1993 г. — журналіст беларускага тыднёвіку ў Польшчы — газеты "Ніва". У 1996 г. абараніў доктарскую дысертацыю на тэму "Беларускія вайсковыя фарміраванні ў 1917–1923 гг." ва Універсітэце імя М.Каперніка ў Торуні. Адзін з ініцыятараў стварэння ў 1990 г. Беларускага дэмакратычнага аб'яднання, са студзеня 1992 г. старшыня Галоўнай рады БДА, з сакавіка 1996 г. старшыня Беларускага гістарычнага таварыства. Член рэдакцыйнай калегіі часопіса "Беларускія гістарычныя сшыткі" "Białoruskie Zeszyty Historyczne". Галоўныя накірункі навуковых даследаванняў — гісторыя беларускага адраджэння, рэлігійна-царкоўныя адносіны на Беларусі ў XVIII – пач. XX стст., гісторыя беларускіх вайсковых фарміраванняў у 20-я гг. XX ст., беларускі грамадска-палітычны рух у Польшчы ў 80–90-я гг., гісторыя беларускай эміграцыі. Аўтар манаграфіі "Беларускія вайсковыя фарміраванні ў 1917–1923 гг." (Беласток, 1995), прысвечанай гісторыі беларускага вайсковага руху ў Расіі, Літве, Украіне, Эстоніі, лёсу беларускіх вайсковых фарміраванняў у Польшчы — Беларускай вайсковай камісіі, арміі генерала Булак-Балаховіча, арганізацыі "Зялёны дуб", Слуцкай брыгады і інш. Аўтар навуковых і навукова-папулярных артыкулаў у перыядычных выданнях Польшчы, Беларусі, Літвы, ЗША, Вялікабрытаніі. Друкаваўся ў часопісах "Białoruskie Zeszyty Historyczne", "Dyskusja", "Białostocczyzna", "Czasopis", "Беларускія навіны", "Ніва", "Спадчына" і інш. Сябар Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Удзельнік Першага з'езда

беларусаў свету (Мінск, 1993), Першай Усебеларускай канферэнцыі гісторыкаў (Мінск, 1993), навуковых канферэнцый, сімпозіумаў, семінараў у Польшчы, Беларусі, Літве і інш.

Ларыса Языковіч

Леўшчанка Леанід

Леўшчанка Леанід Іванавіч *(4(16).8.1882, Гомель – 24.8.1954), літаратуразнавец, грамадскі дзеяч, педагог.*

Л. Леўшчанка скончыў гімназію ў Кіеве, Кіеўскі універсітэт (1910). Працаваў настаўнікам у Чарнігаўскай губ., у 1915 г. — у 7-й гімназіі ў Кіеве. У 1917 г. выкладаў фізіку і вышэйшую матэматыку на Кіеўскіх вышэйшых курсах Жакулінай. У маі–жніўні 1919 г. — загадчык літаратурна-выдавецкага аддзела Народнага камісарыята асветы Літоўска-Беларускай ССР. З лістапада 1919 г. — выкладчык фізікі Кіеўскага настаўніцкага інстытута, пазней супрацоўнік Украінскага навукова-даследчага інстытута педагогікі, настаўнік фізікі ў школах Кіева і Кіеўскай вобл. У 1917–1919 гг. — адзін з кіраўнікоў кіеўскага беларускага гуртка "Зорка". На з'ездзе воінаў-беларусаў Паўдзёва-Заходняга фронту ў Кіеве (снежань 1917) выступіў з дакладам аб становішчы ў Беларусі. У 1919 г. выдаў у Кіеве, у беларускім выдавецтве "Зорка" анталогію беларускай літаратуры "Дыяменты беларускага прыгожага пісьменства", куды ўвайшлі творы В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Ядвігіна Ш., Я. Коласа, Я. Купалы, С. Палуяна, М. Багдановіча, З. Бядулі, А. Гаруна, бібліяграфічныя даведкі пра пісьменнікаў, уступны артыкул складальніка пад назвай "Гісторыя беларускага прыгожага пісьменства" (пад псеўд. Лявон Леуш). Распрацоўваў беларускую фізічную тэрміналогію (арт. "Пытанне аб беларускай тэрміналогіі" ў газеце "Вольная Беларусь", 1918, № 30, 34). Аўтар школьных падручнікаў, дапаможнікаў па фізіцы (Харкаў, Кіеў, 1929–1935). Лёс яго рукапіснай спадчыны (раман, што пісаўся ў пасляваенныя гады, падручнік па матэматыцы на беларускай мове) невядомы.

Віталь Скалабан

Лех Генадзь

Лех Генадзь Язэпавіч *(6.10.1963, Магілёў), доктар тэхнічных навук, беларускі грамадскі дзеяч.*

Г. Лех нарадзіўся ў сям'і беларусаў. Маці паходзіла з дробнай магілёўскай шляхты, бацька — з сям'і буйных шляхецкіх землеўласнікаў на Заходнім Палессі. У 1980 г. Г. Лех закончыў мастацкую школу № 1, у 1981 г. — Магілёўскую сярэднюю фізіка-матэматычную школу. Завочна вучыўся ў матэматычнай школе пры Маскоўскім дзяржаўным універсітэце. Пасля заканчэння Маскоўскага інстытута сталі і сплаваў (1986) да 1995 г. працаваў ва Усерасійскім інстытуце лёгкіх сплаваў, займаючы розныя пасады — ад малодшага навуковага супрацоўніка да загадчыка сектара і куратара навуковай тэматыкі па Расіі. У 1993 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 1995 г. прайшоў папярэднюю абарону доктарскай. Займаецца навукова-даследчыцкай дзейнасцю ў галіне распрацоўкі новых матэрыялаў і тэхналогій для авіякасмічнай прамысловасці. Мае 11 патэнтаў і больш за 20 апублікаваных навуковых прац. З 1995 г. выконвае абавязкі дырэктара ЗАА "ФІЛМЕТ", якая вырабляе алюмініевыя і тытанавыя паўвырабы.

Са студэнцкіх часоў Г. Лех актыўна займаецца грамадска-культурнай дзейнасцю, выступаючы за кансалідацыю этнічных беларусаў у Расіі. Быў сябрам нефармальнага беларускага зямляцтва, якое аб'ядноўвала студэнтаў-беларусаў трох маскоўскіх ВНУ. У 1989 г. уступіў у Маскоўскае таварыства беларускай культуры імя Ф. Скарыны. У 1990 г. абраны ў Раду ТБК. З 1992 г. — першы намеснік старшыні ТБК, з 1995 г. — старшыня ТБК. У 1998 г. выбраны на другі тэрмін да 2001 г. На Устаноўчым з'ездзе беларусаў Расіі ў 1999 г. выбраны старшынёй Міжрэгіянальнага аб'яднання беларусаў Расіі. У 1998 г. уступіў у маскоўскую філію БНФ, у 1993 г. стаў яе старшынёй. Быў дэлегатам на II, III, IV з'ездах БНФ "Адраджэньне". Разам з групай маскоўскіх беларусаў удзельнічаў у падзеях 1991 і 1993 гг. у Маскве. У 1997 г. на канферэнцыі Еўрапейскай секцыі Рады БНР у Вільнюсе выбраны сябрам Рады БНР, яе прадстаўніком у Расіі.

Г. Лех з'яўляецца галоўным рэдактарам часопіса "Шляхам Скарыны", органа Маскоўскага ТБК, дзе часта выступае з артыкуламі.

Ірына Тамільчык

Лініч Мікалай

Лініч Мікалай Васільевіч *(1922, в. Пасырава Круглянскага р-на Магілёўскай вобл.), ваенны дзеяч, кандыдат тэхнічных навук.*

М. Лініч закончыў Круглянскую сярэднюю школу (1940). Удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне. Закончыў ваенна-паветраную інжынерную акадэмію імя М. Я. Жукоўскага (1953), палкоўнік. У 1956—1984 гг. служыў у Цэнтральным навукова-даследчым інстытуце ВПС, быў начальнікам даследчага аддзела па распрацоўцы авіяцыйных і касмічных трэнажораў для экіпажаў найноўшых самалётаў і касмічных караблёў.
М. Лініч узнагароджаны трыма ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені, медалямі. Цяпер на пенсіі. Жыве ў Маскоўскай вобласці.

Вацлаў Мацкевіч

Луба Віталь

Луба Віталь Канстанцінавіч *(15.12.1947, в. Чорная Вялікая Сямятыцкага пав. Беластоцкага ваяв., Польшча), беларускі літаратар, журналіст.*

В. Луба ў 1972–1977 гг. вучыўся на завочным аддзяленні кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта. У 1966–1974 гг. працаваў настаўнікам у вясковай школе, у 1974–1985 гг. — на партыйнай рабоце. У 1985 г. перайшоў на работу ў Беларускае грамадска-культурнае таварыства ў Беластоку і там займаў пасаду (да 1988) сакратара Галоўнага праўлення БГКТ. З 1988 г. — у "Ніве". У 1988–1992 гг. — яе галоўны рэдактар, у 1992–1997 гг. — адказны сакратар, а з 1998 г. — зноў галоўны рэдактар.

Як журналіст В. Луба выступае ў беларускім і польскім друку з артыкуламі па пытаннях грамадска-палітычнага і культурнага жыцця. Даследуе польскую палітыку ў дачыненні да ўсходніх дзяржаў у апошнім дзесяцігоддзі (Przegląd Wschodni. 1997. № 4) і інш.

Ірына Тамільчык

Лукашук Сяргей

Лукашук Сяргей *(22.7.1944, в. Грэдалі Падляшскага ваяв., Польшча), музыказнавец, грамадска-культурны дзеяч беларускай дыяспары ў Польшчы.*

С. Лукашук нарадзіўся ў беларускай сям'і. Пасля заканчэння ў 1964 г. Педагагічнага ліцэя у Бельску-Падляшскім выкладаў музыку ў пачатковай школе ў Межвіне. Служыў у арміі (1964–1966). Пасля дэмабілізацыі кіраваў пачатковай школай ў Галадах (1966–1970), узначальваў культурна-асветны аддзел Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства (1970–1972). Быў дырэктарам пачатковай школы № 3 у Бельску-Падляшскім. З 1975 г. — дырэктар Бельскага Дома культуры. У 1979 г. С. Лукашук закончыў завочную настаўніцкую студыю ў Беластоку па спецыяльнасці музычнае выхаванне. У 1981 г. паступіў на завочнае музычна-педагагічнае аддзяленне Дзяржаўнай вышэйшай музычнай школы ў Варшаве, якую закончыў з навуковай ступенню магістра мастацтваў.

Творчае жыццё С. Лукашука было звязана з рознымі музычнымі калектывамі. Шмат увагі ён надаваў выхаванню моладзі. Быў акампаніятарам, потым на працягу дваццаці год — дырыжорам беларускага хора "Васілёчкі" (1970–1990), мастацкім кіраўніком маладзёжнага вакальнага калектыву "Дзявочыя ноткі" пры II Агульнаадукацыйным ліцэі з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім, які неаднаразова удзельнічаў у Агульнапольскім фестывалі дзіцячай, маладзёжнай і гарцэрскай песні ў Седльцах. Пры пачатковай школе № 3 у Бельску-Падляшскім кіраваў мастацкімі калектывамі "Нашы дзеці", "Жучкі", "Журавінка". Любоў да беларускай народнай творчасці падштурхнулі С. Лукашука да стварэння калектыва беларускай народнай песні "Маланка", з якім ён гастраляваў па Польшчы, Францыі, Германіі, Беларусі. Выступленні творчых калектываў пад яго кіраўніцтвам заўсёды мелі вялікі поспех на разнастайных конкурсах, фестывалях, імпрэзах беларускай песні, дзе займалі вядучыя месцы. Калектывы далі разам звыш 1200 канцэртаў. З "Маланкай" С. Лукашук запісаў і выдаў тры магнітафонныя касеты з беларускімі песнямі і адну з калядкамі, з дзіцячым гуртам "Журавінка" — з беларускімі дзіцячымі песнямі са спеўнікам, у якім змешчаны словы і ноты запісаных на касету песняў. Плённай працы С. Лукашука спрыяла сям'я — жонка Валянціна, дачка і сын удзельнічалі ў беларускіх мастацкіх калектывах, якімі ён кіраваў.

С. Лукашук актыўна займаецца грамадска-палітычнай дзейнасцю. Ён з'яўляецца аўтарам і рэалізатарам ідэі папулярнай імпрэзы "Дні Бельска-Падляшскага", якія праводзяцца з 1976 г., а таксама цыклічнай імпрэзы

"Бельскія мастацкія кліматы". На працягу апошніх 8 гадоў быў дэпутатам Павятовай рады ў Бельску-Падляшскім, член яе Камісіі асветы і культуры.

Ірына Тамільчык

Лукашэвіч Юзаф

Лукашэвіч Юзаф *(26.3.1927, в. Дубае Пінскага пав. Палескага ваяв., цяпер Пінскі р-н Брэсцкай вобл.), матэматык, прафесар Вроцлаўскага універсітэта (Польшча), рэлігійны, грамадскі і культурны дзеяч.*

Ю. Лукашэвіч мае ў Беларусі і Літве даўнія карані. Дзед па лініі маці Напалеон Роўба (1860–1929) сябраваў з Францішкам Багушэвічам, пасля яго заўчаснай смерці напісаў пра яго падрабязныя ўспаміны. Журналіст і літаратар, ён пакінуў кнігі "Спадарожнік у вандроўцы па Літве і Беларусі" (Вільня, 1909) і цыкл рэпартажаў "Па слядах Вешчуна" (Варшава, 1898), напісаны да стагоддзя з дня нараджэння Адама Міцкевіча. Абедзве гэтыя працы былі ўзноўлены стараннем Ю. Лукашэвіча (Гданьск, 1995, Вроцлаў, 1999, 2000). Бацька, Станіслаў Лукашэвіч, быў землеўласнікам, але пасля Першай сусветнай вайны яго сямейныя ўладанні аказаліся за граніцай, у Літве, таму працаваў настаўнікам у сельскагаспадарчых школах (паміж іншым, у родным Дубае), а пасля, да 1939 г., візітатарам гаспадарчых школ у куратурыі.

Ю. Лукашэвіч распачаў вучобу ў езуіцкай школе ў Вільні. У 1944 г. нядоўгі час быў салдатам VII брыгады Арміі Краёвай. Пасля раззбраення яго вывезлі ў Калугу, адкуль у 1946 г. выехаў у Польшчу. Закончыўшы падрыхтоўчыя курсы ў Торуні, з восені 1946 г. пачаў заняткі матэматыкай ў Вроцлаўскім універсітэце. Пасля яго заканчэння там жа выкладаў. У 1981 г. быў выбраны рэктарам Вроцлаўскага універсітэта (адкліканы ў сувязі з увядзеннем ваеннага становішча). У навуковым даробку Ю. Лукашэвіча звыш 60 навуковых прац у галіне матэматыкі. У 1958 г. быў запрошаны выкладаць у Матэматычным інстытуце Кітайскай акадэміі навук у Пекіне. У 1960 г. атрымаў ад Фонду Форда дзевяцімесячную навуковую стажыроўку ў ЗША. У 1988–1990 гг. з'яўляўся членам Грамадзянскага камітэта пры Леху Валенсе.

Ю. Лукашэвіч — актыўны арганізатар рэлігійнага жыцця. У 1946 г. заснаваў у Вроцлаве гурток каталіцкай студэнцкай арганізацыі "Ювентус хрысціяна" (гэтая арганізацыя ўзнікла ў Мінску яшчэ да рэвалюцыі 1917 г.). Адзін з арганізатараў у 1957 г. Клуба каталіцкай інтэлігенцыі ў Вроцлаве. Затым член навуковай рады епіскапа Польшчы, камісіі Епіскапата па справах экуменізму. Арганізатар і ўдзельнік многіх пешых пілігрымак: у Рым (1980), праз Гродна ў Вільнюс (1992, 1993). У 2000 г. у шосты раз вандраваў пешшу разам з пілігрымамі з Баранавіч да Будслава. З'яўляецца членам праўлення Агульнапольскага клуба прыхільнікаў Літвы і членам рэдкалегіі квартальніка "Літуанія" (Варшава), прысвечанага праблемам Цэнтральна-Усходняй Еўропы (у тым ліку Беларусі). У 2000 г. быў узнагароджаны ганаровым медалём "Інтэгральны гуманізм", устаноўленым літоўскімі і польскімі дзеячамі культуры. У абгрунтаванні гэтай узнагароды ўказана, што яна была нададзена "за рэалізацыю каштоўнасці першынства ва ўсіх галінах грамадскага і прыватнага жыцця".

Наталля Ракіцкая (Гродна)

Лукша Міраслава

Лукша Міраслава *(9.91958, Гайнаўка Беластоцкага ваяв., Польшча), беларуская пісьменніца, журналістка.*

М.Лукша вывучала польскую і рускую філалогію на філалагічным факультэце філіяла Варшаўскага універсітэта ў Беластоку. З 1985 г. працуе журналісткай у беластоцкім тыжнёвіку "Ніва". Аўтар двух паэтычных зборнікаў – "Замова" (1993) і "Ёсць" (1994) і двух зборнікаў прозы – "Дзікі птах верабей" (1992), "Выспа" (1994). Проза пісьменніцы вызначаецца лаканічнасцю і змястоўнасцю. Вонкава гэта аўтэнтычныя запісы аповядаў "простых" людзей пра іх жыццё.

М.Лукша – сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў (1997), сябар Беларускага літаратурнага аб'яднання "Белавежа" (1973).

Ян Чыквін (Беласток, Польшча)

Лур'е Анатоль

Лур'е Анатоль Ісакавіч *(6(19).6.1901, Магілёў – 12.2.1980, Ленінград, Расія), матэматык, прафесар. Член-карэспандэнт АН СССР (1960).*

А. Лур'е атрымаў сярэднюю адукацыю ў Магілёве. У 1925 г. скончыў Ленінградскі палітэканамічны інстытут і быў пакінуты ў ім для выкладчыцкай работы, з 1944 г. загадваў кафедрай гэтага інстытута. У 1935 г. быў абраны прафесарам. У час Вялікай Айчыннай вайны, у 1942–1944 гг., выкладаў ва Уральскім індустрыяльным інстытуце.

Работы А. Лур'е прысвечаны тэарэтычнай і прыкладной механіцы. Выканаў навуковыя даследаванні па тэорыі пругкасці, устойлівасці сістэм аўтаматычнага кіравання, па аналітычнай механіцы. Рашыў некаторыя пытанні дынамікі кіравання касмічным палётам, праектавання аптымальных сістэм кіравання. Прапанаваў метады рашэння і вырашыў некаторыя пытанні прыкладной матэматыкі, тэорыі дыферэнцыйных ураўненняў, аперацыйнага вылічэння. Распрацаваў сімвалічны метад рашэння задач аб раўнавазе пругкага цела. Сярод асноўных прац А. Лур'е — трохтомнае выданне "Тэарэтычная механіка" (Л., 1932–1934), кнігі "Прасторавыя задачы тэорыі пругкасці" (Л., 1955), "Аналітычная механіка" (М., 1961), "Тэорыя пругкасці" (М., 1970).

Навуковая і педагагічная дзейнасць А. Лур'е адзначана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

Вольга Гапоненка

Луцкевіч Лявон

Луцкевіч Лявон *(псеўд. Лявон Крывіцкі, Дзядзька Лявон; 17.3.1922, Вільня – 28.7.1997, Вільнюс), публіцыст, грамадскі дзеяч беларускай дыяспары ў Літве.*

Л.Луцкевіч паходзіў са славутага роду Луцкевічаў, які пакінуў адметны след у гісторыі Беларусі. Яго бацька, Антон Луцкевіч, — вядомы беларускі дзеяч пачатку XX ст., адзін з пачынальнікаў нацыянальнага адраджэння. Вучыўся Л.Луцкевіч у Віленскай беларускай гімназіі (1932–1936). У 1940 г. скончыў Тэхнічны ліцэй, набыўшы там прафесію электрыка. У час Другой сусветнай вайны выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Радашковіцкай і Сычавіцкай школах Маладзечанскага раёна, быў дырэктарам Мастацкай школы ў Баранавічах. У сувязі з гэтым у 1945 г. быў арыштаваны і да 1957 г. знаходзіўся ў лагерах Сібіры, на Калыме. У час зняволення моцна захварэў. Вярнуўся ў Вільнюс у 1958 г. Працаваў электрыкам у калгасах, потым — энергетыкам на заводзе жалезабетонных канструкцый. Адразу пасля вяртання стаў займацца грамадскай дзейнасцю па адраджэнню і вывучэнню культурнай спадчыны беларускага народа. Збіраў матэрыялы пра бацьку, Антона Луцкевіча, дзядзьку, Івана Луцкевіча, іншых вядомых беларускіх дзеячаў, пра Віленскі беларускі музей імя Івана Луцкевіча. Зацікавіўшыся гісторыяй свайго горада, адшуквае архіўныя дакументы, фотаздымкі, паштоўкі з відамі Вільні. Заклапочаны захаваннем беларускіх традыцый і іх вывучэннем, стаў адным з ініцыятараў стварэння ў Вільнюсе "Таварыства беларускай культуры" (1988) і суполкі "Сябрына" (1987). Быў старшынёй Таварыства беларускай школы. Маючы музычныя здольнасці, браў самы актыўны ўдзел у стварэнні хору "Сябрына" (1988), дапамагаў яму ў выбары рэпертуару, сам іграў на музычных інструментах.

Лявон Луцкевіч — аўтар шматлікіх артыкулаў у літоўскім, польскім і беларускім друку. Ён узначальваў рэдакцыйную раду старонкі "Беларус Віленшчыны" ў газетах "Эхо Литвы" і "Kurier Wileński", удзельнічаў у выданні газеты "Рунь". Падрыхтаваў да выдання кнігу аб беларускіх мясцінах "Вандроўкі па Вільні" (выйшла ў ліпені 1998 г.) і "Партрэты віленчукоў", дзе змешчаны 50 партрэтаў беларускіх дзеячаў, звязаных з гэтым горадам. У 1989 г. Лявон Луцкевіч стаў аўтарам і вядучым перадач "Беларускае слова на хвалях літоўскага радыё", працаваў карэспандэнтам беларускай рэдакцыі радыё "Свабода".

Пахаваны на могілках Роса ў Вільні побач з сімвалічнай магілай братоў Луцкевічаў.

Леакадзія Мілаш (Вільнюс)

Лушчыцкі Міхаіл

Лушчыцкі Міхаіл Аляксеевіч *(10.2.1919, м. Колаўка Капыльскага р-на Мінскай вобл.), генерал-маёр медыцынскай службы, доктар медыцынскіх навук (1967).*

М. Лушчыцкі скончыў сярэднюю школу ў в. Цімкавічы. У 1936 г. паступіў у 1-шы Ленінградскі медыцынскі інстытут, адкуль на 3-м курсе быў пераведзены ў Ваенна-марскую медыцынскую акадэмію, якую скончыў у 1941 г. У 1941–1949 гг. служыў на Ціхаакіянскім флоце, быў начальнікам хірургічнага аддзялення ваенна-марскога шпіталя. У 1949–1951 гг. вучыўся на факультэце ўдасканалення ўрачоў Ваенна-медыцынскай акадэміі. З 1951 г. працаваў начальнікам хірургічнага аддзялення Кранштацкага ваенна-марскога шпіталя. У 1957–1961 гг. — ад'юнкт кафедры ваенна-марской хірургіі, з 1961 г. — выкладчык кафедры ваенна-марской і шпітальнай хірургіі Ваенна-медыцынскай акадэміі. У 1973–1986 гг. — загадчык кафедры ваенна-марской і шпітальнай хірургіі. З 1969 да 1973 г. з'яўляўся галоўным хірургам Ваенна-Марскога флоту СССР.

Займаўся навукова-даследчай працай у галіне медыцыны. Аўтар больш як 140 навуковых прац, прысвечаных хірургіі. Распрацоўваў пытанні арганізацыі і аказання хірургічнай дапамогі на Ваенна-Марскім флоце, і, у прыватнасці, на атамных падводных лодках.

Мікалай Нікалаеў (Санкт-Пецярбург, Расія), Ларыса Языковіч

Львовіч Мая

***Львовіч Мая Давыдаўна** (23.4.1933, Адэса, Украіна), беларуская, украінская і габрэйская паэтэса, перакладчыца.*

М. Львовіч нарадзілася ў сям'і габрэяў-выхадцаў з Беларусі. Яе маці паходзіла з Гомеля, бацька — з Веткі. У 1938 г. сям'я пераехала ў Харкаў. У восем гадоў М. Львовіч паступіла ў рускую школу, дзе пазней вывучала і ўкраінскую мову. У 1941 г. яе бацька пайшоў на фронт, маці з дзецьмі эвакуіраваліся. Жылі ў Сталінградзе, Казахстане, у п. Алга Акцюбінскай вобл. Вярнуўшыся пасля вызвалення ў Харкаў, М.Львовіч працягвала вучобу ў школе. Яшчэ ў маленстве пачала пісаць вершы на рускай мове, у школьныя гады напісала першы верш на ўкраінскай мове. Закончыўшы школу з сярэбраным медалём (1951), спрабавала паступіць на ўкраінскае аддзяленне філфака Харкаўскага дзяржаўнага універсітэта. Аднак з-за этнічнага паходжання дакументы яе не прынялі. Вучылася на нямецкім аддзяленні факультэта замежных моваў ХДУ (1951—1952). У снежні 1952 г. была пераведзена на ўкраінскае аддзяленне філфака універсітэта, які закончыла у 1957 г. з адзнакай. Ва універсітэцкай шматтыражцы друкавала свае вершы і пераклады. Яшчэ у час вучобы М. Львовіч цяжка хварэла. Потым па стану здароўя не магла ўладкавацца на работу. У 1959 г. ёй была зроблена аперацыя на сэрцы. З таго часу інвалід II групы. Працавала карэктарам-надомнікам у выдавецтве "Прапор" (1963–1988). Дзякуючы падтрымцы маці і сяброў змагла актыўна працаваць над перакладамі з польскай, чэшскай (В. Галька "Чэшская паэзія", 1964), сербскай (Д. Максімавіч) моваў.

З 1961 г. творы М. Львовіч друкаваліся на старонках украінскіх перыядычных выданняў. Гэтаму спрыялі Г. Кочур, які ўключаў украінскія пераклады М. Львовіч у рэдагаваныя ім зборнікі і анталогіі, і Д. Максімавіч, якая перакладала яе вершы на сербскую мову і двойчы апублікавала іх у Югаславіі. Перакладалі і друкавалі вершы М. Львовіч і ў Беларусі. Пачынаючы з 1968 г. яна ўдзельнічала ў трох беларускіх анталогіях. Пачала пісаць на беларускай мове, пераклала з яе многія паэтычныя зборнікі, дзве кнігі беларускай прозы. Як да першакрыніц М. Львовіч звярталася да беларускіх народных песень, творчасці класікаў і сучасных беларускіх пісьменнікаў — М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа, У. Караткевіча, Л. Геніюш, М. Танка, П. Панчанкі, А. Пысіна, Я. Брыля, Р. Барадуліна, Н. Мацяш, В. Бечыка і інш. У сваю чаргу У. Караткевіч, В. Ярац і інш. знаёмілі беларускага чытача з арыгінальнымі вершамі М. Львовіч, перакладаючы іх на беларускую мову. У 1971 г. паэтэса ўпершыню наведала Беларусь. У 1985 г. выйшаў паэтычны зборнік М. Львовіч на ўкраінскай мове "Земле моя...", у 1995 г. — дзвюхмоўная кніга вершаў "Цяпельца-вогнік". У рукапісах (у тым ліку ў Цэнтры імя Ф. Скарыны) застаюцца многія яе пераклады і вершы, на беларускай мове падрыхтаваныя ёй карткі для ўкраінскага і беларускага сінанімічнага слоўнікаў.

М. Львовіч удзельнічае ў грамадска-культурным жыцці беларускай дыяспары ў Харкаве, сабрала там беларускую бібліятэку. Яна сябра Саюза пісьменнікаў Украіны (1984) і Беларусі (1996), старшыня суполкі харкаўскіх беларусістаў, лаўрэат часопіса "Березиль", актыўны аўтар беларускай і ўкраінскай перыёдыкі.

Аляксандра Кавалёва (Харкаў, Украіна)

Любошыц Нота

***Любошыц Нота** (25.7.1910, Мінск), кінарэжысёр. Заслужаны дзеяч культуры Літоўскай ССР (1976).*

Н. Любошыц у 1936 г. скончыў Усесаюзны дзяржаўны інстытут кінематаграфістаў, вучань С. Эйзенштэйна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1937 да 1948 г. — рэжысёр "Ленфільма" і "Беларусьфільма". Разам з П. Армандам у 1942 г. на кінастудыі "Ленфільм" паставіў кінафільм "Рукавічкі" ("Самы адважны"). На Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў у 1945 г. зняў фільмы "Нашы дзеці" (з С. Сплашновым) і "25 гадоў БДТ", у 1946 г. —"Выбраннікі народа".

У 1949 г. Н. Любошыц стаў рэжысёрам Літоўскай кінастудыі. Зняў навукова-папулярныя і дакументальныя фільмы "Новыя людзі" (1951), "Мічурынцы Дотнувы" (1952), "Свята песні" (1955), "Вясна Прыбалтыйскага тэатра" (1957), "Поўнач — іх дом" (1965) і інш. Яго аўтарству належыць каля 200 кіначасопісаў "Tarybu, Lietuva".

Яніна Кісялёва

Ляўчук Зміцер

***Ляўчук Зміцер** (псеўд. Фалькоўскі; 3.11.1898, в. Лепясы Гродзенскай губ. цяпер Кобрынскі р-н Брэсцкай вобл. — 1934), украінскі паэт.*

З. Ляўчук нарадзіўся ў сялянскай сям'і. З дзяцінства дапамагаў па гаспадарцы. Нягледзячы на беднасць, бацькі спачатку аддалі хлопчыка ў Кобрынскае рэальнае вучылішча, потым у Брэст-Літоўскую рускую гімназію (цяпер гэта адзін з карпусоў Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта). Добра валодаючы нямецкай мовай, у час Першай

сусветнай вайны З. Ляўчук пранікаў у варожыя гарнізоны, вёў агітацыю супраць вайны сярод кайзераўскіх салдат. Трапіў у канцлагер, які знаходзіўся ў в. Лінова Пружанскага р-на, адкуль яму ўдалося збегчы. Служыў у органах бяспекі. Захварэўшы на сухоты, камісаваўся. У 1923 г. пераязджае ў Кіеў. Пачынае пісаць вершы, якія друкаваліся на старонках перыядычных выданнях Украіны. У 30-я гг. рэпрэсаваны і расстраляны. У 1957 г. рэабілітаваны.

У 1989 г. у Кіеве выдадзены зборнік вершаў З. Ляўчука "Паэзія", у які ўвайшлі лепшыя творы з прыжыццёвых публікацый ва ўкраінскай прэсе, асобная тэматыка якіх — лёс сялянства ў даваенны час.

Уладзімір Замкавец

Мазоль Вацлаў

Мазоль (Мазоліс) Вацлаў (Вацловас) *(1.12.1928, в. Беняконі Лідскага пав. Навагрудскага ваяв., цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл.), хімік, кандыдат хімічных навук (1960).*

В. Мазоль у 1950 г. скончыў Вільнюскі універсітэт. З 1954 да 1962 г. — навуковы супрацоўнік Інстытута хіміі і хімічнай тэхналогіі. У 1962–1963 гг. працаваў выкладчыкам у Вільнюскім універсітэце. З 1963 г. зноў у Інстытуце хіміі і хімічнай тэхналогіі — старшы навуковы супрацоўнік, а з 1975 г. — загадчык лабараторыі арганічнага сінтэза.

В. Мазоль апублікаваў навуковыя артыкулы аб сінтэзе цыклагексанавых кетонаў, ненасычаных алхаголяў, аміна- і серных арганічных злучэнняў і іх уласцівасцях. Разам з іншымі стварыў 15 электралітаў меднага глянцавання, нікелявання, луджэння, сплаваў жалеза з нікелем.

Яніна Кісялёва

Мазялайціс Йонас

Мазялайціс Йонас *(14.10.1907, в. Беняконі Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. — 30.4.1994, Вільнюс), батанік-міколаг, доктар прыродазнаўчых навук, Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Літоўскай ССР (1981).*

Й. Мазялайціс у 1940–1949 гг. настаўнічаў у вільнюскіх гімназіях і школах. У 1946–1947 гг. быў дырэктарам Вільнюскай мужчынскай гімназіі. У 1946 г. скончыў Вільнюскі універсітэт. У 1947–1959 гг. працаваў навуковым супрацоўнікам, навуковым сакратаром Інстытута біялогіі, у 1959–1961 гг. — навуковым сакратаром Інстытута батанікі. З 1961 да 1983 г. — загадчык сектара споравых раслін Інстытута батанікі, старэйшы навуковы супрацоўнік.

Й. Мазялайціс з'яўляецца аўтарам навуковых прац па мікалогіі. Галоўныя з іх — "Ядомыя і ядавітыя грыбы" (1957, з А. Мінкявічусам), "Грыбы" (1966, з А. Грыцусам; 1970. 2-е выд.), "Грыбы афілафаровага парадку Літоўскай ССР" (1976), "Грыбы Літвы" (1980, з В. Урбонасам), "Гастэраміцэты Літоўскай ССР" (1982).

Яніна Кісялёва

Майзель Веніямін

Майзель Веніямін Міхайлавіч *(20.6.1900, Мінск – 28.2.1943, Харкаў, Украіна), матэматык, прафесар. Член-карэспандэнт Акадэміі навук УССР (1939).*

В. Майзель скончыў у 1921 г. Харкаўскі матэматычны інстытут. Потым вучыўся у Харкаўскім інстытуце народнай адукацыі (скончыў у 1922) і Харкаўскім інстытуце народнай гаспадаркі (скончыў у 1923 г.). У 1922–1925 гг. працаваў інжынерам-канструктарам па гідрамашынабудаванню. У 1925–1927 гг. быў намеснікам начальніка Навукова-тэхнічнага ўпраўлення УСНГ УССР. У 1928 г. быў абраны прафесарам і працаваў на педагагічнай рабоце (да 1941) у інстытутах Харкава: механіка-машынабудаўнічым, авіяцыйным, інжынерна-будаўнічым і аўтадарожным, з 1933 г. — у Харкаўскім фізіка-хіміка-матэматычным інстытуце, з 1934 г. — у Харкаўскім універсітэце. Адначасова працаваў у Інстытуце збудаванняў, Інстытуце энергетыкі і Інстытуце будаўнічай механікі АН УССР.

Асноўныя навуковыя даследаванні В. Майзеля — у галіне тэорыі гідратурбамашын, дынамікі машын, тэорыі пругкасці. Вызначыў рух вадкасці ўнутры колаў цэнтрабежных помпаў з улікам уплыву колькасці лапатак і іх профілю. Даследаваў тэорыю гнуткіх валоў. Прапанаваў новыя рашэнні ў рабоце кампрэсараў. Унёс уклад у распрацоўку аптычнага метада даследавання напружанняў. В. Майзель — аўтар грунтоўных прац па праблеме напружанага стану пругкіх сістэм пад уплывам тэмпературы. Распрацаваў метад, які дазваляе эксперыментальна вырашаць пытанне аб напружаным стане і які носіць цяпер яго імя — "метад Майзеля".

Загінуў у час Вялікай Айчыннай вайны пры вызваленні Харкава.

Вольга Гапоненка

Макарэвіч Іван

Макарэвіч Іван Фаміч *(17.2.1936, в. Казловічы Аршанскага р-на Віцебскай вобл.), хімік, прафесар. Член-карэспандэнт Інжынернай акадэміі Украіны.*

У 1958 г. І. Макарэвіч скончыў фармацэўтычны факультэт Маскоўскага медыцынскага інстытута, у 1963 г. — хімічны факультэт Харкаўскага дзяржаўнага універсітэта. Абараніў дысертацыю на ступень доктара хімічных навук у Інстытуце арганічнай хіміі імя Зялінскага Акадэміі навук СССР у 1976 г. У 1978 г. яму прысвоена вучонае званне прафесара. У 1992 г. ён абраны членам-карэспандэнтам Інжынернай акадэміі Украіны.

І. Макарэвіч з'яўляецца аўтарам 300 навуковых прац, 57 вынаходніцтваў і патэнтаў у галіне хіміі прыродных злучэнняў, 5 кніг. Падрыхтаваў 19 кандыдатаў і дактароў навук. Распрацаваў больш за 20 новых высокаэфектыўных прэпаратаў. Узнагароджаны медалямі Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі СССР (1983, 1988), дыпломам і медалём "Вынаходнік СССР" (1985). Жыве і працуе ў Харкаве.

Вольга Гапоненка

Макрэцкі Зыгмунт

Макрэцкі Зыгмунт *(2.1.1865, б. маёнтак Дзітрыкі Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Лідскі р-н Гродзенскай вобл. — 3.3.1936, Варшава), вучоны-энтамолаг, педагог.*

Нарадзіўся З. Макрэцкі ў шляхецкай сям'і. У 1879—1884 гг. вучыўся ў рэальнай гімназіі ў Вільні. Пасля яе заканчэння паступіў у Лясны інстытут ў Пецярбургу, дзе спецыялізаваўся па энтамалогіі, паспяхова скончыў яго ў 1889 г. У 1890—1892 гг. вучыўся ў Харкаўскім універсітэце і адначасова працаваў там асістэнтам на кафедры заалогіі. У 1892—1920 гг. – губернскі энтамолаг ў Сімферопалі. У 1916—1917 гг. прымаў удзел у стварэнні Таўрычаскага універсітэта з агранамічным аддзяленнем у Сімферопалі. Быў абраны там спачатку дацэнтам, а потым прафесарам энтамалогіі. У 1918 г. атрымаў ступень доктара. З 1921 г.— ў Сафіі, галоўны энтамолаг і інспектар аховы раслін ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі Балгарыі. У 1922 г. быў абраны прафесарам і загадчыкам кафедры энтамалогіі і аховы раслін у Галоўнай сельскагаспадарчай школе ў Варшаве (займаў гэтую пасаду да 1935 г.). Вёў курсы насякомазнаўства і аховы лесу для студэнтаў адзялення лесу, курс аб шкодніках раслін для студэнтаў сельскагаспадарчага аддзялення і аддзялення азелянення паркаў. Адначасова, у 1927–1931 гг., выкладаў энтамалогію на матэматычна-прыродазнаўчым аддзяленні Варшаўскага універсітэта.

Навуковыя даследаванні З. Макрэцкага ў асноўным прысвечаны барацьбе са шкодніцтвам насякомых ў сельскай і лясной гаспадарках і парках у паўднёвых рэгіёнах Расіі, галоўным чынам у Крыме, у Балгарыі і Польшчы. Распрацаваў і шырока прапагандаваў спосабы аховы раслін ад шкоднікаў, пры гэтым вялікую ўвагу надаваў выяўленню і выкарыстанню ў барацьбе са шкоднікамі іх натуральных ворагаў – паразітаў і ролі біяцэнозу. Правёў першыя на Украіне і ў Польшчы даследаванні над шкоднікамі сельскагаспадарчых раслін. Выканаў наватарскія даследаванні па распрацоўцы метадаў лячэння і ажыўлення дрэў, унутранай тэрапіі раслін, навуковаму прагназаванню іх развіцця. У 1922—1925 гг. кіраваў работамі па знішчэню шкоднікаў жывёльнага свету Белавежскай пушчы і Татраў. Адзін з ініцыятараў і актыўны арганізатар службы аховы раслін Польшчы.

У 1899 г. арганізаваў ў Сімферопалі Прыродазнаўчы музей, а ў 1913 г. — памалагічную доследную станцыю ў Суглуце. Асноўныя працы З. Макрэцкага — "Аб насякомых, якія былі знойдзены на снезе ў Віленскай губерні" (1893), "Фаўна Крыма" (1914), "Старажытная сасна на руінах Лідскага замка" (1931).

Ганаровы член і прэзідэнт (з 1922) Польскага энтамалагічнага аб'яднання, член і віцэ-прэзідэнт Польскага анатамічна-заалагічнага таварыства, член Польскага батанічнага таварыства, Польскага прыродазнаўчага таварыства імя Каперніка, Навуковых таварыстваў у Варшаве і Вільні, Віленскага памалагічнага таварыства, Таварыства агароднікаў у Варшаве, член і віцэ-прэзідэнт Польскага лясного таварыства, член многіх замежных навуковых таварыстваў.

Пахаваны ў Варшаве на Павонзках.

Януш Чыжэўскі (Варшава)

Максімюк Ян

Максімюк Ян *(18.5.1958, в. Ляхі Гайнаўскага пав. Беластоцкага ваяв., Польшча), беларускі літаратар, перакладчык, журналіст, гісторык, грамадскі дзеяч беларускай дыяспара ў Польшчы.*

Я. Максімюк нарадзіўся у сялянскай сям'і. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Гайнаўскім польскім ліцэі. У 1984 г. закончыў фізічны факультэт Варшаўскага універсітэта. Працаваў настаўнікам, потым — у Беларускім грамадска-культурным таварыстве (1988–1989), у рэдакцыі тыднёвіка "Ніва" (1989–1993). З 1993 г. — перакладчык

пасольства ЗША ў Варшаве. Адзін з арганізатараў Беларускага аб'яднання студэнтаў (БАС) і Беларускага дэмакратычнага аб'яднання ў Польшчы (БДА), заснавальнік беларускага студэнцкага часопіса "Сустрэчы". Прымаў удзел у выданні бюлетэня БДА "Беларускія навіны". З 1998 г. працуе палітычным аналітыкам на Радыё "Свабода" ў Празе.

Я. Максімюк пераклаў на беларускую мову і выдаў у 1993 г. першы том рамана ірландскага пісьменніка Дж. Джойса "Уліс". Рыхтуе да выдання другі том рамана. На стыпендыю Фонду імя Івана Любачкі працаваў у архівах беларускай эміграцыі ў ЗША, вынікам чаго з'явілася кніга "Беларуская гімназія імя Янкі Кулалы у Заходняй Нямеччыне 1945 — 1950 гг.", выдадзеная ў Беластоку ў 1994 г. З'яўляецца ўкладальнікам і перакладчыкам анталогіі сучаснай беларускай паэзіі на польскай мове (1998). Займаецца мастацкімі перакладамі з беларускай мовы на польскую, з англійскай, польскай, французскай, чэшскай — на беларускую. Пераклаў на польскую мову апавяданні А. Глобуса (1998).

Член беларускага літаратурнага аб'яднання ў Польшчы "Белавежа", у 1989–1996 гг. уваходзіў у склад яго галоўнай управы.

Ларыса Языковіч

Мамонька Язэп

Мамонька Язэп Аляксеевіч *(28.1.1889, в. Залессе Слуцкага пав. Мінскай губ. – 10.9.1937), грамадска-палітычны дзеяч.*

У 1907–1917 гг. Я. Мамонька быў членам партыі эсэраў. Служыў у арміі. Удзельнічаў у рабоце III з'езда Беларускай сацыялістычнай грамады ў якасці дэлегата ад 12-й арміі (кастрычнік 1917, Мінск), быў абраны членам ЦК БСГ. Уваходзіў у склад Беларускай арміі і Беларускай Цэнтральнай вайсковай рады. Адзін з арганізатараў Першага Усебеларускага кангрэса (снежань 1917) — актыўна ўдзельнічаў у яго рабоце, уваходзіў у склад Савета старэйшын кангрэса. Пасля прымусовага роспуску кангрэса 17 снежня 1917 г. часова арыштаваны. У 1918 г. уваходзіў у склад прэзідыума Рады БНР, быў адным з кіраўнікоў Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. У снежні 1919 г. стаў сакратаром Прэзідыума Народнай Рады БНР. У кастрычніку 1920 г. удзельнічаў у Беларускай нацыянальна-палітычнай нарадзе ў Рызе. Выступаў за незалежнасць і непадзельнасць Беларусі. У лютым 1921 г. уваходзіў у склад Камітэта загранічных груп беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. У пачатку 1921 г. арыштаваны ў Мінску, перавезены ў Маскву. У красавіку 1921 г. сасланы ў Казань, адкуль збег за мяжу. Удзельнічаў у рабоце Першай Усебеларускай канферэнцыі (верасень 1921, Прага). З 1922 г. жыў у Празе, дзе скончыў тры курсы камерцыйнага інстытута (1925). У 1923 г. пратэставаў супраць стварэння ўрада на чале з А. Цвікевічам. У кастрычніку 1925 г. удзельнічаў у рабоце Другой Усебеларускай канферэнцыі (Берлін), на якой выказаўся супраць самароспуску ўрада БНР. У верасні 1928 г. атрымаў дазвол на пераезд у СССР, быў арыштаваны на ст. Бігосава і перавезены ў Маскву. У студзені 1929 г. асуджаны на 10 гадоў канцлагераў. У верасні 1937 г. пастановай тройкі НКУС Казахскай ССР прыгавораны да вышэйшай меры пакарання; расстраляны. Рэабілітаваны Генеральнай Пракуратурай Рэспублікі Беларусь у 1993 г.

Александр Ціхаміраў

Мандэльштам Леанід

Мандэльштам Леанід Ісакавіч *(4.5.1879, Магілёў – 24.6.1944, Масква), фізік, прафесар. Акадэмік Акадэміі навук СССР (1929; член-карэспандэнт з 1928). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1942).*

Вучыўся Л. Мандэльштам у Новарасійскім (цяпер Адэскім) універсітэце, з якога быў адлічаны за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях. Скончыў Страсбургскі універсітэт (1902), дзе застаўся працаваць. З 1913 г. — прафесар гэтага універсітэта. У 1914 г. вярнуўся ў Расію. Загадваў у 1918–1922 гг. кафедрай фізікі Адэскага політэхнічнага інстытута. З 1925 г. — загадчык кафедры тэарэтычнай фізікі Маскоўскага універсітэта і супрацоўнік Навукова-даследчага інстытута фізікі Маскоўскага універсітэта. З 1934 г. адначасова працаваў у Фізіка-тэхнічным інстытуце Акадэміі навук СССР.

Навуковыя даследаванні Л. Мандэльштама прысвечаны оптыцы, радыёфізіцы, тэорыі нелінейных ваганняў, квантавай механіцы, гісторыі і метадалогіі фізікі. У 1907 г. у працы "Пра аптычна аднастайныя і цьмяныя асяроддзі", якая была прысвечана рассейванню святла, даказаў памылковасць шырока прынятай у той час тэорыі М. Планка і Рэлея, і паказаў, што рассейванне святла абумоўлена неаднастайнасцю асяроддзя. Даказаў у далейшых даследаваннях, што неаднароднасць асяроддзяў абумоўлена статыстычнымі функцыямі шчыльнасці асяроддзя. У 1926 г. незалежна ад французскага фізіка Л. Брылюэна тэарэтычна прадказаў, што пры рассейванні святла пругкім асяроддзем павінна назірацца расшчапленне лініі рассеянага святла (эфект Брылюэна–Мандэльштама). Правёў эксперыментальныя даследаванні, каб выявіць гэты эфект. У 1928 г. сумесна з Г. Ландсбергам

эксперыментальна адкрыў эфект камбінаванага рассейвання святла. З ім жа адкрыў з'яву селектыўнага рассейвання святла. Сумесна з М. Леантовічам распрацаваў тэорыю рассейвання святла ў цвёрдых асяроддзях. Прапанаваў дакладную матэматычную тэорыю аптычных адлюстраванняў. Аўтар шэрагу перспектыўных ідэй у квантавай тэорыі. Распрацаваў у 1928 г. (сумесна з М. Леантовічам) тэорыю праходжання часцінак праз патэнцыяльны бар'ер. Прадказаў існаванне матрыцы рассейвання. Адным з першых зразумеў фізічнае значэнне тэорыі адноснасці і рабіў шмат намаганняў для ее тлумачэння і прапаганды. Сумесна з І. Тамам прапанаваў больш агульную трактоўку суадносін недакладнасцей у тэрмінах "энергія — час", за што яму была прысуджана Дзяржаўная прэмія імя У. І. Леніна (1931). Даследаванні Л. Мандэльштама па тэорыі ваганняў (сумесна з М. Папалексі) прывялі да стварэння новага накірунка ў фізіцы — тэорыі нелінейных ваганняў. Прапанаваў тэорыю, якая разглядала вагальныя працэсы ў радыётэхніцы, акустыцы, аўтаматыцы, электрадынаміцы. З яго імем звязана адкрыццё новых відаў рэзананса, у прыватнасці, рэзананса 2-га роду і стварэнне яго тэорыі, абагульненне і паглыбленне паняцця рэзананса, стварэнне тэорыі стацыянарных ваганняў пры рэзанансе 2-га роду, выяўленне асінхроннага ўзбуджэння, распрацоўка новага метаду генерацыі электрамагнітнай энергіі пры дапамозе параметрычных генератараў.

Л. Мандэльштам унёс істотны ўклад у радыёфізіку і радыётэхніку. Распрацаваў (сумесна з М. Папалексі) новыя спосабы радыётэлеграфнай і радыётэлефоннай мадуляцыі, радыёінтэрферэнцыйныя метады даследавання радыёхваляў і вымярэння адлегласцей, стварыў новую вобласць радыётэхнікі — радыёгеадэзію.

Л. Мандэльштам з'яўляецца заснавальнікам фізічнай школы. Сярод яго вучняў — А. Андронаў, А. Вітт, Г. Ландсберг, М. Леантовіч, І. Тамм, С. Шубін, С. Рытаў, У. Мігулін, інш. вядомыя вучоныя.

Вольга Гапоненка

Маневіч Леў

Маневіч Леў Яфімавіч *(28.8.1898, Чавусы Магілёўскай губ., цяпер вобл. — 12.5.1945, Аўстрыя), ваенны разведчык, палкоўнік. Герой Савецкага Саюза.*

Л. Маневіч з 1918 г. — у Чырвонай Арміі. Удзельнік грамадзянскай вайны: ваенкам браняпоезда, камандзір камуністычнага атрада. Працаваў у палітаддзеле Самара-Златавустаўскай чыгункі. Скончыў Ваенную акадэмію імя М. В. Фрунзе, вучыўся ў Ваенна-паветранай акадэміі імя М. Я. Жукоўскага.

У 20-я — пачатку 30-х гг. Л. Маневіч дабываў важную для СССР разведвальную інфармацыю, працуючы ў краінах Еўропы. Яго псеўданімы — Эцьен, Конрад Кертнэр, Тарасцін. У некаторых краінах Еўропы яго ведалі як камерсанта, уладальніка камерцыйных фірмаў. 12 снежня 1936 г. Л. Маневіча арыштавала італьянская фашысцкая контрразведка. Асобы трыбунал прыгаварыў яго да 12-ці гадоў зняволення. Адбываў пакаранне ў італьянскіх канцлагерах і турмах. У верасні 1943 г. быў вязнем катаржнай турмы на в. Сан-Стэфана, адкуль трапіў у рукі нямецкаму гестапа. Пераведзены спачатку ў канцлагер Маўтхаўзен у Аўстрыі, затым у Мельк, Эбензее. Л. Маневіч стаў там адным з арганізатараў падполля, кіраўніком групы супраціўлення, падпольнай арганізацыі ў канцлагеры Эбензее. Пры яго ўдзеле быў знішчаны падземны шарыкападшыпнікавы завод у Мельку. 6 мая 1945 г. Л. Маневіча вызвалілі амерыканскія войскі, але ён быў цяжка хворы на сухоты і памёр праз некалькі дзён. Яго астанкі спачываюць на могілках Сант-Марцін у г. Лінц (Аўстрыя).

У Чавусах у памяць пра Л. Маневіча ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Адна з вуліц носіць яго імя. Нашаму земляку прысвечана кніга Я. Вараб'ёва "Зямля, да запатрабавання" (М., 1974).

Вацлаў Мацкевіч

Манюшыс Юозас

Манюшыс Юозас *(12.12.1910, в. Малькоўка Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Крычаўскі р-н Магілёўскай вобл. — 17.3.1987, Вільнюс), літоўскі дзяржаўны і партыйны дзеяч.*

Ю. Манюшыс нарадзіўся ў сялянскай сям'і перасяленцаў з Літвы. У 1931 г. скончыў Мінскі педагагічны тэхнікум, у 1938 г. — Ленінградскі аўтадарожны інстытут. У 1931–1932 гг. настаўнічаў у Беларусі. З 1938 да 1941 г. працаваў інжынерам на будаўніцтве мастоў у Кіеве. Бярдзічаве, Ленінградзе. У 1941–1944 гг. — афіцэр Савецкай Арміі, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З канца 1942 г. служыў у асобным літоўскім батальёне, удзельнічаў у абароне Ленінграда. У 1944–1947 гг. — намеснік старшыні Выканаўчага камітэта г. Вільнюса і старшыня Планавай камісіі, у 1947–1950 гг. — старшыня Выканаўчага камітэта г. Каўнаса. З 1950 да 1955 г. — міністр будаўніцтва Літвы. У 1955–1967 гг. — сакратар ЦК КПЛ, а ў 1957 г. — адначасова першы сакратар Гарадскога камітэта КПЛ г. Каўнаса. У 1964–1965 гг. Й. Манюшыс працаваў старшынёй Бюро ЦК КПЛ па кіраўніцтву прамысловасцю і будаўніцтвам. З 1967 да 1981 г. — старшыня Савета міністраў Літоўскай ССР. У 1981–1985 гг. — дырэктар Інстытута эканомікі. З 1967 да 1981 г. — член Камітэта парламенцкай групы Вярхоўнага Савета СССР, у 1962–1984 гг. — старшыня секцыі СССР — Аўстрыя згаданай групы. З 1971 г. — кандыдат у члены ЦК КПСС. У 1951–

1963 гг. і 1967–1985 гг. — дэпутат Вярхоўнага Савета Літоўскай ССР, у 1984 г. — дэпутат Вярхоўнага Савета СССР. Узнагароджаны ордэнамі і медалямі.

Ю. Манюшыс з'яўляецца аўтарам шматлікіх навуковых прац, прысвечаных пытанням эканомікі Літвы і Прыбалтыкі. Галоўныя з іх — "Прамысловасць Савецкай Літвы на шляху тэхнічнага прагрэсу" (1960), "Развіццё будаўніцтва і яго матэрыяльна-тэхнічнай базы ў Літоўскай ССР" (1963), "Тэхнічны прагрэс і развіццё індустрыяльнай базы будаўніцтва ў рэспубліках Прыбалтыкі" (1969), "Эканоміка і культура Савецкай Літвы" (1973), "Навукова-тэхнічны прагрэс у будаўніцтве" (1974), "Савецкая Літва: дасягненні і перспектывы" (1975, 1976), "Эканамічная аснова развітога сацыялізму" (1978), "Жыццё ў працы" (1979), "Савецкая Літва на шляху сацыяльна-эканамічнага развіцця" (1980), "Актуальныя праблемы эфектыўнасці капітальнага будаўніцтва" (1984) і інш.

Яніна Кісялёва

Мараўскі Рышард

***Мараўскі Рышард (Рамуальд);** (1843, Гродзеншчына – ?), мастак, удзельнік вызваленчага руху.*

Паходзіў са шляхты Гродзенскай губ. За ўдзел у паўстанні 1863 г. і ўкрывальніцтва на працягу 2-х гадоў у Варшаве пад імем шляхціца Куленкі, "за набыццё яго пашпарта і крадзёж у гродзенскага натарыуса футра і паліто" па канфірмацыі камандуючага войскамі Віленскай вайсковай акругі быў пазбаўлены шляхецкай годнасці і ўсіх маёмасных правоў і адпраўлены на пасяленне ў Сібір. У лістападзе 1866 г. у Іркуцку быў прызначаны на пасяленне ў Індзінскую вобл. Балаганскай акругі Іркуцкай губ. Але ў сакавіку 1867 г. за дрэнныя паводзіны быў пераведзены ў Якуцкую вобл. і паселены ў Намскім улусе, а потым пераведзены ў 2-гі Хаяхсыцкі наслет Батурускага ўлуса. У 1868 г. яму было дазволена пражываць у г. Якуцку, каб зарабіць сабе на жыццё. У студзені 1872 г. Р. Мараўскі пераходзіць у праваслаўе пад імем Уладзіміра. У маі 1872 г. яму вяртаюць саслоўныя правы і дазваляюць займацца іканапісам. У 1878 г. ён распісваў царкву і капліцы Батурускага ўлуса. У 1878 г. ён знаходзіўся ў г. Ахоцку Прыморскай вобл.

Алесь Баркоўскі (Якуцк)

Маркевіч Арсень

***Маркевіч Арсень Іванавіч** (31.3.(12.4).1855, Брэст-Літоўск, цяпер Брэст — 18.1.1942, Ленінград, Расія), філолаг-славіст, краязнавец, археолаг, архівіст, літаратуразнавец, прафесар. Член-карэспандэнт Акадэміі навук СССР (1927).*

А. Маркевіч нарадзіўся ў сям'і праваслаўнага святара. Вучыўся ў павятовым вучылішчы Брэсцкай прагімназіі. У 1872 г. скончыў гімназію ў г. Бяла Сядлецкай губ. (цяпер Польшча). Вучыўся на філалагічным факультэце Варшаўскага універсітэта, дзе вывучаў сербскую, харвацкую і чэшскую мовы. З 1876 да 1883 г. — выкладчык рускай мовы і славеснасці ў г. Хэлме (Польшча), потым у г. Шаўляі (Літва).

Першую навуковую працу "Юрый Крыжаніч і яго літаратурная дзейнасць" (Варшава, 1876) напісаў у 20-гадовым узросце. З-за матэрыяльнай нястачы вымушаны быў адмовіцца ад прапановы застацца пры універсітэце. У 1883 г. А. Маркевіч пераехаў у Сімферопаль, дзе на працягу 30-ці гадоў займаўся педагагічнай дзейнасцю: выкладаў у Сімферопальскіх мужчынскай і жаночай гімназіях. Пасля падарожжа ў Грэцыю, Егіпет і Палесціну (1884) у яго абудзілася цікавасць да гісторыі Таўрыды — Крыма. З 1887 г. працаваў у Таўрыдскай вучонай архіўнай камісіі, у 1908 г. быў абраны яе старшынёй. Выступаў з артыкуламі на старонках "Известий Тавридской ученой архивной комиссии". Вывучаў гісторыю Крыма, разам з вучнямі гімназіі праводзіў археалагічныя раскопкі паблізу Сімферопаля, у іншых месцах. У часы Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў прыкладаў шмат намаганняў для захавання помнікаў старажытнасці, крымскіх архіваў. У 1918 г. спрыяў адкрыццю Таўрыдскага (цяпер Сімферопальскі) універсітэта, куды ён перадаў сваю бібліятэку, а пазней быў выкладчыкам (1928) і прафесарам. У 1941 г., пасля смерці жонкі, А. Маркевіч пераехаў да дачкі ў Ленінград, дзе працягваў работу над "Тапанімікай Крыма".

А. Маркевіч з'яўляецца складальнікам картатэкі (21 тыс. адзінак), якую ў 1931 г. набыў Інстытут гісторыі матэрыяльнай культуры АН СССР (цяпер захоўваецца ў архіве Санкт-Пецярбургскага аддзялення Інстытута археалогіі), а таксама аўтарам навуковых прац, прысвечаных гісторыі Крыма. Сярод іх — "Паездка ў Стары Крым", "Да гісторыі Бахчысарайскага палаца", "Taurica — вопыт паказчыка сачыненняў пра Крым", "Сімферопаль, яго гістарычны лёс, даўніна і нядаўняе мінулае", "Тапаніміка Крыма". У 1994–1995 гг. у Сімферопалі перавыдадзена яго кніга "Таўрычаская губерня ў час Крымскай вайны. Па архіўных матэрыялах". Займаўся таксама літаратуразнаўчай дзейнасцю, склаў зборнік "Крым ў рускай паэзіі".

Аляксей Гардзіцкі, Вацлаў Мацкевіч

Марцінкенене Юзэфа

Марцінкенене Юзэфа Валянцінаўна *(19.3.1948, в. Цябуты Пастаўскага р-на Віцебскай вобл.), мастачка, дзеяч. беларускай дыяспары ў Літве.*

Ю. Марцінкенене нарадзілася ў беларускай сям'і. Вучылася ў Ацкавіцкай васьмігадовай школе. У 1969 г. скончыла Цырклішскі сельскагаспадарчы тэхнікум (Літва). Вучылася на завочным аддзяленні Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута, пасля заканчэння якога ў 1983 г. атрымала дыплом вучонага-зоаінжынера. Працавала ў розных сельскагаспадарчых структурах Літвы. Цяпер дзяжурны інспектар Свянчонскага ўчастка Вільнюскай тэрытарыяльнай мытні. Жыве ў в. Соры (Сарай) Свянчонскага раёна Літвы.

У 1994 г. пачала прафесійна займацца жывапісам. Удзельнічала ў васьмі персанальных і некалькіх агульных выстаўках, трох рэспубліканскіх конкурсах. Яе карціны выстаўлены ў музеях Літоўскай Рэспублікі, прыватных зборах Польшчы, Расіі, Англіі, Літвы. Галоўная тэматыка творчасці мастачкі — прырода, адзінства чалавека і навакольнага свету. У 1995 г. прынята ў Саюз народных мастакоў Літвы. З 1997 г. з'яўляецца старшынёй Беларускага таварыства Свянцянскага р-на.

Валянцін Нідзянскі (Вільнюс)

Мастовіч Далэнга Тадэвуш

Мастовіч Далэнга Тадэвуш *(10.8.1898, б. маёнтак Акунёва Дзісенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. — паміж 18 і 20.9.1939., мяст. Куты, цяпер Украіна), польскі пісьменнік, журналіст.*

Т. Мастовіч нарадзіўся ў сям'і арандатара маёнтка, Стэфана Мастовіча. Дзяцінства правёў у Глыбокім, куды сям'я неўзабаве пераехала. У 1915 г. скончыў гімназію і да 1917 г. вучыўся на юрыдычным факультэце Кіеўскага універсітэта. У 1919 г. добраахвотнікам пайшоў у польскую армію і ўдзельнічаў у польска-савецкай вайне 1920 — 1921 гг. З 1922 г. жыў у Варшаве і да 1928 г. працаваў у газеце "Rzeczpospolita". Пасля пераварота ў маі 1926 г. стаў апазіцыйным журналістам. У 1930 — 1931 гг. супрацоўнічаў з часопісамі "ABC", "Polonia", "Wiadomości Literackie".

Першыя апавяданні Т. Дадэнгі-Мастовіча з'явіліся ў друку ў 1923 г., а першая аповесць "Апошняя брыгада" была надрукавана ў 1932 г. Вядомасць прынеслі пісьменніку раман "Кар'ера Нікадэма Дызмы", аповесці "Пракурор Аліцыя Горн", "Трэці пол", "Доктар Мурэк звольнены" і "Другое жыццё доктара Мурэка", "Знахар", "Тры сэрцы", "Прафесар Вільчур", "Дзённік панны Ганкі" і інш. Усяго ў даваеннай Польшчы ім выдадзена 16 твораў, з якіх 8 экранізавана. Загінуў у вераснёўскай кампаніі 1939 г. над ракой Чарамош, расстраляны савецкім салдатам.

У гонар Т. Далэнгі-Мастовіча ў Глыбокім на доме 2 па вул. Савецкай устаноўлена мемарыяльная дошка. У 1998 г. да 100-гадавога юбілею ў Глыбокім адбыўся вечар памяці пісьменніка, была арганізавана выстаўка яго кніг. Творы Т. Далэнгі-Мастовіча выстаўлены ў экспазіцыі гістарычнага музея, які знаходзіцца ў сярэдняй школе № 3 г. Міёры.

Юрый Вашкевіч

Матышэўскі Павел

Матышэўскі Павел Сямёнавіч *(10.10.1919, Клешаў Слуцкага р-на Мінскай вобл.), юрыст, прафесар.*

Нарадзіўся П. Матышэўскі ў сялянскай сям'і. У 1939 г. скончыў Грэскую сярэднюю школу і паступіў у Мінскі медыцынскі інстытут. У лістападзе таго ж года быў прызваны ў армію і накіраваны ў Жытомірскае ваеннае вучылішча, якое пасля было пераведзена ў Растоў-на-Доне. У маі 1941 г. атрымаў званне лейтэнанта. З пачатку вайны ў складзе 6-й арміі знаходзіўся на Паўднёва-Заходнім фронце і камандаваў кулямётным узводам. Прымаў удзел у баях на р. Збруч, абараняў Гусяцін, Уладзімір-Валынскі, Жытомір, Міронаўку, Кіеў. Быў паранены пад Палтаваю. Пасля лячэння абараняў Растоў, змагаўся пад Таганрогам, дзе і атрымаў цяжкое раненне, у выніку якога стаў інвалідам вайны.

У кастрычніку 1942 г. П. Матышэўскі паступіў у Азербайджанскі універсітэт на юрыдычны факультэт. У верасні 1944 г. перавёўся ў Кіеўскі універсітэт, які скончыў у 1946 г. Быў пакінуты у аспірантуры (скончыў у 1949). У 1952 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю, а ў 1969 г. — доктарскую. З 1948 да 1997 г. працаваў асістэнтам, дацэнтам, прафесарам кафедры крымінальнага права і крыміналогіі юрыдычнага факультэта Кіеўскага універсітэта. Чытаў курс лекцый з крымінальнага права і спецыяльныя курсы "Злачынствы супраць уласнасці" і "Ваенныя злачынствы". З 1971 да 1990 г. загадваў кафедрай крымінальнага права і крыміналогіі юрыдычнага факультэта Кіеўскага універсітэта, а з 1974 да 1984 г. быў дэканам гэтага факультэта. Чытаў лекцыі ў Браціслаўскім універсітэце (Славакія), Сафійскім універсітэце (Балгарыя), Нацыянальнай юрыдычнай акадэміі Украіны, у

Прававой акадэміі МУС Украіны. Выступаў з навуковымі дакладамі на міжнародных канферэнцыях і сімпозіумах у Рыме, Сафіі, Маскве. У верасні—кастрычніку 1973 г. працаваў у Міжнародным камітэце па барацьбе з міжнародным тэрарызмам пры ААН (Нью-Йорк). Шмат гадоў уваходзіў у склад Навукова-метадычнага савета Мінвуза Украіны, старшыня секцыі крымінальнага права Метадычнага савета пры Вярхоўным судзе Украіны. Як навуковы кіраўнік падрыхтаваў 20 кандыдатаў і 2 дактароў юрыдычных навук. Цяпер працуе прафесарам кафедры крымінальнага права і правасуддзя юрыдычнага факультэта Запарожскага універсітэта, навуковым кансультантам прававога факультэта пры Кіеўскім політэхнічным інстытуце.

П. Матышэўскі з'яўляецца аўтарам 162 навуковых прац, 6 манаграфій, 5 вучэбных дапаможнікаў і сааўтар 4 падручнікаў для студэнтаў юрыдычнага факультэта. Сярод яго манаграфій — "Адказнасць за злачынствы супраць грамадскай бяспекі, грамадскага парадку і здароўя насельніцтва" (М., 1964), "Адказнасць за злачынствы супраць сацыялістычнай уласнасці" (Кіеў, 1968), "Прававыя меры барацьбы супраць п'янства, алкагалізму і наркаманіі" (Кіеў, 1980), "Злачынствы супраць уласнасці і сумежныя з імі злачынствы" (1996).

П. Матышэўскі ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны І-й ступені, пятнаццаццю медалямі. У 1980 г. узнагароджаны сярэбраным медалём Браціслаўскага універсітэта імя Я. Коменскага. У гэтым жа годзе яму прысвоена ганаровае званне "Заслужаны работнік вышэйшай школы Украіны".

Ала Такіпданг

Маўлевіч Каятан

***Маўлевіч Каятан Сямёнавіч** (1844, Гродна – ?), удзельнік вызваленчага руху, медык.*

Нарадзіўся ў мяшчанскай сям'і. Атрымаў фельчарскую адукацыю. У сакавіку 1863 г. быў прызваны на вайсковую службу. Служыў у 72-м Тульскім пяхотным палку, а ў чэрвені 1863 г. далучыўся да паўстанцаў. У жніўні 1863 г. быў арыштаваны і ў час допыту даў ілжывыя звесткі аб сваім званні. Па канфірмацыі вайсковага каменданта Варшавы быў пазбаўлены вайсковага звання і сасланы на пасяленне ў Якуцкую вобл. З Якуцка быў адпраўлены ў Хорынскі наслет Заходне-Кангаласкага ўлуса і паселены на Табагінскай станцыі. Там ажаніўся з дачкой селяніна Марыяй Бутырынскай, якая нарадзіла 3 дачок і сына. Прадпісаннем якуцкага губернатара ад 24 мая 1868 г. пераселены ў Алёкмінскую акругу, дзе быў паселены ў Бярдзенскім паселішчы Алёкмінскай вол. Яму першаму з палітычных ссыльных было дазволена займацца медыцынскай практыкай. Да восені 1872 г. ён служыў фельчарам на прыватных залатых капальнях І. Базілеўскага. Па запыту Якуцкай адміністрацыі генерал-губернатар Усходняй Сібіры 4 верасня 1872 г. дазволіў яму займацца медыцынскай практыкай у г. Алёкмінску і воласці. У чэрвені 1874 г. алёкмінскі акруговы спраўнік у сваім рапарце ўхваляў дзейнасць К. Маўлевіча ў акрузе і асабліва ў горадзе. У 1875 г. ён па пашпарту выехаў у г. Якуцк і ў лютым 1877 г. быў прыпісаны да якуцкіх мяшчан. Працаваў фельчарам. Згодна з Маніфестам ад 15 мая 1883 г. атрымаў правы вольнага выбару месца жыхарства у межах "Еўрапейскай і Азіяцкай Расіі", за выключэннем сталіц і сталічных губерняў. У кастрычніку 1886 г. падаў прашэнне на атрыманне дазволу на выезд з Якуцка.

Алесь Баркоўскі (Якуцк)

Маханько Віталь

***Маханько Віталь Вітальевіч** (13.1.1939, в. Новы Дзедзін Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.), вядучы інжынер-канструктар касмічнай тэхнікі, грамадскі дзеяч.*

В. Маханько нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У 1953 г. закончыў 7 класаў Стара-Дзедзінскай школы. Паступіў у Рослаўльскі чыгуначны тэхнікум, пасля заканчэння якога працаваў на чыгуначнай станцыі Барабінск Новасібірскай вобл. У 1957–1958 гг. служыў у Савецкай Арміі. З 1959 да 1967 г. працаваў на Жданаўскім (цяпер Марыупальскім) заводзе цяжкага машынабудавання кацельшчыкам, электразваршчыкам, тэхнолагам, канструктарам. У 1966 г. закончыў вячэрняе аддзяленне Жданаўскага металургічнага інстытута. З 1967 г. працаваў інжынерам-канструктарам, затым вядучым інжынерам-канструктарам Цэнтральнага канструктарскага бюро эксперыментальнага машынабудавання (цяпер "Ракетна-касмічная карпарацыя "Энергія" імя С. П. Каралёва"). Займаецца стварэннем касмічнай тэхнікі. Мае 7 вынаходніцтваў у гэтай галіне. Прымаў удзел у канструяванні многіх ракетна-касмічных аб'ектаў Месяцахода, "Энергіі", "Бурана", касмічных станцый "Мір", "Альфа" і інш. З 1999 г. на пенсіі. Займаецца садаводствам і пчалаводствам.

Цікавіцца гісторыяй роднага краю, актыўна супрацоўнічае з Клімавіцкім раённым аб'яднаннем краязнаўцаў "Спадчына". Жыве ў Маскве.

Аляксей Кажамяка (в. Пенькаўка Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.)

Мацейка Юозас

***Мацейка Юозас** (16.12.1904, в. Лаздуны Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл.), музейны работнік, дзеяч літоўскай культуры.*

У 1928–1939 гг. Ю. Мацейка ўдзельнічаў у рабоце Літоўскага навуковага таварыства, іншых літоўскіх таварыстваў у Вільні. У 1934 г. скончыў аддзяленне сацыялогіі тэалагічнага і філасофскага факультэта Віленскага універсітэта.

Ю. Мацейка пісаў краязнаўчыя артыкулы, склаў і выдаў на літоўскай мове насценныя календары на 1937—1940 гг. Пераклаў з польскай мовы кнігу М. Кацпжака "Гігіена вясковай хаты". У 1940–1941 гг. — настаўнік у гімназіі, з 1941 г. — бібліёграф бібліятэкі АН Літвы. Сабраў шмат рукапісных матэрыялаў пра бібліятэку, друк віленскіх літоўцаў у 1919–1939 гг. У 1945–1959 гг. — загадчык аддзела Мастацкага музея, 1960 да 1967 г. — галоўны захавальнік фондаў музея. Даследаваў гісторыю Мастацкага музея і Карціннай галерэі (Вільнюская катэдра), склаў каталог экспанатаў музея, набытых у 1945–1965 гг. Падрыхтаваў і выдаў кнігі: "Вільнюс і яго аколіцы" (1937, з А. Юшкявічусам, кніга была канфіскавана польскімі ўладамі, у 1940 г. перавыдадзена), "Тракай" (1940, з П. Гудзінасам), "Даведнік пра Вільнюс" (1960, на рускай мове — 1962), "Вільнюская карцінная галерэя" (1967).

Яніна Кісялёва

Маціеўскі Ігар

***Маціеўскі Ігар Уладзіміравіч** (28.6.1941, Харкаў, Украіна), кампазітар, этнамузыказнавец, грамадскі дзеяч. Доктар мастацтвазнаўства, прафесар.*

У 1965 г. скончыў Львоўскую кансерваторыю па класу кампазіцыі, у 1970 г. — асістэнтуру Ленінградскай кансерваторыі, у 1970 г. — аспірантуру Расійскага інстытута гісторыі мастацтваў. Працуе у Расійскім інстытуце гісторыі мастацтваў загадчыкам сектара інструментазнаўства, адначасова з'яўляецца прафесарам Петразаводскай кансерваторыі. У 1970 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 1990 г. — дысертацыю на тэму "Народная інструментальная музыка як феномен культуры" на атрыманне навуковай ступені доктара мастацтвазнаўства. Сярод напрамкаў яго навуковых даследаванняў — традыцыйная беларуская інструментальная музыка Палесся, Паазер'я, Беласточчыны. Удзельнік і арганізатар шматлікіх этнамузыказнаўчых экспедыцый. Выступаў на міжнародных канферэнцыях. Аўтар навуковых і навукова-папулярных публікацый у Беларусі, Расіі і за мяжой. З'яўляецца аўтарам сімфанічных, харавых, камерных твораў, некаторыя з іх выконваліся на канцэртах у Мінску і ў праграмах Беларускага тэлебачання і радыё. Напісаў музыку да фільмаў "Рассыпушка" ("Белвідэафільм"), "Данчык", "Вось такі лёс", "Развітанне", "Дрэва вечнасці" ("Беларусьфільм", у двух апошніх — таксама і аўтар сцэнарыяў), навуковы кансультант фільма "Цымбальныя званы" ("Беларусьфільм"). Аўтар музыкі (рамансаў і хораў) на вершы М. Багдановіча (каля 20 твораў), А. Гаруна, Н. Арсенневай, В. Таўлая, Н. Артымовіч. Многія з гэтых твораў выконваліся ў Пецярбургу, Маскве, Львове, Таліне, Петразаводску. Сярод беларускіх выканаўцаў твораў І. Маціеўскага — А. Алоўнікаў, І. Алоўнікаў В. Скорабагатаў, Л. Габрусёнак, В. Фурман, харавыя калектывы пад кіраўніцтвам В. Роўды, К. Насаева і інш. І. Маціеўскі — намеснік старшыні Фальклорнай камісіі Саюза кампазітараў Расіі, член Вялікай рады Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына". З'яўляецца адным з заснавальнікаў Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу. З 1989 г. нязменны член Рады таварыства.

Мікалай Нікалаеў (Санкт-Пецярбург, Расія), Ларыса Языковіч

Мацка (Моцка) Мечыслаў

***Мацка (Моцка) Мечыслаў** (3.8.1923, в. Гайголі Ашмянскага пав. Віленскага ваяв., цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл.), інжынер лясной гаспадаркі. Заслужаны лесавод Літоўскай ССР (1965).*

М. Мацка ў 1950 г. скончыў Літоўскую сельскагаспадарчую акадэмію. З 1950 да 1957 г. працаваў галоўным лесаводам лясной гаспадаркі Рокішскага р-на Літвы, з 1957 да 1973 г. — дырэктар той жа гаспадаркі. З 1973 г. — дырэктар вытворчага аб'яднання лясной гаспадаркі таго ж р-на. Пад яго кіраўніцтвам гаспадарка перайшла да выбарачнай высечкі дрэў. Вялікія плошчы высечаных участкаў лесу былі зноў засаджаны, ўведзена механізаваная пагрузка лесаматэрыялаў.

Яніна Кісялёва

Мекін Чэслаў

***Мекін Чэслаў Іванавіч** (3.11.1930, в. Стасіна былога Ашмянскага пав., месцазнаходжанне не ідэнтыфікавана), грамадскі дзеяч.*

Ч. Мекін нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Скончыў сярэднюю школу ў Астраўцы (1950) і Віленскі чыгуначны тэхнікум (1956). Працоўную дзейнасць пачаў у 1956 г. тэхнікам на чыгунцы ў г. Вічуга Іванаўскай вобл. Затым працаваў ў Маладзечне і Вільнюсе, дзе неаднаразова сустракаўся з У. Караткевічам. У 1967 г. пераехаў з сям'ёй у Польшчу. Жыў у Калабжэгу, пасля ў Гданьску. Працаваў на чыгунцы, з 1990 г. – на пенсіі. З 1994 г. з'яўляецца намеснікам старшыні Беларускага культурнага таварыства "Хатка" ў Гданьску. Прымаў удзел у арганізацыі розных культурных мерапрыемстваў беларускай дыяспары, Першага і Другога з'ездах беларусаў свету.

Лена Глагоўская (Гданьск, Польшча)

Мельнічэнка Андрэй

***Мельнічэнка Андрэй Мікалаевіч** (31.10.1904, в. Казіміраўка, цяпер Лельчыц р-н Гомельскай вобл.), вучоны-біёлаг, доктар біялагічных навук. Акадэмік УАСГНІЛ, пасля РАСТА.*

А. Мельнічэнка закончыў біялагічны факультэт Смаленскага універсітэта. Усё жыццё прысвяціў навуцы і вышэйшай школе. Яго навуковыя працы звязаны з раслінным светам, фаунай. Па праву лічыцца "галоўным пчаляром Расіі". Асноўныя тэмы манаграфій і іншых прац А. Мельнічэнкі — тэарэтычнае абгрунтаванне экалагічнай ролі кветкавых раслін і пчол у абнаўленні жыццёвых умоў навакольнага асяроддзя. У 1930 г. рабіў даклад на IV Усесаюзным з'ездзе заолагаў, эколагаў і генетыкаў аб экалогіі ранневеснавых кветкавых раслін і насякомых-апыляльнікаў. Па гэтай тэме абараніў у 1931 г. кандыдацкую дысертацыю. В 1940 г. абараніў доктарскую дысертацыю "Полеабарончыя лясныя палосы і размнажэнне карысных і шкодных жывёл". У апошнія гады — кіраўнік секцыі пчалярства РАСТА. Некаторы час выкладаў у Ніжагародскім універсітэце. Адна з апошніх прац А. Мельнічэнкі — манаграфія "Біялагічныя асновы інтэнсіўнага пчалярства". Пра яго гаворыцца ў кнізе А. Ніканава "Спіраль шматвекавой драмы: Аграрная навука і палітыка Расіі (XVIII–XX стст.)" (Мн., 1996).

Алесь Карлюкевіч

Меркін Генадзь

***Меркін Генадзь** (23.3.1940, Віцебск), рускі і беларускі літаратуразнавец, прафесар.*

Нарадзіўся ў сям'і служачага-чыгуначніка. У 1957 г. скончыў сярэднюю школу і паступіў на філалагічнае аддзяленне Полацкага педагагічнага інстытута імя Г. Скарыны. Праз два гады ў сувязі з расфарміраваннем гэтага інстытута быў пераведзены ў Магілёўскі педагагічны інстытут, які і скончыў з адзнакай у 1962 г. Займацца праблемамі літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства пачаў яшчэ ў студэнцкія гады. Актыўна друкаваўся ў абласным і рэспубліканскім перыядычным друку (у газетах "Віцебскі рабочы", "Магілёўская праўда", "Знамя юности", "Звязда", "ЛІМ", "Чырвоная змена" і інш.).

З 1962 да 1981 г. працаваў у г. Вязьме Смаленскай вобл. завучам у школе рабочай моладзі, загадчыкам метадычным кабінетам гарана, настаўнікам рускай мовы і літаратуры, дырэктарам сярэдняй школы № 5. Будучы настаўнікам, у 1979 г. у Маскоўскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя У. І. Леніна абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук. З 1981 да 1995 г. — дацэнт кафедры літаратуры Смаленскага педагагічнага інстытута. У 1995 г. у Маскоўскім педагагічным дзяржаўным універсітэце абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені доктара педагагічных навук. З 1996 г. — прафесар.

Г. Меркін — аўтар шматлікіх артыкулаў і звыш 20 кніг (манаграфій, вучэбных дапаможнікаў, падручнікаў для сярэдняй школы) па праблемах філалогіі і методыкі выкладання літаратуры ў сярэдняй і вышэйшай школе. Да найбольш важных можна аднесці наступныя выданні: "Душа обязана трудиться" (М., 1988), "Путь к сотворчеству" (М., 1991, у суаўтарстве з сынам, кандыдатам філалагічных навук Б. Г. Меркіным), двухтомны падручнік-хрэстаматыя па літаратурнаму краязнаўству для вучняў 9-х класаў "Литература Смоленщины" (Смаленск, 1994), "Проблема сотворчества на уроках и во внеклассной работе по литературе" (Смаленск, 1995), вучэбная кніга для вучняў старэйшых класаў у двух тамах "Русская литература XX века" (М., 1995) і інш. Пад кіраўніцтвам Г. Меркіна ў 1985 г. у пас. Усходы Угранскага раёна, на радзіме М. В. Ісакоўскага, быў створаны адзіны ў Расіі (а магчыма, і ў свеце) літаратурны музей адной песні — славутай "Катюши" М. І. Блантэра і М. В. Ісакоўскага. Г. Меркін пастаянна працуе і над праблемай руска-беларускіх літаратурных сувязей.

Мікалай Ількевіч (Смаленск, Расія)

Мігай Сяргей

Мігай Сяргей Іванавіч *(18.(30).5.1888, Магілёў — 8.12.1959, Масква), рускі спявак, педагог, прафесар (1952). Народны артыст РСФСР (1939).*

С. Мігай нарадзіўся ў сям'і святара. Ужо з шасці гадоў спяваў у царкоўным хоры Магілёўскай гімназіі. Прымаў удзел у канцэртна-асветнай дзейнасці Магілёўскага літаратурна-музычна-драматычнага гуртка, які існаваў у 1905–1914 гг. Вучыўся на юрыдычным факультэце Пецярбургскага універсітэта (1907—1909). За ўдзел у студэнцкіх хваляваннях быў выключаны. Пераехаў у Адэсу і паступіў на юрыдычны факультэт універсітэта. Адначасова вучыўся спевам у класе Ю. Рэйдэр у музычным вучылішчы, якое скончыў у 1911 г. А. Няжданава рэкамендавала яго ў Вялікі тэатр, на сцэне якога ў красавіку 1912 г. ён дэбютаваў у ролі Валянціна ў оперы Ш. Гуно "Фаўст". Салістам Вялікага тэатра быў да 1924 г. Выступаў у сузор'і вялікіх спевакоў — А. Няжданавай, Л. Собінава, Ф. Шаляпіна. У 1918—1920 гг. вучыўся ў К. Станіслаўскага ў Опернай студыі пры Вялікім тэатры. Яшчэ раней (1911—1913) браў урокі спеваў у М. Батыстыні, калі той гастраляваў у Расіі. У 1924—1927 гг. С. Мігай — саліст Ленінградскага тэатра оперы і балета. У 1927—1941 гг. папераменна выступаў у Маскве і Ленінградзе, а таксама гастраляваў у іншых гарадах Савецкага Саюза. Часта спяваў у Тбілісі, там выканаў партыю Эскамільё на грузінскай мове. У 1941—1948 гг. саліст, кіраўнік і кансультант вакальнай групы Усесаюзнага радыёкамітэта. У 1948—1959 гг. выкладаў у Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі. Сярод яго вучняў — Ю. Мазурок, А. Саўчанка.

С. Мігай — адзін з яркіх прадстаўнікоў рускай вакальнай школы. Меў насычаны голас (барытон) цёплага тэмбру і вялікага дыяпазону (больш за дзве актавы), дасканала валодаў вакальнай тэхнікай. Сярод лепшых партый, выкананых ім, — князь Ігар (А. Барадзін "Князь Ігар"), Анегін (П. Чайкоўскі "Яўгеній Анегін"), Мізгір, Гразной (М. Рымскі-Корсакаў "Снягурка", "Царская нявеста"), Дэман (А. Рубінштэйн "Дэман"), Каралевіч (М. Рымскі-Корсакаў "Кашчэй несмяротны"), Рыгалета, Жэрмон, Дзі Луна (Дж. Вердзі "Рыгалета", "Травіята", "Трубадур") і інш. У оперным рэпертуары С. Мігая налічвалася 65 партый, 43 з іх — вядучыя. Ён таксама актыўна займаўся канцэртнай дзейнасцю. У яго рэпертуары — рамансы П. Чайкоўскага, С. Рахманінава, Шуберта, Э. Грыга. У камерны рэпертуар С. Мігая ўваходзіла больш за 5 тыс. твораў. У 20-я гг. ён часта спяваў з Л. Собінавым (дуэты А. Даргамыжскага, М. Глінкі). С. Мігай — аўтар мастацтвазнаўчых і метадычных прац. Узнагароджаны двума ордэнамі, рознымі медалямі СССР. Адна з вуліц Магілёва названа яго імем. Яму прысвечана кніга П. Гусева "С. І. Мігай" (Л., 1975).

Вацлаў Мацкевіч

Мігдал Аркадзь

Мігдал Аркадзь Бейнусавіч *(11.3.1911, Ліда Гродзенскай губ., цяпер Гродзенскай вобл. — 1991), фізік. Акадэмік АН СССР (1966, член-карэспандэнт з 1953), Расійскай акадэміі навук (1991).*

А. Мігдал скончыў Ленінградскі універсітэт (1936). У 1943–1945 гг. працаваў у Інстытуце фізічных праблем АН СССР, у 1945–1971 гг. — у Інстытуце атамнай энергіі імя І. Курчатава. З 1971 г. працаваў ў Інстытуце тэарэтычнай фізікі Расійскай акадэміі навук. Адначасова з 1944 г. — прафесар Маскоўскага інжынерна-фізічнага інстытута.

Навуковыя даследаванні А. Мігдала прысвечаны атамнай і ядзернай фізіцы, квантавай тэорыі поля, іншым праблемам сучаснай тэарэтычнай фізікі. Сумесна з Л. Ландау стварыў новы накірунак ў тэарэтычнай фізіцы — выкарыстанне метадаў квантавай тэорыі поля ў праблеме многіх целаў. Упершыню карэктна разгледзеў узаемадзеянне электронаў з ваганнямі рашоткі (фанонамі) у нармальных металах і ўстанавіў шэраг вынікаў, якія ўзнікаюць пры ўліку гэтага ўзаемадзеяння. Даказаў існаванне скоку ў размеркаванні фермі-часцінак на імпульсах для сістэм з любым ўзаемадзеяннем, развіў метады тэорыі фермі-вадкасці для сістэм канчатковых памераў. Скарыстаў метады тэорыі многіх целаў у фізіцы ядра і атрымаў важныя вынікі па тэорыі момантаў інерцыі ядра. Прымяніў ідэі тэорыі фермі-вадкасці для апісання канчатковых сістэм, упершыню колькасна апісаў такія важныя ўласцівасці ядзер, як магнітныя і квадрапольныя моманты, ізатанічны зрух, радыяцыйныя пераходы, гіганцкі рэзананс у фотапаглынанні. А. Мігдал пабудаваў строгую квантава-электрадынамічную тэорыю тармазнога выпраменьвання і ўтварэння пароў у асяроддзях (1954). Выказаў (1959) дапушчэнне, што ядзерная матэрыя ў нейтронных зорках уяўляе сабой вадкасць, якая знаходзіцца ў звышвадкім стане. Выканаў шэраг даследаванняў, якія прысвечаны вывучэнню ўласцівасцей вакуума ў моцных палях. Займаўся таксама распрацоўкай прыкладных пытанняў.

А. Мігдал — заснавальнік навуковай школы тэарэтычнай фізікі. Сярод яго вучняў — многія вядомыя фізікі.

Вольга Гапоненка

Міканенка Валерый

Міканенка Валерый Георгіевіч *(1937, в. Курына Суражскага р-на Віцебскай вобл.), спецыяліст у галіне касмічнай тэхналогіі.*

Пасля заканчэння Калінінградскага механічнага тэхнікума В. Міканенка вучыўся ў Арэнбургскім ваенным лётным вучылішчы. Служыў у Групе савецкіх войск у Германіі. Пасля звальнення ў запас працаваў лабарантам у Асобым канструктарскім бюро №1 (цяпер Ракетна-касмічная карпарацыя "Энергія" імя С. П. Каралёва). Завочна вучыўся ва Усесаюзным політэхнічным інстытуце. Удзельнічаў у распрацоўцы цеплаізаляцыйных і цеплаахоўных матэрыялаў для касмічных апаратаў "Усход", "Саюз", "Буран". Прымаў удзел у рабоце пошукавых атрадаў пры вяртанні апаратаў на Зямлю. Працуе ў "Ракетна-касмічнай карпарацыі "Энергія" імя С. П. Каралёва. Мае 33 аўтарскія пасведчанні на вынаходніцтвы ў касмічнай тэхналогіі.

Міканенка — аўтар многіх навуковых артыкулаў, якія друкаваліся на старонках часопісаў "Металлургия", "Космическая техника" і інш.

Аляксей Кажамяка (в. Пенькаўка Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.)

Мікульчык Аляксандр

Мікульчык Аляксандр Андрэевіч *(12(14).8.1882, мяст. Шпак Ігуменскага пав., цяпер в. у Пухавіцкім р-не Мінскай вобл. — пасля 1918), рускі і беларускі паэт.*

Працаваў перапісчыкам, грузчыкам, матросам. Удзельнічаў у забастовачным руху. У снежні 1905 – чэрвені 1906 г. зняволены ў Мінску па падазрэнню ў прыналежнасці да "анархістаў-камуністаў". У 1906–1907 гг. працаваў у Пецярбургу, потым у тэатры ў Кіеве. Быў знаёмы з М. Горкім, падтрымліваў творчыя сувязі з У. Дз. Бонч-Бруевічам. Друкаваўся ў газетах "Наша ніва", "Северо-Западный край", "Белорусский голос" (Кіеў), у калектыўным "Зборніку вершаў" (Кіеў, 1913, на рус. мове). Выдаў адзіны зборнік паэзіі "Песні рабочага" (СПб., 1906, на рус. мове). Найбольш вядомы яго верш "Адвеку мы спалі і нас разбудзілі" (1905), вядомы таксама пад назвай "Беларуская марсельеза". Верш стаў папулярнай рэвалюцыйнай песняй, аднак доўгі час лічыўся народным творам.

Аляксей Каўка (Масква)

Мілаш Леакадзія

Мілаш Леакадзія Баляславаўна *(11.11.1958, в. Соргаўцы Смаргонскага, цяпер Астравецкага р-на Гродзенскай вобл.), выкладчык беларускай мовы, публіцыст, даследчык, грамадскі дзеяч беларускай рыяспары ў Літве. Выдатнік культуры Літвы.*

Л. Мілаш нарадзілася ў сялянскай сям'і. Друкавацца пачала ў школьныя гады ў газеце "Піянер Беларусі", там жа змяшчала свае малюнкі. Вучылася ў Ашмянскім тэхнікуме па спецыяльнасці бухгалтарскі ўлік. У 1987 г. скончыла філалагічны факультэт Вільнюскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута. Працавала старшым інжынерам. Супрацоўнічала з рэдакцыямі газет "Советская культура", "Книжное обозрение", "Учительская газета", "Літаратура і мастацтва", "Вечерние новости", "Эхо Литвы", часопісаў "Вильнюс", "Русский язык и литература". З 1990 г. працавала ў рускай школе, з 1994 г. — у Вільнюскай беларускай сярэдняй школе імя Ф. Скарыны.

Л. Мілаш прымае актыўны ўдзел у грамадска-культурным жыцці беларускай дыяспары ў Вільнюсе. Яе погляды сфарміраваліся пад уплывам беларускіх дзеячаў Янкі Багдановіча, Лявона Луцкевіча і інш. Уваходзіла ў склад "Саюдзіса". З'яўляецца намеснікам старшыні мясцовага Таварыства беларускай культуры, прэзідэнтам Літоўскай асацыяцыі беларусістаў, членам рады Таварыства беларускай школы, рэдкалегіі газеты "Наша слова". Дзеля папулярызацыі ідэй адраджэння і захавання беларускай культуры ў Літве выступае ініцыятарам правядзення разнастайных мерапрыемстваў — выставак, канцэртаў, сустрэч з вядомымі беларускімі дзеячамі. Часта друкуецца ў газетах "Ніва" (Беласток), "Рунь" (Вільнюс), "Наша слова" (Ліда) і інш. Л. Мілаш была дэлегатам Другога з'езда беларусаў свету, Першага і Другога з'ездаў беларусаў краін Балтыі. Прымае ўдзел у беларусазнаўчых навуковых канферэнцыях. Жыве ў Вільнюсе.

Ірына Тамільчык

Мінкін Алег

Мінкін Алег Гаўрылавіч *(31.3.1952, в. Чарняўка Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл.), паэт, драматург. Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў (1988), СП Літвы (1991).*

А. Мінкін нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Вучыўся ў Хоцімскай васьмігадовай школе-інтэрнаце. Дзесяты клас скончыў у Бабруйскай школе-інтэрнаце № 1. У 1969 г. паступіў у Маскоўскі энергетычны інстытут. Пасля 2 гадоў вучобы перавёўся на факультэт электрыфікацыі Маскоўскага інстытута інжынераў сельскагаспадарчай вытворчасці (1971–1975). Атрымаўшы спецыяльнасць інжынера-электрыка, накіраваны майстрам ва Улан-Удэ, у тэхкалону № 56. Працаваў электрамантажнікам, брыгадзірам, майстрам па будаўніцтву электрападстанцый. З Буратіі вярнуўся ў Беларусь. З 1977 г. працаваў інжынерам у сістэме "Галоўтранснафта", у тым ліку начальнікам брыгады на поўначы Цюменскай вобл. (г. Наябрск). Потым інжынерам у Брэсце. З пачатку 1990-х гг. жыве ў Вільнюсе, працаваў у рэдакцыі газеты "Наша ніва", цяпер — галоўны рэдактар газеты беларусаў Літвы "Рунь". Друкуецца А. Мінкін з 1980 г. Першы зборнік вершаў "Сурма" выйшаў у 1985. Тады ж у зборніку п'ес "Крынічка" надрукавана яго п'еса-казка "Як Лыска ваўком быў". Аўтар зборнікаў "Расколіна" (1991), "За месяцам месяц" (1994), "Праўдзівая гісторыя Краіны Хлудаў: Кароткія антыутопіі" (1994). Паэзія А. Мінкіна вызначаецца адметнай паэтычнай пластыкай, сталым поглядам на свет з яго складанымі праблемамі. Пераклаў з польскай мовы кнігі "Пан Блішчынскі" Б. Лесьмяна, "Ідзі за мною" Ц. Норвіда, "Высокія дрэвы" Л. Стафа, вершы грузінскіх паэтаў. У сваю чаргу творы А. Мінкіна перакладаліся на літоўскую і ўкраінскую мовы.

Тамара Тарасава

Мінор Восіп

Мінор Восіп (Іосіф) Саламонавіч *(сапр. Залкінд; 12.11.1861, Мінск – 1934, Парыж), рэвалюцыянер, адзін з лідэраў Партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (ПСР).*

З сям'і равіна, яўрэйскага пісьменніка С. Залкінда. Студэнтам Маскоўскага універсітэта ўдзельнічаў у рэвалюцыйных гуртках, упершыню арыштаваны ў 1884 г. Вучыўся ў Яраслаўскім юрыдычным ліцэі, удзельнічаў у групе "Народная воля", арыштаваны ў 1886 г., высланы на 10 гадоў. За ўдзел 22 сакавіка 1889 г. у т. зв. "якуцкай трагедыі", калі ссыльныя ўступілі ва ўзброены канфлікт з уладамі, прыгавораны да смяротнага пакарання, якое замянілі пажыццёвай катаргай. У 1897 г. па царскаму маніфесту адпраўлены на пасяленне ў Чыту, з 1930 г. — у Вільні. З 1902 г. эсэр. У 1902–1905 гг. — у Жэневе. Распрацаваў аграрную праграму ПСР. Удзельнік I і II з'ездаў партыі. З 1905 г. на партыйнай рабоце ў Расіі, у 1907–1908 гг. — у Парыжы. 2 студзеня 1909 г. арыштаваны ў выніку правакацыі Азефа. У 1910 г. за прыналежнасць да ПСР атрымаў 8 гадоў катаржных работ. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. прыехаў у Маскву. На 3-й гарадской канферэнцыі эсэраў быў абраны ганаровым старшынёй схода. З сакавіка — адзін з рэдактараў маскоўскай эсэраўскай газеты "Труд", член Маскоўскага камітэта эсэраў. Удзельнічаў у рабоце 6-га Савета партыі эсэраў (30 красавіка – 1 мая), дзе выступіў з дакладам "Палітыка партыі ў нацыянальным пытанні і адносіны да нацыянальных сацыялістычных партый". 25 мая – 4 чэрвеня дэлегат III з'езда эсэраў, член мандатнай камісіі, член прэзідыума, выбраны членам ЦК, увайшоў у камісіі (выдавецкую, іншагароднюю, па нацыянальнаму пытанню і зносінах з нацыянальнымі сацыялістычнымі партыямі). 7 ліпеня на 1-м пасяджэнні новай маскоўскай Гарадской думы выбраны яе старшынёй. Падтрымліваў пазіцыю Часовага ўрада па стварэнню кааліцыйнага ўрада. Кастрычніцкую рэвалюцыю не прыняў. Пасля рашэння Маскоўскага ВРК аб роспуску думы разам з іншымі яе членамі працягваў супрацьстаяць бальшавікам, спрабуючы стварыць адзіны дэмакратычны фронт. 14 снежня — старшыня паседжання маскоўскай Гарадской думы, якое прыняло рэзалюцыю супраць насілля бальшавікоў над друкам. У верасні 1918 г. выехаў у Сімбірск, затым ва Уфу, пасля ва Уладзівасток, адкуль перабраўся ў Парыж. 16 мая 1921 г. разам з А. Керанскім, М. Аўксенцьевым і інш. падпісаў маніфест правай групы партыі эсэраў з заклікам да новай інтэрвенцыі супраць Савецкай улады. У эміграцыі працягваў актыўна працаваць у партыі, з верасня 1920 г. — член рэдакцыі газеты "Воля России". Выдаў мемуары "Гэта было даўно: Успаміны салдата рэвалюцыі" (Парыж, 1930).

Ларыса Языковіч

Мірановіч Антон

Мірановіч Антон Васільевіч *(30.10.1959, Беласток, Польшча), беларускі гісторык, грамадскі дзеяч, доктар габілітаваны (1997), прафесар (1998).*

У 1982 г. А. Мірановіч закончыў Беластоцкі універсітэт. Пасля працаваў настаўнікам у школе, супрацоўнічаў з газетамі "Ніва" і "Przegląd Prawosławny". З 1986 г. — выкладчык Інстытута гісторыі Варшаўскага універсітэта, пасля — Інстытута гісторыі універсітэта ў Беластоку. Быў выкладчыкам навучальных устаноў у Рыме, Лондане, Таронта і Мінску. У 1990 г. атрымаў званне доктара гісторыі ў Торуньскім універсітэце імя М. Каперніка. У 1997 г. Каталіцкі універсітэт у Любліне прысвоіў яму званне доктара габілітаванага. У 1998 г. Сенат Беластоцкага універсітэта запрасіў А. Мірановіча на пасаду прафесара.

А. Мірановіч з'яўляецца аўтарам звыш 10 кніг і больш 150 навуковых артыкулаў. Яго працы прысвечаны гісторыі праваслаўнай царквы ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, беларуска-польскім зносінам канца XVIII ст. і беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы. У спісе яго кніг на польскай мове значацца: "Супрасль як культурна-рэлігійны асяродак у XVI стагоддзі" (Ляймен, 1984), "Падляшскія праваслаўныя асяродкі і арганізацыі ў XVI–XVII стст." (Беласток, 1991), "Невядомы гербоўнік Міхала Шацілы" (Лондан, 1992), "Брацтва Аб'яўлення Панскага ў Бельску" (Бельск, 1994), "Праваслаўе і унія ў часы панавання Яна Казіміра" (Беласток, 1996), "Тэадозы Васілевіч, слуцкі архімандрыт, беларускі біскуп" (Беласток, 1997), "Кніга цудаў, якія адбыліся перад іконай Маці Божай у Старым Карніне" (Беласток, 1997) і інш.

А. Мірановіч — сябра прэзідыума Міжнароднай акадэміі вывучэння нацыянальных меншасцей, сябра Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, Польска-расійскай гістарычнай камісіі Польскай акадэміі навук, Міжнароднай камісіі гісторыі Царквы Польскай акадэміі навук, Усходнеславянскай камісіі Польскай акадэміі ўмельстваў у Кракаве і іншых міжнародных арганізацый. Ён таксама з'яўляецца старшынёй Беларускага гістарычнага таварыства ў Польшчы, намеснікам старшыні Беларускага дэмакратычнага аб'яднання ў Польшчы.

Ала Такіданг

Мірановіч Яўген

Мірановіч Яўген Васільевіч *(2.9.1955, в. Алексічы Беластоцкага ваяв., Польшча), беларускі гісторык, публіцыст, грамадска-палітычны дзеяч беларускай дыяспары ў Польшчы.*

У 1980 г. скончыў філіял Варшаўскага універсітэта ў Беластоку. Працаваў настаўнікам, выкладчыкам ліцэя ў Супраслі. З ліпеня 1992 г. — галоўны рэдактар газеты "Ніва". У 1990 г. абараніў доктарскую дысертацыю на тэму "Беларусы ў Польшчы. 1944–1949 гг.". Адзін з ініцыятараў стварэння ў 1990 г. Беларускага дэмакратычнага аб'яднання, член Галоўнай рады БДА, з 1992 г. — намеснік старшыні Беларускага дэмакратычнага аб'яднання. Сябра Беларускага гістарычнага таварыства, член рэдакцыйнай калегіі часопіса "Bialoruskie Zeszyty Historyczne". Кандыдат у сейм Польшчы ад Беларускага выбарчага камітэта на парламенцкіх выбарах 1989 г.

Галоўныя накірункі навуковых даследаванняў — беларускі нацыянальны рух у Польшчы паміж Першай і Другой сусветнымі войнамі і пасля іх, беларуска-польскія адносіны ў перыяд Першай сусветнай вайны, фарміраванне беларускай нацыянальнай самасвядомасці ў Польшчы ў 1918–1939 гг. Вывучае гісторыю праваслаўнай царквы ў Польшчы, беларускі грамадска-палітычны рух у Польшчы ў 1980–1990-я гг. Аўтар манаграфій "Беларусы ў Польшчы. 1944–1949 гг." (Варшава, 1993), "Навейшая гісторыя Беларусі" (Беласток, 1999); раздзелаў у кнігах "Праваслаўная царква ў Польшчы: Гісторыя і сучаснасць" (Варшава, 1993), "Нацыянальныя меньшасці ў Польшчы" (Беласток, 1998), навуковых і навукова-папулярных артыкулаў у выданнях "Zeszyty Naukowe Instytutu Nauk Politycznych", "Bialoruskie Zeszyty Historyczne", "Bialostocczyzna", "Czasopis", "Ніва" і інш. Удзельнічаў у арганізацыі і правядзенні міжнародных канферэнцый, сімпозіумаў, семінараў, "круглых сталоў" па асобных пытаннях гісторыі Беларусі, беларусазнаўства. Член Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, удзельнік Першага з'езда беларусаў свету (Мінск, 1993), Першай Усебеларускай канферэнцыі гісторыкаў (Мінск, 1993) і інш.

Ларыса Языковіч

Міронава Любоў

***Міронава Любоў Іларыёнаўна** (12.4.1947, в. Серадава, Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл.), народная лекарка, мецэнатка.*

Народнае лекаванне Л. Міронава пераняла ад сваіх маці і бабулі яшчэ ў дзяцінстве. Пасля заканчэння школы працавала на дывановым заводзе (г. Каўроў, Расія). У 1975 г. прыехала ў Рыгу, працавала на электралямпавым заводзе. Дыплом народнай лекаркі атрымала ў 1980 г. Скончыла курсы масажыстаў мануальнай тэрапіі, класічнага масажу, атрымала ліцэнзію на права прыватнага лячэння. Сярод яе пацыентаў жыхары Латвіі, Расіі, Польшчы, Германіі, Галандыі, ЗША. З 1992 г. з'яўляецца сябрам Асацыяцыі народных лекараў Латвіі. Яе спагадлівасць да людскіх бедаў, чуласць, асабліва да дзяцей, адзначаецца людзьмі, якія да яе звяртаюцца.

Акрамя лекарскіх спраў Л. Міронава займаецца мецэнацтвам, дапамагае беларускім суполкам Латвіі, Рыжскай беларускай школе. З'яўляецца сябрам рады Фонду беларускай культуры. Удзельнічае ў дабрачынных акцыях беларускіх таварыстваў Латвіі. Разам з сябрамі-прадпрымальнікамі І. Кабановічам, В. Трафімчыкам з'яўляецца фундатарам Рыжскай беларускай сярэдняй школы (дырэктар В. Целеш). Жыве ў Рызе.

Алесь Карповіч (Рыга)

Міронава Ніна

***Міронава Ніна Афанасьеўна** (1941, в. Стары Дрыбін Дрыбінскага р-на Магілёўскай вобл.), эканаміст, беларускі грамадскі дзеяч у Кыргыстане.*

Н. Міронава нарадзілася і вырасла ў сялянскай сям'і. У 1958 г. скончыла Дрыбінскую беларускую сярэднюю школу і па сямейных абставінах пераехала ў Кыргызстан, Фрунзе (цяпер Бішкек). Закончыла факультэт эканомікі гандлю Маскоўскага завочна-статыстычнага тэхнікума. Трыццаць сем гадоў працавала ў сістэме гандлю Бішкека. З 1993 г. Н. Міронава стала прымаць актыўны ўдзел у заснаванні Беларускай абшчыны "Світанак" у Кыргызстане і цяпер з'яўляецца старшынёй Рады гэтай арганізацыі. Уся яе грамадская праца накіравана на згуртаванне беларусаў у Кыргызстане, зберажэнне роднай мовы, духоўнасці і традыцый беларускага народа, а таксама на матэрыяльную падтрымку маламаёмасных беларусаў, якія пражываюць у Кыргызстане. Н. Міронава праводзіць вялікую грамадзянскую работу, накіраваную на згоду і дружбу з іншымі народамі, якія пражываюць у Рэспубліцы Кыргызстан. Прымала ўдзел у рабоце Першага і Другога з'ездаў беларусаў свету.

Алексей Шут

Місуна Ганна

***Місуна Ганна** (12.11.1868, Чашніцкі пав. Віцебскай губ., цяпер Чашніцкі р-н Віцебскай вобл. – 2.5.1922, Масква), першая жанчына-геолаг у Расіі.*

Г. Місуна нарадзілася ў беднай сялянскай сям'і. Скончыла прыватныя жаночыя курсы ў Маскве (1896), з 1919 г. працавала прыватным дацэнтам геалагічнага факультэта Маскоўскага універсітэта. Праводзіла палявыя геалагічныя даследаванні на тэрыторыі Расіі і Беларусі, зрабіўшы вялікі ўклад у вывучэнне ледніковых адкладаў Беларусі і Літвы, высветліла іх стратыграфію. Выніковая праца аб гэтым — "Матэрыялы да вывучэння ледніковых адкладаў Беларусіі і Літоўскага краю" былі апублікаваны ў кнізе "Матэрыялы да пазнання геалагічнай будовы Расійскай імперыі" (М., 1903. Т. 1–2).

Валерый Ярмоленка

Місюра Йонас

***Місюра Йонас** (13.12.1917, в. Дайнова Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл. — 23.10.1966, Вільнюс), урач-тэрапеўт, доктар медыцынскіх навук (1966).*

Й. Місюра ў 1942 г. скончыў Каўнаскі універсітэт. З 1945 г. працаваў выкладчыкам у Вільнюскім універсітэце, з 1957 г. загадваў там кафедрай факультатыўнай тэрапіі. Адначасова з 1965 г. быў дэканам Інстытута ўдасканалення медыцынскіх работнікаў.

У доктарскай дысертацыі "Клінічныя і эксперыментальныя дадзеныя комплекснага лячэння (антыбіётыкамі, прадніза лонам і неабензінолам) хранічных неспецыфічных захворванняў лёгкіх" Й. Місюра даследаваў спосабы

лячэння хранічных хвароб лёгкіх, класіфікаваў гэтыя хваробы. Разам з іншымі вучонымі стварыў мадэль эксперыментальнага хранічнага бранхіта. З'яўляецца адным з аўтараў падручніка "Догляд хворых" (1967), падрыхтаванага пад яго кіраўніцтвам.

Яніна Кісялёва

Міткевіч Уладзімір

Міткевіч Уладзімір Фёдаравіч *(3.8.1872, Мінск – 1951, Ленінград, Расія), вучоны-электратэхнік, прафесар. Сапраўдны член Акадэміі навук СССР, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі. Лаўрэат Сталінскай прэміі (1943).*

У. Міткевіч скончыў Мінскую гімназію (1891), матэматычнае аддзяленне фізіка-матэматычнага факультэта Пецярбургскага універсітэта (1895). Выкладаў электратэхніку ў Пецярбургскім электратэхнічным інстытуце (1895–1901), фізіку ў Пецярбургскім горным інстытуце (1896–1905), на Пецярбургскіх вышэйшых жаночых курсах (1898–1901, 1906–1912), у Пецярбургскім універсітэце (1901–1902). З 1902 г. працаваў у Пецярбургскім політэхнічным інстытуце, дзе з 1904 г. пачаў чытанне лекцый па курсу "Тэорыя электрычных і магнітных з'яў". У ім пры выкладанні вучэння аб электрамагнітных з'явах на падставе ідэй Фарадэя і Максвела ён шырока выкарыстоўваў метады матэматычнай фізікі, даў глыбокі фізічны аналіз працэсаў, што адбываюцца ў электрычных прыладах, тым самым перакінуўшы мост паміж электрафізікай і электратэхнікай. Гэты курс быў упершыню выдадзены ў 1910 г. пад назвай "Тэорыя электрычных і магнітных з'яў", а ў 1923, 1932 і 1933 гг. кніга была перавыдадзена пад назвай "Фізічныя асновы электратэхнікі". Адначасова чытаў курс "Тэорыя пераменных токаў", у якім шырока выкарыстоўваў графічныя метады для разліку ланцугоў пераменнага тока. Гэтымі курсамі ён, па сутнасці, стварыў новую дысцыпліну, якая носіць назву "Тэарэтычныя асновы электратэхнікі". Адначасова з падрыхтоўкай навучальных курсаў арганізаваў першую ў Расіі лабараторыю па тэарэтычных асновах электратэхнікі, якая была прызначана для правядзення студэнтамі лабараторных работ і стала базай для шэрагу эксперыментальных навуковых прац, што выконваліся У. Міткевічам і яго вучнямі. У 1906 г. абараніў у Пецярбургскім політэхнічным інстытуце дысертацыю на званне ад'юнкта (адзіная навуковая ступень на той час у тэхнічных ВНУ) пад назвай "Аб вольтавай дузе" і быў абраны прафесарам таго ж інстытута. У 1912 г. абраны на пасаду дэкана электрамеханічнага аддзялення Пецярбургскага політэхнічнага інстытута.

Навуковыя працы У. Міткевіча прысвечаны вывучэнню электрамагнітных з'яў. Даказаў магчымасць прымянення фарадэеўскай і максвелаўскай фармулёвак закона электрамагнітнай індукцыі для вызначэння электрарухаючай сілы ў абмотках электрычных машын з гладкім і з зубчатым якарамі. Важнае значэнне маюць яго працы па даследаванню вольтавай дугі. Упершыню ўстанавіў прыроду вольтавай дугі і вывучыў умовы яе ўзнікнення і развіцця. Прымаў удзел у стварэнні ў Расіі акумулятарнай прамысловасці, актыўна працаваў у галіне тэлефаніі і радыё. Упершыню прапанаваў выкарыстоўваць расчэпленыя дроты для высакавольтных ліній электраперадач і навукова даказаў мэтазгоднасць такой канструкцыі ліній. Аўтар навуковых прац "Даследы па намагнічванню горных парод", "Магнітны паток і яго пераўтварэнне", "Электрычная энергія". Унёс уклад у даследаванні па гісторыі навукі і тэхнікі. Пад яго рэдакцыяй былі выдадзены манаграфіі "Дынамамашына ў яе гістарычным развіцці", "Электрарухавікі ў яго гістарычным развіцці". Удзельнічаў у распрацоўцы плана электрыфікацыі Расіі (ГОЭЛРО).

Быў абраны членам Рускага электратэхнічнага камітэта міжнароднай электратэхнічнай камісіі, Цэнтральнага электратэхнічнага савета. Уваходзіў у склад рэдкалегіі часопіса "Электричество".

Вольга Гапоненка

Міхалеўскі Корчак Серафін

Міхалеўскі Корчак Серафін *(18.5.1923, Брэст-над-Бугам, цяпер Брэст), польскі вучоны, філосаф, філолаг, паэт.*

С. Міхалеўскі паходзіць з сям'і радавітага двараніна Яна Нікольскага. Дзяцінства прайшло ў в. Росахі на Пружаншчыне. Тут, у польскай школе, атрымаў ён пачатковую адукацыю. У 1939 г. скончыў Польскую гімназію імя А. Міцкевіча ў Пружанах, у 1941 г. — беларускую сярэднюю школу № 1. У гэтым жа годзе вывезены з сям'ёй у Сібір. У 1941–1943 гг. вучыўся ў Новасібірскім педагагічным інстытуце. У час Другой сусветнай вайны С. Міхалеўскі быў прызваны ў Польскае войска. У 1944 г. скончыў афіцэрскую артылерыйскую школу ў Кастраме. Камандзірам батарэі ў шэрагах 3-га Берлінскага палка 1-й дывізіі пяхоты імя Т. Касцюшкі дайшоў да Берліна. Тройчы быў цяжка паранены. Узнагароджаны ордэнам Віртуці Мілітары, медалямі. Пасля вайны вучыўся ва універсітэтах Лодзі, Вроцлава, Варшавы, па заканчэнню якіх атрымаў дыпломы па філасофіі і англійскай філалогіі. Займаўся таксама рускай філалогіяй.

С. Міхалеўскі выконваў абавязкі навуковага супрацоўніка ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве, у Інстытуце матэматычных лічбавых машын, Бібліятэцы Польскай акадэміі навук, выдавецкай рэдакцыі футуралогіі. Займаўся навукова-даследчай дзейнасцю ў галіне філасофіі, рэлігіі, філалогіі. Даследаваў рэлігійна-філасофскае вучэнне старажытнай Індыі — ёгі. Гэтай тэме прысвечаны каля дзесяці яго навуковых рэфератаў, з якімі ён выступаў у варшаўскіх Дамах культуры, і яго тэарэтычная праца "Уводзіны да трансцэндэнтальнай медытацыі". Склаў два санскрыцка-польскія слоўнікі. У Варшаўскім універсітэце С. Міхалеўскі наладзіў першыя ў Еўропе дзве выставы, прысвечаныя вучэнню ёгі. У галіне рэлігіі яму належыць тлумачэнне догмы пра Святую Тройцу і тэадыцыю; устанаўленне сапраўднага аблічча Багародзіцы і Збавіцеля. Пераклаў на польскую мову праваслаўную імшу святога Іаана Златавуста. С. Міхалеўскі — аўтар шматлікіх прац па лінгвістыцы. Ён склаў селектыўную бібліяграфію па 900 мовах (слоўнікі і граматыкі), бібліяграфію караімскіх кніг, вывучаў лексічныя запазычанні ў караімскай мове, распрацаваў праект рэформы кітайскага іерагліфічнага пісьма. У штомесячніку "Nowe ksiazki" апублікаваны яго рэцэнзіі на многія навуковыя кнігі.

С. Міхалеўскі вядомы ў Польшчы як паэт. Яго вершаваныя творы на англійскай, польскай, беларускай мовах друкаваліся ў штотыднёвіку "Ніва", розных перыядычных выданнях Варшавы. Ён уваходзіць у Міжнароднае таварыства паэтаў 60 краін (International Society of Poets). У Музеі славутых паэтаў (The International Poetry Hall of Fame) адна з экспазіцый прысвечана С. Міхалеўскаму. Дзве яго паэмы і некалькі празаічных твораў, пераважна ўспаміны, змешчаны на старонках газеты "Раённыя будні", што выходзіць на радзіме С. Міхалеўскага ў Пружанах Брэсцкай вобл. Выдаў некалькі зборнікаў сваіх афарызмаў на польскай мове.

Ірына Тамільчык

Міцкевіч Аляксандр

Міцкевіч Аляксандр Міхайлавіч *(11.8.1801, г. Навагрудак – 16.11.1871, м. Губернія Кобрынскага пав., цяпер Драгічынскі р-н Брэсцкай вобл.), правазнавец, прафесар Кіеўскага, Харкаўскага універсітэту, родны брат польскага паэта Адама Міцкевіча.*

Пачатковую адукацыю А. Міцкевіч атрымаў у Навагрудку, скончыў дамініканскую школу. У 1819 г. паступіў на юрыдычны факультэт Віленскага універсітэта, які паспяхова кончыў са ступенню кандыдата (1823). У 1823—1824 гг. працаваў у канцылярыі галоўнага ўпраўляючага лясной часткай Валынскай губ. З 1824 г. жыў у Пецярбургу і Маскве, дзе слухаў лекцыі і рыхтаваўся да магістэрскага экзамена. У 1826 г. абараніў дысертацыю і атрымаў ступень магістра заканадаўства і царкоўнага права. Прызначаны ў тым жа годзе выкладчыкам рымскага і грамадзянскага польска-літоўскага права ў Крамянецкі ліцэй. З 1833 г. – памочнік папячыцеля Кіеўскай навучальнай акругі, займаўся арганізацыяй вучылішчаў і фінансавымі пытаннямі. У год адкрыцця універсітэта св. Уладзіміра (1834) прызначаны членам праўлення універсітэта і членам Вучэбнага камітэта. У 1835 г. зацверджаны экстраардынарным прафесарам, у 1836 г. – ардынарным прафесарам на кафедры рымскага права Кіеўскага універсітэта. У студзені 1838 г. пераведзены ардынарным прафесарам у Харкаўскі універсітэт. У 1848—1850 гг. – дэкан юрыдычнага факультэта. У жніўні 1858 г. выйшаў на пенсію. Апошнія гады жыцця правёў у набытым маёнку Губернія на Кобрыншчыне.

Навуковыя даследаванні А. Міцкевіча прысвечаны "Літоўскаму статуту", гісторыі польскага і літоўска-беларускага права, распрацаваў дапаможнік па гэтых дысцыплінах. Выдаў у Варшаве ў 1827 г. кнігу "Аб уплыве рымскага заканадаўства на заканадаўства польскае". Падрыхтаваў "Курс расійскага права", "Энцыклапедыю права" і "Курс польскага грамадзянскага права", якія пасля смерці вучонага засталіся ў рукапісах.

Вольга Гапоненка

Могілевер Шмуэль

Могілевер Шмуэль *(1824, м. Глыбокае Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер райцэнтр Віцебскай вобл – 1898, Беласток, Польшча), яўрэйскі рэлігійны і грамадскі дзеяч, вучоны-талмудыст.*

Паходзіў Ш. Могілевер з сям'і равінаў. Закончыў Валожынскую ешыву і ў 1843 г. атрымаў званне равіна. Лічыўся адным з вядучых талмудыстаў свайго часу. Заснаваў рэлігійны напрамак у руху "Ховевей Цыён", які папярэднічаў сіянізму. Цікавіўся таксама матэматыкай, тэхнікай, ведаў рускую, польскую і нямецкую мовы, быў знаёмы з літаратурай на іх. З 1848 г. — равін у Глыбокім; у 1854–1860 гг. — у Шаках, у 1860–1868 гг. — у Сувалках, з 1868 г. — у Радаме, з 1883 г. — у Беластоку. Могілевер актыўна ўдзельнічаў у жыцці веруючых, якімі ён кіраваў, патрабаваў ад іншых равінаў спалучаць рэлігійную навуку "з духам часу". Падтрымліваў ідэю пасялення яўрэяў у Ізраілі, намагаўся аб'яднаць розныя яўрэйскія арганізацыі і плыні. У Ізраілі заснаваў пасяленне Экірон для выхадцаў з Расіі (1883). Па яго ініцыятыве на нарадзе членаў рэлігійнай плыні ў руху "Ховевей Цыён" была прынята пастанова заснаваць асобны Духоўны цэнтр для прапаганды яўрэйскага пасялення ў Ізраілі —

Мізрахі. У 1897 г. на Першым сіянісцкім кангрэсе Могілевер стаў адным з чатырох кіраўнікоў гэтай арганізацыі ў Расіі.

Большасць талмудычных прац Ш. Могілевера загінула ў час беластоцкага пагрому ў 1906 г., а тыя, што захаваліся, былі апублікаваны ў 1944 г. пад назвай "Даследаванні па Галаху і рэспонсы".

Браніслава Котава

Мурашка Леанід

Мурашка Леанід (Лявон, Леанідас) Адамавіч *(27.8.1924, в. Сіняўка Нясвіжскага пав. Навагрудскага ваяв., цяпер Клецкі р-н Мінскай вобл.), оперны спявак, лаўрэат Маскоўскага конкурса вакалістаў (1956). Заслужаны артыст Літвы (1974), заслужаны дзеяч мастацтва Літвы (1984).*

Бацька Л. Мурашкі кіраваў царкоўным хорам, што спрыяла зацікаўленасці хлопчыка спевамі. У 1936 г. разам з сям'ёй перасяліўся ў Вільню, дзе на яго жыццё аказаў ўплыў Р. Шырма. Па яго парадзе паступіў у Беларускую гімназію, але вымушаны быў вучыцца ў Рускай гімназіі імя А. Пушкіна, якую скончыў у 1943 г. На светапогляд і лёс юнака ў гады вучобы паўплывалі такія вядомыя дзеячы беларускай культуры, як кампазітар К. Галкоўскі, кс. А. Станкевіч, праслаўленыя артысты-вакалісты — Пракапеня і Беноні. З 1944 да 1946 г. у Беларускім ансамблі песні і танца пад кіраўніцтвам Р. Шырмы. Музыказнаўца І. Нісневіч падкрэсліў, што Р. Шырма даў Л. Мурашку пуцёўку ў вялікае мастацтва. У 1946 г. залічаны салістам у Літоўскую філармонію і адначасова паступіў у кансерваторыю, дзе вучыўся пад кіраўніцтвам выдатнага майстра вакалу К. Пятраўскаса, прафесара К. Галкоўскага. У 1950 г. прадстаўляў Літоўскую кансерваторыю на конкурсным праглядзе вакальных факультэтаў у Маскве. Студэнтам 5-га курса кансерваторыі быў прыняты ў Дзяржаўны тэатр оперы і балета Літвы, дзе працаваў да 1988 г. Выканаў больш за 60 музычных партый (Герман з оперы "Яўгеній Анегін", Качубей з оперы "Мазепа" і інш.). З поспехам прайшлі яго канцэртныя паездкі ў Іспанію, Італію, Югаславію, Венгрыю, Румынію, Польшчу, Чэхаславакію, Германію. Больш 20-ці гадоў Мурашка працаваў у Вільнюскай дзяржаўнай кансерваторыі выкладчыкам класа сольных спеваў. З 1988 г. на пенсіі, але працягвае працаваць рэгентам царкоўнага хору ў Свята-Духаўскім саборы. Адзін з актыўных стваральнікаў і цяперашні прэзідент Згуртавання беларускіх грамадскіх арганізацый у Літве.

Галіна Сяргеева

Мухлінскі Антон

Мухлінскі Антон Восіпавіч *(1808, б. маёнтак Саснова Навагрудскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл., — 25.10.1877, Варшава), усходазнавец, славіст, прафесар Пецярбургскага універсітэта.*

А. Мухлінскі нарадзіўся ў дробнай шляхецкай сям'і (магчыма татарскага паходжання). Сярэднюю адукацыю атрымаў у павятовай школе ў Маладзечне. У 1826 г. закончыў факультэт маральна-палітычных навук Віленскага універсітэта, атрымаўшы ступень кандыдата юрыдычных навук, у 1827 г. — ступень кандыдата на факультэце літаратуры і вольнага мастацтва. Фальклору і побыту беларусаў прысвяціў артыкул "Святы, забавы, прымхі і забабонныя абрады простага народа ў Навагрудскім павеце Літоўска-Гродзенскай губерні", апублікаваны ў часопісе "Вестник Европы" (1830). Вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце, ва Усходнім інстытуце пры Дэпартаменце Азіяцкай калегіі замежных спраў. У 1832 г. як урадавы стыпендыят для паглыблення моўных ведаў быў накіраваны на Усход: спачатку ў Стамбул, у 1834 г. — у Егіпет, дзе браў урокі ў вядомых пісьменнікаў, знайшоў у архівах (і потым апублікаваў) некалькі важных рукапісаў. У 1835–1839 гг. быў звышштатным прафесарам на кафедры турэцкай філалогіі Пецярбургскага універсітэта. У 1845 г. падаў у адстаўку і пераехаў у Варшаву, дзе атрымаў пасаду ў Галоўнай універсітэцкай бібліятэцы. У 1849 г. вярнуўся ў Пецярбург на кафедру турэцкай філалогіі. У 1853 г. А. Мухлінскі стаў штатным прафесарам, а ў 1859 г. — дэканам факультэта ўсходніх моваў Пецярбургскага універсітэта. У 1862 г. атрымаў ступень дзяржаўнага саветніка. Выйшаўшы ў 1866-1868 гг. на пенсію, падарожнічаў па Еўропе і Блізкім Усходзе. Стала жыў у Варшаве.

У сферы навуковых інтарэсаў А. Мухлінскага знаходзіліся гістарычныя сувязі Блізкага Усходу і Рэчы Паспалітай, усходнія запазычанні ў польскай мове, гісторыя мясцовых татараў і іх пісьменства на беларускай і польскай мовах арабскім алфавітам. Друкаваўся ў часопісе В. Сянкоўскага "Библиотека для чтения". Сярод апублікаваных яго даследаванняў — "Асманская хрэстаматыя для універсітэцкага выкладання (1858–1859), "Урывак з падарожжа па Усходзе" (1857-1858; 1860–1862), "Даследаванні аб паходжанні і стане літоўскіх татар (1857) і інш. Шмат прац А. Мухлінскага засталося ў рукапісах, у тым ліку "Турэцка-рускі слоўнік", "Граматыка турэцкай мовы", "Нарысы па гісторыі Турцыі". Фрагменты гэтых рукапісаў захоўваюцца цяпер у бібліятэцы Вільнюскага універсітэта. Наш суайчыннік быў вядомы таксама як вялікі аматар і калекцыянер кніг.

Алена Русаковіч

Мялешка Міхась

Мялешка Міхась (Міхаіл) Вінцэнтавіч; *псеўд. Міхалка Скарэўскі; (27.4(9.05).1892, в. Скары Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл. – красавік 1941, Куйбышаў, Расія), гісторык, архівіст, краязнавец, пісьменнік.*

З 1910 г. жыў у Пецярбургу, працаваў рабочым на азбеставай фабрыцы, канторшчыкам. Пазнаёміўся са студэнцкім беларускім гуртком і яго неафіцыйным кіраўніком Б. Эпімахам-Шыпілай. Спрабаваў свае сілы ў прыгожым пісьменстве, друкаваўся ў альманаху "Маладая Беларусь", "Нашай ніве". З 1914 г. — у арміі. У 1921 г. скончыў Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута. З 1923 г. — у Мінску, адзін з арганізатараў архіўнай справы, намеснік загадчыка Цэнтрархіва Беларусі. Арыштаваны 18 ліпеня 1930 г., абвінавачваўся ў прыналежнасці да так званага "Саюза вызвалення Беларусі", высланы у Самару тэрмінам на 5 гадоў. Працаваў у планавай камісіі, статыстычным упраўленні, краявым бюро краязнаўства і Навуковым таварыстве вывучэння Куйбышаўскага края. Выдаў кнігу "Славуты настаўнік, краязнавец і эксперыментатар Г. Дз. Смагін" (Самара, 1936). Склаў бібліяграфічныя даведнікі "Перыёдыка Сярэдневолжскага краю ў 1930 г.", "Орская прамысловая акруга", разам з акадэмікам Ю. У. Гацье і прафесарам П. Праабражэнскім — бібліяграфічны паказальнік літаратуры пра карысныя выкапні Сярэдняй Волгі (больш за 1500 назваў). Аўтар публікацый у часопісе "Советское краеведение". Арыштаваны 24 лютага 1938 г. органамі НКУС Куйбышаўскай вобл. Асобая нарада пры НКУС СССР 4 сакавіка 1940 г. вызваліла яго з залікам у тэрмін пакарання часу папярэдняга зняволення. З турмы выйшаў цяжка хворым. У адным з лістоў з бальніцы пісаў да жонкі: "1. Я прымаю смерць як збаўленне ад кашмарнага жыцця. (...) Хацелася б, каб прах мой тлеў у роднай зямлі, дзе пахаваны мае родныя — гэта немагчыма" (зберагаецца ў дачкі Людмілы Міхайлаўны Сакаловай). Рэабілітаваны ў 1957 і 1962 гг. У 1998 г. выдадзены зводны каталог "Бібліятэка Міхася Мялешкі". Асабісты архіў М. Мялешкі зберагаецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, асобныя дакументы (у т. л. лісты Т. Грыба з Прагі — у дачкі). У нашчадкаў захоўваецца і жывапісны партрэт М. Мялешкі работы мастака Я. Кругера, што дэманстраваўся на Першай Усебеларускай мастацкай выстаўцы ў 1925 г. Унучка М. Мялешкі кампазітар Наталля Спічко стварыла вакальны цыкл "Самарский туесок" на тэксты, запісаныя ў 30-я гг. дзедам.

Віталь Скалабан

Навадворскі Вітальд

Навадворскі Вітальд Уладзіслававіч *(2.6.1861, б. маёнтак Лемна Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл., — 25.11.1923, Вільня), гісторык, дацэнт Пецярбургскага і Кіеўскага універсітэтаў, прафесар Віленскага універсітэта.*

В. Навадворскі паходзіў са збяднелай шляхты. У 1878 г. скончыў гімназію ў Полацку і паступіў у Інстытут дарог і камунікацый у Пецярбургу. Праз 2 гады перавёўся на гісторыка-філалагічны факультэт Пецярбургскага універсітэта, які скончыў у 1885 г. са ступенню кандыдата навук. Да 1906 г. выкладаў гісторыю ў сярэдніх школах, І Пецярбургскім корпусе кадэтаў, польскай жаночай гімназіі пры касцёле св. Кацярыны. У 1900 г. стаў прыват-дацэнтам Пецярбургскага універсітэта, у 1904 г. атрымаў ступень магістра агульнай гісторыі на падставе крыніцазнаўчага даследавання "Барацьба за Лівонію паміж Масквой і Рэччу Паспалітай (1570–1582)".

В. Навадворскі — аўтар шматлікіх публікацый, рэцэнзій і навуковых артыкулаў, якія друкаваліся ў польскіх перыядычных выданнях "Głos", "Kwartalnik Historyczny", "Przegląd historyczny" і інш. Супрацоўнічаў з энцыклапедычнымі выданнямі, пісаў працы па гістарыяграфіі Літвы і Польшчы. Праводзіў вялікую работу па папулярызацыі польскай гістарычнай навукі і яе прадстаўнікоў. Апрацоўваў артыкулы з польскай тэматыкай для расійскіх энцыклапедычных выданняў. У 1906 г. В. Навадворскі прымаў удзел у гістарычна-літаратурым з'ездзе імя Мікалая Рэя ў Кракаве, дзе прадстаўляў польскую супольнасць Пецярбурга. У тым жа 1906 г. быў накіраваны звышштатным прафесарам агульнай гісторыі ў Гісторыка-філалагічны інстытут кн. Безбародкі ў Нежыне. Выкладаў на вышэйшых курсах А. Жэкулінай. З 1909 г. — у Кіеўскім гандлёвым інстытуце. У "Известиях" гэтага інстытута ўбачыла свет частка яго працы "Гістарычны матэрыялізм. Дактрына Маркса і Энгельса. Вопыт гістарычнага даследавання", дзе даў крытычны аналіз "Маніфеста камуністычнай партыі", гістарычных прац Маркса і Энгельса. На польскіх вышэйшых курсах, створаных у 1917 г. (пазней — Польская універсітэцкая калегія ў Кіеве), В. Навадворскі выкладаў гісторыю Польшчы, дзе закранаў праблемы, звязаныя са станаўленнем дэмакратыі. Быў адным з заснавальнікаў Польскага навуковага таварыства ў Кіеве. У 1922 г. стаў прафесарам агульнай гісторыі ў Віленскім універсітэце. Некаторы час выконваў абавязкі дырэктара Публічнай бібліятэкі таго ж універсітэта. У Вільні падрыхтаваў да друку польскі пераклад сваёй кнігі аб гістарычным матэрыялізме, працаваў над сінтэзам гісторыі культуры тагачаснай Еўропы.

Алена Русаковіч

Навасельскі Леанід

Навасельскі Леанід Мікалаевіч *(псеўд. Дзядзька Лявон; 10.9.1932, Мінск – 1.5.1996, Санкт-Пецярбург, Расія), вучоны, грамадска-палітычны дзеяч, паэт. Кандыдат тэхнічных навук (1975).*

Л. Навасельскі ў 1950 г. скончыў мінскую школу № 42. У 1956 г. — Вышэйшае ваенна-марское вучылішча (г. Пушкін Ленінградскай вобл.), праходзіў службу на Ціхаакіянскім флоце. У 1966 г. за першы ў гісторыі падводны паход з Паўночнага Ледавітага акіяна ў Міжземнае мора быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Быў удзельнікам выпрабаванняў доследнай падводнай лодкі К-27, у час якіх разгерметызаваўся ядзерны рэактар (1968), лодка была пахавана пад вадой. Потым працаваў у навукова-даследчым інстытуце над праблемамі эксплуатацыі падводных лодак. Капітан 1-га рангу.

У 1992 г. Л. Навасельскі стаў членам Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу, падрыхтаваў усе неабходныя дакументы і афіцыйна зарэгістраваў БГКТ у мэрыі Санкт-Пецярбурга. З 1994 г. — член праўлення БГКТ. Удзельнічаў у адкрыцці помніка беларусам і літоўцам — ахвярам палітычных рэпрэсій у Левашове. Супрацоўнічаў з Санкт-Пецярбургскай беларускай газетай "Родзічы". Быў чалавекам высокай культуры: чытаў па-французску і па-англійску, пісаў вершы на беларускай, рускай і польскай мовах. Заўчасна памёр у выніку абпраменьвання пры аварыі на падводнай лодцы К-27.

Мікалай Нікалаеў (Санкт-Пецярбург, Расія), Ларыса Языковіч

Навумавец Антон

Навумавец Антон Рыгоравіч *(2.1.1936, в. Рудка Пінскага пав. Палескага ваяв., цяпер Пінскі р-н Брэсцкай вобл.), фізік-матэматык, грамадскі дзеяч, прафесар (1984), доктар фізіка-матэматычных навук. Член-карэспандэнт НАН Украіны (1990), акадэмік НАН Украіны (1997), Сорасаўскі прафесар (1997). Лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР (1988) і Украіны (1997), заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Украіны (1995).*

А. Навумавец паходзіць з беларускай сям'і, яго бацька быў настаўнікам пачатковай школы. У 1952 г. з сярэбраным медалём скончыў сярэднюю школу г. Іванава Брэсцкай вобл. Вучыўся на радыёфізічным факультэце Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта імя Т. Шаўчэнкі. Пасля яго заканчэння (1957) працуе ў Інстытуце фізікі НАН Украіны ў Кіеве. З 1981 г. — загадчык аддзела фізічнай электронікі гэтага інстытута. У 1972–1993 гг. быў адказным сакратаром рэдкалегіі "Украинского физического журнала". Уваходзіць у склад рэдкалегіі. Таксама з'яўляецца членам міжнародных рэдакцыйных саветаў часопісаў "Физика низких температур" (Украіна), "Physics of Low-Dimensional Structures" (Расія), "Surface Science" (Галандыя), "Progress in Surface Science" (ЗША), "Journal of Physics D: Applied Physics" (Англія). З 1983 па 1998 г. з'яўляўся намеснікам акадэміка-сакратара Аддзела фізікі і астраноміі НАН Украіны. У 1998 г. выбраны акадэмікам-сакратаром.

А. Навумавец — вядомы вучоны ў галіне фізікі паверхні цвёрдых цел і фізічнай электронікі. Ім адкрыты шэраг новых з'яў у звыштонкіх плёнках, маючых таўшчыню ў адзін атамны слой. З'яўляецца аўтарам і сааўтарам каля 150 навуковых даследаванняў, у тым ліку 2 манаграфій. Адна з іх — "Двухмерныя крышталі" (Кіеў, 1988) — з'яўляецца першай у свеце манаграфіяй, спецыяльна прысвечанай плоскім (двухмерным) крышталям. А. Навумаўцом апублікавана шмат аглядных артыкулаў па розных пытаннях фізікі паверхні ў часопісах "Успехи физических наук", "Физика низких температур", "Soviet Scientific Reviews", "Surface Science Reports", "Contemporary Physics", "Chemical Physics of Solid Surfaces", зборніку "Solitons" і інш. Яго працы шырока цытуюцца ў літаратуры, у тым ліку і ў базавых падручніках па фізіцы паверхні, выдадзеных у ЗША і ФРГ. Ён выступаў з дакладамі на многіх аўтарытэтных міжнародных канферэнцыях. А. Навумавец выкладае ў Кіеўскім універсітэце. Сярод яго вучняў — 3 дактары і 8 кандыдатаў навук.

Андрей Нягрыйка (Кіеў)

Нарбут Андрэй

Нарбут Андрэй Мікалаевіч *(18.5.1930, Новасібірск, Расія), інжынер, прафесар, даследчык беларускай генеалогіі. Заслужаны работнік вышэйшай школы Расійскай Федэрацыі (1996).*

А. Нарбут у 1954 г. скончыў МВТВ імя Баўмана. У 1954–1963 гг. працаваў на аўтамабільным заводзе імя Ліхачова (ЗІЛ), у 1963–1969 гг. — ва Усесаюзным навукова-даследчым інстытуце будаўнічых і дарожных машын. З 1969 г. працуе ў Маскоўскім аўтамабільна-дарожным інстытуце. Доктар тэхнічных навук (1977).

З 1982 г. займаецца пытаннямі гісторыі генеалогіі Беларусі, радаслоўнымі княжацкіх, магнацкіх і шляхецкіх родаў. Удзельнік I і II Міжнародных кангрэсаў беларусістаў, навуковых канферэнцый, звязанных з гісторыяй і

генеалогіяй Беларусі. Аўтар больш 60 публікацый па гісторыі і генеалогіі, надрукаваных у Расіі, Беларусі, Украіне, Літве, Польшчы, манаграфіі "Генеалогія Беларусі" (1994–1996. Вып. 1–4), навуковых і навукова-папулярных артыкулаў у час. "Кантакты і дыялогі" (Мінск), зборніку "Наш радавод" (Гродна), зборніках "Беларусіка" і інш. Падтрымлівае сувязі з Таварыствам беларускай культуры імя Ф. Скарыны і Беларускім таварыствам "Бацькаўшчына" ў Маскве.

Замежны член Польскага геральдычнага таварыства (1989), член Гісторыка-радаслоўнага таварыства ў Маскве (1990), Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў (1991), старшыня Асацыяцыі беларусістаў Масквы (1995), правадзейны член Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі (1995)

Ларыса Языковіч

Наркевіч Альгерд

***Наркевіч Альгерд Станіслаў Адольфавіч** (21.10.1925 г., Вільня, цяпер Вільнюс), вучоны, доктар медыцынскіх навук (1960), прафесар (1971), член камітэта фізіялагічных навук ПАН (1988), член камітэта неўралагічных навук (1991), намеснік старшыні аддзела ПАН у Гданьску (1992).*

А. Наркевіч паходзіў з сям'і, дзе шанаваліся беларускія і польскія карэнні і традыцыі. Навуковая яго дзейнасць звязана з Гданьскай медыцынскай акадэміяй, дзе ён быў асістэнтам (1947–1952), старшым асістэнтам (1952–1954), ад'юнктам (1954–1962), дацэнтам (1962–1971). Доўгі час загадваў кафедрай анатоміі (1964–1996). Праходзіў навуковую стажыроўку ў ЗША (1961–1963, 1990–1991), Вялікабрытаніі (1968), Нарвегіі (1977), Германіі (1983). А. Наркевіч — аўтар каля 200 публікацый у галіне анатоміі і неўраанатоміі. З'яўляецца ўдзельнікам міжнародных навуковых канферэнцый, членам разнастайных таварыстваў і аб'яднанняў. У 1979–1988 гг. — старшыня, а з 1994 г. — ганаровы член Польскага анатамічнага таварыства. Ганаровы член Балгарскага таварыства анатамістаў, гістолагаў і эмбрыёлагаў (1978), член камісіі міжнародных кантактаў (1994), прадстаўнік РТА у IFAA і інш.

За вялікі ўклад у развіццё навукі наш суайчыннік неаднаразова адзначаўся Польскай акадэміяй навук. Узнагароджаны афіцэрскім крыжам адраджэння Польшчы (1995), мае навуковую ўзнагароду ад прэзідэнта Гданьска (1995). Жыве ў Гданьску.

Алена Глагоўска (Гданьск, Польшча)

Нарушэвіч Алена

***Нарушэвіч Алена** (11.11.1957, Орша Віцебскай вобл.), журналіст, дзеяч беларускай дыяспары ў Латвіі.*

А. Нарушэвіч скончыла Шумілінскую сярэднюю школу № 2, а ў 1986 г. — факультэт журналістыкі БДУ. Да лютага 1986 г. працавала ў Чашніцкай раённай газеце "Чырвоны прамень" (карэспандэнтам, загадчыцай аддзела, адказным сакратаром). З сакавіка 1986 г. жыве ў г. Вентспілс (Латвія), працуе карэспандэнтам гарадской газеты "Вентас Балсс". Выступае з атыкуламі пра беларуска-латышскае грамадска-культурнае ўзаемадзеянне. З'яўляецца намеснікам старшыні праўлення мясцовай беларускай суполкі "Спадчына". Часта наведвае Беларусь.

Ірына Тамільчык

Немэн Чэслаў

***Немэн Чэслаў** (сапр. Выдрыцкі Чэслаў Юліюш; 1939, в. Старыя Васілішкі Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл.), польскі спявак, музыкант, кампазітар.*

Нарадзіўся Ч. Немэн у сям'і, якая пасля вайны выехала ў Польшчу. Задэбютаваў як спявак у кабарэ "То ту" студэнцкага клуба "Жак" у Гданьску (1959). Лаўрэат І фестывалю маладых талентаў у Шчэціне (1962). Потым выступаў салістам у ансамблі "Чырвона-чорныя" ў Францыі. Заснавальнік ансамбляў "Акварэлі", "Немэн Энігматык", "Група Немэн", і "Немэн-Аэраліт". У канцы 1960-х гг. зацікавіўся польскай паэзіяй, асабліва Ц.-К. Норвідам і пачаў пісаць да яе музыку. Аўтар музыкі да фільма "Пах зямлі", тэлефільмаў, спектакляў "Дзяды", "Пан Тадэвуш" на словы А. Міцкевіча. Яго грампласцінкі і дыскі выходзілі ў розных краінах Еўропы, ЗША. Выканаўчая манера Ч. Немэна вызначаецца экспрэсіўнасцю. Выступаў у Гродне і на Гродзеншчыне.

Узнагароджаны Залатым крыжам заслугі (1974), прэміямі старшыні Савета Міністраў Польшчы за "творчыя дасягненні ў галіне кампазіцыі і інтэрпрэтацыі" (1970), "Трафеум мідэм" у Каннах (1968) і інш.

Юрый Вашкевіч

Нікалаева-Комісар Надзея

Нікалаева-Комісар Надзея Андрэеўна *(17.9.1907, Дзвінск, цяпер Даўгаўпілс, Латвія, – 6.10.1993, Рыга), дзеяч латышскай і беларускай музычнай культуры.*

Н. Нікалаева-Комісар скончыла Дзвінскую беларускую дзяржаўную гімназію (1927), Латвійскую кансерваторыю па класу вакала (1932), адначасова займалася на Беларускіх настаўніцкіх курсах (Рыга). Была салісткай радыё і Ліепайскай оперы. Станаўленне таленту Н. Нікалаевай у Дзвінску праходзіла пад кіраўніцтвам выкладчыцы гімназіі П. Мядзёлка. Па яе пачынанню і пад яе рэжысурай сіламі навучэнцаў гімназіі была пастаўлена "Паўлінка" Я. Купалы (1924), дзе Н. Нікалаева выканала ролю Паўлінкі. Гэты спектакль, першы ў яе жыцці, ставіўся з вялікім поспехам у многіх мясцінах Латвіі, у т.л. на сцэне Латвійскага Нацыянальнага тэатра (1924).

Н. Нікалаева-Комісар прымала ўдзел у рабоце Рыжскага беларускага народнага тэатра. У латышскім друку прыязна сустрэлі яго спектакль "Паўлінка", пастаўлены 24 красавіка 1927 г. Янам Шабертам, артыстам Латвійскага Нацыянальнага тэатра. У рэцэнзіі адзначалася ігра Надзеі Нікалаевай (Паўлінка), Мікалая Трубецкага (Пранцысь), Параскевы Раманоўскай (Альжбета). Н. Нікалаева-Комісар згадвае: "Над вобразам Паўлінкі працавала з вялікім захапленнем. З цеплынёй і сардэчнасцю прыпамінаю, як многа дапамагла мне Паўліна Вікенцьеўна Мядзёлка. Яна сама вельмі любіла тэатр, музыку і да гэтага мастацтва далучала і мяне. Роля Паўлінкі мне вельмі падабалася, у яе я ўкладвала ўсё сваё захапленне і любоў да гэтага вобраза, не гаворачы ўжо пра тое, што ўся п'еса прываблівала мяне жыццёвай мудрасцю, дасціпнасцю, мастацкай праўдай, музычнай напоўненасцю. Нездарма за добрае выкананне ў п'есе народнай песні "Не кукуй жа, зязюленька, рана" мяне доўга называлі Зязюлькай. Так спатканне з купалаўскім творам прадвызначыла ўвесь мой далейшы жыццёвы шлях".

Сяргей Панізьнік

Нікалаеў Мікалай

Нікалаеў Мікалай Віктаравіч *(21.11.1955, Шчучын Гродзенскай вобл.), беларускі гісторык і грамадскі дзеяч у Расіі.*

З сям'і афіцэра ваенна-паветраных сіл СССР. У 1972 г. скончыў сярэднюю школу у г. Навагрудку. У 1972–1977 гг. — студэнт гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, спецыялізаваўся па археалогіі, прымаў удзел у раскопках Замкавай гары старажытнага Навагрудка (экспедыцыя Ленінградскага аддзялення Інстытута археалогіі Акадэміі навук СССР, кіраўнік Ф. Д. Гурэвіч). Пасля заканчэння універсітэта — настаўнік гісторыі ў Лукашоўскай школе (Пастаўскі р-н Віцебскай вобл.). З 1978 г. жыве ў Ленінградзе (Санкт-Пецярбургу). Працаваў у Інстытуце археалогіі Акадэміі навук СССР, удзельнічаў у раскопках Старой Ладагі. З канца 1978 г. — у Расійскай Нацыянальнай бібліятэцы (навуковы супрацоўнік аддзелу рукапісаў, з 1993 г. загадчык аддзела газет). У 1991 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную старажытнабеларускай рукапіснай кнізе ў бібліятэках Расіі, Беларусі, Літвы і Польшчы. У 1997 г. атрымаў навуковую ступень доктара філалагічных навук за дысертацыю "Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага". Займаецца праблемамі гісторыі беларускага кнігазнаўства, археалогіі, гісторыі мастацтва і праваслаўнай царквы ў Беларусі. Аўтар манаграфіі "Палата кнігапісная" (Мн., 1993). Надрукаваў больш за 50 навуковых і навукова-папулярных артыкулаў у перыядычных выданнях Беларусі, Расіі, Польшчы, Літвы і інш. Адзін з заснавальнікаў Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, член Прэзідыума МАБ. Удзельнічаў у арганізацыі і правядзенні міжнародных канферэнцый, сімпозіумаў, семінараў, "круглых сталоў" па асобных пытаннях беларусазнаўства. Удзельнік Першага і Другога з'ездаў беларусаў свету (Мінск, 1993, 1997), Першай і Другой Усебеларускіх канферэнцый гісторыкаў (Мінск, 1993, 1996), навуковых канферэнцый у Мінску, Гродне, Брэсце, Навагрудку, Вільнюсе, Санкт-Пецярбургу і інш. Арганізатар і кіраўнік штогадовай навуковай канферэнцыі "Санкт-Пецярбург і беларуская культура" (з 1993). З 1994 г. выкладае ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце (спецкурс "Кніжная культура Беларусі"). З'яўляўся навуковым кансультантам пры стварэнні Полацкага музея беларускага кнігадрукавання і Навагрудскага гісторыка-краязнаўчага музея. Аўтар артыкулаў у "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" і "Беларускай энцыклапедыі".

Адзін з заснавальнікаў Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу, член яго праўлення. Старшыня рады Санкт-Пецярбурскай суполкі Міжнароднага беларуска-расійска-японскага фонду імя Іосіфа Гашкевіча (з 1995).

Ларыса Языковіч

Нісенбаўм Іцхак

Нісенбаўм Іцхак *(1868, Бабруйск – 1942, Варшава), яўрэйскі рэлігійны дзеяч, пісьменнік, вучоны-талмудыст.*

Вучыўся І. Нісенбаўм у іешыве ў Валожыне, дзе ў 1885 г. уступіў у тайны гурток "Нес Ціёна", мэтай якога было распаўсюджаванне ідэй засялення Эрэц-Ізраіля. У 1891 г. гурток быў разагнаны паліцыяй. У 1892 г. яго былыя члены стварылі арганізацыю з падобнай праграмай – "Нецах Ісраэль". У гэтам жа годзе і яна перастала існаваць у сувязі з закрыццём уладамі Валожынскай іешывы. Пасля арганізацыі "Нецах Ісраэль" пад кіраўніцтвам І. Нісенбаўма аднавілася ў Мінску і праіснавала да 1894 г. У 1984 г. Нісенбаўм атрымаў званне равіна, пераехаў у Беласток, дзе па запрашэнню Ш. Могілевера стаў сакратаром Духоўнага цэнтра. Пасля смерці Ш. Могілевера прапагандаваў ідэі сіянізму ў Расіі, Польшчы, Латвіі і Літве, стаў адной з цэнтральных постацей у сіянісцкім духу. У 1900 г. пасяліўся ў Варшаве, дзе і жыў да гібелі ў Варшаўскім гета (за выключэннем паездкі ў 1905 г. у Ізраіль). Ён быў адным з заснавальнікаў і актыўным членам руху Мізрахі., а таксама адным з кіраўнікоў Яўрэйскага Нацыянальнага фонду, быў членам выканаўчага камітэта сіянісцкай арганізацыі Польшчы, з 1937 г. кіраваў польскім адзяленнем Мізрахі.

У перыяд паміж дзвюма сусветнымі войнамі І. Нісенбаўм апублікаваў у друку на іўрыце і на ідыш шмат нарысаў аб сучасных падзеях, сіянізме і яўрэйскай духоўнай спадчыне, рэдагаваў газету "Ха-цфіра". І. Нісенбаўм з'яўляецца аўтарам некалькіх кніг – "Казані на ўсе суботы года і на святы" (1908), "Роздумы сэрца" (1911) і інш. Рэлігійны сіянізм стаў аб'ектам вывучэння ў яго працах "Рэлігія і нацыянальнае адраджэнне" (1920), "Нацыянальнае яўрэйства" (1920), "Традыцыя і свабода" (1939) і інш. У 1929 г. апублікавана аўтабіяграфія І. Нісенбаўма "Старонкі майго жыцця". Яго імя прысвоена аднаму з кібуцаў у Ізраілі.

Браніслава Котава

Нюнька Хведар

Нюнька Хведар Якубавіч *(6.4.1928, в. Алешавічы Шчучынскага пав. Навагрудскага ваяв., цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл.), інжынер, грамадскі дзеяч беларускай дыяспары ў Літве.*

Нарадзіўся ў беднай сялянскай сям'і, якая з часам дабілася пэўнага матэрыяльнага дабрабыту. У 1934 г. сям'я пераехала ў Вільню, дзе ў 1948 г. Х. Нюнька скончыў рускую гімназію імя І. Чарняўскага і паступіў у Літоўскую сельскагаспадарчую акадэмію на лясны факультэт, які скончыў у 1953 г. Працаваў па спецыяльнасці да 1959 г. З 1959 да 1992 г. — у праектных інстытутах Вільнюса. Апошнія 25 гадоў займаў пасаду галоўнага спецыяліста па каштарысах.

Х. Нюнька з'яўляецца актыўным беларускім грамадска-культурным дзеячам Вільнюскага краю. У 1989 г. выбраны старшынёй Таварыства беларускай культуры ў Літве. Пад яго кіраўніцтвам Таварыства змагло на працягу амаль двух гадоў наладзіць выпуск тыднёвай старонкі "Беларус Віленшчыны" ў рускамоўных і польскамоўных газетах, устанавіла 7 мемарыяльных дошак і 5 помнікаў знакамітым беларускім дзеячам, у сакавіку 1997 г. распачало выданне штомесячнай газеты "Рунь", арганізавала беларускую школу і факультэт беларускай мовы і літаратуры пры педінстытуце. У 1997 г. увайшоў у склад прэзідыума Рады БНР.

Ала Такінданг

Нядзвецкі Антон

Нядзвецкі Антон Пятровіч *(1902, в. Улукі Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Слаўгарадскі р-н Магілёўскай вобл. – 1986, Душанбе), геолаг. Акадэмік і віцэ-прэзідэнт АН Таджыкістана (1953).*

А. Нядзвецкі нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Скончыў Ленінградскі горны інстытут (1934). У 1932–1939 гг. працаваў у Цэнтральным навукова-даследчым геолагаразведачным інстытуце (Ленінград) як супрацоўнік Таджыкска-Памірскай экспедыцыі АН СССР, а ў 1939–1952 гг. — у Таджыкскім геалагічным упраўленні (з 1947 г. — галоўны геолаг). У 1953–1957 гг. быў віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук Таджыкістана. На працягу многіх гадоў кіраваў Таджыкскім філіялам Геаграфічнага таварыства СССР.

Асноўныя навуковыя даследаванні А. Нядзвецкага прысвечаны рэгіянальнай геалогіі і карысным выкапням Таджыкістана, заканамернасцям распаўсюджання поліметалічных і рэдказямельных радовішчаў Паміра, Зераўшана-Гісарскай горнай вобл. і Карамазара. А. Нядзвецкі — першаадкрывальнік буйнейшых у Сярэдняй Азіі сурмяна-ртутных радовішчаў Кадамджай-Хайдарканскага руднага поля і інш. Навуковыя працы друкаваў у "Докладах АН Таджикской ССР", "Вестях АН Таджикской ССР", "Трудах Института геологии АН Таджикской ССР" і інш. Яны шырока вядомы сусветнай геалагічнай навуцы.

Валерый Ярмоленка

Нядзвецкі Іосіф

Нядзвецкі Іосіф Маркавіч *(23.6.1908, Магілёў – 31.12.1949, Масква), даследчык Арктыкі, герой лядовага дрэйфу парахода "Георгій Сядоў". Герой Савецкага Саюза.*

Нарадзіўся І. Нядзвецкі ў сям'і рабочага. Рана застаўшыся без бацькоў, выхоўваўся ў дзіцячым доме. З 16 гадоў пачаў у Магілёве свой працоўны шлях як качагар, працаваў пракладчыкам чыгункі ў Карэліі, потым слесарам на заводзе "Анега" ў Петразаводску. Затым перайшоў працаваць машыністам ледакола "Ярмак". У канцы 1937 і пачатку 1938 г. ледакол "Ярмак" вызваляў параходы "Садко", "Малыгін" і "Георгій Сядоў" з лядовага палону ў моры Лапцевых. Першыя два судны былі выратаваны адразу, а трэцяе вымушана было дрэйфаваць з ільдамі. Экіпаж гэтага парахода замянілі добраахвотнікі з "Ермака", у тым ліку і І. Нядзвецкі.

Дрэйф "Георгія Сядова" працягваўся больш за 800 дзён і склаў 6100 км. Параходу пагражала гібель, але мужнасць і самаадданасць каманды выратавала яго. За праяўлены гераізм у час дрэйфу "Георгія Сядова" ўсім 15 членам экіпажа, у тым ліку і І. Нядзвецкаму, Указам Саўнаркама СССР ад 3 лютага 1940 г. было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. І. Нядзвецкі стаў другім Героем Савецкага Саюза з Магілёва, пасля О. Шміта, — і таксама за подзвіг у Арктыцы. З 1946 г. І. Нядзвецкі працаваў начальнікам палярнай станцыі на мысе Арктычны. У снежні 1949 г. трагічна загінуў, пахаваны ў Маскве.

Валерый Ярмоленка

Озераў Уладзімір

Озераў Уладзімір Фёдаравіч *(13.2.1935, в. Емяльянчыкі Дзісенскага пав. Віленскага ваяв., цяпер Шаркоўшчынскі р-н Віцебскай вобл.), палкоўнік медыцынскай службы, доктар медыцынскіх навук, прафесар, хірург вышэйшай катэгорыі.*

Нарадзіўся У. Озераў у сялянскай сям'і. У 1953 г. скончыў сярэднюю школу, паступіў у Ленінградскі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту. У 1954–1957 гг. курсант ваеннага вучылішча. У 1957–1980 гг. на вайсковай службе. У 1960–1966 гг. вучыўся на факультэце падрыхтоўкі ўрачоў для Ваенна-Марскога флоту Ваенна-медыцынскай акадэміі ў Ленінградзе, пасля заканчэння якой накіраваны начальнікам медыцынскай службы — урачом-хірургам акіянаграфічнага карабля "Мікалай Зубаў". З 1969 г. вучыўся ў клінічнай ардынатуры кафедры ваенна-марской і шпітальнай хірургіі Ваенна-медыцынскай акадэміі, потым працаваў там на кафедры: старшы ардынатар, выкладчык, старшы выкладчык, намеснік начальніка клінікі па лячэбнай рабоце, намеснік загадчыка кафедры. Пасля звальнення з Узброеных сіл працуе загадчыкам клініка-кансультацыйнага цэнтра ў Санкт-Пецярбургу.

У. Озераў займаецца навукова-даследчай працай у галіне медыцыны. У 1977 г. абараніў дысертацыю, атрымаў навуковую ступень кандыдата медыцынскіх навук, з 1985 г. — доктар медыцынскіх навук. У 1989 г. яму было прысвоена навуковае званне прафесара. Аўтар больш 130 друкаваных навуковых прац, прысвечаных пытанням клінічнай і ваенна-марской хірургіі.

З'яўляецца членам Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу.

Мікалай Нікалаеў (Санкт-Пецярбург, Расія), Ларыса Языковіч

Падбярэзскі Эдуард

Падбярэзскі Эдуард *(1947, Магілёўшчына), беларускі мастак, скульптар.*

Э. Падбярэзскі разам з бацькамі ў 1969 г. пераехаў у Літву, дзе ў 1971 г. закончыў мастацкую школу ў Вільнюсе. Творчую працу пачаў у рэстаўрацыйнай майстэрні з вяртання твораў мастацтва мінулых вякоў, на якіх час і войны пакінулі свае сляды. У шмат якіх святынях Вільнюса, багатых скульптурамі і фрэскамі вялікіх майстроў, ёсць творы, выратаваныя і вернутыя да жыцця Э. Падбярэзскім. Уласныя мастацкія пошукі прывялі яго да захаплення скульптурай. З 1975 г. ён самастойна працуе ў гэтай галіне. Адна з яго прац знаходзіцца ў касцёле Дзевы Марыі на Звярынцы. Аб цікавасці да яго твораў сведчыць тое, што яны знаходзяць пакупнікоў (заказы з Украіны і іншых дзяржаў). У апошнія гады з'явіліся акварэльныя працы. У 1994 г. адбылася выстаўка акварэляў Э. Падбярэзскага ў Вільнюсе. Мастак актыўна ўдзельнічае ў справах беларускай супольнасці ў Вільнюсе. Ён бясплатна зрабіў надмагільны помнік беларускаму драматургу Ф. Аляхновічу, устаноўлены на віленскіх могілках "Роса". Аўтарству Э. Падбярэскага належыць шасціметровая скльптура Хрыста, устаноўленая ў міленійным годзе пры пад'ездзе ў Вільнюс з боку Беларусі.

Галіна Сяргеева

Падсядлоўскі Тадэвуш

***Падсядлоўскі Тадэвуш** (22.11.1914, Мінск — 24.2.1986, Вільнюс), урач-эпідэміёлаг.*

Т. Падсядлоўскі ў 1938 г. скончыў Віленскі універсітэт. Пасля працаваў урачом у Вільнюсе, а ў 1939–1941 гг. — у Лідскім р-не Гродзенскай вобл. З 1942 г. Т. Падсядлоўскі ўключыўся ў партызанскую барацьбу. У 1943–1944 гг. быў намеснікам па санітарных справах кіраўніка партызанскай брыгады імя Варашылава. У студзені – ліпені 1944 г. — кіраўнік санітарнай часткі партызанскіх аб'яднанняў Нарачанскай зоны. Дапамагаў арганізоўваць санітарную службу ў партызанскіх атрадах Паўднёвай групы Літвы. З 1945 да 1960 г. працаваў у Міністэрстве аховы здароўя Літоўскай ССР: у 1945–1947 гг. — урач-эпідэміёлаг, у 1947–1954 гг. — загадчык супрацьэпідэміялагічнага аддзела, з 1954 да 1960 г. — начальнік упраўлення санітарыі і эпідэміялогіі. У 1960–1963 гг. — загадчык аддзела эпідэміялогіі Інстытута эпідэміялогіі, мікрабіялогіі і гігіены. У 1963–1984 г. Т. Падсядлоўскі быў галоўным эпідэміёлагам Міністэрства аховы здароўя Літоўскай ССР. Апублікаваў шэраг навуковых артыкулаў па пытаннях эпідэміялогіі.

Яніна Кісялёва

Палякоў Сяргей

***Палякоў Сяргей** (1956, Гомель), рускі і беларускі мастак.*

Дзяцінства С. Палякова прайшло ў Беларусі. Мастацкую адукацыю атрымаў у Маскве — скончыў мастацкае вучылішча памяці рэвалюцыі 1905 г., Маскоўскі дзяржаўны мастацкі інстытут імя Сурыкава (1987). Выхаванец рэалістычнай (акадэмічнай) школы І. Глазунова, С. Палякоў ужо на першай персанальнай выстаўцы (1990) выявіў самастойнасць у пошуках мастацкага стылю. У пачатку 90-х гг. ён перайшоў "ад рускага мадэрнізму да ўласных экзістэнцый і фарматворчасці", якія рускі мастацтвазнавец В. Хлебнікава абазначыла як "экзістэнцыяльнае перажыванне колеру" (Мастацтва. 1996. № 12). Працы яго набылі вядомасць і экспанаваліся не толькі ў Расіі, але і ў замежжы. Цікавасць гледачоў выклікалі шэсць выставак у ЗША (адна з іх адбылася ў галерэі прэстыжнага раёна Соха, другая — у Лінкольн-цэнтры, Нью-Йорк), персанальная выстаўка ў Швейцарыі (1996). Карціны мастака, намаляваныя ў 1989–1996 гг., экспанаваліся ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі (1997). У яго творах атрымала ўвасабленне тэма славянскага паганства, рускага народа, фальклорныя сюжэты ("Ноч Купалы", серыя "Славянскія матывы", "Доля", "З глыбінь стагоддзяў", "Лель і Лада", "Мікула Селянінавіч"). Шэраг карцін С. Палякова апошніх гадоў створаны ў стылі абстрактнага мастацтва ("Двое", "Меланхолія", "Асалода", "Фантазія", "Смутак"). С. Палякоў — адзін з прадстаўнікоў сучасных расійскіх жывапісцаў, звязаных з Беларуссю як паходжаннем, так і тэматыкай. У пачатку 1990-х гг. прыняты ў Міжнародную федэрацыю мастакоў пры ЮНЕСКО.

Галіна Сяргеева

Паперна Аўрахам Якаў

***Паперна Аўрахам Якаў** (1840, м. Капыль Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. – 1919, Адэса, Украіна), рускі і яўрэйскі пісьменнік, літаратурны крытык, педагог.*

А.-Я. Паперна вучыўся ў равінскіх семінарыях у Жытоміры і Вільні. У 1868–1909 гг. выкладаў асновы яўрэйскага веравучэння ў гімназіях Плоцка, загадваў мясцовым яўрэйскім вучылішчам. З 1862 г. пачаў публікаваць вершы і артыкулы ў яўрэйскім перыядычным друку. Тады ж захапіўся рускай літаратурай і літаратурнай крытыкай. У 1867 г. выдаў зборнік артыкулаў на ідышы "Новы гладыш са старым віном". Яго творы выклікалі вострую палеміку. Разгарэліся спрэчкі і вакол яго брашуры "Драма наогул і яўрэйская драма ў прыватнасці" (1868), рэцэнзіі на раман "Бацькі і дзеці" ўраджэнца Беларусі Мендэле Мойхера Сфорыма. А.-Я. Паперна напісаў падручнік рускай мовы, дапаможнік па складанню лістоў, "Кароткую граматыку яўрэйскай мовы ў катэхізіснай форме", якія вытрымалі некалькі выданняў. У 1890-х гг. апублікаваў шэраг вершаў і нарысаў, а таксама кнігі "Гутаркі жывёлы і птушак" (1892) і "Сучасныя байкі" (1893). З твораў на рускай мове варта назваць артыкул "Аб кнігах Макавейскіх" (час.: Христианское чтение. 1872), кнігу аб стане і патрэбах пачатковага яўрэйскага навучання (у хедэрах) у Расіі (1884), а таксама серыю гістарычных нарысаў аб яўрэйскіх абшчынных установах у Польшчы. "Успаміны" Паперны, надрукаваныя ў зборніку "Пережитое" (№ 2–3 за 1910 і 1911 гг.), вобразна паказваюць яўрэйскае жыццё ў Расіі 1850–1860 гг.

Браніслава Котава

Папковіч Пётр

Папковіч Пётр Фёдаравіч *(5.4.1887, Брэст – 3.4.1946, Ленінград, Расія), інжынер-механік, матэматык, доктар тэхнічных навук, прафесар. Член-карэспандэнт АН СССР (1933). Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі РСФСР (1944), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1946).*

Нарадзіўся П. Папковіч у сям'і служачага чыгункі. Скончыў суднабудаўнічы факультэт Пецярбургскага політэхнічнага інстытута са званнем марскога інжынера (1911). Працаваў інжынерам на будаўніцтве лінейных суднаў тыпу "Севастопаль". Адначасова займаўся навуковай дзейнасцю. Вынікі сваіх першых навуковых даследаванняў абмяркоўваў на пасяджэннях Таварыства марскіх афіцэраў. У 1920 г. паступіў у Ваенна-марскую акадэмію ад'юнктам. Затым яе выкладчык, прафесар, загадчык кафедры, прафесар Ленінградскага суднабудаўнічага інстытута. Прымаў актыўны ўдзел у арганізацыі першых навукова-даследчых інстытутаў Ваенна-Марскога флоту і суднабудаўнічай прамысловасці, у стварэнні Ленінградскага суднабудаўнічага інстытута.

Навуковыя інтарэсы П. Папковіча склаліся пад уплывам прафесара І. Бубнова, па прапанове якога ён быў запрошаны на кафедру будаўнічай механікі караблёў у Пецярбургскі політэхнічны інстытут (1916). З'яўляецца адным са стваральнікаў метадаў разлікаў і ацэнкі трываласці падводных лодак.

Даследаванні П. Папковіча (усяго 107 прац) прысвечаны пытанням будаўнічай механікі карабля і тэорыі пругкасці. Аўтар фундаментальных прац аб метадзе рашэння задач тэорыі пругкасці з дапамогаю трох гарманічных функцый, аб агульных тэарэмах устойлівасці пругкіх сістэм, на якія ўздзейнічаюць некалькі нагрузак. Вынікі сваіх тэарэтычных даследаванняў шырока выкарыстоўваў на практыцы. Распрацаваў арыгінальны метад для вывучэння частотаў вольных ваганняў складаных сістэм і паказаў, як выкарыстоўваюць яго ў разліках для марскіх артылерыйскіх прыстасаванняў. Стваральнік навуковай школы ў галіне будаўнічай механікі карабля. Аўтар навуковых дапаможнікаў па агульным і спецыяльным курсах. Як педагог выхаваў некалькі пакаленняў інжынераў-суднабудаўнікоў.

У 1940 г. атрымаў званне інжынера-контр-адмірала. У гады Вялікай Айчыннай вайны займаўся распрацоўкай і ўдасканаленнем баявых і тэхнічных якасцей караблёў па выніках вайсковых аперацый.

Вольга Гапоненка

Папоў Аляксандр

Папоў Аляксандр Нічыпаравіч *(1840, Віцебская губ. – 6.8.1881, Варшава), хімік, педагог.*

Нарадзіўся А. Папоў пад Віцебскам (месца дакладна не ўстаноўлена) у небагатай шляхецкай сям'і. Пачатковую адукацыю атрымаў дома, потым вучыўся ў Віцебскай і Табольскай гімназіях, апошнюю паспяхова скончыў у 1856 г. З-за фінансавых праблем у сям'і не меў магчымасці працягваць вучобу і ў 1856 г. быў вымушаны пайсці на вайсковую службу. У 1861 г. паступіў на юрыдычны факультэт Казанскага універсітэта на казённы кошт, паспяхова скончыў яго са ступенню кандыдата ў 1865 г. Працаваў хавальнікам Хімічнага музея, лабарантам у Казанскім універсітэце. У кастрычніку 1869 г. быў пераведзены ў Варшаўскі універсітэт і прызначаны экстраардынарным прафесарам і загадчыкам кафедры хіміі універсітэта. Чытаў для студэнтаў універсітэта курсы арганічнай, агульнай, аналітычнай і тэхнічнай хіміі. У 1869 г. арганізаваў там першую хімічную лабараторыю для правядзення навуковых даследаванняў і для практычных заняткаў са студэнтамі. У 1877 г., у час вайны з Турцыяй, знаходзіўся ў расійскай дзеючай арміі. Як хімік займаўся работамі па дызенфекцыі палёў бітваў і лагерных стаянак, а ў 1878 г. быў прызначаны членам Варшаўскага санітарнага камітэта.

Хіміяй А. Папоў зацікавіўся ў час вучобы ва універсітэце і пад кіраўніцтвам А. Бутлерава яшчэ ў студэнцкія гады выканаў свае першыя навуковыя даследаванні па хіміі вугляродных злучэнняў. Яны былі апублікаваны ў брашуры "Наконт роднасці вугляроднага паю" (Казань, 1865). У чэрвені 1865 г. ён абараніў дысертацыйную працу "Аб ізамерыі кетонаў", якая ў тым жа годзе выйшла асобным выданнем на нямецкай і французскай мовах. У красавіку 1869 г. абараніў у Казанскім універсітэце дысертацыю "Аб акісленні кетонаў аднаатамных" і атрымаў ступень магістра хіміі. Даследаванні па акісленню кетонаў і араматычных вуглевадародаў ён працягнуў у сваёй доктарскай дысертацыі "Аб заканамернасцях акіслення кетонаў і аб прымяненні іх для вызначэння будовы алкаголей і кіслот", якую абараніў у снежні 1872 г. у Пецярбургскім універсітэце.

Навуковыя працы А. Папова прысвечаны арганічнай хіміі. Ён адкрыў заканамернасці ў акісленні арганічных злучэнняў — кіслот, алкаголей, неарганічных і араматычных вуглевадародаў. Эксперыментальна даказаў, што ўсе чатыры адзінкі валентнасці вугляроднага атама тоесныя. Прапанаваў метады і распрацаваў першыя аналітычныя рэакцыі вызначэння хімічнай будовы кетонаў, кіслот, спіртоў і вуглевадародаў. Вывучаючы акісленне арганічных злучэнняў хромавай сумессю, А. Папоў даказаў, што яны распадаюцца па месцу падвойнай сувязі (т. зв. "правіла Папова"). Гэта правіла доўгі час было вядома як "правіла Кекуле", аднак прыярытэт тут належыць А. Папову.

А. Папоў быў ініцыятарам і рэдактарам спецыялізаванага перыядычнага выдання "Сборник трудов химической лаборатории Варшавского университета", у якім абагульняліся вынікі навуковых даследаванняў па хіміі ва універсітэце і якое з'явілася першым выданнем такога тыпу на тэрыторыі тагачаснай Расійскай імперыі. Першы выпуск зборніка быў выдадзены ў 1876 г., да V з'езда рускіх прыродазнаўцаў і ўрачоў, які праходзіў у Варшаве. А. Папоў быў членам арганізацыйнага камітэта гэтага з'езда (Варшава, 1876). Аўтар серыі навуковых артыкулаў у "Журнале Русского физико-химического общества", "Вестях Казанского университета", "Варшавских университетских известиях", якія спрыялі выпрацоўцы аналітычных метадаў аргіначнай хіміі. Вынікі навуковых даследаванняў вучонага былі абагулены ім у манаграфіі "Хімія вугляродаў" (у рукапісе), а для студэнтаў універсітэта ім быў напісаны падручнік "Арганічная хімія: Спецыяльны курс", якія не паспелі выйсці з-за смерці вучонага.

Памёр А. Папоў з-за хваробы, якую артымаў у арміі, і дадатковага атручвання пры рабоце са шкоднымі хімічнымі рэчывамі.

Вольга Гапоненка

Паўловіч Мікалай

***Паўловіч Мікалай** (24.6.1956, г.п. Карэлічы Гродзенскай вобл.), гісторык, краязнаўца, калекцыянер, дзеяч беларускай дыяспары ў Латвіі.*

М. Паўловіч нарадзіўся ў сям'і служачых. Вучыўся на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Вышэйшую адукацыю завяршыў у Латвійскім дзяржаўным універсітэце (1987). Жыве і працуе у г. Даўгаўпілсе. Збірае матэрыялы па гісторыі беларускага насельніцтва Латвіі, асабліва Латгаліі, па гісторыі Дзвінскай беларускай гімназіі. Публікуецца ў гарадскіх газетах. Падтрымлівае сувязі з беларускімі і латвійскімі даследчыкамі і калекцыянерамі. Зчасу заснавання Беларускага таварыства ў г. Даўгаўпілсе з'яўляецца адным з яго актывістаў.

М. Паўловіч актыўна супрацоўнічае з Браслаўскім музейным аб'яднаннем. З'яўляецца сябрам Браслаўскага краязнаўчага таварыства. Браў удзел у навукова-краязнаўчых канферэнцыях "Браслаўскія чытанні" (1997, 2000). Аказвае дапамогу ў падрыхтоўцы гістарычных зборнікаў "Браслаўскія сшыткі". Перадаў у фонды музея звыш 500 экспанатаў — прадметаў даўніны, друкаў, сабраных на тэрыторыі Браслаўшчыны і Латгаліі. Збірае для музея матэрыялы пра дзейнасць выхадцаў з Браслаўшчыны ў Латвіі. У 2000 г. адбылася выстаўка экспанатаў, падараваных М. Паўловічам музею у Браславе.

М. Паўловіч з'яўляецца сябрам Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына", быў удзельнікам з'ездаў беларусаў свету.

Кастусь Шыдлоўскі (Браслаў Віцебскай вобл.)

Пачобут-Адляніцкі Міхал

***Пачобут-Адляніцкі Міхал** (31.3.1910, в. Пачобуты Гродзенскай губ., цяпер Гродзенскі р-н), геадэзіст, прафесар (1960). Сапраўдны член Польскай акадэміі навук (з 1989, член-карэспандэнт з 1983).*

М. Пачобут-Адляніцкі атрымаў сярэднюю адукацыю ў Віленскай класічнай гімназіі ордэна езуітаў, а затым у Гродзенскай гуманітарнай гімназіі імя А. Міцкевіча. У 1929–1934 гг. вучыўся на геадэзічным факультэце Варшаўскага політэхнічнага інстытута. Пасля вучобы праводзіў землямерна-ўпарадкавальную работу ў Беластоцкім ваяводстве і горных рэгіёнах Польшчы. У 1939–1945 гг. выконваў геадэзічныя замеры ў Кракаве і яго ваколіцах, а таксама выкладаў у Кракаўскай горна-металургічна-землямернай школе. Пасля вайны М. Пачобут-Адляніцкі займаўся прасторавым планаваннем, выкладаў у вышэйшых навучальных установах. З 1951 г. выконваў абавязкі надзвычайнага, а з 1960 г. — звычайнага прафесара. З'яўляецца правадзейным старшынёй Польскага таварыства аматараў астраноміі.

М. Пачобут-Адляніцкі ўнёс вялікі ўклад у геадэзічныя, інжынерна-вышукальныя даследаванні, прасторавае планаванне вёскі (у т. л. шляхам аэрафатаграфіі). Падрыхтаваў плеяду навукоўцаў — дацэнтаў і прафесараў. Як вучоны вядомы не толькі ў Польшчы, але і за яе мяжой. Пачынаў працу і кіраваў Сацыяльнай групай даследаванняў Міжнароднай асацыяцыі геадэзіі, каардынаваў яе дзейнасць, праводзіў канферэнцыі, рэдагаваў геафізічныя працы для друку. У 1991 г. выбраны ганаровым членам гэтай асацыяцыі. У Міжнароднай федэрацыі геадэзістаў (FJG) узначальваў Камісію геафізічнай бібліяграфіі. Венгерскае таварыства геадэзіі і картаграфіі выбрала яго сваім ганаровым членам. Гэты ж тытул яму надалі польскія таварыствы геадэзістаў і урбаністаў. Сенат Сельскагаспадарча-тэхнічнай акадэміі імя М. Ачапоўскага ў Ольштыне ў 1997 г. надаў М. Пачобуту-Адляніцкаму тытул ганаровага доктара.

Браніслава Котава

Пекур Ігар

***Пекур Ігар** (18.4.1935, Мінск), мастак-жывапісец, заслужаны дзеяч мастацтва Літоўскай ССР (1985).*

І. Пекур у 1959 г. скончыў Мастацкі інстытут Літоўскай ССР. З 1960 г. працаваў выкладчыкам Вільнюскай дзіцячай мастацкай школы. З гэтага ж года удзельнічае ў мастацкіх выстаўках. У 1969 і 1986 гг. арганізаваў персанальныя выстаўкі сваіх твораў. І. Пекур стварыў тэматычныя кампазіцыі, сярод якіх многа антымілітарысцкіх: "Рэквіем ахвярам фашызму" (1968), "Хірасіма" (1967), "Дэкрэт аб міры" (1969), "Мае ўспаміны аб вайне" (1975). Малюе пейзажы — "Вясна" (1963), "Адліга" (1965), "Пейзаж з маланкай" (1976), "Кусты бэзу" (1980), "Фантастычны пейзаж" (1985). Піша таксама партрэты, графічныя творы. Яго творам уласцівы выразны малюнак, ясная кампазіцыйная структура, матэрыяльнасць формаў, эфектыўнасць розных фактур.

Яніна Кісялёва

Перасветаў Іван

***Перасветаў Іван Сямёнавіч** (XVI ст.), рускі публіцыст, філосаф, тэарэтык ваеннай справы.*

І. Перасветаў лічыў сябе нашчадкам Аляксандра Перасвета — героя Кулікоўскай бітвы. Быў ураджэнцам Беларускай часткі Вялікага Княства Літоўскага, "каралеўскім дваранінам". Паехаў у Расію ў канцы 30-х гг. XVI ст. У 1549 г. перадаў свае творы-чалабітныя і "Казанне пра цара Канстанціна" Івану IV Грознаму. І. Перасветаў з'яўляўся ідэолагам дваранства, выкрываў удзельных князёў і баяр, якія імкнуліся зноў раздрабніць Расію на часткі, прапаноўваў умацаваць уладу рускага цара, які пры гэтым павінен быў абапірацца на дваран і разлічвацца з імі не зямельнымі надзеламі, а грашовым узнагароджаннем за службу. Абгрунтаваў стварэнне стралецкага войска, узброенага вогнестрэльнай зброяй, раіў стварыць сталае 300-тысячнае войска для барацьбы з мяцежнымі баярамі і знешнімі ворагамі. Быў супраць закабалення свабодных людзей. І. Перасветаў пісаў, што цар павінен распраўляцца з непакорнымі вяльможамі так, як робіць гэта турэцкі султан. Гісторыкі лічаць, што некаторыя ідэі, выказаныя І. Перасветавым, былі ўвасоблены ў жыццё ў Расіі ў сярэдзіне XVI ст.

Алесь Карлюкевіч

Петрашкевіч Ядвіга

***Петрашкевіч Ядвіга** (30.8.1919, в. Налібакі Навагрудскага пав. і ваяв., цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл.), спявачка (сапрана). Заслужаная артыстка Літоўскай ССР (1954).*

Я. Петрашкевіч у 1947 г. скончыла Вільнюскую кансерваторыю па класу сольнага спеву. У 1948–1959 гг. — салістка Тэатра оперы і балета Літоўскай ССР, з 1959 г. — у Польшчы, спявала ў розных спектаклях оперных тэатраў. У Літве і Польшчы ўдзельнічала ў канцэртах. У Тэатры оперы і балета Літоўскай ССР выканала ролі Яраслаўны (А. Барадзін "Князь Ігар"), Марыны (М. Мусаргскі "Барыс Гадуноў", за гэтую ролю ў 1950 г. атрымала Дзяржаўную прэмію Літоўскай ССР), Таццяны, Марыі і Лізы (П. Чайкоўскі "Яўгеній Анегін", "Мазепа" і "Пікавая дама"), Тамары (А. Рубенштэйн "Дэман"), Тоскі (у аднайменнай оперы Дж. Пучыні) і інш. Гастралявала ў гарадах Венгрыі, Данії, Румыніі, СССР, Фінляндыі.

Яніна Кісялёва

Петручук Васіль

***Петручук Васіль Уладзіміравіч** (псеўд. Веслаў Пятроўскі, крыпт. В. П., Пе Ве.; 23.8.1926, в. Грабавец Беластоцкага. ваяв., Польшча), беларускі і польскі пісьменнік. Сябар Саюза польскіх літаратараў з 1987. Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Польшча (1988).*

Нарадзіўся В. Петручук у сялянскаи сям'і. Дзед яго служыў у рускай арміі ў Петраградзе. Бацькі працавалі на сваёй гаспадарцы. Цяжкім было дзяцінства будучага пісьменніка. Рана застаўшыся сіратой, служыў пастушком у вёсцы. У 1939 г., пасля з'яднання Заходняй Беларусі з БССР, пачаў вучыцца ў пачатковай школе і да 1941 г. скончыў тры класы. У гады вайны В. Петручук супрацоўнічаў з савецкімі партызанамі. З красавіка 1943 г. да ліпеня 1944 г. служыў парабкам. Па ўспамінах самога пісьменніка, працаваў як на катарзе, днём і ноччу, "за страву і лахманы". Пасля вайны служыў у Войску Польскім — у Корпусе ўнутранай бяспекі (1946–1949). Закончыўшы унтэр-афіцэрскія курсы (1947), стаў камандзірам аддзялення, намеснікам камандзіра ўзвода. Удзельнічаў у барацьбе супраць бандытаў. У 1949 г. скончыў курсы старшын рот і пасля павышэння ў вайсковым

званні накіраваны ў афіцэрскую школу Корпуса ўнутранай бяспекі (г. Легніца). Займаўся на курсах разведчыкаў у г. Вроцлаве (1951), у афіцэрскай школе контрразведкі (г. Легіянова, 1960–61). З 1950 да 1962 г. жыў і працаваў у Варшаве. Год вучыўся ў тэхнікуме сувязі (1955–1956). У 1960 г. скончыў эканамічны тэхнікум. Працаваў аператарам спецсувязі Міністэрства ўнутраных спраў. З 1969 г. на пенсіі. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, польскімі ордэнамі, медалямі, ганаровымі граматамі. З'яўляўся членам Верыфікацыйнаи камісіі, старшынёй камісіі па справах моладзі Саюза барацьбітоў за свабоду і дэмакратыю, членам Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага Таварыства, таварыства польска-савецкай дружбы, сакратаром літаб'яднання "Белавежа".

Упершыню В. Петручук выступіў у польскім друку ў 1961 г. Першае апавяданне на беларускай мове "Закалядаваў" апублікавана ў 1975 г. у беластоцкай газеце "Ніва". Заваяваў папулярнасць як аўтар фельетонаў "З маёй званіцы", якія друкаваліся ў той жа газеце. Аўтар аповесці "Пожня", выдадзенай на беларускай (Беласток, 1987; Мн., 1991) і польскай (Варшава, 1986) мовах, кнігі "Клавуня, гэта я, твой Вася" (Беласток, 1998). Артыкулы, апавяданні В. Петручука друкаваліся ў альманаху "Белавежа", "Беларускіх календарах", польскім часопісе "Kontrasty" і інш. Абапіраючыся на ўласны вопыт, расказвае пра цяжкае жыццё даваеннай беларускай вёскі на Беласточчыне. Сваімі творамі імкнецца абудзіць у чалавеку сумленне, выклікаць спагаду, міласэрнасць. Перакладае з беларускай на польскую мову. Жыве ў Беластоку.

Галіна Урупіна

Пецюкевіч Марыян

Пецюкевіч Марыян *(24.9.1904, в. Цяцеркі Браслаўскага пав. Віленскага ваяв., цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. – 25.9.1983, Торунь, Польшча), вучоны-этнограф, грамадскі дзеяч.*

М. Пецюкевіч нарадзіўся ў сям'і малазямельнага селяніна. Не маючы сродкаў на вучобу, спачатку вучыўся дома, потым — у Рускім народным вучылішчы ў в. Шаўляны (1914–1915). Да 1921 г. работу па бацькавай гаспадарцы ён чаргаваў з вучобай у Барадзеніцкай прыватнай школе (1917–1918), польскай школе ў Інаве (1918–1919). У 1920 г. у створанай па жаданню сялян Цяцерскай школе выкладаў беларускую мову. Нейкі час вучыўся на каваля ў свайго дзеда. Займаўся польскай мовай у прыватнага настаўніка ў в. Ёды (1921–1922). У 1922 г. паступіў у Віленскую беларускую гімназію. У час вучобы разгарнуў асветніцкую дзейнасць у вясковым асяроддзі па прапагандзе друкаванага беларускага слова, беларускіх народных песень, твораў беларускіх пісьменнікаў. Разам з сябрамі на свае сродкі арганізаваў у Цяцерках бібліятэку. Пасля заканчэння гімназіі ў Вільні (1926) М. Пецюкевіч вучыўся ў 8-м класе Радашковіцкай гімназіі (1927–1928). Паспрабаваў выехаць у Прагу для працягу вучобы, але на мяжы быў затрыманы польскай паліцыяй і пад прымусам узяты ў войска, дзе спачатку быў накіраваны ў Цешынскую афіцэрскую школу, а потым — у 5-ты полк легіянераў. Звольніўся са службы на пачатку 1929 г. Падрыхтаваўшыся на прыватных курсах Дубіцкага ў Вільні, здаў экзамены на атэстат сталасці. Адначасова супрацоўнічаў з рэдакцыяй газеты "Беларуская крыніца", куды дасылаў матэрыялы аб жыцці заходнебеларускіх вёсак. У 1929 г. паступіў у Віленскі універсітэт на гуманітарны факультэт, дзе вывучаў гісторыю, этнаграфію, этналогію, славістыку, археалогію. Каб мець сродкі на вучобу, уладкаваўся на работу ў бібліятэку імя Урублеўскіх (цяпер — Цэнтральная бібліятэка Акадэміі навук Літвы), дзе, маючы доступ да спецфондаў, дапамагаў беларускім дзеячам знаёміцца з забароненымі ў Польшчы выданнямі з БССР. Жывучы ў Вільні, М. Пецюкевіч працаваў у Беларускім інстытуце гаспадаркі і культуры, Беларускім студэнцкім саюзе, браў удзел у Беларускім касцельным хоры, быў членам Беларускага навуковага таварыства, рэдактарам маладзёжнага часопіса "Шлях моладзі" (1930–1935), супрацоўнічаў з Беларускім музеем імя І. Луцкевіча. У 1938 г. атрымаў дыплом магістра філалогіі. З прыходам Савецкай улады, у 1939 г., М. Пецюкевіч быў першым рэдактарам беларускіх перадач на Віленскім радыё, выконваў абавязкі дырэктара дзяржаўнай бібліятэкі імя Урублеўскіх і актыўна ўдзельнічаў у дзейнасці Прафсаюза працаўнікоў культуры Вільні. У кастрычніку 1939 г. быў прызначаны дырэктарам Беларускага музея.

У першыя дні гітлераўскай акупацыі М. Пецюкевіч выехаў у вёску да сям'і, потым па загаду Беларускага нацыянальнага камітэта арганізаваў у Вільні беларускія настаўніцкія курсы, дзе выкладаў беларускую мову і літаратуру. Пасля заканчэння работы на курсах быў накіраваны ў Ашмяны павятовым школьным інспектарам, потым выкладаў беларускую мову ў эвакуіраваным з Магілёва ў Новую Вілейку медыцынскім інстытуце. У 1944–1949 гг. жыў з сям'ёй у в. Неманчынка, працаваў на сельскай гаспадарцы, быў выбраны старшынёй Ажулайскага сельсавета. У 1945 г. быў арыштаваны, сядзеў у Лукішскай турме. У 1949 г. зноў рэпрэсіраваны за "нацыяналізм" і разам з сям'ёй высланы ў Сібір (г. Ужур Краснаярскага краю). У 1952 г. па санкцыі Генеральнага Пракурора ЛітССР яго адправілі ў Вільню на паўторнае следства і суд, які прыгаварыў М. Пецюкевіча да 25 гадоў пазбаўлення волі. Да 1957 г. знаходзіўся на катаржных работах у Варкуцінскім лагеры. Паводле пастановы Спецыяльнай Маскоўскай камісіі быў вызвалены. На падставе польска-савецкага пагаднення "Аб аб'яднанні разлучаных сем'яў" М. Пецюкевіч, скарыстаўшы права на рэпатрыяцыю, выехаў у Польшчу да жонкі.

З 1959 г. да 1970 г. працаваў у Этнаграфічным музеі ў Торуні. Часта выязджаў у творчыя камандзіроўкі, сустракаўся з беларускімі дзеячамі, сабраў каштоўны навуковы і мастацкі матэрыял. Меў добрыя літаратурныя здольнасці, пакінуў пасля сябе багатую спадчыну.

У сваёй навуковай працы М. Пецюкевіч шмат увагі ўдзяляў вывучэнню народнай культуры беларускага насельніцтва Беласточчыны. Аўтар шматлікіх артыкулаў па этнаграфіі і фальклору. У 1998 г. стараннем дачкі Марыі, якая жыве ў Італіі, выдадзена ў Вільнюсе кніга яго ўспамінаў "У пошуках зачараваных скарбаў". У рукапісах засталіся яго манаграфія пра родную вёску Цяцеркі і інш. працы.

Ірына Тамільчык

Пігулеўскі Уладзімір

Пігулеўскі Уладзімір Васільевіч *(псеўд. Гуль; 26.2(10.3).1889, Гродна – 17.6.1958, Рыга), беларускі, латышскі і рускі празаік, драматург, перакладчык, крытык. Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1957.*

Нарадзіўся У. Пігулеўскі ў небагатай сям'і. Бацька быў калежскім сакратаром у гарадской управе, марыў аб добрай адукацыі для сына. У. Пігулеўскі скончыў Мінскую мужчынскую класічную гімназію (1907), дзе быў членам гуртка рэвалюцыйна настроенай моладзі. У 1908 г. паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Пецярбургскага універсітэта. Адначасова з вучобай працаваў у "Прадамеце". Пасля заканчэння універсітэта (1912) служыў у царскай арміі ў Гродне. У гады Першай сусветнай вайны ўвесь час быў на фронце. Канец вайны застаў яго ў Літве, дзе давялося зведаць многа цяжкасцей, бракуа за выпадковую работу. У 1922 г. перабраўся ў Латвію, працаваў выкладчыкам беларускай гімназіі ў Дзвінску (Даўгаўпілсе), у 1924–1925 гг. быў дырэктарам Люцынскай беларускай гімназіі. Тады ж пазнаёміўся з Я. Райнісам, разам з якім удзельнічаў у арганізаванай Інбелкультам акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу (Мінск, 1926). Выступаў з прамовай на святкаванні 20-годдзя літаратурнай дзейнасці Я. Коласа. Пры падтрымцы Я. Райніса ўдзельнічаў у культурна-асветнай рабоце сярод беларускага насельніцтва Латвіі. У 1925 г., у выніку сфабрыкаванага адміністрацыяй працэсу, на якім беларускіх настаўнікаў абвінавачвалі ў намеры далучыць Латвію да Савецкага Саюза, У. Пігулеўскі быў вызвалены ад педагагічнай працы. Пераехаў з Люцына ў Рыгу, дзе знайшоў работу ў Транзітным кааператыўным банку. На з'ездзе прадстаўнікоў беларускіх культурна-асветных устаноў, гурткоў і арганізацый (Рыга, 1926) быў вылучаны на пасаду загадчыка Беларускага аддзела пры Міністэрстве асветы Латвіі і працаваў там у 1926–1934 гг. Пасля пераваротуа Ульманіса быў арыштаваны і сасланы ў Ліепайскі лагер (1935). Вярнуўшыся адтуль, актыўна ўдзельнічаў у падпольным рэвалюцыйным руху, займаўся журналістыкай. У 1940–1941 гг. — інспектар Міністэрства асветы Латвійскай ССР. У час Вялікай Айчыннай вайны эвакуіраваўся з латышскімі дзецьмі на Паволжжа, працаваў там школьным інспектарам, потым выхавацелем у дзіцячым доме (Менгеры, Татарыя). Пасля вайны працаваў у Рызе, выкладаў у мараходным вучылішчы, педагагічным інстытуце. Выйшаўшы ў 1950 г. на пенсію, займаўся літаратурнай работай. Узнагароджаны медалём, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР і інш.

Друкавацца У. Пігулеўскі пачаў у Люцыне ў 1924 г. У той час пераклаў на беларускую мову для пастаноўкі на школьнай сцэне п'есу латышскага драматурга Р. Блаўманіса "Блудны сын" (не апублікавана). Для школьнага ж тэатра напісаў п'есы "Хамуты", "У трамваі", "Вечар пад Каляды", "Гідра" (аб іх публікацыі звестак няма). Склаў чытанку для беларускіх школ у Латвіі "Наш край". Плённа працаваў у галіне перакладу з латышскай і чэшскай моў. На беларускай мове з дапамогай У. Пігулеўскага з'явіліся творы М. Бірзэ, Г. Бродэле, Я. Гранта, А. Грыгуліса, В. Кацэны, В. Клівера, В. Лаціса, І. Лейманіса, І. Муйжнека, Я. Ніедрэ, Г. Саксэ, З. Скуіня, А. Упіта і інш. На латышскую мову пераклаў камедыю Я. Купалы "Паўлінка" (пастаўлена ў 1949 г. Латвійскім мастацкім тэатрам імя Я. Райніса). Апублікаваў у латышскім друку многа артыкулаў пра беларускую літаратуру і тэатр, творчасць Я. Купалы, Я. Коласа. Рукапісная спадчына (у тым ліку неапублікаваныя творы) У. Пігулеўскага захоўваецца ў Аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі.

Людміла Бялевіч

Піліпенка Міхаіл

Піліпенка Міхаіл Карнеевіч *(3.9.1924, в. Дуброўка Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл.), ваенны, генерал-лейтэнант (1982). Герой Савецкага Саюза (1943). Ганаровы грамадзянін Кіева (1985). Заслужаны дзеяч вышэйшай школы.*

Нарадзіўся М. Піліпенка ў сялянскай сям'і. У ліпені 1941 г. разам з бацькам пайшоў добраахвотнікам на фронт, неўзабаве пры знішчэнні фашысцкага авіядэсанта быў ранены. Удзельнічаў у баях на Заходнім, Паўночна-Заходнім, Ленінградскім, Варонежскім, 1-м Украінскім франтах. Удзельнічаў у Курскай і Корсунь-Шаўчэнкаўскай бітвах. Сувязіст-разведчык малодшы лейтэнант М. Піліпенка асабіста вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра паўночней і паўднёвей Кіева. 1 кастрычніка 1943 г. у раёне в. Бортнічы і 5 кастрычніка 1943 г. ля в. Моцеж пад абстрэлам праціўніка перапраўляўся праз раку, каб наладзіць сувязь і карэкціраваць агонь артылерыі. На захопленым плацдарме з яго удзелам былі адбіты шматлікія контратакі ворага. У складзе перадавых падраздзяленняў удзельнічаў у вызваленні Кіева. У 1953 г. скончыў Ваенную акадэмію сувязі імя М. Будзённага. З 1963 г.

М. Піліпенка — начальнік Кіеўскага вышэйшага ваеннага інжынернага вучылішча сувязі імя М. Калініна. Прымаў актыўны ўдзел у ліквідацыі вынікаў Чарнобыльскай катастрофы. Ганаровы радыст СССР. З 1993 г. — старшыня Камітэта Герояў Савецкага Саюза і Кавалераў Славы 3-х ступеняў Украіны.

У 1996 г. М. піліпенка быў выбраны старшынёй грамадскай арганізацыі — Культурна-асветнага Таварыства "Беларусь", якая гуртуе суайчыннікаў у Кіеве і ў Украіне.

Браніслава Котава

Піскунова Валянціна

Піскунова Валянціна Аляксандраўна *(28.3.1941, в. Рудня-Целяшоўская Гомельскага р-на), прэзідэнт асацыяцыі беларусаў-прадпрымальнікаў Латвіі "Беларускі шлях", дырэктар фірмы "Ільгюцыемс", інжынер-будаўнік, прадпрымальнік, беларускі грамадскі дзеяч у Латвіі.*

У 1963 г. скончыла Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту (факультэт "прамысловае і грамадзянскага будаўніцтва). Атрымала спецыяльнасць інжынера-будаўніка. Накіравана на работу ў Латвію. Займала розныя пасады — ад майстра да намесніка кіраўніка буйнейшага ў рэспубліцы Рыжскага трэста буйнапанельнага домабудаўніцтва. Пасля яго рэарганізацыі пераведзена на пасаду намесніка начальніка Упраўлення забеспячэння капітальнага будаўніцтва Дзяржснаба Латвіі.

В. Піскунова паралельна сумяшчала службовыя абавязкі з шырокай грамадскай дзейнасцю. На працягу дзесяці гадоў працавала дэпутатам Ленінградскага райсавета г. Рыгі. Такі давер выбаршчыкаў невыпадковы. Многім дапамагла яна атрымаць кватэры, працаўладкавацца, вырашала пенсійныя справы, клапацілася аб уладкаванні дзяцей у дашкольныя ўстановы. Як выпускніцы прэстыжнага ВНУ, а потым і высокакласнаму спецыялісту, які праявіў сябе непасрэдна на будоўлі, а праз некаторы час — у апараце міністэрства, ёй быў аказаны давер узначаліць камісію народных дэпутатаў па архітэктуры і будаўніцтву. У тым, што раён Задзвіння адзін з найпрыгажэйшых у латвійскай сталіцы — немалая заслуга старшыні названай камісіі.

Цяпер В. Піскунова працуе дырэктарам фірмы "Ільгюцыемс", а ў чэрвені 1996 г. абрана прэзідэнтам асацыяцыі беларусаў-прадпрымальнікаў Латвіі "Беларускі шлях". Яна знаходзілася ля вытокаў Латвійскага фонду беларускай культуры. Ініцыятар і арганізатар стварэння газеты беларусаў Латвіі "Прамень". Пры яе непасрэдным матэрыяльным садзеянні першы нумар выйшаў у канцы снежня 1994 г. Гэтым самым быў узноўлены беларускі друк у Латвіі. В. Піскунова — намеснік старшыні Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны "Прамень", член Вялікай рады Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына". Аказвае значную дапамогу развіццю беларускай культуры ў Латвіі, фінансуе газету "Прамень". Ініцыятар стварэння культурнага камерцыйна-інфармацыйнага цэнтра. Шануе беларускую мову, беларускія традыцыі, карыстаецца вялікай павагай сярод сваіх суайчыннікаў.

Лявон Шакавец (Рыга)

Плуг Адам

Плуг Адам (сапр. Пяткевіч Антон Антонавіч, *крыпт. Р., А. Р.; 23.10.1823, в. Замосце Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Слуцкі р-н Мінскай вобл. – 2.11.1903, Варшава), польскі і беларускі пісьменнік і публіцыст, падарожнік.*

А. Плуг нарадзіўся ў шляхецкай сям'і. У 1831–1835 гг. жыў з бацькамі ў в. Жукаў Барок на Стаўбцоўшчыне. Скончыў Слуцкую гімназію (1842) і да 1845 г. працаваў хатнім настаўнікам на Падоллі. У 1845–1846 гг. вучыўся на філасофска-літаратурным факультэце Кіеўскага універсітэта, але недахоп матэрыяльных сродкаў вымусіў яго спыніць вучобу і вярнуцца на Падолле да настаўніцкай работы. Падарожнічаў па Украіне, наведваў Беларусь, Польшчу, Літву. За садзейнічанне паўстанцам 1863–1864 гг. А. Плуг быў зняволены і ў 1864–1866 гг. знаходзіўся пад арыштам у Жытоміры, потым у Кіеве. У 1874 г. А. Плуг прыняў прапанову выдаўца В. Левенталя пераехаць у Варшаву і супрацоўнічаць з ім у новым часопісе. Гэта супрацоўніцтва працягвалася амаль 5 гадоў; у 1879–1890 гг. працаваў рэдактарам часопіса "Kłosy", дзе друкаваў матэрыялы пра Беларусь. Калі "Kłosy" спынілі сваё існаванне (1891), А. Плуг стаў галоўным рэдактарам выдання "Wielka encyklopedya powszechna ilustrowana", адначасова працаваў у газеце "Kurjer Warszawski" (1899–1903) быў літаратурным кіраўніком часопіса "Wędrowiec" (1894–1899).

А. Плуг шмат зрабіў для развіцця польскай журналістыкі. У Варшаве быў членам многіх навуковых, літаратурных і дабрачынных таварыстваў, спрычыніўся да арганізацыі беларускага літаратурна-асветніцкага гуртка. Яго творчасць як пісьменніка і журналіста, аўтара многіх аповесцей, цесна звязана з Беларуссю. Ён сябраваў з У. Сыракомлем і В. Дуніным-Марцінкевічам, напісаў пра іх шэраг артыкулаў. У варшаўскім касцёле св. Крыжа ў 1905 г. устаноўлены яго бюст.

Валерый Ярмоленка

Пранчышчаў Васіль

Пранчышчаў Васіль *(1702, Магілёўшчына – 9.9.1736, Расія), мараплавацель, першы даследчык паўвострава Таймыр у Паўночным Ледавітым акіяне.*

Паходзіць са старажытнага шляхецкага роду. Закончыў Навігацыйную школу ў Маскве і Марскую акадэмію ў Пецярбургу (1721). У 1723 г. — мічман В. Пранчышчаў прымаў удзел у вайне з Персіяй на Каспійскім моры, потым служыў на Балтыцы. У 1733 г. як лепшы штурман Кранштадта лейтэнант В. Пранчышчаў быў прызначаны капітанам дубель-шлюпкі "Якуцк" з мэтай марскога плавання ўздоўж паўночна-ўсходняга ўзбярэжжа паўвострава Таймыр у складзе Вялікай паўночнай экспедыцыі. Каманду складалі падштурман Сямён Чалюскін, геадэзіст, іераманах, лекар, 50 матросаў і жонка Пранчышчава Таццяна. Перад В. Пранчышчавым была пастаўлена вельмі скаладана*я* задача — скласці карту і апісаць берагі Паўночнага Ледавітага акіяна ад вусця Лены да вусця Пясіны на паўночным захадзе Таймырскага п-ва. Упершыню еўрапейскі чалавек павінен быў наведаць самую паўночную кропку Азіі (зараз мыс Чалюскіна). Пачатковым пунктам для экспедыцыі быў прызначаны Якуцк. Да адплыцця была падрыхтавана дубель-шлюпка "Якуцк" — неглыбока сідзячае судна пад ветразямі і на вёслах, без палубы, спецыяльна для прыбярэжнага плавання. В. Пранчышчаў адплыў з Якуцка ўніз па Лене 30 чэрвеня 1735 г. На пачатку шляху давялося прайсці каля 1800 км па малавядомай магутнай рацэ Лене. Праз паўтара месяцы "Якуцк" дасягнуў дэльты ракі і выйшаў у Ледавіты акіян. У верасні судна ўвайшло ў вусце р. Алянёк, дзе з-за пачаўшыхся замаразкаў давялося стаць на зімоўку. Толькі ў жніўні 1736 г. судна атрымала магчымасць пачаць плаванне і ўзяць накірунак на паўночны захад. За вусцем Хатанскай губы экспедыцыя сустрэла два астравы, якія былі падзелены пралівам у 1 мілю (раён заліва Фадзея). За гэтымі астравамі давялося змяніць курс на поўнач, каб абмінуць суцэльны лёд, што падыходзіў да берага. 31 жніўня на шыраце 77°29′ судна трапіла ў самыя глыбокія ільды. Далейшае плаванне стала немагчымым, і яны павярнулі на поўдзень. Такім чынам, "Якуцк" не дайшоў да самай паўночнай кропкі Азіі ўсяго 40 міль, але ўпершыню падняўся на поўначы амаль да 78 п. ш. — падзея выключнай важнасці ў гісторыі пакарэння Арктыкі, якая заставалася недасяжнай на працягу амаль 150 гадоў (да 1878 г.); рэкорд Пранчышчава быў перакрыты вядомым Нардэльшэльдам пад час плавання на "Везе". У гэтым раёне былі адкрыты астравы Пятра і Самуіла. Вяртанне "Якуцка" было не менш цяжкім. У верасні падышлі да вусця р. Алянёк. Увесь экіпаж знаходзіўся на апошняй мяжы стомленасці. Хворы В. Пранчышчаў ужо не выходзіў з каюты і ў хуткім часе памёр. Пахаваны ён 17 верасня на высокім беразе р. Алянёк. Праз 13 дзён памерла і яго жонка. Дзве адзінокія магілы, пазначаныя крыжамі, доўгі час заставаліся ў невядомасці. Толькі ў 1875 г. географ А. Чаканоўскі знайшоў іх. У 1839 г. знакаміты палярны даследчык Э. Толь таксама наведаў гэтыя магілы і абнавіў на іх надпіс.

Імя В. Пранчышчава носіць адзін з мысаў Таймырскага п-ва (на ўсход ад мыса Чалюскіна), усё ўсходняе ўзбярэжжа Таймыра і краж ля вусця р. Алянёк.

Валерый Ярмоленка

Прахаў Андрыян

Прахаў Андрыян Віктаравіч *(16.3.1846, Мсціслаў Магілёўскай губ., цяпер Магілёўскай вобл. – 14.5.1916, Петраград, Расія), гісторык мастацтва, мастацкі крытык, падарожнік, педагог.*

Скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Пецярбургскага універсітэта (1867), пасля чаго вандраваў па Еўропе і вывучаў творы выяўленчага мастацтва (Германія, Аўстрыя, Італія, Францыя, Англія). Атрымаў ступень магістра навук за дысертацыю "Аб рэстаўрацыі групы ўсходняга франтона Эгінскага храма ў Афінах" (1873) і стаў дацэнтам Пецярбургскага універсітэта, дзе выкладаў гісторыю мастацтва. Два гады выкладаў таксама гісторыю і тэорыю прыгожых мастацтваў у Акадэміі мастацтваў, дзе пазней абараніў доктарскую дысертацыю на тэму "Дойлідства старажытнага Егіпта" (1879). У 1875–1878 гг. рэдагаваў ілюстраваны часопіс "Пчела". Вывучаў старажытныя помнікі хрысціянскага перыяду ў Расіі і на Украіне. У 1881–1882 гг. вандраваў па Грэцыі, Турцыі, Сірыі і Егіпце; у 1886–1887 гг. зноў наведаў Блізкі Усход і Італію. У 1887–1897 гг. працаваў выкладчыкам у Кіеўскім універсітэце на кафедры гісторыі прыгожых мастацтваў; адначасова кіраваў работамі па ўнутранаму аздабленню Уладзімірскага сабора і даследаваў фрэскі Сафійскага сабора ў Кіеве. Аднавіў ракію для захоўвання мошчаў Феадосіі Угліцкай у Чарнігаве. У 1897 г. вярнуўся ў Пецярбургскі універсітэт. Аўтар прац па гісторыі мастацтва з багатымі геаграфічнымі звесткамі: "Крытычныя даследаванні па гісторыі грэчаскіх мастацтваў" (1872), "Крытычныя назіранні за помнікамі старажытнага мастацтва" (1879), "Кіеўскае мастацтва XV–XII стст." (1883) і інш.

Валерый Ярмоленка

Прунікаў Іван

Прунікаў Іван Савельевіч *(16.6.1919, в. Папаратка Клімавіцкага пав. Гомельскай губ., цяпер Клімавіцкі р-н Магілёўскай вобл.), канструктар касмічнай тэхнікі, доктар тэхнічных навук (1958).*

І. Прунікаў нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У 1924 г. разам з сям'ёй выехаў у Краснадарскі край. Вярнуўся ў 1933 г. на радзіму, але неўзабаве выехаў у Краматорск (Данецкая вобл., Украіна), потым — да старэйшага брата ў Варонеж. Пасля заканчэння сярэдняй школы (1936) вучыўся ў Сталінградскім механічным інстытуце. У 1941 г. закончыў яго з адзнакай. У ліпені-жніўні 1941 г. працаваў на Сталінградскім трактарным заводзе тэхнолагам, потым наладчыкам станкоў ў цэху па выпуску танкаў Т-34. З верасня 1942 г. да сакавіка 1946 г. працаваў на эвакуіраваным з г. Сумы заводзе № 724 імя М. Фрунзе ў г. Чырчыку Ташкенцкай вобл. Узначальваў канструктарскае бюро інструментаў і прыстасаванняў.

І. Прунікаў з 1946 г. распачаў работу ў галіне ракетабудавання. Працаваў у навукова-даследчым інстытуце № 88 (цяпер Ракетна-касмічная карпарацыя "Энергія" імя С. П. Каралёва) у аддзеле галоўнага канструктара С. П. Каралёва. Прымаў удзел у стварэнні айчыннай ракеты Р-1, ракеты-носьбіта Р-2. Вучыўся ў аспірантуры (навуковы кіраўнік С. П. Каралёў). Абараніў кандыдацкую дысертацыю (1955). У 1956-1966 гг. узначальваў праектна-канструктарскі аддзел галаўных частак балістычных ракет, у 1966-1974 гг. — аддзел па праектаванню касмічных караблёў і распрацоўцы ракетна-касмічнага комплекса для экспедыцыі на Месяц. У 1974-1982 гг. быў галоўным канструктарам экспедыцыйнай месячнай базы-станцыі. З 1982 г. на пенсіі, але да 1995 г. працаваў на пасадзе старшага навуковага супрацоўніка.

І. Прунікаў — лаўрэат Ленінскай прэміі, узнагароджаны 2 ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Жыве ў г. Каралёве Маскоўскай вобл.

Аляксей Кажамяка (г. Клімавічы Магілёўскай губ.)

Пруфер Ян

Пруфер Ян *(5.3.1890, в. Бакуны Кобрынскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Пружанскі р-н Брэсцкай вобл. — 30.12.1959, Торунь, Польшча), заолаг-энтамолаг, доктар філасофскіх навук (1921), прафесар (1930).*

Я. Пруфер скончыў Кракаўскі універсітэт. У 1921–1940 гг. працаваў загадчыкам кафедры заалогіі Віленскага універсітэта. Адначасова з 1928 да 1940 г. быў дырэктарам Віленскай станцыі аховы раслін, а ў 1940–1945 гг. — навуковым супрацоўнікам гэтай станцыі. З 1945 г. — загадчык кафедры заалогіі Торуньскага універсітэта. Я. Пруфер напісаў навуковыя працы аб матылях, жуках, барацьбе са шкоднікамі раслін. Падрыхтаваў кнігу "Даследаванне матылёў Віленскага краю" (1947–1948).

Яніна Кісялёва

Прушынская Наталля

Прушынская Наталля Андрэеўна *(13.12.1939, Кола Мурманскай вобл., Расія), філолаг.*

Н. Прушынская паходзіць з сям'і беларускага пісьменніка Андрэя Мрыя (сапр. прозвішча Андрэй Шашалевіч), які быў рэпрэсаваны і загінуў у сталінскіх лагерах у 1943 г. Сям'я да 1944 г. жыла ў Клінцаўскім р-не Бранскай вобл., акупіраваным немцамі. Н. Прушынская вучылася ў Петразаводску (1944–1947), Гомелі (1947–1949), в. Негаўка Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл. (1949–1953), зноў у Петразаводску (1953–1956), на ст. Лоўхі Кіраўскай чыгункі (1956–1957), на філалагічным факультэце (аддзяленне нямецкай мовы, рускай мовы і літаратуры) Карэльскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута (1957–1962), пасля заканчэння якога выкладала ў вочна-завочнай сярэдняй школе № 2 ст. Петразаводск (1962–1966), у гомельскай школе № 41 (1966-1968). Да 1998 г. працавала ў Інстытуце мовы, літаратуры і гісторыі Карэльскага філіяла АН СССР (цяпер Карэльскі навуковы цэнтр РАН). Са студзеня 1999 г. з'яўляецца пазаштатным навуковым супрацоўнікам гэтага ж інстытута, кіраўніком тэмы. Н. Прушынская з'яўляецца аўтарам навуковых даследаванняў "Якуб Колас і "Калевала" (1994), "Калевала" ў Беларусі" (на фінскай мове, 1987), бібліяграфічных указальнікаў "Калевала"—помнік сусветнай культуры" (1993), "Летапіс літаратурнага жыцця Карэліі" (1989, 1994) і інш. Цікавіцца сучасным культурным і палітычным жыццём Беларусі.

Ірына Тамільчык

Прушынскі Конрад

Прушынскі Конрад *(псеўд. Казімеж Промык; 19.2.1851, Мінск — 8.7.1908, Варшава), асветнік, папулярызатар навукі.*

Пачатковую адукацыю К. Прушынскі атрымаў у Томску, куды яго бацька быў сасланы за ўдзел у паўстанні 1863 г. Экзамен за курс гімназіі здаў паспяхова экстэрнам у Варшаве ў 1872 г. і ў тым жа годзе паступіў на прыродазнаўчае аддзяленне Варшаўскага універсітэта, які скончыў у 1876 г.

К. Прушынскі мае вялікія заслугі ў пашырэнні асветы на тэрыторыі Польшчы і Беларусі. Арганізаваў у Варшаве Таварыства народнай асветы, якое мела мэтай адукацыю незаможных людзей. З 1881 г. выдаваў штогоднік "Gazeta Świateczna" (выходзіла да 1939 г.) і каляндар "Gość" (выходзіў да 1893 г.). Аўтар папулярных кніжак па геалогіі, астраноміі, прыродазнаўству, гісторыі і сельскай гаспадарцы.

Абраны ганаровым членам Таварыства ў Галіцыі (1906), Польскага таварыства асветы ў Вільні, Польскага таварыства асветы ў Мінску (1907). Пахаваны ў Варшаве, на Павозжаўскіх могілках.

Барбара Зяліньска (Варшава)

Прыбытак Станіслаў

Прыбытак Станіслаў Аляксандравіч *(25.9.1852, Мінск – 11.8.1927, Варшава), хімік і медык, прафесар Ваенна-медыцынскай акадэміі ў Пецярбургу, Варшаўскага універсітэта.*

Нарадзіўся С. Прыбытак у сям'і адваката. Пасля заканчэння ў 1869 г. Мінскай класічнай гімназіі паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Пецярбурскага універсітэта, які скончыў у 1874 г. са ступенню кандыдата прыродазнаўчых навук. У тым жа годзе быў прыняты на III курс Ваенна-медыцынскай акадэміі ў Пецярбургу. Пасля заканчэння вучобы прымаў удзел у турэцкай кампаніі як палкавы лекар. На ваеннай службе заставаўся да 1881 г. і працаваў урачом у вайсковым шпіталі ў Пецярбургу. За гады ваеннай службы быў узнагароджаны ордэнам св. Станіслава III (1877) і II (1878) ступеняў.

Першыя навуковыя даследаванні С. Прыбытак распачаў яшчэ ў студэнцкія гады. У 1881 г. ён абараніў дысертацыю на тэму "Некаторыя прадукты акіслення шмататамных спіртоў" і атрымаў ступень доктара медыцыны. У тым жа годзе быў запрошаны ў Пецярбургскі універсітэт. З 1881 г. працаваў лабарантам, ад'юнкт-лабарантам кафедры агульнай хіміі. У 1889 г. атрымаў ступень магістра хіміі за работу "Аб арганічных двухвокісах" (СПб., 1887) і быў абраны неардынарным прафесарам фармакалогіі і фармацэўтычнай хіміі Ваенна-медыцынскай акадэміі. Адначасова працаваў загадчыкам гарадской санітарнай лабараторыі. У 1902 г. быў прызначаны ардынарным прафесарам, а ў 1908 г. — ганаровым прафесарам акадэміі.

С. Прыбытак — аўтар шматлікіх артыкулаў па хіміі, якія друкаваліся ў розных расійскіх і замежных навуковых часопісах. За вынікі навуковых даследаванняў у 1911 г. быў абраны акадэмікам Ваенна-медыцынскай акадэміі, членам Рады ўрачоў Міністэрства унутраных спраў і Вучонага вайскова-санітарнага камітэта (да моманту іх закрыцця ў 1918 г.), узнагароджаны ордэнамі св. Станіслава I ступені, св. Анны I і II ступеняў, ордэнамі св. Уладзіміра II і III ступеняў.

Даследчык прымаў актыўны ўдзел у рабоце навуковых таварыстваў, у т. л. Рускага фізіка-хімічнага таварыства, Таварыства польскіх прыродазнаўцаў у Пецярбургу, міжнародных навуковых з'ездаў і кангрэсаў (Брусель, 1904, Жэнева, 1909, Парыж, 1910, 1911, Лондан, 1912). З 1920 г. жыў у Польшчы. Быў членам Вайсковай санітарнай рады ў Варшаве. У красавіку 1922 г. абраны прафесарам Варшаўскага універсітэта. З 1923 г. — ганаровы прафесар універсітэта.

Вольга Гапоненка

Путрамант Ежы

Путрамант Ежы *(14.11.1910, Мінск — 23.6.1986, Варшава), польскі празаік, публіцыст, грамадскі дзеяч.*

Е. Путрамант паходзіў з сям'і інтэлігентаў. Скончыў рускую школу ў Лідзе, факультэт польскай філалогіі Віленскага універсітэта (1934). У 1931–1934 гг. належаў да групы паэтаў, згуртаваных вакол часопіса "Żagary" ("Жагары"). У гэты ж перыяд быў сябрам нелегальнай арганізацыі Саюз універсітэцкіх левых "Фронт", што паўстала па ініцыятыве Камуністычнай партыі Польшчы. У 1935–1936 гг. сябра рэдакцыйнай калегіі часопіса "Po prostu" ("По просту"), у 1936 г. адказным рэдактарам часопіса "Karta" ("Карта"). У 1937 г. разам з іншымі сябрамі групы быў абвінавачаны ў камуністычнай прапагандзе на старонках гэтых выданняў. У выніку судовага працэсу

апраўданы. У пачатку Другой сусветнай вайны знаходзіўся ў Львове. У чэрвені 1941 г. эвакуаваўся ў глыбіню СССР. Быў адным з заснавальнікаў Саюза польскіх патрыётаў у Маскве, сябрам рэдкалегіі яго органа двухтыднёвіка "Nowe Widnokręgi" ("Новэ Віднокрэнгі"). Удзельнічаў у арганізацыі Першай арміі Войска Польскага, а затым служыў афіцэрам-палітруком у I Дывізіі імя Т. Касцюшкі. У 1944–1945 гг. працаваў у Любліне і Кракаве як журналіст і рэдактар. З верася 1945 г. знаходзіўся ў Швейцарыі як палол ПНР. У 1947–1950 гг. працаваў паслом Польшчы ў Парыжы. У 1952–1956 гг. дэпутат Сейма. У 1950–1956 гг. генеральны сакратар, у 1969–1980 гг. намеснік старшыні Галоўнага праўлення Саюза польскіх пісьменнікаў. Дзеяч ПАРП, у 1964–1981 гг. член яе ЦК. У 1972–1981 гг. галоўны рэдактар тыднёвіка, а з 1981 г. месячніка "Literatura" ("Літаратура"), прапагандыст сацыялістычнага рэалізму. У сваіх пазаічных творах Е. Путрамант аднабакова, згодна з афіцыйнай лініяй, выкладаў і інтэрпрэтаваў найноўшую гісторыю Польшчы: міжваеннага перыяду ("Рэчаіснасць"), вераснёўскай кампаніі 1939 г. ("Верасень"), ідэйна-палітычных канфліктаў 50-х гадоў ("Малааданыя"), "Раздарожжа", "Пушча". Пісаў успаміны ("Паўстагоддзя"), апавяданні ("Трынаццаты з Вясёлка"), "Выпадак у Красным ставе"), рэпартажы і фельетоны ("Тры вяртанні", "Палемічныя нататкі", "Два глыткі Амерыкі"), вершы ("Учора вяртанне", "Лясная дарога"). У многіх творах Е. Путраманта апісана Заходняя Беларусь. Апублікаваў некалькі артыкулаў пра беларускую літаратуру, творчасць Максіма Танка, перакладаў яго вершы (з 1935 г.). На беларускую мову перакладаліся вершы і апавяданні Е. Путраманта, яго раман "Верасень" (1959).

Лаўрэат Дзяржаўных прэмій ПНР (1953, 1955, 1964). Узнагароджаны Залатым крыжам заслугі і ордэнам Адраджэння Польшчы.

Пшыбароўскі Караль

Пшыбароўскі Караль *(18.8.1824, ваколіцы м. Хойнікі Рэчыцкага пав. Мінскай губ., цяпер Гомельскай вобл. – 1879, Камянец-Падольскі, Украіна), хірург, грамадскі дзеяч.*

Нарадзіўся К. Пшыбароўскі на Палессі, каля Хойнікаў. Вучыўся ў павятовай школе ў Мазыры. Скончыў гімназію ў Кіеве (1840). У 1845 г. скончыў медыцынскі факультэт Маскоўскага універсітэта і быў там пакінуты для падрыхтоўкі да вучонага звання. У 1848 г. атрымаў ступень доктара медыцыны, абараніўшы ў Маскоўскім універсітэце дысертацыйную працу "Nonnulla de morbo Brighti" (М., 1848). Некалькі гадоў працаваў у Смаленскай губ. як прыватны ўрач. На працягу 1850–1851 гг. слухаў у Пецярбургскім універсітэце лекцыі вядомага хірурга М. Пірагова, а ў 1852 г. паспяхова вытрымаў экзамен на аператара (памочніка хірурга). З 1853 г. — у Камянец-Падольскім (Украіна). Працаваў аператарам урачэбнага аддзела губернскай рады, потым заняў пасаду хірурга. У 1862 г. узначаліў мясцовы шпіталь ў Камянец-Падольскім, які тады меў два аддзяленні — для прыёму хворых і стацыянар. У выніку актыўных намаганняў К. Пшыбароўскага стацыянарнае аддзяленне шпіталя атрымала асобны будынак. З 1862 г. працаваў таксама ў шпіталі стараверaў.

Навуковыя даследаванні К. Пшыбароўскага прысвечаны практычнай хірургіі і фізіятэрапіі. Вывучаў залежнасць складу крыві ад стану здароўя чалавека. Сцвярджаў, што задачы медыцыны — дапамагаць арганізму падтрымліваць натуральныя працэсы жыцця. Меў добрыя здольнасці як хірург і карыстаўся вялікім аўтарытэтам сярод урачоў. Цікавіўся гісторыяй медыцыны. У 1859 г. падрыхтаваў і выдаў кнігу "Пасольскія лекары". К. Пшыбароўскі актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці. Дапамагаў у зборы ахвяраванняў для вучняў з бедных сем'яў. Быў аўтарам праекта па арганізацыі ў Камянец-Падольскім пажарнай аховы. З 1859 г. — сакратар, а з 1862 г. — неадменны сакратар (да моманту закрыцця ў 1865 г.) Таварыства падольскіх урачоў. У 1877 г. таварыства было адноўлена, і К. Пшыбароўскі стаў яго сапраўдным членам. У час паўстання 1863 г. уваходзіў у склад Падольскага рэвалюцыйнага камітэта. У 1864 г. утварыў Камісію для распрацоўкі статута гэтага камітэта. У 1878 г., пасля правядзення рэформы сістэмы кіравання, быў аднагалосна абраны гарадскім галавою Камянец-Падольскага.

У памяць пра К. Пшыбароўскага ў Камянец-Падольскім касцёле ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Вольга Гапоненка

Пякарскі Эдуард

Пякарскі Эдуард Карлавіч *(25.10.1858, х. Пятровічы Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл. – 29.6.1934, Ленінград, Расія), этнограф, лінгвіст, падарожнік, прыродазнаўца-географ, даследчык народнай культуры якутаў. Член-карэспандэнт Акадэміі навук СССР (1927), яе ганаровы акадэмік (1931).*

Э. Пякарскі нарадзіўся ў дваранскай сям'і. Вучыўся ў Мінскай і Мазырскай гімназіях. З-за палітычнай "нядобранадзейнасці" не змог завяршыць вышэйшую адукацыю. Пасля выключэння ў 1878 г. з Харкаўскага інстытута за ўдзел у студэнцкіх беспарадках быў арыштаваны ў Маскве (1879). За ўдзел у рэвалюцыйным руху

быў высланы ў 1881 г. ваенна-акруговым судом у Якуцкі край, дзе прабыў каля чвэрці стагоддзя (да жніўня 1905); 1881–1899 гг. пражываў у Ігідацкім наслегу Ботурускага ўлуса, а 1900–1905 гг. — у Якуцку. Будучы ў ссылцы ў цесных сувязях з якуцкім насельніцтвам, Э. Пякарскі, не маючы спецыяльнай лінгвістычнай і этнаграфічнай падрыхтоўкі, шляхам самаадукацыі стаў адным з лепшых знаўцаў якуцкай мовы, побыту і фальклору. Пры садзейнічанні сяброў па ссылцы, саміх якутаў і мясцовых рускіх жыхароў ён сабраў адпаведныя каштоўныя матэрыялы, выкарастаныя ў яго друкаваных працах. Па краязнаўчай рабоце завязаў сувязі з Якуцкім статыстычным камітэтам і Усходне-Сібірскім аддзелам Рускага геаграфічнага таварыства, прыняў удзел у складанні "Памятнай кніжкі Якуцкай вобласці", у першым выпуску якой (1895) з'явілася яго першая друкаваная праца "Якуцкі род да і пасля з'яўлення рускіх".

Па запрашэнню вядомага навукова-палітычнага дзеяча Расіі Д. Клеменца ў 1894–1896 гг. Э. Пякарскі прыняў удзел у т.зв. Сібіракоўскай якуцкай экспедыцыі, арганізаванай Усходне-Сібірскім аддзелам Расійскага геаграфічнага таварыства для вывучэння краю ў эканамічным, юрыдычным і бытавым планах. Склаў для яе навуковую праграму па збору звестак аб матэрыяльнай і духоўнай культуры якутаў. На сродкі экспедыцыі выдаў у Якуцку (1899) першы выпуск свайго "Слоўніка якуцкай мовы", які з'явіўся пазней (1907) другім выданнем у Пецярбургу пад эгідай Акадэміі навук. Летам 1903 г. Пякарскі ўдзельнічаў у Нэлькана-Аянскай экспедыцыі, займаючыся вывучэннем прыаянскіх тунгусаў і зборам калекцый для Этнаграфічнага аддзела Рускага музея ў Пецярбургу, дзе потым, у 1905–1911 гг., працаваў рэгістратарам этнаграфічных калекцый. Справаздача аб экспедыцыі была надрукавана ў "Известиях Общества археологии, истории и этнографии" (Казань, 1904. Т. 20. Вып. 4–5 с.).

Пераехаўшы ў 1905 г. у Пецярбург, Э. Пякарскі працаваў у музеях. Да канца свайго жыцця праяўляў вялікую цікавасць да слоўнікавага багацця якуцкай мовы. Прыступіў ён да гэтай справы ў першыя ж дні сваёй ссылкі (1881) і не спыняў яе нават пасля з'яўлення акадэмічнага выдання (1930), выніку амаль 50-гадовай сваёй працы. Ва ўказаным выданні налічваецца 25 000 якуцкіх слоў.

З 1911 г. і да смерці, больш за 20 гадоў, Э. Пякарскі працаваў у Расійскай акадэміі навук — спачатку ў Музеі антрапалогіі і этнаграфіі, які выдзеліўся з Рускага музея, а ў апошнія гады жыцця — у Інстытуце ўсходазнаўства АН СССР. З 1914 г. ён быў сакратаром Этнаграфічнага аддзела РУТ, вёў вялікую рэдакцыйную работу. Аўтар шматлікіх навуковых прац па геаграфіі, этнаграфіі, лінгвістыцы і фальклярыстыцы якутаў і тунгусаў.

Валерый Ярмоленка

Пярдэня Ян

Пярдэня Ян *(1898, в. Пелішчы Брэст-Літоўскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Камянецкі р-н Брэсцкай вобл. – 5.1.1973, Кракаў, Польшча), польскі гісторык, краязнавец.*

Нарадзіўся Я. Пярдэня ў сялянскай сям'і. Атрымаў пачатковую адукацыю ў народным вучылішчы ў Пелішчах, у 1915 г. скончыў вышэйшую пачатковую школу ў Кобрыне. Вучыўся на педагагічных курсах у Кобрыне, настаўнічаў у аднакласных школах у Багдзюках, Турне, Падлессі, Грабаўцах, Вуглянах. Удасканальваў свае веды самаадукацыяй. У 1926 г. скончыў настаўніцкую семінарыю ў Пружанах, экстэрнам здаў экзамены на атэстат сталасці ў Брэсцкай гімназіі. У 1930–1934 гг. вучыўся ў Ягелонскім універсітэце у Кракаве, які закончыў абаронай магістарскай дысертацыі на тэму "Свет Гржымултоўскага". Вярнуўся на Камянеччыну, працаваў у Вуглянах, потым да 1938 г. быў настаўнікам у Камянец-Літоўскім. Праводзіў археалагічныя раскопкі вакол Камянецкай вежы, вывучаў гісторыю Камянеччыны, вёў пошукавую работу ў архівах Бельгіі, Гродна, Варшавы. У 1938 г. працаваў у Брэсцкай гімназіі імя Р. Траўгута. У 1936–1938 гг. напісаў манаграфію, прысвечаную гісторыі Камянец-Літоўска і Камянецкага пав. у 1413–1566 гг., якая была станоўча ацэнена польскімі даследчыкамі. У 1938 г. стаў сакратаром Польскага гістарычнага таварыства. Пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР працаваў выкладчыкам фізікі і матэматыкі ў школах Брэста. У гады фашысцкай акупацыі — рабочы ў шпіталі, быў звязаны з антыфашысцкім падполлем. З-за пагрозы арышту ў 1944 г. разам з сям'ёй пераехаў у ваколіцы Кракава. У 1945 г. у Ягелонскім універсітэце ў Кракаве абараніў дысертацыю "Манаграфія Камянца-Літоўска і староства" і атрымаў ступень доктара філасофіі. У 1946–1948 гг. працаваў асістэнтам кафедры сучаснай гісторыі Польшчы ў Ягелонскім універсітэце, выкладаў у ліцэях. З 1951 да 1969 г. — у Вышэйшай педагагічнай школе ў Кракаве — выкладчык рускай мовы і гісторыі, старшы выкладчык, пасля 1969 г. — дацэнт Ягелонскага універсітэта. Вывучаў гісторыю казацкага руху ў Рэчы Паспалітай, адносіны Рэчы Паспалітай да Украіны ў XVII–XVIII стст., гісторыю ўсходніх зямель Рэчы Паспалітай. З'яўляўся членам Камісіі гістарычных навук і Камісіі педагагічных навук Кракаўскага аддзялення Польскай акадэміі навук.

Ларыса Языковіч

Пяткевіч Лявон

Пяткевіч Лявон *(9.12.1916, Віцебск — 8.7.1986, Вільнюс), хірург-траўматолаг, артапед, доктар медыцынскіх навук (1974), прафесар (1978).*

Л. Пяткевіч у 1942 г. скончыў Каўнаскі універсітэт. Працаваў у бальніцах Вільнюса. З 1946 г. выкладаў у Вільнюскім універсітэце. Адначасова ў 1954–1963 гг. — загадчык аддзялення траўматалогіі і артапедыі Вільнюскай рэспубліканскай клінічнай бальніцы. З 1977 г. — старшыня Навуковага таварыства траўматолагаў і артапедаў Літоўскай ССР.

У доктарскай дысертацыі Л. Пяткевіч даследаваў спосабы хірургічнага лячэння дэфармацыйнага артроза суставаў бядра. Адзін з першых у Літве пачаў праводзіць артрапластычныя аперацыі. З'яўляецца адным з аўтараў падручнікаў "Догляд хворых" (1967) і "Клінічная хірургія" (1969, 1980). Разам з іншымі падрыхтаваў і выдаў кнігу "Найбольш распаўсюджаныя артапедычныя захворванні" (1982).

Яніна Кісялёва

Пятруннікаў Аляксандр

Пятруннікаў Аляксандр Емяльянавіч *(4.10.1936, п. Нікольскі Жлобінскага р-на Гомельскай вобл.), вучоны.*

А. Пятруннікаў скончыў Пірэвіцкую сярэднюю школу, затым працаваў на будаўніцтве Васілевіцкай ДРЭС, адкуль пайшоў служыць у Савецкую Армію. У 1959 г. паступіў вучыцца у Гомельскае тэхнічнае вучылішча, пасля заканчэння якога працаваў на заводзе "Гомсельмаш". У 1963 г. паступіў на гістарычны факультэт Гродзенскага педагагічнага інстытута імя Я. Купалы, у 1970 г. — у аспірантуру Інстытута гісторыі АН БССР і паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю. Працаваў ў розных навуковых установах Беларусі. З 1984 г. — дацэнт Санкт-Пецярбургскага горнага інстытута імя Г. Пляханава. Цяпер працуе ў філіяле гэтага інстытута ў г. Манчагорску Мурманскай вобл. (Расія).

А. Пятруннікаў — аўтар шматлікіх прац па гісторыі маладзёжнага руху, развіцця грамадства і станаўлення беларускай дзяржаўнасці.

Браніслава Котава

Рабіновіч Ісак

Рабіновіч Ісак Майсеевіч *(10(22).1.1886, Магілёў – 28.4.1977, Масква), вучоны ў галіне будаўнічай механікі. Член-карэспандэнт АН СССР (1946), сапраўдны член Акадэміі будаўніцтва і архітэктуры СССР (1956), генерал-маёр-інжынер (1943), Герой Сацыялістычнай Працы (1966), заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі РСФСР (1944).*

І. Рабіновіч скончыў у 1918 г. Маскоўскае вышэйшае тэхнічнае вучылішча. Працаваў прафесарам у Вайскова-інжынернай акадэміі (1932) і Маскоўскім інжынерна-будаўнічым інстытуце (1933).

Навуковыя даследаванні І. Рабіновіча прысвечаны дынаміцы і трываласці збудаванняў. Распрацаваў метады разліку складаных статычна нявызначаных сістэм, тэорыю вантовых ферм, разгледзеў прымяненне кінетычнага метаду ў будаўнічай механіцы. У тэорыі структуры прапанаваў некаторыя спосабы стварэння кінематычных ланцугоў з адвольнай ступенню свабоды, сфармуляваў тэарэму аб кінетычным разліку складаных прасторавых ферм, пашырыў паняцце аб лініі ўплыву. Прапанаваў геаметрычны метад вызначэння перамяшчэнняў, які улічвае любы закон змянення знешняй сілы ў часе. Вывучыў дзеянне кароткачасовых нагрузак на элементы збудаванняў. І. Рабіновіч вядомы таксама як даследчык гісторыі будаўнічай механікі.

Вольга Гапоненка

Равенскі Станіслаў

Равенскі Станіслаў *(9.3.1825, в. Пятрэвічы Навагрудскага пав., цяпер Навагрудскі р-н. Гродзенскай вобл. – 19.3.1907, в. Калдычава Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл.), пісьменнік, публіцыст.*

С. Равенскі скончыў гімназію ў Вільні (1842). У 1843–1848 гг. вывучаў прыродазнаўчыя і сельскагаспадарчыя навукі на фізіка-матэматычным аддзяленні Дэрпцкага універсітэта, дзе атрымаў у 1851 г. ступень кандыдата навук. У 1848–1856 гг. быў хатнім настаўнікам у розных заможных дамах на Беларусі, з 1857 г. жыў і працаваў на радзіме, у Пятрэвічах. Прыняў удзел у паўстанні 1863 г. Пасля яго падаўлення эмігравaў у Варшаву і заняўся

публіцыстыкай. З 1868 г. друкаваўся ў розных газетах і часопісах. Аўтар каля 200 артыкулаў па сельска-гаспадарчых і эканамічных пытаннях. С. Равенскі выконваў абавязкі сакратара рэдкалегіі пры падрыхтоўцы і выданні энцыклапедычных выданняў "Encyklopedii rolnictwa i wiadomości zwią zek z nim mają cych" (Warszawa, 1873–1879. Т. 1–5), а потым "Encyklopedii rolniczej" (Warszawa, 1890–1902. Т. 1–11). Ён быў аўтарам некаторых артыкулаў гэтага выдання, склаў для яго бібліяграфію літаратуры па сельскай гаспадарцы ў Польшчы з 1800 г. да канца XIX ст. У 1905 г. па стану здароўя пераехаў у Калдычава, дзе і памёр.

С. Равенскага лічаць лепшым публіцыстам Польшчы другой паловы XIX ст. па ўказаных вышэй пытаннях. Яго дзейнасць спрыяла развіццю сельскай гаспадаркі Польшчы. Сярод асноўных прац, выдадзеных у Варшаве, "Гаспадарчая бухгалтэрыя" (1879), "Лісты пра конную язду" (1880, 1885), "Гаспадараннe ў кароўніку, малачарні і хляве" (1887), "Дапаможнік для паляўнічых" (1903) і інш. Пераклаў з нямецкай мовы кнігі А.-Р. Шнайдэра "Узорны земляроб" (1887), Э. Бірнбаўма "Пясчаныя землі і іх апрацоўка" (1888), Б. Шульца "Кармленне жывёлы" (1898). С. Равенскі з'яўляецца аўтарам шматлікіх артыкулаў па сельскай гаспадарцы, у т. л. аб сельскагаспадарчых выстаўках, у энцыклапедыях і газетах.

Вольга Гапоненка

Рагоўскі Яўген

Рагоўскі Яўген Аляксандравіч *(1855, Кобрын Гродзенскай губ., цяпер Брэсцкая вобл. – 1923, Харкаў, Украіна), фізік, прафесар Пецярбургскага і Харкаўскага універсітэтаў.*

Я. Рагоўскі паходзіў з патомнай шляхты Гродзенскай губ. Яго бацька быў гарадскім урачом ў Кобрыне. Скончыў Беластоцкае рэальнае вучылішча (1874). У 1876 г. паступіў у Пецярбурскі тэхналагічны інстытут. У 1877 г. перайшоў на матэматычнае аддзяленне фізіка-матэматычнага факультэта Пецярбургскага універсітэта. Слухаў лекцыі Дз. Мендзялеева, П. Чэбышава, Ф. Петрушэўскага, І. Боргмана, А. Хвольсана. Скончыў курс універсітэта ў 1882 г. са ступенню кандыдата і паступіў на службу ў Пакроўскую жаночую гімназію ў Санкт-Пецярбургу як выкладчык матэматыкі і фізікі. Адначасова быў пакінуты пры Пецярбургскім універсітэце для падрыхтоўкі да прафесарскага звання і працаваў там у фізічнай лабараторыі пад кіраўніцтвам праф. Ф. Петрушэўскага. З 1891 г. выкладаў фізіку і матэматычную геаграфію ва Увядзенскай мужчынскай гімназіі. З 1885 г. да 1904 г. быў памочнікам пад кіраўніцтвам праф. Ф. Петрушэўскага. З 1891 г. выкладаў фізіку і матэматычную геаграфію ва Увядзенскай мужчынскай гімназіі. З 1885 г. да 1904 г. быў памочнікам рэдактара фізічнай часткі часопіса "Журнал Русского физико-химического общества" і на працягу некалькіх гадоў кіраваў практычнымі заняткамі студэнтаў у фізічнай лабараторыі Пецярбургскага універсітэта. У 1887 г. быў камандзіраваны Рускім фізіка-хімічным таварыствам на станцыю Падсолнечная (Маскоўская губ.) для фотаметрычных вымярэнняў у складзе камісіі па даследаваннях поўнага сонечнага зацьмення, якое назіралася 7 жніўня 1887 г. У 1903 г. за працы "Аб складзе атмасферы сонца і планет і іх тэмпературы" і "Яшчэ пра тэмпературу і склад сонца і планет" быў удастоены Рускім астранамічным таварыствам прэміі і медаля імя Гасудара Імператара Мікалая Аляксандравіча.

У 1903 г. абараніў дысертацыю "Аб знешняй цеплаправоднасці сярэбраных дратоў ў вадзе" (СПб., 1903.) на ступень магістра фізікі. На працягу 1903–1904 гг. чытаў лекцыі па кінетычнай тэорыі газаў у Пецярбургскім універсітэце ў якасці прыват-дацэнта, адначасова працуючы ў гімназіях. Чытаў публічныя лекцыі аб тэрмаэлектрычнасці, аб Сонцы, а таксама публічны курс гідрастатыкі. У 1904 г. быў абраны выконваючым абавязкі экстраардынарнага прафесара па кафедры фізікі Харкаўскага універсітэта. Чытаў курс метэаралогіі і механічнай тэорыі цяпла, адначасова курс эксперыментальнай фізікі ў Харкаўскім ветэрынарным інстытуце.

З'яўляўся пажыццёвым сябрам Рускага фізіка-хімічнага таварыства і сапраўдным сябрам Рускага астранамічнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу, Французскага фізічнага таварыства ў Парыжы і Харкаўскага матэматычнага таварыства.

Вольга Гапоненка

Радзішэўскі Андрэй

Радзішэўскі Андрэй *(псеўд., потым прозв. Р. Арскі, 7.11.1886, Гродна — 28.11.1934, Якуцк), дзеяч польскага і рускага рабочага руху, эканаміст, публіцыст, пісьменнік.*

А. Радзішэўскі нарадзіўся ў сям'і ляснічага і хатняй настаўніцы. Вучыўся ў Гродзенскай гімназіі, дзе ўступіў у Польскую сацыялістычную партыю (ППС). У 1905 г. стаў студэнтам Варшаўскай політэхнікі, друкаваўся ў газеце "Trybuna", у час дэманстрацыі быў цяжка паранены. Пасля выздараўлення вярнуўся ў Гродна, вёў агітацыю ў вёсках Ласосна і Адамавічы, у 1906 г. удзельнічаў у Гродзенскай канферэнцыі ППС. Паступіўшы ў Пецярбургскі горны інстытут, зблізіўся з бальшавікамі. У канцы 1910 г. выключаны з інстытута за ўдзел у пратэстацыйных

акцыях студэнтаў у час "талстоўскіх дзён", у 1911–1914 гг. вучыўся ў Горным нстытуце ў Фрайбургу (Германія). Закончыўшы яго, вярнуўся ў Пецярбург (1914), працаваў інжынерам. У 1915 г. разам з М. Горкім выдаваў часопіс "Летопись", у 1916 г. — польскі сацыял-дэмакратычны часопіс "Życie", у 1917 г. супрацоўнічаў з часопісам "Новая жизнь" М. Горкага. Удзельнічаў у Кастрычніцкай рэвалюцыі, у 1917–1918 гг. быў сакратаром Наркамата працы РСФСР. У 1918–1921 гг. працаваў у Маскве рэдактарам часопіса "Экономическая жизнь", загадчыкам эканамічнага аддзела газеты "Известия ВЦИК". Як эксперт удзельнічаў у Рыжскай канферэнцыі 1921 г. З 1921 г. у Петраградзе. У 1925–1928 гг. узначальваў Інстытут эканамічных даследаванняў, рэдагаваў газету "Ленинградская правда", у 1928–1931 гг. прафесар Ленінградскага горнага інстытута. У 1933 г. накіраваны ў Якуцію, стаў старшынёй Навукова-тэхнічнай рады пры СНК і намеснікам старшыні Дзяржплана Якуцкай АССР, увайшоў у склад Якуцкага абкама УКП(б).

А. Радзішэўскі з'яўляецца аўтарам каля 100 навуковых і навукова-папулярных прац, мастацкіх твораў на польскай і рускай мовах. Сярод іх — кнігі "Польшча і яе эканамічныя рэсурсы" (П., 1920, на рускай мове), "Кастрычніцкая рэвалюцыя і каталіцкі касцёл" (Л., 1924, на польскай мове), "Белы тэрор у Польшчы" (Л., 1925, на рускай мове) і інш. Выдаў на рускай мове раманы "Балеты" (Л., 1930) і "Аснінская вахта" (Л., 1931). Напісаў уступныя артыкулы да перакладаў на рускую мову твораў польскіх празаікаў С. Жэромскага, М. Дамброўскай, А. Струга. Многія працы А. Радзішэўскага засталіся ў рукапісах у Архіве Інстытута марксізму-ленінізму ў Маскве. У Якуцку захоўваецца ў рукапісе яго двухтомная праца "Прыродныя багацці Якуціі і іх выкарыстанне".

Алесь Баркоўскі (Якуцк)

Размене Ганарата

***Размене Ганарата** (20.11.1930, в. Бяляны Дзісенскага пав. Віленскага ваяв., цяпер Міёрскі р-н Віцебскай вобл.), мастак-тэкстыльшчык.*

Г. Размене ў 1959 г. скончыла Літоўскі дзяржаўны мастацкі інстытут. У 1959–1961 гг. — мастак Вільнюскага дома мадэляў. З 1962 г. працуе выкладчыкам у Літоўскім дзяржаўным мастацкім інстытуце. З 1959 г. удзельнічае ў выстаўках. У 1982 г. адбыліся персанальныя выстаўкі ў Вільнюсе і ў Мінску. Стварыла дываны "Летува" (1975), "Свята" (1976), "Сёстры" (1979), "Прыродны матыў" (1986), міні-габелен "Успаміны" (1981). Працавала таксама над дэкаратыўнымі тканінамі, мадэляваннем адзення. Г. Размене найбольш карыстаецца льняным валакном. Яе творам уласцівы сувязі з літоўскім народным тэкстыльным мастацтвам, нескладаная, канструктыўная кампазіцыя, рэльефнасць, спалучэнне розных матэрыялаў, тэхнікі і фактуры.

Яніна Кісялёва

Разумаў Анатоль

***Разумаў Анатоль Якаўлевіч** (18.11.1954, Слуцк), гісторык, грамадскі дзеяч.*

У 1972 г. А. Разумаў скончыў сярэднюю школу ў Гродне. У 1972–1978 гг. вучыўся на гістарычным факультэце Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта, спецыялізаваўся ў гісторыі і археалогіі. З кастрычніка 1978 г. працуе ў Дзяржаўнай Публічнай (цяпер Расійскай Нацыянальнай) бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу: старшы бібліятэкар, галоўны бібліятэкар, навуковы супрацоўнік. Даследуе гісторыю палітычных рэпрэсій у СССР; аўтар больш 50 публікацый у газетах і часопісах па дадзенай праблематыцы. Складальнік зборнікаў "Старонкі гісторыі" і "Гісторыя без "белых плям" (Л., 1988–1990). Складальнік і адказны рэдактар кнігі памяці ахвар палітычных рэпрэсій "Ленінградскі мартыралог. 1937–1938 гг." (СПб., 1995. Т. 1; 1996. Т. 2, выданне працягваецца). Прымае актыўны ўдзел у дзейнасці Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу, член яго праўлення. Па ініцыятыве А. Разумава ў 1992 г. на Левашоўскіх могілках каля Санкт-Пецярбургу, дзе пахаваны ахвяры палітычных рэпрэсій, быў пастаўлены сумесны беларуска-літоўскі помнік-крыж.

Мікалай Нікалаеў (Санкт-Пецярбург, Расія), Ларыса Языковіч

Ракоўскі Лявон

***Ракоўскі Лявон Іосіфавіч** (28.12.1895 (9.1.1896), г. Глыбокае Віленскай губ., цяпер Віцебская вобл. – 15.8.1979, Ленінград), рускі пісьменнік.*

Л. Ракоўскі скончыў факультэт грамадскіх навук Ленінградскага універсітэта (1924). Друкавацца пачаў у 1924 г. (яго апавяданне "Помста" было змешчана ў часопісе "Ленинград"). Аўтар аповесцей "Гадзіннік" (1926), "Пастаялец" (1926), "Блудны д'ябал" (1928), зборнікаў апавяданняў і аповесцей "Зялёная Амерыка" (1927),

"Сівапляс" (1928) і інш., у якіх паказаны побыт жыхароў беларускіх мястэчак, зроблены сакавітыя жанравыя замалёўкі. Пошукамі гістарычных абагульненняў і сацыяльнай вастрынёй вызначаецца раман Л. Ракоўскага "Чацвёртая жонка" (1930). Пазней напісаў і выдаў гістарычныя раманы "Здзіўлены капітан" (1936), "Генералісімус Суворaў" (ч. 1 – 2, 1941 – 1947), "Адмірал Ушакоў" (1952), "Кутузаў" (1960), гістарычныя аповесці "Аленка" (1938), "Канстанцін Заслонаў" (1949, беларускі пераклад – 1976), "Міхаіл Тухачэўскі" (1967). Творы на гістарычную тэматыку Л. Ракоўскага вызначаюцца навуковай праўдзівасцю, шырынёй ахопу падзей, яркасцю партрэтных характарыстык персанажаў, вобразнасцю мовы. У 1925 г. у газеце "Ленинградская правда" апублікаваў некалькі нарысаў пра Беларусь ("Два гарады. Пісьмы з Барысава", "На Бабруйшчыне", "У Слуцку – усё па-людску" і інш.). На рускую мову пераклаў "Паўлінку" Я. Купалы, драму Я. Коласа "Вайна вайне", яго апавяданні, раман І. Мележа "Мінскі напрамак", аповесць П. Кавалёва "Андрэйка", апавяданні М. Лынькова, зборнік апавяданняў беларускіх дзяцей, якія перажылі жахі фашызму, — "Ніколі не забудзем!". Творы Л. Ракоўскага перакладалі на многія замежныя мовы і мовы народаў былога СССР.

Святлана Сачанка

Ракоўскі Сяргей

Ракоўскі Сяргей Дзмітрыевіч *(30.3.1899, Магілёў – 13.3.1963, Сусуман Магаданскага краю, Расія), геолаг, даследчык радовішчаў золата на Калыме. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.*

С. Ракоўскі нарадзіўся ў сям'і рабочага. На пачатку XX ст. пераехаў разам з бацькамі ў павятовы г. Троіцкасаўск у Забайкаллі. Пасля заканчэння мясцовай сярэдняй школы Ракоўскі ў радах Чырвонай Арміі змагаўся з белагвардзейцамі ў Забайкаллі і на Далёкім Усходзе. Пасля дэмабілізацыі стаў студэнтам геалагічнага факультэта Іркуцкага політэхнічнага інстытута. Атрымаўшы дыплом горнага інжынера-геолага, С. Ракоўскі ўдзельнічаў у геалагічных экспедыцыях па пошуках золата ў шэрагу радовішчаў. Доўгі час быў кіраўніком Верхнекалымскай геалагічнай экспедыцыі, якая выявіла вядомае радовішча золата ў прытоках ракі Нера (басейн Індыгіркі). Ва ўмовах Крайняй Поўначы працаваў 32 гады — з 1928 да 1959 г. За геалагічныя даследаванні і адкрыццё радовішчаў золата Ракоўскі быў узнагароджаны ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Імем С. Ракоўскага ў г. Сусуман на Калыме названа вуліца, на якой устаноўлена прысвечаная яму мемарыяльная дошка з надпісам "Ракоўскі Сяргей Дзмітрыевіч. 30 сакавіка 1899 года — 13 сакавіка 1963 года. Геолаг, першаадкрывальнік Калымы. Працаваў у раёне Крайняй Поўначы з 1928 па 1959 год".

Валерый Ярмоленка

Рамановіч Леанід

Рамановіч Леанід *(23.1.1923, г. п. Антопаль Драгічынскага пав. Палескага ваяв., цяпер Драгічынскі р-н Брэсцкай вобл.), журналіст. Заслужаны дзеяч культуры Літоўскай ССР (1973), заслужаны дзеяч культуры Польшчы (1983).*

Л. Рамановіч скончыў сярэднюю школу ў Вільнюсе (1941). У 1942–1944 гг. служыў у 16-й Літоўскай дывізіі Чырвонай Арміі, быў радыстам аператыўнай групы штаба партызанскага руху Літвы. У 1944–1945 гг. — сакратар Камітэта камсамола Літвы г. Вільнюса. У 1945–1947 гг. працаваў рэферэнтам Міністэрства замежных спраў Літоўскай ССР, У 1949 г. скончыў Рэспубліканскую партыйную школу. У 1949–1950 гг. быў рэдактарам Вільнюскай абласной газеты "Lenino keliw". У 1950–1951 гг. працаваў загадчыкам сектара друку Вільнюскага абласнога камітэта КПЛ. У 1952–1953 гг. — намеснік вільнюскай абласной і гарадской газеты "Raudonoji žvaigžde". У 1953 г. Л. Рамановіч скончыў Вільнюскі дзяржаўны універсітэт, у 1957 г. акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС. У 1957–1958 г. — рэферэнт Дзяржаўнага камітэта па культурных сувязях з зарубежнымі краінамі пры Савеце Міністраў СССР. У 1958–1962 гг. — карэспандэнт газеты "Правда" ў Польшчы. У 1962– 1984 гг. — рэдактар польскай газеты ў Вільнюсе "Czerwony Sztandar". У 1963–1975 — дэпутат Вярхоўнага Савета Літоўскай ССР.

Яніна Кісялёва

Рамішэўскі Мікалай

Рамішэўскі Мікалай *(20.12.1907, Беласток, Польшча — 18.10.1985, Вільнюс), інжынер-будаўнік. Заслужаны інжынер Літоўскай ССР (1965).*

М. Рамішэўскі ў 1946 г. скончыў Каўнаскі універсітэт, дзе з 1940 да 1950 г. працаваў выкладчыкам. У 1950–1953 і ў 1957–1969 гг. — выкладчык Каўнаскага політэхнічнага інстытута, 1962–1965 гг. быў загадчынам кафедры будаўнічых дысцыплін Клайпедскага вячэрняга факультэта гэтага інстытута. З 1969 да 1974 г.

М. Рамішэўскі быў выкладчыкам Вільнюскага інжынерна-будаўнічага інстытута. Напісаў падручнікі "Тэарэтычная механіка" (1961, з Б. Варанковым) і "Будаўнічая статыка" (19830. Адзін з аўтараў і рэдактар навуковай працы "Цвёрдасць рэчываў".

Яніна Кісялёва

Расолаў Міхаіл

Расолаў Міхаіл Міхайлавіч *(9.10.1948, в. Ціхінічы Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.), рускі пісьменнік, вучоны. Доктар юрыдычных навук.*

М. Расолаў закончыў Маскоўскі дзяржаўны універсітэт. Жыве ў Маскве, загадчык кафедры Маскоўскага юрыдычнага інстытута, намеснік старшыні Вышэйшага атэстацыйнага камітэта Расійскай Федэрацыі. Піша на рускай мове. Аўтар аповесці "Не забі", кніг "Вершы і апавяданні", "Мне прыснілася канюшына", раманаў "Выканаўца", "Цяжкое раздарожжа", "Жніверьскі зарапад". У Мінску пабачыла свет яго кніга "Дрэва дабра і зла". Ганарар за яе аўтар перадаў навучэнцам Ціхініцкай СШ Рагачоўскага р-на на стварэнне лінгафоннага кабінета. У 1991 г. М. Расолаў звярнуўся з просьбай да маскоўскіх мастакоў перадаць свае карціны яго землякам-рагачоўцам. Было сабрана болей за 200 палотнаў жывапісу, твораў графікі. Свае творы падаравалі З. Брагоўскі, М. Абрыньба, В. Бубноў, А. Крымскі, В. Волк і інш. Усе гэтыя каштоўнасці зямляк даставіў у Рагачоў, размясціў у Ціхініцкай, Крушынаўскай і Азёраўскай сярэдніх школах. За сродкі ад рэалізацыі ўласных кніг М. Расолаў пабудуваў у вёсцы, дзе нарадзіўся і вырас, храм Міхаіла Архангела. Ён з'яўляецца членам рэдакцыйнай калегіі літаратурна-мастацкага і гісторыка-публіцыстычнага часопіса "Славяне", які заснаваны пісьменніцкімі арганізацыямі Гомельскай, Бранскай і Чарнігаўскай абласцей і выдаецца ў Гомелі. За сваю патрыятычную дзейнасць быў у 1997 г. прызнаны ў Беларусі "чалавекам года".

Алесь Карлюкевіч

Ратомскі Аляксандр

Ратомскі Аляксандр *(17.1.1908, б. маёнт. Кларынава Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяперашняе месцазнаходжанне не ўстаноўлена – 1965, Пулавы, Польшча), ветэрынар, мікрабіёлаг.*

Нарадзіўся А. Ратомскі ў сям'і інжынера. Скончыў у 1827 г. класічную гімназію ў Вільні. У 1927–1933 гг. вучыўся ў Акадэміі ветэрынарнай медыцыны ў Львове, якую скончыў з дыпломам урача ветэрынарыі. Працоўную дзейнасць пачаў у час навучання ў акадэміі. У 1931–1935 гг. быў малодшым, потым старшым асістэнтам на кафедры мікрабіялогіі Акадэміі ветэрынарнай медыцыны. Сваю першую навуковую працу апублікаваў у 1933 г. у часопісе "Pamietnik XVI Zjazdu Lekarzy i Przyrodników Polskich". У 1938 г. абараніў дысертацыю і атрымаў ступень доктара ветэрынарнай медыцыны. У 1940 г. абараніў дысертацыю на ступень кандыдата біялагічных навук і быў абраны дацэнтам. З 1941 г. — дырэктар Ветэрынарнай клінікі ў Львове. З 1943 г. жыў у Кракаве. Працаваў урачом-бактэрыёлагам ў ветэрынарнай лячэбніцы. Узначальваў пасля вайны ваяводскае аддзяленне ветэрынарнай гігіены ў Кракаве. У 1948–1952 гг. — намеснік прафесара Кракаўскага універсітэта і кіраўнік кафедры мікрабіялогіі ветэрынарнага аддзялення Палітэхнікі ў Вроцлаве. З 1952 г. — загадчык лабараторыі ў Ветэрынарным інстытуце ў Пулавах. У 1956 г. атрымаў тут званне дацэнта.

Навуковыя даследаванні А. Ратомскага прысвечаны вывучэнню бактэрыялагічных, цераталагічных, гематалагічных, паразіталагічных і анатамапаталагічных асаблівасцей фауны Кракаўскага і Жэшуўскага ваяводстваў. Вывучаў развіццё хвароб у жывёлін і метады іх дыягностыкі. Займаўся штучным вывядзеннем асобных відаў бактэрый. А. Ратомскі першым у Польшчы на пачатку 1950-х гг. атрымаў у лабараторных умовах бактэрыю waglika. Вынікі навуковых даследаванняў А. Ратомскага атрымалі прызнанне навуковай супольнасці. Ён быў абраны членам Польскага таварыства ветэрынарных навук, Аб'яднання ветэрынарных урачоў Польшчы, Польскага эпідэміялагічнага таварыства.

Вольга Гапоненка

Рахнеўскі Станіслаў

Рахнеўскі Станіслаў Казімір *(4.3.1833, Міншчына – 20.12.1885, Санкт-Пецярбург, Расія), генерал-лейтэнант Расійскай арміі, прафесар Акадэміі Генеральнага штаба ў Пецярбургу.*

Паходзіў С. Рахнеўскі са старажытнай беларускай шляхты. Скончыў гімназію ў Мінску. Вучыўся ў Інжынерна-ваеннай акадэміі ў Пецярбургу, якую скончыў у 1854 г. з адзнакай "выдатна". Удасканальваў веды на

аддзяленні геадэзіі Мікалаеўскай акадэміі Генеральнага штаба ў Пецярбургу. У лютым 1858 г. быў прызначаны выконваючым абавязкі прафесара, а з 1859 г. — прафесара геадэзіі гэтай жа акадэміі. У тым жа годзе ён атрымаў званне падпалкоўніка і быў прызначаны начальнікам аддзела канцылярыі Міністэрства абароны. З 1872 г. С. Рахнеўскі — генерал-маёр царскай арміі і член Вайскова-навуковага камітэта пры Генеральным штабе. У 1878 г. па стану здароўя пакінуў выкладчыцкую працу і ў чыне генерал-лейтэнанта выйшаў у адстаўку. С. Рахнеўскі займаўся распрацоўкай сістэм сувязі і метадаў выкарыстання тэлеграфнай сувязі ў арміі. Аўтар працы "Тэлеграфы і іх выкарыстанне ў вайсковай справе" (СПб., 1872). З 1872 г. уваходзіў у склад спецыяльнай камісіі па рэформе ваеннай павіннасці, за актыўны ўдзел у яе рабоце атрымаў падзяку ад Аляксандра II. Падзяляў ідэі расійскіх лібералаў. Быў сябрам групы польскай радыкальнай інтэлегенцыі ў Пецярбургу, членам літаратурнага гуртка і ўваходзіў у склад рэдакцыі іх друкаванага органа — часопіса "Słowo". Падтрымліваў актыўныя сувязі з арганізацыяй польскіх афіцэраў у Пецярбургу "Koło Wojskowych". У час навуковай камандзіроўкі ў Англію (1861) завязаў кантакты з расійскай рэвалюцыйнай эміграцыяй.

Вольга Гапоненка

Рахнеўскі Юліян

***Рахнеўскі Юліян** (1824–25.3.1887, Санкт-Пецярбург, Расія) — педагог, юрыст, грамадскі дзеяч.*

Нарадзіўся Ю. Рахнеўскі на Міншчыне. Паходзіў са старадаўняга шляхецкага роду. Быў сынам Сымона Рахнеўскага, пра якога вядома, што ён цікавіўся навукай і пакінуў рукапісы работ: "Мінералогія паводле сістэмы Вернера Соса" (1824), "Астранамічныя нататкі" (1826). Ю Рахнеўскі скончыў гімназію ў Мінску (1843) і ў тым жа годзе паступіў на аддзяленне права Маскоўскага універсітэта, які скончыў у 1848 г. са ступенню сапраўднага студэнта. Выкладаў расійскае права ў Гродзенскай гімназіі. У 1853 г. пераехаў у Пецярбург. Выкладаў правазнаўства, статыстыку і геаграфію ў Будаўнічай школе. З 1862 г. загадваў рэдакцыяй лістоў у "Журнале Министерства народного образования". Ю. Рахнеўскі быў адным з заснавальнікаў Польскага аб'яднання ў Пецярбургу, ініцыятарам стварэння літаратурнага кола, якое стала палітычнай арганізацыяй польскай літаратурнай інтэлігенцыі. Ён актыўна выступаў супраць палітыкі русіфікацыі ў адукацыйным працэсе, ідэі культурнай аўтаноміі Польшчы ў складзе Расійскай імперыі. Адзін з ініцыятараў выдання ў Пецярбургу польскага часопіса "Slowo" з літаратурным дадаткам (у выданні многа ўвагі ўдзялялася беларускай праблематыцы). У 1866 г. падаў у адстаўку ў сувязі з непрыняццем рэакцыйнага курса ўрада. Працаваў адвакатам у гандлёвым судзе ў Пецярбургу. У 1872 г. спыніў сваю юрыдычную практыку. Апошнія гады правёў у Лібаве (цяпер Ліепая, Літва).

Ю. Рахнеўскі з'яўляецца аўтарам даследаванняў па тэорыі і гісторыі педагагічнай думкі. Сярод яго асноўных навуковых прац — "Навучальныя ўстановы Літвы да яе далучэння да Расіі" (СПб., 1880), "Императарская Публічная бібліятэка ў перыяд пераходу да Міністэрства народнай асветы" (СПб.,1863), артыкулы "Нарыс гісторыі народнай школы ў Германіі" (ЖМНП. 1860. Т. 10. № 12), "З педагагічнай практыкі дырэктара прыватнага пансіёна" (ЖМНП. 1860. Т. 11. № 2). Цікавіўся гісторыяй адукацыі Польшчы. Апублікаваў у часопісе Рускага геаграфічнага таварыства артыкул "Польскія прыходна-расходныя кнігі XVII–XVIII стст." (Известия Русскаго географического общества. 1859. № 1.). Сапраўдны член Рускага геаграфічнага таварыства (1853).

Вольга Гапоненка

Рубацкі Уладзімір

***Рубацкі Уладзімір** (19.6.1914, Ашмяны Віленскай губ., цяпер Гродзенская вобл. — 27.5.1981, Вільнюс), спявак (барытон). Заслужаны артыст Літоўскай ССР (1950).*

У 1944–1947 гг. У. Рубацкі спяваў у хоры Ансамбля песні і танца БССР. У 1951 г. скончыў Літоўскую дзяржаўную кансерваторыю па класу Кіпраса Пятраўскаса. З 1948 да 1953 г. і з 1963 да 1976 г. быў салістам Літоўскай дзяржаўнай філармоніі. У 1949–1963 гг. — саліст Тэатра оперы і балета Літоўскай ССР, дзе стварыў каля 30 вобразаў. Выконваў партыі Яўгнія Анегіна ў аднайменнай оперы П. Чайкоўскага, Грознага ў оперы М. Рымскага-Корсакава "Царская нявеста", Жэрмона, Яга і Рыгалета ў операх Дж. Вердзі "Травіята", "Атэла" і "Рыгалета", Дэмана ў аднайменнай оперы А. Рубінштэйна, Валянціна ў оперы Ш. Гуно "Фаўст" і інш.

У. Рубацкі валодаў моцным, густым, з своеасаблівым металічным тэмбрам голасам. Выступаў у канцэртах, дзе спяваў песні літоўскіх, рускіх і замежных кампазітараў, рамансы і народныя песні (у тым ліку беларускія). Гастраляваў у многіх рэспубліках Савецкага Саюза.

Яніна Кісялёва

Рудакоў Алег

Рудакоў Алег Васільевіч *(29.4.1968, в. Бяздзедавічы Полацкага р-на Віцебскай вобл.), гісторык, педагог, грамадска- культурны дзеяч беларускай дыяспары ў Расіі.*

А. Рудакоў скончыў Астраўшчанскую сярэднюю школу (1985), вучыўся ў Цюменскім вышэйшым ваенна-інжынерным камандным вучылішчы. Пасля яго заканчэння (1989) быў накіраваны для далейшага праходжання службы ў Іркуцку. У 1994 г. звольнены ў запас з радоў ВС Расіі па стану здароўя. У тым жа годзе паступіў у Іркуцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт (ІДТУ) на паскораныя курсы па перападрыхтоўцы афіцэраў запасу па спецыяльнасці "Менеджмент" і ў Іркуцкі дзяржаўны універсітэт (ІДУ) на гістарычны факультэт. У 1995 г. закончыў ІДТУ, атрымаўшы дыплом па спецыяльнасці менеджэр. У ІДУ цяпер вучыцца на апошнім курсе. У 1994–1999 гг. працаваў ў розных камерцыйных структурах. З 1998 г. член Савета некамерцыйных арганізацый Іркуцка, а з кастрычніка 1999 г. ад імя Савета некамерцыйных арганізацый прыняты ў члены Іркуцкага аддзялення Асацыяцыі садзейнічання ААН. З лютага 1999 г. — выкладчык гісторыі ў Іркуцкай сярэдняй школе № 31. Быў удзельнікам розных навуковых канферэнцый у Мінску, Новасібірску, Іркуцку, Маскве. Аўтар некалькіх дзесяткаў навуковых публікацый.

А. Рудакоў прымае актыўны ўдзел у грамадскім і культурным жыцці беларускай дыяспары ў Сібіры. У верасні 1995 г. быў дэлегатам чацвёртага з'езда Таварыства беларускай мовы ў Мінску, дзе выступіў з дакладам пра жыццё беларусаў у Сібіры. З лістапада 1995 г. вядзе работу па аб'яднанню беларусаў, якія пражываюць на тэрыторыі Іркуцкай вобл. у адзіную культурную супольнасць. У 1996 г. на першым з'ездзе Іркуцкага Таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага (ІТБК) А. Рудакоў быў выбраны намеснікам старшыні Рады. З 1998 г. — старшыня Рады ІТБК. У сакавіку 1999 г. быў дэлегатам з'езду беларусаў Расіі ў Маскве, дзе выбраны другім намеснікам старшыні Рады Міжрэгіянальнага Аб'яднання беларусаў Расіі. З'яўляецца рэдактарам штомесячнага бюлетэня ІТБК "Маланка" — адзінага ў Іркуцку двухмоўнага выдання.

Ірына Тамільчык

Рудкоўскі Барыслаў

Рудкоўскі Барыслаў *(1921, Камянец-Падольскі, Украіна), інжынер, дзеяч беларускай дыяспары ў Польшчы.*

Б. Рудкоўскі нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У 1941 г. закончыў Варонежскую інжынерную лесатэхнічную акадэмію па спецыяльнасці геадэзія лясных дарог з элементамі петраграфіі грунту. Удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне — у інжынерных войсках 1-га Беларускага фронта. Пасля 1947 г. працаваў геадэзістам на чыгуначных лініях Ольштынскай дырэкцыі ў Польшчы. У 1951 г. пераехаў на Беласточчыну. Быў на службе ў лясных і дарожных ведамствах Бельска-Падляшскага і Гайнаўкі. Экстэрнам закончыў магістратуру і дактарантуру па петраграфіі грунту з элементамі геадэзіі шляхоў злучэння ў Альштынскай сельскагаспадарчай акадэміі.

Навуковая дзейнасць Б. Рудкоўскага накіравана на ахову і тапаграфію слядоў бытнасці ўсходнеславянскіх плямёнаў на этнічнай тэрыторыі Беласточчыны. Гэтай праблеме прысвечаны яго навуковыя працы "Геамарфалогія аховы прыроды ваколіц Бельска-Падляшскага", "Тапаграфія дарог, урочышчаў і гідраграфічнай сеткі Гацькоў, Арэхвічаў і Праневіч", "Тапаграфія дарог і помнікаў", "Геадэзія дарожных помнікаў з элементамі петраграфіі" і інш.

З'яўляецца аўтарам графічных работ, якія змешчаны ў многіх кнігах. Ім распрацаваны геадэзічныя планы цэркваў, капліц з гістарычнымі каментарыямі. Пісаў і дапаўняў графікай "Запіскі натураліста" ў беластоцкай "Ніве".

Б. Рудкоўскі з'яўляецца членам Беларускага грамадска-культурнага таварыства. Быў дэлегатам з'езда БГКТ ў Беластоку.

Узнагароджаны ордэнам праваслаўя Раўнаапостальнай Марыі Магдалены II ступені (1992).

Ірына Тамільчык

Рулінскі Мікалай

Рулінскі Мікалай Максімавіч *(23.3.1923, в. Новамыш Баранавіцкага пав. Навагрудскага ваяв., цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл.), дзеяч беларускай дыяспары ў Літве.*

Бацькі М. Рулінскага паходзілі з в. Дзяніскавічы на Палессі. Бацька быў добрым будаўніком, а калі атрымаў сан дзяка, лёс кідаў яго з аднаго прыходу ў другі: спачатку Новамыш каля Баранавіч, потым Астроўкі, Морач Клецкага р-на, Купоса пад Нясвіжам, Любча. Усюды будаваў, пісаў вершы.

М. Рулінскі скончыў у Нясвіжы 6-ты клас, потым вучыўся ў Любчы, дзе бацька атрымаў у 1936 г. прыход. Навучанне было на польскай мове, што не задавальняла бацьку, таму ён адправіў сына вучыцца ў Віленскую

беларускую гімназію. З 1936 да 1939 г. вучыўся ў Вільні. Скончыць гімназію не давялося — пачалася Другая сусветая вайна. Прадоўжыў вучобу ў Навагрудскай настаўніцкай семінарыі. У 1943 г. у Альберціне скончыў курсы кіраўнікоў СБМ.

У час Вялікай Айчыннай вайны М. Рулінскі з сябрам, рызыкуючы жыццём, выратаваў частку архіва К. Езавітава ў акупаванай Рызе. У вайну трапіў у Германію, пасля вайны працаваў на розных пасадах у Польшчы. Марыў стаць лекарам або архітэктарам. За беларускую свядомасць без суда і следства трапіў на восем гадоў за краты. Тэрмін зняволення адбываў у Омску. Вярнуўся ў 60-х гг. на радзіму, у Беларусь, але ўладкавацца на працу не змог, пераехаў у Вільню, да пенсіі працаваў на папяровай фабрыцы ў Грыгішках. Актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці, спяваў у хоры, займаўся спортам. Калі ў 1987 г. у Літве з'явіліся беларускія згуртаванні, прыняў актыўны ўдзел у арганізацыі "Сябрыны", Таварыства беларускай культуры, хору "Сябрынта", стараўся быць на ўсіх мерапрыемствах, якія ладзілі беларусы Літвы, спяваў беларускія песні, выступаў з сольнымі нумарамі. Прымаў удзел у рабоце Першага з'езда беларусаў свету. Цяпер ён малюе краявіды, піша вершы. Кіруе беларускай суполкай ў Грыгішках, якая была зарэгістравана ў 1989 г.

Леакадзія Мілаш (Вільнюс)

Русачык Тамара

***Русачык Тамара** (23.1.1953, г. Орля Беластоцкага ваяв., Польшча), філолаг, педагог, грамадскі дзеяч беларускай дыяспары ў Польшчы.*

У 1977 г. Т. Русачык закончыла факультэт беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта. Працавала ў пачатковай школе ў в. Маліннікі. У 1982 — 1992 г. метадыст беларускай мовы ў беластоцкім аддзяленні сістэмы ўдасканалення настаўнікаў, у 1992 — 1998 гг. — інспектар Беластоцкай куратарыі асветы і каардынатар беларускага школьніцтва ў Польшчы. З 1998 г. — метадыст беларускай мовы ў Ваяводскім метадычным асяродку ў Беластоку.

Т. Русачык — аўтар падручнікаў па беларускай мове для 2-га, 3-га і 5-га класаў "базавай школы" ("Васількі", "Зараначка", "Вяснянка"), сааўтар праграмы навучання па беларускай мове, аўтар многіх метадычных артыкулаў. Ініцыятар і галоўны арганізатар алімпіяды па беларускай мове для моладзі агульнаадукацыйных ліцэяў на працягу 1994 — 1997 гг., а для вучняў "базавых школ" — прадметнага конкурсу па беларускай мове, арганізатар школьных экскурсій для вучняў беларускіх школ у Беларусь і паездак на курсы павышэння кваліфікацыі для настаўнікаў беларускай мовы ў Мінск. Для папулярызацыі беларускай мовы арганізуе разнастайныя творчыя конкурсы для вучняў пачатковых і сярэдніх школ: дэкламатарскія, тэатральныя, музычныя. Рэфарматар беларускай асветы і папулярызатар ідэй "новай школы". З'яўляецца членам Сумеснай камісіі па справах адукацыі нацыянальных меншасцей у Польшчы і Беларусі. Прымае актыўны ўдзел у культурна-грамадскім жыцці беларускай дыяспары на Беласточчыне. Выконвала абавязкі намесніка старшыні ГП БГКТ (1993 — 1997). З 1993 г. — член Прэзідыума ГП БГКТ, старшыня Камісіі асветы пры ГП БГКТ.

Ірына Тамільчык

Руткоўскі Браніслаў

***Руткоўскі Браніслаў** (пс. Ян Ольха, Слаўскі; 27.2.1898, в. Камаі Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл. – 1.6.1964), арганіст, дырыжор, педагог, публіцыст, грамадскі дзеяч, прафесар.*

Б. Руткоўскі рана далучыўся да музыкі. Ужо ў васьмігадовым узросце хлопчык вучыўся ў мясцовага арганіста, потым на працягу трох гадоў — у арганіста Кабыльніцкага касцёла (Нарач). У 1912–1914 гг. працягваў вучобу ў Дзісне, пасля вучыўся ў польскай гімназіі св. Кацярыны ў Пецярбургу, там кіраваў хорам. Пасля заканчэння гімназіі (1917) працаваў арганістам у касцёле св. Казіміра. Вучыўся ў кансерваторыі Царскага Рускага музыкальнага таварыства па класу арганаў У. Гандшына. У гэты час удзельнічаў у рабоце клуба "Прамень", выкладаў музыку, спевы, гісторыю і польскую мову ў жаночай гімназіі. У 1919 г. Б. Руткоўскі вярнуўся на радзіму ў Камаі, але ў хуткім часе паступіў у Віленскі універсітэт на аддзяленне каланістыкі. Каб аплаціць вучобу, працаваў настаўнікам спеваў у рамесленнай школе айцоў Салезіянаў. Пад час вучобы займаўся ў літаратурным і драматычным гуртках, браў удзел у выступленнях Акадэмічнага тэатра. У 1921 г. паступіў у Варшаўскую дзяржаўную музычную кансерваторыю. Супрацоўнічаў з тэатрам "Рэдута", дзе здзяйсняў музычнае афармленне спектакляў "Пастаралі" Л. Шылера, "Новы Дон Кіхот" С. Манюшкі. Паспяхова скончыўшы кансерваторыю, атрымаў накіраванне ў Парыж для ўдасканальвання музычнага майстэрства (1924). Тут вучыўся ў Л. Вернера па класу аргана, вывучаў грэка-рымскую харальную музыку. З 1926 г. у Варшаўскай кансерваторыі Б. Руткоўскі працуе выкладчыкам па класу аргана. Арганізаваў сістэму музычнага ўдасканалення настаўнікаў музыкі, стварыўшы ў Крэмянцы "Музыкальны касцёр", які дзейнічаў ў час летніх вакацый з 1928 па 1939 г. Займаўся

выдавецкай дзейнасцю. Рэдагаваў часопісы "Польская музыка", "Музыкальная газетка", "Журнал арганіста", выдаў зборнікі песень "Зялёны гаёчак", "Спяваем песенькі", "Польскія харавыя песні", апрацоўваў старапольскую музыку, харальныя творы. У 1927–1935 гг. выступаў з канцэртамі арганнай музыкі ў Варшаўскім саборы св. Яна. У верасні 1939 г. Б. Руткоўскі быў мабілізаваны ў Войска Польскае. Як заложнік у студзені 1940 г. быў пасаджаны немцамі ў турму. Пасля вызвалення ўдзельнічаў ў падпольных арганізацыях. Пад псеўданімам Карыцкі ўзначальваў аддзел бюро прапаганды і інфармацыі галоўнага штаба Арміі Краёвай. У час Другой сусветнай вайны стварыў духавы аркестр, хор, ладзіў тайныя канцэрты. Выдаў "Спеўнік жаўнера". У яго кватэры адбываліся рэпетыцыі хору. На тайных настаўніцкіх курсах выкладаў спевы. Удзельнічаў у Варшаўскім паўстанні, даваў канцэрты для паўстанцаў, выступаў у шпіталях, вёў перадачы на паўстанцкай радыёстанцыі "Бліскавіца". Пасля разгрому паўстання быў вывезены ў Германію ў лагер ваеннапалонных. Пасля вызвалення выехаў у Італію, там працаваў у польскай культурна-асветнай акцыі, выдаў зборнік "Ідзе салдат". Пачынаючы з 1946 г. Б. Руткоўскі звязаў свой лёс з Кракаўскай Вышэйшай музычнай школай, выхаваў 12 арганістаў сусветнага маштабу. У 1958 г. яму было прысвоена званне прафесара.

Артыкулы вядомага музыканта змяшчаліся на старонках польскіх выданняў "Muzyka", "Ruch muzyczny", рэдактарам апошняга быў на працягу 1957–1959 гг. Б. Руткоўскі выступаў з канцэртамі ў розных гарадах Польшчы і за яе межамі: у Югаславіі (1959, 1961), Італіі (1959), Румыніі (1964), Германіі (1963), краінах былога СССР (1960, 1963). Рэпертуар канцэртаў ахопліваў розныя стылі і эпохі. Яго майстэрства вылучалася высокай артыстычнасцю, арыгінальнасцю і каларытнасцю выканання.

Б. Руткоўскі прымаў актыўны ўдзел у культурна-грамадскім жыцці краіны. Быў старшынёй Саюза арганістаў і хормайстраў, узначальваў Саюз аматараў старажытнай музыкі, дзе сам браў актыўны ўдзел у якасці арганіста, дырыжора і лектара. З'яўляўся аўтарам цэлага шэрагу цыклаў музычных радыёперадач "Спявае ўся Польшча", "З песняй па краіне", "Спявайма песенькі", "Канцэрты для дзяцей", "Гутарак пра музыку", "Стылі ў музыцы", "Слухаем музыку". Быў пачынальнікам фестываляў арганнай музыкі, якія ў 1963 г. набылі статус міжнародных, праектантам і кансультантам па ўстаноўцы арганаў у Варшаве, Кракаве, Вроцлаве, Чэнстахове. Ён быў членам праграмнай камісіі Вышэйшай музычнай школы пры Міністэрстве навукі і мастацтва, Таварыства польскіх музыкантаў, рады Вышэйшай музычнай школы, Таварыства оперы. Узначальваў Кракаўскую філармонію, быў членам журы шматлікіх музычных конкурсаў.

Узнагароджаны сярэбраным крыжам Virtuti Military, срэбым Крыжам заслуг з мячамі, Камандорскім крыжам Адраджэння Польшчы. Яго імя носіць Дзяржаўная музычная школа № 3 у Падчужы, актавая зала ў Дзяржаўнай вышэйшай музычнай школе ў Кракаве. Пра жыццёвы і творчы шлях Б. Руткоўскага напісана шмат манаграфій. Пахаваны на Алеі заслужаных Ракавіцкіх могілак у Кракаве.

Іван Драўніцкі (Мядзельскі р-н Мінскай вобл.)

Рушчыц Фердынанд

Рушчыц Фердынанд *(10.2.1870, в. Багданава Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Ашмянскі р-н Гродзенскай вобл. — 30.10.1936, там жа), польскі і беларускі мастак, графік, сцэнограф, грамадскі і культурны дзеяч, прафесар Віленскага універсітэта, школы выяўленчага мастацтва ў Варшаве і Акадэміі выяўленчага мастацтва ў Кракаве.*

Ф. Рушчыц паходзіў з сям'і землеўладальнікаў (маці яго была датчанкай). Дзяцінства правёў у Ліепаі (Латвія). З 1877 г. жыў у Мінску, дзе скончыў з залатым медалём класічную гімназію. Яшчэ будучы вучнем выявіў вялікія здольнасці ў маляванні (яго першым настаўнікам быў К. Ермакоў). У 1890 г. паступіў на юрыдычны факультэт Пецярбургскга універсітэта. Адначасова, як вольны слухач, наведваў Акадэмію мастацтва, куды ў 1892 г. паступіў. Вучыўся ў І. Шышкіна. У 1895 г. перайшоў у майстэрню пейзажа А. Куінджы, у якой і заставаўся да атрымання дыплома ў 1897 г. Сябраваў з выдатнымі мастакамі — М. Рэрыхам, А. Рыловым, В. Пурвітам. У час вучобы Ф. Рушчыц здзейсніў творчыя падарожжы ў Крым, Швецыю, на востраў Барнгхольм, ад якіх засталося шмат эскізаў і малюнкаў. Падарожжы да мора падказалі яму і тэмы першых карцін "Трытоны", "Вячэрняя зара", прызначаных на конкурсную выстаўку ў Акадэміі ў 1897 г. Дыпломную работу Ф. Рушчыца "Вясна" з краявідам бацькаўшчыны набыў для сваёй калекцыі П. Траццякоў. Летам 1898 г. для далейшай адукацыі выехаў у Заходнюю Еўропу. Наведаў Бельгію, Францыю. Італію, Швейцарыю, Аўстрыю. Пасля гэтага некалькі гадоў правёў на радзіме, у Багданаве. Гэта быў найбольш плённы перыяд мастацкай творчасці Ф. Рушчыца, галоўнай тэмай якой было адлюстраванне родных краявідаў. Карціна "Млын зімою", напісаная ў 1898 г., была выстаўлена ў Пецярбургу і набыта маскоўскім мецэнатам і калекцыянерам С. Марозавым. На працягу наступных гадоў з'явіліся "Млын", "Над ставамі", "Крэва", "Апошні снег", "Перад касцёлам", "Балада", "Лясны ручай", "Стары дом", "Дажынкі", а таксама "У свет", "Эмігранты", "На анёл Панскі", "Воблака", "Мінулае" (1898–1904), дзе арганічна спалучаны сімвалізм і "экспрэсіянізм на выразнай натуралістычнай аснове". У гэтыя гады Ф. Рушчыц удзельнічаў у веснавых выстаўках Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў і ў выстаўках "Свет мастацтва".

З цягам часу сувязі з пецярбургскім мастацкім асяроддзем аслаблі. Карціны мастака пачалі выстаўляцца на радзіме. У 1899 г. упершыню Ф. Рушчыц паказаў некалькі сваіх прац у Вільні, а ў снежні таго ж года адбыўся яго

дэбют у Варшаве. На працягу 1900–1905 гг. плённа выстаўляўся ў Варшаве, Вільні, Кракаве, Львове, атрымаў шмат узнагародаў, быў абраны сябрам Таварыства польскіх артыстаў (ТАР). Яго карціны пачалі выстаўляцца ў Вене, Празе, Дзюсельдорфе, Лондане. У 1903–1904 гг. Ф. Рушчыц удзельнічаў у стварэнні новай школы мастацтваў у Варшаве, стаў яе прафесарам і на некаторы час пераехаў у Варшаву.

У 1908 г. Ф. Рушчыц вярнуўся ў Багданава, але ўжо у 1907 г. узначаліў кафедру пейзажа Акадэміі мастацтва ў Кракаве. З гэтага часу ён рэдка маляваў. Яго апошняя праца алеем "Гняздо" (1908) з фрагментамі бацькоўскага дома завяршае перыяд яго мастацкай дзейнасці. У лютым 1908 г. ён арганізаваў у Вене выстаўку мастацкага таварыства "Sztuka". У тым жа годзе пакінуў Кракаў, зноў вярнуўся на радзіму, стаў арганізатарам многіх культурных мерапрыемстваў у Вільні. Важнае месца ў творчасці Ф. Рушчыца займала кніжная графіка. Перад Першай сусветнай вайной з'явіліся ў яго афармленні літаратурныя альманахі "Zyrawce" (1910), "Litwa i Ruś-pamięci Syrokomli" (1912), альбом "Вільня 100 гадоў таму" (1912) і інш. У час вайны жыў у Багданаве, вярнуўся ў Вільню з польскімі войскамі. Шмат працаваў дзеля аднаўлення Віленскага універсітэта, стаў стваральнікам і дэканам яго факультэта мастацтваў. Да 400-годдзя кананізацыі патрона Вільні св. Казіміра спраектаваў саркафаг для яго рэліквій. У 1921 г. арганізаваў у Парыжы першую афіцыйную выстаўку польскага мастацтва XIX — XX стст., за што быў узнагароджаны ордэнам Ганаровага легіёна. У 1928 г. пасля выстаўкі народнага мастацтва Віленшчыны, атрымаў Залаты крыж заслугі. З 1931 г. старшыня камісіі па аднаўленні Віленскай катэдры і Вострабрамскай капліцы. Працаваў таксама як сцэнограф-пастаноўшчык і арганізатар выставак.

У памяць пра мастака ў Вільні, Варшаве, Кракаве былі створаны розныя камітэты, адбываліся выстаўкі яго твораў. У Варшаве на доме, дзе ён жыў, і ў Багданаве устаноўлены мемарыяльныя дошкі. Яго імем названы сквер перад універсітэцкай бібліятэкай у Вільні. Працы нашага суайчынніка (карціны, малюнкі, эскізы, графіка) знаходзяцца ў музеях Польшчы, Літвы, Украіны (Львоў), Расіі (Масква і Санкт-Пецярбург), Беларусі. У 2000 г. у Багданаве быў праведзены Міжнародны мастацкі пленэр імя Ф. Рушчыца, на якім ганаровымі гасцямі былі яго сын і ўнук з Варшавы.

Алена Русаковіч

Рылькоў Уладзімір

Рылькоў Уладзімір Апанасавіч *(1947, в. Лясныя Круглянскага р-на Магілёўскай вобл.), генерал-маёр.*

У. Рылькоў скончыў Скляпаўскую сярэднюю школу, ПТВ № 40 у Мінску, Вышэйшае Алма-Аціпскае пагранічнае вучылішча імя Ф. Э. Дзяржынскага (1971). З 1966 г. — у пагранічных войсках. Служыў камандзірам аддзялення, часці, злучэння, начальнікам Львоўскага пагранічнага атрада. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём.

Вацлаў Мацкевіч

Рэут Густаў

Рэут Густаў *(28.8.1842, б. маёнт. Чарніца Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Смалявіцкі р-н Мінскай вобл. – 8.11.1902, Львоў, Украіна), інжынер, удзельнік паўстання 1863 г.*

Нарадзіўся Г. Рэут у шляхецкай сям'і. Скончыў з адзнакай гімназію ў Віцебску і ў 1858 г. паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Маскоўскага універсітэта. У 1860 г. стаў членам тайнай арганізацыі "Польскі манаскі ордэн". У студзені 1861 г. разам з іншымі студэнтамі-палякамі выехаў з Масквы, каб прыняць удзел у паўстанні ў Польскім легіёне пад кіраўніцтвам Л. Мераслаўскага. Браў удзел у паўстанцкіх бітвах 1863 г. на тэрыторыі Польшчы. Пасля ранення эміграваў у Парыж. Свае ўспаміны пра падзеі тых часоў Г. Рэут апублікаваў у артыкуле "Успаміны аб 1860–1863 гг." (Gazeta Narodowa. 1913. Nr. 165–170). Вучыўся ў Школе інжынерыі і артылерыі ў Метцы, якую скончыў у 1868 г. З 1868 г. працаваў павятовым інжынерам у Кракаве. Кіраваў будаўніцтвам дарог. З 1872 г. — у Львове, дзе атрымаў пасаду інжынера ў тэхнічным аддзеле краёвага аддзела, а ў 1894 г. быў прызначаны дырэктарам тэхнічна-дарожнага бюро гэтага аддзела. У 1896 г. будаваў дарогу з Марскога Вока да Закапанэ. З 1901 г. — на пенсіі.

Г. Рэут — член Політэхнічнага таварыства ў Львове, у 1895 г. быў абраны ў склад яго праўлення. Узнагароджаны ордэнам Франца Йозефа (1899).

Пахаваны сярод заслужаных на Лычакоўскіх могілках у Львове.

Вольга Гапоненка

Рэут Марыя

***Рэут Марыя Ядвіга**, (псеўд. І. Богуш, Ян Вжос, Марыя з Палесся, Ежы Сурвінт; 1863, па іншых крыніцах 1867, б. маёнт. Дзярновічы Рэчыцкага пав. Мінскай губ., цяпер тэрыторыя Гомельскай вобл. – 15.1.1942, Вільнюс), польская пісьменніца, грамадскі дзеяч.*

Пачатковую адукацыю М. Рэут атрымала дома. Скончыла Настаўніцкую семінарыю ў Вільні. З 1894 г. — у Варшаве, працавала ў кніжнай фірме. Была сябрам асветніцкай суполкі Бібліятэчнай секцыі, потым была выбрана ў цэнтральную раду секцыі. У 1905 г. была арыштавана за ўдзел у дастаўцы польскіх кніг з-за мяжы, асуджана і выслана з Варшавы (вызвалена праз 3 месяцы). Жыла ў Коўне, дзе арганізавала жаночы гурток самаадукацыі. Прымала ўдзел у стварэнні Жаночага гуртка за раўнапраўе — арганізацыі, якая змагалася за роўныя правы жанчын, была выбрана яго страшынёю. У 1906 г. запрошана Аб'яднаннем настаўнікаў у Львоў, для працы ў Таварыстве народных школ. Стала сябрам Гуртка імя Тадэвуша Касцюшкі. У час Першай сусветнай вайны жыла ў Любартаўскім павеце і займалася, галоўным чынам, арганізацыяй вясковых школ. У 1915–1918 гг. арганізавала 12 такіх школ. З 1919 г. — у Вільні, працавала ў секцыі асветы Цэнтральнага аддзела Усходніх земляў. Была сябрам Таварыства польскай радзімай школы (TPMS), курыравала яго бібліятэкі і школы.

Публіцыстычную і літаратурную дзейнасць М. Рэут распачала ў Львове. Пісала рэпартажы, артыкулы, апавяданні, успаміны пра знакамітых людзей. З 1907 г. — член рэдкалегіі газеты "Kurier Lwowski", дзе публікавала артыкулы па гісторыі Польшчы, біяграфіі вядомых дзеячаў, апавяданні. Аўтар кніг "З-за кратаў" (Львоў, 1908), "Дзённік швачкі" (Львоў, 1909), "Пра птушак, коцікаў і іншых звераняток" (Львоў, 1912), зборніка апавяданняў "З гісторыі язычніцкай Літвы" (Варшава, 1913; 1919. 2 выд.). На падставе архіўных звестак і ўласнага вопыту напісала некалькі артыкулаў пра школьніцтва на Віленшчыне, у т. л. на этнічна беларускай тэрыторыі ("Родная школа на Віленскай зямлі" (Oświata Pol. 1924), "З гісторыі адукацыі ў Літве" (Almanach Szkolnictwa Ziem i Wil. 1925). Пісала артыкулы пра жыццё моладзі, сцэнарыі для школьных і самадзейных тэатральных пастановак (некаторыя з іх былі надрукаваны). У 1925 г. — рэдактар дзяцячага часопіса "Gwiazdkę".

У 1933 г. за асветніцкую і педагагічную дзейнасць М. Рэут была ўзнагароджана сярэбраным Крыжам заслугі. Пахавана ў Вільні на Бернардзінскіх могілках.

Вольга Гапоненка

Рэут Ядвіга

***Рэут Ядвіга** (8.2.1881, Віцебск – 19.2.1972, Скалімова, Польшча), польская асветніца.*

Нарадзілася Я. Рэут у сям'і банкаўскага служачага. Дзяцінства правяла ў родавым маёнтку над Віцебскам. Скончыла Віцебскую гімназію (1898), двухгадовы Вышэйшы педагагічны інстытут ў Варшаве (1923). Слухала лекцыі ў Варшаўскім універсітэце. Прайшла навуковыя стажыроўкі ў Швецыі, Францыі, Аўстрыі, дзе пераймала вопыт школ гэтых краін, слухала лекцыі вядомых педагогаў.

У 1900–1908 гг. выкладала педагогіку, гісторыю і літаратуру ў гаспадарчай школе ў Хілічках і ў жаночай школе пры Жаночай гімназіі імя Цэцыліі Плятэр-Зыберк у Варшаве. У 1910 г. стала дырэктарам жаночай школы. Абавязкі яе дырэктара Я. Рэут выконвала да 1944 г., адначасова выкладала польскую мову і гісторыю. У час Першай сусветнай вайны была арганізатарам дабрачыннага руху ў дапамогу шпіталям. Была адным з ініцыятараў школьнай рэформы ў Польшчы, актыўна ўводзіла новыя метады навучання. Адстойвала ідэю стварэння навуковых кабінетаў, гімнастычных залаў у гімназіях і школах, далучэння да выкладання ў іх вядомых прафесараў універсітэтаў. Выступала за адкрыццё жаночай настаўніцкай семінарыі. З красавіка 1926 г. выконвала функцыі намесніка старшыні Таварыства настаўнікаў сярэдніх школ і вышэйшых навучальных устаноў.

У час Другой сусветнай вайны вяла тайныя заняткі па курсу гімназіі і ліцэя (больш за 200 яе вучаніц атрымалі дыпломы). Прымала ўдзел ў Варшаўскім паўстанні 1944 г., прадаставіла памяшканне школы для бежанцаў. Апекавалася шпіталем паўстанцаў у адным з будынкаў школы. Пасля паўстання пераехала ў Кельцы, дзе ў 1945–1950 гг. працавала ў мужчынскай гімназіі пры Келецкім біскупстве. З 1958 г. працавала настаўніцай у Скалімове пад Варшавай. За працу па ўдасканаленню сістэмы адукацыі ў Польшчы была ўзнагароджана медалём Адраджэння Польшчы.

Пахавана ў Варшаве на Павонзскіх могілках для заслужаных.

Вольга Гапоненка

Сабалеўскі Антон

Сабалеўскі Антон Аляксандравіч *(17.11.1926, Мінск), інжынер-будаўнік, палкоўнік у адстаўцы, грамадскі дзеяч беларускай дыяспары ў Расіі.*

А. Сабалеўскі нарадзіўся ў сям'і настаўнікаў. Яго бацька, Алесь Аляксандравіч, быў адным з першых дырэктараў беларускамоўных школ г. Мінска. Бацькі, якія ў 1920–я гг. удзельнічалі ў нацыянальна-культурным руху краіны, выхавалі ў хлопчыка любоў да беларускага краю, да роднай мовы. А. Сабалеўскі вучыўся ў беларускамоўнай школе. У 1951 г. закончыў будаўнічы факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута. З 1952 г. жыве ў Маскве. Да 1981 г. служыў у арміі. Пасля выхаду ў адстаўку працаваў ў Міннафтагазбудзе.

Наш суайчыннік актыўна займаецца культурна-грамадскай дзейнасцю. Удзельнічае ў рабоце Маскоўскага таварыства беларускай культуры імя Ф. Скарыны, старшынёй якога быў у 1992–1993 гг. А. Сабалеўскі — сябра шматлікіх суполак і аб'яднанняў: Маскоўскага рэгіянальнага аб'яднання беларусістаў, Міжнароднага фонду Янкі Купалы, Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына".

Аляксей Каўка (Масква)

Сабалеўскі Ян

Сабалеўскі Ян Мацвеевіч *(11.9.1925, в. Іванава (Вішнева) Нясвіжскага пав. Навагрудскага ваяв., цяпер Нясвіжскщ р-н Мінскай вобл.), старшыня Вышэйшай калегіі Мусульманскага рэлігійнага Саюза ў Польшчы (1991).*

Я. Сабалеўскі спачатку вучыўся ў пачатковай школе (1932–1938), потым у сярэдняй школе (1939–1941) г. Лань. У 1942–1944 гг. — у Клецкай тэхнічнай сярэдняй школе, дзе скончыў 3 курсы. У гады Другой сусветнай вайны супрацоўнічаў з партызанскім атрадам, які дзейнічаў у Клецкім р-не: падтрымліваў пастаянную сувязь з партызанам Мухтарам Карыцкім, перадаваў неабходную інфармацыю, удзельнічаў ў дыверсійных аперацыях. У ліпені 1944 г. быў мабілізаваны ў Чырвоную Армію. Ваенную падрыхтоўку прайшоў у ваенным лагеры ў Сельцах над р. Ака. У снежні 1944 г. адпраўлены на фронт. У баі пад Кёнігсбергам быў цяжка паранены (10.4. 1945 г.). У верасні 1945 г. дэмабілізаваны па стану здароўя. За ўдзел у баях у складзе 33-яй Гвардзейскай Севастопальскай дывізіі ва Усходняй Прусіі быў узнагароджаны ордэнам "Чырвонай зоркі", медалём "За Перамогу", прысвоена званне старшага сяржанта. У 1945–1946 гг. скончыў 10-ы клас сярэдняй школы ў Лані. У чэрвені 1946 г. выехаў на пастаяннае месца жыхарства ў Польшчу разам з бацькамі, дзе ў в. Радалін у р-не Ціцянка Любуска ім выдзелілі зямлю. У 1947–1949 гг. вучыўся ў Познаньскай гандлёвай гімназіі. Працоўную дзейнасць пачаў у Познані рэферэнтам у фірме г. Хартвіг СА (1949–1951). З чэрвеня 1951 г. перайшоў на работу ў раённае будаўнічае прадпрыемства ў Ціцянцы Любускай, дзе ўзначальваў планавы аддзел. Працаваў у аб'яднанні бытавых паслуг (1954). Вучыўся ў Цэнтральнай школе павышэння кваліфікацыі ў Кракаве (1955–1956). Жаніўся ў чэрвені 1957 г. З кастрычніка 1956 г. па лістапад 1959 г. Ян Сабалеўскі працаваў у кааператыве інвалідаў у Ціцянцы Любускай на пасадзе фінансавага кіраўніка. Быў прыняты ў члены ПОРП (1953 г.), быў сакратаром першаснай партарганізацыі, членам гарадскога камітэта ПОРП у Ціцянцы Любускай. У 1958–1959 гг. другім сакратаром гэтага камітэта. Таксама быў выбраны членам мясцовага Савета ў Ціцянцы Любускай. Скончыў вячэрні універсітэт у Познані (1959), курсы бухгалтараў (1950), курсы для інвестараў (1954), курсы членаў кіраўніцтва кааператывамі (1955), у 1956 г. — курсы дакументацыі і аплаты. У 1959 г. разам з сям'ёй пераехаў на пастаяннае месца жыхарства ў Беласток, дзе працаваў у абласным аб'яднанні кааператываў (1960–1967), потым у кааператыве апрацоўкі скур, на фабрыцы гаспадарчых вырабаў. У 1985 г. выйшаў на пенсію.

З 1961 г. з'яўляецца старшынёй Рэвізійнай камісіі Саюза ваенных інвалідаў у Беластоку, з 1995 г. — старшыня Рэвізійнай камісіі Саюза ветэранаў вайны і былых палітвязняў абласнога ўпраўлення ў Беластоку. У 1974–1979 гг. быў выбраны членам Вышэйшай калегіі Мусульманскага рэлігійнага Саюза ў Польшчы, а ў 1984–1991 гг. — старшынёй Рэвізійнай камісіі гэтага Саюза.

За ўдзел у вытворчай і грамадскай дзейнасці Ян Сабалеўскі ўзнагароджаны шмалікімі ўзнагародамі, падзякамі ад дзяржавы і розных арганізацый. Член Польскай манархічнай Лігі — з тытулам князя.

Юрый Вашкевіч

Сабольшчыкаў Васіль

Сабольшчыкаў Васіль Іванавіч *(1813, Віцебск – 1872, Пецярбург), рускі бібліятэказнавец, архітэктар.*

В. Сабольшчыкаў нарадзіўся ў збяднелай купецкай сям'і. У 1830 г. прыехаў у Пецярбург. У 1834 г. пачаў працаваць у Пецярбургскай публічнай бібліятэцы: спачатку пісцом, пазней — старшым бібліятэкарам і архітэктарам. Скончыў Акадэмію мастацтваў (1839). У бібліятэцы арганізаваў аддзяленне мастацтваў і тэхналогіі, фонд замежных

кніг пра Расію, сістэматызаваў фонд эстампаў. У 1862 г. пабудаваў па сваім праекце новую чытальную залу. Улічваючы шырокае грамадскае карыстанне бібліятэкай, распрацаваў шэраг пытанняў арганізацыі бібліятэчных фондаў і каталогаў (расстаноўка фондаў, сістэма каталогаў, правілы кнігаапісання і інш.).

В. Сабольшчыкаў аказаў вялікі ўплыў на развіццё бібліятэчнай справы ў Расіі. Ён з'яўляецца аўтарам прац "Аб уладкаванні грамадскіх бібліятэк і складанні іх каталогаў" (1859), "Агляд вялікіх бібліятэк Еўропы на пачатку 1859 г." (1860). Напісаў "Успаміны старога бібліятэкара", якія былі апублікаваны ў часопісе "Исторический вестник" (1889).

Вацлаў Мацкевіч

Сабэцкая Анна

Сабэцкая Анна *(2.4.1948, в. Масціха на Сакольшчыне Беластоцкага ваяв.), журналіст, перакладчык.*

Анна Сабэцкая ў 1966 г. закончыла агульнаадукацыйны ліцэй у Дуброве Беластоцкай. Вучылася ў Інстытуце бібліятэказнаўства і навуковай інфармацыі Варшаўскага універсітэта (1970). Працавала журналістам на Польскім радыё ў Зялёнай Гуры (1971–1979). З 1982 г. працуе на Польскім радыё ў Гданьску, дзе вядзе культурныя праграмы, у т.л. праграму "Калейдаскоп", прысвечаную нацыянальным меншасцям на Памор'і.

Стварае праграмы пра беларускую літаратуру, Беларускую Народную Рэспубліку. З'яўляецца аўтарам праграмы пра Максіма Багдановіча. Падрыхтавала цыкл перадач для Польскага радыё "Партрэты беларускіх пісьменнікаў". На Гданьскім тэлебачанні вяла праграму "Sky ORUNIA", прысвечаную нацыянальным меншасцям (1994–1995). Займаецца перакладамі беларускай мастацкай паэзіі і прозы на польскую мову. Пераклады твораў Сакрата Яновіча, Янкі Брыля, Еўдакіі Лось, Івана Шамякіна, Максіма Танка, Міхася Данілёнкі, М. Лынькова, Г. Далідовіча, І. Мележа, А. кураўца, Б. Сачанкі былі надрукаваны на старонках польскіх часопісаў "Odra", "Krajoobrazy", "Literatura", "Kamena", "Integracje", "Fakty", "Opole" і іншых.

Жыве ў Гданьску.

Алена Глагоўская (Гданьск, Польшча)

Савінава Ніна

Савінава (Міцук) Ніна Рыгораўна *(25.6.1955, в. Лукава Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл.), рэжысёр масавых відовішчаў, дзеяч беларускай дыяспары ў Эстоніі.*

У 1972 г. Н. Савінава скончыла Лукаўскую сярэднюю школу і паступіла ў Гродзенскае культурна-асветнае вучылішча на аддзяленне народнага тэатра. Працягвала вучобу ў Мінску ў Інстытуце культуры па спецыяльнасці "Рэжысура масавых відовішчаў". З 1981 г. пастаянна пражывае ў Таліне. У 1989 г. стварыла беларускую суполку. У 1993 г. стала прэзідэнтам Беларускага культурнага цэнтра "Бацькаўшчына" ў Таліне. З 1997 г. Н. Савінава рыхтуе і вядзе гадзінную беларускамоўную праграму на Эстонскім радыё-4. Яна з'яўляецца рэжысёрам-пастаноўшчыкам традыцыйных святаў "Спатканне" і "Беларускае надвор'е", якія карыстаюцца вялікай папулярнасцю. У Беларускім культурным цэнтры "Бацькаўшчына" працуе нядзельная школа, у якой вывучаюць беларускую мову, знаёмяцца з гісторыяй краіны, яе фальклорам, з творчымі здабыткамі беларускіх пісьменнікаў. Н. Савінава з'яўляецца членам Асацыяцыі народаў Эстоніі, пад эгідай якой адбываюцца традыцыйныя фестывалі нацыянальных культур "Славянскі вянок", выступае рэжысёрам гэтых фестываляў. Ёю створаны фальклорны гурт "Алеся" і дзіцячы танцавальны калектыў "Крыжачок", якія паспяхова выступаюць.

Грамадскую работу Н. Савінава спалучае з працай у АТ "Дарына"-Н, прэзідэнтам якога з'яўляецца. Яна таксама генеральны дырэктар Міжнароднага гандлёвага дома "Белрэсурсы–Эстонія", створанага ў 1998 г. пры яе непасрэдным удзеле.

Пятрусь Капчык (Ізяслаў, Украіна)

Садоўскі Аляксандр

Садоўскі Аляксандр Іванавіч *(24.11.1859, Віцебск – 26.12.1921, Прага), фізік, прафесар.*

Нарадзіўся А. Садоўскі ў шляхецкай сям'і. Пачатковую адукацыю атрымаў дома. У 1872 г. паступіў у Аляксандраўскую рускую гімназію ў Гельсінгфорсе, якую паспяхова скончыў у 1877 г. і ў тым жа годзе паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Пецярбургскага універсітэта, які скончыў у 1881 г. Быў пакінуты пры універсітэце для падрыхтоўкі да прафесарскага звання. З 1882 г. выкладаў матэматыку і фізіку ў гімназіях і прыватных вучылішчах, у вышэйшых навучальных установах Пецярбурга — Інстытуце грамадзянскіх інжынераў, Марской акадэміі, Горным інстытуце. У 1894 г. зацверджаны прафесарам Юр'еўскага (Тартускага) універсітэта. З 1916 г.

— загадчык кафедры фізікі Марской акадэміі. Прымаў удзел ў рабоце з'ездаў рускіх прыродазнаўцаў і ўрачоў (1889–1913), расійскіх з'ездаў выкладчыкаў фізікі (Пецярбург, 1902–1913). Быў членам Рускага фізіка-хімічнага таварыства. У ліпені 1915 г. запрошаны Ваенна-прамысловым камітэтам Расіі кансультантам на Расійскае прадпрыемства па дакладнай механіцы і оптыцы для вырашэння праблем, звязаных з вытворчасцю аптычнага шкла для ваенных мэтаў. З 1919 г. жыў у Празе, дзе з 1923 г. загадваў кафедрай фізікі Расійскага народнага універсітэта.

Першыя навуковыя даследаванні А. Садоўскага былі прысвечаны вывучэнню электрамагнітных уласцівасцей розных рэчываў. Эксперыментальна паказаў анамальныя паводзіны вісмута ў магнітным полі. Вынікі гэтых даследаванняў былі выкладзены вучоным ў магістэрскай дысертацыі, якую ён паспяхова абараніў ў 1894 г. Праводзіў навуковыя даследаванні ў галіне оптыкі і спектраскапіі. У 1898 г. упершыню тэарэтычна даказаў існаванне вярчальнага дзеяння светлавых хваляў, якія падаюць на крышталь (эфект Садоўскага), вылічыў вярчальныя моманты і даказаў магчымасць непасрэднага пераўтварэння светлавой энергіі ў механічную. Слушнасць тэарэтычных высноў А. Садоўскага была эксперыментальна даказана толькі ў 1935 г. амерыканскім вучоным Р. Бэтам, пасля чаго яны і атрымалі сусветнае прызнанне. Распрацаваў таксама спектральны метад вымярэння тэмпературы.

Вольга Гапоненка

Сакол Пятро

Сакол Пятро *(сапр. Масальскі Пётр Аляксандравіч, інш. псеўд. Пятрусь; 1(14).7.1905, м. Пасінь Люцынскага пав. Віцебскай губ., цяпер в. Пасіне Лудзенскага р-на Латвіі – 6.7.1985, Рыга), паэт, перакладчык, фальклярыст.*

Нарадзіўся П. Сакол у сялянскай сям'і. Пасля вучобы ў Пасінскай народнай школе і Себежскім вучылішчы займаўся ў Люцынскай беларускай гімназіі (1922–1923). У 1923 г. пераехаў у Рыгу, дзе працаваў на выпадковых работах — канторшчыкам, рабочым-будаўніком, падзёншчыкам на тартаку, карэктарам у рэдакцыі газеты "Голас беларуса". Вечарамі вучыўся на Беларускіх 2-гадовых настаўніцкіх курсах (1925–1926). У 1927 г. атрымаў месца настаўніка-практыканта ў Даўгаўпілскай беларускай гімназіі. За дзейнасць у партыі незалежных сацыялістаў і ў Латгальскім рабочым прафсаюзе быў арыштаваны, пазбаўлены права настаўнічаць, жыў пад наглядам паліцыі. У 1929–1936 гг. уладкоўваўся на розныя часовыя работы ў Ліепаі і Рызе — чарцёжнікам, табельшчыкам, грузчыкам, карэктарам-перакладчыкам часопіса "Беларуская школа ў Латвіі", справаводам рыжскай беларускай вячэрняй школы. Са студзеня 1936 да ліпеня 1942 г. працаваў бухгалтарам на фанернай фабрыцы, адкуль у адміністрацыйным парадку быў пераведзены на пасаду карэктара-перакладчыка ў рэдакцыю часопіса "Новы шлях", створанага ў Рызе нямецкімі акупацыйнымі ўладамі. У штаце рэдакцыі знаходзіўся да верасня 1944 г., калі, пазбягаючы прымусовай эвакуацыі ў Германію, трапіў у Шкедскае лясніцтва (Курляндыя) на нарыхтоўку дроў. Быў рэпрэсіраваны. З 1945 да 1947 г. знаходзіўся на "фільтрацыі" ў Хабараўскім краі, у Ніжне-Амурскім выхаваўча-працоўным лагеры МУС СССР. Вярнуўся ў Рыгу ў сакавіку 1947 г. Працаваў вартаўніком, дарожным майстрам, нарміроўшчыкам.

Захапленне літаратурай пачалося ў П. Сакола са знаёмства з паэмай "Тарас на Парнасе", якую ён ведаў на памяць Калі вучыўся ў Люцынскай беларускай гімназіі, рыхтаваў там штомесячнік вучнёўскай творчасці і фальклорных запісаў "Ластаўка" (выйшлі 9 нумароў), прымаў удзел у тэатральных пастаноўках, ладзіў літаратурныя чытанні. Першыя спробы пяра — п'есы, якія пачаў пісаць з 15-гадовага ўзросту. Але больш удаваліся вершы (друкаваліся яны з 1923 г.) пра гістарычнае мінулае краю ("Люцынскі замак"), пра самаўсведамленне асобы ва ўмовах нацыянальнага і сацыяльнага прымусу ("Беларускі сцяг") і скаўцкі рух. Пісаў пра нялёгкае жыццё працоўнага чалавека ("Каваль"), пакуты латгальскага сялянства ("Адвечныя рабы"). Пасляваенныя рэпрэсіі на 20 гадоў перапынілі працу на беларускай ніве. Так засталася неадноўленай картатэка да беларуска-латышскага слоўніка, якую ён складаў у канцы вайны. Паэтычная спадчына П. Сакола невялікая: зборнік вершаў "На світанні" (1929), пераклады твораў рускіх і ўкраінскіх паэтаў, прозы Я. Порука і паэзіі Я. Райніса, латышскіх фальклорных твораў. У 1935 г. зрабіў смелую спробу падрыхтаваць зборнік перакладаў латышскіх дайнаў. Але яго падборка латышскіх народных песень убачыла свет у штотыднёвіку "Далягляды" толькі ў 1979 г. Зборнік перакладаў "Дайны" быў выдадзены ў Мінску ў 1987 г.

Сяргей Панізнік

Салавейчык Хаім

Салавейчык Хаім ха-Леві *(1853, Валожын Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер райцэнтр Мінскай вобл. – 1918, Отвоцк, Польшча), яўрэйскі рэлігійны дзеяч, вучоны-талмудыст.*

З 1873 г. Х. Салавейчык выкладаў у Валожынскай іешыве, з 1880 г. і да яе закрыцця ў 1892 г. — адзін з равінаў і яе кіраўнікоў. Пасля смерці бацькі ў 1892 г. змяніў яго на пасадзе равіна ў Брэсце. Лічыў галоўным сваім абавязкам клопаты аб духоўных і матэрыяльных патрэбах абшчыны. Удзельнічаў у некалькіх з'ездах расійскіх равінаў і аказаў на іх пастановы вырашальны ўплыў. Прытрымліваўся кансерватыўных поглядаў на свецкую адукацыю яўрэяў і выступаў супраць сіянізму. Х. Салавейчык выдзяляўся цярплівасцю, дабрынёй і міласэрнасцю, якія сталі легендарнымі. Яго метад выкладання ў Брэсце атрымаў пазней назву брэсцкага. У Першую сусветную вайну пераехаў у Мінск, у 1918 г. — у Варшаву, а адтуль — у Отвацк.

Пры жыцці Х. Салавейчыка не ўбачыла свет ніводная яго праца, — яго вучэнне і спосаб выкладання перадаваліся ў беларускіх іешывах з вуснаў у вусны яго вучнямі. Толькі невялікую колькасць сваіх навел, якія лічыў вывераными, ён выклаў у пісьмовай форме. Пасмяротна яны выдадзены пад назвай "Навелы нашага настаўніка Хаіма ха-Леві". Метад вывучэння Галахі, прапанаваны Х. Салавейчыкам, пераважае ў іешывах "літоўскага тыпу" і сёння.

Браніслава Котава

Саламенка Мікалай

Саламенка Мікалай Сцяпанавіч *(5.12.1923, Мінск – 25.6.1995, Санкт-Пецярбург, Расія), вучоны ў галіне механікі. Акадэмік АН СССР (1984, член-карэспандэнт з 1975), Расійскай акадэміі навук (з 1991). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1984).*

М. Саламенка скончыў у 1946 г. Вышэйшае ваенна-марское інжынернае вучылішча. Працаваў у розных канструктарскіх бюро СССР у Інстытуце праблем транспарту ў Санкт-Пецярбургу.

Асноўныя навуковыя працы М. Саламенкі прысвечаны будаўнічай механіцы караблёў, статыцы і дынаміцы інжынерных збудаванняў, пласцін і абалонак, праблемам дынамічнай устойлівасці абалонак пры дзяленні ўдарных хваляў. Вывучаў уплывы геалагічнай нелінейнасці канструкцый і пругка-пластычных характарыстык матэрыялаў на дынамічную трываласць і ўстойлівасць абалонак і плоскіх перакрыццяў. Даследаваў павышэнне надзейнасці інжынерных збудаванняў.

Вольга Гапоненка

Салаўёў Зіновій

Салаўёў Зіновій Пятровіч *(10.11.1876, Гродна — 6.11.1928, Масква), вучоны-медык, прафесар, дзяржаўны і грамадскі дзеяч.*

З. Салаўёў нарадзіўся ў сям'і губернскага каморніка. Пазней сям'я пераехала ў Сімбірск (цяпер Ульянаўск). У 1897 г. скончыў Сімбірскую гімназію і паступіў на медыцынскі факультэт Казанскага універсітэта. Пасля заканчэння універсітэта, у 1904 г., з атрадам Чырвонага Крыжа, Салаўёў паехаў на фронт – у Маньчжурыю. У 1905 г. атрымаў прызначэнне на пасаду цывільнага ўрача, пасля загадваў санітарным бюро Сімбірскага земства, а на наступны год перайшоў у Саратаўскае земства. У 1905-1906 гг. наш зямляк разам з братам У. Леніна Дзмітрыем Ульянавым, санітарным урачом Сімбірскага павятовага земства, быў членам Сімбірскага камітэта РСДРП. За падполную дзейнасць у 1908 г. З. Салаўёва на тры гады выслалі ў Усць-Сысольск пад нагляд паліцыі. Там, на Валагодчыне, ён як мог дапамагаў людзям, хоць працаваць урачом яму не дазвалялі. У ссылцы З. Салаўёў займаўся літаратурна-публіцыстычнай працай. У тагачаснай медыцынскай перыёдыцы — часопісах "Фельдшерский вестник", "Общественный врач", "Русский врач" і інш. з'яўляюцца яго артыкулы і допісы. Вярнуўшыся ў 1912 са ссылкі, З. Салаўёў стаў рэдактарам аддзела часопіса "Общественный врач" у Маскве, сакратаром Усерасійскай лігі барацьбы з туберкулёзам. 17 красавіка 1917 ў Маскве адбыўся надзвычайны пірагоўскі з'езд урачоў, на якім З. Салаўёў быў выбраны членам праўлення. З 28 жніўня стала выходзіць новая штотыднёвая газета "Врачебная жизнь", галоўным рэдактарам якой быў З. Салаўёў. Актыўна ўдзельнічаў ў правядзенні паўстання ў Маскве ў 1917 г. Пасля рэвалюцыі наладжваў дзейнасць медыцынскіх установ. Працаваў загадчыкам аддзела аховы здароўя ў Народным камісарыяце ўнутраных спраў, а з 11 чэрвеня 1918 г. — намеснікам наркома аховы здароўя РСФСР. Нязменны старшыня Цэнтральнага камітэта Чырвонага Крыжа, прафесар кафедры сацыяльнай гігіены, начальнік

Галоўнага ваенна-санітарнага ўпраўлення, ініцыятар стварэння піянерскага лагера "Артэк". З. Салаўёў у сваёй рабоце кіраваўся тым, што ахова здароўя – частка дзяржаўнага ладу жыцця.

Імя З. Салаўёва прысвоена 1-й клінічнай бальніцы г. Гродна.

Галіна Івуць

Саленіекс Эдуардс

Саленіекс Эдуардс *(6.6.1900, в. Пушча Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер в. Грузды Сенненскага р-на Віцебскай вобл. – 6.5.1977, Рыга), латышскі пісьменнік.*

Э. Саленіекс нарадзіўся ў сям'і латышскіх перасяленцаў-каланістаў. У 1910 – 1913 гг. хадзіў у школу ў в. Забор'е. У 1918 г. скончыў прыватную латышскую гімназію Неруша ў Віцебску. У 1919 г. прызваны ў Чырвоную Армію. Пасля лячэння ў шпіталі (Віцебск) працаваў пісарам ваеннага камісарыята ў Какоўчыне (1920 – 1921), настаўнічаў у Ярошынскай валасной (1922) і Лашнеўскай сямігадовай (1923 – 1929) школах. Вучыў дзяцей і ў Вялікалуцкім раёне. На пачатку 1930-х гг. працаваў літаратурным рэдактарам латышскай газеты "Комунару Цыня", якая выходзіла ў Маскве. З 1934 па 1937 г. узначальваў рэдакцыю дзіцячай і мастацкай літаратуры выдавецтва "Праметэй". Быў рэпрэсіраваны, да 1946 г. жыццё Э. Саленіекса праходзіла на Калыме. Пасля рэабілітацыі (1956) пераехаў у Латвію, але толькі ў 1960 г. яму было дазволена пасяліцца ў Рызе. Сябрам Саюза пісьменнікаў стаў у 1953 г. У 1970 г. атрымаў званне заслужанага дзеяча культуры ЛССР.

Друкуецца Э. Саленіекс з 1917 г. Першы верш на латышскай мове апублікаваў ў петраградскай газеце "Камуніст" (1921) — ён быў прысвечаны жыццю латышскіх каланістаў у Беларусі. Гэтая тэма стала стрыжнявой і для прозы пісьменніка. Перасяленец Робертс Заланс – галоўны герой многіх твораў Э. Саленіекса (раман пад назвай "Робертс Заланс" выйшаў у 1958 г.). Своеасаблівай "новай зямлі" латышоў прысвечаны цыкл з пяці аўтабіяграфічных раманаў-успамінаў пісьменніка пад агульнай назвай "Так яны працавалі" (закончаны ў 1970 г.). Аўтар ад свайго імя вядзе апавяданне, пачынаючы з першых дзіцячых крокаў на беларускай зямлі, знаёміць чытачоў з побытам перасяленцаў, якія трапілі з Латвіі да суседзяў, шукаючы "свой лапік зямлі", вольны ад баронаў-памешчыкаў. Творы Э. Саленіекса перакладаліся на рускую мову: "Мінулыя дні" (Рыга, 1953), "Крок за крокам" (М., 1957), "Шчодрае жыццё" (М., 1961), "Другое паліто", "Не кідайся ў агонь" (М., 1977). На радзіме літаратара, у г. Сянно памятаюць імя земляка.

Сяргей Панізьнік

Салярцінскі Іван

Салярцінскі Іван Іванавіч *(20.11.1902, Віцебск – 11.2.1944, Новасібірск, Расія), гісторык музыкі, тэатра і літаратуры.*

Нарадзіўся І. Салярцінскі ў сям'і юрыста. Бацька, Іван Іванавіч, у той час працаваў старшынёй гарадскога суда. Хутка сям'я пераехала ў Харкаў, а ў 1906 г. – у Пецярбург. У 1911 г. І. Салярцінскі паступіў у 3-ю Пецярбургскую класічную гімназію, якую скончыў у 1919 г. Затым сям'я вярнулася ў Віцебск. І. Сялярцінскі пачаў займацца педагагічнай работай, праводзіў заняткі ў Віцебскай драматычнай студыі, зблізіўся з многімі дзеячамі мастацтва. У 1921 г. пераехаў у Петраград, працаваў у 15-й працоўнай школе. У 1924 г. паступіў на рамана-германскае аддзяленне факультэта грамадскіх навук Петраградскага універсітэта. Адначасова вучыўся ў Інстытуце гісторыі мастацтва, дзе потым прайшоў і курс аспірантуры па тэатразнаўству.

Усё жыццё І. Салярцінскі вылучаўся незвычайнай зацікаўленасцю мастацтвам, імкненнем заразіць гэтай зацікаўленасцю іншых, далучыць магчыма большую колькасць людзей да рускіх і сусветных каштоўнасцей. Гэта абумовіла шырокі спектр яго інтарэсаў і дзейнасці. Ён чытаў лекцыі па пытаннях мастацтва, эстэтыкі, псіхалогіі ў Ленінградскім універсітэце, Інстытуце гісторыі мастацтваў, Педінстытуце імя Пакроўскага, Ленінградскай кансерваторыі. З 1924 г. супрацоўнічаў з перыядычнымі выданнямі ("Известия", "Смена", "Советское искусство" і інш.), пісаў пра музыку, тэатр, балет. У сваіх працах ён даследаваў праблемы класічнай музычнай спадчыны, сімфанізму, харэаграфіі, опернай і балетнай драматургіі, сучаснай музычнай культуры. Пад уздзеяннем І. Салярцінскага Ленінградская філармонія стала цэнтрам асветніцкай работы, аўтарытэтнай музычнай установай СССР. У 1941 г. разам з філармоніяй (як яе мастацкі кіраўнік) І. Салярцінскі быў эвакуіраваны ў Новасібірск. Там, акрамя філармоніі, ён працаваў яшчэ ў Тэатры драмы імя А. С. Пушкіна, кіраваў кафедрай мастацтвазнаўства Ленінградскага тэатральнага інстытута. У гарадской бібліятэцы Новасібірска разабраў і ўпарадкаваў кніжныя фонды на 23 мовах.

Імя І. Салярцінскага шануецца ў Віцебску, дзе штогод праводзяцца Міжнародныя музычныя фестывалі яго імя, прысвечаныя яму навуковыя чытанні.

Алена Русакевіч

Сахарава Вольга

Сахарава (Нікановіч) Вольга Фёдараўна *(крыпт. О. С.; 15(28).6.1884, в. Казаноўка Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Чашніцкі р-н Віцебскай вобл. – 13.3.1943, Люцын (Лудза), Латвія), беларуская паэтэса, драматург.*

Паходзіла В. Сахарава з сям'і праваслаўнага святара Х. Нікановіча. Вучылася ў Полацкай рускай гімназіі, а пасля яе заканчэння (1900) накіравалася ў Люцын, куды быў пераведзены настаяцелем царквы яе бацька. Працавала 4 гады ў Люцыне настаўніцай прыходскай школы для дзяўчынак. Тут пазнаёмілася з С. Сахаравым, настаўнікам Люцынскага гарадскога вучылішча, у 1905 г. яны ажаніліся. У студзені 1907 г. В. і С. Сахаравы пераехала ў Юр'еў (цяпер Тарту), дзе яна пачала вучыцца на прыватных курсах дашкольнага выхавання. У час працы мужа на педагагічна-адміністрацыйных пасадах у розных гарадах (Віцебск, Юр'еў, Пінск, Магілёў і інш.) таксама працавала на школьна-асветнай ніве, гадавала траіх дзяцей. У 1917 г. зноў апынуліся ў Люцыне (з 1918 — тэрыторыя Латвіі), куды С. Сахараў быў запрошаны на пасаду дырэктара беларускай гімназіі. В. Сахарава арганізавала там прыватны беларускі дзіцячы садок, удзельнічала ў рабоце культурна-асветнага таварыства беларусаў у Латгаліі "Бацькаўшчына". У 1922 г. пераехалі ў Рыгу, у 1925 г. — у Дзвінск (цяпер Даўгаўпілс), дзе да 1932 г. працавала ў беларускай гімназіі. У канцы 1932 г. зноў перабраліся ў Рыгу. Жыццёвая неўладкаванасць змушала некалькі разоў мяняць месца жыхарства. У 1935 г. яны пераехалі ў м. Краслава, дзе В. Сахарава дапамагала мужу збіраць беларускі фальклор. У 1936–1937 гг. жылі ў Дзвінску, потым зноў у Рызе — разам з сям'ёй дачкі Ірыны. Смерць дачкі Галіны, неспакойнае вандроўнае жыццё ў бесперапынным змаганні за нацыянальныя правы беларускай меншасці ў Латвіі адмоўна паўплывалі на стан здароўя В. Сахаравай. Яе разбіў паралюш, а пасля другога прыступу, увосень 1942 г., яна памерла ў Люцынскім шпіталі.

Актыўная пісьменніцкая дзейнасць В. Сахаравай распачалася пасля пераезду ў 1917 г. у Люцын. Тут, працуючы ў культурна-асветным накірунку і адчуваючы патрэбу ў дзіцячых сцэнічных творах, яна пісала невялічкія інсцэніроўкі для выхаванцаў свайго дзіцячага садка, якія і ставіла разам з імі. У Дзвінску пісала п'есы для вучнёўскіх пастановак у гімназіі. З гэтага часу вядомы два яе буйныя сцэнічныя творы: "На Полацкім замчышчы" — п'еса, у сюжэтную аснову якой пакладзена драматургічная паэма Я. Купалы "Сон на кургане" (першы раз пастаўлена на сцэне Дзвінскай беларускай гімназіі ў 1927 г., у 1928 г. выйшла ў Дзвінску асобным выданнем і ставілася ў беларускіх школах на вёсках; мела поспех на Віленшчыне, а кампазітар К. Галкоўскі апрацаваў для яе некалькі мелодый), і "Птушка на волі" — п'еса ў 3-х дзеях са спевамі з жыцця беларускай вёскі (з 1928 г. рэгулярна ставілася школьнымі беларускімі тэатрамі, у 1932 г. выйшла асобным выданнем у Дзвінску). Другая п'еса па сюжэту крыху нагадвала купалаўскую "Паўлінку". У ёй развівалася класічная драматургічная сітуацыя — супрацьстаянне паміж каханнем і разлікам. Ненадрукаванымі засталіся тры п'есы В. Сахаравай, якія ставіліся ў Дзвінскай беларускай гімназіі — "Маладыя пабегі", "Ліст да Прэзідэнта" і "Аксюткіна ёлка" (калядная п'еса для дзіцячага тэатра). Няскончанай засталася інсцэніроўка "Беларускае вяселле", заснаваная на багатым фальклорным матэрыяле. Пісала В. Сахарава і вершы. Некаторыя з іх былі надрукаваны ў 1926 г. у рыжскай беларускай газеце "Голас беларуса", у зборніку "Першы крок", часопісе "Школьная праца". Аднак большая частка паэтычнай спадчыны В. Сахаравай засталася неапублікаванай. У 1943 г. рыхтаваўся да друку пасмяротны зборнік яе вершаў "Водгукі сэрца", дзе былі сабраны лепшыя паэтычныя творы патрыятычнага характару ("Беларускай грамадзе ў Латвіі", "Брату-беларусу", "Змагару-адраджэнцу", "Ворагам", "Праўда людская" і інш.), вершы, напісаныя ўдалечыні ад радзімы ("Успаміны аб радзіме", "Роднай вёсцы", "Родная школа"), і глыбока асабістыя ("Прайшлі гады", "На смерць мае дачкі Галіны" і інш.). Рукапіс гэтага зборніка захоўваецца ў акадэмічнай бібліятэцы ў Вільнюсе. Вяла дзённік (не захаваўся).

Ірына Багдановіч

Сахараў Сяргей

Сахараў Сяргей Пятровіч *(псеўд. Гісторык, Двинчанин, Дзьвінчук, С. Дзьвінчук, Скучающий; крыпт. С.; 16(29).9.1880, Полацк – 22.4.1954, Рыга), беларускі і рускі фалькларыст, этнограф, публіцыст, педагог.*

Паходзіў С. Сахараў з сям'і псаломшчыка царквы пры Полацкім кадэцкім корпусе. Праз год пасля нараджэння хлопчыка бацьку яго перавялі ў в. Банонь Полацкага пав., дзе ён у хуткім часе памёр. Маці пераехала да сваякоў у в. Туроўлю таго ж павета. Там С. Сахараў пайшоў у школу. Праз тры гады сям'я пераехала ў Полацк, дзе С. Сахараў у 1891 г. паступіў вучыцца ў духоўнае вучылішча. Паспяхова вытрымаў экхамены і ў 1895 г. быў пераведзены ў Віцебскую духоўную семінарыю, якую скончыў у 1901 г. Адмовіўшыся ад духоўнага сану, заняўся педагагічнай дзейнасцю. Быў прызначаны настаўнікам Пасінскай народнай школы Люцынскага пав., а з 1902 г. працаваў выкладчыкам гарадскога вучылішча ў Люцыне (цяпер г. Лудза, Латвія). У Люцыне ў 1905 г. ажаніўся з Вольгай Сахаравай (Нікановіч). З пачатку 1907 г. С. Сахараў вучыўся на юрыдычным факультэце Юр'еўскага (цяпер Тартускага) універсітэта і адначасова слухаў лекцыі на гісторыка-філалагічным факультэце. Пасля заканчэння вучобы ў 1911 г. атрымаў дыплом юрыста (выканаў кандыдацкую працу па царкоўнаму праву, якая

была надрукавана ў 16, 20 і 21 зборніках "Вучона-літаратурнага таварыства пры Юр'еўскім універсітэце") і правы выкладчыка гісторыі і мовы ў сярэдніх школах. Па прыездзе на работу ў Віцебск ён быў прызначаны настаўнікам правазнаўства ў трох гімназіях і ў настаўніцкім інстытуце. У 1913 г. прызначаны на пасаду інспектара народных вучылішчаў у Юр'еве. Там яго заспела Першая сусветная вайна і Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. З мая па кастрычнік 1917 г. давялося шмат павандраваць у пошуках працы па Беларусі (жыў у Пінску, Барысаве, Мінску, Магілёве). У кастрычніку 1917 г. прыйшло запрашэнне ад Люцынскай гарадской управы заняць пасаду дырэктара арганізаванай там беларускай гімназіі. З 1921 г. у Люцыне (з 1918 г. тэрыторыя Латвіі) пачынае дзейнасць беларускае грамадскае культурна-асветнае таварыства "Бацькаўшчына". С. Сахараў стаў старшынёй праўлення гэтага таварыства. Увосень 1921 г. ён прызначаны кіраўніком беларускага аддзела Міністэрства асветы ў Рызе і ў 1922 г. пераехаў туды з сям'ёй. Гэта быў перыяд актыўнай і цяжкай працы, звязанай з адкрыццём пачатковых беларускіх школ, гімназій, настаўніцкіх курсаў. Барацьба за беларускую школу суправаджалася нядобразычлівымі адносінамі з боку рускага, польскага і часткова латышскага насельніцтва, адсутнасцю нацыянальна настроенай інтэлігенцыі, чуткамі і абвінавачваннямі ў "левізне". Усё гэта прывяло да таго, што ў 1925 г. аддзел быў ліквідаваны. С. Сахараў становіцца настаўнікам, а неўзабаве дырэктарам беларускай гімназіі ў Дзвінску (цяпер Даўгаўпілс). Педагагічную дзейнасць спалучаў з грамадскай, быў прадстаўніком беларусаў у Дзвінскай гарадской думе. Рэдагаваў вучнёўскі часопіс "Школьная праца" (гектограф). Тэндэнцыя да закрыцця школ нацыянальных меншасцей прывяла да таго, што ў 1932 г. Дзвінская беларуская гімназія была ліквідавана, а С. Сахараў вымушаны быў пайсці на пенсію. Ён пераехаў у Рыгу, актыўна заняўся гісторыка-літаратурнай працай. Летам 1935 г., будучы ў м. Краславе, С. Сахараў пачаў інтэнсіўна запісваць беларускі фальклор. У 1936–1937 гг. жыў у Дзвінску, потым зноў у Рызе. У 1939 г. было арганізавана беларускае таварыства ў Латвіі, і С. Сахараў актыўна ўключыўся ў яго дзейнасць. У кастрычніку 1940 – снежні 1941 гг. працаваў настаўнікам у Рыжскай беларускай вячэрняй школе, у 1942 г. — дырэктарам Зылупскай беларускай гімназіі. З мая 1944 г. — зноў у Рызе, настаўнік рускай школы. У красавіку 1945 г. арыштаваны па даносе як "нацыяналістычны беларус" і асуджаны на 5 гадоў лагераў. Пакаранне адбываў у казахстанскіх лагерах Карабас і Батык. Вярнуўся ў жніўні 1950 г.

Творчая спадчына С. Сахарава досыць вялікая. Яна ўключае ў сябе пераважна навуковыя працы кананічнага, гісторыка-культурнага, педагагічнага, этнаграфічнага і фальклорнага характару. Першыя яго выступленні ў прэсе — шэраг карэспанданцкый у газеце "Витебский голос" у 1903 г. пад псеўд. Скучающий. Дасланыя з Люцына, яны датычыліся правінцыйнага жыцця гэтага горада. У красавіку 1906 г. у гэтай жа газеце з'явілася яго публікацыя "Люцынская легенда аб старым замку", якую ён запісаў ад свайго вучня. Сістэматычна выступаць у друку С. Сахараў пачаў з 1911 г. Змяшчаў свае матэрыялы ў "Полоцких епархиальных ведомостях", "Витебских губернских ведомостях", часопісе Віцебскай вучонай архіўнай камісіі "Полоцко-Витебская старина", у "Юрьевском вестнике", "Могилевской жизни". Знаходзячыся ў Юр'еве, выдаў кнігі на рускай мове "Канстанцін Дзмітрыевіч Ушынскі" (1916) і "Народная адукацыя ў Юр'еўскім павеце" (1917). У 1920–30-я гг. выдаў кнігі "Гістарычны нарыс пяцігоддзя Дзвінскай дзяржаўнай беларускай гімназіі за 1922–1927 гг." (Дзвінск, 1927), "Горад Лудза ў мінулым і сучасным" (Рыга, 1935, на рус. мове), "Прападобная Ефрасіння, княжна Полацкая" (Рыга, 1938, на рус. мове), "Полацкі князь Усяслаў — нацыянальны беларускі асілак" (Вільня, 1939), "Праваслаўныя цэрквы ў Латгаліі" (Рыга, 1939, на рус. мове) і інш.; друкаваўся ў беларускіх газетах і часопісах, якія выходзілі ў Латвіі ("Голас беларуса", "Думка беларуса", "Беларуская школа ў Латвіі"), у віленскіх часопісах "Шлях моладзі" і "Калоссе". Пазнавальнае значэнне маюць нарысы пра беларускіх фальклярыстаў П. Шэйна, Е. Раманава, М. Нікіфароўскага, гісторыка А. Сапунова, якога С. Сахараў называў беларускім Нестарам. Сярод гісторыка-этнаграфічных прац вылучаецца "Беларускі каляндар на 1937 год", куды ўвайшлі апісанні святаў, астралагічных з'яў, гістарычныя памяткі на кожны месяц, народныя прыкметы і сельскагаспадарчыя парады, літаратурныя і фальклорныя матэрыялы. Самай грунтоўнай сваёй працай С. Сахараў лічыў збор "Народная творчасць Латгальскіх і Ілукстэнскіх беларусаў" (Рыга, 1940. Вып.1), які ўключаў 414 песень. Да некаторых з іх даваліся і нотныя запісы, а таксама фотаздымкі сялян, ад якіх творы былі запісаны. Большасць фальклорна-этнаграфічных запісаў С. Сахарава засталіся ў рукапісах (сярод іх ёсць і запісы, зробленыя ў лагеры). У яго творчай спадчыне ёсць таксама працы па кнігазнаўстве і тэатразнаўстве, па гісторыі культурных сувязей беларусаў з літоўцамі і латышамі, працы педагагічнага і краязнаўчага характару. Рукапісы С. Сахарава зберагаюцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы НАН Беларусі (ф. 3), а таксама ў навуковых бібліятэках Латвіі і Літвы.

Ірына Багданоаіч

Сачко Зося

Сачко Зося*(18.7.1955, в. Волька Беластоцкага ваяв., Польшча), беларуская, руская, польская, украінская паэтэса. Сябар Саюза польскіх пісьменнікаў (1992).*

З. Сачко нарадзілася ў сялянскай сям'і. Закончыла Агульнаадукацыйны ліцэй імя Т. Касцюшкі ў Бельску-Падляшскім і аддзяленне рускай філалогіі Люблінскага універсітэта. Працавала настаўніцай на Беласточчыне і ў

Варшаве. З 1981 г. зноў на Беласточчыне. Дэбютавала вершам "Падарунак", змешчаным у 1970 г. у беластоцкай "Ніве". Потым пачала пісаць па-польску (вершы ў часопісе "Radar"). У 1982 г. выдала ў Беластоку зборнік вершаў "Пошукі". Зборнік "Над днём похіляна" (Беласток, 1991) напісаны на беларускай гаворцы, пераходнай паміж беларускай і ўкраінскай мовамі. Вершы З. Сачко на ўкраінскай мове з 1984 г. друкуюцца ў часопісах "Наш голос", "Наше слово", "Всесвіт", "Світо-вид", "Над Бугом і Нарвою". Яны змешчаны ў "Анталогіі ўкраінскай сучаснай паэзіі ў дыяспары" (Кіеў; Таронта, 1993). У паэзіі З. Сачко раскрываецца інтымны свет сучаснай жанчыны, адчуваецца турбота за лёс чалавека. Жыве ў Бельску-Падляшскім.

Ян Чыквін (Беласток, Польшча)

Сваяк Янка

Сваяк Янка *(сапр. Фальскі Мар'ян; крыпт. М. Ф., М. F.; 7.12.1881, в. Нача Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Ляхавіцкі р-н Брэсцкай вобл. – 7.10.1974, Варшава), польскі і беларускі перакладчык, публіцыст, педагог, грамадскі дзеяч, прафесар (1954).*

Я. Сваяк у 1899 г. скончыў Мінскую гімназію, потым вучыўся ў Варшаўскім політэхнічным інстытуце. Адзін з аўтараў лістовак на беларускай мове "Царская гаспадарка", "Прызыўныя" (1904–1905), у якіх востра крытыкавалася тагачасная афіцыйная царская палітыка. У 1905–1906 гг. актыўны дзеяч ППС, пасля ППС-лявіцы, падтрымліваў кантакты з Беларускай сацыялістычнай грамадой. За рэвалюцыйную дзейнасць у 1907 г. арыштаваны царскімі ўладамі і заключаны ў Варшаўскую цытадэль. У 1910 г. выдаў польскі лемантар "Навука чытання і пісання", які вызначаўся перадавой методыкай і на працягу 60 гадоў быў абавязковым падручнікам у школах. З 1919 г. працаваў у Міністэрстве асветы Польшчы. У 1931 г. быў экспертам Лігі нацый у Кітаі па праблемах школы. Пасля Другой сусветнай вайны працаваў у Міністэрстве асветы ПНР і Польскай Акадэміі навук — кіраўнік, куратар аддзела арганізацыі асветы.

У 1904 г. у кракаўскай друкарні У. Тэадарчука Я. Сваяк надрукаваў па-беларуску свой пераклад апавядання Г. Сянкевіча "Янка-музыкант" і аповесці невядомага аўтара "Ведзьма". У 1906 г. у перакладзе на беларускую мову выдаў апавяданне М. Жыха (С. Жаромскага) "Да свайго Бога". Пад уласным прозвішчам апублікаваў на польскай мове шматлікія працы па гісторыі, арганізацыі і методыцы навучання, а таксама мемуары.

Мікалай Варвашэвіч (Брэст)

Світыч-Ілліч

Світыч-Ілліч (Ілліч-Світыч) *(псеўд., сапр. Уладзіслаў Ігнацій Станіслававіч; 1853, Магілёўская губ. – 21.7.1916 Кіеў), рэвалюцыянер, літаратар.*

Паходзіў Світыч-Ілліч са шляхты Магілёўскай губ. (бацька — тытулярны саветнік). Вучыўся ў Магілёўскай гімназіі, дзе кіраваў гуртком і адкуль з 4 курса быў выключаны за "дрэнныя паводзіны". Служыў юнкерам у 61-м пяхотным Уладзімірскім палку, потым — пісарам на Кіеўска-Брэсцкай чыгункі, вёў прапаганду сярод рабочых у Крэменчугу. З вясны 1876 г. працаваў чорнарабочым у Ачакаве на будоўлі крапасной батарэі, распаўсюджваў забароненыя кнігі, якія атрымліваў ад сваёй сястры Элеаноры, сярод рабочых і матросаў. Быў арыштаваны і пераведзены ў Херсонскі турэмны замак (па гэтай жа справе прыцягвалася да адказнасці яго сястра Лізавета, якая служыла настаўніцай пры пансіёне ў Кіеве), адтуль уцёк у снежні 1877 г. Нелегальна жыў у Адэсе пад прозвішчам Ф. Васкрасенскага і ўваходзіў у гурток І. Кавалынскага. Прымаў удзел у друкаванні адозвы "Голас сумленных людзей". У студзені 1878 г. быў арыштаваны ў Адэсе (пры аказанні ўзброенага супраціўлення быў паранены ў нагу) і асуджаны на 8 год катаржных работ. Да лістапада 1880 г. сядзеў у адзіночцы Навабеліцкай катаржнай турмы, да вясны 1881 г. — у Мцэнскай перасыльнай турме. На Карыйскія руднікі прыбыў у лютым 1882 г. У 1883 г. накіраваны на пасяленне ў Якуцкую вобл. У 1884 г. паселены ў Амгінскай слабадзе; у красавіку 1886 г. пераведзены ў Барагонскі ўлус, а вясною 1887 г. — у Верхне-Кангаласкі ўлус, прыпісаны да сялянскай грамады. У маі 1893 г. выехаў з Якуцкай вобл. Жыў пад наглядам паліцыі ў Іркуцку, дзе працаваў у "Восточном обозрении" і ва Уладзівастоку. У 1900 гг. вярнуўся ў Еўрапейскую Расію. Супрацоўнічаў у "Новостях" і інш. газетах. Ананімна ў Жэневе ў 1901 г. выдаў "Надмагільнае слова Аляксандру II (Успаміны палітычнага катаржаніна)", у 1906 і 1921 гг. перавыдаваліся пад назвай "У каменным мяшку". Некралогі аб ім былі змешчаны ў "Киевской мысли" (1916. № 204) і "Историческом вестнике" (1916. Т. 9).

Алесь Баркоўскі (Якуцк)

Свянціцкі Баляслаў

***Свянціцкі Баляслаў** (16.2.1876, в. Закалюжжа Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Лагойскі р-н Мінскай вобл., — 1966, Варшава), інжынер па селькай гаспадарцы, публіцыст, філосаф.*

Б. Свянціцкі нарадзіўся ў беларускай сям'і. У 1899 г. закончыў вышэйшую сельскагаспадарчую школу ў Пулавах (Польшча). У 1908 г. ажаніўся з Канстанцыяй Сіпайла, выпускніцай вакальнага факультэта Маскоўскай кансерваторыі, пазней — прафесарам кафедры спеваў у Вільні. Да 1920 г. у родавым маёнтку ўводзіў новыя метады земляробства, садаводства і лесаводства. У міжваенны перыяд (1921-1939) Б. Свянціцкі быў супрацоўнікам Аддзела зямельнай рэформы і парцэляцыі ў Вільні.

У 1938 г. Б. Свянціцкі выдаў у Вільні кнігу "Унія хрысціянскіх краін", дзе выступаў за злучэнне суверэнных народаў, якія прынялі за аснову існавання хрысціянскія прынцыпы. Крытычна ацэньваў польскую палітыку ў адносінах да слабейшых народаў. Б.Свянціцкі — прыхільнік каталіцка-праваслаўнага збліжэння. Быў сябрам праваслаўных бацькоў вядомага польскага пісьменніка А. Голубева. Пасля Другой сусветнай вайны жыў у Торуні, Варшаве. Даследчык полльскай філасофіі XX ст.

Чэслаў Сэнюх (Варшава)

Семашкевіч Раман

***Семашкевіч Раман Мацвеевіч** (1.10.1900, в. Лебедзева Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Маладзечанскі р-н. Мінскай вобл. – 1937), жывапісец, графік, скульптар.*

Нарадзіўся ў беларускай мнагадзетнай сялянскай сям'і. Скончыў Віленскую беларускую гімназію. Там жа спасцігаў пачаткі выяўленчага мастацтва. Уступіў у Камуністычны саюз моладзі Заходняй Беларусі. Пераехаў у СССР, з 1924 г. вучыўся на скульптурным аддзяленні Віцебскага мастацкага тэхнікума, прымаў тут удзел у стварэнні мастацкай секцыі-філіяла "Маладняка". Пасля заканчэння тэхнікума ў 1927 г. быў накіраваны як выдатнік ва Усерасійскі мастацка-тэхнічны інстытут у Маскве. Вучыўся на факультэце жывапісу (майстэрня Д. Кардоўскага), які скончыў ў 1930 г. Працаваў апантана, здзіўляючы сучаснікаў сваім самабытным талентам і наватарствам. Пісаў партрэты, пейзажы, не прытрымліваўся догмаў. Сучаснікі лічылі яго самародкам, яркім "стыхійным" мастаком. У лістападзе 1937 г. беспадстаўна рэпрэсіраваны па сфабрыкаванай НКУС справе і ў снежні гэтага года расстраляны без суда і следства. Рэабілітаваны ў 1958 г.

Творчая праца Р. Семашкевіча пачалася з афармлення маладзёжнага часопіса "Рунь" (1923), які выдавалі навучэнцы Віленскай беларускай гімназіі. Графічныя работы мастака адлюстроўвалі родныя пейзажы, сялянскі побыт, а многія жывапісныя палотны — пратэст працоўных Заходняй Беларусі супраць прыгнёту, прысвечаны барацьбітам падполля ("Галадоўка палітзняволеных у Лукішскай турме", "На этапе", "Здзек паліцыі" і інш.), грамадскім дзеячам і майстрам культуры (партрэты А. Грыневіча, В. Таўлая, Я. Купалы, Я. Коласа, групавы партрэт М. Галадзеда, М. Гікалы і А. Александровіча, "Камсамолка"). Стварыў скульптурную кампазіцыю "Юны змаганец". Яго творчасцю захапляліся знакаміты авангардыст У. Татлін, вядомы крытык і перакладчык С. Ромаў, пісьменнікі В. Катаеў і К. Паустоўскі, мастак А. Дайнека і інш. За сваё нядоўгае жыццё мастак стварыў багатую спадчыну — 700 палотнаў, шмат графічных работ. У час арышту былі канфіскаваны больш за 300 жывапісных палотнаў, лёс якіх невядомы. Частка яго спадчыны цяпер захоўваецца ў музеях Масквы, Санкт-Пецярбургу, Нікалаева, Таганрога, Яраслаўля, Мінска, прыватных калекцыях.

Жыццё мастака ў Маскве было цесна звязана з бацькаўшчынай, у тым ліку і тэматыкай творчасці. Ён сябраваў з народнымі паэтамі Я. Купалай, Я. Коласам. Удзельнічаў у III Усебеларускай мастацкай выстаўцы (1930). У 1932 і 1937 гг. знаходзіўся ў творчых камандзіроўках ў Беларусі, у першую з якіх адбыліся яго персанальныя выстаўкі ў Мінску, Петрыкаве, Мазыры.

Пасля доўгіх гадоў забыцця ў нашу рэчаіснасць вяртаецца імя і спадчына таленавітага беларуса. Адбыліся персанальныя выстаўкі яго работ ў Траццякоўскай галерэі (1991) і Рускім музеі (1992). У Маскве выдадзены альбом, які змяшчае 115 рэпрадукцый жывапісных і графічных твораў Семашкевіча, успаміны пра яго вядомых дзеячаў культуры (1996). На бацькаўшчыне імя мастака ўваскрашаюць з небыцця публікацыі ў беларускай прэсе, фільм пра яго Беларускага тэлебачання.

Галіна Сяргеева

Серапін Іосіф

Серапін (Серапінас) Іосіф (Юозас) *(2.1.1921, в. Бальценікі Лідскага пав. Навагрудскага ваяв., цяпер Воранаўскі р-н Гродзенскай вобл.), хірург, доктар медыцынскіх навук (1975), прафесар (1979).*

І. Серапін у 1947 г. скончыў Вільнюскі дзяржаўны універсітэт. З 1952 г. выкладаў ва універсітэце. У доктарскай дысертацыі даследаваў своеасаблівасці крывяносных сасудаў печані і жоўцевых пратокаў, іх значэнне пры рэзекцыі печані. Стварыў метад раздзялення печані на долі, сектары і сегменты, дастасаваў гэты метад пры рэзекцыі печані. Удасканаліў спосаб падшывання прабадной язвы страўніка і дванаццаціперснай кішкі. Апублікаваў шэраг артыкулаў па гісторыі медыцыны, па пытаннях анатоміі і хірургіі.

Яніна Кісялёва

Сергіевіч Пётра

Сергіевіч Пётра (Пётр Аляксандравіч) *(10.7.1900, в. Стаўрова, цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. – 1.11.1984, Вільнюс), беларускі жывапісец і графік, грамадскі дзеяч. Заслужаны дзеяч мастацтваў Літоўскай ССР (1965).*

Нарадзіўся ў сям'і беззямельных сялян, мастаком марыў стаць з дзяцінства. Вучыўся на фабрычных курсах у Санкт-Пецярбургу, працаваў у брыгадзе рамонтнікаў на чыгуначнай станцыі. Вучыўся на мастацкім факультэце Віленскага універсітэта (1919–1922, 1925–1927, у прафесараў Рушчыца, Богуша-Сестранцэвіча, Кубіцкага, Сляндзінскага і інш.), у Кракаўскай акадэміі мастацтваў (1924–1925, у праф. Панкевіча). Як творчая асоба склаўся пад уплывам спецыфічных абставін жыцця ў Заходняй Беларусі. Быў рэдактарам заходнебеларускага літаратурна-мастацка-навуковага часопіса "Нёман" (1930-я гг.), у 1932 г. уступіў у Віленскі саюз незалежных мастакоў. Першая персанальная выстаўка П. Сергіевіча адкрылася 26 снежня 1935 г. у Вільні. Тагачасная беларуская крытыка прыхільна сустрэла творы маладога мастака.

Прыход у Заходнюю Беларусь Савецкай улады прынёс П. Сергіевічу праблемы: яго сястру Гелену з сям'ёй саслалі ў Казахстан (яе муж быў уладальнікам млына). Узімку 1940 г. мастак ездзіў у Мінск да першага сакратара ЦК КП(б)Б Ц. Гарбунова, хадайнічаў за сястру. Але яе ўдалося вярнуць на радзіму толькі з дапамогай П.К. Панамарэнкі пасля вайны. У час Вялікай Айчыннай вайны П. Сергіевіч пераехаў у родную в. Стаўрова на Браслаўшчыне; на жыццё зарабляў маляваннем. Пасля таго, як вёску спалілі карнікі (многія творы яго загінулі), мастак перабраўся ў Вільню. Там П. Сергіевіч і правёў рэшту жыцця. У Мінску адбыліся дзве персанальныя выстаўкі твораў мастака (1963, 1978).

Адметная мастацкая манера П. Сергіевіча склалася ўжо ў 1920–1930-я гг. Асабліва ўдаваліся мастаку партрэты; сярод напісаных ім у гэтым жанры, бадай, самыя дасканалыя па зместу і выкананню творы — "Беларуская настаўніца", "Дзяўчына ў сінім сарафане", "Аксіння Сергіевіч", "Званар", "Сейбіт", "Вясляр", "Юнак з кнігай", "Земляроб", "Лесаруб", "Пастух", "Цётка Агата" і інш. П. Сергіевіч — аўтар партрэтаў слынных беларускіх грамадскіх і палітычных дзеячаў, паэтаў, мастакоў, публіцыстаў — С. Глякоўскага, А. Луцкевіча, А. Станкевіча, П. Багрыма, Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, З. Верас, М. Забэйды-Суміцкага, М. Машары, Р. Шырмы, М. Багдановіча, Ф. Шантыра. Тэме гістарычнага мінулага краіны прысвечаны творы "Скарына ў друкарні", "Скарына ў рабочым кабінеце", "Каліноўскі і Урублеўскі на аглядзе паўстанцаў" і інш.

Пейзажы "Сум", "Зімовая казка" і інш. у лірычным святле паказваюць прыгажосць беларускай прыроды. У яго манументальных работах "Шляхам жыцця", "Насустрач буры", "Праз навальніцу", "У партызанскай кузні", "Рабочыя", "А хто там ідзе?", "Веснавая сяўба", "Дажынкі" і інш. выказаны роздум аб няпростым гістарычным лёсе беларускага народа. П. Сергіевіч займаўся сцэнаграфіяй, ілюстраваў кнігі (напрыклад, два паэтычныя зборнікі М. Машары). У сваёй працы мастак карыстаўся дэвізам Ф. Рушчыца: "Праўда і харство". Творчаму почырку П. Сергіевіча ўласцівы шчырасць, прастата выяўленчай манеры, гарманічнасць колераў. Многія з яго твораў эпічныя, аналітычныя, вызначаюцца тонкім веданнем псіхалогіі. У іх закрануты складаныя філасофскія праблемы. Пра жыццё і творчасць мастака даследчыкам А. Лісам напісаны грунтоўны нарыс.

Творы П. Сергіевіча захоўваюцца ў шматлікіх мастацкіх музеях свету.

Святлана Сачанка

Сеўрук Людвіг

Сеўрук Людвіг Сцяпанавіч *(1807, б. маёнт. Канстанцінава Рэчыцкага пав. Мінскай губ., па цяперашняму адм. дзяленню месца не ўстаноўлена – 21.6.1852, Масква), вучоны-медык, педагог, прафесар Маскоўскага універсітэта.*

Нарадзіўся ў дваранскай сям'і. Пачатковую адукацыю атрымаў дома. На працягу сямі гадоў вучыўся ў Трашкунскім вучылішчы ордэна бернардзінцаў, якое належала да Віленскай навучальнай акругі. У 1823 г. паступіў на юрыдычны факультэт Віленскага універсітэта. У 1824 г. перайшоў на фізічнае, потым на філалагічнае аддзяленне

універсітэта. У 1827 г. быў прыняты на "казённы кошт" на медыцынскае аддзяленне Віленскага універсітэта, якое скончыў у 1831 г. са ступенню кандыдата навук. Першыя практычныя веды па абранай спецыяльнасці атрымаў яшчэ ў студэнцкія гады. За поспехі ў анатоміі і падрыхтоўку спеыяльных прэпаратаў рэктарам Віленскага універсітэта У. Пеліканам на 4-м курсе навучання быў прызначаны памочнікам патолагаанатама.

У 1831 г., пасля заканчэння універсітэта, Л. Сеўрук быў прызначаны ардынатарам у ваенны шпіталь у Вільні. У 1832 г. атрымаў ступень урача і дазвол на абарону дысертацыйнай працы на ступень доктара медыцыны без папярэдняй здачы адпаведных экзаменаў. У тым жа годзе зацверджаны памочнікам празектара анатоміі Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі. З 1834 г. выкладчык паталагічнай анатоміі ў Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі. Першым распрацаваў адпаведны курс ў Медыка-хірургічнай акадэміі, які паспяхова выкладаў тут да 1840 г. У 1835 г. быў абраны на пасаду ад'юнкта. Адначасова ў 1833 г. працаваў аператарам і акушэрам ў віленскай яўрэйскай клініцы. У 1838 г. атрымаў ступень доктара медыцыны. З 1840 г. Л. Сеўрук — выконваючы абавязкі ардынарнага прафесара, а з 1840 г. — ардынарны прафесар па кафедры анатоміі Маскоўскага універсітэта. Чытаў ва універсітэце курс лекцый па практычнай анатоміі, вёў практычныя заняткі са студэнтамі. Адначасова працаваў урачом пры дзвюх маскоўскіх бальніцах — Марыінскай і для чорнарабочых. У 1848 г. быў прызначаны дэканам медыцынскага факультэта Маскоўскага універсітэта.

Навуковыя даследаванні Л. Сеўрука былі сканцэнтраваны на вывучэнні ўплыву медыкаментаў на арганізм чалавека і жывёлы, праблемам дыягностыкі, лячэння і прадухілення вірусных хвароб. Аўтар прац "Аб сутнасці халеры" (1849), "Аб уздзеянні маслянай кіслаты на жывы арганізм" (1852), "Прапіламін пры рэўматызме" і інш., артыкулаў у дадатку да перакладу "Настаўленне па анатамапаталагічнай анатоміі і дыягностыцы" (1853) і інш. Выбраны ў 1838 г. членам Імператарскага Віленскага медыцынскага таварыства. З 1844 г. — член Варшаўскага, з 1850 г. — Шведскага таварыства ўрачоў.

Вольга Гапоненка

Сівуха Віктар

Сівуха Віктар Сцяпанавіч *(18.11.1951, в. Роўнае Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.), мастак.*

У 1983 г. В. Сівуха скончыў Ленінградскае вышэйшае мастацка-прамысловае вучылішча імя В. Мухінай па спецыяльнасці тэкстыль. Працуе мастаком у Доме мод у Санкт-Пецярбургу. Член аб'яднання мастакоў-беларусаў Балтыі "Маю гонар", Саюза мастакоў Расіі, член Таварыства свабодных мастакоў Санкт-Пецярбургу, — працуе ў тэхніцы аплікацыі з тканіны. З'яўляецца ўдзельнікам многіх мастацкіх выставак. Творы В. Сівухі знаходзяцца ў музейных зборах і прыватных калекцыях Расіі, Беларусі, ЗША, Польшчы і інш. краін.

Ларыса Языковіч

Сілівончык Анатоль

Сілівончык Анатоль Паўлавіч *(4.5.1957, в. Гамза Светлагорскага р-на Гомельскай вобл.), дзеяч беларускай дыяспары ў Расіі, прадпрымальнік, мецэнат.*

А. Сілівончык скончыў Мікалаеўскую сярэднюю школу Светлагорскага р-на і Бабруйскі аўтатранспартны тэхнікум (1976), вучыцца ў Маскоўскай акадэміі народнай гаспадаркі пры Урадзе Расійскай Федэрацыі. У 1976–1978 гг. служыў у арміі. У 1978 г. пераехаў на сталае жыхарства ў Расію, у Сургут Цюменскай вобл. Працоўную дзейнасць у Сібіры пачынаў шафёрам на нафтавых распрацоўках. У 1987 г. стварыў прыватнае прадпрыемства. Далучыўшыся да беларускага руху, у снежні 1992 г. удзельнічаў у Сходзе беларусаў блізкага замежжа — першым зборы беларускай дыяспары на радзіме, які арганізавала Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына". Быў дэлегатам Першага з'езду беларусаў свету ў ліпені 1993 г., дзе яго выбралі ў склад Рады ЗБС "Бацькаўшчына". У ліпені 1997 г. на Другім з'ездзе беларусаў свету паўторна абраны ў склад Рады. Стаў адным з ініцыятараў стварэння ў ліпені 1993 г. грамадскай арганізацыі — Рады прадпрымальнікаў беларускага замежжа, быў абраны намеснікам яе кіраўніка.

У 1993 г. ад Згуртавання "Бацькаўшчына" прызначаны адказным за выкананне праграмы па адраджэнню вобраза духоўнай святыні беларускага народа — Крыжа св. Ефрасінні Полацкай. Многае зрабіў, каб праграма была выканана паспяхова, каб адроджаны Крыж заняў належнае яму месца ў царкве Спаса ў Полацку. Адначасова стаў галоўным фундатарам праграмы.

Вядомы ў Беларусі і па-за яе межамі сваёй дабрачыннай дзейнасцю, падтрымкай беларускай культуры. Аказваў фінансавую дапамогу ў выданні беларускіх кніг, дапамагаў у фінансаванні Першага і Другога з'ездаў беларусаў свету, інш. мерапрыемстваў. Аплаціў выданне кнігі "Жыватворны сімвал Бацькаўшчыны" і вытворчасць дакументальнага фільма "Шлях да святыні" (пра Крыж св. Ефрасінні), якія выйшлі ў 1998 г. Купіў для жыхароў роднай вёскі аўтобус. Быў адным з ініцыятараў стварэння ў 1997 г. грамадскай арганізацыі "Міжнародны

дабрачынны Фонд Жыватворнага Крыжа св. Ефрасінні Полацкай", зарэгістраванай 29 кастрычніка 1997 г. Пасля абрання прэзідэнтам Фонду стаў яго асноўным ахвярадаўцам.

За паспяховую работу па аднаўленню вобраза Крыжа св. Ефрасінні ўзнагароджаны Маскоўскім патрыярхатам ордэнам Святога Роўнаапостальнага князя Уладзіміра.

Жыве і працуе ў г. Сургуце, але часта наведвае Беларусь, каб працягваць грамадскую працу на карысць Бацькаўшчыны.

Ганна Сурмач

Скарджус Вінцас

Скарджус (Скардзіс) Вінцас *(псеўд. В. Віскарас; 2.4.1897, Сафейск Магілёўскага пав. і губ., цяпер Магілёўскага р-на і вобл. — 15.2.1967, Вільнюс), літоўскі, беларускі і рускі паэт, публіцыст.*

В. Скарджус нарадзіўся ў сялянскай сям'і літоўцаў-перасяленцаў. Скончыў педагагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1926). Настаўнічаў у г. Талачыне Віцебскай вобл. У 1930–1937 гг. — навуковы супрацоўнік Інстытута нацыянальных меншасцей АН БССР. У 1938 г. быў высланы ў Казахстан. У 1939–1958 гг. — на адміністрацыйнай рабоце ў Кустанайскай вобл. У 1957 г. рэабілітаваны. Напісаў публіцыстычныя творы "Нацыянальна-культурнае будаўніцтва сярод літоўскіх працоўных у Савецкай Беларусі" (1932, на рус. мове) і "Літоўцы ў Савецкай Беларусі" (1935, на бел. мове). У літоўскім і беларускім перыядычным друку публікаваў вершы, артыкулы пра культуру, быт і фальклор літоўцаў у Беларусі. У перыядычных выданнях Кустаная змяшчаў вершы на рускай мове. У 1961 г. у Вільнюсе выйшла кніга вершаў В. Скарджуса "Дарогамі змагання". У яго паэзіі пераважаюць вобразы і тэмы сельскага, калгаснага жыцця.

Яніна Кісялёва

Смоліч Уллян

Смоліч Уллян Яўгенавіч *(3.10.1922, в. Воўчая Гара Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.), геолаг, журналіст.*

Нарадзіўся У. Смоліч у сям'і служачага. У 1940 г. скончыў 9 класаў СШ ў г. Рэчыцы і паступіў у Архангельскае ваенна-інжынернае вучылішча, якое скончыў у ліпені 1941 г. Да снежня 1941 г. служыў камандзірам сапёрнага узвода 866 стралковага палка, адкуль быў накіраваны ў тыл ворага і знаходзіўся у складзе партызанскага атрада імя Будзённага брыгады імя Варашылава Гомельскага паўднёвага злучэння (камандзір узвода, роты, дыверсійна-падрыўной групы). У 1943 – 1945 гг. служыў у органах дзяржаўнай бяспекі. У 1948 г. выехаў у Магадан, дзе скончыў курсы горных майстроў і пачаў працаваць горным майстрам, затым геолагам на шахце "Маршальская". Быў карэспандэнтам газеты "Северная Заря" (п. Усць-Нера Аймяконскага р-на ЯАССР). Там жа друкаваліся яго ўспаміны з партызанскага мінулага ў Беларусі. Узнагароджаны ордэнам і медалямі.

Алесь Баркоўскі (Якуцк)

Снарская Іна

Снарская Іна Станіславаўна *(7.3.1965, Полацк), інжынер-будаўнік, журналіст, паэтэса. Дзеяч беларускай дыяспары на Украіне.*

Скончыла Полацкую СШ № 3 і Наваполацкі політэхнічны інстытут і атрымала дыплом інжынера-будаўніка. Пасля заканчэння інстытута (1987) тры месяцы працавала ў Маладзечна, выйшла замуж за ўкраінца і пераехала на Украіну, дзе спынілася на сталае жыццё ў г. Палтаве. Два гады працавала па спецыяльнасці на кафедры жалезабетонных канструкцый Палтаўскага тэхналагічнага універсітэта, але, маючы творчую натуру, занялася журналістыкай.

Пісаць у розныя беларускія выданні Снарская пачала яшчэ ў 8-м класе ў Полацку. На журналісцкай працы Снарская пачынала рэкламным агентам выдавецтва "Криниця" ("Крыніца"), потым намеснікам рэдактара часопіса "Бізнес-клуб", рэдактарам аддзела на канале камерцыйнага тэлебачання "ЮТА–ТВ". Сёння яна — прэс-сакратар Палтаўскага абласнога цэнтра сацыяльных служб для моладзі. Снарская працяглы час супрацоўнічае з дзяржаўным абласным тэлебачаннем "Палтава", яе допісы, вершы рэгулярна друкуюцца ў палтаўскіх газетах "Приватна справа", "Молода громада", у кіеўскіх газетах "Закон і бізнес", "Молодь України". У Беларусі і Украіне Снарская добра вядома як таленавітая паэтка, а першы верш (на рускай мове) напісала на 4-м курсе інстытута. У той час (1986) яна наведвала Наваполацкае літаратурнае аб'яднанне "Крыніца", якім кіраваў Уладзімір Арлоў. Побач з ёю былі такія неардынарныя асобы, як С. Сокалаў-Воюш, В. Аксак, Н. Гальпяровіч, І. Жарнасек, Л. Баршчэўскі,

мастакі С. і Р. Цімохавы. Ёй было ў каго павучыцца майстэрству вершаскладання, беларускай мове, беларускасці. "Крыніца" адыграла вызначальную ролю ў яе творчым станаўленні, у станаўленні нацыянальнай свядомасці, хаця любоў да беларускай мовы ў яе была ад бабулі, у якой яна гадавалася да першага класа. Ды й маці была выкладчыцай беларускай мовы і літаратуры, у хатняй бібліятэцы было шмат кніг славутых беларускіх паэтаў і празаікаў.

Першыя вершы І. Снарскай з'явіліся ў полацкай газеце "Сцяг камунізму". Потым былі вершаваныя падборкі ў наваполацкім "Хіміку", а ў 1987 г. яе вершы пабачылі свет ў часопісе "Маладосць". Ахвотна друкавалі І. Снарскую на сваіх старонках "Беларусь", "Першацвет", "Полымя", "Крыніца", "Край". А на Украіне яе вершы можна пабачыць у "Палтаўскай думцы", "Маладой грамадзе", "Моладзі Украіны" (у верасні 1997 г. самая папулярная маладзёжная газета Украіны надрукавала вершы Іны ў арыгінале, па-беларуску).

У 1994 г. у сталіцы Беларусі выйшаў першы паэтычны зборнік І. Снарскай "Пацеркі", які адразу прыцягнуў увагу як крытыкаў літаратуры, так і аматараў паэзіі. А ў 1997 г. у Кіеве 13 вершаў Іны Снарскай ўвайшлі ў калектыўную трохтомную анталогію выбранай паэзіі "На нашай, на сваёй зямлі". Чарговы зборнік паэзіі "Пачакай, мая птушка" выйшаў у 1998 г. Прынята ў Саюз журналістаў Украіны, у 1998 г. стала сябрам Саюза пісьменнікаў Беларусі. Выхоўвае сына Уладзіка.

Снарская — кіраўнік беларускага культурна-асветнага асяродка ў Палтаве, які мае паэтычную назву "Агніца". Галоўная задача "Агніцы" — не даваць беларускім палтаўчанам забыцца пра родную зямлю, мову, гісторыю. Бярэ актыўны ўдзел у рабоце ЗБС "Бацькаўшчына", была дэлегатам абодвух з'ездаў, абрана ў Вялікую раду ЗБС "Бацькаўшчына".

Пятрусь Капчык (Ізяслаў, Украіна)

Сосна Грыгорый

Сасна Грыгорый Афанасьевіч *(30.4.1939, в. Шэрні Бельска-Падляшскага пав. Беластоцкага ваяв., Польшча), беларускі рэлігійны і грамадскі дзеяч у Польшчы.*

У 1963 г. скончыў Хрысціянскую тэалагічную акадэмію ў Варшаве. У 1966 г. атрымаў ступень магістра багаслоўя. Працаваў святаром у населеных пунктах Кодэнь і Капытаў (1960–1964), Сямяцічы, Рогаўка і Цеханавец (1964–1987), з 1987 г. настаяцель прыхода ў Рыбалах, Паўлах і Войшках. Займаецца гісторыяй праваслаўнай царквы ў Польшчы, бібліяграфіяй ўсходняга хрысціянства, польскамоўнага друку аб Беларусі. Аўтар грунтоўнага даследавання "Бібліяграфія праваслаўных прыходаў на Беласточчыне" (Беласток, 1984–1992; Рыбалы, 1991–1993. Ч. 1–4), у якім разглядае гісторыю праваслаўнай царквы на Беласточчыне, постаці праваслаўных царкоўных дзеячаў гэтага краю, адносіны польскіх дзяржаўных улад да праваслаўнай царквы ў Польшчы ўвогуле і на Беласточчыне ў прыватнасці. Надрукаваў працы "Праваслаўная царква на Беласточчыне і адносіны да яе ўлад II Рэчы Паспалітай: Выбраныя дакументы (1928–1939)" (Рыбалы, 1991), "Дзейнасць царквы ў Бельску-Падляшскім" (у сааўтарстве з Д. Фёнікам, Беласток, 1995), "Нацыянальныя і рэлігійныя справы і адносіны да іх польскай дзяржавы: Зб. дакументаў (1944–1948)" (Беласток, 1996) і інш. Аўтар артыкулаў у часопісах "Wiadomosci Polskiego Autokefalicznego Kościola Prawoslawnego", "Cerkowny wiestnik", "Przegląd Prawoslawny", "Беларускі каляндар", "Rocznik Teologiczny", "Праваслаўе ў Беларусі і ў свеце" і інш. Сябра Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў (МАБ), удзельнік навуковых канферэнцый у Беластоку, Варшаве, Мінску, Гродне, Брэсце, Вільнюсе і інш.

Узнагароджаны сярэбраным знакам "Заслужаны Беласточчыне" (1984), сярэбраным Крыжам заслугі ПНР (1985), медалём імя кн. Канстанціна Астрожскага, прысвоенага рэдакцыяй штомесячніка "Przegla d Prawoslawny" (1993), ордэнам св. Марыі Магдалены II ступені (1995).

Ларыса Языковіч

Стальмаховіч Міхаіл

Стальмаховіч Міхаіл Ігнатавіч *(1830, Мсціслаўль Магілёўскай губ., цяпер Магілёўская вобл. – 1870, Харкаў), правазнавец. Прыват-дацэнт Харкаўскага універсітэта.*

Нарадзіўся М. Стальмаховіч у сям'і дробнага чыноўніка. Пачатковую і сярэднюю адукацыю атрымаў у Мсціслаўлі і Магілёве. У 1852 г. скончыў юрыдычны факультэт Харкаўскага універсітэта (вучыўся за кошт Магілёўскага Прыказа грамадскага апекавання) са ступенню кандыдата. У 1854 г. здаў экзамен на ступень магістра дзяржаўнага права і ў 1861 г. абараніў дысертацыю "Погляд на развіццё і сучасны стан фінансавай навукі". У 1862 г. па хадайніцтву факультэта быў зацверджаны выкладчыкам на кафедры законаў аб дзяржаўных павіннасцях і фінансах. З кастрычніка 1862 г. — прыват-дацэнт па кафедры фінансавага права. У сувязі з хваробай ў 1868 г. прыпыніў выкладчыцкую дзейнасць.

Навуковыя даследаванні М. Стальмаховіча прысвечаны гісторыі і практычным пытанням грамадзянскага права. Займаўся фінансавым правам.

Вольга Гапоненка

Станкевіч Здзіслаў

***Станкевіч Здзіслаў** (28.11.1929. в. Вялікая Сваротва Навагрудскага пав. Навагрудскага ваяв., цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл.), педагог, гісторык*

З. Станкевіч нарадзіўся ў беларускай сям'і. Бацька служыў у паліцыі, маці працавала настаўніцай. Прадзеды з абодвух бакоў былі ўдзельнікамі паўстання 1863 г. Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны застаўся жыць у Польшчы, на Памор'і, дзе працаваў журналістам. У 1959 г. скончыў сацыяльна-педагагічны факультэт Варшаўскага універсітэта. Выкладаў у ліцэі і на настаўніцкіх курсах. Працаваў спецыялістам па грамадскіх сувязях у прамысловасці.

Выйшаўшы на пенсію, З. Станкевіч пачаў вывучаць гісторыю Слонімшчыны. Збірае матэрыялы да манаграфічнай працы пра Слонім міжваеннага перыяду. Артыкулы З. Станкевіча, прысвечаныя гісторыі Слоніма, друкаваліся ў "Слонімскай газеце", з якой ён працягвае супрацоўнічаць. З'яўляецца адным з арганізатараў Універсітэта трэцяга тысячагоддзя ў Шчэціне, потым — у Слупску. Чытае лекцыі па сацыялогіі і філасофіі, закранае тэмы з гісторыі Беларусі.

Жыве ў Слупску.

Ірына Тамільчык

Стахвюк Віктар

***Стахвюк Віктар** (1948, в. Трэсцянка Нарэўскага пав. Беластоцкага ваяв.), паэт, публіцыст, беларускі грамадскі дзеяч у Польшчы.*

В. Стахвюк вучыўся ў беларускім ліцэі ў Бельску-Падлятшскім. Скончыў Політэхнічны інстытут у Беластоку (па спецыяльнасці тэлеаўтаматыка), факультэт беларускай і рускай філалогіі Варшаўскага універсітэта. Вучыўся на двухгадовых курсах у Маскве у Польскай акадэміі навук вывучаў пытанні міжнародных адносін.

В. Стахвюк — адзін з ініцыятараў стварэння Праваслаўнага брацтва імя Кірыла і Мяфодзія ў Польшчы (1989) і Беларускага дэмакратычнага аб'яднання. З 1992 г. уваходзіў у Галоўную раду БДА, з'яўляўся намеснікам старшыні Галоўнай рады. З 1990 г. быў каардынатарам краёвай управы Беларускага дэмакратычнага аб'яднання на Беласточчыне. Актыўна работаў у камісіях Рады беларускіх арганізацый у Польшчы (у камісіі па справах кантактаў з асветнымі ўладамі і інш.). З 1992 г. з'яўляецца прадстаўніком БДА ў Радзе беларускіх арганізацый у Польшчы.

В. Стахвюк — член беларускага літаратурнага аб'яднання ў Польшчы "Белавежа". Яго паэтычныя і публіцыстычныя творы друкуюцца на старонках беларускіх перыядычных выданняў у Польшчы. З'яўляецца сакратаром Галоўнай управы Беларускага грамадска-культурнага таварыства (БГКТ) у Польшчы.

Ларыса Языковіч

Стахіеў Юрый

***Стахіеў Юрый Міхайлавіч** (1934, Орша Віцебскай вобл.), інжынер, член-карэспандэнт Расійскай акадэміі прыродазнаўчых навук.*

Бацька Ю. Стахіева, Міхаіл Канстанцінавіч, працаваў у Оршы галоўным лекарам бальніцы імя Сямашкі, а затым загадваў інфекцыйным аддзяленнем. У 1951 г. Ю. Стахіеў з залатым медалём скончыў Аршанскую сярэднюю школу № 1, а ў 1956 г. на выдатна — Ленінградскую лесатэхнічную акадэмію. Прайшоў шлях ад звычайнага інжынера на льнозаводзе ў г. Энгельсе да члена-карэспандэнта галіновай Акадэміі навук. З 1960 г. жыве ў г. Архангельску, загадвае лабараторыяй круглапільнага абсталявання і інструмента ў Цэнтральным навукова-даследчым інстытуце механічнай апрацоўкі драўніны. Кандыдат тэхнічных наук.

Ю. Стахіеў — аўтар больш 300 апублікаваных навуковых прац і 65 патэнтаў на вынаходніцтвы. Адна з яго манаграфій выключная ў свеце: у ёй абагульнены сучасны стан ведаў пра круглыя пілы. Працы Ю. Стахіева 12 разоў дэманстраваліся на ВДНГ СССР. Цесна супрацоўнічае з Аршанскім інструментальным заводам, куды часта прыязджае. Друкуецца ў "Известиях", "Лесной газете".

З'яўляецца лаўрэатам прэміі Ламаносаўскага Фонду па рэсурсазберагальных тэхналогіях. Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў, медалямі.

Аляксандра Дзедзінец (Орша)

Стрэмінскі Уладзіслаў

Стрэмінскі Уладзіслаў Максімільянавіч *(21.11.1893, Мінск – 25.12.1952, Лодзь, Польшча), мастак, тэарэтык унізма, піянер авангарднага мастацтва ў Польшчы.*

У. Стрэмінскі быў старэйшым з трох дзяцей у сям'і падпалкоўніка Максімільяна і Евы Стрэмінскіх. У 11-гадовым узросце яго аддалі ў Маскоўскі кадэцкі корпус імя Аляксандра II. Затым вучыўся ў Вышэйшым вайсковым інжынерным вучылішчы ў Пецярбургу (1911—1914). Першая сусветная вайна закінула маладога афіцэра-сапёра ў Беларусь. Тут, на фронце, пад мястэчкам Пяршаі ў маі 1916 г. ён быў цяжка паранены: яму часткова ампутавалі левую руку і правую нагу, левае вока амаль страціла зрок. Каля 2 гадоў правёў у шпіталі ў Маскве. Там сустрэў сваю будучую жонку і аднадумца Кацярыну Кобра, якая стала вядомым скульптарам-футурыстам. У 1918 г. У. Стрэмінскі наведаў Першыя дзяржаўныя свабодныя майстэрні ў Маскве. Блізка сыйшоўся з К. Малевічам. Пачынаецца незвычайна бурны і плённы творчы шлях мастака-наватара. Ужо ў 1918 г. яго канструкцыйныя творы дэманстраваліся на выстаўках у Маскве, Разані і Віцебску. Разам з К. Малевічам У. Стрэмінскі абіраецца ў Маскоўскую калегію па справах мастацкай прамысловасці. На пачатку 1919 г. У. Стрэмінскі вярнуўся ў Мінск, працаваў у аддзеле выяўленчага мастацтва Народнага камісарыята асветы. Выступаў арганізатарам авангарднага афармлення горада. Па запрашэнню Смаленскага аддзела асветы ў тым жа годзе пераехаў у Смаленск, выкладаў там у мастацкай школе, супрацоўнічаў з аддзелам РОСТа. Калі 20 красавіка 1920 г. К. Малевіч арганізаваў у Віцебску суполку СНОМАС (УНОВИС), У. Стрэмінскі і К. Кобра сталі яе сябрамі і ўзначалілі філіял СНОМАС у Смаленску. У 1922 г. У. Стрэмінскі з жонкай пакінулі Смаленск і нелегальна перабраліся ў Вільню. Ён стаў першым папулярызатарам рэвалюцыйнага авангарднага мастацтва ў Заходняй Беларусі і Польшчы. Друкаваў у часопісе кракаўскага мастацкага авангарда "Zwrotnica" ("Стрэлка") "Нататкі пра рускае мастацтва". Летам 1923 г. арганізаваў выстаўку новага мастацтва, гуртаваў вакол сябе мастакоў-авангардыстаў і ў 1924 г. выступіў сузаснавальнікам суполкі кубістаў, канструктывістаў і супрэматыстаў "Блок". Але ўжо ў 1926 г. адышоў ад "Блока" і стварыў суполку мастакоў і архітэктараў "Прэзенс". Стварыў першую архітэктурную кампазіцыю. Прымаў удзел у выстаўцы суполкі "Прэзенс". У 1927 г. адбылася першая персанальная выстаўка У. Стрэмінскага ў Варшаве. Яго творы экспанаваліся ў Нью-Йорку, Бельгіі, Галандыі, на Парыжскім восеньскім салоне ў 1929 г. У 1928 г. У. Стрэмінскі апублікаваў сваю тэарэтычную працу "Унізм у жывапісе", дзе вызначыў прынцыпы сучаснага адлюстравання на плоскасці.

З пачатку 30-х гг. У. Стрэмінскі жыў і працаваў у Лодзі. Там у 1932 г. У. Стрэмінскі атрымаў "Мастацкую ўзнагароду г. Лодзі" за вялікія здабыткі ў авангарднай творчасці. Другая сусветная вайна закінула У. Стрэмінскага ў Беларусь. Тут, жывучы ў брата Валяр'яна у Вілейцы, ён стварыў цыкл "Заходняя Беларусь". У маі 1940 г. У. Стрэмінскі з сям'ёй вярнуўся ў Лодзь. Там жыў у цяжкіх умовах фашысцкай акупацыі. І ўсё ж тварыў — з'яўляюцца цыклы малюнкаў — "Дэпартацыя", "Вайна дамам" і самы значны "Танныя, як балота".

У паваеннай Польшчы лёс У. Стрэмінскага склаўся трагічна. Ён дазволіў сабе крытыку метаду сацыялістычнага рэалізму. За гэта мастака пазбавілі работы, выключылі з Саюза мастакоў Польшчы, яго імя імкнуліся выкрасліць з памяці. Хворы на сухоты У. Стрэмінскі памёр у галечы. Яго дачка, якая жыве ў Варшаве, напісала пра бацькоў кнігу "Мастацтва, каханне, нянавісць".

Вацлаў Мацкевіч

Стыркіна Святлана

Стыркіна (дзяв. Пляскач) Святлана Паўлаўна *(1949, в. Кунцы Круглянскага р-на Магілёўскай вобл.), спартсменка.*

С. Стыркіна — чэмпіёнка свету ў эстафетным бегу 4 х 800 м у камандных спаборніцтвах (1976). Заваявала тры залатыя медалі на летніх, зімовых чэмпіянатах СССР і ў эстафеце 4 х 400 м (1977), сярэбраны медаль у час "Кубка Еўропы" ў эстафеце 4 х 100 м (1977), спецыяльны прыз на спаборніцтвах "Залатыя шыпоўкі" ў Браціславе (1978), залаты медаль на чэмпіянаце СССР (1978). Сярод вучняў С. Стыркінай — чэмпіёны свету, Еўропы, Расіі. Заслужаны трэнер СССР. Працуе ў Маскве.

Вацлаў Мацкевіч

Стэповіч Вітаўт Юрый

Стэповіч Вітаўт Юрый *(12.3.1939, Вільня), вучоны, доктар габілітаваны, інжынер электронікі, дзеяч беларускай дыяспары ў Польшчы.*

Бацька В. Стэповіча Ян быў братам беларускага паэта і святара Канстанціна (Казіміра Сваяка) і беларускага дзеяча Альбіна Стэповіча. Ён да 1939 г. з'яўляўся сакратаром акруговага суда ў Вільні. У 1945 г. сям'я пераехала

ў Сопат. У 1963 г. В. Стэповіч скончыў факультэт сувязі Гданьскага політэхнічнага інстытута і адразу пачаў навуковую дзейнасць. Спецыялізаваўся ў фізіцы паўправаднікоў, паўправадніковых дэталяў і інтэграваных сістэм. Цяпер займаецца тэрмічнымі з'явамі ў паўправадніках. Кандыдацкую дысертацыю абараніў у 1975 г., а ў 1985 г. – доктарскую дысертацыю па тэме "Неізатэрмічныя токава-напружаныя характарыстыкі выбраных паўправадніковых элементаў". Аўтар больш за 100 навуковых публікацый і лекцый, выдадзеных на правах рукапісу. Неаднаразова за навуковыя і метадычныя дасягненні ўзнагароджваўся рэктарам Гданьскага політэхнічнага інстытута і міністрам адукацыі Польшчы. У 1989—1993 гг. быў дэканам навучальнага працэсу факультэта электронікі таго ж інстытута, Цяпер – прафесар факультэта электронікі тэлекамунікацыі і інфарматыкі. В. Стэповіч – адзін з заснавальнікаў Беларускага культурнага таварыства "Хатка" ў Гданьску. Разам са стрыечным братам Эдмундам і пры дапамозе таварыства, а таксама Людвікі і Сержука Вітушкаў з Вільнюса ў снежні 1994 г. узнавіў помнік на магіле Альбіна Стэповіча на могілках Роса ў Вільнюсе. Захоўвае эпісталярную спадчыну Казіміра Сваяка і Альбіна Стэповіча.

Лена Глагоўская (Гданьск, Польшча)

Стэфаноўская Міхаліна

Стэфаноўская Міхаліна *(20.11.1855, Гродна — 15.12.1942, Кракаў), біёлаг, фізіёлаг. Член-карэспандэнт Польскай акадэміі навук.*

Пачатковую адукацыю М. Стэфаноўская атрымала ў Гродне. Пасля заканчэння Гродзенскай гімназіі (1872) працавала настаўніцай прыродазнаўства і геаграфіі ў земскай прагімназіі ў Лодзі. У 1883 — 1888 гг. — студэнтка Жэнеўскага універсітэта, дзе вывучала прыродазнаўчыя навукі, у 1889 г. абараніла там дысертацыю і атрымала ступень доктара прыродазнаўства. У 1891 — 1897 гг. мела стыпендыю для пашырэння тэарэтычных ведаў у галіне біялогіі і псіхалогіі ў Сарбонскім універсітэце, адначасова займалася навуковымі даследаваннямі ў навуковых лабараторыях Парыжа. У 1897 — 1906 гг. працавала ў Фізіялагічным інстытуце ў Бруселі. На аддзяленні прыродазнаўчых навук Жэнеўскага універсітэта абараніла ў 1903 г. габілітацыйную дысертацыю па агульнай фізіялогіі. З 1908 г. М. Стэфаноўская ў Польшчы, працавала ў розных навучальных установах. У 1908 — 1912 гг. на Вышэйшых навуковых курсах у Варшаве чытала курс фізіялогіі нервовай сістэмы. У 1912 г. была прызнана дырэктарам жаночай гімназіі імя Э. Ажэшка ў Лодзі. У 1917 — 1921 гг. займалася арганізацыяй першых ў Польшчы спецыяльных школьных класаў для дзяцей з парушэннямі ў развіцці нервовай сістэмы. З 1922 г. — дацэнт, з 1923 г. — прафесар Познаньскага універсітэта, дзе да 1939 г. вяла курс фізіялогіі нервовай сістэмы.

Навуковыя працы М. Стэфаноўскай прысвечаны фізіялогіі нервовай сістэмы, псіхалогіі, псіхаэнергалогіі, фізіялагічнай энергетыцы.

М. Стэфаноўская — другая пасля М. Складоўскай-Кюры жанчына — член Польскай акадэміі навук.

Вольга Гапоненка

Сузін Адам

Сузін Адам *(1800, в. Кулінаўшчына Кобрынскага пав. Гродзенскай губ., цяперашняе месцазнаходжанне не ўстаноўлена – 11.12.1879, Варшава), падарожнік, географ.*

А. Сузін нарадзіўся ў шляхецкай сям'і. З 1819 г. вучыўся ў Віленскім універсітэце. Пасля працэсу над віленскай моладдзю, членаў Таварыства філарэтаў, у 1824 г. у ліку найбольш пакараных быў сасланы салдатам у Орск, а праз 5 гадоў пераведзены ў Арэнбург, дзе адбылася яго сустрэча з сябрамі па універсітэту Тамашом Занам і Янам Чачотам, якія таксама адбывалі ссылку.

У час знаходжання ў Арэнбургу разам з Т. Занам А. Сузін займаўся вывучэннем геалагічнай будовы і расліннага свету навакольнага краю. Па просьбе Дэрпцкага (цяпер Тартускага) універсітэта выконваў кліматалагічныя і метэаралагічныя назіранні. У 1834 г. прымаў удзел у экспедыцыі па Казахстану. Свае назіранні апублікаваў пазней у працы "Экспедыцыя ў кіргізскія стэпы ў 1834 годзе" (Kronika Rodzinna. 1871. №. 17–20, 22–24). Пасля амністыі (1838) А. Сузін пераехаў у Кіеў, а ў 1841 г. вярнуўся ў Вільню. Апошнія гады свайго жыцця правёў у Варшаве, дзе і памёр.

Валерый Ярмоленка

Сулкоўскі Мікалай

Сулкоўскі Мікалай Пятровіч *(12.11.1961, в. Колкі Столінскага р-на Брэсцкай вобл.), прадпрымальнік, беларускі грамадска-культурны дзеяч у Расіі.*

М. Сулкоўскі нарадзіўся ў беларускай сялянскай сям'і. У 1962 г. яна выехала ў Кустанайскую вобл. (Казахстан). Пасля заканчэння прафтэхвучылішча М. Сулкоўскі працаваў механізатарам у Казахстане. Служыў у чыгуначных войсках у Прымор'і (1981–1983). У час вайсковай службы быў узнагароджаны ганаровымі граматамі Прыморскага краю, занесены ў Ганаровую кнігу часці. З 1983 г. жыве ў Новасібірску. Закончыў Новасібірскі інстытут воднага транспарту. Стварыў вытворчую гандлёвую фірму "БелТранссіб". Праводзіць арганізацыйную работу па стварэнню Беларускага гандлёвага дому ў Новасібірску для пашырэння беларускай прадукцыі ў рэгіёнах Сібіры.

М. Сулкоўскі прымае актыўны ўдзел у грамадска-культурным жыцці беларускай дыяспары ў Новасібірску, прапагандуе ідэі захавання беларускай культуры ў Сібіры. Быў адным з ініцыятараў стварэння Рады прадпрымальнікаў беларускага замежжа (1993), мецэнатам праграмы Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына" па стварэнню крыжа, падобнага да крыжа Ефрасінні Полацкай, арганізатарам сустрэчы беларусаў Сібіры ў Новасібірску (1995). Многа зрабіў для фінансавага забеспячэння дзейнасці Новасібірскага аб'яднання "Беларусы Сібіры", старшынёй якога ён выбраны ў 1999 г. З'яўляецца намеснікам прэзідэнта нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў Новасібірска і Новасібірскай вобл. Быў удзельнікам З'езда беларусаў бліжняга замежжа, І і ІІ з'ездаў беларусаў свету.

Узнагароджаны Ганаровай граматай ЗБС "Бацькаўшчына" (1997). Жыве ў Новасібірску.

Уладзімір Галуза (Новасібірск, Расія)

Сухі Павел

Сухі Павел Восіпавіч *(22.7(10.8). 1895, в. Глыбоцкае Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Гомельскага р-на Гомельскай вобл. – 15.9.1975, Масква), авіяканструктар. Лаўрэат Ленінскай прэміі (1968) і Дзяржаўнай прэміі СССР (1943), двойчы Герой Сацыялістычнай Працы (1957, 1965), доктар тэхнічных навук (1940).*

Нарадзіўся П.Сухі ў сям'і настаўніка. У 1905 г. паступіў вучыцца ў Гомельскую гімназію, якую скончыў у 1914 г. з сярэбраным медалём. У тым жа годзе паступіў на матэматычны факультэт Маскоўскага універсітэта, пасля заканчэння першага курса перайшоў у Маскоўскае вышэйшае тэхнічнае вучылішча. З 1916 г. П. Сухі ў арміі, заканчвае школу прапаршчыкаў, прымае ўдзел ў Першай сусветнай вайне. У 1918–1920 гг. працуе выкладчыкам матэматыкі ў школе ў г. Лунінец Брэсцкай вобл., чыгуначнай школе ў Гомелі. Пасля аднаўлення дзейнасці вышэйшых навучальных устаноў Расіі прадоўжыў вучобу ў Маскоўскім вышэйшым тэхнічным вучылішчы (1920), якое скончыў у 1925 г. З 1925 г. працаваў інжынерам-канструктарам у Цэнтральным аэрагідрадынамічным інстытуце імя М. Жукоўскага (ЦАГІ), з 1936 г. — намеснікам начальніка канструктарскага бюро завода доследных канструкцый ЦАГІ, а з 1937 г. — начальнікам канструктарскага бюро завода. У 1939 г. прызначаны галоўным канструктарам і дырэктарам доследнага завода. З 1956 г. — галоўны канструктар авіяцыйнай тэхнікі.

П. Сухі — аўтар больш 50 арыгінальных канструкцый ваенных самалётаў, з якіх 30 пабудаваны і выпрабаваны. Прымаў удзел у праектаванні самалётаў АНТ-3, АНТ-4, АНТ-6, АНТ-9, АНТ-10. Пад кіраўніцтвам А. Тупалева распрацаваў знішчальнік І-4 (АНТ-5), выпрабаванні і серыйная вытворчасць якога былі пачаты ў 1927 г., і І-14 (АНТ-31) (1932—1934). Вядучы канструктар і кіраўнік аддзела па распрацоўцы самалётаў РД (АНТ-25) і "Радзіма" (АНТ-37). Стварыў шматфункцыянальны баявы самалёт Су-2, браніраваны штурмавік Су-6, якія выкарыстоўваліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Пад яго кіраўніцтвам у 1940–1941 гг. створаны доследныя знішчальнікі Су-1, Су-3 і інш. са звычайнымі і камбінаванымі сілавымі ўстаноўкамі з высокімі лётна-тэхнічнымі характарыстыкамі, у 1942–1943 гг. — браніраваны штурмавік Су-6. Адзін са стваральнікаў звышгукавой рэактыўнай авіяцыі. Распрацаваў рэактыўныя самалёты Су-9 з двума рэактыўнымі рухавікамі, знішчальнік-перахватчык Су-15 і інш. з турбарэактыўнымі рухавікамі, звышгукавыя знішчальнікі з стралападобным і трохвугольным крылом. Пад яго кіраўніцтвам быў распрацаваны першы знішчальнік-бамбардзіроўшчык Су-7Б. Прымаў удзел ў распрацоўцы і кіраваў лётнымі выпрабаваннямі бамбардзіроўшчыка Ту-14. На самалётах канструкцыі П. Сухога неаднаразова ўстанаўліваліся рэкорды па працягласці, хуткасці і вышыні палёту. У 1934 г. на самалёце РД (АНТ-25) быў ўстаноўлены сусветны рэкорд па працягласці беспасадачнага палёту, а ў 1936 г. зроблены беспасадачны пералёт Масква – Далёкі Усход (экіпаж пад кіраўніцтвам В. Чкалава). На самалётах Т-431 і Т-405 устаноўлены два сусветныя рэкорды па вышыні (1959, 1962) і два рэкорды хуткасці палёту па замкнёным маршруце (1960, 1962).

П. Сухі быў узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі. У 1975 г. Прэзідыум Акадэміі навук СССР за "найвыдатнейшыя дасягненні ў галіне авіяцыйнай

навукі і тэхнікі" прысудзіў медаль № 1 імя А. Тупалева генеральнаму кантруктару П. Сухому (пасмяротна). Пахаваны ў Маскве, на Навадзевічых могілках. У Гомелі П. Сухому ў 1977 г. устаноўлены бронзавы бюст. Яго імя прысвоена Канструктарскаму бюро (сакавік 1977), Гомельскаму дзяржаўнаму тэхнічнаму універсітэту.

Вольга Гапоненка

Сцяпаненас Повілас

Сцяпаненас Павел (Повілас) *(25.11.1915, в. Красоўшчына Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл. – 12.12.1981, Вільнюс), урач, акушэр-гінеколаг.*

П. Сцяпаненас у 1942 г. скончыў Каўнаскі унзверсітэт. З 1944 г. працаваў на кафедры акушэрства і гінекалогіі Вільнюскага універсітэта, дацэнт (1967), загадчык гэтай кафедры (1969—1979). У 1962 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. Звайміся даследаваннямі хірургічнага лячэння рака маткі, вывучаў пытанні таксікоза цяжарных жанчын. Апублікаваў навуковыя артыкулы па гінекалогіі, а таксама па пытаннях санітарнай асветы. Праводзіў складаныя аперацыі.

Сычэўскі Янка

Сычэўскі Янка *(26.3.1937, в. Стрыкі Бельска-Падляшскага пав. Беластоцкага ваяв., Польшча), педагог, грамадскі дзеяч.*

Я. Сычэўскі паходзіць з беднай сялянскай сям'і. Пасля заканчэння базавай школы вучыўся у Педагагічным ліцэі у Бельску-Падляшскім, дзе пачаў вывучаць беларускую мову. Пасля яго заканчэння ў 1955 г. быў накіраваны на работу ў школу ў Чаромсе Вёсцы, пасля — у Арэшкава. Завочна вучыўся на аддзяленні фізікі ў Настаўніцкай студыі ў Торуні (1955–1959). Скончыў педагагічны факультэт Гданьскага універсітэта. У 1962–1964 гг. працаваў у Гайнаўцы на пасадзе сакратара павятовага праўлення Саюза польскіх настаўнікаў. З 1964 г. у Беластоку выконваў абавязкі дырэктара Дома культуры прафсаюзаў. З 1970 г. працаваў выкладчыкам ў Беластоцкім політэхнічным інстытуце, дзе вёў заняткі па псіхалогіі і сацыялогіі працы, педагагічнай адукацыі студэнтаў і маладых супрацоўнікаў інстытута. Апублікаваў больш за 10 навуковых прац як вынік даследаванняў у галіне педагогікі ВНУ.

Я. Сычэўскі займаецца грамадска-культурнай дзейнасцю. У 1991 г. быў выбраны намеснікам старшыні Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства, у 1993 і 1997 гг. — старшынёй Галоўнага праўлення БГКТ. У 1997 г. на парламенцкіх выбарах, быў выбраны дэпутатам сейма Рэчы Паспалітай III склікання. З 1973 г. — сакратар ваяводскага праўлення Таварыства прыяцеляў сям'і ў Беластоку.

Узнагароджаны многімі польскімі адзнакамі, а ўладамі Рэспублікі Беларусь — медалём Ф. Скарыны.

Ірына Тамільчык

Сэнюх Чэслаў

Сэнюх Чэслаў *(9.7.1930, мяст. Любча Навагрудскага пав. і ваяв., цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл.), перакладчык, паэт, публіцыст.*

Ч. Сэнюх нарадзіўся ў беларускай сям'і. Яго бацькі добра ведалі польскую, украінскую і беларускую мовы, выхоўвалі любоў да іх у сына. Будучы паэт вучыўся ў Любчанскай сямігадовай беларускай школе (1941-1944), дзе авалодаў беларускай і рускай мовамі. Пасля рэпатрыяцыі ў 1950 г. здаў экзамены на атэстат сталасці ў гімназіі № 1 імя Зыгмунта Аўгуста ў Беластоку. Вучыўся ў Варшаўскім універсітэце на рускім аддзяленні філфака (1950-1954).

З 1951 да 1972 г. Ч. Сэнюх працаваў дыктарам і рэдактарам на Польскім радыё. У час работы ў польскай рэдакцыі радыё "Масква" (1965-1969) займаўся перакладамі з усходнеславянскіх моваў. У 1972-1974 гг. рэдагаваў рускамоўны дадатак да польскага штотыднёвіка "Przyjaźń" з урокамі польскай мовы для рускіх чытачоў. У 1975-1988 гг. працаваў у рэдакцыі Варшаўскай кінастудыі дакументальных фільмаў. На працягу 1988-1989 гг. Ч. Сэнюх быў ініцыятарам і галоўным рэдактарам часопіса "Tłumacz" пры Таварыстве польскіх перакладчыкаў, членам якога з'яўляецца з 1983 г. На журналісцкай пенсіі з 1996 г.

Беларускай культурай Ч. Сэнюх пачаў актыўна займацца ў 70-я гг. — працаваў над перакладамі беларускай паэзіі і прозы для часопіса "Literatura radziecka", які выдаваўся ў Маскве. Сярод яго першых перакладаў — верш Я. Купалы "Прарок" (1982), апавяданне Я. Брыля "Хуткі Нёман" (1989). На творчым рахунку Ч. Сэнюха пераклады рамана У. Караткевіча "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" (1989), аповесці В. Быкава "Аблава" (1991), паэм С. Законнікава (1996), а таксама вершаў М. Танка, В. Зуёнка, У. Арлова, С. Адамовіча. Дасканалае валоданне беларускай мовай і здольнасць перакладчыка захаваць дакладнасць арыгінала без парушэння вершаванага рытму

падштурхнулі Ч. Сэнюха да перакладу эпічнай паэмы Я. Коласа "Новая зямля", над якім ён працуе з 1991 г. Выступае з вострымі публіцыстычнымі артыкуламі на беларускія тэмы на старонках перыядычных выданняў "Gazeta Polska", "Obóz", "Czasopis", "Magazyn Literacki", "Наша слова", "Ніва", "Літаратура і мастацтва" і інш.

З 1995 г. Ч. Сэнюх з'яўляецца членам замежнага беларускага ПЭН-клуба. У 1996 г. узнагароджаны прэміяй POLCUL (Аўстралія) за ўклад у развіццё беларускай культуры ў Польшчы. Жыве ў Варшаве. Часта наведвае Беларусь. Актыўна ўдзельнічае ў рабоце Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў.

Юрый Вашкевіч

Сямёнаў Дзмітрый

Сямёнаў Дзмітрый Дзмітрыевіч *(1835, в. Асінаўка Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. – 8(21).3.1902, Пецярбург), рускі педагог.*

Нарадзіўся Дз. Сямёнаў у сям'і настаўніка. У 1843 г. быў прыняты ў Віцебскую ланкастэрскую школу і паспяхова скончыў яе двухгадовы курс. У 1844—1852 гг. вучыўся ў Віцебскай гімназіі, дзе рускую мову выкладаў яго бацька. Пасля заканчэння гімназіі паспяхова вытрымаў экзамен на званне настаўніка павятовых вучылішчаў і стаў выкладчыкам рускай мовы, гісторыі і геаграфіі ў яўрэйскім чатырохкласным вычылішчы ў Віцебску, потым працаваў выкладчыкам у яўрэйскім гандлёва-прамысловым вучылішчы. У 1857 г. быў запрошаны настаўнікам геаграфіі і гісторыі ў 1-ю Пецярбургскую гімназію. Адначасова слухаў лекцыі ў Пецярбургскім універсітэце, каб атрымаць права на выкладанне геаграфіі ў сярэдніх навучальных установах Расіі (экзамен паспяхова вытрымаў у 1859 г.). У 1859 г. запрошаны ў першае ў Расіі вучылішча для жанчын — Марыінскае (у 1862 г. ператворана. ў гімназію). Адначасова працаваў у Таўрычаскай школе, якая рыхтавала настаўнікаў для народных школ. З 1860 г. — у Смольным інстытуце. У 1865 г. адкамандзіраваны Вышэйшымі педагагічнымі курсамі пры ваеннай гімназіі ў Германію і Швейцарыю для вывучэння сістэмы выкладання школьных прадметаў у навучальных установах розных тыпаў. З 1870 г. — дырэктар Кубанскай, а з 1878 г. – Закаўказскай настаўніцкіх семінарый. З 1883 г. — у Пецярбургу, працаваў экспертам гарадскіх школ. Валодаў нямецкай і французскай мовамі.

Дз. Сямёнаў унёс істотны ўклад у распрацоўку пытанняў дыдактыкі пачатковай адукацыі і педагагічную падрыхтоўку настаўнікаў. Аўтар шматлікіх прац па методыцы выкладання геаграфіі. У 1856 г. склаў "Кароткі дапаможнік гандлёва-прамысловай геаграфіі". Аўтар ілюстраванай кнігі для чытання "Дар слова" (1868), якая стала першым наглядным дапаможнікам для практыкаванняў і атрымала шырокае распаўсюджанне ў Расіі ў другой палове XIX ст. Гэтая кніга экспанавалася у 1878 г. ў педагагічным аддзеле на Парыжскай выстаўцы. У 1866 г. выдаў кнігу "Свет у малюнках" – збор тлумачальных тэкстаў да вучэбных карцін па гісторыі і геаграфіі, якія з'яўлялася адзіным у сваім родзе наглядным дапаможнікам для настаўнікаў гімназій. Асобныя пытанні методыкі выкладання геаграфіі ў школах былі разгледжаны вучоным у кнізе "Каментарый да нагляднага навучання па малюнках "Поры года" (СПб., 1880). Першым найбольш поўна распрацаваў методыку гісторыка-геаграфічных экскурсій, напісаў падручнік "Урокі геаграфіі" (у 3 ч., 1864—1969). Аўтар першай у Расіі геаграфічнай хрэстаматыі ("Бацькаўшчыназнаўства" т.1—6) і метадычнага дапаможніка да гэтай хрэстаматыі – "Педагагічныя заўвагі для настаўнікаў" (СПб., 1864). Меў выдатныя арганізацыйныя здольнасці. У 1870 г. узначаліў Кубанскую гімназію, якая намаганнямі Дз.Сямёнава пачала сваю работу ўжо ў 1871 г. Пры гімназіі ім былі створаны дзве школы – эксперыментальная і паказальная, прасемінарыя, жаночыя курсы, пабудаваў спартыўную пляцоўку, увёў абавязковую пазакласную работу з навучэнцамі. У 1874 г. у семінарыі ўпершыню ў Расіі быў падрыхтаваны да друку і выдадзены "Педагагічны штогоднік Кубанскай настаўніцкай семінарыі" для асвятлення перадавога вопыту настаўнікаў гімназій. Пры Закаўказскай семінарыі Дз. Сямёнаў адкрыў азербайджанскае аддзяленне з пачатковым вучылішчам, рускае пачатковае вучылішча, 2-х гадовае падрыхтоўчае аддзяленне. Патрабаваў ад вучняў карэннай нацыянальнасці ведання рускай мовы, а ад навучэнцаў рускай нацыянальнасці – мясцовых моваў. Лічыў, што вывучэнне геаграфіі неабходна пры выхаванні грамадзяніна. Пазнанне Радзімы, народнай гаспадаркі, прыродных багаццяў разглядаў як дзейсны сродак выхавання патрыятызму. У 1880 г. упершыню ва ўмовах Каўказа правёў далёкую гісторыка-краязнаўчую экскурсію, у час якой семінарысты знаёміліся з геалагічнай будовай рэгіёна, праводзілі маршрутныя здымкі, вывучалі гаспадарчыя аб'екты. Быў прыхільнікам геаграфізму, лічыў, што грамадства ў сваім развіцці залежыць ад прыроды, але адначасова ўлічваў і ўплыў чалавека на прыроду. Актыўна падтрымліваў ідэю развіцця ў Расіі жаночай адукацыі. Прымаў актыўны ўдзел у рэформе жаночай адукацыі, распрацоўцы і абмеркаванні ў 1863 г. праекта сярэдняй школы. Вучань і ў будучым сябар К. Ушынскага.

Дз. Сямёнаў быў членам Пецярбургскага педагагічнага таварыства. Узначальваў касу ўзаемадапамогі пры Таварыстве настаўнікаў. Узначальваў Камісію імя К. Дз. Ушынскага пры Музеі ваенных навучальных устаноў. Прымаў удзел у рэдагаванні часопіса "Журнал Министерства народного просвещения" (1860—1861). Быў рэдактарам часопіса "Детское чтение" (1888—1891). Выбраныя творы Дз.Сямёнава па педагогіцы былі выдадзены ў 1953 г. Акадэміяй педагагічных навук СССР асобным выданнем.

Іван Шаруха

Талвінскі Канстанцін

Талвінскі Канстанцін *(7.1.1877, Віцебск – 15.5.1961, Кракаў), геолаг, падарожнік.*

Нарадзіўся К. Талвінскі ў шляхецкай сям'і. Адукацыю атрымаў хатнюю, а вышэйшую — у Швейцарыі (Цюрых, 1904–1910). Да 1914 г. працаваў у геалагічным камітэце Швейцарыі. У 1910–1912 гг. праводзіў геалагічныя даследаванні на востраве Суматра ў Інданезіі, іх вынікі былі апублікаваны ў "Польскім друку" (Кракаў, 1916–1917. №. 2–4). Надрукаваў свае уражанні аб падарожжы па астравах Інданезіі — "Мае пошукі на Суматры" (Кракаў, 1917). У 1920–1929 гг. працаваў дырэктарам Карпацкага нафтагеалагічнага інстытута ў Барыславе, а ў 1930–1939 гг. — у Варшаве. Апошнія гады жыцця правёў у Кракаве. Неапублікаваныя рукапісы К. Талвінскага знаходзяцца ў Музеі Зямлі Польскай акадэміі навук (Варшава).

Валерый Ярмоленка

Талерка Мікалай

Талерка Мікалай Нікандравіч *(4(17).12.1898, мяст. Дагда Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Латвія – 3.4.1984, Даўгаўпілс, Латвія), педагог, культурна-грамадскі дзеяч, паэт.*

Нарадзіўся ў сям'і чыгуначнага службоўца. Пасля сканчэння Лівенгофскага вышэйшага паштовага вучылішча служыў тэлефаністам у дзеючай арміі Заходняга фронту (1916–1917). З 1917 па 1920 г. — паштовы работнік на чыгуначнай станцыі Бальбінова (Індра). У 1920 г. прызваны на службу ў Латвійскую армію (бібліятэкар Відземскага артпалка). У 1921–1922 гг. праслухаў поўны курс Дзяржаўных беларускіх вучыцельскіх аднагадовых курсаў у Дзвінску і да прымусовай адпраўкі на пенсію (падазраваўся ў нядобранадзейнасці) да 1932 г. працаваў настаўнікам Шнёкаўскай, Келаўскай, Кузьмінскай, Вайцюлеўскай беларускіх пачатковых школ. У 1924–1927 гг. наведваў чатырохгадовыя агульнаадукацыйныя летнія настаўніцкія курсы пры Дзвінскай дзяржаўнай беларускай гімназіі, а таксама сельскагаспадарчыя курсы (яго ўласная хутарная сядзіба — як узорная — адзначана ордэнам Латвійскай дзяржавы).

Быў сябрам Таварыства беларускіх вучыцялёў і Беларускага навукова-краязнаўчага таварыства. Збіраў фальклор беларусаў Латгальскага краю, цікавіўся археалогіяй, нумізматыкай, філатэліяй. Фотаздымкамі М. Талеркі аздабляліся беларускія і латышскія выданні. У 1925–1935 гг. актыўна друкаваўся ў беларускай прэсе, дзе змяшчаў нататкі, допісы, фальклорныя запісы, вершы (вядома каля трыццаці псеўданімаў).

Вершы і прозу пачаў пісаць у 15-гадовым узросце. Пад многімі творамі на рускай мове пазначана месца іх напісання: Дагда, Лівенгоф (Ліваны), Дрыса, Браслаў, Бальбінова, Юльянова, Белае. Адзін з вершаў надрукаваны ў газеце Смаленскай акругі "Голос" (7.11.1918).

Часопіс "Беларуская школа ў Латвіі" (люты 1927) паведамляў, што М. Талерка "...выпусціў першы друкаваны на пішучай машынцы зборнік сваіх вершаў пад назовам "Адгукі Сяродкі". Рэцэнзуючы 26 змешчаных там вершаў, рэдактар часопіса так ацэньваў іх: "Матывы высокаграмадзянскія пераплятаюцца ў М. Талеркі... з матывамі асабістых перажыванняў. І ў тых, і ў другіх вершах малады паэта шчыра вылівае сваё пачуццё і думку. Піша ён заўсёды з натуры, адгукаючыся на запраўдныя рэальныя здарэнні. Элемент фантастычнасці, прыдуманасці і штучнасці ў аўтара адсутны. У гэтай шчырасці пачуццяў і адгукаў на штодзённае жыццё галоўная адзнака творчасці М. Талеркі".

З "Адгукаў Сяродкі" толькі шэсць твораў былі надрукаваны ў калектыўным зборніку вершаў Гуртка маладых беларускіх паэтаў "Першы крок" (Рыга. 1926. Выданне "Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў у Дзяржаўны Сейм, павятовыя, гарадскія і валасныя самаўрады ў Латвіі").

Ва ўспамінах Э. Вайвадзіша, калегі М. Талеркі, згадваецца: "Ён меў схільнасці да культурна-асветніцкай работы. У свой час ладзіў спектаклі, развіваў школьную самадзейнасць. У Індры, напрыклад, арганізаваў дзіцячую беларускую трупу. Адна з пастаўленых ім п'ес — "Цар Максімільян"... У Індры М. Талерка працаваў настаўнікам у 1940–1941, 1942–1944 гг. Пасля вайны і да паўторнага выхаду на пенсію ў 1960 г. быў настаўнікам Індраўскай рускай школы (у 1952 г. скончыў курсы ўдасканалення).

У апошнія гады жыцця поўнасцю аддаўся жывапіснай творчасці. У спадчыне М. Талеркі многа алейных работ, прысвечаных прыродзе роднай Латгаліі, на жаль, вялікая калекцыя шкляных фотанегатываў прапала. Частку архіва бацькі перадаў Беларускаму дзяржаўнаму архіву-музею літаратуры і мастацтва яго сын Дзмітрый. З паэтычнай спадчынай М. Талеркі чытачы "Голасу Радзімы" пазнаёміліся ў 1993 г. (№ 32, 12 жн.). 22 снежня 1998 г. Таварыства "Беларусь—Латвія" адзначыла ў Мінску 100-гадовы юбілей паэта і педагога. Да гэтай нагоды ў Даўгаўпілсе сябрамі Беларускага таварыства "Уздым" выдадзены паштовы канверт з партрэтам М. Талеркі.

Мікалай Паўловіч, Сяргей Панізьнік

Тамко Ягор

Тамко Ягор Андрэевіч *(3.8.1935, в. Ляонаўцы Дзісенскага пав. Віленскага ваяв., цяпер Міёрскі р-н Віцебскай вобл.), ваенны дзеяч, віцэ-адмірал. Герой Савецкага Саюза.*

У 1953 г. Я. Тамко закончыў сярэднюю школу ў Міёрах. З 1954 г. — на службе ў Ваенна-Марскім флоце. У 1954–1958 гг. вучыўся ў Вышэйшым ваенна-марскім вучылішчы імя Фрунзе ў Ленінградзе. Пасля заканчэння вучобы служыў на Паўночным і Балтыйскім флотах на падводных лодках. У 1967–1973 гг. служыў камандзірам атамнай падводнай лодкі, у 1973–1977 гг. — начальнік штаба дывізіі атамных падводных лодак, у 1978–1984 гг. — камандзір гэтай дывізіі. У 1984 г. закончыў Ваенна-марскую акадэмію імя адмірала Кузняцова. З 1984 г. да 1992 г. працаваў начальнікам Вышэйшага ваенна-марскога вучылішча падводнага плавання імя Ленінскага камсомала. У маі 1992 г. звольнены ў запас. Цяпер працуе ў Навукова-даследчым інстытуце Ваенна-Марскога флота Расіі — дацэнт, старшы навуковы супрацоўнік. Займаецца грамадскай дзейнасцю: намеснік старшыні Савета Герояў Савецкага Саюза, Герояў Расіі і поўных кавалераў ордэна Славы Санкт-Пецярбургу і Ленінградскай вобл. Узнагароджаны ордэнамі і медалямі.

Мікалай Нікалаеў (Санкт-Пецярбург, Расія), Ларыса Языковіч

Тарасэвіч Лявон

Тарасэвіч Лявон *(14.3.1957, станцыя Валілы Беластоцкага ваяв., Польшча), беларускі і польскі мастак.*

Л. Тарасэвіч нарадзіўся ў рабочай сям'і. Вучыўся ў ліцэі выяўленчага мастацтва ў Супраслі. У 1984 г. скончыў Акадэмію прыгожых мастацтваў у Варшаве. Дыпломную работу абараніў у майстэрні праф. Тадэвуша Дамініка. Першая выстаўка яго твораў адбылася ў 1984 г. у Варшаве. Л. Тарасэвіч стала супрацоўнічае з варшаўскай галерэяй "Фоксаль", а таксама з галерэямі ў Германіі і Швецыі. У 1985 – 1999 гг. яго творы экспанаваліся таксама ў Беларусі, Італіі, Вялікабрытаніі, ЗША, Ізраілі, Венгрыі і шматлікіх гарадах Польшчы. Ён адзін з самых вядомых сучасных мастакоў Польшчы. Наватарскія творы Л. Тарасэвіча сведчаць пра ўменне бачыць, асэнсоўваць і абагульняць прыроду. Таму па жанру яны бліжэй за ўсё да своеасабліва зразуметага пейзажу. Абапіраецца на праваслаўныя і беларускія традыцыі.

У 1998 г. Л. Тарасэвіч стаў лаўрэатам прэстыжнай прэміі імя Яна Цыбіса. Выкладае ў Акадэміі прыгожых мастацтваў у Варшаве, стварыў там Гасцінную майстэрню жывапісу. Ілюструе творы беларускіх пісьменнікаў Беласточчыны, найперш Сакрата Яновіча. Выдае на радзіме беларуска-польскі часопіс "Гарадоцкія навіны". Жыве і працуе ў Валілах на Беласточчыне, дзе стварыў унікальны культурны цэнтр. Выстаўляе там творы мастацтва, разводзіць экзатычныя птушкі.

Юрый Вашкевіч

Ткачэнка Марыя

Ткачэнка Марыя Іванаўна *(2.8.1955, в. Селішча Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл.), гісторык мастацтва. Унучатая пляменніца беларускага мастака Я. Драздовіча.*

Скончыла Мінскі інстытут замежных моваў (1979), аспірантуру пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР (1988). З 1979 г. жыве ў Ленінградзе (Санкт-Пецярбургу). Працуе ў замежным кніжным фондзе Расійскай нацыянальнай бібліятэкі. Даследуе гісторыю беларускага мастацтва, гравюру Беларусі XVI–XVIII стст. Удзельніца шматлікіх канферэнцый па гісторыі мастацтва і культуры Беларусі, у тым ліку Заслаўскіх чытанняў, канферэнцый Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі ў 1990, 1994 і 1996 гг., Другога Міжнароднага кангрэса беларусістаў (1995), штогадовых канферэнцый "Санкт-Пецярбург і беларуская культура" (з 1993) і інш.

М. Ткачэнка з'яўляецца аўтарам шматлікіх публікацый і артыкулаў у часопісах "Мастацтва Беларусі", "Vieda", зборніках "Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння" (Мн., 1994), "Матэрыялы да 100-годдзя з дня нараджэння Міколы Шчакаціхіна. 1896–1940" (Мн., 1996), "Беларусіка 6. Беларусь паміж Усходам і Захадам. Ч. 1" (Мн., 1997) і інш. Увяла ў навуковы ўжытак невядомыя творы Т. Макоўскага, Г. Ляйбовіча, віленскіх гравёраў XVII ст. З'яўляецца членам Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу.

Мікалай Нікалаеў (Санкт-Пецярбург, Расія), Ларыса Языковіч

Ткачэнка Сяргей

Ткачэнка Сяргей Вітальевіч *(10.5.1954, в. Емяльянаўка каля Чарнобыля на Украіне), мастак. Дзеяч беларускай дыяспары ў Расіі.*

У 1988 г. скончыў Ленінградскі інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І. Рэпіна. З 1991 г. з'яўляецаа членам Санкт-Пецярбургскага аддлязення Саюза мастакоў Расіі. З 1993 г. ганаровы член Беларускага творчага аб'яднання "Пагоня". Значнае месца ў творчасці С. Ткачэнкі займае беларуская тэматыка. Працуе ў жанрах партрэту, пейзажу, нацюрморту. Аўтар партрэтаў вядомых дзеячаў беларускай культуры — С. Станюты, В. Быкава, Р. Барадуліна, А. Марачкіна, М. Нікалаева (усе 1993), М. Ткачэнка (1990) і інш. Адметнасцю кампазіцыі, тонкім каларытам, багатым зместам вызначаюцца нацюрморты С. Ткачэнкі, пейзажы беларускіх мясцін, асабліва з радзімы беларускага мастака, скульптара, археолага Я. Драздовіча. С. Ткачэнка — удзельнік шматлікіх мастацкіх выстаў, у тым ліку Беларускай рэспубліканскай мастацкай выставы 1990 г., выставы твораў мастакоў да Першага з'езду беларусаў свету (1993 г.), штогадовых выстаў беларускага творчага аб'яднання мастакоў "Пагоня" (з 1993). У 1996 г. адбылася персанальная выстава твораў мастака ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі (г. Мінск). Творы С. Ткачэнкі знаходзяцца ў дзяржаўных установах і прыватных калекцыях Расіі, Украіны, Беларусі, Швейцарыі, Англіі, Францыі, Канады, ЗША, Польшчы.

Мікалай Нікалаеў (Санкт-Пецярбург, Расія), Ларыса Языковіч

Трафімук Андрэй

Трафімук Андрэй Аляксеевіч *(16.8.1911, в. Хведкавічы Кобрынскага пав. Гродзенскай губ., цяпер в. Федзькавічы Жабінкаўскага р-на Брэсцкай вобл. – 24.3.1999, Новасібірск, Расія), геолаг-нафтавік, арганізатар навукі, прафесар, дзяржаўны і грамадскі дзеяч. Акадэмік АН СССР (1958, член-карэспандэнт з 1953), акадэмік Расійскай АН (1991). Адзін з заснавальнікаў Сібірскага аддзялення Расійскай акадэміі навук. Лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР (1946, 1950) і Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі (1994), Герой Сацыялістычнай Працы (1944). Ганаровы грамадзянін Новасібірска.*

Нарадзіўся А. Трафімук у збяднелай сялянскай сям'і. У 1933 г. скончыў геалагічны факультэт Казанскага дзяржаўнага універсітэта. Працаваў старшым геолагам, навуковым кіраўніком трэста "Усходнафта" (1934–1940), галоўным геолагам аб'яднання "Башнафта" (1940–1950). У 1950–1953 гг. — галоўны геолаг Галоўнафтаразведкі, у 1953–1957 гг. — намеснік дырэктара, дырэктар Усесаюзнага нафтагазавага навукова-даследчага інстытута. З 1957 г. працаваў у Сібірскім аддзяленні Акадэміі навук СССР (з 1991 г. — Расійскай АН), у 1958–1961 гг. быў намеснікам, з 1961 да 1988 г. — першым намеснікам старшыні Сібірскага аддзялення АН СССР. На гэтай пасадзе ён прыклаў вялікія намаганні для арганізацыі і станаўлення навуковых цэнтраў Сібірскага аддзялення Акадэміі навук у розных сібірскіх рэгіёнах, у вызначэнні і ажыццяўленні стратэгіі развіцця навукі ў Сібіры. Арганізаваў і больш за 30 гадоў, з 1957 да 1988 г., узначальваў Інстытут геалогіі і геафізікі (з 1990 г. — Аб'яднаны інстытут геалогіі, геафізікі і мінералогіі Расійскай АН), з 1988 г. быў ганаровым дырэктарам і галоўным спецыялістам гэтага інстытута. З 1961 г. — член Прэзідыума АН СССР, з 1992 г. — саветнік Прэзідыума РАН.

А. Трафімук — спецыяліст у галіне геалогіі нафты і газу. Ён аўтар больш за 1100 навуковых прац па праблемах фарміравання радовішчаў нафты і газу, павышэння эфектыўнасці пошуку нафты і газаздабычы. Сярод асноўных навуковых прац — кнігі "Нафтагазаноснасць палеазоя Башкірыі" (М., 1950), "Нафтагазаносныя басейны Далёкага Усходу СССР" (М., 1971), "Урала-Паволжа — новая нафтавая база Сібіры" (М., 1975), "Геалогія нафты і газу Заходняй Сібіры" (М., 1975), "Геалогія нафты і газу Сібірскай платформы" (М., 1981), "Праблемы нафты і газу" (М., 1983), "Сорак гадоў барацьбы за развіццё нафтагазавай прамысловасці Сібіры" (Новасібірск, 1998). Стаў першаадкрывальнікам шэрагу буйнейшых радовішчаў Волга-Уральскай нафтагазаноснай правінцыі — т. зв. "другога Баку", якія забяспечылі ў час Вялікай Айчыннай вайны бесперапыннае паступленне нафты на фронт. За гэта А.Трафімук у 1944 г. першым сярод геолагаў СССР быў удастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы. Быў гарачым прыхільнікам пошукаў сібірскай нафты. Яго навуковыя прагнозы пацвердзіліся адкрыццём нафтагазаносных сховішчаў у Заходняй Сібіры, і ўжо некалькі дзесяцігоддзяў тут дзейнічае найбуйнейшы ў Расіі Заходне-Сібірскі нафтавы комплекс. Даказаў вялікія магчымасці выяўлення і асваення новых нафтагазаносных правінцый Усходняй Сібіры. З яго імем звязана адкрыццё невядомай раней прыроднай з'явы — цвёрдага прыроднага газу ў выглядзе газагідратаў, запасы якіх на планеце, па яго ацэнцы, у дзесяткі разоў перавышаюць рэсурсы звычайных газавых радовішчаў. За гэтыя работы А. Трафімук быў удастоены ў 1974 г. прэміі АН СССР імя І. Губкіна, а ў 1994 г. — Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі.

Глыбокая ўпэўненасць А. Трафімука ў неабходнасці найбольш поўнага выкарыстання прыродных багацяў і энергетычных рэсурсаў Сібіры дзеля павышэння эканамічнага патэнцыялу краіны была рэалізавана ў яго рабоце па стварэнню рэгіянальнай навукова-даследчай праграмы "Сібір", навуковым кіраўніком якой ён быў амаль 15

гадоў і вакол якой згуртоўваў навуковыя сілы Сібіры незалежна ад іх ведамаснай падпарадкаванасці. На пасадзе старшыні Навуковага савета па Байкалу ён настойліва абараняў захаванне чысціні унікальнага возера. Абараніў права Новасібірска на будаўніцтва першага ў Сібіры метро.

Унёс значны ўклад ў падрыхтоўку навуковых кадраў геолагаў-нафтавікоў. На працягу 1962–1973 г. узначальваў кафедру карысных выкапняў Новасібірскага дзяржаўнага універсітэта, у 1969 г. быў абраны прафесарам. Шырокае прызнанне ў свеце набыла сібірская школа геолагаў і геафізікаў-нафтавікоў, якую ён стварыў. А. Трафімук цікавіўся геалогіяй Беларусі, асабліва станам нафтавай геалогіі і нафтаздабываючай прамысловасці. Неаднаразова наведваў родную Беларусь, кансультаваў тут многіх вучоных, удзельнічаў у экспертызах, прысвечаных праблемам разведкі нафты на тэрыторыі Беларусі.

А. Трафімук актыўна ўдзельнічаў ў дзяржаўным і грамадскім жыцці. Больш за паўвека працаваў у саветах народных дэпутатаў ва Уфе, Маскве, Новасібірску, быў дэпутатам Вярхоўнага Савета РСФСР 6-га, 7-га, 8-га і 10-га скліканняў, выбіраўся ў партыйныя органы, дэлегатам XXIV, XXVI і XXVII з'ездаў КПСС. Узнагароджаны шасцю ордэнамі Леніна, ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі і Працоўнага Чырвонага Сцяга, шматлікімі медалямі. А. Трафімук выступаў супраць разбуральных працэсаў, што праходзілі ў Расіі апошнім часам, супраць незапатрабаванасці навукі, яе вынікаў дзяржавай. У знак пратэсту адмовіўся прыняць ордэн "За заслугі перад Айчынай", якім ён быў узнагароджаны ў 1998 г.

Наталля Прытвіц (Новасібірск, Расія), Вольга Гапоненка

Траццяк Іван

Траццяк Іван Якаўлевіч *(1884, в. Ракашычы Мінскага пав. і губ., цяпер Уздзенскі р-н Мінскай вобл. — 17.8.1939), удзельнік барацьбы за ўстанаўленне савецкай улады на Алтаі.*

І. Траццяк паходзіў з сям'і селяніна-бедняка. Правучыўся ў школе ўсяго тры зімы. З 14-ці гадоў батрачыў, восем гадоў працаваў лесарубам. У 1904 г. збліжаецца з рэвалюцыйна настроенымі студэнтамі, вядзе агітацыйную работу, прымае актыўны ўдзел у сялянскім руху, выступае супраць руска-японскай вайны. У 1907 г. трапляе пад тайны нагляд паліцыі, уцякае ад праследаванняў за мяжу — спачатку ў Германію, затым — ЗША. Там І. Траццяк працуе на заводах, прымае актыўны ўдзел у рэвалюцыйным рабочым руху, становіцца членам Федэрацыі рускіх рабочых, Камітэта абароны палітычных вязняў (Сан-Францыска). Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Расіі — імкнецца вярнуцца ў Беларусь, каб дапамагчы ўсталяванню новай улады. Праз Японію, Карэю, Кітай, Далёкі Усход і Маньчжурыю з цяжкасцямі ў 1918 г. дабіраецца да станцыі Чарышская ў Горным Алтаі, дзе ў гэты час жылі яго бацька, двое братоў і сястра.

У жніўні 1919 г. горнаалтайскія партызаны прызначылі І. Траццяка камісарам па арганізацыі партызанскага руху ў тыле арміі Калчака. Потым ён становіцца камандзірам Першага коннага партызанскага палка, Першай горнаалтайскай брыгады і, нарэшце, Першай горнаалтайскай партызанскай дывізіі, якая да канца баёў на Усходнім фронце кантралявала ўвесь Горны Алтай. Пасля заканчэння грамадзянскай вайны, з ліпеня 1920 г., жыў у г. Бійску, знаходзіўся на партыйнай і савецкай рабоце.

У 1937 г. быў рэпрэсаваны і "памёр у месцах зняволення". Рэабілітаваны ў 50-я гг.

І. Траццяк узнагароджаны ордэнам Баявога Чырвонага Сцяга. У 1933 г. выйшла яго кніга "Партызанскі рух у Горным Алтаі ў 1919 годзе". На доме ў Бійску, дзе жыў І. Траццяк, устаноўлена ў яго памяць мемарыяльная дошка, а вуліца носіць яго імя.

Вацлаў Мацкевіч

Тураеў Барыс

Тураеў Барыс Аляксандравіч *(23.7.1868, Навагрудак Мінскай губ., цяпер Гродзенскай вобл. – 23.8.1920, Петраград, Расія), усходазнавец, гісторык і філолаг Старажытнага Усходу, эфіопазнавец.*

Нарадзіўся Б. Тураеў у сям'і навагрудскага шляхціца. Сярэднюю адукацыю атрымаў у І-й Віленскай гімназіі. У 1891 г. скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Пецярбургскага універсітэта па спецыялізацыі гісторык-егіптолаг, хаця у час навучання ва універсітэце займаўся егіпецкай, копцкай і семіцкай філалогіяй. Пасля заканчэння універсітэта Б. Тураеў быў накіраваны ў замежную навуковую камандзіроўку ў даследчыя цэнтры Германіі, Францыі, Вялікабрытаніі і Італіі. У 1894 г. (па іншых звестках — у 1896) пачынае навуковую і выкладчыцкую дзейнасць у Пецярбургскім універсітэце: з 1894 г. — прыват-дацэнт, з 1904 г. — экстраардынарны, а з 1911 г. — ардынарны прафесар. У Лейпцыгскім універсітэце ў 1898 г. абараніў магістэрскую дысертацыю па ўсеагульнай гісторыі — "Бог Тот. Спробы даследавання ў галіне старажытнаегіпецкай культуры", а ў Пецярбургскім універсітэце ў 1902 г. — доктарскую дысертацыю "Даследаванні ў галіне агіялагічных крыніц гісторыі Эфіопіі". З 1912 г. і да апошніх дзён Б. Тураеў працаваў захавальнікам знакамітай Галянішчаўскай егіпецкай калекцыі Музея прыгожых

мастацтваў. Менавіта дзякуючы яму калекцыя ў свой час не была прададзена прыватным калекцыянерам.

Б. Тураеў апублікаваў больш за 400 прац. Яго кнігі і артыкулы прысвечаны праблемам егіпталогіі, эфіопеістыкі, семіталогіі, асірыялогіі, шумералогіі, копталогіі, хеталогіі, урартазнаўства і інш. У прыватнасці, Б. Тураеў з'яўляецца аўтарам многіх прац па гісторыі Эфіопіі і гісторыі эфіопскай царквы перыяду сярэдневякоўя: "Monumenta Aethiopiae Hagiologia" (СПб., 1902), "Даследаванне Зара Якаба" (1905), "Абісінскія хронікі XIV–XVI стст." (М; Л., 1936, пераклад з эфіоп.). Яму належыць публікацыя, у якой ахарактарызаваны вартасці хецкай культуры, — "Да гісторыі хецкага пытання" ў "Записках класического отделения Русского археологического общества". (1900. Т. 5). Асвятляліся ім і фінікійскія старажытнасці: "Нарыс гісторыі вывучэння фінікійскай старажытнасці" (Историческое обозрение. 1893. Т. 8).

Вялікай заслугай Б. Тураева было вывучэнне і публікацыя помнікаў (у асноўным старажытнаегіпецкіх) з расійскіх збораў, асабліва з правінцыяльных і прыватных калекцый ("Апісанне Егіпецкага збору Музея прыгожых мастацтваў" СПб., 1911). Адной з апошніх публікацый вучонага быў невялікі артыкул у "Ancient Egypt" у 1917 г. пра выдатны помнік Галянішчаўскай калекцыі — іератычны матэматычны папірус, які выклікаў надзвычайную цікавасць ва ўсім тагачасным навуковым свеце. Пытанням егіпецкай гісторыі былі прысвечаны кнігі "Егіпецкая літаратура" (Пг., 1920); "Старажытны Егіпет" (Пг., 1922). Аднак асноўнай, найбольш важнай працай Б. Тураева лічыцца "Гісторыя Старажытнага Усходу" (СПб., 1911. Ч. 1–2), якая не мела роўных па сваіх геаграфічных і храналагічных рамках ахопу матэрыялу. Па словах даследчыка, яна ўключала гісторыю краін "ад Каўказскага хрыбта і Сярэдняй Азіі да Персідскага заліву, Паўднёвай Аравіі, краін афрыканскіх азёраў, ад межаў Ірана і Індыі да Геркулесавых слупоў". У гэтай працы выразна выявілася тэорыя, якой прытрымліваўся аўтар: геаграфічнае асяроддзе аказвае ўплыў на гістарычнае развіццё краіны. "Гісторыя Старажытнага Усходу" лічыцца адной з лепшых прац еўрапейскага ўсходазнаўства, і менавіта за яе гісторык у 1916 г. атрымаў вялікі залаты медаль Рускага археалагічнага таварыства.

За свае навуковыя дасягненні Б. Тураеў у 1913 г. быў абраны членам-карэспандэнтам, а ў 1919 г. — сапраўдным членам Акадэміі гісторыі матэрыяльнай культуры. На пачатку XX ст. ён актыўна ўдзельнічаў у міжнародных форумах — XV (Капенгаген, 1908) і XVII (Афіны, 1912) кангрэсах усходазнаўцаў.

Вучнямі Б. Тураева былі вядомыя ўсходазнаўцы (І. Крачкоўскі, В. Струве, І. Волкаў, Н. Флітнер), некаторыя з іх — беларускага паходжання.

Віктар Астрога

Тышкевіч Канстанцін

Тышкевіч Канстанцін *(8.3.1915, в. Тарканы Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Калінкавіцкі р-н Гомельскай вобл.), гісторык, кандыдат гістарычных навук (1959), прафесар (1976). Заслужаны дзеяч культуры Літоўскай ССР (1965).*

У 1934–1937 гг. К. Тышкевіч працаваў загадчыкам аддзела ЦК камсамола Беларусі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1949 г. скончыў Вільнюскі універсітэт. У 1948–1956 гг. працаваў выкладчыкам, з 1951 г. — намеснікам дырэктара, з 1953 да 1956 г. — дырэктарам Рэспубліканскай партшколы Літвы. З 1956 да 1978 г. — дырэктарам Вільнюскай вышэйшай партшколы, а з 1978 да 1983 г. — рэктарам гэтай школы. Апублікаваў працы па гісторыі КП Літоўскай ССР і па гісторыі КПСС.

Яніна Кісялёва

Уладыка Аляксандр

Уладыка Аляксандр Дзмітрыевіч *(1933, в. Храны Круглянскага р-на Магілёўскай вобл), вучоны-эканаміст, прафесар.*

А. Уладыка скончыў Цяцерынскую сярэднюю школу, Ленінградскі сельскагаспадарчы інстытут. Працаваў у калгасе "Рассвет" Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл., галоўным аграномам Чэрыкаўскай МТС, першым сакратаром Чэрыкаўскага райкама камсамола. У 1962—1964 гг. аспірант Ленінградскага сельскагаспадарчага інстытута, з 1964 г. намеснік начальніка Ламаносаўскага раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі, першы намеснік начальніка статыстычнага ўпраўлення Ленінградскай вобл. і г. Ленінграда. У 1968 г. атрымаў званне кандыдата эканамічных навук. У 1970—1990 гг. дацэнт кафедры эканомікі і арганізацыі сельскай гаспадаркі Ленінградскай ВПШ, з 1990 г. загадчык кафедры эканомікі і аграбізнесу Акадэміі менеджменту і аграбізнесу Нечарназёмнай зоны Расійскай Федэрацыі.

Вацлаў Мацкевіч

Улашчык Аляксандр

***Улашчык Аляксандр Мікалаевіч** (1.5.1947, Ленінград, Расія), фізік, дзеяч беларускай дыяспары ў Расіі.*

А. Улашчык паходзіў з беларускай сям'і. Яго бацька — вядомы беларускі гісторык, археограф М. М. Улашчык, маці — фізіёлаг, доктар біялагічных навук. Пасля заканчэння ў 1965 г. сярэдняй школы № 151 г. Масквы А. Улашчык вучыўся на фізічным факультэце Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. В. Ламаносава (1965–1972). Працуе старшым іжынерам у Інстытуце высокіх тэмператур Расійскай акадэміі навук. З'яўляецца аўтарам шэрагу вынаходніцтваў у сваёй галіне, пацверджаных аўтарскімі пасведчаннямі.

А. Улашчык актыўна ўдзельнічае ў навукова-асветніцкай, культурнай дзейнасці беларускай дыяспары ў Маскве. Удзельнік установчага сходу, сябра першай Рады Маскоўскага таварыства беларускай культуры імя Ф. Скарыны. Шмат увагі надае захаванню і папулярызацыі навуковай спадчыны свайго бацькі. Апублікаваў часткі яго "Хронікі" (Скарыніч. Мн., 1990. Вып 1; 1991. Вып 2). Спрыяў правядзенню і публікацыі матэрыялаў Міжнароднай канферэнцыі ў Маскве, прысвечанай 90-годдзю М. Улашчыка (Русь — Літва — Беларусь..., М. 1997), падрыхтоўцы да друку твораў М. Улашчыка. А. Улашчык перадаў у рукапісны аддзел Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі архіў свайго бацькі.

Быў дэлегатам I, II з'ездаў Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына".

Аляксей Каўка (Масква)

Улашчык Мікалай

***Улашчык Мікалай Мікалаевіч** (1(14).2.1906, в. Віцкаўшчына Мінскага пав., цяпер Дзяржынскі р-н Мінскай вобл. – 14.11.1986, Масква), гісторык, археограф, празаік, перакладчык. Доктар гістарычных навук.*

М. Улашчык паходзіў з заможных сялян. Продкі яго па бацьку перасяліліся ў Віцкаўшчыну з-пад Навагрудка. Яшчэ ў час вучобы ў школе захапіўся беларускай гісторыяй. Гэта прывяло яго на сацыяльна-гістарычнае аддзяленне педфака БДУ, куды ён паступіў у 1924 г., скончыўшы Мінскую вячэрнюю школу. Актыўна ўдзельнічаў у краязнаўчым жыцці рэспублікі, археалагічных экспедыцыях. Паспяхова скончыўшы ў 1929 г. універсітэт, працягваў рыхтаваць сябе да сур'ёзнай даследчыцкай працы ў галіне беларускай гісторыі. Аднак яго планам не суджана было ажыццявіцца. У 1930 г. быў беспадстаўна рэпрэсіраваны і высланы за межы Беларусі. Спачатку адбываў зняволенне ў Налінску, адзін час выкладаў матэматыку ў мясцовай школе. У верасні 1930 г. быў пераведзены ў Марыінск (Новасібірская вобл.), дзе працаваў справаводам у лагеры, затым у размешчанае побач Суслава. Вызвалены ў пачатку 1935 г., падаўся ў Ташкент, бо вяртацца ў Беларусь было небяспечна, але не змог працаўладкавацца. У пошуках працы пабываў у Вятцы, Горкім і спыніўся ў Іванаве, дзе працаваў выкладчыкам гісторыі ў тэхнікумах сувязі і медыцынскім. Праз год звольніўся. Лета 1936 г. правёў у Быхаве ў свайго сябра, археолага С. Шутава, затым падаўся ва Ульянаўск, дзе год выкладаў геаграфію на рабфаку. Наступныя два гады настаўнічаў у Дзергачах (Саратаўскай вобл.) і Чарапаўцы. Часта пераязджаць з месца на месца М. Улашчыка вымушалі абставіны: былыя палітвязні і ссыльныя лічыліся нядобранадзейнымі, знаходзіліся пад асобым наглядам органаў і нярэдка паўторна траплялі пад машыну рэпрэсій. Летам 1939 г. прыбыў у Ленінград, дзе ў Інстытуце фізіялогіі імя Паўлава працавала яго жонка Наталля Шамарына. Настаўнічаў, паглыбляў веды па роднай і расійскай гісторыі. У чэрвені 1941 г. М. Улашчыка зноў арыштавалі і выслалі ў Златавуст. У снежні 1942 г. быў выпушчаны з турмы як безнадзейна хворы. Падаўся ў Азнакаева (Татарстан) да старшага брата Івана. Крыху акрыяўшы, вясною 1943 г. паехаў у Казань, дзе знаходзілася жонка і куды быў эвакуіраваны з Ленінграда Інстытут фізіялогіі. Яго дырэктар акадэмік Л. Арбелі дапамог М. Улашчыку здабыць пашпарт і паспрыяў паступіць у канцы таго ж года ў аспірантуру пры Інстытуце гісторыі АН СССР (Масква). Спецыялізаваўся па аграрнай гісторыі Беларусі і Літвы XIX ст. У 1947 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. У 1948–1949 гг. — старшы выкладчык Маскоўскага універсітэта. У 1950 г. у трэці раз быў рэпрэсіраваны. Пяць гадоў правёў у Марыінскім лагеры. Вясной 1955 г. вярнуўся ў Маскву і да выхаду на пенсію (1982) працаваў навуковым супрацоўнікам у Інстытуце гісторыі АН СССР. Доктар гістарычных навук.

Друкавацца М. Улашчык пачаў у 1927 г. З'яўляўся высокакваліфікаваным спецыялістам з міжнародным аўтарытэтам у галіне грамадзянскай гісторыі, археаграфіі і крыніцазнаўства Беларусі і Літвы эпохі феадалізму. Аўтар гістарычных манаграфій на рускай мове "Перадумовы сялянскай рэформы 1861 г. у Літве і Заходняй Беларусі" (Мн., 1965), "Нарысы па археаграфіі і крыніцазнаўству Беларусі феадальнага перыяду" (М., 1973). Вылучаўся энцыклапедычнымі ведамі, глыбокай павагай да гістарычных фактаў, навуковай сумленнасцю і аб'ектыўнасцю. За сухімі лічбамі і фактамі гістарычных дакументаў умеў бачыць жывыя галасы і лёсы людзей далёкіх і блізкіх эпох, адчуваць подых часу, сапраўдную паэзію ў роднай мінуўшчыне. Адкрываючы і спасцігаючы багацці беларускай гісторыі, М. Улашчык не толькі выкладаў вынікі сваіх доследаў у грунтоўных навуковых працах, але імкнуўся данесці гэтыя багацці шырокаму чытачу, пісаў рэцэнзіі і навукова-папулярныя артыкулы для беларускіх газет і часопісаў. Асабліва ярка выявіўся яго талент пісьменніка, цікавага і назіральнага апавядальніка ў нарысе пра родную Віцкаўшчыну — "Была такая вёска" (Мн., 1989). Вялікі ўклад зрабіў М. Улашчык у даследаванне і папулярызацыю беларускага летапісання. Упершыню пераклаў на рускую мову і апублікаваў "Хроніку Быхаўца",

падрыхтаваў 2-томнае выданне беларускіх летапісаў і хронік у акадэмічнай серыі "Поўны збор рускіх летапісаў", напісаў цікавае і каштоўнае гісторыка-літаратуразнаўчае даследаванне "Уводзіны ў вывучэнне беларуска-літоўскага летапісання" (М., 1985).

Нягледзячы на тое, што М. Улашчык больш як паўвека пражыў за межамі роднай зямлі, ён выдатна валодаў жывой беларускай мовай. Меў добры мастацкі густ, пільна сачыў за навінамі беларускай літаратуры, перапісваўся і сябраваў з Я. Брылём, У. Караткевічам, І. Мележам. У апошнія гады часта наведваў бацькаўшчыну.

Пасля крэміравання ў Маскве пахаваны ў Мінску. Памяці вучонага былі прысвечаны навуковыя канферэнцыі ў Маскве і Мінску (1996). Матэрыялы апошняй выйшлі пад назвай "М. М. Улашчык і праблемы беларускай гістарыяграфі, крыніцазнаўства і археаграфіі: (Да 90-х угодкаў вучонага)" (Мн., 1997).

Вячаслаў Чамярыцкі

Улдукіс Эдуардас

Улдукіс Эдуардас *(18.3.1932, в. Далёкія Браслаўскага пав. Віленскага ваяв., цяпер Браслаўскі р-н Віцебскай вобл.), літоўскі пісьменнік, журналіст. Заслужаны дзеяч культуры Літоўскай ССР (1982).*

Э. Улдукіс у 1950 – 1951 і 1954 – 1956 гг. працаваў у рэдакцыі Рокішскай раённай газеты "Po Spalio veliava". У 1963 г. скончыў Вільнюскі дзяржаўны універсітэт па спецыяльнасці журналістыка. З 1956 да 1980 г. – карэспандэнт газеты "Правда" ў розных раёнах Літвы. З 1980 г. – галоўны рэдактар Камітэта па кінематаграфіі Літвы. Выдаў кнігі нарысаў аб земляробах, мараках Клайпеды, суднабудаўніках "Да новых вышынь" (1967), "Чорныя слёзы" (1968), "Суровы бок рамантыкі" (1979). Выйшлі таксама яго прыгодніцкія аповесці для дзяцей і кнігі для моладзі "Чырвоны жэмайціс" (1970), "Восьмы марак "Дзівоніі" (1976), "Вока Цыклона" (1979), "Бермудскі трохкутнік" (1983), "Чэрвеньскія зоркі" (1985). Напісаў прыгодніцкі раман "Усё аб Пранісе" (1984). У дакументальным рамане пра Уладаса Рэкашуса "Зарыва" (1981) паказаў гістарычныя падзеі 1919 – 1920 гг. Апісаў пачатак Вялікай Айчыннай вайны ў дакументальным рамане "Віхор". Барацьбу літоўцаў з крыжаносцамі і мечаносцамі ў XIII ст. паказаў у гістарычным рамане "Дзіда помсты" (1987). У сааўтарстве з Вітаўтасам Гайлюнасам напісаў дакументальную аповесць аб пасляваеннай класавай барацьбе ў Літве "З вінтоўкай і аралам" (1966), з Грыгорыем Кановічам – сцэнарый кінафільма "Раны зямлі нашай" (1971).

Яніна Кісялёва

Уляноўскі Баляслаў

Уляноўскі Баляслаў *(1860, Брэст-Літоўск, цяпер Брэст — 1919), польскі гісторык, палеограф, прафесар Ягелонскага універсітэта ў Кракаве (1888),*

Б. Уляноўскі паходзіў з беларускай сям'і. Вучыўся ў Ягелонскім універсітэце, дзе вывучаў гістарычныя і юрыдычныя навукі (1877–1881). Пасля яго заканчэння атрымаў ступень доктара права. Вучыўся ў Парыжскім універсітэце і ў Калеж дэ Франс (1883). У 1886 г. стаў дацэнтам. У 1879–1881 гг. працаваў у Дзяржаўным архіве гарадскіх і земскіх актаў у Кракаве. Загадваў кафедрай касцельнага права (1888–1919), кафедрай польскага права і гісторыі (1890–1891), кафедрай нямецкага права (1893–1895). Быў дэканам факультэта права (1893–1894, 1899–1900). Па стану здароўя ў 1909 г. не змог заняць пасаду рэктара Ягелонскага універсітэта. Даследаваў гісторыю касцельнага права, польскай гаспадаркі перыяду сярэдневякоўя. Займаўся палеаграфіяй, дыпламатыкай, метадалогіяй гісторыі права. Першы звярнуў увагу на асаблівае значэнне вясковых кніг у гістарычна-прававых даследаваннях і асабліва на значэнне фармуляраў актаў польскага паходжання. З універсітэцкіх дакументаў выдаў "Album studiosorum Universitatis Cracoviesis". Быў сакратаром (1898–1919), генеральным сакратаром (1903–1919), старшынёй (1917–1919) Акадэміі ўмеласці і Польскай акадэміі ўмеласці.

Вольга Гапоненка

Урбан Галіна

Урбан (Мекін) Галіна *(26.9.1957, г. Вічуга Іванаўскай вобл., Расія), архітэктар, мастак, удзельніца культурнага жыцця беларускай дыяспары ў Польшчы.*

Г. Урбан нарадзілася ў сям'і служачых. У 1964 г. пачала вучыцца ў пачатковай школе ў г.п. Астравец Гродзенскай вобл. У 1967 г. з бацькамі пераехала ў Польшчу. Сям'я жыла ў Калабжэгу, а з 1969 г. – у Гданьску. Скончыла агульнаадукацыйны ліцэй у Гданьску (1976), факультэт архітэктуры і урбаністыкі Гданьскага політэхнічнага інстытута (1992).

Г. Урбан прафесійна займаецца мастацтвам у галіне вітражоў. З'яўляецца аўтарам дэкарацыйных вітражоў у рэстаранах, гасцініцах, касцёлах Трыгарада, Торуня, Эльблонга, Быдгашчы і інш. Працуе над вітражом для касцёла ў Маскве.

Жыве ў Сопаце. З'яўляецца актыўным сябрам Беларускага культурнага таварыства "Хатка" ў Гданьску.

Лена Глагоўская (Гданьск, Польшча)

Урончанка Міхаіл

Урончанка (Врончанка) Міхаіл Паўлавіч *(1801 ці 1802, м. Копысь Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. – 14(26).11(ці 10).1855, Харкаў), рускі перакладчык, ваенны геадэзіст, географ, генерал-маёр. Адзін з заснавальнікаў Рускага геаграфічнага таварыства (1845).*

М. Урончанка нарадзіўся ў сям'і свяшчэнніка. Скончыў Магілёўскую гімназію (1819). Паступіў у Маскоўскі універсітэт, адкуль перайшоў у маскоўскую школу калонаважатых (закончыў у 1822). У 1823–1824 гг. у чыне прапаршчыка праводзіў тапаграфічныя здымкі ў Віленскай губ. У Вільні пазнаёміўся з А. Міцкевічам, які паказваў Урончанку рукапіс паэмы "Дзяды". У 1824–1828 гг. — у Дэрпцкім (цяпер Тартускі) універсітэце вывучае астраномію пад кіраўніцтвам акадэміка В. Струве. Адначасова пачаў займацца перакладамі на рускую мову. Асобнымі выданнямі вышлі ў яго перакладзе "Гамлет" У. Шэкспіра (СПб., 1828), "Манфрэд" Дж. Байрана (СПб., 1828), "Макбет" У. Шэкспіра (СПб., 1837), "Фаўст" І.-В. Гётэ (СПб., 1844). У "Невском альманахе" друкаваліся перакладзеныя ім "Дзяды" ("Праотцы") А. Міцкевіча (1829). Вясной 1828 г. камандзіраваны ў Малдавію, Валахію, Балгарыю для тапаграфічных здымкаў у час руска-турэцкай вайны. У 1834–1835 гг. зрабіў падарожжа па Малой Азіі, надрукаваў пасля даследаванне "Агляд Малой Азіі ў сучасным яе стане" ("Записки Военно-топографического депо". СПб., 1838–1840. Ч. 3, 5). У 1837–1841 гг. — член камісіі па кіраванню Закаўказскім краем. У 1843 г. звольніўся з вайсковай службы і перайшоў на работу ў Міністэрства народнай асветы (на пасаду чыноўніка асобых даручэнняў у Варшаўскай навучальнай акрузе). У 1848 г. вярнуўся на вайсковую службу ў Генеральны штаб. Да 1854 г. узначальваў трыангуляцыйныя работы ў Новарасійскім краі.

Алесь Карлюкевіч, Валерый Ярмоленка

Урублеўскі Зыгмунт

Урублеўскі Зыгмунт-Флярэнт *(28.10.1845, Гродна – 16.4.1888, Кракаў, Польшча), фізік, педагог, прафесар. Член-карэспандэнт Польскай акадэміі навук (1883), Акадэміі навук у Вене (1886). Адзін з заснавальнікаў фізікі і тэхнікі нізкіх тэмператур.*

Нарадзіўся З. Урублеўскі ў небагатай шляхецкай сям'і. Родны брат Э. Урублеўскага. Скончыў у 1862 г. гімназію ў Гродне і паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Універсітэта св. Уладзіміра ў Кіеве. За ўдзел у паўстанні 1863 г. быў сасланы на шэсць гадоў у Сібір (два гады правёў у Томску, потым быў пераведзены ў Цывільск Казанскай губ.). Вышэйшую адукацыю атрымаў у Берлінскім універсітэце. Працаваў у фізічных лабараторыях Германіі і Францыі пад кіраўніцтвам славутых фізікаў Г. Гельмгольца, Г. Кіргофа, Ф. Жалі, А. Кунта. У 1874 г. абараніў у Мюнхене дысертацыю "Экспериментальнае даследаванне магчымасці ўзбуджэння электрычнасці механічнымі сродкамі" на ступень доктара філасофіі, а праз два гады, у 1876 г., у Страсбургу, габілітацыйную працу "Аб дыфузіі газаў праз абсарбавальныя субстанцыі", станоўчы водгук на якую даў Дж. Максвел (надрукаваны ў час. "Nature"). У 1882 г. быў запрошаны ў Кракаў, дзе заняў пасаду загадчыка кафедры фізікі Ягелонскага універсітэта. З 1888 г. — дэкан фізічнага факультэта універсітэта. Арганізаваў там у 1883 г. першую фізічную лабараторыю — Фізічны інстытут — для правядзення навуковых даследаванняў і практычных заняткаў са студэнтамі.

Навуковыя даследаванні З. Урублеўскага прысвечаны дыфузіі газаў, фізіцы і тэхніцы нізкіх тэмператур. Сумесна з К. Альшэўскім, прафесарам хіміі Ягелонскага універсітэта, у красавіку 1884 г. упершыню ў свеце атрымаў вадкі кісларод у вымернай колькасці. Звадкаваў азот, вокіс вугляроду і вадарод. Упершыню вызначыў крытычныя тэмпературы вокісу вугляроду (1883), кісларoду і азоту (1885–1888). Працы З. Урублеўскага канчаткова абверглі метафізічныя погляды пра т. зв. "сталыя" газы (несціскальныя, якія немагчыма ператварыць у вадкасць) і паклалі пачатак шырокім доследам у галіне фізікі нізкіх тэмператур. Устанавіў залежнасць паміж крытычнымі велічынямі тэмпературы і ціску для газаў (тэарэма Урублеўскага). З. Урублеўскі выканаў першыя ў свеце даследаванні электраправоднасці металаў пры нізкіх тэмпературах, у прыватнасці, вызначыў велічыню электрычнага супраціўлення медзі пры тэмпературы, блізкай да абсалютнага нуля.

За фундаментальныя даследаванні ў галіне фізікі нізкіх тэмператур ў 1886 г. Венская акадэмія навук прысудзіла З. Урублеўскаму прэмію імя Баўмгартнера. Быў ганаровым сябрам Таварыства фізікі і гісторыі прыродазнаўства ў Жэневе і Таварыства садзейнічання навуцы ў Львове.

Трагічна загінуў у выніку пажару ў фізічнай лабараторыі. Пахаваны на Ракавіцкіх могілках у Кракаве. На надмагільнай пліце выбіты словы: "Нарадзіўся ў Гродна. Служыў Айчыне. Памёр дзеля навукі". Мемарыяльныя дошкі з гарыльефам З. Урублеўскага ўстаноўлены ў акадэмічным касцёле св. Ганны ў Кракаве і ў Фарным касцёле ў Гродне.

Вольга Гапоненка

Урублеўскі Эдуард

Урублеўскі Эдуард Вінцэнт *(Эдуард Антонавіч; 1848, Гродна – 1892, Пецярбург), хімік, педагог, прафесар Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута (з 1875).*

Нарадзіўся Э. Урублеўскі ў небагатай шляхецкай сям'і. Родны брат З. Урублеўскага. Скончыў гімназію ў Гродне. Вучыўся у Пецярбургскім тэхналагічным інстытуце, які паспяхова скончыў у 1868 г. са званнем тэхнолага 1 разраду. У 1871 г. абараніў у Гетынгенскім універсітэце дысертацыю на ступень доктара філасофіі, а затым выкладаў хімію ў Пецярбургскім тэхналагічным інстытуце.

Э. Урублеўскі ўнёс значны ўклад у даследаванне хімічнага складу газаў. Навуковыя даследаванні вучонага былі прасвечаны вывучэнню араматычных злучэнняў, будовы атамаў бензола, ізаметрыі і правілаў замяшчэння ў яго вытворных. У 1870 г. адкрыў рэакцыю замяшчэння дыязагрупы этаксігрупай. Устанавіў эквівалентнасць атамаў вадарода ў малекуле бензола. Пацвердзіў эксперыментальнымі даследаваннямі слушнасць хімічнай структурнай формулы бензола, якая была прапанавана Ф. Кекуле. Сінтэзаваў і вывучыў вялікую колькасць вытворных талуола. Апісаў склад і ўласцівасці мінеральных вод Каўказа. Эксперыментальныя даследаванні, з дапамогай якіх Э. Урублеўскі вырашыў пытанні аб месцах вытворных талуола і праверыў слушнасць тэорыі араматычных злучэнняў, стварылі яму імя не толькі сярод вучоных Расіі, але і на Захадзе. Цікавыя доследы, з дапамогаю якіх ён знайшоў адказ на актуальныя на той час для хімічнай навукі пытанні, і цяпер дазваляюць адносіць яго працы да ліку класічных. Сярод асноўных прац вучонага — "Гіпотэза Кекуле аб будове духмяных злучэнняў і яе праверка" (1876), "Аб некаторых злучэннях талуолавага рада" (1879).

Э. Урублеўскі быў адным з заснавальнікаў і актыўным член Рускага фізіка-хімічнага таварыства.

Вольга Гапоненка

Усцілоўскі Георгій

Усцілоўскі Георгій Іванавіч *(15.1.1915, в. Чарнавусы Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер вобл.), грамадскі дзеяч.*

Г. Усцілоўскі вучыўся ў Расненскай сямігодцы, Добрушскім ФЗВ, дзе атрымаў спецыяльнасць тэхніка па эксплуатацыі тарфяных балотаў. Працаваў на тарфяным заводзе імя Даўмана ў Обалі. Быў накіраваны на вучобу ў Савпартшколу. Пасля заканчэння яе працаваў у рэдакцыі раённай газеты ў Гардзееўцы Смаленскай вобл., а потым у рэдакцыі "Минской правды" пад Ленінградам. Тут быў выключаны з камсамола за ўтойванне сацыяльнага паходжання: бацька яго быў пазбаўлены выбарчых правоў як "класава варожы элемент".

У сувязі з гэтым Г. Усцілоўскі быў звольнены з работы, вярнуўся ў Смаленскую вобл. і пачаў працаваць у раённай газеце "Социалистический путь" у г. Ельня. 10 жніўня 1936 г. быў рэпрэсіраваны і асуджаны на 10 гадоў зняволення, сядзеў у смаленскай турме. У кастрычніку 1937 г. накіраваны ў Комі, у вярхоўе ракі Вычагды, у Мыелдзінскае аддзяленне Локчымлага, потым знаходзіўся ў Усцьвымлагу (Княжагосцкі р-н). У 1956 г. рэабілітаваны. Пасля вызвалення застаўся ў Комі, працаваў на кіруючых пасадах у лясной прамысловасці: ва Ухцінскім і Саснагорскім леспрамгасах начальнікам лесапунктаў, намеснікам дырэктара леспрамгаса. У 1975 г. выйшаў на пенсію.

Г. Усцілоўскі вядзе актыўную грамадскую работу ў Саснагорску. З 1992 г. узначальвае грамадскую арганізацыю былых вязняў сталінскіх лагераў "Саснагорскі мемарыял". Многае зрабіў дзеля ўшанавання памяці ахвяр сталінскіх рэпрэсій, у тым ліку выхадцаў з Беларусі, склаў і апублікаваў спісы беларусаў, якія былі сасланы ў Комі. Выдаў кнігу пра ахвяр палітычных рэпрэсій. Падтрымлівае сувязі з радзімаю. Быў дэлегатам з'ездаў беларусаў свету ў 1993 і 1997 гг., двойчы абраны сябрам Вялікай рады Згуртавання беларусаў "Бацькаўшчына". Удзельнічае ў рабоце беларускай суполкі ў Саснагорску.

Ганна Сурмач

Файніцкі Іван

Файніцкі Іван Якаўлевіч *(29.8.1847, Магілёўская губ. – 1913, Пецярбург), юрыст, прафесар Пецярбургскага універсітэта.*

Пачатковую адукацыю Іван Файніцкі атрымаў у Чарнігаўскай (1857–1859) і Магілёўскай (1859–1864) гімназіях (апошнюю скончыў з залатым медалём). У 1864 г. паступіў на юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта, які скончыў ў маі 1868 г. На выпускных экзаменах атрымаў залаты медаль за работу "Пра меры спынення абвінавачаным спробаў ухілення ад следства і суда". З чэрвеня 1868 г. па прадастаўленню прафесара А. П. Чэбышава-Дзмітрыева пакінуты стыпендыятам пры Пецяргбургскім універсітэце для падрыхтоўкі да прафесарскага звання. У 1868–1871 гг. чытаў курс у Аўдытарскім вучылішчы. У 1871 г. Іван Файніцкі паспяхова

абараніў магістарскую дысертацыю "Ашуканства паводле рускага права" і ў тым жа годзе быў абраны Саветам Пецярбургскага універсітэта і зацверджаны Міністэрствам асветы штатным дацэнтам па крымінальнаму праву. У 1881 г. абараніў дысертацыю "Ссылка на Захадзе" і атрымаў за яе ступень доктара крымінальнага права. Быў абраны і зацверджаны ў 1882 г. ардынарным прафесарам на кафедры крымінальнага права Пецярбургскага універсітэта. Адначасова чытаў з 1873 г. курс крымінальнага права ў Імператарскім вучылішчы правазнаўства і курс энцыклапедычнага права ў Імператарскім Аляксандраўскім ліцэі. Стажыраваўся ў Англіі, Францыю, Германіі, Швейцарыі. З мая 1896 г. зацверджаны ардынарным прафесарам, а ў снежні 1897 г. абраны дэканам юрыдычнага факультэта Пецярбургскага універсітэта.

Іван Файніцкі ініцыятар і адзін са стваральнікаў (1876) Юрыдычнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу. Прымаў удзел у рабоце камісіі Міністэрства юстыцыі па упарадкаванні спраў для выдання статыстычных даведнікаў па крымінальных справах. Прымаў удзел у рабоце замежных навуковых таварыстваў і міжнародных кангрэсах. Адзін з арганізатараў і стваральнікаў Міжнароднага саюза крымінальнага права (1895), з 1905 г. быў яго старшынёй. З 1876 г. — таварыш обер-пракурора Крымінальнага дэпартамента Кіруючага Сената, з 1900 г. сенатар. У 1903 г. Іван Файніцкі быў абраны ў гласныя Санкт-Пецярбурскай гарадской думы.

Навуковыя даследаванні Івана Файніцкага прысвечаны юрыдычным аспектам пакарання злачыннасці. Пакаранне ён разглядаў як меру барацьбы са злачыннасцю. Упершыню ў Расіі дзякуючы намаганням вучонага праблема пакарання і выпраўлення злачынцаў ва ўмовах папраўчых устаноў стала разглядацца як самастойная прававая навука. Аўтар "Курса крымінальнага судаводства" (СПб., 1884–1887. Т. 1–2) — першага па часе навуковага выкладу асноў крымінальнага працэсу, а таксама кніг "Вучэнне аб пакаранні ў сувязі з турмазнаўствам" (СПб., 1889), "Замах на асобу і маёмасць" (Пг., 1917. 7-е выд.)

Вольга Гапоненка

Фаменка Уладзімір

Фаменка Уладзімір Трафімавіч *(15.1.1939, Мінск), расійскі рэлігійны і грамадскі дзеяч. Кандыдат багаслоўя.*

Нарадзіўся У. Фаменка ў сям'і служачых. Скончыў сярэднюю школу ў Мінску, у 1962 г. — Мінскую духоўную семінарыю (у мястэчку Жыровічы Гродзенскай вобл.). З 1962 г. жыве і працуе ў Ленінградзе (Санкт-Пецярбургу). У 1966 г. скончыў па 1-му разраду Ленінградскую духоўную акадэмію. Абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму "Дагматычнае значэнне іконашанавання". З'яўляецца настаяцелем царквы Уладзімірскай іконы Божай Маці ў Санкт-Пецярбургу. Сааўтар радыёперадачы "Званы" Санкт-Пецярбургскага радыё. За актыўную царкоўна-грамадскую дзейнасць узнагароджаны ордэнамі св. роўнаапостальнага князя Уладзіміра II ступені, св. дабравернага князя Данііла Маскоўскага II ступені Маскоўскага патрыярхата, св. роўнаапостальнай Марыі Магдалены Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы.

Ларыса Языковіч

Фольбарт Аляксандр

Фольбарт Аляксандр Фёдаравіч *(1800, Магілёў – 1876, Пецярбург), прыродазнаўца. Член-карэспандэнт Пецярбургскай акадэміі навук (1863).*

А. Фольбарт нарадзіўся ў сямі пастара. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Пецярбургу, потым вучыўся медыцыне ў Германіі, Францыі і Англіі. Працаваў урачом у Пецярбургу. Ва ўзросце 30 гадоў пакінуў медыцыну і пачаў займацца мінералогіяй, склаў багатую калекцыю мінералаў. Адкрыў новы мінерал — ванадзіевакіслую медзь, якому геолагі свету далі назву "фольбарцыт". Пазней пачаў займацца палеанталогіяй. З 1846 г. А. Фольбарт правадзейны, а з 1858 г. — ганаровы член Мінералагічнага таварыства Расіі. Выбіраўся таксама правадзейным членам Маскоўскага і Рыжскага прыродазнаўчых таварыстваў, Маскоўскага таварыства аматараў прыродазнаўства і інш. навуковых таварыстваў.

Валерый Ярмоленка

Фрумянкоў Георгій

Фрумянкоў Георгій Георгіевіч *(1919, Рагачоў — 18.8.1989, Архангельск, Расія), доктар гістарычных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Расійскай Федэрацыі.*

Г. Фрумянкоў паходзіў з сям'і "ворага народа" — у 1937 г. быў рэпрэсіраваны яго бацька (рэабілітаваны ў 1958 г.). Будучы вучоны паступіў на гістарычны факультэт Ленінградскага педагагічнага інстытута імя А. І. Герцэна. З-за бацькі ледзь не быў выключаны адтуль. 28 чэрвеня 1941 г. скончыў вучобу і пайшоў на фронт. Удзельнічаў у абароне Ленінграда.У чэрвені 1943 г. стаў ваенным карэспандэнтам. Пасля вайны скончыў

аспірантуру Ленінградскага педагагічнага інстытута і ў 1947 г. быў накіраваны ў Архангельскі педагагічны інстытут. Працаваў выкладчыкам, загадваў кафедрай гісторыі СССР. У 1954 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 1966 г. — доктарскую. У 1962—1980 гг. рэктар Архангельскага педагагічнага інстытута імя М. В. Ламаносава.

Г. Фрумянкоў – аўтар больш за 200 навуковых прац, кніг па гісторыі Архангельскай Поўначы: "З гісторыі ссылкі ў Салавецкі манастыр у XVIII стагоддзі", "Салавецкі манастыр і абарона Памор'я ў XVI—XIX стст.", "Вернікі Салавецкага манастыра" і інш. Адзін з аўтараў і рэдактараў "Северного археологического сборника". Многа зрабіў для папулярызацыі творчай спадчыны М. В. Ламаносава. Ганаровы грамадзянін г. Архангельска. У Дзяржаўным архіве Архангельскай вобласці створаны асабісты фонд Г. Фрумянкова. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, "Знак Пашаны", медалямі.

Вацлаў Мацкевіч

Халасцякоў Георгій

Халасцякоў Георгій Мікітавіч *(20.7.1902, Баранавічы – 22.7.1983, Масква), віцэ-адмірал. Герой Савецкага Саюза.*

У 1921 г. Г. Халасцякоў стаў ваенным мараком. У 1925 г. скончыў Вышэйшае ваенна-марское гідраграфічнае вучылішча. Праходзіў службу на Балтыйскім, Ціхаакіянскім і Чарнаморскім флотах: камандзір падводнай лодкі, камандзір дывізіёна і брыгады падводных лодак. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны — начальнік аддзела падводнага плавання Чарнаморскага флоту, з верасня 1941 па снежань 1944 г. — камандзір Новарасійскай ваенна-марской базы. У студзені – лютым 1944 г. узначальваў Азоўскую ваенную флатылію, са снежня 1944 г. да заканчэння вайны — камандзір Дунайскай ваеннай флатыліі. Быў удзельнікам баёў за Крым і Каўказ, вызваленне Югаславіі, Венгрыі, Балгарыі, Чэхаславакіі, Аўстрыі. З 1943 г. — контр-адмірал, з 1945 г. — віцэ-адмірал. У 1950 г. скончыў Ваенную акадэмію Генеральнага штаба. Тады ж стаў камандуючым Каспійскай ваеннай флатыліяй. У 1951–1953 гг. — камандуючы 7-м Ціхаакіянскім флотам. Праводзіў выпрабаванні навейшых падводных лодак у 1960-я гг., потым служыў у Галоўным штабе Ваенна-Марскога флоту СССР. У 1969 г. выйшаў у адстаўку. Узнагароджаны ордэнам Леніна, больш як 20 айчыннымі і замежнымі ордэнамі і медалямі.

Ларыса Языковіч

Ханевіч Міхаіл

Ханевіч Міхаіл Дзмітрыевіч *(20.12.1954, в. Купіск Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл.), хірург, даследчык у галіне медыцыны, прафесар (1993), доктар медыцынскіх навук (1993).*

А. Ханевіч закончыў Купіскую 8-гадовую школу (1970) і Слонімскае медыцынскае вучылішча (1974). Працаваў фельчарам у в. Дзяляцічы Навагрудскага р-на. У 1975–1981 гг. вучыўся ў Ваенна-медыцынскай акадэміі ў Ленінградзе, пасля заканчэння якой служыў ваенным урачом у Паўднёвай групе савецкіх войск. У 1984–1987 гг. — ад'юнкт кафедры хірургіі Ваенна-медыцынскай акадэміі. У 1988 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму "Даследаванне патагенезу эндатаксікоза пры перытаніце". Прайшоў шлях ад старшага ардынатара да намесніка начальніка кафедры хірургіі Ваенна-медыцынскай акадэміі. У 1993 г. абараніў доктарскую дысертацыю, прысвечаную кішэчнай непраходнасці. З 1995 г. — галоўны хірург клінічнай бальніцы № 20 у Санкт-Пецярбургу. Стваральнік і кіраўнік адзінага ў Расіі цэнтра рэканструктыўна-ўзнаўляльнай хірургіі кішэчніка (з 1997). Уваходзіць у склад праблемнай камісіі Акадэміі медыцынскіх навук Расійскай Федэрацыі. Аўтар больш як 130 навуковых публікацый, у тым ліку 2-х манаграфій і падручніка па хірургіі.

Член Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу.

Мікалай Нікалаеў (Санкт-Пецярбург, Расія), Ларыса Языковіч

Хвісюк Мікалай

Хвісюк Мікалай Іванавіч *(1934, в. Варацэвічы Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл.), вучоны-медык, прафесар. Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Украіны.*

М. Хвісюк нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння сямігодкі паступіў у Пінскую фельчарска-акушэрскую школу, а ў 1953–1958 гг. вучыўся ў Віцебскім медыцынскім інстытуце, пасля чаго пачалася яго працоўная дзейнасць на пасадзе галоўнага ўрача санаторыя "Домрачава" на Брэстчыне. З 1963 г. вучыўся ў аспірантуры Харкаўскага інстытута ўдасканалення ўрачоў. Фактычна з гэтага часу яго лёс звязаны з Украінай.

Працаваў асістэнтам кафедры траўматалогіі і артапедыі, дацэнтам, намеснікам дырэктара па навуцы Харкаўскага НДІ траўматалогіі і артапедыі ім. М. Сітэнкі, з 1977 г. — рэктар Харкаўскага інстытута ўдасканалення ўрачоў. Прафесар М. Хвісюк — вучоны з арыгінальнымі навуковымі поглядамі па многіх тэарэтычных і клінічных пытаннях траўматалогіі і артапедыі. Ён з'яўляецца заснавальнікам адной з буйных навуковых школ у галіне артапедыі пазваночніка (вертэбралогіі), ім распрацаваны шэраг новых навуковых напрамкаў па гэтай спецыяльнасці. М. Хвісюк з'яўляецца аўтарам 252 навуковых прац, у тым ліку 6 манаграфій, і 52 вынаходніцтваў. Пад яго кіраўніцтвам абаронены 32 кандыдацкія і 5 доктарскіх дысертацый.

У 1995 г. прызначаны членам Бюро Паўночна-ўсходняга цэнтра НАН Украіны. Шмат гадоў быў намеснікам Харкаўскай абласной комплекснай праграмы "Здароўе", у 1996 г. зацверджаны саветнікам-экспертам Камісіі па радыяцыйнай абароне насельніцтва Украіны. У 1997 г. Міжнародным біяграфічным цэнтрам Кембрыджа (Англія), а ў 1998 г. Амерыканскім біяграфічным інстытутам прызнаны "чалавекам года" за заслугі ў галіне медыцынскіх навук. На працягу 22 год працуе рэктарам Харкаўскай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, загадвае там кафедрай.

За выдатныя навуковыя дасягненні ў развіцці актуальных праблем лячэння пазваночніка і суставаў М. Хвісюк узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1976), "Дружбы народаў" (1986), пачэснай адзнакай Прэзідэнта Украіны (1996). З'яўляецца галоўным рэдактарам часопіса "Проблемы науки и образования", членам шматлікіх рэдкалегій медыцынскіх выданняў. Абраны правадзейным членам Інжынернай акадэміі Украіны, членам-карэспандэнтам Міжнароднай інжынернай акадэміі.

Ірына Тамільчык

Хлябцэвіч Уладзімір

Хлябцэвіч Уладзімір Іванавіч *(22.8(3.9).1894, мяст. Жыровічы Слонімскага пав. Гродзенскай губ., цяпер в. Жыровічы Слонімскага р-на Гродзенскай вобл. – 28.2(13.3).1917, Сызрань), удзельнік беларускага літаратурна-грамадскага руху пачатку XX ст.*

Брат Я. Хлябцэвіча. Вучыўся у Пецярбурскім універсітэце. Удзельнічаў у рабоце Беларускага навукова-літаратурнага гуртка ў Пецярбургу. Аўтар нарыса "Сяло Кленікі перад бежанствам — у час сусветнай вайны" (1915, надрукаваны ў час. "Biełaruskie zeszyty historyczne". 1995. № 2), вершаў на рускай мове. Загінуў у Лютаўскую рэвалюцыю 1917 г. у Петраградзе. Пахаваны ў Сызрані, дзе ў той час быў у бежанстве яго бацька Іван Андрэевіч (1857–1919), які выдаў у Сызрані кнігу "Вянок бацькі на магілу сына. Ахвяра вялікай рэвалюцыі. Кароткі біяграфічны нарыс студэнта У. І. Хлябцэвіча" (1917). Магіла У. Хлябцэвіча захавалася ў цэнтры Сызрані.

Віталь Скалабан

Хлябцэвіч Яўген

Хлябцэвіч Яўген Іванавіч *(псеўданім Халімон з-пад Пушчы; 25.7(6.8).1884, мяст. Жыровічы Слонімскага пав. Гродзенскай губ., цяпер в. Жыровічы Слонімскага р-на Гродзенскай вобл. – 20.10.1953, Масква), грамадскі і палітычны дзеяч, кнігазнавец, літаратуразнавец. Кандыдат педагагічных навук (1947).*

З 1900 г. Я. Хлябцэвіч вучыўся у Віленскай духоўнай семінарыі, далучыўся да беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, быў дэлегатам 2-га з'езда Беларускай сацыялістычнай грамады ў Мінску. Вучыўся ў Юр'еўскім (цяпер Тартускі), з 1907 г. — у Пецярбургскім універсітэтах (скончыў у 1913). Друкаваў допісы у "Нашай долі" і "Нашай ніве", супрацоўнічаў у пецярбургскай газ. "Новая Русь", дзе рэдагаваў "Кніжны і бібліятэчны лісток" (1901–1910). Адзін з арганізатараў гуртка па вывучэнню Гродзенскай губ., Беларускага навукова-літаратурнага гуртка ў Пецярбургу. Удзельнічаў у стварэнні бясплатных паўленкаўскіх бібліятэк, у т. л. у в. Кленікі Бельскага пав., дзе святаром быў яго бацька — І. Хлябцэвіч. На Першым Усерасійскім з'ездзе па бібліятэчнай справе (1911) выступіў з дакладам "Развіццё бібліятэчнай справы на Беларусі". З 1914 г. — у арміі. У 1918 г. — у Кіеве, удзельнічаў у рабоце беларускіх арганізацый, друкаваўся у газеце "Белорусское эхо". У 1919 г. — інструктар Беларускага пададдзела аддзела асветы нацыянальных меншасцей Народнага камісарыята асветы РСФСР у Кіеве, вёў перагаворы з М. Доўнар-Запольскім аб выданні яго "Гісторыі Беларусі". З 1919 г. — загадчык бібліятэчнага аддзялення Палітычнага ўпраўлення Рэўваенсавета рэспублікі, з 1930 г. працаваў ў Наркамасвеце РСФСР, з 1943 г. — выкладчык, вучоны сакратар Маскоўскага бібліятэчнага інстытута. У 1919–1920 гг. змяшчаў артыкулы па гісторыі беларускай літаратуры ў газеце "Жизнь национальностей". Аўтар працы "Адраджэнне беларускай народніцкай літаратуры" (Пг., 1914, у 1917 г. перавыдадзена пад назвай "Народніцкая паэзія беларусаў"), артыкулаў і ўспамінаў пра Я. Баршчэўскага, Ф. Багушэвіча, Я. Купалу, Цётку, А. Бурбіса. Асабісты архіў Я. Хлябцэвіча зберагаецца ў Аддзеле рэдкай кнігі і рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Віталь Скалабан

Хмялеўскі Міхась

Хмялеўскі Міхась *(псеўд. Міхась Сваяк, крыпт. М. С., М. Х.; 26.6.1925, в. Паўднёвы Востраў Гродзенскага ваяв., цяпер Беластоцкае ваяв., Польшча), журналіст, дзеяч беларускай дыяспары ў Польшчы.*

М. Хмялеўскі вучыўся ў Ленінградскім універсітэце. Пасля заканчэння (1953) працаваў журналістам у Люблінскай ваяводскай газеце "Sztandar Ludu" і "Gazecie Białostockiej", з 1956 г. — органе Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы штотыднёвіку "Ніва". Узначальваючы на грамадскіх пачатках ГП БГКТ (1963–1966, 1969–1972), а пазней — Галоўную рэвізійную камісію таварыства, прымаў актыўны ўдзел у рабоце камісій Галоўнага праўлення па культуры і выдавецкіх справах. Працаваў у рэдкалегіях па выпуску беларускіх календароў. Асабіста М. Хмялеўскім падрыхтаваны календары на 1966 і 1983 гг. Спрыяў дзейнасці вясковых гурткоў БГКТ, развіццю беларускага школьніцтва ў Польшчы, дапамагаў у зборы экспанатаў для беларускага этнаграфічнага музея ў Белавежы.

У "Ніве" М. Хмялеўскі вёў старонку "Трыбуна чытачоў". Лепшыя яго апавяданні і эсе склалі кнігу "І так бывала", што пабачыла свет у Беластоку ў сувязі з 70-годдзем аўтара (1995). Фундатарам выдання стаў сын журналіста Юрка Хмялеўскі. М. Хмялеўскі цікава расказвае аб сапраўдных здарэннях, трагедыях асобных людзей, іх лёсах, аб злачынствах гітлераўскіх акупантаў на беларускай зямлі.

Алесь Жалкоўскі (Ліда)

Ходзька Іосіф

Ходзька Іосіф (Юзаф) Іванавіч *(6(19).12.1800, в. Крывічы Вілейскага пав. Мінскай губ., цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл. – 21.2(5.3).1881, Тыфліс (цяпер Тбілісі, Грузія), ваенны геадэзіст, падарожнік, генерал-лейтэнант.*

Брат польскага паэта Аляксандра Ходзькі. Вывучаў геадэзію і астраномію ў Віленскім універсітэце. У 1821 г. добраахвотна пайшоў у рускую армію на тапаграфічную службу, праводзіў трыянгуляцыйныя працы ў Курляндыі, Літве і Беларусі. За кантакты з маладзёжнымі арганізацыямі, якія рыхтавалі паўстанне, накіраваны ў глыб Расіі. Кіраваў трыянгуляцыйнымі работамі на Каўказе (з 1847) — ад Чорнага да Каспійскага мора, на якіх заснавана сучасная картаграфія гэтага рэгіёна. І. Ходзька адным з першых ажыццявіў узыходжанне на Арарат (1850) і быў залічаны ў Альпінісцкі клуб Францыі; аб гэтым узыходжанні паведамілі "Географические известия" (1850. Вып. 3). Склаў першую карту Каўказскіх гор з абазначэннем усіх вяршынь і горных перавалаў, ледавікоў і інш.

У час Крымскай вайны (1854 г.) быў прызначаны ў геадэзічны аддзел рускай арміі ў Турцыі і праводзіў тапаграфічныя работы ў раёне Карса і Эрзерума. У 1860–1865 гг. пры дапамозе І. Сцябніцкага вёў трыянгуляцыйныя працы на Паўночным Каўказе. У 1867 г. выйшаў на пенсію, але працягваў навуковыя даследаванні на Каўказе, дзе знаходзіўся больш за 40 год. У далейшым яго працы былі выкарыстаны для складання сучаснай тапаграфа-геаграфічнай карты гэтага велізарнага рэгіёна.

Навуковыя працы І. Ходзька публікаваў у расійскіх, французскіх і нямецкіх часопісах. Цесна супрацоўнічаў з Расійскім геаграфічным таварыствам і яго Каўказскім філіялам у Тыфлісе. У архіве РГТ (Санкт-Пецярбург) захоўваецца шэраг матэрыялаў І. Ходзькі аб яго працы на Каўказе, у прыватнасці, сумесныя з Б. Статкоўскім, палявыя матэрыялы па нівеліроўцы Вялікага Каўказскага хрыбта для праектавання чыгункі. Да ліку яго важнейшых прац адносіцца "Агульны погляд на араграфію Каўказа" (Записки Кавказского отдела ИРГО. 1884. Т. 6). Свае справаздачы і навуковыя артыкулы публікаваў таксама ў "Записках военно-топографического депо".

Заслугі І. Ходзькі па даследаванню араграфіі Каўказа былі высока ацэнены расійскімі навуковымі коламі. Ён быў узнагароджаны вялікім залатым медалём РГТ (1868) і выбраны ганаровым сябрам РГТ (1871). Каўказскі аддзел РГТ заснаваў прэмію імя І. Ходзькі за лепшую геаграфічную працу па каўказскай тэматыцы.

Святлана Сачанка

Худаба (Кудаба) Чэслаў

Худаба (Кудаба) Чэслаў Францавіч *(25.6.1932, в. Кабыльнік Вілейскага пав. Віленскага ваяв., цяпер в. Нарач Мядзельскага р-на Мінскай вобл. — 19.2.1993, Вільнюс), географ, педагог, публіцыст, літоўскі і беларускі грамадскі дзеяч, прафесар.*

Ч. Худаба нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Яго бацька арандаваў зямлю ў розных вёсках. У 1940 г. сям'я выехала на Свянцяншчыну, у м. Цвярачус. Другая сусветная вайна перашкодзіла вучобе хлопчыка, — толькі пасля яе заканчэння Чэслаў змог вучыцца ў прагімназіі ў Цвярачусе, а ў 1954 г. скончыць Швянчонскую настаўніцкую семінарыю. Працягваў вучобу на геаграфічным факультэце Вільнюскага універсітэта, пасля заканчэння якога (1959) працаваў там спачатку асістэнтам, потым старшым выкладчыкам. Назначаўся дэканам факультэта прыроды (1964 — 1968). У 1964 г. стаў кандыдатам геаграфічных навук, а ў 1972 г. абараніў доктарскую

дысертацыю на тэму "Глацнамарфалогія маргінальных узвышшаў", дзе даследаваў глацнамарфалагічную структуру рэльефа Літвы. З 1978 г. — загадчык кафедры гідралогіі і кліматалогіі, з 1982 г. — навуковы кіраўнік лабараторыі інжынернай фатаграметрыі. Валодаў нямецкай, польскай, літоўскай, рускай і беларускай мовамі.

Ч. Худаба плённа займаўся выкладчыцкай і навуковай дзейнасцю. Выкладаючы курсы агульнай фізічнай геаграфіі, геамарфалогіі, аэраскапічнага метаду, гісторыі і аховы прыроды, ён падрыхтаваў шмат высокакваліфікаваных спецыялістаў. Пад яго кіраўніцтвам выдадзены геаграфічны атлас Літвы. Ім напісаны манаграфіі "Марэнныя ўзвышшы Літвы" і "Геаграфічныя падарожжы і адкрыцці", шмат навукова-папулярных кніг — "Ваколіцы Ігналіны" (1967), "Там, дзе цячэ Нёман" (1970), "Узгоркавая Жэмайція" (1972), "Ігналінскі край" (1987), "Нёман-Нямунас" (1989) і інш. У беларускім калектыўным зборніку "Наш Нёман" (1988) змешчаны нарыс Ч. Худабы "Каля вытокаў крыніцы", дзе аўтар згадвае гады дзяцінства, праведзеныя на Нарачы, апавядае пра харство Нарачанскага краю. Ён напісаў тэкст да кнігі-альбома "Іду па Літве" (1992), дзе ў цікавай мастацкай форме расказаў пра гісторыю і прыроду літоўскага краю. Кніга Ч. Худабы "Па Віліі: Падарожныя запісы" (1992), прысвечаная розным пытанням гісторыі, этнаграфіі, культуры, была перакладзена на беларускую мову дацэнтам Вільнюскага універсітэта Галінай Войцік. Шмат артыкулаў Ч. Худабы (каля 1000), прысвечаных праблемам экалогіі і аховы прыроды, друкавалася на старонках польскага двухтыднёвіка "Znad Wilii", у квартальніку "Lithuania", часопісе "Santara". У 1993 г. выдадзена апошняя прыжыццёвая кніга вучонага "Сем дарог з Варняй". Істотнай адметнасцю яго выданняў з'яўляецца мноства фотаілюстрацый, выкананых самім аўтарам. У час шматлікіх выступленняў Ч. Худаба выказваўся за адраджэнне беларускага і літоўскага краёў, за развіццё разнастайных культурных сувязяў польскага, беларускага і літоўскага народаў, за беражлівыя адносіны да прыроды.

Ч. Худаба ўзначальваў Фонд культуры Літвы (1987—1990), выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Літвы (1990—1993), прэзідэнтам Фонду адкрытай Літвы, сігнатарам Акта Незалежнасці. Быў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Літвы 1984 і 1993 гг., прэмій імя Йонаса Басанавічуса (1993), імя Вінцаса Кудзіркі (1993), імя Адамкуса (1994) — пасмяротна.

Іван Драўніцкі (в. Камарова Мядзельскага р-на)

Целеш Вячка

***Целеш Вячка (Вячаслаў) Міхайлавіч**, (25.9.1938, в. Чырвонае Сяло, цяпер г. пас. Краснасельскі Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл.), беларускі мастак, педагог, грамадскі, культурны дзеяч.*

Маляваннем захапіўся ў школьныя гады, але ажыццявіць юнацкую мару ўдалося не адразу. Пасля заканчэння Краснасельскай сярэдняй школы працаваў на Ваўкавыскім цэментным заводзе рабочым, быў мастаком-афарміцелем.

Пераехаў у Рыгу ў 1958 г., нейкі час быў матросам, у 1961 г. паступіў у мастацкую студыю А. Петэрсана. З 1964 г. займаўся на падрыхтоўчых курсах Латвійскай акадэміі мастацтваў, паступова авалодваў будучай спецыяльнасцю пад кіраўніцтвам М. Карнецкага. Вучыўся на педагагічным аддзяленні Латвійскай акадэміі мастацтваў (1970–1975). Першая персанальная выстаўка В. Целеша адбылася ў 1976 г., з 1977 г. ён як жывапісец, графік дэманстраваў свае работы ў рэспубліках Прыбалтыкі, у Беларусі, а таксама ў ЗША, Канадзе, Данії, Швецыі, Фінляндыі.

Шмат зрабіў для пашырэння ведаў пра Беларусь і як калекцыянер, старшыня клуба рыжскіх філакартыстаў. В. Целеш з 1968 г. пачаў збіраць паштоўкі беларускай і латвійскай тэматыкі: мае іх цяпер каля 5 тыс. Самыя старыя з унікальнага збору мастака былі выпушчаны ў 90-я гг. XIX ст. Дзякуючы намаганням В. Целеша ў 1984 г. у Мінску ўбачыла свет кніжка "Мінск на старых паштоўках".

Грамадская дзейнасць мастака дазваляе залічыць яго ў шэрагі лідэраў беларускага нацыянальнага руху ў Латвіі. Ён арганізаваў дзіцячую мастацкую студыю "Вясёлка", нядзельную беларускую школу, аддзел беларускай прэсы і культуры ў адной з рыжскіх бібліятэк, майстэрню "Беларуская хатка". Дзякуючы яго актыўнасці былі заснаваны і Таварыства беларускай культуры "Світанак" (у Рызе), мастацкая суполка "Маю гонар". В. Целеш на працягу апошніх гадоў з'яўляўся загадчыкам беларускай нядзельнай школкі, намеснікам старшыні Латвійскага таварыства беларускай культуры "Світанак", старшынёй аб'яднання мастакоў-беларусаў Балтыі "Маю гонар". Многа разоў прыязджаў у Беларусь. Набыў вядомасць у асяроддзі сталічнай творчай інтэлігенцыі з канца 1970-х. Сталыя кантакты падтрымлівае з вядомым беларускім мастаком Я. Куліком, археолагам М. Чарняўскім. Сябраваў з пісьменнікам У. Караткевічам. Удзельнік мастацкіх выстаў, прысвечаных 500-годдзю Міколы Гусоўскага (1980) і 100-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча (1991). У студзені–лютым 1993 г. у Дзяржаўным мастацкім музеі Беларусі адбылася персанальная выстаўка твораў В. Целеша. Яго работы экспанаваліся ў Мінску, Гродне, пас. Краснасельскім.

На думку спецыялістаў творчую манеру мастака вызначае сінтэз беларускай і латвійскай традыцый. В. Целеш намаляваў партрэты шматлікіх беларускіх дзеячаў культуры, літаратуры, мастацтва — Ф. Скарыны, В. Дуніна-Марцінкевіча, М. Багдановіча, Я. Купалы, З. Верас, У. Караткевіча, А. Мальдзіса, Р. Шырмы і інш.

Паспяхова працуе і ў жанрах пейзажа, нацюрморта, экслібрыса, піша на гістарычныя тэмы. Творы В. Целеша ў асноўным лірычныя, настраёвыя, вельмі гарманічныя, блізкія да народнага мастацтва Беларусі і Латвіі. Ім уласцівы свежасць і навізна. Сярод лепшых крытыкі называюць цыклы "Касмічныя шляхі" (1983), "У ценю часу трыумфаў" (1989–1990), у якіх адчуваюцца творчая пераемнасць і вучоба ў Я. Драздовіча. Імкненне перакінуць "мост" паміж дзвюма блізкімі культурамі, асабліва дарагімі мастаку, заўважаецца у раней напісаных карцінах "Маці наша — Дзвіна-Даўгава (Купала і Райніс)", "Першыя крокі ў свет. Францішак Скарына ў Рызе". В. Целеш намаляваў 600 ілюстрацый да гісторыі беларускіх гарадоў.

Усё вышэйсказанае дазваляе думаць, што духоўна мастак ніколі не пакідаў Беларусі, застаючыся ў Латвіі прапагандыстам роднай культуры і носьбітам нацыянальных каштоўнасцей.

Святлана Сачанка

Церахаў Мікалай

Церахаў Мікалай Сяргеевіч *(7.1.1932, в. Лямна Аршанскага р-на Віцебскай вобл.), інжынер.*

Нарадзіўся М. Церахаў у сялянскай сям'і. У 1952 г. скончыў Якаўлевіцкую сярэднюю школу, у 1957 г. Харкаўскі горны інстытут. Пасля працаваў на шахтах у Данбасе, у інстытуце Паўдгіпраруд у Харкаве. З 1972 г. — галоўны канструктар інстытута. Ажыццяўляў тэхнічнае кіраўніцтва праектавання сістэм аўтаматычнага кіравання і кантролю тэхналагічных працэсаў аб'ектаў горнаруднай прамысловасці. Пры непасрэдным удзеле М. Церахава ў працэсе праектавання пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю драбільна-ўзбагачальныя фабрыкі на Дакучаеўскім камбінаце, марганцаварудныя шахты, аб'екты цыклічна-паточнай тэхналогіі транспартацыі руды і пароды з кар'ераў на Паўночным, Паўднёвым і Новакрыварожскім горнаўзбагачальных камбінатах. Удзельнічаў у стварэнні сістэм аўтаматычнага кіравання горнарудных прадпрыемстваў Тульскай, Маскоўскай, Ліпецкай, Жытомірскай абласцей. З 1993 г. на пенсіі. Удзельнічаў у Першым з'ездзе беларусаў свету (1993). Прымае ўдзел у грамадскім жыцці беларусаў Харкава.

Браніслава Котава

Цімашэнка Барыс

Цімашэнка Барыс Мікалаевіч *(6.12.1941, г. Котлас Архангельскай вобл. Расія), пісьменнік, журналіст, культурна-грамадскі дзеяч беларускай дыяспары на Украіне.*

Б. Цімашэнка нарадзіўся ў беларускай сялянскай сям'і. Яго бацькі, ураджэнцы Гомельшчыны і Магілёўшчыны, у 1935 г. былі раскулачаны і сасланы ў Архангельскую вобл., адкуль вярнуліся ў Беларусь у 1947 г. Пасля заканчэння Мазырскай сярэдняй школы № 2 Б. Цімашэнка быў прызваны ў Савецкую Армію. У 1966 г. закончыў Львоўскае Вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча і быў размеркаваны на Паўночны флот, дзе праслужыў больш за 17 гадоў. З 1989 г. капітан II рангу ў запасе. Удзельнік баявых падзей у Афганістане. У 1976 — 1988 гг. узначальваў драматычныя тэатры Паўночнага флоту і Прыкарпацкай вайсковай акруіі ў Львове.

З 1990 г. Б. Цімашэнка актыўна займаецца культурна-грамадскай дзейнасцю. У 1992 г. упершыню ў Львове было створана беларускае нацыянальна-культурнае таварыства "Белая Рунь" імя Ф. Скарыны, якое ён узначальваў да 1998 г. З'яўляецца аўтарам і вядучым першай беларускамоўнай праграмы ў Заходнім рэгіёне Украіны "Весткі з Беларусі", заснавальнікам, а з 1995 г. — галоўным рэдактарам першай беларускамоўнай газеты на Украіне "Беларус Галіччыны" ("Галіцкая Рунь"). Выдаўніцтва "Камяняр" у 1995 г. выдала яго дакументальную аповесць пра знакамітага падводніка часоў Вялікай Айчыннай вайны А. Марынеска. Сябра Вялікай Рады згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына". Жыве і працуе ў Львове.

Вольга Караткевіч

Ціхаў Гаўрыіл

Ціхаў Гаўрыіл Андрыянавіч *(19.4. (1.5).1875, мяст. Смалявічы Мінскай губ., цяпер вобл. — 25.1.1960), астраном, заснавальнік астрабатанікі, Ганаровы член АН БССР з 1959 г., член-карэспандэнт АН СССР (1927), акадэмік АН Казахскай ССР (1946).*

Г. Ціхаў скончыў Маскоўскі універсітэт (1897). У 1906–1941 гг. працаваў у Пулкаўскай абсерваторыі. З 1947 г. — загадчык сектара астрабатанікі АН Казахскай ССР. Займаўся праблемамі астрабатанікі, даследаваннямі ў галіне астраметрыі і спектрафотаметрыі. Распрацаваў методыку фотаметрычных назіранняў, у прыватнасці метад каларыметрыі са светафільтрамі, метад прадоўжнага спектрографа для вызначэння колеру

зорак і інш. Шэраг работ Г. Ціхава прысвечаны пытанням атмасфернай оптыкі і аэрафотаздымкі. Сканструяваў шэраг астранамічных прыбораў. Аўтар каля 100 навуковых прац. Яны сабраны ў "Асноўных працах" (Т. 1-5. Алма-Ата, 1954 — 1960). Выдаў успамінаны "Шэсцьдзесят год ля тэлескопа" (М., 1959).

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

Вольга Гапоненка

Цукерзіс Якаў

Цукерзіс Якаў *(24.10.1909, г. Ашмяны Віленскай губ., цяпер Гродзенская вобл.—?), заолаг, доктар біялагічных навук (1971), прафесар (1983), заслужаны дзеяч навукі Літоўскай ССР (1979).*

Я. Цукерзіс скончыў Віленскі універсітэт (1934). У 1951–1960 гг. працаваў інспектарам Міністэрства асветы Літвы. З 1960 г. — навуковы супрацоўнік Інстытута заалогіі і паразіталогіі, у 1964–1972 гг. — загадчык сектара заалогіі пазваночных, а з 1972 г. загадчык лабараторыі карцыналогіі таго ж інстытута. Даследаваў пытанні экалогіі, штучнага развядзення і аховы ракавых. Галоўная праца Я. Цукерзіса — "Біялогія шырокапалага рака" (1970, на рус. мове). Падрыхтаваў бібліяграфічны паказальнік "Астакалогія Літвы" (1983, з Й. Шэстокасам). Я. Цукерзіс з'яўляецца адным з аўтараў кнігі "Біялогія рачных ракаў вадаёмаў Літвы" (1979, на рускай мове). Чытаў даклады на міжнародных сімпозіумах астаколагаў у Францыі (1978) і ЗША (1981). У 1989 г. выйшла яго кніга "Рачныя ракі" (на рус. мове).

Яніна Кісялёва

Цыбульскі Напалеон Нікадзім

Цыбульскі Напалеон Нікадзім *(13.9.1854, в. Крываносы Свянцянскага пав. Віленскай губ., цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл. – 26.4.1919, Кракаў, Польшча), фізіёлаг, філосаф, грамадскі дзеяч, прафесар Ягелонскага універсітэта (Кракаў). Доктар медыцыны. Рэктар Ягелонскага універсітэта (Кракаў).*

Н.-Н. Цыбульскі паходзіў з беларускай шляхты. Дзяцінства яго прайшло на Астравеччыне. Пачатковую адукацыю атрымаў дома. У 1875 г. з сярэбраным медалём скончыў Мінскую гімназію. Вучыўся ў Пецярбургскай ваенна-медыцынскай акадэміі (1875–1880), пасля яе заканчэння атрымаў спецыяльнасць урача. Стаўшы пераможцам конкурсу на права працягваць вучобу ў выбранай галіне навукі, атрымаў накіраванне на трохгадовае бясплатнае навучанне ў гэтай жа акадэміі. Закончыў вучобу з залатым медалём 1-й ступені. Быў намеснікам, а з 1881 г. загадчыкам фізіялагічнай лабараторыі акадэміі. Не маючы магчымасці займацца навукай у Пецярбургу, пераехаў у Аўстра-Венгрыю. Займаўся навуковымі эксперыментамі ў галіне фізіялогіі ў Ягелонскім універсітэце, дзе стаў стваральнікам медыцынска-навуковай школы. У 1885 г. абараніў дысертацыю і атрымаў вучоную ступень доктара медыцыны. Восенню таго ж года Цыбульскі стаў загадчыкам кафедры фізіялогіі, гісталогіі і эмбрыялогіі. Займаўся выкладчыцкай і навуковай дзейнасцю, зубаўрачэбнай практыкай. Двойчы прызначаўся дэканам медыцынскага факультэта, у 1904 г. быў выбраны рэктарам Ягелонскага універсітэта.

Н.-Н. Цыбульскі надрукаваў на рускай, польскай, французскай, нямецкай мовах каля 100 навуковых прац. Апрача "Фізіялогіі чалавека", якая выйшла двума выданнямі, напісаў шмат навуковых артыкулаў. Зрабіў шэраг вынаходніцтваў і адкрыццяў у галіне фізіялогіі: даследаваў хуткасць кровазвароту ў арганізме з дапамогай вынайдзенага ім самім прыбора — фотагематометра; вывучыў электрычныя з'явы ў мускулатуры, нервах і паўшар'ях галаўнога мозга (сумесна з А. Бекам), працаваў над прымяненнем кандэнсатараў пры вывучэнні ўзбуджэння нерваў і мускулатуры, вызначаў цеплыню арганізмаў з дапамогай мікракаларыметра ўласнай канструкцыі. Сумесна са сваім вучнем і асістэнтам В. Шамановічам адкрыў уласцівасці гармона эмоцый — адрэналіна. Першым распачаў дакладнае вывучэнне з'явы гіпнозу, прысвяціўшы гэтай тэме шмат папулярных артыкулаў. Аўтар працы "Харчаванне людзей у Галіцыі" (Кракаў, 1894) .

Н.-Н. Цыбульскі прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці краіны. Працаваў у гарадской радзе Кракава, напісаў артыкул "Аб справе арганізацыі валасных гаспадарак" (Кракаў, 1900) і філасофскі трактат "Аб сучасным віталізме і механізме" (Кракаў, 1904). З'яўляўся правадзейным членам АН Польшчы, ганаровым сябрам таварыстваў урачоў у Пецярбургу, Кракаве, Львове, Лодзі, Вільні, сябрам Таварыства прыроды імя Каперніка, уваходзіў у Таварыства сяброў навукі ў Познані. У 1918 г. атрымаў ад Польскай АН ўзнагароду з фонду Ежманоўскіх. Восенню 1936 г. пасмяротна адзначаны Камандорскім крыжам Адраджэння Польшчы.

Іван Драўніцкі (в. Камарова Мядзельскага р-на)

Цытовіч Мікалай

***Цытовіч Мікалай Аляксандравіч** (26.5.1900, в. Бель 1 Крычаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Крычаўскі р-н Магілёўскай вобл. – 28. 4.1984, Масква), геолаг, доктар геолага-мінералагічных навук, прафесар. Член-карэспандэнт АН СССР (з 1943). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1950). Герой Сацыялістычнай працы (1980).*

М. Цытовіч нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння Ленінградскага інстытута грамадзянскіх інжынераў (1927) доўгі час працаваў выкладчыкам у вышэйшых навучальных установах Ленінграда. З 1943 г. — навуковы супрацоўнік Інстытута мерзлатазнаўства Сібірскага аддзялення АН СССР, а ў 1947–1952 гг. узначальваў Якуцкі філіял СА АН СССР. Асноўную ўвагу М. Цытовіч удзяляў пытанням механікі грунтаў і інжынернай геалогіі пры будаўніцтве ва ўмовах Крайняй Поўначы. За навуковыя працы ў гэтай галіне быў узнагароджаны Сталінскай прэміяй. З 1953 г. працаваў прафесарам Маскоўскага інжынерна-будаўнічага інстытута, узначальваў камісіі па выбару пляцовак пад будаўніцтва Куйбышаўскай, Ангарскай і Вілюйскай ГЭС.

М. Цытовіч выдаў шэраг падручнікаў для вышэйшых навучальных устаноў па механіцы грунтоў, якія неаднаразова перавыдаваліся. Галоўныя працы М. Цытовіча — "Асновы механікі грунтоў" (Л.; М., 1934); "Разлік асадак фундаментаў" (Л.; М., 1941); "Механіка грунтоў: Вучэбны дапаможнік для ВНУ" (М.; Л., 1951); "Матэрыялы да IV Міжнароднага кангрэса па механіцы грунтаў и фундаментабудавання" (Пад рэд. М. А. Цытовіча. М., 1957); "Механіка грунтаў: Кароткі курс для ВНУ" (М., 1983). М. Цытовіч з'яўляецца заснавальнікам вучэння аб механіцы мёрзлых грунтоў. Ён даследаваў устойлівасць фундаментаў розных збудаванняў ва ўмовах вечнай мерзлаты і сфармуляваў асноўныя прынцыпы будаўніцтва ў гэтай зоне, распрацаваўшы метады вызначэння фізіка-механічных і геалагічных уласцівасцей мёрзлых грунтоў. М. Цытовіч быў абраны Ганаровым прэзідэнтам Нацыянальнага камітэта СССР Міжнароднага таварыства механікі грунтаў.

За ўклад у развіццё айчыннай геалагічнай навукі М. Цытовіч узнагароджаны двума ордэнамі Леніна і ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Валерый Ярмоленка

Цытрон Шмуэль Лейб

***Цытрон Шмуэль Лейб** (1860, Мінск — 1930, Вільня), яўрэйскі пісьменнік, журналіст.*

Ш.-Л. Цытрон паходзіў з сям'і вядомых у Мінску гандляроў. Яго бацька, Мошэ Якаў, сам займаўся навучаннем сына. Пасля смерці бацькі дзесяцігадовы хлопчык вымушаны быў блукаць па іешывах. Апошняй з іх была валожынская, адкуль яго, самага юнага сярод трохсот вучняў, выключылі за чытанне кніг яўрэйскіх асветнікаў. У 1876 г. Ш.-Л. Цытрон пры падтрымцы вядомага грамадскага дзеяча, журналіста, рэдактара часопіса "Ха-шахар" Перэца Смаленскага паехаў у Вену, адкуль праз паўгода пераехаў у Вроцлаў і некаторы час вучыўся ў равінскай семінарыі. У 1877 г. даслаў першую карэспандэнцыю ў газету "Ха-магід", а праз год было апублікавана яго першае апавяданне на іўрыце. У 1882 — 1883 гг. выкладаў іўрыт ў г. Простэкене (Усходняя Прусія), стаў пастаянным супрацоўнікам газет "Ха-магід" і "Ха-шахар". У 1884 г. пераехаў у Вільню, дзе яўрэйскія актывісты арганізацыі "Ховевей Цыён" апублікавалі зроблены Ш.-Л. Цытронам пераклад на іўрыт трактата аднаго з першых рускіх сіяністаў Л. Пінскера "Аўтаэмансіпацыя — заклік рускага яўрэя да сваіх супляменнікаў". У 1886 г. пераехаў у Варшаву, дзе апублікаваў свае новыя апавяданні на іўрыце. У 1886 — 1887 гг. быў галоўным рэдактарам альманаха "Кнесет Ісраэль". Ажаніўшыся, жыў з сям'ёй у Марыупалі, потым у Навазыбкаве Чарнігаўскай губ., працаваў настаўнікам. З 90-х гг. мінулага стагоддзя актыўна супрацоўнічаў у многіх яўрэйскіх выданнях, дзе акрамя публіцыстычных і крытычных артыкулаў, друкаваў апавяданні і нарысы па гісторыі літаратуры. У 1904 г. зноў пасяліўся ў Вільні і стаў супрацоўнікам газеты "Ха-зман". У 1911 — 1915 гг. у часопісе "Хаолам" апублікавана серыя яго нарысаў па гісторыі друку на іўрыце, у 1914 г. у Адэсе — кніга "Гісторыя Хібат Цыён". На той час ён пісаў ужо на ідыш. Вясной 1916 г., з пачаткам нямецкай акупацыі Вільні, Цытрон стаў інспектарам школ Яўрэйскага цэнтральнага савета, створанага пры мясцовым самакіраванні. У незалежнай Польшчы ён быў выбраны старшынёй Віленскага аб'яднання яўрэйскіх пісьменнікаў і журналістаў, супрацоўнічаў у выданнях Марціна Бубера, лодзінскім зборніку "Блавайс", быў сурэдактарам сіянісцкага штотыднёвіка "Ідышэ цайтунг" і дадатку да яго на іўрыце "Ха-шавуа". У 1920 г. стаў сталым супрацоўнікам варшаўскай газеты "Дэр мамент", друкаваўся і ў іншых газетах. З'яўляецца аўтарам гістарычных і мемуарных кніг. Важнейшыя з іх наступныя: на ідыш — "Тры пакаленні літаратараў" (1920 — 1928), "Гісторыя перыядычнага друку" (1923), "Адступнікі" (1923 — 1927), "Вядомыя яўрэйскія жанчыны, іх жыццё і ўплыў" (1928) і інш.; на іўрыце — "Людзі і пісьменнікі" (1921), "Сіянісцкі даведнік" (1924) і інш.

Ш.-Л. Цытрон быў адным з кіраўнікоў Саюза яўрэйскіх журналістаў і яўрэйскага ПЕН-клуба, заснаваных у 1926 г.

Аляксандр Цытрон (г. Афула, Ізраіль)

Цэраскі Вітольд

Цэраскі Вітольд Карлавіч *(27.4.1849, Случчына – 29.5.1925, Масква), вучоны-астраном, доктар навук (1888), прафесар Маскоўскага універсітэта (1889), член-карэспандэнт Пецярбургскай акадэміі навук (1914), педагог, папулярызатар навукі.*

В. Цэраскі скончыў Слуцкую гімназію (цяпер сярэдняя школа № 1) і паступіў у Маскоўскі універсітэт, які завяршыў у 1871 г. З 1878 г. працаваў на пасадзе астранома-назіральніка ў астранамічнай абсерваторыі Маскоўскага універсітэта. У 1883 г. абараніў магістарскую, а ў 1888 г. – доктарскую дысертацыі, прысвечаныя астрафотаметрычным даследаванням. У 1890 – 1916 гг. – дырэктар астранамічнай абсерваторыі. Працуючы там, ён абсталяваў яе першакласным абсталяваннем.

В. Цэраскі з'яўляецца заснавальнікам маскоўскай школы фотаметрыстаў. Ён распрацаваў методыку фотаметрычных назіранняў і ўдасканаліў фотаметр Цэльнера, які з 1881 г. называецца фотаметрам Цэльнера-Цэраскага. У 1875 – 1903 гг. В. Цэраскім быў вымераны бляск больш за 500 зорак. Быў адным з першых даследчыкаў, якія вызначылі зорную велічыню Сонца (1903). В. Цэраскі ўпершыню эксперыментальна вызначыў ніжэйшую мяжу тэмпературы Сонца ў 3500°. У 1885 г. ён адкрыў існаванне так званых серабрыстых воблакаў і сумесна з А. Белапольскім вызначыў, што яны знаходзяцца на вялікай вышыні ад зямлі (каля 80 км). Некаторыя навуковыя працы В. Цэраскага прысвечаны вывучэнню метэораў. Ён прапанаваў арыгінальны метад вызначэння каардынат радыянта метэорных патокаў; сканструяваў прыбор для вызначэння вуглавой хуткасці метэораў, асаблівы акуляр для назірання за сонечнымі плямамі, геліёметр для вызначэння формы сонечнага дыска і пабудаваў "астранамічны" бінокль. З 1895 г. па яго ініцыятыве пачалося сістэматычнае фатаграфаванне неба. У час Прэсненскага паўстання ў Маскве (1905) фізічна выратаваў ад разбурэння абсталяванне абсерваторыі, якая была ў цэнтры паўстання.

У 1917 – 1922 гг В. Цэраскі жыў у Феадосіі (Крым), дзе пазнаёміўся з рускім паэтам М. Валошыным, які прысвяціў яму верш "Памяти В. К. Церасского. Он был из тех..." (1925). У пачатку 20-х гадоў апынуўся ў цяжкім фінансавым становішчы: быў пазбаўлены харчовага пайка, была рэквізавана палавіна яго невялікай кватэры. На жыццё ўрокамі французскай мовы зарабляла яго жонка Лідзія Цэраская, вядомы астраном. У 1922 г. з'ехаў у Маскву, дзе таксама жыў у беднасці. У 1953 г. у Маскве была выдадзена яго кніга "Выбраныя працы па астраноміі" (на рускай мове).

Таццяна Махнач

Цярэшчанкаў Яфім

Цярэшчанкаў Яфім Якаўлевіч *(1893, в. Грусіна Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Крычаўскі р-н Магілёўскай вобл. — ?), рускі пісьменнік, педагог.*

Я. Цярэшчанкаў нарадзіўся ў беднай сялянскай сям'і. У 1912 г. паехаў на Далёкі Усход у пошуках лепшай долі, будаваў Амурскую чыгунку, настаўнічаў. З пачаткам Першай сусветнай вайны вярнуўся на бацькаўшчыну, каб добраахвотнікам пайсці на фронт, настаўнічаў у Клімавіцкім павеце, быў у бежанцах, ваяваў у Галіцыі. Пасля дэмабілізацыі ў Гомелі зноў выехаў на Далёкі Усход, прымаў удзел у грамадзянскай вайне. Першым наборам паступіў у Далёкаўсходні універсітэт і з таго часу быў на выкладчыцкай працы.

Пісаць Я. Цярэшчанкаў пачаў у 60-я гады. У першай кнізе "Сустрэчы на дарогах: Запіскі настаўніка" (Уладзівасток, 1954, 1968; М., 1955) ён апісаў сваё дзяцінства ў Беларусі, падзеі Першай сусветнай вайны, лёс сваіх аднавяскоўцаў на Далёкім Усходзе. Потым ва Уладзівастоку выйшлі яго кнігі "Там, дзе пачынаецца дзень" (1955), "Жэня Журавіна" (1958, 1963); "Край сямі скарбаў" (1959, 1966), "Дырэктар школы" (1962); "Саду квітнець" (1962). Пра творчасць Я. Цярэшчанкава пісалі Ю. Лясота ("Спявак працы і жыцця". Далёкі Усход. 1968. № 5), Г. Халілецкі ("Чалавек і яго справа". Далёкі Усход. 1961. № 3).

Алесь Баркоўскі (Якуцк)

Чапковіч Сяргей

Чапковіч Сяргей Аляксандравіч *(1905, Драгічын Кобрынскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Брэсцкай вобл. – ?), журналіст.*

Нарадзіўся С. Чапковіч у беднай сялянскай сям'і. У 1915 г. разам з бацькамі перасяліўся ў Бабруйск. Батрачыў у вёсцы, у 1923 г. вярнуўся ў Бабруйск, працаваў на сезонных будаўнічых работах райваенінжынерства і лесазаводзе № 1, уступіў у камсамол, дзе выявіў арганізацыйныя здольнасці. У 1926 г. быў абраны ў склад пленума бюро Бабруйскага акружкама камсамола, а ў 1927 г. — сакратаром Краснаслабодскага райкама камсамола. У 1930 г.

мабілізаваны на партыйную работу ў Клічаўскі райкам партыі, быў сябрам рэдкалегіі раённай шматтыражкі. У 1932 г. камандзіраваны на курсы пры Маскоўскім камуністычным інстытуце журналістыкі. Пасля заканчэння, у 1935 г., накіраваны ў Галоўнае кіраўніцтва Паўночнага марскога шляху рэдактарам мурманскай газеты "Звезда Заполярья", а ў 1937 г. пераведзены рэдактарам газеты якуцкага палітаддзела Паўночнага марскога шляху "Полярный большевик". З 1943 г. — парторг Янскага рачнога параходства. У партыйных характарыстыках указвалася, што ён "добра валодае беларускай мовай".

Алесь Баркоўскі (Якуцк)

Чараванін Фёдар

Чараванін Фёдар Андрэевіч *(сапр. прозв. Ліпкін; 3.11.1869, Чэрыкаў Магілёўскай губ., цяпер вобл. – 8.3.1938), рэвалюцыянер, публіцыст.*

З сям'і сапраўднага стацкага саветніка, чэрыкаўскага міравога суддзі. У час вучобы на юрыдычным факультэце Пецярбургскага універсітэта быў выключаны за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях. З 1891 г. у сацыял-дэмакратычным руху, член РСДРП з 1890 г., меншавік. Удзельнік рэвалюцыі 1905–1907 гг. Дэлегат IV (1906) і V (1907) з'ездаў РСДРП. У гады рэакцыі ўдзельнічаў у выданнях ліквідатарскага накірунку, у меншавіцкім пяцітомніку "Грамадскі рух у Расіі ў пачатку XX ст.". На жнівеньскай канферэнцыі меншавікоў (1912) выбраны членам АК. У час Першай сусветнай вайны "абаронец", працаваў у спажывецкай кааперацыі, член Савета Саюза рабочых спажывецкіх таварыстваў у Петраградзе. У 1917 г., пасля ўтварэння Петраградскага Савета РСД, член яго выканкама (з 23 сакавіка прадстаўнік у Цэнтральным харчовым камітэце). У сакавіку зноў увайшоў у РСДРП і ў рэдакцыю "Рабочей газеты". Пасля Лютаўскай рэвалюцыі актыўна выступаў за рэгуляванне ўсяго эканамічнага жыцця. Заклікаў Часовы ўрад устанавіць дзяржаўны кантроль у прамысловасці. Уваходзіў у рэдакцыю часопіса "Труд", газеты "Наш голас" (орган Галоўнага камітэта на Украіне, Харкаў, 1917–19), "Вперед" (1917), "Рабочий Интернационал" (1917). Дэлегат I Усерасійскага з'езда саветаў РСД, дзе выступаў з дакладам. 14 ліпеня на пасяджэнні бюро ВЦВК прызначаны загадчыкам эканамічнага аддзела ВЦВК. На аб'яднаўчым з'ездзе РСДРП (19–26 жніўня) выбраны членам ЦК РСДРП. Хаця і не прыняў Кастрычніцкую рэвалюцыю, быў аднак прыхільнікам перамоў з бальшавікамі, за стварэнне "аднароднага сацыялістычнага ўрада". Усяляк заклікаў меншавікоў і іншыя сілы адмовіцца ад узброенай барацьбы супраць савецкай улады, выказваўся за барацьбу выключна метадамі палітычнай апазіцыі.

Са студзеня 1922 г. неаднаразова высылаўся (Разань, Калуга). У 1930 г. арыштаваны і ў красавіку 1931 г. калегіяй АДПУ прыгавораны па справе "Саюзнага бюро ЦК меншавікоў" да 5 гадоў заключэння. У маі 1935 г. высланы ў Акмолінск. 8 сакавіка 1938 г. ваенная калегія Вярхоўнага суда СССР прыгавораны да расстрэлу. Поўнасцю рэабілітаваны ў 1939 г.

Алесь Карлюкевіч

Чарненка Майсей

Чарненка Майсей Барысавіч *(27.10.1908, Гомель – 26.11.1965, Ленінград, Расія), журналіст-палярнік, пісьменнік.*

М. Чарненка нарадзіўся ў сям'і горнага інжынера. Скончыў Днепрапятроўскі горны інстытут (1931), працаваў на шахтах Данбаса. У 1935 г. прыняў удзел у першай савецкай экспедыцыі на ледаколе "Садко" ў высокія шыроты Паўночнага Ледавітага акіяна як карэспандэнт "Комсомольской правды". У гэтай жа якасці на ледаколе "Таймыр" прымаў удзел у выратаванні дрэйфуючай навуковай станцыі "Паўночны полюс" у Грэнландскім моры (1938). З 1939 г. М. Чарненка працаваў галоўным рэдактарам выдавецтва Галоўпаўночморшляху, а ў 1949 г. перайшоў на навуковую работу ў Арктычны інстытут (Ленінград). Тут ён распачаў выданне сістэматычных зборнікаў "Праблемы Поўначы", першы выпуск якога выйшаў у 1958 г., і зборнікаў "Летапіс Поўначы". У 1956, 1959 і 1962 гг. пад рэдакцыяй М. Чарненкі і прафесара Я. Гакеля выйшлі з друку тры тамы фундаментальнай манаграфіі "Гісторыя адкрыцця і асваення Паўночнага марскога шляху". Пад яго рэдакцыяй і з каментарыямі выйшла ў 2 тамах на рускай мове кніга нарвежскага вучонага і палярнага даследчыка Ф. Нансена "Фрам" у Палярным моры".

Імем М. Чарненкі названы пік на Зямлі Каралевы Мод у Антарктыдзе.

Валерый Ярмоленка

Чарнякевіч Іван

Чарнякевіч Іван Міхайлавіч *(9.4.1955, в. Плябанцы Пружанскага р-на Брэсцкай вобл.), мастак, грамадска-культурны дзеяч беларускай дыяспары ў Расіі.*

У 1973 г. І. Чарнякевіч закончыў Рэспубліканскую школу-інтэрнат па музыцы і выяўленчаму мастацтву ў Мінску, у 1981 г. — Ленінградскае вышэйшае мастацка-прамысловае вучылішча імя В. Мухінай. Займаецца жывапісам і дызайнам тэкстылю. Працуе ў Мастацкім фондзе (Санкт-Пецярбург). Член Саюза мастакоў Расіі. Адзін са стваральнікаў мастацкага аб'яднання "Маю гонар", у якое ўваходзяць мастакі-беларусы краін Балтыі. З 1981 г. — удзельнік мастацкіх выставак, у тым ліку выстаўкі, прысвечанай Першаму з'езду беларусаў свету ў Мінску (1993); занальных і тэматычных выставак у Санкт-Пецярбургу (1981–1998). Адбыліся таксама дзве персанальныя выстаўкі. Творы І. Чарнякевіча знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Полацкім музеі беларускага кнігадрукавання, Навагрудскім гісторыка-краязнаўчым музеі, прыватных мастацкіх зборах у многіх краінах свету.

І. Чарнякевіч прымае актыўны ўдзел у грамадска-культурнай дзейнасці беларусаў Санкт-Пецярбурга, адзін з заснавальнікаў Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу, з 1989 г. з'яўляецца нязменным членам рады таварыства.

Мікалай Нікалаеў (Санкт-Пецярбург, Расія), Ларыса Языковіч

Чарнякевіч Яніна

Чарнякевіч Яніна Міхайлаўна *(5.10.1935, в. Лапаровічы Заслаўскага р-на Мінскай вобл.), журналістка, беларускі культурны дзеяч у Польшчы.*

Я. Чарнякевіч закончыла геаграфічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. З 1959 г. жыве ў Беластоку. У 1959–1990 гг. працавала ў рэдакцыі газеты "Ніва", дзе з 1960 г. рэдагавала старонку для дзяцей "Зорка". У 1991–1997 гг. вяла на Беластоцкім радыё штотыднёвую беларускую радыёперадачу "Для школы і для дома".

Ірына Тамільчык

Чугаевіч Рыгор

Чугаевіч Рыгор Аляксандравіч *(17.11.1822, мяст. Бабінавічы Магілёўскай губ, цяпер Лёзненскі р-н Віцебскай вобл. – ?), хімік, прафесар Кіеўскага універсітэта св. Уладзіміра.*

Паходзіў Р. Чугаевіч са шляхты. Пачатковую адукацыю атрымаў у Аршанскім уездным вучылішчы (1833–1837). У 1840 г. скончыў Магілёўскую губернскую гімназію і ў тым жа годзе паступіў на філасофскі факультэт (аддзяленне прыродазнаўчых навук) Кіеўскага універсітэта св. Уладзіміра, які скончыў у 1844 г. са ступенню кандыдата. З 2-га курса яму за выдатныя поспехі была прысуджана прафесарская стыпендыя. Пасля заканчэння універсітэта быў прызначаны выконваючым абавязкі кансерватара мінералагічнага кабінета. Адначасова выкладаў натуральную гісторыю ў прыватным жаночым пансіёне і ў Інстытуце высакародных дзяўчат. З 1848 г. — старшы настаўнік матэматыкі і фізікі ў 2-ой Адэскай гімназіі. У 1850 г. атрымаў ступень магістра хіміі універсітэта св. Уладзіміра. З 1851 г. Р. Чугаевіч — ад'юнкт па кафедры хіміі Кіеўскага універсітэта св. Уладзіміра. Адначасова (1854–1856) выкладаў натуральную гісторыю і фізіку ў Кіеўскім кадэцкім корпусе. Сакратар фізіка-матэматычнага факультэта універсітэта (1852–1857). З 1857 г. — ад'юнкт па кафедры тэхналогіі. Атрымаў навуковую стажыроўку на 2 гады ў Парыж у Ecole centrale, слухаў лекцыі ў Сарбоне, Ecole de Medecine, наведваў навуковыя лабараторыі і заводы ў Бельгіі, Галандыі, Германіі, Швейцарыі. Удзельнічаў у рабоце Прамысловых выставак ў Боне, Бруселі, Турыне і Мюнхене, у 34-м з'ездзе нямецкіх прыродазнаўцаў і ўрачоў у Карлсруэ (1858), у Міжнароднай мастацка-прамысловай выстаўцы (1862, Лондан), Сусветнай выстацы ў Парыжы (1867). У 1861 г. прызначаныэкстраардынарным прафесарам на кафедры тэхналогіі. Выкладаў тут аналітычную і арганічную хімію, тэхналогію. Праводзіў практычныя заняткі са студэнтамі ў тэхнічнай лабараторыі. У 1870 г. звольнены па выслузе гадоў.

Навуковыя даследаванні Р. Чугаевіча прысвечаны растварымасці некаторых вадкасцяў у газах, вывучаў механічную дысцыляцыю, прыгатаванне анелінавых фарбаў, праводзіў фотаграфічныя даследаванні (склаў дапаможнік па фатаграфіі). Апублікаваў ў 1850 г. у Адэсе кнігу "Аб ізамерыі і поліформеннасці". Цікавіўся распрацоўкай аўтаматычнага ветравога рухавіка.

Вольга Гапоненка

Чурлёнітэ-Зубовене Данутэ

Чурлёнітэ-Зубовене Данутэ *(12.6.1910, в. Пятроўшчына Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. — ?), літоўская пісьменніца, перакладчыца.*

Д. Чурлёнітэ-Зубовене з'яўляецца дачкой літоўскага кампазітара і мастака Мікалоюса Канстанцінаса Чурлёніса і літоўскай пісьменніцы Софіі Чурлёнене. У 1929–1936 гг. вывучала гісторыю на факультэце гуманітарных навук Каўнаскага універсітэта. Напісала празаічныя творы для дзяцей: аповесць "Пёсік-разбойнік і разумніца Алдуте" (1936), казкі "Краіна калядных дзядуляў" (1939) і "Заяц-лапатун белы баярын" (1940), п'есы "Казачная краіна" (надрукавана і пастаўлена ў 1955 г.) і "Маленькая бальніца" (надрукавана ў 1955). У 1946 г. выдадзены зборнік твораў пісьменніцы "Тэатр Йонукаса Дундулюкаса", у 1957 г. зборнік "Лясная школа". У сваіх творах Д. Чурлёнітэ-Зубовене апісвае прыроду, дзяцей, жывёльны свет. Многія з іх напісаны па матывах народных казак. Займалася таксама перакладамі з іншых моваў. На літоўскую мову пераклала "Доктара Айбаліта" К. Чукоўскага (1957), "Падарожжа Блакітнай стралы" Дж. Радары (1958), "З Зямлі на Месяц" Жуль Верна (1964) і інш. творы для дзяцей. Напісала ўспаміны пра маці.

Яніна Кісялёва

Чыквін Ян

Чыквін Ян Арцёмавіч *(псеўд. Янка Дубіцкі; 18.5.1940, в. Дубічы Царкоўныя Беластоцкай вобл., цяпер Беластоцкае ваяв., Польшча), паэт, літаратуразнавец, перакладчык, доктар філалагічных навук, прафесар Універсітэта ў Беластоку.*

Нарадзіўся Ян Чыквін у сялянскай сям'і. Скончыў беларускі агульнаадукацыйны ліцэй у Бельску — Падляшскім (1959), аддзяленне рускай філалогіі Варшаўскага універсітэта (1964). Працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў Беластоку (1964–1969). З 1969 г. — асістэнт, затым ад'юнкт філіяла Варшаўскага універсітэта ў Беластоку. З 1985 г. — дацэнт кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта. З 1988 г. узначаліў польскае літаратурнае аб'яднанне "Белавежа", дзе заснаваў і пастаянна вядзе "Бібліятэчку".

Першыя вершы Я. Чыквіна надрукаваны ў 1957 г. на старонках беластоцкай "Нівы". Аўтар паэтычных зборнікаў "Іду" (1969), "Святая студня" (1970), "Неспакой" (1977), "Сонечная вязь" (1988), "Светлы міг" (1989), "Кругавая чара" (1992), артыкулаў па гісторыі беларускай і рускай літаратур, перакладаў на польскую мову. Спрабаваў свае сілы ў жанрах апавядання, драматычнага твора. У перакладзе на польскую мову ў 1983 г. выйшаў яго зборнік "На парозе свету" і "Сонечнае спляценне". У 1997 г. выйшла яго кніга "Далёкія і блізкія: Беларускія пісьменнікі замежжа", у перакладзе — "Odpoczynek przy wyschnistą żrydle" (1996).

Плённа супрацоўнічае з пісьменнікамі Беларусі. З'яўляецца сябрам ГА "Міжнародная асацыяцыя беларусістаў" і Міжнароднага ПЭН-клуба ад Беларускага ПЭН-цэнтра, членам галоўнага праўлення Саюза польскіх пісьменнікаў (1990).

Адам Мальдзіс

Чэрскі Іван

Чэрскі Іван (Ян) Дзяменцьевіч *(3(15).5.1845, б. маёнт. Свольна Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н. Віцебскай вобл. – 25.6.1892, Калыма, Расія), падарожнік.*

Нарадзіўся І. Чэрскі ў дваранскай сям'і. Пасля хатняга навучання ў 1860 г. працягваў адукацыю ў Вільні ва Урадавым (дваранскім) інстытуце. Праз тры гады за ўдзел у паўстанні пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага арыштаваны і асуджаны да высылкі ў Сібір з канфіскацыяй маёнтка і пазбаўлення дваранскага звання. Па дарозе да месца ссылкі (г. Омск) знаёміцца з вядомым геолагам М. Чаканоўскім, які абудзіў у ім цікавасць да геалагічнай геаграфіі. Гады знаходжання ў Омскай ссылцы сталі гадамі спасціжэння прыродазнаўчых навук, чаму спрыялі творчыя сувязі з падарожнікам Р. Патаніным, бібліяфілам В. Квяткоўскім і акадэмікам А. Міндэндорфам, якія жылі ў Омску. У 1869 г. у сувязі з абвастрэннем хваробы сэрца І. Чэрскі быў пераведзены з казармы лінейнага батальёна, дзе ён служыў рэкрутам, на вольнае пасяленне ў Омск. Ён адразу ж звярнуўся да пецярбургскіх улад з просьбай аб пераездзе ў Казань для паступлення ва універсітэт. Аднак у гэты час ва універсітэцкіх цэнтрах Расіі пашыраўся падпольны рэвалюцыйны рух і вобраз ссыльнага ў студэнцкай форме для царскіх саноўнікаў быў малапрывабным. Яму адмовілі.

З'явілася першая навуковая праца І. Чэрскага — "Нарыс геагнастычнай будовы наваколля г. Омска", якая абвергла сцвярджэнне славутага нямецкага прыродазнаўца А. Гумбальта аб тым, што ў мінулым Паўночны Ледавіты акіян злучаўся з Аральскім, Каспійскім, Чорным і Міжземным морамі. Па хадайніцтву акадэміка Міндэндорфа

восенню 1871 г. Чэрскага перавялі на вольнае пасяленне ў Іркуцк для работы ў Сібірскім аддзяленні Расійскага геаграфічнага таварыства. Пасля няўдачы з Казанскім універсітэтам ён імкнуўся ў гэты горад, дзе знаходзіўся адзіны (на ўсю велізарную прастору ад Урала да Ціхага акіяна) цэнтр ведаў і асветы, навукі і культуры — САРГТ. Асаблівую групу даследчыкаў складалі выгнаннікі 1863 г., і сярод іх — ужо вядомы яму Чаканоўскі і прафесар Варшаўскага універсітэта У. Дыбоўскі. Чэрскага прынялі на работу адразу на тры пасады — бібліятэкара, пісара і кансерватара музея; яму даручылі экспедыцыі на тэрыторыі Іркуцкай губерні для геолага-геаграфічнага даследавання Усходніх Саянаў. Амаль у кожным выпуску "Вестей Географического общества" з'яўляліся арыгінальныя артыкулы Чэрскага па матэрыялах даследаванняў горных сістэм Прыбайкалля. За геаграфічныя даследаванні яго ўзнагародзілі сярэбраным медалём Імператарскага беаграфічнага таварыства (1876), а за геалагічныя — малым залатым медалём (1878).

У той час аўтарытэты ў галіне прыродазнаўства спрабавалі разгадаць таямніцу паходжання Байкала. У апошняй чвэрці XIX ст., мусіць, ніводзін геолаг Расіі не быў так падрыхтаваны для даследаванняў праблем Байкала, як Чэрскі. І ў 1877 г. Геаграфічнае таварыства паставіла перад ім складаную задачу — комплекснае вывучэнне ўзбярэжжа Байкала па ўсяму перыметру гэтага унікальнага аб'екта прыроды. За чатыры гады Чэрскі зрабіў практычна немагчымую для аднаго чалавека работу па складанню 10-вёрстнай геолага-геамарфалагічнай карты Байкала, якая выкарыстоўвалася на практыцы да 40-х гг. XX ст. і цяпер не згубіла свайго навуковага значэння. Карта была прадстаўлена на Міжнародным геаграфічным кангрэсе ў Венецыі, а яе аўтар заваяваў сусветную вядомасць.

Вясной 1885 г. Расійская акадэмія навук прапанавала Чэрскаму правесці шырокамаштабнае геолага-геаграфічнае абследаванне Сібірскага тракта ад Іркуцка да Урала. Па яго экспедыцыйна-картаграфічных матэрыялах намячалася праектаванне Транссібірскай чыгуначнай магістралі (па яго ж матэрыялах ажыццяўлялася і праектаванне Кругабайкальскай чыгункі — унікальнага помніка тэхнічнай думкі Расіі пачатку XX ст.). Па завяршэнню гэтай экспедыцыі Чэрскаму належала з'явіцца ў Пецярбург для выканання заданняў Акадэміі навук і Расійскага геаграфічнага таварыства. Гэта азначала, што РГТ нарэшце дамаглося канчатковага "даравання" яму за "памылкі маладосці". Чэрскаму вярталася дваранскае званне. Разам з жонкай і сынам ён пакінуў сталіцу і вярнуўся ў звыклую экспедыцыйную стыхію. Зрабіў тры маршруты да Падунскага парога, па Енісеі і па Мінусінскай катлавіне. Усё гэта, з улікам ранейшых даследаванняў у раёне Байкала, дазволіла яму ўпершыню намаляваць стройную палеагеаграфічную карціну Сібіры паміж Ябланавым і Уральскім хрыбтамі (за гэтую працу ён у 1886 г. быў узнагароджаны вялікім залатым медалём імя Ф. Літке).

У 1886 г. перадавыя навукоўцы Пецярбурга з захапленнем сустрэлі Чэрскага. Яму была прапанавана праца ў Заалагічным музеі. Ён выступаў з дакладамі, рэдагаваў кнігі, пісаў артыкулы. "Лепшы знаўца Сібіры" — рэпутацыя, якая адразу ж замацавалася за Чэрскім у навуковых колах расійскай сталіцы.

І. Чэрскі пражыў у Санкт-Пецярбургу 5 гадоў (1886–1891). У гэты перыяд ён па рэкамендацыі прэзідэнта РГТ П. Сямёнава-Цян-Шанскага поўнасцю "перапісаў" састарэлае шматтомнае "Землезнаўства Азіі" К. Рытэра на падставе ўласных шматгадовых даследаванняў Усходняй Сібіры. У параўнанні з вульгарным геаграфізмам Рытэра погляды Чэрскага на фізіка-геаграфічныя ўмовы Сібіры былі намнога больш пераканаўчымі. Многія яго працы і цяпер не згубілі навуковай каштоўнасці (тэорыя эвалюцыйнага развіцця рэльефа, палеатэктанічная схема Усходняй Сібіры, араграфічная схема Паўночнай Азіі і інш.). Яны прынеслі апантанаму даследчыку рэпутацыю "геалагічнага географа" і падарожніка сусветнага маштабу.

Зімой 1891 г. І. Чэрскі па заданню Акадэміі навук накіраваўся ў калыма-індыгірскую экспедыцыю па амаль недаследаванаму краю Сібіры, які заставаўся белай плямай на геаграфічнай карце Расіі. Асабліва каштоўнымі аказаліся геаграфічныя меркаванні І. Чэрскага па горных утварэннях паміж Верхаянскім хрыбтом і Калымой. У блытаніне рознанакіраваных горных ланцугоў, пройдзеных яго экспедыцыяй летам 1891 г., яму ўдалося выявіць пануючую заканамернасць. Гэтыя меркаванні, пакладзеныя на карту, былі поўнасцю пацверджаны ў XX ст. экспедыцыяй С. Обручава, па прапанове якога гэтая горная краіна працягласцю ў 1500 км была названа хрыбтом Чэрскага.

25 чэрвеня 1892 г. стан здароўя вучонага рэзка пагоршыўся, і ён памёр на экспедыцыйным баркасе ў нізоўях Калымы. 1 чэрвеня жонка, Маўра Чэрская пахавала мужа ў зазімцы ля вусця Амалона — прытока Калымы.

Валерый Ярмоленка

Шакавец Лявон

Шакавец Лявон Рыгоравіч *(8.8.1947, в. Хаўхоліца Барысаўскага р-на Мінскай вобл.), рэдактар газеты беларусаў Латвіі "Прамень".*

Л. Шакавец нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння мясцовай сямігодкі вучыўся ў Гомельскім рачным тэхнікуме на аддзяленні "капітаны рачнога плавання". З-за адсутнасці матэрыяльнай падтрымкі вярнуўся ў сваё сяло і працягваў навучанне ў Кішчына-Слабодскай сярэдняй школе. Служыў у арміі. Вучыўся на журналісцкім

факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Тры гады працаваў у рэдакцыі старадарожскай раённай газеты. Пасля атрымання дыплома па размеркаванні трапіў у Рыгу, у рэдакцыю рэспубліканскай газеты "Советская Литва", дзе працаваў да яе закрыцця. Газетную кар'еру пачынаў з літсупрацоўніка, быў адказным сакратаром, намеснікам рэдактара. Адзін са стваральнікаў рускай грамадскай газеты "Панорама Латвии", сёння вельмі папулярнай.

Л. Шакавец актыўна займаецца культурна-грамадскай дзейнасцю. Прымае ўдзел у розных імпрэзах, абрадавых святах, якія ладзіць беларускае таварыства "Прамень", спявае ў ансамблі "Надзея". Прадстаўляе ў Латвіі Беларускае тэлебачанне. Часта выступае з артыкуламі на старонках газеты "Прамень", якую рэдагуе з часу яе заснавання (1995).

Алесь Карповіч (Рыга)

Шапіра Фёдар

Шапіра Фёдар Львовіч *(6.4.1915, Віцебск – 30.1.1973, Масква), фізік, прафесар. Член-карэспандэнт АН СССР (1968). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1971), прэміі імя І. В. Курчатава (1977).*

Ф. Шапіра закончыў у 1941 г. Маскоўскі універсітэт. У 1945–1958 гг. працаваў у Фізічным інстытуце АН СССР, з 1959 г. — намеснік дырэктара лабараторыі нейтроннай фізікі Аб'яднанага інстытута ядзерных даследаванняў (г. Дубна). Адначасова з 1967 г. прафесар Маскоўскага універсітэта.

Навуковыя даследаванні Ф. Шапіры прысвечаны нейтроннай фізіцы. Эксперыментальна ён вывеў і абгрунтаваў адхіленне ад закона Фермі, прапанаваў новы метад палярызацыі нейтронаў фільтрацыяй іх праз палярызаваную пратонную мішэнь і метад дыфракцыі нейтронаў для нейтронна-структурных даследаванняў, які заснаваны на вымярэнні энергіі нейтронаў пры пэўным (зададзенным) вугле дыфракцыі. Прапанаваў і прымяніў метад зваротнай геаметрыі для вывучэння няпругкіх узаемадзеянняў павольных нейтронаў. Упершыню стварыў сістэму, якая аб'яднала ў сабе імпульсны рэактар з электронным інжэктарам. Выказаў і ажыццявіў на практыцы ідэю вымярэння магнітных момантаў нейтронных рэзанансаў па іх зрухах ў магнітным полі. У 1968 г. упершыню атрымаў пучок ультрахалодных нейтронаў і эксперыментальна пацвердзіў эфект іх поўнага адлюстравання пры любых вуглах падзення.

Вольга Гапоненка

Шаховіч Ігар

Шаховіч Ігар Расціслававіч *(13.6.1961, Калінінград, Расія), фізік, грамадскі дзеяч беларускай дыяспары ў Расіі.*

І. Шаховіч нарадзіўся ў беларускай сям'і. Яго бацька, Расціслаў Міхайлавіч, родам з Полаччыны, маці, Валянціна Фёдараўна, — са Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл. Менавіта маці, настаўніца беларускай і рускай моваў, навучыла хлопчыка беларускай мове, зацікавіла роднай літаратурай. У 1968 г. І. Шаховіч пайшоў у 1-шы клас сярэдняй школы № 12 г. Калінінграда, якую скончыў у 1978 г. Вышэйшую адукацыю атрымаў у Калінінградскім дзяржаўным універсітэце, паступіўшы туды ў 1978 г. на фізічны факультэт. Пасля заканчэння універсітэта (1983) на працягу двух гадоў працаваў інжынерам-фізікам у Доследным канструктарскім бюро вайсковага накірунку. З 1984 г. выкладаў фізіку ў Ябланеўскай сярэдняй школе Гур'еўскага р-на Калінінградскай вобл. У 1991 г., адышоўшы ад выкладчыцкай дзейнасці, вяртаецца ў Калінінград, дзе прымае самы актыўны удзел у стварэнні Таварыства беларускай культуры "Каралявец". Пасля рэгістрацыі таварыства быў выбраны яго старшынёй. У 1992 г. І. Шаховіч стварыў камерцыйную фірму, якая займаецца гандлем кніг, у тым ліку і кніг беларускіх пісьменнікаў, выдадзеных у Мінску.

Цяпер І. Шаховіч прымае актыўны ўдзел у культурна-грамадскім жыцці Калінінградчыны. Па ініцыятыве Таварыства пад яго кіраўніцтвам у розных гарадах Калінінградскай вобл. праводзяцца Дні культуры Беларусі, вечарыны, у якіх бяруць удзел дзеячы культуры і мастацтва з Беларусі, ладзяцца выстаўкі беларускіх мастакоў. Сам І. Шаховіч — чалавек адукаваны ў пытаннях беларускай гісторыі, добры знаўца беларускай літаратуры, фальклору і музыкі.

У планах І. Шаховіча — адкрыццё помніка беларускаму першадрукару Ф. Скарыне, стварэнне нядзельнай беларускай школы. Ён удзельнічае ў мерапрыемствах, якія ладзяць Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына", Міністэрствы культуры і адукацыі. У 1997 г. выбраны членам Вялікай рады ЗБС "Бацькаўшчына".

Пятрусь Капчык (Ізяслаў, Украіна)

Шаховіч Міхась

Шаховіч Міхась *(псеўд. Міхаль Пашкоўскі; 20.11.1953, в. Сакі Беластоцкага ваяв., Польшча — 5.6.2000, Кнышын, Польшча), беларускі і польскі журналіст, паэт, фальклярыст, выдавец.*

М. Шаховіч паходзіў з сялянскай сям'і. Вучыўся ў Бельскім беларускім ліцэі. Скончыў беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта Варшаўскага універсітэта (1977). З 1 жніўня 1975 г. да снежня 1984 г. працаваў у беларускім тыднёвіку "Ніва". З 1 студзеня 1985 г. да снежня 1990 г. адказн сакратар польскага штомесячніка "Kontrasty". Затым паўтара гады кіраваў выдавецкім прадпрыемствам "Пагранічча".

На працягу пяці год у "Ніве" вёў рубрыку "З народнай абраднасці", дзе публікаваў тэксты народнай творчасці з польска-беларускага культурнага сумежжа. У такім жа аспекце друкаваў матэрыялы пад рубрыкай "З народных гаворак". У 1982 г. пад яго рэдакцыяй выйшаў навуковы зборнік "Мост праз стагоддзі" — плён дзвюх навуковых сесій пад той жа назвай. Як паэт дэбютаваў у 1974 г. у "Ніве" вершам "Туды". Аўтар васьмі літаратурных зборнікаў — "Прамінанне" (1978), "Святая ноч" (1979), "Вада ў рэшаце" (1984), пераклад на польскую мову "Woda w przetaku" (1990), "Напевы" (1987), "Рапсодыя" (1993), "Кліч" (1993), "Пад сузор'ямі" (1998). Член праўлення Беларускага літаратурнага аб'яднання "Белавежа". Сябар Саюза польскіх пісьменнікаў (1984).

Ірына Тамільчык

Швед Віктар

Швед Віктар Мікітавіч *(крыпт. В. Ш.; 23.3.1925, в. Мора Беластоцкага ваяв., Польшча), беларускі паэт, грамадскі дзеяч. Заслужаны дзеяч культуры Польшчы (1971).*

Нарадзіўся В. Швед у сялянскай сям'і. Да вайны вучыўся ў польскай пачатковай школе, дзесяцігодцы ў в. Орля. Скончыў Беларускі ліцэй у Бельску-Падляшскім (1946), Галоўную школу замежных спраў у Варшаве (1951), аддзяленні журналістыкі (1955) і беларускай філалогіі (1969) Варшаўскага універсітэта. Актыўны дзеяч Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы. Да выхаду на пенсію працаваў у выдавецтве "Ксёнжка і ведза" ў Варшаве. Удзельнік літаратурнага аб'яднання "Белавежа" (Беласток).

Пісаць вершы В. Швед пачаў у пятым класе пачатковай школы на польскай мове і мясцовым дыялекце. У 1940 г. з сшыткам беларускіх вершаў удзельнічаў у алімпіядзе дзіцячай творчасці ў Бельску-Падляшскім. У час акупацыі спрабаваў пісаць па-руску. Друкавацца пачаў у 1957 г. на старонках беластоцкай беларускай газеты "Ніва". Аўтар паэтычных зборнікаў "Жыццёвыя сцежкі" (Беласток, 1967), "Дзяцінства прыстань" (Беласток, 1975), "Дружба" (Мн., 1976), "Мая зялёная Дубровія" (Мн., 1990), "Родны схоў", "Вясёлка" (Беласток, 1991). Творы В. Шведа публікаваліся ў літаратурных альманахах "Мой родны кут", "Белавежа", зборніку "Літаратурная Беласточчына", на старонках газеты "Ніва", часопіса "Полымя", у падручніках беларускай мовы, выдадзеных у Польшчы і ЗША, штогадовых беларускіх календарах (Беласток).

Асноўныя рысы паэзіі В. Шведа — непасрэднасць, шчырасць, адкрытае выяўленне грамадзянскай і патрыятычнай пазіцый. Творчае крэда В. Шведа выкладзена ў вершы "Я — беларус" ("Я — беларус і гэтым ганаруся..."). Паэт звычайна выяўляе сябе як змагар за беларускасць сваёй "малой радзімы", за беларускую мову. Вершы В. Шведа паводле манеры традыцыйныя, поўняцца даступнымі параўнаннямі, метафарамі. У вершах для дзяцей паэт выступае выдатным знаўцам іх бачання і разумення навакольнага свету. Паэзія В. Шведа натхніла многіх кампазітараў на стварэнне песень, у тым ліку дзіцячых. В. Швед займаецца перакладам з польскай мовы на беларускую (акрамя вершаў пераклаў таксама школьны падручнік па геаграфіі), а з беларускай, рускай, украінскай – на польскую. Сябар Саюза польскіх пісьменнікаў (1977).

Уладзімір Казбярук, Святлана Сачанка

Шклярэўскі Ігар

Шклярэўскі Ігар Іванавіч *(25.6.1938, г. п. Бялынічы Магілёўскай вобл.), рускі і беларускі паэт, празаік, перакладчык. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1987).*

Нарадзіўся І. Шклярэўскі ў сям'і настаўніка. У 1955 г. скончыў Бялыніцкую сярэднюю школу. Працаваў фармоўшчыкам, токарам на заводах Магілёва, служыў матросам гандлёвага флота на Далёкім Усходзе, працаваў у рэдакцыі Анучынскай раённай газеты ("Приморский край"), затым — "Зорьки" (Мінск). У 1960–1965 вучыўся ў Літаратурным інстытуце імя М. Горкага, пасля заканчэння якога жыве ў Маскве. Пераехаўшы ў Маскву, стаў членам рэдкалегіі часопіса "Юность", Грамадскага савета "Литературной газеты". Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў, залатым знакам паэтычнага тэатра (Балгарыя). На грошы ад Дзяржаўнай прэміі СССР ім было пасаджана 18 гектараў лесу ў чарнобыльскай зоне — на ўкраінскім і беларускім Палессі.

Першы артыкул І. Шклярэўскага датуецца 1955 г., першы друкаваны верш — 1956 г. Аўтар зборнікаў паэзіі "Я іду!" (Мн., 1962), "Лодка" (М., 1977), "Фартуна" (М., 1968), "Рэўнасць" (М., 1974), "Пахаладанне" (М., 1975), "Дазорная галінка" (Мн., 1975), "Неназваная сіла" (М., 1978), "Госць" (Мн., 1980), "Тайнік" (М., 1981), кнігі прозы "Цень птушкі" (М., 1976), нататак пра літаратуру "Паэзія — львіца з грывай" (М., 1986). Увагу паэта прыцягваюць дарагі сэрцу куток Магілёўскай зямлі, запаветныя сцяжынкі над дняпроўскімі кручамі, пасляваеннае дзяцінства. Сустрэчы і развітанні, маладосць і каханне — асноўныя матывы яго паэтычных твораў. Паэт разважае над складанымі духоўнымі, экалагічнымі праблемамі сучаснасці, гісторыяй славянскага адзінства, над лёсам роднай культуры, чалавека, яго адносінамі да культуры. Адной з асноўных у творчасці апошніх гадоў стала тэма чарнобыльскай бяды. Гуманістычныя ідэалы выяўляюцца у паэмах І. Шклярэўскага "Слова пра Кулікова поле" (па матывах "Сказання пра Мамаева пабоішча"), "Слова пра мір". Выступае і як крытык. На рускую мову пераклаў "Слова аб палку Ігаравым" (гэты пераклад стаў хрэстаматыйным), "Песню пра зубра" М. Гусоўскага, вершы Я. Купалы, М. Багдановіча, Р. Барадуліна, П. Броўкі, Г. Бураўкіна, А. Вялюгіна, П. Панчанкі, А. Пысіна, М. Танка і інш. На беларускую мову творы І. Шклярэўскага перакладалі Р. Барадулін, В. Ярац. Яго творы перакладзены на многія мовы. Сябар Саюза пісьменнікаў з 1964, з 1968 — Маскоўскай пісьменніцкай арганізацыі.

Любоў Гарэлік

Школьнікаў Іосіф

Школьнікаў Іосіф Бенцыянавіч *(25.9.1912, Бабруйск – 23.6.1964, Масква), палярны даследчык.*

Нарадзіўся І. Школьнікаў у рабочай сям'і. Сваё прызванне знайшоў не адразу: пачынаў вучыцца ў Тамбоўскай авіяшколе, потым у Ленінградскай лесатэхнічнай акадэміі. Але калі быў створаны Гідраграфічны інстытут Галоўпаўночмаршляху, І. Школьнікаў у ліку лепшых студэнтаў ленінградскіх ВНУ перайшоў туды і ў 1939 г. паспяхова закончыў інстытут. Яшчэ студэнтам ён уступіў на шлях палярнага даследчыка. Першай яго зімоўкай быў удзел у дрэйфе ледакольнага парахода "Георгій Сядоў" (1937–1938). Пасля заканчэння Гідраграфічнага інстытута некаторы час працаваў на р. Лена і Індыгірка. З ліпеня 1941 г. І. Школьнікаў прымаў удзел у Вялікай Айчыннай вайне, якую закончыў з 4 узнагародамі. У радах Чырвонай Арміі ён заставаўся да 1947 г. Пасля дэмабілізацыі вярнуўся ў палярную гідраграфію і адразу ўзначаліў гідраграфічную экспедыцыю на Новую Зямлю. З 1950 г. працаваў у Міністэрстве марскога флоту на пасадзе кіраўніка аддзела гідраграфічных даследаванняў, неаднаразова на кароткі тэрмін выязджаў у Арктыку.

Імем І. Школьнікава названы мыс на ўсход ад Чаўнскай губы (узбярэжжа Чукоткі) і праліў у Карскім моры.

Валерый Ярмоленка

Шкялёнак Міхаіл

Шкялёнак Міхаіл Міхайлавіч *(2.8.1950, в. Пекаціна Полацкага, цяпер Дзісненскага р-на Віцебскай вобл.), прадпрымальнік, беларускі грамадскі дзеяч і мецэнат.*

М. Шкялёнак нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У 1954 г. сям'я пераехала ў Днепрапятроўскую вобл. У 70-х гг. жыў у Томскай вобл. Працаваў у леспрамгасе слесарам, вадзіцелем. Скончыў Томскі тэхнікум грамадскага харчавання, працаваў на розных пасадах у сістэме грамадскага харчавання. У 1980 г. скончыў Маскоўскі Інстытут народнай гаспадаркі імя В. Пляханава. З пачатку 90-х гг. узначальваў акцыянернае камерцыйна-вытворчае таварыства "Рух", цяпер — генеральны дырэктар індывідуальна-прыватнага прадпрыемства ў Маскве.

М. Шкялёнак — актыўны ўдзельнік кансалідацыйнага руху беларускай дыяспары Масквы і Падмаскоўя. У складзе аргкамітэта ўдзельнічаў у заснаванні Маскоўскага таварыства беларускай культуры імя Ф. Скарыны, быў дэлегатам Першага і Другога з'ездаў Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына", а таксама — Устаноўчага з'езду Міжрэгіянальнага аб'яднання беларусаў Расіі (сакавік 1999), фундатар шэрагу творчых пачынанняў па папулярызацыі беларускай навукі і культуры, у тым ліку зборніка Скарынаўскіх чытанняў у Маскве — "Вялікаю ласкаю: Ф. Скарына і традыцыі славянскага асветніцтва" (М., 1994), літаратурна-навуковага гадавіка "Скарыніч" (Мн.; М., 1998. Вып. 3, 4), зборнікаў А. Каўкі "Жывом!" (Мн.; М., 1997), "Будам жыць!" (Мн.; М., 1998).

Аляксей Каўка (Масква)

Шміт Ота

Шміт Ота Юльевіч *(18(30).9.1891, Магілёў – 7.9.1956, Масква), матэматык, астраном, геафізік, даследчык Арктыкі, грамадскі дзеяч. Акадэмік АН СССР (1935, член-карэспандэнт з 1933). Герой Савецкага Саюза.*

Нарадзіўся Ота Шміт у Магілёве ў сям'і выхадцаў з латышскіх сялян. Там жа прайшлі яго дзіцячыя гады. Вучыўся ў Магілёўскай гімназіі (цяпер СШ № 3), на будынку якой цяпер установлена мемарыяльная дошка.

Скончыў Універсітэт св. Уладзіміра ў Кіеве (1913). У 1913–1917 гг. працаваў у Кіеўскім універсітэце, у 1920–1923 гг. — прафесар універсітэта, у 1926–1956 гг. — прафесар Маскоўскага універсітэта, у 1930–1931 гг. — дырэктар Інстытута матэматыкі і механікі Маскоўскага універсітэта, у 1937–1949 гг. — дырэктар Геафізічнага інстытута АН СССР. Адначасова ў 1932–1939 гг. — начальнік Галоўнага упраўлення Паўночнага марскога шляху. У 1924 г. узначальваў Дзяржаўнае выдавецтва, у 1924–1941 гг. галоўны рэдактар БСЭ і шэрагу навуковых часопісаў і зборнікаў. У 1939–1942 гг. — віцэ-прэзідэнт АН СССР.

Асноўныя матэматычныя працы О. Шміта прысвечаны тэорыі груп. Ужо ў першых даследаваннях (1912–1913) ім былі атрыманы арыгінальныя вынікі, звязаныя з раскладваннем канчатковай групы ў прамое памнажэнне нераскладваемых груп. Прапанаваў у 1926 г. тэарэму, якая ўвайшла ў навучальныя дапаможнікі і манаграфічныя кнігі пад назвай "тэарэма Рэмака—Шміта". У 1913 г. у "Известиях Киевского университета" апублікаваў працу "Аб ураўненнях, якія рашаюцца ў радыкалах, ступені якіх ёсць ступені простай лічбы". Асноўныя ідэі гэтай працы пра вывучэнне прымітыўных дазваляльных груп толькі праз трыццаць гадоў атрымалі развіццё ў працах матэматыкаў.

Аўтар кнігі "Абстрактная тэорыя груп" (Кіеў, 1916), якая ўвайшла ў залаты фонд па алгебры. Кніга акумулявала асноўныя дасягненні свайго часу па тэорыі груп. У ёй упершыню ў сусветнай літаратуры выкладаліся агульныя тэарэтычныя панятці і факты па тэорыі груп. Кніга двойчы перавыдавалася ў СССР, а таксама ў ЗША. Даследаваў мінімальныя неніпольнатэнтныя канчатковыя групы, якія атрымалі назву груп Шміта. Выканаў даследаванні па бясконцых спецыяльных і бясконцых вырашальных групах (1940–1945), якія стымулявалі развіццё сучаснай тэорыі бясконцых груп.

У 1927/28 навучальным годзе ўпершыню ў гісторыі савецкай адукацыйнай сістэмы падрыхтаваў і прачытаў ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце курс па тэорыі груп, а ў 1930 г. арганізаваў навуковы семінар па аналагічнай праблематыцы. Заснавальнік савецкай школы па тэорыі груп.

Выканаў цікавыя даследаванні ў галіне астраноміі (новая касмаганічная тэорыя паходжання Зямлі і планет), геафізікі, геаграфіі. Вядомы як даследчык Арктыкі. У 1929–1930 гг. узначаліў экспедыцыю на Зямлю Францa-Іосіфа, у 1932 г. на ледаколе "Сібіракоў" прайшоў з Архангельска ў Ціхі акіян. У 1933–1934 гг. узначаліў вядомую экспедыцыю на параходзе "Чалюскін".

Імем О. Шміта названы востраў у Карскім моры, пасёлак і раён на Чукотцы, Інстытут фізікі Зямлі РАН. Памяць пра вучонага зберагаецца і ў Беларусі. Яго імем названы праспект у Магілёве, вуліцы ў Бабруйску, Быхаве, Гомелі, Горках. У Магілёве дзейнічае прысвечаны яму школьны музей.

Вольга Гапоненка

Шнырэльман Леў

Шнырэльман Леў Генрыхавіч *[2(14).1.1905, Гомель – 24.9.1938, Масква (?)], матэматык. Член-карэспандэнт АН СССР (1933).*

У 1925 г. Л. Шнырэльман скончыў матэматычны факультэт Маскоўскага універсітэта. У 1929–1934 гг. выкладаў як прафесар у Данскім політэхнічным інстытуце, у 1934–1938 гг. — у Маскоўскім універсітэце. Адначасова працаваў у Матэматычным інстытуце АН СССР.

Асноўныя навуковыя даследаванні Л. Шнырэльмана адносяцца да галіны тэорыі лічбаў і варыяцыйнага вылічэння. Распрацаваў матэматычныя метады і ўпершыню прымяніў іх для рашэння задач варыяцыйнага вылічэння. Рашыў задачу А. Пуанкарэ аб трох геадэзічных. З дапамогай якасных метадаў ім было даказана існаванне трох замкнёных геадэзічных не толькі на выпуклых паверхнях, але і на паверхнях рода нуль. Стварыў у тэорыі лічбаў агульныя метрычныя метады. Прапанаваў новы метад рашэння адытыўнай тэорыі лічбаў, які быў заснаваны на разглядзе шчыльнасцей лічбавых паслядоўнасцей. Увёў у тэорыю лічбаў паняцце "шчыльнасць паслядоўнасцей натуральных лічбаў". Прапанаваў метад рашэння праблемы Гольдбака, які быў заснаваны на выкарыстанні гэтага паняцця пры рашэнні задачы.

Вольга Гапоненка

Шпілеўскі Павел

Шпілеўскі Павел Міхайлавіч *(псеўд. П. Древлянский; 12.11.1823, в. Шыпілавічы Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Бабруйскі р-н Магілёўскай вобл. – 29.10.1861, Санкт-Пецярбург, Расія), рускі пісьменнік, публіцыст, этнограф, падарожнік.*

П. Шпілеўскі нарадзіўся ў сям'і праваслаўнага свяшчэнніка. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1843), Пецярбургскую духоўную акадэмію (1847). Дасканала авалодаў лацінскай, польскай, нямецкай і французскай мовамі. Яшчэ у час навучання ў акадэміі надрукаваў шэраг прац па этнаграфіі Заходняга краю Расіі, склаў

слоўнік беларускай мовы. Пасля заканчэння акадэміі прызначаны выкладчыкам славеснасці Варшаўскага духоўнага вучылішча. У гэты перыяд у Пецярбургу выдаецца яго першая буйная праца — "Апісанне пасольства Льва Сапегі ў Маскву ў 1600 годзе" (Журнал Министерства народного просвещения. Ч. 68. 1850 № 12.). Даследаванне, добра ўспрынятае сталічнымі навукоўцамі, было падрыхтавана на аснове рукапісаў, якія П. Шпілеўскі знайшоў у бібліятэцы Пуслоўскага на Слонімшчыне. З 1853 г. жыў і працаваў у Пецярбургу. Працяглым і плённым было яго супрацоўніцтва з часопісам "Пантеон" (з 1853), дзе ён змясціў серыю этнаграфічных артыкулаў пра беларусаў, якая была высока ацэнена М. Чарнышэўскім і М. Дабралюбавым. У маскоўскім часопісе "Мосвитянин" апублікаваў каштоўную працу пра беларускія павер'і "Даследаванні пра вурдалакаў".

П. Шпілеўскі перыядычна ажыццяўляў экспедыцыйныя паездкі па Беларусі, Літве і Польшчы. У серыі нарысаў "Падарожжа па Палессі і беларускаму краю" (час. Современник. 1853–1855) ён падаў цікавыя звесткі па гісторыі гарадоў, мястэчак і вёсак Беларусі, апісаў побыт беларускага народа, становішча сельскай гаспадаркі і прамысловасці. Гэта багата насычаная гістарычным, этнаграфічным і краязнаўчым матэрыялам праца была выдадзена асобнай кнігай, значная частка якой прысвечана Мінску і Міншчыне. Выдаў "Нарысы Жмудзі" (СПб., 1855) і вялікую працу "Мазыршчына. З падарожжа па Заходняму краю" (Архив исторических и практических сведений, относящихся к России. 1859. Кн. 3.), дзе звярнуў увагу на самабытнасць беларускай мовы. У артыкуле "Археалагічныя знаходкі", надрукаваным у "Санкт-Петербургских ведомостях" (1857) паведаміў аб адкрыцці Музея старажытнасцей у Вільні, які быў заснаваны Я. Тышкевічам. У тым жа годзе вёў у час. "Сын Отечества" своеасаблівы пецярбургскі летапіс — "Дзённік знаёмага чалавека". З 1859 г. П. Шпілеўскі супрацоўнічаў у газ. "Русский мир" і час. "Искусство", але найбольш актыўна — у час. "Театральный и музыкальный вестник", дзе за тры гады надрукаваў каля 30 артыкулаў. У іх П. Шпілеўскі асвятляў не толькі тэатральна-музычныя, але і чыста літаратурныя пытанні, выступаў абаронцам гогалеўскай "натуральнай школы". Спрабаваў свае сілы і ў белетрыстыцы (апавяданні ў "Современнике" за 1851–1854 гг.).

Смерць П. Шпілеўскага прыйшла амаль незаўважна. Толькі пазней, у кніжцы "Месяцаслоў на 1863 год", з'явіўся кароткі некралог без подпісу.

Валерый Ярмоленка

Шугля Уладзімір

Шугля Уладзімір Фёдаравіч *(30.1.1947, Барысаў Мінскай вобл.), інжынер-эканаміст. Прэзідэнт Холдзінгавай кампаніі "Мангазея". Доктар філасофіі ў галіне інфармацыйных тэхналогій, член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі інфармацыйных тэхналогій (1999). Старшыня ГА "Беларусь" у Цюменскай вобл.*

У. Шугля паходзіць з беларускай сям'і. Закончыў Свярдлоўскі інстытут народнай гаспадаркі, Уральскі сацыяльна-палітычны інстытут па спецыяльнасці палітолаг і інжынер-эканаміст. Працоўную дзейнасць пачаў у Свярдлоўску слесарам-механікам (1965–1966). Да 1969 г. працаваў слесарам-электрыкам на Балакаўскім камбінаце тэхнічных валокнаў (Саратаўская вобл.). У 1969–1971 гг. — начальнік філіяла орса камбіната "Алапаевсклес" пры Міністэрстве лясной прамысловасці. Служыў у арміі (1971–1972). У 1972–1976 гг. — старшыня праўлення Алапаеўскага райспажыўсаюза, 1976–1979 — намеснік старшыні праўлення Свярдлоўскага аблспажыўсаюза. У 1979–1984 гг. узначальваў упраўленне рабочага забеспячэння Свярдлоўскай чыгункі. У 1984–1986 гг. — "Тюменьстройпуть" у Цюмені. У 1986–1990 гг. — начальнік Галоўнага упраўлення гандлю аблваканкама пры Міністэрстве гандлю РСФСР. З 1990 г. — прэзідэнт холдзінгавай кампаніі Гандлёвы дом "Мангазея".

Актыўна супрацоўнічае з беларускімі прадпрыемствамі, аказвае фінансаваую падтрымку дзейнасці абласной грамадскай арганізацыі "Беларусь", асноўная мэта якой — вывучэнне быту, культуры, традыцый беларускага народа. З 1997 г. з'яўляецца старшынёй ГА "Беларусь". За 3 гады існавання гэты культурна-асветны цэнтр, дзякуючы ўдзелу ў культурна-масавых мерапрыемствах, што праводзяцца ў Цюмені і іншых гарадах вобласці, выступленням па тэлебачанні, радыё, артыкулам ў перыядычных выданнях, стаў вельмі папулярным у Цюменскай вобл. У. Шугля з'яўляецца членам савета федэральнай аўтаноміі "Беларусы Расіі", старшынёй праўлення Цюменскага рэгіянальнага аддзялення Саюзнай грамадскай палаты. Віцэ-прэзідэнт Асацыяцыі гандлёвых арганізацый Урала, Сібіры і Далёкага Усходу. У жніўні 2000 г. У. Шугля прызначаны саветнікам губернатара Цюменскай вобл.

Узнагароджаны медалём "Ветэран працы", мае званне "Заслужаны работнік гандлю Расіі". Уклад У. Шуглі ў развіццё адносін Расіі і Беларусі адзначаны граматай Дзяржаўнага камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь і Пахвальным лістом Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. З'яўляецца аўтарам зборніка вершаў "З табой мая душа".

Ірына Тамільчык

Шур Якаў

Шур Якаў Шэбселевіч *(20.4.1908, м. Дуброўна Віцебскай губ., цяпер цэнтр р-на Віцебскай вобл. – 23.11.1986, Свярдлоўск, Расія), фізік, прафесар. Член-карэспандэнт Акадэміі навук СССР (1970). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1967).*

Я. Шур у 1932 г. скончыў Ленінградскі універсітэт і быў накіраваны на работу ў Інстытут фізікі металаў Уральскага навуковага цэнтра Акадэміі навук СССР у Свярдлоўску (1932–1939 гг.). У 1938–1944 гг. — дацэнт, у 1944–1972 гг. — прафесар Уральскага універсітэта.

Навуковыя даследаванні Я. Шура прысвечаны фізіцы магнітных з'яў і магнітных матэрыялаў. Вывучаў магнітныя ўласцівасці газаў і пары, ферамагнітныя ўласцівасці розных рэчываў. Выказаў тэорыю тэхнічнай крывой намагнічвання. Даследаваў працэсы перамагнічвання, магнітны гістэрэзіс. Вывучаў даменную структуру ферамагнетыкаў. Устанавіў заканамернасці анізатрапіі каэрцытыўнай сілы ў ферамагнітных монакрышталях, адкрыў тэмпературны магнітны гістэрэзіс (1948), пераходную даменную структуру ў высокамагнітна-анізатропных ферамагнетыках (1953). Вывучаў механізм узнікнення зародышаў перамагнічвання (1973). Прапанаваў спосаб стварэння тэкстуры шляхам тэрмамеханічнай апрацоўкі (1941). Стварыў новыя тэхнічныя магнітныя матэрыялы.

Вольга Гапоненка

Шутаў Сцяпан

Шутаў Сцяпан Фёдаравіч *(17(30)1.1902, в. Дварэц Бабруйскага пав. Мінскай губ. цяпер Бабруйскі р-н Магілёўскай вобл. — 17.4.1963), двойчы Герой Савецкага Саюза (студзень — верасень 1944 г. за фарсіраванне р. Днепр, прарыў абароны праціўніка і авалоданне гарадамі Факшаны, Рымнік, Плаешці ў Румыніі), палкоўнік.*

С. Шутаў паходзіў з сялян. Са снежня 1917 г. — у Гарадоцкім і Асіповіцкім атрадах Чырвонай гвардыі Бабруйскага пав. З ліпеня 1920 г. — у Чырвонай Арміі на Заходнім фронце, конны разведчык. Скончыў ваенную школу імя УЦВК (1927), бранятанкавыя курсы (1937). У Вялікую Айчынную вайну С. Шутаў знаходзіўся на Заходнім, Волхаўскім, Варонежскім і 2-м Украінскім франтах. Камандзір танкавага батальёна, гвардзейскай танкавай брыгады, намеснік камандзіра корпуса. Брыгада пад камандаваннем С. Шутава вызначылася ў 1943 г. пры фарсіраванні Дняпра і вызваленні Кіева, у 1944 г. — у Яска-Кішынёўскай аперацыі. Свой удзел у ваенных паходах апісаў у кнізе ўспамінаў "Чырвоныя стрэлы" (М., 1963).

З 1945 г. знаходзіўся ў адстаўцы. Быў дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР у 1946—1950 гг., Вярхоўнага Савета БССР 3-га склікання.

У г.п. Глуск устаноўлены бюст С. Шутаву. Яго імем названы вуліцы ў Бабруйску, Кіеве, Гарадоцкая сярэдняя школа ў Глускім раёне.

Вацлаў Мацкевіч

Шутовіч Янка

Шутовіч Янка *(Іван Іосіфавіч; псеўд. Іван Дубневіч, Ян Дубневіч, Я. Сцяблінскі; крыпт. І. Ш., Я. Ш., Я. Ш-ч, L. S.; 11(24).1.1904, в. Шутавічы Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл. – 9.12.1973, Вільнюс), літаратуразнавец, выдавец, грамадскі і культурны дзеяч.*

Нарадзіўся І. Шутовіч у шматдзетнай сям'і малазямельных сялян. Вучыўся ў Віленскай беларускай гімназіі. У 1934 г. скончыў факультэт права і грамадскіх навук універсітэта імя С. Баторыя ў Вільні з дыпломам магістра права. У час навучання ва універсітэце ўдзельнічаў у дзейнасці Беларускага студэнцкага саюза, Беларускага навуковага таварыства, Таварыства прыяцеляў беларусаведы, рэдагаваў часопісы "Студэнцкая думка", "Шлях моладзі". Адзін з кіраўнікоў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. Працаваў карэктарам у Беларускай друкарні імя Ф. Скарыны. У 1935–1939 гг. — рэдактар і выдавец літаратурна-навуковага і грамадскага часопіса "Калоссе", які быў галоўнай літаратурнай трыбунай Заходняй Беларусі, спрыяў кансалідацыі заходнебеларускай інтэлігенцыі. Актыўна супрацоўнічаў з Беларускім інстытутам гаспадаркі і культуры ў Вільні. У 1936 г. кіраваў Школьным сакратарыятам, створаным у рамках пагаднення БХД і КПЗБ. Кінуты польскімі ўладамі ў Бяроза-Картузскі канцлагер, адкуль яго вызвалілі савецкія войскі ў верасні 1939 г. З восені 1939 г. Я. Шутовіч займаўся асветніцкай і выдавецкай дзейнасцю ў Вільнюсе. Летам 1940 г. стаў працаваць у Беларускім музеі. На пачатку нямецкай акупацыі (ліпень 1941) прызначаны дырэктарам музея. Дзеля ўратавання музея ад рабаванняў, дырэктар запакаваў самыя каштоўныя экспанаты ў драўляныя скрыні і схаваў іх у падзямеллях віленскага касцёла св. Міхаіла.

20 лістапада 1944 г. Я. Шутовіч быў арыштаваны органамі МДБ. Рашэннем Асобай нарады пры МДБ СССР яго асудзілі на 10 гадоў зняволення. Да мая 1950 г. адбываў пакаранне ва Унжлагу (Горкаўская вобл.),

потым у Пясчанлагу (г. Караганда). Пасля вызвалення з лагераў (28.8.1954) знаходзіўся да 10 красавіка 1956 г. у ссылцы ў Карагандзе і ў г. Сарань Карагандзінскай вобл. З ссылкі вярнуўся ў Вільнюс, дзе яго чакала жонка — літоўская паэтэса Она Міцютэ (быў жанаты з ёй з 1940 г.). 25 красавіка 1958 г. Вярхоўны суд Літоўскай ССР адмяніў рашэнне Асобай нарады пры МДБ СССР, спыніў справу ў сувязі з недаказанасцю абвінавачвання. У 1957 г. уладкаваўся на работу пажарнікам у Вільнюскі дзяржаўны мастацкі музей. Займаўся даследаваннем архіўнай беларусікі, перапісваўся з М. Забэйдам-Суміцкім, сям'ёй Гарэцкіх, М. Танкам і многімі іншымі прадстаўнікамі творчай і навуковай інтэлігенцыі БССР і беларускага замежжа.

Першыя публікацыі Я. Шутовіча ў заходнебеларускай перыёдыцы з'явіліся ў 1927 г. Пад яго рэдакцыяй была выдадзена ў 1940 г. у Вільні кніга "Ксёндз Адам Станкевіч у 25-ыя ўгодкі сьвяшчэнства і беларускай нацыянальнай дзейнасьці (10.1.1915–10.1.1940)". Пасля сталінскіх лагераў аднавіў творчую працу — рыхтаваў матэрыялы пра М. Гарэцкага, А. Гурыновіча, М. Забэйду-Суміцкага, Я. Карскага, А. Уласава, пра Віленскі беларускі музей і інш. Некаторыя з іх друкаваліся на старонках часопісаў "Беларусь", "Спадчына", "Полымя", газет "Літ. і мастацтва", "Голас Радзімы" і інш. Пісаў артыкулы пра захаванне помнікаў беларускай культуры, беларускую мову. Знайшоў у архіве рукапіс рамана-хронікі М. Гарэцкага "Віленскія камунары". Большая частка творчай спадчыны Я. Шутовіча засталася ў рукапісах. Яго асабісты архіў захоўваецца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў Мінску.

Аляксандр Вабішчэвіч (Брэст)

Шчавінская Ларыса

Шчавінская Ларыса Леанідаўна *(1.6.1957, Гомель), гісторык культуры, вучоны сакратар Цэнтра беларусазнаўчых даследаванняў Інстытута славяназнаўства і балканістыкі Расійскай акадэміі навук.*

Л. Шчавінская закончыла Мінскі радыётэхнічны інстытут па спецыяльнасці "аўтаматызаваныя сістэмы кіравання". Вучылася на спецыяльных курсах у вядучых навуковых установах, праслухала спецкурс па гістарычнай інфарматыцы ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце. З'яўляецца спецыялістам у галіне крыніцазнаўства, праграмавання, выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у гуманітарных і сацыяльных даследаваннях. Сярод навуковых даследаванняў Л. Шчавінскай — праблемы сістэмнага аналізу, метадаў і спосабаў выкарыстання найноўшых інфармацыйных тэхналогій у комплексных гуманітарных даследаваннях па гісторыі і культуры народаў Цэнтральна-Усходняй Еўропы, вывучэнне гісторыі духоўнай культуры Падляшша. Удзельнічала ў рабоце многіх навуковых сімпозіумаў.

Л. Шчавінскай належаць звыш 30 прац, сярод якіх 8 кніг і брашур на рускай мове: "Мікіта Іванавіч Гарбачэўскі" (Мн., 1991), "Праваслаўная царква на Беласточчыне ў працах пратаірэя Грыгорыя Сосны" (у сааўт.; Мн., 1994), "Завяшчана Айчыне" (у сааўт.; М., 1994), "Супрасльскі царкоўнаславяно-польскі слоўнік 1772 г." (у сааўт.; Мн., 1995), "Усяму праваслаўнаму свету (Праваслаўная літаратура міжваеннай Польшчы)" (у сааўт.; М., 1995), "У горадзе, які называецца Заблудавам" (у сааўт.; Беласток, 1995) і інш. Выконвае абавязкі вучонага сакратара Таварыства беларусістаў пры Інстытуце славяназнаўства і балканістыкі РАН і сучонага сакратара міжнароднага даследчыцкага праекта "Slavia Orthodoxa et Slavia Romana. Узаемадзеянне славянскіх светаў. Духоўная культура Памежжа Цэнтральнай і Усходняй Еўропы". З'яўляецца членам рэдкалегій шэрагу выданняў.

Ірына Тамільчык

Шчэрба Леў

Шчэрба Леў Уладзіміравіч *(20.2 (5.3),1880, мяст. Ігумен Мінскай губ., цяпер г. Чэрвень Мінскай вобл. – 26.12.1944, Масква), моваznавец, педагог, член-карэспандэнт (1924), акадэмік АН СССР (1943), акадэмік Акадэміі педагагічных навук (1944).*

Пасля заканчэння Кіеўскай гімназіі ў 1898 г. Л. Шчэрба паступіў у Кіеўскі універсітэт, але ў 1899 г. перавёўся на гісторыка-філалагічны факультэт Пецярбургскага універсітэта. Пасля яго заканчэння, (1899) быў пакінуты там для падрыхтоўкі да прафесарскага звання. Адначасова выкладаў рускую мову ў Пецярбургскім настаўніцкім інстытуце. З 1906 да 1909 г. — у навуковых камандзіроўках у Германіі, Італіі, Францыі, дзе вывучаў лужыцкую мову, займаўся фанетычнымі эксперыментамі ў Калеж дэ Франс. Пасля вяртання ў Пецярбург выбраны прыват-дацэнтам універсітэта (1909), загадваў кабінетам эксперыментальнай фанетыкі. Абараніў магістарскую працу "Рускія галосныя ў якасных і колькасных адносінах" (1912), а затым – доктарскую дысертацыю "Усходнелужыцкія гаворкі" (1915). Выбраны прафесарам Петраградскага універсітэта (1916). Выкладаў і займаўся навукова-даследчыцкай работай у іншых установах Петраграда—Ленінграда (Інстытут жывога слова, Інстытут гісторыі мастацтваў і інш.). Заснаваў пры Петраградскім універсітэце Лінгвістычнае таварыства (1920), удзельнічаў у стварэнні пісьменнасці комі (1921), арганізаваў і кіраваў курсамі замежных моваў. У гады Вялікай Айчыннай

вайны працягваў навуковую і педагагічную работу ў г. Нолінску Кіраўскай вобл. З 1943 г. – супрацоўнік Інстытута рускай мовы АН СССР (Масква).

Прызнаннем значнасці навуковых ідэй Л. Шчэрбы стала абранне яго сябрам Міжнароднай асацыяцыі фанетыстаў, Парыжскага інстытута па вывучэнню славянскіх моваў, Парыжскага лінгвістычнага таварыства, Парыжскай асацыяцыі выкладання сучасных моваў і інш. У 1927 г. выступіў з дакладам аб рускай мове ў Парыжы. Меў добрыя адносіны з вядомымі еўрапейскімі лінгвістамі (Ж. Русло, А. Мее, К. Бругман, Л. Тэньер і інш.). Пры ўдзеле Л. Шчэрбы заснавана Таварыства славянскай філалогіі ў Парыжы. Дыяпазон яго навуковых інтарэсаў быў шырокі, пра што сведчаць публікацыі па праблемах агульнага мовазнаўства, русістыкі, славістыкі, лексікаграфіі, педагогікі. Сведчаннем значнасці яго навуковай спадчыны сталі публікацыі пасля смерці вучонага "Выбраных прац па рускай мове" (М., 1957), "Выбраных прац па мовазнаўству і фанетыцы" (1958), манаграфіі "Моўная сістэма і маўленчая дзейнасць" (Л., 1974).

Памяць пра вучонага ўшанавана публікацыяй зборніка "Памяці акадэміка Льва Уладзіміравіча Шчэрбы" (Л., 1951), правядзеннем ў Ленінградскім універсітэце навуковага пасяджэння, прысвечанага 30-годдзю з дня смерці акадэміка.

Галіна Сяргеева

Шыраеў Яўген

Шыраеў Яўген Яўгенавіч *(4. 3. 1933, в. Паляны Вілейскага пав. Віленскага ваяв., цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл.), геадэзіст-картограф, мастак, этнолаг, прафесар, прэзідэнт Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі.*

Я. Шыраеў паходзіць з беларускай сям'і. яго Дзіцячыя і юнацкія гады прайшлі на Маладзечыншчыне ў родавым маёнтку продкаў па бацькоўскай лініі. Вучыўся на геадэзічным факультэце Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта землеўпарадкавання, пасля заканчэння якога (1956) працаваў там жа да 1960 г. Быў асістэнтам у Маскоўскім дзяржаўным універсітэце (МДУ) імя М. В. Ламаносава (1961 — 1974). Узначальваў кафедру Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта геадэзіі і картаграфіі (1974 — 1980). Загадваў лабараторыяй і кіраваў Цэнтрам аэракасмічных метадаў даследавання ў сістэме Мінвадгаса СССР (1980 — 1988). У 1988 — 1991 гг. — вядучы навуковы супрацоўнік Геалагічнага інстытута Акадэміі навук СССР. Дырэктар яго Навукова-тэхнічнага цэнтра (1991 — 1994). Паралельна з асноўнай работай у сямідзесятыя гады быў старшынёй Камісіі па картаграфіі секцыі геадэзіі, аэракасмічнай здымкі і картаграфіі Навукова-тэхнічнага савета Міністэрства ВНУ СССР. З'яўляўся членам Прэзідыума Навукова-тэхнічнага савета па геадэзіі, Навукова-метадычнага савета па геадэзіі. У 80-ыя гг. уваходіў у склад Прэзідыума Навукова-тэхнічнага савета па аэракасмічных метадах Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхніцы СССР. Член рэдацыйных калегій многіх навуковых часопісаў, у т. л. і ў ЗША.

Кандыдацкая (1969) і доктарская (1974) дысертацыі, падрыхтаваныя Я. Шыраевым у час работы ў МДУ, былі першымі ў СССР такімі даследаваннямі па праблеме аўтаматызацыі картаграфічнага адлюстравання, счытвання, пераўтварэння і аналізу геаінфармацыі. Ён упершыню ўвёў паняцці "геаінфармацыя", "геаінфарматыка", "геаінфармацыйныя сістэмы", даўшы ім навуковае тлумачэнне. Па гэтай праблеме Я. Шыраеў выдаў чатыры манаграфіі, якія мелі шырокі рэзананс у замежным друку. Найбольш дакладна яго распрацоўкі і даследаванні адлюстраваны ў манаграфіі "Computers and the Representations of Geographical Date", выдадзенай у 1987 г. у Англіі па заказу Міжнароднай выдавецкай фірмы навуковай літаратуры John Wiley (ЗША — Англія). Ён аўтар больш за 150 публікацый, некалькіх дзесяткаў вынаходніцтваў, васьмі кніг. Сярод яго вынаходніцтваў — спосаб дыстанцыйнага вызначэння аптычных характарыстык другаснага выпраменьвання аб'ектаў геалагічнага і воднага асяроддзя; спосабы пабудовы стэрэаскапічных мадэляў на картах; штрыхаваны (растравы) спосаб кадзіравання інфармацыі. Я. Шыраеву належыць рашэнне адной са складаных задач у галіне геалогіі і геафізікі — распрацоўка матэматычнай мадэлі працэсу расцягвання дэфармаванай зямной паверхні да зыходнага стану па ізагібсам. Ім распрацаваны спосабы карэляцыйнага аналізу па картах, шэраг новых картаграфічных спосабаў адлюстравання геаінфармацыі праблемна арыентаваных на іх аўтаматычнае распазнаванне і пабудову лічбавых мадэляў. Я. Шыраеў ажыццяўляў навуковае кіраўніцтва закрытай тэматыкай па праблеме інфармацыйнага забеспячэння крылатых ракет і даследаванні падсцілаючай паверхні Зямлі аэракасмічнымі метадамі дыстанцыйнага зандзіравання па праграмах Мінвадгаса СССР.

У апошнія гады Я. Шыраеў займаецца гісторыка-этнаграфічнымі і этна-генетычнымі пытаннямі славяназнаўства, галоўным чынам, беларускім этнасам. Ён аўтар шматлікіх публікацый на гэтую тэму, а таксама кнігі "Русь Белая, Русь Чорная і Літва ў картах", выдадзенай у 1991 г. у Мінску. У 1998 г. напісаў кнігу па мастацтвазнаўству "Найвялікшае шарлатанства XX стагоддзя". У апошні час займаецца жывапісам, яго карціны выстаўляліся ў Расіі і ў многіх замежных краінах.

Я. Шыраеў — адзін з ініцыятараў стварэння Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, з 1994 г. — яе прэзідэнт. Прымаў удзел у кангрэсах беларусістаўі беларусазнаўчых выданнях.

Ірына Тамільчык

Шэндараў Міхаіл

Шэндараў (Шэндэравас) Міхаіл *(17.5.1917, Гомель — 2.1. 1984, Вільнюс), віяланчаліст, заслужаны артыст Літоўскай ССР (1959).*

М. Шэндараў вучыўся ў Ленінградскай кансерваторыі. У 1940 г. працаваў у сімфанічным аркестры Мінскага радыё. У 1941–1944 гг. — дырыжор і канцэртмайстар Свярдлоўскага тэатра юнага гледача. Падрыхтаваў 100 канцэртаў для воінаў Чырвонай Арміі. У 1946 г. пераехаў у Вільнюс, працаваў канцэртмайстрам Вільнюскага сімфанічнага аркестра. У 1952 г. скончыў Літоўскую дзяржаўную кансерваторыю па класу Повіласа Беркавічуса. У 1952–1961 гг. іграў у квартэце Літвы. У 1958 г. на Усесаюзным фестывалі музычных калектываў заняў 1 месца, у 1959 г. стаў лаўрэатам конкурса струнных квартэтаў І. Гайдна ў Будапешце. У 1962–1969 гг. — канцэртмайстар Камернага аркестра Літвы, у 1965–1969 гг. — адначасова канцэртмайстар і сімфанічнага аркестра Вільнюскай філармоніі. З 1961 г. працаваў выкладчыкам у Літоўскай дзяржаўнай кансерваторыі, яе дацэнт (1974). У рэпертуар М. Шэндарава ўваходзілі творы літоўскіх кампазітараў Ю. Каросаса, В. Кловы, А. Кляніцкіса, В. Пекатуры, А. Шэндарава і інш. Выступаў з канцэртамі ў Англіі, Балгарыі, Венгрыі, Грэцыі, Італіі, Канадзе, Польшчы, Фінляндыі, Францыі, Чэхаславакіі, рэспубліках СССР.

Яніна Кісялёва

Шэрамет Мікалай

Шэрамет Мікалай Спірыдонавіч *(23.12.1906, Магілёў), украінскі пісьменнік.*

М. Шэрамет нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У 1929 г. скончыў Кіеўскі інстытут народнай адукацыі. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў на фронце і ў партызанскім злучэнні А. Ф. Фёдарава.

М. Шэрамет — аўтар больш 50-ці кніг паэзіі, прозы, публіцыстыкі. Піша па-ўкраінску. У 1929 г. пабачыў свет яго першы зборнік вершаў "У паходзе". Затым выйшлі паэтычныя кнігі "Бадзёрасць" (1930), "Рапарт "Маладняка" VII Усеўкраінскаму з'езду ЛКСМУ", "Шаржы і пародыі" (1931), "Разгорнутым фронтам", "Крутая траекторыя (Вайсковая паэзія)", "Нас сцяг Леніна вядзе", "Удары брыгад" (1932), "Зіма, вясна, лета, восень" (1933), "Лірыка і вайна" (1934), "Вяршыні" (1938), паэмы "Трактарабуд" (1932) і "Шчорс" (1940). Выдаў кнігі нарысаў "Кроў іх не прайшла дарэмна" (1938), "Першыя загоны" (1939), раман "Вартавыя міру" (1936). Займаўся літаратурнай працай і ў час вайны, калі выйшлі зборнік нарысаў і паэтычных твораў "Баявыя сябры" (1941), кніга вершаў "На лініі агню" (1942), зборнік нарысаў "У лясах Украіны" (1944). Тэма Вялікай Айчыннай засталася ў творчасці М. Шэрамета галоўнай. Пра гэта сведчаць кніга нарысаў "У партызанскіх атрадах" (1947), паэтычныя зборнікі "Подзвіг" (1967), "Я гераічнае слаўю" (1972), паэма "Лілія Карастаянава" (1972, у 1977 г. паэма выдадзена ў Сафіі на балгарскай мове).

Узнагароджаны ордэнам Чырвонага сцяга, медалём "Партызану Айчыннай вайны" 1-й ступені.

Алесь Карлюкевіч

Юрэвіч Аляксандр

Юрэвіч Аляксандр *(18.11.1952, г. Ліда Гродзенскай вобл.), польскі пісьменнік.*

А. Юрэвіч паходзіць з беларускай сям'і. Дзяцінства яго прайшло ў мяст. Крупава каля Ліды. У 1957 г. выехаў з бацькам у Польшчу. У 1971 г. закончыў агульнаадукацыйны ліцэй у Рэдле, у 1976 г. — паланістыку ў Гданьскім універсітэце, у 1983 г. — двухгадовыя курсы сцэнарыстаў у кінашколе ў Лодзі. У творчым здабытку А. Юрэвіча польскія зборнікі вершаў "Сон, які напэўна не быў каханнем" (1974), "На другім баку" (1978), "Не страляйце ў Бітлзаў" (1983), "Як галубы, гнаныя бурай" (1990), "Пакуль яшчэ і іншыя вершы" (1991), аповесці "Пасярод ночы"(1980), "Ліда" (1990, 1994), "Пан Бог чуе глухіх" (1995). У 1998 г. выдаў зборнік фельетонаў "Жыццё і лірыка", якія раней друкаваліся на старонках гданьскай газеты "Dziennik Baltycki". У творчасці закранае беларускую тэматыку. Перакладаўся на нямецкую і англійскую мовы. На беларускую мову перакладзены фрагменты яго "Ліды".

А. Юрэвіч атрымаў узнагароды Чэслава Мілаша і фонду Марыі і Ежага Купцэвічаў за аповесць "Ліда" (1991). Гданьская ваяводская публічная бібліятэка прысудзіла яму ўзнагароду"Pro Libro Legendo". Жыве ў Гданьску.

Алена Глагоўская (Гданьск, Польшча)

Якаўлеў Якаў

Якаўлеў (Эпштэйн) Якаў Аркадзьевіч *(21.6.1896, Гродна — 29.7.1938) гісторык, дзяржаўны і палітычны дзеяч.*

Я. Якаўлеў нарадзіўся ў настаўніцкай сям'і. Вучыўся ў рэальным вучылішчы, Пецярбургскім політэхнічным інстытуце. З 1914 г. пачаў займацца партыйнай работай. У дні Лютаўскай рэвалюцыі арганізаваў палкавыя камітэты і рабочую міліцыю. Працаваў на партыйнай рабоце ў Екацярынаславе (Днепрапятроўску), а потым быў пасланы на падпольную партыйную работу ў акупіраваныя немцамі раёны Украіны – у Кіеў і Харкаў. Пасля грамадзянскай вайны працаваў у Галоўпалітасвеце. У 1923 г. прызначаны загадчыкам аддзела друку ЦК РКП(б), рэдактарам "Крестьянской газеты" і газеты "Беднота". У снежні 1929 г. прызначаны наркомам земляробства СССР. З 1930 г. працаваў у апараце ЦК ВКП(б). У 1938 г. рэпрасаваны. Рэабілітаваны пасмяротна.

Аўтар кніг "Анархізм у рускай рэвалюцыі", "Вёска, якая яна ёсць", "Наша вёска", "Аб гістарычным сэнсе Кастрычніка", "Індустрыялізацыя і сельская гаспадарка", выдадзеных на рускай мове.

Галіна Івуць

Якубоўскі Іван

Якубоўскі Іван Ігнатавіч *(25.12.1911 (7.1.1912), в. Зайцава Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер вобл. – 30.11.1976), ваенны дзеяч, маршал, двойчы Герой Савецкага Саюза.*

І. Якубоўскі паходзіў з вялікай і беднай сялянскай сям'і. Калі яму было 5 гадоў, памерла маці. Скончыў пачатковую школу ў в. Куртасы, сямігодку ў Горках. Пасля школы працаваў на цагельным заводзе ў Горках. Затым паступіў у Аршанскі педагагічны тэхнікум. З 1932 г. у Чырвонай Арміі. Скончыў Аб'яднаную беларускую ваенную школу імя ЦВК БССР (1934) і Ваенную акадэмію Генеральнага штаба (1948). Удзельнічаў у паходзе ў Заходнюю Беларусь у 1939 г., у савецка-фінскай вайне 1939—1940 гг., камандаваў танкавай ротай. У Вялікую Айчынную вайну І. Якубоўскі змагаўся на Бранскім, Паўднёвым, Паўднёва-Заходнім, Сталінградскім, Данскім, Цэнтральным і Першым Украінскім франтах. Быў камандзірам танкавага палка, брыгады, намеснікам камандзіра танкавага корпуса. Прымаў удзел у абарончых баях пад Мінскам, Магілёвам, у Сталінградскай і Курскай бітвах, вызваленні Украіны, у Сандамірска-Сілезскай, Опельнскай, Вісла-Одэрскай, Берлінскай і Пражскай аперацыях. Вясной 1943 г. І. Якубоўскі сфарміраваў 91-ю танкавую брыгаду, з якой прайшоў з баямі шлях ад Сталінграда да Прагі. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра і Віслы. За вызваленне Фастава, раённага цэнтра ў Кіеўскай вобласці, І. Якубоўскаму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза (студзень 1944), а за фарсіраванне Віслы і захоп плацдарма гэтае званне нададзена яму паўторна (верасень 1944 г.).

Пасля вайны І. Якубоўскі займаў адказныя пасады ў савецкіх войсках. З 1957 г. — першы намеснік галоўнакамандуючага і галоўнакамандуючы Групай савецкіх войскаў у Германіі. З 1965 г. камандуючы войскамі Кіеўскай ваеннай акругі. З 1967 г. першы намеснік міністра абароны СССР і галоўнакамандуючы Аб'яднанымі Узброенымі Сіламі Варшаўскага дагавору.

І. Якубоўскі ўзнагароджаны многімі ордэнамі і медалямі СССР, адзінаццаццю ордэнамі і медалямі замежных краін. Яму прысвоена званне Героя ЧССР (1970). Ён абіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР VI — IV скліканняў. У Горках Магілёўскай вобласці яму пастаўлены бюст.

Вацлаў Мацкевіч

Якубук Пётр

Якубук Пётр Рыгоравіч *(1937, Камянецкі р-н Брэсцкай вобл.), беларускі і ўкраінскі мастак.*

П. Якубук выхоўваўся ў дзіцячым доме № 2 г. Кобрына. Першыя крокі ў мастацтве зрабіў у 1949 г.

З 1953 г. вучыўся ў Вентспілскім рамесніцкім вучылішчы, па заканчэнню якога вярнуўся на радзіму і працаваў на Кобрынскім рамонтным заводзе, спалучаючы работу з вучобай у школе рабочай моладзі. Па стану здароўя быў звольнены з працы. Вучыўся ў Мінскім мастацкім вучылішчы (1958 — 1963). Пасля заканчэння вучылішча П. Якубук лячыўся ў курортнай паліклініцы ў г Ялта, дзе працаваў мастаком-афарміцелем. З 1969 г. удзельнік разнастайных мастацкіх выставак. Удзельнічаў у Рэспубліканскай маладзёжнай выстаўцы (1970), Міжнароднай выстаўцы біжутэрыі ў Чэхаславакіі (1973). Удзельнічаў у пяці ўсесаюзных мастацкіх выстаўках, у тым ліку ў занальнай (Украіна, Беларусь, Расія), прысвечанай 1500-годдзю Кіева. З'яўляецца ўдзельнікам больш дваццаці ўсеўкраінскіх выставак. З 1970 г. — бяззменны кіраўнік майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ялцінскіх мастацка-вытворчых майстэрань, з 1993 г. — старшыня ялцінскай арганізацыі Нацыянальнага саюза мастакоў Украіны, член праўлення Саюза мастакоў Крыма.

За працоўныя і творчыя поспехі П. Якубук узнагароджаны граматамі, дыпломамі. У 1998 г. атрымаў ганаровую грамату Кабінета міністраў Украіны з уручэннем памятнага знака "За вялікі асабісты ўклад у галіне ювелірнага мастацтва, украінскай і сусветнай культуры" ў гонар 60-годдзя Саюза мастакоў Украіны.

Ірына Тамільчык

Яновіч Сакрат

Яновіч Сакрат *(псеўд. Аляксандр Анташэвіч, Адоль Кастрыца, Колька Сплюх, К. Янкоўскі, Кастусь Янкоўскі, крыпт. С. Я., (С. Я.), (ся); 4.9.1936, мяст. Крынкі Беластоцкага ваяв., Польшча), беларускі і польскі празаік, драматург, публіцыст, грамадскі дзеяч. Сябар Саюза польскіх пісьменнікаў з 1970 г. Ганаровы сябар Міжнароднай Акадэміі навук Еўразіі і Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў.*

Нарадзіўся С. Яновіч у сям'і шаўца, Канстанціна Яновіча, які меў таксама трохгектарную гаспадарку. У школе спрабаваў пісаць вершы па-польску і па-руску. У 1950 г. адправіўся з Крынак у "вялікі горад Беласток", дзе скончыў электратэхнікум (1955) і затым (завочна) аддзяленне беларускай філалогіі Настаўніцкага інстытута (1962). Працаваў журналістам у штотыднёвіку "Ніва", кіраваў аддзелам галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства. У 1973 г. завочна скончыў факультэт польскай філалогіі Варшаўскага універсітэта. Пратэстуючы супраць бюракратызацыі ўлады, быў вымушаны пайсці на "чорную работу" — рабіў кладаўшчыком, тэхнікам бяспекі працы, што ўзбагаціла яго жыццёвымі назіраннямі. Быў старшынёй Клуба Саюза польскіх пісьменнікаў у Беластоку (1976–1981). У апошнія гады ўсё больш займаецца палітычнай дзейнасцю, змагаецца за роўныя правы беларусаў Беласточчыны з палякамі. Адзін з заснавальнікаў Беларускага незалежнага выдавецтва (1981–1987). Старшыня партыі Беларускае дэмакратычнае аб'яднанне (з 1990). Жыве ў мяст. Крынкі Беластоцкага ваяв. Яго дом (т. зв. Villa Sokrates) стаў беларускім культурным асяродкам. Тут атрымала бясплатна памяшканне рэдакцыя штомесячніка "Czasopis" (С. Яновіч — яго сакратар).

Як празаік С. Яновіч дэбютаваў у 1956 г. на старонках беларускага штотыднёвіка "Ніва". Аўтар зборніка апавяданняў і мініяцюр "Загоны" (Беласток, 1969), аповесці пра К. Каліноўскага "Сярэбраны яздок" (Мн., 1978), кніг "Думкі пра аўтаномію" (Беласток, 1981), "Праваслаўная царква ў Беластоцкім краі і беларуская мова ў ім" (Нью-Йорк, 1984) "Самасей" (Мн., 1992), "Доўгая сьмерць Крынак" (Беласток; Бельск, 1993), "Лістоўе — лістове" (Беласток, 1995), "Сцяна, (Мн., 1997) і інш. У перакладзе на польскую мову выйшлі яго кнігі прозы "Вялікі горад Беласток" (Варшава, 1973), "Забыцці" (Вроцлаў, 1978), "Сцяна" (Ольштын, 1979), "Самасей" (Варшава, 1981), "Малыя дні" (Варшава, 1981), "Сярэбраны яздок" (Варшава, 1984), "Трэцяя пара" (Беласток, 1985), а таксама эсэ "Беларусь, Беларусь" (Варшава, 1987; Беласток, 1993), якое выклікала вялікую палеміку, прыцягнула ўвагу да патрэб беларусаў у Польшчы. Проза С. Яновіча вызначаецца філасафічнасцю, глыбокім псіхалагізмам. Пісьменнік адным з першых паказаў у Польшчы адчужэнне ўлады ад народа ("Сцяна"), духоўную трагедыю ўчарашняга вяскоўца ў горадзе ("Самасей"), у сувязі з чым у аўтара былі цяжкасці з друкаваннем — як на Беласточчыне, так і ў БССР. Напісаў некалькі драматычных твораў, якія выйшлі асобнымі выданнямі ("Зборнік сцэнічных твораў", "Не пашанцавала"). Пераклаў на польскую мову "Вітражы" Я. Брыля, п'есу Я. Шабана "Шрамы" (для Драматычнага тэатра імя А. Вянгеркі ў Беластоку). Аўтар літаратуразнаўчых прац і крытычных артыкулаў пра творчасць беларускіх пісьменнікаў, якія жывуць у Польшчы і гуртуюцца ў "Белавежы", эсэ пра польска-беларускія сувязі. Мініяцюры-імпрэсіі С. Яновіча выйшлі асобнымі выданнямі ў Лондане — у арыгінале і перакладзе Ш. Акінэр на англійскую мову, у Венецыі — у перакладзе на італьянскую і англійскую мовы. Паводле слоў пісьменніка, рукапісы яго твораў знаходзяцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, БДАМЛіМ і музеях у Мінску, бібліятэцы імя Ф. Скарыны ў Лондане, бібліятэцы "Асалінэум" у Вроцлаве, Акруговым музеі ў Беластоку і інш.

Узнагароджаны Афіцэрскім крыжам ордэна Адраджэння Польшчы і іншымі ўзнагародамі.

Баляслаў Харкевіч

Янсанэ Ніна

Янсанэ (дзяв. Панізьнік) Ніна *(21.11.1933, в. Бабышкі Браслаўскага пав. Віленскага ваяв., цяпер Міёрскі р-н Віцебскай вобл.), беларуская перакладчыца*

Н. Янсанэ нарадзілася ў сялянскай сям'і, якая параднілася з латышамі яшчэ з дарэвалюцыйных петраградскіх часоў. Вучылася ў в. Латышы, дзе беларуская школа працавала і ў гады Другой сусветнай вайны. Пасля заканчэння Лявонпальскай сямігодкі выехала да родзічаў у Рыгу (1951). Там паступіла на вучобу ў тэхнікум малочна-мясной прамысловасці. Да выхаду на пенсію працавала на адным з рыжскіх заводаў. Замужам за латышом. З 1998 г. – грамадзянка Латвійскай Рэспублікі. Жыве ў Юрмале. Там жа, на Яўндубултскіх могілках, пахаваны яе бацькі.

За паўвека жыцця ў Латвіі Н. Янсанэ ўвабрала ў сябе дух латышскай культуры, дасканала авалодала глабіннымі пластамі мовы, што дазволіла ёй падступіцца да складаных тэкстаў у час падрыхтоўкі ў Мінску

выбраных твораў Яна Райніса для серыі "Скарбы сусветнай літаратуры" (1993). У томе класіка латышскага пісьменства, падрыхтаванага М. Абалай, Н. Янсанэ выступае не толькі як аўтар падрадковых перакладаў, але і як перакладчык паасобных твораў райнісаўскай публіцыстыкі. З іншых здабыткаў Н. Янсанэ варта адзначыць яе пераклады латышскіх народных казак, прозы Саўлцэрытэ Віесэ, Аі Лацэ і інш., а таксама ўспамінаў Яніса Ніедрэ, навуковага даследавання Петэрыса Зэйлэ на тэму латышска-беларускіх узаемадачыненняў. Чакае публікацыі перакладзены Н. Янсанэ нарыс Матыльды Езавітавай "Кароткі агляд старажытнай беларускай культуры і літаратуры", надрукаваны ў час. "Domas" (1929. № 6-7). Цікавай для сучасных даследчыкаў можа быць і брашура Вілбертса Краснайса "Беларусы як адгалінаванне народа латышскага" (Рыга, 1938), тэкст якой таксама перакладзены Н. Янсанэ.

Н. Янсанэ з'яўляецца дарадчыцай Мірдзы Абала ў яе рабоце над падрыхтоўкай латышска-беларускага і беларуска-латышскага слоўнікаў.

Сяргей Панізьнік

Яркоўскі Іван

Яркоўскі Іван Восіпавіч *(12.5.1844, мяст. Асвея Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. – 21.1.1902, г. Гейдэльберг, Германія), інжынер-тэхнолаг, даследчык у галіне фізікі, хіміі, мэтэаралогіі, паветраплавання. Член Рускага фізіка-хімічнага таварыства, Рускага таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і антрапалогіі, Рускага тэхнічнага таварыства, Таварыства тэхнолагаў.*

І. Яркоўскі паходзіў са старадаўняга шляхецкага роду. Пачатковую адукацыю атрымаў у школе пры Петрапаўлаўскай царкве ў Маскве, скончыў Маскоўскі Аляксандраўскі сіроцкі кадэцкі корпус (1868), Пецярбургскі тэхналагічны інстытут са званнем тэхнолага 1-га разраду (1870). У 1872 г., пасля абароны дысертацыйнай працы "Праект машыны для водазабеспячэння і тэарэтычнае даследаванне механізма" атрымаў званне інжынера-тэхнолага (экземпляр яго дысертацыі захоўваецца ў Пяцербургу, у Расійскай Нацыянальнай бібліятэцы імя Салтыкова-Шчадрына). Працаваў у Мінску зборным майстрам ў чыгуначных майстэрнях Маскоўска-Брэсцкай чыгункі (1872–1874), начальнікам дэпо ў Смаленску (1874–1876), начальнікам вагонных майстэрняў Маскоўска-Брэсцкай чыгункі ў Маскве (1876–1894), упраўляючым Неўскага механічнага і судабудаўнічага заводаў (1894–1897), памочнікам галоўнага ўпраўляючага заводамі Акцыянернага таварыства Мальцава (1897–1901).

У 1887 г. для таго, каб растлумачыць сусветнае прыцягненне, І. Яркоўскіі прапанаваў "кінетычную гіпотэзу", скарыстаўшы потым асноўныя яе палажэнні для аналізу фізіка-хімічных і мэтэаралагічных з'яў. Сукупнасць высноў, якія атрымаў аўтар, звязаны ў адно цэлае асноўнай ідэяй, прадстаўляюцца ў выглядзе філасофскага спалучэння разрозненых навуковых ідэй, выказаных у дачыненні да розных з'яў прыроды. Ужо летам 1888 г. праца І. Яркоўскага "Сусветнае прыцягненне як вынік утварэння важкай матэрыі ўнутры нябесных целаў: Кінетычная гіпотэза" з'явілася ў друку спачатку на французскай мове, а ў 1899 г. у пашыраным і дапоўненым выглядзе — на рускай. Прапанаваў механічнае тлумачэнне прыцягненню. Сілу цяжару І. Яркоўскі разглядаў як вынік існавання накіраванага руху частак эфіру і яго ўсмоктвання праз паверхню любых целаў. Вывеў формулу закона сусветнага прыцягнення, якая адрознівалася ад ньютанаўскай пераменным значэннем каэфіцыента спамернасці. На падставе кінетычнай гіпотэзы прапанаваў тэарэтычную канцэпцыю будовы як матэрыі, так і міжмалекулярных сілаў, перыядычнасці хімічных элементаў і іх фізіка-хімічных уласцівасцей. Пранаваў арыгінальныя гіпотэзы зямнога магнетызму, вулканічнай дзейнасці, эвалюцыі зорак. Уяўленні І. Яркоўскага аб тым, што міжмалекулярныя сілы абумоўлены абменным узаемадзеяннем атамаў эфіру, знайшла ў наш час новую інтэрпрэтацыю на падставе квантавамеханічных уяўленняў. Меркаванні пра тое, што перыядычнасць уласцівасцей элементаў вызначаецца падабенствам атамных структур, знайшла пацвярджэнне ў законе перыядычнай будовы атамным абалонак Дз. Мендзялеева. Магчымасць вылучэння целам энергіі дзякуючы яго ўнутранай будове пацвердзіліся праз гады адкрыццём радыя. Кінетычная гіпотэза І. Яркоўскага — гэта, па сутнасці, праграма аб'яднання гравітацыйных і электрамагнітных палёў на падставе ўяўлення аб эфіры.

У 1889 г. прапанаваў канструкцыю вертыкальнага вадатрубнага параўтваральніка, якая атрымала прывілею тэрмінам на 10 гадоў. Праводзіў даследаванні па выбару аптымальных параметраў змазачных маслаў і даследаваў уплыў розных гатункаў масла на зніжэнне затрат пры трэнні.

Сканструяваў прыстасаванне для вымярэння паскарэння свабоднага падзення, якому даў назву "гравітаскоп". Праводзіў работы па аэрадынаміцы. Эксперыментальным шляхам знайшоў залежнасць супраціўлення паветра ад плоскасці крылаў, вугла нахілу і хуткасці руху. Вывеў формулу для разліку аэрадынамічнага супраціўлення і пад'ёмнай сілы, падобную да формул М. Жукоўскага.

Асноўныя навуковыя працы І. Яркоўскага: "Сусветнае прыцягненне як вынік ўтварэння важкай матэрыі ўнутры нябесных целаў: Кінетычная гіпотэза" (М., 1887, 1889, 1912), "Новы пагляд на прычыны метэаралагічных з'яў" (М., 1891), "Будова матэрыі і міжмалекулярныя сілы" (М., 1894), "Захапленне матэматычнымі тэорыямі ў сучаснай навуцы" (М., 1893), "Шчыльнасць светлавога эфіру і супраціўленне руху, якое ён аказвае" (Бранск, 1893).

У апошнія месяцы жыцця знаходзіўся ў Германіі. Памёр у шпіталі г. Гейдэльберга.

Вольга Гапоненка

Ярмалковіч Віктар

Ярмалковіч Віктар *(23.12.1917, в. Юшкі Віленскага пав. Віленскай губ., цяпер Літва – 15.12.1987, Варшава), беларускі гісторык, публіцыст, юрыст.*

В. Ярмалковіч нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Бацька змалку прывучаў хлопчыка шанаваць беларускую мову і спрыяў вучобе сына. У трынаццацігадовым узросце В. Ярмалковіч паступіў у гімназію айцоў марыянаў у Друі каля Браслава, дзе выкладчыкі імкнуліся абудзіць нацыянальную свядомасць вучняў. Пасля смерці бацькі ў 1935 г. ён вымушаны быў перапыніць вучобу і заняцца гаспадаркай. У 1937 г. здаў экзамены ў 7 клас Беларускай гімназіі ў Вільні. Пасля заканчэння вучобы паступіў на юрыдычны факультэт універсітэта імя С. Баторыя. Каб мець сродкі на жыццё і вучобу, даваў прыватныя ўрокі. Прымаў актыўны ўдзел у рабоце Саюза беларускіх студэнтаў, быў сябрам рэдакцыі газеты "Хрысціянская думка". У жніўні 1939 г. В. Ярмалковіч быў арыштаваны і без суда адпраўлены ў Бяроза-Картузскі канцэнтрацыйны лагер. Пасля ліквідацыі лагера ў верасні 1939 г. з вялікімі перашкодамі дабраўся да Вільні. З прыходам Савецкай улады вярнуўся да вучобы ва універсітэце, вывучыў літоўскую мову. Вясной 1941 г. атрымаў дыплом юрыста. У чэрвені 1941 г., пасля акупацыі гітлераўцамі Вільні, выехаў у родную вёску Юшкі. Восенню, вырашыўшы знайсці работу па спецыяльнасці, вярнуўся ў Вільню. Аднак уладкавацца на работу змог толькі ў павятовым судзе ў Лідзе. Праз год яго павысілі, перавялі суддзёй у Шчучын, дзе даводзілася працаваць у цяжкіх умовах, у атмасферы нацыянальных канфліктаў. У чэрвені 1944 г. пры набліжэнні Савецкай Арміі В. Ярмалковіч з жонкай пакінуў Шчучын. Дабраўся да Варшавы, дзе ў час жнівеньскага паўстання (1944) прайшоў шмат выпрабаванняў. Пасля капітуляцыі Варшавы разам з іншымі жыхарамі горада апынуўся ў нямецкім лагеры ў Прушкове. Пасля роспуску лагера перабраўся ў вёску каля Скярневіц, дзе зарабляў на жыццё, лечачы зубы. Пасля заканчэння вайны беспаспяхова шукаў работу ў Падбяскіддзе. У сярэдзіне 1945 г. пераехаў з жонкай у Біскупец, дзе пачаў працаваць у адміністрацыі павятовых улад. Восенню 1949 г. па даносу В. Ярмалковіч быў арыштаваны, тры месяцы знаходзіўся пад вартай у Ольштыне. Прызнаўся, што ён з'яўляецца грамадзянінам СССР, яго перавялі спачатку ў Варшаву, перадаўшы органам МДБ, а потым перавезлі ў Легніцу. Пасля шматлікіх допытаў быў адпраўлены на катаржныя работы ва Усольск у Сібіры, потым у калгас каля Іркуцка. Атрымаўшы пасведчанне для пашпарта, працаваў на будоўлі. Восенню 1951 г. удалося выехаць у родныя Юшкі, але магчымасці жыць там не было. У хуткім часе В. Ярмалковіч атрымаў накіраванне ў Старое Сяло каля Тургеляў, дзе спачатку выкладаў у польскай пачатковай школе, а з 1952 г. стаў яе дырэктарам. У пачатку 1953 г. быў зноў арыштаваны, сядзеў у Лукішскай турме. Суд прыгаварыў В. Ярмалковіча да 25 гадоў пазбаўлення волі. У красавіку 1953 г. быў адпраўлены ў лагер у Вяцкую вобл., дзе прабыў да восені 1956 г. У 1957 г., атрымаўшы рэпатрыяцыйныя дакументы, выехаў да сям'і ў Польшчу.

Аб гісторыі роднага краю, яго культуры, рэлігіі, вядомых дзеячах, аб перажытым у жыцці В. Ярмалковіч напісаў шмат артыкулаў на польскай і беларускай мовах. Выйшла яго кніга па гісторыі Беларусі, надрукаваны артыкулы "Беларускі студэнцкі саюз у Вільні" (Сустрэчы. Вып. 6), "Беларуская хрысціянская дэмакратыя" (Wiez. 1988. N 11). У рукапісах засталіся яго працы: "З падвіленскіх палёў", "Вільня", "Шчучын", "Кароткі нарыс касцельнай гісторыі Беларусі", "Цярністы шлях Беларусі", "Крывы горад — Вільня", "Паміж Прыпяццю і Дзвіной", "Пазнавайма родны край: Ліда і Лідская зямля, Шчучынскі раён, Іўеўскі раён", "На жыццёвых хвалях", "Біяграфіі кс. Адама Станкевіча і інш.".

Мечыслаў Яцкевіч (Ольштын, Польшча)

Яўневіч Іпаліт

Яўневіч Іпаліт Антонавіч *(4.8.1831, Сенненскі пав. Магілёўскай губ., цяпер Сенненскі р-н Віцебскай вобл. – 5.11.1903, Санкт-Пецярбург, Расія), матэматык, механік, прафесар Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута.*

І. Яўневіч паходзіў са шляхецкага рода з Рэчыцкага пав. Мінскай губ. Пачатковую адукацыю атрымаў у Беларусі. Вучыўся ў Аршанскім павятовым вучылішчы, Магілёўскай гімназіі. Скончыў у 1856 г. са ступенню кандыдата фізіка-матэматычных навук фізіка-матэматычны факультэт Пецярбургскага універсітэта, дзе яго настаўнікамі былі матэматыкі В. Я. Бунякоўскі, П. Чэбышаў, А. Сомаў, фізік Э. Ленц. У тым жа годзе запрошаны ў Пецярбургскі тэхналагічны інстытут для выкладання матэматыкі і механікі. У 1861–1862 гг. знаходзіўся ў замежнай камандзіроўцы, дзе пазнаёміўся з найноўшымі дасягненнямі ў машынабудаванні, лепшымі заводамі Германіі, Бельгіі, Францыі, Англіі. На працягу шасці месяцаў ў Льежэ (Бельгія) займаўся праектаваннем машын пад кіраўніцтвам прафесара Любэра. Пасля вяртання з камандзіроўкі (1863) быў прызначаны выконваючым абавязкі прафесара кафедры канструявання машын Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута. У 1868 г. атрымаў ступень магістра прыкладной матэматыкі і быў зацверджаны ў званні прафесара. З 1868 г. Вучэбным камітэтам Тэхналагічнага інстытута быў выбраны дэканам і займаў гэтую пасаду да 1887 г. Выкладаў прыкладную механіку, гідраўліку, тэорыю пругкасці, тэорыю верагоднасцей, асновы вышэйшай матэматыкі і адначасова — прыкладную

механіку, тэорыю пругкасці і гідраўліку ў іншых ВНУ Пецярбурга: Марской акадэміі (з 1863), Інстытуце грамадзянскіх інжэнераў (з 1886), Электратэхнічным інстытуце (з 1891).

Навуковыя даследаванні І. Яўневіча прысвечаны пытанням супраціўлення матэрыялаў, тэорыі пругкасці, гідраўлікі, прыкладной механікі, матэматыкі. Вызначыў характарыстыкі трываласці многіх будаўнічых матэрыялаў, паставіў і рашыў шэраг задач тэорыі пругкасці і дынамікі паравой машыны. Даследаваў некаторыя пытанні тэорыі набліжэння функцый. Правёў даследаванні ў галіне механікі вадкасцей. Заклаў асновы набліжаннай тэорыі згібу крывалінейнага стрыжня і вывеў формулу прадоўжанага нармальнага напружання бруса вялікай крывізны. Зрабіў уклад ў распрацоўку прынцыпа найменьшай работы ўнутраных сіл і разгледзеў яго некаторыя прыватныя выпадкі, у тым ліку для вызначэння статыстыкі магчымых рэакцый апор.

І. Яўневіч — аўтар падручнікаў па матэматыцы і гідраўліцы, першага на рускай мове дапаможніка па тэорыі пругкасці, якія атрымалі высокія ацэнкі сучаснікаў вучонага і неаднаразова перавыдаваліся. Сярод яго асноўных навуковых прац — "Курс гідраўлікі" (СПб., 1891. 2-е выд.), "Курс прыкладной матэматыкі" (СПб., 1897. 2-е выд.; 1902. 3-е выд.), "Дапаможнік для вывучэння законаў супраціўлення будаўнічых матэрыялаў з дадаткам агульных пачаткаў тэорыі пругкасці цел" (СПб., 1868).

Вольга Гапоненка

Яцкевіч Мечыслаў

Яцкевіч Мечыслаў *(26.3.1931, в. Бокшышкі Валожынскага пав. Навагрудскага ваяв., цяпер Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл.), доктар габілітаваны, літаратуразнавец, перакладчык, грамадска-культурны дзеяч, дыпламат.*

З 1931 г. жыў у Вільні, дзе бацька працаваў слесарам. У 1938 г. М. Яцкевіч пайшоў у Віленскую пачатковую школу № 11. У час Другой сусветнай вайны жыў у Вільні, потым — у Кямелішках (цяпер Астравецкі р-н Гродзенскай вобл.), дзе закончыў сярэднюю школу. Вучыўся ў настаўніцкай семінарыі ў Тракай. У 1951 г. працаваў настаўнікам у Кямелішках. У 1951—1954 гг. праходзіў ваенную службу ў радах Савецкай Арміі ў Туркменіі. Пасля дэмабілізацыі вярнуўся ў Літву, дзе працаваў настаўнікам у Міцкунах каля Вільнюса. У 1954 г. ажаніўся і разам з сям'ёй выехаў у Польшчу. У 1956—1958 гг. выконваў абавязкі дырэктара сярэдняй школы, у 1958—1969 гг. быў дырэктарам дзіцячага дома. У 1961 г. закончыў настаўніцкія курсы ў Кшэшавіцах каля Кракава па спецыяльнасці педагогіка-ахова дзяцей. У 1966 г. закончыў рускае аддзяленне філалагічнага факультэта Варшаўскага універсітэта. У 1969 г. пераехаў у Ольштын, дзе ў 1969—1973 гг. быў генеральным сакратаром грамадска-культурнага таварыства "Паазер'е". У 1973 г. пачаў працаваць у Вышэйшай педагагічнай школе ў Ольштыне. У 1975 г. у Варшаўскім універсітэце атрымаў званне доктара гуманітарных навук. У 1988—1998 гг. працаваў на кафедры ўсходазнаўства і балтыстыкі Універсітэта імя А. Міцкевіча ў Познані, дзе выкладаў гісторыю літоўскай літаратуры. У 1994 г. атрымаў навуковае званне доктара габілітаванага ў галіне параўнальнага літаратуразнаўства. З 1994 г. працаваў ў Вышэйшай педагагічнай школе ў Ольштыне і ва Універсітэце імя А. Міцкевіча. З красавіка 1998 г. быў накіраваны на пасаду Генеральнага консула Рэспублікі Польшча ў Вільнюсе.

М. Яцкевіч актыўна займаецца навукова-даследчай працай. Апублікаваў 14 кніг і каля 450 артыкулаў, прысвечаных пытанням польскай, беларускай і літоўскай літаратур і культур. Перакладае творы беларускіх і літоўскіх пісьменнікаў. Неаднаразова бываў у Мінску, выступаў на навуковых кангрэсах і канферэнцыях беларусістаў.

Тэрэса Голуб

ЗМЕСТ

I. Агульныя артыкулы

Бежанцы ... 4
Беларускае рэлігійнае жыццё ў памежных краінах ... 6
Беларусы на Украіне ... 6
Беларусы ў Арменіі ... 9
Беларусы ў Казахстане ... 9
Беларусы ў Кыргызстане ... 10
Беларусы ў Латвіі ... 10
Беларусы ў Літве ... 15
Беларусы ў Малдове ... 21
Беларусы ў Польшчы ... 22
Беларусы ў Расіі (Расійскай Федэрацыі) ... 25
Беларусы ў Эстоніі ... 34
Высылка ... 35
Дыяспара беларуская ... 37
Дэпартацыя ... 39
Міграцыя ... 40
Натуралізацыя ... 42
Рэпатрыяцыя ... 42
Эміграцыя ... 44

II. Арганізацыі, установы, падзеі

Аб'яднанне студэнтаў-беларусаў Літоўскага універсітэта імя Вітаўта Вялікага ў Каўнасе ... 51
"Агніца" ... 51
Асацыяцыя беларускіх студэнтаў ВНУ ... 51
Асацыяцыя "Святло Радзімы" ... 51
Асветнае таварыства беларусаў ... 52
"Бацькаўшчына" ... 52
"Беларус" ... 53
Беларуска-ўкраінскі камітэт помачы ахвярам вайны (Беларуская грамада) у Барнауле ... 53
Беларуска-эстонскае згуртаванне БЭЗ ... 53
Беларускае аб'яднанне студэнтаў ... 53
Беларускае вольна-эканамічнае таварыства ў Петраградзе ... 54
"Беларускае выдавецкае таварыства" ў Латвіі ... 55
Беларускае гістарычнае таварыства = Bialoruskie Towarzystwo Historyczne ... 55
Беларускае грамадска-культурнае таварыства (БГКТ) ... 55
Беларускае грамадска-культурнае таварыства ў Санкт-Пецярбургу (БГКТ) ... 56
Беларускае дэмакратычнае аб'яднанне (БДА) ... 56
Беларускае згуртаванне палітычных вязняў і ссыльных у Вільнюсе ... 56
Беларускае зямляцтва пралетарскага студэнцтва ў Кіеве ... 57
Беларускае культурна-асветнае таварыства (БКАТ) ў Каунасе (Коўне) ... 57
Беларускае культурна-асветніцкае таварыства "Уздым" у г. Даўгаўпілсе (Латвія) ... 57
Беларускае культурнае таварыства "Хатка" ... 58
Беларускае літаратурнае аб'яднанне "Белавежа" ... 59
Беларускае навукова-краязнаўчае таварыства ў Латвіі ... 60
Беларускае навукова-культурнае таварыства (БНКТ) ў Маскве ... 60
"Беларускае незалежнае выдавецтва" ... 60
Беларускае пралетарскае студэнцкае зямляцтва ... 61
Беларускае прэс-бюро ... 62
Беларускае сабранне ... 62
Беларускае студэнцкае зямляцтва ў Варонежы ... 62
Беларускае студэнцкае зямляцтва ў Варшаве ... 62
Беларускае студэнцкае зямляцтва ў Казані ... 63
Беларускае студэнцкае зямляцтва ў Ленінградзе ... 63
Беларускае (Паўночна-Каўказскае) студэнцкае зямляцтва ў Растове-на-Доне ... 63
Беларускае студэнцкае зямляцтва ў Сараташе ... 63
Беларускае студэнцкае зямляцтва ў Смаленску ... 64
Беларускае студэнцкае зямляцтва ў Томску ... 64

Беларускае студэнцкае зямляцтва ў Тыфлісе ... 64
Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі ... 64
Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за мяжой (Таварыства "Радзіма") ... 65
Беларускае таварыства ў Петраградзе па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны ... 66
Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа (БТЧК) ... 66
Беларускае таварыства Чырвонага крыжа ў Каўнасе ... 67
Беларускае цэнтральнае бюро пры Народным камісарыяце асветы РСФСР ... 67
Беларуская абшчына Львоўшчыны ... 67
Беларуская абшчына "Світанак" ... 68
Беларуская вучнёўская грамада ... 68
Беларуская гандлёвая палата ў Кіеве ... 68
Беларуская грамада ў Коўне ... 69
Беларуская народная грамада ... 69
Беларуская нацыянальна-палітычная нарада ў Рызе (Рыжская нарада беларускай эміграцыі) ... 70
Беларуская рада ў Адэсе ... 70
Беларуская секцыя ... 70
Беларуская секцыя пры Адэскім губернскім аддзеле народнай асветы ... 71
Беларуская секцыя пры Смаленскім губернскім бюро народнай асветы ... 71
Беларуская філія ... 71
"Беларуская хатка" ў Арле ... 71
"Беларуская хатка" ў Петраградзе ... 72
Беларуская чыгуначная грамада ў Маскве ... 72
Беларуская школа імя Францыска Скарыны ў Вільнюсе ... 72
Беларускі аддзел пры Міністэрстве асветы Латвіі ... 72
Беларускі камітэт у Варшаве (Варшаўскі беларускі камітэт) ... 73
Беларускі клуб у Маскве ... 73
Беларускі навукова-літаратурны гурток ... 73
Беларускі народны універсітэт у Маскве ... 74
Беларускі нацыянальны гурток у Багародзіцку (Тульская губ.) ... 74
Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацкам, Белнакам) ... 74
Беларускі пададдзел Аддзела асветы нацыянальных меншасцей Народнага камісарыята асветы РСФСР ... 75
Беларускі пасольскі клуб (БПК) у Варшаве ... 76
Беларускі цэнтр у Літве ... 76
Беларускі этнаграфічны музей у Гайнаўцы ... 77
Беларускія дзяржаўныя настаўніцкія курсы ... 77
Беларускія секцыі РКП(б) ... 77
"Бераг" ... 78
Вайскова-дыпламатычная місія БНР у Латвіі і Эстоніі ... 78
Варшаўскі нарадавольніцкі гурток беларускіх студэнтаў ... 79
Выдавецтва Грыневіча ў Пецярбургу ... 79
Выдавецтва "Таварыства беларусаў-выбаршчыкаў" ... 79
"Гоман" ... 79
"Грамада" ... 80
Гурток беларускай моладзі ... 80
Гурток беларускай сацыялістычнай моладзі ... 80
Гурток маладых беларускіх паэтаў у Латвіі ... 80
Гурток моладзі польска-літоўска-беларускай і маларускай ... 81
Дзвінская беларуская гімназія ... 81
Другі з'езд беларусаў свету ... 82
Жаночы камітэт пры беларускай калоніі ... 83
"Загляне сонца і ў наша аконца" ... 83
Звяз беларускай моладзі (ЗБМ) ... 83
Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" ... 84
Згуртаванне беларускай культуры Іда-Вірумаа ... 85
Згуртаванне беларускіх грамадскіх арганізацый (ЗБГА) у Літве ... 85
Згуртаванне прадпрымальнікаў беларускай дыяспары ... 85
"Зорка" ... 86
З'езды беларусаў краін Балтыі (1994, 1998) ... 86
Іркуцкае таварыства беларускай культуры імя Я. Д. Чэрскага ... 86
Камітэт беларускі ў Польшчы ... 87
Камітэт загранічных груп беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў ... 87

Кафедра беларускай філалогіі Вільнюскага педуніверсітэта 88
"Круг беларускай народнай прасветы і культуры" 88
"Крывіцкі вязок" 88
Латвійскі Фонд беларускай культуры 89
Люцынская дзяржаўная беларуская гімназія 89
"Маланка" 89
"Маю гонар" 90
Міжнародная асацыяцыя беларусістаў (МАБ) 90
Міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі "Культура і адукацыя беларускага замежжа" (1994, 1996, 1998) 90
Міністэрства беларускіх спраў пры ўрадзе Літвы (Міністэрства беларускіх спраў Літвы) 91
Першы з'езд беларусаў свету 91
Першы сход беларусаў блізкага замежжа 92
Прыазёрская гарадская рада Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны 93
"Світанак" 93
Севастопальскае таварыства беларусаў імя Максіма Багдановіча "Пагоня" 93
Смаленскае аддзяленне Беларускага нацыянальнага камісарыята 94
"Спадчына" 94
Студэнцкія беларускія гурткі ў памежных краінах у канцы XIX – пачатку XX ст. 95
Сустрэча кіраўнікоў беларускіх суполак замежжа 96
"Сьвітанак" 96
"Сябры" 96
"Сябрына" 97
"Сябрына", хор 97
Таварыства апекі над эмігрантамі 98
Таварыства беларускага пісьменства 98
Таварыства беларускага тэатра ў Латвіі 98
Таварыства беларускай культуры ў Вільнюсе 99
Таварыства беларускай культуры ў Калінінградскай вобласці 99
Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны Віленскага краю (ТБМ) 100
Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны "Прамень" 100
Таварыства беларускай школы 101

III. Выданіі

"Апошнія паведамленні БАС" 102
"Беларус Віленшчыны" (1) 102
"Беларус Віленшчыны" (2) 102
"Беларуская школа ў Латвіі" 103
"Беларускі каляндар" 103
"Беларускі сьцяг" 103
"Беларускія гістарычныя сшыткі" = "Bialoruskie Zeszyty Historyczne" 104
"Беларускія дакументы" 104
"Беларусы Балтыі: учора, сёння, заўтра" 104
"Белорусская криница" 105
"Белорусское эхо" 105
"Голас Беларуса" 105
"Голас Радзімы" 106
"Дзянніца" 106
"Зажынкі" 107
"Кантакт" ("Шляхі беларускай думкі") 107
"Кантакты і дыялогі" 108
"Крывіч" 108
"Ластаўка"(1) 109
"Ластаўка"(2) 109
"Ніва" 109
"Першы крок" 109
"Прамень" 110
"Рунь" 110
"Скарыніч" 110
"Сустрэчы" 111
"Фос" 112
"Часопіс" ("Czasopis") 112
"Чырвоны шлях" 112

IV. Персаналіі

Аблажэй Алег 113
Абламовіч Ігнацій 113
Абрамоўскі Станіслаў 113
Агрызка Іасафат 114
Адамовіч Юрый 114
Азарэвіч Дзмітрый 114
Алейнікаў Пётр 115
Алфёраў Жарэс 115
Альтшулер Аляксандр 116
Альтшулер Сямён 117
Аляшкевіч Мікалай 117
Анішчык Аляксей 117
Антановіч Канстанцін 118
Анцукевіч Мікалай 118
Арлоўскі Зянон 119
Артымовіч Надзея 119
Аскназій Ісак 119
Астраумава Маргарыта 120
Асяндоўскі Антоній 120
Аўдзееў Міхаіл 121
Аўсянік Антон 121
Ахрамовіч Раман 121
Ачапоўскі Ян 122
Багдановіч Адам 122
Багдановіч Янка 123
Баена Юрый 124
Бажанаў Мікалай 124
Байкачоў Міхаіл 124
Бакст Мікалай 125
Балакіна Раіса 125
Балаховіч Андрэй 126
Балаховіч Хрысціна 126
Балашэвіч Леанід 126
Баранкевіч Іван 127
Баркоўскі Алесь 127
Барташэвіч Альберт 127
Бартусевіч Уладзімір 128
Баруховіч Ічэ 128
Баршчэўская Ніна 129
Баршчэўскі Аляксандр 129
Барэйка Аркадзь 130
Баталаў Рыгор 130
Белы Валерый 130
Белы Міхаіл 130
Бескін Ізраіль 131
Блажэўскі Рамуальд 131
Блізняцова Марыя 131
Блузман Пётр 131
Брадоўскі Леан 132
Брайцаў Якуб 132
Брант Барыс 133
Брафман Якаў 133
Брыш Аркадзь 133
Будзіловіч Антон 134
Булгарын Язэп 134
Бурш Яша 134
Бурштынаў Аляксей 135
Буры Мікалай 135
Бутама-Названава Вольга 135
Бутрамееў Уладзімір 135
Бучэль Таццяна 136
Бушко Мікалай 136
Бялыніцкі-Біруля Аляксей 137
Бялыніцкі-Біруля Вітольд 137
Бялыніцкі-Біруля Вячаслаў 138
Бяляцкін Сымон 138
Бярдзяеў Валер'ян 138
Бяржыніс Віктар 139
Вагнер Пётр 139
Вазіла Аляксандр 139
Вазнясенскі Аляксандр 140
Вайвадзіш Эдвард 140
Вайнруб Мацвей 141
Вайцюлевіч Вера 141
Валасовіч Канстанцін 141
Валкавыцкі Георгій 141
Валодзін Аляксандр 142
Валодзька Станіслаў 142
Вальтар Віктар 143
Вальфсон Фёдар 143
Ваньковіч Мельхіёр 143
Варановіч Алі 144
Вараняева Ларыса 144
Варашыльскі Віктар 145
Варона Валерый 145
Варонка Язэп 146
Ваўбельскі Аляксандр 147
Велікоўскі Імануіл 147
Вендраў Залман 147
Верас Зоська 148
Вернікоўскі Іван 148
Весялоўскі Іван 149
Вігдарава Фрыда 149
Вількіцкі Андрэй 149
Віннікаў Ісак 150
Віралайнен Любоў 150
Віткоўскі Мікалай 150
Войцік Галіна 151
Вольскі Аркадзь 151
Вуек Зыгмунт 151
Выгодскі Давід 152
Выгоцкі Леў 152
Вярыга Аляксандр 153
Вярыга Браніслаў 153
Гаданьчук Ірына 154
Гайдук Лідзія 154
Гайдук Мікола 154
Гайдук Уладзімір 155
Галавачоў Павел 155
Галавачоў Пётр 155
Галавінскі Аляксандр 156
Галёркін Барыс 156
Галкін Самуіл 157
Галуза Уладзімір 157
Гальданскі Віталь 158
Гарбук Вісарыён 158
Гарэцкі Усяслаў 159
Гаўрылюк Андрэй 159

Гаштальд Тадэвуш 160
Гваздзёў Яўген 160
Геніюш Юрый 161
Гзоўскі Аляксандр 161
Гіль Юрый 162
Гінцбург Ілья 162
Гіргас Уладзімір 162
Глагоўская Алена 163
Глікман Давід 163
Глінская Алена 163
Глобус Мірон 163
Глод Аляксандр 164
Гохман Веньямін 164
Грабніцкі Адам 165
Грамыка Андрэй 165
Гржэскі Мікалай 166
Грыневіч Юрый 166
Грыцкевіч Валянцін 166
Гурлянд Хаім Іона 167
Гурын Мікалай 167
Гушча Ян 168
Дабравольскі Уладзімір 168
Дабрынін Барыс 169
Дамброўскі Франц 170
Данілаў Іван 170
Данілевіч Міхаіл 170
Данільчанка Анатоль 171
Дашчынскі Станіслаў 171
Дзевятоўскі Антоній 171
Дзяржыцкі Уладзімір 172
Доўбня Іван 172
Драянкоў Алесь 173
Дробыш-Драбышэўскі Аляксей 173
Дубноў Сямён 173
Дубяга Зміцер 174
Дудышкін Сцяпан 174
Душэўскі Клаўдзій 175
Дыбоўскі Бенядзікт 176
Езавітаў Кастусь 177
Ерамееў Канстанцін 178
Ермакоў Васіль 178
Есьман Іосіф 179
Жалтоўскі Іван 180
Жамойцін Янка 180
Жарабцова-Андрэева Ганна 181
ЖыбрыкНіна 181
Жэлігоўскі Люцыян 182
Забара Натан 182
Закараўскас Юозас 182
Залескі Уладзімір 183
Замыслоўскі Ягор 183
Зарэцкі Айзік 183
Зенюк Янка 184
Зялёнка Станіслаў 184
Зяльдовіч Якаў 185
Зямкевіч Рамуальд 185
Іваноўскі Тадэвуш 186
Іванюк Ганна 187
Каваленка Надзея 187
Кавалеўскі Восіп 187
Кавалёнак Уладзімір 188
Кавалёў Дзмітрый 188
Казакоў Міхаіл 188
Казарскі Аляксандр 189
Кайгародаў Дзмітрый 190
Калінін Міхаіл 190
Калінковіч Мікалай 191
Кальвіш Зоя 191
Камаржынскі Язэп 192
Камароў Яўген 192
Камароўскі Георгій 192
Камінскі Антон 193
Кананюк Віталь 193
Канапацкі Мацей 193
Канчар Яўсей 194
Каплан Танхум 195
Капцюг Валянцін 195
Капчык Пятрусь 196
Караткевіч-Цыганок Таццяна 196
Каратынскі Вінцэсь 196
Карнейчук Мікалай 197
Каро Фердынанд 197
Карповіч Алесь 198
Карсалін Кандрат 198
Касовіч Каятан 199
Касцюшка Вацлаў 199
Каўка Аляксей 199
Клімовіч Адольф 200
Клімук Пётр 200
Клякоўскі Рамуальд 201
Коган Пётр 201
Копа Сцяпан 202
Косберг Сямён 202
Котвіч Уладзіслаў 203
Красоўскі Апалінар 203
Крупенька Аркадзь 203
Кугель Аляксандр 204
Кузняцоў Сяргей 204
Кузьменка Уладзімір 205
Кулікоў Сяргей 205
Куптэль Міхась 205
Курака Міхаіл 206
Куторга Сцяпан 206
Кухто Пётр 207
Кучараў Міхаіл 207
Лазарэвіч-Шапялевіч Леў Міхаіл 207
Лапацін Антон 208
Ласкевіч Валянціна 208
Латышонак Алег 208
Леўшчанка Леанід 209
Лех Генадзь 209
Лініч Мікалай 210
Луба Віталь 210
Лукашук Сяргей 210
Лукашэвіч Юзаф 211
Лукша Міраслава 211
Лур'е Анатоль 211
Луцкевіч Лявон 212
Лушчыцкі Міхаіл 212
Львовіч Мая 213
Любошыц Нота 213
Ляўчук Зміцер 213
Мазоль Вацлаў 214
Мазялайціс Йонас 214

Майзель Веніямін 214
Макарэвіч Іван 215
Макрэцкі Зыгмунт 215
Максімюк Ян 215
Мамонька Язэп 216
Мандэльштам Леанід 216
Маневіч Леў 217
Манюшыс Юозас 217
Мараўскі Рышард 218
Маркевіч Арсень 218
Марцінкенене Юзэфа 219
Мастовіч Далэнга Тадэвуш 219
Матышэўскі Павел 219
Маўлевіч Каятан 220
Маханько Віталь 220
Мацейка Юозас 221
Маціеўскі Ігар 221
Мацка (Моцка) Мечыслаў 221
Мекін Чэслаў 222
Мельнічэнка Андрэй 222
Меркін Генадзь 222
Мігай Сяргей 223
Мігдал Аркадзь 223
Міканенка Валерый 224
Мікульчык Аляксандр 224
Мілаш Леакадзія 224
Мінкін Алег 225
Мінор Восіп 225
Міранавіч Антон 226
Міранавіч Яўген 226
Міронава Любоў 227
Міронава Ніна 227
Місуна Ганна 227
Місюра Йонас 227
Міткевіч Уладзімір 228
Міхалеўскі Корчак Серафін 228
Міцкевіч Аляксандр 229
Могілевер Шмуэль 229
Мурашка Леанід 230
Мухлінскі Антон 230
Мялешка Міхась 231
Навадворскі Вітальд 231
Навасельскі Леанід 232
Навумавец Антон 232
Нарбут Андрэй 232
Наркевіч Альгерд 233
Нарушэвіч Алена 233
Немэн Чэслаў 233
Нікалаева-Комісар Надзея 234
Нікалаеў Мікалай 234
Нісенбаўм Іцхак 235
Нюнька Хведар 235
Нядзвецкі Антон 235
Нядзвецкі Іосіф 236
Озераў Уладзімір 236
Падбярэзскі Эдуард 236
Падсядлоўскі Тадэвуш 237
Палякоў Сяргей 237
Паперна Аўрахам Якаў 237
Папковіч Пётр 238
Папоў Аляксандр 238
Паўловіч Мікалай 239
Пачобут-Адляніцкі Міхал 239
Пекур Ігар 240
Перасветаў Іван 240
Петрашкевіч Ядвіга 240
Петручук Васіль 240
Пецюкевіч Марыян 241
Пігулеўскі Уладзімір 242
Піліпенка Міхаіл 242
Піскунова Валянціна 243
Плуг Адам 243
Пранчышчаў Васіль 244
Прахаў Андрыян 244
Прудзікаў Іван 245
Пруфер Ян 245
Прушынская Наталля 245
Прушынскі Конрад 246
Прыбытак Станіслаў 246
Путрамант Ежы 246
Пшыбароўскі Караль 247
Пякарскі Эдуард 247
Пярдэня Ян 248
Пяткевіч Лявон 249
Пятруннікаў Аляксандр 249
Рабіновіч Ісак 249
Равенскі Станіслаў 249
Рагоўскі Яўген 250
Радзішэўскі Андрэй 250
Размене Ганарата 251
Разумаў Анатоль 251
Ракоўскі Леанід 251
Ракоўскі Сяргей 252
Рамановіч Леанід 252
Рамішэўскі Мікалай 252
Расолаў Міхаіл 253
Ратомскі Аляксандр 253
Рахнеўскі Станіслаў 253
Рахнеўскі Юліян 254
Рубацкі Уладзімір 254
Рудакоў Алег 255
Рудкоўскі Барыслаў 255
Рулінскі Мікалай 255
Русачык Тамара 256
Руткоўскі Браніслаў 256
Рушчыц Фердынанд 257
Рылькоў Уладзімір 258
Рэут Густаў 258
Рэут Марыя 259
Рэут Ядвіга 259
Сабалеўскі Антон 260
Сабалеўскі Ян 260
Сабольшчыкаў Васіль 260
Сабэцкая Анна 261
Савінава Ніна 261
Садоўскі Аляксандр 261
Сакол Пятро 262
Салавейчык Хаім 263
Саламенка Мікалай 263
Салаўёў Зіновій 263
Саленіекс Эдуардс 264
Салярцінскі Іван 264
Сахарава Вольга 265
Сахараў Сяргей 265

Сачко Зося 266
Сваяк Янка 267
Світыч-Ілліч 267
Свянціцкі Баляслаў 268
Семашкевіч Раман 268
Серапін Іосіф 269
Сергіевіч Пётра 269
Сеўрук Людвіг 269
Сівуха Віктар 270
Сілівончык Анатоль 270
Скарджус Вінцас 271
Смоліч Уллян 271
Снарская Іна 271
Сосна Грыгорый 272
Стальмаховіч Міхаіл 272
Станкевіч Здзіслаў 273
Стахвюк Віктар 273
Стахіеў Юры 273
Стрэмінскі Уладзіслаў 274
Стыркіна Святлана 274
Стэповіч Вітаўт Юрый 274
Стэфаноўская Міхаліна 275
Сузін Адам 275
Сулкоўскі Мікалай 276
Сухі Павел 276
Сцяпаненас Повілас 277
Сычэўскі Янка 277
Сэнюх Чэслаў 277
Сямёнаў Дзмітрый 278
Талвінскі Канстанцін 279
Талерка Мікалай 279
Тамко Ягор 280
Тарасэвіч Лявон 280
Ткачэнка Марыя 280
Ткачэнка Сяргей 281
Трафімук Андрэй 281
Тращцяк Іван 282
Тураеў Барыс 282
Тышкевіч Канстанцін 283
Уладыка Аляксандр 283
Улашчык Аляксандр 284
Улашчык Мікалай 284
Улдукіс Эдуардас 285
Уляноўскі Баляслаў 285
Урбан Галіна 285
Урончанка Міхаіл 286
Урублеўскі Зыгмунт 286
Урублеўскі Эдуард 287
Усцілоўскі Георгій 287
Файніцкі Іван 287
Фаменка Уладзімір 288
Фольбарт Аляксандр 288
Фрумянкоў Георгій 288
Халасцякоў Георгій 289
Ханевіч Міхаіл 289
Хвісюк Мікалай 289
Хлябцэвіч Уладзімір 290
Хлябцэвіч Яўген 290
Хмялеўскі Міхась 291
Ходзька Іосіф 291
Худаба (Кудаба) Чэслаў 291
Целеш Вячка 292
Церахаў Мікалай 293
Цімашэнка Барыс 293
Ціхаў Гаўрыіл 293
Цукерзіс Якаў 294
Цыбульскі Напалеон Нікадзім 294
Цытовіч Мікалай 295
Цытрон Шмуэль Лейб 295
Цэраскі Вітольд 296
Цярэшчанкаў Яфім 296
Чапковіч Сяргей 296
Чараванін Фёдар 297
Чарненка Майсей 297
Чарнякевіч Іван 298
Чарнякевіч Яніна 298
Чугаевіч Рыгор 298
Чурлёнітэ-Зубовене Данутэ 299
Чыквін Ян 299
Чэрскі Іван 299
Шакавец Лявон 300
Шапіра Фёдар 301
Шаховіч Ігар 301
Шаховіч Міхась 302
Швед Віктар 302
Шклярэўскі Ігар 302
Школьнікаў Іосіф 303
Шкялёнак Міхаіл 303
Шміт Ота 303
Шнырэльман Леў 304
Шпілеўскі Павел 304
Шугля Уладзімір 305
Шур Якаў 306
Шутаў Сцяпан 306
Шутовіч Янка 306
Шчавінская Ларыса 307
Шчэрба Леў 307
Шыраеў Яўген 308
Шэндараў Міхаіл 309
Шэрамет Мікалай 309
Юрэвіч Аляксандр 309
Якаўлеў Якаў 310
Якубоўскі Іван 310
Якубук Пётр 310
Яновіч Сакрат 311
ЯнсанэНіна 311
Яркоўскі Іван 312
Ярмалковіч Віктар 313
Яўневіч Іпаліт 313
Яцкевіч Мечыслаў 314

Даведачнае выданне

Хто ёсць хто сярод беларусаў свету.
Энцыклапедычны даведнік.
Частка 1.
Беларусы і ўраджэнцы Беларусі ў памежных краінах

Адказны за выданне Ігар Чакалаў
Рэдактар Зміцер Колас
Кампутарны дызайн і вёрстка Павел Бокач
Карэктар Наталля Давыдзенка

Падпісана да друку 21.11.2000, Фармат 60х84 1/4. Папера афсетная, гарнітура Таймс.
Афсетны друк. Ум. друк. арк. 42. Улік.-выд. арк. 41. Наклад 1000 экз. Заказ____

Падатковая льгота – Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь
АК РБ 007-98, ч.1; 22.11.20.650

Выдавецтва ТАА "Энцыклапедыкс"
220100, г. Мінск, вул. Кульман 28-126, тэл. 206-64-87, 234-32-79
Ліцэнзія ЛВ № 395 от 02.08.1999 г.

Надрукавана ў друкарні "Мінсктыппраект".
Ліцэнзія ЛП № 162 ад 06.01.1998 г.
г. Мінск, вул. В. Харужай, 13/61

ISBN 985-6599-17-2

Хто ёсць Хто сярод беларусаў свету 2000